ВІТАЎТ ЧАРОПКА

ІМЯ Ў ЛЕТАПІСЕ



роговолодъ в беже в городъ. и приступивше и к городу. и взя
шаи. градъ полтескъ. и самого кнзя роговолода. и зыма.
и женоу его. и дщерь его:



добрыня поноси дщери его. и емоу. нарекше емоу робичича.
и повелѣ володимироу быти с нею. предъ оцемъ ея и мтрью.
и потомъ оца оуби. а самоу поя женѣ. и нарекоша имя
ей. горислава. и родъ изяслава. поя же паки. и ины жены
многи. и начаеи негодовати. нѣколи емоу пришедши к неи.
и оуснувшю. и хотѣ зарѣзати ножемъ. и клюся емоу оу
бити. и яю за роуко:



[illegible] за не оца моего оуби. и землю его полони.

лѣ ҂ѕ҃х҃лз҃. рестави. ярославъ стослави. в моромь.
в то же лѣто престави. михалко. вячислави. в то же лѣто.
поточи мстиславъ. кнзи полоцкие. ко црю градъ с женами и детьми



лѣ ҂ѕ҃х҃ли҃. посла мстиславъ сны своя. всеволода.
изяслава. ростислава. со дроужиною их начю. и взя
шаи. и дань на нихъ въ зложиша:



лѣ ҂ѕ҃х҃лѳ҃. нзъ велики и мстиславъ. ходи на литву
и в земъ полонъ многъ велми. и вратися за ся. в то
же лѣто. заложилъ мстиславъ. црквь. стые бци

ВІТАЎТ ЧАРОПКА

ІМЯ Ў ЛЕТАПІСЕ



2-ое выданне, дапрацаванае

ВЫДАВЕЦТВА
«БЕЛАРУСЬ»
2003

УДК 94(476)
ББК 63.3(4 Беи)
Ч-20

Мастакі *А.А.Александровіч*
Фотарэпрадукцыі *В.Я.Савіча, В.К.Чаропкі*

На форзацах: старонкі з Радзівілаўскага летапісу з апавяданнем пра Рагнеду і Рагвалода, замах Рагнеды на князя Уладзіміра, высылку полацкіх князёў у Візантыю

Чаропка В.

Ч-20 Імя ў летапісе / Вітаўт Чаропка. — 2-ое выд., дап. — Мн.: Беларусь, 2003. — 639 с.: іл.

ISBN 985-01-0387-6.

Распавядаецца пра гістарычных дзеячаў мінулага Беларусі: Рагвалода, Рагнеду, Святаполка Тураўскага, Брачыслава Ізяславіча, Усяслава Чарадзея, Глеба Менскага, Рагвалода Барысавіча, Уладзіміра Полацкага, Віценя, Гедыміна, Альгерда і інш. Асэнсоўваецца роля Беларусі ў палітычным жыцці Еўропы X—XV стст. Чытач даведаецца пра барацьбу Полацкага княства за сваю незалежнасць, пра ўтварэнне Вялікага княства Літоўскага, войны беларуска-літоўскай дзяржавы з Тэўтонскім ордэнам, Залатою Ардою, Маскоўскім княствам, Польшчай. Прыводзіцца шмат малавядомых гістарычных фактаў.

Першае выданне выйшла ў 1994 годзе.

Адрасуецца ўсім, хто жадае глыбей ведаць беларускую мінуўшчыну.

УДК 94(476)
ББК 63.3(4 Беи)

© Чаропка В., 1994.
© Чаропка В., 2003, са змяненнямі.
© Афармленне. УП «Выдавецтва Беларусь», 2003

ISBN 985-01-0387-6

АД АЎТАРА

Іншы раз, калі гартаеш кнігі па гісторыі Беларусі, так хочацца за фактамі і датамі гістарычных падзей убачыць людзей, пра якіх у летапісах, або дакументах, або манаграфіях напісана толькі некалькі радкоў, даведацца пра тое, як яны жылі, чаму радаваліся і аб чым сумавалі, прачытаць хоць адно моўленае імі слоўца, паглядзець на іх партрэты, каб наблізіць да сябе той далёкі час і стаць сведкам усяму, што некалі адбывалася.

Нічога новага не адкрыю, калі скажу, што гісторыя — гэта не толькі даты падзей і ясныя, на падставе сведчанняў сучаснікаў, факты (хаця іх, безумоўна, трэба ведаць, каб хтосьці не спекуляваў на гістарычнай неадукаванасці народа), але і духоўны скарб, які стагоддзямі збіраўся народам і жывіць яго-ную памяць, абуджае нацыянальную свядомасць. Гэта таксама маральныя ўрокі, што засцерагаюць нас ад паўтарэння памылак. Гэта і запавет любіць і шанаваць сваю Бацькаўшчыну, запавет, перададзены нам бацькамі і дзядамі.

Уся дакастрычніцкая гісторыя Беларусі раней, у савецкія часы, у выкладанні школьных падручнікаў уяўляла сабой міфы пра так званую заваёву Беларусі літоўскімі феадаламі, адпаведна жорсткі прыгнёт беларусаў і іх векавую мару ўвайсці ў Расійскую імперыю, міфы аб занядбанасці культуры і асветы, у параўнанні з якімі гэтак грандыёзна выглядаюць дасягненні паслякастрычніцкага часу — шматлікія перамогі (калгаснага ладу, індустрыялізацыі) і росквіты (культуры, навукі і г.д.). Захутаўшыся ў вопратку праўды, пані догма вадзіла за ручку многіх нашых гісторыкаў, і яны загіпнатызавана крочылі па зачараваным коле. Гіпноз пазбаўляў іх волі, свайго розуму, свайго меркавання.

У дагоду догме ад беларускай гісторыі адлучылі палітычных і вайсковых дзеячаў нашага мінулага. Адных, як выдатнага важара, пераможцу шведскіх і турэцкіх войскаў Яна-Карла

Хадкевіча або Льва Сапегу, што падрыхтаваў трэцяе выданне «Статута Вялікага княства Літоўскага», называлі польскімі феадаламі; другіх, напрыклад вялікіх князёў літоўскіх, толькі па тытулу прылічылі да літоўцаў, ігнаруючы іх беларускае паходжанне, тое, што размаўлялі яны ў сваім жыцці па-беларуску; трэціх — Усяслава Чарадзея, Канстанціна Астрожскага — адносілі да рускіх, хаця ў рускіх летапісах полацкія князі называюцца крыўскімі, а гетман Астрожскі ніколі не служыў рускім. Найчасцей усе яны паўставалі «жорсткімі прыгнятальнікамі беларускага народа». А гэтыя «прыгнятальнікі» са зброяю ў руках баранілі Беларусь ад ворагаў, гінулі ў сечах за вольную Бацькаўшчыну, выдавалі кнігі, будавалі храмы, зберагалі і ўзбагачалі нашу спадчыну. І лёс не быў да іх літасцівы. Зведалі яны страты, і прыніжалі іх, і кідалі ў вязніцы, рэдка каго з іх абрала сваім улюбёным слава, многія ізгоямі жылі ўдалечыні ад Айчыны і часта, што задумвалі здзейсніць, не ажыццявілі. Яны былі сынамі свайго часу, а таму не пазбаўлены прымхаў і грубасці, жорсткасці і фанабэрыі. Добрае і злое, нізкае і высокае жывуць у чалавеку.

Я думаю пра герояў маёй кнігі. Памяць пра іх — гэта памяць і пра нас, нашчадкаў мінулай славы і дзеяў: забудземся іх — не ўспомняць і нас тыя, хто ідуць следам.

РАГВАЛОДАЎ РОД





РАГНЕДА І РАГВАЛОД
(?—1000) (?—980)
Мініяцюра Радзівілаўскага летапісу. *XVI ст.*

РАГВАЛОД, РАГНЕДА



агвалод, Тур, Рагнеда, Ізяслаў — першыя вядомыя нам гістарычныя асобы старажытнай Беларусі. З іх імёнамі беларуская гісторыя перастае быць безасабоваю і ананімнай.

Доўгім быў шлях нашых продкаў да той вяхі, калі летапісцы занеслі ў аналы дзеі Рагвалода і яго дачкі Рагнеды. З якога стагоддзя пачаўся адлік гэтага шляху? Багатая на падзеі, гераічная і слаўная гісторыя была ў нас і да часоў Рагвалодавых. Ды шкада, што вельмі мала дайшло звестак пра жыццё крывічоў, дрыгавічоў і радзімічаў да іх перасялення на землі сучаснай Беларусі, а таксама пра жыццё легендарных неўраў і волатаў. З «Жыція Дзмітрыя Салунскага» даведваемся мы пра вольналюбівых дрыгавітаў, якія ваявалі ў VII стагоддзі з Візантыяй. Няшмат ведаем і пра гісторыю нашых далёкіх продкаў пазнейшых часоў, іх паходы на Візантыю, барацьбу з варагамі, з кіеўскімі князямі Аскольдам і Дзірам. Як міф успрымаецца цяпер намі аповяд ісландскай сагі аб вайне палачанаў пад кіраўніцтвам князя Уладзіміра супраць готаў і гунаў.

Рагвалод стаў першым, чыё імя не згінула ў невядомасці стагоддзяў. Летапіс паказвае яго самастойным валадаром Полацкага княства: «Роговолоду держащю и владеющю и княжащю Полотьскую землю»[1]. Хто ж такі быў Рагвалод? У летапісе сказана, што прыйшоў ён «и-заморья, имяше свою волость в Полотьске»[2]. Некаторыя гісторыкі лічаць Рагвалода славянінам, іншыя варагам. Вядома, што імя Рагвалод сустракалася ў чэхаў[3]. Аднак яно, як і імя Рагнеда, паходзіць з нарвежскай мовы. Па-нарвежску Рёгнвальд (Рагнвальд) азначае «богападобны валадар», а Рагнеда — Рогнэйтр (Рагнхейд) — «прыгожая, як багіня»[4]. Нарвежскім з'яўляецца імя Рагвалодавага брата Туры. Тады летапіснае паведамленне аб прыходзе Рагвалода ў Полацк «и-заморья» сведчыць аб яго скандынаўскім паходжанні.

Гэта дало магчымасць гісторыку М.Бяляеву выводзіць Рагвалода з нарвежскай каралеўскай дынастыі Інглінгаў — нашчадкаў Харальда Прыгожавалосага. У Харальда ад чараўніцы Снефрыд нарадзіўся сын Рёгнвальд. Нашчадкі гэтага Рёгнвальда, па меркаванні Бяляева, перасяліліся на Русь і сталі правіць у Полацку[5]. Гістарычнага пацвярджэння гэтай версіі няма.

З'яўленне Рагвалода ў Полацку не было выпадковым. Летапіс не паведамляе аб заваёве Полацка Рагвалодам, але ўказвае, што ён меў «свою волость в Полотьске». Значыць, улада ў Полацку Рагвалоду дасталася па спадчыне. Магчыма, ён быў звязаны дынастычнымі сувязямі з полацкім княжацкім родам. Вядома, што ў гэтым родзе было папулярным жаночае імя Прадслава. Яго насіла дачка Рагнеды, а таксама славутая Ефрасіння Полацкая. Верагодна, гэтае імя давалі ў гонар княгіні Прадславы, пра якую ўзгадвае пад 945 год «Аповесць мінулых гадоў», але не паведамляе, дзе яна княжыла. Праўдападобна, яна была полацкай княгіняй. А Рагвалод мог ажаніцца на яе дачцэ і такім чынам стаць полацкім князем. Пэўна, менавіта ў гонар сваёй бабулі Рагнеда назвала дачку Прадславай.

Іншую трактоўку з'яўлення Рагвалода ў Полацку падае ў сваіх гістарычных запісках імператрыца Кацярына II, якая карысталася многімі не вядомымі нам крыніцамі. Яна пісала, што Рурык паслаў у Полацк «князя Рохвольда, родственника своего», але сутыкнулася з неадпаведнасцю свайго паведамлення з гістарычнымі фактамі. Рагвалод упамінаецца больш за сто гадоў пазней за Рурыка. Выхад з гэтай неадпаведнасці быў знойдзены даволі арыгінальна. «Вероятно, что у князя Рохвольда сын был Рохвольд же. Сей скончался в 976 годе, а ежели не так, и Рохвольд I скончался в 976 году, то сему князю, пришедшим со князем великим Рюриком I тогда было полтораста лет, о чем однако нигде не упомянуто»[6]. І зразумела чаму — такі муфасаілаўскі ўзрост практычна немагчымы, а значыць, Рагвалод не быў сучаснікам Рурыка.

Летапіснае паведамленне аб Рагвалодавым прыходзе з-за мора можна ўспрымаць як паданне, што склалася ў Полацку аб усласным княжацкім родзе, роўным па знатнасці Рурыкавічам, аб чым сведчыла яго варажскае паходжанне. А можна тлумачыць гэтае паведамленне інакш. Нагадаем, што ў канцы IX стагоддзя Полацк заваявалі кіеўскія князі Аскольд і Дзір, і, верагодна, полацкія князі, ратуючыся ад смерці, уцяклі да паморскіх славянаў або на востраў Ругію ці да нарманаў. Ужо ў сярэдзіне X стагоддзя, скарыстаўшы тое, што Кіеўская Русь ваявала з Іудэя-Хазарыяй, нашчадак князёў-уцекачоў Рагвалод вярнуўся на зямлю бацькоў як законны яе ўладар, на што і ўказвае летапіс: «...имяше свою волость в Полотьске».



А.Ласенка. Уладзімір сватаецца да Рагнеды. *1770 г.*

Аналогію ўскняжання ў Полацку Рагвалода або ягонага бацькі мы знойдзем у складзенай у IX стагоддзі сазе пра Дзітрыка Бернскага. Паводле сагі, князь вільцінаў (волатаў-люцічаў) Вількін заваяваў Польшчу, Полацк і Смаленск, а пасля і сталіцу рускага конунга Герніта Ноўгарад. Рускі конунг павінен быў плаціць Вількіну даніну, аднак пасля ягонай смерці Герніт скарыў вільцінаў. Ці не пераказ гэта рэальных падзей: ускняжання ў крыўскіх землях люціцкага князя. Ягонае з'яўленне ў Полацку не выпадковае. Люцічы — гэта волаты, якіх народныя паданні называюць ранейшымі жыхарамі старажытнай Беларусі, і ў прыватнасці Полаччыны. Верагодна, крывічы і дрыгавічы ўваходзілі ў люціцкі саюз, прынамсі археалагічныя помнікі крывічоў і люцічаў вельмі падобныя. Сага ўказвае, што краіна вільцінаў межавала з Полацкай зямлёй. А ці

не Літва гэта, якая раней называлася Лютва або Лютава, а літвіны — лютвінамі? Літвінскія летапісы захоўвалі памяць, што полацкія князі па паходжанні літвіны. Пацвярджае летапісныя звесткі і руская быліна пра Дуная. Полацкі князь названы ў быліне каралём літоўскім.

Калі зірнуць на мапу рассялення крывічоў, убачым, што яны займалі вялізную прастору ад Верхняга Панямоння да вярхоўя Волгі, а з поўначы на поўдзень — прастору ад Чудскага возера да лініі ўпадзення Свіслачы ў Бярэзіну. Крывічы валодалі вярхоўямі Нёмана, Дзвіны, Дняпра і Волгі — вузламі галоўных гандлёвых шляхоў Усходняй Еўропы. Склалася сапраўдная крыўская імперыя са сталіцай у Полацку. Летапіс і сцвярджае гэта, гаворачы аб крывічах, «еже живут на верх Волги и на верх Двины и на верх Днепра, их же град есть Смоленск и прочии Полотьские власти»[7]. Аднак, калі пад 865 год пры Аскольдзе і Дзіры Полацк быў захоплены іх войскамі, парушылася былое адзінства крыўскіх земляў. Пры Алегу яго ўладу прызналі ізборскія, пскоўскія і смаленскія крывічы. Крыўскае «княжанне» перастала існаваць.

І вось Рагвалод аднавіў незалежнасць палачанаў. Але гэтым ён не абмежаваў сваёй дзейнасці. У яго на мэце было аб'яднанне ўсіх крыўскіх і дрыгавіцкіх земляў пад уладай Полацка. Полацкі князь ажыццяўляе паход на Палессе. Народнае паданне, запісанае ў 70-ых гадах XIX стагоддзя, даносіць да нас некаторыя дэталі гэтага паходу. Рагвалод з вялікім войскам спусціўся на ладдзях па Дняпры да вусця Прыпяці. Тут ён спыніўся, каб загарадзіць шлях кіеўскаму войску, і выслаў уверх па Прыпяці дружыну пад зверхнасцю Тура (ва Усцюжскім летапісе ён названы братам Рагвалода). Падначаліўшы дрыгавіцкія і яцвяжскія землі, Тур заклаў на Прыпяці горад і назваў яго сваім імем — Тураў[8]. Выгадным было геаграфічнае размяшчэнне Турава: у гэтым месцы ў Прыпяць упадалі буйнейшыя прытокі — Піна, Ясельда, Случ, Гарынь, Убараць, якія звязвалі новы град з басейнамі Нёмана і Заходняга Буга. Паводле звестак Кацярыны II, Тур памёр бяздетным.

Услед за заваёвай Дрыгавіцкай зямлі Рагвалод пачаў вайну з Ноўгарадам, жадаючы вярнуць пскоўскія ды ізборскія землі[9].

Верагодна, і на гэты раз Рагвалод дамогся перамогі. Гэтак, у «Хроніцы з летапісцаў старадаўніх» Феадосія Сафановіча Рагвалод названы пскоўскім князем[10]. Звесткі Сафановіча заслугоўваюць веры, бо ён карыстаўся летапісамі, якія не дайшлі да нашага часу, у прыватнасці Залатаверхім летапісам, які болей поўна збярог тэкст арыгінала Пачатковага Зводу, чым ягоныя рэдакцыі. З далучэннем да Полацкага княства Турава і Пскова



Андэрсан. Замах Рагнеды на Уладзіміра. *1836 г.*

Рагвалод стаў адным з магутнейшых уладароў ва Усходняй Еўропе*.

Тым часам на Русі наспявалі крывавыя падзеі. Пасля гібелі ад печанегаў вялікага князя Святаслава ў Кіеве правіў яго старэйшы сын Яраполк, у Чарнігаве — Алег, а ў Ноўгарадзе — пазашлюбны сын Уладзімір. Увесну 975 года чарнігаўцы забілі сына Яраполкавага ваяводы Свенельда.

---

*Рускі гісторык В.Таціщчаў, які карыстаўся шэрагам страчаных летапісаў, пісаў, што Рагвалод апроч Полацка «Мурамам і Туравам валодаў» (Татищев В.И. История Российская. Т. 1. С. 297.)

Праз два гады Яраполк напаў на Чарнігаўшчыну. Каля Оўруча кіеўскія і чарнігаўскія дружыны сустрэліся ў бітве. Не вытрымаўшы ўдару кіеўскіх войск, якімі верхаводзіў Свенельд, чарнігаўцы разам з Алегам кінуліся ратавацца за гарадскімі сценамі. На мосце цераз роў узнікла даўка: многа вояў сарвалася ўніз і загінула, сярод іх і Алег.

Гэтыя падзеі ўстрывожылі Уладзіміра і яго дзядзьку Дабрыню. Было ясна, што рана ці позна Яраполк захоча расправіцца і з Уладзімірам. І яны не памыліліся: Яраполк не стаў цярпець у Ноўгарадзе ўладу зводнага брата. Уладзімір і Дабрыня ўцяклі з горада і два гады збіралі войска. На думку гісторыка І.Забеліна, уцекачы знайшлі прытулак «у славянскіх памаранаў, быць можа, на самым востраве Ругене, у тутэйшых русаў, або ў Шчэціне, ці ўласна ў славянаў у Славоніі бліжэй да вусця Віслы»[11].

Здавалася, становішча Яраполка было моцнае і надзейнае: ён расправіўся са сваімі ворагамі, і нішто не абяцала ў бліжэйшы час бяды і небяспекі. Ды вось нечакана ў 980 годзе Уладзімір і Дабрыня са сваімі наймітамі наляцелі на Ноўгарад, прагналі адтуль кіеўскага намесніка і загадалі перадаць Яраполку: «Уладзімір ідзе на цябе. Рыхтуйся біцца з ім»[12].

І Яраполк, і Уладзімір шукалі саюзу з Рагвалодам: у будучай вайне многае вырашалася ад таго, на чыім баку выступіць полацкі князь. Палачане кантралявалі водныя шляхі, што злучалі Ноўгарад і Кіеў, і саюзнік мог без перашкод правесці па іх войскі. Акрамя таго, ён мог атрымаць значную дапамогу ад полацкай дружыны. І вось амаль адначасова з Ноўгарада і з Кіева да Рагвалода прыбываюць сваты, каб высватаць ягоную дачку — прыгажуню Рагнеду*. Паводле летапісу, Рагвалод спытаўся ў дачкі: «Ці хочаш ісці за Уладзіміра?». Яна ганарліва адказала: «Не хачу разуць сына рабыні, а хачу за Яраполка»[13]. Хутчэй за ўсё гэты выбар не быў выбарам самой Рагнеды, выбіраў Рагвалод і выбраў у Яраполка. Яно і зразумела: Яраполк — законны ўладар Русі, а хто такі Уладзімір — незаконнанароджаны сын Святаслава ад ключніцы Малушы, які не мае правоў на кіеўскі пасад. І вуснамі Рагнеды Рагвалод ясна мовіў, каго ён падтрымлівае. У гэтым становішчы для Уладзіміра засталося адно выйсце: не марудзіць, не даць саюзнікам аб'яднацца, расправіцца з імі паасобку.

Атрымаўшы ад Рагнеды адмову, наўгародскі князь выступіў на Полацк. Ён вёў больш чым двухтысячны атрад шведскіх наймітаў пад зверхнасцю ярла (ваяводы) Фуліера, наўгарод-

---

*У «Хроніцы» Ф.Сафановіча Рагнеда названа сястрой Рагвалода. Ф.Сафановіч. Хроніка з літописців стародавніх. С. 69.



І.Мядзведзеў. Рагнеда, Ізяслаў і Уладзімір. *Канец XIX ст.*

скую дружыну, атрады чудзі (эстаў), ізборскіх і пскоўскіх крывічоў. Усё войска складала больш за дзесяць тысячаў вояў[14]. Летам таго ж года Уладзіміра войска на ладдзях з возера Ільмень па Лавоці дабралася да вярхоўя Заходняй Дзвіны і праз валокі перацягнула караблі ў Дзвіну, па якой і падступіла да сцен Полацка[15]. Рагвалод выйшаў насустрач ворагу і быў разбіты. Пасля моцнага штурму Уладзімір захапіў Полацк.

Горад быў разрабаваны і спалены. Палоннага Рагвалода разам з сям'ёй прывялі да Уладзіміра. Не, не высакароднасць, не

літасць праявіў будучы хрысціцель Русі. Жорсткая расправа чакала полацкага князя. На ягоных вачах Уладзімір згвалціў Рагнеду, а пасля забіў жонку, двух сыноў і самога Рагвалода. Становіцца не па сабе, калі ўяўляеш гэтую дзікую сцэну. У адно імгненне гінулі, ляцелі ў бездань забыцця ўсё свядомае Рагвалодавае жыццё, надзеі, мары. У адно імгненне не стала блізкіх і дарагіх яму людзей. За гэта імгненне перажыў ён столькі, што іншаму і за ўсё жыццё не наканавана. Ды лепш ён загінуў бы ў сечы, чым бачыць, як пад рогат заваёўнікаў Уладзімір растаптаў гонар яго дачкі, чуць апошнія ўздыханні сыноў і жонкі.

Уладзімір задаволіў сваё звярынае жаданне помсты. Рагвалод пераможаны і забіты, ганарлівая Рагнеда абражана. Вось табе «сын рабыні»! Ён падараваў ёй жыццё. Толькі што гэта было за жыццё? З забойцам родных, нялюбым, якога ўсім сваім сэрцам ненавідзела. Гораснае жыццё! І празвалі яе ў народзе Гарыславай.

Яраполк, даведаўшыся аб заваёве Полацка, паслаў на Уладзіміра сваіх ваявод. І куды падзелася Уладзімірава смеласць? У жаху ён ужо гатовы быў уцякаць у Ноўгарад, і толькі Дабрыня ўтрымаў яго. Довад Дабрыні аказаўся пераканаўчым: «Яраполк не любімы ёсць у людзей, бо хрысціянам даў волю вялікую»[16]. І сапраўды, Яраполк, сам паганец, прыхільна ставіўся да хрысціян, што жылі ў Кіеве. А гэта прыйшлося не даспадобы баярам-паганцам. Яны не без падстаў прадчувалі, што Яраполк падумвае аб хрышчэнні Русі. Вось тут і нарадзілася ў ваяводы Блуды задума замяніць Яраполка на зацятага паганца Уладзіміра. Блуд са сваімі прыхільнікамі папярэдзілі Дабрыню аб гэтым намеры.

На рацэ Дручы абодва войскі сустрэліся. Дабрыня задобрывае кіеўскіх ваявод падарункамі, падгаварыўшы іх здрадзіць Яраполку. І Уладзімір «...победиша полки Ярополка не силою, не храбростию, но предательством воевод Ярополчих»[17].

У абозе Уладзіміра ехала ў Кіеў і Рагнеда. Пэўна, той, хто ведаў яе раней, з цяжкасцю пазнаў бы ў гэтай маўклівай жанчыне ранейшую дзяўчыну-прыгажуню. Лёс асуджаў яе на новыя пакуты: дзяліць ложа з чалавекам, якога яна ненавідзела. Што заставалася ёй? У самыя адчайныя хвіліны, калі не хацелася жыць, памятала: яна апошняя ў родзе Рагвалодавічаў, і насуперак прыніжэнням і гору, ёй трэба жыць. Быць можа, начамі, уткнуўшыся тварам у далоні, яна плакала. Беззваротна загінула былое, але не загінула памяць аб ім.

І зноў «не силою, не храбростию, но предательством» перамог Уладзімір Яраполка. Ён паслаў сваіх людзей да Блуда: «Будзь мне сябрам! Калі заб'ю брата майго, дык буду шанаваць цябе, як бацьку, і ўшану вялікую атрымаеш ад мяне, не я пачаў забіваць братоў, але ён. Я, спалохаўшыся гэтага, выступіў супраць яго»[18].

Блуд згадзіўся і перадаў паслам: «Буду з табою ў любові і сяброўстве»[19]. Ён запэўніў Яраполка, што Уладзімір не адважыцца напасці на Кіеў: «Гэта ўсё роўна, як сініца пайшла ваяваць на арла... Чаго нам баяцца і збіраць войска? Дарэмная праца будзе і для цябе, і для ратных людзей»[20]. І Яраполк паслухаў. А калі да Кіева падышоў Уладзімір, у кіеўскага князя не было дастаткова войска, каб абараніць горад. Яраполк запёрся ў сценах крэпасці на Старакіеўскай гары. Аблога цвержы зацягнулася. Блуд пачаў нагаворваць Яраполку на дружыну: маўляў, воі жадаюць выдаць цябе Уладзіміру, трэба ўцякаць да печанегаў. І на гэты раз Яраполк паслухаўся Блуда і разам з ім уцёк у Родню — памежны горад на рацэ Росі, прытоку Дняпра. Уладзімір без бою авалодаў Кіевам і адразу пагнаўся за братам. Родня была ўзята ў аблогу. У горадзе пачаўся голад. А Блуд нашэптваў Яраполку: «Бачыш, колькі воінаў у брата твайго? Нам іх не перамагчы. Заключай мір з братам сваім». Яраполк пакінуў і Родню. Аднак Блуд раіў: «Пайдзі да брата свайго і кажы яму: «Што ты мне ні дасі, тое я і прыму»[21]. Пазбаўлены волі і веры ў перамогу, Яраполк адправіўся да Уладзіміра і напаткаў смерць ад мячоў варагаў. А пераможцу дастаўся велікакняжацкі пасад.

Сын рабыні стаў вялікім князем кіеўскім. Можна было пацешыць самалюбства, зрабіць Рагнеду наложніцай, зноў прынізіць ганарлівую палачанку. Але ўсё-такі Рагнеда была полацкай князёўнай, і, ажаніўшыся з ёю, Уладзімір як яе муж станавіўся ўспрыемнікам княжацкай улады на Полаччыне.

Ішоў час — князь быў заняты дзяржаўнымі справамі: паходы, збор даніны, пашырэнне межаў сваёй дзяржавы. А доля жонкі празаічная і разам з тым вечная і святая — выношваць і песціць новае жыццё. Чатырох сыноў нарадзіла Рагнеда свайму мужу: Ізяслава, будучага вялікага полацкага князя, Яраслава, будучага вялікага князя кіеўскага, Мсціслава, будучага цьмутараканскага князя, пераможцу Хазарскага каганату, Усевалада, будучага заснавальніка Уладзіміра-Валынскага. Дала жыццё яна і дзвюм дачкам: Прадславе (яе напаткаў матчын лёс: да яе сватаўся польскі князь Баляслаў, якому адмовілі; калі ж ён захапіў Кіеў, дык забраў князёўну ў палон) і Дабранезе, будучай жонцы польскага князя Казіміра, маці польскіх князёў Баляслава Храбрага і Уладзіслава I [22].

З усіх сваіх жонак, а ў яго было іх чатыры, Уладзімір аддаваў перавагу Рагнедзе. Не, гэта не каханне. Ці мог кахаць Рагнеду чалавек, які на вачах сваіх слуг згвалціў яе, а пасля забіў яе бацькоў і братоў, чалавек, пра якога летапісец паведамляў: «И был он ненасытен в блуде, приводя к себе замужних женщин, и растлял девиц...»?[23] Думаецца, не. Відаць, Уладзімір, памятаючы аб сваім паходжанні (сын рабыні), хацеў, каб маці яго дзя-

цей была прадстаўніцаю знатнай княжацкай сям'і. Тым самым ён жадаў падняць іх прэстыж у вачах баярства і простага люду.

Міналі гады. Але час не вылечыў былы боль. Памятала Рагнеда пра той жахлівы дзень, па-ранейшаму ненавідзела Уладзіміра. З Уладзімірам бачыліся яны рэдка. Не частым госцем быў ён у Лыбедзі, вёсцы каля Кіева, дзе жыла з дзецьмі Рагнеда. Князь прападаў у паходах, а вярнуўшыся ў Кіеў, займаўся дзяржаўнымі справамі ці баляваў са сваёй дружынай, а часцей наведваў наложніц, каб спатоліць ненасыцства блуднае. Ды і васьмісот наложніц не хапала яму, тады прыводзілі прыгожых жанчын, якіх упадабала княжацкае вока. Было, што князь згадваў і пра Рагнеду, прыязджаў да яе словам-другім перамовіцца і зірнуць на дзяцей. У час аднаго такога прыезду князь застаўся начаваць у Лыбедзі. Вось тады і вырашыла княгіня адпомсціць мужу за ўвесь той здзек з яе Айчыны, з бацькоў і з яе самой. Калі князь спаў, Рагнеда з кінжалам у руцэ падышла да ягонага ложка, схілілася над ім. Уладзімір раптам прачнуўся і перахапіў Рагнедзіну руку з кінжалам. Ён тут жа ўскочыў. На пытанне, чаму яна хацела яго забіць, Рагнеда адказала: «За тое, што бацьку майго забіў і зямлю яго паланіў і не любіш ні мяне, ні сваіх дзяцей». На расправу ён быў і цяпер хуткі: загадаў княгіні рыхтавацца да смерці, апрануцца ў шлюбнае. Пасля таго як Уладзімір выйшаў з пакоя паклікаць слуг, Рагнеда дала меч старэйшаму сыну Ізяславу і мовіла: «Калі бацька прыйдзе сюды, скажы яму: «Ты не адзін тут». Ізяслаў так і зрабіў. Калі Уладзімір вярнуўся, падняў на яго меч: «Ты не адзін тут». Гэтага князь не чакаў, ён збянтэжана адказаў: «А хто ведаў, што ты тут?» Сынавы словы і жэст выратавалі Рагнеду. На баярскай радзе баяры параілі Уладзіміру: «Ужо не забі яе дзеля дзіцяці гэтага, але аднаві айчыну яе і дай ёй з сынам сваім»[24].

Не з добрай ласкі згадзіўся Уладзімр аднавіць полацкае княства і пасадзіць там князя. Полаччына не скарылася. Тое, што не занатавалі летапісы, захоўвалася ў народнай памяці. Паводле быліны аб Іллі Мурамцу, у часы Уладзіміра на Чарнігаўскую зямлю «наехала» Літва. І легендарны Салавей-разбойнік мог быць рэальнай асобай — правадыром літвіна-крыўскага паўстання супраць заваёўнікаў. Лес, дзе засеў Салавей, названы Крывым, так звычайна называлі мясцовасці, звязаныя з крывічамі, напрыклад Крывы горад, Крывая гара. А імя Салаўя па бацьку Адзіхмант супадае з літвінскімі імёнамі тыпу Ямант, Нарымонт, Пасімонт і г.д. Так што ёсць падставы сцвярджаць, што Полацк працягваў вайну за сваю незалежнасць. Кіеў прызнаў сваё бяссілле перад ім. А цяпер самы час і прымірыцца з Полацкам. Уладзімір пабудаваў горад, які назваў Ізяслаўлем, і адправіў туды Рагнеду са старэйшым сынам. Але



Пячатка князя Ізяслава. *X ст.*

чаму з Рагнедай адправіўся Ізяслаў? Мог жа Уладзімір пакінуць яго пры сабе, як пакінуў другіх Рагнедзіных дзяцей.

У нашай гісторыі шмат таямніц і загадак. І не ўсё таемнае становіцца яўным. Многія тайны паміраюць разам з тымі, хто ведаў іх. Гісторык С.Анінскі пісаў: «Спрадвечнай княжацкай дынастыяй, якая спадчынна кіравала Полацкам, былі Рагвалодавічы. Шэраг абставін (своеасаблівасць імён гэтай дынастыі, амаль пастаянная ізаляванасць полацкай палітыкі ад палітычнага жыцця Рурыкавічаў, родавая нянавісць і стогадовая барацьба паміж нашчадкамі Рагвалода і «ўнукамі Яраслава» ў 1021—1129 гадах дазваляе думаць, што «ўнукі Рагвалода» не належалі да Рурыкавічаў, таму і першы з іх, Ізяслаў, сын Рагнеды, не мог быць сынам Уладзіміра»[25]. Калі дапусціць верагоднасць гэтага меркавання, дык няўмольна паўстае пытанне: хто бацька Ізяслава? Іншую версію вылучыў Паўла Урбан. Паводле яе, Рагнеда была жонкай Рагвалода. Ён дапускае, што канфлікт паміж Полацкам і Ноўгарадам адбыўся ў 971 годзе, калі полацкі князь «повоева волости Новогородские». У гэтай вайне Рагвалод загінуў. Пазней, калі Уладзімір перамог Яраполка, ён ажаніўся на Рагнедзе, а ў Полацку стаў княжыць Рагвалодаў сын Ізяслаў[26]. Пэўна, таму нашчадкі Ізяслава называліся «Рогволожи внуци». У такім выпадку гісторыя помсты Рагнеды Уладзіміру толькі прыгожая легенда, якая тлумачыла чаму «мечь взимають Рогволожи внуци противу Ярославлим внуком»[27].

Хоць летапісы і маўчаць, але можна думаць, што, пакуль Ізяслаў не вырас, Рагнеда кіравала Полацкім княствам. Але лёс рыхтаваў княгіні новае выпрабаванне. У 988 годзе Уладзімір з палітычных меркаванняў прымае хрысціянства і жэніцца з сястрою візантыйскага імператара Васіля II, Ганнаю. Давялося адмовіцца ад наложніц і жонак. У Ізяслаўль князь шле Рагнедзе загад: «Цяпер, хрысціўшыся, павінен я мець адну жонку, а ты выберы сабе мужа з маіх

князёў і баяраў, каго пажадаеш». І на гэты раз Рагнеда аказалася духоўна прыгажэйшай і высакароднейшай за свайго былога мужа. Горда адказала яму: «Царыцай я была, царыцай і застануся, і нічыёй рабыняй не буду. А калі ты хрысціўся, дык я буду нявестай Хрыстовай»[28]. У гэтых словах — нескароны дух Рагнеды. Вымушаная грубай сілай стаць жонкай нялюбага, абражаная ім, яна захавала свой жаночы гонар, не стала яго рабыняй, не даравала яму ні забойства бацькоў, ні спусташэння Айчыны, ні здзекаў з сябе. І цяпер не збіралася паслухмяна выконваць Уладзіміраву волю. Але Уладзімір мог гвалтам аддаць яе за аднаго са сваіх баяраў, і таму, каб пазбегнуць гэтага, Рагнеда прымае манаства. Яна заснавала пад Ізяслаўлем, першы ва Усходняй Еўропе жаночы манастыр і пастрыглася пад імем Анастасія. Адсюль, з Ізяслаўскага манастыра, і пачало пашырацца на Полаччыне хрысціянства.

Праз дванаццаць гадоў, на парозе XI стагоддзя, Рагнеда памерла. Паводле падання, яе пахавалі на гары паўвостраў Перавоз, паміж вусцем рэчкі Ушы, якая ўпадае ў возера Дрысу, і вытокам рэчкі Дрысы, што выцякае з яго. На гэтым месцы нібыта быў забіты князь Рагвалод[29]. Памяць пра гордую і палымяную полацкую княгіню доўга жыла ў народзе. Яшчэ ў XIX стагоддзі этнографы запісвалі паданні аб Рагнедзе.

На год пазней за сваю маці (1001 год) памёр Ізяслаў, пражыўшы дзесьці каля дваццаці трох гадоў. Ніканаўскі летапіс з пахвалою паведамляе аб полацкім князі: «Бысть жа сий князь тих и кроток, и смирен, и милостив, и любя зело и почитая священнический чин иноческий, и прилежаще прочитанию божественных писаний, и отвращаяся от суетных глумлений, и слезен, и умилен, и долготерпелив...»[30] Ізяслаў ахарактарызаваны ў летапісе як кніжнік і асветнік. А Ізяславава пячатка з надпісам ад граматы з'яўляецца першым помнікам усходнеславянскага пісьменства.

Пасля смерці Ізяслава полацкі пасад займалі яго сыны Усяслаў і Брачыслаў. Княжацкая дынастыя Рагвалодавічаў не перарвалася. Аднаўленне Полацкай зямлі адбылося! І сімвалічна, што хрысціянскае імя Рагнеды Анастасія азначае ўваскрашэнне!

«АКАЯННЫ»





СВЯТАПОЛК
(?—1019)
Выява на манеце. ***XI ст.***

СВЯТАПОЛК

Не назавеш лёс гэтага чалавека незвычайным. Гісторыя ведае не адзін прыклад, калі пасля смерці таго ці іншага валадара паміж яго сынамі распачыналася крывавая барацьба за бацькоўскі пасад. Хто перамог — той і кіруе дзяржавай. Ну, а лёс пераможанага — сумны, трагічны: ці ізгоем туляецца ён па чужыне, ці гіне ад мяча пераможцы. Тое самае здарылася і з тураўскім князем Святаполкам, які прайграў вайну за кіеўскі пасад Ярославу Мудраму і вымушаны быў уцякаць на чужыну, дзе і памёр. Незвычайнае пачалося пасля Святаполкавай смерці. Воляю заказчыкаў «Аповесці мінулых гадоў» — кіеўскіх князёў Святаполка Ізяславіча і Уладзіміра Манамаха — Святаполк быў аб'яўлены забойцам сваіх братоў Барыса, Глеба і Святаслава. Так і ўвайшоў ён у гісторыю як хцівы забойца сваякоў, названы летапісцам Каінам і Акаянным.

Неспакойнаю выдалася старасць вялікага князя кіеўскага Уладзіміра Святаславіча. Бунтавалі смерды, не жадаючы прымаць новай веры, паказвала свой нораў баярская знаць, непакоілі і знешнія ворагі, не заціхала вайна з ляхамі. Толькі намаганнем апошніх сіл удавалася Уладзіміру падтрымліваць хоць нейкі парадак у сваёй агромністай дзяржаве, трымаць ва ўладзе гарады і землі. Але асабліва засмучалі князя сыны. Не было паміж імі любові і яднання, кожны думаў пра сваю выгоду, жыў сваімі інтарэсамі. Яраслаў сядзеў у Ноўгарадзе, Барыс, сын ад Ганны, — у Растове, Глеб, таксама сын ад Ганны, — у Мураме, Святаслаў кіраваў Драўлянскаю зямлёй, Мсціслаў — Цьмутараканню. Святаполка, які быў сынам Яраполка (яго маці — грачанка Прэслава), Уладзімір пасадзіў у Тураве, і невыпадкова. Князь ведаў, што Святаполк ненавідзіць яго за забойства бацькі і пазбаўленне права на велікакняжацкі кіеўскі пасад. У эканамічна неразвітым Палессі пасынку цяжка было б

сабраць моцнае войска для вайны супраць вялікага князя. Ды і з Кіева можна было кантраляваць становішча ў Тураве. Відаць, Уладзімір адаслаў Святаполка ў Тураў яшчэ малалетнім (10—12 гадоў). Кіеўскія войскі захапілі Тураў і хрысцілі тураўцаў. Паданне распавядае, што пасля Тура ў горадзе правіў уладыка, пэўна, епіскап, які апекаваўся над малалетнім князем[1].

Пасталеўшы, Святаполк стаў праводзіць палітыку на адасабленне Тураўскага княства ад Кіева, нават пачаў чаканіць свае грошы. Не выключана, што з Турава ён перабраўся ў Пінск, дзе, паводле Суздальскага летапісу, збіраў вояў. Але для барацьбы з Кіевам патрэбны быў моцны саюзнік. І Святаполк знайшоў яго — польскі князь Баляслаў, які беспаспяхова адваёўваў у Русі Чэрвеньскую зямлю*. Ажаніўшыся з дачкою польскага князя, тураўскі ўладар заручыўся яго падтрымкай. Да Святаполка ад Баляслава прыехаў духоўнік яго дачкі біскуп Рэйнберн. Прыбыў ён з «асобым» заданнем: падрыхтаваць змову супраць Уладзіміра, скінуць яго і пасадзіць на велікакняжацкі пасад Святаполка. Рэйнберн усталяваў сувязі з кіеўскай баярскай апазіцыяй і святарствам, перацягнуўшы на свой бок епіскапа Анастаса.

Відаць, паход Баляслава ў 1013 годзе супраць Русі быў здзейснены з мэтай ажыццяўлення Святаполкавых задум. За гэтую дапамогу Святаполк, мабыць, абяцаў саступіць цесцю Чэрвеньскую зямлю. Паход сарваўся з-за хваляванняў печанегаў, якія далучыліся да польскага войска. І Баляслаў не адважыўся біцца з Уладзімірам. Можна дапусціць, што Святаполк актыўна ўдзельнічаў у гэтым выступе, мог падняць і дружыну у паход. Так ці інакш, а Уладзімір даведаўся пра намеры тураўскага князя і выклікаў яго да сябе. Святаполк, спадзеючыся на міласць уладара, прыехаў разам з жонкай і Рэйнбернам у Кіеў і паплаціўся за сваю даверлівасць. Уладзімір засадзіў яго з жонкай у няволю. А біскупа, верагодна, атруціў, бо той заўчасна памёр. Як паведамляе летапісец Цітмар, Баляслаў не пакінуў зяця ў бядзе і прасіў Уладзіміра выпусціць яго на волю. Уладзімір, каб не сварыцца з польскім уладаром, саступіў яго просьбе.

Не паспеў Уладзімір пазбавіцца адной бяды, як ля парога новая: Яраслаў пад ціскам наўгародцаў адмовіўся плаціць даніну Кіеву. Не думаў князь, што на старасці гадоў прыйдзецца ваяваць з родным сынам, але што рабіць — трэба сядлаць коней. Інтарэсы дзяржавы вышэй за асабістыя пачуцці і сваяцкія сувязі. Стаў бы ён, Уладзімір, вялікім кіеўскім князем, калі б кіраваўся пачуццямі, калі б быў паслухмяны брату свайму Яраполку? Не! У барацьбе за ўладу для яго няма сваякоў і

*Чэрвеньская зямля, або Галіцыя, ці, як пазней называлі гэтую вобласць, — Чэрвоная Русь.



Мініяцюра Радзівілаўскага летапісу. Святаполк на пасадзе. *XVI ст.*

сяброў — ёсць праціўнікі і саюзнікі. Яраслаў падняўся супраць яго — і вораг цяпер ён.

Уладзімір загадаў дружыне рыхтавацца да паходу. Але як ні апраўдваў сябе Уладзімір, а сынаву непаслухмянасць перажываў цяжка і ўсё адцягваў і адцягваў паход, спадзеючыся, што «напужаны» Яраслаў перадумае. А той не перадумваў. Вайна была непазбежнаю. Князь захварэў і выклікаў з Растова любімага сына Барыса, які і павінен быў узначаліць паход на Ноўгарад.

Да гэтага моманту апавяданне «Аповесці мінулых гадоў» рэалістычнае, і ў яго праўдзівасці не прыходзіцца сумнявацца. А пасля? А пасля пачынаецца тое, што сучаснай мовай называецца фальсіфікацыяй.

Раптам у Кіеў прыходзяць весткі, што неспакойна на паўднёвых межах. Барыс выступае на печанегаў, якіх чамусьці не знаходзіць.

15 ліпеня 1015 года ў сваёй загараднай рэзідэнцыі — Бераставе — памірае Уладзімір. І вось як падае наступныя падзеі «Аповесць мінулых гадоў»[2]. Кіеўскія баяры, палохаючыся прыходу да ўлады Святаполка, утаілі Уладзіміраву смерць. Ноччу ўпотайкі княжацкае цела вывезлі ў царкву Багародзіцы. Аднак доўга маўчаць пра смерць вялікага князя не ўдалося. Пасля пахавання Уладзіміра на велікакняжацкі пасад сеў Святаполк. Каб задобрыць кіянаў, ён раздае ім падарункі з Уладзіміравай скарбніцы. Падарункі кіяне бралі, «але сэрца іх не ляжала да яго, таму што браты іх былі з Барысам».

А што ж Барыс? Пасля весткі аб бацькавай смерці ён паводзіць сябе не як князь-вой, а як герой павучальных права-

слаўных казанняў і жыцій. Не спяшаецца на пахаванне бацькі, не збіраецца і займаць кіеўскі пасад. На прапанову дружыны: «Вось у цябе бацькоўская дружына і войска. Пайдзі сядзь у Кіеў на бацькоўскім пасадзе» — Барыс адказаў: «Не падыму рукі на брата свайго старэйшага: калі бацька ў мяне памёр, дык няхай гэты будзе мне замест бацькі». Незадаволеныя дружыннікі пакінулі Барыса, а ён у акружэнні отракаў застаўся на Альце аплакваць бацьку. Між тым Святаполк «успрыняў думку Каінаву» — захацеў забіць Барыса і паслаў да яго перадаць: «Хачу з табою любоў мець і аддам табе яшчэ да атрыманага ад бацькі ўладання». Разам з тым патаемна пасылае забойцаў. Не, Барыс не ратуецца ад смерці, а пакорліва і паслухмяна сустракае яе.

Барысавай смерцю Святаполк не абмяжоўваецца. «Перабʼю ўсіх братоў і стану адзін валодаць Рускаю зямлёю», — вырашае ён. Таксама пакорліва, як і Барыс, прымае смерць Глеб. Ён, атрымаўшы ад Святаполка вестку аб хваробе бацькі, не спяшаецца ў Кіеў, а некалькі тыдняў немаведама што робіць у Смаленску. Да яго прыязджаюць вестуны ад Яраслава, якія папярэджваюць аб смерці Уладзіміра і забойстве Барыса. І Глеб, як і брат, не ратуецца ад небяспекі, аплаквае сваякоў. Яго пакідае дружына. Святаполкавы слугі без перашкод захапілі княжацкі карабель і забілі Глеба. Наступнай ахвярай стаў Святаслаў. Ён паспрабаваў уцячы ў Венгрыю, але і тут Святаполк аказаўся спрытнейшым. Яго слугі перанялі Святаслава ў Карпатах і расправіліся з ім.

Ну, а князь Яраслаў? Ён, даведаўшыся ад сястры Прадславы, якая ўцякла з Кіева, пра забойства Барыса, вырашыў адпомсціць за яго смерць. Яраслаў сабраў наўгародцаў, наняў дружыну варагаў і выступіў перад імі: «Не я пачаў забіваць братоў, але ён, няхай будзе Бог мсціўцам за кроў братоў маіх, бо без віны пралітая праведная кроў Барыса і Глеба. Відаць, і са мной тое самае зробіць? Судзі мяне, Госпадзі, па праўдзе, няхай сунімецца зладзейства грэшнага». Гэтыя словы надта падобныя на словы Уладзіміравы перад яго вайной з Ярапалкам. Як і Уладзімір, летапіс прадстаўляе Яраслава помснікам за кроў братоў, барацьбітом за справядлівасць.

Увосень 1015 года Яраслаў і Святаполк з войскамі сышліся на Дняпры пад Любечам. Тры месяцы не адважваліся праціўнікі пачынаць бітву. І толькі калі ўдарылі першыя замаразкі, Яраслаў ноччу па лёдзе перайшоў рэчку і напаў на Святаполкава войска. Святаполк усю ноч разам з дружынаю п'янстваваў. Нечаканасць нападу, аддаленасць Святаполка ад лагера яго саюзнікаў — печанегаў, якія не змаглі прыйсці яму на дапамогу, спрыялі поспеху Яраслава.



Мініяцюра з «Сказання пра Барыса і Глеба». Барыс і Глеб. Руская дружына *XIV ст.*

Святаполк з дружынай адступіў да возера, але пад воямі праламіўся лёд... Князь кінуў дружыну і ўцёк у Польшчу.

У 1017 годзе Яраслаў сеў у Кіеве. Але праз год польскі князь Баляслаў і Святаполк перамаглі Яраслава і захапілі Кіеў. Пасля таго як на Русі пачалі ўспыхваць паўстанні супраць палякаў, Баляслаў вярнуўся ў Польшчу. Яраслаў з наўгародскім войскам тут як тут, ля Кіева. Святаполк уцёк да печанегаў і набіраў там войска. Калі на рацэ Альце ворагі сустрэліся, Яраслаў зноў перамог. Святаполк, «ганімы божым гневам, прыбег у пустыннае месца паміж Польшчай і Чэхіяй, і там няшчасна закончыў жыццё сваё...».

Так распавядае «Аповесць мінулых часоў». І доўгі час гісторыкі бралі на веру аповяд Нестара. Стагоддзямі імя Святаполка ганілі як імя забойцы і злодзея. Мала хто сумняваўся, што ён пасля смерці быў абылганы і на яго спісалі злачынствы таго, хто ў «Аповесці...» выступаў як барацьбіт за справядлівасць — Яраслава Мудрага.

Для дапытлівага чытача «Аповесці...» многае ў апісанні падзей 1015—1018 гадоў было незразумелым і нерастлумачаным. Так і хочацца атрымаць адказ, навошта Святаполк, які не карыстаўся любоўю ў кіян, забіў Барыса, калі той добраахвотна прыняў яго ўладу і быў такі далёкі ад палітыкі? Што тут за выгода? Навошта было Святаполку пазбаўляць жыцця Глеба і Святаслава, якія не мелі значнага ўплыву на агульнарускія справы? І чаму Святаполк так удачліва распраўляўся з другарадным сваімі праціўнікамі ў той час, як яго галоўны вораг — Яраслаў — быў жывы-здаровы? Незразумела таксама, чаму кіяне не жадалі прымаць у Кіеве цела Барыса і яно да 1072 года знаходзілася ў драўлянай труне ў Вышградзе? А самае незразумелае, чаму імя Святаполка — гэтага крыважэрнага братазабойцы — насіў унук Яраслава? Як гэта растлумачыць?

Летапісец Нестар добрасумленна выканаў загад сваіх венцаносных заказчыкаў і стварыў міф аб Святаполку Акаянным. Але ён не ведаў, што ў далёкай Скандынавіі вось ужо стагоддзе як існавала «Сага аб Эймундзе», якую склаў відавочца тых падзей. Яму перайначваць нічога не спатрэбілася, толькі пахваліўся подзвігамі Эймунда і варагаў у краіне Гардарыкі, а так па сутнасці праўдзіва распавёў аб барацьбе Ярыцлайва (Яраслава) і Бурыслава (Барыса) за велікакняжацкі пасад. Гэтая сага, а таксама хроніка біскупа Цітмара Мерзебургскага і дапаможа нам аднавіць праўду тых падзей.

Цітмар, апісваючы паход польскага караля Баляслава і Святаполка на Кіеў летам 1018 года, адзначае, што перад гэтым на Русі памёр князь Уладзімір, які пакінуў усю сваю спадчыну двум сынам, а трэці, вызваліўшыся з вязніцы, уцёк да цесця,

Баляслава[3]. Значыць, Святаполк не застаўся ў Кіеве, прычым Цітмар нічога не ведае пра братазабойства, здзейсненае Святаполкам. Тады хто ж сядзеў у Кіеве? Памятаеце, Уладзімір выклікаў да сябе Барыса, каб ён узначаліў паход на Ноўгарад? Менавіта Барыс сеў пасля бацькавай смерці на велікакняжацкі пасад. Аб гэтым і кажа сага: «Бурыслаў (Барыс) валодаў Кенугардам (Кіевам)»[4]. Вось так: Барыс зусім не аплакваў смерць бацькі на Альце, а знаходзіўся ў Кіеве і дзейсна рыхтаваўся да вайны з Яраславам. Не, не пакорлівым хрысціянінам прадстае Барыс. Верагодна, што менавіта ён і арганізаваў забойства Святаслава. Навошта? Як ведаем, Святаслаў уцякаў у Венгрыю прасіць дапамогі ў караля Іштвана I. Перш за ўсё гэта пагражала Барысу...

Ну, а хто загадаў забіць Глеба? Хутчэй за ўсё забойцаў паслаў Яраслаў, які баяўся, што Глеб падтрымае Барыса. Яраслаў і перахапіў Глеба ў Смаленску, не пусціўшы яго ў Кіеў.

Такім чынам, Яраслаў і Барыс засталіся адзін на адзін. Звернемся да «Сагі аб Эймундзе». Што яна паведамляе аб іх барацьбе? Барыс прысылае да Яраслава патрабаванне саступіць яму некалькі валасцей і гарадоў, якія межавалі з Кіеўскай зямлёй. Заклапочаны Яраслаў звярнуўся па параду да Эймунда, правадыра варажскай дружыны, што служыла ў Ноўгарадзе. Эймунд параіў не падначальвацца кіеўскаму князю: «...Заўсёды саступаць яму ўсё, што ён просіць, не так і небяспечна, і многім можа здацца маладушным і нявартым конунга, калі ты будзеш так рабіць. Не ведаю таксама, навошта ты прымаеш іншаземнае войска, калі ты не спадзяешся на нас? Цяпер ты павінен сам выбіраць»[5]. Яраслаў адмовіўся выконваць Барысава патрабаванне і разаслаў па княству стралу — знак збору войска. У апісанні бітвы «каля вялікага лесу ля ракі»[6] паміж войскам Яраслава і Барыса мы распазнаём асобныя эпізоды з паведамлення Нестара аб сечы Яраслава і Святаполка каля Любечы. І сага, і Нестар кажуць, што войскі сустрэліся ля ракі. Паводле Нестара, войскі прастаялі тры месяцы. Паводле сагі, — чатыры дні. Але звернем увагу на працяг апавядання сагі. Вараг Рагнар звяртаецца да Эймунда: «Чаго мы чакаем і што гэта значыць, што мы сядзім спакойна?» Эймунд адказвае: «Нашаму конунгу раць нашых ворагаў здаецца невялікай: яго задумы мала чаго варты»[7]. Пасля чаго яны ідуць да Яраслава і настойваюць пачынаць бой. Думаецца, што аўтар сагі наўмысна скарачаў тэрмін да чатырох дзён, каб такім чынам паказаць, як нецярпліва рваліся ў бітву варагі, а не тупалі на адным месцы ў нерашучасці на працягу трох месяцаў. Ці можна дапусціць, што варагі падышлі пазней і Яраслаў без іх не пачынаў бітвы? А тое, што прайшло

не чатыры дні стаяння войска, а куды больш, якраз сведчаць словы Эймунда: «...А ў вас (у Яраслава. — *В.Ч.*) шмат войска разышлося дадому па валасцях, і ненадзейнае яно, пане»[8]. Цяжка паверыць, каб праз чатыры дні пасля прыходу на месца бітвы войска пачало разыходзіцца. Такое магло адбыцца толькі тады, калі яно стаяла без справы ўжо працяглы час і ў лагеры пачаўся голад.

Не супярэчыць Нестараваму апісанню бітвы і аповяд сагі. У «Аповесці...» Яраслаў пераправіўся через Дняпро і знянацку напаў на Святаполка. Сага таксама паведамляе, што вынік бітвы вырашыў нечаканы напад Яраслава. Эймунд са сваёй дружынай патаемна пераправіўся через рэчку і ўдарыў у «адкрыты шчыт», гэта значыць ззаду, зайшоўшы ў тыл Барысаваму войску. Барыс не вытрымаў гэтага ўдару і ўцёк з поля сечы. Як бачым, ёсць сур'ёзныя падставы сцвярджаць, што і Нестар, і сага апісваюць адну і тую бітву, толькі летапісец замест Барыса падставіў Святаполка.

«Пасля гэтага (бітвы. — *В.Ч.*) летам і зімой было мірна, і нічога не здарылася, і кіраваў Ярыцлайв абодвума княствамі з парады і розуму Эймунда-конунга», — паведамляе пра далейшыя падзеі сага[9]. Для нас істотна, што з дня бітвы (глыбокая восень 1015 г.) прайшло лета 1016 года і зіма 1017-га. І вось у 1017 годзе, паводле сагі, Барыс з войскам пайшоў на Кіеў, дзе сядзеў Яраслаў. Барысава войска складалі печанегі, якіх сага называе, як і жыхароў суседняй са Скандынавіяй вобласці, Б'ярмаланд, б'ярмамі. Падчас штурму Кіева нападаючыя завалодалі брамай, дзе кіраваў абаронай сам Яраслаў. Князя цяжка паранілі ў нагу — з гэтага часу ён стаў кульгаць, на што ўказваюць не толькі сага і летапіс, але і сучаснае анатамічнае даследаванне княжацкіх астанкаў[10]. Б'ярмы-печанегі ўварваліся ў горад. У гэты момант на дапамогу Ярославу прыйшоў з дружынай варагаў Эймунд. Ён выбіў з горада Барысавых вояў і адкінуў іх ад гарадскіх сцен.

Напад печанегаў на Кіеў у 1017 годзе, спаленне многіх цэркваў і Сафійскага сабора падцвярджаюць і старажытнарускія крыніцы[11]. Хроніка Цітмара таксама распавядае аб спусташэнні Кіева і спаленні сабора[12]. Цяпер становіцца зразумелым, чаму кіяне не жадалі прымаць у горад цела Барыса і трымалі яго астанкі ў драўлянай труне ў Вышградзе, — не маглі дараваць яму нападу на Кіеў.

Пасля паражэння Барыс зноў уцякае да печанегаў і збірае новае войска. На вайсковай нарадзе Эймунд спытаўся ў Яраслава: «Але як жа быць, пане, калі мы дабяромся да конунга (Барыса. — *В.Ч.*), — забіць яго ці не? Бо ніколі не будзе канца варожасці, пакуль вы абодва жывыя». І вось адказ Яраслава:

«Не стану я ні заклікаць людзей да бою з Барысам князем, ні вінаваціць, калі ён будзе забіты»[13]. Тым самым Яраслаў умываў рукі: нібыта і не загадваў забіць брата, але і не забараняў гэта зрабіць.

Хаця асобныя моманты апавядання пра забойства Эймундам Барыса і выглядаюць малаверагоднымі, як, скажам, эпізод з нахіленнем дрэва, але па сутнасці яно праўдзівае і рэалістычнае. Эймунд з 12 варагамі пайшоў насустрач Барысу. Яны доўга ехалі па лесе, пакуль не дабраліся да вялікага поля. Тады Эймунд паведаміў сваім таварышам: «Тут мы спынімся. Я даведаўся, што тут будзе стан Бурыслава-конунга і будуць пастаўлены на ноч шатры»[14]. Знайшоўшы месца, дзе Барыс мог паставіць свой шацёр, загадаў завязаць на бліжэйшым дрэве вяроўку і схіліць яго так, каб галіны дакрануліся да зямлі, а пасля замацаваць канцы вяроўкі. Як толькі варагі скончылі гэтую працу, паказалася Барысава войска. Сам Барыс ехаў у багата ўпрыгожаным кочы, перад якім вой нёс сцяг. Варагі пахаваліся ў лесе і дачакаліся ночы. Як і думаў Эймунд, княжацкі шацёр паставілі там, дзе была падрыхтавана пастка.

Ноччу, калі Барысавы людзі заснулі, таму што яны «стаміліся ад паходу і былі п'яныя»[15], варагі нячутна акружылі Барысаў шацёр. Па загаду Эймунда завязалі пятлю на вяроўцы і на дзідзе ўзнялі яе на флюгер шатра. Тут жа варагі перасеклі вяроўку, што трымала схіленае ўнізе дрэва, яно рэзка разагнулася, сарвала шацёр і закінула яго далёка ў лес. Эймунд адразу ж пабег туды, дзе спаў Барыс, забіў яго і адсек галаву. Скарыстаўшы сумятню, што ўсчалася ў лагеры, Эймунд без перашкод захаваўся ў лесе. Гэтае забойства, відаць, адбылося непадалёку ад ракі Альты. Таму Нестар, каб растлумачыць, чаму Барыс апынуўся тут, і выдумаў паход на печанегаў, якіх князь нібыта не знайшоў. Мала таго, Нестар піша, што быццам тут, на рацэ, Барыс даведаўся пра бацькаву смерць.

Яраслаў толькі пачырванеў, калі яму паказалі адсечаную галаву Барыса. І гэтая маленькая дэталь, якая не выпала з-пад зроку будучага аўтара сагі, што прысутнічаў пры тых падзеях, яшчэ раз пераконвае нас у праўдзівасці яго апавядання.

Войска Барыса, пазбаўленае свайго правадыра, «разышлося ў нязгоднасці»[16].

Але яшчэ рана было Яраславу святкаваць перамогу. Супраць яго ў 1018 годзе выступіў Святаполк з падтрымкі Баляслава. Польскі князь нарэшце закончыў вайну з германскім імператарам Генрыхам II, які падтрымліваў саюзныя адносіны з

Яраславам. Паводле мірнай дамовы, ён абавязаўся дапамагаць Баляславу ў вайне з Руссю. І сапраўды немцы прыслалі тры сотні вояў. Разам з палякамі і немцамі ў паходзе ўдзельнічалі «500 уграў і 1000 печанегаў»[17].

Яраслаў паспешліва сабраў русь, варагаў, славян і сустрэў сваіх ворагаў на Валыні каля Буга. Удача, якая так доўга была з ім, здрадзіла. Баляслаў рашуча пераправіўся цераз Буг, не даў Яраслававым воям «исполчиться» да сечы і разбіў іх. Толькі з чатырма слугамі прыбег Яраслаў у Ноўгарад. А польскі князь 14 жніўня ўступіў у Кіеў і пасадзіў на велікакняжацкі пасад Святаполка. Новаму вялікаму князю хочаш-не хочаш, а давялося трываць залежнасць ад Баляслава. Ён пусціў польскае войска ў гарады на пакорм. Але пад заступніцтвам Баляслава нядоўга пакняжыш: патрэбна свая сіла. Святаполк падтрымлівае сувязі з Тураўскім княствам, дзе засталіся яго прыхільнікі, набірае там вояў у дружыну.

Збіраў вояў у Ноўгарадзе і Яраслаў. Ён спачатку думаў бегчы за мора, але пасаднік Канстанцін, сын Дабрыні, з наўгародцамі рассёк ладдзі: «Хочам і яшчэ біцца з Баляславам і Святаполкам»[18]. Занадта многа меў спадзяванняў Ноўгарад на Яраслава. Праз яго разлічвалі наўгародцы падпарадкаваць Кіеў. З другога боку, калі б Яраслаў уцёк за мора, Святаполк прыйшоў бы ў Ноўгарад і ўчыніў расправу з тымі, хто паўставаў на яго. Таму жыхары сабралі сродкі, на якія Яраслаў наняў варагаў.

Становішча Святаполка ў Кіеве пагоршылася. Мацнеў на Русі гнеў супраць засілля палякаў. Баляслаў паводзіў сябе як захопнік. Разрабаваў велікакняжацкую скарбніцу і, помсцячы Прадславе за адмову пабрацца з ім шлюбам, згвалціў яе. Не мог падабацца Святаполк кіянам і за любоў да шумлівых баляванняў, на якіх піў віно і весяліўся са сваімі ўлюбёнцамі, і ён апынуўся перад выбарам: з кім быць — ці з Баляславам, ці з народам? Зброяй, ды яшчэ чужой, не абароніш свой пасад. Куды больш надзейная народная падтрымка. І Святаполк загадаў: «Колькі ёсць палякаў па гарадах, забівайце іх»[19]. Заклік тут жа падхапілі. Супраць польскіх войскаў успыхнула паўстанне. Баляслаў, захапіўшы каштоўнасці з княжацкай скарбніцы і ўзяўшы ў палон князя Прадставу і Дабрагневу, пакінуў Кіеў.

Нядоўга пракняжыў Святаполк у Кіеве. Яраслаў пасля таго, як з Кіева ўцёк польскі князь, з'явіўся з войскам каля горада. Не спадзяваўся Святаполк на падтрымку і вернасць кіянаў, бо адчуваў, што не даравалі яны яму прыводу палякаў і разрабаванне скарбніцы. Як і Барыс, ён уцякае да печанегаў, а ўжо праз год на чале печанежскага войска ідзе на

Кіеў. На сумна вядомай Альце Яраслаў сустрэў Святаполка. Паводле «Аповесці...», Яраслаў перад бітвай стаў на месцы, дзе забілі Барыса, і, узняўшы рукі да нябёсаў, усклікнуў: «Кроў брата майго кліча да цябе, уладыка! Адпомсці за кроў праведніка гэтага, як адпомсціў ты за кроў Авеля, наслаўшы на Каіна стогны і жах: так нашлі і на гэтага»[20]. Калі яно так і было, дык нельга не здзіўляцца прытворству Яраслава. Зразумелае яго імкненне адмыцца ад крыві брата, перакласці ўсю віну за забойства Барыса на Святаполка. Ужо тады здзейсненае злачынства не давала спаць спакойна ўзурпатару кіеўскага пасада. І пры кожным зручным выпадку ён намагаўся «выкрыць забойцу братоў», а сябе выставіць як мсціўца за іх кроў.

Бітву на Альце Яраслаў выйграў. «Была ж тады пятніца, і ўсходзіла сонца, і сышліся абодва бакі, і была сеча жорсткая, якой не бывала на Русі, і, за рукі хапаючыся, секліся, і сыходзіліся тройчы, так што цякла кроў па нізінах. К вечару перамог Яраслаў, а Святаполк уцёк» — так распавядае «Аповесць...»[21].

Верагодна, гэтая бітва і не адбылася, а проста летапісец, дзеля лепаты свайго расповяда пра тое, што зло павінна абавязкова быць пераможаным, выдумаў яе. Можна дапусціць, што Святаполк, зразумеўшы, што яму не ўтрымацца ў Кіеве, сам пакінуў велікакняжацкі пасад і падаўся пад апеку Баляслава.

Калі верыць далейшаму аповяду Нестара, дык на Святаполка «напаў д'ябал, і раслабелі ўсе цялёсы яго, і не мог ён сядзець на кані, і неслі яго на насілках». Увесь час Святаполк у бяспамяцтве трызніў: «Уцякайце са мною, гоняцца за намі»[22]. Не, не д'ябал звалiў з ног Святаполка. Калі яго атруцілі? А па чыйму загаду гэта зрабілі, здагадацца няцяжка — па Яраслававу. Святаполк так і не ачуняў. Недзе ў Польшчы ён памёр. Польскі храніст Ян Длугаш паведамляў, што Святаполк уцёк у Бярэсце, адтуль падаўся да Баляслава, дзе і памёр[23].

Яраслаў жа доўгія гады кіраваў Руссю. І не давалі яму спакою размовы, што незаконна ён ускняжыўся ў Кіеве, на трупах сваіх братоў падняўся на велікакняжацкі пасад.

Пра сваі грахі ён прызнаўся мітрапаліту Іаану. Святар жахнуўся ад княжацкай споведзі і сабраў параіцца «попоство». Вось пасля гэтага сабору магіла Барыса становіцца месцам паклону людзей. Віноўнікам забойства Барыса і Глеба быў названы няшчасны Святаполк. На яго спісалі грахі чужога чалавека, яму ўклалі ў магілу акрываўлены другім меч, яму паставілі ў гісторыі таўро «Акаянны». Гэты міф занёс Нестар

у летапіс пры ўнуках Яраслава, якім важна было абгрунтаваць сваё законнае права на кіраванне Руссю.

Так баязлівец і хцівец стаў героем, далёкія ад святасці Барыс і Глеб былі абвешчаны святымі (рускаму праваслаўю якраз былі патрэбны «нацыянальныя» святыя). Святаслаў, які, пэўна, загінуў па загаду Барыса, такога гонару не меў, ну а законны прэтэндэнт на кіеўскі пасад Святаполк быў названы забойцам братоў і праклятым царквою.

Творцы гэтага міфа спадзяваліся, што тайнае не стане яўным. І пралічыліся. Бо было сказана Божай мудрасцю: «Няма нічога тайнага, што не выявілася б, і ўкрытага, аб чым не даведаліся б».

УНУК РАГВАЛОДА





КНЯЗЬ БРАЧЫСЛАЎ
(?—1044)
Мініяцюра Радзівілаўскага летапісу. *XVI ст.*

БРАЧЫСЛАЎ ІЗЯСЛАВІЧ



купыя летапісныя радкі данеслі нам паведамленне пра барацьбу полацкага князя Брачыслава Ізяславіча з Яраславам Мудрым: «Приде Брячислав, сын Изяславль, внук Володимърь, на Новъгород, и зая Новъгород, и поим новгородцев и именья их, поиде Полотьску опять. И прешедшю ему к Судомере реце, и Ярослав ис Кыева в 7 день постиже и ту. И победи Ярослав Брячислава, и новгородце вороти Новгороду, а Брачислав бежа Полотьску»[1]. Больш падрабязна распавядае пра гэтыя падзеі «Сага аб Эймундзе». Да яе і мы звернемся.

Пасля таго як Яраслаў выгнаў з Кіева Святаполка, Эймунд, не атрымаўшы ад князя платы, адправіўся у Полацк.

Яшчэ ў раннім маленстве застаўся Брачыслаў без бацькі і, трэба думаць, яго выхоўваў хтосьці з полацкіх баяраў. Нагадаем, як крок за крокам вёў па жыцці маладога Уладзіміра яго дзядзька Дабрыня. Так і Брачыслава ўводзіў у складаны свет княжацкага жыцця вопытны і мудры настаўнік, вучыў трымацца ў баявым сядле, валодаць зброяй, спасцігаць кніжную мудрасць, разбірацца ў хітраспляценнях палітыкі. Дзейным, смелым воінам, мудрым дзяржаўным мужам хацелі бачыць палачане сына Ізяслава, якому наканавана было сядзець на полацкім пасадзе. Нямала спадзяванняў ускладалі яны на Брачыслава.

Амаль палова стагоддзя мінула з таго часу, калі раз'юшаныя Уладзіміравы ваяры захапілі і спалілі горад, а памяць пра гэты трагічны дзень жыла ў сэрцах яго жыхароў. Толькі не помсты Ноўгараду праглі палачане. Куды больш значныя мэты паўсталі перад Полацкам. Хаця Уладзімір і вымушаны быў аднавіць Полацкае княства, але, відаць, не прамінуў адцясніць палачанаў ад вярхоўяў Заходняй Дзвіны і Дняпра. Можа быць, тады і перайшлі ва ўладанне Ноўгарада гарады Віцебск і Усвят — ключавыя пункты на водных шляхах. Палачане жадалі

зноў вярнуць пад сваю ўладу вярхоўі Дзвіны і Дняпра, не адмовіліся яны і ад даўняй мары аб'яднаць вакол Полацка ўсе крыўскія землі, аднавіць страчаныя пазіцыі ў Дрыгавіцкай зямлі. Дасягнуць сваіх мэтаў можна было толькі ў крывавай барацьбе з Ноўгарадам і Кіевам.

У той час, калі на Русі лілася кроў міжусобнай вайны, Брачыславу было каля дваццаці гадоў. Полацкі князь не падтрымаў ні Яраслава, ні Барыса, ні Святаполка. Можа, у гэтым і была свая мудрасць: не спяшацца, чакаць, хто пераможа, не траціць дарэмна сілы. Перамог Яраслаў, ён і сеў у Кіеве. Прыход Эймундавых варагаў у Полацк быў дарэчы.

І вось адбылася першая сустрэча паміж Эймундам і Брачыславам. Полацкі князь прыняў правадыра варагаў ветла і гасцінна. Эймунд падрабязна распавёў Брачыславу аб тым, што прымусіла яго пакінуць Яраслава. «Што ж вы цяпер думаеце рабіць?» — спытаў Брачыслаў. Эймунд адказаў: «Мовіў я Ярыцлайву-конунгу, што мы сюды да вас паедзем, бо я думаю, ён хоча паменшыць твае ўладанні, як брат яго зрабіў з ім, і вырашайце цяпер самі, уладар, ці думаеце вы, што вам патрэбна наша дапамога»[2].

Пра баявыя якасці варагаў Брачыслаў ведаў. «Так, — згадзіўся Брачыслаў, — жадаем мы вашай дапамогі, але што вы патрабуеце за гэта?» На што Эймунд адказаў: «Таго ж самага, што было ў нас у брата твайго»[3].

Але каб прыняць на службу варагаў, Брачыславу патрэбная была згода веча. Як у Ноўгарадзе, так і ў Полацку веча выконвала заканадаўчую ролю, яно запрашала ў горад князёў, кантралявала іх дзейнасць, заключала мірныя і гандлёвыя дамовы, слала пасольствы, вырашала іншыя важныя дзяржаўныя пытанні.

Брачыслаў і тлумачыць Эймунду сваю залежнасць ад веча: «Дайце мне тэрмін параіцца з маімі людзьмі, таму што яны даюць грошы, хоць выплачваю іх я»[4]. На вечы Брачыслаў распавёў аб жаданні Яраслава адабраць ад Полаччыны землі і прапанаваў прыняць на службу варагаў. Красамоўны факт, на які ўказвае сага: дамову з Эймундам заключыў не Брачыслаў, а веча. Вядома, трымаць на службе варажскую дружыну было накладна, не па кішэні гэта аказалася Ярославу, але палачане не скупіліся. Пагрозу Кіева ўспрынялі яны сур'ёзна: наўрад ці змірыцца Яраслаў з незалежнасцю Полацкай зямлі. Такім чынам, Брачыслаў наняў варажскую дружыну. Пра наяўнасць у Брачыслава варагаў пісаў і Ян Длугаш, што можа сведчыць аб праўдзівасці сагі[5].

Брачыславава перасцярога была недарэмнай. Перамогшы на Альце Святаполка, Яраслаў у 1021 годзе прыслаў у Полацк паслоў з патрабаваннем перадаць яму гарады і сёлы, што межавалі з кіеўскімі ўладаннямі. Паводле сагі, Эймунд параіў

Брачыславу: «...Уладар, падобна на тое, што трэба чакаць бойкі з прагным ваўком. Будзе захоплена яшчэ болей, калі гэта саступіць»[6]. Брачыслаў назначыў месца, дзе павінны былі сустрэцца полацкія і кіеўскія войскі, і адпусціў паслоў. Сам жа вырашыў апярэдзіць Яраслава і першым нанесці ўдар па яго спадчыннаму ўдзелу — Наўгародскай зямлі. Гэта, з аднаго боку, аслабіла б Яраслава, а з другога — дало б магчымасць Полацку пашырыць свае ўладанні за кошт Ноўгарада.

Бліскучым па выкананні і выніках трэба назваць гэты паход на Ноўгарад. Каб захапіць буйнейшы ва Усходняй Еўропе горад з непрыступнымі абарончымі ўмацаваннямі, Брачыславу трэба было мець немалое войска. Такое войска ён здолеў сабраць за кароткі час і хутка прывесці пад Ноўгарад. З'яўленне палачанаў пад горадам застала наўгародцаў знянацку. Не даўшы ім падрыхтавацца да абароны, полацкае войска штурмам узяло Ноўгарад.

Паводле польскага храніста Яна Длугаша, Брачыслаў услед за Ноўгарадам авалодаў усім Наўгародскім княствам[7]. Захапіўшы наўгародскія гарады, паставіў там сваіх намеснікаў. Відавочна імкненне Брачыслава не проста падарваць магутнасць суседняга княства, а пазбавіць яго палітычнай незалежнасці і поўнасцю далучыць да Полацка. У Ноўгарадзе Брачыслаў таксама паставіў свайго намесніка, а сам узяў у палон многа знатных наўгародцаў і выступіў дадому.

Паводле рускіх летапісаў, Яраслаў сустрэў Брачыслава на рацэ Судоме і разбіў яго. А ці была сапраўды гэта бітва? На прыкладзе Святаполка мы маглі пераканацца, як бессаромна перайначвалася ў летапісах праўда ў дагоду кіеўскім князям. На маю думку, бітва на Судоме такі ж міф, як і міф пра забойства Святаполкам Барыса і Глеба. Па-першае, не назавеш лагічным вынік гэтай бітвы: пераможца Яраслаў нечакана перадае ва ўладанне Брачыславу такія важныя гарады на водных шляхах, як Віцебск і Усвят, заключае з полацкім князем мір. Па-другое, нерэальна прыйсці з войскам з Кіева за тысячу вёрст на Судому за сем дзён, як аб гэтым паведамляе летапіс. Можна дапусціць, што Брачыслаў без перашкод вярнуўся ў Полацк, а ўжо пасля выступіў супраць Яраслава.

Маўчыць пра бітву паміж полацкім і кіеўскім войскам і «Сага аб Эймундзе», а яе сведчанні заслугоўваюць даверу. Паводле сагі, войскі прастаялі, не пачынаючы бітвы, сем дзён. Ці не адсюль з'явілася летапіснае паведамленне аб сямідзённым паходзе Яраслава з Кіева на Судому? Відавочна, Яраслаў не адважыўся нападаць на Брачыслава.

Брачыслаў звярнуўся да Эймунда: «Што ж мы будзем тут сядзець без справы? Нельга ўпускаць перамогу з рук»[8]. Зна-

чыць, ён быў упэўнены ў сваіх сілах, верыў у сваю перамогу. А хітры вараг задумаў захапіць у палон жонку Яраслава Інгігерд, якая мела вялікі ўплыў на свайго мужа, і такім чынам вымусіць кіеўскага князя пайсці на мір з Брачыславам. Гэтая задума Эймунда спадабалася Брачыславу. Эймунд удвох з таварышам прабраліся ў лес, што знаходзіўся за баявым станам кіеўскіх войск, і заселі ў засадзе. Яны дачакаліся, калі па дарозе праязджала са слугамі княгіня Інгігерд, нечакана напалі на яе і захапілі ў палон. Яраслаў вымушаны быў пайсці на перамовы з Брачыславам і перадаць яму Віцебск і Усвят. Такім чынам палачане дамагліся адной са сваіх мэт — вярнулі частку страчаных крыўскіх земляў, зноў выйшлі да вярхоўяў Заходняй Дзвіны і Дняпра. У сваю чаргу Брачыслаў адмовіўся ад улады над Ноўгарадам і вызваліў захопленых у палон яго абаронцаў. Гэты двухбаковы кампраміс быў выгадны і Яраславу, і Брачыславу. Полацкі князь пашырыў межы сваёй дзяржавы, а кіеўскі пазбег верагоднага паражэння, якое ўскладніла б яго становішча.

Нельга адмаўляць сцвярджэнне сагі, што Яраслаў саступіў Брачыславу кіеўскі пасад. З паведамленняў летапісаў вядома, што Яраслаў з гэтага часу пражываў у Ноўгарадзе і кіраваў Кіевам праз сваіх намеснікаў. Такім намеснікам мог быць і Брачыслаў. Пра гэта сведчыць наяўнасць у Кіеве «двара Брачыслаўля», дзе жыў Брачыслаў.

Няма дакладных звестак, як склаўся ў далейшым лёс Брачыслава. Паводле дамовы, полацкі князь згадзіўся «заадзін» ваяваць з Ярославам да канца жыцця і, відаць, удзельнічаў у многіх яго захопніцкіх паходах, хаця крыніцы маўчаць пра гэта. І ў Кіеве, па ўсёй верагоднасці, Брачыслаў сядзеў не доўга. Вярнуўшыся назад у Полацк, ён скіраваў сваю дзейнасць на пашырэнне межаў Полацкага княства на захад, на пакарэнне памежных балцкіх плямёнаў. Ён разумеў, што падначаленне балцкіх плямёнаў Полацку было важнай крыніцай магутнасці княства. На заваяваных землях князь заснаваў новыя гарады і вёскі. Так узніклі горад Брачыслаўль (сучасны Браслаў), вёска Браслаў каля возера Сівер, Браслаў (Абрэнскі раён, Латвія), Браслаў, што ў 20 кіламетрах на поўнач ад Оршы. Як лічыць гісторык Ю.Заяц, пры Брачыславе да Полацкага княства была далучана Менская воласць[9]. Адбылася гэтая падзея ў 1024 годзе, калі Яраслаў пацярпеў паражэнне ў бітве пры Ліцвіні ад цьмутараканскага князя Мсціслава.

Палітычная дзейнасць Брачыслава прывяла да аднаўлення незалежнай Полацкай дзяржавы і яе росквіту.

ВЕЩЧАЯ ДУША





УСЯСЛАЎ ПОЛАЦКІ
(?—1101)
Фрагмент мініяцюры Радзівілаўскага летапісу. *XVI ст.*

УСЯСЛАЎ БРАЧЫСЛАВІЧ



Сучаснікі ў жаданні хоць неяк растлумачыць незвычайны лёс гэтага чалавека, таямнічасць і легендарнасць яго асобы, ягоную бурлівую дзейнасць, бліскучыя перамогі далучылі Усяслава Брачыславіча да чарадзеяў, волхваў. Нават у летапісе пра Усяслававa* нараджэнне запісана, што паявіўся на свет ён ад «волхования». Верылі, што можа князь абвярнуцца ў ваўка, тура, сокала, нібыта герой быліннага эпасу волат Вольга. Лічылі, што меў ён вешчую душу. Ужо пры жыцці пра яго подзвігі складалі быліны і паданні. Яскравая і каларытная постаць Усяслава натхняла і невядомага аўтара «Слова пра паход Ігаравы»:

Усяслаў-князь людзям чыніў суды,
Радзіў князям гарады,
А сам уночы ваўком рыскаў,
З Кіева паспяваў да пеўняў
да Тмутараканя,
Хорсу вялікаму шлях перацінаў.
Яму ў Полацку пазвоняць Ютрань рана
У званы святое Сафіі,
А ён той звон чуе ў Кіеве**.

На адзінай вядомай выяве князя — у мініяцюры Радзівілаўскага летапісу бачым яго схуднелы і стомлены твар. Быццам не грознага ваяра паказаў мастак, а пакутніка. Нейкая наканаванасць адчуваецца ва ўсім абліччы, у позірку сумных вялікіх вачэй, а княжацкі вянец падобны на цярновы. Але хіба не пакутаваў Усяслаў у сваім жыцці?

---

*Гісторык М.Белямук лічыць, што Усяслаў меў хрысціянскае імя Дзмітрый (Белямук М. Пячатка Усяслава Чарадзея // Беларускі гістарычны часопіс. 2001. № 2. С. 69—70).

**Тут і надалей «Слова пра паход Ігаравы» даецца ў перакладзе Р.Барадуліна (ЛіМ. 1985. 24 мая).

Хоць і вешчую меў душу ў дзёрзкім
целе,
Ды часта ад бедаў цярпеў ён.

Дзень 10 ліпеня 1067 года, калі Усяслаў прыехаў на перамовы да кіеўскага князя Ізяслава Яраславіча, стаў адным з самых трагічных у яго жыцці. Пад ціскам свайго брата, чарнігаўскага князя Святаслава, Ізяслаў, парушыўшы «крестное целование», звязеніў Усяслава, прывёз яго ў Кіеў і кінуў у поруб — турму без дзвярэй, з адным маленькім акенцам, праз якое падавалі ежу. Што яго чакала? Ніякіх надзей на вызваленне. Ізяслаў не выпусціць яго жывога з поруба, не пашкадуе і сыноў. Так і скончыцца дынастыя полацкіх князёў. І невыносная думка пра тое, што цяпер у родным Полацку запраўляе чужынец, што ходзіць той на службы ў яго Сафію, якую ён, Усяслаў, колькі гадоў з любоўю будаваў... І цяжка змірыцца, што без дагляду застануцца магілкі продкаў, а з часам забудуцца іх слаўныя імёны... Няма ніякага суцяшэння. Колькі гадоў паклаў на служэнне Полаччыне, і ўсе яго намаганні дарэмныя. Засталіся толькі ўспаміны. Можна ўзгадаць бацьку, князя Брачыслава, яго аповяды пра мінулае Полацка. Можна аднавіць у памяці, як ён, Усяслаў, пятнаццацігадовым юнаком узышоў на полацкі пасад*, сустрэчу з вечам, калі тысячу вачэй з надзеяй паглядалі на прапраўнука князя Рагвалода, праўнука Рагнеды і ўнука Ізяслава, успомніць, як марыў ён аб велічы і славе Полацка.

Быў ён, нягледзячы на маладосць, мудрым правіцелем. Раіўся не толькі з хрысціянскімі святарамі, але і з язычніцкімі жрацамі і вешчунамі. Але чакала яго небяспечнае выпрабаванне. Баярын Вадзіла, жадаючы сам князяваць і вярнуць язычніцкія звычаі, заклікаў палачан на мяцеж: «Усяслаў ёсць маладзён неразумны, і праклён багоў нашых на ім назаўжды, бо верыць у таго раскрыжаванага Хрыста Богу нашаму». Мяцежнікі напалі на княжацкі двор. Ён, Усяслаў, на чале варажскай дружыны з 99 воінаў абараняўся ў замку ажно тры дні. Тады Вадзіла загадаў страляць запаленымі стрэламі і запаліў замак. І раптам пайшоў дождж і патушыў пажар. У гэтым уба-

---

*Аб тым, што Усяслаў у пятнаццацігадовым узросце стаў вялікім полацкім князем, дае падставу сцвярджаць быліна пра Волха Усяславіча, правобразам якога быў Усяслаў:

Стал себе Волх дружину
прибирать,
Дружину прибирал в три года.
Он набрал дружину себе
сем тысячей:
Сам он, Волх, в пятнадцать лет...
(Былины. Л., 1984. С. 390)



Мініяцюра Радзівілаўскага летапісу.
Заваёва Усяславам Полацкім Ноўгарада. *XVI ст.*

чым чарадзейства князя: «Якімісь чарамі і модламі забараніў агонь з дапамогай дажджу». Хоць і славіўся ён за чарадзея, але спадзяваўся не на чары. Смела павёў ён дружыну на мяцежнікаў, натхніўшы воінаў словамі: «Дружына харобрая, адзінакроўная! Вось нашы багі з намі: мой Спадар Ісус Хрыстос, і вашыя, якія нам дапамагаюць у бітвах. Будзьма мужныя, браты, каб перамогу здабыць над ворагамі нашымі!» Ён перамог.

Праз год Усяслаў убачыў вешчы сон — яму з'явілася тройчы дзяўчына — воін у чорным воблаку, асветленая бліскавіцамі, якая трымала крыж у правай руцэ. І вось замест воблака ўзнік палац, у які ўвайшла дзяўчына. І быў голас: «Гэта Сафея-Прамудрасць...»[1] Пасля гэтага пабудаваў Усяслаў храм святой Сафіі. Храм стаў сімвалам Полацка. З клічам «За святую Сохфію!» ішлі палачане ў бітву за свабоду Полацка[2].

Можна згадаць, як сем гадоў назад радасна сустракалі яго кіяне, калі прывёў дружыну на дапамогу Ізяславу супраць торкаў. Як насцярожліва паглядаў на яго Ізяслаў, нібыта прадчуваў, што хутка падняць ім мячы адзін на аднаго. І ён, Усяслаў, ведаў, што не абысціся без вайны з Кіевам.

Не раз успамінаў Усяслаў у порубе тыя тры гады, што прайшлі ў вайне з Кіевам. Нанесці ўдар па тых цвержах Кіеўшчыны, якімі яна акружыла Полаччыну, — вось дзеля чаго і пачаў раць трымаць.

Першы ўдар нанёс ён у 1065 годзе па Пскове. Ізяслаў у гэты час разам з братамі, чарнігаўскім князем Святаславам і пуціўльскім князем Усеваладам, ваяваў супраць цьмутараканскага князя Расціслава Уладзіміравіча. Акружыў ён Пскоў,

расставіў парóкі* і пачаў з іх разбіваць крапасныя сцены. Яшчэ колькі дзён — і паў бы горад. На дапамогу Пскову з Ноўгарада выступіла войска князя Мсціслава Ізяславіча. Давялося ісці насустрач наўгародцам. На рацэ Чарэсе яны сустрэліся.

Перамога над Мсціславам акрыліла яго. Цяпер і Ноўгарад не палохаў. Праз год Усяслаў пайшоў на заходняга суседа. І вось ён, «господин великий Новгород». Узнёсся ганарліва золатам купалоў Сафіі над Паўночнай Руссю — самы багаты і вялікі горад на ёй. Кіеву, «мати городов русских», у красе сваёй і велічы не саступіць. Але ж спазнаў ты, «господин великий», і прыніжэнні, і сорам, калі князь Брачыслаў пераможцам ехаў па тваіх вуліцах. Прыйдзецца і зараз схіліць ганарлівую выю перад Полацкам. І яго, Усяслававы воі, раз'юшаныя ад упартага супраціўлення наўгародцаў, уварваліся ў горад.

Быць можа, летапісцы назавуць яго няміласцівым, крывавым? Так яно і будзе. У апраўданне сабе ён можа сказаць, што вайна не бывае без крыві. Можа, нагадаць, як пры Рагвалодзе тое самае з Полацкам учынілі наўгародцы? Але хіба гэта даруецца? На апошнім судзе цяжка будзе адказ трымаць. Казаў жа яму вешчы Баян: «Ни хитру, ни горазду, ни птицю горазду суда божио не минути!..»[3]

На знак падначалення Ноўгарада зняў з Сафійскага сабора званы і перавёз іх у Полацк.

Вось тут і ўстрывожыліся Яраславічы. Падасланы імі грэк Катапан атруціў Расціслава Уладзіміравіча, супраць якога яны ваявалі. Развязалі сабе рукі і раццю пайшлі на Полацкае княства. І вось варожыя войскі падышлі да Менска. Толькі сілы былі няроўныя. Дзе ж кýпцы месцічаў было ўстояць супраць дружын, якія трымалі ў пакоры землі ад Варажскага да Рускага мораў. Расправа з Менскам была жорсткая: усіх мужчын русы забілі, жанчын і дзяцей узялі ў палон, а сам горад спалілі.

Такі быў адказ Кіева. А ён, Усяслаў, спазніўся і сустрэў Яраславічаў на Нямізе, непадалёку ад Менска. З сакавіка 1067 года адбылася бітва. Калі б перамаглі Яраславічы, Полаччына засталася б безабароннай: бяры і дзялі яе. Не ведаў тады Усяслаў, што і праз стагоддзі нашчадкі будуць памятаць аб гэтым жорсткім пабоішчы. Аўтар «Слова пра паход Ігаравы» напіша: «На Немизе снопы стелют головами, молотят чепи харалужными, на тоце живот кладут, веют душу от тела. Немизе кровави брезе не бологом бяхуть посеяни, посеяни костьми русских сынов»[4]. Яраславічы так і не перамаглі.

Толькі верыў ён сваім воям — ганебны бег не ўчыняць, шукаюць яны сабе гонару і слаўнае імя і змагаюцца за Радзі-

---

*Парокі — камнекідальныя машыны.



Старонка з Радзівілаўскага летапісу з апавяданнем пра захоп кіеўскімі дружынамі Менска і бітву на Нямізе. *XVI ст.*

му. І паклаўшы спадзяванні на Бога, павёў ён іх у сечу. Да цемры біліся дзве раці. Мячы булатныя прытупіліся. Стрэлы схавалі сонца. Трубы ратныя гласам гласілі, а не чуваць іх было з-за лязгату зброі і баявых клічаў. Шмат палачан паклалі жыватьі свае ў сечы, душы жамчужныя аддалі Богу і вянцы нябесныя атрымалі. Не прайшоў вораг.

Поле сечы засталося за ім, Усяславам, а так ужо павялося: хто застаўся «стаяць на касцях» — той і пераможца. Ён засланіў Полаччыну ад варожай навалы, вораг адступіў. Аднак не радасныя весткі панеслі вестуны ў Полацк. Шмат, ой як шмат загінула палачанаў на Нямізе. Плачам асірацелых матуляў, аўдавелых жонак, нявестаў, што не дачакаліся сваіх каханых, адзначаць гэтую перамогу ў Полацку. Калі б была ў яго, Усяслава, тады тысяча-другая вояў, не выпусціў бы Яраславічаў з Полацкай зямлі. А праз чатыры месяцы з новым войскам яны ўжо стаялі каля Воршы, на беразе Дняпра. Аднак яго баяліся і цяпер, памяталі Нямігу. Таму і задумалі ўзяць хітрасцю: выклікалі да сябе на перамовы і крыж святы цалавалі: «Прыйдзі да нас, не зробім табе зла»[5]. І паверыў ім. Некалі так прыехаў да Яраслава Мудрага бацька, князь Брачыслаў, і паразумеліся яны паміж сабою. Яраславічы ж аказаліся вераломнымі, крыж пераступілі. Звязенілі яго з сынамі і кінулі ў поруб.

Ці гэта Божае пакаранне за спусташэнне Ноўгарада, за разрабаванне Сафіі? Ці спраўдзіліся словы вешчага Баяна і не мінуў ён Божага суда? Можа, яму трэба пакаяцца за пралітую кроў? Пакаецца, але ж гэта здрада самому сабе, прызнанне свайго паражэння, свайго бяссілля. А Полаччына? Як яна без яго? Пакуль ён жывы, пакуль ён не выракся Радзімы, палачане адданы яму, спадзяюцца на яго чарадзейную сілу, вераць, што ён зноў апынецца на волі. Таму і не замірыліся з ворагам, змагаюцца. Як доўга ён будзе тут, у порубе? Да канца свайго жыцця? Няхай так, але ён не мае права адымаць веры ў свайго народа. Ён не належыць сабе, ён належыць Полацку, палачанам. І яны ніколі не даруюць яму маладушша, здрады.

А з усходу, з бяскрайніх азіяцкіх стэпаў, прыйшла новая бяда — полаўцы. Як і хазары, і печанегі, і торкі, вогненным смерчам уварваліся яны ў Паўднёвую Русь. У 1068 годзе Яраславічы выступілі супраць полаўцаў. На рацэ Альце 15 верасня ў жорсткай сечы браты былі разбітыя і ледзьве выратаваліся ганебнымі ўцёкамі. Гэта і выклікала гнеў у кіян. Сабраўшыся на веча, яны звярнуліся да Ізяслава: «Полаўцы разышліся па зямлі; дай, княжа, зброю і коней, і яшчэ паб'емся з імі»[6]. Куды болей за полаўцаў баяўся Ізяслаў свайго народа: а раптам зброю падымуць супраць яго? Тады не быць яму на пасадзе. Князь адмовіў кіянам — і як алею ў агонь ліпуў. Успыхнулі кіяне.



Мініяцюра Радзівілаўскага летапісу. Усяслаў з сынамі перапраўляецца цераз Днепр на перамовы з Яраславічамі. Поруб у Кіеве, дзе сядзеў Усяслаў. *XVI ст.*

Раздаліся заклікі да паўстання. Гэта і скарысталі палачане, якія былі ў горадзе, і прапанавалі паўстаўшым: «Пойдзем, высадзім дружыну сваю з поруба»[7].

Кіяне рушылі да княжацкага двара, дзе ў порубе сядзеў Усяслаў. Баяры параілі Ізяславу: «Пашлі да Усяслава, ды пакліч падманам да ваконца, пракалі мячом»[8]. Лёгка было даваць парады: забі князя! А Усяслаў папулярны сярод кіянаў, памятаюць яны, як той прывёў сваю дружыну і дапамог яму, Ізяславу, перамагчы торкаў. Памятаюць, як, забыўшыся на цалаванне крыжа, звязеніў ён полацкага князя. І за гэты грэх паслаў на Русь Бог паганых. Забі князя — і кіяне ў гневе самога заб'юць. Ізяслаў не адважыўся ажыццявіць баярскую параду, вырашыў сам, пакуль жывы-здаровы, несці ногі з Кіева. А Усяслава пад вітальныя крыкі кіяне вызвалілі з няволі, праслаўляючы, абвясцілі вялікім князем кіеўскім.

Бачыў ён у сваім вызваленні і ўзвышэнні Божую ўзнагароду за свае пакуты і веру: «О! Крыжу найсвяты, суцяшэнне верным! Хто ў цябе верыць, не будзе расчараваным. Хто цябе шануе, ніякай не можа дазнаць прыгоды. Твая моц і ўлада ёсць найвышэйшая. Ты нават наймацнейшых непрыяцеляў тваіх і блюзнерцаў перамагаеш, трушчыш і караеш; а тых, якія боскасць тваю шануюць і пакорна вызнаюць, бярэш пад тваю апёку, вызваляеш з нядолі і абдарваеш хвалой!»[9]

Сем месяцаў кіраваў Усяслаў Руссю, але доўга памяталі ў народзе справядлівае і мудрае княжанне свайго абранніка. Памяць гэтая жыла і ў часы аўтара «Слова...»:

Усяслаў-князь людзям чыніў суды,
Радзіў князям гарады.

А вось баярства ўспрымала Усяслава як незаконнага ўладара кіеўскага пасада. Баярскую варожасць да сябе князь адчуваў і разумеў, што ў цяжкі момант кіеўская знаць не падтрымае яго. Не прызнавалі полацкага ўладара вялікім князем і ўдзельныя князі. Наўгародцы на патрабаванне заплаціць даніну адказалі: «Княжа, мы ёсць племяні Яраслава і да Полацка даніны бацькі і дзяды не давалі і табе не хочам, а бяры са сваей воласці»[10]. Што ж, як дарабілі ліха, прарэжуцца і зубы.

А тым часам з Польшчы з войскам свайго цесця, караля Баляслава II, рушыў на Кіеў Ізяслаў. З кім выходзіць супраць яго? З дружынай і баярамі, на якіх няма надзеі, што не здрадзяць табе? З натоўпам чэрні, які не ўстаіць перад закутым у браню войскам? На каго спадзявацца? Калі б былі ў яго пад рукою палачане, можна паваяваць, ды Полацк далёкі.

Раніцай, калі прачынаецца пад звон Сафіі, здаецца яму, што звоніць яго родная, полацкая Сафія, а падыдзе да акенца ў княжацкіх палатах — убачыць не Дзвіну, а Днепр, не Полацк, а Кіеў. Чужы ён тут, і ўсё яму тут чужое, не роднае. Ды што гэта ён? Няўжо пачне ваяваць за кіеўскі пасад, забыўшыся пра родную зямлю? Там яго любяць, там яго чакаюць, там ён моцны. І Усяслаў патаемна ад кіянаў, якіх прывёў супраць Ізяслава пад Белград, уцякае ў Полацк.

Ізяслаў заняў Кіеў і жорстка расправіўся з тымі, хто падтрымліваў Усяслава.

Нядоўга Усяслаў заставаўся ў Полацку. Ізяслаў з польскім войскам выступіў на яго. Сабраць за кароткі час дружыну Усяслаў не паспеў і вымушаны быў пакінуць Полацк. Куды яму цяпер? Як за ваўком, гоняцца за ім Ізяслававы воі. І, як воўк, па начах, употайкі, па воўчых сцежках прабіраецца князь-ізгой з купкай верных сваіх паплечнікаў. Спакойныя, яны вераць яму, вераць, што ў князя вешчая душа, што валодае ён чарадзейнай сілай, знойдзе выйсце і з гэтага цяжкага становішча, пераможа і на гэты раз. І ні адчаем, ні злосцю, ні разгубленасцю не павінен Усяслаў паказаць, як цяжка яму цяпер.

Ён знаходзіць прытулак у фінскага племені водзі. Аднак, відаць, водскія старэйшыны, спадзеючыся на вайсковы талент полацкага князя, марылі з яго дапамогай аслабіць Ноўгарад. І, пэўна, умовай прадастаўлення войска быў захоп Ноўгарада. Калі шлях у Полацк ляжыць праз Ноўгарад — Усяслаў пойдзе гэтым шляхам. 23 кастрычніка 1069 года ён падышоў да Ноўга-



Мініяцюра Радзівілаўскага летапісу. Усяслаў на кіеўскім пасадзе. *XVI ст.*

рада. Наўгародскі князь Глеб Святаславіч на чале войска сустрэў яго на рацэ Гзені. Наўгародцы разбілі водзь, а Усяслава захапілі ў палон. Цяпер яны маглі адпомсціць яму за 1066 год. Ды палітычныя меркаванні ўзялі верх над пачуццямі.

Яшчэ ў 1015 годзе наўгародскі князь Яраслаў Уладзіміравіч адмовіўся плаціць Кіеву даніну, але Кіеў у гэтай спрэчцы аказаўся мацнейшым. Мара ж быць самастойным і незалежным не пакідала Ноўгарад. Толькі ці магла яна здзейсніцца, калі Кіеў захапіў Полацк і рэальна пагражаў накласці руку і на тую прывідную, але ўсё ж самастойнасць Наўгародскай рэспублікі. Наўгародцам быў патрэбны саюз з Полацкам для барацьбы з Кіевам. Тут інтарэсы наўгародскага і полацкага баярства супалі. Таму і адпусцілі наўгародцы свайго палоннага.

Два гады Усяслаў пры падтрымцы войска, якое, пэўна, набраў з варагаў, змагаецца супраць кіеўскага стаўленіка ў Полацку, князя Святаполка, і выганяе яго. З Кіева тут жа ідзе войска пад зверхнасцю Яраполка Ізяславіча, каля Галацічаска (месца знаходжання гэтага горада не вызначана) разбівае Усяслава. І сапраўды паверыш, што Усяслаў — чарадзей. Вось і зараз, нібыта зачараваўшы Яраполка, пазбаўляе яго волі, перацягвае на свой бок. І паражэнне становіцца для Усяслава перамогай: паміж ім і Яраполкам заключаны мір. Усяславаў сын, Глеб, бярэ за сябе Яраполкаву дачку.

Здавалася б, трывалы саюз паўднёварускіх князёў даў трэшчыну. Але Усяслаў не спыніўся на гэтым. Калі зброяй перамагчы Кіеў цяжка, дык на дапамогу прыходзіць інтрыга. Пасеяць варожасць паміж Яраславічамі, нацкаваць іх адзін на аднаго — вось мэта Усяслава. І дамогся свайго, паразумеўся з Ізя-



Г.Лебедзеў. Полацкі Сафійскі сабор. *Рэканструкцыя*

славам. А вынікі міру з Ізяславам пажынаў ён, Усяслаў. Святаслаў і Усевалад, устрывожаныя сепаратнымі зносінамі Ізяслава з полацкім князем, здагадаліся, што гэты саюз накіраваны супраць іх: «Ізяслаў сватаецца з Усяславам, думаючы на нас, калі яго не сцерагчыся, дык прагоняць нас»[11], таму выгналі свайго брата з Кіева. А выгадаў Усяслаў. Сеўшы на кіеўскі пасад, Святаслаў, які баяўся вайны з Ізяславам, пакінуў у спакоі Полацкую зямлю. Тры гады мірнага жыцця выйграў Полацк. Усяслаў скарыстаў іх для ўмацавання сваёй дзяржавы. Не ведаў ён спакою, снаваў па Полаччыне з краю ў край, збіраў ваяроў у дружыны, узводзіў цвержы: рыхтаваўся да новай вайны з Кіевам.

Відаць, у гэты час Усяслаў і аднавіў Менск. Паводле дакументаў Менскай епархіі, полацкі князь пабудаваў цвержу пры вусці ракі Нямігі ў Свіслач, на тым месцы, дзе некалі адбылася Нямігская бітва. Ён жа заснаваў Узнясенскі манастыр, дзе жыў легендарны Баян[12]. З той прычыны, што першапачатковага Менска, які стаяў на рацэ Менцы, ужо не было, Усяслаў стаў заснавальнікам новага Менска на Свіслачы.

У канцы 1076 года Святаслаў памёр. На кіеўскі пасад сеў Усевалад. Ён і распачаў наступ на Полаччыну. Разам са сваім сынам, чарнігаўскім і смаленскім князем Уладзімірам Манамахам, з вайсковымі сіламі ўсёй Паўднёвай Русі ў 1077 годзе



Л.Аляксееў, Г.Штыхаў, Г.Семянчук. Карта Полацкага княства



Пярсцёнак Усяслава Полацкага

рушыў на Полацк. Толькі не перамогі дамагліся яны. Палачане пад зверхнасцю Усяслава адбілі ад сцен свайго горада ворага.

Няўдача яшчэ болей раззлавала паўднёварускіх князёў. З Полацкам тэрмінова трэба было канчаць. Уладзімір Манамах збірае велізарнае войска, якога з часоў Святаслава Ігаравіча не было на Русі. Усе вайсковыя сілы Паўднёвай Русі, наўгародская дружына князя Святаполка (якога некалі Усяслаў выгнаў з Полацка) і палавецкая арда зімою 1078 года пайшлі на Полацк. Некалі з такою сілаю Алег вымусіў Візантыю да пакорлівасці, павесіў свой шчыт на браму Канстанцінопаля. Напэўна, цешыў Манамах сябе надзеяй, што дажывае Полацк апошнія дні сваёй незалежнасці. Але і на гэты раз аказаліся бяссільнымі супраць Полацка Манамахавы раці. Зноў Усяслаў абараніў сталіцу сваёй дзяржавы. У гневе Манамах спаліў полацкія прадмесці, а вяртаючыся дадому ў Чарнігаў, каменя на камені не пакінуў ад Одрска. Гэты горад так і не адрадзіўся да жыцця. За такой жорсткасцю хавалася бяссілле Кіева. Гады барацьбы з непакорлівым Усяславам не прынеслі жаданай перамогі.

Помсцячы за разрабаванне сваёй зямлі, Усяслаў напаў на Смаленск, захапіў яго і спаліў. Манамах з чарнігаўцамі «о двое коне» (г.зн. з запаснымі конямі) памчаўся ў Смаленск. Не заспеўшы там Усяслава, пайшоў за ім у пагоню, ды той ужо быў у Полацку, а сунуцца туды ў Манамаха прапала ахвота. Ён і тут выказаў свой крывавы нораў, «пожег землю, повоевав до Лукомля и до Логожска, та на Дрютск воюя»[13]. У 1084 годзе Уладзімір нападзе на Менск, возьме яго на шчыт. Але перамагчы Усяслава сіл у Кіеве не хапала і, хочаш не хочаш, трэба было прызнаваць сваё паражэнне — адступіцца ад Полаччыны. І калі на Любецкім з'ездзе ў 1097 годзе сабраліся рускія князі, каб дамовіцца кожнаму трымаць «вотчыну сваю», з Полацкага княства як з самастойнай, асобнай ад Русі дзяржавы не прыехаў ні адзін князь.

Апошнія гады жыцця Усяслаў пражыў у міры. Суседзі асцерагаліся нападаць на полацкія землі, каб не выклікаць яго помсту. На гэтыя гады прыпадае росквіт магутнасці Полацкага княства, яго ўлада распаўсюджваецца на Ніжняе Падзвінне аж да Балтыйскага мора — на Земігалію, Лівонію, Летонію, Літву.

У 1101 годзе Усяслаў памёр. Летапісец дакладна адзначыў і дзень (14 красавіка), і час (9 гадзін), калі вялікі сын Полаччыны адышоў у бессмяроцце.

НЯСПРАЎДЖАНЫЯ НАДЗЕІ





ГЛЕБ МЕНСКІ
(?—1119)
Мастак А.Александровіч

ГЛЕБ МЕНСКІ

Пасля смерці Усяслава ў Полацку сеў яго старэйшы сын Рагвалод Барыс. Але не ён, вялікі князь полацкі, вёў рэй палітычнага жыцця на Полаччыне ў першай чвэрці XII стагоддзя, а менскі князь Глеб. Дзейны і ваяўнічы, гэты сын Усяслава мог прысвяціць сябе барацьбе за полацкі пасад і, трэба думаць, дамогся б свайго. Мог, аднак сваю дзейнасць падначаліў інтарэсам Полацкага княства. З усіх братоў ён адзіны паслядоўна працягваў справу бацькі. Мэты, якія Глеб ставіў перад сабою, былі яму не пад сілу, і жыццё ягонае закончылася не ў славе, не ў велічы здзейсненага, а на чужыне, у няволі. Азіраючыся на пражытае, горка было яму ўсведамляць, што так і не спраўдзіліся надзеі.

Амаль немагчыма без полацкага летапісу дэталёва крок за крокам прасачыць жыццёвы шлях Глеба. Дзякуй, Божа, і за тыя весткі, што дайшлі да нас пра менскага князя. А там, дзе постаць Глеба знікае ў невядомасці, нам застаецца спасылацца на здагадкі, версіі.

Вось першая здагадка. Можа, гэта ён, Глеб, разам з бацькам сваім Усяславам Брачыславічам і другім сваім братам быў кінуты Ізяславам Кіеўскім у поруб і амаль год пакутаваў там. І што відавочна, дык тое, што маладосць Глеба не прайшла ў раскошы і забавах. Удзел у баявых паходах бацькі, вымушанае блуканне па чужыне ўдалечыні ад Радзімы, вайна з Кіевам выпалі на яго юнацкія гады. Але пры Усяслававым жыцці Глеб, як і астатнія яго браты, не мог праявіць сябе самастойным палітычным дзеячам: Усяслаў да самай смерці трымаў уладу ў Полацкім княстве ў сваіх руках. Быць можа, гэта і ўсцерагло яго сыноў ад памылак, якія звычайна робяцца ў маладосці. Перажылі яны з гадамі і сверб славалюбства, і зайздрасць адзін да аднаго. Пасталеўшы, набраўшыся мудрасці, зразумелі, што яны будучыя гаспадары сваёй Бацькаўшчыны, а яе інтарэсы



Пячатка Глеба Менскага

куды вышэйшыя за асабістыя амбіцыі і крыўды. Відаць, стары Усяслаў не раз прасіў і заклікаў сыноў не падымаць меч адзін на аднаго, памятаць, што іх нязгодай скарыстаюцца ворагі Полацкай зямлі. Вялікі быў аўтарытэт Усяслава, і не асмеліліся сыны парушыць яго запавет: быць разам, быць заадно.

Гісторык, зазірнуўшы ў летапісы і хронікі, можа прывесці не адзін прыклад, як пасля смерці таго ці іншага валадара яго сыны мячамі пачыналі дзяліць спадчыну. Адно з красамоўных таму пацвярджэнняў — смерць Уладзіміра Чырвонае Сонейка. Адразу ж пачалася вайна паміж яго сынамі, пралілася братняя кроў... Пэўна, ох як чакалі ў Кіеве, што пачнуць Усяславічы ўздымаць меч адзін на аднаго. Не абышлося і без гэтага.

У Менску сядзеў Давыд, ён праводзіў сепаратную палітыку на саюз з Кіевам. Больш за тое, у 1103 годзе Давыд хадзіў разам з паўднёварускімі князямі ў паход на полаўцаў. Гэтыя актыўныя стасункі менскага князя з варожым Полацку Кіевам выклікалі зразумелую трывогу ў Барыса. Не трэба быць вельмі разумным, каб здагадацца, што Кіеў сее зерне варожасці паміж Усяславічамі і спадзяецца прыбраць да рук Менск. І ў 1104 годзе Барыс ідзе з войскам на Менск і выганяе адтуль Давыда. На яго месца сеў Глеб. Дзейны, адданы Полаччыне, рашучы Глеб, на думку Барыса, якраз і падыходзіў на ролю князя ў Менску — важнейшым эканамічным і стратэгічным цэнтры Полацкай зямлі.

Выгнаны Давыд знайшоў прытулак у Ноўгарадзе-Северскім, дзе князяваў Алег Святаславіч. У Кіеве з'явілася магчымасць пад выглядам дапамогі Давыду напасці на Полацкае княства. Каб не надаваць паходу характар адкрытай вайны, ні вялікі князь Святаполк, ні неўтаймоны Уладзімір Манамах не бралі ў ім удзелу, але войскі свае Давыду далі. Падтрымаў князя-ізгоя і Алег Святаславіч. Так што ў добра арганізаванай вайсковай акцыі супраць Полаччыны ўдзельнічалі, як звычайна, усе вайсковыя сілы Кіеўскай Русі. Гэтае вялікае войска падышло да Менска.

У памяці менчукоў былі яшчэ свежыя ўспаміны пра расправы паўднёварускіх князёў з іх родным горадам, калі ад яго



Э.Загарульскі. Менск XII—XIII стст. *Рэканструкцыя*

засталіся адны галавешкі, а жыхароў вывелі ў няволю. Гэты жах спусташэння і палону мог паўтарыцца. Мог, але не паўтарыўся. Менчукі, мабыць, з удзячнасцю згадвалі Усяслава Чарадзея. У апошнія гады жыцця вялікі князь полацкі, замірыўшыся з Кіевам і Ноўгарадам, заняўся будаўніцтвам. Менск адрадзіўся з попелу. Вакол горада выраслі высокія крапасныя сцены. Паспрабуй цяпер узяць Менск! Глеб Усяславіч падняў менчукоў на абарону роднага горада. Дзесяць месяцаў прастаяла каля Менска рускае войска і так нічога і не дабілася. Ну, а Давыд, яшчэ нейкі час памыкаўся пры двары Алега Святаславіча і таксама нічога не дамогся. Няўдача пад Менскам астудзіла заваёўніцкі імпэт паўднёварускіх князёў. Хочаш не хочаш, а давялося Давыду вяртацца дадому і мірыцца з Усяславічамі. Барыс не стаў караць брата. Яго вяртанне было дарэчы. Полацк рыхтаваўся да буйнога паходу на Земігалію, і варта было захоўваць адзінства і згоду паміж Усяславічамі.

Смерць Усяслава скарысталі некаторыя падуладныя Полацку землі. Так, яшчэ ў 1102 годзе пачалі барацьбу за свабоду яцвягі, што жылі ў Верхнім Панямонні. І Барыс вымушаны быў ісці на іх паходам.

Мы вельмі мала ведаем пра яцвягаў. Гэты мужны і свабодалюбівы народ у старажытнасці да прыходу славянаў жыў па левым беразе Нёмана і Прыпяці. Чатыры стагоддзі, не выпускаючы зброі з рук, яцвягі змагаліся за сваю свабоду супраць



Э.Загарульскі. Менск XII—XIII стст. *Рэканструкцыя*

польскіх, кіеўскіх і вось цяпер полацкіх войскаў. Паміж смерцю на полі сечы і ганебнымі ўцёкамі яны выбіралі смерць і стаялі да апошняга ўдару сэрца. Помсцячы за напады на свае землі, рабілі набегі на Русь і Польшчу. Не лёгкай прагулкай па даніну з'явіўся для палачан паход 1102 года, але, відаць, ён быў удачлівы, і Полацк зноў аднавіў уладу над яцвягамі. У гэтым паходзе ўдзельнічаў і Глеб.

Вяртаючыся ў Полацк, Барыс заснаваў на Бярэзіне горад Барысаў — паводле «Хронікі Літоўскай і Жамойцкай», «знак вечной границы умоцнити межи Литвою и князством Полотцким»*[1]. Беларускі гісторык М.Ермаловіч лічыць, што мяжа гістарычнай Літвы з Полацкім княствам праходзіла па Бярэзіне Нёманскай, а не па Дняпроўскай, але можна дапусціць, што валоданні Літвы даходзілі і да Бярэзіны Дняпроўскай. Таму яшчэ ў XVI стагоддзі Масква прызнавала мяжу Полаччыны з Літоўскай зямлёю па Бярэзіне[2]. Яшчэ адно падуладнае Полацку племя адмовілася плаціць даніну — земігалы. У 1106 годзе вялікае полацкае войска, у якім былі і менчукі пад зверхнасцю Глеба, выступіла ў паход. Відаць, палачане на караблях спусціліся ўніз па Дзвіне ў Лівонію, а адтуль пайшлі на Земігалію.

---

*Цытаты з беларускіх летапісаў падаюцца на мове арыгінала.



В.Сташчанюк. Менск у XII ст.

Земігалы выкарысталі звычайную тактыку ўсіх балцкіх плямёнаў — завабліванне ворага ў глухі, непраходны гушчар, дзе яго чакала засада. Нечаканы напад з усіх бакоў, не даць ворагу ачуняць, перашыхавацца — і перамога! Палачане трапілі ў такую засаду. Паражэнне было катастрафічным. Паводле адных крыніц, у бітве загінула дзевяць тысяч полацкіх вояў, паводле другіх, — дзевяцьсот. Немалыя страты панесла і Глебава дружына.

Паражэнне ў Земігаліі ў пэўнай ступені адцягнула ажыццяўленне Глебам сваіх шыроказадуманых планаў. Амаль дзесяць гадоў Глеб не пераходзіў да актыўных дзеяў, збіраў сілы. Аб чым жа марыў менскі князь? А замахнуўся ён на многае — малое яго не задавальняла. Цягнула Глеба Падняпроўе. Авалодай сярэднім цячэннем Дняпра, авалодай шляхам «з варагаў у грэкі» — і ты багацейшы на Полаччыне і Русі князь. Колькі золата асядае ў тваёй скарбніцы, золата, якое бярэ з купцоў Смаленск і багацее штогод. А там марылася Глебу завалодаць Наваградскай зямлёй і Верхнім Панямоннем — трымаць у сваіх руках гандлёвы шлях па Нёмане, выхад у Варажскае мора. Калі б здзейсніў свае намеры Глеб, Менск на вачах багацеў бы і мацнеў. А праз колькі гадоў можна было б адваяваць у Кіева дрыгавіцкія землі, аднавіць былое адзінства крывіцка-

дрыгавіцкіх земляў, раз'яднаных пры Аскольдзе і Дзіры, аб'яднаных зноў Рагвалодам і наноў раз'яднаных Уладзімірам Святаславічам.

Такія былі задумы менскага князя Глеба. І можна было спадзявацца іх ажыццявіць. Глеба падтрымліваў вялікі князь полацкі Рагвалод-Барыс, а праз сваю жонку быў ён у сваяцтве з яе бацькам Яраполкам Ізяславічам, князем уладзіміра-валынскім, луцкім і тураўскім. Не бедную меў Глеб і скарбніцу, калі ахвяраваў Кіеўскаму Пячэрскаму манастыру шасцісот грыўнаў срэбра і пяцьдзесят грыўнаў золата[3]. Каб паказаць сваю незалежнасць ад Полацка і Кіева, Глеб пачынае будаўніцтва мураванага храма, прысвечанага заступніцы рускага воінства Багародзіцы. Сваю сілу Глеб ведаў, а сіла надавала яму надзею на поспех задуманага. Ужо да 1116 года ён, умацаваўшыся ў Друцку, захапіў у Смаленскага княства Оршу і Копысь. Асабліва важным для Глеба было авалоданне Копыссю, дзе знаходзіўся перавоз цераз Днепр, мытні і корчмы, што прыносілі вялікія прыбыткі.

А ў 1116 годзе Глеб «паваеваў Другавічы», захапіў Слуцк і спаліў яго, жыхароў узяў у палон[4]. Гэта быў удар па ўладзе Кіева на дрыгавіцкіх землях. Кіеўскі князь Уладзімір Манамах, каб выйграць час для падрыхтоўкі да вайны з Глебам і з мэтай запалохаць яго, прыслаў у Менск паслоў. Глеб і слухаць не захацеў аб скарэнні Кіеву, пасмяяўся ў адказ з паслоў і паабяцаў захапіць кіеўскія ўладанні. Значыць, адчуваў Глеб сваю сілу, не страшны быў яму вялікі кіеўскі князь, таму і кідаў Манамах выклік. Аднак той не асмеліўся сам пайсці на Менск. Як раней супраць Усяслава, ён сабраў супраць Глеба кааліцыю паўднёварускіх князёў, далучыў да іх і смаленскага князя, свайго сына Вячаслава. Зноў уся Паўднёвая Русь падняялася на Полаччыну. Вячаслаў Смаленскі ў купе са сваім братам пераяслаўскім князем Яраполкам і чарнігаўскім князем Давыдам Святаславічам напалі на Друцк, разрабавалі яго, а ўсіх жыхароў узялі ў палон і пасялілі ў спецыяльна пабудаваным горадзе Жэлні.

Цяпер сам Манамах пайшоў на Менск. 28 студзеня 1117 года кіеўскія войскі апынуліся каля менскіх сцен. Манамах на свае вочы мог убачыць, што ў Менску час дарэмна не гублялі. Уражвалі дзесяціметровыя, пакрытыя лёдам валы, на якіх высіліся моцныя сцены. Адзіны ўваход у горад абаранялі дзве высокія, па 12 метраў угору, вежы. Было відавочна, што прыступам Менск не ўзяць. Два месяцы стаяў Манамах перад горадам. Прыбліжалася вясна, таянне снягоў, а гэта адразала дарогі ад Кіева. Не хапала харчоў. Але ніяк не хацелася прызнавацца ў сваёй няўдачы і вяртацца ні з чым. Каб з гонарам



Фрагмент абраза «Царква ваяўнічая». Уладзімір Манамах.
1550-ыя гг.

выйсці з непрыемнага становішча, Манамах распачаў перамовы з Глебам.

На вачах князёў-саюзнікаў Манамах пагрозліва пужае карамі Глебавых паслоў, патрабуе перадаць менскаму князю прапанову скарыцца. Хітрыў Манамах. Патаемна адразу ж пасля прыёму паслоў адпраўляе ў Менск сваіх даверaных людзей, каб яны падвучылі Глеба пайсці да яго і прасіць заступніцтва. Відаць, за гэта Манамах абяцаў Глебу адмовіцца ад аблогі Менска. З тым паслы і прыбылі ў Менск. Глеб прыняў прапанову Манамаха, бо чакаць дапамогі з Полацка не выходзіла. Манамах прадугледзеў такую магчымасць, таму і заставаліся на ўсходніх межах Полаччыны смаленска-пераяслаўска-чарнігаўскія войскі.

Наступным днём Глеб разам з жонкаю, дзецьмі* і набліжонымі прыйшоў да Манамаха і «прыніжана» прасіў аб літасці. Уладзімір узяў ад менскага князя абяцанне не парушаць у далейшым міру і адпусціў яго.

Аднак Сафановіч у сваёй «Хроніцы» падае іншыя звесткі — Глеб заваяваў Смаленск[5]. Менавіта ў гэтым горадзе і абараняўся Глеб ад раці кіеўскага князя. І толькі тады, калі Манамах пачаў «ставіць ізбу» — будаваць абложную вежу, Глеб запрасіў «пакоі». Уладзімір «зжаліўшыся крывіпраліцця» абяцаў Глебу «пакой» і выпусціў менскую дружыну з Смаленска. Падзеі даволі верагодныя. Вярнуць Смаленск да Полацкага княства намагаўся Усяслаў Вешчая Душа, а за ім паспрабаваў і Глеб. Заваяваць Смаленск яму ўдалося, а вось утрымаць — не ўтрымаў. Гэтае паведамленне не магло быць недакладнасцю летапісца, бо Сафановіч, які карыстаўся кіеўскімі летапісамі, двойчы нагадаў, што Уладзімір «Глеба вывеў з Смаленска» і адзначыў: «даў яму Менск»[6]. Дарэчы, і ў «Аповесці мінулых гадоў» сказана пра паход Манамаха супраць Глеба «к Смоленьску»[7].

Што ж, першая спроба ажыццявіць свае задумы не ўдалася. Але застаўся ён жывы-здаровы, горад не спалены, дружына на полі бітвы не пасечана, менскія землі не спустошаны. І што, адмаўляцца ад мары? Сядзець да скону гадоў у Менску, як мыш у нары? Ну, не!..

Цяпер Глеб вырашыў дзейнічаць у саюзе з Полацкам. Менскі князь папрасіў дапамогі ў палачанаў і атрымаў яе. І ў 1117 го-

---

*Глеб быў жанаты на дачцэ князя Яраполка Ізяславіча і меў шэсць сыноў: Ізяслава, які памёр у 1134 годзе; Давыда, у якога было два сыны — Расціслаў і Святаслаў; Расціслава, які быў жанаты на княгіне Софіі Яраслаўне (памерла ў 1157 годзе), ад іх нарадзіўся сын Глеб; Усевалада, Валадара (які меў трох сыноў, сярод якіх і загадкавы Уладзімір Менскі); Яраслава (Сочинения императрицы Екатерины II. Т. 10. С. 32).



Мініяцюра Радзівілаўскага летапісу. Паход Уладзіміра Манамаха на Друцк і Менск. *XVI ст.*

дзе (паводле іншых крыніц, у 1119 годзе) Глеб з полацка-менскім войскам праз Літву ўрываецца ў Наваградскую зямлю і, трэба думаць, заваёўвае яе. Вярнуўшыся з гэтага паходу, менскі князь пачынае барацьбу за Падняпроўе, жадаючы вярнуць Оршу і Копысь.

У кнізе «Воспоминания о древнем православии Западной Руси», напісанай у сярэдзіне XIX стагоддзя на падставе архіваў Тураўскай і Менскай епархій ігуменам Антоніем, знаходзім цікавыя звесткі пра «нечестивого» князя Глеба. Паводле гэтых звестак, Глеб рабіў рабаўніцкія паходы на дрыгавіцкія землі, браў гарады Мазыр, Петрыкаў, Тураў і Давыд-Гарадок, выводзіў адтуль жыхароў, якіх у Друі прадаваў немцам[8]. Тое самае сцвярджае Нарбут. Менскі князь часта нападаў на Літву Завілейскую, дзе ўладарыў князь Жывінбуд, даходзіў да ракі Дзітвы і захопліваў нявольнікаў, якіх таксама прадаваў, але ўжо ў Друцку. Пасля ж таго як Жывінбуд напаў на Менск і спаліў яго, Глеб стаў хадзіць за лупам* і палоннымі на Палессе. Спаленыя вёскі, разрабаваныя гарады пакідаў пасля сябе. Кіеўскі мітрапаліт праклаў менскага князя[9]. І хаця летапісы маўчаць пра падобныя паходы Глеба, але адмаўляць гэты факт нельга. Гандаль нявольнікамі быў важнай крыніцай прыбытку ў тыя часы, і Глеб мог займацца такім ганебным промыслам. Можна пагадзіцца з Ю.Зайцам, што Глеб, магчыма, меў права на частку дрыгавіцкіх зямель, якія былі замацаваны за наш-

*Луп — вайсковая здабыча.

чадкам Ізяслава. Пасля смерці цесця Глеба Яраполка Ізяславіча і яго сыноў, менскі князь як муж яго дачкі Анастасіі хацеў атрымаць частку цесцевых уладанняў[10]. Таму, пэўна, і захапіў ён Слуцк.

У адказ Кіеў перайшоў да актыўных дзеяў супраць Глеба. Вялікае войска ў 1119 годзе рушыла на Менск. Глеб вярнуўся ў сваю вотчыну ў спадзяванні і на гэты раз адсядзецца за магутнымі крапаснымі сценамі. Але Уладзімір Манамах штурмам авалодаў горадам.

Кіеўскі князь ужо не верыў Глебу, не разлічваў на яго паслушэнства. Найлепшае вырашэнне «праблемы Глеба» — кінуць менчука ў поруб і згнаіць яго там. Ды памятаў Уладзімір выпадак з Усяславам, калі таго паўстаўшыя кіяне вызвалілі з няволі і абвясцілі сваім вялікім князем. Магло такое здарыцца і цяпер. Толькі тры гады назад бунтавалі кіяне. Лепш, каб Глеба не было ў жывых. Так спакайней, так надзейней. А пры больш спрыяльных умовах можна і Менск далучыць да кіеўскіх уладанняў. Няма чаго дзівіцца, што хутка пасля прыезду ў Кіеў Глеб памёр (13 верасня 1119 года). Так і засталіся не здзейсненымі мары князя Глеба Усяславіча.

У ЧАСИ МІЖУСОБІЦ





РАГВАЛОД-ВАСІЛЬ
(?—?)
Мастак А.Александровіч

РАГВАЛОД-ВАСІЛЬ



ялікая Скуфь — так называлі Русь візантыйцы. «Шматвяковая імперыя Рурыкавічаў» — паводле К.Маркса і Ф.Энгельса. Замешаная на крыві, сабраная мячом, яна і сотні гадоў не пражыла ў адзінстве і міры. Ад былой велічы толькі засталіся аповяды ў летапісах. І дарэмна будуць намагацца кіеўскія князі хоць неяк уратаваць сваю дзяржаву. Сам Кіеў, пакорліва схіліўшыся перад Андрэем Багалюбскім, стане толькі сталіцай невялікага Кіеўскага княства.

Перыяд федальнай раз'яднанасці не абмінуў і Полацкую зямлю. І тут брат пайшоў на брата. Але ў адрозненне ад міжусобных войнаў, якія адбываліся ў Кіеўскай Русі, дзе асобныя землі дамагаліся самастойнасці, на Полаччыне барацьба адбывалася за палітычнае першынство паміж Полацкам і Менскам. Напал гэтай барацьбы прыпадае на 1158—1167 гады, калі ў Полацку сядзеў князь Рагвалод-Васіль — старэйшы сын вялікага князя Рагвалода-Барыса. Не назавеш яго выдатным палітычным дзеячам або ваяводам. Увесь ягоны шлях — няўдача за няўдачай. Гэта ў рэшце рэшт і абумовіла лёс Рагвалода як полацкага валадара.

У 1119 годзе Полаччына страціла Менскае княства, а разам з ім — Сярэдняе Падняпроўе з Оршай і Копыссю і Верхняе Панямонне, якое было заселена балцкімі плямёнамі і якое паступова каланізавалі дрыгавічы і крывічы. Цяпер у Кіеве маглі спадзявацца на паслухмянасць Полацка. Але пралічыліся.

Ізяславічы былі настроены ваяўніча і не мірыліся са стратай полацкіх земляў. Устрывожаны іх настроем Уладзімір Манамах у 1121 годзе склікаў у Смаленску сваіх сыноў, каб паразумецца супраць крыўскіх князёў. Запрасіў у Смаленск Манамах і Ізяславічаў. Мабыць, пужаў іх вайной, калі яны не перастануць быць у «нязгодзе» з Руссю. І на час Ізяславічы затоіліся. Аднак, калі ў маі 1125 года памёр Уладзімір Мана-

мах, крыўскія князі вырашылі скарыстацца спрыяльным для іх момантам. Паводле звестак В.Таціщава, полацкія князі пачалі нападаць і спусташаць землі, што належалі Русі[1]. Вось тады разгневаны вялікі князь кіеўскі Мсціслаў Уладзіміравіч вырашыў скарыць Полацкае княства. У паход на Крывію ён сабраў дружыны наўгародскага, уладзіміра-валынскага, чарнігаўскага, курскага, тураўскага, клецкага, гарадзельскага княстваў, а таксама атрады торкаў. Князі ўзгаднілі план сумесных дзеяў, паводле якога яны адначасова павінны былі выступіць на Полацкае княства з чатырох бакоў і ўзяць у аблогу Ізяслаўль, Лагожаск, Барысаў і Друцк. На 4 жніўня 1127 года намячаўся штурм гэтых гарадоў, тым самым Мсціслаў не даваў палачанам магчымасці змагацца з праціўнікам паасобку. Аднак і на гэты раз Русь не дамаглася жаданай перамогі над Крывіяй. Няўдача напаткала курскага князя Ізяслава Мсціславіча, які не змог узяць Лагожска. Тады ён паспяшыў да Ізяслаўля, куды ўжо падышлі дружыны ўладзіміра-валынскага князя Андрэя, тураўскага князя Вячаслава (братоў Мсціслава), гарадзельскага князя Усевалада і клецкага князя Вячаслава. Ізяслаўскі князь Брачыслаў, які быў жанаты на Мсціслававай дачцэ, выехаў з горада на сустрэчу са сваім цесцем, жадаючы пакорлівасцю заслужыць ягоную міласць. Па дарозе Брачыслаў трапіў у рукі да Ізяслава Курскага. Нядоўга баранілiся ізяслаўцы, паверыўшы абяцанню ворага, што іх горад не будзе «ўзяты на шчыт», яны здаліся. Як толькі адчынілі браму Ізяслаўля, рускія ваяры забыліся пра сваё слова і ўварваліся ў горад. Цэлую ноч рабавалі Ізяслаўль пераможцы. Нават маёмасць Мсціслававай дачкі ўдалося адстояць толькі з праліццём крыві. Невядома, як адбываліся падзеі каля Барысава і Друцка, але калі пра гэта маўчаць летапісы, дык можна дапусціць, што русаў напаткала там няўдача. Надзея палачан адбіць ворага прапала, калі на Полацк выступіў наўгародскі князь Усевалад Мсціславіч. У гэты цяжкі час полацкае веча выдаліла з Полацка князя Давыда, а на яго месца выбрала Рагвалода-Барыса. Ён, пэўна, прызнаў над сабой уладу Мсціслава. Рускія князі не сталі рызыкаваць працягваць вайну з Крывіяй і задаволіліся дасягнутым. Толькі і Рагвалод-Барыс аказаўся непаслухмяным волі вялікага кіеўскага князя. Калі ў 1128 годзе Мсціслаў Уладзіміравіч, збіраючыся на полаўцаў, паслаў загад крыўскім князям удзельнічаць у паходзе, дык яны здзекліва адказалі ўладару Русі: «Ты з Бонякам Шэлудзюком будзьце здаровымі і ўпраўляйцеся самыя, а мы маем што рабіць дома»[2]. Палачане зноў паказвалі свой свабодалюбівы дух. І Мсціслаў не дараваў ім гэтага. Тым больш, полацкія дружыны пачалі нападаць на кіеўскія землі, пэўна, жадаючы вярнуць Менск.



Фрагмент з абраза прападобнай Ефрасінні Полацкай.
Полацк. XII ст.

Адразу ж пасля паходу на полаўцаў Мсціслаў у 1129 годзе паслаў войска на Полацк. Становішча палачан ускладнілася нечаканай смерцю Рагвалода-Барыса.

Полацкае веча, каб уратаваць дзяржаву ад спусташэння, выдала Кіеву князёў Расціслава, Святаслава, Рагвалода-Васіля, Івана, Давыда. Мсціслаў саслаў іх у Візантыю. Кіеўскі князь не пасмеў расправіцца з Ізяславічамі — за імі стаяла Візантыя. У сваёй антыкіеўскай палітыцы Полацкае княства знаходзіла саюзнікаў у Царградзе, у асобе візантыйскіх імператараў. Невыпадкова, што адзін з іх парадніўся з полацкім княжацкім домам, узяўшы адтуль жонку*.

Паводле запісак Кацярыны II, палачане, убачыўшы, што вялікі князь Мсціслаў ваюе Полацкую зямлю за няпраўду князя Давыда, сына князя Глеба Усяславіча і іншых князей, выслалі князя Давыда з сынамі Расціславам і Святаславам з Полацка, заявіўшы, што ён няпраўдаю даў прычыну да вайны, і паслалі да Мсціслава прасіць сабе князем Рагвалода-Барыса. Мсціслаў абвясціў палачанам, «што князі іх учынілі яму непаслушэнства і крыўду, самі на полаўцаў не пайшлі ў абарону айчыны і войска не паслалі, але ў гэты час рабілі напады на ўдзелы братоў яго, а паколькі ён ведае, што гарады і землі Полацкія ў гэтым не павінны, таму загадаў толькі князёў Полацкіх узяць на суд у Кіеў праз князёў рускіх»[3].

У Полацку сеў кіеўскі намеснік. Але і цяпер палачане не склалі зброі. У суседняй Літве ацалелыя ад высылкі Ізяславічы збіралі войска. І Мсціслаў у 1130 годзе здзейсніў паход у Літву

---

*Цётка Ефрасінні Полацкай была замужам за сынам імператара Мануіла — Аляксеем.

да Ізяслаўля, спаліў нямала сёл, вывеў шматлікі палон, але галоўнай мэты не дасягнуў: полацка-літоўскае войска не было разбіта. І таму ў 1131 годзе ён з кіянамі і чарнігаўцамі зноў пайшоў на Літву. Палачане і літвіны напалі на войска кіеўскага князя і нанеслі яму цяжкае паражэнне.

Пасля Мсціслававай смерці ў 1132 годзе, калі Русь канчаткова развалілася на асобныя княствы, Кіеву было ўжо не да Полацка, самому б уцалець у той віхуры міжусобнай барацьбы, што пачалася паміж Рурыкавічамі. Палачане тут жа выгналі з Полацка кіеўскага стаўленіка князя Святаслава («пазбаўляешся нас») і ўзвялі на полацкі пасад свайго князя Васільку Усяславіча. А ў канцы 30-ых — пачатку 40-ых гадоў менскія землі перайшлі да сыноў Глеба. У Менску сеў князь Расціслаў Глебавіч. У 1140 годзе з Візантыі вярнуліся князі Іван і Рагвалод — пасля дванаццацігадовай разлукі з Радзімай яны зноў убачылі яе. Пастарэлыя, праславіўшыя свае імёны ў войнах з сарацынамі, пазнаўшыя не адну бяду і расчараванне.

О Радзіма, колькі разоў там, на чужыне, ляцелі птушкай думкі да цябе, колькі разоў ажывала ў памяці твая мілая, непаўторная прыгажосць. Вось гэтыя хваёвыя бары, дзе так лёгка дыхаецца водарам лясным, вось гэтыя дубровы з паганскімі капішчамі, вось гэтыя палеткі, дзе каля самай дарогі сярод жыта квітнеюць валошкі і рамонкі, зялёныя выганы, адкуль чуваць няхітрыя спевы пастуховай жалейкі. Хвалі роднай Дзвіны. Усё з дзяцінства знаёмае і дарагое сэрцу. І як стала хвалюючa на сэрцы, калі ўбачылі купалы Сафіі. Полацк! Вось і вярнуліся да цябе.

Не быў князь Рагвалод-Васіль улюбёнцам лёсу. Яму выпала доля няўдачніка, нявольніка, ізгоя. Гэта пра яго сказана: адна бяда не ходзіць... Хаця хіба толькі Рагвалода тое тычыцца? Увесь Ізяславаў род выпіў з гэтай чашы нямала, а колькі яшчэ наканавана горычы! Не для мяккіх пуховых ложкаў, не для хмельных баляванняў, не для пустых забаў і пацех, не для асабістай выгоды жылі полацкія князі. Меч узнялі яны супраць Яраславічаў, супраць Кіева. Ганарлівыя варагі служылі Кіеву, лацінскія каралі за гонар лічылі парадніцца з Яраславічамі, ваяўнічыя куманы баяліся іх. Магутная Візантыя з Кіевам на ліслівым «Вы», а вось яны, Ізяславічы, на «ты». Паднялі меч за веліч і славу роднай зямлі, за яе свабоду і незалежнасць. Кроў Рагвалода на іх сцягах. Нялёгкая барацьба з Кіевам, ды лёс, як і Радзіму, не выбіраюць. Значыць, несці ім крыж на сваю Галгофу, а шлях на Галгофу — шлях у вечнасць. Не дажываць свой век на Радзіме, а служыць ёй вярнуўся Рагвалод.

Напачатку ўсё складвалася ў яго даволі добра, прынамсі, ён аб такім не марыў. Палачане з радасцю сустрэлі яго. Праз тры

гады выбралі сваім князем. У той жа час другая, не меншая прыемнасць — жаніцьба з дачкой Ізяслава Мсціславіча. Сам кіеўскі князь Усевалад Ольгавіч з усёй сваёй сям'ёй і баярамі прысутнічалі на вяселлі. Пашану яму выказалі. Здавалася, цяпер толькі і жыві, уладар, служы Бацькаўшчыне, Полацку.

Восем гадоў княжыў Рагвалод. Ніякіх звестак пра яго гаспадаранне ў нас няма. Толькі ў «Хроніцы Літоўскай і Жамойцкай» туманна паведамляецца: «Той Василий псковян долгою войною примусил до голду и поступленя некоторых волостей, которые были от князства Полоцкого оторвали а, гды в покою потым пановал много лет»*[4]. Нельга адмаўляць падобны канфлікт паміж Полацкам і Псковам. Цалкам верагодна, што Пскоў мог скарыстацца аслабленнем Полацкага княства і захапіць некаторыя полацкія воласці. І вось Рагвалоду-Васілю давялося зброяй вяртаць страчанае. Не выключана, што складальнік «Хронікі...» карыстаўся летапісамі, якія не дайшлі да нас, і там знайшоў паведамленне пра «долгую войну» паміж Полацкам і Псковам.

Можна думаць, сярод асноўных клопатаў полацкага князя найважнейшым было далучэнне да Полацка земляў Менскага княства. Але як гэта зрабіць? На Меншчыне ўмацаваліся Глебавічы, якія яго ўлады не прызнавалі і марылі самі завалодаць Полацкам. Пачынаць вайну з Менскам? Але ці прынясе яна жаданы вынік?

Нерашучасць Рагвалода не задавальняла полацкае баярства. І тады яны вырашылі запрасіць у Полацк менскага князя Расціслава Глебавіча, які пад сваёй уладай аб'яднаў бы Полацкую і Менскую землі. Каб прадухіліць сутычкі з Мсціславічамі, да якіх мог звярнуцца Рагвалод, палачане папрасілі ў ноўгарад-северскага князя Святаслава Ольгавіча апекі над імі, тым самым заручыліся падтрымкай моцнай кааліцыі паўднёварускіх князёў. Самога ж Рагвалода яны звязенілі і «держаша в велице нужи». Гэтая перасцярога не была залішняй: Рагвалод-Васіль, апынуўшыся на волі, мог паклікаць на дапамогу зацікаўленых у міжусобнай калатнечы на Полаччыне суседзяў, пайсці вайной на Полацк.

Да Расціслава Глебавіча прыбылі паслы з прапановай стаць полацкім князем. І Расціслаў не адмовіўся: полацкі пасад для Ізяславічаў меў значэнне велікакняжацкага.

У 1151 годзе Расціслаў сеў у Полацку, а Рагвалода саслаў у Менск. Восем доўгіх гадоў знаходзіўся былы вялікі князь у няволі. Пэўна, не пакідала яго крыўда на палачанаў. Ён ака-

---

*Ён названы сынам літоўскага князя Гінвіла-Барыса.

заўся цацкай у руках полацкага веча, баяраў, якія там верхаводзілі. І не няволя яго прыгнятала, а няўдзячнасць суайчыннікаў. Верай і праўдай служыў ім, а падзяка якая! Ну, не спадабаўся ён ім, не спраўдзіў іх надзей, дык мовілі б яму: «Пазбаўляешся нас», — і развіталіся б у любові, адпусцілі б яго на ўсе чатыры бакі. Дык не ж!.. За сваю службу ізгоем быць ён не заслужыў. Як злодзея і душаемца, кінулі ў цвержу, пахлебнічалі перад Расціславам.

Горкі прыклад Рагвалода, ды і іншых князёў, якіх свавольнае веча выгнала з Полацка, вымусіла Расціслава Глебавіча імкнуцца да ўмацавання сваёй улады. Жорсткі, рашучы, не паслухмяны вечавой волі, Расціслаў не ўсім падабаўся ў Полацку. Многія палачане марылі вярнуць назад «ціхмянага» Рагвалода. Рагвалодавыя прыхільнікі звяртаюцца да магутнага Юрыя Даўгарукага. Той, даведаўшыся пра нялёгкі лёс былога полацкага князя, патрабуе ад Расціслава адпусціць яго. Так Рагвалод атрымаў волю. Адразу ж пасля вызвалення ён адпраўляецца да Святаслава Ольгавіча, у якога і знаходзіць падтрымку. Святаслаў дае Рагвалоду «полк», з якім той і пайшоў на Полаччыну.

А ў Полацку ўсё болей незадаволеных Расціславам. У 1158 годзе полацкая дружына, якую вёў Расціслаў, удзельнічала ў паходзе на Тураў. На гэты паход спатрэбіліся немалыя выдаткі ад палачанаў, і яны спадзяваліся акупіць іх вайсковай здабычай. Расціслаў з дружынай спазніўся пад горад, усе навакольныя вёскі ўжо былі разрабаваныя саюзнікамі, і полацкім воям ні з чым давялося вяртацца назад. Гэта таксама магло выклікаць незадавальненне палачанаў сваім князем.

Тым часам Рагвалод-Васіль прыбыў у Слуцк. Адсюль ён пасылае сваіх людзей у Друцк. Дручане з радасцю запрашаюць Рагвалода да сябе, бо, мабыць, яны стаміліся ад Расціслававай улады (князем у Друцку быў сын Расціслава — Глеб). Такі ўдалы пачатак абнадзеіў Рагвалода. Ён выступае да Друцка. Дручане паўсталі супраць Глеба Расціславіча, выгналі яго з горада, разрабавалі двор і з пашанай і ўрачыстасцю разам з палачанамі — прыхільнікамі Рагвалода, якія прыбылі ў Друцк, — сустрэлі былога свайго ўладара.

З'яўленне Рагвалода ў Друцку падштурхнула да дзеянняў і палачанаў. Яго прыхільнікі ў Полацку выступілі супраць Расціслава. Толькі дарамі і ўдалося Расціславу ўціхамірыць незадаволеных ім месцічаў, прывесці іх да прысягі. Не губляючы часу, ён аб'ядноўваецца з братамі. Што-што, а тлумачыць Глебавічам, які іх чакае лёс, калі ў Полацку сядзе Рагвалод, не трэба: яны разумеюць, што застануцца без удзелаў, як і Глеб Расціславіч. Наступныя падзеі падштурхнулі князя да рашучых дзеяў.



Мініяцюра з Радзівілаўскага летапісу.
Палачане выганяюць князя. *XVI ст.*

У Полацку ўспыхнуў мяцеж. Мяцежнікі патрабавалі вяртання на полацкі пасад Рагвалода. Дарамі многімі Расціслаў супакоіў сваіх непрыяцеляў і вадзіў іх да крыжа — узяў клятву на вернасць. Хутчэй трэба было расправіцца з Рагвалодам. На Друцк рушыла вялікае войска, сабранае з усяго княства.

Рагвалод замкнуўся ў Друцку. Дручане падтрымалі яго. «Бъяхутся крепко», — сказана ў летапісе аб тых баях[5]. Абодва бакі неслі вялікія страты. Працяглая аблога пагражала Расціславу паражэннем. А ў Полацку гэтага яму не даравалі б. І Расціслаў ідзе на мір з Рагвалодам, прызнаўшы яго друцкім князем.

Няўдача пад Друцкам дала Рагвалодавым прыхільнікам зачэпку для таго, каб узбунтаваць палачан супраць Расціслава. Яны шлюць спачатку патаемных паслоў да Рагвалода: «Княже нашь! Согрешили есмь к Богу и к тобе, оже въстахом на тя без вины, и жизнь твою всю разазграбихом и товея дружины, а самого емше выдахом тя Глебовичем на великую муку: да аще ныне помнеши всего того, и же створихом своим безумием, и хрест к нам целуеши, то мы людие твое, а ты еси нашь князь; а Ростислава ти емше вдамы в руче, а ежь хощеши, то створиши ему»*[6]. Рагвалод пакляўся на крыжы, што даруе палачанам учыненае яму зло.

На Пятроў дзень было вырашана звязеніць Расціслава. Палачане запрасілі князя з яго рэзідэнцыі ў Бельчыцах удзельнічаць разам з імі ў свяце. Расціслаў разважліва апрануў пад адзежу даспехі і прыехаў у горад. Але тады змоўшчыкі не адважыліся напасці на яго. Наступным днём яны зноў паклікалі яго з Бельчыцаў: «Княже! Поеди к нам, суть ны с тобою речи; поеди же к нам в город». Расціслаў здзівіўся: «А вчера есмь у вас вчера был; а чему есте не молвили ко мне, а что вы было речи?»[7] Аднак усё ж згадзіўся прыехаць. Каля Сафіі тым часам сабралася веча, якое і вырашыла пазбавіць Расціслава пасада. Найболей гарачыя галовы ўжо раззбройвалі княжацкіх дружыннікаў. Аб гэтым Расціслаў і даведаўся ад аднаго са сваіх слуг. Той уцёк з горада і папярэдзіў князя: «Не езди, княже, вече ти в городе, а дружину ти избивають, а тебе хотять яти»[8]. Для Расціслава ўсё стала ясна: Полацк падняўся супраць яго, і полацкім князем яму не быць. Ён вяртаецца ў Бельчыцы і, забраўшы дружыну, уцякае да брата Валадара ў Менск. Па дарозе, помсцячы за сваё паражэнне, рабуе і паліць полацкія воласці.

Рагвалод па запрашэнні палачанаў прыйшоў у Полацк і сеў «на столе деда своего и отца своего с честью великою»[9]. Але з выгнаннем Расціслава парушалася адзінства Полацкай зямлі: зноў яна падзялілася на Полацкае і Менскае княствы. Рагвалоду неабходна было аб'яднаць іх. Мірным шляхам зрабіць гэтага ён не мог. Расціслаў не дараваў Полацку свайго выгнання. Разам з братам Валадарам нападаў ён на полацкія ўладанні. Рагвалод звярнуўся па дапамогу да дзядзькі сваёй жонкі, Расціслава Мсціславіча, які прыслаў яму смаленскую дружыну. Да палачанаў і смаленцаў далучыліся наўгародцы і пскавічы. За гэта Рагвалод павінен быў удзельнічаць у паходзе на Ушчызну.

---

*Даследчыкі лічаць, што гэта ўрывак з Полацкага летапісу.



Рагвалодаў камень. *XII ст.*

Першы ўдар Рагвалод вырашыў нанесці па Ізяслаўлі і тым самым адрэзаць Менск ад саюзнай з ім Літвы (тут, у Літве, набіралі дружыны менскія князі). Заслаўскі князь Усевалад, спадзеючыся на былыя сяброўскія адносіны з Рагвалодам, выйшаў з горада на сустрэчу з ім. Сяброўства сяброўствам, а палітыка палітыкай — Рагвалод забірае ў былога сябра Ізяслаўль, а яго самога высылае ў Стрэжаў. У горадзе ён садзіць сваіх намеснікаў: князёў Брачыслава і Валодшу.

На гэтым і закончыліся поспехі Рагвалода. Дзесяць дзён яго войска прастаяла пад Менскам — так і не рашыўся ён на штурм.

Вялікія страты маглі выклікаць незадаволенасць полацкага веча. Давялося Рагвалоду заключыць мір з Расціславам. Але калі Расціслаў памірыўся з Полацкам, дык ягоны брат Валадар «не целова хреста, темь оже ходяше под Литвою в лесах...»[10], збіраў там войскі. Так што вайна не закончылася. Адразу пасля таго як Рагвалод вярнуўся ў Полацк, Глебавічы напалі на Ізяслаўль, захапілі яго. Валодшу кінулі ў поруб, Брачыслава закавалі ў жалеза. Рагвалоду зноў давялося надзяваць баявыя даспехі. На дапамогу сваяку Расціслаў Мсціславіч, які цяпер сядзеў у Кіеве, прыслаў 600 торкаў. Шэсць тыдняў прастаяў Рагвалод Барысавіч каля Менска. Ад голаду ў торкаў падохлі коні, і саюзнікі, не дачакаўшыся канчатку вайсковых дзеяў, адправіліся пехатою ў Кіеў. І на гэты раз Рагвалод не авалодаў Менскам «и створи мир с Ростиславом по своеи воли». Удалося толькі вызваліць з няволі Брачыслава і Валодшу.

У Полацку засталіся незадаволены паходамі — Менск не зломлены, і ў наступным 1161 годзе Рагвалод хадзіў на Менск. І зноў няўдача, зноў з нічым прыйшлося «възвратися въсвои».

Тры безвыніковыя паходы на Менск, бездапаможнасць у кіраванні дружынай... І сцішыліся галасы Рагвалодавых прыхільнікаў. Рагвалод адчуваў холад, з якім цяпер адносіліся да яго ў Полацку. Адзіны сродак вярнуць сабе прыхільнасць палачанаў — перамагчы Менск. У 1162 годзе Рагвалод-Васіль з полацкімі ваярамі зноў каля Менска, дзе пасля смерці Расціслава сеў Валадар. Хітры і асцярожны менскі князь не ўступіў у бой з Рагвалодам днём, а ўначы з войскам, якое набраў у Літве, выступіў з горада і напаў на полацкі стан. У бітве шмат палачанаў загінула, яшчэ болей трапіла ў палон. Рагвалод з рэшткаю дружыны ўцёк у Слуцк. Ён разумеў, што Полацк не даруе яму ганебнага паражэння. Са Слуцка ён пасылае сваіх людзей у Полацк, каб яны сказалі, што вялікі князь адракаецца ад пасада, а сам вяртаецца ў Друцк.

Так бясслаўна скончылася княжанне Рагвалода ў Полацку. Яму не хапала ні рашучасці, ні цвёрдасці, ні вайсковага ўмельства, ні палітычнай мудрасці. І калі ў мірныя гады ён яшчэ спраўляўся са сваімі абавязкамі полацкага валадара, дык у вайне не змог праявіць сябе. І да самай смерці Рагвалод заставаўся князем у Друцку.

А міжусобная вайна паміж Полацкам і Менскам не закончылася. Праз пяць гадоў Валадар з менска-літоўскім войскам пайшоў на Полацк. Полацкі князь Усяслаў Васількавіч выступіў яму насустрач і стаў чакаць падыходу віцебскага князя Давыда Расціславіча. Валадар нечакана напаў на палачанаў і разбіў іх.

Пасля паражэння Усяслаў Васількавіч уцёк у Віцебск да Давыда Расціславіча. Полацкім князем стаў Валадар, і першай

яго справай з'явіўся паход на Віцебск. Князь Давыд ухіліўся ад бою, бо чакаў дапамогі ад брата, смаленскага князя Рамана. Аднак неспадзяваны выпадак перакрэсліў усе Валадаравы намаганні. Ноччу расхадзілася навальніца, ударылі перуны. Воі Валадаравы ўспрынялі гэта як нядобры знак і сталі прасіць князя адступіць. Валадар вымушаны быў паслухаць. Раніцай Давыд, убачыўшы, што варожае войска адступіла, пусціўся наўздагон, але не дагнаў яго. Валадар, не заходзячы ў Полацк, вярнуўся ў Менск, назаўжды адмовіўшыся ад мары стаць полацкім князем.

Міжусобная вайна на Полаччыне закончылася. Яе горкія ўрокі не прайшлі дарэмна для палачанаў. Ужо праз дванаццаць гадоў — у 1180 годзе — у вайне са Смаленскам за Друцк усе полацкія князі, у тым ліку і менскія, выступілі на абарону сваёй зямлі. І адзінства прынясло перамогу.

А што ж Рагвалод-Васіль? Ён жыў у Друцку і, мабыць, не праяўляў былой актыўнасці ў палітыцы, а таму яго імя знікла з летапісаў. Аднак 7 мая 1171 года ў ягоным жыцці павінна была адбыцца нейкая важная падзея, бо ён выбіў на камяні, што ляжаў паміж Друцкам і Воршай, зварот да Бога. «В ле(то) сход мсца маия въ з днь доспе(н)ъ (к)рьсні гипомози (ра)бу своему Василию в с крщенц(и) (и) менемь Рогволод(у) сну Борисову». Што за падзея?

У летапісах пад 1175 год князь Усяслаў Васількавіч названы віцебскім князем, значыць, да гэтага часу ён страціў полацкі пасад. Калі? Можа, якраз у 1171 годзе і Рагвалод паспрабаваў зноў вярнуцца ў Полацк. Праўдзівая наша версія або памылковая, застаецца толькі гадаць.

Далейшы лёс Рагвалода-Васіля нам невядомы. Але свой след у гісторыі ён пакінуў не толькі дзеямі, але і слаўнымі нашчадкамі. У літвінскіх летапісах распавядаецца, што князь меў сына Глеба, які нядоўга княжыў у Полацку, а таксама дачку Параскеву, якая за сваю хрысціянскую добразычлівасць пасля смерці была прылічана да святых. Магчыма, што і князь Усяслаў Васількавіч быў ягоным сынам, бо ў Густынскім летапісе ён названы паводле княжацкага імя бацькі Усяславам Рагвалодавічам. Увогуле лёс нашчадкаў Рагвалода-Васіля вельмі загадкавы. Ад Рагвалода-Васіля летапісцы выводзяць такія княжацкія роды, як Друцкія, Астрожскія, Пуцяты, Сакалінскія. Стрыйкоўскі даводзіў, што і польская каралева Сафія паходзіла ад Друцкіх. Але самае заблытанае, дык гэта радавод літвінскіх князёў. Незалежна адзін ад аднаго розныя летапісцы выводзілі ўладароў Літвы ад Рагвалода-Васіля. Гэтак, паводле Васкрэсінскага летапісу і Міндоўг, і Тройдзень, і Віцень былі нашчадкамі Рагвалодавага сына Расціслава[11]. Той жа Стрыйкоўскі пісаў,

што літвінскі князь Таўцівіл, а значыць, і ягоны брат жамойцкі князь Транята, былі сынамі Глеба Рагвалодавіча, а таму і стаў Таўцівіл па «праву дзедзічнаму» полацкім князем[12]. А можа, так яно і ёсць, Рагвалод-Васіль паклаў пачатак дынастыі вялікіх князёў літоўскіх? І сапраўдную славу, і памяць пра Рагвалода-Васіля прынеслі яму ягоныя нашчадкі!

Вось такая гісторыя пра князя Рагвалода-Васіля — асоба не гераічная, і не славай ён праславіўся ў летапісах. Але пакінуў сваё імя на памяць нашчадкам. Жыў такі чалавек, можа быць, мяккадушны і нерашучы па натуры, стаў нявольнікам свайго княжацкага паходжання і воляю людской і паверыў, што можа спраўдзіць надзеі, што ўсклалі на яго, пераацаніў сілы, а сіл вось і не хапіла. Асудзіў сябе на пакуты і другім прынёс нямала бяды. Ды і гонар княжацкі не дазваляў прызнацца ў сваёй слабасці: і праліваў братнюю кроў, мячом і гвалтам сцвярджаў сябе. І сабе шчасця не здабыў, і не тым, хто даверыўся яму. Павучальная гісторыя пра ўладара, не вартага высокага пасада і княжацкага вянца. Пэўна, трэба толькі пашкадаваць гэтага чалавека, ну што рабіць, калі абставіны былі мацнейшымі за яго. Але не хочацца і асуджаць. Усё ж вабіць барацьба слабага, які смела кідае выклік моцнаму, не хаваецца за чужымі спінамі, а мужна бярэ свой крыж у рукі і нясе яго. Прыніжалі і білі, а нёс. А калі зразумеў, што ноша не па ім, змірыў свой гонар, выракся ад таго, што наканавана не яму. І можа быць, у сваім маленькім і зялёным Друцку, дзе яго любілі месцічы, дзе штодня радавалася сэрца, гледзячы на сваіх дзяцей, састарэлы князь адчуваў сябе як ніколі шчаслівым, і адкрывалася яму новая ісціна, што ні ўлада, ні багацце, ні пераможная, на крыві ўзгадаваная слава, ні самаўлюбёнасць у свой гонар — шчасце. І дзякаваў Богу князь, што давялося яму пажыць простым жыццём, як людзі жывуць. І не карона яго суцяшала, а любоў людзей да яго і любоў яго да людзей. Чамусьці верыцца, што Рагвалод-Васіль дажыў апошнія гады ў шчасці, любові і згодзе з самім сабой.

ЗА ДВА СТАГОДДЗІ ДА ГРУНВАЛЬДА





УЛАДЗІМІР ПОЛАЦКІ
(?—1216)
З. Азгур. ***1943 г.***

УЛАДЗІМІР ПОЛАЦКІ



1186 годзе высадзіўся на бераг Лівоніі святар ордэна бласлаўеннага Аўгусціна Мейнард і «проста дзеля справы Хрыстовай» прыняўся «садзіць вінаграднік Гасподні». Полацкі князь Уладзімір — валадар Лівоніі — дазволіў Мейнарду прапаведаваць хрысціянства лівам. Ні полацкі князь, ні Усевалад, князь Герцыке, ні кукейноскі князь Вячка — ніхто з іх не адчуваў, якая бяда пастукала ў дзверы іхняга дома. Як жа не спрыяць было святой справе — слова Божае распаўсюдзіць сярод пазбаўленых выратавальнай веры паганцаў.

З'яўленне Мейнарда ў Лівоніі не было выпадковым. Яшчэ ў сярэдзіне X стагоддзя пры германскім каралі Генрыху I Птушкалове нямецкія феадалы пачалі заваёву земляў заходніх славянаў. Пасля доўгай і крывавай барацьбы Генрыху I удалося скарыць лужыцкіх сербаў і люцічаў. Але ўжо ў канцы таго ж стагоддзя падуладныя немцам славянскія плямёны паўсталі і на цэлыя паўтара стагоддзі адваявалі сабе незалежнасць, толькі землі люцічаў засталіся ў руках немцаў. Аднак з сярэдзіны XII стагоддзя немцы зноў пачалі «рух на ўсход». У 1160 годзе саксонскі герцаг Генрых Леў перамог абадрытаў. На захопленай абадрыцкай зямлі нямецкія феадалы стварылі Мекленбургскае герцагства. Такі ж трагічны лёс напаткаў астатніх люцічаў і шпрэвян, на іх землях захопнікі стварылі Брандэнбургскае герцагства са сталіцай Берлін. На славянскіх землях немцы адчувалі сябе ўладарамі: гвалтоўна хрысцілі славянаў, прымушалі іх працаваць на сябе, а непакорных каралі смерцю. Заваёўніцкі імпэт нямецкіх рыцараў павялічыўся, іх прагнае вока ўглядалася ва ўсход — там ляжалі новыя землі. Ад купцоў даведаліся яны і пра Лівонію.

А Лівонія ў той час належала Полацку. Лівы, як падуладны народ, плацілі полацкаму князю даніну, а ў час вайсковых дзе-

янняў выстаўлялі войска. Апроч Лівоніі полацкая ўлада распаўсюджвалася на Латгалію, на землі селаў і лэтаў. Так, папа рымскі Урбан III лічыў, што Латгалія знаходзіцца «ў Русіі»[1]. Паводле Рыфмаванай хронікі, землі селаў, ліваў, лэтаў да прыходу мечаносцаў былі ў руках рускіх[2]. Хто былі гэтыя рускія, указаў Арнольд Любецкі, які пісаў: «Кароль Русіі з Полацка меў звычай час ад часу збіраць даніну з гэтых ліваў»[3]. Палачане валодалі Ніжняй Дзвіной аж да вусця Балтыйскага мора, што давала ім магчымасць бесперашкодна гандляваць з нямецкімі і скандынаўскімі купцамі. Па Дзвіне стаялі полацкія гарады Кукейнос і Герцыке — шматлюдныя, з мноствам цэркваў, у якіх знаходзіліся дарагія абразы і срэбнае начынне, з добраўмацаванымі замкамі. Гэта былі цэнтры крывіцкай каланізацыі ў Прыбалтыцы, на якія абапіраўся ў сваім кіраванні Лівоніяй полацкі князь, яны ж з'яўляліся і сталіцамі ўдзельных княстваў. Апроч Герцыке і Кукейноса палачане мелі ў Лівоніі шэраг невялікіх гарадоў-крэпасцей: Аіціна, Ашуце, Лепэкэ, Бебшынэ, Бебінэ, Ліксна, Гердынэ, Рэжыца.

Каб заваяваць Лівонію, нямецкім феадалам трэба было не толькі змагацца з лівамі і суседнімі плямёнамі, але перш за ўсё з Полацкам. А сілу гэтага княства яны разумелі. Вялікім каралём называў нямецкі храніст Генрых Латвійскі князя Уладзіміра. І пакуль нямецкія каланісты не замацаваліся ў Лівоніі, не набраліся сілы, ім патрэбны быў мір з Полацкам. Таму Мейнард і дзейнічаў асцярожна, хаваў сапраўдныя мэты сваёй дзейнасці. Разам з пропаведдзю ён займаўся зусім далёкімі ад веры справамі — узводзіў з нямецкімі паломнікамі замкі Ікесколь і Гольм. Пасля дабіваўся ў брэменскага архібіскупа дазволу на ўтварэнне Ікескольскага біскупства.

У Рым ад наваяўленага біскупа да папы прыбыў пасол з просьбай абвясціць крыжовы паход супраць язычнікаў-ліваў. Мейнард зняў маску дабрадзейнага святара, пад ёю прадстаў жорсткі і хітры палітык з нясцерпнай прагай заваёвы новых земляў. Цэлестын III не мог не ўхваліць дзеянні Мейнарда: у Рыме таксама марылі аб новых землях і новай пастве. У 1192 годзе папа абвясціў крыжовы паход у Лівонію і паабяцаў адпушчэнне грахоў усякаму, хто ўскладзе на сябе крыж для падтрымкі новазаснаванай царквы. Разлік Мейнарда быў дакладны — ён дамогся падтрымкі каталіцкага свету. І паспяшылі ў Лівонію бедныя нямецкія рыцары ў надзеі атрымаць зямельныя лены, святошы-пілігрымы, грэшнікі — адкупляць крывёю язычнікаў грахі, проста авантурысты і шукальнікі прыгодаў. Ахвотнікаў было нямала. Гэта ж не далёкая і небяспечная Палесціна з яе спёкай і пустынямі і не войны з ваяўнічымі сарацынамі. Да Лівоніі — рукой падаць, падарожжа туды не доў-



Сярэдневяковая мініяцюра. Крыжакі

гае, а лівы амаль бяззбройныя, куды ім ваяваць супраць закутых у латы рыцараў. І запалалі ліўскія сёлы, пралілася кроў.

Пасля смерці Мейнарда «місію хрысціцеля» Лівоніі працягваў дзейны біскуп Бертольд. Але ў баі з лівамі ён загінуў. На яго месца заступіў біскуп Альберт. Дзе трэба было хітрыць — Альберт хітрыў, дзе выгадна было забыцца на хрысціянскія запаветы — Альберт забываў, дзе неабходна было праліваць кроў — Альберт праліваў яе. Як і Мейнард, ён звярнуўся да папы рымскага з просьбай абвясціць крыжовы паход на ліваў. Інакенцій III заклікаў вернікаў Саксоніі і Вестфаліі прыйсці на дапамогу Лівонскай царкве супраць «язычнікаў». Сам Альберт і прапаведаваў у Германіі паход на Лівонію. Толькі на востраве Готландзе пасля ягонага казання болей за пяцьсот чалавек згадзіліся прыняць крыж. Біскуп зачасціў у двары знатных нямецкіх феадалаў, у якіх дамагаўся падтрымкі крыжаносцаў. Сустрэўся ён і з дацкім каралём Кнудам VI, спакушаючы яго на заваёву Усходняй Прыбалтыкі. Быў Альберт прыняты і германскім каралём Філіпам, дзе выступіў у каралеўскай радзе.

Увесну 1200 года 23 караблі з крыжакамі прычалілі да берагоў Лівоніі. «І залілі крывёю паганцаў усе дарогі і месцы», «і схапілі яны многіх, і перабілі ўсіх мужчын і звялі ў палон жан-

чын і дзяцей», «спустошылі і аддалі агню ўсе сёлы, а мужчын, якіх захапілі, усіх спалілі жывымі...» Як ні апяваў подзвігі нямецкіх рыцараў ордэнскі храніст Генрых Латвійскі, але ўсё ж не ўтойваў і праўды аб хрышчэнні Лівоніі. Каб полацкі князь не ўстрывожыўся і не павёў сваё войска на крыжакоў, Альберт плаціў Полацку даніну за ліваў.

Захопленыя землі натхніцель экспансіі раздаваў на ленных правах рыцарам, якія павінны былі несці вайсковую службу. Аднак Альберт разумеў, што без пастаяннай вайсковай сілы нельга ўтрымаць Лівонію ў сваіх руках. Многія паломнікі пасля году службы ў біскупавым войску вярталіся ў Германію. Нічога новага рыжскі святоша не прыдумаў — ён заснаваў вайскова-манаскі ордэн на ўзор існаваўшых рыцарскіх ордэнаў.

Папа рымскі Інакенцій III надаў новаму Ордэну статут храмоўнікаў (тампліераў) і сымбалі для нашэння на вопратцы. Першапачаткова новы Ордэн называўся «Fratres militiae Christi» — «Браты воінства Хрыстова», але па сымбалях на вопратцы — чырвонаму крыжу і мячы — ён называўся Ордэнам мечаносцаў, або Лівонскім.

Кожнаму, хто ўступаў у Ордэн, адрасавалі такія словы: «Ты вельмі памыляешся, калі думаеш жыць у нас спакойна і весела: наш статут — калі жадаеш снедаць, дык павінен пасціцца, калі хочаш пасціцца, дык павінен снедаць, калі не хочаш спаць, павінен спаць, калі хочаш спаць, павінен забыцца на сон. Дзеля Ордэна ты павінен адрачыся ад бацькі, ад маці, ад брата і сястры, і ўзнагародай за гэта Ордэн дасць табе хлеб, ваду і вопратку»[4]. Ордэнскі статут быў суровы. Кожны рыцар даваў чатыры зарокі — зарок паслушэнства начальству, зарок дабрачыннасці, зарок беднасці і зарок прысвячэння ўсяго свайго жыцця барацьбе з паганцамі ды іншаверцамі. За парушэнне статута рыцара жорстка каралі. На чале Ордэна стаяў магістр, які карыстаўся неабмежаванай уладай.

Больш за два стагоддзі Ордэн мечаносцаў быў самым небяспечным ворагам Полацкай зямлі.

«ВЯЛІКІ КАРОЛЬ ВАЛЬДЭМАР»

Толькі тады, калі ў вусці Дзвіны Альберт узвёў Рыгу і загарадзіў палачанам выхад у Балтыйскае мора, у Полацку забілі трывогу. Уладзімір пачаў збіраць войска... Але няўжо раней не было бачна небяспекі, што так позна схамянуліся? Калі і бачылі, і разумелі, што з'яленне ў Лівоніі немцаў — прамая пагроза Полацку, дык куды болей важныя і неадкладныя справы ў той час адцягвалі сілы палачанаў ад Лівоніі.

Полацкая зямля ў сярэдзіне XII стагоддзя трымала шчыльны саюз з Суздальскім княствам, дзе ўладарыў Андрэй Багалюбскі. Полацкія дружыны разам са смаленскімі і суздальскімі ў 1167 і 1169 гадах хадзілі на Ноўгарад, а ў 1168, 1174 і 1178-ым — на Кіеў. І аслабленне Ноўгарада, і аслабленне Кіева — даўніх палітычных праціўнікаў Полацка — было яму на руку. Так што паходы гэтыя прынеслі Полацку карысць — хаця б тое, што працяглы час у межах Полацкай зямлі не з'яўляліся варожыя войскі. А гэта — уцалелыя сёлы і гарады, гэта мірнае жыццё, гэта гандаль і развіццё рамёстваў, гэта росквіт культуры. Ззаду засталіся міжусобіцы, і ўсё выразней было імкненне полацкіх удзелаў да згоды і адзінства.

Ужо ў 1180 годзе ў паходзе на падуладны Смаленску Друцк удзельнічалі шэсць полацкіх князёў разам з літвінамі і лівамі. Адзінства стала залогам перамогі. Палачанаў падтрымалі чарнігаўцы і наўгародцы. Смаленскі князь Давыд Расціславіч, каб пазбегнуць сечы, адступіў з-пад Друцка ў Смаленск. Аднак ён не змог змірыцца з тым, што страціў Друцк і ўсяляк намагаўся аднавіць свае пазіцыі на Полаччыне. Ён дабіўся поспеху ў гэтым.

Пасля інтрыг Давыд пасадзіў у Друцку саюзнага сабе Усяслава Мікуліча, былога лагожскага князя. А ў 1186 годзе арганізаваў паход на Полацк. Разам са смалянамі выступілі наўгародцы на чале з сынам Давыда — Мсціславам. Падтрымалі смаленскага князя і яго саюзнікі — друцкі князь Усяслаў і лагожскі князь Васілька Валадаравіч. Такія сілы спатрэбіліся Давыду для заваёвы Полаччыны і далучэння яе да Смаленскага княства. Тым самым Смаленск выступаў у ролі пераемніка даўняй палітыкі Полацка — аб'яднання крыўскіх земляў у адну дзяржаву. Ды вось бяда: ні раней Смаленск, ні цяпер Полацк не хацелі пазбавіцца палітычнай самастойнасці. Таму палачане без асаблівай радасці ўспрынялі перспектыву хадзіць пад уладаю Смаленска. А гэта значыць, што зноў вайна. Толькі вось сілы не на карысць палачанам.

Веча вырашыла не дапусціць варожае войска на свае землі і дыпламатычным шляхам пазбегнуць спусташальнай вайны: «Не можам стаць супраць наўгародцаў і смалян, і калі пусцім іх у сваю зямлю, калі і мір учынім з імі, шмат нам зла ўчыняць, пустую зямлю учыняць тыя, хто ідуць на нас, але пойдзем да іх на сумежжа і ўчынім там з імі мір»[5]. Паслы з Полацка з багатымі дарамі сустрэлі наўгародцаў і смалян на полацкай мяжы і дамагліся свайго. Задобраны падарункамі князь Давыд спыніў свае войскі. Не абышлося і без зямельных уступак: да Смаленска адышоў Віцебск. Вось у гэты час і пачаў княжыць у Полацку князь Уладзімір.

Хто ён, гэты загадкавы «вялікі кароль Вальдэмар»? У рускіх летапісах пра яго няма ніякіх звестак. І каб не ордэнскі храніст, нічога б мы не даведаліся пра яго, і загінулі б у забыцці яго імя, яго дзеянні, яго жыццё.

У гістарычнай літаратуры прынята, што Вальдэмар — гэта нямецкая форма імя Уладзімір. Мікола Ермаловіч лічыць, што імя полацкага князя магло быць іншае — характэрнае для палачанаў Валадар або Валодша[6]. Яны гучаннем падобныя на імя Уладзімір, і не выключана, што Генрых Латвійскі назваў Вальдэмарам Валадара ці Валодшу. Гэты ж вучоны выказаў думку, што князь Валодша ў летапісах мог быць узгаданы пад імем Уладзімір — ён той самы, якога ў 1159 годзе менскія князі Глебавічы пасадзілі ў поруб у Ізяслаўлі і які вельмі верагодна мог быць сынам Рагвалода Барысавіча. Не выключана, што пазней яго абралі на полацкі пасад і ён дажыў да 1216 года[7].

«Каралём Вальдэмарам» мог быць і менскі князь Уладзімірка Валадаравіч, сын Валадара Глебавіча, звесткі пра якога знаходзім у Таціщава[8]. Паводле гісторыка, Уладзімірка ў 1182 годзе напаў на Падляшша — землі дарагічынскага князя Васількі Яраполкавіча. Дарагічынскі князь паклікаў на дапамогу палякаў і мазураў. На рацэ Буг варожыя войскі сустрэліся. У жорсткай сечы Уладзімірка Валадаравіч быў разбіты і адступіў у Менск. Васількі ўзяў Бярэсце, дзе пакінуў з дружынай свайго швагра — мазавецкага князя, і вярнуўся ў Драгічын.

А Уладзімірка рыхтаваўся да новага паходу. На дапамогу яму прыйшлі палачане. Менскі князь зноў адваяваў Бярэсце, пасля чаго рушыў на Васількі, які з войскам палякаў стаяў на Нуры за Драгічыным. Цяпер перамога была на баку Уладзіміркі. Не вытрымаўшы націску ягоных вояў, палякі пачалі адступаць да лесу, а Уладзімірка ў помсце за сваё ранейшае паражэнне амаль усіх іх пасек. Васількі з невялічкай дружынай уцёк да свайго цесця Лешкі і пры падтрымцы таго ў рэшце рэшт прагнаў з Падляшша Уладзіміркі.

Адсутнасць дакладных крыніц і сведчанняў пра асобу полацкага вялікага князя не дае магчымасці вызначыць, хто ён быў сапраўды.

ПОЛАЦКАЕ КНЯСТВА НАПРЫКАНЦЫ XII стагоддзя

Запрашаючы Уладзіміра ў Полацк, веча, мабыць, паставіла перад ім дакладныя задачы, ад вырашэння якіх і залежаў яго лёс як кіраўніка Полацкай дзяржавы. Што ж маглі патрабаваць ад новага князя палачане? Аднаўлення былой магутнасці і велічы Полацкага княства, вяртання страчаных земляў, заха-

вання адзінства полацкіх удзелаў. Мяркуючы па тым, што Уладзімір княжыў у Полацку на працягу трыццаці гадоў (1186—1216), чаго пасля славутага Усяслава Чарадзея не ўдавалася ніводнаму полацкаму валадару, ён, калі і не выканаў усе тыя патрабаванні веча, усё ж сваёй дзейнасцю шмат у чым апраўдаў спадзяванні палачанаў. Галоўнае — не толькі дамогся аб'яднання ўсіх удзельных полацкіх князёў пад сваёй уладай, але і здолеў абараніць полацкі пасад ад іх дамаганняў. Унутраная стабільнасць дзяржавы, моцная ўлада яе кіраўніка давала палачанам надзею на поспех і ў знешняй палітыцы. І першай мэтай было — вызваліцца ад палітычнага ўплыву Смаленска, вярнуць Віцебск. А там, магчыма, бачылася баярам перспектыва авалодання Смаленскам і аб'яднання пад сваёй рукой усіх крыўскіх земляў.

Для барацьбы са Смаленскам у Полацку шукалі саюзнікаў. Спачатку надзея была на Ноўгарад. У 1191 годзе наўгародскі князь Яраслаў Уладзіміравіч у Вялікіх Луках сустрэўся з полацкімі пасламі, якіх, верагодна, узначальваў Уладзімір. У асвятленні гэтага эпізоду нельга не пагадзіцца з думкай М.Ермаловіча, які лічыў, што Ноўгарад у адплату за саюз з Полацкам патрабаваў ад яго паходу на Чудзь і на Літву[9]. Гэта было нявыгадна Полацку, і палачане адмовіліся ад саюзу з Ноўгарадам. Полацк дамаўляецца з Чарнігавам, які таксама быў зацікаўлены ў аслабленні Смаленска. У 1195 годзе чарнігаўскі князь Алег пасылае на Смаленскае княства войска на чале са сваім сынам Давыдам. Дзесьці каля Віцебска чарнігаўцы сустрэліся з палачанамі, якіх, без сумненняў, прывёў Уладзімір, бо ўдзел князя ў баявых паходах — адзін з яго абавязкаў.

Сюды, пад Віцебск, паспяшалася і смаленскае войска пад зверхнасцю Мсціслава Раманавіча, а таксама разанская дружына. Мсціслаў Раманавіч, убачыўшы перад сабой чарнігаўцаў, адразу рушыў у бой, нават «не изрядивши полков своих». Баявы дух і мужнасць смаленскіх вояў былі добра вядомыя на Русі (летапіс паведамляе пра іх «дерзи боевы»). Смаленцы змялі чарнігаўскія палкі, патапталі сцягі Алегавы і забілі яго сына Давыда.

Вось тут і паказалі сябе «грозные» палачане. Паводле тацішчаўскіх звестак, палачане сталі перад лесам, і смаленцы, выступіўшы супраць іх, палічылі, што перад імі толькі частка полацкага войска, а другая схавалася ў лесе[10]. Тысяцкі* Міхалка даў смаленцам загад адыходзіць. Тым не менеў палачане не пагналіся на злом галавы за ворагам, а патаемна абышлі яго і

---

*Тысяцкі — водца гарадскога апалчэння.

ўдарылі нечакана ў спіну. У шэрагах смаленскага войска пачалася сумятня. Да самай цемры палачане распраўляліся са смаленцамі. Мсціслаў Раманавіч у гэты час пасля пагоні за чарнігаўцамі вяртаўся з перадавой дружынай, але ў цемры натрапіў на палачанаў. Друцкі князь Барыс захапіў яго ў палон. Астатнія смаленскія князі ў паніцы кінуліся наўцёкі. Уладзімір авалодаў Віцебскам і пасадзіў там князя Васільку.

Так ярка была здабыта перамога над Смаленскам, і цяпер у Полацку выношвалі задуму аслабіць Ноўгарад. Уладзімір, як гэта часта ён рабіў раней, набірае ў Літве войска, якое разам з палачанамі нападае на бліжэйшы ад іх княства наўгародскі горад Вялікія Лукі і спальвае яго. Гэты паход выклікаў шаленства ў Ноўгарадзе. Зімой 1198/99 года вялікае войска наўгародцаў, пскавічоў, ладжанаў, наваторжцаў рушыла на Полацк. Уладзімір, каб не дапусціць спусташэння сваіх земляў, пусціўся ў дыпламатыю, як у 1186 годзе, калі такім чынам удалося вырашыць канфлікт са Смаленскам і Ноўгарадам. Полацкія паслы каля возера Каспля сустрэлі варожае войска і дарамі і грашамі задобрылі наўгародскага князя, які ўсё ж палохаўся і добра ведаў, што сустрэча з палачанамі не абавязкова скончыцца перамогай. Так паступова Полацк вызваляўся ад уплыву двух моцных суседзяў і сам пераходзіў да агрэсіўнай палітыкі ў дачыненні да іх.

Моц княства выявілася і ў 1201 годзе, калі частка літоўскіх князёў выправілася ў рабаўніцкі паход на падуладных Полацку земігалаў. Тут жа Уладзімір увёў свае войскі ў Літву, вымусіўшы літоўцаў вярнуцца ў свае межы.

Толькі пасля гэтых падзей — у 1203 годзе — Уладзімір пачаў адкрытую вайну з крыжакамі.

ПАЧАТАК ВАЙНЫ З ОРДЭНАМ

Існавала ў сярэднявеччы традыцыя: перад сечай лепшыя віцязі варожых рацей скрыжоўвалі зброю паміж сабой. Пераможца гэтага паядынку нібыта рабіў зачын на перамогу, усяляў у сэрцах сваіх таварышаў адвагу і мужнасць. Вельмі падобны на гэтых віцязяў палачане — яны першымі з усходніх славянаў прынялі бой з небяспечным ворагам. Грунвальд пачынаўся тут, у Лівоніі, дзе беларускія дружыны ўпершыню ўступілі ў бой з крыжакамі — зачын на грунвальдскую перамогу рабіўся за два стагоддзі да яе.

Паход 1203 года болей паходзіў на набег, чым на прадуманую і добра падрыхтаваную вайсковую аперацыю. Яшчэ ў барацьбе з лівамі, што прызналі ўладу Ордэна, Уладзіміру спры-

яў поспех (ягоная дружына абклала замак Ікескола і вымусіла ліваў плаціць даніну), але вось з крыжакамі... Тых жахам не возьмеш, у тых навейшая ў Еўропе зброя: далёкасяжныя самастрэлы і моцныя каменямёты. Пад Гольмам рыцары з самастрэлаў і каменямётаў паранілі ў палачанаў шмат коней — і Уладзімір не разыкнуў пад абстрэлам перапраўляцца цераз Дзвіну. Палачане адступілі ад Гольма. Відаць, Уладзімір усё жтакі не даацаніў крыжацкай пагрозы і ўзяў з сабой у паход невялікую дружыну.

Адразу пасля адступлення палачанаў герцыкскі князь Усевалад з літвінамі, або летонамі, як іх называе «Хроніка Лівоніі», таксама зрабіў напад на Рыгу і парабаваў рыжскія ваколіцы.

Нягледзячы на адносную няўдачу першага сутыкнення палачанаў з крыжакамі, паход 1203 года стаў сур'ёзнай перасцярогай Альберту. Яму неабходна было шукаць шляхі стрымання Полацка, не даць разгарэцца вайне з ім, трэба было выйграць час, каб паспець умацаваць свае пазіцыі ў Лівоніі, папоўніць Ордэн новымі пілігрымамі. Альберт працягвае лічыць Уладзіміра ўладаром Лівоніі, прызнае ягоную ўладу і выплачвае яму даніну за ліваў, але адначасова мячом заганяе ліваў у хрысціянства, захоплівае і раздае рыцарам у леннае карыстанне лівонскія землі. Так доўга не магло працягвацца. Да Уладзіміра ў 1206 годзе прыбыло ліўскае пасольства. Паслы скардзіліся на немцаў, што тыя не трымаюць мір, нападаюць на ліваў, прымушаюць іх прымаць новую веру. І Уладзімір зрабіў выбар: ён разаслаў па ўсёй Полацкай зямлі вестуноў збіраць дружыны для паходу на Лівонію. Князь вырашыў на караблях і плытах з бярвенняў спусціцца да Рыгі і захапіць яе.

Нейкім чынам пра пасольства ліваў даведаўся Альберт, і ён, каб задобрыць полацкага князя і сарваць паход, пасылае да Уладзіміра сваё пасольства, а на чале яго ставіць хітрага манаха Тэадорыха — таго самага, што яшчэ пры Мейнрадзе ездзіў да папы рымскага. Па дарозе ў Полацк на пасольства напалі летоны і адабралі дары для полацкага князя. Верагодна, да гэтага прыклаў руку герцыкскі князь Усевалад — ён быў у сваяцтве з летонскім князем Даўгерутам і часта ўзначальваў летонаў у паходах. Усеваладу, валоданні якога знаходзіліся ў Лівоніі, нічога не выгарала ад міра Полацка з Рыгай. Ён разумеў, што рана ці позна крыжакі нападуць і на ягонае княства.

Паслы прыбылі ў Полацк. Прымаючы іх, Уладзімір вырашыў выкрыць хлусню ордэнцаў, што нібыта Ордэн не парушаў мір і не нападаў на ліваў. Для гэтага ён паклікаў і лівонскіх паслоў. Тыя пацвердзілі свае словы: крыжакі не выконваюць умоў міру. Князь загадаў немцам выйсці на двор і чакаць ягонага рашэння. Пакуль князь раіўся са сваімі баярамі, Тэадо-

рыху ўдалося грашыма падкупіць аднаго з княжацкіх слуг і выведаць у яго аб намерах Уладзіміра выступіць паходам на Лівонію. Генрых Латвійскі, які апісвае гэтыя падзеі, распавядае, што Тэадорых, знайшоўшы ў Полацку жабрака з Гольма, наняў таго і паслаў у Рыгу да Альберта з папярэджаннем аб небяспецы. Але ўзнікае пытанне: як мог Тэадорых так хутка знайсці ў вялікім горадзе гэтага «жабрака з Гольма»? Ці не быў гэта ордэнскі віж?*

Даведаўшыся, што Уладзімір рыхтуецца да паходу на Рыгу, Альберт затрымаў у Лівоніі пілігрымаў, што збіраліся вярнуцца ў Германію. У сваю чаргу і Уладзімір даведаўся пра ўчынак Тэадорыха і, зразумеўшы, што яго намер выкрылі, задумаў хітрасць. Ён адпусціў Тэадорыха дадому і адправіў разам з ім сваіх паслоў да Альберта, нібыта дзеля таго, каб яны, выслухаўшы абодва бакі — крыжакоў і ліваў, — вырашылі, хто з іх кажа праўду. Сапраўднай жа мэтай іх было падняць супраць Ордэна ліваў і лэтаў. Прыбыўшы ў Лівонію, полацкія паслы спыніліся ў кукейноскага князя Вячкі. Разам з Тэадорыхам у Рыгу паслалі дзяка Стафана, каб той запрасіў Альберта на сустрэчу з пасольствам 30 мая 1206 года каля ракі Вогі (зараз Огер). Як толькі Тэадорых са Стафанам пакінулі Кукейнос, палачане раз'ехаліся па селішчах ліваў і лэтаў і пачалі заклікаць іх падняцца на крыжакоў. Тут і праявілася раз'яднанасць і варожасць паміж плямёнамі, чым не раз карысталіся крыжакі. Калі лівы падняліся на барацьбу з ворагам, дык лэты не падтрымалі іх.

На запрашэнне Стафана Альберт пасля нарады са сваімі набліжанымі адказаў: «Ва ўсіх краінах, як вядома, існуе агульны звычай, каб паслы, адпраўленыя сваімі валадарамі, самі шукалі таго, да каго пасланыя, і з'яўляліся да яго, але ніколі гаспадар, якім бы сціплым і ласкавым ён ні быў, не выходзіць са сваіх умацаванняў насустрач паслам. Таму і паслам, і іх ганцам належыць шукаць нас у нашым горадзе, дзе мы са сваімі маглі б прыняць і ўтрымліваць іх з большай пашанай. Такім чынам, хай завітаюць, нічога не баючыся, чакаючы ганаровага прыёму»[11]. Альберт адмовіўся пакідаць Рыгу. Можа, на яго выезд з Рыгі і спадзяваўся Уладзімір, каб з дапамогай ліваў захапіць рыжскага біскупа.

У прызначаны дзень лівы сабраліся на рацэ Возе. З Гольма на караблі прыбылі іх старэйшыны, што жылі ў гэтым замку. Па дарозе яны спрабавалі хітрасцю выманіць з Ікескола меча-

---

*Падзеі 1216 года, калі нечакана перад самым паходам памёр Уладзімір, празрыста сведчаць, што ён быў атручаны і гэта справа крыжацкіх шпегаў. Вельмі верагодна, што Альберт меў у Полацку сваю агентуру.



К.Веерман. Рэшткі Кукейноскага замка. *XIX ст.*

носцаў, запрашаючы тых сесці да іх на карабель, але немцы не згадзіліся. Тады лівы, аб'яднаўшыся з летонамі з Тарэйды і з Вейкалы, напалі на Гольм і захапілі яго. Адсюль паўстанцы накіраваліся на Рыгу. Калі б былі ў іх даспехі, навейшая зброя, хто ведае, як бы закончыліся падзеі ў Лівоніі. Закутыя ў браню крыжакі, лёгка разбіўшы ліваў, вярнулі сабе Гольм. Апошняй надзеяй для ліваў быў полацкі князь, і яны звярнуліся да яго па дапамогу.

Уладзімір сабраў «войска з усяго свайго каралеўства, а таксама ад суседніх каралёў, сваіх сяброў»[12] — так Генрых Латвійскі засведчыў адзінства Полацкай зямлі. Палачане на караблях спусціліся ўніз па Дзвіне. Пры высадцы ля Ікескола многіх у полацкім войску крыжакі паранілі з каменямётаў. Уладзімір не стаў штурмаваць замак, а нечакана падышоў да Гольма і акружыў яго з усіх бакоў. Некалькі дзён паміж абаронцамі і палачанамі доўжыўся бой. Крыжакі адбіваліся з дапамогай каменямётаў, палачане, «вопытныя ў стральбе з лукаў»[13], закідвалі замак стрэламі. Спрабавалі палачане падпаліць умацаванні, расклалі вялікае вогнішча пад сценамі, толькі ўсё дарэмна — крыжакі тушылі агонь. Не прынесла поспеху і баліста, якую зрабілі палачане па ўзору тэўтонскіх: не ведаючы майстэрства кідаць з такога прыстасавання камяні, яны ранілі

многіх сваіх. Не дапамаглі Уладзіміру і лівы з Тарэйды, амаль бяззбройныя ў параўнанні з крыжакамі.

Між тым вярнуліся пасланыя пад Рыгу віжы і паведамілі, што ўсе дарогі і палі вакол горада поўныя жалезных трохзубых шыпоў, аб якія коні колюць ногі.

Уладзімір перадумаў пасылаць войскі пад Рыгу і працягваў аблогу Гольма. «Калі б працягнуліся дні вайны, дык наўрад ці рыжане і жыхары Гольма пры сваёй малалікасці змаглі б абараніцца», — прызнаецца Генрых Латвійскі[14]. Выратавала крыжакоў падмога, што прыбыла з Германіі, а таксама дацкі кароль Вальдэмар з войскам, якое ён збіраў тры гады і з якім высадзіўся на Эзелі. Суадносіны сіл палачанаў і крыжакоў адразу перамяніліся. Дзе тут было працягваць вайну — Уладзімір адступіў.

Адчуўшы сваю сілу, Ордэн ад тактыкі ўступак Полацку, мірных пагадненняў з ім, прызнання яго правоў на Лівонію пераходзіць у наступ. Да 1207 года ўся Лівонія апынулася ў руках крыжакоў. Яны падступілі да межаў Кукейноскага княства.

Яшчэ ў 1205 годзе Вячка сустракаўся ў Рызе з Альбертам і заключыў з ім мір. У 1207 годзе ён зноў адпраўляецца ў Рыгу. Пужаючы кукейноскага князя летонскай пагрозай, біскуп вымушае яго аддаць палавіну княства Ордэну, які за гэта быццам будзе абараняць Кукейнос ад летонаў. Аднак не з прычыны летонскай пагрозы саступіў Вячка Альберту (летоны ні разу не напалі на Кукейнос і, больш за тое, былі саюзнікамі полацкіх князёў). У Вячкі не хапала сілы супрацьстаяць агрэсіі Ордэна. І каб зусім не пазбавіцца княства, ён пайшоў на кампраміс, згадзіўся з Альбертам. Але гэта не значыць, што змірыўся кукейноскі князь з залежнасцю ад Ордэна. Некалькі разоў Вячка нападаў на крыжакоў. У адказ і тыя пад павадырствам нейкага рыцара Данілы аднойчы ноччу напалі на Кукейноскі замак. Узышоўшы на вал, крыжакі захапілі галоўнае ўмацаванне. У ліку палонных апынуўся і Вячка. Біскуп Альберт вярнуў яму горад, але з умоваю размясціць там крыжацкі гарнізон. Хітры біскуп ведаў, што рабіў. Далучыць адкрыта Кукейнос да сваіх уладанняў — значыць, пачаць вайну з Уладзімірам. У ход пускаецца прыём з арсеналу візантыйскіх базылеўсаў. Вячку з пашанай прымаюць у Рызе, дораць яму коней, дарагую вопратку. У самых пачцівых інтанацыях біскуп просіць прабачэння ў Вячкі за «непаразуменне»: крыжакі без ягонай, біскупавай, згоды захапілі горад. Таму ў знак міру вяртае яму Кукейнос. Але вось крыжацкі гарнізон... Вячка нібы і гаспадар у сваім горадзе, а разам з тым і нібы вязень. Кожны ягоны крок пад увагай крыжакоў. І, прадчуваючы ў любое імгненне

здрадніцкі ўдар у спіну, Вячка распраўляецца з крыжакамі, спальвае замак і ідзе ў Наўгародскую Русь непрымірымым ворагам «хрыстовых рыцараў».

НАСТУП ОРДЭНА

...Языкі полымя дрыготка ўздымаліся ў неба. Агонь знішчаў хаты, цэрквы, замкавыя сцены і вежы — усё тое, што гадамі будавалася руплівымі рукамі гараджан. Чорны час надышоў для Герцыке. Паспешліва пакідалі ахоплены пажарам полацкі град крыжакі, «бласлаўляючы Бога за тое, што так нечакана ён даў ім перамогу», вялі закутых у кайданы нявольнікаў, гналі жывёлу, везлі на вазах здабычу. Сярод палонных ішла і герцыкская княгіня. А сам валадар Герцыке — кароль Усевалад, як называлі яго крыжакі, ледзь выратаваўся ад палону. З некалькімі служкамі пераправіўся ён на лодцы цераз Дзвіну і з другога берага глядзеў на трыумф пераможцаў. Не, ён не працягваў да Бога рукі і не ўсклікаў са слязьмі на вачах: «О Герцыке, мілы горад! О спадчына бацькоў маіх! О нечаканая гібель майго народа. Гора мне! Навошта я нарадзіўся, каб бачыць пажар майго горада і знішчэнне майго народа»[15]. Гэта ўжо крыжацкі летапісец Генрых Латвійскі ў сваёй «Хроніцы Лівоніі» ўклаў у княжацкія вусны запазычаныя ў плачу Макавеяў словы. Усевалад быў сапраўдны воін, і небяспечнае баявое жыццё навучыла яго мужна трываць няўдачы і цяжкасці. Ён моўчкі перажываў гібель Герцыке і мсціва, да болю сціскаў у руцэ рукаяць мяча. Была восень 1209 года.

А здарылася ўсё гэта вось якім чынам. Біскуп Альберт, які вельмі ўважліва сачыў за падзеямі на Полаччыне, хутка здагадаўся аб ролі Усевалада ў полацкай палітыцы. «герцыскі кароль заўжды быў ворагам рыжан, змагаючыся з імі і не жадаючы заключыць мір», — адзначае ён[16].

Восенню 1209 года Альберт сабраў раду, абмеркаваў на ёй, «якім чынам пазбавіць маладую царкву ад падкопаў летонаў і русаў, нагадаў усё зло, прычыненае каралём Герцыке разам з летонамі гораду Рызе»[17]. Было вырашана захапіць Герцыке. Біскуп распачаў збіраць вялікае войска з усёй Лівоніі. Да яго далучыліся нямецкія каланісты з Рыгі, пілігрымы, рыцары, атрады хрышчоных ліваў і лэтаў. Супрацьстаяць гэтым полчышчам Усевалад не меў сілы. Крыжакі разбілі ягоную дружыну і ўварваліся ў Герцыке.

Як і ў выпадку з Кукейносам, біскуп Альберт зрабіў выгляд, што напад адбыўся без ягонага ведама, і выказаў жаданне заключыць з Усеваладам мір, вярнуць палонных і нарабаванае

дабро. Зноў імкненне не развязваць вайны з полацкім князем, які, паводле тагачасных законаў, павінен быў бараніць свайго васала. Усевалада гэты «грасмайстарскі ход» не ўвёў у зман, ён разумеў, што біскуп навяжа яму, як і Вячку, сваю волю, але выйсця не было. Толькі згадзіўшыся з умовамі Ордэна, князь мог вызваліць з няволі сваю сям'ю. Герцыкскі князь прыехаў у Рыгу. Непрыемнай была для яго сустрэча з Альбертам. Давялося і прыніжацца перад святаром, прасіць «забыць былое зло». «Калі ты згодзішся ў далейшым пазбягаць зносін з паганцамі, не будзеш разам з летонамі ваяваць зямлю тваіх рускіх хрысціян, калі ты згодзішся аддаць сваё каралеўства ў вечны дар царкве святой Марыі...»[18] — вось пры якіх умовах Усевалад мог атрымаць назад палонных і заключыць мір з крыжакамі. Ён згаджаецца, абяцае «заўсёды быць верным царкве святой Марыі, пазбягаць зносін з паганцамі і быць саюзнікам рыжан».

«Тым не меней у далейшым ён працягваў удзельнічаць у задумах летонаў», — адзначае Генрых Латвійскі[19]. Так, Усевалад і не збіраўся служыць Ордэну, хаця вонкава і выконваў мірныя ўмовы. Ужо праз год летоны нападаюць на Рыгу. У 1211 годзе яны двойчы ваююць ордэнскія землі. Канечне, натхняў гэтыя паходы Усевалад, які прагнуў адпомсціць крыжакам за разрабаванне Герцыке.

Першым з крыўскіх князёў ён разумее, што змагацца з крыжакамі паасобку нельга: толькі сумеснымі сіламі ўсходніх славян і балтаў можна разбіць Ордэн. Не без ведамі Усевалада ягоны цесць Даўгерут з багатымі дарамі едзе ў Ноўгарад і заключае там саюз. На зваротным шляху ён быў схоплены крыжакамі і кінуты ў вязніцу, дзе пакончыў з сабою, працяўшы сябе мячом.

Але якімі б значнымі ні былі поспехі мечаносцаў у Лівоніі, усё роўна Альберт не мог адчуваць сябе спакойна. У любы момант Полацк мог зноў пачаць з Ордэнам вайну. Таму біскуп імкнецца ўсяляк адцягнуць яе. Да Уладзіміра ў 1210 годзе прыбываюць яго паслы пад зверхнасцю рыцара Арнольда. Ведаючы зацікаўленасць Полацка ў гандлі з Рыгай, Арнольд паспрабаваў скарыстаць гэта. Уладзіміру прапануецца заключыць з Рыгай мір і адчыніць рыжскім купцам доступ у свае ўладанні. За ветлівымі словамі і зычлівасцямі кожны бок хаваў свае карысныя інтарэсы. Каб абмеркаваць умовы пагаднення, Уладзімір адправіў да Альберта багатага чалавека Лудольфа са Смаленска. Гэта нейкім чынам можа сведчыць, што Уладзімір выступаў у інтарэсах як Полацка, так і Смаленска. Галоўнае, што хвалявала князя, — даніна біскупа за ліваў. Альберт ахвотна згаджаецца выплачваць яе. Гэта тыя путы, якія будуць

стрымліваць Уладзіміра. Калі хто болей і выйграе ад міру, дык Ордэн, які цяпер без хвалявання за свае падзвінскія ўладанні мог ваяваць Эстонію. І толькі тады, калі крыжакі скарылі эстаў, Уладзімір зразумеў сваю памылку: сваёй згодай з Альбертам развязаў Ордэну рукі, які з заваёвай Эстоніі яшчэ болей умацаваўся ў Прыбалтыцы.

Занепакоены князь настаяў на сустрэчы з Альбертам у Герцыке, дзе спадзяваўся канчаткова вырашыць лёс ліваў, абмеркаваць пытанне бяспекі плавання купцоў па Дзвіне і аднаўленне міру. Альберт адпраўляецца разам са сваімі людзьмі і былым пскоўскім князем Уладзімірам, які ўцёк ў Лівонію.

То прамымі пагрозамі, то ўгаворамі полацкі князь вымагае біскупа адмовіцца ад хрышчэння ліваў, сцвярджаючы, што толькі ў яго ўладзе або хрысціць рабоў яго ліваў, або пакінуць нехрышчонымі, бо каралі русаў, пакараючы зброяй які-небудзь народ, звычайна клапоцяцца не аб хрышчэнні, а пра выплату даніны. Альберт і не думаў паддавацца на патрабаванні Уладзіміра — сіла была на ягоным баку, цяпер ён фактычны ўладар Лівоніі. Насміханнем і з Уладзіміра, і з хрысціянства гучалі ў вуснах Альберта словы пра выкананне ім святой справы пропаведзі, даручанай яму вярхоўным святаром. Як выконваў Альберт гэтую «святую справу», Уладзімір ведаў. Біскуп, нібыта не адмаўляўся ад выплаты даніны, кіруючыся евангельскім: «Аддайце кесарава кесару, а Богава Богу», ды вось лівы не жадаюць служыць двум гаспадарам і ўмольваюць яго вызваліць іх ад ярма русаў. Так Альберт адмовіўся выплачваць за ліваў даніну. І Уладзімір страчвае вытрымку, пагражае спаліць усе замкі Лівоніі, а разам з тым і Рыгу. Ён выводзіць сваё войска з замка і рушыць на рыцараў, якіх прывёў з сабою біскуп. Калі абодва войскі сышліся, былы пскоўскі князь Уладзімір і настаяцель царквы св. Марыі Іаан сталі пераконваць полацкага князя не трывожыць вайной маладую царкву, каб і яго не трывожылі тэўтоны. Прымусіць ордэнцаў зброяй слухацца яго Уладзімір не наважыўся. Ён загадаў свайму войску адступіць, а сам зноў адправіўся на сустрэчу з біскупам. Перамовы нічога не далі. Альберт настойваў на сваім, і князь саступіў — перадаў Лівонію ва ўладу Ордэну.

Змірыцца са стратай Лівоніі Уладзімір не мог. Знешне пачцівы, называючы біскупа айцом, князь застаўся ў душы яго непрымірымым ворагам. Ён пачаў дзейнічаць супраць Ордэна праз Усевалада. Нібы і мір трымаў з ім, але ў той час з дапамогай Усевалада ўваходзіў у зносіны з летонамі і падтрымліваў іх у вайне з крыжакамі. «Бо кароль Усевалад з Герцыке заўсёды быў ворагам хрысціянскага роду, а болей за ўсё лацінян. Ён быў жанаты з дачкою аднаго з найболей магутнейшых лето-

наў (Даўгерута. — *В.Ч.*). І будучы як зяць ягоны для іх амаль сваім, звязаны з імі звыш таго і сяброўствам, часта ўзначальваў іх войскі, аблягчаў ім пераправу цераз Дзвіну, забяспечваў іх прадуктамі, калі ішлі яны на Русію, Лівонію ці Эстонію»[20]. І схапіць за руку Уладзіміра немагчыма: ён нібы не мае ніякага дачынення да летонскіх паходаў.

Тую самую палітыку мы назіраем у адносінах Полацкай зямлі да суседніх рускіх княстваў. Альберт указвае, што Усевалад ваяваў землі рускіх хрысціян. Якія ж землі меў на ўвазе біскуп? Трэба думаць, не полацкія. Не мог Усевалад у такі складаны для ягонага княства час, калі над ім навісла крыжацкая навала, падняць меч супраць свайго сюзерэна і саюзніка ў барацьбе з Ордэнам. Таму можна сцвярджаць, што з Уладзіміравага ведама Усевалад нападаў на смаленскія, пскоўскія і наўгародскія землі. І тут таксама Уладзіміра было цяжка схапіць за руку, абвінаваціць у парушэнні міру з суседнімі княствамі, а значыць, пачаць з ім вайну.

Як правіла, летонскія набегі адбываліся з Полацкай зямлі, што пасля дало падставу гісторыкам сцвярджаць, нібыта Полацкая дзяржава ў канцы XII стагоддзя настолькі аслабела, што падпала пад уладу Літвы. Паведамленне Генрыха Латвійскага ў многім абвяргае гэты міф. Характэрна, што рускія князі так і не здзейснілі ніводнага паходу на Літву праз Полаччыну. Відаць, полацкія князі, якія не былі зацікаўлены ў паражэнні Літвы, проста не прапускалі іх праз свае землі.

А Ордэн тым часам зноў перайшоў у наступ. Кукейноскія рыцары абвінавацілі князя Усевалада ў тым, што ён ужо шмат гадоў не з'яўляецца да Альберта і заўсёды дапамагае летонам і парадай, і справай. З біскупава бласлаўлення крыжакі з лэтамі ў 1214 годзе выправіліся на Усевалада. Паблізу Герцыке яны злавілі аднаго з русаў, звязалі яго і ноччу павялі з сабою да замка. Загадалі яму перабрацца цераз роў і загаварыць з вартавым, а самі крочылі за ім. Вартавы падумаў, што гэта ішлі свае гараджане, якія днём пакінулі горад, і бесперашкодна прапусціў іх. Крыжакі падняліся на вал, акружылі замак. Раніцай яны захапілі Герцыке і разрабавалі яго. Жыхароў, якія не паспелі ўцячы, узялі ў палон.

Усевалад у гэты час адсутнічаў, вярнуўся ён ужо на папялішча роднага дома. Толькі не аднаўляць спалены горад давялося яму, а зноў абараняцца ад ворага. Ордэн паўтарае паход на Герцыке. Усевалад пасылае вестуноў да летонаў. Але тыя спазніліся. Ёсць звесткі, што ў баі з крыжакамі Усевалад загінуў[21]. Хоць Генрых Латвійскі і згадвае ягонае імя ў 1225 годзе сярод тых, хто прыехаў у Рыгу на сустрэчу з папскім легатам, але хутчэй за ўсё крыжацкаму храністу было непрыемна за-

носіць на старонкі летапісу факт здрадніцкага забойства рыцарамі ордэнскага падданага, бо чым можна вытлумачыць, што амаль за дзесяць гадоў ён ані разу не памянуў імя герцыкскага князя. Змірэннем Усевалада? Нешта не падобна, каб ён, зацяты вораг крыжакоў, мог змірыцца з іхняй уладай над сабою.

Так Полацк страціў свой апошні фарпост у Ніжнім Падзвінні. І ўсё ж Полацк не склаў зброі. Яго пазіцыі ў Прыбалтыцы паранейшаму былі моцныя. У руках палачан заставалася Латыгольская зямля. Па-ранейшаму народы, што змагаліся супраць крыжакоў, бачылі ў Полацку свайго саюзніка. У 1216 годзе эсты звярнуліся да князя Уладзіміра з просьбай, каб ён з войскам прыйшоў ваяваць Рыгу. Самі эсты абяцалі адначасова пачаць вайну супраць ліваў і лэтаў, а таксама заперці гавань у Дынамюндэ. Гэта быў той момант, які так цярпліва чакаў Уладзімір. У выніку ўзгодненых дзеянняў эстаў і палачанаў Ордэн аказаўся б у акружэнні, а гэта абяцала перамогу над ім. Уладзімір пачаў дзейсна збіраць войска з Полаччыны і Літвы. Калі ўсё было гатова для паходу, Уладзімір, які збіраўся ўзначаліць войска, узышоў на карабель. Раптам ён беспрытомна паваліўся і адразу памёр. Застаўшыся без правадыра, войска разышлося па дамах. Верагодна, і гэта падобна на праўду, Уладзіміра атруцілі ордэнцы.

А праз восем гадоў — у 1224 годзе — пры абароне наўгародскага горада Юр'ева* загінуў князь Вячка. Так і не ўклаў ён меч у похвы — ваяваў з крыжакамі. Як прызнаецца ордэнскі храніст: «...стаў корнем усялякага зла ў Лівоніі»[22]. Вячка ўзначаліў паўстанне эстаў супраць Ордэна і, калі крыжакі акружылі яго ў Юр'еве і прапанавалі «вольны шлях», адмовіўся ад гэтай прапановы.

Многа дзён доўжылася аблога. Крыжакі абстрэльвалі замак з балістрыяў і катапультаў. Разам са стрэламі на замак ляцелі гаршкі з гаручай смалой — «грэчаскім агнём». Дзеля запалохання абаронцаў крыжакі палілі перад валамі вялікія вогнішчы. І ўдзень, і ўначы ішоў падкоп пад сцены. У адказ з сценаў стралялі з лукаў і балістрыяў. Расказ Генрыха Латвійскага паказвае, наколькі жорстка біліся крыжакі за Юр'еў. Угневаныя крыжакі на вайсковай нарадзе вырашылі нікога з абаронцаў замка не шкадаваць і «адпомсціць зладзеям на жах іншым»[23]. І вось быў вырыты падкоп, і крыжакі пайшлі на штурм. Абаронцы мужна сустрэлі ворага. Праз адтуліны ў вале яны пускалі на крыжакоў вогненыя колы. Але крыжакі патушылі агонь з запаленай штурмавой вежы і самі запалілі

*Цяпер горад Тарту ў Эстоніі.

замкавую вежу, скарыстаўшы падкоп. Некаторыя штурмуючыя праз адтуліны ў валах праніклі ў замак. За імі ў бой кінуліся ўсе сілы крыжакоў. Уварваўшыся ў замак, яны «адразу пачалі забіваць народ, і мужчын, і нават жанчын, не шкадавалі нікога, так што лічба забітых дасягнула да тысячы»[24].

Вячка на чале з двума сотнямі воінаў заняў абарону ва ўнутраных умацаваннях. Біліся да апошняга. І Вячка гераічна загінуў у баі.

Пасля будуць гады жорсткай і ўпартай барацьбы з крыжакамі. Будуць і паражэнні, будуць і перамогі, і надыдзе дзень Грунвальдскай бітвы, калі беларускія, жамойцкія, украінскія, чэшскія, польскія палкі разгромяць Тэўтонскі ордэн. Але тады, калі на пажарышчах разбураных гарадоў крыжакі святкавалі сваю чарговую заваёву, ніхто з іх не ведаў аб сумным і бясслаўным канчатку той справы, дзеля якой яны ўзялі ў рукі зброю, не ведалі, што смерць і Усевалада, і Уладзіміра, і Вячкі — гэта зачын вялікай перамогі над Ордэнам.

ПАДМАНЛІВАЯ ВЕЛІЧ





МІНДОЎГ
(?—1263)
Гравюра з «Хронікі Еўрапейскай Сарматыі»
А. Гваньіні. *1578 г.*

МІНДОЎГ

Ён загінуў тады, калі, здавалася, дасягнуў усяго, аб чым многія гады марыў: улады «во всей земле Литовской», славы, багацця. Толькі ці прынесла ўсё гэта яму шчасце, адчуванне недарэмнасці пражытых гадоў, супакой? Мяркуючы па тым, што ўсё жыццё ён ваяваў супраць ворагаў, падманваў, хітрыў, здраджваў учарашнім сябрам, саюзнікам, паплечнікам, сам сабе, мяняў веру, ён адчуваў, што ўся ягоная веліч, усе дасягненні — мройныя, а таму зноў падманваў, хітрыў, здраджваў сябрам і саюзнікам, мяняў веру, ваяваў... І хіба не адпомсціла яму жыццё за здраду і аблудлівасць, калі ўчарашнія паплечнікі забілі яго разам з сынамі? Пазней яму беспадстаўна прыпішуць тое, чаго ён не здзейсніў, яго назавуць вялікім, прысвецяць не адзін твор, ідэалізуюць яго вобраз. Але якім жа на самай справе быў той, каго клікалі Міндоўгам?

Даводзіцца толькі шкадаваць, што час данёс да нас не так ужо шмат звестак як пра Міндоўга, так і пра яго эпоху. Фрагментарнасць звестак, іх «туманнасць», адсутнасць багатага фактычнага матэрыялу спарадзілі нямала спекуляцый адносна асобы Міндоўга. Да яго спраў далучалі «заваёву» Беларусі, прычым ніхто з гісторыкаў, якія сцвярджалі гэта, не прывёў ніводнага дакумента на доказ. Нам, беларусам, аднаго з дзеячаў нашай мінуўшчыны афіцыйная гісторыяграфія прадстаўляла як чужынца і заваёўніка.

Але ж зазірнём у беларускія паданні: што распавядаюць яны пра Міндоўга? Як жа самі простыя беларусы ўспрымалі князя? Дык вось беларусы ў паданнях не называюць Міндоўга ні заваёўнікам, ні тыранам, ні чужаком, а называюць наваградскім князем[1] — гэтым самым прызнаюць яго законным уладаром Наваградка. Памяць народная зберагла і тое, пра што так сціпла нагадваюць летапісы, — што Наваградак «быў у той час сталі-

цай Літоўскай»[2]. І яшчэ адна акалічнасць. Так званыя «вызваліцелі» — галіцка-валынскія князі са сваімі дружынамі — старажытнымі навагрудцамі, паводле паданняў, успрымаліся адназначна — вораг, а войска Міндоўга для іх — «наша» войска[3].

Першы напамін пра Міндоўга мы знаходзім у Іпацьеўскім летапісе, у запісе пад 1219 годам, сярод князёў Літвы і Жамойці, якія прыехалі да Данілы Галіцкага браць мір з Галіцка-Валынскім княствам. Другі раз згадвае летапіс пра Міндоўга пад 1237 годам. У той час Даніла Галіцкі ваяваў з Кандратам Мазавецкім, і «возведе на Конрада Литву Миндовга* Изяслава Новогородьского»[4]. Гэты запіс дае нам каштоўную інфармацыю, і, як вынікае з яго, «Літва Міндоўга» залежала ад Ізяслава Навагрудскага і знаходзілася недзе паблізу Навагрудка. Дзе? Адказ на гэта пытанне даў М.Ермаловіч.

«ЛИТВА МИНДОВГА»

Прааналізаваўшы дадзеныя летапісаў, дакументаў, тапанімікі, гісторык М.Ермаловіч высветліў, што летапісная Літва знаходзілася ў Верхнім Панямонні, а не на тэрыторыі сучаснай Летувы. Гэтая летапісная Літва «пакінула свае «аўтографы» ў выглядзе назваў вёсак Літва, якія мы знаходзім і зараз у Слонімскім, Ляхавіцкім, Уздзенскім, Стаўбцоўскім і Маладзечанскім раёнах. Яна ўрэзвалася клінам паміж Полацкай, Турава-Пінскай і Навагародскай землямі і побач з імі з'яўлялася гістарычнай вобласцю Беларусі»**[5]. І тут, у раёне к паўночнаму захаду ад Барысава і паўднёвага захаду ад Бярэзінскага запаведніка, у радыусе 80—100 кіламетраў знаходзіцца арэал

---

*Пэўна, пад выразам «Літва Міндоўга» трэба разумець не землю, а баявую дружыну літвы (літвінаў), якую ўзначаліў Міндоўг. На гэты «рубеж» указвае і Длугаш, які пісаў, што Бярэзіна аддзяляе Літву ад рускіх земляў.

**Можна дапусціць, што межы старажытнай Літвы былі куды шырэй, чым тыя, якія вызначыў М.Ермаловіч. На поўдні літоўская мяжа, пэўна, сягала да Ясельды і нават пераходзіла яе. «Хроніка Літоўская і Жамойцкая», распавядаючы пра паход Данілы і Васількі Раманавічаў на Літву, кажа: «...места и все их волости огнем и мечем аж за Ясолдаю и Нарвою реками выплендровали». Усходне-паўднёвая мяжа пралягала каля Слуцка і Менска, пра што ўказвае Магілёўская хроніка. У раёне Слуцк—Капыль і Шацк—Талька якраз і знаходзім значны арэал балцкіх назваў. Абагнуўшы Менск, літоўская мяжа на ўсходзе ішла, пэўна, да Барысава і пралягала па Бярэзіне. Не выпадкова супадаюць паданні «Хронікі Літоўскай і Жамойцкай», дзе гаворыцца, што князь Барыс заснаваў горад Барысаў: «...знак вечной границы умоцнити межи Литвою и князством Полотцким», і заява маскоўскіх паслоў, якія патрабавалі беларускія гарады: «...а рубеж был тем городом с Литовской землею по Березыню».



М.Ермаловіч. Карта летапіснай Літвы

балцкіх назваў. На поўначы мяжа, відаць, пралягала за Віліяй і праходзіла каля вёскі Крывічы. А на паўночны захад у кірунку Крэва ўжо пачыналася Нальшанская зямля. На захадзе па лініі Слонім—Наваградак — рака Нёман старажытная Літва мяжавала з яцвяжскімі землямі.

Тут, у старажытнай Літве, як лічыць М.Ермаловіч, знаходзілася і так званая «Літва Міндоўга», якая ляжала на левым беразе Нёмана паміж Пінскай і Наваградскай землямі. Сам Міндоўг жыў, пэўна, у гарадку Варута, дзе ён адбіваўся ад сваіх ворагаў. Розначытанне Хлебнікаўскага і Пагодзінскага

спісаў з Іпацьеўскім дазваляе удакладніць назву Міндоўгавай сталіцы. У Хлебнікаўскім і Пагодзінскім пішацца «въ Роута», што значыць Рута[6]. Некалькі населеных пунктаў з назвай Рута ёсць паблізу Наваградка, там працякае і рака з такой назвай. Тое, што «Літва Міндоўга» магла знаходзіцца побач з Наваградкам, указвае і «Хроніка» Стрыйкоўскага. Так, у аповядзе пра вайну Данілы Галіцкага з Міндоўгам сказана, што галіцка-валынскія атрады «ад Наваградка пусціліся да Здзітава, бурачы і пустошачы краіну Мендогаву і шмат замкаў літоўскіх пабраўшы». Гэты рух галіцка-валынскіх дружын апісвае таксама і Іпацьеўскі летапіс. Значыцца, на правым беразе Нёмана паміж Наваградкам і Здзітавам і знаходзілася «Краіна Мендогава»[7]. Красамоўна, што побач са Здзітавам у Пружанскім раёне ёсць сяло Таўтвелы, гэта можа ўказваць на пражыванне тут князя Таўцівіла, з якім змагаўся Міндоўг. А на ўсходзе, каля Клецка, два тапоніма «Балевічы» сведчаць пра тое, што ў тых мясцінах жылі князі Булевічы — з імі таксама змагаўся Міндоўг. І яшчэ адна цікавая акалічнасць — наяўнасць у мінулым у Пінску кургана і вуліцы Мендога[8]. Можна дапусціць, што Міндоўг адзін час жыў у гэтым горадзе, дзе служыў са сваёй дружынай пінскаму князю. Вельмі падобна, што быў ён наймітам і прадаваў свой меч таму, хто добра заплаціць. Не выключана і тое, што Міндоўг прызнаваў сябе васалам наваградскага князя. На гэта, апроч Іпацьеўскага летапісу, указвае і ў «Пачатках» Мацей Стрыйкоўскі: «Тая Літва, якая жыла над Нёманам у пушчах, здаўна прыслугоўвала Наваградскаму княству»[9].

Сучасная Летува ў тыя далёкія часы называлася па-іншаму. Паўночная прыбалтыйская яе частка аж да XX стагоддзя мела назву Жамойція (Нізкая зямля)*. У раёне сучаснага Вількаміра была зямля Дзяволтава. Паўднёвы захад і цэнтр сучаснай Летувы займала Аўкштайція (Высокая зямля). З утварэннем Вялікага княства Літоўскага назва «Літва» распаўсюдзілася і на гэтыя землі. Але перш за ўсё яна адносілася да сучасных беларускіх земляў, аб чым сведчаць летапісы. Так, калі ў 1345 годзе з Вялікага княства Літоўскага і Рускага выдзялілася Трокскае княства, «Хроніка Быхаўца» адзначыла: «І ў той час княжыў на Літве і ў Русі вялікі князь Альгерд», а пра вялікага князя Кейстута, уладанні якога былі ў Аўкштайціі і Жамойці, хроніка кажа, што ён уладарыў «у Троках і зямлі Жамойцкай»[10]. Як

---

*Пэўна, Жамойцкая зямля даходзіла на поўдні да ракі Святой (Свенты), бо ў Пскоўскіх летапісах Вількамір знаходзіўся «оу Жимоитскои земли, оу Святои реке». (ПЛ. Вып. 2. С. 131.) Тое самае адзначаў і польскі гісторык XV стагоддзя Ян Длугаш: «Святая падзяляе Жмудзь ад Літвы». (Długosz J. Dzieła wszustkie. T. 1. S. 20.)

бачым, раней не лічылі, што Трокі знаходзяцца на землях гістарычнай Літвы. І варта было князю Вітаўту вярнуць назад завяваную Ягайлам бацькаву сталіцу, як «Хроніка Літоўская і Жамойцкая» адзначыла, што ён вярнуў «впавши до Литвы Троки»[11].

З той прычыны, што кароткая назва Вялікага княства Літоўскага была Літва, дык яна пашырылася на старажытныя беларускія землі, што ўвайшлі ў яго склад. Ужо напрыканцы XV стагоддзя Літвой называлі старажытную Беларусь, а беларусы называлі сябе літвінамі*. Гэтак звалі іх і суседзі — рускія, украінцы, мазуры, палякі, жамойты. Белай Руссю яшчэ ў XII стагоддзі называецца Растова-Суздальская зямля, а пасля гэтае імя носяць Наўгародская і Пскоўская землі, а ў XV стагоддзі ўжо маскоўскія ўладары тытулуюць сябе князямі Белай Русі[12]. Аж да XX стагоддзя літвіны лічылі, што Белая Русь — гэта Расея. Беларусцамі ў Літве называлі праваслаўных, і гэты тэрмін не быў этнонімам нашых продкаў[13].

Ужо ў XII—XIII стагоддзях старажытная Літва ў значнай частцы была каланізавана крывічамі і дрыгавічамі, а балты, што жылі тут, асіміляваліся. Узнікалі на яе землях славянскія паселішчы: Ізяслаўль, Гарадок, Менск, Крывы-горад (Вільня) і інш. Невыпадкова, што біскуп Хрысціян, які пры Міндоўгу узначальваў Літоўскае біскупства, адзначаў: «Літва, або Літванія, — гэта славянская краіна»[14]. Сведчанне славянскай каланізацыі летапіснай Літвы, а таксама іншых балцкіх земляў і асіміляцыі балтаў мы бачым у славянскіх імёнах літвінаў: Жывінбуд, Вілікаіл, Хвал, Логвеній, Лоў, Алехна, Данута, Будзікід, Будзівід, Слаўка, Нямір, Нялюб, Лялюш, Борза, Лесь, Лесій, Серпуцій, Тройдзень, Рукля, Войшалк, Транята, Любім, Любка, Лютавер, Віцень, Воін, Няжыла, Кумец, Круглец, Гольша, Рэпенья, Сірвід, Полюш, Спуд, Гердзень, Фёдар, Волчка, Лісіца, Казлейка.

Імя Міндоўг, паводле меркавання філолага В.Юргевіча, таксама славянскае, атрыманае ад памяншальна-ласкальнага Менця (Дземянцей). Наўгародскае імя Мендуй атрымалася таксама з той жа формы[15]. Сустракаецца яно ў беларусаў у такіх формах: Міндзюк, Мінда, Мендыла, Мендык[16]. Верагодна, яно было нямецкім і азначала «Магутны дабрынёй»[17].

У некаторых летапісах бацькам Міндоўга называецца наваградскі князь Рынгольд[18], аднак, паводле Іпацьеўскага летапісу, князем у Наваградку ў гэты час быў нейкі Ізяслаў, а зна-

---

У дадзеных нарысах згодна са шматвяковай традыцыяй пакінуты назвы старажытнай Беларусі з яе спрадвечным імем — Літва, а старажытных беларусаў — літвіны.

чыць, Рынгольд — асоба міфічная. Не называе імя Міндоўгавага бацькі і «Рыфмаваная хроніка», аднак адзначае, што ён «быў вялікім каралём і ў яго час не меў сабе роўных у Літве»[19]. Як вынікае з гэтай узгадкі, Міндоўг пачынаў ажыццяўленне сваіх задум не з голага месца. Ад бацькі ён атрымаў і багацце, і землі, і ўладу, і моцную дружыну, што і надавала яму ўпэўненасці ў сваіх сілах.

Можна дапусціць, што аўтар хронікі назваў сапраўднае імя Міндоўгавага бацькі. Звернем увагу на імя Рынгольд — яно паходзіць, як і імя Рагвалод, ад нарвежскага Рёнгвальд. Як вядома, імя Рагвалод было дынастычным у полацкім княжацкім родзе. З'яўленне літоўскага князя з такім імем (а больш яно не сустракалася ў старажытных літоўцаў) можна растлумачыць яго паходжаннем з роду Рагвалодавічаў па жаночай лініі. Верагодна, ягоны бацька (паводле «Хронікі Быхаўца», Альгімонт) ажаніўся на княгіне з полацкага княжацкага роду. Магчыма, гэта была дачка менскага князя Валадара Глебавіча. Як сведчаць летапісы, ён быў у шчыльных сувязях з Літвой, і таму натуральна гэты саюз мог быць замацаваны шлюбам яго дачкі Валадараўны і Альгімонта.

Калі ж дапусціць, што нагаданы В.Таціщавым менскі князь Уладзімір Валадаравіч і ёсць той загадкавы «вялікі кароль Вальдэмар», які правіў у Полацку, дык ён прыходзіўся па матчынай лініі дзедам Міндоўгу і яго брату Даўспрунку. Са згасаннем роду Рагвалодавічаў іх спадкаемцамі станавіліся «Рынгольдавічы». Таму палачане і выбралі сваім князем сына Даўспрунка Таўцівіла, а пасля яго смерці прызналі ўладу сына Міндоўга Войшалка.

Гіпатэтычна прымем, што бацькам Міндоўга быў сын «Валадараўны» Рынгольд. У Рынгольда нарадзіліся сыны Даўспрунк і Міндоўг, а таксама невядомая на імя дачка. У старэйшага Даўспрунка было два сыны: Таўцівіл і Едзівід. Сынам «Рынгольдаўны» быў Транята. Міндоўг меў трох сыноў: Войшалка, Руклю, Рэпенью і дачку. Верагодна, Міндоўг быў двойчы жанаты. Ад першага шлюбу ў яго былі дарослыя дзеці Войшалк і дачка, ад другога з удавой князя Вісімота Булевіча, які загінуў у 1252 годзе, малалетнія Рукля і Рэпенья.

Даволі цікавай з'яўляецца думка гісторыкаў Г.Семенчука і А.Шаланды, што першай жонкай Міндоўга была дачка наваградскага князя Ізяслава[20]. Пасля смерці Ізяслава Міндоўг як муж апошняй дзедзічкі роду стаў яго спадкаемцам і такім чынам і наваградскім князем. Версія выглядала б праўдападобнай, каб у нас былі дакладныя звесткі пра княжанне Міндоўга ў Наваградку.

Кацярына II лічыла Міндоўга сваяком князя Яраслава Уладзіміравіча Новагаржскага, і быў ён жанаты на княжне цвяр-

ской, ад якой меў двух сыноў — Вышлега ды Домантa[21]. Звесткі не такія неверагодныя, як падаецца. Магчымасць шлюбу Міндоўга з цвярской княгіняй не выключана. Што датычыцца другога сына Даўмонта, то ён называецца ў рускіх летапісах і радасловах XVI стагоддзя. З усіх гэтых заблытаных звестак можна зрабіць выснову, што яшэ ў XVI стагоддзі памяталі пра нейкія роднасныя сувязі Міндоўга з рускімі княжацкімі дамамі. Узнікае пытанне: «Пад князем Новагаржскім ці не меўся невядомы нам наваградскі князь Яраслаў, а сваяцтва з ім тлумачыцца тым, што Міндоўг быў сынам яе дачкі?» Калі гэта так, то са згасаннем роду наваградскіх князёў Міндоўг станавіўся іх прамым нашчадкам. Як бачым, даводзіцца больш гадаць, чым сцвярджаць. І Міндоўг выступае больш легендарнай асобай, чым рэальным гістарычным дзеячам, што, безумоўна, толькі павышае інтарэс да гэтай незвычайнай постаці ў нашай гісторыі.

Што не выклікае сумневу, дык яго этнічная прыналежнасць — ён быў балтам. Іпацьеўскі летапіс называе язычаскіх багоў, якім пакланяўся Міндоўг, — Ненадееви, Телявели, Диверкз, Меидеик. Даследчык — балціст У.Топараў лічыць, што яны адносіліся «да яцвяжскай або, у крайняй ступені, да паўднёва-літоўскай вобласці»[22]. Значыць, Міндоўг быў яцвягам? Магчыма, частка ўладанняў Міндоўга знаходзілася на яцвяжскіх землях, а таму ён і пакланяўся яцвяжскім багам. Але на якіх яцвяжскіх землях правіў Міндоўг?

Іпацьеўскі летапіс распавядае, што галіцка-валынскія войскі ў вайне з Міндоўгам з Бельска пайшлі «на град их, и плениша всю воотчину их и страны их»[23]. Якраз з Бельска было зручна ваяваць яцвяжскія землі па рацэ Нараў. Але гэты паход мог быць накіраваны і ў раён Скідзеля, Шчучына, Ліды, які лічыцца даследчыкамі яцвяжскім[24]. Гісторык Э.Гудавічус лічыць, што паўднёвыя межы домена Міндоўга — гэта ваколіцы Меркіне, Даўгай, Варенаў, Ліды[25]. Гэта зямля яцвяжскага племені Дайнава. Аднак Дайнаву, «якая завецца некаторымі яцвяжскай зямлёй»[26] Міндоўг перадаў у 1252 годзе Ордэну. Цяжка паверыць, каб Міндоўг аддаў сваё родавае ўладанне. Можна сцвярджаць адно: Міндоўг паходзіў з яцвяжска-літоўскага памежжа і яго дамен, калі ён у яго быў, знаходзіўся па суседству з Наваградкам, на правым беразе Нёмана, у раёне Ліды, Шчучына, Скідзеля, Мерачы, Друскенікаў, Даўгая.

ШЛЯХ ДА ЎЛАДЫ

У адрозненне ад іншых балцкіх земляў «Літва Міндоўга» не ведала спусташальных крыжацкіх нашэсцяў, не была ў гандлёвай блакадзе Ордэна, вяла ажыўлены гандаль з Наваградкам, і не выпадкова, што Міндоўг становіцца адным з моцных і ўплывовых феадалаў «всей земли Литовской». Саюзныя адносіны з галіцка-валынскім князем Данілам Раманавічам (Міндоўг двойчы ўдзельнічаў у яго паходах: першы ў 1237 годзе супраць Конрада Мазавецкага, другі ў 1245 годзе супраць чарнігаўскага князя Расціслава) забяспечвалі князя падтрымкай моцнага саюзніка. Таму і звярнуліся да яго куршы з просьбаю аб дапамозе ў барацьбе супраць немцаў, якія з 1242 года пачалі захопліваць куршскія землі, будаваць там замкі і мячом хрысціць насельніцтва.

Міндоўг сабраў, паводле «Рыфмаванай хронікі», каля 30 тысячаў вояў, што даволі верагодна (польская «Вялікая хроніка» называе такую ж колькасць войска Міндоўга падчас яго паходу на Мазовію[27]), і пайшоў на Амботэн і ўзяў яго ў аблогу. Пяць тыдняў беспаспяхова ваяваў ён гэтую цвержу.

З Гольдынгена на дапамогу крыжакам падаспеў ордэнскі атрад. Калі Міндоўг павёў сваё войска на штурм, крыжакі нечакана з лесу ўдарылі ў тыл. Пачалася паніка, войска кінулася наўцёкі. Міндоўг згубіў 1500 воінаў. Крыжакі захапілі і яго абоз. Акрыленыя перамогай рыцары рушылі ўслед за Міндоўгам, каб канчаткова расправіцца з князем. Міндоўг зачыніўся ў сваім градзе (відаць, Руце, дзе ён пазней таксама будзе абараняцца ад сваіх ворагаў) і ледзь здолеў адбіцца ад крыжакоў.

Паражэннем тут жа скарысталіся ворагі Міндоўга ўнутры Літвы. «За ворожьство с ними» яны і выгналі князя з яго зямлі. Міндоўга напаткаў лёс многіх літоўскіх феадалаў, якія ў выніку міжусобных войнаў уцякалі з Літвы і шукалі прытулак пры дварах рускіх князёў або ў крыжакоў. Уцекачы прымалі хрысціянства, а пасля з войскам, якое давалі ім новыя гаспадары, ваявалі сваю былую Радзіму. Так рабілі Таўцівіл, Едзівіл, Вікінт, Даўмонт, Суксе, Полюш, Вітаўт, Свідрыгайла. Міндоўг са сваімі баярамі, пэўна, уцёк у Наваградак, дзе яго добра ведалі.

Мінула два стагоддзі, як Яраслаў Мудры пасля паходу на Літву заснаваў на мяжы яцвяжскіх і літоўскіх земляў Наваградак. За гэты час невялікая цвержа ператварылася ў багаты і шматлюдны горад — цэнтр славянскай каланізацыі балцкіх земляў. Горад акружалі высокія драўляныя сцены, а ўнутры ён быў забудаваны дварамі феадалаў і купцоў, дамы якіх упрыгожвалі яркія роспісы, разьба, мэбля. Урадлівая глеба, наяў-

насць балотных рудаў, а значыць ... радовішчы крэйды ў раёне прытока Нёмана Росі (археолагі знайшлі там старажытныя шахты), і як вынік — развіццё рамёстваў, сталі асновай эканамічнай магутнасці Навагрудчыны.

Важнай крыніцай багацця Навагрудка быў гандаль. Па Нёмане навагрудскія купцы пападалі ў Балтыйскае мора, а далей у гарады Паўночнай і Заходняй Еўропы. Развітая волакавая сістэма звязвала Нёман з Дняпром і Заходняй Дзвіной. Па Дняпры быў выхад у Чорнае мора, а праз Заходнюю Дзвіну купцы маглі выйсці ў басейн Волгі, у Каспійскае мора. Як сведчанне шырокіх гандлёвых сувязей Навагрудскай зямлі — знаходкі скарбаў з арабскімі дзірхемамі, манетамі візантыйскіх імператараў, пражскімі грошамі, дынарыямі манетнага двара Вісбю, шылінгамі Тэўтонскага ордэна, заходнееўрапейскімі грашамі[28]. А па разнастайнасці прывазнога посуду, які знаходзяць археолагі ў Навагрудку, можна вывучыць мастацкія стылі візантыйскіх, кіпрскіх, сірыйскіх сасудаў[29]. Усё гэта сведчыць, што ў навагрудскіх баяраў назапасілася нямала багацця.

Прыток славянскіх перасяленцаў спрыяў узнікненню гарадоў: Слоніма, Ваўкавыска, Гарадзеня, Здзітава, Зэльвы, Свіслачы. А выгаднае геаграфічнае становішча ўратавала Навагрудчыну ад спусташальнага татара-мангольскага нашэсця. Тысячы і тысячы ўцекачоў з рускіх княстваў знаходзілі тут сабе паратунак ад мангольскай навалы.

І не такой ужо нязбытнай марай было жаданне навагрудцаў вызваліцца ад улады Данілы Галіцкага, зрабіць свой горад цэнтрам аб'яднання ўсіх беларускіх земляў. Для гэтага меліся ўсе ўмовы: выгадная палітычная кан'юнктура ва Усходняй Еўропе, і аслабленне Галіцка-Валынскага княства пасля мангольскага нашэсця, і развітая гаспадарка і эканоміка, і багатая скарбніца. Ордэнская і мангольская пагрозы вымушалі не чакаць. Патрэбна была моцная дзяржава, якая б супрацьстаяла і крыжакам, і мангалам, і другім ворагам. На падставе летапіснага паведамлення, што Міндоўг у 1246 годзе прыняў «веру христианскую от Востока со многими своими бояры», М.Ермаловіч робіць выснову, што гэта адбылося ў Навагрудку, куды яго запрасілі на княжанне[30]. Аднак гэтае паведамленне летапісу XVII стагоддзя. Іпацьеўскі летапіс, які вёўся і ў часы Міндоўга, не паведамляе ні аб прыняцці ім праваслаўя, ні аб княжанні яго ў Навагрудку. Не выключана, што ён мог прасіць дапамогі ў навагрудчан.

Некалькі гадоў Міндоўг затраціў на збіранне баявой дружыны і падрыхтоўку да заваёўніцкага паходу на Літву. Мяркуючы па археалагічных дадзеных, навагрудскія воі шырока карысталіся баявымі сякерамі, лукамі, дзідамі, штылетамі, кісценямі, дубінамі і паліцамі.

Дзесьці ў 1252 годзе Міндоўг «Литву зане»[31]. Тое, што ён дзейнічаў на чале наваградскай дружыны, вынікае і з паведамлення І Наўгародскага летапісу. Распавядаючы пра падзеі, якія адбыліся пасля Міндоўгавай смерці, летапіс указвае, што Войшалк прыйшоў на Літву «съвкупи около себя вои отца своего и приятели»[32], а Іпацьеўскі летапіс удакладняе, што гэта былі наваградцы[33]. Ваяводам у Міндоўга служыў разанскі баярын Астафій Канстанцінавіч, які ўцёк ад мангола-татарскага нашэсця ў Наваградак.

ВАЙНА З ГАЛІЦКА-ВАЛЫНСКІМ КНЯСТВАМ

Здрадніцкія забойствы, хітрасць, падман — ні перад чым не спыняўся Міндоўг, каб усталяваць сваю ўладу на Літве, той, хто станавіўся на ягоным шляху, быў забіты, як князі Булевічы, альбо вымушаны падзяліць лёс ізгояў, як князі Вікінт, Таўцівіл і Едзівіл. «Бесчисленное имение» літоўскіх феадалаў Міндоўг раздаваў сваім паплечнікам. «...Бысть княжющю ему в земли Литовьской, и пача избивати братью свою и сыновце свои, а другия выгна из земле. И нача гордети велми, и вознесеся славою и гордостью великою, и не творяше противу себе никого же», — гэтак пісаў пра праўленне Міндоўга Іпацьеўскі летапіс[34].

Вельмі ўмела выкарыстоўвае ён міжусобныя войны дробных літоўскіх і жамойцкіх князькоў. Напрыклад, падтрымаў нейкага князя Лонгвена, які варагаваў з князямі Дуцэ, Мільгернэ і Дзіндэне. «З тых часоў як Міндоўг пайшоў супраць нас, нам не жыць у гэтай краіне», — прызнаюць яны[35]. І ўцякаюць у Рыгу, дзе, прыняўшы хрысціянства, становяцца крыжацкімі прыслужнікамі і водзяць рыцараў у паходы на Літву. Падобны лёс напаткаў і князёў Таўцівіла (магчыма, тапонім Таўтвелы ў Пружанскім раёне паказвае, што Таўцівіл жыў там), Едзівіла і жамойцкага князя Вікінта. Каб пазбавіцца ад іх, Міндоўг пусціўся на хітрасць — паслаў ваяваць Смаленск і паабяцаў: «Што кто приемлеть, собе держать»[36], а ўслед паслаў сваё войска для расправы з імі.

Не думалі яны, калі Міндоўг з купкай сваіх баяраў «за ворожьство» з імі ўцёк з Літвы, што ўся вайна з ім яшчэ наперадзе. Што знойдзе ён падтрымку ў Наваградку і з наваградскімі дружынамі вернецца назад. І будзе звяваны «вся земля Литовская». І ўжо яны толькі ўцёкамі і выратуюцца. Не прадбачылі. Вяртанне Міндоўга было нечаканасцю. Хаця і змоцніліся яны супраць яго, але давялося прызнаць над сабою ягоную ўладу. Ды хіба пакора магла выратаваць жыццё? Не падманула іх ветлая ўсмешка Міндоўга: у халодных ягоных вачах чыталі яны смяротны прысуд. Смерць князёў Булевічаў памят-



Я.Павіслак. Сустрэча Міндоўга з Андрэем Сцірландам.
Канец XIX ст.

ная ім. Ну, скарыліся яму, і што — чакаць, калі ён пачне іх знішчаць, ці ратавацца?

Міндоўг пасля нямала будзе шкадаваць, што выпусціў іх з Літвы. А разлічыў, здаецца, усё. Не ўлічыў аднаго: што яго непрыяцелі, не спадзеючыся на ратунак, на Смаленск не пойдуць.

Шляхі ізгояў... Куды яны вядуць? Туды, дзе вораг твайго ворага. Галіцка-валынскі князь Даніла, які быў жанаты з Таўцівілавай сястрой, — вось хто мог дапамагчы ім у барацьбе з Міндоўгам. Князь даўно з трывогай сачыў за падзеямі, што адбываліся на Наваградчыне і Літве. Наваградак станавіўся новым палітычным цэнтрам Усходняй Еўропы, канкурэнтам Галічу і Уладзіміру. Да Данілы і прыбылі князі-ўцекачы.

Адным моцным ударам рашае Даніла пакончыць з новай дзяржавай. А для гэтага патрэбны войскі, і таму князь звяртаецца да Польшчы. Адасобленая ад Наваградка і Літвы Падляшскай зямлёй, яна не бачыла пагрозы сабе. Наадварот, Наваградская дзяржава разглядалася палякамі як сіла, здольная супрацьстаяць Галіцка-Валынскаму княству. І Польшча адмовілася падтрымаць Данілу. Так Міндоўг, які яшчэ не ўступіў у вайну, атрымаў важную перамогу. А для Таўцівіла гэта было паражэнне.

Тады Даніла пасылае ў доўгі ваяж Вікінта — Яцвезь, Жамойць, Лівонія. «Сребром и дарми многыми» Вікінту ўдаецца схіліць супраць Міндоўга яцвяжскіх і жамойцкіх князёў. Трохі складаней было з «рыцарамі Хрыстовымі». Тыя гандляваліся. Умова: прыміце хрысціянства. Ну як жа: слугі хрысціянства і дапамагаюць паганцам. Вікінт прыняў хрысціянства, і крыжакі забылі аб крыўдах на яго. Занепакоены Міндоўг шле Данілу дары, каб той расправіўся з Таўцівілам: «Не чини има милости»[37]. Марная надзея.

І пачалася вайна. «И многое воевание бысть межи ими»[38]. Можна ўявіць, што хаваецца за гэтымі скупымі летапіснымі словамі. «Воевание» не ведала літасці. Гарэлі вёскі, коні тапталі жытнія палеткі, руйнаваліся «грады многи».

Менавіта з тых часоў захавалася паданне пра гібель горада Свіцязь. Свіцязянскі князь Туган прыйшоў на дапамогу Міндоўгу, а гэтым і скарыстаўся вораг. Рускія дружыны ўзялі ў аблогу горад. «Тады свіцязянкі даюць клятву лепш памерці, пахаваць сябе жывымі ў зямлю, чым аддацца ў рукі ворагу». Паводле падання, жыхары Свіцязя паклікалі багоў, «каб не дапусцілі зганьбавання». А калі іх голас быў пачуты, горад праваліўся, а на ягоным месцы паўстала возера[39]. Паданне гэта, відаць, нарадзілася з рэальнай падзеі. Верагодна, рускія ваяры разбурылі дамбы на беразе возера або неяк інакш затапілі непакорлівы горад. З таго часу Свіцязь не адрадзіўся да жыцця, і памяць пра яго жыла ў паданнях. Яшчэ адзін эпізод з



Хрышчэнне Міндоўга. *XX ст.*

гэтай вайны знаходзім у летапісах, дзе распавядаецца, што Міндоўгава войска здабывала Полацк, і толькі Таўцівіл, які прывёў з сабой лівонскіх рыцараў, адбіў «Литву пречь»[40]. Ні «Рыфмаваная хроніка», ні Іпацьеўскі летапіс не ўзгадваюць пра гэты паход на Полацк, аднак ён мог і адбыцца, бо ў планах наваградскіх бояраў і Міндоўга як раз і было аб'яднанне крыўскіх, літвінскіх і дрыгавіцкіх земляў.

Паводле хронікі Русава, лівонскі магістр Андрэй Сцірланд з рыцарамі спустошыў Міндоўгавы землі і падышоў да града, дзе зачыніўся князь. А польскі храніст Мацей Стрыйкоўскі піша аб буйной бітве войска Міндоўга з крыжацкім войскам на берагах возера Браслаў. Перад самай бітвай Міндоўг выступіў з палымянай прамовай перад сваімі воінамі: «Мужове, таварышы і рыцары мае! Цяпер на вашай мужнасці грунт айчызны стаіць, каторая ў вас бачыць надзею і каторую бураць немцы, пагардліва з вас смеючыся. Вось тут непрыяцель перад вамі гарцуе. Вашы двары нішчыць і сёлы плюндруе. Ужо нам знікненне набліжае. І айчызну наймілейшую вашу мячом трывожыць. За тое пакажыце нераможную сілу за вольнасць, за багоў, жонак і дзетак мілых»[41]. У гістарычных крыніцах таксама няма ўзгадак аб гэтай бітве. Хоць яна і магла адбыцца і, паводле Стрыйкоўскага, літвіны перамаглі крыжакоў. Адноc-

на прамовы Міндоўга, то без сумненняў — гэта плён мастацкай фантазіі Стрыйкоўскага. У асобе Міндоўга ён вывеў не хітрага і жорсткага правіцеля, а мужнага абаронцу «айчызны наймілейшай». Так гісторыя становіцца міфам.

Галоўны ўдар наносіўся сіламі галіцка-валынскіх князёў Данілы і Васількі Раманавічаў на Ваўкавыск, Слонім, а пасля князі «поидоша к Новугородку», які захапіць так і не ўдалося.

Таўцівіл тым часам разам з ордэнскім войскам вяртаецца ў Рыгу, дзе прымае хрысціянства. І пакуль каталіцкія святары пасвячалі новахрышчонага ў таемствы святой веры, магістр Андрэй Сцірланд вёў перамовы з Міндоўгам. «І калі яны (Міндоўг і магістр. — *В.Ч.*) любезна сустрэліся і пагаварылі, дык князь загадаў прыгатаваць шыкоўную вячэру і запрасіў магістра ў госці, падчас вячэры магістр доўга ласкава размаўляў з князем»[42]. Дзе ўжо там ласкава, магістр адразу паставіў свае ўмовы: «Не выратуешся і не пераможаш ворага, калі не пашлеш да папы і не прымеш хрысціянства. А служыць табе рад, і хаця асляпіў вочы свае золатам, якое атрымаў ад цябе, усё ж я табе дапамагу»[43].

«Так што нарэшце князь абяцаў, што ён прыме хрысціянства. І князь пажадаў, каб магістр выпрасіў у папы, каб князя і яго княгіню адразу ж пасля хрышчэння каранавалі, як хрысціянскага караля, што яму магістр Андрэй Сцірланд і абяцаў»[44]. Як бачым, Таўцівіл у гэтай гульні аказаўся пешкай, якую мянялі на караля, праўда, яшчэ без кароны. Але што значыць выкаваць карону? Быў бы кароль, а карона знойдзецца. «Калі б ты быў хрысціянінам, дык я зрабіў бы табе яшчэ большы гонар і выпрасіў бы табе каралеўскую карону, клянуся жыццём»[45], — абяцаў магістр Міндоўгу. Магістр прапануе Міндоўгу не толькі самому прыняць веру Хрыстову, але і сваіх падданых прывесці да яе, ну і за тружанне Ордэну саступіць частку земляў жамойтаў і селонаў, а магістр падтрымае яго ў барацьбе з Таўцівілам і Данілам. Міндоўг ведаў, на што ідзе: раз'яднаць варожую кааліцыю, знайсці сярод ворагаў саюзнікаў. А землі, што ён адпісваў Ордэну, яму не належалі. Нібыта ён, Міндоўг, з гэтага пагаднення выгадаў болей карысці, чым Ордэн. А па сутнасці крыжакі скарысталі яго ў сваёй палітыцы, знайшлі сабе саюзніка ў скарэнні балцкіх земляў, саюзніка, які хаця і не падтрымае іх войскам, але цяпер ужо не будзе ваяваць супраць Ордэна і дапамагаць жамойтам і куршам.

У далёкі Рым разам з ордэнскімі пасламі адправіўся і Міндоўгаў баярын Парнус. Папа абрадаваўся, што Міндоўг «спазнаў хвалу Божую і праз хрышчэнне адрадзіўся» і прыслаў яму булу, якой абвяшчаў: «...каралеўства літоўскае і ўсе землі, якія здабыў ад няверных або ў будучыні мог здабыць на права і ўлас-



Карона вялікіх князёў літоўскіх

насць святога Пятра і яго (Міндоўга. — *В.Ч.*) з жонкай, сынамі і ўсім дваром пад пратэкцыю і апеку апостальскай сталіцы вырашылі ўзяць»[46]. А ў другой буле папа прасіў дапамагчы «каралю літоўскаму, які жадае павярнуць паганцаў да веры» рыжскага, дерптскага і эзелійскага біскупаў[47]. Хельмскаму біскупу Генрыху папа даручыў каранаваць Міндоўга. Так Міндоўг дабіўся яшчэ адной важнай перамогі.

У адчаі Таўцівіл пакінуў Рыгу і павёў сваю дружыну на Міндоўгаў град Руту. А да Міндоўга на дапамогу прыйшоў нямецкі атрад. Градам Таўцівіл не змог авалодаць. У адной з начных вылазак Міндоўг «разогнаша и Русь и Ятвязе»[48].

Таўцівіл бачыў, што воі ягоныя ўжо не вераць у перамогу і ў бітве не шукаюць ворага, а ўцякаюць ад яго. Зноў паражэнне. Таўцівіл адпраўляецца ў Жамойць да Вікінта. А па ягоных слядах, «собрав силу велику»[49], урываецца туды Міндоўг. І хаця ўдалося адбіць яго ад Вікінтавага града, Цвірамента, але гэта не перамога. Удача адвярнулася ад Таўцівіла, а вось Міндоўгу лёс спрыяе. Той карануецца каралеўскім вянцом. Сам лівонскі магістр са сваёю світаю прыехаў на каранацыю. Хельмскі біскуп Генрых уздзеў на галаву князю каралеўскую карону. Узнікае пытанне, дзе і калі каранаваўся Міндоўг? Калі і сапраўды, як падае гэта «Хроніка Быхаўца», ён панаваў у Наваградку, то і каранацыя адбылася тут. Па традыцыі гісторыкі прынялі дату 6 ліпеня 1253 года. Аднак Тэадор Нарбут прывёў (праўда, у сваім пераказе, што нараджае падазрэнне ў фальсіфікаце) дакумент, паводле якога, папскі легат Альберт Суербер 21 ліпеня 1252 года прысутнічаў на каранацыі Міндоўга ў абозе каля замка Navenpille — гэта значыць Новага горада. Хоць Нарбут лічыць, што гэта не Наваградак, а іншы горад. Каля Друскенікаў пры мясцечку Лішкаве над Нёманам ёсць гара Пілкалнс-Замкавая, з руінамі збудаванняў. Вось тут на думку Нарбута і знаходзіўся Наўпіліс, або Новая Гародня, якую заклалі гарадзенскія князі[50]. Пазнейшы Густынскі летапіс указвае, што каранацыя адбылася ў 1252 годзе ў Наваградку[51]. Гады тыя самыя, ды і горад, калі ўлічыць, што Наўпіліс гэта літоўская назва Наваградка, таксама. Значыць, складальнік летапісу меў крыніцу, дзе ўказваліся год і месца каранацыі Міндоўга. Нямецкі гісторык Войгт спасылаецца на дакумент 1253 года з кралявецкага тайнага архіва, у якім гаворыцца, што ў 1252 годзе хельмскі біскуп прысутнічаў на каранацыі Міндоўга ў Наваградку[52].

Міндоўг шчодра аддзячыў Ордэн і падпісаў некалькі грамат, у якіх саступаў яму Корсь, Яцвязь, Нальшчаны, Дайнову і «ўгневаны на жамойтаў» — Жамойць[53]. Не адна з гэтых земляў не належала Міндоўгу, а з Яцвязю і Жамойцю ён ваяваў. Пэўна, трэба сказаць, што Міндоўг даваў слова не прэтэндаваць на гэтыя землі. Паколькі сярод адпісаных Міндоўгам земляў былі Дайнова (зямля паміж Нёманам і вярхоўем ракі Нараў), Нальшчаны, мястэчка Вейшышкі (знаходзіцца на сучасным беларуска-летувіскім памежжы), а таксама мястэчка Лукаў на Падляшшы, дык можна прыблізна вызначыць межы Міндоўгавай дзяржавы на поўначы і на ўсходзе. На поўначы гэтая мяжа, пэўна, ішла па лініі Гародня—Ліда—Крэва, а на захадзе, пэўна, не сягала далей Ваўкавыска. Што ж датычыцца мяжы на поўдні, дык яна магла праходзіць па лініі Камянец—Здзітаў—возера Зьяце, а на ўсходзе па лініі возера Зьяце—Бялевічы—Койданава—Валожын—Маладзечна—Крэва.

Не абышлося без хітрасці. Міндоўг хацеў, каб касцёл у Літве не падпарадкоўваўся рыжскаму біскупу. Ён просіць папу заснаваць на Літве асобнае біскупства са сваёй сталіцай, дзе гатоў за ўласны кошт пабудаваць катэдру. Папа згадзіўся і назначыў літвінскім біскупам ордэнскага каплана Хрысціяна, чаму працівіўся рыжскі біскуп Альберт. Аднак Міндоўг адпісаў літвінскаму біскупству землі ў Жамойці, якая не прызнавала ягонай улады і якую ён саступаў Ордэну. Хітры ход. З гэтага надання Хрысціян не меў ніякіх прыбыткаў, а значыць, падпаў пад залежнасць ад Міндоўга, з добрай волі якога біскупства магло існаваць ці бедна, ці багата. Хрысціян нават скардзіўся на караля новаму папе Аляксандру IV, і той у буле ад 7 сакавіка 1255 года пісаў, каб Міндоўг «памятаў аб патрэбах біскупства»[54]. Так што і ў сферы духоўнай Міндоўг прагнуў улады. Ды і сваіх падданых не вёў да крыжа. Толькі 600 чалавек акружэння і воінаў хрысціліся.

Таўцівіл яшчэ гатоў змагацца. Уся надзея на Данілу Галіцкага. «Поди к Новугородку», — пасылае ён да яго свайго слугу Роўбу (быць можа, назва сяла Раўбы ў Лідскім раёне ўказвае, што той паходзіў адсюль). У 1253 годзе Даніла з братам Васількам, з сынам Львом і з полаўцамі зімой прыйшлі да Пінска. Пінскія князі, якія ўжо даўно арыентаваліся ў сваёй палітыцы на Наваградак і Літву, «неволею» пайшлі на вайну. У першым жа баі на возеры Зьяце Міндоўгава дружына разбіла перадавыя атрады Данілавага войска і пагнала іх праз балоты да ракі Шчары. Раззлаваны Даніла патрабаваў ад саюзнікаў працягваць вайну: «Срамоту имеем от Литвы и от всех земель, аще не дойдем и вратимся»[55].

Наступным днём галіцка-валынскае войска зламала супраціўленне Міндоўгавых войск, уварвалася на Літву, а адтуль і на Наваградчыну і «плениша всю землю Новогородьскую»[56]. Раман Данілавіч у гэты час захапіў Гародню.

Міндоўг яшчэ спрабуе наладзіць абарону Наваградчыны, пасылае свайго сына (відаць, Войшалка) ваяваць каля Турыйска, але супрацьстаяць Данілу ён не ў сілах. На ўсе ягоныя звароты аб заключэнні міру Даніла не адказвае. Няўдачы Міндоўга ў гэтай вайне паўплывалі на адносіны да яго наваградскіх баяраў — ён пакідае Наваградак, а наваградскім князем выбіраюць яго сына Войшалка. Той і заключае мір з Данілам Галіцкім. А Міндоўг застаецца правіць у Літве. Для Таўцівіла ж — гэта канчатковае паражэнне. Застаўшыся без саюзнікаў, ён амаль бездапаможны перад Міндоўгам. Срэбра Міндоўгава адвяло ад яго і яцвягаў, і жамойтаў. Як ваяваць? Адчай гоніць яго з Жамойці на Валынь да Данілы. Таўцівіл заклінае таго змагацца з Міндоўгам. Але Даніла свайго дамог-

ся: Наваградак і Літва зноў падуладныя яму. Трэба перадыхнуць, сабраць сілы. З поўдня пагражаюць татары, і пра гэта забывацца нельга. Ніяк не выпадала зноў ваяваць. Адзінае, што застаецца Таўцівілу, — кінуць галіцкаму князю: «Миндовг убеди я серебром многим»[57]. Ды толькі ўгнявіў Данілу. І няма цяпер у Таўцівіла саюзнікаў, застаўся адзін. З чаго пачынаў, тым і скончыў: ізгой, без войска, без надзейных сяброў і паплечнікаў, без грошай. А па слядах крадзецца смерць. Міндоўг не супакоіцца, пакуль ён жывы. Князь пакідае Радзіму.

І вось Полацк. Мужы-палачане хочуць узяць яго за баявога князя. Выбару няма, і ён згодны.

ПРАЗВАЛІ ЯГО ДОБРЫМ

Усю вайну Полацк заставаўся ўбаку, староннім гледачом назіраў за падзеямі на заходніх і паўднёвых межах сваіх зямель. Што ў ягоным позірку? Зацікаўленасць? Трывога? Абыякавасць? Чаканне? Многа загадкавага і незразумелага ў гэтым бяздзейным маўчанні. Што скажа Полацк? Літва ж даўняя данніца, яго саюзнік, зямля, якую не першае стагоддзе каланізуюць крывічы разам з дрыгавічамі. Дык чаму бяздзейнічае Полацк? Страціў Смаленск — свой даўні прыгарад, страціў Лівонію — данніцу сваю, вось і Літву аддае на волю галіцкіх князёў. Няўжо няма каму ў Крыўі пазвінець мячамі аб варожыя шаломы? Аднак вось Полацк выклікаў да сябе Таўцівіла, ізгоя і літвіна, мог жа свайго Ізяславіча пасадзіць, дык спатрэбіўся літвін. Навошта? Якія такія надзеі звязваюць з ім палачане?

Не ў інтарэсах Полацка было ўзвышэнне Наваградка і Літвы. Полацк і сам не супраць аб'яднаць Наваградскую зямлю і Літву пад сваёй зверхнасцю. Вайна Данілы Галіцкага з Міндоўгам Полацку на руку. Хай кідаюць у пашчу смерці лепшых сваіх вояў, а ён пачакае, а пасля можна і слаць свае дружыны, і мець зямлю Літоўскую. Можа, на гэта спадзяваўся Полацк? Аднак Наваградчына і Літва — у залежнасці ад Галіцка-Валынскага княства. Ці на гэта разлічваў Полацк? Не, не на гэта. Значыць, вынікамі вайны незадаволены. Таўцівіл пераходзіць у праваслаўе і цяпер замест каталіцкага імя Готліб атрымлівае праваслаўнае Феафіл. А каб болей прывязаць князя да Полацка, яго ажанілі з дачкою былога полацкага князя. І па жонцы ён парадніўся з Аляксандрам Неўскім.

Мацей Стрыйкоўскі пісаў, што полацкім князем Таўцівіл стаў нібыта ў той час, калі Міндоўг паслаў яго на Русь, ён заваяваў Полацк. Гэта паведамленне не пацвярджаецца гістарычнымі дакументамі. Верагодна, гэта прыдумка самога Стрый-

коўскага. Ён жа піша, што падчас вайны Даніла Галіцкі выправіў Таўцівіла з войскам для ратавання Полацка, які абклала Міндоўгава войска. Таўцівіл злучыўся з крыжакамі, адбіў ворага ад горада[58]. Адсутнасць сведчанняў пра гэтую падзею ў іншых крыніцах дае падставу таксама лічыць гэта за прыдумку храніста. Немагчыма лагічна растлумачыць паводзіны Таўцівіла. Ён, полацкі князь, як ізгой туляецца на чужыне. Навошта яму, праваслаўнаму князю, прымаць каталіцтва? А таму, што на той час ён не быў полацкім князем, а значыць, заставаўся ў паганстве.

За верную службу Полацку палюбілі палачане Таўцівіла і празвалі яго Добрым.

ЦЯЖАР УЛАДЫ

Цяжка было заваяваць уладу, яшчэ цяжэй было яе ўтрымаць. Міндоўг разумеў усю хісткасць свайго становішча: яму пагражае Таўцівіл з Полацка; незадаволеныя ім многія феадалы ўнутры Літвы наракаюць за саюз з Ордэнам; жамойты падбіваюць выракціся хрысціянства і парваць з крыжакамі. І гэта дваістае становішча: для хрысціянаў паказваць, што ты хрысціянін, для язычнікаў — што не адрокся ад старой веры, што «крещение... льстиво бысть»[59]. За пакланенне старым багам на яго наракае жонка. І гэтая зняважлівая залежнасць ад Ордэна і Данілы Галіцкага. Па першым патрабаванні галіцка-валынскага князя ён паслухмяна шле яму войска для барацьбы з татарамі, тым самым выклікае гнеў татараў. І вось паваяваў у 1258 годзе Літву татарскі водца Бурундай. Колькі сёлаў ляжыць у руінах. Такая расплата. Невядома, як бараніўся Міндоўг ад татара-манголаў. Захавалася паданне пра перамогу Міндоўга над ханам Кайданам у бітве каля Нёмана, пасля чаго месца гэтае пачалі называць Койданава[60]. У летапісе мы знаходзім узгадку, што Бурундай «имя мел власнае Кадан»[61]. Так што, магчыма, хан Кайдан з падання і быў Бурундаем.

Трывожыў Міндоўга і сын Войшалк. Варожасць і нелюбоў між імі. Каля самай мяжы Літвы ён у Лаўрышава пабудаваў манастыр. Навошта? Трывогі, няўпэненасць у заўтрашнім дні, сумненні... Цяжар улады не прыносіў ні радасці, ні шчасця, ні супакою. Сваё хісткае становішча Міндоўг усведамляў, таму зноў заручыўся падтрымкай апостальскай сталіцы. Папа Аляксандр IV на Міндоўгаву просьбу пацвердзіў ад 6 сакавіка 1255 года ягоны каралеўскі тытул і дазволіў каранавацца ягонаму сыну, пацвердзіў і ўладу Міндоўга на Літве. Толькі рэальнай сілы папская була не давала.



Пячатка Міндоўга

У 1260 годзе каля возера Дурбе жамойцка-куршскія дружыны разбілі войска Лівонскага ордэна. Паўсюдна ў Куроніі, Земігаліі, Жамойці супраць крыжакоў успыхнула паўстанне.

Жамойці патрэбна была дапамога Літвы, і жамойцкія феадалы звярнуліся да князя Траняты: «Жадаем, каб кароль загадаў перабіць усіх хрысціян, што жывуць у яго, і сам зноў стаў язычнікам і выракся хрышчэння». Транята паабяцаў: «Не хвалюйцеся, жамойты, я сам пайду да Міндоўга і буду прасіць і пагражаць яму, пакуль ён не згодзіцца».

Транята, не хаваючы прыкрасці, выгаварыў яму за саюз з Ордэнам: «Жамойты не задаволены табою, і дзеля твайго гонару ты павінен выконваць тое, што ад цябе патрабуем. Так будзе лепш. Забудзь Хрыста, якім цябе падманулі. Усё хлусня, што табе распавядаюць ордэнскія браты, калі адгаворваюць ад тваіх багоў. Твой бацька быў вялікі кароль, і ў яго час не было яму роўных у Літве. Няўжо ты жадаеш прыняць ярмо сам і сваім дзецям, калі можаш быць вольным. Калі крыжакі скораць жамойтаў, дык слава твая загіне, а з ёю і ўсё тваё каралеўства, бо ты павінен будзеш скарыцца ім тады з усімі дзецьмі. Няўжо ты такі невідушчы? Калі жадаеш цяпер жа вызваліцца ад католікаў, на тваім баку жамойты, якія любяць цябе, ты павінен згадзіцца адрачыся ад хрысціянства. Пашкадуй ад усёй душы, што ты, усімі шанаваны, моцны і да таго ж багаты кароль, пакінуў сваіх багоў, якія так часта дапамагалі тваім бацькам. Хочаш застацца хрысціянінам, заставайся, аднак пасля пашкадуеш, што застаўся. Гэта табе параіць усялякі, хто жадае табе славы. Як толькі мы з табой прыйдзем да латгалаў і ў Лівонію, дык абедзве гэтыя землі адразу трапяць у твае рукі, бо яны так хочуць зрабіцца язычнікамі»[62]. Вось такія кароль выслухаў дакоры. Ніякай пачцівасці: «...Ты павінен выконваць тое, што ад цябе патрабуем... Пашкадуеш...»

Спакуса ўладарыць у Жамойці, Куроніі, Лівоніі была вялікая, і Міндоўг згадзіўся з Транятам. Ён парывае з Ордэнам, адракаецца ад каталіцтва і ідзе на дапамогу Жамойці. У Куроніі ягоныя войскі занялі крыжацкія крэпасці Сіцеліс, Геор-

генбург, Добен. 30-тысячнае войска з літвінаў, русі, яцвягаў і жамойтаў пайшлі на Мазовію і спалілі Плоцк. Адказнага ўдару крыжакоў доўга чакаць не давялося. Яны ў саюзе з мазавецкімі князямі і велікапольскім войскам у студзені 1261 года рушылі «ў землі літоўцаў і другіх паганскіх народаў з намерам іх завяваць і вынішчыць»[63]. Калі заваёўнікі раздзяліліся на некалькі атрадаў і разышліся па краіне, Міндоўгава войска напала на варожы лагер і заняло яго. Крыжакі з саюзнікамі вярнуліся ў лагер і сустрэлі там непрыяцельскае войска. «Храбра з імі сышоўшыся, яны смела пачалі бітву. І хаця яны забілі многіх язычнікаў, аднак апошнія з дазволу Госпада і за грахі хрысціян дабіліся перамогі і прагналі хрысціян»[64]. Гэтая перамога яшчэ больш узвысіла Міндоўга ў сваім жа ўяўленні. Паняволеныя Ордэнам народы бачаць у ім надзею. О, ён моцны!..

Аднак пасля таго як Жамойць адбілася ад крыжакоў, Транята і жамойцкія феадалы не пажадалі мірыцца з уладай Міндоўга. Транята і сам марыў стаць адзіным уладаром усёй зямлі Літоўскай. Так у асяродку жамойцкіх феадалаў нарадзілася змова супраць Міндоўга.

ЗМОВА ТРАНЯТЫ

Пакуль Міндоўг цешыўся падманлівай веліччу сваёй улады, Транята рабіў усё, каб аслабіць свайго ўладара. Ён і падбіў Міндоўга зімой 1261/62 года на паход у Лівонію, абяцаючы падтрымку ліваў і латгалаў. Міндоўг паверыў яму, нават накіраваў пасольства ў Ноўгарад да Аляксандра Неўскага і заключыў з ім пагадненне аб сумесных дзеях супраць крыжакоў. Гэты крок Міндоўга ніяк не ўваходзіў у задумы Траняты: неабходна, каб літоўскага князя перамаглі крыжакі, атрымлівалася ж адваротнае — аб'яднанымі сіламі Літвы, Жамойці, Ноўгарада, Полацка і Віцебска Міндоўг мог разбіць Ордэн і тым самым умацаваць сваю ўладу на Літве. Таму Транята зрабіў усё магчымае, каб сарваць паход. Ні лівы, ні латгалы не паўсталі супраць крыжакоў, ноўгарад-полацкае войска своечасова не з'явілася, Транята пайшоў з жамойтамі, і Міндоўг ні з чым вярнуўся з Лівоніі. Толькі цяпер, пераканаўшыся ў здрадзе Траняты, Міндоўг прызнаў усю праўду жончыных слоў, што ён дарэмна слухае такую малпу, як Транята, дарэмна адрокся ад каталіцтва і здрадзіў Ордэну. Міндоўг з горыччу адказаў жонцы Марфе: «Падабаецца табе ці не, але я кінуў хрысціянства, парваў з магістрам і зноў прыйшоў да паганства. Вяртацца ў каталіцтва цяпер позна. Таму, жонка, маўчы цяпер. Што будзе, то будзе, я прытрымаюся ўказанняў Траняты і жамой-

таў. Ведаю, што зрабіў неразумна, але тваім настаўленням цяпер канец»[65].

«Што будзе, то будзе...» Паслухмяны нявольнік абставін, выканаўца чужой волі, які разумее, што не мае сіл неяк змяніць сваё незайздроснае становішча і вымушаны змірыцца з ім. Цяпер бы Міндоўгу болей разважлівасці, мудрасці, асцярожнасці, каб не нарабіць глупства, што магло абцяжарыць яго становішча. Ды пачаў ён неапраўданыя войны. Помсцячы мазавецкаму князю Земавіту за нядаўні напад на Літву, Міндоўг рушыў у паход на Мазовію. 30-тысячнае войска Міндоўга пакрыла попелам Мазовію. Ляжалі ў руінах Плоцк, Яздоў, Ловіч. Каля Яздова трапіў у палон мазавецкі князь Земавіт са сваім сынам Конрадам. Паводле «Вялікай хронікі», галіцка-валынскі князь Шварн адсек галаву Земавіту, але гэта выдумка. У каталозе кракаўскіх біскупаў ёсць паведамленне, што Земавіта забіў нехта з яго акружэння[66]. Такое ж спусташальнае нашэсце Міндоўгава войска пражыла і Прусія, дзе пры яго прыходзе паўсталі супраць Ордэна прусы. І, паверыўшы ў сваю моц, Міндоўг распачаў вайну з берасцейскім князем Васількам Раманавічам. Даніла Раманавіч Галіцкі прыслаў на дапамогу брату сваё войска. Адзін атрад літвінаў прагналі за Ясельду, аднак галоўнае войска пад началам даводцы Жэкадбажада Мінавіча напала на ваколіцы Мельніца і, пабраўшы палон, павярнула да Літвы. Васілька са сваімі ваярамі дагнаў літвінаў каля Невеля і дазвання разбіў іх, толькі адзінкам удалося выратавацца. Гэтае паражэнне і разрыў Міндоўгам мірных адносінаў з Васількам былі толькі на руку Траняту. А Міндоўг робіць чарговую памылку, як пазней высветлілася — ракавую. Пасля таго як памерла ягоная жонка Марфа, ён захацеў, каб за ягонымі малалетнімі сынамі даглядала яе сястра — жонка нальшчанскага князя Даўмонта. Міндоўг запрасіў яе да сябе. «Се сестра твоя мертва, а поеди карить по своей сестре». А калі яна прыехала да караля, дык ён сілай узяў яе ў жонкі: «Сестра твоя, умираючи, велела ми тя пояти за ся: тако рекла ать иная детий не цвелить»[67].

Становішча, у якім апынуўся Міндоўг, і сапраўды было нялёгкім. Ён ухітрыўся пасварыцца з усімі суседнімі дзяржавамі — і Ордэн, і Полацкае княства, і Галіцка-Валынскае княства, і Мазовія, і Наваградскае княства варагавалі з ім. У самой Літве супраць яго выступалі Транята і Даўмонт. На што мог спадзявацца Міндоўг? Нібыта ў адчаі ён робіць нечаканы для ўсіх крок. Пакінуўшы напрыканцы 1262 года Літву, Міндоўг адправіўся ў далёкі Рым шукаць заступніцтва папы. У Рыме ён зноў ахрысціўся паводле каталіцкага абрадка і выпрасіў у папы Урбана IV дараванне за разрыў з хрысціян-



Ф.Бразоўскі. Міндоўгаў курган у Наваградку. *Канец XIX ст.*

ствам[68*]. Толькі на Літве ён сутыкнуўся з супрацьстаяннем Траняты, Даўмонта і паганцаў, незадаволеных ягоным вяртаннем у хрысціянства. Нічога лепшага не прыдумаў, як прыбегнуць да таго ж прыёму, які некалі выкарыстаў, каб расправіцца з Таўцівілам і Вікінтам, — паслаў Даўмонта і многіх варожых сабе князёў на Русь, пад Бранск у надзеі на іх паражэнне. Стары прыём і цяпер не прынёс жаданых вынікаў. І зараз Міндоўга перахітрылі. Даўмонт вярнуўся назад і нечакана ноччу напаў на дом соннага літоўскага ўладара, забіў яго разам з сынамі Рэпеньёй і Рукляй. Хаця ў рочніку кракаўскага капітулу забойцам Міндоўга названы Транята[69]. Верагодна, што яны абодва ўдзельнічалі ў забойстве першага караля Літвы.

Істотны факт падае Т.Нарбут, які паведамляе, што ў 1618 годзе ў Лівоніі каля мястэчка Аглона знайшлі мармуровую пліту з напалову сцертым надпісам, аднак можна было прачытаць «Mendocus Dux Lirhuanas...», а таксама і дату 12 верасня 1263 год[70]. Нарбут лічыць, што гэтая пліта стаяла на месцы Міндоўгавай магілы. Аднак, паводле падання, Міндоўга пахавалі ў Наваградку, і на месцы ягонай магілы наваградцы ў памяць аб сваім князі насыпалі высокі курган, які і дагэтуль называецца Міндоўгавым курганам. Праўдападобна, што гэта пліта стаяла

---

*Гэты факт пацвярджае і була (1267) папы Клемента IV да чэшскага караля Атакара, у якой Міндоўг названы хрысціянінам. (Narbutt T. Op. cit. T. 1. S. 217—218.)

на месцы забойства Міндоўга. Хаця, калі ўлічыць паведамленні некаторых крыніц, дык паміж змоўшчыкамі і атрадам Міндоўга адбыўся бой, дзе кароль і загінуў[71], дык, пэўна, разам з ім загінулі і ягоныя паплечнікі і завесці ў Літву тулава свайго ўладара не было каму. А Транята не абцяжарваў сябе такім клопатам і пахаваў Міндоўга на месцы забойства. Пазней, мабыць, крыжакі паставілі на ягонай магіле помнік. Ва ўсёй гэтай гісторыі важны іншы момант, а менавіта чаму апынуўся Міндоўг так далёка ад Літвы — у Лівоніі. Сяло Аглоне, верагодна, знаходзілася на рацэ з назвай Еглоне — левым прытоку Заходняй Дзвіны. Упадае Еглоне ў Дзвіну непадалёк ад Герцыке[72]. Праўдападобна, што невыпадкова з'явіліся ў гэтых мясцінах Міндоўг, Транята і Даўмонт са сваімі войскамі. Мэта паходу на Лівонію становіцца зразумелай — адваяванне ў Ордэна былой полацкай цвержы Герцыке. Самым зацікаўленым у гэтым чалавекам быў Таўцівіл, як полацкі князь, ён і мог выступіць з прапановай аб'яднанага паходу на Герцыке. Ягоны брат Транята падтрымаў прапанову, а за ім і Даўмонт. А Міндоўг зноў трапіў у нялёгкае становішча — удзел яго ў вайне з Ордэнам пагражаў яму стратай заступніцтва папы, але і адмовіцца адкрыта ён не мог, бо ў гэтым выпадку зноў бы абвастрыліся адносіны з Таўцівілам і Транятам. Мабыць, Міндоўг вырашыў сарваць паход, каб і з Ордэнам не ваяваць, і з жамойцкім і полацкім князямі не пасварыцца. У паходзе ён удзельнічаў, але, калі войска падышло да Герцыке, нечакана пасылае яго на Бранск, добра ведаючы, што без яго ні Транята, ні Таўцівіл не наважацца на штурм Герцыке. Падставу можна было знайсці, напрыклад, перашкодзіць шлюбу сына Рамана Бранскага з дачкой Васількі Берасцейскага, які павінен быў адбыцца ў гэты час. З палітычнага і вайсковага пункту гледжання гэты паход быў бессэнсоўны: ні заваяваць, ні далучыць Бранск да Літвы Міндоўг не мог, бо Бранскае княства не межавала з дзяржавай. Але так як Міндоўгу патрэбна было сарваць штурм Герцыке, ён даволі хітра выправадзіў сваё войска з Лівоніі за няблізкі свет. Як высветлілася, перахітрыў сам сябе.

Справу бацькі прадоўжыў сын, наваградскі князь Войшалк. Менавіта ён з дапамогай пінскіх і наваградскіх палкоў і галіцка-валынскіх дружын аб'яднаў Навагародскую, Літоўскую, Нальшчанскую землі і Дзяволтву ў адзіную дзяржаву — Вялікае княства Літоўскае.

НАВАГРАДСКІ КНЯЗЬ





ВОЙШАЛК-ЛАЎРЫШ
(?—1268)
Лаўрышаўскае евангелле. ***XIII ст.***

ВОЙШАЛК



а акладзе помніка старажытнай беларускай пісьменнасці — Лаўрышаўскага Евангелля ёсць выбітая на срэбры выява воіна з дзідай і шчытом. Па традыцыі лічыцца, што гэта вобраз святога Лаўрыша, а ў свеце Войшалка*, сына Міндоўга, князя наваградскага, вялікага князя літоўскага. Глыбока сімвалічна, што яго вобраз змясцілі на Евангеллі. Князь, дзяржаўны дзеяч, воін, а разам з тым богабаязны манах, паломнік, заснавальнік Лаўрышаўскага манастыра — два розныя бакі жыцця гэтага чалавека. Многія дзеі і ўчынкі Войшалка выклікалі ў сучаснікаў неразуменне і здаваліся непаслядоўнымі і нелагічнымі. Але калі прыгадаць, у якім складаным становішчы апынулася Наваградская зямля пасля паражэння ў вайне з Галіцка-Валынскім княствам, дык стане ясна, што толькі ўмелая, вытанчаная дыпламатыя, хітрасць, дэталёвы разлік маглі прынесці Наваградку поспех. Войшалк у адрозненне ад Міндоўга дзейнічаў не грубай сілай, не аблудлівасцю. Ён да патрэбнага часу хаваў свае намеры, без шуму плёў інтрыгі, пускаўся на хітрасці, ішоў на кампрамісы. Учынкі яго толькі на першы погляд здаваліся нелагічнымі. На самай справе кожны князеў крок быў прадуманы, паслядоўны. Менавіта Войшалку выпала фактычна стаць заснавальнікам буйнейшай еўрапейскай сярэдневяковай дзяржавы — Вялікага княства Літоўскага.

Іпацьеўскі летапіс, прыводзячы ў прыклад Войшалка, даказвае на эфекце кантрастаў сілу хрысціянскай веры. Войшалк-язычнік, дзікун — няміласцівы да людзей, штодня забівае па тры, па чатыры чалавекі, а калі ў які дзень не заб'е нікога, «печаловашеть тогда, коли же убьяшеть кого, тогда весел бяшеть». Але вось «вниде страх божий во сердце его»[1] — і як

*Паводле П.Урбана, імя Войшалк азначала, верагодна, «Самаадданы воін». («Урбан П. Старажытныя ліцьвіны. С. 140.)

падмянілі Войшалка. Святасць на душы ў яго, дні ў малітвах праводзіць, на Афон паломнікам адпраўляецца — святы чалавек. Няма чаго і казаць пра ўсю надуманасць гэтай летапіснай характарыстыкі, якая нічога агульнага з гістарычнай праўдай не мае. Але вінаваціць Войшалка-хрысціяніна за хітрасць, жорсткасць не выпадае: час і абставіны патрабавалі менавіта такога чалавека на чале дзяржавы. Больш важна адзначыць іншае: Войшалк не здраджваў сваёй веры, як Міндоўг, ён быў ваяўнічы праваслаўны хрысціянін.

Гэтае летапіснае паведамленне можна ўспрыняць і літаратальна — сапраўды на пачатку свайго княжання Войшалк быў язычнікам. Такая версія не выглядае неверагоднай. Значна пазней, у 1378 годзе, мітрапаліт кіеўскі Кіпрыян пісаў, што Наваградак «давно отпал» ад хрысціянства[2]. Трэба думаць, што ў XII стагоддзі язычніцтва было куды мацнейшым як у Наваградку, гэтак і ў Верхнім Панямонні.

Усе спробы Міндоўга заключыць з Данілам мір заканчваліся няўдачамі. Цяпер заключэнне міру стала справай Войшалка. Не магло быць ніякай гаворкі аб тым, каб Наваградак выступаў як роўны з Галіцка-Валынскім княствам: ён павінен паслухмяна прыняць усе ўмовы пераможцы. Аднак трэба было неяк выгадаць і свае інтарэсы. Войшалк адправіўся ў Холм на сустрэчу з Данілам Галіцкім. Каб знайсці саюзніка ў лагеры галіцка-валынскіх князёў, ён аддае сваю сястру за сына Данілы, холмскага князя Шварна. І цяпер яго візіт мае выразную афарбоўку: вось бачыце, ён прыехаў да Данілы з самымі лепшымі намерамі, ён хоча міру і сяброўства з ім. Нялёгка было Данілу разгледзець гэтага маладога князя. Што ў яго на розуме? З Міндоўгам ясна — той хітры і вераломны, і верыць яму нельга. А гэты?

Даніла Галіцкі запатрабаваў аддаць Наваградскую зямлю Шварну, дзеці якога маглі б мець яе ў спадчыну. Войшалк быў гатовы ўступіць Наваградак, але з умовай, што ў ім сядзе не Шварн, а яго брат — князь Раман Данілавіч. Які разлік Войшалка? Было відавочна, што Галіцка-Валынскае княства не змагло трывала далучыць да сябе Наваградскую зямлю хаця б таму, што паміж імі ўкліньвалася Пінская зямля. Галоўнае ж заключалася ў тым, што дзяржава Данілы Раманавіча кацілася да скону, усё болей і болей трапляючы ў залежнасць ад Залатой Арды, таму і сілай утрымаць Наваградчыну ў сваіх руках Даніла Галіцкі не меў. Войшалк гэта добра разумеў. Якія пяць-шэсць гадоў — і Наваградак акрыяе, збярэцца з сіламі.

Даніла згадзіўся з Войшалкам. Наваградскім князем стаў Раман. Аднак Войшалк як заложнік павінен быў жыць пры двары Данілы. Каб пазбавіцца ад гэтага ганаровага палону, Войшалк прымае манаства.

Даніла лічыў, што Войшалк адмовіўся ад палітычнай барацьбы і цалкам аддаў сябе на служэнне Богу. І сапраўды, Войшалк нібыта выракся свецкага жыцця, забыўся пра ўладу. Тры гады жыве ён у Палонінскім манастыры. Як і кожны з браціі, творыць малітвы, посціцца, працуе ў манастырскай гаспадарцы. Змірыў свой княжацкі гонар, моліцца аб уратаванні сваёй душы і нават хрысціць унука Данілы Галіцкага — Юрыя Львовіча. Потым просіць адпусціць яго ў паломніцтва на Афон, і Даніла дазваляе. Адпраўляўся Войшалк на Афон з канкрэтнай мэтай — прывесці адтуль святароў для будучага хрышчэння Літвы, але з-за ваенных перашкод вярнуўся назад.

Паверыў Даніла былому князю і тады, калі той выказаў жаданне заснаваць каля Наваградка манастыр. У 1258 годзе Войшалк з манахамі, набранымі ім у Палонінскім манастыры, зноў у Наваградку. На самай мяжы з Літвой ён засноўвае манастыр і адначасова ўважліва сочыць за падзеямі на Наваградчыне. Для яго не сакрэт, што наваградцы не задаволены князем Раманам. Удзел Наваградка ў вайсковых авантурах Данілы Галіцкага (у 1255 годзе наваградцы хадзілі разам з галіцка-валынскімі войскамі на Яцвязь; у 1258-ым — на Кіеў супраць татараў) не толькі не адпавядаў інтарэсам наваградцаў, але і прыносіў ім людскія страты. Дый давялося несці цяжар «волі татарскай», якою было заярэмлена Галіцка-Валынскае княства. Войшалк мог сустракацца — і, верагодна, не раз гэта рабіў — з прадстаўнікамі наваградскага баярства і ведаў, што ў Наваградку чакаюць яго. Але, рыхтуючыся да паўстання супраць Данілы Галіцкага, ён цвяроза ацэньваў свае сілы — іх не хапала, патрэбна была дапамога. І ён знайшоў саюзніка — полацкага князя. Можа, Таўцівіл не пайшоў бы на саюз з сынам свайго непрымірымага ворага, але палачанаў непакоіла распаўсюджанне ўлады Галіцка-Валынскага княства на Наваградак і Літву, і ён як баявы князь Полацкай рэспублікі вымушаны быў выконваць насуперак сваім асабістым інтарэсам волю веча.

Зноў Войшалк усё разлічыў дакладна. Ён не мог не ведаць аб будучым паходзе мангола-татарскага войска Бурундая на Паўднёва-Заходнюю Русь і разумеў, што ў такі нялёгкі час Данілу Галіцкаму будзе не да Наваградка. Незадоўга да паходу Бурундая Войшалк пакідае манастыр і бярэцца за зброю. Аднак і ў свеце Войшалк не забываўся пра свой манаскі чын. Як піша ў сваёй «Хроніцы» Ф.Сафановіч: «Стаўшы вялікім князем Літоўскім, Войшалк жыў набожна ў чэрнечым законе, у княжых адзежах ходзячы, насіў заўсёды клобук на галаве»[3]. Выпадак у гісторыі выключны — на чале дзяржавы стаў манах-князь.

З Полацка прыбывае з дружынай Таўцівіл. Удвух Войшалк і Таўцівіл авалодалі Наваградкам. Пасля чатырох гадоў прыніжэння, змірэння са сваім становішчам, прытворства Войшалк зноў сеў на наваградскі пасад. Толькі часу ні для радасці, ні для ўрачыстасцей у яго няма. Раз'юшаны Даніла Галіцкі рушыў з войскам на Наваградскую зямлю. Войшалк і Таўцівіл, не ўступаючы з ім у сечу, умела манеўруюць, заблытваюць сляды. І Даніла ніяк не можа знайсці іх. Ён захапіў Ваўкавыск, паслаў атрад на Зэльву, а сына Льва — на Гародню. Войшалк, так і не ўступіўшы з Данілам Галіцкім у бой, захаваў сваю дружыну ад разгрому і выйграў час. У Паўднёва-Заходнюю Русь прыйшло войска Бурундая. Даніла Галіцкі вымушаны быў выводзіць войскі з Наваградчыны і слаць іх па загаду Бурундая на Літву і Нальшчаны.

Вызваленне Наваградка з-пад улады галіцка-валынскіх князёў з'явілася пачатковым этапам у планах наваградскіх бояраў стварыць сваю моцную дзяржаву. Наступны крок — заваёва Літвы. Першая спроба яе заваёвы закончылася няўдачай. Сумны вопыт стаў добрым настаўнікам наваградскаму баярству. Ранейшых памылак яно не паўторыць. На сваёй скуры адчулі наваградцы, што значыць не ўлічыць палітычнай кан'юнктуры, не прадбачыць наперад развіццё падзей, паспяшыць. Цяпер яны былі мудрэйшыя.

Не ўсё ў палітыцы вырашае зброя. Хіба ўменне сыграць на супярэчнасцях паміж тваімі суседзямі, перацягнуць на свой бок будучага ворага, пасварыць саюзнікаў не з'яўляецца сілай, якая можа прынесці болей плёну, чым зброя? Яшчэ якой сілай! Гэта і возьме на ўзбраенне Наваградак у сваёй новай палітыцы, а Войшалк яе бліскуча ажыццявіць на справе.

Пасля Міндоўгавай смерці жамойцкі князь Транята захапіў уладу «во всей земле Литовской и Жемоти». Але ён не мог адчуваць сябе ў бяспецы, ведаючы, што ў Полацку і Наваградку сядзяць законныя прэтэндэнты на Літву. Таму Транята і вырашыў паасобку расправіцца і з полацкім, і з наваградскім князямі. Ён запрасіў Таўцівіла да сябе дзяліць «зямлю и добыток Миндовгов». У Полацку вырашылі, што надышоў час дзейнічаць, забіць рукамі Таўцівіла Траняту і далучыць Літву да Полаччыны. Магчыма, на гэтае рашэнне паўплывала і жаданне Войшалка перадаць Таўцівілу «ўсё права сваё прыроджанае, як хрысціяніну і брату, у супольнай Рускай веры, калі б забіў Траняту»[4]. Каб падтрымаць свайго князя і дапамагчы яму расправіцца з Транятам, разам з Таўцівілам у Літву адправілася цэлая світа полацкіх бояраў. Цяжка сказаць, што вымусіла баярына Пракопія выдаць Траняту намеры палачанаў. А той не стаў марудзіць. Апярэдзіўшы Таўцівіла, ён забіў яго і па-

ланіў полацкіх баяраў. Перад Полацкам была пастаўлена ўмова — прыняць да сябе залежнага ад Траняты князя, а ўзамен палонныя баяры атрымаюць волю. Выбару не было — Полацк згадзіўся. Транята яшчэ дамагаўся выдачы Таўцівілавага сына, але палачане адмовілі яму ў гэтым і дапамаглі таму ўцячы ў Ноўгарад.

Іншы ход падзей падае Кацярына II. Палачане вывезлі сына Таўцівіла Святаслава ў Ноўгарад, дзе ён хрысціўся пад імем Міхаіл. А пасланых Транятам літоўцаў выгналі. Такая трактоўка падзей падаецца больш праўдападобнай[5].

Цяпер, калі Полацк выйшаў з палітычнай барацьбы, Транята мог расправіцца і з Войшалкам. Аднак Войшалк аказаўся і хітрэйшы, і прадбачлівейшы за літоўскага ўладара. Ён не толькі не паехаў у Літву, але, больш за тое, — пакінуў Наваградак і адправіўся ў Пінск, у Ляшчынскі манастыр. Зноў надзеўшы манаскую расу і клобук, Войшалк збірае войска і, верагодна, вядзе перамовы з літоўскімі феадаламі. Трэба думаць, што не без ягонага ўдзелу сярод літоўскай знаці, якая была незадаволена жамойцкай уладай, узнікае змова супраць Траняты. Былыя Міндоўгавы слугі забілі Траняту. Атрымаўшы вестку пра гэта, Войшалк з пінскай дружынай выступае да Наваградка, дзе «съвкупи около себя вои отца своего и приятели»[6], г.зн. наваградскую дружыну, абапіраючыся на якую Міндоўг у свой час «зане Литву».

Ніканаўскі летапіс падае паход Войшалка на Літву як крыжовы паход супраць язычнікаў: «Господи Боже виждь неправду сію, и прослави имя твое, да не похваляются беззаконіи в нечестіи своем, и даждь мне помощь и силу изыти на них за имя твое святое, яко прославится имя твое святое»[7].

Як і спадзяваліся ў Наваградку, Войшалка прынялі на Літве як законнага ўладара: «Литва же вся прияше с радостью своего господитича»[8]. Але з «радостью» да Войшалка ставіліся не ўсе. І былы манах, забыўшыся на хрысціянскую літасць, з жорсткасцю «поча вороги свои убивати, изби их бесчисленное множество, а друзии разбегошося камо кто видя»[9].

Жорсткасць Войшалка да сваіх аднапляменнікаў падкрэслівае і Наўгародскі летапіс. «Иядъ на поганую Литву и победи я, и стоя на земли ихъ все лето, тогда оканьным възда Господь под делом ихъ; всю бо землю ихъ оружіем поплени»[10]. У гэтым паведамленні Войшалк выступае як жорсткі заваёўнік. Магчыма, гэтая жорсткасць была выклікана не толькі палітычнымі меркаваннямі, але і жаданнем сілай расправіцца з паганствам.

Расправіўшыся з унутранымі ворагамі сваёй дзяржавы, Войшалк зрабіў захады, каб забяспечыць мір з суседзямі, унік-

нуць вайны з імі. Ён вырашыў перацягнуць на свой бок Ордэн. З палону былі вызвалены хрысціяне, якіх пасля адрачэння ад хрысціянства звязеніў Міндоўг і якіх трымаў у палоне заўзяты язычнік Транята. Да магістра ў Рыгу прыбыў Войшалкаў пасол. Новы ордэнскі магістр Конрад адразу ацаніў тую выгоду, якую прынясе крыжакам мір з Войшалкам. Жамойць зноў заставалася без саюзніка, і можна было прыступаць да яе заваёвы. За дапамогу ў вайне Войшалк саступаў Ордэну Жамойць.

Забяспечыўшы мір з Ордэнам, Войшалк шукае магчымасць паразумецца з Галіцка-Валынскім княствам. Калі б не зрабіў ён гэтага, магло б паўтарыцца тое, што адбылося пры Міндоўгу: тады Даніла Галіцкі скалаціў супраць Наваградка кааліцыю і пайшоў на яго вайной. Войшалк прызнаў сябе васалам князя Васількі Берасцейскага. Як ён і спадзяваўся, галіцка-валынскія князі забыліся на яго вераломства і, прывабленыя перспектывай валодаць Наваградскай зямлёй і Літвой, згадзіліся на мір.

Галіцка-Валынскае княства ўжо не тая моцная дзяржава, якою яна была раней. Супярэчнасці паміж яго ўдзельнымі князямі падрывалі моц княства, і яно ўсё болей трапляла пад уладу Залатой Арды. Так, па загаду мангольскага хана Даніла Галіцкі зруйнаваў крапасныя сцены сваіх гарадоў. Утрымаць жа пад сабой Наваградак Галіцка-Валынскае княства не мела сіл. На гэта і разлічваў Войшалк. Ён прызнаў над сабою ўладу Васількі, забяспечыў мір з варожай дзяржавай, атрымаў ад яе вайсковыя сілы для заваёвы новых земляў і ўтрымання іх пад сваёй рукой. На наваградскі пасад Войшалк запрашае «дапамагаць яму ўладарыць» Шварна. Калі ў 1254 годзе Войшалк асцерагаўся перадаваць Наваградак жанатаму з ягонай сястрой Шварну, дык цяпер трывогі не было: Шварн не меў дзяцей, і пасля яго смерці Войшалк зноў мог стаць паўнапраўным гаспадаром у сваёй дзяржаве на Наваградчыне і Літве.

З вайсковай дапамогай Шварна і Васількі Войшалк у 1264 годзе напаў на Дзяволтву і заваяваў яе. Гэтакі лёс напаткаў і другую балцкую зямлю — Нальшчаны з яе сталіцай Крэва (паўночны захад сучаснай Беларусі і крайні паўднёвы ўсход сучаснай Летувы). Як у Літве, так і на новых заваяваных землях наваградскі князь жорстка расправіўся з мясцовымі феадаламі, «вороги своя избив»[6]. Пасля заваёвы Дзяволтвы і Нальшчан Войшалк вярнуўся ў Наваградак. Захоп Літвы, як слушна адзначыў М.Ермаловіч, «быў адначасова і ўдарам па Полацку, які пасля страты Ніжняга Падзвіння страціў сваю апору і ў гэтых землях. Каб карыстацца і ў далейшым матэры-

яльнымі рэсурсамі і вайсковай сілай балцкіх земляў, Полацк павінен быў прызнаць «волю» Наваградка. У гэтым і заключаўся стратэгічны план Войшалка»[11]. Ужо ў грамаце полацкага князя Ізяслава (прыблізна ў 1265 годзе) прызнаецца «воля» Войшалка над Полацкам.

Аб'яднанне Войшалкам вакол Наваградка Літоўскай і Нальшчанскай земляў, а таксама Дзяволтвы, саюз з Пінскам і Полацкам — усё гэта і было пачаткам утварэння Вялікага княства Літоўскага. Першай сталіцай гэтай дзяржавы стаў Наваградак, а яго герб — коннік на белым кані з мячом у руцэ — дзяржаўным гербам Вялікага княства. З тае прычыны, што Наваградак, які ўзнік на землях старажытнай Літвы, і сама Літва былі ядром новай дзяржавы, яна і атрымала назву Вялікае княства Літоўскае.

Утварэнне Вялікага княства Літоўскага — гэта вынік эканамічнага, палітычнага і культурна-этнічнага збліжэння і аб'яднання беларускіх і балцкіх земляў. Дзяржава з'яўлялася перш за ўсё беларускай, і таму ў ёй панавалі беларуская мова, беларуская культура, беларускае права.

Няшмат паспеў зрабіць Войшалк на велікакняжацкім пасадзе. У 1266 годзе ён разам з князем драгічынскім і луцкім Шварнам удзельнічаў у паходзе на Польшчу. Аб'яднанае руска-літвінскае войска паваявала ваколіцы гарадоў Скарышава, Ваўжы і Таржка. Мабыць, ініцыятарам гэтага паходу выступіў Войшалк, бо Шварн, апраўдваючыся перад польскім каралём Баляславам, заявіў: «Не я, але Літва ваявала». Баляслаў гэтаму не здзівіўся: «На Літву не скарджуся, бо яны з намі не маюць пакою»[12]. Сапраўды, пасля таго, як Польшча і Мазовія сталі спрабаваць захапіць яцвяжскія землі, «пакой» з Літвой скончыўся. І Міндоўг ваяваў з-за Яцвязі з Мазовіяй, а вось цяпер і Войшалк арганізаваў паход з мэтаю заваёвы яцвяжскіх земляў[13]. Праўда, жаданай мэты ён не прынёс, аднак раскрыў Войшалкавы задумы — далучыць да Літвы і Яцвязь.

Пасля таго як Войшалк «победи Литву», ён задумаў хрысціць яе. Ніканаўскі летапіс паведамляе, што Войшалк «многих кресги, и церкви и монастыри воздвише»[14]. Рэлігія разглядалася ім не толькі як магчымасць ідэалагічнага ўплыву на паганскае насельніцтва Літвы, але і як сродак асіміляцыі балтаў. Ужо пры ім вызначыўся адзін з галоўных напрамкаў у палітыцы ўладароў Вялікага княства — асіміляцыя балтаў па прынцыпу «адна дзяржава — адзін народ».

З мэтай ахрысціць Літву Войшалк у 1265 годзе звяртаецца з просьбай у Пскоў прыслаць яму святароў, бо яны больш за іншых знаёмыя з мовай і звычаямі Літвы. Войшалк так і не

дачакаўся іх. У гэты час пскоўскім князем быў вораг ягонага бацькі — нальшчанскі князь Даўмонт. Не дачакаўшыся адказу з Пскова, Войшалк адправіўся ў былы Палонінскі манастыр, каб набраць там манахаў.

А на велікакняжацкім пасадзе пакінуў Шварна. Той адгаворваў Войшалка ад вяртання ў манастыр, але ён адказаў: «Согрешил есмь много перед Богом и человеки, ты княжи, а земля ть опасена»[15]. Ён зноў надзеў клобук і расу, каб дзейнічаць як манах, бо, мабыць, асцерагаўся помсты князя Льва Данілавіча за тое, што «дал землю Литовскую брату яго Шварновы». Але той усё ж даведаўся аб прыездзе Войшалка ў Галіцка-Валынскае княства і паслаў вестуна да Васількі: «Хотел бых снятися с тобою, абы туто и Войшелк был!..» Васілька паслаў да Войшалка: «Прислал ко мне Лев, а быхомся сняли; а не бойся ничего же»[16]. Войшалку нічога не засталося, як ехаць да свайго «сюзерэна» ва Уладзімір-Валынскі. Паводле Іпацьеўскага летапісу, Леў Данілавіч і Войшалк сустрэліся ў доме нейкага немца Марколта, які паклікаў іх да сябе на абед. Госці селі «обедати и пити и веселитися». Васілька, напіўшыся, паехаў спаць у манастыр, у якім спыніўся і Войшалк. Следам сюды прыехаў Леў Данілавіч і мовіў: «Куме! Напъемся»[17]. За хмельнымі чашамі і абудзіліся ў Льва даўнія крыўды на Войшалка. Галіцкі князь, відаць, пачаў пагрозамі патрабаваць ад Войшалка перадачы яму Наваградка. На гэта Войшалк не згадзіўся, чым выклікаў у Льва гнеў, і той у п'яным шаленстве выхапіў шаблю дый засек Войшалка.

Так трагічна і неспадзявана абарвалася жыццё гэтага чалавека. Адбылося гэта 12 студзеня 1267 года.

Іншую версію забойства Войшалка падае «Хроніка Літоўская і Жамойцкая». Паводле хронікі, пасля смерці Данілы ягоныя сыны мячом пачалі дзяліць бацькоўскую спадчыну. Князь Леў Данілавіч захапіў Шварнаў удзел — Драгічынскую зямлю. Шварн звярнуўся па дапамогу да саўладальніка Наваградскага пасада. І Войшалк не прамінуў выкарыстаць спрыяльны момант нанесці ўдар па Галіцка-Валынскаму княству. На чале вялікага войска ён заняў Драгічынскую і Берасцейскую землі і рушыў на сталіцу Валыні Уладзімір. Тут ужо Льву Данілавічу было не да варажнечы са сваякамі, ён адразу памірыўся з імі. Але ясна бачыў, што сіл супрацьстаяць Войшалку ў яго не хапае, а таму прыбегнуў да аблудлівасці. Праз пасрэдніцтва князя Уладзіміра Леў запрасіў Войшалка на перамовы. Шварн і Васілька «верою своею» абяцалі Войшалку «безпеченство». І Войшалк паверыў іх клятве, спыніў сваё войска і з набліжонымі прыехаў ва Уладзімір. Вось у манастыры святога Міхай-



Леў Данілавіч. *Старажытная гравюра*

лы п'яны князь Леў Данілавіч забіў Войшалка, рассекшы шабляй яму галаву. Гэта быў не хвілінны гнеў аслепленага злосцю чалавека, а загадзя спланаваная змова супраць літвінскіх паслоў, бо «гасціныя» гаспадары ў тую ж ноч пасеклі іх, парэзалі сонных і бяззбройных. Такая нябачная раней аблудлівасць абурыла Васільку і Шварна. Вечная ганьба лягла на дом Данілавічаў, і Бог пакараў іх. Не прайшло і стагоддзя, як іх род выра-

дзіўся, спадчына стала здабыткам чужынцаў, а імёны забыліся. Яшчэ адзін яскравы прыклад містычнай сувязі паміж злачынствам і пакараннем. Рана ці позна любое злачынства будзе пакарана ці па законах зямных, ці па законах Божых.

Падобныя звесткі пра забойства Войшалка падае ў сваіх запісках і Кацярына II. У 1267 годзе ўчыніўся мяцеж паміж сынамі князя вялікага Данілы Раманавіча Львом і Раманам. Даведаўшыся пра гэта, Войшалк, сабраўшы войска з Літвы, Жамойці і Яцвягаў, пайшоў на Валынь, жадаючы ўзяць Уладзімір, але быў забіты ад князя Льва Данілавіча[18]. Трэба прызнаць гэтыя звесткі імператрыцы кампіляцыяй з «Хронікі Літоўскай і Жамойцкай» або з хронікі М.Стрыйкоўскага, дзе яна першапачаткова і з'явілася. Не бачыцца логікі ў дзеях Войшалка, які адышоў ад свецкіх спраў. Навошта яму быў патрэбны Уладзімір? Хоць можна і прызнаць праўдзівасць гэтай падзеі, але растлумачыць па-іншаму. Войшалк пакінуў манастыр, каб падтрымаць у міжусобнай барацьбе Рамана.

А мне больш падабаецца версія, што Войшалк зняў рызу «обещася Богу на 3 лета» (як кажа Наўгародскі летапіс), каб выканаць сваю місію з'яднаць Наваградак і Літву ў адну дзяржаву. А выканаўшы яе, вярнуўся да служэння Богу, бо, можа, разумеў усю мітуслівасць гэтага свету і бачыў, што за ўладу ў ім трэба плаціць чужой крывёю і сваім жыццём.

Смерць Войшалка ўжо нічога не вырашыла: Вялікае княства не загінула. Наваградскі князь Шварн абараніў новую дзяржаву ад пасягнення галіцка-валынскіх заваёўнікаў. У бітве на рацэ Ясельдзе наваградскае войска дазвання разграміла галіцка-валынскае. Пераможцам Шварн уехаў у Пінск і Тураў. Пасля смерці бяздзетнага Шварна ўладу ў Вялікім княстве ўзяў у свае рукі князь Тройдзень. Сеўшы ў Наваградку, ён адбіў усе спробы галіцка-валынскіх князёў авалодаць Вялікім княствам Літоўскім. Закладзены Войшалкам падмурак аказаўся трывалым. На ім і пабудавалі Войшалкавы наступнікі буйнейшую ў Еўропе дзяржаву, якая стала на многія стагоддзі агульным домам для літвінаў, жамойтаў і ўкраінцаў.

СЛАЎНЫ ВАЛАДАР





ТРОЙДЗЕНЬ
(?—1282)
Гравюра з «Хронікі Еўрапейскай Сарматыі» А.Гваньіні. ***1578 г.***

ТРОЙДЗЕНЬ



ельмі мала захавалася звестак пра Тройдзеня* — князя, які пасля Шварна падняўся на велікакняжацкі наваградскі пасад. Можна было б звярнуцца да летапісаў XVI стагоддзя, але яны так збліталі падзеі, якія адбываліся пры Міндоўгу, з падзеямі часоў Тройдзеня, што не выклікаюць даверу. Толькі з малой доляй дапушчэння можна ўслед за імі казаць, што Тройдзень быў малодшым сынам вялікага князя Нарымонта (гістарычныя крыніцы не ведаюць такога князя), а яго братам — князь Гольша, легендарны продак князёў Гальшанскіх з пакалення рускага.

Паводле летапісаў, Нарымонт пасадзіў Тройдзеня князем над яцвягамі. Новы валадар «зарубил город, и назовет его Райгород»[1]. Нельга адмаўляць, што ў 60-ых гадах Наваградак далучыў да сваіх уладанняў яцвяжскія землі па рацэ Бобр, і Тройдзень быў тут наваградскім намеснікам**. На гэта, дарэчы, указвае і летапіс, кажучы, што Тройдзень «прибавил ятвяг»[2]. Красамоўны факт: горад, які нібыта заснаваў Тройдзень, насіў славянскую назву.

У Іпацьеўскім летапісе не паведамляецца, што Тройдзень захапіў уладу, значыць, ён меў законнае права на яе, бо, пэўна, належаў да роду Рынгольдавічаў. Наўрад ці ён быў сын Таўцівіла. Вядома, што Таўцівілаў сын, ратуючыся ад Траняты, уцёк у Ноўгарад. Магчыма, ён быў яшчэ малалетнім, а значыць, не мог заняць княжацкі пасад. У такім становішчы адзіным, хто меў права на спадчыну Войшалка, мог быць сын яго стрыечнага брата Едзівіда. Як і Таўцівіл, Едзівід быў сын Даў-

---

*Яго імя, пэўна, паходзіла з кельцкай мовы і азначала «Здольны валадар» або «Слаўны валадар». (Урбан П. Старажытныя ліцьвіны. С. 203.)

** Т.Нарбут лічыў Тройдзеня князем Дайноўскім, які сядзеў у Лідзе. (Narbutt T. Dzeje narodu litewskiego. T. IV. S. 285.)

спрунка, старэйшага брата Міндоўга. У Іпацьеўскім летапісе Едзівід упамінаецца толькі раз, у сувязі з тым, што Міндоўг выгнаў яго разам з Таўцівілам з Літвы. Паколькі Таўцівіл названы першым, то, пэўна, Едзівід быў яго малодшы брат. У вайне з Міндоўгам ён актыўна не ўдзельнічаў, а таму больш не ўзгадваўся ў летапісе. Магчыма, ён неўзабаве памёр ці загінуў. Канечне, калі б ён быў жывы, дык пасля смерці Войшалка і Шварна павінен быў стаць вялікім князем. Пэўна, апеку над дзецьмі Едзівіда ўзяў Таўцівіл. Яны разам з ім жылі ў Полацку. Сведчаннем гэтага можа служыць тапонім Тройдзевічы каля Полацка[3]. Патранамічны суфікс «віч» паказвае, што гэты тапонім утвораны ад імя Тройда. Яно магло быць кароткай формай імя Тройдзень. Такая форма гэтага імя (Трэйда) сустракаецца ў пісьмовых крыніцах, прысвечаных мазавецкаму князю Тройдзеню, сыну Тройдзеневай дачкі. Магчыма, і Тройдзеня звалі коратка — Тройда. Паселішча, дзе жыў Тройдзень, атрымала назву Тройдзевічы.

Яшчэ адзін факт указвае на сувязь Тройдзеня з Полацкам — гэта імя яго дачкі Прадзіслава. Прадзіслава, або Прадслава, пашыранае імя ў полацкіх княгінь. Нагадаем Прадславу, дачку Рагнеды, свецкае імя Ефрасінні Полацкай — Прадслава. Выказывалася думка, што княгіня Прадслава, згаданая ў «Аповесці мінулых гадоў» пад 945 годам, правіла ў Полацку. Магчыма, і Тройдзень даў дачцэ імя Прадзіслава ў гонар прабабкі. Не выключана, што Прадзіслава мела і другое імя, Гаўдземунда (звернем увагу на яго гоцка-скандынаўскае паходжанне), а пры хрышчэнні атрымала імя Сафія.

Незразумела, чаму Тройдзень, калі верыць Іпацьеўскаму летапісу, не хрысціўся, у той час як яго браты Серпуцій, Лесій і Свелкеній былі хрысціяне. Магчыма, гэта тлумачыцца тым, што ён да вялікага княжання правіў у язычніцкіх яцвяжскіх землях.

Як сын Едзівіда і прадстаўнік старэйшай лініі Рынгольдавічаў Тройдзень меў законнае права на ўладу ў Літве, а як пляменнік Войшалка і Таўцівіла — на ўладу ў Наваградку і ў Полацку.

Распавядаюць летапісы пра тое, што Тройдзень «великие вальки чынил з Ляхи, и з Русю, и з Мазовшаны, и завжды зыскивал и над землями их сильные окрущества чынил»[4]. Што так, дык так — Тройдзень нямала паваяваў з ворагамі беларускай дзяржавы. Прыступы нянавісці выклікала ягонае імя ў крыжакоў, якія называлі яго Хіжым. А колькі жоўці і злосці выліў у яго адрас галіцка-валынскі летапісец! «Окаяньный и безаконьный, проклятый, немилостивый Тройден, его же безаконья не могохом псати срама ради». Летапісец параўноў-

ваў Тройдзеня з Ірадам і Неронам, не забыўшы дадаць, што ён «многа злейша того безаконья чиняша»[5], што ён ледзь не вораг чалавецтва, ледзь не ўвасабленне д'ябла. Летапісец хацеў хоць гэтак адпомсціць таму, хто паклаў канец дамаганням галіцка-валынскіх князёў на Наваградскую зямлю. Аднак словы летапісца наводзяць на думку і пра тое, што наваградскі князь быў чалавекам уладарным, рашучым і хітрым, які асабліва не выбіраў сродкі для дасягнення сваіх мэтаў і руку меў цяжкую, моцна трымаў у ёй ганарлівых князёў.

Войны для яго былі з'явай звычайнай: «...весь живот свой до войны и крови розляне простовал», — кажа «Хроніка Літоўская і Жамойцкая»[6]. Той трывожны час і вымагаў такога ўладара: крыжакі, галіцка-валынскія войскі, манголы, свае князі, якія пасля смерці Войшалка паднялі галаву, пагражалі незалежнасці Вялікага княства Літоўскага. Толькі цвёрды душой, мудры розумам, смелы ў брані мог адбіць варожую пагрозу.

Да таго як Тройдзень падняўся на велікакняжацкі пасад, яго імя звонам пераможных мячоў гучала на Літве. Паводле «Хронікі Літоўскай і Жамойцкай», ён з вялікім войскам спустошыў Мазовію і Холмскую зямлю. Невядома, як дамогся Тройдзень улады: ці сілай, ці мірным шляхам. Але ў 1270 годзе ён «нача княжити в Литве».

Дванаццаць гадоў уладарыў Тройдзень. Для стагоддзяў — імгненне. Аднак і гэтага імгнення хапае, каб знікла ў нябыт не адна дзяржава, здавалася б, учора яшчэ моцная і непераможная, каб у попел ператварыліся яе квітнеючыя гарады. Дзе Егіпет? Дзе Месапатамія? Дзе дзяржава ганарлівых рымлян? Дзе Хазарыя? Дзе Волжская Булгарыя?

У гады княжання Тройдзеня старажытнай беларускай дзяржаве выпалі цяжкія выпрабаванні. Расправіўшыся з прусамі, земігаламі, выйшлі да межаў Вялікага княства крыжакі і ўжо ў марах дзялілі яго землі. Яны вялікімі дарамі выпрасілі ў чэшскага караля Атакара права валодаць Галіндзіяй, Яцвязю і Літвой. На радасць крыжакам папа зацвердзіў гэтую дамову. У сваю чаргу папа Клемент IV паслаў Атакару булу, у якой заклікаў караля дзеля дабра хрысціянства заваяваць Літву і па свайму выбару каранаваць караля з умовай захавання наданняў Ордэну. Так што на землі Літвы з'явіўся яшчэ адзін прэтэндэнт.

У прадсмяротнай агоніі, абапіраючыся на золатаардынскія тумены, двойчы спрабавала Галіцка-Валынскае княства пакончыць з Наваградкам. Калі б не выстаяла ў гэты час Вялікае княства Літоўскае, калі б перамаглі яго ворагі, які лёс чакаў бы нашых продкаў? Лёс полаўцаў? Прусаў? Яцвягаў?

З самага пачатку свайго княжання Тройдзеню прыйшлося браць меч. Упартая барацьба распачалася паміж ім і валынскім

князем Уладзімірам Васількавічам. І хоць ваявалі яны «не великими ратями», але крыві пралілі нямала. Загінулі Тройдзеневы браты Лесій і Свелкеній. З малых іскраў гатовы быў успыхнуць агонь вялікай вайны. І ён успыхнуў. Зусім нечакана Тройдзень пасылае гарадзенскую дружыну на Драгічын-на-Бузе, які належаў галіцкаму князю Льву Данілавічу. А з ім жа Тройдзень, «живаше во величе любови, шлюче многа дары межи собою»[7]. Чым жа растлумачыць дзеі вялікага князя? Тым, што «забыв любви Львови»? Тады трэба прызнаць, што на наваградскім пасадзе сядзеў валадар, які не ведаў, што тварыў. Было ж ясна, што напад на Драгічын парушыць мір паміж Наваградкам і Галічам. Але ўсё ж паслаў гарадзенцаў, і тыя ў ноч на Вялікдзень захапілі горад, «избиша вся и мала и до велика».

Не трэба літаральна верыць у летапіснае паведамленне. Летапісец быў верны традыцыі паказваць ворагаў ягонай зямлі як аспідаў няміласцівых, прагных да крыві хрысціянскай. Якой жорсткай ні была расправа над драгічынцамі, але наўрад ці ўсе яны загінулі пад шаблямі гарадзенцаў. Хутчэй за ўсё смерць напаткала ваяроў і гараджан, якія са зброяй абаранялі свой горад. Усіх астатніх вывелі ў палон.

Ці не быў напад на Драгічын помстай Льву Данілавічу? Аб чым маўчыць летапіс, чаго не сказаў летапісец? А мо не ведаў усіх палітычных таямніц галіцкага князя? Даць загад на такое жорсткае пакаранне драгічынцаў Тройдзень мог у гневе на Льва Данілавіча за здраду, за патаемную падтрымку Уладзіміра Васількавіча. Калі згадаць пра злахітрасць і аблуднасць галіцкага князя, які ўжо дагэтуль парушыў святы закон гасціннасці — забіў вялікага князя Войшалка, — дык можна ўявіць, што і з Тройдзенем ён збіраўся расправіцца не ў адкрытым баі, а хітрасцю і ашуканствам, ударам у спіну. І вось угневаны Тройдзень паслаў на Драгічын свае войскі.

А гэтага толькі і чакаў Леў Данілавіч. «И посла в татары ко великому царю Меньгаут-Мереви, прося себе помочи у него на Литвоу»[8], — паведамляе Іпацьеўскі летапіс. Галіцкаму князю карцела вымусіць Тройдзеня пачаць з ім вайну. Цяпер галіцкія паслы палохаюць ардынскага валадара Тройдзенем: маўляў, хоча захапіць ханскі улус. Разлік правільны. Хан шле да Льва Данілавіча войска пад зверхнасцю Ягурчына, а разам з тым прымушае ісці на Літву і князёў, што знаходзіліся ў «волі татарскай»: Рамана Бранскага, Глеба Смаленскага і «иные князии заднепровские». Да гэтай кааліцыі далучыліся тураўскія і пінскія дружыны. Леў Данілавіч прагне захапіць Літву разам з Наваградкам, дзе можна было б набраць нямала дарагога скарбу, каб ім выплочваць ардыншчыну. Лядашчая дзяржава галі-



Н.Орда. Белая вежа. *1877 г.*

цка-валынскіх князёў, якая ўжо дыхала на ладан, яшчэ мелася пажывіцца за чужы кошт, каб выратавацца ад загубы.

Ды не ўсё так адбылося, як хацелася Льву Данілавічу. Ні Раман Бранскі, ні Глеб Смаленскі, ні князі задняпроўскія не збіраліся класці свае галовы за галіцкія інтарэсы. Глеб і Раман не спяшалі ў сечу і адсталі ад асноўных войскаў. А тураўскія і пінскія князі ўвогуле ўхіліліся ад паходу. Мсціславу Холмскаму прыйшлося са сваімі ваярамі караць аслушнікаў, плюндраваць Палессе. Удар, які, паводле задумы Льва Данілавіча, павінен быў стаць смяротным для Вялікага княства, мог яшчэ атрымацца моцным, але не атрымаўся.

Саюзнікі падышлі да Наваградка, акружылі яго і сталі чакаць падыходу смаленска-бранскіх дружын. І тут Леў Данілавіч не вытрымаў. Навошта з кімсьці дзяліцца ворапам* і здабыткам? У сваёй неспатольнай празе здабычы князь дзейнічаў не як дзяржаўны муж, а як звычайны таць з лясных гушчароў. «Лев же лесть учини межи братью своею, оутаивше Мстислава и Володимера взя окольный град»[9] — так апавядае

---

* Ворап — нарабаваная здабыча.

нам Іпацьеўскі летапіс пра гэты «подзвіг» галіцкага князя. І не словы падтрымкі, ухвалы, нават зайздрасці, а абурэння і гневу зляталі з вуснаў князёў і татарскіх важароў, калі яны даведаліся аб дзеяннях Льва Данілавіча. Хаўруснікі так перасварыліся між сабою, што ўжо не маглі дамовіцца аб далейшых дзеях супраць Літвы і з «гневом про Льва» вярнуліся назад.

Так закончыўся гэты паход. Нібыта пашчасціла Тройдзеню: без бою здабыў перамогу. Дзень за днём мацаваў ён Вялікае княства Літоўскае, жорстка распраўляўся з праціўнікамі ўнутранага адзінства, што марылі аб самастойнасці і гатовы былі ў міжусобных спрэчках і войнах аслабляць дзяржаву. Уцёк у Лівонію Суксе, так і не дамогся самастойнасці Нальшчанаў, якія канчаткова зліліся з Літвой у адзіны палітычны арганізм. Паступова падпадае ў залежнасць ад Наваградка і другая балцкая зямля — Аўкштайція.

Менавіта пры Тройдзені на аснове беларускіх вайсковых традыцый — знакамітай «Пагоні» — складваецца сістэма абароны Вялікага княства ад варожых нашэсцяў. На дарогах, што вялі з суседніх краін, рабіліся засекі і завалы дрэў, насыпаліся земляныя валы. Дзень і ноч на памежных заставах несла службы варта. Пры з'яўленні ворага падаваўся вогнішчамі знак наступнай заставе. Тут жа пра небяспеку папярэджвалі сёлы і гарады. Мужчыны браліся за зброю: удзел у вайне з ворагам быў абавязкам кожнага з іх. Тройдзень распачаў справу, якую пасля яго працягнулі Віцень і Гедымін, Альгерд і Вітаўт, — будаваць замкі. Першая мураваная вежа ўзведзена ў Наваградку, «столп бо без камен» паўстаў у Гародні.

Падумаў Тройдзень і пра «камунікацыю». Уцёкшых ад крыжакоў прусаў князь наўмысна рассяляе ля перапраў цераз Нёман, прызначыўшы ім павіннасць будаваць масты. Ён стварае добра ўзброенае і навучанае ратнай справе войска, якое ходзіць на Валынь, Падляшша, Мазовію, Лівонію.

Мацнела, падымалася з попелу былых пажарышчаў, поўнілася жыццёвай сілай Нёманская зямля.

Леў Данілавіч яшчэ спадзяецца скарыць Вялікае княства Літоўскае. Не атрымалася раз, можа, дасць Бог перамогу за другім разам. Ён не складвае зброі і разам з Уладзімірам Васількавічам нападае на Турыйск і на Слонім. У адказ Тройдзень пасылае свайго брата Серпуція «воевать около Камене». Не, на доўгую вайну ў галіцка-валынскіх князёў не хапае сілаў, патрэбна перадышка. Але ці надоўга заключаны мір паміж імі і Тройдзенем? Разумеюць, што ненадоўга. Вялікі князь спяшаецца з войскам пад Дынабург (сучасны Даўгаўпілс), дзе крыжакі паспешліва ўзвялі на мяжы з Літвой і Полацкай зямлёй крэпасць. А ў Льва Данілавіча іншы клопат: ён рыхтуецца да

новага паходу на Наваградчыну. Адправіліся ў Залатую Арду паслы са скаргамі на Літву: зноў яна зарыцца на ханскі улус. Уладзімір Васількавіч паставіў на мяжы з Вялікім княствам новы град-крэпасць Камянец. «Градоруб» Алекса ўзвёў славутую Камянецкую вежу.

А тым часам Тройдзень ваюе Дынабург. Здабыць яго нялёгка, бо размешчаны на высокім абрывістым беразе Дзвіны, акружаны мурамі крыжацкі замак амаль непрыступны. І хоць Тройдзень вядзе аблогу па ўсіх правілах тагачасных войнаў, крэпасцю яму не авалодаць. Пабудаваны чатыры вялікія рухомыя вежы для штурму — балісты, штоночы кідаюць на замак камяні. На дапамогу Тройдзеню прыходзяць рускія лучнікі. Імі маглі быць толькі палачане, бо ні ў пскоўскіх, ні ў наўгародскіх летапісах няма ўспамінаў аб паходзе пскавічоў або наўгародцаў пад Дынабург. Можа, пра гэтае полацкае войска паведамляў на берасцянай грамаце, датаванай прыкладна тым часам, наўгародскі пасаднік: «Пришел искупник (выкуплены палонны. — *В.Ч.*) из Полоцка. Сообщает о большом войске. Пришлите же пшеницы для гарнизона»[10]. Тая грамата лепш за ўсе летапісныя паведамленні сведчыць пра нерастрачаную моц Полацка. Адно паведамленне пра вялікае полацкае войска, як бачым, выклікала трывогу ў Ноўгарадзе. Толькі не на Ноўгарад пайшлі палачане, а пад Дынабург.

Чатыры тыдні доўжылася аблога. А пасля гэтага Тройдзень павёў сваё войска з-пад сцен Дынабурга. Не, гэта не прызнанне бяссілля. Калі б у Тройдзеня быў час, ён узяў бы замак на змор. А часу якраз і бракавала. На паўднёвых межах гучала бразганне зброі: Леў Данілавіч рыхтаваў сваё воінства ў паход, і трэба было спяшацца сустрэць яго.

Усё ж такі ў 1277 годзе пад Дынабургам атрымана перамога, і важная: над узаемным недаверам паміж літвінамі і наваградцамі, з аднаго боку, і палачанамі — з другога. Не ворагамі адзін аднаму, не праціўнікамі прадсталі яны, а саюзнікамі, у якіх адзін вораг, братамі, што адчуваюць сваю этнічную блізкасць, разумеюць агульнасць лёсу, ведаюць: будучыня не ў раз'яднанні, а ў адзінстве. Пад Дынабургам зроблены яшчэ адзін крок дзвюх беларускіх дзяржаў — Вялікага княства Літоўскага і Полацкай зямлі — да аб'яднання ў адну дзяржаву — Вялікае княства Літоўскае і Рускае. Гэта здарыцца пры вялікім князі Віцені, але ідэя нараджалася ўжо тады, у 1277 годзе.

А Дынабургам Тройдзень усё ж авалодаў. У 1281 годзе ён захапіў Герцыке, адрэзаў Дынабург ад Лівоніі і прымусіў крыжакоў аддаць яму крэпасць узамен захопленага Герцыке.

Галіцкім паслам удалося вымаліць у Залатой Арды войска пад павадырствам ваяводы Мамшына. Разам з мангола-тата-

рамі і галічанамі ў паход на Наваградак выправіліся і валынскія князі. Праўда, замест сябе Леў Данілавіч паслаў сына Юрыя. І зноў гэтае жаданне замест бітваў рабаваць сёлы і гарады, нібыта адзінае, аб чым марылі, дык аб багатай здабычы.

Мамшынава раць адразу накіравалася да Наваградка. А што ж галіцка-валынскія князі? Яны сабраліся ў Бярэсці, дзе і даведаліся, што татары ўжо каля сталіцы Вялікага княства. І што, паспяшалі на дапамогу сваім хаўруснікам? Як бы не так! «Поедем к Новоугродкоу а тамо оуже татарове извоевали все»[11]. І да Наваградка не пайшлі, адправіліся «ко Городкоу» — там татары яшчэ не зваявалі нічога. Але чым бліжэй Гародня, тым болей трывожна на сэрцы ў князёў, каб хто з іх «лесть не учинил». Ужо за Ваўкавыскам луцкі князь Мсціслаў і Юрый Галіцкі, утоіўшыся ад Уладзіміра Васількавіча, паслалі свае дружыны плендраваць гарадзенскія ваколіцы. І, пэўна, няблага папрацавалі. Сп'янеўшы ад удачы, дружыннікі разбілі на ноч стан і забыліся пра варту. Перабежчык паведаміў пра гэта гарадзенцам. А тыя раздумваць не сталі. Тут жа была накіравана дружына прусаў і борцей, якія жылі ў горадзе. «И избиша я все, и дроугим изоимаша и в город ведоша»[12], — паведамляе Іпацьеўскі летапіс. Паранены ваявода Таюма трапіў у палон. Мсціславаў сын, «наг и бос», ледзь уцёк да бацькі.

Раз'ятраныя князі наступным днём сталі палком перад горадам. Толькі гараджане, «аки мертва стояша на забролях города»[13] мужна адбілі штурм. Такога адпору князі не чакалі. Адзінае, што заставалася: прасіць міру, «какао города ими не имати»[14] ды ісці прэч. Так і зрабілі. І князі, атрымаўшы на знак міру палонных, «городу не вспеша ничего же тако возвратиша во свояси»[15]. Так бясслаўна скончыўся паход.

Аднак зімой 1278 года з поўначы рухаўся новы вораг — крыжакі. Вялікае войска — ордэнская брація, дружыны ліваў, лэтаў, земігалаў, куршаў, дацкіх і нямецкіх рыцараў — адправілася ў крыжовы паход. Тройдзень, які, відаць, у гэты час знаходзіўся на Наваградчыне, не змог сустрэць ворага. Усю зіму крыжакі беспакарана рабавалі Аўкштайцію, але кара іх не абмінула. Тройдзень са сваёй дружынай кінуўся па слядах захопнікаў, калі яны са здабычай і палонам вярталіся ў Рыгу. Ужо ў межах Лівоніі, пад Ашэрадэнам, на правым беразе Дзвіны, Тройдзень нагнаў крыжакоў. 5 сакавіка 1279 года ў жорсткай сечы літвінскае войска разбіла ордэнцаў. Сам магістр Эрнэст і 71 ордэнскі брат загінулі. Дружыны земігалаў, ліваў, лэтаў разбегліся, толькі датчане, якія трапілі ў акружэнне і страцілі свайго важара Эйларта, здолелі прабіцца праз шэрагі Тройдзеневых воінаў.



К.Вееpман. Дынабургскі замак. *Рэканструкцыя А.Плятара. Канец XIX ст.*

Калі вестка пра паражэнне крыжакоў дасягнула Земгаліі, там успыхнула паўстанне супраць Ордэна. Узначаліў земгалаў Наймес, які прызнаў сябе васалам Тройдзеня. Паўстанцы захапілі крыжацкія замкі, а палонных адправілі на Тройдзеня ў надзеі на яго дапамогу.

Але галоўную пагрозу Вялікаму княству Тройдзень бачыў у Прускім ордэне. Рыцары няўмольна прыбіралі да рук Прусію. І адчайная барацьба прусаў не магла спыніць іх. Тройдзень, нягледзячы на тое, што і самому даводзілася адбівацца ад ворага, падтрымліваў прусаў і яцвягаў. Так, у 1277 годзе дружыны з Вялікага княства ўдзельнічалі ў паходзе на Хельмінскую зямлю чатырохтысячнага атрада яцвяжскага князя Скомунда. У 1280 годзе Тройдзень зноў шле сваё войска на дапамогу яцвягам у паходзе на Самбію. Па яго ж загаду і Найміс хадзіў на Памезанію. Ды Ордэн быў мацнейшым. Адну за другой скаралі крыжакі прускія землі. Натоўпы прусаў і яцвягаў уцякалі ў Вялікае княства. Тройдзень даваў ім прытулак на землях Наваградчыны, воінаў прымаў у свае дружыны. Па сутнасці, Вялікае княства Літоўскае знаходзілася ў варожым акружэнні. Суседнія дзяржавы паглядалі на Наваградскую зямлю і Літву як на ахвяру будучых заваёў, кожны марыў адарваць сабе кавалак зямлі: Ордэн — Аўкштайцію, Залатая Арда — Наваградчыну. Відавочна, што пры такім становішчы выстаяць няпроста.



Сцены Гарадзенскага дзяцінца XII ст. *Рэканструкцыя*

Тройдзень падтрымліваў земгалаў, прусаў, яцвягаў у іх вайне з Ордэнам, але разумеў, што, нягледзячы на іх мужнасць і гераізм, асуджаны яны на паражэнне. Ну год, два, дзесяць будуць абараняцца ад крыжакоў, але не выстаяць ім. А значыцца, ужо Вялікаму княству ўступаць у доўгую і цяжкую вайну з Ордэнам. Каб гэтага не здарылася, патрэбен мір з Польшчаю, або Мазовіяй, або з Галіцка-Валынскім княствам.

Польшча — саюзнік Ордэна. Тройдзень спрабуе разарваць гэты саюз. У канцы 1278 года князь пасылае брата Серпуція з раццю на дапамогу яцвягам, якія ваявалі Мазовію і Усходнюю Польшчу. Аж да Любліна дайшлі яцвяжскія і літвінскія дружыны. Больш за ўсё выпала на долю Мазовіі. Мазавецкія князі, каб выратаваць свае землі ад спусташальных нашэсцяў, разарвалі адносіны з Ордэнам і запрасілі ў Тройдзеня прымірэння. У 1279 годзе быў заключаны мір паміж Мазовіяй і Вялікім княствам. Мазавецкі князь Баляслаў ажаніўся з Тройдзеневай дачкой Прадславай — Софіяй. Саюз гэты быў накіраваны як супраць Ордэна, так і супраць Польшчы. Пад гэты год М.Стрыйкоўскі адносіць шлюб паміж Тройдзенем і мазавецкай княгіняй Ганнай. Паводле падання, Тройдзень з дружынай захапіў замак Бабін, які належаў князю Конраду Земавітавічу. Сам князь у гэты час паляваў на звера ў навакольных лясах, а ў замку засталася ягоная хворая маці ды сястра Ганна. Уварваўшыся ў замак, літвіны пачалі рабаваць яго. У адным з пакояў Тройдзеня сустрэла Ганна, і ён, уражаны яе прыгажосцю, апусціў меч. Быў ён чалавекам хуткім на рашэнні і адразу прапанаваў Ганне стаць ягонай жонкай. Ганна адказала, што дзеля гэтага трэба спыніць рабаванне і бяззбройным прасіць дазвол на шлюб яе маці. Тройдзень паслухаўся, зняў з сябе зброю і адправіўся ў пакой да Ганнавай маці. Між тым вярнуўся з палявання Конрад, і Тройдзень выйшаў яму насустрэч і таксама прасіў у яго сабе ў жонкі Ганну. Конрад прадставіў права выбару сястры, і яна, жадаючы міру паміж Літвой і Мазовіяй, згадзілася пайсці за Тройдзеня[16]. Але шлюб Тройдзеня з Ганнай Мазавецкай не пацверджаны гістарычнымі дакументамі. Так што гэты аповяд Стрыйкоўскага можна лічыць прыгожай легендай.

У тым жа годзе рыжскі архібіскуп прыслаў да Тройдзеня паслоў і прапанаваў, каб ён па прыкладу свайго вялікага папярэдніка Міндоўга прыняў хрысціянства. Тройдзень адказаў: «За прыкладам дзеянняў мінулых гадоў, не знаходзім ніякай ахвоты да прыняцця хрысціянства. Народ літоўскі моцна настроены супраць Рымскага вызнання з прычыны выпадкаў, што напаткалі яго пабраціму земгалаў, якія добраахвотна прынялі новую веру ў надзеі на лепшае, а знайшлі найсмут-

нейшае зняволенне, было б тое больш падрыхтоўкай добраахвотнай да прыняцця кайданоў крыжацкага закону»[17]. Так, нянавісць да крыжакоў была такой, што іх вера, якую яны неслі мячом, успрымалася літвінамі як зняволенне.

Усё актыўней Тройдзень вядзе палітыку на міжнароднай арэне. Хочаш не хочаш, а з Вялікім княствам павінны лічыцца і Галіцка-Валынскае княства, і Залатая Арда, і Ордэн, і Польшча, і Полацкая зямля. Гэта быў час сталення Вялікага княства, нялёгкі час.

Тайнай ахутана смерць Тройдзеня. Паводле беларускіх летапісаў, ён загінуў ад рук забойцаў. Нібыта пскоўскі князь Даўмонт накіраваў у Наваградак шэсць слуг. Яны падкаравулілі вялікага князя, калі ён бяспечна ішоў з лазні, і забілі яго. Факт гвалтоўнай смерці Тройдзеня адмаўляць нельга. На нашу думку, летапісец збліытаў Даўмонта-Цімафея з другім Даўмонтам, які загінуў у бітве з рускімі князямі ў 1285 годзе пад Цверру. Летапісы называюць яго вялікім князем. Не выключана, што менавіта гэты Даўмонт і падаслаў да Тройдзеня забойцаў, а пасля яго смерці захапіў уладу ў Вялікім княстве. Але ворагі літвінскай дзяржавы пралічыліся — яна пасля Тройдзеневай смерці не заняпала і не развалілася, як, напрыклад, Галіцка-Валынскае княства пасля смерці Данілы Галіцкага. Было каму захаваць адзінства і моц Вялікага княства Літоўскага.

Дванаццаць гадоў з мячом у руках Тройдзень бараніў нашу Бацькаўшчыну ад ворагаў. Дванаццаць гадоў на мяжы «быць або не быць?..». Быць нашым продкам вольнымі на сваёй спрадвечнай зямлі, быць на ёй гаспадарамі, быць іхнім спевам і паданням, гучаць іх мове ці паўтарыць лёс полаўцаў, яцвягаў, прусаў і знікнуць у небыцці? «Быць!» — такім быў адказ Тройдзеня.

СНЫ АБ РАДЗІМЕ





ДАЎМОНТ-ЦІМАФЕЙ І ЯГО ЖОНКА МАРЫЯ
(?—1299)
Пскоўскі абраз. *XIV ст.*

ДАЎМОНТ

Князю снілася Бацькаўшчына. У снах ён вяртаўся да яе. Раніцай князь сумна паглядаў з вокнаў палат у бок літвінскай мяжы, туды, дзе ляжала зямля бацькоў — Нальшчанская*. Зямля бурштынавых лясоў і крынічнай сінявы азёраў і рэк, старажытных міфаў і паданняў. Зямля, дзе свята верылі ў адухоўленасць нябёсаў, зямлі і водаў, дзе гарэў нязгасны агонь Зніча. Край, дзе князь нарадзіўся. Пад зорамі якога спазнаў ён каханне жанчыны. З крыніц якога наталяў смагу. Там засталося ягонае дзяцінства, там адгаралі дні ягонага юнацтва.

У мігаценні агменя бачылася князю палыханне Зніча. У завываннi зімовага ветру, вясновым шапаценні зялёных вершалін, у тужлівым мармытанні восеньскіх дажджоў чуўся князю спеў нальшчанскіх пушчаў. І нават у шматгалоссі знаменных распеваў чулася песня роднага краю, яго хвалюючы кліч. І бачылася князю вечаровае сонца, што стомлена пакідала залітае рабінавай чырванню неба і кацілася за спічастую сцяну лесу. Апошнія промні бліскавіцамі зіхацелі на рачных хвалях. А на беразе бачылася адзінокая постаць хлопчыка, на пачціваў адлегласці — узброеныя слугі, што суправаджалі яго. Хто гэта? Гэта ён — Даўмонт. Яшчэ не дарос ён да сядла. Яшчэ далёка яму да баявых паходаў, і птах славы яшчэ не пралятаў над ім. Бацька ўпершыню ўзяў яго ў аб'езд па Нальшчанскай зямлі. Вось бацька падыходзіць да яго, кладзе на плячо руку. А за ракой — зямля крывічоў. Памяць зберагла ў віхуры падзей і панесла праз не адно кола часу гэтую яву далёкага дзяцінства. Бацькаўшчына — яна сонцам, заходзячым за лес, рэчкай, на хвалях якой мігацелі сонечныя промні — апошняй

---

* Нальшчанская зямля — паўночны захад Беларусі, раён Крэва, Гальшанаў, Ашмянаў.

мяжой перад Чужыншчынай, крыніцамі, у якіх спаталяў смагу, і бурштынавымі стваламі хваін — гэтымі вобразамі жыла ў ягоным сэрцы. І водар скошаных траў... І крыкі драчоў на лугах... І бацькоўская рука на плячы... Як гэта было даўно!

Нікому князь не казаў пра свае сны.

Даўно ў князя была другая Айчына — Пскоў. Даўно ён насіў другое імя — Цімафей. Даўно забыта бацькоўская вера.

Каму-каму, а яму грэх наракаць на лёс. Не напаткала князя смерць, як многіх, з кім сутыкнуўся на шляхах зямных. Няма ўжо Міндоўга, Таўцівіла, Траняты, Войшалка. Не туляецца ён ізгоем пры дварах лівонскіх рыцараў, як той Суксе. Ужо якое дзесяцігоддзе ён улюбёнец і абраннік пскоўскі. Любяць яго пскавічы за храбраць і ўмельства ў ратным баі, багалюбства і дабрачыннасць да люду хрысціянскага, спагаду да сірот і ўдавіц, за дух разумнасці святой, за дзеянні дзеля прыбытку і славы Пскова. І слаўнае імя ягонае вядома не толькі ў Пскове, але і ў іншых краях і землях. Шматмудрыя мніхі-летапісцы заносяць ягоныя дзеянні на старонкі летапісаў нашчадкам для павучання і памяці, параўноўваюць яго з вялікім Аляксандрам Неўскім — князем князёў, ваяводам ваявод. Грэх наракаць на лёс.

Малады быў тады князь нальшчанскі Даўмонт, калі на Літве прагным звычаем брат пайшоў на брата. Дружалюбства і іншыя добрыя норавы забыў Міндоўт, зірнуць смерці ў вочы многіх літвінаў прымусіў, правам і вольнасцям баярскім гвалт ад яго стаў. Улады, славы, пажытку, новых зямель Міндоўгу хацелася. Але болей, чым князю, хацелася гэтага ягоным воям. А што ён, князь нальшчанскі? Ён укленчыў перад Міндоўгам. Іх звязвала сваяцтва — іхнія жонкі былі сёстры. Часта гасцяваў у Міндоўгавым доме і не раз прымаў будучага літвінскага караля ў сваім.

Да Міндоўга тоіў ён нелюбоў. Неміласцівы на кроў, вуздою хцівасці абрытаны, хіжы і злахітры. Сэрца сваё да сяброў і паплечнікаў зачыніў і лічыў іх сваімі галдоўнікамі*. Ад боязі за карону і кволасці ўлады было гэта.

І здзіўляла Міндоўгава любоў да жонкі Марфы. Была яна тым чалавекам, ля якога забываўся ён пра цяжар улады. Калі памерла яна, тугою і смуткам пакутаваў былы кароль. Ці не ейныя незабыўныя рысы ўбачыліся Міндоўгу ў твары Даўмонтавай жонкі, ці не голас Даўмонтавай жонкі нагадваў яму голас каханай? І гвалтам узяў за сябе чужую жонку.

Стрываць, змірыцца з абразай, праглынуць крыўду? А дзе гонар? Можна дараваць учарашняму ворагу, які просіць у цябе літасці, зла не памятаць, пусціць у сваё жытло, пасадзіць по-

---

* Галдоўнікі — тыя, хто плаціць даніну.



Куманіні. Клятва Даўмонта. *1838 г.*

бач за сталом, падняць кубак за любоў і яднанне, але як дараваць таму, каму служыў без хітрасці, а ўзнагародай табе — здзек? Аднак хто ён, Даўмонт, а хто — Міндоўг? Вялікая сіла Міндоўга — моцная ў бранях дружына. І малая — у яго, у Даўмонта, не паспееш і меч падняць на вялікага князя, як сам без галавы ляжаш ля ягоных ног.

А тут Транята. Той ведаў, што яму трэба ад іншых. Прагнуў князь улады, і таму, хто мог дапамагчы яму, гатовы быў дапамагчы і ён. Так яны змовіліся. І надышла ноч, калі іхнія воі акружылі Міндоўгаў дом. Без шуму, нібы прывіды, выраслі

яны з начной цемры перад вартай і пасеклі яе. Сам Транята* і Даўмонт кінуліся ў велікакняжацкія пакоі. Кароль спаў. Соннага яго ў ложку і забілі. І сыноў ягоных — Руклю і Рэпенью — забілі. Хіба дзеці прычынілі яму зло? Навошта было гэтае забойства? Каб ніхто не змог узяць меч помсты, каб ніхто не адпомсціў за Міндоўга.

Было каму помсціць за Міндоўга — Войшалку. Ён з-пад Пінска прыйшоў на Літву, у Верхняе Панямонне. Наваградскія дружыннікі і баяры, пінчукі — сіла вялікая. Літасці нальшчанцы не чакалі. Уцёкамі выратаваўся Даўмонт. Тады не ведаў, што назаўсёды пакідае Бацькаўшчыну. Не мог князь прадбачыць, што рыхтуе яму лёс. Ды і думаць пра гэта не думаў. Смерць была побач — ратаваўся ад яе. І толькі вось цяпер, пасля столькіх гадоў, смуткам адзывалася ў душы памяць аб Бацькаўшчыне. А была магчымасць вярнуцца. Была. Загінуў Войшалк. У Наваградку сеў Войшалкаў швагер Шварн Раманавіч: можна было вяртацца. Не вярнуўся, застаўся ў Пскове.

Пскоў — малодшы брат «господина Великого Новгорода». Малодшы прагнуў роўнасці са старэйшым. Малодшаму надакучыла несці цяжар залежнасці ад старэйшага. Малодшы марыў пра вольны дух вечавы. Ноўгарад, аслеплены велічнасцю, па-ранейшаму прызнаваў Пскоў сваім прыгарадам. І не болей. Па-ранейшаму наўгародскае веча вырашала лёс пскавічоў. Толькі вось у бедах, калі імклівым набегам ваявала Пскоўшчыну Літва або прыпаўзаў да яе межаў жалезны цмок крыжацкай навалы, не спяшаў старэйшы брат дапамагчы малодшаму, і ўсё часцей пскавічы адбіваліся ад ворага сваімі сіламі. Пскоў шукаў выйсце і часта не лепшае знаходзіў. Мір з крыжакамі, які заключылі яны — здрада агульнарускім інтарэсам, — не прынёс чаканага. Давялося пакласці за Ордэн многіх лепшых мужоў сваіх у бітве з жамойтамі пры Шаўлях у памятным 1236 годзе. А праз чатыры гады Ордэн, сабраўшыся сіламі, рушыў свае закутыя ў браню «свінні» на Пскоўскую зямлю. Ізборск і Пскоў расплаціліся за лішнюю даверлівасць незалежнасцю. Праз два гады Аляксандр Неўскі разбіў крыжакоў і вызваліў Пскоў, але на гэтым вайна з імі не закончылася.

Пскову патрэбны быў баявы князь, які адвагу і ўмельства яўляў бы ў рацях, які мог бы адстаяць інтарэсы пскоўскія перад Ноўгарадам, які разбіраўся ва ўсіх хітраспляценнях адносін літоўска-рускіх, наўгародска-рускіх і ў супярэчнасцях іхніх шукаў выгаду для Пскова. Надзеі ўскладалі на Даў-

---

* У летапісах Даўмонт названы зяцем Траняты. (ПСРЛ. Т. 32. С. 27.) Тады жонка Міндоўга Марта была дачкой Траняты.



Мініяцюра з «Ліцавога зводу». Прыход крыжакоў пад Пскоў. *XVI ст.*

монта. Пскавічы добра разлічылі. У ізгоя выбару мала, нават зусім няма, — значыць, волі вечавай падначаліцца. Падтрымку ў іншых землях яму цяжка знайсці — значыць, стане даражыць месцам баявога князя. А вопыту баявога Даўмонт паднабраўся нямала. Чаму б не ўзяць яго? Узялі ж палачане Таўцівіла, і верай і праўдай служыў ім, атрымаўшы ад іх імя Добры.

«И крещен был бысть у соборной церкви святой Троицы и наречено было имя ему в святом крещении Тимофей», — пакіне летапісец паведамленне пра Даўмонтава хрышчэнне[1]. А пасля адразу выпрабаванне. Вядзі, княжа, дружыну ў паход. І павёў Даўмонт пскавічоў на сваю былую Бацькаўшчыну. Не гонару сабе шукаці ішлі пскавічы, не імя слаўнага, нават не здабытку. Хай пралье Даўмонт кроў былых суайчыннікаў, хай гора і слёзы прынясе Літве, каб не вабіла яго дарога назад. Разумеў гэта Даўмонт, а вёў патаемнымі сцежкамі ў Нальшчаны пскоўскую дружыну. Праз адрачэнне ад Радзімы мог ён застацца ў Пскове. І адрокся. За ўсё прыходзіцца плаціць у гэтым свеце. За вячыстае шчасце на нябёсах — адрачэннем ад зямных радасцей. За каханне да жанчыны — неспакоем душэўным. За славу ваярскую — крывёй. І ён таксама плаціў...

Браталюбна жыў раней з Гердзенем, полацкім князем, а цяпер — вораг яму. На ягоныя землі напаў і аб браталюбстве забыў, аб сваяцтве. Хацелі гэтага ад яго пскавічы — і ён падняў на Гердзеня меч, і не па-ваярску ў адкрытым баі, а, як таць, патаемна. Гвалту і рабавання не спыняў. Закон войнаў святы. Узятае зброяй у ворага — тваё. Нямала здабыткаў пскавічы захапілі, нямала палону павялі з сабою. Паланянкай стала і жонка Гердзеня з двума сынамі. Праўда, не ўзяў грэх на душу, не пакараў іх смерцю.

Гердзень з дружынай у сем сот ваяроў дагнаў яго за Дзвіной. І хаця толькі сотню вояў і меў Даўмонт, але бой прыняў. Уцякаць? Толькі пераможцам мог ён вярнуцца назад у горад. Абняславіць сябе баязлівасцю — пазбавіцца пасада пскоўскага. «Браты, мужы, пскавічы, хто стары — той бацька мне, а хто малады — той брат; чуваць пра вашу мужнасць ва ўсіх краінах: дык вось жа, браты, нам выбіраць жывот і смерць: браты, мужы пскоўскія, падніміцеся за святую Тройцу і за святыя цэрквы, за сваю Айчыну», — заклікаў ён пскавічоў за сабою ў бой[2]. Першым рушыў у сечу Даўмонт.

І кожны раз, апускаючы цяжкі меч на галовы нальшчанцаў, ён нібыта зноў рассякаў тыя павязі, што яшчэ злучалі яго з Бацькаўшчынай.

Той бой ён выйграў. У Літве яго імя клялі — у Пскове славілі. І ў Ноўгарадзе з пачцвівасцю аднесліся да новага пскоўскага князя. Таму і не падтрымалі наўгародцы вялікага князя ўладзімірскага Яраслава, калі той з сваімі палкамі прыйшоў у Ноўгарад з прапановаю рушыць паходам на Пскоў, каб выгнаць Даўмонта.

У наступным, 1267 годзе Даўмонт зноў павёў на Літву пскавічоў, цяпер ужо разам з наўгародцамі. І зноў прынёс Бацькаўшчыне кроў і слёзы. Новай Радзіме служыў верай і праў-

дай. Хто ў дакор слова скажа? Усякае было: смяротная пагроза ад вялікага князя Яраслава, выгнанне з Пскова і зноў вяртанне ў горад, сечы з крыжакамі, паходы ў Лівонію, адраджэнне спаленых пскоўскіх пасадаў, узвядзенне крамля.

Перамогамі над крыжакамі праславіў імя сваё Даўмонт. У 1268 годзе ягоныя воі разам з наўгародцамі, князем Дзмітрыем Аляксандравічам і дружынамі Яраслава пасля жорсткай сечы ля Кергольма разбілі ордэнскае войска. У баі гэтым загадваў ён правым крылом, стрымліваючы націск жалезнай «свінні». Пасля перамогі агнём і мячом прайшоўся князь з пскавічамі па Эсцейскай зямлі да самага мора. Магістр Отан, помсцячы пскавічам, праз год прывёў пад сцены Пскова васемнаццаць тысяч ваяроў Хрыстовых. Тыя падзеі ўжо сталі легендай, дзе прыдуманае і праўдзівае пераплялося, як карані дрэў... Перад бітвай Даўмонт асвяціў у саборы св. Тройцы меч з выгравіраваным на ім надпісам: «Гонару майго не аддам нікому». Гэта быў жыццёвы дэвіз князя. Адзнаку пераможнага мяча атрымаў ад пскоўскага князя на твары сам магістр. І крыжакі адступілі. Як адступалі яны і пазней — у 1271 і 1272 гадах, — так і не перамогшы Даўмонта.

На многія гады адбіў ён ахвоту ў крыжакоў хадзіць на Русь, на многія гады дараваў Пскову мір. Цэлае пакаленне пскавічоў вырасла не пад звон мячоў, а пад спевы жнеяў і гучанне саборных званоў. Ягоным клопатам аперазаўся горад каменнай сцяной, самай моцнай на Русі. Імем прышлага князя называецца сцяна і цяпер — Даўмонтаў град. Пскоў рос, багацеў, набіраўся моцы перад новымі выпрабаваннямі. Славілі пскавічы свайго ўладара. Шчаслівы, зайздросны лёс.

Усё часцей снілася князю Бацькаўшчына, на крылах памяці ляцеў ён туды. Там і сонца не такое, там і месяц не такі, там і зоркі не такія, там і дрэвы не такія, там усё да болю роднае, мілае, апетае моваю матчынаю, там усё сваё. Там засталося маленства, там ягонае юнацтва. Там спяць вечным сном яго бацькі. Апавядаюць, што легендарны Усяслаў Чарадзей у Кіеве звон сваёй Сафіі Полацкай чуў. І да яго, Даўмонта, людзі трызнілі аб страчанай Бацькаўшчыне. А можа, ад старасці гэта? Жыццё, як знічка, дагарае. І цягне азірнуцца назад. А там бачыцца постаць хлопчыка на рачным беразе, а побач — постаць ягонага бацькі. І сонца ўжо зайшло за лес. Напіцца б вады з той ракі...

Стары князь зноў возьме ў рукі пераможны меч і разаб'е крыжакоў, што з'явяцца пад Пскоў. «Быць сеча зла яко николи яше тока не бывала ў Пскове»[3]. Гэта адбудзецца ў сакавіку 1299 года. А праз месяц князь памрэ.

«Гэты князь не адной храбрасцю быў паказаны ад Бога, але і багалюбцам паказаўся, у міры ветлівы і цэрквы ўпрыгожваў і папоў, і жабракоў любіў і ўсе святы чэсна праводзіў, і папоў і чэрнецоў карміў і міластыню даваў сіротам і ўдовіцца». «Быў тады жаль вялікі ў Пскове, мужам, жонкам і малым дзецям, па добрым уладары прававерным князю Цімафеі»[4]. Так запісалі летапісцы.

І не хлусілі яны. Дзіўныя справы твае, пане Божа! Змірыла свой гонар пыха ў сэрцы чалавека, прасветленага тваёй верай. Узвышаны нізкі і нягодны тваёй любоўю да святога прызначэння — служыць людзям. Іншая тайна жыцця, іншы сэнс жыцця раскрыліся перад дзікуном і рабаўніком. І гэтая тайна абараніла ад бед, і гэты сэнс усцярог ягоную душу ад вечнай няволі цемры і зла. Той, хто спазнаў любоў да Бога, той спазнаў і гэтую тайну, і гэты сэнс. Іх існасць не выкажаш словам — гэта адчуеш душой. І хай нам, нашчадкам літвінаў, хай нашай легендарнай Літве-маці руплівым заступнікам будзе і святы Цімафей. У коле нябёсных заступнікаў нашай Айчыны і ён бярэ на сябе нашы грахі і нашу паняверку, і ён, нябесны віцязь, абараняе бацькоўскую зямлю ад цяжкіх выпрабаванняў. Хай малітва святога Цімафея падтрымае нас: «Пане Божа, дай нам сіл, мы людзі твае, авечкі пожні тваёй, імя тваё заклікаем, зміласціся над лагоднымі людзьмі сваімі, і змірэнных узвысі, і ганарлівых высокія думкі спакладзі, хай не апусцее пожня авечак тваіх».

...У адзін з летніх дзён 1299 года літоўска-пскоўскую мяжу пераехаў атрад вершнікаў. Суправаджалі яны Даўмонтавага сына — князя Давыда. Сын выканаў перадсмяротную волю бацькі — вярнуўся на зямлю сваіх продкаў. Што чакала яго на ёй?

МЕЧ І СЛАВА





ДАВЫД ГАРАДЗЕНСКІ
(?—1326)
Мастак Ул. Кіслы

ДАВЫД ГАРАДЗЕНСКІ



ялікі князь літоўскі Віцень прымаў Давыда, сына былога нальшчанскага і пскоўскага князя Даўмонта. У яго дзёрзкім поглядзе адчуваў Віцень смеласць і ганарыстасць. Што прывяло Давыда на Літву? Віцень хацеў верыць, што малады князь, выконваючы наказ свайго бацькі, вярнуўся ў яго Айчыну, каб служыць ёй. Хацеў верыць і сумняваўся. А што, калі ён задумаў вярнуць вотчыну? Абжывецца, агледзіцца, а пасля пакліча пскавічоў і разам з імі пачне адваёўваць Нальшчаны. Не ўдасца — уцячэ да крыжакоў.

Для асцярогі ў Віценя меліся сур'ёзныя падставы. Каторы ўжо год ваюе Літву князь Полюш! Таксама імкнецца вярнуць страчаныя бацькоўскія землі. Як воўк, па патаемных сцежках вядзе за сабою крыжацкія зграі ў глыб Вялікага княства. Колькі сёлаў папаліў, колькі крыві праліў. Чатыры гады таму, у 1296 годзе, разам з тэўтонамі напаў на Нальшчанскую зямлю, дзе сваяк яго гуляў вяселле сваёй дачкі. Семсот гасцей — знатных князёў, баяраў, вояў — забіў, а маладых, жанчын і дзяцей вывеў у палон. І гэта толькі адзін Полюш. А калі вось і гэты ганарысты юнак возьме меч у рукі і стане ваяваць Вялікае княства? Унутраныя ворагі небяспечнейшыя за знешніх. Хіба лёс Міндоўга таму не прыклад? Учарашнія паплечнікі нанеслі першаму каралю Літвы здрадніцкі ўдар. Аднак пры ўсёй асцярожнасці нельга адмовіць Давыду, не ўзяць яго на службу: праз Давыда можна нарэшце памірыцца з Псковам, знайсці саюзніка ў барацьбе з крыжакамі, гандляваць з пскавічамі.

...Іншы раз, калі думаеш аб лёсе той ці іншай гістарычнай асобы, задаеш пытанне: ці мог бы ён стаць тым, кім стаў для гісторыі, калі б жыў у іншым часе, ці змог бы праявіць сябе ў іншых абставінах? Ці быў бы Давыд тым славутым ваяводам і як склаўся б яго лёс, калі б застаўся ён у Пскове? Можна

гадаць, можна ўяўляць. Мог быць ён любімым пскавічамі, а маглі яны выправадзіць яго з горада, як гэта здаралася не з адным князем, і туляўся б ён ізгоем па чужых дварах. Толькі прадчуваў малады князь, што ў Літве чакае яго слава, прызнанне, каханне, што там, на бацькавай радзіме, ён патрэбнейшы, чым у Пскове, і рашыўся — ад'ехаў з горада, у якім нарадзіўся*.

Не адразу Віцень паслаў Давыда кашталянам у Гародню, трымаў каля сябе і ўвачавідкі пераканаўся і ў вернасці свайго васала, і ў яго рыцарстве, адвазе, ваяводскім таленце. У паходах не шукаў сабе Давыд бяспечнага месца, пераносіў, як і воі, усе нястачы і цяжкасці, у бітвах не хаваўся за чужыя спіны, змагаўся з ворагам у першых шэрагах. Малады, дзейсны і адважны князь спадабаўся Віценю, таму і даверыў ён Давыду абарону Гародні.

Назначэнне Давыда адбылося якраз напярэдадні аднаўлення вайсковых дзеяў паміж Тэўтонскім ордэнам і Вялікім княствам Літоўскім. Сам Ордэн быў заснаваны нямецкімі рыцарамі ў 1197 годзе ў Палесціне. Але, так і не дамогшыся перамогі над арабамі, тэўтоны перанеслі сваю дзейнасць у Еўропу. Пад добразычлівай апекай папы рымскага Ганорыя III Ордэн набыў землі ў Германіі, Італіі. Атрымаўшы запрашэнне венгерскага караля Андрэя II, атабарыўся ў Сяміграддзе, паабяцаўшы ахоўваць усходнія межы краіны ад ваяўнічых полаўцаў. Не вайна з полаўцамі вабіла тэўтонаў, а новыя землі. Кароль своечасова разгледзеў сапраўднае аблічча «хрыстовых вояў» і сілай выгнаў іх з Венгрыі. Але і цяпер Ордэн не застаўся без справы. Мазавецкі князь Конрад звярнуўся да яго па дапамогу ў вайне супраць прусаў. Тэўтоны перабраліся ў Прусію, і з падтрымкай і бласлаўленнем папскай курыі прыняліся заваёўваць прускія землі. Нічым не адрозніваліся яны ад лівонскіх рыцараў, агнём і мячом скаралі прусаў. Пасля паражэння тэўтонаў, што нанёс галіцка-валынскі князь Даніла Раманавіч, пасля бітвы пры Сауле ў 1237 годзе**, калі жамойцка-куршскія войскі разбілі войска лівонскіх крыжакоў, Тэўтонскі і Лівонскі ордэны аб'ядналіся.

Ні перамогі над ордэнскімі войскамі, ні гераізм прускіх вояў не змаглі стрымаць крыжацкі наступ на Прусію. Уся Заходняя Еўропа падтрымлівала Ордэн. Здрадніцкі ўдар у спіну нанёс

---

* Першую ўзгадку пра Давыда мы знаходзім пад 1299 годам, калі Пскоў зноў апынуўся ў аблозе крыжакоў. 14 сакавіка князь Даўмонт з сынам Давыдам на чале з дружынай выйшлі з горада і перамаглі немцаў. А пасля смерці бацькі ён стаў пскоўскім князем. (Сочинения императрицы Екатерины II. Т. 11. С. 44.)

** Сучасны Шаўляй у Летуве.

прусам Міндоўг сваім мірам з крыжакамі. У 1283 годзе Прусія была скорана. Рэшткі прусаў знайшлі прытулак на Літве, астатніх асімілявалі немцы. Ордэнскія ўладанні раскінуліся ад Ніжняй Вісты да Нёмана, ад паўночнай мяжы Мазовіі да Балтыйскага мора.

Для утрымання заваяваных земляў Ордэн будаваў гарады і крэпасці, запрашаў туды каланістаў з Германіі. Асаблівая ўвага надавалася войску. У ім пры абозе і на караблях служылі нямецкія сяляне, у лёгкай кавалерыі — прусы, у цяжкай кавалерыі — рыцары са сваімі васаламі. Апроч таго, Ордэн звяртаўся па дапамогу да шматлікіх паломнікаў, якія прыязджалі ў Прусію. А каб прыцягнуць іх да сябе, не скупіўся на куплю святынь царквы, мошчаў святых, якім пакланяліся вернікі.

Уважліва сачылі ў Ордэне за развіццём вайсковай справы ў Еўропе. Усё навейшае ўзбраенне выкарыстоўвалі ў сябе. Так, у 1324 годзе ў Еўропе з'явілася гармата, а ўжо праз чатыры гады Ордэн валодаў паходнымі, абложнымі і марскімі гарматамі. Навейшае ўзбраенне, матэрыяльная падтрымка Германіі, строгая дысцыпліна, вайсковая вывучка рабілі ордэнскае войска адным з лепшых. У паходах своечасова вызначаўся парадак руху харугваў, праводзілася віжаванне маршруту. Войска ахоўвалася авангардам і ар'ергардам. Без дазволу старэйшага ніхто не мог выйсці з шэрага або зняць даспехі.

Вось такі вораг стаяў каля мяжы Вялікага княства Літоўскага. Ужо ў наступным годзе пасля скарэння Прусіі крыжакі перайшлі мяжу і свой першы ўдар нанеслі па Гародні. Дзякуючы дапамозе князя Скомунда, выхадца з Прусіі, які патаемна правёў тэўтонаў да горада, яны захапілі і спалілі яго. Разумеючы важнае стратэгічнае значэнне Гародні, Віцень зноў аднавіў паселішча, умацаваў замак. Узімку 1296 года камандор Ордэна Зігфрыд Рэйберг спрабаваў штурмам авалодаць замкам, але яго войска было адбіта. Увесну таго ж года ўмацаванне штурмавалі крыжакі на чале з камандорам Генрыхам Зугівертам, і зноў без поспеху.

Сюды, у Гародню, і адправіўся Давыд. Невядома, калі гэта адбылося. Пётр Дузбург называе Давыда гарадзенскім кашталяном у 1314 годзе[1]. Трэба думаць, назначэнне Давыда кашталяном адбылося раней, а менавіта ў 1306 годзе. Тады крыжакі ў 400 рыцараў на чале з Альбертам фон Хагенам напалі на Гародню. Яны выбралі зручны момант, бо горад быў амаль безабаронны — гарадзенская дружына ўдзельнічала ў паходзе Віценя на Польшчу. Скарыстаўшыся гэтым, крыжакі спалілі прадмесце, а яго жыхароў перабілі. Відаць, пасля гэтага нападу Віцень і назначыў Давыда кашталяном гарадзенскага замка. Гэтая выснова вынікае з паведамлення Дузбурга: «Але кароль

Літвы, пачуўшы аб разбурэнні прадмесця гэтага замка, паслаў лепшых мужоў і многіх, выпрабаваных у бітвах, дзеля абароны»[2]. Такім лепшым і выпрабаваным у бітвах і быў Давыд. То як не яму даверыць абарону важнейшага на Літве замка.

Непрыступным быў гарадзенскі замак. На крутой трыццацімятровай гары ўзвышаліся па-над Нёманам яго сцены. Аб высокую каменную вежу-данжон («столп камен») не раз разбіваліся штурмавыя хвалі варожых рацей. Але не толькі на непрыступнасць сценаў і вежаў спадзяваўся Давыд. Ён дзейсна ўзяўся за стварэнне баявой дружыны, з якой можна і бараніць замак, і хадзіць у далёкія паходы. І такую дружыну Давыд стварыў.

У тым жа 1306 годзе кёнігсбергскі комтур Гебхард фон Бірнербург вырашыў захапіць гарадзенскі замак. Ён прывёў 100 рыцараў і 6 тысяч вершнікаў. Але і з такой сілай крыжакі не змаглі захапіць замак. «...Жыхары замка мужна выйшлі на бітву, якая доўга вялася паміж імі. Нарэшце браты прымусілі іх уцякаць. Тады, вярнуўшыся ў замак, праз некаторы час, сабраўшыся сіламі і духам, яны зноў выйшлі на бітву, і гэтак адбывалася шмат разоў ад усходу сонца да апоўдні. І часам гэтыя цяснілі тых, парой — наадварот», — апісвае гэтую бітву Пётр Дузбург[3]. У крыжакоў было паранена 12 рыцараў і 300 воінаў, загінуў знатны рыцар Гартман фон Эльстцерберг. Такія страты напужалі крыжакоў, і той жа ноччу яны адступілі ў Прусію.

У 1311 годзе ваколіцы Гародні спустошыў атрад Ота фон Берга. Праз некалькі месяцаў славуты Генрых фон Процкі, былы ордэнскі магістр, а зараз вялікі маршал, што ў адной з бітваў у Прусіі разбіў атрад Віценя, сабраў 5-тысячнае войска. Нейкі прыдворны Віценя абяцаў крыжакам здаць Гародню, калі яны вызваляць яго. Яму паверылі і вызвалілі з няволі. Аднак ён папярэдзіў Віценя аб намеры крыжакоў. Вялікі князь з войскам падышоў да Гародні і стаў у засадзе. Крыжакі даведаліся аб гэтым ад палоннага. «Пачуўшы гэта, браты узнеслі ўдзячнасць Богу, які так міласэрна пазбавіў іх ад гэтай грознай небяспекі, цэлымі і здаровымі вярнуліся назад», — піша Дузбург[4], не сказаўшы праўды, што «браты» панічна ўцяклі ад літвінскага войска, як «ад грознай небяспекі». Пётр Дузбург, апісваючы гэтыя падзеі, не называе імя гарадзенскага кашталяна. І толькі ў 1314 годзе ягонае імя трапляе на старонкі хронікі. Ордэнскі храніст не мог замаўчаць яго. Бо праславілася яно вялікай перамогай над крыжакамі.

Ордэн вырашыў нанесці ўдар у самае сэрца Вялікага княства, па яго сталіцы Наваградку. У верасні Генрых фон Плоцке «з усёй сілай войска свайго» выправіліся ў паход на Наваградак. Войска рухалася двума шляхамі: конніца — па дарозе ўздоўж Нёмана, а астатнія воі плылі на караблях па рацэ. Пас-



П.Рапапорт, У.Навадворская. Гародня ў XII ст.

ля кожнага пераходу крыжакі рабілі склады з правіянтам і выстаўлялі каля іх шматлікую ахову. Усе сёлы, што сустракаліся на шляху, рабаваліся і спальваліся. Так тэўтоны дабраліся да Наваградка. Захапіўшы гарадскія прадмесці, яны спрабавалі штурмаваць замак. Сустрэўшы адчайнае супраціўленне наваградцаў, крыжакі адступілі. Яны ўзялі замак у аблогу і разбілі каля яго баявы стан. Назаўтра штурм аднавіўся. Рыцарам у цяжкіх даспехах нязручна было падымацца на высокую замкавую гару, таму яны пакінулі баявое аблачэнне ў лагеры. Наваградцы мужна абараняліся ад ворага, кідалі на галовы штурмуючых камяні і бярвенні, стралялі з лукаў.

А з Гародні на дапамогу са сваёй дружынай выступіў Давыд. Дзейнічаў ён не сілаю, а хітрасцю і смеласцю. Гарадзенцы напалі на крыжацкія склады з правіянтам, перабілі варту і забралі ўсе прыпасы. Пасля Давыд нечакана з'явіўся каля стаянкі ордэнскага флоту на Нёмане, захапіў і спаліў караблі. Патаемнымі сцежкамі дружына зайшла крыжакам у тыл, потым імклівай атакай уварвалася ў крыжацкі стан, перабіла 30 чалавек аховы, авалодала даспехамі, абозам, павяла з сабою 1500 коней. Гэты напад Давыда на крыжацкі лагер быў настолькі дзёрзкім і нечаканым, што напужаныя тэўтоны, чакаючы новага ўдару літвінаў, спынілі штурм і ў баявым парадку

адступілі ад Наваградка. Варта ім было дайсці да Нёмана, дзе павінен быў знаходзіцца флот, і ўбачыць, што караблі спаленыя, як роспач і замятня расстроілі ордэнскія шэрагі. Войска страціла ўсялякую дысцыпліну. Рыцары, не слухаючы правадыроў, пакідалі зброю, параненых таварышаў і кідаліся наўцёкі. Не здолеўшы здабыць сабе ежы, тэўтоны харчаваліся карэннямі і травамі, сілы пакідалі іх. І ўвесь час іх непакоілі атрады літвінскіх вояў, што нападалі з засадаў. Амаль усё крыжацкае войска загінула ад голаду, знясілення і ад зброі пагрозлівых мсціўцаў з Гародні. Толькі адзінкі праз шэсць тыдняў вярнуліся дадому. Бясслаўная гібель крыжацкага войска аслабіла моц Ордэна. З шаленствам, схаваўшыся за непрыступныя сцены Мальбарга, рыцары пазіралі, як літвінскія дружыны спусташалі Прусію. Арганізаваць ім адпор не хапала сілаў. Чатыры гады не асмельваліся тэўтоны нападаць на Вялікае княства.

У 1315 годзе, вяртаючыся з паходу ў Прусію, загінуў Віцень. На велікакняжацкі пасад сеў Віценеў брат Гедымін. Можна было чакаць, што пры новым вярхоўным уладары Вялікага княства зменяцца адносіны да ўлюбёнца ягонага брата. Але не, Гедымін таксама вылучаў гарадзенскага кашталяна сярод усіх сваіх дзяржаўных мужоў. Ён жа аддаў за Давыда сваю дачку. Выпадак выключны, калі нагадаць, што Гедымін праз шлюб сваіх дачок парадніўся з уладарамі Усходняй Еўропы: маскоўскім, цвярскім, галіцка-валынскім, мазавецкім князямі, а таксама з польскім каралём. Значыць, высока цаніў вялікі князь Давыда Гарадзенскага, даражыў яго дружбай.

І не дарэмна давяраў Гедымін свайму зяцю: любую адказную вайсковую акцыю Давыд выконваў бліскуча, з той падманлівай лёгкасцю і ўдачлівасцю, за якой хаваюцца штодзённая цяжкая праца з дружынай, вайсковы талент і доблесць, пагарда да небяспекі і смерці. Калі ў 1319 годзе крыжакі рыхтаваліся да паходу на Жамойць, Гедымін паслаў на Прусію Давыда Гарадзенскага. З васьмістамі вершнікаў літвінскі ваявода дасягнуў прускай правінцыі Вегендорф. Пакінуўшы дружыну, Давыд на чале 80 воінаў увайшоў у правінцыю і захапіў там вялікі палон. Комтур замка Тапілаў загадаў разбурыць мост цераз раку на шляху Давыда. Калі ж Давыд падышоў да ракі, то крыжакі напалі на яго невялікі атрад. У жорсткай бітве Давыд страціў 55 воінаў і палон, але ўсё ж вырваўся з акружэння і ўплаў пераправіўся цераз раку. Яшчэ раз пераконваемся, наколькі небяспечнымі і цяжкімі былі гэтыя паходы Давыда.

Слава аб адважным ваяводзе з Гародні дасягнула і Пскова. Згадалі пскавічы сына свайго ўлюбёнца — князя Даўмонта, згадалі перад нялёгкімі выпрабаваннямі, калі лівонскія і дацкія рыцары збіралі раці для паходу на Пскоў, і запрасілі ў 1322

годзе Давыда да сябе на княжанне. Паводле лівонскіх дакументаў, крыжакі, устрывожаныя запрашэннем у Пскоў Давыда, заключылі ў студзені 1323 года саюз з Ноўгарадам і, каб вымусіць пскавічоў адмовіцца ад свайго рашэння, захапілі Гдоў, перабілі на Чудскім возеры пскоўскіх купцоў. У гэты час у Пскове знаходзіўся маскоўскі князь Юрый Данілавіч, брат Івана Каліты, і пскавічы звярнуліся да яго, просячы адпомсціць крыжакам. Маскоўскі князь, не жадаючы звязвацца з Ордэнам, палахліва пакінуў горад і ад'ехаў у Ноўгарад. Тады пскавічы адправілі пасла ў Гародню — да Давыда, і ён паспяшаў на іхні кліч*. Далучыўшы да гарадзенскай дружыны пскоўскіх вояў, Давыд пайшоў у Рэвельскую зямлю.

Попел пакідалі пасля сябе Давыдавы воі. Быў узяты штурмам Рэвель**. Рыцарскі храніст Пётр Дузбург пісаў, што Давыд забіў «многіх святароў, парафіяльных і манастырскіх. Святыні царквы, святыя ўборы і посуд бажніцы, і ўсё, што адносілася да набажэнства, ён бесчалавечна ганьбіў і раскрадаў»[5]. Не верыцца, што сам Давыд асабіста забіваў манахаў, рабаваў цэрквы. Безумоўна, аўтар хронікі жадаў ачарніць гарадзенскага кашталяна, прыпісаць яму антыхрысціянскія ўчынкі. Але і тое, што расправа з крыжакамі была жорсткаю, праўда. У многіх вояў з гарадзенскай і пскоўскай дружын загінулі ад крыжацкіх мячоў сваякі і блізкія, і воі забыліся аб літасці. А многія, як звычайна, імкнуліся абагаціцца ў паходзе.

З вялікім войскам лівонскія рыцары пагналіся ўслед за Давыдам і 13 красавіка падышлі да Пскова. Трое сутак прабылі яны каля Даўмонтава града. Увесь гэты час Давыд знаходзіўся на крапасных сценах. Напад крыжакоў быў адбіты, і яны без славы пайшлі прэч. А Давыда пад вітальныя крыкі пскавічы праводзілі дадому.

З тужлівым сэрцам пакідаў ён Пскоў. Многа роднага і памятнага засталося ў гэтым горадзе. Калі яшчэ прыедзе сюды? Аднак лёс зноў прывёў Давыда ў горад юнацтва ўжо праз месяц.

Пасля ад'езду з Пскова гарадзенскага кашталяна лівонцы асмялелі і ў маі на ладдзях і конях рушылі да горада. Кіраваў рыцарамі намеснік лівонскага правінцыйнага магістра Кецельгод. Васемнаццаць дзён працягвалася аблога. Крыжакі абстрэльвалі горад з каменямётаў, разбуралі сцены сценабітнымі машы-

---

* Паводле запісак Кацярыны II, Давыд прыйшоў з Полацка са сваім войскам. Цікава, што Кацярына II называе яго пскоўскім і полацкім князем, што не выключана. Палачане ўслед за пскавічамі маглі выбраць сваім князем славутага палкаводца. (Сочинения императрицы Екатерины II. Т. 11. С. 83.)

** Сучасны Талін.



Мініяцюра з кнігі «Апакаліпсіс Тэўтонскага ордэна».
Тэўтонскія рыцары. *XIV ст.*

намі. Пры першым жа прыступе ворага загінуў пскоўскі пасаднік Сяліла Алексіяіч, пскавічы засталіся без правадыра. Адзінае выратаванне ў гэтым становішчы — дапамога Ноўгарада. Некалькі вестуноў «з многою печялию и тугою» паслалі пскавічы да князя Юрыя Данілавіча. Ён і цяпер пабаяўся «не помогоша».

А на дапамогу Пскову «приспе князь Давыд из Литвы с людьми своими»[6]. Дзень і ноч, не шкадуючы ні сябе, ні коней, імчаліся гарадзенцы. Кароткі адпачынак — і зноў у дарогу. У гэты час з Ізборска выступіў князь Астафій і ўдарыў па крыжаках. Давыд паспеў у самы разгар бітвы і адкінуў ордэнцаў за раку Вялікую. Усе асадныя машыны і каменямёты дасталіся пераможцам. Крыжакі ўцяклі ў Лівонію.

Сяброўства з Давыдам Гарадзенскім шукае і Рыга. У пасланні рады горада Гедыміну ад 1323 года чытаем: «Пасля даведаліся мы, быццам пан Давыд стаў цяпер князем пскоўскім. А паколькі вы з ім вельмі блізкія сябры, дык мы настойліва просім вашу міласць не адмовіць зрабіць так, каб з вашага ўплывовага пасрэдніцтва ён стаў сябрам нашага горада і заступнікам нашых суайчыннікаў, таму што яны не аднойчы праязджаюць праз яго землі»[7].

Яшчэ не адпачылі воіны з паходу, як Давыд у верасні павёў іх на Добжынскую зямлю. Гэта было спусташальнае нашэсце. Усё княства гарэла ў агні пажараў. Была захоплена і сталіца Добжын. Загінула ці трапіла ў палон 20 тысяч чалавек. Пётр Дузбург з жалем адзначае, «што з-за разгрому гэтага княства язычнікам адкрыўся болей лёгкі шлях у межы хрысціянскія, бліжэйшыя і суседнія»[8].

Вынікі гэтага паходу мелі важныя палітычныя наступствы для Вялікага княства Літоўскага. У той час пачалася барацьба за валынскі пасад, які вызваліўся пасля смерці князя Андрэя Юр'евіча. На яго дачцэ быў жанаты Гедымінаў сын Любарт, а таму меў правы на Валынь. Аднак добжынская княгіня Анастасія хацела пасадзіць на валынскі пасад свайго сына. Быў яшчэ адзін прэтэндэнт — Баляслаў Мазавецкі — сястрынец Андрэя Юр'евіча. Яго падтрымліваў дзядзька, плоцкі князь Вацлаў. Пэўна, паміж Гедымінам і Вацлавам была дамова: за дапамогу ў барацьбе супраць Анастасіі і прызнання Баляслава валынскім князем да Вялікага княства адыходзілі Берасцейская зямля і Падляшша. Верагодна, у наступным годзе Давыд Гарадзенскі заняў гэтыя землі. Аднак узніклі нейкія нязгоды паміж Гедымінам і Вацлавам. Апошні мог выказаць свае прэтэнзіі на Падляшша. Тады па Мазовіі быў нанесены ўдар. У канцы лістапада Давыд з войскам увайшоў у Мазовію і ўзяў Плоцк. Вацлаў вымушаны быў адмовіцца ад прэтэнзій на Падляшша. Магчыма, Давыд і кіраваў далучанымі землямі, якія разам з Гарадзенскай зямлёй склалі ягоны ўдзел!

Не здолеўшы перамагчы літвінскага ваяводу ў адкрытым баі, Ордэн вырашыў расправіцца з ім хітрасцю. У раннюю вясну 1324 года атрад з 600 крыжакоў патаемна прабраўся ў гарадзенскія ваколіцы і напаў на памесце Давыда. Усіх, хто там жыў, напаткала смерць. Пад мячамі крыжакоў, відаць, загінула і жонка Давыда. Сам ён у гэты час знаходзіўся ў Гародні, а калі з дружынай паспяшаў дадому, крыжакі паспелі ўцячы за мяжу. Толькі попел убачыў Давыд на месцы свайго дома.

Паходы Давыда на Мазовію і Добжынскую зямлю нанеслі па Польшчы сакрушальны ўдар. Польскі кароль Уладзіслаў Лакетак адправіў да Гедыміна пасольства з прапановай заключыць саюз супраць крыжакоў. Вялікі князь прыняў гэтую прапанову і, каб умацаваць саюз, выдаў сваю дачку Альдону (у хрышчэнні — Ганну) за сына Уладзіслава — Казіміра і вярнуў з палону 20 тысяч палякаў. Мірны саюз з Вялікім княствам заключыла і Мазовія. І гэтую дамову Гедымін змацаваў шлюбам сваёй дачкі Марыі з мазавецкім князем Тройдзенем.

Упершыню супраць Ордэна выступілі Вялікае княства Літоўскае і Польшча. Давыд Гарадзенскі з 1200 літвінскімі ваярамі і польскім атрадам уварваўся ў Брандэнбургскую мархію. Саюзнае войска дайшло да Франкфурта-на-Одэры, захапіўшы 6 тысяч палонных.

Падчас гэтага паходу адбыўся незвычайны выпадак. Адзін літвін угледзеў прыгожую манашку Бенедыкту і ўзяў яе ў палон. Не жадаючы губляць святасці манаскай цнатлівасці, Бенедыкта выбрала смерць. Яна мовіла літвіну, што яго ніколі не параняць і не заб'юць на вайне, калі будзе насіць пры сабе частку яе косткі з чала. Абрадаваны дзікун паверыў, выхапіў меч і адсек манашцы галаву. Давыд, угневаны такой жорсткасцю свайго воіна, выклікаў яго на паядынак і працяў наскрозь дзідай — пакараў за бяздумнае кровапраліцце[9]. Гэты ўчынак паказвае, што Давыд быў не жорсткім і крывавым ваякам, якім яго малюе Пётр Дузбург, а рыцарам — з ворагам мужны і з безабароннымі высакародны. Ён мог паўтарыць услед за бацькам: «Гонару майго не аддам нікому». Не заваёўнікам ён быў, а абаронцам. Абараняў Радзіму. Ён быў увасабленнем гневу і помсты сцякаючай крывёю ад крыжацкіх ран Радзімы.

На зваротным шляху падкуплены крыжакамі мазавецкі рыцар Анджэй Гост, скарыстаўшы даверлівасць Давыда, прыйшоў да яго ў шацёр і па-здрадніцку забіў ваяводу. Па даўняй славянскай традыцыі літвінскія ваяры на шчытах прынеслі цела свайго правадыра ў Гародню. Пахавалі Давыда на беразе Нёмана, каля Каложскай царквы. І назаўсёды застаўся Давыд на зямлі сваіх продкаў.

ВІЦЯЗЬ ПАГОНІ





ВІЦЕНЬ
(?—1316)
Гравюра з «Хронікі Еўрапейскай Сарматыі» А. Гваньіні. ***1578 г.***

ВІЦЕНЬ

Першыя вялікія літоўскія князі падобныя да міфічных герояў-волатаў. Здаецца, усе іх перамогі былі непазбежныя — як праяўленне іхняй волі, сілы, смеласці, і нават паражэнні ўспрымаюцца не як трагедыя, а як чарговае выпрабаванне лёсу, якое здольныя адолець, і стануць ад гэтага яшчэ мацнейшымі. Што можна сказаць пра іх дакладна? Яшчэ не быў імі растрачаны на прыдворных баляваннях і ловах, і ў шматразумных размовах з кніжнікамі дух вояў, змагароў, заваёўнікаў; яшчэ манеры іх простыя, грубыя, не вызначаныя прыдворным этыкетам; яшчэ не ведаюць яны над сабою ўлады паноў-дарадцаў; яшчэ гаспадары яны свайму слову; яшчэ не цешаць іх слых спевы італьянскіх спевакоў, а свае гусляры і песняры кранаюць ім душу народнымі спевамі; яшчэ не разбэшчаны яны ўтульнасцю і раскошай палацаў, і прызвычаенае для іх не крэсла велікакняжацкае, а баявое сядло, яшчэ на Купалу, ці на Каляды, ці на Сёмуху можна ўбачыць іх сярод люду, яшчэ адчуваюць яны адказнасць за лёс свайго народу, і песняй, і мовай, і горам, і радасцю злучаны з ім.

ЗАГАДКІ ВІЦЕНЯ

Вялікі князь Віцень... Не ведаем, дзе і калі ён нарадзіўся, і пра смерць ягоную дакладна нічога не ведаем. А пра жыццё? А пра тыя гады, калі стаяў князь на чале нашай дзяржавы?

У «Хроніцы Літоўскай і Жамойцкай» даводзіцца, што Віцень жыў у Жамойці. Нібыта там, у двары Эрыгойла, убачыў яго, «дитя обличем велми хорошо и възросту цудного», Тройдзень, узяў яго служыць да сябе каморнікам, потым за «цноту его и доброе заховане, вчынил его в себе маршалком», а перад смерцю запаветаваў яму велікакняжацкі пасад[1]. Але гэтае паведам-

ленне падобнае на міф. У жыцці, відаць, усё было інакш. Хроніка Дузбурга называе Віценя сынам правіцеля Літвы Пукувера[2]. А Васкрасенскі летапіс сцвярджае, што Віцень быў сынам полацкага князя Гердзеня. Гэтае паведамленне пацвердзіла і Кацярына II, якая цікавілася генеалогіяй уладароў Вялікага княства Літоўскага[3]. Заўважым, што ў Маскве, пры царскім двары, Гедымінавічаў прызнавалі за нашчадкаў полацкага князя Расціслава Рагвалодавіча, пра што маскоўскія баяры афіцыйна паведамлялі панам Вялікага княства: «Только вспомнить старину, каким образом гетманы литовские Рогволодовичей Данила и Мовколда на Литовское княжество взяли...»[4]. Родавы герб Гедымінавічаў «Калюмны», або «Гедымінавым слупы», лічыўся ў Маскве як «печать полотская»[5].

Яшчэ па адной версіі, Віцень з «рода Полотских князей», ратуючыся ад татараў, перасяліўся ў Жамойць, дзе ажаніўся на дачцэ «некоего бортника». Пражыў з ёй бяздзетна трыццаць гадоў і загінуў ад удару перуна. На жонцы Віценя ажаніўся Гедымін[6]. Але і гэтую версію трэба прызнаць палітычным памфлетам XVI стагоддзя, каб давесці, што Гедымінавічы «не карэнныя гасудары»[7].

Паводле Радунскага летапісу, які прыводзіць Т.Нарбут, бацькам Віценя названы Лютавер. Быў ён нібыта нашчадкам міфічнага героя Гелона. Калі шведы-вікінгі захапілі Жамойць, усе нашчадкі Гелона загінулі, апроч князя Імінуса, які жыў у «зямлі дрыгавічоў, народу прыязнага Літве ў горадзе Ігмене». Калі ж у XII стагоддзі кіеўскі князь Ігар заваяваў гэтую зямлю, унук Імінуса Гланімін вярнуўся ў Жамойць. У Гланіміна быў сын Суцінк, а ў яго — Дармунімунд, які стаў бацькам Лютавера. У Лютавера ў 1232 годзе нарадзіўся Віцень. Пасля смерці Траняты літвінскія паны паслалі ў 1264 годзе Лютавера і Віценя княжыць у Полацк. Віцень удзельнічаў у баях з татарамі і трапіў да іх у палон. Некалькі гадоў ён правёў у абозе Батыя. Калі ж вярнуўся з няволі, княжыў у Полацку. На з'ездзе ў Кернаве пад старшынствам манаха Лаўрэніса, сына Тройдзеня, Віценя абралі вялікім князем літоўскім. Памёр ён у 1315 годзе ад удару перуна. Віцень меў трох жонак. Ад першай у 1257 годзе нарадзіўся Гедымін, ад другой у 1295-ым — Гвазэлута і ў 1296 годзе — Воін[8]. Аднак аўтэнтычнага тэксту рукапісу няма, што выклікае сумненні ў яго сапраўднасці.

Найбольш праўдападобным з'яўляецца радавод, змешчаны ў «Задоншчыне», дзе Гедымінавічы названы праўнукамі «Сколомендовы»[9]. Не выключана, што інфарматарамі аўтара гэтага твору былі ўнукі Гедыміна Андрэй Альгердавіч і Дзмітрый Альгердавіч. Польскі гісторык Ежы Ахманьскі лічыў Скаламенда бацькам Пукувера[10], якога Дузбург называе каралём



В.Сташчанюк. Старажытны Наваградак

Літвы[11]. У хроніцы Міколы Ярошына ён названы Путуверам, таксама і ў «Хроніцы вялікіх магістраў»[12]. У гістарычнай літаратуры Путувера атаясамліваюць з князем Будзівідам, які разам з братам Будзікідам у 1289 годзе перадаў валынскаму князю Мсціславу Ваўкавыск. Будзікіда індэнтыфікуюць з упамянутым у ордэнскіх дакументах «Regis Butegey de». Гісторык І.Пузына лічыць, што Будзікід правіў Наваградкам, Слонімам, Ваўкавыскам і, магчыма, Гародняй, а Будзівід — паўднёва-ўсходняй Жамойцю, воласцю Паграўдзен, дзе на правым беразе ў вярхоўі ракі Юры, вышэй Таўрогаў, існавала асада Будывіцэ, паўднёва-ўсходняй Яцвязю ці Дайноўскай зямлёю з Райгорадам[13]. Але асноўныя ўладанні Будзівіда—Путувера знаходзіліся на левым беразе Нёмана на Судава-яцвяжскай зямлі, дзе зафіксаваны чатыры тапонімы Будвіцы, а таксама цэлы комплекс падобных назваў у кальварыйскім (3 вёскі), марыямпольскім (3 вёскі), уладыслаўскім паветах. Тут магла быць галоўная рэзідэнцыя Будзівіда[14]. У гэтым рэгіёне каля замка Хрыстамемель знаходзілася і сядзіба Віценя[15]. Пэўна, Будзівід стаў вялікім князем пасля смерці Будзікіда, дзесьці ў 1290 годзе, і правіў да 1294—1296 гадоў, бо менавіта ў 1296 годзе Віцень названы каралём Літвы[16].

На нашу думку, Віцень паходзіў з роду, які па жаночай лініі быў звязаны з Міндоўгам. Вядома, што ў Міндоўга была сяст-

ра, яе сын Транята стаў нават вялікім князем. Верагодна, яна была замужам за судава-яцвяжскім князем Скаламендам. Сапраўды, князь з падобным імем (Скоманд) сустракаецца ў яцвягаў.

Апроч Траняты ў Скаламенда (Скоманда) былі таксама сыны Будзікід і Будзівід, а магчыма, Скуманд, пра якога ўзгадвае Дузбург. Пасля смерці Тройдзеня да ўлады ў Літве прыходзіць князь Даўмонт, які названы вялікім князем і які загінуў пад Цверру ў 1285 годзе. Магчыма, ён быў сынам Траняты, бо, паводле Густынскага летапісу, ён меў за жонку дачку Даўмонта Нальшчанскага[18]. Дык вось, у гонар свайго дзеда Даўмонт і мог атрымаць імя. Сынам Траняты названы князь Полюш[19]. Вядомы Полюш і па хроніцы Дузбурга. Там паведамляецца, што ў 1286 годзе Полюш (Пелузе), пакрыўджаны «адным каральком», які быў другім пасля караля літвінаў, перабег у Ордэн[20]. Па часе гэтая падзея адбылася пасля смерці Даўмонта. Як сын Траняты і брат Даўмонта, Полюш меў права на вялікае княжанне, але ў выніку міжусобнай барацьбы быў выгнаны з Літвы. Да ўлады прыйшлі яго дзядзькі Будзікід і Будзівід, магчыма, таму новая дынастыя зброяй устанаўлівала ўладу ў Жамойці, а таксама прэтэндавала на Усходнюю Прусію як на сваё дзедзічнае ўладанне[21].

І яшчэ адну таямніцу трэба раскрыць. Дзе ж княжыў Віцень? Які горад быў пры ім сталіцай Вялікага княства Літоўскага? Кернаў* — сцвярджае «Хроніка Быхаўца»[22]. Ведаем, што Наваградак пры Міндоўгу і Войшалку стаў першай сталіцай новай дзяржавы. Гэта зафіксавана ў крыніцах, дзе горад называюць «королевоу»[23]. Памяць пра гэта захавалі і беларускія паданні. Тое, што Тройдзень сядзеў у Наваградку, вынікае з тагачаснай традыцыі: валадар дзяржавы абавязаны валодаць сталіцай і абвяшчаецца там на валадарства. Значыць, Тройдзень як Войшалкаў наступнік павінен таксама сядзець у Наваградку. Па той жа логіцы і Віцень павінен быў уладарыць у Наваградку. Зноў няма пра гэта звестак. Існуюць толькі ўскосныя сведчанні. Возьмем пасланні вялікага князя Гедыміна і прачытаем іх уважліва. У адным з іх ён піша, што ягоны папярэднік Віцень прасіў папскага легата Францыска прыслаць да яго двух манахаў Ордэна мінарытаў, для якіх пабудаваў касцёл, але гэты касцёл спалілі крыжакі[24]. У другім пасланні Гедымін ясна дае зразумець, куды да сябе запрашаў мінарытаў Віцень і ў якім горадзе ён пабудаваў касцёл. Тэкст гучыць так: «...Мы два гады таму ў нашым горадзе Вільні пабудавалі адну царкву Ордэна прапаведнікаў, а таксама цэрквы Ордэна мінарытаў; у назва-

* Сучасны горад Кярнове ў Летуве.

ным нашым горадзе Вільня адну, у Наваградку — другую, якую спалілі прускія крыжакі...»[25]. Значыць, той касцёл мінарытаў, які пабудаваў Віцень, быў у Наваградку. Сюды да сябе і запрашаў Віцень манахаў-мінарытаў. Супадае гэтае Гедымінава паведамленне і з гістарычнымі падзеямі. Так, крыжакі ў сярэдзіне верасня 1314 года здзейснілі паход на Наваградак і разрабавалі, спалілі горад. І, як заўважае Гедымін у сваім пасланні, «у тым жа годзе мы загадалі адбудаваць»[26] касцёл. Такім чынам, не выклікае сумненняў, што менавіта ў Наваградку і княжыў Віцень і менавіта гэты горад быў сталіцай Вялікага княства Літоўскага.

І яшчэ адна загадка. Ці быў Віцень хрысціянінам? У нямецкіх хроніках ён прадстае як зацяты паганец. А між тым полацкі епіскап Якаў называе Віценя «сыном моим»[27] — так ён мог назваць толькі сваё духоўнае чада, а не паганца. На хрысціянства Віценя ўказвала і Кацярына II, якая адзначыла ў сваіх запісках, што ў святым хрышчэнні ён меў імя Лаўрэнцій[28]. Ды і дзейнасць Віценя выдае ў ім хрысціяніна. Ён вядзе барацьбу за заснаванне ў Літве праваслаўнай мітраполіі, запрашае ў Наваградак манахаў-мінарытаў. Паганец-князь не стаў бы клапаціцца пра пашырэнне хрысціянства ў сваёй дзяржаве.

ПАЧАТАК КНЯЖАННЯ

Віценева княжанне прайшло ў войнах з польскімі і жамойцкімі феадаламі, з прускімі і лівонскімі крыжакамі. Пра спакойнае жыццё прыходзілася толькі марыць. За 24 гады свайго княжання Віцень здзейсніў 11 паходаў у Прусію, 5 — у Лівонію, 9 — у Польшчу. Скарыўшы адну за другой прускія землі, тэўтоны выйшлі да межаў Вялікага княства Літоўскага. Толькі Нёман аддзяляў літвінскія і жамойцкія землі ад ордэнскіх уладанняў.

Ордэн адмаўляецца ад шырокіх наступальных дзеянняў і пераходзіць да тактыкі, якой карыстаўся ў войнах з арабамі, — будаўніцтва на новых землях замкаў, што выконвалі б ролю апорных пунктаў у далейшай заваёве Жамойці і Аўкштайціі і ў канчатковай мэце — Вялікага княства Літоўскага. Адзін за адным на Нёмане паспешліва ўзводяцца ордэнскія замкі: Рагніт, Тыльзіт, Хрыстамемель, Шалаўэнбург, Георгенбург, Марыенбург. Адначасова прускія рыцары актывізуюць сувязі з Польшчай і Лівонскім ордэнам, падбіваючы іх выступіць супраць Вялікага княства.

Трэба было абавязкова сарваць гэтую замову, не даць магчымасці саюзнікам адначасова выступіць на Літву. Таму Пу-

кувер вырашыў нанесці ўдар па Польшчы, і ў 1291 годзе ён паслаў Віценя на Брэст-Куяўскую зямлю. Куяўскі князь Казімір і польскі кароль Уладзіслаў Лакетак прасілі дапамогі ў магістра Мейніке фон Кверфурта. Супольны выступ палякаў і крыжакоў супраць Віценя закончыўся для іх ганьбай. Падчас бітвы Казімір і Лакетак са сваімі войскамі баязліва ўцяклі з поля, а за імі і крыжакі, напалоханыя, што ім нестае сіл змагацца, адступілі. Дузбург не хацеў занатаваць для гісторыі паражэнне крыжацкага войска. Таму ганебныя ўцёкі названы ім «адступленнем». Аднак ён усё ж вымушаны прызнацца, што адступілі браты-рыцары «не без вялікіх страт»[29]. Прызнанне вымушанае, але праўдзівае.

Паведамленне Дузбурга аб гэтым паходзе літвінаў — першая звестка пра Віценя. І сваё з'яўленне на арэне гісторыі адзначыў князь слаўнай перамогай. Будуць у яго перамогі, будуць і паражэнні. Аднак за скупасцю звестак не толькі цяжка ўявіць вобраз Віценя, але і даведацца, як правіў ён, што зрабіў вартага памяці нашчадкаў. Але і гэтыя скупыя звесткі даюць нам уяўленне пра Віценя як пра вялікага дзеяча нашай гісторыі.

У 1292 годзе магістр вырашыў здзейсніць паход на Літву. Было сабрана вялікае войска. Падчас паходу шпег папярэдзіў магістра, што літвіны чакаюць крыжакоў: «І нікому з вас не пазбегнуць пагібелі»[30]. Аднаго гэтага паведамлення хапіла, каб магістр напалохаўся і паспешліва адступіў назад. Эпізод вельмі красамоўны. Як бы ні ўсхваляў Дузбург смеласць і гераізм братоў-рыцараў, але на справе смелымі і гераічнымі яны былі, калі знянацку нападалі на мірныя вёскі, а вось калі супраць іх выходзілі віцязі, баязліва ўцяклі за муры сваіх замкаў. «Вось як з усіх бакоў братоў атачала небяспека»[31], — наракаў храніст.

У 1294 годзе адбыўся спусташальны паход на Польшчу, у Ленчыцкую зямлю. Віцень, маючы з сабою «тысячу и осьмьсот» воінаў, «тихо пред лесы в землю Ленчискую выедишь, кляшторы, костелы побурили, людей духовного и свецкаго стану, преложных и посполитых в неволю забрали, потым села и местечки огнём и мечем сплюндровали»[32]. Непадалёку ад Сахачова Віцень даў бой войскам князя Казіміра. Як заўсёды ў сечах, вялікі князь быў наперадзе сваёй дружыны, «мужне чинячи з неприятелями». У той бітве Віцень перамог войска куяўскага князя, а самога Казіміра забіў.

Некалькі іначай кажа аб гэтым паходзе Дузбург[33]. Віцень на чале 800 воінаў 6 чэрвеня напаў на Ленчыцу і захапіў яе. Сам гэты факт сведчыць, што паход літвінаў быў нечаканы для палякаў, бо ніякай абароны горада не падрыхтавалі. Храніст апісвае жорсткасці літвінаў, якія забілі 400 чалавек і яшчэ больш

узялі ў палон. На кожнага літвіна дасталося па 20 чалавек. А Віцень — гэта ўвасабленне сатаны. Ён у знак знявагі Бога чыніў святатацтва з святыняў, паліў касцёлы. Іначай ордэнскі храніст і не мог апісваць князя «язычнікаў». Дзікасць і жорсткасць гэтых «дзяцей д'ябла» апраўдвала вайну супраць іх, апраўдвала дзікасць і жорсткасць братоў-рыцараў. Зразумела, «язычнікі» павінны быць і злахітрымі. Калі за імі пагнаўся куяўскі князь Казімір з 1800 воінамі, яны заключылі перамір'е з мазавецкім князем Баляславам. А пасля напалі на Казіміра, які паверыў ім, і разбілі яго войска, а самога забілі.

Пасля гэтага Польшча хаця і не змяніла сваёй арыентацыі на саюз з Прускім ордэнам, але ўжо не здолела весці актыўную барацьбу супраць Вялікага княства Літоўскага. А гэта была перамога.

На карысць Вялікага княства складвалася становішча і ў Лівоніі. Віцень скарыстаў канфлікт рыжан з лівонскімі рыцарамі. (На той час ён быў ужо вялікім князем. Дузбург называе яго «каралём Літвы» ў паведамленні пад 1296 годам.)

Канфлікт наспяваў даўно. Ордэн імкнуўся падпарадкаваць сваёй уладзе Рыгу, патрабаваў сабе трэць гарадскіх даходаў. Уступіўшы ў Ганзейскі саюз, Рыга багацела ад гандлю. У руках рыжскіх купцоў назапасіліся немалыя грошы, на якія можна было наняць войска. Патрэбнасць у мечаносцах адпала. І варта было крыжакам чарговы раз напасці на рыжан, як яны паўсталі супраць Ордэна, разбурылі ордэнскі замак, рыжскага камандора павесілі за бараду. Магістр Бруна пачаў рыхтаваць войска для падаўлення паўстання. Ордэнцы захапілі рыжскага архібіскупа і кінулі яго ў вязніцу Ноермюленскага замка.

Віцень уважліва сачыў за падзеямі ў Лівоніі. Каб заахвоціць Рыгу да саюзу з Вялікім княствам, ён абяцаў рыжскаму архібіскупу хрысціць Літву. Абяцанне сваё падмацаваў тым, што пасылаў лісты да папскага легата Францыска і архібіскупа Фрыдрыха, просячы іх прыслаць каталіцкіх святароў, для якіх ён пабудаваў у Наваградку касцёл.

Віцень добра разумеў выгаду саюзу з Рыгай: Лівонскі ордэн пазбаўляўся надзейнага тылу і не змог бы весці вайну супраць Вялікага княства. Таму адразу, як толькі рыжане звярнуліся да яго з просьбай аб дапамозе, князь на чале войска рушыў на Рыгу, дзе злучыўся з гарадскім апалчэннем. Аб'яднанае войска авалодала рыцарскім замкам і крэпасцю Каркус. 1 чэрвеня 1298 года літвінская дружына і атрад рыжанаў сустрэліся на рацэ Трэйдры з арміяй Лівонскага ордэна. Сам магістр Бруна павёў крыжакоў у бой. Не паспеўшы пастроіцца ў баявыя парадкі, саюзнае войска пачало адступаць. Пад мячамі крыжакоў загінула восем соцень вояў. Здавалася, усё — паражэнне!

Ужо гучалі пераможныя крыкі ордэнцаў. У гэты небяспечны момант Віцень спыніў адступленне сваіх вояў, перашыкаваў іх і павёў у наступ. Удар быў настолькі сакрушальны, што крыжакі не вытрымалі і кінуліся наўцёкі. На полі сечы засталіся 60 ордэнскіх рыцараў і болей за тысячу пяцьсот крыжакоў. Загінуў і магістр Бруна.

Пасля гэтай перамогі Віцень стаў гаспадаром Ліваніі. Літвіны і рыжане ўзялі ў аблогу замак Ноермюлен, дзе сядзеў у вязніцы архібіскуп. Такога паражэння Ордэн не меў ніколі з дня свайго заснавання. Яшчэ адзін удар — і Ордэн перастаў бы існаваць.

У Прусію з Венецыі прыбывае вялікі магістр Ордэна Готфрыд Гогэнлоэ. Па ягонаму загаду на дапамогу лівонам выступіў з войскам кёнігсбергскі камандор Бертольд Бругавен. Разам з ім ехаў і прызначаны на месца забітага Бруна новы лівонскі магістр Готфрыд Рог. У Ліваніі прускія рыцары злучыліся з рэшткамі лівонскага войска і нечакана напалі на літвінаў і рыжанаў, што здабывалі Ноермюлен.

Нечаканы ўдар прынёс перамогу крыжакам. Саюзнікі страцілі 400 чалавек. Рыцары-мечаносцы былі выратаваны ад разгрому. Ад выгаднага саюзу з Рыгай давялося адмовіцца. Але мір, заключаны пасля гэтае бітвы з Вялікім княствам, звязваў Лівонскаму ордэну рукі, і той аж да 1330 года так і не змог дзейнічаць супраць Літвы і Полацка.

Самым недарэчным было тое, што здрадзіла Жамойць і прызнала ўладу Ордэна. Пасля спусташальных паходаў крыжакоў Жамойць не магла аднавіць свае сілы. Выратаванне бачылася ў пакорлівасці Ордэну. За сытае і спакойнае рабства трэба было плаціць крывёю літвінаў. Ордэн падбіваў жамойцкіх князькоў на вайну супраць Віценя. Давялося Віценю зброяй падначальваць Жамойць. Адбываліся крывавыя бітвы, дзе з абодвух бакоў гінула шмат воінаў. Ордэн толькі цешыўся з гэтай братазабойчай разні. Дузбург не хаваў задавальнення: «І ніколі падчас свайго праўлення кароль Літвы не мог дамовіцца з жамойтамі, каб разам выступіць супраць братоў»[34]. Аднак ці кажа ён праўду? Пад 1304 год ён абвяргае сам сябе, паведамляючы аб замку Гедыміна ў жамойцкай воласці Пограўда[35]. Гедымін быў братам Віценя, і з'яўленне яго ў Жамойці можна растлумачыць тым, што ён быў там Віценевым намеснікам.

Кароткі мірны час, які выпаў Вялікаму княству, Віцень імкнуўся выкарыстаць з найбольшай выгадай. Трэба было ўмацаваць сваю ўладу ў дзяржаве, зламаць супраціўленне жамойцкіх феадалаў, што падтрымлівалі немцаў, і галоўнае — Полацк. І ў Наваградку, і ў Полацку разумелі неабходнасць



Фрагмент з карціны Я.Стыкі «Клятва Вітаўта». Воіны-літвіны. *Пачатак XX ст.*

аб'яднання дзвюх дзяржаў у адну, каб агульнымі сіламі супрацьстаяць крыжацкаму і мангола-татарскаму ціску. Як адбылося гэтае аб'яднанне, пры адсутнасці дакументаў меркаваць цяжка. Але відавочна, што не вайсковай сілай, а на падставе «раду» — мірных пагадненняў. Ужо ў пачатку 1300 гадоў у грамаце полацкага епіскапа Якава, якая была адрасавана рыжскаму пробсту, Віцень згаданы як полацкі саюзнік.

Звычайна гісторыкі называюць як дату аб'яднання Полацка і Вялікага княства Літоўскага 1307 год. Лічыцца, што полацкі князь Канстанцін запаветаваў Полацк рыжскаму архібіскупу. Нібыта біскупавы людзі, прыбыўшы ў горад, пачалі насаджаць каталіцтва, а палачане паўсталі. Яны папрасілі дапамогі ў Віценя, і той са сваёй дружаный расправіўся з немцамі. На полацкі пасад быў выбраны Віценеў брат Воін. Можа, так яно і было? Аднак адсутнасць дакладнага фактычнага матэрыялу пра гэтыя падзеі выклікае сумненне ў іх рэальнасці. Яны застаюцца толькі гіпотэзай. Звычайна спасылаюцца на грамату-скаргу на Лівонскі ордэн рыжскага архібіскупа, у якой сярод іншых абвінавачанняў крыжакам ставіцца ў віну, што яны аддалі язычнікам біскупаў замак у Полацку. Калі ж прааналізаваць гэтае паведамленне, дык заўважым, што гаворыцца тут не пра горад, а пра біскупаў замак у ім, але гэта не адно і тое ж. І хто былі тыя паганцы? Чаму адразу літоўцы, калі ў вачах каталіцкай царквы язычнікамі былі і праваслаўныя хрысціяне? Па-другое, аніякага біскупскага замка ў Полацку ў тыя часы не было. Толькі ў 1406 годзе рыжскі архібіскуп атрымаў месца ў горадзе для пабудовы касцёла. Аб гэтым сведчыць і адказ ордэнскага пракуратара ў Рыме на згаданую скаргу, у якім ён даводзіў, што пункт аб Полацку ёсць выдумка архібіскупа, што ніякага архібіскупскага замка ў горадзе няма і таму ордэнцы не маглі яго аддаць язычнікам[36].

Так ці інакш, але аб'ядненне Літвы і Полацкай зямлі адбылося хутчэй за ўсё пры Віцені праз выбранне палачанамі сваім князем Воіна. Выгада ад аб'яднання была ўзаемная. Літва атрымала магчымасць прарваць гандлёвую блакаду Прускага і Лівонскага ордэнаў і весці гандаль з Полацкай зямлёй. У Віценевым войску з'явіліся дружыны «рускіх», на што ўказвалі ордэнскія і польскія хронікі пад 1293, 1298, 1306, 1308, 1311, 1315 гадамі [37]. Гэтымі «рускімі дружынамі» і былі вайсковыя сілы Полацкай зямлі, бо ні Ноўгарад, ні Пскоў, ні Масква, ні Галіч не пасылалі Віценю сваіх дружын. Ну а Полацк? Што выгадалі палачане? Калі меркаваць па пазнейшых граматах-прывілеях, якія атрымаў Полацк ад вялікіх князёў літоўскіх, яны захоўвалі вечавы лад, аўтаномнасць Полацкай зямлі, маёмасныя правы, непадуладнасць велікакняжацкаму суду, самастойнасць у пытаннях веры і гандлю. Полацкія купцы мелі права без мыта гандляваць па ўсёй Літве ў час, калі літоўскія купцы на межах Полацкай зямлі плацілі мыт. Выгоды для палачанаў відавочныя. Цяпер Полацк падчас вайсковых дзеянняў мог выкарыстаць дружыны з Літвы, і суседзі асцерагаліся нападаць на полацкія ўладанні. Не выпадкова амаль на працягу трыццаці гадоў на Полаччыне панаваў мір.

«ИЗМЫСЛИ СЕБЕ ГЕРБ»

Паводле летапісных звестак, менавіта Віцень прыняў герб «Пагоня» як адзін з галоўных атрыбутаў літвінскай дзяржавы. Вось як пра гэта кажа Густынскі летапіс: «А Витен нача княжити над Литвою, измысли себе герб и всему князству Литовскому печать: рыцар збройный на коне з мечем, еже ныне наричут погоня»[38]. Назва герба «Пагоня» ясна ўказвае на беларускае паходжанне яго, аб чым, дарэчы, пісаў і польскі гісторык М.Стрыйкоўскі. Італьянец Гваньіні, які ў XVI стагоддзі служыў на Літве, указваў, што ў мінулым гербам Наваградскага княства быў «езднік на белым кані ў чырвоным сцягу з шабляю над галавою»[39].

Трэба адкінуць меркаванне, што складальнік Густынскага летапісу скарыстаўся невядомай і не дайшоўшай да нас крыніцай і ўзяў адтуль звесткі аб Віценю. Папярэдні тэкст указвае, што летапісец браў звесткі з легендарнай часткі беларускіх летапісаў. Але там нічога не гаворыцца аб тым, што Віцень «измысли себе герб». Значыць, летапісец проста выказаў сваю гіпотэзу, выдаўшы яе за гістарычны факт. Мяркуем, што падставай для гэтага стала семантычнае значэнне імя Віцень. Летапісец, пэўна, ведаў, што слова «віцень» абазначае дубец або вітую пугу, якімі паганяюць жывёліну, іншае значэнне — паганяты. Да таго ж абвяшчэнне пагоні адбывалася праз рассылку віцей — гнутых галінаў вербалозаў, ці, як іх называлі, вітвы. Таму, зразумела, напрошвалася выснова, што «Пагоню» мог прыдумаць якраз «паганяты» Віцень. Аднак ні сфрагістычнымі, ні дакументальнымі дадзенымі гэта не пацвярджаецца.

Няма аднадушнага меркавання, як тлумачыць «рыцар збройный на коне з мечем». Можна дапусціць, што герб сімвалізаваў супрацьстаянне Вялікага княства Літоўскага і Ордэна. Згуртаванне ўсіх жыхароў дзяржавы адбывалася пад сцягамі з «Пагоняй». Само слова «пагоня» заключала ў сабе вызначэнне старажытнай літвінскай традыцыі: выгнанне ворага, калі ў пагоню за ім «адпраўляюцца не толькі рыцары, але і ўсякі мужчына, якога ён ні быў бы паходжання або становішча, толькі б ён насіў зброю»[40].

Беларускі гісторык В.Ластоўскі лічыў, што «рыцар збройны» — гэта выява святога Меркурыя Смаленскага. «Вера ў тое, што нацыянальны Крыўскі герой уставаў з гробу, узбройваўся ў сваю зброю, садзіўся на вешчага каня і выступаў у кожнай вайсковай патрэбе краю, падсунала мысль Крывічом выабражаць сьв. Мэркурага на дзяржаўных пячатках і дзяржаўных сьцягах»[41]. А можа, на гербе «Пагоня» адлюстраваны паганскі бог Ярыла? Міфалагема «коннага боства», «бога-вер-

шніка» была даволі шырока распаўсюджана сярод індаеўрапейскіх народаў. Узгадаем блізнят Ашвінаў ведыйскай міфалогіі, інда-іранскага Мітру, грэчаскага Арэса, лацінскага Марса, фракійскага Белерафонта. Галоўныя элементы «Пагоні» — вершнік на белым кані, меч, шчыт, шасціканцовы «крыж Ярылы» — робяць гэты герб генетычна ды тыпалагічна тоесным адпаведным персанажам міфалогій іншых індаеўрапейскіх народаў. Усіх конных персанажаў аб'ядноўвае іхняя медыяльнасць, г.зн. прыналежнасць сярэдняму свету індаеўрапейскага космасу. У дадзенай функцыі гэтыя багі апякуюцца сярэднім светам (а гэта, як правіла, людскі свет), злучаюць ніжні (падземны) і верхні (нябесны) свет, а таксама людскі свет і свет продкаў (дзядоў, памерлых, навіяў). У гэтай сувязі звяртае ўвагу шасціканцовы крыж на шчыце вершніка «Пагоні». Дзве гарызантальныя лініі сімвалізуюць ніжні ды верхні свет, вертыкальная (медыятар) — агонь, конь, сусветнае дрэва, купальскі і калядны шост і г.д. — злучае абода светы. Як Мітра, Белерафонт ды іншыя, а таксама беларускія казачныя героі і беларускі святы Юрый (хрысціянскае пераасэнсаванне вобраза Ярылы), Ярыла ездзіць на белым кані.

Але хутчэй блізкай да ісціны ёсць выснова Якава Ленсу, які лічыць прататыпам віцязя «Пагоні» Перуна. Ленсу сцвярджае, што «Ярылаў крыж» — нішто іншае, як трансфармаванае шасціспіцавае кола — салярны знак, як суадносіцца да бога-грамоўніка[42]. Паколькі, як лічылася, «Пераун есть мног», дык адной з яго іпастасяў, магчыма, быў Ярыла (Пярун—Ярун—Ярыла). На гэта можа ўказваць і тое, што Ярылу, як і Перуну, быў прысвечаны чацвер. Ярыла спалучаў функцыі бога ўрадлівасці і вайсковыя функцыі Перуна. А на адным з гербаў «Пагоні» вершнік змагаецца са змеем. Пярун і быў богам — змеяборцам. Такім чынам, можна сцвярджаць, што бог-вершнік у «Пагоні» ўвасабляў бога-грамоўніка Перуна. Культ Перуна быў вельмі шанаваны ў старажытнай Беларусі. Верагодна, народныя апалчэнні, якія ішлі ў пагоню на ворага, мелі сцягі з выбражэннем воіна-вершніка, які сімвалізаваў апекуна воінаў Перуна. Пазней «Пагоня» з ваярскага герба стала земскім гербам на Беларусі, што і абумовіла выбар яго за дзяржаўны герб. Канешне, традыцыя пагоні сягае ў далёкае мінулае, а з ёй і выкарыстанне на баявых харугвах герба «Пагоні». Так, што і ў часы Віценевы літвіны змагаліся пад гэтым гербам. Можа быць, сапраўды Віцень першым прыняў яго за герб сваёй дзяржавы.

«І ПАНАВАЎ ШМАТ ГАДОЎ»

...Пачатак XIV стагоддзя Вялікае княства Літоўскае сустракала, вытрымаўшы ўжо не адно выпрабаванне і здолеўшы не толькі абараніць свае землі, але і набыць новыя. Краіна ведала сваю сілу і разумела, што ўся вайна з крыжакамі яшчэ наперадзе. Жыццё працягвалася. Жыццё, за якое трэба было плаціць крывёю.

У 1304 годзе Прускі ордэн папоўніўся рыцарамі з Германіі. Быў сярод іх знатны госць — граф хомбургскі Вернер. Крыжакі нанеслі двайны ўдар. Адзін атрад на чале з брандэнбургскім комтурам Конрадам фон Ліхтэнхаймам напаў на Гарадзенскую воласць. Але, даведаўшыся, што каля Гародні стаіць літвінская конніца, крыжакі вярнуліся ў Прусію. Адначасова другі атрад у дзве тысячы крыжакоў пад зверхнасцю кёнігсбергскага комтура Гебхарда фон Бірнербурга пайшоў у Жамойць. Але і тут іх чакала няўдача. Гэтак не ўзялі яны замак Гедыміна, затое спустошылі воласць, забілі і ўзялі ў палон тысячу «язычнікаў». У тым жа годзе кёнігсбергскі комтур паўтарыў паход на Жамойць і спустошыў прадмесце замка Аўкайм. Крыжакі перабілі ўсіх мужчын, а дзяцей і жанчын забралі ў няволю.

Наступны паход у жніўні 1305 года закончыўся для крыжакоў няўдачна. Яны спалілі тры вёскі, а жыхароў, як звычайна, ці забілі, ці пабралі ў няволю. Віцень у гэты час праводзіў сойм. Калі ён даведаўся аб варожым нашэсці, дык на чале 1500 воінаў выступіў на ворага. Літвіны дагналі крыжакоў і напалі на яго. У баі загінула чатыры рыцары і шэсць простых воінаў. Крыжакі паспешліва адступілі. У 1306 годзе магістр Зан двойчы пасылаў ордэнскае войска на Гародню. Крыжакі па-ранейшаму прагнулі авалодаць гэтай крэпасцю. Зноў спалены гарадзенскія прадмесці. Шэсць тысяч крыжакоў рынуліся на штурм замка. Ягоныя абаронцы адбілі штурм. Гэта быў сёмы — з 1284 года — напад крыжакоў на горад. Усё больш акрэслена вызначаўся напрамак галоўнага ўдару Прускага ордэна — Верхняе Панямонне і Наваградская зямля. Віцень прыклаў нямала намаганняў для ўмацавання Гародні. Старастам горада ён прызначыў сына былога нальшчанскага князя Даўмонта — Давыда.

У 1311 годзе новая бяда: на Літве, у Польшчы, Прусіі пачаўся страшэнны голад. Памяць пра яго захавалася аж да XVI стагоддзя, калі пісаліся летапісы і хронікі Літвы. «Матки и отцы убогие дети свои ели, иншие трупы умерлых и розмаитые гноі и плюгавства людские ели, и голод незносный свой тым усмирали навет: гды ишол хто, либо муж який сам, або жонка якая,



Фрагмент з барэльефа з Мальбаргскага замка.
Хрышчэнне крыжакамі прусаў. *XIV ст.*

хлопец або девка улицею выпадали з хат, з дворов иншие люде, хватали и забивали и ели»[43]. Трэба было нешта рабіць. І Віцень напрыканцы лютага з дружынай нападае на прускія землі Самію і Натангію. Але не палонных, не багатую здабычу браў, а хлеб.

І вось ужо гараць прускія сёлы, лямантуюць жанчыны, плачуць дзеці, пад мячамі вояў гінуць мужчыны, якія асмеліліся ўзяць у рукі зброю. Што думаў у такія хвіліны Віцень? Апраўдваў пралітую кроў, знаходзіў доказы, каб супакоіць сябе? Калі ён не расправіцца з нямецкімі каланістамі сёння — заўтра яны ўжо будуць рабаваць яго Бацькаўшчыну. Гэта так — колькі прыкладаў, уся гісторыя барацьбы з крыжакамі сведчанне таму. Кроў за кроў... Хто яму суддзя? Бог, які дазваляе, каб ад яго імя забівалі дзяцей і жанчын? Тыя, хто называў сябе Хрыстовымі рыцарамі? Нашчадкі? Дзеці тых, каго ён сёння з мячом у руках бароніць ад крыжацкай смерці? Нашчадкі — яны ягоныя суддзі. Апраўдаюць, будуць ганарыцца ім або праклянуць, нагадаюць і яму пралітую кроў... Такі лёс уладароў.



М.Андрыёлі. Бой літвінаў з крыжакамі. *1883 г.*

У адказ крыжакі напалі на жамойцкую воласць Пограўда і спустошылі яе так, «што яна на працягу многіх гадоў не магла аднавіць ранейшыя сілы»[44]. Адначасова 400 крыжакоў рабавалі і палілі прадмесці Гародні. Віцень, помсцячы, з войскам у чатыры тысячы воінаў у сакавіку напаў на Прусію.

7 красавіка 1311 года Віценева дружына спынілася на адпачынак каля горада Растэнбурга*. Ноччу баявы стан акружылі крыжацкія атрады, якія ўзначальваў вялікі маршал былы прускі магістр Генрых фон Плоцке. Першыя сонечныя промні асвяцілі закутыя ў браню шэрагі ордэнскай арміі. Па загаду вялікага маршала тэўтоны рушылі ў бой. Літвіны, схаваўшыся за плот, якім быў абнесены лагер, доўга стрымлівалі штурм і забілі 60 крыжакоў. Калі ордэнцы ўсё ж такі ўварваліся, цесната, абмежаванасць прасторы не дазволілі Віценю манеўраваць войскамі. Адзін за адным гінулі ягоныя воі. Толькі невялікай жменьцы дружыны разам з вялікім князем удалося вырвацца

* Цяпер Кентжын.

з акружэння, адарвацца ад пагоні і з цяжкасцю дабрацца да Літвы.

Гэтае паражэнне Віценя Дузбург падае як Божую кару князю-язычніку, які нібыта здзекліва казаў палонным хрысціянам: «Дзе ваш Бог? Чаму не дапамагае вам, як нашы багі дапамаглі нам сёння і ў другі раз?»[45]. І Бог «дапамог» хрысціянскім воінам разбіць язычнікаў. Але не дапамог Бог крыжакам, калі яны прыйшлі ў 1314 годзе да Наваградка. Ордэн вырашыў нанесці ўдар літвінскай дзяржаве ў самае сэрца — па яе сталіцы Наваградку.

Пад зверхнасцю таго ж Генрыха фон Плоцке прыйшлі на Крывіцыю. Дзе ў гэты час знаходзіўся Віцень? Застаецца толькі гадаць. Можа, ён і кіраваў абаронай Наваградка, але пра гэта маўчаць ордэнскія хронікі, якія апісвалі крыжацкі паход.

Давыд Гарадзенскі, які са сваёй дружынай з Гародні захапіў крыжацкі стан, абоз, коней і харчы і тым самым вымусіў крыжакоў адступіць ад Наваградка. Загуба дзвюх крыжацкіх армій давала Віценю магчымасць адкінуць крыжакоў ад Нёмана. У верасні 1315 годзе ён вядзе войска на ордэнскі замак Хрыстамемель. 17 дзён літвіны абстрэльвалі замак з камнямётаў і лукаў, штурмавалі яго. Крыжакі, каб выратавацца, запалілі прадмесце. На дапамогу замку прыплыў на караблях атрад у 50 воінаў. Аднак літвіны занялі ўсе подступы да замка і не далі атраду высадзіцца на бераг. На 17-ы дзень Віцень зняў аблогу. Гэты паход быў апошняй справай вялікага князя Віценя. Вяртаючыся назад на Літву, Віцень быў забіты ўдарам маланкі. Паводле другой версіі, якую выказалі нямецкія хронікі, Віценя забілі Гедымінавы слугі.

Вось і ўсё, што ўдалося даведацца пра чалавека, імя якога данеслі нам летапісы. Данеслі толькі этапы ягонага бурлівага жыцця — перамогі і паражэнні, а паміж імі было штодзённае жыццё, пра якое мы нічога не ведаем. Легендарным было яго нараджэнне — легендарнай стала і смерць.

ДОБРЫ ВАЛАДАР





ГЕДЫМІН
(?—1341)
Гравюра з «Хронікі Еўрапейскай Сарматыі» А. Гваньіні. ***1578 г.***

ГЕДЫМІН

Жыццё і праўленне Гедыміна* за адсутнасцю дастатковай колькасці гістарычных крыніц таксама ахутана таямніцамі і невядомасцю. Шкада. Тыя нямногія звесткі, што дайшлі да нас, не даюць уяўлення пра вобраз гэтага чалавека. Можа быць, красамоўней за ўсе характарыстыкі кажуць яго справы? Калі іх аналізаваць, дык перад намі паўстае велічная і цэласная постаць уладара Вялікага княства — мужнага змагара з ворагам, таленавітага палкаводца, разважлівага палітыка. Аднак загадак нямала пакінуў нам Гедымін.

У беларускіх летапісах Гедымін названы сынам Віценя. Доўгі час так і лічылася. Аднак у XIX стагоддзі, калі былі надрукаваны лівонскія акты, то высветлілася, што ў лісце рыжскага магістрата да Гедыміна ў 1322 годзе ён названы братам Віценя[1]. Амаль нічога не вядома пра дзейнасць Гедыміна да велікакняжацкага перыяду. Дзе ён быў, чым займаўся? Толькі можна дапусціць, што ён быў Віценевым намеснікам у Аўкштайціі, бо ў ордэнскіх дакументах ён названы каралём гэтай зямлі[2]. Мяркуючы па тым, што ў Клайпедскай зямлі знаходзіліся вёскі, назвы якіх паходзяць ад яго імя, а ў жамойцкай воласці Поўградзе Дузбург узгадвае замак Гедыміна, то, пэўна, ён валодаў гэтымі землямі.

З самага пачатку свайго праўлення Гедыміну давялося весці вайну з крыжакамі. Ордэн па-ранейшаму агнём і мячом наступаў на Вялікае княства. Зімой 1316 года маршал Генрых фон Плоцке здзейсніў паход у воласць Пастовія і забіў, і ўзяў у няволю 500 чалавек. Вярнуўшыся ў Кёнігсберг, ён сустрэў там рыцараў з Нямеччыны, сярод графаў Берга з Наенара і

---

* Паводле П.Урбана, імя Гедымін азначае «Добры валадар». (Урбан П. Старажытныя ліцьвіны. С. 143.)

Арнольда фон Эмера. Для знатных гасцей быў наладжаны паход на жамойцкую воласць Медзенікі. Гэты паход закончыўся смерцю 50 крыжакоў. Адначасова яшчэ адзін крыжацкі атрад ваяваў у прадмесці замка Бісены, а вясной крыжакі заваявалі і замак. Летам яны зноў напалі на Медзенікі і спалілі дзве вёскі. І гэта толькі за адзін год. Ордэн упарта імкнуўся завяваць Жамойць, каб злучыць свае прускія і лівонскія ўладанні. Тактыка была простая, але эфектыўная — ператварэнне Жамойці ў пустыню. Таму Ордэн знішчаў насельніцтва або выводзіў яго ў няволю, вёскі і месцы паліліся.

Крыжацкія паходы адбываліся і ў 1317 годзе. Летам крыжакі спустошылі воласць Поўграда і штурмавалі замак Гедыміна, але былі адбіты. У верасні Генрых фон Плоцке спаліў пасля няўдалага штурму Вялоны замкавае прадмесце. Напады на гэты замак паўтарыліся ў 1318 і 1319 гадах. У 1320 годзе ордэнскае войска на чале з ваяўнічым маршалам пайшло на Жамойць.

Па словах «Хронікі Літоўскай і Жамойцкай», крыжакі падзялілі «войска свои натрое, всю землю Жамойтскую огнем и мечем сплюндровали и завоевали без отпору и Юрборку замку добыли»[3]. Гедымін паслаў ваяводу Гаштольда «з людом малым» на абарону Коўны. Дзень і ноч штурмавалі рыцары замак: то рабілі падкопы пад вежы, то закідвалі сцены з парокаў каменнямі, то білі іх таранамі, то ішлі на прыступ. Як мужна ні змагаліся абаронцы, але крыжакі «мнозством своим» перамаглі іх і ўварваліся ў замак. Пачалася жорсткая расправа з тымі, хто яшчэ ацалеў. А пасля, «выдравши» ўсё, што было ў замку, крыжакі спалілі яго. Жанчын і дзяцей пагналі ў палон. Трапіў у няволю і Гаштольд.

Чым займаўся ў гэты час Гедымін? Ён стаяў з войскам і з атрадам татар паміж Юбаргам і Коўнай і чакаў падыходу дружын з Наваградка і Полацка. І толькі калі падаспела дапамога, вялікі князь выступіў супраць крыжакоў. Каля мястэчка Жэймы ён спыніў войска. Сюды падышлі і крыжакі. Перабежчыкі-жамойты паведамілі князю аб «шиках и поступках военных» ордэнцаў. Гедымін паставіў наперадзе татараў, а сам з галоўнымі сіламі (вальным гуфам) заняў цэнтр, па краях знаходзіліся наваградскі і полацкі палкі. Бітва адбылася 27 ліпеня.

Першымі бітву пачалі крыжакі, якіх павёў за сабою Генрых фон Плоцке. Іх сустрэлі татарскія загоны. Узброеныя ручніцамі («которые того часу были вымышленны»)[4], крыжакі адкрылі стральбу. Татары адказалі градам стрэлаў, але ўсё ж не вытрымалі ціску закутых у браню рыцараў і адступілі. Паверыўшы ў лёгкую перамогу,крыжакі пагналіся за татарскай конніцай, збліталі баявы шыхт і трапілі ў засаду, дзе з галоўнымі сіламі стаяў Гедымін. Завязалася крывавая сеча... «А так

немцы зброею, а Літва хибкостю перемагала, копиями, мечами, потисками срогую битву з обу сторон ведучи, крик людей, громот збройных, рзане коней, звук труб и бубнов»[5], — распавядае «Хроніка Літоўская і Жамойцкая».

Амаль цэлы дзень кіпела бітва. Ні адно з войскаў не дабівалася перамогі. Лёс бітвы вырашыла паўстанне жамойтаў. Некалькі тысяч іх знаходзілася сярод запасных атрадаў крыжацкага войска. У самы разгар сечы жамойты ўдарылі па крыжаках. «Замешалися немцы зараз, обачивши несподеваную здраду»[6], а гэтага хапіла, каб Гедымінавы харугвы перайшлі ў наступ. Наваградскі і полацкі палкі з абодвух бакоў агарнулі ордэнскае войска. Але і ганебныя ўцёкі не выратавалі рыцараў. Літвінскія воі гналі ворага некалькі міль, «биючи, стинаючи, колючи, стреляючи, топячи и имаючи так, иж на килканадцеть миль по дорогах и полях трупу немецого полно было»[7]. Тых жа, хто выратаваўся ад пагоні, пераймалі жамойты, нападалі, скідалі з коней і забівалі. Нават сабак пускалі па следу, каб толькі знайсці ненавіснага ворага. Загінула 22 рыцары і 220 воінаў. У гэтай бітве загінуў і славуты ордэнскі рыцар Генрых фон Плоцке.

Ад Жэймаў Гедымін рушыў на Прусію. Яго харугвы даходзілі да гарадоў Рагніта і Тыльзіта. Падчас гэтага паходу ў палон трапіў Полюш са сваімі паплечнікамі Драйкам ды Свідрылам. Па загаду Гедыміна іх пазбавілі жыцця.

Так пачалося слаўнае праўленне Гедыміна.

НОВАЯ СТАЛІЦА ВЯЛІКАГА КНЯСТВА

Пасля Віценя засталося не княства, а Вялікае княства. Літва, Наваградчына, Аўкштайція, Нальшчаны, Полаччына, а ўсё разам — буйная дзяржава, якую не аб'едзеш і за некалькі тыдняў. Розныя ў ёй жывуць народы, розным багам яны моляцца, нямала ў ёй гарадоў, слаўных і вялікіх. Трэба думаць аб адзінстве і згодзе ў краі, аб гандлі, узвядзенні новых цвержаў.

Рэдка быў князь дома. Клопат дзяржаўны вёў яго ў дарогу. У падарожжы па краіне Гедымін прыглядваўся, дзе можна паставіць замкі, каб перакрыць шлях крыжакам у глыб сваіх уладанняў. Так, на востраве возера Мядзела князь загадаў будаваць замак з магутнай вежай-данжонам. Узвялі замак і на востраве возера Тракай. А Гедымін марыць стварыць пояс замкавых умацаванняў па лініі Тракай — Вільня — Меднікі — Гародня — Наваградак — Ліда — Крэва. З усіх канцоў дзяржавы збіраліся майстры-будаўнікі, княжацкія цівуны зганялі просты люд насыпаць валы, капаць равы, цягаць камяні, выся-



М.Андрыёлі. Ляздзейка тлумачыць Гедыміну ягоны сон. *1887 г.*

каць лес. І праз стагоддзі ў народзе жыла памяць аб гэтых грандыёзных будоўлях і бытавалі выразы: «Каб цябе закаталі ў Вільню горы капаць!», «Каб ты на Крэўскі замак каменне цягаў!»[8].

Дзесьці ў гэты час Гедымін пераносіць сталіцу Вялікага княства з Наваградка ў Вільню і будуе на Крывой гары замак. Ужо ў 1323 годзе Вільня ў Гедымінавых граматах называецца каралеўскім горадам, г.зн. сталіцай. Лічыцца, што Гедымін сам і заснаваў горад. У якасці доказу прыводзіцца летапіснае паве-



М.Андрыёлі. Будаўніцтва Вільні. *1880-ыя гг.*

дамленне «Хронікі Быхаўца»: «У пэўны час паехаў князь вялікі Гедымін са стальца свайго Кернава ў ловы за пяць міль, за раку Веллю, і нойдзе гару ў пушчы красну, дубровамі і раўнінамі аблеглую, і спадабалася яму вельмі, і ён там пасяліўся і залажыў горад і назваў імя яму Трокі... І з Кернава перанёс сталец свой у Трокі, па малых часех паехаў пасля таго князь вялікі Гедымін у ловы ад Трок чатыры мілі і найдзе гару красну над ракою Вільняю, на якой натрапіў на звера вялікага тура і забіў яго на той гары, дзе цяпер завуць Тур'я гара. І

вельмі было позна ў Трокі ехаць, і стаў ён на луцэ, на Швінтарозе, дзе першых князёў спальвалі, і заначаваў. І калі спаў, убачыў сон, што на гары, якую звалі Крывая, а цяпер Лысая, стаіць воўк жалезны, вялікі, а ў ім раве, быццам сто ваўкоў вые. Прачнуўшыся, паклікаў Ляздзейку, якога калісьці знайшлі ў арліным гняздзе, і быў ён у князя Гедыміна варажбітом і найвышэйшым паганскім святаром. Расказаў яму князь усё, што ў сне бачыў. І той Ляздзейка кажа гаспадару гэтак: «Княжа вялікі, воўк жалезны азначае: сталічны горад тут будзе. А што ў яго нутры раве — гэта слава яго будзе лунаць на ўсім свеце». І князь вялікі Гедымін назаўтра ж, не ад'язджаючы, паслаў па людзей і заснаваў горад адзін на Швінтарозе — Ніжні, а другі на Крывой гары, якую цяпер завуць Лысаю, і дасць тым гарадам імя — Вільня. І, збудаваўшы гарады, перанёс сталец свой з Трокаў на Вільню»[9].

Так распавядае «Хроніка Быхаўца». Маляўнічае, прыгожае паданне. Але ордэнскі пасол Конрад Кібург, які пабываў у 1397 годзе ў Вільні, у сваім дзённіку адзначаў, што сон пра ваўка прысніўся Ляздзейку, які і распавёў пра яго вялікаму князю[10]. Як вярхоўны жрэц паганскай рэлігіі на Літве, Ляздзейка быў зацікаўлены, каб горад, дзе ён жыў, стаў сталіцай дзяржавы. Аднак гістарычная праўда зусім іншая. Нельга лічыць Гедыміна заснавальнікам Трокаў ды Вільні.

Гісторыкі В.Галубовіч і Е.Галубовіч на падставе археалагічных вышукаў устанавілі, што на гары Алтарыі, якая раней называлася Крывой, знаходзілася частка Вільні — Крывы-горад. На думку гісторыкаў, старажытнае гарадзішча Вільня магло існаваць пад назвай «Крывіч-горад» ужо ў XI—XII стагоддзях, калі полацкаму князю належала і частка літоўскіх земляў[11]. Але, па дадзеных археалогіі, паселішча крывічоў знаходзілася і на левым, усходнім, беразе ракі Вілії. Узведзены Гедымінам на Крывой гары замак ахоўваў гэтае паселішча ад варожых нашэсцяў з захаду.

Аб тым, што жыхарамі Вільні ў старажытнасці былі славяне, сведчаць гістарычныя назвы віленскіх вуліц і прадмесцяў: Зарэчча, Папоўшчына, Алтары, Пагулянка, Воўчая вуліца, Вострая брама, Гранічная вуліца, Воўчы брод, Востры горад, Лаварышкі, Паплавы, Саф'янікі, Верхні, Ніжні, Крывы замкі і інш. Ды і сама назва Вільні паходзіць ад беларускай назвы рэчкі Нярыс — Вільні. Таму цалкам правамерна тое, што ордэнскі храніст Віганд Марбурскі называе Вільню славянскім горадам[12].

Якая ж прычына прымусіла Гедыміна перанесці сваю сталіцу ў Крывы-град? Можна пагадзіцца, што гэтаму спрыяла выгаднае геаграфічнае становішча. Пэўна, не геаграфічнае

становішча гэтага горада вызначыла Гедымінаў выбар. Конрад Кібург лічыў: «У вайсковых адносінах становішча горада выдатнае, у ім можна абараняцца пры нязначных умацаваннях: шматлікія пагоркі, цясніны і глыбокія камілогі даюць вельмі зручныя ўмовы для нападу на тых, хто трымаў у аблозе горад. Пры такім становішчы можна ворага ўпусціць у горад і, акружыўшы, выразаць да апошняга чалавека, быў бы толькі гарнізон можны і верны і прытым пад умелым кіраўніцтвам — Вільні немагчыма нанесці асаблівыя шкоды. З гэтага вынікае, што не сон пра жалезнага ваўка і не прадказанне чарнакніжніка далі Гедыміну думку заснаваць тут сталіцу дзяржавы, але веданне вайсковай справы, прычым ён не мог не бачыць выгоды размяшчэння. Гедымін быў вялікім ваяводам свайго часу і варты прыкладу, хаця ён і паганец»[13]. Важным фактарам у пераносе сталіцы ў Крывы-горад з'явілася і тое, што ён быў рэзідэнцыяй вышэйшага паганскага жраца Крыва-Крывейты і тут знаходзіліся паганскія капішчы. Як адзначыў Конрад Кібург, «паганская Вільня сапраўды была гняздом д'ябальскай веры»[14]. Вось таму, каб узвысіць свой аўтарытэт, Гедымін і выбраў Крывы-горад за сталіцу дзяржавы. Хоць і сам Ляздзейка быў зацікаўлены, каб яго рэзідэнцыя стала цэнтрам дзяржаўнай улады, што ўзвышала і яго статус. Так ці інакш, а прадказанне Ляздзейкі збылося. Замест Крывы-горада паўстала славутая Вільня — сімвал велічы Літвы!

ПАХОД НА КІЕЎ

Паводле Мацея Стрыйкоўскага, валынскія князі, ведаючы, што Гедымін ваюе з крыжакамі, заключылі з імі саюз і рабілі набегі на Наваградчыну. У тым жа 1320 годзе вялікі князь павёў войска на Уладзімір-Валынскі. Ягоная дружына ў асноўным складалася з палачанаў, наваградцаў, гарадзенцаў. Гедымін вызваліў Драгічын і Бярэсце ад валынскіх гарнізонаў і рушыў на Уладзімір, дзе княжыў Уладзімір Уладзіміравіч. Валынскі князь «даў бой люты» літвінам. Пасля доўгага і ўпартага штурму горад паў, а князь Уладзімір загінуў у баі. Гедымін авалодаў і Луцкам. Леў Луцкі ўцёк да свайго зяця ў Бранск. Валынскія баяры білі чалом Гедыміну, каб ён правіў на Валыні. Князь прыняў у баяраў прысягу і, пакінуўшы на Валыні сваіх намеснікаў, вярнуўся ў Бярэсце, дзе застаўся зімаваць.

А навесну зноў пачалі збірацца харугвы. Цяпер Гедымін павёў іх на Кіеў.

Мінулі часы магутнасці былой сталіцы Русі. «Воля татарская» была над Кіевам, і кіеўскія князі пакорліва прызнавалі

сябе ардынскімі падданымі. Сціхлі славутыя рынкі, не радавалі мнагалюднасцю вуліцы, шмат храмаў ляжала ў руінах яшчэ ад Батыевых часоў. У гэты час у Кіеве сядзеў князь Станіслаў. Даведаўшыся, што на горад ідзе Гедымін, ён заклікаў на дапамогу Алега Пераяслаўскага, Рамана Бранскага, Льва Валынскага. Перад зброяй літвінскіх вояў адчынілі брамы Оўруч і Жытомір. Гедымін пераможна ішоў па Кіеўскай зямлі. На рацэ Ірпені, пад Белгарадам, яго ўжо чакала аб'яднанае войска рускіх князёў. Далей спашлёмся на «Хроніку Быхаўца». Вось як яна апісвае гэты паход Гедыміна:

«І быў бой і сеча вялікая, і дапамог Бог вялікаму князю Гедыміну, пабіў усіх князёў рускіх нагалаву і ўсё войска іх пабітае на месцы засталося, і князя Льва Луцкага і князя Алега Пераяслаўскага забіў, а Станіслаў Кіеўскі і Раман Бранскі з невялікім атрадам уцяклі ў Бранск.

І князь вялікі Гедымін узяў у аблогу горад Белгарад, і гараджане, бачачы, што гасудар іх з войскам уцёк, а войска ўсё напалову разбіта, і тыя, не жадаючы супраціўляцца такому магутнаму літоўскаму войску, здаліся з горадам князю Гедыміну і прысягнулі служыць Вялікаму княству Літоўскаму. Пасля князь Гедымін пайшоў з усімі сваімі сіламі да Кіева і абклаў горад Кіеў, а кіяўляне пачалі яго абараняць: і ляжаў князь вялікі Гедымін пад Кіевам месяц. А пасля вырашылі паміж сабою гараджане кіеўскія, што супраць сілы вялікага князя без гасудара свайго вялікага князя Станіслава Кіеўскага болей трываць не могуць. І пачуўшы тое, што гасудар іх князь Станіслаў уцёк ад Гедыміна і што войска гасудара іх усё пабіта, і ім у дапамогу ніякай сілы князь іх не пакінуў, і яны, змовіўшыся, аднадушна здаліся вялікаму князю Гедыміну. І выйшлі з горада з крыжамі ігумены, папы і дыяканы, і адчынілы вароты гарадскія, і сустрэлі вялікага князя Гедыміна з гонарам, і ўдарылі яму чалом: пачалі служыць яму і па тым прысягнулі вялікаму князю і білі чалом, каб у іх вотчын не забіраў. І князь Гедымін іх пры тым пакінуў і сам з гонарам уехаў у горад Кіеў.

І пачуўшы аб тым, прыгарады кіеўскія, Вышгарад, Чаркасы, Канеў, Пуціўль, Слепаўрод, што кіяне перадаліся з горадам, а пра гасудара свайго чулі, што ён уцёк у Бранск і што сілу яго ўсю пабілі, і ўсе прыйшлі да вялікага князя Гедыміна і пачалі служыць з тымі названымі кіеўскімі прыгарадамі, і прысягнулі на тым вялікаму князю Гедыміну. А пераяслаўцы, пачуўшы, што Кіеў і прыгарады кіеўскія падначаліліся вялікаму князю Гедыміну, а гасудар іх князь Алег забіты вялікім князем Гедымінам, і яны, прыехаўшы, пачалі з горадам служыць вялікаму князю Гедыміну, і на гэтым прысягнулі.

І князь вялікі Гедымін узяў Кіеў і Пераяслаўль і ўсе тыя пералічаныя прыгарадкі і пасадзіў у іх сына Міндоўга князя Альгімонта, вялікага князя Галышанскага, а сам з вялікай радасцю вярнуўся на Літву»[15].

Карамзін лічыў, што апавяданне «Хронікі Быхаўца» аб паходах Гедыміна на Валынь і Кіеў — выдумка летапісца. Тагачасныя рускія і польскія крыніцы не згадваюць пра тыя паходы. Болей падрабязна гэтае пытанне разгледзеў гісторык В.Антановіч[16]. Ён указваў на шэраг гістарычных недакладнасцей у апавяданні аб заваёве Гедымінам Валыні і Кіева. У прыватнасці, князі Уладзімір Валынскі і Раман Бранскі жылі зусім у іншыя часы. Уладзімір Валынскі памёр у 1289 годзе, а Раман Бранскі вядомы па падзеях 1264 года, калі супраць яго ваяваў Міндоўг. У пачатку XIV стагоддзя за бранскі пасад змагаліся князі Святаслаў Глебавіч і Васіль Аляксандравіч. Такім чынам, ні Уладзімір, ні Раман не маглі быць праціўнікамі Гедыміна. Выдумка летапісца і князі Алег Пераяслаўскі ды Станіслаў Кіеўскі. Пасля спусташэння Батыем Пераяслаўскага княства яно ўжо не існавала, і летапісцы не паведамляюць аб пераяслаўскіх князях.

Пра тое, што Валынь і Кіеў не былі заваяваны Гедымінам, сведчаць падзеі 1331 года. У гэтым годзе на Валынь прыехаў рускі мітрапаліт Феагност. З Уладзіміра-Валынскага мітрапаліт і паведаміў наўгародцам, што хоча асвяціць абранага імі ў архіепіскапы Васіля. Будучы наўгародскі ўладыка са світай баяраў адправіўся на Валынь праз Літву. Гедымін выкарыстаў зручны момант для шантажу Ноўгарада. Ён парушыў мір, звязеніў уладыку і яго світу. Адпусціў іх тады, калі наўгародцы абяцалі даць ягонаму сыну Нарымунту воласць. Васіль дабраўся да Уладзіміра, быў асвечаны мітрапалітам у наўгародскія архіепіскапы. Гедымін падтрымаў пскавічоў, якія ўжо марылі скінуць з сябе ярмо наўгародскай улады і стаць незалежнымі. Пскавічы прыслалі да мітрапаліта пасольства з просьбаю высвяціць выбранага імі ў епіскапы Арсеня. За іх прасіў і Гедымін. Наўгародцы, не жадаючы выхаду Пскова з Наўгародскай епархіі, прасілі мітрапаліта адмовіць пскавічам. Як паведамляе летапіс: «Арсений уехал со Псковичи посрамлен от митрополита».

Раззлаваны Гедымін загадаў сваім слугам перахапіць па дарозе Васіля і звязеніць яго. Наўгародскі ўладыка «поеха Киевъ, бояся Литвы». Калі ён аб'язджаў літоўскую мяжу «меже Литвы и Киева», дык атрымаў ад мітрапаліта вестку, што Гедымінаў атрад гоніцца за ім. Васіль паспяшаў і дабраўся да Кіева і адтуль накіраваўся да Чарнігава. Аднак каля гэтага горада на яго напаў кіеўскі князь Фёдар разам з татарскім баскакам. Атрымаўшы ад архіепіскапа выкуп, Фёдар адпусціў яго[17].

Як бачым, Кіеў не ўваходзіў у склад Вялікага княства і там сядзеў паднявольны татарам князь. Захоўвала сваю незалежнасць і Валынь. Там княжылі да 1324 года нашчадкі Данілы Раманавіча — князі Андрэй і Леў Юр'евічы. А з 1325 па 1335 год на Валыні сядзеў Юрый II. І толькі пасля яго смерці Валынь перайшла пад уладу Гедымінавага сына Любарта, які быў жанаты з дачкою Льва Юр'евіча і з'яўляўся законным спадкаемцам Юрыя II.

І ўсё ж цалкам адмаўляць магчымасць паходаў Гедыміна на Валынь і Кіеў нельга. Відаць, буйны татарскі набег у 1324 годзе на Вялікае княства быў прама звязаны менавіта з гэтымі паходамі. Зразумела, Залатая Арда ўстрывожылася наступам літвінаў на падуладныя ёй землі. Але, калі Гедыміну і ўдалося авалодаць Кіевам і Валынню, дык, пасля таго як татарскія загоны спустошылі землі яго дзяржавы, вялікаму князю няволей давялося адмовіцца ад заваяванага.

МІРНАЯ ІНІЦЫЯТЫВА ГЕДЫМІНА

Буйныя паражэнні Тэўтонскага ордэна ў вайне з Вялікім княствам выклікалі сур'ёзную трывогу папскай курыі. Папа Ян XXII прадпісаў манаскаму ордэну дамініканцаў прапаведаваць крыжовы паход на Літву і Жамойць і абяцаў крыжакам дараванне грахоў. Ён жа заклікаў германскіх феадалаў ускласці на сябе крыж і адправіцца на дапамогу Тэўтонскаму ордэну. Заклік папы Яна XXII да крыжовага паходу на Літву быў пачуты. Сярод крыжакоў былі знатныя асобы: Бернард, князь вроцлаўскі, граф з Гарольдзека, сыны графаў з Юліха і Вільдэнберга, багемскія рыцары. У Германіі сабралася вялікае апалчэнне крыжакоў, якое ў пачатку зімы 1322 года прыбыло ў Прусію і аб'ядналася з прускімі рыцарамі ў дваццацітысячнае войска. Яго ўзначаліў магістр Фрыдрых Вільдэнберг. Значных перамог крыжакі не дамагліся, затое далі волю сваёй сквапнасці ды жорсткасці. Усе сёлы на іх шляху былі разрабаваны і спалены, рыцары не шкадавалі ні дзяцей, ні жанчын. Былі спустошаны жамойцкія воласці Расіены і Эрыйгола. Так, пакідаючы пасля сябе попел мірных селішчаў, заваёўнікі дайшлі да крэпасці Піста.

Крыжакі не ўзялі штурмам цвержу, але абаронцы на другі дзень прызналі ордэнскую ўладу і выдалі заложнікаў. Пазней пад ціскам Гедыміна яны выракліся прысягі Ордэну. Пакуль крыжакі нішчылі Жамойць, Гедымін напаў на Лівонію і спустошыў Дэрптскае біскупства. Загінула і было ўзята ў палон 5 тысяч лівонцаў. Такім чынам, удар за ўдар. Вайна абяцала быць доўгай і крывавай.



Гедымін. *Партрэтная галерэя Сапегаў у Коўне. XVI ст.*

А да крыжакоў у Прусіі падаспела папаўненне з Чэхіі і Рэйнскіх земляў. Хоць і не хацелася магістру Вільдэнбергу ў мароз выбірацца з цёплых пакояў Марынбургскага замка, а давялося зноў весці рыцараў у паход. Аднак лютыя маразы былі мацнейшыя за зброю непрыяцеля, і крыжакі павярнулі назад.

Дабіцца перамогі над Ордэнам, спадзеючыся толькі на зброю, было немагчыма. Гэта разумеў Віцень, які ўмела выкарыстаў супярэчнасці паміж Лівонскім ордэнам і Рыгай. Разумеў і Гедымін.

У Лівоніі зноў склаліся спрыяльныя ўмовы для міру з Вялікім княствам. Зноў успыхнула даўняя звадка паміж рыжскім архібіскупам і магістратам Рыгі, з аднаго боку, і лівонскімі рыцарамі — з другога. Падставай да гэтага стала пакупка рыцарамі без згоды архібіскупа замка і манастыра Дынамюндэ ў манахаў тыстэрціянскага ордэна. Рыцары ведалі, што набывалі: замак і кляштар ахоўвалі рыжскі порт, і тым самым крыжакі бралі ў свае рукі гандаль — галоўную крыніцу багацця Рыгі. Тады архібіскуп пачаў закідваць папу скаргамі на крыжакоў. Цікава прывесці некаторыя вытрымкі з гэтых граматаў-скаргаў, каб у нас склалася ясная карціна аб норавах «воінаў Хрыстовых».

«Рыцары затрымліваюць дамініканцаў і мінарэтаў і нават накладваюць на іх гвалтоўна рукі, забараняючы ім прапаведаваць слова Божае ў паганцаў і новахрышчоных; рыцары не будуюць цэркваў для хрысціянскіх неафітаў, не даюць ім святароў, у выніку чаго народ у Лівоніі да гэтых часоў знаходзіцца ў той цемры, што і ад пачатку свайго хрышчэння, за выключэннем хрысціян, якія прыязджаюць сюды». «Паміж архібіскупам і суфраганамі, паміж біскупамі і іх капітуламі сеюць звадкі, і калі нападуць паганцы і пачнуць рабаваць, дык ордэнская брацыя і не думае супрадзейнічаць такім нападам, забыўшы мэту, з якою яны выкліканы ў гэтую зямлю, і забыўшы свой абавязак абараняць Рыжскую царкву. Праследуюць яны мячом усякага, хто заступіцца за архібіскупа пры рымскім двары, так што архібіскуп толькі з цяжкасцю знаходзіць чалавека, які даставіў бы рымскаму двару звесткі аб становішчы архібіскупа і яго царквы. Яны забілі аднаго такога чалавека, мовіўшы яму: «Папа табе дапаможа», яны прынялі паганскія звычаі: дабіваюць сваіх параненых і тулавы іх не хаваюць, а спальваюць»[18].

Калі б гэтыя абвінавачанні пацвердзіліся, Лівонскі ордэн чакаў бы лёс тампліераў, якіх папа за хцівасць і злачынствы аб'явіў ворагамі хрысціянства. Расправіліся над тампліерамі жорстка: іх судзілі, найболей уплывовых з іх пазбавілі жыцця, толькі ў Парыжы ў 1309 годзе папская інквізіцыя спаліла 54 храмоўнікі. Лівонскім рыцарам заставалася адмаўляцца ад абвінавачанняў рыжскага архібіскупа. Ордэнскія пракуратары пры папскім двары сцвярджалі адно: хлусня, намовы, Ордэн клапоціцца аб хрысціянах, нікога не праследуе, архібіскупа брацыя паважае, любіць і г.д. Аднак папа Клімент V паслаў у Лівонію легата, каб той на месцы ва ўсім разабраўся.

Болей за тры месяцы папскі легат вёў следства, дапытаў мноства сведкаў і пераканаўся ў вінаватасці рыцараў. Папа адлучыў Ордэн ад царквы, а на ордэнскія землі наклаў інтэр-

дыкт. І толькі подкуп папскай курыі выратаваў Ордэн ад загубы. У 1313 годзе пасля шчодрых паднашэнняў папскай булай было знята з Лівонскага ордэна адлучэнне ад царквы.

Рыжане так і не дамагліся праўды ў наступніка апостала Пятра, цяпер даводзілася спадзявацца толькі на свае сілы. 24 красавіка 1316 года гараджане напалі на кляштар Дынамюндзе і спалілі яго. Пачалася вайна паміж Рыгай і Ордэнам. Рыжскі архібіскуп звярнуўся са скаргай на Ордэн да папы. Ян XXII вырашыў учыніць новае следства, аднак замацаваў за рыцарамі Дынамюндзе. А ў 1321 годзе папа ўвогуле прыняў бок крыжакоў, прызнаўшы іх прэтэнзіі справядлівымі. Вось тут і нарадзілася ў рыжанаў думка звярнуцца па дапамогу да Гедыміна, каб ён пацвердзіў усе абвінавачанні ў адрас Ордэна і давёў папу, што галоўнай перашкодай у распаўсюджанні хрысціянства сярод паганцаў з'яўляюцца менавіта рыцары.

У 1322 годзе рыжскае пасольства прыбыло ў Вільню. Гедымін з ахвотаю прыняў прапанову рыжан заключыць мірны саюз. Рыжскім паслам удалося ўгаварыць князя звярнуцца да папы з пасланнем, у якім ён выкрыў бы Ордэн. А гэта было і ў інтарэсах Гедыміна: пазбавіць рыцараў ідэйнага шчыта, якім яны прыкрываліся ў заваёве балцкіх земляў. Пад дыктоўку Гедыміна два манахі-францысканцы, пераклаўшы яго словы на лаціну, склалі пасланне да папы.

«Найвышэйшаму айцу, папу Яну, першасвятару рымскага пасаду, Гедымін, кароль літвінаў і многіх рускіх.

Мы ўжо даўно чулі, што ўсе паслядоўнікі хрысціянскай веры павінны падначальвацца вашай волі і бацькоўскай уладзе і што сама каталіцкая вера накіроўваецца клопатам рымскай царквы, таму гэтым пасланнем мы паведамляем вашай міласці, што наш папярэднік кароль Міндоўг з усім каралеўствам прыняў хрысціянскую веру, але з-за абуральных несправядлівасцей ды шматлікіх здрад братоў Тэўтонскага ордэна ўсе адступіліся ад веры, так і мы з-за крыўд, што нам чыняць, да сённяшняга дня знаходзімся ў памылках нашых продкаў. Нашы папярэднікі неаднойчы накіроўвалі для заключэння міру да паноў рыжскіх архібіскупаў сваіх паслоў, якіх яны (тэўтоны) бязлітасна забівалі, як гэта сведчыць выпадак у часы пана Ісарна, што ад асобы папы Баніфацыя садзейнічаў устанаўленню міру паміж намі і братамі Тэўтонскага ордэна і адправіў нам сваё пасланне; але калі паслы ад пана Ісарна вярталіся, дык па дарозе адных забілі, другіх павесілі ці вымусілі ўтапіцца.

Таксама папярэднік наш, кароль Віцень, накіраваў пасланне пану легату Францыску, архібіскупу Фрэдэрыку з просьбаю прыслаць яму двух братоў Ордэна мінарытаў, даючы ім месца і пабудаваную царкву. Даведаўшыся пра гэта, браты прускія

Тэўтонскага ордэна паслалі вакольнымі шляхамі атрад і спалілі гэтую царкву.

Таксама яны захопліваюць паноў архібіскупаў і біскупаў, і клерыкаў, як сведчыць выпадак з панам Янам, якога забілі ў курыі ў часы папы Баніфацыя, і з панам архібіскупам Фрэдэрыкам, якога яны падманам выгналі з царквы; і з выпадку з адным клерыкам панам Бертольдам, якога яны ў горадзе Рызе бязлітасна забілі ў яго доме.

Таксама яны спусташаюць землі, як сведчыць прыклад Земгаліі і многіх іншых. Але кажуць яны, што робяць для таго, каб абараніць хрысціян.

Святы і паважаны айцец, мы з хрысціянамі вялі барацьбу не дзеля таго, каб знішчыць каталіцкую веру, але каб супрацьстаяць несправядлівасці, як чыняць каралі і князі хрысціянскія; гэта відавочна, паколькі ў нас жывуць браты Ордэна мінарытаў і Ордэна праведнікаў, якім мы далі поўную свабоду хрышчэння іншых абрадаў.

Мы, паважаны айцец, напісалі вам гэта таму, каб вы ведалі, чаму нашы продкі ўпалі ў грэх нявернасці і паняверкі. Але цяпер, святы і паважаны айцец, мы дбайна молімся, каб вы звярнулі ўвагу на нашае бядотнае становішча, паколькі мы гатовы, як і іншыя хрысціянскія каралі, за вамі ва ўсім ісці і прыняць каталіцкую веру, толькі б нас ні ў чым не прыцяснялі нагаданыя каты, а менавіта магістры і браты»[19].

Гэтую грамату Гедымін паслаў са сваім паслом у Рыгу. У дарозе крыжакі перахапілі яго і кінулі ў вязніцу. Аднак грамату знішчыць яны не асмеліліся, толькі разламалі пячатку і спалілі яе*. Гедымінавага пасла вызвалілі, і ён прыбыў у Авіньён, дзе жыў Ян XXII. У іншы час папа ўзрадаваўся б такому пасланню: апошняя цвержа паганства расчыніла перад ім браму. Як кажуць, плод сам падаў у рукі. Ды складанае становішча ў Еўропе вымагала асцярожнасці. Людовік Баварскі без згоды на тое папы абвясціў сябе рымскім каралём і германскім імператарам. Сваёю булаю Ян XXII загадаў Людовіку адмовіцца ад тытулаў. У адказ Людовік распаўсюдзіў граматы, у якіх абвінавацiў Яна, «які называе сябе папаю і дваццаць другім» у варожасці да міру, ерасі, хцівасці і г.д. Калі б Ян падтрымаў Гедыміна і Рыгу, дык настроіў бы супраць сябе Тэўтонскі ордэн, чым тут жа скарыстаўся бы Людовік Баварскі. Мінуў амаль год, а папа не прымаў ніякіх рашэнняў. Тым часам у Еўропе з'явіліся новыя граматы Гедыміна.

---

*Ліст без пячаткі ў сярэднявеччы не меў юрыдычнай сілы і ўспрымаўся як фальсіфікацыя.

Што гэта былі за пасланні? Войны з крыжакамі вымагалі ад урада Вялікага княства актыўнага будаўніцтва замкаў, развіцця рамёстваў, засялення спустошаных крыжакамі земляў. Гедымін і вырашыў звярнуцца да германскіх гарадоў і запрасіць на Літву перасяленцаў. З аднаго боку, гэта была эканамічная акцыя, а з другога — палітычная, накіраваная на ізаляцыю Ордэна. У пасланні ад 25 студзеня 1323 года да гараджан Любека, Штральзунда, Брэмена, Магдэбурга, Кёльна Гедымін, запрашаючы іх да сябе, абяцаў надзяліць зямлёю, даць гарадам, у якіх яны будуць жыць, магдэбургскае права, выслабаніць купцоў ад мыта, а святарам прадаставіць цэрквы і свабоду казанняў. Красамоўна гучыць абгрунтаванне Гедымінам яго запрашэння: «Бо наша жаданне цяпер — нікому не чыніць шкоды, але ўсім дапамагаць і замацаваць саюзам мір, братэрства і сапраўдную любоў з усімі вернікамі Хрыстовымі»[20]. У другім пасланні (ад 26 мая 1323 года) Гедымін таксама абяцае перасяленцам розныя льготы. Ён запэўнівае: «Клятваю абяцаем вам усім, што ўстановім такі мір, якога хрысціяне ніколі не ведалі»[21]. У гэтых словах — мэта Гедыміна, палітыка і чалавека, да якой ён шчыра ўсім сэрцам імкнуўся. І няўдачу сваю ён балюча перажываў. Паводле сведчанняў набліжаных да Гедыміна прыдворных, пасля таго, як не спраўдзіліся яго надзеі, ён па начах «горка плакаў».

Дзве граматы былі адпраўлены і да манахаў дамініканскага і францысканскага ордэнаў, у якіх ён запрашаў місіянераў на Літву.

З'яўленне гэтых пасланняў прымусіла папу паведаміць аб жаданні Гедыміна французскаму каралю Людовіку X і адправіць у Лівонію двух легатаў — Варфаламея, біскупа Алецкага, ды Бернарда, абата манастыра св. Тэафрыда. Пакуль яны ехалі ў Рыгу, да Гедыміна 6 жніўня 1323 года прыбыло пасольства ад духоўнай улады Лівоніі, рыжскага магістрата, Лівонскага ордэна і дацкага намесніка Рэвельскай зямлі. Былі зачытаны прывітальныя граматы. Паслы пацікавіліся ў Гедыміна, ці збіраецца ён выконваць сваё абяцанне. Князь не адказаў прама: «Як хутка прыедуць да мяне паслы ад папы, якіх я чакаю штодня, тады ўсё будзе вядома. Што я маю цяпер на сваім сэрцы, тое ведае Бог і я сам. Ад маіх бацькоў я чуў, што папа ёсць наш агульны айцец, бліжэйшыя за ім — архібіскупы, затым іншыя біскупы. Кожнаму чалавеку я дазваляю жыць у маёй зямлі па яго звычаі і па яго веры»[22].

Гедымін ухіляўся ад разгляду пытання аб веры і да пары да часу не раскрываў сваіх задум. Такое ўражанне, што ён або перадумаў прымаць каталіцкую веру, або сумняваўся ў правільнасці свайго рашэння. І для гэтага ўзніклі сур'ёзныя пад-

ставы. Як толькі стала вядома аб жаданні Гедыміна хрысціць у каталіцтва Літву, супраць яго выступілі жамойцкія феадалы. Яны пагражалі вялікаму князю захапіць яго разам з сям'ёй і з дапамогай тэўтонаў выгнаць з дзяржавы ці забіць. Такія пагрозы не былі пустымі словамі. У Жамойць ужо зачасцілі ордэнскія ваяжоры, якія дарамі падкуплівалі найбольш уплывовых жамойцкіх старэйшын. Тыя ж пагрозы Гедымін чуў і ад праваслаўных феадалаў, якія таксама занепакоіліся непрыемнай для іх перспектывай з'яўлення ў дзяржаве каталіцкай царквы.

Затое такі патрэбны мір з Лівоніяй Гедымін заключыў. Гэты мір прызнаў і Лівонскі ордэн, бо не асмеліўся не падпарадкавацца папскаму загаду спыніць вайну супраць Вялікага княства. Дамова прадугледжвала свабоду гандлю з Рыгай ды іншымі лівонскімі гарадамі.

Дамову адправілі да папы Яна XXII, і ён зацвердзіў яе ў ліпені 1324 года. Аднак Ордэн не мог чакаць, калі вырашаўся яго лёс. Калі б Гедымін прыняў каталіцтва, ахрысціў паганскае насельніцтва ў сваёй дзяржаве, само існаванне Ордэна станавілася бессэнсоўным. А там магло стаць, што папскі суд прыняў бы бок рыжскага архібіскупа. Адзіны спосаб унікнуць лёсу тампліераў — гэта расстроіць будучае хрышчэнне Літвы, вымусіць Гедыміна пачаць вайну з Ордэнам. Прускія біскупы паслалі грамату лівонскім уладарам такога зместу: «Вялікая спакуса будзе ў гурце Хрыстовым, непапраўная шкода нашай зямлі, калі вы не адмовіцеся ад міру з літвінамі. Гэтыя дзеці сатаны задумваюць хлусню і аблуду... Адкарміўшыся, як мыш у мяшку, як гадзюка за пазухай, яны ператвораць у нішто спачатку нас і нашы землі, пасля вас і вашы правінцыі... Не можа быць міру ў Хрыста з Веліалам, не павінна быць саюзу ў вояў Госпада з родам грахоўным і брыдкім, сынамі злачынстваў...»[23]

Прускіх біскупаў падтрымалі і манахі-францысканцы, што жылі ў Прусіі: яны таксама адправілі ў Лівонію пасланне, у якім заклікалі лівонцаў не верыць Гедыміну. «Нам справы вядомы паўней і лепш: Гедымін сапраўды разаслаў па розных краінах граматы, у якіх аб'яўляе за сябе, за сваіх і за ўсё сваё каралеўства жаданне хрысціцца, але, калі да яго прыходзілі з розных месцаў урачыстыя пасольствы, дык не толькі ўбачылі хлуслівасць у гэтых адносінах, але нават пачулі, як ён блюзнерыў супраць нашага Госпада Бога!.. Піша аб жаданні хрысціцца, а ў той час пасылае сваіх вояў на каталіцкія землі, якія перабілі восем тысяч народу, цэрквы папалілі, звялі ў палон мноства народу, святароў у тым ліку»[24].

І прускія біскупы, і манахі-францысканцы ставілі ў віну Гедыміну, што ён зброяй абараняе Вялікае княства і саюзны Пскоў ад крыжакоў. І, вядома, у граматах сваіх біскупы і фран-

цысканцы і словам не абмовіліся пра тыя зверствы, што ўчынялі крыжакі ў Жамойці, Аўкштайціі, Пскоўскай зямлі. За спусташэнне земляў біскупа і караля дацкага Гедымін абяцаў выплаціць любую кампенсацыю. Гэта яшчэ раз указвае аб яго шчырым жаданні трымаць мір з суседзямі. Кажучы аб «хлусні Гедыміна», тыя ж вусны самі хлусілі.

Лівонскі магістр Кетэльгод паддаўся ўгаворам прусакоў. У канцы 1323 года ён звярнуўся да рыжскага магістрата з прапановаю скасаваць мір з Вялікім княствам. Рыжане адмовіліся ад такой прапановы; урокі мінулага сталі добрай навукай. Рыжскі магістрат склаў грамату, у якой апраўдваліся дзеянні Гедыміна, і адправіў яе ў Любек. У тым жа годзе лівонскія рыцары заключылі саюз з Ноўгарадам, накіраваны супраць Пскова і Рыгі, па якому ўсіх рыжскіх купцоў наўгародцы павінны былі няволіць, а іх тавар адбіраць. На гэтую дамову Гедымін адказаў набегамі сваіх дружын на наўгародскія гарады Ловаць і Лукі.

Па ўсіх дарогах і рэках Лівоніі стаялі ордэнскія заставы, якія перахоплівалі кожнага, хто ехаў у Літву. Але гэтага крыжакам здалося мала. Буйны атрад рыцараў пранік да Мядзела. Не рашыўшыся штурмаваць замак, крыжакі расправіліся з мірнымі жыхарамі. «Таксама зямлю полацкую яны варожа спустошылі, людзей і коней захапілі і звялі; частку з іх яны вярнулі. Але, да немалой шкоды для душ сваіх, усё яшчэ гвалтоўна затрымліваюць дваццаць чалавек. Таксама роўна сорак дзён пасля яны зноў, нібыта драпежныя ваўкі, жорстка спустошылі тую ж зямлю, бязлітасна забілі восемдзесят чалавек, а некаторых звялі з сабой»,[25] — пісаў у Рыгу Гедымін. Ранняй вясною 1324 года ўжо прускія рыцары напалі на Гародненскую зямлю і спалілі маёнтак князя Давыда. У маі яны падступілі да прадмесця замка Гедыміна. Цяпер вялікі князь змог упэўніцца, што хрышчэнне язычнікаў у яго дзяржаве не спыніць нападаў крыжакоў, як не спыніў іх і папскі загад не ваяваць супраць Літвы.

ПЕРАМОВЫ З ПАПСКІМІ ПАСЛАМІ

У гэты час у Рыгу нарэшце прыбылі папскія легаты. Сярод стосу грамат, што яны атрымалі ад папы, была і була, якая вызначала паўнамоцтвы паслоў і дзе гаварылася аб хрышчэнні не паганцаў, а «схізматыкаў». Тэрмін «схізматыкі» папская курыя ўжывала ў дачыненні да хрысціян праваслаўнага веравызнання. Думаю, правільна заўважыў гісторык В.Васільеўскі, што папа пайшоў на кампраміс з Ордэнам, таму і прапанаваў

Гедыміну перавесці праваслаўных у каталіцтва, а паганцаў аддаць пад духоўную апеку крыжакам[26]. На такую здзелку Гедымін не мог пайсці, добра разумеючы, што гэта выкліча незадавальненне як з боку праваслаўных, так і паганцаў.

3 лістапада 1324 года ўпаўнаважаныя ад папскіх легатаў прыехалі ў Вільню. Увечары Гедымін запрасіў іх да сябе і прыняў у акружэнні сваёй пышнай світы. На прапанову прадстаўнікоў «абмеркаваць з ім справы» Гедымін адказаў: «Ужо позна, а вы прыбылі з дарогі, і пасля цяжкасцей трэба адпачыць і павячэраць у радасці і задавальненні»[27].

Наступнага дня паслы пайшлі да францысканцаў, якія мелі царкву ў Вільні, і да мшы размаўлялі з манахам Мікалаем, блізкім да двара Гедыміна. Паслоў цікавіла: ці застаўся вялікі князь верны сваім ранейшым намерам? Манах адказаў, што Гедымін не хоча прымаць веру Хрыстову. Тое самае паслам адказалі і іншыя манахі: «У караля былі добрыя намеры, але пад уплывам абставін, што нечакана ўзніклі, ён перадумаў»[28].

Пасля мшы і снедання паслоў запрасілі ў палац. Гедымін зноў сустрэў іх у акружэнні дарадчыкаў, што паслам не спадабалася, бо яны жадалі размаўляць з каралём адны. Паслы паведамілі Гедыміну: папскія легаты, «пасланыя дзеля вашага хрышчэння, якога доўга дабіваліся вы і вашы продкі, з вялікім нецярпеннем жадаюць бачыць вас, бо яны накіраваны дзеля вашага выратавання і ўзвышэння вашага каралеўства»[29]. Вось тут і высветлілася, што Гедымін і не збіраецца прымаць каталіцтва. Ён спытаўся, ці ведаюць паслы змест пасланння да папы. Тыя адказалі, што ў пасланні кароль жадае хрысціцца. «Я не загадваў гэтага пісаць, — мовіў Гедымін, — калі брат Бертольд так напісаў, дык няхай гэта падзе на яго галаву. Але калі ў мяне было калі-небудзь такое жаданне, дык няхай мяне хрысціць д'ябал. Я гатоў шанаваць папу, бо ён старэйшы за мяне, і пана архібіскупа я таксама шаную, як бацьку, бо ён старэйшы за мяне, а маіх аднагодкаў я буду шанаваць, як братоў, а тых, хто маладзейшы за мяне, як сыноў. Я не забараняю хрысціянам служыць Богу па іх звычаі. Рускім — па-свойму, а мы служым Богу па нашым звычаі, і ва ўсіх адзін Бог. І што вы мне кажаце аб хрысціянах? Дзе болей несправядлівасці, зла, гвалту, злахітрасці і хцівасці, як не сярод хрысціян, і асабліва сярод тых, якія выдаюць сябе за манахаў, як крыжакі? Няма зла, якога б яны не здзейснілі; яны бралі ў палон біскупаў, кідалі іх у вязніцы і трымалі да таго часу, пакуль тыя не згаджаліся на ўсе іх жаданні, іншых яны выганялі; яны забівалі духоўных асобаў і манахаў, гораду Рызе чынілі вялікія крыўды. З тых часоў, як з'явіліся тут гэтыя хрысціяне, яны ніколі не выконвалі таго, што абяцалі ў сваіх клятвах. Летась былі

тут паслы з вашай зямлі; з агульнай згоды, без усялякага прымусу яны заключылі мір з намі і ад імя ўсяго хрысціянства пацвердзілі дамову клятваю, цалавалі крыж і не стрымалі таго, што было замацавана клятваю. Яны забілі маіх паслоў, якіх я паслаў для зацвярджэння міру, і не толькі іх адных, але многіх іншых, і шмат разоў яны забівалі, бралі ў палон, трымалі ў цяжкім зняволенні — я не веру болей іх клятвам»[30].

Заслугоўвае павагі рэдкая на тыя часы верацярпімасць Гедыміна, асабліва чалавечная ў параўнанні з ваяўнічай нецярпімасцю да іншых рэлігій як з боку папскай курыі, так і з боку крыжакоў. Трэба згадзіцца з гісторыкам В.Васільўскім, які пісаў: «Каб прыйсці да ўсведамлення аб адзінстве Вярхоўнага Валадара, якому аднолькава служыць і пакланяецца кожны па-свойму — і польскі католік, і праваслаўны рускі, і літоўскі язычнік, — дзеля гэтага Гедымін павінен быў стаць вышэй за сваё паганства і нават вышэй свайго часу»[31].

Зразумеўшы, што хрышчэнне не прынясе жаданага міру з Ордэнам і, больш за тое, — настроіць супраць яго Жамойць і праваслаўнае насельніцтва Вялікага княства, Гедымін адмовіўся ад свайго намеру. Аднак князь не хацеў праславіцца як чалавек, які не выконвае свае абяцанні, таму ён і вырашыў перакласці ўсю віну на пісца, манаха-францысканца, які нібыта недакладна запісаў у пасланні яго словы. Дзеля гэтага ў прысутнасці паслоў адзін з Гедымінавых вяльмож учыніў допыт францысканцу. Бертольд адказаў, што ў пасланні пісаў тое, што чуў з вуснаў караля: што той жадае быць пакорлівым сынам і ўвайсці ва ўлонне святой царквы, прыняць хрысціянства і праславіць веру Хрыстову, бо ён усвядоміў сваю памылку. Вяльможа спытаўся: «Значыцца, ты ўспамінаеш, што кароль не загадваў табе пісаць аб хрышчэнні?»[32]

Паслы і сам Бертольд запярэчылі, што быць пакорлівым сынам і ўвайсці ва ўлонне святой маці-царквы гэта і значыць хрысціцца. Аднак гэты довад не пераканаў Гедымінавага вяльможу, ён заключыў, што менавіта Бертольд быў тым, хто ўвёў караля ў зман.

Пры гэтым допыце не прысутнічаў перакладчык, які быў паміж Гедымінам і Бертольдам, калі апошні пісаў пасланне да папы. Вось ад перакладчыка паслы і даведаліся аб цвёрдым намеры Гедыміна прыняць каталіцтва. «Я ведаю, што кароль быў перакананы ў сваім рашэнні хрысціцца, бо ён з вялікай ахвотай загадаў напісаць пасланне, а чаму ён ухіліўся, я не ведаю»[33].

Гедымін балюча перажываў крах сваіх спадзяванняў. Відаць, быў ён чалавек эмацыянальны і не мог стрымаць пачуцця расчаравання і крыўды. Каштоўнае сведчанне паслоў пра гэта:

«Пасля мы пачулі ад нейкага брата Ордэна мінарытаў, нібыта адна жанчына з прыбліжаных да каралевы адкрыла яму, што, калі мы там былі і пасля таго, як пайшлі з прыёму, кароль на ўсю ноч удаліўся ў сваю спачывальню, узяўшы з сабою сваяка Ерудоне, і горка плакаў і, перастаўшы, пачынаў зноў, і нібыта штоноч ён рабіў так тройчы і, як гэтая жанчына можа меркаваць, ён рабіў гэта таму, што ён павінен адмовіцца ад свайго першапачатковага рашэння»[34].

Хацелася б дадаць, што думка аб хрышчэнні паганскага насельніцтва сваёй дзяржавы Гедыміна не пакідала. Як цвярозы палітык, ён разумеў, што гвалтоўна гэта рабіць — значыць, настроіць супраць сябе вярхушку паганскага святарства, а гэта магло прывесці да паўстання. І ён выбірае іншы сродак. Я б назваў яго «ціхім, або мірным», хрышчэннем Літвы, калі праваслаўныя і каталіцкія святары без прымусу, а словам і дзеяннямі сваімі паварочвалі ў хрысціянства паганцаў. І вынік — пры афіцыйным хрышчэнні Літвы ў 1387 годзе было ахрышчана толькі 30 тысяч чалавек. Пры маўклівай згодзе Гедыміна, а можа, і з яго дазволу ў 1331 годзе віцебская князёўна Марыя Яраслаўна, жонка Гедымінавага сына Альгерда, разбурыла ў Вільні (!) паганскае капішча бога Рагуціса і ўзвяла на яго месцы царкву. Ды і сам Гедымін толькі ў палітычных мэтах рабіў выгляд, што ён вызнае паганства, бо адначасова прызнаваўся, што даўно ўвераваў у Святую Тройцу. А дзве яго жонкі — Вольга і Ева — былі праваслаўныя, і ўсе яго сыны, апроч Кейстута і Монвіда, прынялі праваслаўе.

25 лістапада 1324 года паслы легатаў вярнуліся ў Рыгу. Разам з імі прыбыў і Гедымінаў пасол, які заявіў, што вялікі князь ніякай іншай веры вызнаваць не будзе, акрамя той, у якой памерлі яго продкі.

На гэтым і скончылася місія папскіх легатаў. Яны да вясны засталіся ў Рызе, чакаючы навігацыі на Балтыйскім моры. Тут яны даведаліся, што рыцары захапілі ў палон і закулі ў кайданы Гедымінавага пасла Леся, а яго спадарожнікаў «рускіх» (праваслаўных літвінаў) абрабавалі. Толькі пасля настойлівых патрабаванняў легатаў Леся вызвалілі. Ён яшчэ раз ад імя Гедыміна пацвердзіў мірныя намеры ўрада Вялікага княства: «Кароль наш жадае строга шанаваць мір, калі толькі не будзе вымушаны неабходнасцю адмовіцца ад гэтага, абараняючыся ад сваіх ворагаў, варожым нападам якіх мы, як вядома, увесь час падвяргаемся»[35].

Крыжакі не жадалі выконваць мірную ўмову, хаця адначасова былі зацікаўленыя ў гандлі з Літвой. Яны заключылі з Гедымінам сепаратны ад Рыгі мір і вялі гандаль у памежных абласцях. А Гедымін яшчэ раз мог пераканацца ў двудушнасці

«воінаў Хрыстовых». Так, яны, згадзіўшыся перадаць яму два замкі, і не думалі гэтага рабіць. А пасля таго як рыцары забілі яго пасла да рыжскага архібіскупа, Гедымін не вытрымаў. Пасланае ім войска спустошыла Розіценскую зямлю. У той жа час Давыд Гарадзенскі на чале сваёй дружыны нанёс страшэнны ўдар па ордэнскаму саюзніку Мазовіі.

Рыжскі архібіскуп Фрыдрых, бачачы, што рыцары не выконваюць папскай булы аб захаванні міру, праклiў Ордэн і адлучыў яго ад царквы. Грамату прачыталі ў Рыжскім кафедральным саборы ў прысутнасці папскага пасла, абата Бернарда, а пасля яе прыбілі на браме храма. Цяпер усе чакалі адказных дзеяў Ордэна. Папскія паслы вырашылі своечасова пакінуць Лівонію і па моры адправіліся ў Любек. У Прусіі яны, згодна з папскай булай, патрабавалі прызначыць ім сутачнае ўтрыманне на 380 гульдэнаў. Ордэн адмовіўся плаціць такія грошы, і раззлаваныя паслы ўслед за рыжскім архібіскупам праклялі рыцараў.

БАРАЦЬБА З ОРДЭНАМ

Пасля паходу на Мазовію Давыда Гарадзенскага мазавецкія князі Земавіт і Тройдзень разам з біскупам Фларыянам Плоцкім звярнуліся з пасланнем да папы Яна XXII, у якім пісалі: «...хоць папскія легаты і заключылі мір паміж Літвою і Ордэнам на чатыры гады ў надзеі, што з цягам часу адбудзецца далучэнне да каталіцтва літоўскага князя (Гедыміна. — *В.Ч.*), але толькі гэтая надзея зусім падманлівая, бо князь літоўскі толькі сілаю зброі і вострага мяча можа быць прымушаны да перамены веры. Якімі вялікімі стратамі пагражае гэты мір хрысціянскім краінам, суседнім з Літвою, таго без глыбокага смутку і слёз і распавесці нельга. Дастаткова нагадаць спусташэнне і разрабаванне, што ўчынілі літвіны ў Добжынскай зямлі пад зверхнасцю князя Давыда Гарадзенскага. Калі ваша святасць не прыме выратавальных і хуткіх захадаў ад абароны хрысціян у Мазавецкай зямлі і асабліва ў Плоцкай епархіі, дык гэтыя язычнікі абагацяцца здабычаю і зброяй, умацуюцца падчас перамір'я, палепшаць свае памежныя ўмацаванні, як палепшылі ўмацаванні Гародні, што стаіць за некалькі міль ад нашай мяжы, і пад абаронаю гэтай крэпасці пачнуць свае спусташальныя набегі мацней за ранейшыя. Вельмі просім вашу святасць скасаваць мір і даручыць магістру і ордэнскай браціі, каб яны ваявалі літвінаў па-ранейшаму і абаранялі нашы землі і асабліва Плоцкую царкву супраць варожых нападаў, бо літоўскія язычнікі толькі і баяцца рыцараў, і дрыжаць перад імі»[36].

Услед за мазавецкімі князямі сваё пасланне напісалі і прускія біскупы, у якім таксама заклікалі не верыць Гедыміну і пачаць з ім вайну. Падобную эпістолю распаўсюдзіў і рэвельскі біскуп. Ордэн зноў разлічваў падняць супраць Вялікага княства Еўропу.

У гэты час Гедымін знайшоў саюзніка — польскага караля Уладзіслава Лакетку. Яшчэ ў 1309 годзе Ордэн з дапамогі брандэнбургскага маргграфа захапіў польскае Памор'е. Усе спробы палякаў мірным шляхам вярнуць страчаныя землі не прынеслі поспеху. Тады Уладзіслаў Лакетак і адправіў да Гедыміна пасольства з прапановаю сумесна выступіць супраць Тэўтонскага ордэна. Гедымін з радасцю прыняў прапанову польскага караля, і саюз з Польшчай быў заключаны. У Кракаў з Гедымінавай дачкой Альдонай, якая брала шлюб з сынам Лакеткі, Казімірам, адпраўлялася 20 тысяч вызваленых з палону палякаў. Сапраўды каралеўскі падарунак, і вельмі гуманны. Услед за Польшчай Гедымін пры пасрэдніцтве полацкага і менскага князёў заключыў мір і з Ноўгарадам, які дагэтуль падтрымліваў лівонскіх рыцараў. Так дыпламатыя Гедыміна атрымала важныя перамогі, была створана антыордэнская кааліцыя.

У 1326 годзе пачаліся сумесныя дзеянні Польшчы і Вялікага княства. Лакетак павёў сваё войска на Брандэнбург. На дапамогу яму з дружынай прыбыў Давыд Гарадзенскі. Гарадзенцы дайшлі да Франкфурта-на-Одэры. Наступным годам у красавіку ўжо Альгерд павёў літвінскіх вояў на Брандэнбург і таксама дайшоў да Франкфурта-на-Одэры. Людовік Брандэнбургскі (сын імператара. — *В.Ч.*) вымушаны быў надоўга адмовіцца ад сваіх планаў захопу Заходняга Памор'я. У гэты крытычны для Брандэнбурга момант яго падтрымала Чэхія. Чэшскі кароль Ян Люксембургскі ў 1327 годзе напаў на Польшчу. Палякам дапамог варожы германскаму імператару угорскі кароль Карл-Роберт Анжуйскі.

Успыхнула вайна і ў Лівоніі. Рыжане не маглі змірыцца, што ў руках крыжакоў засталіся вусце Дзвіны і дарога на Пскоў. Была надзея на папу, што ён прадпіша рыцарам вярнуць Рызе Дынамюндскі замак, але Ян XXII і на гэты раз не стаў сварыцца з Ордэнам і пакінуў замак ва ўладанні крыжакоў. Рыжане ўзяліся за зброю. Ноччу 23 чэрвеня 1328 года яны напалі на Дынамюнд. Крыжакі адбілі прыступ. Тады ў Рызе зноў згадалі пра Гедыміна. Да вялікага князя ў Вільню прыбыло рыжскае пасольства. Паслы прапанавалі аддаць Гедыміну ўсе замкі і крэпасці, што належалі Рызе, калі ён дапаможа ў вайне з Ордэнам. Доўга Гедыміна не трэба было ўпрошваць. Размясціць свае гарнізоны ў Лівоніі, кантраляваць дзеянні рыцараў — значная тактычная перавага над Ордэнам. Але новы лівонскі

магістр Эбергард Мангеймскі, чалавек рашучы ў вайсковай справе, апярэдзіў Гедыміна. Крыжакі ў кароткі тэрмін захапілі рыжскія замкі і паставілі там моцныя гарнізоны. У красавіку 1328 года Гедымін з войскам падышоў да Дзвіны і даведаўся, што рыцары апярэдзілі яго. Раззлаваны вялікі князь угнявіўся на рыжскіх паслоў. Такая жаданая здабыча ўплыла з рук. Рыжане, каб суцешыць Гедыміна, далі яму праваднікоў, якія правялі ягонае войска ў багатыя ордэнскія ўладанні.

15 верасня Гедымінава дружына спустошыла ваколіцы Каркуса, праз сем дзён яна ўжо ўладарыла ў прыходзе Гельмеце. Наступным днём палалі ордэнскія сядзібы ў парафіі Пейстэле. Тут загінула 400 крыжакоў. Далей шлях літвінскіх вояў ляжаў на Тарваст. Прускія рыцары ў гэты час напалі на Гародню. Частка войска схавалася на подступах да горада, а 400 вояў, разрабаваўшы прадмесці, адышлі. Жыхары, якія былі ў замку, вырашылі, што крыжакі ўбраліся, пакінулі крэпасць. Рыцары, скарыстаўшыся гэтым, рынуліся на воласць і спустошылі яе. Гедымін паспяшыў на Літву, аднак крыжакоў ужо каля Гародні не застаў.

Адначасова крыжакі захапілі замкі Пуценікі і Аўкам. А ў пачатку 1329 года ў Прусію прыбыў чэшскі кароль Ян Люксембургскі, атачоны світай знатных асоб: сілезскім князем Фалькенбергам і графамі з Лейнінгена, Оцінгена, Нейнара, Велькаў, Вюртамберга, Шаўенберга і Фальканштэйна, а таксама бургграфам з Доны. Сабраліся не як у паход, а як на ловы. Крыжацкае войска налічвала 18 тысяч чалавек. Яно пайшло на шматпакутную Жамойць.

Гедымін хаця і не выступіў супраць Яна Люксембургскага, але вымушаны быў трымаць сваё войска ў Аўкштайціі. Крыжакі захапілі пяць жамойцкіх гарадкоў, разрабавалі іх і вярнуліся назад у Прусію. А рыжане пасля 13 месяцаў аблогі здалі горад лівонскім рыцарам. Па загаду Эбергарда Мангеймскага ў гарадской сцяне выбілі праём, праз які, ён, як пераможца, і ўехаў у Рыгу. Рыцары неадкладна прыступілі да будаўніцтва гарадскога замка, каб утрымаць гараджан ад зносін з Гедымінам.

Падначаліўшы Рыгу, Ордэн стаў адзіным гаспадаром у Лівоніі. Цяпер лівонскія рыцары маглі перайсці ў наступ на Вялікае княства. Двойчы — у 1330 і 1332 гадах — яны нападалі на Жамойць. У 1333 годзе магістр Эбергард са шматлікім войскам на ладдзях быў каля Полацка, дзе яго сустрэлі зброяй палачане на чале з Гедымінавым братам Воінам. У наступным годзе магістр павёў войска на Аўкштайцію, дзе забіў 1200 чалавек. Крыжакі былі за чатыры мілі ад Вільні, але так і не адважыліся напасці на яе. І зноў заявіліся пад Полацк, адкуль іх прагнаў Воін.

У 1330 годзе намячаўся сумесны паход войск Польшчы, Венгрыі і Вялікага княства на Ордэн. Гедымін дамовіўся з Ла-

кеткам, што 8 верасня яны з войскам з двух бакоў нападуць на Прусію і сустрэнуцца на берагах ракі Дрэвенц каля Курніка. У назначаны тэрмін Гедымін выступіў у паход. Ён не сустракаў адпору крыжакоў, якія кінулі свае сілы супраць палякаў. Таму вялікі князь беспакарана пустошыў на сваім шляху ордэнскія землі.

Польскага войска і караля каля Курніка не было. Некалькі дзён Гедымін прастаяў каля горада, чакаючы прыходу Лакеткі. Ніякіх звестак пра яго не меў — дзе ён, што з ім ці ўвогуле павёў войска ў паход. Між тым Лакетка стаяў каля Бродніцы, баючыся крыжацкага войска, якое загарадзіла яму шлях. Нарэшце цярпенне Гедыміна скончылася, і ён павярнуў назад. Па дарозе літвіны трапілі ў засаду. Крыжакі небяспечна атакавалі. Ледзь адбіліся ад іх. Тут і дагнаў Гедыміна каралеўскі пасол і ад імя караля прасіў яго весці войска на злучэнне з палякамі. Гедымін гневаўся на караля. Тым больш, калі даведаўся, што венгры выступілі супраць яго. Граф Вільгельм, які ўзначаліў 8-тысячны венгерскі корпус, заявіў Лакетку, што той хоча з дапамогай паганцаў ваяваць з хрысціянамі. «Калі хочаш бачыць нас пад сваімі харугвамі, адпусці паганцаў дадому», — ультыматыўна патрабаваў граф[37]. Лакетка вагаўся. Гедымін угледзеў у паводзінах караля двудушнасць, таму і адказ паслу прагучаў рэзка: «Я ўжо быў дамовіўся з тваім каралём на дзень і месца назначанае з'ехацца на Дрэвенцы; я прыбыў на месца, але караля там не знайшоў, і каб мае богі не ўратавалі, трапіў бы ў рукі крыжакоў праз здраду, але толькі я ведаю маіх здрайцаў»[38]. Празрыста намякаў на Лакетку, чыя бяздзейнасць была падобна на здраду. Гедымінаў пасол перадаў такі адказ. Гедымін, як і было дамоўлена, у назначаны тэрмін увайшоў у Прусію і чакаў караля каля Курніка. Не атрымаўшы ад яго ніякай звесткі, павярнуў назад і ледзь не панёс паражэнне. Вось таму, выканаўшы свае абавязкі, Гедымін у інтарэсах сваіх людзей не будзе ўдзельнічаць у вайне. Нагадаў пасол і пра выплату жалавання літвінскаму войску. Лакетка, зразумела, засмуціўся, але сварыцца з Гедымінам не хацеў і выплаціў літвінам абяцанае золата за падтрымку ў вайне. Тым не менш Гедымін не пакінуў сваяка без дапамогі — вораг у іх быў агульны. У наступным годзе ён паслаў буйны атрад каралю. Прускія і лівонскія рыцары, умацаваўшы свае шэрагі наймітамі з Германіі, уварваліся ў Польшчу. 27 верасня пад Плоўцамі крыжакі сустрэліся з польскім войскам. Спачатку палякі мелі поспех, яны пацяснілі рыцараў, нават захапілі ў палон маршала Дзітрыха Альтэнбургскага. І ўсё ж ордэнцы здолелі разбіць іх, а ўжо ў наступным годзе захапілі Куяўскую зямлю.

Так з пераменлівым поспехам ішла барацьба з Ордэнам.

ЗБІРАННЕ ЗЕМЛЯЎ

Як і ягоныя папярэднікі на велікакняжацкім пасадзе, Гедымін праводзіў палітыку аб'яднання старажытных беларускіх земляў. Пасля яго смерці ў 1341 годзе ў склад Вялікага княства ўваходзілі Полацкая, Віцебская, Менская, Турава-Пінская землі. Гістарычныя крыніцы маўчаць, як адбывалася гэтае аб'яднанне. І такое «загадкавае» маўчанне — красамоўнае сведчанне аб мірным характары гэтага працэсу.

Менскае княства ўваходзіла ў склад Вялікага княства Літоўскага ўжо ў 1326 годзе. Менскі князь Васіль разам з князямі Воінам Полацкім і Фёдарам Святаславічам у гэтым жа годзе ездзіў ад Гедыміна ў Ноўгарад. І тое, што ўладар Менскага княства не быў выгнаны са сваёй зямлі, а княжыў там, выконваў важныя даручэнні Гедыміна, таксама сведчыць аб мірным характары далучэння Менска да Вялікага княства. З таго, што ў пасольстве знаходзіўся князь Дарагабужа і Вязьмы Фёдар Святаславіч, можна дапусціць, што ўлада вялікага князя распаўсюджвалася і на землі ўсходняй Смаленшчыны. Таму смаленскі князь і называў сябе «малодшым братам» Гедыміна, падкрэсліваючы сваю васальную залежнасць ад яго. Мірным шляхам увайшло ў Вялікае княства і Віцебскае княства. Гедымінаў сын Альгерд пабраўся шлюбам з дачкой князя Яраслава Васільевіча Марыяй і пасля яго смерці сеў на віцебскі пасад.

Лагічным завяршэннем збліжэння Пінска з Наваградкам і Літвой з'явілася далучэнне яго да дзяржавы, якая нарадзілася на гэтых землях. Нагадаем, што менавіта пінчане прытулілі ў сябе Войшалка, калі ён ратаваўся ад Траняты, а пасля далі яму дружыну для пакарання Літвы. Аб гэтым добра памяталі ў Пінску і з сімпатыяй ставіліся да Вялікага княства. Нават калі мангола-татары і галіцка-валынскія князі ў 1275 годзе сілай вымушалі пінчан удзельнічаць у вайне з Наваградкам, яны, да свайго гонару, здолелі ўхіліцца ад паходу. Пагроза апынуцца ў «волі татарскай», стаць падданымі Залатой Арды прадвызначыла рашэнне пінчанаў увайсці ў склад Вялікага княства. Пры Гедыміне тут сядзеў яго сын Нарымонт-Глеб.

Што тычыцца Турава, дык там, відаць, княжылі нашчадкі турава-пінскіх князёў аж да 1385 года, калі Ягайла перадаў тураўскаму князю Фёдару замест Турава — Астрог на Валыні.

Няма дакладных звестак пра час далучэння да Вялікага княства Падляшша. Але вядома, што ў бітве літвінскага войска з крыжакамі ў 1348 годзе ўдзельнічала харугва з Бярэсця. Значыцца, ужо да гэтага часу Падляшша апынулася ў складзе гэтай дзяржавы.

Пры ўключэнні новых зямель Гедымін гарантаваў ім аўтаномію і непадзельнасць тэрыторыі, дэкларавaў «старыны не рушыць», захоўваў мясцовыя законы, недатыкальнасць правоў і ўладанняў феадалаў, мяшчанаў, святарства, падсуднасць мясцовым судам, аўтаномнасць. Гэта пацвярджае і мірнае пагадненне, якое заключыў Гедымін у 1338 годзе з Ордэнам. Вялікі князь указвае ў ім, што ён заключае дамову са згоды епіскапа Полацка, кaраля і горада Полацка і кaраля Віцебска і горада Віцебска[39]. Як вынікае, Полацкая і Віцебская землі знаходзіліся ў палітычным саюзе з Вялікім княствам Літоўскім і разам каардынавалі сваю палітыку.

Зусім іншым было становішча заваяваных Навагрaдкам балцкіх земляў: Літвы, Нальшчанаў, Аўкштайціі. Тут вялікі князь кіраваў як паўнаўладны гаспадар. Калі меркаваць па грамаце Ягайлы аб прывілеях феадалам-паганцам, якія прымуць каталіцкую веру, дык да хрышчэння Літвы яны не мелі маёмасных правоў і цалкам падначальваліся вялікаму князю. Гэта быў эфектыўны сродак утрымання балцкіх феадалаў ва ўладзе вялікага князя. Пазбавіў Гедымін балцкія землі і ўсякай палітычнай самастойнасці. І калі спачатку ў знешніх зносінах ён выступаў ад імя Жамойціі і Аўкштайціі, дык у далейшым пры заключэнні міру з Ордэнам ужо не згадваў гэтыя землі як пазбаўленыя ўсялякай палітычнай вагі.

Не толькі Вільня імкнулася сабраць вакол сябе ўсходнеславянскія землі — гэткую палітыку праводзіла і Масква. У адрозненне ад Гедыміна маскоўскі князь Іван Каліта знаходзіўся ў выйгрышным становішчы. Ён не траціў сілы на барацьбу са знешнім ворагам. Купіўшы крывёю Цверы ярлык вялікага князя Уладзімірскага, ён весь за вессю, горад за горадам далучаў да сваіх уладанняў новыя землі. Нізкапаклоннічаючы перад ханам Узбекам, задобрываючы яго багатымі паднашэннямі, Каліта з дапамогай ардынскага апекуна прыбірае са свайго шляху найболей небяспечных праціўнікаў. Падтрымка мітрапаліта таксама ўзмацняла ўладу Каліты. Маскоўскія ваяводы адчувалі сябе як дома ў Паўночна-Усходняй Русі, бралі даніну для свайго князя. Прызнаваў уладу Каліты і «господин великий Новгород». Палітычныя ворагі маскоўскага князя шукалі падтрымку ў Гедыміна. Так рабілі цвярскія і смаленскія князі, Пскоў, а пазней і Ноўгарад. Для самога Гедыміна перш за ўсё важна было ўтрымаць у арбіце свайго ўплыву Пскоў — аплот абароны ад Лівонскага ордэна на паўночна-ўсходніх межах Вялікага княства.

Гедымін дапамог пскавічам адбіць нашэсці нямецкіх і дацкіх рыцараў у 1322—1323 гадах, падтрымаў іх у спробе адасобіцца ад Наўгародскай епархіі ў 1331 годзе. Ён жа апякаў Аляксанд-



Н.Орда. Лідскі замак. *1880-ыя гг.*

ра Міхайлавіча, выгнанага з Цверы Калітой і абранага князем у Пскове. Занепакоены Ноўгарад паскардзіўся Каліце і мітрапаліту Феагносту. Маскоўскі ўладар са сваёй раццю і мітрапалітам заявіўся ў Ноўгарад і стаў пагражаць Пскову вайною. Пскавічы, адчуваючы падтрымку Гедыміна, заявілі, што не выдадуць свайго князя. Спраўдзіць сваю пагрозу Каліта асцерагаўся, добра разумеючы, што вайна са Псковам немінуча прывядзе да вайны з Вялікім княствам Літоўскім. Тады ён угаварыў мітрапаліта адлучыць Пскоў ад царквы. «Анафема» ў вуснах мітрапаліта была страшнейшая за зброю ў руках Каліты: пскавічы скарыліся. Аляксандр Міхайлавіч пакінуў Пскоў і прыехаў да Гедыміна. Аднак гэта было часовае адступленне Пскова. Як толькі Каліта вярнуўся ў Маскву, былы цвярскі князь з дапамогай Гедыміна зноў сеў у Пскове. Давялося Каліце змірыцца з Гедымінавым стаўленікам, пакуль той не загінуў у 1337 годзе ў Ардзе.

Хутка і Ноўгарад адчуў на сабе цяжар маскоўскай улады. Каліта прагна выграбаў з кішэняў наўгародцаў срэбра для выплаты ардынцам. Але гэтага яму здавалася мала. У 1333 годзе Каліта запрасіў у наўгародцаў новай даніны, а за адмову захапіў Таржок, Бежацкі Верх. У наступным годзе ён заявіўся з войскам і пачаў рабаваць наўгародскія воласці. Каб зару-

чыцца падтрымкай Вялікага княства Літоўскага, наўгародцы выканалі сваё абяцанне даць Гедымінаву сыну Нарымонту-Глебу воласці. У 1333 годзе ён атрымаў наўгародскія прыгарады Ладагу, Арэхава, палову Капор'я і Карэльскую зямлю. Улада Вялікага княства распаўсюдзілася на Паўночную Русь. І з гэтым павінен быў лічыцца Каліта. Ён зносіцца з Гедымінам, сватае сына (будучага вялікага князя маскоўскага Сімяона Гордага) да яго дачкі Аўгусты. Адначасова падладжваецца да Ноўгарада. У 1335 годзе Каліта збіраўся з наўгародцамі і з усімі нізаўскімі князямі ісці на Пскоў. Набег Гедымінавага атрада на Таржок астудзіў памкненні наўгародцаў. Угневаны Каліта напаў на памежныя літвінскія гарадкі Асечан ды Расну. Паведамленне летапісаў пра гэты напад вельмі важнае для вызначэння ўсходняй мяжы Вялікага княства Літоўскага. Яна праходзіла за Дняпром на адлегласці 55 кіламетраў (менавіта такая адлегласць ад Магілёва да сучаснай Расны).*

Былі ў Гедыміна і прыкрыя паражэнні. Так, пасля смерці літоўскага мітрапаліта Філафея ў 1330 годзе візантыйскі патрыярх скасаваў літоўскую мітраполію, і Каліта атрымаў магчымасць праз маскоўскага мітрапаліта ўмешвацца ва ўнутраныя справы Вялікага княства. Не жадаючы мець адзінага з Масквой мітрапаліта, Гедымін спрабаваў аднавіць мітраполію. Для гэтага Любарт Гедымінавіч авалодаў маёмасцю Філафея, да якой ужо прагна цягнуў рукі Феагност. Маскоўкі мітрапаліт тут жа раструбіў, што «язычнікі» (хаця Любарт быў праваслаўным) рабуюць цэрквы, а гэта, вядома, зрабіла свой уплыў на рашэнне патрыярха.

«...УСЕ СВАЕ СІЛЫ АДДАЎ»

Апошнія гады княжання Гедыміна прайшлі ў барацьбе з прускімі рыцарамі. Як пісаў Дузбург, «услед за сваімі папярэднікамі усе свае сілы аддаў на загубу веры і хрысціян»[40].

Па Нёману на межах Аўкштайціі немцы будавалі новыя замкі з гарматамі-бамбардамі. Лівонцы ўзвялі ў Земігаліі замак Доблен, з якога рабілі набегі (рэйзы) на Жамойць.

У сакавіку 1335 года пасля смерці чарговага вялікага магістра Лютэра Браўншвейгскага ордэнцы выбралі на яго месца маршала Дзітрыха Альтэнбургскага, вопытнага і адважнага ваяра. Новы магістр прагнуў вызначыцца баявымі перамогамі над паганскай Літвою. Па яго запрашэнні ў Прусію прыбылі

* Хоць не выключана, што паход І.Каліты адбыўся ў Верхняе Падзвінне, дзе таксама ёсць Асечан і Расна.



Генеалагічнае дрэва Гедымінавічаў. *1647 г.*

200 знатных паломнікаў, сярод іх былі сын германскага імператара маркграф Людовік, граф Філіп Намюрскі, граф Генебергскі і шмат іншых. У лютым 1336 года шасцітысячнае войска крыжакоў напала на аўкштайцкі замак Пулен. Абаронцы замка, не жадаючы трапіць у палон, перабілі адзін аднаго.

Новая вайна, але куды болей цяжкая і крывавая, чакала Вялікае княства Літоўскае. Германскі імператар Людовік Баварскі ў 1338 годзе «падараваў» Ордэну Жамойць, Куронію, Русь і Літву і тым самым падштурхнуў «божых» рыцараў да новых заваёў. Увесь час з Прусіі ляцелі ў Германію заклікі падтрымаць крыжакоў. Прыбывалі новыя паломнікі. У 1337 годзе чэшскі кароль Ян Люксембургскі сабраў войска, з якім пайшоў на дапамогу Ордэну. Вялікі магістр сустрэў яго ў Куявах. Да іх далучыўся польскі кароль Казімір. Пры пасрэдніцтве Яна Польшча і Ордэн заключылі мір. Аб'яднанымі войскамі кіраваў герцаг Генрых Баварскі. Каля вусця ракі Дубісы крыжакі пабудавалі замак Марыенвердэр. Пасля на Нёмане, непадалёку ад жамойцкай цвержы Вялоны, яны ўзвялі яшчэ адзін замак — Баербург, адсюль напалі на Вялону і захапілі яе. Герцаг выгадна прадаў Вялону Ордэну. Цяпер ва ўладанні крыжакоў знаходзіліся тры замкі на правым беразе Нёмана. За больш чым саракагадовую вайну з Вялікім княствам Ордэн нарэшце перайшоў цераз памежную раку і замацаваўся непасрэдна на землях літвінскай дзяржавы. Прадпрыняць нешта сур'ёзнае супраць Ордэна Гедымін не мог. Галоўныя сілы яго войска ў гэты час знаходзіліся на ўсходніх межах дзяржавы, стрымліваючы наступ руска-та-

тарскіх войск Івана Каліты. Так, не без удзелу маскоўскага князя татары здзейснілі ў 1338 годзе набег на Вялікае княства. А ў канцы 1339 года татарскае войска пад зверхнасцю Таўлубея і дружыны Івана Каліты акружыла Смаленск. Але хутка адышло, відаць, на дапамогу смалянам выступілі літвінскія харугвы.

Гедымін абмяжоўваўся дробнымі набегамі сваіх атрадаў на прускія ўладанні. Яму ўдалося нейтралізаваць дзеянні лівонскіх рыцараў. У 1338 годзе Вялікае княства і Лівонскі ордэн заключылі мірную дамову. Праўда, калі меркаваць па яе тэксту, з-пад Гедымінавай улады выйшла Жамойць. Вось на яе і скіравалі свой удар лівонскія рыцары. Так, ужо ў лютым наступнага года яны напалі на жамойцкія землі, і толькі моцныя маразы прымусілі іх вярнуцца дадому. У 1340 годзе крыжакі зноў пабывалі на Жамойці, але і гэты паход з-за адлігі не ўдаўся.

Пасля таго як з-пад Смаленска ўбраліся руска-татарскія раці, Гедымін змог выкарыстаць частку дружын у вайне з крыжакамі. У 1341 годзе ён выступіў на Баербург. Два прускія ваяры паведамілі зручны час для нападу на замак. Але Гедымінавы планы выдаў крыжакам немец, які дзевяць гадоў служыў у велікакняжацкай дружыне, і ў Баербургу падрыхтаваліся да сустрэчы ворага.

Князь не хаваўся за спіны вояў і ваявод, а сам узначальваў штурм. Крыжакі адкрылі агонь з гармат, і адно з каменных ядраў трапіла Гедыміну ў плечы і забіла яго. Рускія летапісы нічога не паведамляюць пра забойства Гедыміна пад Баербургам. Храніст чэшскага караля Бенеш Вейтмілійскі наогул лічыў, што яго атруцілі.

У 1340—1341 гадах Вялікі князь, каб заручыцца саюзам з чэшскім каралём, выказаў жаданне з яго дапамогай ахрысціць паганцаў. У Вялікае княства прыбылі чэшскія манахі. Вось што паведамляе Бенеш Вейтмілійскі: «У той самый год літоўскі князь, жадаючы прыняць хрысціянскую веру, запрасіў да сябе 10 святароў і мноства хрысціян. Сваі ж, параіўшыся, князя атруцілі»[41].

Гедымін пакінуў пасля сябе сем сыноў: Манівіда, Нарымонта-Глеба, Альгерда, Кейстута, Любарта, Яўнута-Івана, Карыята-Міхаіла. Кожнаму з іх выпаў своё лёс — каму вялікая ўлада, каму слава героя, каму няшчасці і расчараванні,але аб'ядноўвала іх адно — гонар за свайго легендарнага продка і гонар называцца Гедымінавічамі.

ВЯЛІКІ СЛАВАЙ





АЛЬГЕРД
(?—1377)
Гравюра з «Хронікі Еўрапейскай Сарматыі» А. Гваньіні

АЛЬГЕРД



апошні шлях праводзілі Гедыміна яго сыны. «Сынове тело его приправодили до Вильня, и все его рицерство, и там обычаем поганским, наложивши великий сруб смолного дерева, смолины сосновой, гроб ему наготовили. А потым, гды все седмь сынов на погреб отца своего зъехалися, убрали его в одежду княжную цветную, в которой сам за живота найлепшей кохался, и при нем шаблю, рогатину, сагайдак, соколов пару, хортов пару, коня животного з седлом, слугу его найвернейшего коханка, з ним звязавши на стос дров положили, так теж зброю его и часть некую лупов неприятельских и трох вязнев немцов збройных живых, вколь дрова запаливши, з ним спалили. А гды горели уже, на той час плакали з великою жалостю всего рицерства, кидали в огонь позногти рисии и медвежии, як был в них звычай стародавний. Потым, гды тела погорели, попел особно и кости якая если не згорела, княжие от конских и псих зобравши в труну зашпунтавали, там же в землю похавали и до места Вильня вернулися все»*.

СЫНЫ ГЕДЫМІНА

Рэдка выпадала ім збірацца ўсім разам. Кожны ўладарыў у сваіх землях і за клопатамі ды справамі не дабіраў часу прыехаць у бацькоўскі дом. І вось зноў разам. Манівід — старэйшы ў сям'і. Пастарэў ужо князь кернаўскі ды слонімскі, але нічым так і не вызначыўся — ні подзвігамі ратнымі, ні здзяйсненнямі дзяржаўнымі. А вось князь пінскі, Глеб-Нарымонт, нерашучы, асцярожны. Не спраўдзіў ён надзей наўгародцаў. Так і

---

* Паводле падання, магіла Гедыміна знаходзіцца пад Вільняй, за правым берагам Віленкі на левым баку дарогі з Зарэчча на Антаколь.

не абараніў іх ад дамаганняў Масквы. А калі пайшлі на Ноўгарад свеі, дык і зусім кінуў у бядзе, спалохаўся брані. Цяпер сядзіць у Пінску — месца ціхае, аддаленае ад межаў дзяржаўных*. Любарт — памяркоўны ў штодзённым жыцці, смелы ў бітвах. Любяць яго на Валыні, дзе ён кіруе. А без падтрымкі валынян не ўтрымаўся б ён. Атруцілі ж галіцкія баяры свайго князя Баляслава Тройдзеневіча. Такі лёс мог чакаць і яго, Любарта. А вось князь наваградскі, Міхаіл-Карыят, чалавек разважлівы, мудры. Гонар яму выпаў немалы — сядзіць у былой сталіцы. Адважны і ваяўнічы Кейстут ужо праславіў сваё імя ў бітвах з крыжакамі. «Рыцар удатны», — кажуць у народзе. Сапраўдная рыцарская высакароднасць у яго паводзінах, у адносінах і да паплечнікаў, і да ворагаў. У словах — праўда. Яўнут малодшы ў сям'і, пястун Гедымінаў. Бацька завяшчаў яму Вільню, Ашмяны, Вількамір і Браслаў. І Альгерд**...

«Князь меў велічны выгляд: твар яго румянкавы, выцягнуты, нос прамы, вочы блакітныя, вельмі выразныя, бровы густыя, светлыя валасы і барада светла-русая з сівізною, лоб высокі, чало лысае: ён росту вышэй сярэдняга, ні тоўсты, ні хударлявы, кажа голасам гучным, ясным і прыемным, ён ездзіць цудоўна на кані, але ходзіць кульгаючы на правую нагу, таму звычайна абапіраецца на кій ці на отрака»[2]. Так апісваў Альгерда адзін з яго сучаснікаў.

У 1318 годзе ажаніўся Альгерд з дачкою віцебскага князя Яраслава Васільевіча Марыяй. Два гады пражылі маладыя ва Усвятах, а пасля цесцявай смерці Альгерд стаў княжыць у Віцеб-

---

*У пазнейшых крыніцах Нарымонт названы вялікім князем. Нібыта ў адной з бітваў з татарамі ён трапіў у палон, адкуль яго выкупіў маскоўскі князь Іван Каліта. Нарымонт хрысціўся пад іменем Глеб. Менавіта з-за хрышчэння ўся Літоўская зямля не прыняла яго зноў на вялікае княжанне, а таму яго запрасілі ў Вялікі Ноўгарад на прыгарады. (Предисловіе (родомъ) великих князей литовских// Временник Московского общества истории и древностей российских. Кн. 10. С. 74—75.)

** У праваслаўі Альгерд насіў імя Аляксандр, па другіх крыніцах — Андрэй; перад смерцю ён прыняў схіму і новае імя — Аляксей. Яго паганскае імя Альгерд, відаць, ёсць народная форма славянскага імя Олігорд (сустракаецца ў «Летапісцы вялікіх князей літоўскіх») або Волігорд (паводле «Сказанія пра Мамаева пабоішча»), і даў Гедымін такое імя сыну ў гонар яго маці Вольгі. У паўднёвых славян сустракалася імя Алегрет. П.Урбан тлумачыў імя Альгерд як «вялікі славай». (Урбан П. Старажытныя ліцьвіны. С. 306.) Нагадаем ісландскае імя Вальгард, германскае Альгерд, Альгардце, англійскае Алегард. У памятніку са слуцкага манастыра запісана: «Князя великого Олгирдово с крещении нареч Димитрія». (Ластоўскі В. Гісторыя Беларускай (крыўскай) кнігі. Каўнас. 1926. С. 487.)

ску*. Быў ён чалавек разважлівы і прадбачлівы, стрыманы ў пачуццях. Калі становішча складвалася супраць яго, дык дзейнічаў асцярожна, з хітрасцю. Мог гадамі чакаць свайго часу, а ўжо дачакаўшыся, не вагаўся, не марудзіў. У глыбокай таямніцы захоўваў свае задумы і намеры. Не радаваў сябе ні пацехамі, ні віном, а думаў пра княства сваё, служыў яму.



Царква Звеставанне ў Віцебску, пабудаваная Альгердам. *1667 г.*

Вестка пра бацькаву смерць застала Альгерда пад Мажайскам, які ён адваёўваў у Івана Каліты. Так і не авалодаўшы горадам, Альгерд паспяшыў у Вільню.

І вось сабраліся сыны Гедымінавы, яго спадкаемцы і прадаўжальнікі ягонай справы. Ці паразумеюцца яны паміж сабою? Што чакае Вялікае княства Літоўскае? Самы малодшы з іх — Яўнут — па бацькоўскай волі цяпер вялікі князь. А ў старэйшых на сэрцы крыўда. Няўжо ніхто з іх не быў варты велікакняжацкага пасада? Чым жа так вызначыўся Яўнут, што яму бацька аддаў перад імі перавагу? Манівід не згодны з такім рашэннем, не жадае падначаліцца вялікаму князю і бярэ палітычную ініцыятыву ў свае рукі. Пасля пахавання бацькі ён узначаліў паход на крыжакоў. І запрасіў удзельнічаць у ім Кейстута ды Альгерда. Відаць, задумаў Манівід здзейсніць дзяржаўны пераварот і сам стаць вялікім князем. А для гэтага шукаў ён падтрымкі Кейстута ды Альгерда, якія «пераўзыходзілі другіх братоў выхаваннем, норавамі, статнасцю, прыроджанай рыцарскай мужнасцю і многімі іншымі знатнымі якасцямі...»[3]. Частку войска Манівід паслаў у Куронію для абароны Жамойці ад лівонскіх рыцараў, а з галоўнымі сіламі пад-

---

* Паводле Стрыйкоўскага, Віцебскае княства займала землі ад Бярэзіны да Угры. У склад княства ўваходзіў і Магілёў. (Stryikowski M. Op. cit. T. I. S. 381.)

ступіў да Баербурга. Пасля ўпартага штурму крэпасць пала. Літвінскае войска падзялілася на дзве часткі. Першая ўварвалася ў прускія землі і спустошыла іх да Дрынгафорта, другая ваявала ваколіцы Рагніты. Ордэн вымушаны быў заключыць перамір'е з Вялікім княствам Літоўскім. У абыход Яўнута пагаджальную грамату падпісаў Манівід*.

Іншыя Гедымінавічы таксама не прызнавалі над сабою ўлады Яўнута. Кожны з іх лічыў сябе ў сваіх землях незалежным ад Вільні князем. Так, Кейстут у 1342 годзе заключыў ад свайго імя гандлёвую дамову з Англіяй. Сыны наваградскага князя Карыята — Юрый, Аляксандр, Канстанцін і Фёдар на чале наваградскіх дружын і пры падтрымцы Альгерда ў сярэдзіне саракавых гадоў вызвалілі Малое Падолле ад ардынскага ярма. «Тады тыя княжаты Карыятавічы, прыйшоўшы ў Падольскую зямлю, у прыязь увайшлі з атаманамі і пачалі бараніць іх ад татар, і баскакам выхада (даніны. — *В.Ч.*) не пачалі даваці», — паведамляе «Хроніка Быхаўца»[4]. Самастойную палітыку праводзілі Любарт і Альгерд. Да пары да часу, калі на межах было спакойна, з такім становішчам у дзяржаве можна мірыцца. А вось у часы небяспекі? Ці аб'яднаюцца тады Гедымінавічы? Ці здолее Яўнут арганізаваць абарону дзяржавы?

ДАПАМОГА ПСКОВУ

Толькі вярнуўся Альгерд у Віцебск, як са Пскова прыехала пасольства: зноў распачаў наступ на Пскоўшчыну Лівонскі ордэн. Рыцары захапілі ў Лівоніі пскоўскіх паслоў і перабілі іх. Князь Аляксандр Усеваладавіч, які сядзеў у Пскове, не адважыўся весці пскавічоў на немцаў і ад'ехаў у Ноўгарад. А крыжакі пачалі рыхтавацца да вайны. На мяжы Пскоўскай зямлі яны ўзвялі цвержу Нейгаўзен. Ноўгарад адмовіўся дапамагчы пскавічам, і ўся іх надзея цяпер была на Віцебск. Паслы прасілі Альгерда: «Братыа наша новгородици не помогают нас, и зли быша на ны; помози нам, господине, в сие время»[5].

---

* Відаць, пра гэты паход нагадвае ў сваёй «Хроніцы» Стрыйкоўскі. Ён адносіць яго да 1330 года — да ўступлення на княжацкі пасад у Вільні Альгерда. Для нас цікавы склад войска. Кейстут «водлуг павінасці паспалітай» прывёў жамойцкіх, трокскіх, падляшскіх, гарадзенскіх баяраў і паноў; Манівід — слонімскіх і кернаўскіх; Нарымонт — пінскіх, мазырскіх, рэчыцкіх; Карыят — наваградскіх, ваўкавыскіх, мсцібогскіх; Яўнут — менскіх і заслаўскіх; Любарт — валынскіх і луцкіх. Выступілі са сваімі дружынамі князі Гальшанскія і Гедройцы. А віцебская, полацкая, браслаўская, дрыская, вількамірская «шляхта граніц Дзвінскіх берагоў» сцерагла лівонцаў. (Stryikowski M. Op. cit. T. II. S. 4.)

Альгерд адправіў у Пскоў дружыну пад зверхнасцю ваяводы Юрыя Вітаўтавіча і паведаміў пра ўсё Кейстуту. Трокскі князь прыбыў у Віцебск, і браты выступілі ў паход. У Полацку да іх далучыўся з палачанамі сын князя Воіна, Любка. 20 лістапада літвінскае войска падышло да Пскова. Перадавы полк, які вёў Юрый Вітаўтавіч, адправіўся да лівонскай мяжы і наткнуўся на крыжацкую раць. Пасля няўдалай сутычкі з немцамі полк адступіў да Ізборска. Услед сюды прысунуліся і крыжакі. Альгерд рухаўся з галоўнымі сіламі за перадавым палком. Даведаўшыся, што Ізборск абкладзены крыжакамі, князь загадаў свайму войску пераправіцца цераз раку Вялікую, а сам з малым атрадам застаўся на левым беразе сачыць за дзеяннямі ворага. Ноччу падчас віжавання Любка па неасцярожнасці натрапіў на вартавы полк крыжакоў і загінуў. Смерць стрыечнага брата засмуціла Альгерда з Кейстутам.

А вайна працягвалася. Ізборцы малілі Альгерда аб дапамозе. Але ён не спяшаўся ў бой, пасылаў у горад вестуноў і ўгаворваў ізборцаў абараняцца ад крыжакоў. У Пскове раздаваліся незадаволеныя галасы. Альгерд жа нібыта насміхаўся з пскавічоў, абяцаў ім, што крыжакі хутка самі ўбяруцца з Пскоўшчыны.

І сапраўды, пасля дзесяці дзён стаяння каля Ізборска лівонцы адступілі ад горада. Манах-летапісец аднёс гэта на кошт заступніцтва святога Міколы.

Альгерд так і не растлумачыў пскавічам прычыну паспешлівага адыходу крыжакоў. А разгадка была ў тым, што князь паслаў у Лівонію тры атрады, якія пачалі спусташаць ордэнскія землі. Немцам ужо не было як думаць аб Ізборску, калі свой дом гарыць, — крыжакі паспяшылі ў Лівонію. Так без асаблівых страт у сваім войску Альгерд выгнаў заваёўнікаў з Пскоўскай зямлі. «Не столько силою, елико мудростью воеваше», — кажа пра князя Ніканаўскі летапіс[6].

Раз усё добра закончылася — памягчэлі сэрцамі пскавічы і перамянілі свае адносіны да Альгерда, ударылі яму чалом, бо «хотяше его крестити и на княжение посадити в Пскове»[7]. Альгерд адмовіўся. У летапісным паведамленні пра гэта звернем увагу на ягоныя словы. Князь сказаў: «уже крещень есмь, а христианин есмь, второе креститися не хошу»[8]. Здавалася б, пскавічы павінны былі ведаць пра тое, што дзеецца ў суседняй зямлі, ведаць, што не мог сядзець у Віцебску князь-язычнік, а вось жа палічылі Альгерда нехрышчоным. Адсюль пытанне: ці заўсёды даверацца тым жа рускім і нямецкім летапісам і хронікам, якія пішуць аб паганстве Тройдзеня, Віценя, Гедыміна?

Замест сябе Альгерд прапанаваў пскавічам свайго сына Андрэя. Зусім юны княжыч быў узведзены на пскоўскі пасад. Але нядоўга сядзеў ён у Пскове. Неўзабаве памёр полацкі князь

Воін. Альгерд выклікае Андрэя да сябе і дамагаецца, каб палачане выбралі сваім князем яго сына. Палачане, вопытныя палітыкі, адразу сцямілі выгаду ад саюзу з Альгердам. Полацк — Віцебск «един есть». І такім чынам аднавілася былое адзінства полацка-віцебскіх земляў.

Альгерд жа, заручыўшыся падтрымкай буйнейшага з літвінскіх гарадоў, ужо не быў сціплым віцебскім князем. Цяпер яго падтрымлівала Полаччына і Нальшчаны. Важкія козыры ў палітычнай гульні, выйгрыш якой самы высокі — велікакняжацкі пасад. Пасля таго як заўчасна памёр Манівід, перад Альгердам адкрылася магчымасць стаць вялікім князем. Праўда, гэтаму ўспрацівіцца старэйшы брат Нарымонт, але выйграе той, у каго сіла, хто гатовы да барацьбы, хто можа чакаць. Сілу вайсковую віцебскі князь меў, змагацца ён умеў і хітрасцю, і зброяй, а чакаць... Не адзін год чакае зручнага часу.

У свае задумы Альгерд пасвяціў і Кейстута. І не таму, што былі яны ў вялікай любові, міласці і ласцы, як браты ад адной маці (жонкі Гедыміна, Вольгі). Хто-хто, а Кейстут разумеў, што на велікакняжацкім пасадзе павінен сядзець чалавек з цвёрдаю воляю, з ясным розумам, вой і палітык. Ні Яўнут, ні Нарымонт такімі якасцямі не валодалі. Карыят ды Любарт не думалі аб велікакняжацкім вянцы. Значыць, Альгерд... Кейстут добраахвотна прызнаваў першынство брата. Але час яшчэ не надышоў. Заставалася чакаць, і Альгерд цярпліва чакаў.

ВЯЛІКІ КНЯЗЬ

Чатыры гады ў Вялікім княстве Літоўскім было спакойна. Ды спакой гэты — падманлівы. Зацішша перад бурай. А ў Ордэне вырашылі, што настаў зручны момант нанесці па княству рашучы ўдар: яно распалася на ўдзелы, вялікі князь ніякай улады над сваімі братамі не мае.

У 1343 годзе Ордэн замірыўся з Польшчай. Польскі кароль Казімір саступіў крыжакам Кульмскую, Міхалаўскую землі, палову Куявіі, адмовіўся ад Памор'я. Гэтыя адчувальныя страты Казімір спадзяваўся папоўніць заваёвай Валыні і Галіцыі. І, вядома, разлічваў, што крыжакі адцягнуць на сябе галоўныя сілы Вялікага княства. Атрымаўшы матэрыяльную падтрымку папскай курыі, Казімір у 1343—1344 гадах захапіў Саноцкую і Перамышльскую землі і выйшаў да межаў Галіцыі.

Умацавала становішча Ордэна і пакупка ў 1341 годзе ў дацкага караля Эстоніі. На межах з Аўкштайціяй закіпела праца. Крыжакі аднавілі разбураны замак Баербург, умацавалі Юрбарг і Марыенбург. Уздоўж мяжы будаваліся тры дарогі, аба-



А.Пянькоўскі. Кейстут. *1838 г.*

роненыя равамі, прысадамі і вежамі. Штогод магістр запрашаў з Германіі паломнікаў. Ордэнскія агенты вербавалі вояў. У 1344 годзе галандскі граф Вільгельм IV, які прыехаў на заклік магістра, разам з крыжакамі паваяваў памежныя аўкштайцкія

землі. У пачатку наступнага года ў Прусію прыбылі шматлікія паломнікі з усёй Еўропы. Яшчэ ніколі Ордэн не прымаў столькі знатных гасцей: кароль чэшскі Ян, кароль угорскі Людовік, герцаг Бургундскі дэ Бурбон, графы Вільгельм IV Галандскі, Гюнтэр Шварцбургскі, Генрых Гаместынскі, мараўскі герцаг Карл Люксембургскі (будучы імператар Карл IV). Якія імёны!

Само становішча вымагала ад Альгерда Кейстута рашучых дзеянняў. Часу на роздум ужо не было. Пасля таго як памерла ўдава Гедыміна, вялікая княгіня Ева, яны прыступілі да ажыццяўлення сваёй задумы. Дамовіўшыся паміж сабою, Альгерд і Кейстут патаемна выступілі з дружынамі на Вільню. Кейстут апярэдзіў брата і першым, уначы, прыйшоў да сталіцы. Віленская варта так і не заўважыла небяспекі. А раніцай Кейстут павёў вояў на штурм Вышняга і Ніжняга замкаў. 22 лістапада без лішняга шуму штурмуючыя падабраліся да замкавых сценаў, па драбінах падняліся на іх. Супраціўленне было хутка падаўлена. Яўнут прама з ложка, накінуўшы на сподняе кажушок, басанож кінуўся наўцёкі. Яму ўдалося спусціцца са сцяны і схавацца ў лесе. Але куды басанож уцячэш па снезе? І пэўна, павінен ён дзякаваць Кейстутавых вояў, што адшукалі яго і прывялі ў замак, бо замёрз бы на марозе. Высакародны Кейстут не праліў братэрскай крыві, з належнай Гедымінавічу пашанай Яўнут «хован был» у вязніцу. Альгерд у гэты час знаходзіўся з віцьбічамі ў Крэве. Тут яго і заспеў Кейстутаў вястун, які паведаміў пра пераварот. Так, дзякуючы Кейстуту, Альгерд прыбраў з віленскага пасада законнага ўладара. Кейстут сустрэў брата з пашанаю: «Табе належыць быць вялікім князем у Вільні, ты нам старэйшы брат, а я з табою буду разам»[9].

За святочным сталом, адзначаючы перамогу, браты заключылі паміж сабою дамову, паводле якой прадугледжвалася, што Гедымінавічы павінны «послушны быти» Альгерду. І першым сваім загадам Альгерд хацеў аб'яднаць вакол сябе братоў, не дапусціць варожасці і міжусобіцы паміж імі: «а быти им до живота в любви, во великой милости; а правду межи себе на том дали: не мыслити лихом никомуже. Такоже быти и до живота своего въ той правде»[10]. На пацвярджэнне сваёй шчырасці Альгерд вызваляе з няволі Яўнута і да «уживаня» аддае яму Заслаўскае княства.

Абгаварылі Альгерд з Кейстутам, каму ў якіх землях панаваць. За ўсімі Гедымінавічамі, апроч Яўнута, заставаліся іх ранейшыя ўдзелы. Кейстут княжыў «волею своею на князстве Троцком», у склад якога ўваходзілі Аўкштайція, Жамойць, Гарадзенская і Берасцейская землі[11]. Сам жа Альгерд, як азначае «Хроніка Літоўская і Жамойцкая», «...в Вильни на Великом князстве Литовском и Руском поновал»[12]. Я не выпадкова прывёў гэтую

цытату. Менавіта яна дапамагае высветліць, што пад Вялікім княствам Літоўскім і Рускім у тыя часы разумеліся беларускія землі: Верхняе Панямонне (летапісная Літва), Нальшчаны, Віленшчына, Навагрудчына, Палессе, Полацкая зямля і заваяваная Войшалкам Дзяволтва (Вількамірская воласць). На гэта адрозненне Вялікага княства Літоўскага ад Аўкштайціі і Жамойці ўказвае і «Хроніка Быхаўца». «І ў той час княжыў на Літве і ў Русі вялікі князь Альгерд»[13], «Князь Фёдар Карыятавіч валодаў у Літве Навагрудкам»[14]. Гэтая ж хроніка пра Кейстута піша: «Кейстут уладарыў у Троках і ў зямлі Жамойцкай»[15]. І тут Аўкштайція і Жамойція не атаясамліваліся з Вялікім княствам Літоўскім.

Па-рознаму аднеслія Гедымінавічы да захопу Альгердам з дапамогай Кейстута велікакняжацкага пасада. Карыят ды Любарт прызналі Альгерда вялікім князем. Старэйшы Нарымонт не наважыўся адкрыта выступіць супраць Альгерда, адправіўся шукаць дапамогі ў Залатой Ардзе. Не змірыўся са стратай улады і Яўнут. Як толькі Альгерд вызваліў яго, ён пералез цераз замкавую сцяну і ўцёк з Вільні. Спадзяваўся ён на падтрымку маскоўскага князя Сімяона Гордага. Як не жадаў Альгерд пазбегнуць міжусобнай вайны паміж Гедымінавічамі, але яе прывід замаячыў на далягляцзе. Аднак трэба было адбіць нашэсце крыжакоў.

Альгерд разам з Кейстутам выступаюць супраць рыцараў, якія ўжо ўварваліся ў Аўкштайцію і ўзялі ў аблогу адну з памежных крэпасцяў. Дзейнічаў Альгерд настолькі рашуча і хутка, што крыжакі былі збіты з панталыку. Пакуль яны беспаспяхова здабывалі цвержу, Альгерд з Кейстутам уварваліся ў Прусію. Літвінскае войска прайшло праз прускую вобласць Самію, «поля немецкие кровию обливши»[16]. Магістр, упэўнены ў тым, што Альгерд будзе працягваць спусташэнне Прусіі, на вайсковай радзе настаяў зняць аблогу.

Пакуль крыжакі вярталіся ў свае межы, Альгерд нечакана памяняў кірунак паходу. Марскім берагам прывёў сваё войска ў Куронію і напаў на ўладанні лівонскіх рыцараў. Лівонскі магістр знаходзіўся на востраве Эзель і не мог арганізаваць супраціўлення. Як смерч, прайшліся па Лівоніі літвінскія харугвы. Земігалы адчынілі перад Альгердам браму Тэрветэнскага замка. Увесь гарнізон быў перабіты, а замак спалены. Пасля запалалі мітаўскія прадмесці.

Ордэнскі храніст распавядае, што лівы падтрымалі Альгерда. Да яго ў лагер прыехаў выбраны імі старэйшына, які абяцаў дапамогу ў авалоданні ўсёй Лівоніяй. «Што ж вы зробіце з магістрам?», — спытаўся Альгерд. Ліўскі старэйшына адказаў: «Мы вырашылі назаўжды выгнаць яго і ўсіх немцаў». — «Не табе, халоп, княжыць у гэтай краіне», — закрычаў Альгерд і загадаў схапіць старэйшыну і адсячы яму галаву[17]. Здаецца,

цяжка растлумачыць гэты ўчынак Альгерда. Але нагадаем, што якіх сто гадоў таму Лівонія належала Полацкаму княству і пра гэта, безумоўна, ведаў Альгерд. З тае прычыны, што Гедымінавічы лічылі сябе пераемнікамі Рагвалодавічаў (адсюль імкненне літвінскіх храністаў вывесці род полацкіх князёў з Літвы), дык і былыя ўладанні Полацка лічыліся ў Вільні прыналежнымі да Вялікага княства. І Альгерд не змірыўся са стратай Лівоніі, рана ці позна спадзяваўся вярнуць яе пад уладу літвінскай дзяржавы. У асобе ліўскага старэйшыны, які марыў аб незалежнасці сваёй Радзімы, Альгерд убачыў канкурэнта на ўладу над Лівоніяй. А раз так, дык і расправа хуткая.

Зразумеўшы, што Альгерд абвёў іх вакол пальца, раззлаваныя крыжакі зноў рынуліся ў Аўкштайцію. Але жыхары пахаваліся ў пушчах, і заваёўнікі так і не спагналі сваёй злосці, нічым не пажывіліся.

Да ўсіх бед наступіла адліга, дарогі заліло вадою, і крыжакі ледзь выбраліся з Аўкштайціі. Такога няўдачнага выніку ніхто ў Ордэне не прадбачыў. Неяк трэба было апраўдвацца. І вінаватага знайшлі. Чэшскі ды ўгорскі каралі ў купе з герцагамі ды графамі абвінавацілі ў няўдачы магістра Людольфа Кёніга, яго нават западозрылі ў здрадзе. Лёс магістра быў вырашаны. Кёніга пазбавілі сану, абвясцілі вар'ятам і засадзілі ў вязніцу, дзе ён хутка і памёр.

Усе тыя падзеі паказалі, што на велікакняжацкі пасад у Вільні сеў хітры і разважлівы, смелы і асцярожны, рашучы і цярплівы валадар. Першыя гады свайго княжання даводзілася Альгерду лавіраваць паміж рознымі групоўкамі баяраў, паміж вярхоўнымі паганскімі святарамі і праваслаўнай царквой, паміж паганцамі і хрысціянамі, паміж сваімі братамі. Даводзілася ісці на ахвяры. Галоўнае — утрымацца на велікакняжацкім пасадзе. І вось пад уплывам духоўніка вялікай княгіні Марыі Яраслаўны Віцебскай — манаха Нестара тры прыдворныя вяльможы — Кумец, Няжыла, Круглец (іх імёны паказваюць, што яны паходзілі са славян) прынялі праваслаўе. З'ява на той час звычайная: нямала паганцаў выракалася бацькоўскай веры і хрысцілася. Паганскія святары касавура паглядалі на князя-хрысціяніна і нічога добрага ад яго не чакалі.

Не, гэта не Гедымін з яго верацярпімасцю — Альгерд адразу паказаў сябе. Па яго загаду паганскае капішча, якое знаходзілася ў Вышнім замку, разбурылі і ўзвялі на яго месцы прыдворную царкву св. Міхаіла. Паганцы сцярпелі такі здзек з іх веры. А далей яшчэ горш. Вярнуўшыся з паходу на Ноўгарад, князь заклаў новую царкву ў гонар Успення Прасвятой Багародзіцы. Стала зразумела, што Альгерд паступова праводзіць хрысціянізацыю Вільні. Вось і бліжэйшае яго акру-

жэнне прымае крыж. А гледзячы на баяраў, просты народ таксама ахрысціцца. Можа, паганскія святары і не выступілі б супраць вялікага князя, але памерла яго жонка Марыя Яраслаўна, якая апекавала праваслаўных, і яны наважыліся. Ад Альгерда патрабавалі пакараць у павучэнне адступнікаў. Які ў яго быў выбар? Паслухаеш паганцаў — настроіш супраць сябе хрысціян, памілуеш новахрышчоных — ужо паганцы затояць на цябе крыўду. А паганства было яшчэ моцнае. Калі б Альгерд меў моцную ўладу, ён не выдаў бы сваіх баяраў на суд паганскіх святароў. Але не меў. Кумца, Няжылу ды Кругляца звязенілі. Гэта адзінае, што мог зрабіць для сваіх былых слуг Альгерд, хоць так выратаваць іх ад расправы паганцаў. Год прабылі вязні ў астрозе. Дый астрогам месца, дзе яны сядзелі, назваць нельга. Да вязняў свабодна прыходзілі іх знаёмыя, сябры, землякі. Сваімі палымянымі казаннямі Круглец, Кумец, Няжыла схілялі іх да хрысціянства. Тады жрацы павесілі адступнікаў ад іх веры на дубе, што рос у свяшчэннай дуброве.*

Міналі гады. Альгерд не толькі ўседзеў на вялікім княжанні, але і ўмацаваў сваю ўладу, «трымаў сваю дзяржаву ў вялікім парадку»[18]. І цяпер ён без аглядкі на жрацоў праводзіў хрысціянізацыю Вільні. Другая Альгердава жонка, Ульяна Цвярская, загадала высечы свяшчэнную дуброву, дзе пакаралі трох пакутнікаў. На вачах разгубленых паганцаў воі валілі дрэвы. І не абрынуўся гнеў багоў на Альгерда, і не асмеліліся выступіць супраць яго жрацы. На месцы, дзе стаяў дуб, на якім павесілі хрысціян, Альгерд узвёў Троіцкую царкву. А пазней ён ужо адкрыта расправіўся з паганцамі. Падставай для гэтага паслужыла іх паўстанне супраць каталіцкіх манахаў, якія жылі ў Вільні. У адсутнасць Альгерда ў 1365 годзе віленскія паганцы спалілі каталіцкі манастыр, забілі сем манахаў, а яшчэ сем прывязалі да крыжа, пусцілі ўніз па Віліі, кажучы: «З заходу сонца прыйшлі і на захад пойдзеце, за тое, што нішчылі нашых багоў»[19]. Вярнуўшыся ў Вільню, Альгерд даведаўся пра тое, што здарылася, і ўгневаўся. Шмат паганцаў па яго загаду былі пакараны «з тым, каб, маючы такі прыклад, ніхто хрысціянам ніякай шкоды не рабіў»[20].

Пазней, у 1368 годзе, Альгерд правёў важную рэформу, накіраваную на абмежаванне ўлады жрацоў-крэваў. Яго намеснікі маглі «яко Кревовие с тоюж моцою судили и суды свои в дело

---

* Гісторык К.Хадыніцкі лічыў, што легенда пра трох віленскіх пакутнікаў нарадзілася напрыканцы XV стагоддзя ў Маскве. У 1547 годзе культ трох пакутнікаў быў афіцыйна прызнаны ў Маскве, адкуль трапіў у Літву. (Chodynicki K. Geneza i rozwój Legendy o trzech męczennikach Wileńskich // Ateneum Wileńskie, 1927. R. 4. Z. 13. S. 442—443.)

вводили, кром одзыву, а одзыв по ваге речы и обычаю давному идеть до нас госпадаря»[21]. Альгерд рашуча ламаў стары ўклад жыцця сваіх падданых. Цяпер яны амаль поўнасцю залежалі ад гаспадара. Сіла жрэчаскай касты была зломлена. І толькі палітычныя меркаванні, а менавіта нежаданне канфліктаваць з Кейстутам, спынялі Альгерда ад хрышчэння паганскага насельніцтва сваёй дзяржавы.

Гэтыя выпадкі і паказваюць рост Альгердавай улады ў дзяржаве. Спачатку мы бачым залежнага ад розных палітычных і рэлігійных груповак вялікага князя. Пасля, калі ён умацаваўся на княжанні, выслабаніўся ад уплыву груповак, калі ўжо канчаткова ўзяў уладу ў свае рукі, дык пачаў дзейнічаць па сваёй волі, зыходзячы з сваіх меркаванняў і задум.

БІТВА НА СТРАВЕ

Зазірнём у летапісы: Альгерд з дружынай з'яўляецца то ў Прусіі, то ў Лівоніі, то пад Псковам, то на Валыні, то ў Польшчы, то на Падоллі, то ў Крыме, то пад Масквою. Сваёй дзейнасцю ён ахоплівае амаль усю Усходнюю Еўропу. І як снег на галаву, налятае са сваім войскам на ворага. Як? Чаму? Адкуль?

Вось у Ноўгарадзе пасаднік Астафій Дваранінец назваў Альгерда псом. Наўгародцы і чакаць не маглі, і думаць, як ужо Альгерд з войскам апынуўся на іх землях, стаў на рацэ Шалоні пры ўпадзенні ў яе Пшагі і паслаў ім абвясціць: «Хачу з вамі бачыцца, лаяў мяне пасаднік ваш, Астафій Дваранінец, называў псом»[22]. Як сама па сабе ні абразлівая для ўладара Вялікага княства лаянка з вуснаў пасадніка, але, думаецца, Альгерд стрываў бы яе. Не, не пакрыўджаная годнасць штурхнула князя падымаць войска — палітыка. У Ноўгарадзе існавалі дзве партыі — з арыентацыяй на Вільню і прамаскоўская; стаўленікам апошняй і з'яўляўся Астафій. Яшчэ раней маскоўскі князь Сімяон Горды заявіўся ў Ноўгарад па запрашэнні прамаскоўскай партыі і быў урачыста пасаджаны на наўгародскі пасад. Адразу, як ён пакінуў Ноўгарад, Альгерд выступіў у падтрымку сваіх прыхільнікаў, каб скінуць непажаданага пасадніка. Пакуль наўгародцы збіралі войска, Альгерд спустошыў землі на Шалоні і пайшоў дадому. У выніку свайго дамогся. На вечы наўгародцы забілі Дваранінца: «З-за цябе спустошылі нашу воласць»[23]. Партыя Альгердавых прыхільнікаў перамагла і заключыла з Вялікім княствам мір.

Такім жа імклівым і нечаканым быў паход Альгерда і ў 1346 годзе — на прускую вобласць Самію. Прыйшоў, папаліў весі, вывеў палон. Шукай ветру ў полі. Пасля гэтага Ордэн звяр-



Ю.Косак. Напад крыжакоў. *Канец XIX ст.*

нуўся да еўрапейскіх краін, запрашаючы ў Прусію паломнікаў. У чэрвені ў Марыенбургу сабраўся генеральны капітул, на якім абмяркоўваўся ход будучага паходу на Трокскае княства. Пакуль крыжакі раіліся, спрачаліся, Кейстут уварваўся ў Прусію, захапіў і спаліў Велаў. Рыхтаваўся да вайны і Альгерд.

У Вільню з'язджаліся дружыны з Пінска, Полацка, Віцебска, Бярэсця, Смаленска, прыбыў атрад і ад Любарта з далёкай Валыні. Радавала Альгерда, што вярнуліся на радзіму Яўнут і Нарымонт, скарыліся яго ўладзе. Тым самым удалося пазбегнуць міжусобнай барацьбы. Альгерд выдзяліў братам удзелы: Яўнуту Заслаўе, Нарымонту Пінск. Разам з пінчукамі і прыйшоў Нарымонт у Вільню.

У пачатку 1348-га ў Прусіі сабраліся паломнікі з Германіі, Францыі, Англіі. Да іх далучыліся прускія рыцары. Саракатысячнае войска выступіла ў паход. Вёў яго сам вялікі магістр Генрых Дусмер. 26 студзеня крыжакі па лёдзе перайшлі Вілію вышэй Коўна і рушылі на Трокі. Сем дзён заваёўнікі, не сустракаючы ніякага супраціўлення, рабавалі і палілі аўкштайцкія селішчы. Кейстут, схаваўшыся за сцены Трокскага замка, не адважваўся даць адпор крыжакам. І гэта ваяўнічы Кейстут? А разгадка яго паводзін простая: ён чакаў Альгерда з літвінскімі дружынамі.

На восьмы дзень пасля пачатку нашэсця да Трок з літвінскімі харугвамі падышоў Альгерд. Паводле звестак ордэнскай хронікі, колькасць аб'яднанага войска Вялікага княства Літоўскага і Трокскага княства складала 45 тысяч вояў. Але гэтая лічба яўна завышаная. Такога войска Вялікае княства не мела. Ужо пазней, калі ў склад літвінскай дзяржавы ўваходзілі Жамойць і Украіна, ВКЛ выстаўляла 30—35 тысяч вояў. Не думаю, што Альгерд мог сабраць большае войска.

2 лютага на рацэ Страве, паміж гарадком Жыжморы ды вёскай Стрэчуны, абедзве раці сустрэліся. Альгерд апынуўся ў нязручным становішчы — за спінай засталася дрэнна замерзлая Страва. І ўсё ж ён прыняў бой. Галоўны ўдар князь нанёс па цэнтры ордэнскіх харугваў. Літвіны і жамойты пацяснілі крыжацкія шэрагі. 50 рыцараў загінула. Магістр, убачыўшы, што правае крыло літвінскага войска аслаблена, рушыў левы фланг сваіх рацей у абыход і ўдарыў па яго цэнтры. Але, якім моцным ні быў удар крыжакоў, літвіны і жамойты вытрымалі яго і толькі пасля жорсткай сечы пачалі адступаць за Страву. Нечакана пад цяжарам тысяч людзей праламаўся лёд. Сотні вояў патанула, у тым ліку і Альгердаў брат Нарымонт.

Крыжакі не адважыліся перайсці раку і прадоўжыць бітву. Альгерд адступіў за Нёман, а магістр павёў свае раці ў Прусію. Паводле адных звестак, Альгерд страціў 6 тысяч вояў, паводле іншых — 10 тысяч. Сустракаецца і лічба 18 тысяч[24]. Відаць, крыжакі, жадаючы згладзіць непрыемнае ўражанне ад бясконцых няўдач у вайне з Вялікім княствам, наўмысна надалі гэтай бітве такое важнае значэнне і расхвалілі свой поспех. Свае ж страты крыжакі ацэньвалі сціпла: 4 тысячы вояў. Вядо-

ма, Ордэн лічыў, што ён атрымаў перамогу на Страве і расцрубіў па ўсёй Еўропе пра подзвіг сваіх рыцараў. Хоць нічога істотнага з гэтай «перамогі» крыжакі не дамагліся.

Ордэн яшчэ святкаваў перамогу над «паганымі», як Альгерд уварваўся ў Прусію, бязлітасна спустошыў і разрабаваў не адно сяло, захапіў тысячы палонных. Сам магістр павёў рыцараў, каб перагарадзіць Альгерду шлях назад. Але вялікі князь змяніў напрамак і, перахітрыўшы крыжакоў, вывеў свае войскі з Прусіі. Вось табе і «пераможаны» Альгерд.

«ДБАННЕ АБ ДЗЯРЖАВЕ СВАЁЙ»

Пасля бітвы на Страве Ордэн адмовіўся ад буйных паходаў і перайшоў да тактыкі дробных набегаў (рэйзаў). Цяпер Трокскае княства магло сваімі сіламі стрымліваць крыжацкі ціск. Альгерд жа звярнуў свой погляд на ўсход. Мэту сваёй палітыкі там Альгерд адкрыта выказаў у 1358 годзе на перамовах з крыжакамі: «Уся Русь павінна належаць Літве»[25].

Усведамляючы непазбежнасць вайны за рускія землі з Масквой, ён шукаў саюзнікаў. У далёкую Арду адправілася пасольства на чале з наваградскім князем Міхаілам-Карыятам ды князем Сымонам Свіслацкім. Зусім нечакана, парушыўшы ўсе законы дыпламатыі, Джанібек звязеніў літвінскіх паслоў і выдаў іх Сімяону Гордаму. Чаму ён так учыніў? Высветлілася, што маскоўскі пасол намаўляў хану: «Альгерд улусы твае ўсе высек і ў палон вывеў, калі хочаш яму дараваць, то і нашу зямлю усю спустошыць, і такім чынам абагаціўшыся, захоча табе быць больш супраціўным»[26]. Традыцыйная палітыка Арды заключалася ў падтрымцы слабейшага боку ў барацьбе з мацнейшым. Гэтым ардынцы дамагаліся раўнавагі сіл ва Усходняй Еўропе. Узмацненне Вялікага княства выклікала зразумелую трывогу ў Сараі. У той жа час Джанібек заключыў дамову з польскім каралём Казімірам, накіраваную супраць Літвы.

За гэтай няўдачай сталася другая — канфлікт з Псковам. У 1348 годзе ў баі з немцамі загінуў намеснік Андрэя Полацкага ў Пскове Юрый Вітаўтавіч. Пскавічы адмовіліся ад літвінскіх намеснікаў і замірыліся з Ноўгарадам. Альгерд не хаваў сваёй крыўды: «Шмат маіх людзей загінула і коней у вашай воласці»[27]. Па яго загаду ўсіх пскоўскіх купцоў, якія гандлявалі ў Вялікім княстве, затрымалі, адабралі ў іх тавар і адпусцілі толькі тады, калі яны выплацілі выкуп. У 1350 годзе Андрэй Полацкі з палачанамі напаў «без вести» на Пскоўшчыну. Пскавічы сталі збіраць раць для паходу на Полацк. Так нечакана рушыліся Альгердавы задумы.



Пячатка Кейстута

А наперадзе князя чакалі новыя цяжкасці. Польскі кароль Казімір III, заручыўшыся падтрымкай Чэхіі ды Арды, у жніўні 1349 года распачаў вайну ў Галіцыі ды на Валыні. Скарыстаўшыся разладам Любарта з дробнымі князькамі Ізяславічамі, ён перацягнуў іх на свой бок і з іх дапамогай авалодаў Уладзімірам і Луцкам. Пасля доўгай аблогі польскія войскі захапілі Холм. Уся Валынь стала здабычай палякаў. Любарт прызнаў сябе васалам польскага караля і задаволіўся адным толькі Луцкам.

Адначасова мазавецкія войскі захапілі Бярэсце. У адказ Кейстут напаў на Мазовію, здабыў Чэрск і Варшаву. Казімір вывеў войскі з Валыні, кінуўся ў пагоню за Кейстутам і дагнаў яго 20 мая 1350 года пад Сахачовам. У жорсткай бітве палякі адбілі палон і вайсковую здабычу. І тым не менеў Кейстут з войскам пераправіўся цераз Віслу і вярнуўся дадому.

Каб спыніць паход Казіміра на Трокскае княства, Кейстут уступіў з ім у перамовы, абяцаючы прыняць хрысціянства. Казімір паведаміў пра Кейстутаў намер папу Клементу VI. Той прыслаў Кейстуту грамату, у якой прапанаваў яму каралеўскую карону адразу ж пасля прыняцця хрысціянства.

Сам факт перамоў Кейстута з польскім каралём пацвярджае, што трокскі князь лічыў сябе незалежным уладаром, а Трокскае княства самастойнай дзяржавай. Нездарма «Хроніка Літоўская і Жамойцкая» ўказвае, што Кейстут княжыў «волею своею», г.зн. не залежаў ад Альгерда. У такіх адносінах да Вялікага княства Літоўскага знаходзіўся і Любарт.

Заваёва Казімірам Валыні выявіла глыбокія супярэчнасці паміж Гедымінавічамі. Кейстут патрабаваў ад Альгерда дапамогі ў вайне з Польшчай. Альгерд адмовіўся.

Відаць, у гэты час ён павёў сваё войска на Падолле, бо аповяд пра гэты паход у «Хроніцы Быхаўца» папярэднічае паведамленню пра яго шлюб у 1350 годзе з цвярской князёўнай Ульянай. Паводле «Хронікі», князь Фёдар Карыятавіч «не жадаў быць разам з Падольскай зямлёю паслухмяным вялікаму князю Альгерду»[28]. Калі гэта так, дык Альгерд быў болей устрывожаны выхадам з-пад яго ўлады Падолля, чым вайною Любарта і Кейстута з Казімірам. Яму спастрэбіўся вайсковы паход, каб зброяй заваяваць гарады Брацлаў, Сакольцу, Камянец, Смотрыч, Скалу і тым самым падначаліць Падолле Вялікаму княству. Тады Кейстут змовіўся з братамі (відаць, з Любартам ды Яўнутам), запрасіў Альгерда да сябе і, калі той пры-

ехаў, зняволіў яго. Ад Альгерда патрабавалі заключыць мір з Сімяонам Гордым і дапамагчы ў вайне з Польшчай. Трэба думаць, калі б Альгерд адмовіўся і зараз падтрымаць сваіх братоў у іх барацьбе з Казімірам III, Гедымінавічы пасадзілі б у Вільні падатлівага Яўнута. Супраць сваёй волі Альгерд даў згоду падтрымаць Любарта ды Кейстута.

У 1350 годзе ў Маскву прыбыло пасольства ад Альгерда «со многими дары». Уладар Літвы прасіў у Сімяона Гордага міру, а таксама вызвалення выдадзеных таму ханам Джанібекам паслоў. Так проста маскоўскі князь не пайшоў насустрач Альгерду. Відаць, той вымушаны быў адмовіцца ад прэтэнзіі на Паўночна-Усходнюю Русь і ад улады над Смаленскім княствам. Мір заключылі і замацавалі яго шлюбамі: Альгерда з цвярской князёўнай Ульянай, Любарта з пляменніцай Сімяона Гордага.

Праз маскоўскага князя Альгерд зноў звярнуўся да Арды, просячы войска для вайны з Польшчай. Што ж, Альгерд не здрадзіў сабе: малою крывёю за кошт дапамогі саюзнікаў дамагаецца сваёй мэты. Арда, зацікаўленая ў працягу вайны, перастала падтрымліваць Польшчу і заняла нейтралітэт.

Тым часам польскі кароль, якога ўсыпілі абяцанні Кейстута, распусціў войска. Як высветлілася, Кейстут гэтага толькі і чакаў. Аб'яднанае літвіна-жамойцка-валынскае войска пад кіраўніцтвам Альгерда, Кейстута ды Любарта выступіла на Валынь. Гарады добраахвотна адчынялі перад імі свае брамы. Тыя ж населеныя пункты, дзе заселі польскія гарнізоны, давялося браць аблогаю. Былі вызвалены ад палякаў Бярэсце, Уладзімір, Холм, Белз. Гедымінавічы са сваімі дружынамі падышлі да Львова. За новай, узведзенай Казімірам цвержай схаваўся вялікі гарнізон. Так і не авалодаўшы Львовам, браты павярнулі на поўнач, уварваліся ў Польшчу і спустошылі Лукоўскую, Сандамірскую і Радомскую землі.

На гэтым вайна не скончылася. Казімір сабраў новае войска, заключыў саюзы з Мазовіяй і Венгрыяй. Папа рымскі абвясціў крыжовы паход на «схізматыкаў». Вялікае польска-мазавецка-угорскае войска (толькі Людовік Угорскі вёў 40 тысяч вояў) рушыла на Галіцыю ды Валынь. На баку Трокскага княства ды Валыні выступіла Залатая Арда. Татары напалі на Пакуце, а пасля на Венгрыю, але былі там разбіты сяміградскім ваяводам. Польскія і ўгорскія войскі без асаблівага супраціўлення захапілі Галіцыю і Валынь. Любарт здаў Уладзімір і сам трапіў у палон. Пасля гэтага угорскае войска рушыла на Трокскае княства.

Кейстут у адчаі рашаецца на рызыку. Ён перапраўляецца на левы бераг Буга, дзе каля Мельніка знаходзіўся варожы стан, і з'яўляецца перад каралём Людовікам. На такі крок мог

адважыцца толькі Кейстут. Дзе тут авантурызм, а дзе тут глыбока прадуманая тактыка вайны з непрыяцелем, не зразумець. Здзіўлены Людовік пачуў ад Кейстута тое, чаго не чакаў. Троцкі князь прапануе мір і абяцае хрысціцца ў каталіцтва разам з княствам. Нечуваная ўдача! Людовік нават не паверыў. Кейстут дае клятву: па паганскім звычаі адсякае мячом галаву валу і абмывае яго крывёю рукі і твар. Тое ж робяць і яго таварышы. Цяпер Людовік не сумняваецца ў шчырасці Кейстута. Дамова заключана. З няволі выпушчаны Любарт, а Кейстут разам з Людовікам адпраўляецца ў Венгрыю прымаць каталіцтва.

Неверагодна, але факт — вось такой хітрасцю Кейстут выратаваў сваю дзяржаву ад варожага нашэсця. Па дарозе ён, скарыстаўшы зручны момант, уцёк з угорскага войска.

І зноў дапамога Вялікага княства Літоўскага дала магчымасць Валыні пазбегнуць разгрому. Хаця выступіць адразу пасля нападу Казіміра Альгерд не мог. Для гэтага былі сур'ёзныя падставы.

У Еўропе ў гэты час лютавала чорная смерць — чума. Тысячы людзей паміралі ў пакутах. Усё гэта прынялі за гнеў Божы. А тут яшчэ знак нябесны — вялікая камета, якая нагнала вялікага жаху. Каб заслужыць Божую ласку, хрышчоны народ забіваў яўрэяў, пускаўся ў паломніцтвы да святых мясцін. Вырашылі і прускія рыцары ўміласцівіць Усявышняга знічтажэннем жамойцкіх язычнікаў. Новы вялікі магістр Вінрых Кніпродэ заклікаў з Германіі паломнікаў, якіх прывёў граф Этынгенскі.

У студзені 1352 года крыжакі напалі на Жамойць. Як і заўжды, пачалі рабаваць і спальваць сёлы, забіраць жамойтаў у палон. Нечакана лінулі дажджы, рэкі выйшлі з берагоў, дарогі сталі непраходнымі. Ордэнскае войска паспешліва адступіла да Рагніта. Ад недахопу фуражу дохла захопленая жывёла, баявыя коні. Мноства крыжакоў загінула ад голаду і знясілення, патанула ў рэках. Толькі рэшткі ордэнскага войска вярнуліся з Жамойці. І хоць так няўдала закончыўся гэты паход, Кейстут вырашыў адпомсціць ворагам. Да яго далучыўся і Альгерд. Падзяліўшы войска на чатыры атрады, браты спустошылі прускія землі да Куршскага заліва.

У паходзе братоў удзельнічалі і смаляне. Яны абклалі крыжацкі замак Лабіў. Але іх прыступ ордэнцы адбілі, адцяснілі вояў да ракі і вымусілі перапраўляцца на другі бераг. Смаленскі князь пачаў тануць. Яму на дапамогу кінуўся фохт замка, выцягнуў на бераг і адпусціў на волю. Гэта было зроблена з-за павагі да Кейстута, якому прадвадзіцель смалян даводзіўся сваяком. Нават крыжакі прызнавалі высакароднасць і рыцарства троцкага князя і паважалі яго.

Толькі пасля гэтага паходу паспяшаўся Кейстут насустрач угорцам. Альгерд жа выступіў пад Смаленск, каб абараніць горад ад маскоўскіх войскаў Сімяона Гордага. Да бітвы справа не дайшла. Сімяон Горды асцерагаўся вайны з Альгердам і на перамовах адмовіўся ад заваёвы Смаленска. Не пакідаючы баявога сядла, Альгерд едзе на Валынь. Казімір III, баючыся страціць Галіцыю, выводзіць войскі з Валыні і заключае з Любартам і Кейстутам мір. Па дамове Валынь заставалася ва ўладанні Любарта. (Тое, што ў гэтай дамове не ўдзельнічаў Альгерд, яшчэ раз указвае на самастойнасць Валыні ды Трокскага княства.) Але ні Любарт, ні Казімір не былі задаволены вынікамі вайны. Валынскі князь спадзяваўся адваяваць Галіцыю. У сваю чаргу Казімір не адмовіўся ад надзей далучыць да Польшчы Валынь.

Ужо ў наступным, 1353 годзе Любарт захапіў Галіч, а пасля дайшоў да польскага горада Завіхоста. Казімір не паспеў нават сабраць войска, і Любарт без перашкод вярнуўся на Валынь. Мір быў парушаны. Польшча пачала рыхтавацца да новай вайны. Казімір зноў паклікаў на дапамогу угорскага караля Людовіка, заключыў дамову з татарамі, папрасіў дапамогу ў Ордэна. Ці магло падабацца Альгерду быць заложнікам неабдуманых дзеяў Любарта? У Вялікім княстве хапала сваіх спраў, а даводзілася ісці на Валынь, трымаць там свае войскі, ваяваць за чужыя інтарэсы. Добра было б уладзіць гэтую звадку мірам. Паабяцаўшы ахрысціць паганцаў, Альгерд заручаецца падтрымкай папы Інакенція VI і дамагаецца міру з Тэўтонскім ордэнам. Крыжакі нападаюць на Мазовію, заваёўваюць некалькі замкаў. Тут ужо Казіміру не да Валыні. Ён (можна ўявіць сабе жах папы!) прызнае сябе даніннікам Залатой Арды і разам з татарамі нападае на Ордэн.

«...КАБ УСЯ РУСЬ НАЛЕЖАЛА ЛІТВЕ»

Сутыкнуўшы лбамі двух ворагаў, Альгерд на якійсьці час забяспечыў спакой на межах саюзных Вялікаму княству дзяржаў і мог нарэшце прыступіць да выканання сваёй мэты — збірання ўсходнеславянскіх земляў. І, пэўна, узяўся за справу з добрым настроем. Як і Гедымін, ён дамагаўся ў візантыйскага патрыярха аднаўлення ў Вялікім княстве мітраполіі. Яшчэ ў 1352 годзе Альгерд паслаў у Канстанцінопаль свайго стаўленіка Феадарыта для ўзвядзення яго ў мітрапаліты. Калі ж патрыярх Філафей адмовіўся гэта зрабіць, князь, выкарыстаўшы раскол паміж Візантыйскай ды Балгарскай цэрквамі, звярнуўся да тырнаўскага патрыярха. І той паставіў Феадарыта. Новы



Пячатка Альгерда

мітрапаліт выбраў сваёй сталіцай Кіеў. Пры яго дапамозе Альгерд разлічваў нейтралізаваць царкоўна-палітычны ўплыў Масквы ў Кіеве і Сярэднім Падняпроўі. Канстанцінопальскі патрыярх абвясціў Феадарыта звергнутым і прыгразіў адлучэннем ад Царквы, калі той не адмовіцца ад мітраполіі. Таксама было прынята рашэнне аб перанясенні рускай мітрапалітавай кафедры з Кіева ва Уладзімір-на-Клязьме. Удар для Альгерда немалы: Масква з дапамогаю візантыйскага патрыярха дамаглася прыярытэту сваёй улады на рускіх землях. Князь шле ў Канстанцінопаль ужо новага стаўленіка, сваяка па жонцы Рамана. І патрыярх ідзе на кампраміс: зацвярджае двух мітрапалітаў: маскоўскага Аляксея і літвінскага Рамана, якому падпарадкаваў Наваградскае, Полацкае, Тураўскае епіскапствы.

Вярнуўшыся на Літву, у сваю рэзідэнцыю ў Наваградку, Раман актыўна заняўся царкоўнымі справамі. Не пакідаў ён надзей падначаліць сабе і Кіеў, каб у яго тытуле значылася: «мітрапаліт усея Русі». Паміж Раманам і Аляксеем успыхнула грызня. Новы сабор у 1355 годзе пацвердзіў за Аляксеем права на кіеўскую мітраполію і «всея Руси», а Раман атрымаў у кіраванне «епіскапства Малой Русі» (Галіцка-Валынскай Русі).

Альгерд усё ж мог быць задаволены ад такога вырашэння справы: у сваіх уладаннях займеў асобнага ад Масквы мітрапаліта і дамогся таго, што цяпер на рускіх землях яго ўспрымалі як праваслаўнага гасудара. Да ўсяго літвінскі мітрапаліт стаў кіраваць і Галіцка-Валынскай епархіяй — гэта таксама на карысць. Такім чынам, Альгерд ухапіў у рукі нітачку, якой можна пры выпадку тузануць і Любарта. А той марыў таксама мець сваю мітраполію і стаць незалежным ад царкоўнай улады Масквы і Наваградка. Не атрымалася.

Нібыта ўсё складвалася для Альгерда ўдала: ён заручыўся падтрымкай праваслаўнай царквы, пазбавіў яе ад духоўнай улады маскоўскага стаўленіка мітрапаліта Аляксея, вывеў свае войскі з Валыні, забяспечыў мір з Ордэнам. Аднак заваёўваць рускія землі не спяшаўся. Чакаў зручнага моманту, сачыў за падзеямі на Русі.

Калі ў 1339 годзе «злые крамольники» на вечы ў Бранску забілі князя Глеба Святаславіча, дык горад доўгі час заставаўся без князя, і кіравала тут веча. І вось у 1355 годзе Альгерд, скарыстаўшыся вечавымі хваляваннямі, «воевал Бранск», але нічога не дамогся. У той жа час з Арды прыбыў князь Васіль, трымаючы пры сабе ханскі ярлык на княжанне ў Бранску.

Сварыцца з Ардой Альгерд не стаў, адступіўся. Да пары да часу. А пакуль яго мэтай стала Смаленскае княства. Сціснутае з абодвух бакоў моцнымі дзяржавамі, яно дажывала апошнія дні свайго палітычнага жыцця. Этнічная сваяцтва смаленскіх і полацкіх крывічоў, даўнія цесныя сувязі паміж Полацкам і Смаленскам, адзіны агульны гандлёвы шлях да лівонскіх гарадоў збліжалі Вялікае княства Літоўскае са Смаленскім княствам. Некалі Смаленск знаходзіўся ў «Полотские власти». Пра гэта ведаў Альгерд і глядзеў на Смаленшчыну як на землі, якія павінны ўвайсці ў яго дзяржаву. А пасля таго як Дняпроўска-Дзвінскі шлях апынуўся ва ўладзе літвінскіх князёў, Смаленску міжволі давялося шукаць саюзу з Вялікім княствам. Штурхала на гэта і маскоўска-ардынская пагроза. Смаленскія князі прызналі сябе васаламі вялікага князя літоўскага, і не аднойчы літвінская дапамога выратавала Смаленск ад захопу яго маскоўска-ардынскімі войскамі. Смаленцы таксама дапамагалі сваім этнічным братам у войнах з крыжакамі: удзельнічалі яны ў бітве на Страве, у паходзе Альгерда ў 1352 годзе на Прусію. Аднак смаленскі князь Іван Аляксандравіч усё ж неяк імкнуўся супраціўляцца паглынанню Вялікім княствам яго дзяржавы, ды далей нясмелага пратэсту супраць дзеянняў Альгерда ён не ішоў. У 1355 годзе абодва князі, відаць, пасварыліся. Альгерд, каб перашкодзіць зносінам смаленскага князя з Масквою і Цверру, заняў горад Ржэў, які стаяў на мяжы смаленскіх земляў з маскоўскімі ды цвярскімі. Пэўна, Іван Аляксандравіч выказаў незадавальненне. Ну а калі Альгерд адчувае сваю сілу, дык не любіць нязгоды, дзейнічае рашуча. Восенню таго ж года ён напаў на Смаленск і захапіў у палон пляменніка Івана Аляксандравіча, князя Васіля. На здзіўленне, гэтая карная акцыя не зрабіла смаленскага ўладара згаворлівым. Па яго просьбе ў 1357 годзе маскоўскія і цвярскія раці выгналі з Ржэва літвінскі гарнізон. А наступным годам смаляне хадзілі адваёўваць горад Бельчу, захоплены Альгердам. І пакаранне наступіла адразу. Альгерд уступіў у Смаленскае княства, узяў Мсціслаў і далучыў яго да Вялікага княства. Адначасова Андрэй Полацкі з палачанамі пасля доўгай аблогі завалодаў Ржэвам. Умацаваўшы горад, ён пакінуў там сваіх намеснікаў. Наследнік Івана Аляксандравіча, Святаслаў Іванавіч, які сеў на смаленскі пасад у 1358 годзе, прызнаў уладу Літвы.

На нейкі час Альгерд перанёс свае дзеі на поўнач. Трэба было прадоўжыць мір з Ордэнам. У чэрвені 1358 года ў Нюрнберг да імператара Карла IV прыбыло Альгердава пасольства на чале з Кейстутам. Паслы заявілі, што Альгерд жадае замірыцца з Ордэнам і прыняць каталіцкую веру. Імператар накіраваў для перамоваў з Альгердам пражскага архібіскупа

Эрыста, герцага Балька Швейдніцкага і германскага правінцыйнага магістра Вольфрама Нэленбурга. Патрабаванні Альгерда аказаліся для Ордэна «занадта вялікімі». А патрабаваў ён вярнуць Вялікаму княству ўсе заваяваныя Ордэнам землі, перасяліць Ордэн на мяжу з татарамі, і «каб Ордэн не ўтрымліваў за сабою ніякага права на рускіх, каб уся Русь належала Літве»[29]. На такія ўмовы ні імператар, ні Ордэн не згадзіліся. У адказ імператарскім паслам Альгерд мовіў: «Цяпер ясна бачу, што ў вас справа не пра маю веру, як кажаце, а пра грошы»[30]. Але Альгерд з Кейстутам дамагліся таго, што ставілі за мэту: выйграць год-другі міру.

1358 і 1359 гады прайшлі без вайны з прускімі рыцарамі. Альгерд зноў вярнуўся да спраў на ўсходзе. У 1359 годзе ў Бранску памёр князь Васілій. Ніканаўскі летапіс лаканічна распавядае аб наступных падзеях. «И бысть въ Брянске мятежъ от лихихъ людей и заметня велия и опустение града; и потом пача обладати Брянском князь Литовский»[31]. Трэба думаць, летапісец вось так туманна і незразумела паведамляў пра барацьбу ў Бранску дзвюх палітычных груповак — пралітвінскай і прамаскоўскай. Частка браццаў бачыла ў Вялікім княстве тую рэальную сілу, якая магла вызваліць Браншчыну ад ардынскага ярма.

Літва не трымала свае межы на замку. Тыя ж браццы прыязджалі сюды і на свае вочы бачылі прававое становішча гарадоў, зямель, тыя прывілеі, якімі карысталіся жыхары княства. Так, трэба было плаціць падаткі, выконваць агульнадзяржаўныя павіннасці; але ж гэта не ганебны цяжар ардыншчыны. Месцічам маглі падабацца тыя вольнасці, якімі карысталіся палачане. Баярству сімпатызавала тое, што вялікі князь захоўваў іх маёмасныя правы. Так што многія ў Бранску паглядалі на Вялікае княства з сімпатыяй. І пасля смерці свайго князя яны, падавіўшы супраціўленне прамаскоўскай групоўкі, запрасілі ў Бранск Альгерда.

Падрабязна на гэтым эпізодзе спынілася ў сваіх запісках Кацярына II. Яна паведамляе, што Альгерд пасля смерці бранскага князя ўзяў у палон яго сына. «І быў у Бранску мяцеж і разнаглассе, і спрэчкі, і бойкі, і забойства, і спусташэнне горада, іншыя хацелі быць як Ноўгарад і Пскоў, іншыя перасылаліся з Смаленскімі князямі, другія з Літоўскімі князямі і працягваліся звадкі іх, пакуль князь вялікі літоўскі пачаў валодаць Бранскам»[32]. Так, верагодна, не абышлося без узброенай барацьбы розных партый у Бранску і паходу самаго Альгерда да Бранска ў падтрымку сваіх прыхільнікаў.

НАСТУП ОРДЭНА

Новы, 1360 год прынёс на Літву бяду. У гарадах і сёлах лютаваў мор. Тысячы людзей забірала ў магілу смерць. У гэтым жа годзе аднавілі свае паходы і крыжакі: пруская і лівонскія рыцары адначасова напалі на Жамойць і страшна спустошылі яе. У наступным годзе Альгерд з Кейстутам на паляванні натыкнуліся на крыжацкую засаду. Альгерду ўдалося выратавацца, а вось Кейстут трапіў у палон.

Адбылося гэта так. Перад Вялікаднем,13 сакавіка, крыжакі зрабілі набег у ваколіцы Бельска. Рака Нарэў выйшла з берагоў, і рыцары не змаглі пераправіцца цераз яе. Нічога не заставалася рабіць, як спыніцца ў бліжэйшай ордэнскай цвержы Экэрсберг. Адсюль важар крыжакоў Генрых Краніхфельд выслаў віжоў. Яны натыкнуліся на сляды конніцы, а пасля ўбачылі кавалькаду, якая забаўлялася паляваннем. Былі тут Альгерд і Кейстут, сын Кейстута Патрыкій. Віжы тут жа паслалі ў цвержу вестуна. Краніхфельд са сваім атрадам і экэрсбергскімі рыцарамі патаемна падышоў да месца, дзе палявалі князі, і напаў на іх. Кейстут хацеў спыніць сваіх уцякаючых воінаў, але быў выбіты з сядла. Яму на дапамогу кінуўся Патрыкій, і яго таксама выбілі з сядла. Крыжакі адцяснілі Патрыкія і зняволілі Кейстута.

Трокскага князя з пашанай прывезлі ў Марыенбург да вялікага магістра Вінрыха фон Кніпродэ. Для важнага вязня знайшлася і надзейная вязніца. Да Кейстута прыставілі наглядчыка, які прыносіў яму пітво і ежу. Князь слова за слова разгаварыўся з ім, і высветлілася, што той таксама нявольнік. Яшчэ дзіцем яго захапілі ў палон крыжакі і выхавалі слугой Ордэна. Альф — так клікалі яго ландскнехты — блізка да сэрца ўспрыняў аповяды Кейстута пра сваю Радзіму, пра яе змаганне з крыжакамі і ўзяўся наладзіць уцёкі. У каморы, дзе сядзеў Кейстут, знаходзілася закладзенае цэглаю і завешанае акенца, якое выходзіла ў бок крапаснога рова. Альф прынёс у каморку кірку, і князь па начах прабіваў адтуліну. Раніцай, калі рыцары збіраліся ў касцёл на службу, Альф выносіў смецце, а дыван зноў вешаўся на сцяну, і ніхто не бачыў пралом. Восем месяцаў працаваў Кейстут. Калі пралом быў зроблены, вязень па вяроўцы спусціўся ў роў, дзе яго чакаў Альф. Яны апрануліся ў рыцарскія белыя плашчы з чорнымі крыжамі, селі на коней, узятых у стайні магістра. Вартаўнік прыняў іх за сваіх і адчыніў замкавую браму. Уцекачы накіраваліся ў Мазовію да князя Януша, жанатага з Кейстутавай дачкою. Па дарозе ім сустракаліся рыцары, якія віталі іх паводле рыцарскага звычаю. Высланая пагоня не дагнала князя і яго спадарожніка.

Дабраўшыся да Трокаў, Кейстут адаслаў магістру ліст, у якім дзякаваў за добры прыём і пакой. Ну, а калі богі дапамогуць яму злавіць Кніпродэ, дык ён паклапоціцца даць яму больш надзейны пакой.

У тым жа 1361 годзе Кейстут з дружынай уступіў у Прусію, каб расшукаць Краніхфельда і адпомсціць яму. Разбурыў некалькі замкаў, але нідзе не знайшоў свайго ворага. Ды лёс яшчэ раз падвёў князя. Ён зноў трапіў у палон.

У баі каля замка Экэрсберг на Кейстута напаў рыцар Вернер Віндэнгейм, моцным ударам дзіды выбіў яго з сядла. Князь не разгубіўся, ускочыў на ногі і, схапіўшы шчыт і дзіду, параніў Вернеравага каня. У той жа момант на Кейстута кінуўся рыцар Дойбан. Зразумеўшы, што яму не адбіцца, Кейстут гатоў быў замірыцца. «Апусці дзіду», — прапануе ён рыцару. — «Чаму ж мне не адпомсціць язычніку!» — адказвае той. — «Спыніся! Я — Кейстут. Ідзі да мяне на службу, я зраблю цябе багатым». Але рыцар працягваў змагацца, адказваючы князю: «Мае ўладары ў адну гадзіну дадуць мне болей, чым ты за ўсё жыццё»[33]. Так Кейстут трэці раз трапіў у палон. Потым скарыстаўшыся замятняй у шэрагах крыжакоў, Кейстут уцёк з іх лагера.

Няўдачы вымагалі Ордэн перайсці да рашучых дзеяў. Магістр падумваў ужо не пра дробныя набегі па лупах, а пра буйныя вайсковыя акцыі, якія прынеслі б Ордэну жаданую перамогу над Трокскім княствам і Вялікім княствам Літоўскім. Было вырашана захапіць Коўна.

Узімку 1361 года магістр пасылае пад Коўна сваіх віжаў даведацца пра яго ўмацаванні, колькасць гарнізона. Адначасова Ордэн пачаў зборы ў паход: будаваў абложныя машыны, запасаўся харчамі. У Кёнігсберг сцякаліся рыцары з Германіі, Італіі, Англіі і Даніі. Прыбылі і знатныя госці — нямецкія графы Герард Вірнебург, Спонгейм, два браты Гагелоге. Войска ўзначаліў сам магістр Вінрых фон Кніпродэ. Ранняй вясною 1362 года вялікі магістр павёў войска да Рагніта. Тут 13 сакавіка адна частка войска села на караблі. Пагрузілі зброю, машыны, харч. Другая частка войска ішла па левым беразе Нёмана.

Крыжакі ўзялі ў аблогу Коўна. Абараняў цвержу трохтысячны гарнізон пад зверхнасцю Кейстутавага сына, навагрудскага князя Войдата-Канстанціна.

Першы штурм закончыўся няўдала. Агнём бамбардаў і таранамі абложных машын яны разбурылі вежу з боку Вілii. Пад абваленай вежай загінула 400 абаронцаў замка. Абрадаваныя крыжакі рынуліся ў замак. Між тым ўспыхнуў пажар. У агні гінулі як абаронцы, гэтак і крыжакі. Перад вогненнай сцяной крыжакі адступілі.



Ю.Азямблоўскі. Коўна. *Паводле старажытнай гравюры*

Альгерд ды Кейстут паспяшылі на дапамогу Коўне. Але сілы былі няроўныя. Літвінскія і жамойцкія харугвы адступілі на правы бераг Віліі. Кейстут і тут праявіў мужнасць. Князь заявіўся ў крыжацкі стан і запатрабаваў сустрэчы з магістрам Вінрыхам фон Кніпродэ. Пасля прывітанняў Кейстут мовіў магістру: «Хочаш узяць горад без правадыра? Калі б я быў у Коўна, ты ніколі не авалодаў бы ім!» — «Дык навошта ты пакінуў горад, калі ўбачыў, што мы набліжаемся?» — спытаў

магістр. — «Таму што тады мой край застаўся бы без галавы», — адказаў Кейстут. — «Калі хочаш, дык вазьмі з сабою столькі людзей, колькі табе патрэбна, і ўвайдзі ў горад. Мы спадзяёмся на Бога і думаем, што ты не зможаш абараніць Коўна», — пахваліўся магістр. — «Як жа я ўвяду туды сваё войска, калі ўсё поле вакол перакапана равамі і пакрыта засекамі?» — спытаў Кейстут. Магістр, якому спадабалася гульня ў рыцарства і велікадушнасць, прапанаваў: «Абяцай мне, што пойдзеш абараняць горад, і я загадаю засыпаць равы і разабраць засекі». Але воі, якія прыехалі з Коўна на перамовы, упэўнілі князя, што гарнізон цвержы вытрымае аблогу. Тады ўгневаны магістр, якому не выпала праявіць высакароднасць, развітаўся з Кейстутам, сказаўшы яму: «Кароль, болей табе няма чаго размаўляць са мною, ідзі да сваёй варты»[34]. Кейстут вярнуўся ў лагер.

25 дзён доўжылася аблога Коўны. Крыжакі крышылі штурмавымі машынамі сцены. 10 красавіка пачаўся штурм. Шэсць дзён адбівалі варожыя прыступы абаронцы. Амаль усе яны загінулі. Крыжакі падцягнулі да сцен абложныя машыны, з якіх лучнікі пасылалі ў замак вогненныя стрэлы. Неўзабаве замак ахапіла полымя. Радасныя крыкі крыжакоў змешваліся з адчайнымі крыкамі абаронцаў, якія гінулі ў агні. І тады Войдат-Канстанцін з апошнімі воямі рынуўся ў бой, жадаючы прабіцца праз крыжацкія шэрагі. Яго разам з трыццаццю шасцю ратнікамі ордэнцы захапілі ў палон*.

На другі дзень — быў Вялікдзень — на развалінах замка крыжакі пабудавалі бажніцу і адслужылі абедню, а пасля па загаду магістра зраўнялі замак з зямлёю.

БІТВА КАЛЯ СІНІХ ВОДАЎ

Інтарэсы Вялікага княства Літоўскага прымусілі Альгерда адмовіцца ад дапамогі Трокскаму княству: хаця пачаўся новы наступ крыжакоў, Альгерд восенню таго года пайшоў на татараў у «Поля Дикие». Недаравальна было б упусціць спрыяльны момант для ўдару па татарах. Становішча ў Залатой Ардзе дазваляла спадзявацца на поспех. Вызваленчая вайна паняволеных народаў, барацьба варагуючых партый, палацавыя перавароты падрывалі яе моц. Толькі пасля смерці хана Бардзібека ў 1359 годзе чатыры разы мяняліся ўладары ў Сараі. У

* У палоне Войдат прыняў каталіцтва. Некаторы час ён знаходзіўся пры двары імператара Карла IV, пакуль не атрымаў ад Ордэна замак Велаў, дзе і памёр.

1362 годзе ў Ардзе зноў распачалася міжусобная барацьба. Крымская, Перакопская і Ямбалукская орды, пад зверхнасцю якіх знаходзілася Паўднёва-Усходняя Украіна, пазбавіліся магчымасці скарыстаць дапамогу цэнтральнай улады.

Цікава, каго Альгерд павёў пад сваімі сцягамі? Яму не маглі дапамагчы ні Кейстут, які стрымліваў крыжакоў, ні Любарт, што баяўся нападу на Валынь палякаў. Давялося князю разлічваць на вайсковыя сілы Вялікага княства Літоўскага, перш за ўсё са сваіх вотчынных земляў: Віцебшчыны, Нальшчанаў, Віленшчыны, Меншчыны. А калі меркаваць па тым, што шэрагу Гедымінавічаў (ужо ўнукаў Гедыміна) Альгерд пасля падараваў удзелы, дык яны таксама прывялі сваіх вояў. Вядома, што Фёдар Карыятавіч, які княжыў у Наваградку, атрымаў Гомель. Значыцца, у паходзе ўдзельнічалі наваградцы (на гэта ўказвае і «Хроніка Літоўская і Жамойцкая»). Андрэй Полацкі, які прыйшоў з палачанамі, далучыў да сваіх уладанняў Трубчэўск. Удзельнічалі ў паходзе пінчукі, бо наследнік Пінскага княства Патрыкій Нарымонтавіч атрымаў за паход Стародуб. Ішлі пад Альгердавымі сцягамі і заслаўцы — сын заслаўскага князя Яўнута, Міхаіл, таксама набыў удзел на новых землях. На жаль, нельга ўстанавіць дакладную яго колькасць, але прыкладна можна назваць лічбу 15—20 тысяч вояў.

Сціпласць летапісных паведамленняў не дазваляе нам падрабязна разгледзець сам паход. Можна дапусціць, што харугвы збіраліся дзесьці на поўдні Літвы, на межах з Кіеўскім княствам. Авалодаўшы Кіевам, Альгерд пасадзіў там замест татарскага памагатага князя Фёдара, свайго сына Уладзіміра. У Кіеве былі зроблены апошнія прыгатаванні перад выхадам у «Поля Дикие». Мінуўшы Канеў і Чаркасы, Альгерд пайшоў насустрач татарскаму войску. Летапісы называюць месца сустрэчы — Сіняя Вада. Даследчыкі лічаць, што гэта назва рэчкі Сінюхі, прытока Паўднёвага Буга. Але дзе менавіта на ёй адбылася бітва? У «Вялікім чарцяжы», які быў выдадзены ў Маскве ў 1846 годзе, сказана так: «А ўверх па рацэ на Бузе рэчка Сіняя Вада, а па рэчцы па Сіняй Вадзе 70 вёрстаў ад Буга град Сіняя Вада». Можа, тут каля гэтага гарадка і біліся літвіны з татарскімі войскамі?

Расейскі гісторык Браўн лічыў, што месца бітвы непадалёк ад Ачакава каля Анджыгольскага возера, якое раней, па некаторых звестках, называлася Сіняя Вада. Так лічыў і польскі гісторык Сарніцкі.

Пра самую бітву летапісы распавядаюць сціпла. Прасочым яе ход паводле апісання ў «Хроніцы Літоўскай і Жамойцкай». «А гды пришли до Синей Воды, минувши Киев и Черкасы, указалася им в полю великия орда з трома цариками на три

обозы разделенными, то есть Котлуба, Китибея-Бекера и Дмитра-Солтана. То обачивши, Ольгерд, же до войны готовы татаре, розшиковал войско свое на шесть гуфов, закривленых з боков, и на чоло розсадивши, абы их татаре танцами звыклыми огорнути и стрелами шкодити не могли. А потом з великою запыльчивасцю татаре град железный з луков на Литву густо пустили, але им стрельбою не зашкодили, для порядного ушикования и прудкого розступеня. Литва зас з русю скочила зараз з копиями и шаблями, потыкаючыся, чоло им перервали и танцы помешали, другие зас з куш белтами, а зливщи новогорожане з Кориятовичами валили их з коней, напираючи на них з боков, летали не иначай як снопы от гвалтовного ветру татаре розбурены, и не могут болш Литвы на чоле вытрвати, почали мешатися и утекати по широких полях»[35].

А цяпер паспрабуем расшыфраваць гэтае летапіснае паведамленне. Спачатку зазначым гістарычнасць імён татарскіх важароў. Так, Кутлубая прызнаюць за сына крымскага намесніка Кутлук-Цімура, Кутлут-Бута. Кіцібея гісторыкі лічаць уладаром Перакопскай арды, уплыў якой распаўсюджваўся ў Паўночным Прычарнамор'і — ад Крыма да Дняпра і Дністра. Уладаром Ямблукскай арды, чыі качэўі знаходзіліся каля Дністра ў межах Карпатаў і нізоўяў Прута і Дуная, прызнаецца Дмітр-Салтан. У дакументах угорскага караля Людовіка і нагадваецца «татарскі князь Дэметрій», землі якога былі ў Ніжнім Падунаўі[36].

З хронікі вынікае, што татарскае войска раней прыйшло на поле бітвы і, безумоўна, выбрала лепшыя пазіцыі. З самага пачатку Альгерд быў пастаўлены ў няроўнае становішча. Перад ім дысцыплінаванае, добра ўзброенае войска, якое шырока карысталася ў баі шматлікімі тактычнымі хітрасцямі і прыёмамі: засадамі, нечаканымі нападамі, завабленнем праціўніка наўмысным адыходам з раптоўным пераходам у наступ. Рухомая лёгкая конніца давала татарам магчымасць манеўраваць, мяняць кірункі атакі, хутка адрывацца ад ворага і без страт адыходзіць.

Што супрацьпаставіў татарам Альгерд? Ён падзяліў сваё войска на шэсць гуфаў (палкоў), што павысіла іх манеўранасць і баяздольнасць, і паставіў іх разгорнутым шыхтам («сярпом»), вылучыўшы флангі далёка наперад ад цэнтра. Атрымаўся «мех» — пастка, у якую Альгерд збіраўся завабіць татарскае войска і пазбавіць яго манеўранасці. Князь ведаў улюбёную тактыку татараў: удар моцнымі флангамі па флангах праціўніка з мэтаю абысці яго, выклікаць паніку і акружыць. Таму на флангах Альгерд паставіў загартаваныя ў войнах з татарамі навагрудскія палкі пад зверхнасцю братоў Карыятавічаў, у цэнтры



Мініяцюра з «Угорскай хронікі». Татары. *XIV ст.*

размясціў астатнія літвінскія дружыны. Тут, у цэнтры, знаходзіліся кушы, або самастрэлы, — машыны, якія кідалі металічныя балты і каменні.

З самага пачатку бітва склалася не на карысць літвінскіх вояў — ім давялося шыхавацца пад абстрэлам татарскіх лучнікаў. «Але им стрельбою не зашкодили». Гонар ды славу перамогі над татарамі падзялілі з воямі і тысячы майстроў: рудакопы, кавалі, збройнікі, якія адзелі воінства ў баявыя даспехі. Важную ролю ў баі адыгралі самастрэлы, чыя стральба дазволіла воям стрымаць татарскі націск. Татарам так і не ўдалося прарваць фронт. Не здабылі яны перамогі і на флангах. Навагрудцы мужна змагаліся з ворагам, адбілі яго атакі і самі ўдарылі па татарах, «напираючы на них з боков», менавіта гэты рашаючы ўдар і прынёс літвінскаму войску перамогу.

«Трупов теж татарских полны поля и реки были», — піша аб татарскіх стратах хроніка. У сечы загінулі ваяводы Катлубей, Кацібей-Бекер і Дмітр-Салтан.

Альгерд як след выкарыстаў сваю перамогу. Адразу пасля бітвы ён вызваліў ад татараў гарады Белую Царкву, Звяніград, Пуціўль, захапіў татарскія цвержы Таргавіцу і Ачакаў, «и от Путивля аж до вустя Дону от татаров волно учинили и остранили аж до Волги»[37]. Землі ад вусця ракі Серэт да Чорнага мора, басейны рэк Днястра, Паўднёвага Буга, Паўднёвае Падняпроўе былі вызвалены ад татараў, «аж ледве часть их праз Днепр утекла на Черное море и до Перекопу»[38]. Кіеўскае, Чарнігаўскае, Ноў-

гарад-Северскае княствы, Падолле ўвайшлі ў склад Вялікага княства Літоўскага. Краіны Усходняй і Паўднёва-Усходняй Еўропы на доўгія гады, пакуль у Крыме не ўтварылася агрэсіўнае Крымскае ханства, пазбавіліся спусташальных татарскіх набегаў. Бітва ля Сініх Водаў садзейнічала вызваленчаму руху паняволеных народаў супраць мангольска-татарскага ярма, натхніла рускі народ на перамогі ў баях на Вожы і Куліковым полі.

ГАДЫ ВЫПРАБАВАННЯЎ

У добрым настроі вяртаўся ў Вільню Альгерд. Перамога наогул радуе, а тут такі трыумф... Адкінуты ад межаў Вялікага княства ваяўнічыя татары, Кіеў — «маці гарадоў рускіх» — у тваёй уладзе, і можна па праву прэтэндаваць на астатнія рускія землі. Доўгі шлях быў да гэтага — пятнаццаць гадоў. І вось ажыццявілася жаданая мара. Цяпер разбіць бы крыжакоў. А ў Вільні чакалі нярадасныя весткі. Крыжакі зацята лезлі на Трокскае княства.

У пачатку лета 1362 года маршал Ордэна Генінг Шынекоп з вялікім атрадам паспрабаваў захапіць Гародню. Рыцары ўжо збіраліся перапраўляцца цераз Нёман, як на іх нечакана напалі гарадзенцы. Крыжакі адступілі.

У студзені 1363 года прускія і лівонскія рыцары адначасова напалі на Аўкштайцію і Жамойць. Вялікі магістр спаліў Эрайголу і Жэймы. Пажар Жэймаў паслужыў лівонцам арыенцірам. Лівонскі магістр Арнольд Фітынгоф прывёў сюды сваіх людзей і сустрэўся з вялікім магістрам. Абгаварыўшы, каму куды ісці, яны накіравалі свае войскі на некранутыя вайной землі. Прускія рыцары з дапамогай паганскага жраца, які служыў ім правадніком, вадзіў іх з сяла ў сяло і паказваў, дзе хаваліся жыхары, захапілі ў палон мноства жанчын і дзяцей. Лівонцы спустошылі ваколіцы Упіты. І нідзе ў хроніках ні словам не згадваюцца хоць нейкія спробы Кейстута актыўна перашкодзіць крыжакам. Ён і цяпер не адважыўся без падтрымкі літвінскіх дружын Альгерда выйсці насустрач ворагу.

Вярнуўшыся ў Прусію, вялікі магістр Вінрых фон Кніпродэ сустрэў тут новых паломнікаў з Англіі ды Шатландыі. Па іх просьбе ён у Вялікі пост хадзіў на Гародню. Насустрач крыжакам разам са сваім князем Патрыкіем Кейстутавічам выйшлі гарадзенцы з хлебам і соллю, духавенства з абразамі і крыжамі. Госці здзівіліся — замест паганцаў іх прывялі ваяваць з хрысціянамі — і абурыліся за падман на тэўтонаў. Абняславіцца вайной з хрысціянамі рыцары не захацелі. Давялося з ганьбаю крыжакам вяртацца ў Прусію.

Сваю злосць за няўдалы паход на Гародню крыжакі спагналі на мазавецкім князю Земавіту, якога абвінавацілі ў падтрымцы паганцаў. Гэтага было дастаткова, каб напасці на Мазовію і спаліць Новагруд. Ордэн не асмеліўся на вачах еўрапейскіх паломнікаў нападаць на хрысціян. Важна было захаваць у Еўропе веру, што тэўтоны змагаюцца з паганцамі, абараняюць хрысціянства.

Восенню крыжакі напалі на адбудаванае Кейстутам Коўна, разбурылі яго і спалілі. Такі ж лёс напаткаў Бісену і Вялону. Кейстут не дараваў гэтых нападаў і спустошыў прадмесці замкаў Солдава і Астэрода ў Прусіі. У гэтым паходзе ўпершыню ўдзельнічаў яго сын Вітаўт. Яшчэ ніхто не ведаў, што з гэтага юнака вырасце слаўны па ўсіх землях уладар. Пазней Кейстут здзейсніў паход пад Георгенбург. Зладзейства крыжакоў не сыходзіла ім беспакарана. Тым не менш яны не супыняліся. Прага крыві клікала іх на забойствы. На іх радасць з Англіі прыбыў граф Томаш Варвік праславіць сваё імя подзвігамі ў вайне з паганцамі. Рагніцкі камандор Бурхард Мансфельд наладзіў яму паход у Эрыйгольскую і Пастаўскую землі, дзе пад мячом крыжакоў загінула 400 чалавек. У наступным, 1364 годзе 2 лютага Вінрых фон Кніпродэ і лівонскі магістр Арнольд падышлі з войскамі да Вількаміра. Дзевяць дзён правілі свой крывавы шабаш крыжакі: «спусташалі, палілі, зводзілі многіх у палон, забівалі шмат людзей»[39]. Кейстут і на гэты раз пазбег сустрэчы на полі бою, толькі напаў на крыжацкі лагер, знішчыў харчовыя запасы і фураж для коней. Нарэшце Альгерд вырашыў адказаць крыжакам сакрушальным ударам. Ён падзяліў войска на чатыры атрады. Вялі іх Кейстут, яго сын Патрыкій, Аляксандр Карыятавіч і сам Альгерд. Літвіны дайшлі да Куршскага заліва, захапіўшы і спаліўшы па дарозе ордэнскія замкі Шалаўберг, Каўстртан і Сплітэрн. На зваротным шляху былі спустошаны ваколіцы Рагніты і Тыльзіта. На нейкі час крыжакі прысмірэлі, аднак нанеслі Альгерду і Кейстуту ўдар у самае сэрца.

Ці думалі Альгерд ды Кейстут, што іх сыны, тыя, каму працягваць іх справу, носяць у сэрцы здраду, нядобрыя задумы? Велікакняжацкі вянец засціў ім вочы, і яны гатовы дзеля яго прадаць бацькоў. Карыгайла-Канстанцін Альгердавіч і Бутаўт-Барыс Кейстутавіч патаемна звярнуліся да крыжацкіх паслоў, якія прыехалі ў Вільню, і прапанавалі рыцарам дапамогу ў авалоданні сталіцай за ўладу над Вялікім княствам. Выпадкова пра гэтыя перамовы даведаўся віленскі намеснік Дырсун, ён і звязеніў змоўшчыкаў. Альгерда ў той час, відаць, не было ў Вільні. Гэтым можна растлумачыць, што ніякага пакарання Бутаўт ды Карыгайла не панеслі. Іх саўдзельнікі забілі намес-

ніка, вызвалілі вязняў і разам уцяклі ў Прусію. У Кёнігсбергу ўцекачоў з урачыстасцямі сустрэў сам магістр і ахрысціў у каталіцтва. На патрабаванні Альгерда выдаць перабежчыкаў Ордэн адказаў адмоваю. Падобнага ўдару ў спіну князь не чакаў.

Бацька здрадніка... Ён, валадар дзяржавы, не даў сыну самага неабходнага — не выхаваў у ім годнасці, высакароднасці, пачуцця любові да Айчыны, за веліч і свабоду якой сам змагаўся ўсё жыццё. І гэта не проста непрыемны выпадак — гэта суровае папярэджанне яму, Альгерду, што можа чакаць дзяржаву пасля яго смерці — братазабойчая вайна за вярхоўную ўладу. І прахам пойдзе ўсё тое, дзеля чаго паклаў жыццё.

Кейстут у адказ на адмову вадаць здраднікаў напаў на ордэнскія ўладанні. Падобная мера не падзейнічла на Ордэн. У тым жа 1365 годзе Бутаўт, адпрацоўваючы ордэнскую міласць, прывёў крыжакоў у Вялікае княства. Ордэнцы захапілі Кернаў і Мейзегале, спустошылі ваколіцы Вількаміра і Вільні.

Выкліканы магістрам для перамоў віленскі намеснік адмовіўся здаць Вільню. Жыхары горада таксама не падтрымалі Бутаўта і зачыніліся ў замку. Расчараваныя крыжакі адступілі да Нёмана, дзе пагрузілі здабычу на ладдзі і без перашкод вярнуліся ў Прусію. Бутаўт пакінуў Ордэн і адправіўся шукаць шчасця пры двары германскага імператара Карла IV, дзе прабыў да 1370 года, а пасля накіраваўся ў Венгрыю — да караля Жыгімонта. А Канстанцін усё ж вярнуўся да Альгерда. Князь дараваў сыну, хаця хто ведае, чаго яму гэта каштавала.

1365 год у Альгердавым жыцці быў ці не самы цяжкі: здрада сына, крыжацкае нашэсце, мор, што лютаваў у краіне, паўстанне паганцаў.

Мор, што забіраў у магілу дзесяткі людзей, тлумачылі дзеямі католікаў-манахаў, якія нібыта раскідвалі па горадзе атручанае семя і тым выклікалі пошасць, каб выкараніць паганства. Гарадскія ўлады загадалі манахам пакінуць горад, але тыя не згадзіліся і папрасілі пачакаць Альгерда. Гэта толькі выклікала гнеў сярод паганцаў. Частка напалоханых манахаў зачыніліся ў кляштары, а частка ўцякла з горада. Раз'ятраны натоўп выламаў манастырскія дзверы, вывалак сем манахаў. 6 сакавіка іх пакаралі смерцю на рыначным пляцы. Тых, хто ўцёк, дагналі, прывязалі да крыжоў і кінулі ў Вілію, сказаўшы: «З захаду сонца прыйшлі і на захад ідзіце за тое, што знішчалі нашых багоў»[40]. Падобная расправа магла перарасці ў рэлігійную вайну паміж паганцамі і хрысціянамі, і таму Альгерд, жадаючы захаваць адзінства і мір у сваёй дзяржаве, жорстка пакараў мяцежнікаў. Паводле сведчання Конрада Кібурга, адзін з галоўных жрацоў, шэсць сябраў гарадской рады, дваццаць



А.Пярэлін. Расправа хрысціян у Вільні. *XIX ст.*

саноўнікаў, трыццаць мяшчан былі пакараны[41]. Знатным сяклі галовы, простых вешалі, «каб, маючы такі прыклад, ніхто хрысціянам ніякай шкоды не рабіў»[42]. «Калі б у гэтым выпадку Альгерд падначаліўся Гаштольду (вяльможа-католік. — *В.Ч.*) і сваёй жонцы Ульяне, дык усе знатныя язычнікі віленскія былі б вынішчаны; безумоўна, што ў гэты час вялікі князь зусім не спачуваў паганству і вызнаваў хрысціянства паводле ўсходняга абраду», — сведчыць Кібург[43] і тым самым указвае на палітыку Альгерда неафіцыйнага хрышчэння балцкіх земляў.

А вайна з Ордэнам працягвалася. Дробнымі набегамі крыжакі спусташалі землі Жамойці ды Аўкштайціі, хадзілі яны і пад Вільню. Лівонскія рыцары былі адкінуты ад Полацка. Між тым Кейстут дамовіўся з магістрам Ордэна пра сустрэчу ў горадзе Інстэрбургу і адправіўся ў Прусію. Магістр, баючыся ваяўнічага князя, размясціў вялікі атрад вояў у замку Тамове, які знаходзіўся паміж Інстэрбургам і Трокскаю мяжою. Кейстут спыніўся адпачыць. Нечакана ў яго стан убег паранены стралою зубр. Князь адчуў няладнае: «У тым баку, адкуль прыбег зубр, ёсць, пэўна, узброеныя людзі». Ён падняў сваіх вояў на коней, павёў іх да Тамава і знянацку напаў на крыжацкую засаду. Рыцары, якія снедалі ў замку, ледзь паспелі падняць ланцуговы мост, а тыя, што засталіся за сценамі, загінулі. Пераможцы захапілі крыжацкіх коней і на іх адправіліся на су-

стрэчу з магістрам. Калі яны прыехалі ў Інстэрбург, адзін з камандораў заўважыў, што князь і яго світа сядзяць на конях, якія належалі яго атраду, і ад здзіўлення ўскрыкнуў: «Гэтага я ніколі не чакаў». Кейстут тут жа знайшоўся: «Што рабіць, такія цяпер сталі часы і норавы»[443]

Так, у адвазе і дасціпнасці Кейстуту не адмовіш. Але даць Ордэну варты адпор ён так і не здолеў пры ўсіх яго намаганнях. Штогод гарэлі вёскі ў яго дзяржаве, сотні людзей гінулі ад варожага мяча, дзеці ды жанчыны траплялі ў няволю. Палын буяў на месцы былых мірных селішчаў, краіна ператварылася ў пустыню. Так некалі крыжакі агнём і мячом пакінулі пустыню ў Земгаліі, паставілі земгалаў на калені, і такі лёс рыхтаваў Ордэн Жамойці ды Аўкштайціі.

У 1367 годзе, 2 сакавіка, крыжакі (паводле хронікі Вартэрберга) «спустошылі агнём і мячом» зямлю Упіта. Кейстут паслаў віжоў цікаваць за ворагам. Яны наткнуліся на крыжакоў і былі забіты. Той самы атрад пад зверхнасцю маршала Генінга «ізбіваў вастрыём мяча, пажарам і забойствамі спусташаў»[45] мясцовасці каля Коўна — і захапіў там 800 чалавек у палон. Крыжакі прабраліся і на Літву, у Тракелях захапілі велікакняжацкую стайню. Восенню вялікі магістр пайшоў на Вялону. Гарнізон, даведаўшыся пра гэта, спаліў замак і адступіў у Новае Коўна. Жамойць і Аўкштайція сцякалі крывёю.

«КАП'Ё ЛІТОЎСКАЕ СТАЯЛА ПАД МАСКВОЙ»

А тым часам польскі король Казімір III здолеў сабраць новыя сілы, паразумеўся з папам рымскім і атрымаў ад яго не толькі ўхвалу на вайну за Валынь, але і дазвол браць царкоўную дзесяціну сабе. Восенню 1365 года Казімір пабываў у Марыенбургу — вядома ж, не ордэнскія скарбы аглядваў, як піша храніст, а дамаўляўся з магістрам аб сумесных дзеях. Спадзяваўся Казімір, што рыцары адцягнуць на сябе дружыны Трокскага і Вялікага княстваў, а ён тым часам нападзе на Валынь. У такім становішчы Гедымінавічы не хутка дапамогуць Любарту. Казіміраў разлік спраўдзіўся. Ні Кейстут, ні Альгерд не рызыкнулі паслаць сваіх вояў Любарту. І Казімір, не сустракаючы супраціўлення, заваяваў Валынь. Князі Юрый Нарымонтавіч і Аляксандр Карыятавіч, якія сядзелі ў валынскіх гарадах, прызналі сябе васаламі польскага караля. Любарт утрымаўся толькі ў Луцку. Праз пасрэдніцтва Альгерда Любарт заключыў перамір'е з Казімірам. Валынь падзялілі на дзве часткі. Любарту дасталася Усходняя Валынь з гарадамі Луцк, Уладзімір, Гародна, Ратна, Астрог, Меджыбож, Данілаў, Кашэр, Любом-

ля, Закамань, Шумск, Турыньск, а Казімір забраў сабе заходнюю частку з гарадамі Крэменец, Белз, Холм, Лапацін, Грабовіцы. Але на гэтым барацьба за Валынь не закончыцца. Яшчэ не раз літвіны і палякі скрыжуюць за яе зброю.

Кейстут жа ў гэты час вырашаў свае задачы: павёў войска на Мазовію, захапіў цвержу Свенцк, падступіў да Пулуцка. Абаронцы, спадзеючыся на непрыступнасць сцен, адмовіліся адчыніць браму. Кейстут загадаў абкласці сухім дрэвам цвержу і спаліў яе. Якіх-небудзь істотных вынікаў з гэтага паходу Кейстут не дамогся.

Альгерда, відаць, мала цікавілі падзеі на Валыні. Куды болей хваляваў наступ Ордэна і актывізацыя маладога маскоўскага князя Дзмітрыя Іванавіча. Не трэба быць прарокам, каб прадбачыць, што Масква, якая з кожным годам мацнела і ўсё далей рассоўвала межы свайго княства, у будучым пачне вайну за рускія землі, якія ўвайшлі ў склад Вялікага княства. Вось дзе бачыў пагрозу Альгерд.

Быў у Альгерда саюзнік супраць Масквы — Цвер. Ганарлівыя цвярскія князі і самі прэтэндавалі на ярлык вялікіх князёў Уладзімірскіх, самі марылі сабраць вакол Цверы рускія землі. Некалі тут аселі крывічы*, іх нашчадкі-цверычане не страцілі этнічнай памяці** і ў патомках полацкіх і навагрудскіх крывічоў бачылі братоў. Адсюль і пралітвінская арыентацыя Цверы, як, скажам, і крыўскага Пскова і Смаленска. Цвярская княгіня Ульяна была другой жонкай Альгерда.

Яшчэ ў 1357 годзе за цвярскі пасад спрачаліся кашынскі князь Васіль Міхайлавіч і яго братаніч Усевалад Аляксандравіч Холмскі. Першы шукаў дапамогі ў Маскве, другі — у Вільні. Праз Сімяона Гордага, які купіў сабе ханскі ярлык, Васіль пазбавіў братаніча воласці. Альгерд паслаў у 1360 годзе войскі на Цвер, і Васіль вярнуў вотчыну Усеваладу. Здавалася, на гэтым канфлікт і скончыцца. Аднак праз шэсць гадоў князь Васіль ужо змагаўся з братам Усевалада — Міхаілам, князем Мікулінскім. У 1367 годзе Васіль з маскавітамі абклаў Цвер. Міхаіл, атрымаўшы дапамогу ад Альгерда, пайшоў на Кашын. Нічога не дамогшыся, ворагі заключылі перамір'е і дамовіліся ў пачатку наступнага года вырашыць свае прэтэнзіі на судзе.

Такая вось перадгісторыя падзей 1368 года, калі Васіль і Міхаіл па выкліку Дзмітрыя Іванавіча і мітрапаліта Аляксея

---

* Паказальна, што ў Гарадзенскай губерні існавала мястэчка Цвер, а ў Цвярской губерні — паселішча Едымінава — ад імя Едымін, ці Гедымін.

** Па дадзеных статыстыкі, у 1917 годзе ў Цвярской губерні пражывала 125 000 літвінаў-беларусаў, якія, безумоўна, паходзілі ад цвярскіх крывічоў.

прыехалі ў Маскву. Князь Дзмітрый насуперак сваім клятвам звязеніў Міхаіла і прымусіў адмовіцца ад Цверы. Толькі прыезд у Маскву ардынскіх царэвічаў выратаваў таго ад расправы. Васіль Міхайлавіч так і не паспеў пакняжыць у Цверы — у гэтым жа годзе ён памёр. Цвярское княства перайшло князю Міхаілу. Вось тут і задумаўся Дзмітрый Іванавіч над сваімі дзеямі. Нажыў смяротнага ворага. Але адзінае выйсце са становішча ён убачыў у прымяненні зброі.

Дзмітрый паслаў на Цвер свае раці. Міхаіл адправіўся да Альгерда прасіць заступніцтва. І той дапамог. Ён аб'яднаўся з Кейстутам, далучыў да сваіх войскаў смалян. Паход рыхтаваўся ў тайне. Некалькі тысяч простага люду пад аховай вояў масціла ў пушчах праз гушчар і балоты дарогі, наводзіла цераз рэкі масты*. Па гэтай дарозе ў абход маскоўскіх застаў Альгерд павёў свае атрады на Маскву.

Дзмітрый нават не паспеў і сабраць войскі для абароны сталіцы. Каб затрымаць Альгерда, адправіў апалчэнні каломенскае, дзмітраўскае ды маскоўскае, што прыйшлі на яго кліч. Войскі Вялікага, Трокскага і Смаленскага княстваў разбілі невялікія дружыны Сімяона-Крапівы Старадубскага, Канстанціна Абаленскага, а пасля на берагах ракі Тросны 21 ліпеня перамаглі і старажавы полк. Даведаўшыся ад палонных, што Дзмітрый у Маскве, Альгерд імклівым маршам падышоў да горада. Маскоўскі князь спаліў пасад і схаваўся ў Крамлі. Альгерд, прастаяўшы трое сутак, адступіў ад Масквы, па дарозе спусташаючы маскоўскія землі. «Остаток посада пожже, и монастыри, и церкви, и волости, и села попали, а христианы изсече, а ины в полон поведе, иже не успели разбежатися, имение же их пограби, и скотину всю с собою отогнаша... Сеже первое зло от Литвы створися окаянно и всегубительно» — вось так апісвае гэты рух Альгердавага войска рускі летапісец[46]. Памеры спусташэнняў сведчаць пра задумы вялікага літоўскага князя падарваць моц Масквы.

Факт паходу Альгерда на Маскву стаў сюжэтам маляўнічага аповяду «Хронікі Быхаўца»[47], дзе падзеі аднесены да Вялікадня.

«Князь вялікі Альгерд Гедымінавіч... быў у добрай прыязні з вялікім князем маскоўскім Дзмітрыем Іванавічам. І гэты князь вялікі без якой-колечы прычыны, зламаўшы прыязнь, прыслаў да вялікага князя Альгерда пасла з падарункамі ды звесткаю. Пасол перадаў агонь і шаблю ды словы: «Буду у зямлі тваёй па краснай вясне, па ціхаму лету». Тады князь Альгерд

---

* Яшчэ ў XIX стагоддзі ў Полацкім уездзе ў маёнтку Стакліцах каля ракі Барузой мясцовыя жыхары паказвалі Альгердаву дарогу.



Мініяцюра з «Ліцавога Зводу». Набег Літвы на Русь. *XVI ст.*

вынуў з агніва губку і крэмень ды, запаліўшы губку, даў паслу і сказаў: «Дай гэта гаспадару свайму і скажы яму, што ў нас, у Літве, агонь ёсць, калі ён хоча быць у зямлі маёй па краснай вясне і па ціхаму лету. А я, дасць Бог, буду ў яго на Вялікдзень і пацалую яго чырвоным яйкам — цераз шчыт суліцаю* і з Божаю дапамогаю да яго горада Масквы сваё кап'ё прысланю...» Адпусціўшы пасла і сабраўшы войскі свае ўсе літоўскія

* Суліца — кап'ё, дзіда.

і рускія, пайшоў ён з Віцебска проста на Маскву. Калі на самы Вялікдзень раніцай князь вялікі Дзмітрый з баярамі і князямі выходзіў з ютрані з царквы, тады князь вялікі Альгерд з усімі сваімі сіламі, распусціўшы харугвы, паказаўся на Паклоннай гары. Як убачыў такое вялікі князь маскоўскі, агарнуў яго вялікі жах, што Альгерд з аграмаднай сілай прыйшоў на яго паводле свайго слова. Не могучы даць ніякага адпору, Дзмітрый паслаў да Альгерда, просячы яго і вялікія дары яму абяцаючы, каб з айчыны яго, Масквы, не выганяў і гнеў свой адпусціў і ўзяў у яго што захоча. Князь вялікі Альгерд зжаліўся, ласку сваю ўчыніў — Маскву яго не здабываў і мір з ім устанавіў. І затым князь вялікі маскоўскі сам да яго прыехаў* і з ім бачыўся, і дарамі незлічонымі, золатам, срэбрам, дарагім жэмчугам, і сабалямі, і іншым дарагім і дзівосным зверам махнатым князя Альгерда абдараваў і шкоду, раней учыненую, аплаціў. І затым князь Альгерд сказаў князю маскоўскаму: «Хоць мы з табой памірыліся, але мне інакш не гадзіцца, як толькі прысланіць кап'ё сваё да сцяны твайго горада Масквы, каб славу ўчыніць, што вялікі князь літоўскі, рускі і жамойцкі Альгерд кап'ё сваё да Масквы прысланіў». Сеўшы на каня і ўзяўшы ў руку кап'ё, пад'ехаў ён да горада і кап'ё да сцяны прысланіў. А едучы назад, крыкнуў: «Княжа вялікі маскоўскі, памятай: кап'ё літоўскае стаяла пад Масквой». Потым князь вялікі Альгерд з усімі войскамі сваімі з вялікай славай, шматлікімі палоннікамі і незлічоным багаццем навяваным, здабыўшы многія гарады, граніцу ўчыніў па Мажайск і Каломну». Паводле «Хронікі Быхаўца», Альгерд спатоліў сваё самалюбства, прыставіў дзіду да маскоўскіх сцен, атрымаў ад Дзмітрыя багатыя падарункі і задаволены адправіўся дадому. А паводле Стрыйкоўскага, у Вільні яго сустракаў народ, біў у далоні і спяваў: «Ладо! Ладо!»[48]

А сапраўды, ці быў задаволены Альгерд? Хаця да пары Дзмітрый Іванавіч змірыўся, што ў Цверы сядзеў варожы яму князь, але моц Масквы не зломлена. Ды ці пераможаш Маскву, якая ў хвіліну пагрозы шукае заступніцтва Залатой Арды? Нярадасныя былі думкі Альгерда. З усіх бакоў акружаюць яго дзяржаву ворагі: з захаду — Польшча, з поўначы — Ордэн, з поўдня — Арда, з усходу — Масква. Ворагі хітрыя, жорсткія, моцныя, і не пераможаш іх у адной бітве. А гады крывавых войнаў? Ці прынясуць перамогу? І траціць свае сілы краіна на палях сечаў, лепшых сыноў губляе. Забыліся людзі на мір. Штогод трывожным звонам ляціць над дзяржавай кліч: «Вай-

---

* Месца, дзе сустрэліся два вялікія князі, потым назвалі Паклоннай гарой, бо Дзмітрый Іванавіч пакорліва пакланіўся Альгерду.

на! Пагоня!» Вось і цэрквы будуюць, нібыта замкі: з вежамі, вузкімі байніцамі, тоўстымі сценамі. Мір, як запаветная мара... Калі ён прыйдзе на яго Бацькаўшчыну?

РУДАЎСКАЯ БІТВА

Зноў пачалі лютаваць крыжакі. Лівонскія рыцары сплюндравалі ў жніўні 1368 года Упіцкую зямлю. Адначасова іх прускія браты па крыжы і разбоі захапілі Коўна і перабілі там 600 чалавек.

Надышоў 1369 год. У пачатку студзеня вялікі магістр павёў крыжакоў да Нёмана, і на правым беразе, ужо на землях Трокскага княства, яны заклалі новую цвержу Годэсвердэр. Гэта было павольнае адступленне Трокскага княства перад Ордэнам. Паўтаралася гісторыя з прусамі. Колькі разоў яны прымушалі крыжакоў уцякаць з поля сечы. Але перамогі каштавалі дорага, гінулі воі, а на іх месцы ўжо не паўставалі новыя героі. Пядзь за пяддзю забіраў Ордэн прускія землі, пакуль уся Прусія не апынулася ў яго руках.

У гэты час Альгерд вярнуўся з набегу на лівонскія землі і паслаў спытацца магістра, па якім праве ён будуе на чужой зямлі цвержу. Магістр адчуваў сваю сілу, яму ўжо не трэба было, як некалі біскупу Альберту, хітрыць, падманваць. Альгерд атрымаў пагардлівы адказ: «Калі жадаеш забараніць будаўніцтва, дык прыходзь»[49]. Аднак ні Альгерд, ні Кейстут не прыйшлі. Крыжакі пабудавалі цвержу і пакінулі ў ёй моцны гарнізон.

Праз два месяцы пасля таго, як яны вярнуліся ў Прусію, Годэсвердэр аблажылі літвінскія войскі. Пяць тыдняў 18 машын закідвалі градам каменняў замак. Пад ударамі таранаў бурыліся магутныя сцены і вежы. Авалодаўшы Годэсвердэрам, Альгерд і Кейстут звялі ў палон яго гарнізон, а побач з крыжацкім замкам узвялі новую цвержу. Гэта быў часовы поспех. У кастрычніку Ордэн павёў перамовы з Альгердам ды Кейстутам аб выкупе палонных. Калі пасля чарговай сустрэчы маршал Генінг Шынекоп вяртаўся ў Прусію, ён сустрэў пасланае вялікім магістрам шматлікае войска і павярнуў назад. Нечакана з'явіўшыся каля Годэсвердэра, прыступам узяў яго, захапіў у палон 309 вояў гарнізона. Кейстут з Альгердам знаходзіліся ў гэты час на другім беразе і нічым не маглі дапамагчы абаронцам замка. Яны «глядзелі з супрацьлеглага берага, нібыта ўдараныя перуном»[50].

Ордэн павольна, але ўпэўнена замацоўваўся на правым беразе Нёмана, стварыў плацдарм для захопу Аўкштайціі.

У адказ Альгерд ды Кейстут задумалі буйны паход на Прусію. У тым жа 1369 годзе яны пачалі збіраць вояў. Войска Вялікага княства Літоўскага амаль поўнасцю складалася з «рускіх», як называлі іх у ордэнскіх хроніках (літвіны праваслаўнай веры); пры чым, як паведамляе Вартэрберг, рускія былі ў саюзе з літвінамі[51]. (Пра гэты саюз крыжацкі хранікст указвае і ў паведамленні пад 1378 год, кажучы, што лівонскія рыцары хадзілі «супраць рускіх у вобласць замка Мядзель, якія былі за паганцаў і падтрымлівалі іх»[52].) Пад сцягі Кейстута прыйшлі літвіны, аўкштайты, жамойты. Агульная колькасць аб'яднаных войскаў Вялікага і Трокскага княстваў склала, паводле звестак крыжакоў, 70 тысяч вояў. Зразумела, гэта лічба завышаная, але можна сказаць, што ў паход на Прусію Вялікае княства і Трокскае сабралі амаль усе свае вайсковыя сілы.

Тым часам магістр узяў у аблогу адбудаваную літвінамі цвержу Баербург. Кейстут паспяшыў на выручку. Падаспеў, калі крыжакі пайшлі на штурм. Замак загарэўся, і абаронцы былі асуджаны загінуць ў агні. Кейстут паслаў трубача да магістра і прасіў таго дазволіць гарнізону здацца ў палон, каб пасля выкупіць яго. Магістр аблудліва не адказаў, а загадаў забіваць кожнага, хто вырвецца з замка. У полымі і ад зброі крыжакоў загінулі ўсе абаронцы замка — 900 чалавек. Угневаны Кейстут на сустрэчы з маршалам Генінгам фон Шынекопам папярэдзіў: «На будучую зіму я думаю наведаць грасмайстра і прасіць у яго добрага прыёму». А гэта азначала, што ён нападзе на Прусію. Маршал самаўпэўнена адказаў: «Будзеш нам мілым госцем, мы прымем вас з належнай пашанай»[53].

А каб пакараць Кейстута за дзёрзкія словы, магістр паслаў на Жамойць рыцараў. Яны абклалі Пастаўскі замак. Не наважыўшыся на штурм, яны пусцілі па рацэ запаленыя караблі. Вецер перанёс агонь на замак. Ратуючыся ад агню, абаронцы здаліся на міласць пераможцам. Але літасці не было. Маршал Шынекоп адпомсціў за смерць рыцараў і раненне рагніцкага комтура Бурхарда Мансфельда. Па загаду маршала крыжакі забілі ўсіх палонных. Які ўжо раз можна было пераканацца, што не веру хрысціянскую неслі крыжакі, а смерць.

Вялікі магістр таксама збіраў у Кёнігсбергу рыцараў. У студзені 1370 года войскі Гедымінавічаў рушылі на Прусію. Кейстут, выступіўшы са сваімі атрадамі з Гародні, захапіў крыжацкую цвержу Арцэльсбург і спаліў яе, потым імкліва прайшоў праз усю Прусію і спыніўся каля Курышгофа. Сюды са сваімі воямі прыйшоў Альгерд. Разам з ім былі яго сын Ягайла і Кейстутаў сын Вітаўт. З Кёнігсберга на чале саракатысячнага войска выступіў вялікі магістр. Літвіна-жамойцкае войска тым часам узяло Рудаўскі замак (цяпер Мельнікава Калінінградскай

вобласці). 17 лютага сюды падышлі крыжакі і спыніліся каля сяла Кведшаў. Адсюль былі бачны вогнішчы стану Гедымінавічаў. Ноччу яны занялі баявыя пазіцыі. Левае крыло заняў Альгерд з харугвамі Вялікага княства і татарскімі загонамі. На правым крыле стаяў са сваім войскам Кейстут. У сярэдзіне на пагорках умацаваліся лучнікі. Ордэнскі маршал правёў разведку, здабыў «языка» і данёс магістру, што літвінскія ды жамойцкія харугвы стаяць каля Рудавы. Магістр вырашыў атакаваць.

Раніцай 18 лютага крыжакі рушылі ў бой. Наступалі крыжакі двума калонамі. Супраць Альгерда ішлі харугвы на чале з маршалам Генінгам фон Шынекопам, а супраць Кейстута вёў крыжакоў вялікі камандор Вальфрам Балдэрснэйм. Перад бітвай адбыліся гарцы — паядынкі паміж асобнымі воінамі. І толькі апоўдні крыжакі ўдарылі па літвінах. Левае крыло Альгерда пад ціскам рыцараў пачало крок за крокам адыходзіць з поля. Затое правае крыло Кейстута стрымлівала крыжакоў. Штурмаваць умацаваныя засекамі і равамі пагоркі, дзе заселі лучнікі, магістр не наважыўся. Ён паслаў рэзервовыя харугвы на Альгерда. Пад іх ударам харугвы вялікага князя адступілі да вёскі Лаптава. Кейстут, убачыўшы адступленне Альгерда, загадаў трубіць адыход. Літвіны адышлі ў густы лес. Крыжакі не палезлі ў гушчар, а паспяшылі на левае крыло літвінаў, каб дабіць яго. Сюды па лесе павёў свае харугвы і Кейстут.

Начная цемра, якая апусцілася на зямлю, не спыніла бітвы. Не жадаючы выпускаць блізкую перамогу з рук, крыжакі зноў рынуліся ў наступ. На дапамогу ім магістр кінуў усе сілы. Харугвы Кейстута стрымлівалі гэты шалёны прыступ, даючы астатняму войску адступаць. Маршал Шынекоп вярхом на кані стаяў на пагорку і глядзеў на бітву. Да яго прабіўся літвін Вішвіл і стрэліў з арбалета. Страла трапіла маршалу ў твар. Параненага маршала на руках вынеслі з поля сечы, але рана была смяротнай. Шынекоп памёр. Так бясслаўна загінуў яшчэ адзін крывавы кат Літвы.

Смерць Шынекопа расстроіла крыжакоў. Яны спынілі бітву. Кейстут без перашкод перайшоў па лёдзе рэчку і павёў сваё войска назад.

Абодва бакі панеслі вялікія страты: у войску Гедымінавічаў загінула каля 5500 вояў, крыжакі страцілі маршала Генінга фон Шынекопа, 4 камандоры, 26 рыцараў, каля 400 чалавек вышэйшых і да 5 тысяч простых ратнікаў. Літвіны і жамойты адступілі. Ордэн утаіў ход бітвы і тое, што ў ёй загінулі вядомыя крыжацкія ваяводы. Гэта наводзіць на думку аб перамозе Альгерда.

Пасля Рудавы крыжакі доўгі час не маглі правесці буйнога паходу ні супраць Трокскага, ні супраць Вялікага княства.

Кейстут выкарыстаў аслабленне Ордэна. Са сваім войскам ён паспяшыў на Валынь, жадаючы пасля смерці караля Казіміра вярнуць Любарту Уладзімір. Браты ўзялі горад у аблогу. Польскі намеснік Турскі здаў сталіцу Валыні. На дапамогу князям прыйшоў і Альгерд, разам яны павялі свае дружыны на Польшчу, спустошылі Люблінскую і Сандамірскую землі. «Пры гэтым яны прычынілі такое паражэнне і бяду рыцарам, дваранам, дзяўчынам і шаноўным жанчынам, пра якія ніколі не было чутна ў мірныя часы»[54].

Як шмат залежыць усё ж ад асобы. Вось памёр Казімір, і няма каму сабраць воінства і разбіць ворага. Людовік Угорскі, які каранаваўся ў Кракаве і стаў цяпер польскім каралём, пра Польшчу думаў мала. Захапіўшы каралеўскія рэгаліі, каб палякі не выбралі каралём каго-небудзь са сваякоў Казіміра, Людовік ад'ехаў у Венгрыю. Кіраваць Польшчаю ён даручыў сваёй маці Альжбеце, якая болей цешылася скарбамі, чым займалася дзяржаўнымі справамі. Крызіс вярхоўнай улады адбіўся як на ўнутраным становішчы Польшчы, так і на знешнім. Брандэнбургскі маркграф захапіў Санток. Князь мазавецкі Самавіт распачаў супраць Польшчы вайну. Ні Вялікаму княству, ні Брандэнбургу, ні Мазовіі палякі не маглі даць адпор. Войска так і не сабралася. Краіна стаяла на парозе свайго краху.

«ТРЫМАЎ УЛАДУ ВЯЛІКУЮ...»

У 1370 годзе Альгерд зноў хадзіў на Маскву. Князь Дзмітрый Іванавіч, скарыстаўшыся тым, што літвінскія войскі былі заняты вайною з крыжакамі, ваяваў смаленскія землі, помсцячы смалянам за іх саюз з Вялікім княствам. Пасылаў ён раць і да Бранска. Праўда, асаблівага поспеху не дамогся — Смаленск ды Бранск не прызналі яго ўлады. А ў жніўні Дзмітрый Іванавіч абвясціў вайну Міхаілу Цвярскому. Той уцёк да Альгерда прасіць дапамогі. Маскоўскія войскі пачалі спусташаць Цвярское княства.

Вялікі князь і рады быў дапамагчы свайму саюзніку, але асцерагаўся нападу крыжакоў. Міхаіл задумаў звярнуцца да Арды і ўжо выехаў туды, але яго прыхільнікі паведамілі з Масквы, што на дарогах расстаўлены маскоўскія заставы, каб перахапіць яго. Міхаіл зноў звярнуўся да Альгерда, слёзна просячы яму дапамагчы. І зімою Альгерд разам з Кейстутам, Міхаілам і смаленскім князем Святаславам выступілі на Маскву. Яны падышлі да Волака Ламскага, спалілі пасад і рушылі далей. 6 снежня саюзнікі абклалі Маскву. Вялікі князь Дзмітрый

Іванавіч і на гэты раз схаваўся за крамлёўскія сцены. Яго стрыечны брат Уладзімір Андрэевіч збіраў у Перамышлі апалчэнне. Да яго прыбылі з дружынамі Уладзімір Пронскі ды Алег Разанскі. Нарэшце Дзмітрый запрасіў міру, Альгерд быў не супраць і адказаў паслу: «Не прагну разліцця крыві людской, не за тым прыйшоў, каб знішчэнне пашырыць, бо хачу справядлівасці і заставацца прыяцелем князя Дзмітрыя»[55]. Князі замірыліся і замацавалі мір шлюбам. Альгерд выдаў сваю дачку Алену за Уладзіміра Андрэевіча. Міхаіл вярнуўся ў Цвер, а Альгерд у Вільню.

Тым часам маскоўскі князь разам з мітрапалітам Аляксеем напісалі канстанцінопальскаму патрыярху скаргу на Альгерда. І патрыярх адгукнуўся, прыслаў дзве граматы. Усе рускія князі заклікаліся да саюзу пад зверхнасцю Дзмітрыя Іванавіча для сумеснай барацьбы супраць «ворагаў крыжа, якія бязбожна пакланяюцца агню», г.зн. супраць Літвы. Вайна Дзмітрыя Іванавіча з Альгердам — гэта змаганне за хрысціянства, выкананне хрысціянскага абавязку «ваяваць за Бога і біць ворагаў яго». Тыя ж праваслаўныя літвінскія і рускія князі («ганебнікі і парушальнікі запаветаў Божых і сваіх клятваў і абяцанняў»), якія дапамагалі «начысціваму» Альгерду ў вайне з Дзмітрыем, былі адлучаны ад Царквы. Патрыярх патрабаваў ад іх выступіць супраць Альгерда і тым самым заслужыць дараванне Царквы. Смаленскаму князю Святаславу Іванавічу даводзілася, што саюз з Альгердам — «цяжкі грэх супраць сваёй веры і свайго хрысціянства» і за гэта патрэбна пакаянне. Частка праваслаўных перакінулася на маскоўскі бок. Перайшлі на службу Масквы козельскі і вяземскі князі. Сам Альгерд быў прадстаўлены «ворагам крыжа», ім пужалі праваслаўных.

Разлік Дзмітрыя Іванавіча пасеяць сярод праваслаўнага люду Літвы непрыязь да свайго ўладара прыносіў плён. Становішча ўскладнялася тым, што літвінскі мітрапаліт Раман памёр і царкоўная ўлада на Літве і Украіне належала Аляксею. Альгерд зноў распачынае барацьбу за асобнага ад Масквы мітрапаліта. У сваім лісце да патрыярха ён патрабуе мітрапаліта як для Вялікага княства, гэтак і для падуладных яму земляў — на Кіеў, Смаленск, Цвер, Малую Русь, Навасіл, Ніжні Ноўгарад. У тым жа лісце Альгерд выкрывае хцівасць і злахітрасць Аляксея: «Не было такога мітрапаліта, як гэты мітрапаліт: бласлаўляе маскавітаў на праліццё крыві, а да нас і ў Кіеў не адпраўляецца. А хто цалаваў крыж мне і ўцёк у Маскву, з таго мітрапаліт здымае цалаванне крыжа. Ці бывала такое на свеце, каб цалаванне крыжа здымаць? Трэба мітрапаліту блаславіць маскавітаў, каб нам дапамагалі, так як мы ваюем за іх з немцамі»[56].

Як жа зараз аднёсся патрыярх Філафей да Аляксея? А ніяк, нібыта ўсё так і павінна быць: з бласлаўлення мітрапаліта праліваецца хрысціянская кроў, маскавітамі пустошацца цвярскія, смаленскія, разанскія землі, парушаецца прысяга на крыжы. Глухім застаўся патрыярх і да Альгердавай прапановы спрыяць саюзу Масквы і Вялікага княства Літоўскага ў вайне супраць Ордэна. У Канстанцінопалі быў свой разлік на Маскву. Як некалі Візантыя выкарыстала Русь для разгрому сваіх праціўнікаў (Балгарыі і Хазарыі), гэтак і цяпер візантыйскія палітыкі марылі накіраваць зброю рускіх вояў супраць туркаў-асманаў, якія пагражалі існаванню імперыі. Таму Канстанцінопаль быў зацікаўлены ў палітычным адзінстве Русі і захаванні кантролю над рускай царквой. Менавіта з місіяй аб'яднаць маскоўскага мітрапаліта, уладароў Паўночна-Усходняй Русі, з аднаго боку, а з другога — князёў падуладных Вялікаму княству земляў на Русь адправіўся патрыярхаў пасол іераманах Кіпрыян Цымбалак. У Вільні ён зблізіўся з вялікім князем, які здолеў перацягнуць яго на свой бок, пэўна, запрапанаваўшы яму мітраполію ў сваёй дзяржаве. Кіпрыян не ўстаяў, але як дамагчыся ў патрыярха прызнання гэтай мітраполіі? Што ж, Кіпрыян прыбыў з Візантыі і ўмеў плесці інтрыгі.

Добрыя весткі прыйшлі з Цверы: вярнуўся з Арды князь Міхаіл з ярлыком на вялікае княства Уладзімірскае. Разам з ім прыехаў татарскі пасол Сарыкоша. Вось блізка той момант, калі будзе зломлена моц Масквы. Ды радасць была нядоўгая. У дыпламатыі Дзмітрый Іванавіч аказаўся хітрэйшым. Ён апярэдзіў Міхаіла, прыехаў у стольны Уладзімір, узяў з баяр і простага люду клятву на тое, што яны не пусцяць цвярскога князя на вялікае княжанне. І калі Міхаіл паехаў ва Уладзімір, гараджане не пусцілі яго ў горад. Сарыкошу Дзмітрый запрасіў у Маскву і дарамі падкупіў яго. Пасля маскоўскі князь набыў у Мамая ярлык на вялікае княства Уладзімірскае, а заадно выплаціў хану пазыку Міхайлавага сына, Івана, і разам з ім вярнуўся ў Маскву. Міхаіл апынуўся ў адзіноце, без падтрымкі Арды, ад яго намеснікаў адмовіўся Ноўгарад. Міхаіл зноў звярнуўся па дапамогу да Альгерда. Вялікі князь і на гэты раз падтрымваў свайго саюзніка.

Вясною 1372 года аб'яднанае войска Вялікага княства Літоўскага і Трокскага княства пад зверхнасцю Кейстута, Вітаўта Гарадзенскага, Андрэя Полацкага, Дзмітрыя Друцкага падышло да Пераяслаў-Залескага, спаліла яго пасад і сплюндравала вакольныя сёлы, пасля чаго з'ядналася з дружынай цвярскога князя і ўзяла ў аблогу Кашын. Кашынскі князь, маскоўскі саюзнік, цалаваў крыж на вернасць Міхаілу. Усё складвалася нібыта ўдала. Міхаіл захапіў Малогу, Угліч, Бежацкі Верх, Дзмітраўск, Кістму і Таржок.

Дзмітрый Іванавіч з маскоўскай раццю рушыў на Міхаіла. На дапамогу апошняму пайшоў сам Альгерд, умацаваўшы сваё войска смалянамі і брацамі. Варожыя войскі сустрэліся каля Любуцка. У першым жа баі маскавіты разбілі перадавы Альгердаў полк. Гэта і вызначыла развіццё далейшых падзей. Альгерд, які не рызыкаваў у неспрыяльных для сябе становішчах, праявіў асцярожнасць. Абодва войскі, раздзеленыя глыбокім ярам, некалькі дзён прастаялі ў бяздзеянні. Альгерд асцерагаўся Дзмітрыя, а той — Альгерда. Нарэшце князі заключылі перамір'е. Альгерд адмаўляўся ў далейшым дапамагаць Міхаілу і абяцаў, што той верне ўсе заваяваныя гарады Маскве. Тым самым Альгерд выдаваў свайго саюзніка на расправу Дзмітрыю. Больш за тое, па дамове цвярскі князь павінен быў ваяваць у выпадку вайны супраць Альгерда. З сумам і расчараваннем вялікі літоўскі князь прызнаў сваё бяссілле перад Масквою, якую так і не ўдалося яму падначаліць сваёй уладзе. Яго няўдачу тут жа выкарыстаў смаленскі князь Святаслаў Іванавіч, пайшоўшы на саюз з Дзмітрыем Іванавічам. «Суцэльны правал» — гэтак мог ацаніць вынікі сваёй маскоўскай палітыкі Альгерд, і ў суцяшэнне — нічога, толькі надзеі на новую барацьбу — можа, шчасце на гэты раз не адвернецца ад яго.

Няўдача пад Любацкам расстроіла Альгерда. Ужо з меншым энтузіязмам бярэцца ён за справы дзяржаўныя, згасла яго былая энергія. Дый гады не тыя — да восьмага дзесятка набягае. Немалады, асабліва ўжо не разгонішся. У яго ўзросце людзі дажываюць свой век, радуюцца спакою, унукам, згадваюць мінулае. Ды, мабыць, не відаць яму спакою да самай смерці. Лівонскія і прускія рыцары спусташаюць набегамі Жамойць ды Аўкштайцію, і ўжо яго сыны — Андрэй Полацкі, Ягайла, Свідрыгайла — водзяць дружыны на крыжакоў. На поўдні не сціхаюць баі з татарамі. Юрый Карыятавіч, абраны «гаспадаром зямлі Малдаўскай», разам са сваімі навагрудцамі і малдаванамі разбіў татараў каля Уладзіч у Падняпроўі. Восенню 1374 года літвінскія войскі ваявалі з татарскім князем Тэмерам (Тэмідзеем).

А на Русі Залескай пасля месячнай аблогі маскоўскімі і наўгародскімі войскамі пала Цвер. Міхаіл прызнаў сябе малодшым братам маскоўскага князя, і цяпер нельга спадзявацца на яго. Таго і чакай, што Масква пашле свае раці на Вялікае княства.

ЗНОЎ ВАЙНА

У 1373 годзе папа Рыгор XI прапанаваў Альгерду, Кейстуту ды Любарту прыняць каталіцтва і тым самым выратаваць свае душы «ад улады сатаны». Папа абяцаў прыслаць місіянераў. Альгерд недаверліва паставіўся да папскай граматы, ужо добра ведаючы кошт абяцанняў наступнікаў апостала Пятра. Ды як паглядзяць на пераход у каталіцтва праваслаўныя? Можна нагадаць, як у свой час галіцкія баяры атруцілі князя свайго Баляслава Тройдзеневіча, які з праваслаўя перакінуўся ў каталіцтва. Можна нагадаць, як пагражалі паганцы і праваслаўныя Гедыміну за яго заігрыванне з папай. І Альгерд не прымае папскай прапановы.

Працягвалася вайна з Ордэнам. Крыжакі нападалі на Трокскае і Вялікае княствы, палілі сёлы, гналі ў палон людзей. Готфрыд Ліндэн хадзіў да Бельска. Альгердавы сыны Свідрыгайла ды Андрэй Полацкі разам з палачанамі ваявалі Дынабург і, нічога не дамогшыся, адышлі ад крыжацкай цвержы.

У вайне з Ордэнам прайшоў і 1374 год. Зноў палалі паселішчы ў Жамойці. Атрад ратніцкага комтура Герарда Ленсена на зваротным шляху трапіў у засаду паміж двума балотамі. Крыжакі вымушаны пакінуць коней і біцца пешшу. А што за рыцар без каня? Сам комтур і 12 рыцараў загінулі.

Праўда, іх паход закончыўся жалобай па свайму маршалу, якога забіла паваліўшаяся дрэва. Кейстут у жніўні праз Мазовію прабраўся ў Прусію і выпаліў там сорак сёлаў, захапіў каля тысячы палонных. Лівонскія рыцары ваявалі полацкія землі. У адказ Андрэй Полацкі зноў хадзіў пад Дынабург. Але гэта была дробная вайна, якая не прыносіла асаблівых пераваг ніводнаму з ваюючых бакоў.

У наступным, 1375 годзе крыжакі выступілі ў буйны паход. Вялікі магістр павёў за сабою 10 тысяч крыжакоў. Калі войска падышло да Нёмана, быў крыгаход, і магістр не адважыўся перапраўляцца цераз раку. Ён загадаў маршалу Готфрыду Ліндэну з атрадамі адправіцца спусташаць памежныя землі Трокскага княства. На працягу дзесяці дзён маршал са сваімі людзьмі паліў і рабаваў прадмесці Трокаў і Вільні. Лівонскія рыцары «геройствавали» каля Вількаміра, захапілі там у палон 600 чалавек.

Старасць не радавала Альгерда. Вярнуліся б гады маладосці, маладая энергія, сіла, запал. Хіба хаваўся ён ад ворага за высокімі сценамі? Крыўдна. Але ёсць у яго вопыт многіх гадоў кіравання дзяржавай, прадбачыць ён тайны палітыкі суседзяў, розум яго яшчэ не памерк, а гэта яго сіла. І значыць, патрэбны ён яшчэ як вялікі князь.

Недарэмнымі былі яго намаганні і ў барацьбе за свайго мітрапаліта. Візантыйскі патрыярх паставіў Кіпрыяна на Кіеўскую і Наваградскую мітраполіі. Праваслаўе павінна мацаваць адзінства ўсіх земляў Вялікага княства, аб'ядноўваць і славян, і балтаў у адзін народ. Нямала дзеля гэтага зрабілі і Віцень, і Гедымін, вось і ён папрацаваў: узводзіў сярод паганцаў храмы, дазваляў прапаведаваць сярод іх слова Божае. І ўсё часцей задумваўся князь пра сваю асабістую адказнасць перад Богам. Сказана ж у Святым пісанні: «Не забі...» А ён? Колькі крыві праліў людской? Яму за яе адказваць. І трэба падумаць пра выпрабаванні душы сваёй. Кінуць бы ўсё і падацца ў манастыр, схімай і малітвай скупіць свае грахі. Ды і тут ён не належыць сабе: на плячах яго — дзяржава. І хіба не бачыць Бог, што не ўлады, не багацця, не ўцехі ён шукаў у жыцці, а служыў народу свайму, дзяржаве, у якой садзіў вінаграднік гаспадні і абараняў яе ад тых, хто нёс у яго зямлю агонь і смерць. Кожнаму сваё: Богу — Богава, а яму, князю, — княжае. І княжацкі свой лёс не падманеш...

У пачатку сакавіка Кейстут разам з сынамі Альгерда — мусіць, Свідрыгайлам, Ягайлам Віцебскім, Андрэем Полацкім — на чале літвінскага войска, перайшоўшы цераз Дзвіну, напаў на землі рыжскага архібіскупа. Набег гэты не застаўся без помсты. Розіцкі фохт заявіўся на Полацкую зямлю і павёў у палон 86 чалавек. Ратэнбургскі прэфект герцаг Альберт фон Заксен прывёў крыжакоў пад Гародню. Гараджане падняліся на абарону роднага горада. Жыла ў іх сэрцах памяць пра подзвігі гарадзенскай дружыны слаўнага ваяводы Давыда. І зараз вораг пацярпеў сакрушальнае паражэнне. Сам герцаг разам са світаю трапіў у палон. Рэштка яго атрада выратавалася ўцёкамі.

Не прынёс міру і 1376 год. Крыжакі абклалі Коўна. Абаронцы цвержы смелымі вылазкамі наносілі ворагу адчувальныя страты. Вялікі магістр кінуў аблогу і ўбраўся з войскам у Прусію. Балцкі комтур Дзітрых Эльнер зрабіў набегі на Бельск і Камянец.

Помсцячы крыжакам, Альгерд сам узначаліў у 1376 годзе паход на Прусію. Нібыта зноў вярнуліся маладыя гады, калі вадзіў ён баявыя дружыны на ворага. Амаль сорак гадоў таму ўпершыню павёў ён вояў пад Брандэнбург. І сорак гадоў — як адзін дзень. Зноў знаёмае хваляванне ў душы ад тупату конскіх капытоў, ад бразгання зброі, баявых клічаў. Зноў гэты позірк тысяч вачэй яго верных вояў, іх надзея на яго.

Усё помніцца з таго далёкага 1327 года, помніцца, бо штогод паўтаралася: паход, сеча, раз'ятраная хваля конніцы, што нясецца на ворага, кроў. Ён, спакойны, упэўнены ў сабе, со-

чыць за бітваю, а ў душы трывога, боль, сумненні, ніхто не ведаў пра гэта.

Можа быць, гэта яго апошні паход, апошняе, што ён зробіць для свайго народа, Бацькаўшчыны?

Даўно Прусія не ведала такога нашэсця. Воі жорстка помсцілі Ордэну: гарэлі сёлы, жытнія палеткі, мноства народу загінула пад мячамі, сотні трапілі ў палон, былі спалены замкі Інстэрбург, Тампава, Норнітэн, Таплаўлен. А ўвосень войска пад зверхнасцю Кейстута, Ягайлы Віцебскага, Вітаўта Гарадзенскага ўчынілі набег на Польшчу. Іх падтрымалі Любарт і Юрый Нарымонтавіч з валынскімі харугвамі. Прычынаю набегу з'явіліся ранейшыя прэтэнзіі Польшчы на Валынь і Галіцыю. Саюзнае войска рухалася па начах, днём адпачывала ў пушчах. У пачатку кастрычніка яно дасягнула берагоў ракі Сан. Тут падзялілася на некалькі атрадаў, якія пачалі спусташаць Польшчу аж да горада Тарнава. Захапіўшы здабычу, воі хаваліся па лясах, каб пазбегнуць сустрэчы з польскімі войскамі.

У Кракаве панаваў жах. Каралева Альжбэта суцяшала палякаў: «Доўгая і магутная рука ў майго сына!»[57] Але Людовік быў на Угоршчыне і моц сваёй рукі так і не паказаў. Незадаволеныя палякі напалі на каралеўскі двор, перабілі ўгорскае акружэнне Альжбэты. І каралева з'ехала да свайго сына. Ён праз некалькі месяцаў усё ж сабраў польскае войска і павёў яго на ўладанні Юрыя Нарымонтавіча: Холм і Белз. Палякі захапілі Холм і пайшлі на дапамогу Людовіку, які ніяк не мог справіцца з Белзам, дзе засеў Юрый Нарымонтавіч. Пасланы Альгердам Кейстут прыехаў да угорскага караля і заключыў з ім мір. Усходняя Валынь заставалася пад уладаю Любарта, а Галіцыя пераходзіла, як ні былі гэтым расчараваны палякі, да Угоршчыны. Так вырашылася гэтая даўняя спрэчка за былое Галіцка-Валынскае княства.

Заставалася апошняе — вырашыць, каму з сыноў пакінуць велікакняжацкі пасад. Ці не самае цяжкае. Старэйшаму? Андрэй Полацкі? З маладосці побач з бацькам у паходах і бітвах. На крыжакоў хадзіў, на татараў, на маскавітаў — вопытны вой і муж дзяржаўны. Багаты горад у дзяржаве трымае — Полацк. Але не падабаецца Альгерду сімпатыя Андрэя да Масквы. Як забыць, што ў 1368 годзе насуперак яго бацькоўскай волі ваяваў той цвярскія гарады Хорвач і Родню, а ў 1372 годзе зноў «много пакости учиниша» цвярскім землям? І ўсё болей схіляўся Альгерд да свайго улюбёнца Ягайлы — старэйшага сына ад другой жонкі Ульяны Цвярской. Ён малады — 29 гадоў, але гэта такі ўзрост, калі не гуляе вецер у галаве. Хітры, але ж, калі трэба дзейнічаць, — дзейнічае без аглядкі. Ягайла

разумее яго запаветную мару — аб'яднаць пад адной уладай і Трокскае княства, і Валынь, і Вялікае княства, разбіць агульнымі сіламі Ордэн, перамагчы Маскву. Дзеля гэтага не спыніцца ні перад падманам, здрадаю, подкупам, забойствам. А іначай нельга. Ягайла — братаніч цвярскому князю Міхаілу. І гэта важна таксама.

Усе сыны ад Марыі Віцебскай атрымалі ўдзелы, і нікога з іх не пакрыўдзіў. Старэйшы Андрэй сядзіць у Полацку. Дзмітрый валодае Бранскам і Друцкам. Канстанцін мае Чарнігаў і Чартарыйск. Уладзімір княжыць у Кіеве. Хведар — князь ратненскі і кобрынскі. А вось сыны ад Ульяны Цвярской па свайму малалецтву засталіся без удзелаў. Пэўна, таму таксама Альгерд перадаваў свой пасад Ягайлу, каб ён паклапаціўся пра малодшых братоў*.

...Надышоў 1377 год — апошні год у Альгердавым жыцці. У пачатку лютага 12 тысяч крыжакоў узялі ў аблогу Трокі. Некалькі атрадаў з'явілася каля Вільні. Са сцен Верхняга замка бачыў састарэлы князь пажары віленскіх пасадаў, белыя плашчы з чорнымі крыжамі. Колькі ні ваяваў з Ордэнам, а так яго і не разбіў**. Ды ці пад сілу аднаму Вялікаму княству гэта? Не падтрымаў яго канстанцінопальскі патрыярх, не садзейнічаў заключэнню саюзу супраць крыжакоў з Масквою. А за спінай Ордэна ўся Еўропа, і супрацьстаяць яму трэба разам: Польшча, Масква, Вялікае княства. Не ўдалося яму аб'яднаць вакол сябе Польшчу і Маскву. Ці здолее гэта здзейсніць Ягайла?

Пакуль крыжакі рабавалі трокскія і віленскія ваколіцы, з Гародні з пяццю сотнямі вершнікаў выступіў гарадзенскі князь Вітаўт. Дзейнічаў ён, як некалі славуты Давыд Гарадзенскі: напаў на склады з харчамі і фуражом, якія крыжакі пабудавалі на дарозе ў Прусію. Пазбаўленыя правіянту, ворагі запрасілі перамір'е. Альгерд паклікаў да сябе ў замак маршала Готфрыда Ліндэна разам са світаю знатных паломнікаў, шчодра адарыў іх, і тыя, улагоджаныя, згадзіліся вывесці свае войскі ў Прусію.

---

* Сыны Альгерда ад Марыі Яраслаўны Віцебскай: Андрэй (князь пскоўскі, полацкі), Дзмітрый (князь бранскі, друцкі, трубчэўскі, стародубскі), Канстанцін (князь чарнігаўскі), Уладзімір (князь кіеўскі), Хведар (князь ратненскі). Ад другой жонкі Ульяны Аляксандраўны Цвярской Альгерд меў сыноў: Ягайла-Уладзіслаў (вялікі князь літоўскі, кароль польскі), Скіргайла-Іван (князь троцкі, полацкі), Карыбут-Дзмітрый (князь наваградскі і северскі, княжыў на Збаражы, Брацлаве і Вінніцы), Карыгайла-Казімір (князь мсціслаўскі), Лугвеній-Сымон (князь мсціслаўскі), Віганд-Аляксандр (князь кернаўскі), Свідрыгайла-Баляслаў (князь падольскі).

** За гады праўлення (1345—1377) Альгерда прускія рыцары здзейснілі 70 паходаў на Літву, а лівонскія — 30.

Не адседжваліся за мурамі і лівонскія рыцары — хадзілі на Жамойць, дзе ўзялі ў палон 300 чалавек. У адказ Кейстут напаў на Лівонію. Як паведамляе Вартэрберг: «У тым жа годзе, напярэдадні вербніцы (21 сакавіка. — *В.Ч.*) кароль Кынстут са сваімі сынамі і Альгердавымі сынамі, сваімі стрыечнымі братамі з вялікім войскам, якое таксама складалася з рускіх, варожа напаў на Курляндыю»[58]. Каштоўная звестка — нарэшце можам пераканацца, з каго складалася як Альгердава, так і Кейстутава войска. З рускіх, пад якімі летапісец разумеў літвінаў, праваслаўнай, «рускай», веры.

Памёр Альгерд у маі. Хроніка Вартберга, распавядаючы пра паход крыжакоў на Упіту, указвае, што ён адбыўся 24 мая, а пасля ідзе паведамленне пра Альгердаву смерць: «У тым жа годзе, у той жа час памёр Альгерд»[59].* Перад самай смерцю па просьбе жонкі Ульяны і яе духоўніка, пячэрскага архімандрыта Давыда, Альгерд прыняў схіму. Хаця і памёр ён хрысціянінам, усё ж паводле старажытнага паганскага звычаю яго спалілі на вогнішчы, а прах пахавалі ў пабудаванай ім царкве Прысвятой Божай Маці. Вось такім чынам прымірыўся Альгерд з паганцамі, якіх у свой час жорстка праследаваў.

«Гэты Альгерд вельмі разумны быў і многімі языкамі размаўляў, і пераўзыйшоў санам і ўладай усіх; і сустрыманне меў вялікае, ад усякай мітусні адвяртаўся, на забавы, гульні і падобнае не зважаў, але клапаціўся дзень і ноч пра дзяржаву сваю; і ад п'янства адвяртаўся: віна і піва, і меда, і ўсялякага напою хмельнага не піў, бо ненавідзеў п'янства, і вельмі сустрыманы быў ва ўсім: і ад гэтага вялікі розум і развагу набыў, і дасціпнасць прыдбаў і гэтым многія землі і дзяржавы паваяваў, і грады, і княствы ўзяў за сябе, і трымаў уладу вялікую, і прымнажалася княства яго болей за ўсіх, чым за бацьку, чым за дзеда, такі быў. Бо звычай Альгерда такі, ніхто не ведаў яго, куды думаў раццю выступіць, або навошта збірае шмат воінства, як і самыя тыя вайсковыя чыны і раць уся не ведалі куды ідуць: ні свае, ні чужыя, ні госці прышэльцы: у таемніцы ўсё тварыў разумна, каб не дайшла вестка ў зямлю, на якую хацеў ісці раццю; і такой хітрасцю забраў многія землі, узяў многія гарады і дзяржавы зняволіў; не столькі сілай, як дасціпнасцю. І быў ад яго жах на ўсіх, і пераўзыйшоў княжаннем і багаццем»[60]. Так запісаў пра жыццё і дзеі Альгерда летапісец.

---

* Т.Нарбут прыводзіць запіс з Віленскага евангелля XIII—XIV стагоддзяў, якое знаходзіцца ў Прачысценскай царкве: «Великій литовский князь Андрей Гедиминовичь, въ святой схиме Алексий, усопши на память Плтона и Романа». А гэты дзень — 18 лістапада. Ластоўскі лічыў, што Нарбут няправільна прачытаў імя Аляксандр. У «Запісках Кацярыны II» Альгерд названы ў святым хрышчэнні таксама Аляксандрам (Сочинения императрицы Екатерины II. Т. 11. С. 101.)

ЧАС ПОДЗВІГУ НАДЫШОЎ





АНДРЭЙ ПОЛАЦКІ І ДЗМІТРЫЙ БРАНСКІ
(?—1399)
Мініяцюра з «Ліцавога Зводу»

АНДРЭЙ ПОЛАЦКІ

У гісторыі часта бывае, што за постацямі венцаносных асоб, з імёнамі якіх звязваюць цэлыя эпохі, губляюцца постаці іхніх паплечнікаў і сучаснікаў. Першым прысвячаюцца шматлікія гістарычныя даследаванні, аб іхніх дзеях пішуцца раманы, яны трапляюць у школьныя падручнікі гісторыі. А другім наканавана зрэдку ценню мільгануць у іх за спінаю. Толькі калі-нікалі дапытлівае вока даследчыка выхапіць са старонак летапісу малавядомае імя, і тады яму адкрыецца незвычайная і значная асоба, высветліцца, што менавіта дзякуючы ёй той ці іншы больш вядомы дзеяч дасягнуў перамог і славы.

У нашым мінулым такі лёс напаткаў многіх. Нагадаем хоць бы Жыгімонта Карыбутавіча, Яна Гаштольда, Івана Хадкевіча, Сымона і Юрыя Алелькавічаў, Яна Карла Хадкевіча, Паўла Сапегу, Канстанціна Астрожскага... Бяры любое імя — нязведаная старонка нашай гісторыі. Андрэй Полацкі таксама належыць да ліку такіх асоб.

Час, калі ён жыў, — гэта час Альгерда, Кейстута, Ягайлы, Вітаўта, Дзмітрыя Данскога. Чым жа быў слаўны полацкі князь, каб паставіць яго побач з магутнымі ўладарамі дзяржаў, вырашальнікамі лёсу народаў?

«О, салавей, летняя птушка, вось бы табе, салавей, сваім спевам праславіць вялікага князя Дзмітрыя Іванавіча і брата яго, князя Уладзіміра Андрэевіча, і з зямлі Літоўскай двух братоў Альгердавічаў, Андрэя і брата яго Дзмітрыя, ды Дзмітрыя Валынскага! Яны — сыны Літвы храбрыя, крэчаты ў ратны час і палкаводцы праслаўленыя, пад гукі труб іх спавівалі, пад шлёмамі мілавалі, з канца кап'я яны ўскормлены, з вострага мяча ўспоены ў Літоўскай зямлі»[1]. Вось так узнёсла ўсхваляў герояў Куліковага поля аўтар «Задоншчыны». Не, ён не перабольшваў, калі казаў, што Андрэй Полацкі і яго брат «з канца

кап'я ўскормлены». Іншага ад князя той час не патрабаваў. Бязвольных, палахлівых, не мужных у бранях чакаў лёс ізгояў і ахвяр болей магутных суседзяў. Князь не выбіраў свайго шляху — само нараджэнне і княжацкае паходжанне прымушала станавіцца на нялёгкую дарогу ваяра, палітыка, абаронцы сваіх земляў і народа. Гэтай дарогай крочылі ягоныя продкі, і іншай яму не выпадала. Настаўнік у маладога князя Андрэя быў варты — бацька, вялікі князь Альгерд. Мудры валадар, вопытны палітык, смелы воін, ён з пасада князя віцебскага падняўся да велікакняжацкага. Такім хацеў бачыць і свайго першынца і спадкаемца. З дзіцячых гадоў Андрэй побач з ім у паходах і сечах. Мінула семнаццаць вёсен, і надышоў час пакінуць бацькоўскі дом.

У 1342 годзе літвінскае войска пад зверхнасцю Альгерда, які займаў віцебскі пасад, адбівала нашэсце крыжакоў на Пскоўскую зямлю. Пскавічы звярнуліся да віцебскага князя: сядзь у нас, барані, як Даўмонт, горад ад крыжакоў. Замест сябе Альгерд пакінуў свайго сына. Так Андрэй з'явіўся на далягляцзе гісторыі, і летапісцы ўпершыню ўнеслі ягонае імя ў аналы.

Шэсць гадоў служыў Андрэй баявым князем у Пскове. Мірны час выпаў на гэтыя гады, таму і не давялося Андрэю праславіцца ў бітвах і паходах. Запрасілі да сябе Андрэя і палачане. Пад звон святой Сафіі князь даў клятву верай і праўдай служыць Полацку. Цяпер на ўсё жыццё да ягонага імя далучылася ганаровае найменне — Полацкі. Ці здолее ён з годнасцю княжыць на землях, на якія «галоўным чынам абапіраліся... веліч Літвы»[2] (так праз два стагоддзі прызначыў іх ролю польскі канцлер Ян Замойскі)!

У 1348 годзе загінуў у баі з крыжакамі Андрэеў намеснік Юрый Вітаўтавіч. Пскавічы прыслалі ў Полацк да Андрэя пасольства. «Табе была княжа сядзець у Пскове на княжанні, а намеснікаў табе ў Пскове не трымаць; а цяпер, ужо табе не пажадана сесці ў нас, бо сабе княжыш, а Пскоў упаў, дык ужо сам пазбавіўся Пскова; а намеснікаў тваіх не жадаем», — заявілі пскавічы[3]. Адмаўляцца ад Пскова было б не разумна, але Андрэй адмовіўся, застаўся ў Полацку. Пэўна, меў ён далёкасяжныя планы. А як жа. Ён старэйшы з Альгердавічаў — спадкаемца велікакняжацкага пасада, а значыць, яму трэба быць на Літве, а не ў Пскове. Незадаволеныя пскавічы шлюць дружыны на Полацкую зямлю. У адказ Андрэй вядзе сваіх вояў на пскоўскія землі. Але не Пскоў быў галоўным ворагам палачан, а крыжакі — вось адкуль зыходзіла смяротная небяспека, вось хто марыў скарыць як палачан, гэтак і пскавічоў у «славу святой царквы рымскай». Неаднойчы літвінскія дружыны прыходзілі на дапамогу Пскову.

Вясной 1366 года магістр Вільгельм прывёў войска пад Полацк. Пад кіраўніцтвам Андрэя Полацкага палачане абаранілі свой горад. Праз сем гадоў ужо Андрэй выступіў з палачанамі на Дынабург*. Добра ўмацаваны замак захапіць не ўдалося. Тады, каб перагарадзіць крыжакам шлях у полацкія землі, князь будуе новы замак (некаторыя гісторыкі лічаць, што гэта будучая Друя). У 1374 годзе ён зноў ля Дынабурга, забірае палонных і ўсю камандорскую жывёлу: кароў, коней, свінняў. Даведаўшыся, што сам камандор з сотняй рыцараў накіраваўся на Полаччыну, Андрэй Полацкі з 250 воямі паспяшаў за ім у пагоню. Камандор вырашыў не рызыкаваць і вярнуўся ў замак.

Наступным годам увесну Андрэй разам з Кейстутам спусташалі лівонскія ўладанні ў раёне горада Крэйцбурга. Гэтыя паходы палачанаў выклікалі ў адказ паход крыжакоў. Ржэцкі фохт з 400 ордэнцамі напаў на Полацкую зямлю, захапіў у палон 86 чалавек і 100 коней і беспакарана вярнуўся ў Лівонію. Восенню таго ж года Андрэй Полацкі, як паведамляе хроніка Германа Вартберга, «рушыў з усёй сваёй конніцаю і ладдзямі да замка Дынабург. Ён спаліў усё сена камандора і гараджан, і ніколькі яго не засталося: ён таксама звёў з сабою 15 чалавек пасялян і коней. Далей ён пагнаў таксама камандорскую жывёлу, у якой камандор меў патрэбу пасля цэлы год»[4]. У жніўні 1376 года Андрэй Полацкі на ста ладдзях з'явіўся пад замкам Розітэн і ў адну ноч выпаліў усё наваколле перад замкам. У адказ крыжакі пад зверхнасцю магістра ўзялі ў аблогу Новы замак і трынаццаць дзён пры дапамозе чатырох абложных машын і двух кідальных прыстасаванняў безвынікова штурмавалі полацкую крэпасць.

Так у паходах і сечах гартаваўся характар Андрэя, сталеў яго вайсковы талент. Далёка за межы Вялікага княства сягала слава полацкага князя, усё часцей і часцей заносілі летапісцы ягонае імя на скрыжалі.

У 1358 годзе ён з палачанамі захапіў Ржэў і пачаў пагражаць Смаленску, а праз дзесяць гадоў — перад паходам Альгерда на Маскву — ваяваў Хорвач і Радню.

Дапамагаў ён у 1373 годзе князю Міхайлу Цвярскому ваяваць Пераяслаўль. Безумоўна, Андрэй Полацкі ўдзельнічаў і ў далучэнні Бранскага і Ноўгарад-Северскага княстваў да Вялікага княства, і ў бітвах на Сініх Водах, Страве і ля Рудавы.

Нямала папрацаваў на славу Айчыны Андрэй Полацкі, і ягонымі высілкамі мацнела яна. Так што на велікакняжацкі пасад ён мог прэтэндаваць не толькі як старэйшы сын, але і як бліжэйшы памочнік Альгерда. Але вялікім князем Андрэй Полацкі не

---

*Цяпер Даўгаўпілс.

стаў, не ўвянчала ягоную галаву Гедымінава карона: на велікакняжацкі пасад узышоў Ягайла. Калі б Альгерд прадбачыў, што ягоны непрадуманы крок прывядзе да трагічных падзей — гвалтоўнай смерці Кейстута ад рук пасланых Ягайлам забойцаў, міжусобных войнаў, аслаблення дзяржавы, ды сакрушальнага паражэння ад татараў на Ворскле і нявыгаднага саюзу з Польшчай — сядзеў бы ў Вільні Андрэй. Альгерд не прадбачыў.

Андрэй Полацкі проста не быў гатовы да такога павароту падзей. Супрацьпаставіць сябе Ягайлу ён не мог — сілаў для барацьбы за велікакняжацкі пасад на той момант у яго не хапала. Не прыняўшы клятвы новаму гаспадару (у граматах Андрэй Полацкі называе сябе вялікім князем), адпраўляецца шукаць падтрымкі ў Пскоў. Там яго чакае расчараванне: Пскоў, аслаблены вайной з крыжакамі, не рашаецца падняць зброю на Літву. І цяпер шлях Андрэя Полацкага ляжыць у Маскву да Дзмітрыя Іванавіча, які стане вядомы як Данскі.

Маскоўскі ўладар не забыўся, як Альгерд разам з Андрэем ударылі кап'ём у браму Масквы. І вось Андрэй перад ім. Як жа не прыняць яго ў любові, не абяцаць падтрымку ў надзеі распаліць вогнішча міжусобнай вайны ў Вялікім княстве Літоўскім? І выправіўся ў паход на Літву. Праўда, паход гэты болей нагадваў забаву. Андрэя і Дзмітрыя Іванавіча чакаў з хлебам і соллю незадаволены Ягайлам Дзмітрый Альгердавіч. Ён са сваім удзелам Бранскім, Трубчэўскім і Старадубам перайшоў на бок Масквы. На сур'ёзную вайну з Вялікім княствам Літоўскім Дзмітрый не адважыўся: «Мамай лютасцю дыхае на ўсіх нас»[5]. Таму новы ўдзел і не далучыў да Масквы.

У 1378 годзе на рацэ Вожы маскоўскі князь разбіў полчышчы Бегіча. Яшчэ са школьнага падручніка гісторыі памятаем цытату Маркса: «Гэта першая правільная бітва з манголамі, якую выйгралі рускія». І тут немалая заслуга полацкай дружыны на чале з князем Андрэем. Ён прынёс у Маскву тактыку нечаканых удараў засадных палкоў, тактыку, якой шырока карысталіся літвінскія дружыны ў бітвах з крыжакамі. Яе і скарыстаў Дзмітрый Іванавіч. «Ударылі на іх (татараў. — *В.Ч.*) з аднаго боку князь Андрэй Полацкі, а з другога боку Даніла Пронскі», — паведамляе Ніканаўскі летапіс[6]. Цяпер можна было спадзявацца, што Дзмітрый Іванавіч дапаможа Андрэю Полацкаму. Аднак у той час яшчэ большая небяспека пагражала Русі. Раз'юшаны паражэннем сваіх войскаў, хан Залатой Арды Мамай прагнуў паўтарыць на Русі Батыевы подзвігі.

У часіну смяротнай пагрозы не ўсе рускія князі прыйшлі пад сцягі Дзмітрыя. У Пскоў даляцеў кліч маскоўскага князя. І зноў Андрэй Альгердавіч адправіўся ў паход. На думку Кастуся Та-



Мініяцюра з «Ліцавога Зводу».
Паход Андрэя Полацкага на Трубчэўск. *XVI ст.*

расава, які прааналізаваў звесткі са старажытных дакументаў, з Андрэем было 2 тысячы полацкіх і пскоўскіх вояў[7]. «Войска вялікае»[8], сведчыць «Хроніка Літоўская і Жамойцкая», прывёў на Кулікова поле Андрэй Полацкі. Трэба нагадаць, што з літвінскай дружынай прыйшоў і Дзмітрый Друцкі. Перад самай бітвай маскоўскі князь склікаў нараду, на якой Андрэй Полацкі прапанаваў перайсці Дон. «Калі будзем тут, слабым будзе воінства, калі ж мы на другі бок Дона пяройдзем, моцным і мужным будзе»[9].

Князь ведаў, што прапаноўваў. Ён адразу ацаніў тую пазіцыйную выгоду, якую атрымае рускае войска, перайшоўшы Дон. Зрытае ярамі і рэчкамі Кулікова поле перашкаджала ардынскай конніцы. Рэчка Няпрадва абараняла тыл рускіх палкоў, прыток Дона — Смолка не даваў магчымасці ардынцам ударыць па левым рускім флангу, а рэчка Ніжні Дубяк ахоўвала правы фланг. У лесе, што рос каля Дона, можна было схаваць засадны полк. Дзмітрый згадзіўся з довадам полацкага князя, і войска перапраўлялася цераз Дон. І ў далейшым, калі прыйшлося шыхаваць палкі, Дзмітрый прыслухоўваўся да парад Андрэя.

8 верасня 1380 года «...соступишеся обе силы великия на бой и бысть брань крепка и сеча зла зело...»[10]. Час подзвігу настаў. Андрэй камандаваў палком правай рукі. Татарам так і не ўдалося перайсці тут у наступ. Полк адбіў усе іхнія атакі, вымусіў ворага адступіць і тым самым спрыяў агульнай перамозе рускіх войск. А вось Дзмітрый Іванавіч уцёк з бітвы і схаваўся пад паваленым дрэвам, прытварыўшыся забітым[11].

Перамога на Куліковым полі была толькі пачаткам вызвалення рускага народа ад ардынскага ярма. Вялікімі стратамі (з дзесяці вояў жывы застаўся адзін) аплаціла войска Дзмітрыя Данскога перамогу. Праз два гады хан Тахтамыш захапіў і спаліў Маскву, якую абараняў Андрэяў сын Асцей.

Разлічваць на Дзмітрыя Іванавіча ў барацьбе з Ягайлам полацкаму князю не даводзілася. Ён вярнуўся ў Полацк. А туды ўжо меціў Ягайлаў брат Скіргайла. Скарыстаўшы адсутнасць полацкага князя, ён заявіўся ў горадзе. Палачане ветліва сустрэлі свайго госця, але, калі даведаліся, што той квапіцца на полацкі пасад, абурыліся і, прывязаўшы яго да хрыбта кабылы, з насмешкамі вывезлі за браму.

За спінай Скіргайлы стаяў Ягайла, які марыў чужымі рукамі расправіцца са сваім палітычным праціўнікам. Ён і даў войска брату і зноў паслаў яго ваяваць Полацк. Разам з Скіргайлам пашукаць удачы ў крывіцкіх землях выправіліся і крыжакі. Шаснаццаць тыдняў аб'яднанае войска трымала Полацк у аблозе. А калі крыжакі вярнуліся да сябе, палачане пад верхнасцю свайго князя разбілі дружыну Скіргайлы. На гэтым барацьба з Ягайлам спынілася. У рэшце рэшт Андрэй вымуша-

ны быў пакінуць Полацк і зноў шукаць падтрымку ў Дзмітрыя Данскога. І зноў расчараванне.

У гэты час польская знаць спакусіла Ягайлу каралеўскай каронай. Яе зіхаценне асляпіла вялікага князя, і ён, доўга не раздумваючы, згаджаўся на ўсё, што патрабавалі ад яго палякі: і веру перамяніць, і Літву ахрысціць, і далучыць Вялікае княства да Польшчы, і адваяваць захопленыя суседнімі дзяржавамі польскія землі. І грошай не шкадаваў для сваёй будучай цешчы. Цяжкая для Літвы была гэтая карона, але Ягайла не адчуваў цяжару.

Андрэй Полацкі вырашыў пачаць рашучую барацьбу з наваяўленым каралём. Ён страчваў вытрымку, спяшаўся. Занадта доўга змагаўся полацкі ўладар з Ягайлам — амаль дзесяць гадоў, ды так і не дасягнуў жаданай мэты, і з кожным новым годам яна ўсё больш аддалялася ад яго. Нецярпенне для воіна, як і для палітыка, — дрэнны саюзнік. Андрэй не хацеў чакаць, а пачакаць трэба было. Проста спакойна прааналізаваць сітуацыю, што склалася ў дзяржаве, і прадбачыць, што гэты крок Ягайлы так ці інакш, рана ці позна выкліча незадавальненне ў Літве. Вось тады і скарыстаў бы момант.

Нецярпенне першакаджае цвярозай думцы. Андрэй баяўся, што, прыняўшы каралеўскі тытул, заручыўшыся падтрымкай Польшчы, Ягайла будзе непераможны. І тады полацкі князь рашыўся на адчайны крок: звярнуўся да сваіх лютых ворагаў — крыжакоў. Яму здавалася, што гэта апошні шанц. Ён 10 кастрычніка 1385 года выдаў грамату крыжакам, у якой перадаў ім тое, чаго і сам ужо не меў, — «Каралеўства полацкае».

Ордэн, зразумела, не адмовіўся ад нечаканага падарунка. Там даўно ўтрымлівалі князёў-ізгояў з Літвы ад вядомага крывавай славай Полюша ды Вітаўта і распрацоўвалі складаныя палітычныя камбінацыі ў барацьбе з Вялікім княствам. Другі саюзнік Андрэя — смаленскі князь Святаслаў Іванавіч, той самы, супраць якога ён калісьці ваяваў. У таго свае інтарэсы — стаць незалежным ад Літвы.

У 1386 годзе Андрэй Полацкі захапіў Лукомль. Разам з рыцарамі ён спустошыў 18 валасцей, дайшоў да Ашмянаў, потым вярнуўся зноў на Дзвіну — там забраў у палон 3 тысячы чалавек і прыгнаў 2 тысячы коней.

Полацк, родны Полацк, якому столькі гадоў служыў, не прыняў яго. Палачане, як убачылі ля сценаў ненавісныя крыжы сваіх спрадвечных ворагаў, зачынілі браму перад князем. І дарэмна заклікаў іх Андрэй скарыцца, падтрымаць яго ў барацьбе з Ягайлам. Палачане не маглі дараваць яму змовы з крыжакамі, пралітай крыві суайчыннікаў. Полацкая зямля, да слова якой прыслухоўвалася Літва, мовіла «не!».

Дамова з крыжакамі — крок да трагічнай развязкі вайны з Ягайлам, палітычны пралік, і варта было ім, разрабаваўшы Полаччыну, пакінуць Андрэя, як войска Скіргайлы разбіла невялікую дружыну полацкага князя. Скіргайла штурмам захапіў Лукомль, дзе быў Андрэй. У бітве загінуў яго сын, а ён сам трапіў у палон.

Сем гадоў пратрымаў Ягайла свайго брата за кратамі ў польскім замку Хенцін. Штодня трывожна сціскалася сэрца былога полацкага князя, калі чуў крокі ахоўнікаў ля сваёй каморы: можа, гэта спяшаліся Ягайлавы служкі-забойцы, каб расправіцца з ім, як раней яны расправіліся з Кейстутам. На гэты раз Ягайла не рашыўся...

Лёсу было пажадана, каб Андрэй Полацкі не памёр пакутнікам — час подзвігу зноў настаў для яго.

Лёс славутага брата хваляваў Альгердавічаў, і яны прасілі Ягайлу вызваліць Андрэя. У лютым 1394 года на сустрэчы з Ягайлам у Долтычах Скіргайла, Уладзімір, Хведар і Вітаўт Кейстутавіч далі клятву за Андрэя. Толькі ў сакавіку Ягайла выпусціў яго на волю. Але куды было яму падацца? Адчуваў ён сябе выгнанцам. Паехаў у Вялікі Ноўгарад, спадзеючыся, што выбяруць яго там князем. Надзеі не спраўдзіліся.

Ваенны вопыт Андрэя Полацкага спатрэбіўся Вітаўту, які рыхтаваўся да вайны з Залатой Ардой. А хто як не пераможца татараў ведаў іх манеру весці бітвы, іх тактыку і прыёмы. Таму, відаць, і вярнуў вялікі князь Андрэю Полацк. Пра гэта можа сведчыць дарчыя граматы Андрэя Полацкаму Троіцкаму манастыру, царкве Іана Прадцечы. Князь пагрозліва папярэдзіў: «А по моем животе который князь иметь отнимати, судить ему святая Троица. Да будеть проклят»[12]. Гэтыя граматы ён выдаў як полацкі князь перад паходам на Залатую Арду. Існавала такая традыцыя перад выправай на вайну прыносіць дар храмам. Андрэй быў шчырым хрысціянінам, хоць і трымаў у руках зброю.

Бітва на Ворскле, трагічны зыход якой у многім паўплываў на лёс Вялікага княства Літоўскага, была прайграна. Упэўнены ў перамозе, Вітаўт дазволіў далучыцца да Цемір-Кутлуга ардзе хана Эдыгея, што і вырашыла вынік бітвы. Андрэй Полацкі змагаўся ў першых радах, стрымліваючы націск татарскіх полчышчаў і даючы магчымасць Вітаўту вывесці з бітвы рэшткі войска, выратаваць вояў, якія праз некалькі гадоў выйдуць супраць крыжакоў на грунвальдскім полі, — і загінуў.

«Ды хто душу сваю паложыць за другі свая — памяць іх з роду ў родзе». Гэта выслоўе сказана і пра Андрэя Полацкага. Ён так і не змірыўся са стратай вялікага пасада і тытулаваў сябе ў граматах «великий князь Андрей Полоцкий», але і без гэтага тытулу ён быў вялікі князь па сваіх справах і здзяйсненнях.

СЛАЎНЫ ВА ЎСІХ ЗЕМЛЯХ





ВІТАЎТ
(1350—1430)
Партрэт з Берасцейскага манастыра аўгусцінцаў. ***XVIII ст.***

ВІТАЎТ



інула не болей за стагоддзе, як на землях Наваградчыны і Літвы ўзнікла Вялікае княства Літоўскае. У змаганні з ваяўнічымі суседзямі адстаяла яно незалежнасць, сабрала ў адну дзяржаву літвінскія землі. Ад Міндоўга да Альгерда кожны ўладар Вялікага княства, не ведаючы спачыну, зброяй і словам, хітрасцю і адвагай, сілай і дыпламатыяй працягваў справу сваіх папярэднікаў. Вялікае княства Літоўскае пры Вітаўце раскінулася ад Балтыйскага да Чорнага мора, ад Бярэсця да ракі Угры — сапраўдная імперыя. Гэта плён Вітаўтавага жыцця. І толькі ён ведаў дарагі кошт сваёй велічы: прыніжэнні, няволя, страты блізкіх, паражэнні, вечны неспакой за лёс дзяржавы, тысячы вёрстаў дарог, бяссонныя ночы, хаця лёс і зміласцівіўся над ім...

Нейкі фатальны рок праследваў сям'ю Кейстута. Самога князя задушылі Ягайлавы слугі, яго жонку ўтапілі ў рацэ, сына Войдата, наваградскага князя, крыжакі ў 1362 годзе захапілі ў палон, маладымі адышлі з гэтага свету сыны Патрыкій і Таўцівіл, стаў ізгоем Бутаўт, самага малодшага Жыгімонта забілі яго прыдворныя. Хапіў гора і Вітаўт. Ці не праклён багоў вісеў над родам Кейстутавым? Некалі ў юнацтве закахаўся Кейстут у прыгажуню — жрыцу язычаскай багіні Праўрмі Біруту. Сустрэў яе князь на ўзбярэжжы Балтыйскага мора, убачыў і спыніў каня: «Не ведаю, хто ты — ці багіня з неба, ці дзяўчына. Калі ты дзяўчына, будзь маёй жонкай. Я жамойцкі князь, але з гэтага часу буду табе верным слугою». Бірута адказала: «Нават калі б я і жадала, усё роўна не змагла б выканаць тваю волю, князь: я вайдэлотка, дала клятву Перкуну не мець мужа»[1]. Каханне да дзяўчыны асляпіла Кейстута. Аднак жрацы адмовіліся выдаць Біруту замуж за яго. Тады князь ноччу выкрыў Біруту са свяцілішча і звёз яе ў Трокі. Угнявіў язычаскіх багоў — і вось расплата.



Замак у Троках. *Рэканструкцыя С.Мікулініса. 1988 г.*

Шэсць сыноў і чатыры дачкі падаравала Бірута Кейстуту. У 1350 годзе нарадзіўся Вітаўт*. Імя сваё атрымаў ён, відаць, у гонар язычаскага бога Святавіта, якога шанавалі славяне. А можна дапусціць, што азначала яно, як і імя Віцень, «жаданы»[2] або «гаспадар»[3]. Рускі гісторык Юргевіч лічыў, што імя Вітаўт утварылася ад памяншальнага Віцюта[4].

У адрозненне ад папярэднікаў Вітаўта на велікакняжацкім пасадзе пра ягоную дзейнасць захавалася нямала пісьмовых крыніц: асабістыя граматы, перапіска, сведчанні сучаснікаў, аповяды ў летапісах і хроніках. Нават вусныя паданні пра князя Віта дайшлі да нас. Скардзіцца на адсутнасць матэрыялаў не даводзіцца. Але пра дзяцінства і юнацтва Вітаўта звестак амаль няма. І гэта зразумела: летапісцы заносілі ў аналы значныя падзеі свайго часу, пісалі пра ўдзельнікаў гэтых падзей, а жыццё нейкага княжыча-юнака іх не цікавіла. Хто з іх мог прадбачыць, што невысокі, хударлявы хлопчык з Трокскага замка стане чалавекам, што сваімі рашэннямі будзе ўплываць на жыццё Еўропы і яго назавуць «паходняй вайны»? Там, у маленстве і юнацтве, княжыч нібыта знаходзіўся ў сваім «дабыцці» — ён нічога значнага не здзейсніў, ён толькі сын Кейстута. Паспрабуем уявіць жыццё Вітаўта ў гэты час «дабыцця».

Вось старажытныя Трокі. Пасярод возера, на выспе, быццам з вады, падымаецца замак: магутныя вежы, высокія сцены. Некалі Яраслаў Мудры, разбіўшы літвінаў на палях слонімскіх, завалодаў іх краінай да Нёмана і заснаваў, як аплот сваёй улады над іх землямі, горад Трокі. Жыў у Троках Гедымін, калі быў Віценевым намеснікам у Аўкштайціі. Ён і пачаў узводзіць на востраве возера Галва каменны замак. Пасля Гедымінавай смерці Трокі сталі сталіцай княства Кейстута. Той у 1348 годзе пабудаваў на беразе возера драўляны замак і абнёс яго каменнай сцяной з вежамі. Пры Кейстуце ў Троках існаваў праваслаўны манастыр. Разам з аўкштайтамі жылі літвіны. Менавіта апошнія ў сваёй большасці складалі двор Кейстута. Верным княжацкім слугою, чалавекам, якому князь давяраў, як самому сабе, і які разам з ім загінуў, быў літвін Рыгор Амуліч. Нехта з адукаваных літвінаў навучыў княжыча славянскай грамаце.

Вядома імя аднаго з настаўнікаў Вітаўта — гэта былы ордэнскі рыцар Гано фон Віндэнгейм, што трапіў да Кейстута ў палон, а пасля стаў яго сябрам. Віндэнгейм вучыў Вітаўта ня-

---

*Польскі гісторык Т.Васілеўскі лічыць, што Вітаўт нарадзіўся прыблізна ў 1354—1355 гадах. (Wasilewski T. Daty urodzin Jagelly i Witolda / Przeglad wschodni 1991. R. 1. Z. 1. S. 25.)

мецкай мове, а таксама даваў урокі вайсковай навукі. Да сёмага поту ганяў свайго вучня рыцар, ніякай палёгкі яму не дазваляў.

Паляванне... Гэта захапленне Вітаўта. Спеў паляўнічых рагоў, брэх сабак, рык звяроў усё жыццё будуць хваляваць яго душу. Неперадавальная асалода скакаць на кані з дзідай на раз'юшанага зубра. Імгненне... а ў ім і непрыемны халадок у прадчуванні небяспекі, і прага барацьбы, і адвага. Вось сапраўдная школа, памылкі тут каштавалі дорага. Сваіх вояў Вітаўт будзе навучаць мужнасці і спрыту на паляваннях.

Настаўнікам княжыча быў і сам Кейстут. Ад бацькі пераняў Вітаўт яго доблесць і высакароднасць — якасці, якія прызнавалі за Кейстутам і крыжакі. «Кейстут болей за ўсё любіў вайну і праўду. Калі ён жадаў напасці на прускую зямлю, заўсёды папярэдне паведамляў пра гэта маршала Ордэна, а калі паведаміў, заўсёды з'яўляўся»[6]. І не аднаму крыжаку Кейстут па-рыцарску выратаваў жыццё. Ордэнскія хронікі распавядаюць, што аднойчы Кейстутава войска нечаканым начным нападам авалодала замкам Іаганісбургам. Пераможцы запатрабавалі ад Кейстута смерці палонных. Тады комтур замка, рыцар Ота, папрасіў у Кейстута смерці для сябе і літасці для астатніх. Кейстут падаў яму руку і прамовіў: «Ты і чатыры таварышы, якіх сам выбераш сярод палонных, можаце ў любы час выйсці з Іаганісбурга. Астатнія застануцца жывымі». Слова сваё Кейстут стрымаў[7]. Або вось другі выпадак. У палон да Кейстута трапіў комтур Зорбах, што праславіўся спусташэннем Трокскага княства. Паганскія святары патрабавалі спаліць крыжака на ахвярным вогнішчы. А Кейстут падараваў яму жыццё. У тыя жорсткія часы Кейстут вызначаўся рэдкім чалавекалюбствам. Такім жа па-рыцарску высакародным, як і бацька, быў у юнацтве Вітаўт.

У навучанні кніжнай мудрасці, вайсковай справе, ловах у пушчах прайшло дзяцінства і юнацтва князя. У першы паход Вітаўт пайшоў з бацькам у 1363 годзе на крыжакоў. А ў 1368 годзе разам з бацькам і вялікім князем Альгердам хадзіў малады Вітаўт у паход на Маскву. Яшчэ ніхто не ведаў, што наканавана яму праславіцца на стагоддзі, але пяро летапісца распачало летапіс яго здзяйсненняў і подзвігаў. Праз два гады Вітаўт удзельнічае ў бітве каля рэчкі Рудавы. У 1372 годзе зноў разам з бацькам і Альгердам ён ходзіць на Маскву. А ў 1376 годзе, стаўшы гарадзенскім князем, разам з Кейстутам, Ягайлам, Юрыем Белзскім ваюе польскія землі. У 1377 годзе падчас нападку крыжакоў на Трокскае княства ён на чале гарадзенскай дружыны ў 500 вершнікаў знішчыў склады крыжацкага правіянту і тым самым вымусіў ворага ўбрацца ў Прусію. Ра-

даваўся Кейстут на свайго сына, было каму перадаць велікакняжацкі пасад. А калі ў Трокі наведваўся Ягайла, цешыў састарэлы князь сябе думкай, што будуць браты жыць у любові і згодзе, разам вырашаць справы дзяржаўныя, ваяваць супраць ворага. Але жыццё паклапацілася зусім інакш.

ЦЯЖКІЯ ЧАСЫ

Пасля Альгердавай смерці ў 1377 годзе Кейстут, паважаючы братаву волю, прызнаў вялікім князем літоўскім і рускім Ягайлу. Як і раней, часта прыязджаў ён у Вільню, але цяпер ужо да братаніча — думу паразумець разам. І Ягайла пачціва слухаў парады стрыя, па словах Вітаўта, «пакуль не вырас і пакуль людзі да яго не прызвычаіліся»[8]. Гэта фраза сведчыць, што Ягайла быў зусім маладым. Здавалася, нічога не абяцала бяды...

Ягайла — не гультай, не аматар забаў, не бязвольная істота, як гэта часта прыпісвалі яму гісторыкі. Ад бацькі свайго пераняў ясны розум, хітрасць, спрытнасць. Не быў ён нявольнікам абставін і падзей, а сам імкнуўся тварыць гэтыя абставіны і падзеі, не бракавала яму палітычнай мудрасці. Калі трэба было забыцца пра свой гонар дзеля інтарэсаў дзяржавы, забываўся. Праявіў сябе як палітык і як ваявода. Ясна ведаў свае мэты і шляхі да дасягнення іх. А на тое, што ён задумаў, не кожны на яго месцы адважыўся — аб'яднаць пад сваёй рукою ўсе землі, дзе ўладарылі Гедымінавічы: Валынь, Трокскае княства, — а таксама аслабіць Маскоўскую Русь. Ну, а грозны Ордэн хітры Ягайла збіраўся зрабіць сваім саюзнікам.

Стаўшы вялікім князем, ён адразу апынуўся ў складаным становішчы. Старэйшы брат Андрэй Полацкі не прызнаў яго ўладаром Вялікага княства. Не маючы дастаткова сіл для барацьбы за Альгердаву карону, Андрэй пакінуў Полацк і прыехаў у Пскоў. Пскавічы прынялі свайго былога князя і пасадзілі на княжанне, але дапамагчы ў барацьбе з Ягайлам адмовіліся. Тады ён адправіўся ў Маскву да князя Дзмітрыя Іванавіча. Праз год, у снежні 1378 года, маскоўскае войска пад зверхнасцю Андрэя Полацкага выступіла на Вялікае княства Літоўскае, заняло Трубчэўск і Старадуб. Князь трубчэўскі Дзмітрый, таксама сын Альгерда ад Марыі Віцебскай, паступіў на службу да маскоўскага ўладара. З прыхільнасцю да Масквы адносіўся і кіеўскі князь Уладзімір Альгердавіч. Наспяваў раскол сярод Альгердавічаў — падзяленне на сыноў Марыі Віцебскай і сыноў Ульяны Цвярской.

І ўсё ж ад сваіх задум Ягайла не адмовіўся. Самым небяспечным для сябе ворагам ён прызнаў... Кейстута — чалавека,

які падтрымліваў яго. Ведаючы, што Трокскае княства толькі дзякуючы дапамозе Літвы адбіваецца ад крыжакоў, Ягайла выдае Жамойць ды Аўкштайцію на расправу Ордэну. Паходы крыжакоў на гэтыя землі ішлі ўслед адзін за адным. Летам 1377 года ў Прусію прыбыў герцаг аўстрыйскі Альбрэхт III. Чалавек далёкі ад вайны, які захапляўся астраноміяй, мастацтвам, раптам захацеў здзейсніць подзвіг, заслужыць рыцарскія залатыя астрогі. Залезшы ў пазыкі, Альбрэхт наняў войска і прывёў з сабой 2 тысячы вершнікаў. Сам вялікі магістр Кніпродэ сустракаў у Мальбаргу знатнага госця. Лілося віно ў кубкі, слугі на залатых падносах разносілі ежу, гучала музыка. Ордэн не сквапіўся. Выдаткі сябе апраўдвалі, бо кожны з паломнікаў, узведзены Ордэнам у рыцары, лічыў сябе яго свецкім сябрам. Не шкадаваў Ордэн і дарагіх падарункаў. Кожны з гасцей, выпіўшы з залатога кубка, забіраў яго сабе.

У пачатку верасня крыжакі пад зверхнасцю магістра і герцага Альбрэхта рушылі на Жамойць. Ордэн зноў пераходзіў да буйных вайсковых акцый супраць Трокскага княства. Адначасова лівонскія рыцары вырашылі скарыстацца адсутнасцю ў Полацку князя Андрэя і напалі на полацкія землі. Трынаццаць дзён яны трымалі ў аблозе Друю і з чатырох вежаў абстрэльвалі замак. Друйскія воі адбілі некалькі штурмаў, і лівонцы адступілі. А прускія рыцары і іх госці на ладдзях, якія загадзя сплавілі па рацэ, пераправіліся цераз Нёман і ўступілі ў Жамойць.

Аўстрыйскі паэт Пётр Захенвірт так апісаў «подзвігі гордых хрысціянскіх герояў»: «Ну вось нарэшце і сяло. Рыцары кідаюцца да яго, як госці, якіх не запрасілі на вяселле, і пачынаюць баль з паганцамі: палова сотні гэтых няшчасных забіта, сяло спалена, і полымя высока падымаецца да неба. Тады граф Герман Цылі вымае свой меч з похваў, трасе ім у паветры, кажа герцагу: «Лепш быць рыцарам, чым зброеносцам», — і пасвячае яго ў рыцары. Герцаг у сваю чаргу вымае сваю шпагу і ў гонар святога хрысціянства і панны Марыі пасвячае ў рыцары ўсіх, хто гэтага хацеў. Пасля адбываецца рабаванне краіны. Бог зрабіў такую міласць хрысціянам, што паганцы далі захапіць сябе знянацку. Гэта ім дорага абыходзіцца: іх колюць і рэжуць. У краі было шмат людзей і дабра: колькі стратаў для паганцаў, колькі пажытку хрысціянам! Ах, як тут было добра!

Ноч не такая вясёлая. Літвіны зрабілі напад: даводзіцца атрымліваць удары, не бачачы ворага, але затое чутна, як яны рыкаюць, нібыта дзікія звяры. На другі дзень маршал ушыхоўвае войска, кожны становіцца ў свой шэраг. Паганцы працягваюць крычаць у хмызняках, але гэта ім не дапамагае. Шмат іх забіваюць, шмат адбіраюць у іх жанчын і дзяцей. І смешна

глядзець на гэтых жанчын, у якіх прывязаны па два дзіцяці — адзін спераду, другі ззаду, і на гэтых мужчын, якія ідуць атрадамі, звязаныя адзін з адным, нібыта ў зграі. Дзень быў удачлівы, і таму вечарам учыняецца вясёлае баляванне: там без канца падаюць гусей, курэй, бараноў, кароў і мёд, і яно доўжыцца да самага сну. Каб не паўтарылася тая ж гісторыя, што напярэдадні, маршал загадвае пабудаваць моцны плот і расстаўляе вартавых, дзякуючы чаму гэтую ноч можна спаць спакойна.

На трэці дзень апалчэнне ўступае ў другую воласць. Тут тыя ж подзвігі: паганцаў цкуюць, як лісіц або зайцоў, а вечарам граф Герман Цылі частуе герцага аўстрыйскага і новых рыцараў. Правіянт для гэтай вячэры прыбыў здалёк. Падалі аленя, забітага за 20 міль ад лагера, а віны ўсе былі з Вінаха, Лютэнберга і Рэйзаля.

Так мінуў тыдзень, цэлых тры воласці спустошаны. Дым спаленых сяліб засцілае ўвесь далягляд. Але тут настае непагадзь: ліюць дажджы з градам, правіянт пачынае псавацца, і таму пра задавальненне няма чаго і ўспамінаць. Тады апалчэнне вяртаецца праз яры і балоты да Мемеля. У Кёнігсбергу рыцары і аўстрыйцы віншуюць адзін аднаго з поспехам, развітваюцца, і прыемна падумаць, як усё добра скончылася!»[9]

Гэта апісанне тыповага крыжацкага паходу. Падманутыя каталіцкай царквой рыцары забівалі бяззбройных людзей, ліча чы гэта подзвігам, і не пакутавалі ад думкі, што пакідалі пасля сябе папялішчы мірных сяліб. Выгляд няшчасных нявольнікаў выклікаў у іх смех, а спусташэнне Жамойці ды Аўкштайціі яны называлі «задавальненнем».

Кейстут не выступіў супраць ворага. Так і не падышлі да князя дружыны з Вялікага княства Літоўскага, а без іх Кейстут не адважыўся біцца з Ордэнам. Што перашкодзіла Ягайлу дапамагчы? Не, Кейстут не верыў у здраду братаніча, не мог такога ўявіць.

Услед за герцагам Альбрэхтам Прусію наведаў новы госць — будучы англійскі кароль Рычард II. Прыехаў праславіцца подзвігамі супраць «ворагаў» веры Хрыстовай. Дзеля яго магістр наладзіў паход на Бельск. Шэсцьсот вояў пад зверхнасцю балгскага комтура Тэадора фон Эльнера выправіліся ў дарогу. Каб падмануць Кейстута, крыжакі накіравалі невялікі атрад пад Гародню. Князь, упэўнены, што вораг збіраецца напасці на гэты горад, сцягнуў да яго свае дружыны. А крыжакі без перашкоды 24 снежня падышлі да Бельска і ўварваліся ў яго. Захопнікі рабавалі хаты месцічаў, забіралі ўсё каштоўнае, жыхароў, якія не паспелі схавацца, забіралі ў палон. Пры святле пажараў вораг рынуўся на штурм замка. Гарматы білі ядрамі па сценах, лучнікі сыпалі стрэламі. І ўзялі б цвержу крыжакі,

калі б абаронцы не паранілі Рычарда. Пушчаная імі страла трапіла прынцу ў твар. Струменем пацякла кроў высакароднай асобы. Устрывожаны комтур вырашыў зняць аблогу, і крыжакі павярнулі назад. Наступіла адліга, якая размыла дарогі. Тады «воіны Хрыстовы» адабралі з палону дзвесце чалавек, а астатніх пасеклі мячамі.

Пачаўся 1378 год. Крыжакі, ужо па старой завядзёнцы, у месяцы лютым па закутых лёдам рэках пранікалі ў глыб Трокскага княства і рабавалі сялібы. Лівонскія рыцары спустошылі Упіцкую зямлю, угналі адтуль пяць соцень палонных. Даходзілі крыжакі аж да Мядзеля. А ў Прусію прыбыў новы «змагар з паганствам» — герцаг Альбрэхт Латарынгскі з 700 вершнікамі. І гэтага госця магістр павёў здзяйсняць подзвіг у Трокскім княстве. Знясіленыя шматтадоваю вайною з Ордэнам Жамойць ды Аўкштайція былі лёгкай здабычай. Зноў, не сустрэўшы супраціўлення, крыжакі беспакарана парабавалі і спустошылі гэтыя землі.

Ужо задумаліся жамойты ды аўкштайты, ці не пакінуць сваю радзіму, як некалі прусы, яцвягі і земігалы, і перасяліцца на новыя землі. Са шкадаваннем успамінаў Кейстут тыя часы, калі яму на дапамогу прыходзіў Альгерд. А цяпер... Вось трэці год на віленскім пасадзе Ягайла і ні разу не дапамог. Праўда, ёсць у таго адгаворка, што асцерагаецца ён нападу маскоўскага князя Дзмітрыя Іванавіча ды Андрэя Полацкага. Бачыў князь, што як ніколі блізкія крыжакі да заваявання Жамойці, а там чарга падыдзе і да Аўкштайціі. Мо і сапраўды перасяліцца на новыя землі, каб выратаваць бацькоўскую веру, не даць хрысціянскаму крыжу загасіць святы агонь Зніча?

Тое, што Жамойць дажывала апошнія дні сваёй волі, бачылі і крыжакі. Летам 1379 года ордэнскі маршал Куна Гатэнштэйн уступіў у Жамойць. Дым палаючых сёлаў зноў падняўся над спакутаваным краем. Крыжакі падышлі да Коўны. Тут крыжацкія віжы данеслі, што да замка набліжаецца авангард войск Трокскага княства. Крыжакі падрыхтаваліся да бітвы. Аднак Кейстут прыслаў маршалу вестуна з прапановаю сустрэчы. На адной з выспаў ракі Нярыс сустрэліся ордэнскі маршал і троцкі князь. Яны дамовіліся абмяняцца палоннымі і заключыць пазней мір.

ЯГАЙЛАВА ЗДРАДА

Крыжакі ўсё ж паспелі перад мірнай дамовай напасці яшчэ раз на Трокскае княства. У жніўні яны беспаспяхова штурмавалі Мельнік, спустошылі Камянецкую зямлю, спалілі Бярэсце, але замак узяць не здолелі. У канцы месяца ў замак Іага-

нісбург прыбыў з ордэнскімі саноўнікамі вялікі магістр. Сюды ж прыехаў Кейстут з Вітаўтам, а разам з імі і Ягайла. Перамовы былі перанесены ў Трокі, дзе абодва бакі і падпісалі мірнае пагадненне. Мір заключаўся на дзесяць гадоў, распаўсюджваўся на літвінскія землі: Ваўкавыскую, Суражскую, Драгічынскую, Мельніцкую, Берасцейскую, Камянецкую, Гарадзенскую — і на прускія: Астэроду, Артэльсбург, Алекштэйн, Гуплаўкен і Заербург. Дамова гэта была выгаднай Ягайлу: заходнія літвінскія землі, на якія прэтэндаваў вялікі князь, ацалеюць ад спусташэнняў, а Жамойць ды Аўкштайція, ператвораныя пасля паходаў крыжакоў у пустыню, для яго таксама не ўяўлялі асаблівай каштоўнасці і аддаваліся ў ахвяру Ордэну. З іх заваёвай наблізіўся б і час Кейстутава падзення. Можна дапусціць, што Ягайла патаемна сустрэўся з ордэнскімі саноўнікамі і дагаварыўся пра заключэнне сепаратнай дамовы супраць Кейстута. У той час ён ужо ўступіў у зносіны з уладаром Залатой Арды Мамаем і абяцаў падтрымаць яго ў вайне з Масквою. Неабходна было забяспечыць мір з Ордэнам і звязаць па руках Кейстута. Не давяраў Ягайла свайму дзядзьку і баяўся, каб той не захапіў уладу ў Вялікім княстве. Таму пасля Трок Ягайла запрасіў крыжацкіх паслоў у Вільню, дзе яны «затрымаліся на тры дні і тры начы, дамаўляючыся пра таемныя справы з каралём», як адзначыў у сваёй хроніцы Віганд Марбургскі[10].

У крыжакоў свае мэты, свая гульня. Зразумеўшы, што паміж Ягайлам і Кейстутам няма згоды, яны задумалі распаліць паміж імі агонь варожасці. Да княгіні Ульяны Цвярской — Ягайлавай маці — магістр прыслаў ліст. Спачатку прыемныя для яе матчынага сэрца навіны, як урачыста прымалі ў Ордэне яе сына Скіргайлу, апісанне балявання ў ягоны гонар, пералік багатых падарункаў, якія ён атрымаў ад рыцараў, а заканчваецца ліст папярэджаннем: «...гэты шалёны сабака Кейстут не толькі супраць усяго хрысціянства, але і супраць Літвы носіць зласлівыя задумы. Асабліва ж (як ужо і раней мы даносілі вашай міласці) гэты нягодны чалавек марыць авалодаць усёй літоўскай дзяржавою, думаючы штодня, якім бы чынам загубіць вашага вельмі слаўнага сына Ягайлу, адарваць ад яго ўсіх падданых, забраць усе землі і падначаліць сабе ўсе княства»[11].

Пасля такіх паведамленняў Ягайла прымае цвёрды намер расправіцца з Кейстутам і Вітаўтам і далучыць іх уладанні да Вялікага княства. У адкрытую выступіць ён не рашаецца. Лепш жар заграбаць чужымі рукамі. Выканаць Ягайлаву задуму ўзяўся лідскі баярын Вайдыла, «нязначнай фамілії чалавек». Служыў ён некалі пры Альгердзе пекарам, пасля князь даручыў яму сцяліць свой ложак і падаваць ваду. Дзейсны і кемлівы парабак палюбіўся Альгерду, князь наблізіў яго да сябе і даў

яму Ліду. Беспрынцыпны і хлуслівы Вайдыла якраз той, на каго можна звaліць віну за смерць Кейстута і Вітаўта. Ягайла робіць неверагоднае — аддае за былога слугу сваю сястру Марыю, якая засталася ўдавою пасля смерці гарадзенскага князя Давыда. Для ўсіх Гедымінавічаў гэты шлюб стаў абразай. Асабліва перажываў Кейстут за такую Ягайлаву «нелюбость» да радавага гонару і дакараў за гэта братанічу. Ягайла паабяцаў Вайдыле перадаць у кіраванне Трокскае княства. Ці мог калі пра такое марыць былы пекар? Лёс даваў яму шчаслівую магчымасць узвысіцца, і Вайдыла быў гатовы на ўсё, каб не ўпусціць яе. Ён патаемна пабываў у Рызе, дзе ад імя Ягайлы падпісаў грамату, па якой лівонскія рыцары маглі ваяваць Жамойць. Пабываў і ў Мальбаргу, сустрэўся з вялікім магістрам. Кніпродэ і Ягайлаў пасол дамовіліся, што ордэнскія прадстаўнікі прыедуць нібыта на паляванне ў Давідзішкі. Сюды прыбудзе і Ягайла, каб заключыць з Ордэнам пагадненне.

У 1380 годзе 1 чэрвеня ў сяльцы Давідзішкі, дзе некалі жыў славуты Давыд Гарадзенскі, Ягайла і Вайдыла сустрэліся з ордэнскімі саноўнікамі. Каб гэтая сустрэча не выклікала падазрэнняў у Кейстута, Ягайла запрасіў на яе Вітаўта. У першы дзень вялікі камандор Эльнер даў шыкоўнае баляванне. Пілі віно, пацяшаліся з жартаў блазнаў. На другі дзень учынілі ловы. Гучалі паляўнічыя рогі, заліваліся брэхам зграі сабак. Загоншчыкі гналі звера, паляўнічыя спаборнічалі ў трапнасці і спрыту. Вітаўт, які ў паляўнічым запале забываўся на ўсё, радаваўся, як дзіця. І не мог ён уявіць, што ў гэты час Вайдыла патаемна склаў з крыжакамі грамату, якая казала: «Вялікі князь абяцае Тэўтонскаму ордэну ў Прусіі і Лівоніі поўны спакой і бяспеку як землям, так і людзям; калі Ордэн пойдзе вайною на Кейстута або яго дзяцей, а вялікі князь рушыць у поле сваі войскі, дык мір праз гэта ніяк не парушыцца, таму што вялікі князь не будзе дапускаць ніякіх вайсковых сутычак з Ордэнам і ніякай крыўды ордэнскім войскам чыніць не стане. Палонныя з ордэнскага войска павінны быць вызвалены адразу і без усякага выкупу. Калі ордэнскія ратнікі па няведанню нападуць на ўладанні вялікага князя і тым самым прычыняць страту і захопяць палон, дык праз гэта мір не парушыцца: гэтыя палонныя адпускаюцца без усялякага выкупу. Але, каб пагадненне не выкрылася, трэба рабіць так, каб з боку думалі, што за палонных выкуп заплачаны»[12]. Усё было абгаворана, усё ўлічана да драбніц.

Як сябры, развіталіся браты пасля сустрэчы. Вітаўт, абрадаваны, што Ягайла запрасіў яго на такія слаўныя ловы, адправіўся да сябе ў Гародню. Ягайла паехаў у Вільню, таксама задаволены ўдачаю ў перамовах з Ордэнам. У сталіцы прабыў



Фрагмент з карціны Я.Стыка «Клятва Вітаўта»

ён нядоўга і адправіўся на ўсходнія межы Літвы, куды ўжо сцягваліся па яго загаду літвінскія харугвы.

Вялікі князь рыхтаваўся да паходу супраць Масквы. Як у выпадку з Кейстутам, якога ён задумаў загубіць рукамі Вайдылы і крыжакоў, так і тут зброяй шматлікіх туменаў Мамая марыў Ягайла расправіцца з Масквою і пазбавіць Андрэя Полацкага ды Дзмітрыя Трубчэўскага маскоўскай падтрымкі. Магчыма, Ягайла меркаваў і большае. Разанскі князь Алег пісаў яму: «Ты даўно хацеў прагнаць маскоўскага князя і авалодаць

Масквой, цяпер надышоў час; Мамай ідзе на яго, злучыся з ім; пашлі сваіх паслоў да яго з падарункамі. Сам лепш за мяне ведаеш, як учыніць»[13]. Але нічога, апроч ганьбы і расчаравання, гэты паход яму не прынёс. 8 верасня 1380 года рускія войскі пад зверхнасцю князя Дзмітрыя Іванавіча разбілі татарскую раць. Даведаўшыся пра паражэнне саюзніка, Ягайла павярнуў назад.

А на Жамойці панаваў жах. Вялікае крыжацкае войска захапіла цвержу Каўенпіль, якая лічылася дагэтуль непрыступнай. Ва ўсіх прускіх касцёлах адбыліся ўрачыстыя службы ў гонар гэтай перамогі. А пасля, парушыўшы ўмовы мірнай дамовы 1379 года, крыжакі рынуліся на Падляшша. Віжы данеслі пра крыжацкае нашэсце Вітаўту, які знаходзіўся ў гэты час у Бярэсці. Князь абвясціў пагоню: у Бярэсце сабраліся з наваколля ўсе мужчыны, здольныя насіць зброю. Умацаваўшы горад, Вітаўт памчаўся на кані з невялікім атрадам вояў пад Драгічын. Сюды ішлі ўздоўж Буга і крыжакі. Яны ўзялі ў аблогу Бужскую крэпасць, Вітаўт, пакінуўшы ў Драгічыне невялікі гарнізон, з астатнімі воямі схаваўся ў навакольных лясах каля Драгічына. Сустрэў крыжакоў агонь гарадскіх прадмесцяў, запаленых па князеву загаду. Не паспелі рыцары спыніцца, як літвінскія лучнікі з лесу закідалі іх абоз стрэламі і адразу зніклі ў лесе. Лёгкая конніца напала на крыжацкі атрад, што абыходзіў горад з другога боку. Ноч у ордэнскім стане прайшла неспакойна — рыцары чакалі нападу літвінаў. Наступным днём крыжакі рынуліся на штурм крэпасці. Гарматныя ядры разбуралі замкавыя сцены. З таго боку адказвалі градам стрэл. А каля крыжацкага стану рыскалі на конях літвінскія воі, гатовыя напасці на ворага. Вітаўт тым часам разбіў крыжакоў, што трымалі ў аблозе Бужскую цвержу. Так і не авалодаўшы Драгічынскім замкам, тэўтоны праз тыдзень аблогі адступілі. Вітаўт са сваімі воямі праследаваў іх ажно да ракі Нараў, імклівымі нападамі наносячы страты ў варожых шэрагах.

З навіною аб перамозе прыскакаў Вітаўт у Трокі. Ды толькі не суцешыў ён бацьку. Астэродскі камандор Куна Ліббштэйн, які некалі хрысціў Кейстутаву дачку Дануту, калі яна брала шлюб з мазавецкім князем Янушам, асабіста прыехаў да Кейстута і паведаміў: «І ты таго не ведаеш, што князь вялікі Ягайла пасылае да нас часта Вайдылу і ўжо запісаўся з намі, як цябе пазбавіць сваіх месцаў, каб яны дасталіся яму разам з сястрою Ягайлы»[14]. Ці ад сваёй высакароднасці папярэдзіў Кейстута камандор, ці вось такім чынам, раскрыўшы Ягайлавы задумы, Ордэн спадзяваўся распаліць вайну паміж дзядзькам і яго братанічам. Ведаючы, што Вітаўт сябруе з Ягайлам,

Кейстут вырашыў параіцца з сынам і распавёў пра папярэджанне камандора. «Ты з ім у сяброўстве жывеш, а ён ужо запісаўся на нас з немцамі», — нібыта ў дакор Вітаўту прамовіў Кейстут. А Вітаўт не мог паверыць у сябраву здраду. «Не веру таму, гэтага няма, бо ён са мною гаразда жыве, і калі б што і мне явіў», — адказаў Вітаўт бацьку[15]. Толькі мудры Кейстут разумеў: там, дзе пачынаюцца палітычныя інтарэсы, там канчаецца сяброўства. Сам жа некалі забыўся на сваяцтва і выгнаў з Вільні Яўнуту.

Жадаючы праверыць Ягайлу, Кейстут папрасіў у яго войска для авалодання цвержай Баербург. Ягайла не адмовіў. Але якім было расчараванне троцкага князя, калі пад Баербург прыйшоў з невялікім атрадам Ягайлаў брат Карыбут. Ягайла вёў хітрую гульню — нібыта гатовы змагацца з крыжакамі, ён адначасова ўсяляк ухіляўся ад вайны з імі. Пад Баербургам Кейстута напаткала няўдача — крыжакі адбілі ўсе прыступы яго вояў. Кейстут абвінаваціў у паражэнні Ягайлу. Палітыка прызнае саюзнікаў, а сяброўства ў ёй — вельмі небяспечнае захапленне. Даверыўшыся высокапастаўленаму сябру, можна атрымаць удар у спіну. Аднак магло стацца і так, што Ордэн жадае настроіць яго, Кейстута, супраць Ягайлы, пасварыць іх. Без цвёрдых доказаў нельга абвініць братаніча ў здрадзе. Але наступныя падзеі пацвердзілі Кейстутаву апаску.

Як толькі пачаўся новы, 1381 год, крыжакі аднавілі паходы на Трокскае княства. Усё меней заставалася ацалелых ад крыжацкага мяча сяліб у Жамойці ды Аўкштайціі. Але на Вялікае княства Ордэн не нападаў — ці ж то ні падазрона? Варта было Кейстуту выступіць супраць рыцараў пад замак Веслаў, як яны ўжо ведалі пра яго набліжэнне і падрыхтаваліся да бою. Тое ж адбывалася і ў другіх месцах, куды ні павёў бы князь сваё войска. Відавочна, што нехта крыжакоў папярэдзіў.

Пасля таго як Андрэй Полацкі ад'ехаў у Пскоў, палачане, прызнаючы па-ранейшаму яго сваім князем, нікога на свой пасад не запрашалі. Ягайла задумаў адняць горад у свайго праціўніка і аддаць яго Скіргайлу. Той заявіўся ў Полацк, упэўнены, што палачане не аслухаюцца волі вялікага князя. Аднак Ягайла парушыў старажытны закон палачан запрашаць да сябе князя па сваёй волі. Абураныя, яны пасадзілі Ягайлавага стаўленіка на кабылу задам наперад і пад свіст і кпіны выправадзілі з горада. Тады Ягайла даў Скіргайлу войска і паслаў яго на Полацк. Падышлі да горада і лівонскія рыцары. Палачане прасілі дапамогу ў Ноўгарада. На іх просьбу наўгародцы паслалі полк на чале з Юрыем Анцыферавым. Шаснаццаць

тыдняў Скіргайла беспаспяхова дабываў горад. Палачане мужна адбівалі ўсе штурмы ворага. А Кейстут канчаткова пераканаўся ў Ягайлавай здрадзе.

Зноў князь параіўся з сынам і выказаў яму свае падазрэнні: «Бачыш, як Ягайла крыўдзіць мяне: за Вайдылу аддаў сястру маю братанічу; запісаўся за немцамі на мае ліха. А вось трэцяе. З кім мы ваюем? — з немцамі. А ён з імі Полацк дабывае. Ужо тое праявілася, што яны на нас супраць сталі з немцамі!» Але без прамых доказаў Ягайлавай здрады Вітаўт і зараз не паверыў бацьку. «Я яшчэ давяраю Ягайлу», — адказаў ён бацьку[16]. І тады Кейстут вырашыў дзейнічаць адзін.

Як толькі Вітаўт паехаў з Трок у Драгічын, Кейстут з войскам нечакана напаў на Вільню і захапіў у палон Ягайлу. У велікакняжацкай канцылярыі Кейстут знайшоў патаемныя граматы-дамовы з Ордэнам. Сумненні растаялі — Ягайла хацеў расправіцца з ім. Кейстут паслаў за Вітаўтам. Вестуны засталі таго ў Гародні. За адзін дзень прыскакаў у Вільню ўстрывожаны гарадзенскі князь. Як нечакана разбураліся пад ударамі жыцця ўсе яго ўяўленні пра высакароднасць, годнасць, сяброўства! Лепш было не ведаць пра братаву здраду!

Кейстут паказаў сыну граматы: «Ты мне не верыў, а гэта тыя граматы, што пісаліся на нас, але Бог нас засцярог. Я князю вялікаму Ягайлу нічога не ўчыніў, ні рушыў ні скарбаў яго, ні статкаў, а самі ў мяне не ў няўцтве* ходзяць, толькі з малою старожаю. А вотчыну яго Віцебск і Крэва, і ўсе месцы, што бацька яго трымаў, то ўсё даю яму. Ні ў што іх не ўступаюся. А то ўчыніў, сцерагучы сваёй галавы, пачуўшы, што на мяне ліха мысліцца»[17].

У што верыў Кейстут, на што спадзяваўся, дараваўшы волю Ягайлу? Што той змірыцца са сваім паражэннем, згадзіцца быць князем віцебскім і крэўскім? Дык не такі характар у Ягайлы. Ён нібыта з гатоўнасцю клянецца Кейстуту ў вернасці, прызнае сябе яго васалам, а ў душы з гэтым не пагаджаецца.

Невядома, пра што размаўляў Вітаўт з Ягайлам, калі праводзіў яго ў Крэва. Можа быць, дакараў за здраду, а той апраўдваўся. Аднак вось не адрокся Вітаўт ад брата, дараваў яму, падтрымаў у нялёгкую хвіліну. Яшчэ не азлобілася ягоная душа, яшчэ высакароднасць не забіта чужым вераломствам.

---

*Няўцтва — няволя.

КЕЙСТУТ — ВЯЛІКІ КНЯЗЬ ЛІТОЎСКІ

Кейстут, нягледзячы на свае немаладыя гады, дзейсна займаўся вырашэннем дзяржаўных спраў. Па яго загаду Вайдылу пакаралі смерцю. Ды толькі не ашчаслівіў гэтым ён сваю братану Марыю, адняў у яе мужа, асіраціў дзяцей. І затоіла Марыя ў душы помсту на Кейстута.

Да войска, што трымала ў аблозе Полацк, Кейстут паслаў вестуна. Воі, якія без усялякай ахвоты здабывалі былую крывіцкую сталіцу, даведаўшыся, што вялікі князь літоўскі цяпер Кейстут, абрадаваліся і знялі аблогу. А Юрый Анцыфераў выступіў пасрэднікам у перамовах Скіргайлы з палачанамі і ўгаварыў яго адступіць ад Полацка. Лівонскія рыцары паспяшылі ўбрацца ў Лівонію. Разам з імі адправіўся і Скіргайла.

Ордэн адразу адчуў моц дзвюх аб'яднаных Кейстутам дзяржаў. Такая блізкая перамога над Жамойцю і Аўкштайціяй зноў аддалялася. У студзені 1381 года Кейстутава войска захапіла ордэнскі горад Астэраду. У пачатку 1382 года спусташальнаму нашэсцю Кейстутавых дружын падверглася пруская вобласць Вармія. Восенню Кейстут асабіста ўзначаліў войска і павёў яго на Юрбарг. Але ні катапульты, якія разбівалі сцены камянямі, ні гарматы не дапамагалі яму авалодаць замкам. Пакуль доўжылася аблога, з Прусіі з'явілася войска і пачало пагражаць літвінам з тылу. Кейстут адступіў. У той жа час лівонскія рыцары здзейснілі набег на Жамойць, але на зваротным шляху былі разбіты.

Пакуль Кейстут і Вітаўт змагаліся з крыжакамі, Ягайла адправіў з Крэва брата Свідрыгайлу да лівонскага магістра Вільгельма. Сярод грамат, якія той вёз у Рыгу, знаходзілася чыстая з загадзя прывешанай Ягайлавай пячаткай. На ёй Ордэн быў павінен запісаць свае ўмовы дапамогі Ягайлу супраць Кейстута. У Рызе Свідрыгайла сустрэўся са Скіргайлам, і далей той узяўся за справу. Магістр даў яму лісты да вялікага камандора Ордэна, які знаходзіўся ў Кёнігсбергу. Ордэну і не спатрэбілася інтрыгаваць. Ягайла сам кланяўся, прасіў дапамогі.

Пасла звергнутага вялікага князя крыжакі сустрэлі з пашанай. З Кёнігсберга Скіргайла прыехаў у Мальбарг, дзе магістр абяцаў яму падтрымку Ягайлы пры ўмове, што Вялікае княства прыме каталіцтва на працягу чатырох гадоў і саступіць Ордэну Жамойць. Той згадзіўся на гэтыя ўмовы і ад імя Ягайлы даў падпіску з абяцаннем выканаць іх. З Мальбарга ў Крэва патаемна прыехалі крыжацкія паслы з паведамленнем пра заключаную дамову. Не губляючы часу, Ордэн стаў збіраць войска. Засталося толькі чакаць зручнага моманту, калі можна

было выступіць на Кейстута. І гэты момант неўзабаве надышоў.

Кейстут адправіўся з войскам на ноўгарад-северскага князя Карыбута Альгердавіча, які не прызнаваў ягоную ўладу. А Вітаўт з гарадзенскай дружынай стаяў пад Вільняй, ахоўваў сталіцу ад магчымага нападу крыжакоў. У паход павінен быў ісці і Ягайла. Гэта аблегчыла яму збор сваіх дружын з Крэўскага і Віцебскага княстваў. Толькі не на Ноўгарад-Северскі пайшоў Ягайла, а на Вільню. Войска рухалася па начах патаемнымі ляснымі дарогамі, і да апошняга моманту Вітаўт не ведаў пра небяспеку. Ягайла нечакана напаў на яго і разбіў гарадзенскую дружыну. Начальнік віленскага гарнізона Гануль (немец, які паступіў на службу да Ягайлы) здаў Вільню пераможцам. Ягайла абвясціў сябе вялікім князем Літоўскім і Рускім і прыняўся дзейсна рыхтавацца да вайны з Кейстутам. З Прусіі і Лівоніі спяшаліся ў Вільню крыжакі.

А Вітаўт з рэшткамі сваёй дружыны адступіў у Трокі. Гэты бой стаў горкім урокам: Ягайла хітры і жорсткі чалавек, і высакароднасці ад яго не чакай — калі задумаў ён загубіць Кейстута і яго, Вітаўта, дык ад свайго не адступіцца. Не ведаў Вітаўт, чаму болей журыцца, ці гэтаму адкрыццю, ці прыкраму паражэнню пад Вільняй.

У Троках Вітаўт дога не заставаўся, забраўшы з сабою маці, ён адправіўся ў Гародню. І гэты шлях стаў пачаткам доўгай і цяжкай дарогі ізгоя. Але яшчэ не ведаў пра гэта Вітаўт, яшчэ жыла надзея на перамогу над былым сябрам.

На палове дарогі на Ноўгарад-Северскі атрымаў Кейстут ад Вітаўта вестку пра Ягайлава паўстанне. Князь павярнуў войска і павёў яго ў Гародню.

Мала радасці прынесла Вітаўту гэтая сустрэча з бацькам. Нельга было без шкадавання глядзець на яго пахмурнелы і стомлены твар. Здагадваўся, што робіцца ў бацькавай душы, хаця стары Кейстут і стараўся трымацца спакойна, не выдаваць сваіх пачуццяў. Які несправядлівы да яго лёс! За ўсё, што ён зрабіў для абароны роднай зямлі, вось якая плата... Яму адпачываць бы на старасці год, а трэба ваяваць. І з кім? Са сваімі ж. Праліваць братнюю кроў, ганьбіць сваё імя.

Бацька і сын абгаварылі, як ім змагацца супраць Ягайлы. Разумелі, што перавага на ягоным баку, бо за ім Вялікае княства, за ім крыжакі. А што ў іх? Спустошаная Жамойць ды Аўкштайція? Апошняя надзея на Гарадзеншчыну ды Берасцейшчыну, ды на зяця, мазавецкага князя Януша. Суцяшалі весткі з-пад Полацка. Там стаяў з лівонскай раццю Скіргайла. Палачане і на гэты раз не пусцілі яго ў горад. Значыцца, не ўсё ўдала складваецца і ў Ягайлы.



Гравюра з «Хронікі Еўрапейскай Сарматыі» А.Гваньіні.
Вітаўт. *1578 г.*

Вітаўт застаўся ў Гародні збіраць дружыны з Падляшша, Берасцейскай і Гарадзенскай зямлі, а Кейстут адправіўся ў Жамойць. Бірута ад'ехала ў Бярэсце. Лёс нанёс Кейстуту яшчэ адзін удар. Януш зусім не думаў дапамагаць сваяку. Ён, як даведаўся, што цесць трапіў у бяду, адразу падняў сваё войска і рушыў на Берасцейшчыну. І час для ўдару разлічыў — калі берасцейскія воі па Вітаўтаву закліку сабраліся ў Гародні. Таму без асаблівых страт і вялікай крыві мазуры захапілі Драгічын і размясцілі там свой гарнізон. Удача распаліла прагу. Януша-

вы войскі захапілі Сураж, без бою занялі яшчэ не адбудаваную пасля крыжацкага нашэсця Бельскую цвержу. Толькі перад магутнай Белай вежай пераламаліся варожыя дзіды. Мазуры, так і не авалодаўшы ёю, адступілі ад Камянца. Януш асабліва не засмуціўся: наперадзе было Бярэсце. Але не хлебам з соллю сустрэла яго Бірута, а зброяй. Берасцейцы падняліся на абарону роднага горада, адбілі некалькі штурмаў. Адступіў Януш толькі тады, калі даведаўся, што Любарт рыхтуецца да паходу на дапамогу Біруце. Заваяваныя землі Януш аддаў роднаму брату Земавіту. А той, рыхтуючыся да барацьбы за польскую карону, уступіў іх за 7 тысяч угорскіх талераў крыжакам. Між тым 20 ліпеня Скіргайла з крыжакамі падышоў да Трок. Ён прапанаваў абаронцам здаць замак. Тыя адказалі, што калі яны паддадуцца крыжакам, то не будуць бараніць замак перад Кейстутам. Тады маршал Куна фон Гатэнштэйн прапанаваў паддацца Ягайлу, што абаронцы і зрабілі.

Яго здабычай стала Кейстутава скарбніца. Пра яе багацце казалі далёка за межамі Літвы. Пазней Ягайла вывезе гэты скарб у Польшчу. Так што брат абрабаваў брата да апошняй ніткі.

Яшчэ большае расчараванне чакала Кейстута на Жамойці. Жамойты адвярнуліся ад яго, бо лічылі віноўным у вайне з Ягайлам. Маўляў, першы захапіў Вільню, а ім даводзіцца расплачвацца. Думалі жамойты спачатку адправіць да Ягайлы паслоў і прымірыцца з ім, калі ён будзе верны Знічу. Нарэшце вырашылі пакінуць радзіму і з усім народам перасяліцца на новыя землі, дзе можна было б захаваць сваю старажытную веру. Толькі адзінкі падтрымалі Кейстута.

З невялічкай дружынай пайшоў князь здабываць Трокі. Каля Коўна да Кейстута далучыўся з пяцітысячным войскам Вітаўт. А па іх слядах з Прусіі рушылі крыжакі. З другога боку да Трок падышлі лівонцы. Трэцяе войска пад зверхнасцю Ягайлы выступіла з Вільні. Кейстут апынуўся ў шчыльнам коле непрыяцельскіх рацей. Нягледзячы на значную перавагу ў воях, Ягайла не пачынаў бітвы. Гэта можна тлумачыць і ўласцівай яму асцярожнасцю, нават бояззю вопытнага ў войнах Кейстута, аднак, трэба думаць, былі і іншыя прычыны. Вітаўт прывёў да бацькі 5 тысяч літвінскіх ратнікаў і, як указвае нямецкі храніст Віганд, Кейстутава войска звычайна складала столькі ж вояў[18]. Набраны яны былі з літвінскіх земляў, частку якіх заваяваў Януш Мазавецкі. Можа, Ягайла, што збіраўся вярнуць страчаныя землі, хацеў захаваць тамтэйшых вояў, не праліваць дарэмна іх крыві. Дзейнічаў ён тут мудра і па-дзяржаўнаму, але вось якімі сродкамі? — падманам і здрадаю.



Гравюра з «Хронікі Еўрапейскай Сарматыі» А.Гваньіні.
Ягайла. *1578* г.

Такім чынам, абодва войскі не пачыналі бітвы, чакалі загадаў сваіх важароў. Толькі адлегласць у чатыры палёты стралы раздзяляла іх. Нечакана ад Ягайлы прыехалі паслы. Яны заявілі Вітаўту: «Князь вялікі Ягайла паслаў нас да цябе, каб ты ўеднаў нас з бацькам тваім, каб ён трымаў сваё, а вы сваё, а бою паміж нас не было, кровапраліцця не ўчынялася. Ты прыехаў бы да брата свайго, князя вялікага Ягайла. А мы праўду (клятву. — *В.Ч.*) даем, каб табе чыста ад'ехаць у раць сваю. А паміж вас быў добры канчатак».

Вітаўт запатрабаваў, каб за Ягайлу паручыўся Скіргайла: «Праўду ў вас (паслоў. — *В.Ч.*) бяру, каб таксама князь Скіргайла сам прыехаў, а таксама праўду даў, і я выеду». Скіргайла прыбыў з Трок і «праўду даў». Упэўнены ў шчырым Ягайлавым намеры памірыцца, Вітаўт прыехаў да яго ў стан. Здавалася, так яно і было: Ягайла раскайваўся, не хацеў праліваць крыві, нават пакляўся, і даверлівае Вітаўтава сэрца падалося на яго хітрыкі. Ён абяцаў угаварыць бацьку сустрэцца з Ягайлам і папрасіў: «Яшчэ, браце, пашлі Скіргайлу, каб ён і я ўчыніў праўду бацьку свайму, каб яму чыста прыйсці і зноў ад'ехаць у раць, а князь Скіргайла ад цябе даў праўду»[19]. Так і вырашылі. Вітаўт і Скіргайла прыехалі да Кейстута, пакляліся ад імя Ягайлы і ад свайго імя ў бяспецы на перамовах. І мудры, вопытны Кейстут паверыў, бо і сам хацеў пазбегнуць міжусобнай вайны.

Як толькі бацька і сын у суправаджэнні Скіргайлы прыехалі да Ягайлы, іх адразу шчыльна акружылі. Ягайла мовіў, што нязручна весці перамовы ў полі і прапанаваў ехаць у Вільню. Кейстут і Вітаўт згадзіліся і на гэта. Моц была за Ягайлам, ён і дыктаваў умовы, а ім даводзілася падначальвацца. У акружэнні Ягайлавых вояў князі адправіліся ў Вільню.

А там на Вітаўта і Кейстута накінуліся воі і звязенілі іх. Кейстута павезлі ў Крэва, а Вітаўта пасадзілі ў замкавую вязніцу.

Кейстутава войска нецярпліва чакала вестак з Вільні. Прыехалі вестуны і паведалі, што мір паміж Кейстутам і Ягайлам заключаны. Адначасова Ягайлавы шпегі распусцілі ў войску чуткі, што незадаволеныя гэтым мірам крыжакі пагражаюць напасці на Жамойць. На другі дзень жамойты адправіліся дадому. А да літвінаў прыехаў пасланец ад Ягайлы і ўгаварыў іх перайсці на яго бок.

Так падманам перамог Ягайла. Для Вітаўта гэта быў жорсткі ўдар. У прыпадку нянавісці да Ягайлы ён кляў яго, пагражаў помстаю і, знясілены, заціхаў. А Кейстута Скіргайла пад вартай прывёз у Крэва. Там старога князя закулі ў кайданы і пасадзілі ў склеп, які знаходзіўся пад вежай. Можа, яшчэ верыў Кейстут, што і на гэты раз, як не аднойчы, яму удасца выратавацца, і не паддаваўся адчаю.

Чатыры дні правёў у вязніцы Кейстут. На пятыя суткі, ноччу, дзверы склепа расчыніліся і пры святле паходняў увайшлі ў памяшканне Ягайлавы каморнікі: Прокша, што падаваў вязню ваду, браты Жэбянцяі, Кучук і Лісіца і нейкі ордэнскі рыцар. Нічога не тлумачачы, яны акружылі князя. Яго верны слуга Рыгор Амуліч, сэрцам адчуўшы небяспеку, кінуўся на абарону свайго гаспадара і тут жа ўпаў, забіты мячом, на ка-



М.Андрыёлі. Забойства Кейстута. *1882 г.*

менную падлогу. Кейстут загінуў не ад зброі — каморнікі задушылі яго шнурком. Так звычайна каралі людзей халопскага роду.

І нежывы Кейстут палохаў Ягайлу. Як аднясуцца да яго забойства ў дзяржаве? Як успрымуць падданыя клятваадступніцтва іх уладара? Ясна, што не адобраць. Каб пазбавіць сябе ад падазрэнняў у забойстве Кейстута, Ягайла разыгрывае прадуманы да дробязей спектакаль. Ён пасылае да ўжо забітага стрыя Скіргайлу нібыта з даручэннем да яго. Скіргайла вяртаецца ў Вільню і прылюдна заяўляе, што Кейстут задушыў сябе залатым шнурком ад сваёй вопраткі. Усе прыдворныя пераконваюцца, што вялікі князь не вінаваты ў Кейстутавай смерці. А спектакль працягваўся далей. Ягайла чыніць урачыстае пахаванне — гэта таксама павінна развеяць усякія падазрэнні ў гвалтоўнай смерці Кейстута. У даліне Святарога ў Вільні над вырытай ямай учынілі жэглішча*, на якое паклалі адзетае ў багатую вопратку цела. Па старадаўняму звычаю побач з ім змясцілі меч, дзіду і калчан з лукам, каб там, у краіне продкаў, князь мог карыстацца гэтымі рэчамі, рысіныя і мядзведжыя кіпцюры, з дапамогай якіх ён падымецца на святую гару продкаў. Там жа пакінулі забітых слугу, каня, двух пародзістых сабак, што павінны служыць яму на тым свеце. Усё як належыць паводле старажытнага звычаю.

Жрацы прынеслі ахвяры багам, прачыталі казанні і ўсхвалілі подзвігі і дзеі Кейстута. І вось запалала вогнішча. Шмат народу прысутнічала на пахаванні — прыехалі развітацца з князем з Трок, Жамойці, прыйшлі віленскія паганцы. Былі тут і крыжакі, уражаныя незвычайнасцю паганскага абраду. Толькі не праводзілі Кейстута да продкаў яго блізкія. Далёка ў Бярэсце, нічога не ведаючы пра смерць мужа, жыла Бірута. Недзе ў Жамойці хаваліся ад Ягайлавых слуг Кейстутавы сыны Таўцівіл, Патрыкій і Жыгімонт. За мурамі ў астрозе пакутаваў Вітаўт.

Гарэла полымя. Маўчалі прысутныя. Жалобу выказваў твар Ягайлы. Хто б мог здагадацца, што вялікі князь прыкідваўся, што ён радаваўся ў душы сваёй перамозе над небяспечным непрыяцелем. І толькі самыя набліжаныя да яго людзі ведалі, што паскакалі забойцы ў Бярэсце, каб утапіць у рэчцы Біруту, што ўжо многія Кейстутавы прыхільнікі паплаціліся галовамі.

Вось агонь спаліў памост, і ўсё жэглішча з трэскам паляцела ўніз у вырытую яму-магілу. Калі патухлі апошнія вуглі, жрацы сабралі попел, абгарэлыя косці і паклалі іх у труну.

Ягайла са світаю вярнуўся ў замак. Не пакідала яго думка: што рабіць з Вітаўтам? Забіць? Але гэта стане прамым дока-

*Рытуальная пабудова, на якой спальвалі памерлых язычнікі.

зам, што і Кейстут загінуў не ад сваёй рукі. А пакінуць брату жыццё небяспечна — не даруе ён забойства бацькоў, будзе помсціць. Князь хістаўся і... загадаў перавезці Вітаўта ў Крэва. Вязня трымалі ў тым жа склепе, дзе і Кейстута. Міналі дні, а Ягайла ўсё не вырашаў лёс Вітаўта. Відаць, нешта кранула Ягайлаву душу, і няпроста было яму даць загад забіць чалавека, з якім лучылі яго гады маленства ды юнацтва. Можа, успамінаў іх сумесныя дзіцячыя забавы, паляванні, сяброўскія сустрэчы. Дарагімі сэрцу былі тыя дні, а забіць Вітаўта — значыцца, выкрэсліць з памяці найшчаслівейшы час свайго жыцця. Не давала яшчэ, мабыць, спакою думка, што ён хаця і вялікі князь, але нягоднік і здрадца. Як бы высока ні ўзнесла ўлада, ды ён жыве сярод людзей, і перад тым, як прадстаць перад Богам, ці не адбудзецца людскі суд? А які ж можа быць прысуд братазабойцу?

УЦЁКІ

Ягайла сустрэўся са стрыечным братам. Знясілены і хворы, страціўшы надзею на вызваленне, Вітаўт прыніжана прасіў вялікага князя выпусціць яго з вязніцы, вярнуць Трокскае княства і абяцаў веру і праўдай служыць яму. Гэтая сустрэча пакінула цяжкае ўражанне ў Ягайлы. Ён хістаўся, быў разгублены і не ведаў, што і рабіць. Ягоную нерашучасць заўважылі. Ад Ягайлы ўпарта патрабуюць Вітаўтавай смерці — то маці Ульяна, то брат Скіргайла, то ўдава пакаранага Кейстутам Вайдылы княгіня Марыя. А яму шкада Вітаўта. Ён нават дапускае ў вязніцу ягоную жонку, княгіню Ганну, каб яна даглядала за хворым мужам.

Не адчапіліся ад Ягайлы тыя, хто прагнуў Вітаўтавай крыві, і ён не ўстаяў... З яго згоды княгіня Марыя паслала ў Крэва кашталяну Прокшы ліст, у якім загадала хутчэй расправіцца з Вітаўтам, бо Ягайла можа перадумаць. Пра падрыхтоўку забойства мужа выпадкова даведалася княгіня Ганна — пачула, як размаўлялі паміж сабою крэўскія воі: «Калі князь вялікі Вітаўт будзе сядзець тут далей, дык яго чакае тое самае, што і бацьку»[20]. Толькі самы цудадзейны выпадак мог дапамагчы ажыццявіць уцёкі, найменшая непрадбачаная выпадковасць — і ўсё... Ды княгіня верыла ў цуд.

Вітаўт, што пройдзе не адно кола зямнога пекла, загрубее душою, але прысутнасць Ганны будзе заўсёды змягчаць ягонае сэрца. «Жонка мае на яго вялікі ўплыў, але якая ж гэта жанчына! Рэдкасць і вялікае рэдкасць паміж Евінымі дочкамі. ...Ён знайшоў у ёй анёла-ахоўніка», — пісаў пра Ганну яе сучаснік Конрад Кібург[21].



Я.Кулік. Замак у Крэве. *Рэканструкцыя М.Ткачова*



Вялікая княгіня Ганна. *XVI ст.*

Ганна была другой Вітаўтавай жонкай. Першая, Марыя Лукомская, памерла пры родах дачкі Софіі ў 1376 годзе. Вітаўт, якога заўсёды хвалявала жаночая прыгажосць (не аднойчы падчас вайсковых паходаў ён кідаў войска і спяшаўся да чарговай каханкі), нядоўга насіў жалобу па Марыі — у наступным годзе ён ажаніўся з Ганнай, дачкой смаленскага князя Святаслава Іванавіча*. Новая жонка стала яго вернай спадарожніцай у жыцці. Яна і выратавала Вітаўта, «вырвала з рук Ягайлавых жывадзёраў»[22].

Угаварыла княгіня дапамагчы ёй нявесту Кейстутавага слугі Рыгора Амуліча, Алену, якая прыслугоўвала Вітаўту. І вось у адзін з восеньскіх вечароў Ганна разам з Аленай прыйшла да мужа. Вартавыя ўжо прызвычаіліся да іх наведванняў і цяпер нічога падазронага не заўважылі. У каморы Алена звярнулася да Вітаўта: «Князь, ты павінен як мага хутчэй уцякаць. Ягайла загубіць цябе, як загубіў Кейстута. Апрані маю адзежу, ды ідзі з княгіняй, а я застануся тут. Ужо цёмна, і ніхто не даведаец-

*Яе маці была дачкой князя Івана Альгімонтавіча Гальшанскага.

ца». Вітаўт запярэчыў: «Што ты кажаш? Ты ведаеш, што тады чакае цябе?» — «Ведаю, што мяне чакае, але маёй смерці ніхто не адчуе, а твая смерць была б няшчасцем для Літвы. Уцякай, князь!» Вітаўт адмаўляўся, і тады мужная дзяўчына адказала: «Я жадаю паслужыць радзіме — мне прыемна будзе памерці за Літву. Ты, вызваліўшыся, зробіш дзеля яе столькі добрага, дазволь і мне ўдзельнічаць у гэтым. Калі любіш Літву, дык паслухай мяне»[36]. Вітаўт прыняў Аленіну ахвяру, пераапрануўся ў яе вопратку.

Княгіня першай выйшла са склепа. Вітаўт, які быў невысокага росту, без барады, з доўгімі, да плеч, валасамі, у жаночай вопратцы не адрозніваўся ад жанчыны. У святле паходняў вартавыя не разгледзелі, што гэта князь. Яшчэ не верачы ў цуд, Вітаўт крочыў па цёмнаму падзямеллю і кожную хвіліну чакаў вокліку вартавых.

На двары стаяла ноч. Князь развітаўся з Ганнай. Нядоўгім было гэта развітанне — час прыспешваў. І не пацалаваць Ганну — што, калі хто ўбачыць і западозрыць нядобрае. Толькі некалькі слоў амаль шэптам — слоў удзячнасці і кахання... Ганна адправілася да сябе ў пакой, а Вітаўт па вяроўцы спусціўся са сцяны і па грудзі ў вадзе перайшоў роў. Воля! Ноч хавала ўцёкача ад вачэй варты. А ён спяшаўся адысці ад змрочнага замка, што, як прывід, узвышаўся за ягонаю спінаю. Раптам наперадзе раздаўся тупат конскіх капытоў, і з цемры наблізіліся постаці вершнікаў на конях. Як і папярэджвала Ганна, яго чакалі ваўкавыскія воі. Нага ў стрэмя — і князь ужо ў сядле. Шукай цяпер ягоных слядоў, Ягайла!

У бліжэйшым лесе Вітаўт пераапрануўся ў сухое адзенне — простае, не княжацкае, каб не прыцягваць увагу. І ў шлях! А куды? Каму патрэбны ён, ізгой, пазбаўлены бацькоўскай вотчыны? Хто прыме яго? Любарт, які толькі і трымаецца з дапамогі Вялікага княства і не адважыцца прыняць уцекача, каб не наклікаць на сябе Ягайлаў гнеў? Да Масквы, дзе шукаў сабе падтрымку Андрэй Полацкі, далёка — праз усю Літву дабірацца, і можна натрапіць на Ягайлаву заставу. У Ордэн таксама не падасіся, выдадуць яго крыжакі свайму саюзніку. Да Януша Мазавецкага, які жанаты на яго сястры Дануце? Але адзіны Бог ведае, як сустрэне яго сваяк. А болей падацца няма куды. Але трэба рызыкаваць.

Услед за Вітаўтам выехала з Крэва Ганна разам з сынамі Юрыем ды Іванам. Іх суправаджалі ашмянскія шляхціцы. Дзесьці ў лясах (а паданне распавядае, што гэта адбылося каля Малых Мажэйкаў, і ў памяць пра гэта Вітаўт пасля заснуе там славутую Маламажэйкаўскую царкву-мураванку) муж і жонка сустрэліся і падаліся ў Мазовію.

Толькі на трэці дзень вартавыя ў крэўскім замку выявілі падман. Угневаны Ягайла загадаў пакараць смерцю Алену, а за ўцекачамі паслаў пагоню. Але было позна — Вітаўт са сваімі паплечнікамі пакінулі межы Вялікага княства.

ІЗГОЙ

Як толькі ўцекачы апынуліся ў Мазовіі, іх узялі пад варту і адвезлі ў Мельнік. Тут яны правялі некалькі дзён, пакуль не прыехаў з Чэрска Януш. Як і чакаў Вітаўт, той без асаблівай радасці сустрэў яго. Паспрабаваў угаварыць Януша вярнуць яму занятыя Пабужжа і Панароўе, але той і слухаць не хацеў. Гэтыя землі, здабытыя зброяй і крывёю, цяпер належаць яму, Янушу, і без бою ён нікому іх не аддасць. Ну, дзякуй хоць, што не выганяў сваяк.

З цяжкасцю пазнала Данута свайго брата. Схуднелы, бледны твар, невясёлыя вочы. Вітаўт падоўгу маўчаў. Баляванні ў замку, ловы ў навакольных пушчах у яго гонар не радавалі князя. Шчырай размовы паміж братам і сястрою так і не атрымалася. Вітаўт папрасіў Дануту пагаварыць з мужам, каб той вярнуў захопленыя землі, але яна заявіла, што як Кейстутава дачка мае права на гэтыя землі. Не ўтрымалася, каб у запале не абвінаваціць брата — выдаў бацьку на смерць, не змог абараніць сваё княства. Чужым і адзінокім адчуваў сябе ў сваякоў Вітаўт. Не дапамогуць яны ў бядзе, на каго цяпер яму спадзявацца?

Уцёкі Вітаўта не давалі спакою Ягайлу. Прадбачыў вялікі князь, што рана ці позна стрыечны брат знойдзе сабе моцных заступнікаў і з іх дапамогай пачне адваёўваць Трокскае княства. Час трывожны. Па-ранейшаму не прызнаваў ягонай улады Полацк, Андрэй чакаў зручнага моманту, каб пачаць вайну за велікакняжацкі вянец. Непакоіла Залатая Арда. Яе новы хан Тахтамыш, як смерч, прайшоўся па Русі, пакідаючы пасля сябе папялішчы, захапіў і спаліў Маскву. Ці не надумаў ён паход і на Вялікае княства?

І тут нечакана прывезлі з Мазовіі ліст ад Вітаўта. Былы гарадзенскі князь прызнаваў Ягайлу вялікім князем літоўскім, абяцаў яму павінавенне і прасіў вярнуць Трокскае княства. Ды жах перад помстаю брата аказаўся мацнейшым за розум. Адмовіўшы Вітаўту ў тым, што таму належала па праву, Ягайла сам штурхнуў яго на вайну. Але цешыў сябе прывіднымі надзеямі. Тэўтоны — яго саюзнікі — не дапамогуць Вітаўту. А каб яшчэ болей прывязаць Ордэн да сябе, Ягайла пайшоў на немалыя ахвяры. Ён паслаў у Мальбарг вестуноў з прапановай

новаму магістру Конраду Цольнеру сустрэцца для перамоваў. Так здарылася, што адначасова з падобнай прапановай прыехалі ў Мальбарг і паслы ад польскага караля. Магістр адправіўся на сустрэчу з апошнім, а на перамовы з Ягайлам выехалі ордэнскі маршал Конрад Валенрод, лівонскі магістр Вільгельм Фрымерсгейм і лівонскі маршал Робін Эльц.

Ягайла са сваёй маці Ульянаю, братамі Скіргайлам, Карыбутам, Лугвеніем, Карыгайлам, Вігандам і Свідрыгайлам прыплыў 1 лістапада 1382 года на ладдзях па Нёману на месца сустрэчы — выспу на рацэ Дубіса, дзе яна ўпадае ў Нёман. Звернем увагу, што разам з Ягайлам былі сыны Альгерда ад Ульяны Цвярской, якая марыла аддаць уладу ў іх рукі і дамаглася адлучэння сыноў Марыі Віцебскай ад вырашэння дзяржаўных спраў.

Шэсць дзён доўжыліся перамовы з ордэнскімі пасламі. Ягайла быў згаворлівым, згаджаўся на ўсе патрабаванні, толькі б крыжакі не падтрымалі Вітаўта. Ордэн выпрасіў Заходнюю Жамойць да ракі Дубісы. Ягайла абяцаў таксама на працягу чатырох гадоў перавесці ў каталіцтва сваю дзяржаву, не нападаць на Прусію і Лівонію, дапамагаць Ордэну ў войнах і не весці самому вайны без узгаднення. У сваю чаргу крыжакі абяцалі не нападаць на Вялікае княства, дапамагаць Ягайлу таксама ў войнах. Абодва бакі засталіся задаволенымі: Ордэн нарэшце авалодаў часткай Жамойці, а Ягайла мог суцяшаць сябе думкаю, што крыжакі не падтрымаюць Вітаўта.

Хітры Ягайла лічыў сябе не абавязаным выконваць шэраг пунктаў дамовы. Так, не збіраўся ён прымаць каталіцкую веру, прысвячаць у свае задумы крыжакоў, а тым болей прасіць у іх згоды на войны. «Жадаючы ўтрымаць частку Жамойці, Ордэн воляй-няволяй будзе саступаць мне», — так, пэўна, думаў Ягайла. Упоўтай ад Ордэна збіраў ён войска, каб адваяваць у Мазовіі страчаныя землі. На пачатку 1383 года Ягайла распачаў вайну з Янушам Мазавецкім. Колькасная перавага літвінскіх войскаў, дзейсная падтрымка насельніцтва ды вайсковыя здольнасці Ягайлы далі добры вынік. Першым быў вызвалены Драгічын. Месцічы дамовіліся з Ягайлам пра сумесныя дзеі, і, калі літвіны ноччу рушылі на штурм, драгічане падпалілі замак, што аблегчыла яго ўзяцце.

Януш Мазавецкі знайшоў падтрымку ў крыжакоў. Заклаўшы Ордэну замак Візну, князь атрымаў 7 тысяч угорскіх залатых для наймання войска. Але гэта не выратавала яго. Падляшскія гарады Сураж, Мельнік, Камянец, Бельск расправіліся з мазавецкімі гарнізонамі і перайшлі на Ягайлаў бок. Берасцейшчына і Падляшша ўз'ядналіся з Вялікім княствам Літоўскім.

Ягайла радаваўся перамозе, а вось у Мальбаргу пахмурнелі твары магістра і яго саноўнікаў. Моцнае Вялікае княства ў яднанні сваіх зямель было небяспечным для Ордэна. Калі б зноў там успыхнула міжусобная вайна, калі б зноў брат пайшоў на брата, можна было б нямала выгадаць на сваю карысць. Пра лёс Вітаўта ў Мальбаргу ведалі. Вось той чалавек, які прынясе паходню вайны ў Вялікае княства. Застаецца пачакаць, калі ізгой прыніжана пахіліцца перад Ордэнам.

З КРЫЖАКАМІ СУПРАЦЬ ЛІТВЫ

Праз князя Януша Вітаўт даведаўся, што ў Ордэне да яго адносяцца прыхільна і гатовы дапамагчы. Януш паехаў у Прусію, дзе дамовіўся з маршалам Конрадам Валенродам аб прыездзе Вітаўта.

У Інстэрбургу Вітаўта сустрэў Валенрод. Разам і адправіліся ў Мальбарг да магістра. Што ён, ізгой, мог абяцаць Ордэну? Толькі вернасць і ўдзячнасць, толькі васальную залежнасць. «Навошта не шукаў, князь, саюзу з Ордэнам у той час, калі меў у сваіх руках Вільню?»[24] — здзекліва спытаў Вітаўта магістр. І князь прамаўчаў, ненавідзячы ў гэтую хвіліну болей усяго не крыжакоў, не Ягайлу, а самога сябе, што вось змірыў свой гонар, здрадзіў бацькавай памяці, ненавідзеў сваё бяссілле. Адчуваў ён адзіноту ў магістравым палацы, больш падобным на замак або вязніцу.

Магістр згадзіўся падтрымаць Вітаўта пры ўмове, што Трокскае княства будзе аддадзена Ордэну, а князь прызнае сябе ордэнскім васалам. Да Ягайлы прыбылі ордэнскія паслы з магістравай просьбаю вярнуць Вітаўту і ягонаму брату Таўцівілу хоць частку іх спадчынных земляў. Разам з тым магістр пачаў дакараць вялікаму князю, што той развязаў вайну з Мазовіяй без ведама і згоды Ордэна і тым самым парушыў дамову. Ягайла і сам стаў абвінавачваць Ордэн у парушэнні дамовы. У пасланні да магістра ён напісаў: «Атрымаў ваш ліст, у якім просіце аб прыняцці ў міласць нашую былых князёў літоўскіх, Вітаўта ды Таўцівіла, і аб выдзяленні ім часткі іх спадчыны, падумайце, ці можам мы выканаць просьбу, не маючы да тых князёў ніякага даверу. Гэта азначала б грэць гадзюку на сваіх грудзях; пры тым не можам не нагадаць вашай міласці, ці павінны вы прымаць і падтрымліваць уцекачоў. Што ж датычыцца да князёў мазавецкіх, з якімі ваша міласць жадае заключэнне намі перамір'я да Вялікадня, дык па сяброўству да вас мы гатовыя выканаць гэтае пажаданне... але нам здаецца дзіўным і не вартым, што вы дапамагаеце нашым ворагам і

непрыяцелям, у той час як мы абяцалі не толькі не перашкаджаць ні ў чым адзін аднаму, але адзін аднаму дапамагаць супраць усялякага ворага. Таксама просім вас, каб вы не стараліся прыцягнуць да сябе жамойтаў, бо яны падаліся нам і любаму нашаму брату Скіргайлу; і без таго ўжо маем мы шмат непрыемнасцей ад нашых людзей і ад літвінаў»[25]. Ягайла адназначна выказаў свае адносіны да Вітаўта: «Ніякага даверу».

А гэтага і чакаў Ордэн. Цяпер заставалася толькі знайсці падставу, каб разарваць мірную дамову з Вялікім княствам. Магістр назначыў Ягайлу на 21 мая 1383 года сустрэчу на ранейшым месцы: выспе на рацэ Дубісы. Ягайла з братамі і світай прыехаў туды і спыніўся на беразе рэчкі. Магістр прыплыў на караблях да Хрыстамемеля, што стаяў у трох мілях ад выспы, і запрасіў праз вестуна вялікага князя ў горад. Сваё запрашэнне магістр тлумачыў тым, што ягоны карабель не можа плыць па мелкаводдзю. Ягайлу насцярожыла просьба магістра прыняць вось цяпер каталіцтва, нешта падазронае адчуў князь у паводзінах крыжакоў і адмовіўся ехаць у Хрыстамемель: «Я ахвотна прыехаў бы да магістра, але баяры мне не дазваляюць»[26]. Абодва бакі затаілі ў душы нянавісць адзін да аднаго. Ордэн распусціў пагалоскі, што Ягайла па радзе сваёй маці хацеў захапіць магістра і ўсю ягоную світу. Гэта быў пачатак ідэалагічнай апрацоўкі Еўропы, каб завабіць да сябе паломнікаў. Хутка магістр разаслаў па Еўропе пасланне, у якім зваліў на Ягайлу віну за будучае кровапраліцце.

Да самога Ягайлы магістр прыслаў гнеўны ліст, ён заканчваўся пагрозлівым папярэджаннем: «Такое тваё сяброўства, якое чыніш нам узамен за нашыя паслугі, але мы не можам ужо далей трываць тваю фанабэрыю і тваю несправядлівасць. Ведай жа, Ягайла, ты і твае браты, што, не знаходзячы ў цябе ні веры, ні вернасці, мы адмаўляем табе ў нашым сяброўстве і з тых часоў, як пераканаліся ў тваім крывадушшы, ніколі ўжо не будзем з табою ў міры»[27]. Хаця Ягайла і не прымаў ордэнскіх абвінавачанняў, але ад гэтага лягчэй на душы ў яго не стала. Наперадзе была вайна.

Ягайла пачынае паспешліва сцягваць у Вільню дружыны. Жамойты падтрымлівалі Вітаўта, і таму магістр не сквапіўся на багатыя дары іхнім старэйшынам. Напрыканцы лета 1383 года пачаліся і вайсковыя дзеі. Крыжацкае войска 13 жніўня захапіла Трокі. Вітаўт вярнуўся ў родны дом, толькі не гаспадаром. Цяпер Трокі належалі крыжакам, а ён, Вітаўт, быў іх паслухмяным васалам. У пакоях, дзе некалі жыла дружная Кейстутава сям'я, загучала нямецкая мова. Немцы адчувалі сябе тут гаспадарамі. Вітаўт, нібы палонны, ахоўваўся крыжакамі. Кожны яго крок пад іх увагаю.



Мініяцюра з «Ліцавога Зводу». Паўстанне Вітаўта. *XVI ст.*

З-пад Трок крыжакі выступілі на Вільню. Тут перад самым горадам іх сустрэла войска Ягайлы. Тройчы ўцякалі з поля бою рыцары і кожны раз, сабраўшыся сіламі, ізноў ішлі ў наступ. Пасля жорсткай сечы ім удалося пацясніць літвінаў і ўвайсці ў віленскія прадмесці.

З болем глядзеў Вітаўт, як крыжакі і жамойты, якіх ён прывёў, змагаюцца супраць вояў, на чыіх сцягах такі знаёмы і любы яму віцязь на белым кані. Не да радасці тут. З абаронцы роднай зямлі ён стаў яе ворагам.

Вільню ордэнцы так і не ўзялі і адступілі ад яе. У крыжацкім абозе вяртаўся ў Прусію і Вітаўт. Родныя Трокі магістр яму так і не перадаў, там засталіся крыжакі, а ён, заложнік сваёй жа клятвы, вымушаны згадзіцца з уладай Ордэна над Жамойцю і не вольны цяпер крок ступіць без магістравай на тое

згоды. Што ж, так усё жыццё прыніжацца перад Ордэнам? Як вырвацца з гэтага становішча? Не ведаў князь як.

У замку Таплаве 21 кастрычніка 1383 года Вітаўт хрысціўся ў каталіцтва. Вось і веру ў яго аднялі, а ўзамен далі другую. З новай вераю імя чужое цяпер насіць яму — Віганд — як клічуць яго хроснага бацьку, рагніцкага комтура Віганда фон Балдэрсгейма. Чужынец роднай зямлі, якую паліў крывёю суайчыннікаў.

Паход крыжакоў на Літву быў безвыніковы. Праз месяц 3 лістапада Ягайла разам са Скіргайлам адваявалі Трокі і далучылі іх да Вялікага княства. А Ордэн бяздзейнічаў, хаця ў Прусію і прыехала шмат паломнікаў, якія праглі «подзвігаў». Як ні ўгаворваў Вітаўт магістра прадоўжыць вайну з Ягайлам — ніякага поспеху. Магістр спасылаўся на цёплую зіму, з-за якой сталі непраходнымі дарогі. Ды не ў дарогах справа. Магістр вёў з Вітаўтам хітрую гульню. Хай прынізіць свой гонар літвін, хай зразумее, што без ордэнскай падтрымкі ён ніхто, а калі зразумее, дык душой і сэрцам стане ордэнскім слугою. У роспачы Вітаўт рашаецца на новыя ахвяры і 30 студзеня 1384 года пацвярджае ранейшую дамову ды і яшчэ завяшчае перадаць усё Трокскае княства Ордэну пасля сваёй смерці. Пад гэтай граматай свае пячаткі паставілі князі Юрый Наваградскі*, Леў Друцкі і баяры Судэмонт з Вейшышак, Мілейка, Дорг, Рокут і іншыя. Факт, які сведчыў, што да Вітаўта пачалі прыходзіць літвінскія князі і баяры.

Нібыта ў насмешку з князя, а сапраўды каб болей заахвоціць Вітаўта на новыя ахвяры, крыжакі зрабілі дробны набег на Аўкштайцію. Вось і ўсё.

Наступны крыжацкі паход быў зроблены для пабудовы на месцы разбуранага Коўна моцнага замка Марыенвердэра — плацдарма для нападу на Аўкштайцію. Пад аховай вялікай ордэнскай арміі 60 тысяч людзей шэсць тыдняў працавалі дзень і ноч. За такі кароткі тэрмін на выспе пасярод Нёмана падняўся магутны замак з непрыступнымі сценамі і высокімі вежамі. «З дапамогаю такіх крэпасцяў, — задаволена ўскрыкнуў магістр, — знішчым Літву без ніякай цяжкасці»[28]. Прагаварыўся на радасцях магістр. Не, не дапамагаць Вітаўту вярнуць страчаныя землі збіраліся крыжакі, а знішчыць Літву. І ён, Вітаўт, з імі. На стагоддзі зганьбіць ён гэтым сваё імя.

Пакуль кіпела праца каля Коўны і цагліна за цаглінай падымаўся новы замак, некалькі атрадаў крыжакоў напалі на землі Вялікага княства. Адзін з такіх атрадаў пад зверхнасцю Вітаў-

---

*Юрый Наваградскі быў сынам Вітаўтава брата Войдата, былога Наваградскага князя.

тавага хроснага бацькі рагніцкага комтура Віганда Балдэрсгейма дайшоў да Кернава і з багатаю здабычаю вяртаўся назад. Ягайла ды Скіргайла з дружынаю дагналі крыжакоў і разбілі іх. У баі загінуў сам комтур і большасць яго рыцараў, астатнія трапілі ў палон. Занепакоены магістр, як толькі скончылася будаўніцтва Марыенвердэра, павярнуў у Прусію. Вітаўту ж ён выдаў грамату, у якой Ордэн абяцаў вярнуць князю ягоныя ўладанні, на што Вітаўт павінен быў пацвердзіць перадачу Трокскага княства пад ордэнскую ўладу.

Апошнія падзеі пераканалі Ягайлу, наколькі небяспечны для яго Вітаўт. Палітычная мудрасць падказвала — трэба забыцца на свае пачуцці і памірыцца з братам. Патаемна да Вітаўта прыязджаюць Ягайлавы паслы. Ягайла прапанаваў мір і абяцаў аддаць Трокскае княства.

Ці мог цяпер паверыць Вітаўт Ягайлу? Ці не задумаў той падман і здраду? Хацелася верыць, але жыццё навучыла абачлівасці. Ды вестуны ад вялікага князя пераконвалі Вітаўта ў добрых намерах свайго ўладара. І Вітаўт усё ж паверыў. Рызыкаваў ён многім, калі не ўсім, але і заставацца ордэнскім памагатым не мог.

На развітанне ён расквітаўся з Ордэнам і за свае прыніжэнні, і за гвалт з роднай зямлі, і за кроў суайчыннікаў. Ведаючы, што кожны ягоны крок цікаваўся ордэнскімі шпегамі, Вітаўт вырашыў перахітрыць крыжакоў. Ён папярэдзіў магістра, быццам атрымаў вестку пра намер Скіргайлы напасці на Прусію, таму жадае сустрэцца з ім у баі на літвінскай мяжы. Абрадаваны такім дбаннем Вітаўта пра ордэнскія інтарэсы, магістр дазволіў яму выехаць на мяжу.

12 ліпеня 1384 года з чатырма сотнямі вершнікаў Вітаўт пакінуў Прусію. У Жамойці ён падступіў з атрадам да крыжацкай цвержы Юрбарга. Спыніўшыся каля замка, Вітаўт запрасіў, нібыта для тэрміновай рады, комтура Дытрыха Крусцэ. Той з некалькімі рыцарамі прыехаў у Вітаўтаў стан. Князь паведаміў крыжакам, што Ягайла са Скіргайлам думаюць напасці на Рагніту. «Пашліце хутчэй вестку пра гэта ў тутэйшы гарнізон, а заўтра я сам прыйду на дапамогу», — мовіў Вітаўт. Цяжка было западозрыць у ягоных словах падман. Удзячныя рыцары запрасілі Вітаўта на вячэру ў замак. «Лепш я паеду на ловы ў бліжэйшы лес, — адмовіўся князь, — а з вамі няхай паразмаўляе ў замку мой сваяк, Судэмонт. Прышліце мне толькі некалькі лоўчых з сеткамі»[29]. Крыжакі пайшлі з Судэмонтам, якога суправаджалі некалькі вояў, у замак. На падвясным мосце літвіны раптам выхапілі зброю і напалі на немцаў. Тры рыцары тут жа былі забіты. А Вітаўт ужо павёў свой атрад на штурм. Па непаднятым мосце літвіны ўварваліся ў адчыненую

браму і авалодалі замкам. Комтура і рыцараў закавалі ў кайданы, замак разбурылі. Сярод палонных былі знатны рыцар Маркварда фон Зальцбах і граф Рэйнеке.

Такой жа хітрасцю Вітаўт захапіў і другі крыжацкі замак Баербург. Цяпер дарогі ў Ордэн у Вітаўта не было.

ТРЫУМФ ЯГАЙЛЫ

Без урачыстасцяў сустрэў брата Ягайла. Пра мінулае гаворкі не заводзілі. Што было — тое было, трэба думаць пра будучыню. Ягайла вырашыў здабыць Марыенвердэр. Восем тыдняў у Вільню збіраліся са ўсёй Літвы, Аўкштайціі і Жамойці баявыя дружыны. З гэтым войскам Ягайла і выступіў на крыжацкую цвержу. У абозе везлі абложныя машыны і гарматы, адлітыя майстрамі на ліцейным двары ў Вільні.

У канцы верасня Ягайла падышоў да Марыенвердэра. З першага дня пачаліся абложныя працы. Сотні вояў рабілі на дарогах у Прусію засекі. З лесу прывозілі на калёсах магутныя дрэвы і перагароджвалі імі Нёман, каб крыжакі не маглі даплыць на караблях да цвержы. Дзень і ноч, не ведаючы спакою, гарматчыкі — «людзі, што паказалі вялікае майстэрства ў гэтай справе» (словы самога магістра)[30], палілі з гармат. Вялікія каменныя ядры крышылі замкавыя сцены і вежы. Крыжакі адчайна супраціўляліся, адбілі некалькі прыступаў, самі рабілі вылазкі. Ім на дапамогу спяшыў маршал Конрад Валенрод. Ягайла з войскам перагарадзіў шлях. «Адважныя», калі справа датычылася рабавання мірных сёлаў, рыцары на гэты раз не рызыкнулі ўступіць у бой. Конрад Валенрод, спаслаўшыся на маразы, павярнуў сваё войска назад, кінуў абложаных адных.

Нарэшце гарматы прабілі ў сцяне праём. Крыжакі закрылі яго вялікай бамбардаю, але гарматы трапнымі стрэламі збілі і яе. Раніцою 25 кастрычніка літвіны рынуліся на штурм. Дзесяткі ладдзей, плытоў, лодак перавозілі іх на выспу, дзе стаяў замак. На ладдзях везлі драбіны, тараны, вялікія драўляныя шчыты, за якімі магло схавацца некалькі вояў. На галовы штурмуючых паляцеў град камянёў. Рой стрэлаў нёс смерць. Аднак штурм працягваўся. Да высокіх сцен ставіліся драбіны, і смельчакі лезлі ўгору. Першыя падалі пад ударамі крыжацкіх мячоў. У каваную жалезам браму забіў таран. Ахутаныя дымам, стралялі гарматы.

Загінуў комтур Генрых Клей. І калі крыжакі ўбачылі, як літвіны абкладваюць сцены дровамі і саломаю, каб запаліць іх, яны здалі замак. Угневаны ўпартым супраціўленнем, Ягайла асабіста адсек галаву аднаму з рыцараў і загадаў пакараць

смерцю некалькіх варожых вояў. А між тым ён абяцаў абаронцам падарыць жыццё — вось чаго каштавала Ягайлава слова.

Марыенвердэр быў узяты. Ордэн пацярпеў вялікія страты: загінула 450 братоў-ордэнцаў і мноства простых ратнікаў, 55 ордэнскіх рыцараў (для параўнання: у Неўскай бітве загінула 50 рыцараў), 250 свецкіх рыцараў, 1500 крыжакоў трапіла ў палон. Усе надзеі магістра на хуткую заваёву Вялікага княства праваліліся.

Гэта бы трыумф Ягайлы. Ён замірыўся з Вітаўтам, з ягонаю дапамогаю авалодаў трыма крыжацкімі замкамі, якія служылі плацдармам для нападу на Трокскае і Вялікае княствы, пад сваю руку прыбраў Вітаўтавы землі, а пасля Любартавай смерці і Валынь. З гэтага часу лёс павядзе Ягайлу да вяршынь улады і славы. А Вітаўта чакаў нялёгкі пакручасты шлях выпрабаванняў, паражэнняў і перамог.

Ягайла вярнуў Вітаўту на ленных правах Трокскае княства, але ў тым жа 1384 годзе забраў Трокі — відаць, пайшоў на кампраміс з незадаволеным іх стратай Скіргайлам. Але такім чынам ён падмануў Вітаўта, той застаўся толькі гарадзенскім князем. Асцерагаючыся помсты стрыечнага брата, Ягайла ўзяў з яго клятву не высылаць ні да каго паслоў і не дамагацца бацькавых уладанняў. Той клятвай Ягайла ставіў Вітаўта ў поўную залежнасць ад сябе, пазбаўляў усялякай палітычнай самастойнасці. Але і гэтага здалося яму мала. Вітаўтаў двор у Гародні наваднілі Ягайлавы шпегі, якія даводзілі свайму гаспадару пра кожны крок гарадзенскага князя. З адной няволі Вітаўт трапіў у другую.

Вырашыўшы праблему з Вітаўтам, адкінуўшы ад межаў Вялікага княства крыжакоў, Ягайла надумаў пабрацца з польскай каралевай Ядвігай. Яшчэ год таму Ульяна Цвярская хацела ажаніць свайго сына з дачкой Дзмітрыя Данскога Софіяй. Перамовы Ульяны з маскоўскім князем закончыліся нічым. Хаця Ягайла і абяцаў ахрысціць у праваслаўе паганцаў, аднак Дзмітрый пыхліва патрабаваў ад яго васальнай залежнасці, каб ён прызнаў сябе «малодшым братам». На такую ўмову Ягайла не згадзіўся. І вось з'явілася магчымасць узяць шлюб з Ядвігай.

Пасля смерці караля Людовіка Угорскага, які ўладарыў і ў Польшчы, польскай каралевай стала ягоная дачка Марыя, жонка маркграфа брандэнбургскага Жыгімонта IV*. Аднак і ўгорцы абвясцілі сваёй каралевай Марыю. Палякі, якія не жадалі, каб Польшча ўвайшла ў склад Угорскага каралеўства, прасілі ад удавы Людовіка, каралевы Альжбэты, прыслаць у Кракаў дру-

*Сын імператара Свяшчэннай Рымскай імперыі Карла IV.

гую яе дачку — дванаццацігадовую Ядвігу. Польская шляхта, паны, князі і святарства падзяліліся: хто стаяў за Жыгімонта, хто за Ядвігу, а хто за нашчадка Пястоў — мазавецкага князя Земавіта. Галоўным аргументам у гэтай спрэчцы была зброя. Пачалася міжусобная вайна. І толькі прыезд Ядвігі замірыў варожыя бакі. 15 верасня 1384 года ў Кракаве адбылася каранацыя. Але каралеве патрэбны быў кароль, які па сутнасці стаў бы ўладаром Польшчы. Ядвіга яшчэ ў дзяцінстве заручылася з аўстрыйскім герцагам Вільгельмам. Палякі і чуць не жадалі пра немца за польскага караля. Частка магнатаў і шляхты прапаноўвала князя Земавіта, другія сталі на бок яшчэ аднаго нашчадка Пястоў — Уладзіміра Апольскага, які быў ужо жанаты, але гатоў быў развесціся дзеля каралеўскай кароны. Аднак існавала яшчэ адна партыя — яна і павяла перамовы з Ягайлам. Вялікі князь літоўскі і рускі, уладар магутнейшай ва Усходняй Еўропе дзяржавы — вось чалавек, які мог выратаваць Польшчу ад заняпаду, вярнуць ёй страчаныя землі. У саюзе з Літвой бачылася многім палякам выратаванне Польшчы.

Да Ягайлы ў Крэва прыязджаюць з Кракава паслы і прапануюць пасватацца да Ядвігі. Зіхаценне каралеўскай кароны не асляпіла Ягайлу — велікакняжацкі вянец даваў яму магчымасць валодаць зямлёй удвая большай за Польшчу, і не ад самалюбства згадзіўся ён стаць польскім каралём. Кіраваўся ён жыццёвымі інтарэсамі: аб'яднаныя пад ягонаю ўладаю Польшча і Вялікае княства Літоўскае і Рускае маглі нарэшце разбіць свайго спрадвечнага ворага — Ордэн, адкінуць ад сваіх межаў ваяўнічых татараў. Дый, зразумела, лепш самому валодаць Польскім каралеўствам, чым дапусціць туды немца Вільгельма Аўстрыйскага, якога падтрымліваў Ордэн, або мазавецкага князя Земавіта, з якім Ягайла ваяваў. Нічога добрага для Вялікага княства, калі хто з іх стане польскім каралём, не чакалася. Ягайла згаджаецца на ўмовы палякаў: з праваслаўя перайсці ў каталіцтва, злучыць Вялікае княства з Польшчаю ў адну дзяржаву, вярнуць польскіх палонных, адваяваць польскія землі, захопленыя суседзямі, заплаціць каралеве Альжбэце 200 000 чырвонцаў, абяцаных ёй бацьку герцага Вільгельма*. 14 жніўня была заключана дамова, якую гісторыкі назавуць Крэўскай уніяй. Пад граматай свае пячаткі паставілі Скіргайла, Карыбут, Лугвен і Вітаўт.

---

*Паколькі не захавалася арыгінала дамовы і яе тэкст вядомы паводле хронікі Яна Длугаша, дык ёсць меркаванне, што ўмовы Крэўскай уніі былі сфальсіфікаваны палякамі (Юхо І. Крыніцы Беларуска-Літоўскага права. Мн., 1991. С. 179—189.)

Так Ягайла ўключыўся ў барацьбу за польскую карону. Яго галоўны аргумент — сіла. З вялікім войскам ён напаў на Мазовію, землю аднаго з прэтэндэнтаў на руку Ядвігі — князя Земавіта. Мазуры ў жаху ўцякалі ў Завіхвосцкі замак. Ягайла з воямі ўплаў пераправіўся цераз Віслу і акружыў Завіхвост. Упэўнены ў перамозе вялікі князь вымавіў: «Не трэба нам гэты горад здабываць гарматамі»[31], — і загадаў закідаць замак паленнем, а пасля падпаліць яго. У агне загінулі сотні людзей. Такая жорсткасць павінна была напалохаць палякаў, стаць ім напамінкам пра пагрозлівага суседа з Усходу, прывесці да думкі, што адзіны сродак вызваліць сваю краіну ад крывавых паходаў літвінаў — гэта запрасіць на каралеўства Ягайлу.

Пасля Завіхвоста літвіны спалілі горад Апатаў. Толькі 9 міль не дайшоў Ягайла да Кракава і павярнуў назад. Падобны «паказ вайсковай сілы» астудзіў галовы многіх польскіх магнатаў і шляхціцаў. Яшчэ адзін такі паход — і ўся Усходняя Польшча пакрыецца папялішчамі гарадоў і сяліб. Выратаванне адно — выбраць Ягайлу сваім каралём. Цяпер вялікі князь з поўнай надзеяй на поспех у пачату 1385 года паслаў сватоў да Ядвігі. Узначаліў пасольства Скіргайла, разам з ім у Кракаў адправіліся суздальскі князь Барыс, жанаты на Ягайлавай сястры Агрыпіне, гальшанскі князь Альгімунт і віленскі староста Ганул.

Паглядзець на паслоў пагрозлівага літвіна ў каралеўскі палац сабралася ўся краса польскага дваранства, вышэйшае святарства*. Наіўная Ядвіга, якая верыла, што заручынамі з Вільгельмам яна назаўжды злучыла сваё жыццё з аўстрыйскім герцагам, не падазравала, што ў гэтыя хвіліны вырашаўся яе лёс і не ёй прыйдзецца выбіраць, а вось гэтым разадзетым у шытую золатам вопратку панам, што ліслівa ўсміхаліся ёй, лавілі яе позіркі. Ганарліва сядзела яна на каралеўскім троне і, не паказваючы сваёй цікавасці, глядзела на літвінаў. Уразіла, што па шыкоўнасці адзення, дарагім упрыгожанням яны не саступалі яе прыдворным. Паслы прывіталі юную каралеву па ўсходняму звычаю — білі чалом. Пасля таго як герольды зачыталі прывітальныя граматы, слугі паднеслі княжацкія дары. Успыхнулі вочы каралевы, убачыўшы тое багацце. Скіргайла праз перакладчыка звярнуўся да каралевы: «Ужо шмат цесараў, каралёў і князёў хрысціянскіх прагнулі ды імкнуліся ўзяць шлюб пасмяротнага сваяцтва з вялікім князем літоўскім, Ягайлам Альгердавічам. Але выкананне гэтага намеру ўсемагутны Божа захаваў дзеля асобы вялікае каралеўскае вялікасці. Падначальваючыся такому выратавальнаму нечаканаму лёсу Божаму, згадзіцеся, ваша каралеўская міласць, прыняць нагаданага вя-

*Гэта адбылося 12 лютага 1385 года.

лікага князя літоўскага сабе ў мужы; калі гэта выканаеце, учыніцца адсюль вялікая слава Божая, выгода душэўная, гонар чалавечы і магутнасць каралеўства»[32]. Далей Скіргайла падрабязна распавёў пра абяцанні Ягайлы прыняць каталіцтва, «сваімі сродкамі і асабістымі намаганнямі ўсе страты і шкоды, панесеныя польскаю каронаю, што кімсьці была адарвана або захоплена, вярнуць, вызваліць палонных палякаў, заплаціць 200 тысяч аўстрыйскаму герцагу і свае літоўскія і рускія землі на вечныя часы далучыць да кароны польскай дзяржавы»[33]. Можна ўявіць радасць палякаў, калі яны пачулі такія шчодрыя абяцанні ад Ягайлы. Магнаты ўявілі сябе ўласнікамі новых земляў на Літве і Русі. Шляхта цешылася думкаю, што ад такога падатлівага літвіна-прастака можна лёгка патрабаваць новых прывілеяў. Святарства прасякнулася пачуццём апостальскай місіі — прынесці веру каталіцкую ў язычніцкую Літву і атрымаць багатыя прыходы. Ці мог такое абяцаць Уладзімір Апольскі або жабрак Земавіт, які клянчыў пад залог сваіх земляў грошы ў Ордэна? Якая гаворка. Сэрцы палякаў былі куплены. Ды вось шкада: дрэнна палякі ведалі Ягайлу. Ён і Ордэну шчодра абяцаў, і Кейстуту, і Вітаўту — і ўсіх падмануў. Можна і Польшчы абяцаць залатыя горы, каб толькі завалодаць ёю.

Каралева Ядвіга ў адказ мовіла, што яна павенчана з аўстрыйскім герцагам і абяцала захаваць яму вернасць. Казала, а лёс яе ўжо быў вырашаны. Які там герцаг аўстрыйскі! Якая там вернасць яму! Трэба было схіліць каралеву на шлюб з Ягайлам і дамагчыся згоды на гэта яе маці. Да Альжбэты ва Угорыю адправілася пасольства на чале з суздальскім князем Барысам і з Вігандам, іх суправаджалі знатныя польскія саноўнікі. Цяпер ужо Барыс паведаміў Альжбэце пра жаданне многіх цесараў, каралёў і князёў парадніцца з Ягайлам, і што сам лёс выбраў дзеля гэтага Ядвігу. Паўтораны былі і шчодрыя Ягайлавы абяцанні. Хаця Альжбэта адразу сцяміла выгоду ад шлюбу яе дачкі з Ягайлам, але не спяшалася з адказам. Гандаль дачкою павінен быў выглядаць прыстойна. Некалькі дзён мінула, а каралева не давала адказу. За справу ўзяліся палякі і пачалі даводзіць Альжбэце, што каралеве трэба прыняць Ягайлаву прапанову, бо для Польшчы вельмі выгадны саюз з Вялікім княствам. А хрышчэнне літвінскіх паганцаў прынясе карысць усяму свету. І Альжбэта згадзілася: «Няхай юная каралева Ядвіга і польскія вяльможы робяць у гэтых адносінах так, як таго патрабуе выгода Рэчы Паспалітай хрысціянскай і польскай»[34]. Яна нават адправіла паслоў да Ягайлы, якія разам з Барысам і Вігандам ад'ехалі з Буды.

Пакуль паслы ездзілі туды-сюды, у Кракаве паны і святары ўгаварылі Ядвігу пайсці пад вянец з Ягайлам. Яна — каралева



Ядвіга. *1888 г.*

і павінна думаць пра пажытак і карысць свайго каралеўства, а таму трэба згадзіцца на шлюб з вялікім князем літоўскім. Святары, ведаючы набожнасць Ядвігі, цешылі каралеву аповядамі пра славу і гонар хрышчэння апошніх паганцаў у Еўропе. Да іх угаворванняў далучыўся голас простага люду, які прасіў каралеву пазбавіць Польшчу ад Ягайлавых набегаў.

А з другога боку праціўнікі Ягайлы на чым свет лаялі яго перад каралевай. Дзікун, паганец, клятваадступнік, забойца свайго стрыя мучыў у вязніцы стрыечнага брата, сам неразумны, гультай. Спіць у ложку да апоўдня, гадзінамі сядзіць за сталом і набівае свае чэрава. Усе справы дзяржаўныя за яго вырашае маці, а выконвае Скіргайла. Не ўмее ні чытаць, ні пісаць. Як кожная нікчэмнасць, любіць сябе; упарты і гнеўны, жорсткі і падазроны. І вось з такім страшыдлам каралева хоча злучыць свой лёс! Пасля падобных аповядаў няшчасная дзяўчына з жахам думала пра сумеснае жыццё з Ягайлам. Яе добразычліўцы адправілі вестуноў у Аўстрыю, запрашаючы Вільгельма хутчэй прыехаць у Кракаў.

А ў Кракаве пачаўся сойм. У гарачых спрэчках вырашалася, быць Ягайлу польскім каралём або не быць. І хаця многія са шляхты падтрымлівалі вялікага князя, аднак знаходзіліся і такія, хто з самалюбівых памкненняў бліснуць розумам працівіліся абранню Ягайлы. Прагучала на сойме і імя Вітаўта як найболей вартага прэтэндэнта на карону. «Вядома, што Ягайла чалавек малога розуму, просты, не падобны на караля. Куды варты кароны Вітальд, сын мужнага Кейстута. Лепш яму аддаць Ядвігу і скіпетр», — прапанавалі Вітаўтавы прыхільнікі. У адказ яны пачулі пераканаўчы для шляхты довад: «Што датычыцца малога розуму Ягайлы, дык усім, сапраўды, пра гэта вядома. Але менавіта дзякуючы яго недалёкаму розуму ён будзе больш прыдатным каралём, чым Вітальд, лёгка згодзіцца на пашырэнне льгот і правоў шляхты»[35]. (Вось жа доля: для аднаго ягоныя недахопы сталі галоўнымі вартасцямі, а для другога вартасці — недахопамі.) Гэты довад і багаты хабар уцішылі крыкуноў, і сойм абвясціў польскім каралём Ягайлу. Ужо напрыканцы чэрвеня 1385 года польскія і ўгорскія паслы прыехалі да Ягайлы ў Крэва. Тут, у сваім радавым замку, 15 жніўня Ягайла ў прысутнасці Скіргайлы, Карыбута, Лугвенія і запрошанага сюды Вітаўта пацвердзіў усе сваю шлюбныя абяцанні.

Прыехалі польскія паслы і да Вільгельма. Ягоны бацька герцаг Леапольд Гамбургскі і не думаў адмаўляцца ад польскай кароны для свайго сына. Ён паспяшаўся ва Угорыю, дзе разам з Уладзімірам Апольскім схіліў каралеву Альжбэту не перашкаджаць шлюбу Вільгельма і Ядвігі. А сама польская каралева абрадавалася вестцы, што яе нарачоны выправіўся ў Кракаў. Бацькоўскі запавет выйсці за Вільгельма як бы вызваляў яе ад рашэння сойма.

Вільгельм спяшаўся апярэдзіць Ягайлу і са шматлікаю світаю прыбыў у Кракаў. Прыхільнікі Ягайлы ўстрывожыліся. Кракаўскі кашталян Дабеслаў Куражэнік не пусціў Вільгельма ў замак. Тады Ядвіга сустрэлася з нарачоным у Францысканскім манастыры. Малады герцаг упершыню за тыя гады, калі ў дзяцінстве іх абручылі, убачыў сваю нявесту і закахаўся ў яе. Цяжка было ўстаяць перад прыгажуняю, пра якую казалі ва ўсіх еўрапейскіх дварах. І герцаг спадабаўся каралеве. Шчаслівыя закаханыя нават забыліся пра тую небяспеку, што пагражала ім разлукаю. Некалькі разоў сустракаліся яны ў тым жа манастыры, але не на імгненне не маглі застацца сам-насам, заўсёды побач былі прыдворныя.

А барацьба за карону працягвалася. Ягайлавы прыхільнікі перацягнулі на свой бок Уладзіміра Апольскага — па дамоўленасці Альжбэты і Леапольда ён павінен быў устроіць шлюб іх дзяцей. Апольскі, землі якога захапілі крыжакі, спадзяваўся,

што Ягайла можа іх адваяваць назад, і ў назначаны дзень шлюб паміж Ядвігай і Вільгельмам так і не адбыўся. Прыхільнікі Вільгельма вырашылі патаемна ўвесці герцага ў замак да каралевы, пакінуць яго там, а пасля завяршыць іх кароткае сумеснае пражыванне шлюбам. Тады ўжо Ягайла расстанецца з надзеяй ажаніцца з Ядвігай.

Як і задумвалася, Вільгельм пранік у замак і сустрэўся са сваёй каханай. Яго суправаджала світа з некалькіх чалавек, якія павінны былі выступіць як сведкі. Але той, хто быў прыстаўлены прыхільнікамі Ягайлы назіраць за каралевай, папярэдзіў іх пра з'яўленне ў замку Вільгельма. Тыя адразу ж схапіліся за зброю і падаліся ў пакоі каралевы. Пачуўшы крокі, змоўшчыкі спалохаліся. Ядвіга запрапанавала Вільгельму ўцякаць. Яго ў карзіне на вяроўках спусцілі з акна за замкавую сцяну. Так спадзяванні закаханых злучыць свой лёс не спраўдзіліся. Пасля гэтага выпадку кожны крок Ядвігі цікаваўся Ягайлавымі прыхільнікамі. З дня на дзень яны чакалі прыезду вялікага князя.

Чуткі пра маючы адбыцца шлюб Ягайлы з Ядвігаю і злучэнне Вялікага княства Літоўскага з Польшчаю дайшлі ў Мальбарг. Разгубленасць панавала сярод ордэнцаў. Палохала крыжакоў моц аб'яднаных у будучым дзяржаў. Уся веліч і слава Ордэна разаб'ецца аб іх вайсковы саюз. Абавязкова, любымі сродкамі перашкодзіць перадачу Ягайлу польскай кароны! Ордэн прымае бок Вільгельма і абвяшчае рашэнне польскага сойма незаконным. Магістр рассылае вестуноў па Германіі з паведамленнем, што Польшча імкнецца аб'яднацца з Літвою, каб самой стаць язычніцкай і знішчыць каталіцтва ў Прусіі, для выратавання хрысціянства неабходна паспяшаць на дапамогу Ордэну.

Пацягнуліся ў Прусію паломнікі са зброяй у руках. Ордэн не сквапіўся, гасцей частаваў сытна і паіў удосталь. Сам магістр Конрад Цольнер, які не асабліва любіў пакідаць свой надзейны замак, узначаліў паход. Напрыканцы жніўня 1386 года ордэнскае войска пераправілася цераз Нёман, абышло Коўна і спынілася над Нярысам. Невялічкая дружына троцкага князя Скіргайлы, якая абараняла пераправу, пасля жорсткага бою адступіла. Крыжакі перасеклі Нярыс і, пакідаючы пасля сябе крывавы след, прайшлі праз усю Аўкштайцію, уступілі ў Літву. Пад Меднікамі магістр даў шыкоўнае баляванне, на якім пасвяціў у рыцары тых, хто асабліва вызначыўся ў рабаванні і забойствах.

Ягайла з крэўскай, віцебскай і іншымі дружынамі, Вітаўт з гарадзенскай і Скіргайла з троцкай занялі пераправы цераз Нёман. Шлях да вяртання ў Прусію крыжакам быў адрэзаны.

Літвіны маглі перамагчы, калі б крыжакі не знайшлі двух здраднікаў, братоў Сурвілаў. Яны павялі ордэнскае войска ў абыход і ўказалі брод цераз Нёман.

Крыжацкі паход так і не прымусіў Ягайлу прасіць міру ў Ордэна і адмовіцца ад польскай кароны. Позняй восенню Ягайла выехаў у Польшчу. Польскія паслы сустрэлі яго 12 студзеня 1386 года ў Ваўкавыску. Ад іх ён даведаўся пра сваё абранне польскім каралём, а таксама пра тое, што яму «даручаюць» Ядвігу «дзеля злучэння з ім вянчаннем законнага шлюбу»[36]. Змаганне за польскую карону Ягайла выйграў.

З Ваўкавыска Ягайла ў акружэнні світы адправіўся ў Кракаў. Суправаджалі яго троцкі і полацкі князь Скіргайла, суздальскі князь Барыс, мсціслаўскі князь Карыгайла, кернаўскі князь Вігунд, Свідрыгайла, Юрый Слуцкі, Іван Белзскі, Міхайла Заслаўскі, Хведар Луцкі. Узяў з сабою Ягайла сваіх пісараў, музыкаў, дойлідаў, мастакоў, кухараў, лоўчых, конюхаў — словам, усе свае Крэўскі ды Віленскі двары. На шматлікіх вазах везлі дарагія падарункі каралеве і польскім саноўнікам.

Ехаў у Ягайлавай свіце і Вітаўт. Не гонар выказаў яму вялікі князь, а ўзяў з сабою, каб мяцежны брат быў на ягоных вачах. Так спакайней.

ЯГАЙЛА — ПОЛЬСКІ КАРОЛЬ

Чым бліжэй пад'язджаў Ягайла да Кракава, тым большы адчай валодаў Ядвігай. Няўжо наканавана ёй стаць жонкаю гэтага дзікуна? І яна адважылася ўцячы з каралеўскага замка да свайго каханага, абвянчацца з ім і ўжо разам вярнуцца назад. Тады ніхто не разлучыць яе з законным перад Богам і людзьмі мужам. У адзін з дзён каралева разам з купкай сваіх прыхільнікаў накіравалася да замкавай брамы. Там яе сустрэла варта і не прапусціла. Раззлаваная каралева спытала: «Хто ж забараніў?» — «Вяльможы», — пачула яна ў адказ. — «І мне забаронена? Каралеве? Падайце сякеру», — загадала Ядвіга і, атрымаўшы сякеру ў роспачы стала збіваць з брамы замок[37]. Аднак прыбеглі вяльможы і з угаворамі адвялі Ядвігу ў пакоі. І да самага прыезду жаніха яны ўвяшчалі, настаўлялі, малілі яе згадзіцца на шлюб з Ягайлам. Заслуга перад царквою, сусветная слава, выгода Польшчы, любоў да яе палякаў.

А ў Сандаміры Ягайлу сустракаў пасланнік Ядвігі — Завіша з Алесніцы. Ён павінен быў распавесці ёй пра Ягайлу, яго знешнасць, нораў, паводзіны. Убачыў ён перад сабою чалавека сярэдняга росту, стройнага, з неспакойным поглядам чорных вачэй. Выцягнуты твар, высокі лоб, глыбокія залысіны, доўгія

танклявыя вусы пад прамым носам — не прыгажун, але і не пачвара, як казалі пра яго. Гаварыў князь груба і рэзка, але разам з тым часта ўсміхаўся, і з-за гэтай частай усмешкі можна было ўспрыняць яго як дабрадушнага прастака. Каб развеяць усе сумненні, Ягайла запрасіў Завішу з сабою ў лазню, і там Ядвізін пасланнік пераканаўся, што ніякіх выродлівасцей у князя няма. Задобраны багатымі падарункамі, Завіша паспяшыў у Кракаў і супакоіў Ядвігу, што ў «Ягайлы цела складнае і прыстойнае, погляд вясёлы і твар зусім не брыдкі, як тое іншыя кажуць»[38]. Заспакоеная гэтым паведамленнем, Ядвіга нарэшце саступіла перад патрабаваннямі саноўнікаў і згадзілася на шлюб з Ягайлам.

12 лютага 1386 года Ягайла ўехаў у Кракаў, а праз другую браму пакідаў польскую сталіцу няшчасны Вільгельм.

Яшчэ ні разу Кракаў не бачыў падобных урачыстасцей. Натоўпы гараджан, магнатаў, шляхты, што з'ехаліся з усёй Польшчы, высыпалі на вуліцы горада і радаснымі крыкамі віталі свайго будучага караля: «Vivat Rex, vivat Pater Patriae!»* Білі званы ў касцёлах, на плошчах гучала музыка, развяваліся сцягі. Вялікага князя акружылі польскія саноўнікі і суправодзілі ў замак. Там яго ўжо з хваляваннем чакала Ядвіга. Убачыўшы сваю будучую жонку, Ягайла не здолеў стрымацца ад здзіўлення перад яе прыгажосцю. Лёс і сапраўды выбраў яго сваім улюбёнцам: дараваў каралеўскі вянец і першую прыгажуню Еўропы. Наступным днём Вітаўт, Свідрыгайла і Барыс паднеслі каралеве ад імя яе будучага мужа падарункі. Ягайла нібыта вырашыў уразіць палякаў сваім багаццем. Нават на Вавелі не хапіла месца, каб размясціць прывезеныя ім скарбы, і давялося наняць у горадзе дзве камяніцы. Як высветлілася пазней, «схільная да святых спраў» Ядвіга не была абыякавай да зіхацення злата ды карункаў, і сэрца яе памягчэла.

Усё адбывалася сваёй чарадой. Праз два дні Ягайла перахрысціўся ў каталіцтва. Ён атрымаў новае імя Уладзіслаў (у праваслаўі быў Якавам), па імені свайго хроснага бацькі апольскага князя Уладзіслава. Разам з Ягайлам хрысціліся Вігунд (у праваслаўі Хведар, а ў каталіцтве Аляксандр), Карыгайла (у праваслаўі Васіль, а ў каталіцтве Казімір), Свідрыгайла (у праваслаўі Аляксандр, а ў каталіцтве Баляслаў). Скіргайла, стаўшы полацкім князем, прыняў праваслаўе і застаўся ў гэтай веры, добра разумеючы, што яго, каталіка, палачане выдаляць з Полацка, як некалі прагналі, калі ён быў паганцам. Засталіся ў праваслаўі і Хведар Луцкі, Іван Белзскі, Міхайла Заслаўскі, Васіль Пінскі. Перайшоў з праваслаўя ў каталіцтва Вітаўт, ат-

*Вітаем караля, вітаем бацьку Айчыны.

рымаўшы імя Аляксандр. Падобную змену веры ён зрабіў, верагодна, пад прымусам Ягайлы. Такое меркаванне тлумачыцца наступнымі разважаннямі. Вітаўт княжыў у Гародні, і таму адной з умоваў прызнання гарадзенцамі яго сваім князем было спавяданне праваслаўя. Пасля вяртання ад крыжакоў Вітаўт зноў перахрысціўся ў праваслаўе. Візантыйскі імператар Эмануіл II з гэтай нагоды прыслаў яму абраз Божай Маці. І вось Вітаўт міжволі памяняў веру сваіх падданых. А выпадак са Скіргайлам у Полацку — добры прыклад, чым гэта магло скончыцца.

Яшчэ раз давялося Вітаўту здрадзіць самому сабе, калі па просьбе Ягайлы ён даводзіў Ядвізе, што яе будучы муж не вінаўны ў смерці Кейстута. Вось так крок за крокам Ягайла пазбаўляў Вітаўта волі і годнасці.

18 лютага Ягайла і Ядвіга пайшлі пад вянец. Калі святары злучылі Ягайлу абручальным пярсцёнкам з Ядвігай, той нават прамовіў камплімент: «З усіх скарбаў свету — гэты пярсцёнак каштоўнейшы для мяне скарб»[39]. У той жа дзень «новы ўладар і апякун кароны польскай» абнародаваў грамату, якая змяшчала ў сабе ўсе галоўныя пастановы будучага каралеўскага кіравання. На радасць шляхце Ягайла абяцаў ёй новыя прывілеі. Гэтым дакументам Ягайла аслабляў сваю каралеўскую ўладу і ўмацоўваў шляхту. А гэта ёй і трэба было. Так Ягайла стаў «адпрацоўваць» сваё званне польскага караля. Пасля некалькіх гадоў праўлення Польшчаю, калі ён адчуе цяжар кароны, калі яго на кожным кроку будуць настаўляць то паны, то святарства, то шляхта, Ягайла гнеўна заявіць: «Я вас ужо прасіў, каб вы ўзялі сабе сваю карону і дазволілі мне вярнуцца ў маю родную Літву. Гэтага патрабую ад вас і сёння»[40].

Разам са шляхтаю мог парадавацца і Вітаўт, бо Ягайла пацвердзіў яму перадачу Гарадзенскага княства і Падляшша. Ды не вялікая гэта радасць: Трокі заставаліся ў Скіргайлы. Яму, відаць, Ягайла і перадасць уладу ў Вялікім княстве. А ён, Вітаўт, суцешыцца ўдзелам з былой бацькоўскай дзяржавы.

Надышоў і дзень каранацыі 4 сакавіка. Калі архібіскуп надзеў карону на галаву новаму каралю — Уладзіславу, той прысягнуў, што выканае ўмовы Крэўскай дамовы і ахрысціць Літву па каталіцкаму абраду.

У Еўропе з непрыязнасцю паставіліся да новага караля. «Як хабар аддалі палякі Ядвігу паганцу», — зласловілі ў Ордэне[41]. «Права Ягайлы на польскую карону заснавана на праве прадажнасці і грошай»[42], — казалі ў Вене. А польская шляхта з удзячнасцю і радасцю прымала шчадроты ад свайго ўладара. «За ўкрадзеныя некалі ў Польшчы жупаны кароль дае палякам новыя», — хвалілі яны Ягайлу. «Якія дзівосныя, разнас-



А.Зайкоўскі. Шлюб Ягайлы з Ядвігай. *1882 г.*

тайныя дары падалі на кракаўскіх вяльмож, што былі задораны золатам, срэбрам, прыбытковымі пасадамі, канямі, мноствам каштоўнасцей і багатых тканін»[43], — хадзілі пагалоскі па Еўропе. Не, Ягайла яшчэ не звар'яцеў, каб так бяздумна раскідвацца скарбам. Калі палякі падкупілі яго польскай каронай, дык і ён падкупліваў іх. Трэба было паклапаціцца пра будучыню. І рассыпаў шчодраю рукою злата. «Падкупіў» ён і нядаўніх сваіх праціўнікаў у барацьбе за карону Уладзіміра Апольскага і Земавіта Мазавецкага, парадніўся з імі. Дачка Апольскага, Ядвіга, узяла шлюб з Ягайлавым братам Вігундам-Аляксандрам, а Земавіту аддаў кароль у жонкі родную сястру Аляксандру.

ПАЎСТАННЕ АНДРЭЯ ПОЛАЦКАГА

Пакуль Ягайла аб'язджаў Польшчу, на Літве Андрэй Полацкі са зброяй выступіў супраць яго. Яшчэ раней «кароль полацкі» вёў перамовы з Лівонскім ордэнам і прасіў у крыжакоў падтрымкі, а за гэта прызнаваў над сабою ордэнскую ўладу. Дзейнічаў Андрэй так, як некалі і Вітаўт. Ордэн «заступіўся» і за гэтага ізгоя. Заключыў Андрэй Полацкі дамову і са смаленскім князем Святаславам Іванавічам, які марыў вярнуць сабе Оршу і Мсціслаўль. Разам яны і пачалі...

На Літве палыхала вайна. Андрэй Полацкі з крыжакамі захапіў Лукомль і звёў у палон 3000 чалавек. Са Смаленска выступіў Святаслаў Іванавіч, абклаў Оршу, але ніяк не мог ёю авалодаць. Раззлаваны смаленскі князь паліў жывымі ў будынках людзей, саджаў іх на палю, абліваў варам і смалою. Ягайла адправіў Скіргайлу і Вітаўта падаўляць паўстанне. Быў аб'яўлены збор войска з усёй Літвы. Без ахвоты вёў сваю дружыну Вітаўт. Разумеў ён Андрэя Полацкага (сам жа некалькі гадоў таму быў у такім становішчы) і спачуваў яму. Гэта ягоны саюзнік у барацьбе з Ягайлам, а вось даводзіцца ваяваць супраць яго, лезці пад мячы, і ўсё дзеля Ягайлы, яго супакою. І супраць цесця, Святаслава Іванавіча, па Ягайлавай волі давядзецца падымаць зброю. А той, не авалодаўшы Оршаю, вярнуўся ў Смаленск, папоўніў шэрагі дружыны новымі воямі і перад самым Вялікаднем з'явіўся перад Мсціслаўем. Смаленцы абклалі горад і пачалі з парокаў разбіваць гарадскія сцены.

Скіргайла і Вітаўт падаспелі, якраз калі пачаўся штурм. Святаслаў Іванавіч вырашыў даць ім бой і ўшыхаваў сваю дружыну ў баявы стан. Вітаўт, Скіргайла, Лугвеній і Карыбут на вайсковай радзе мовілі: «Мы не зрабілі яму ніякага зла, а ён, быўшы з намі ў міры, парушыў хроснае цалаванне і дамову,

ваюе нашую зямлю і кроў хрысціянскую пралівае; мы ідзем на яго, спадзеючыся на Бога і на сілу хрысціянскую»[44].

Бітва адбылася ў нядзелю 29 красавіка, на беразе рэчкі Вехры. Смаленская дружына была разбіта. Сам Святаслаў Іванавіч загінуў ад дзіды нейкага воя. Сыны князя Глеб і Юрый трапілі ў палон. Глеб застаўся ў палоне ў Вітаўта, які паслаў яго ў Гародню пад хатні нагляд, а Юрыя Скіргайла, што валодаў лекарскімі ведамі, пачаў лячыць ад ранаў. Пасля Скіргайла і Вітаўт пайшлі пад Лукомль, дзе засеў Андрэй Полацкі, і ўзялі прыступам горад. Захоплены ў палон Андрэй Полацкі быў адпраўлены ў Польшчу. Ягайла закаваў яго ў кайданы і кінуў у вязніцу Хенцынскага замка. Яшчэ адзін Ягайлаў супраціўнік быў пераможаны — не спраўдзіліся спадзяванні Ордэна пасеяць міжусобіцу ў Вялікім княстве.

Толькі пасля таго як Скіргайла абяцаў захоўваць непарушнасць полацкіх правоў і вольнасцей, палачане ўпусцілі яго ў горад. Здаўся без бою і Смаленск. На Смаленскі пасад сеў Юрый Святаславіч. За падаўленне паўстання Ягайла міласціва ўзнагародзіў Скіргайлу і актам ад 28 красавіка 1387 года зацвердзіў за ім Полацкае княства. А вось Трокі Вітаўту не вярнуў.

ХРЫШЧЭННЕ ЛІТВЫ

Неўзабаве пасля перамогі над Андрэем Полацкім, у кастрычніку 1386 года, Ягайла разам з Ядвігай выехаў на Літву выканаць «апостальскую місію» — хрысціць паганцаў. Караля суправаджалі гнезненскі, кракаўскі, познаньскі архібіскупы, магнаты і шляхта. На вазах везлі розныя тавары і вырабы — своеасаблівы хабар, каб падкупіць сэрцы паганцаў якім-небудзь кавалкам сукна і зрабіць іх згаворлівымі ў прыняцці каталіцтва.

У пачатку 1387 года Ягайла дабраўся да Вільні і склікаў у лютым сойм, на якім прысутнічалі Вітаўт, Карыбут, Вігунд і польскія магнаты. На гэтым сойме пастанавілі: «Усіх прыродных літвінаў, абодвух палоў і ўсякага звання, да веры каталіцкай і да паслужніцтва святой рымскай царквы далучыць і нават прыняволіць, да якой бы веры яны раней не належалі»[45]. Але гэтая пастанова датычылася толькі паганцаў. Ягайла, як высветлілася, зусім не імкнуўся выконваць свае абяцанні літаральна. Так, праваслаўных ён не прымушаў прымаць каталіцтва. Дзеля заахвочвання паганцаў Ягайла 20 лютага выдаў прывілей, па якому той, хто пераходзіў у каталіцтва, атрымліваў права распараджацца сваёй маёмасцю, а таксама лёсам сваіх

дачок і сваячніц — маглі выдаваць іх замуж па сваёй волі, жонкі наследавалі ў выпадку смерці сваіх мужоў іх маёмасць.

У Вільні было заснавана каталіцкае біскупства з сямю прыходамі — у Медніках, Мейшаголе, Вількаміры, Нямеччыне, Крэве, Гайне і Абольцах. Біскупства атрымаў францысканскі манах Андрэй Васіла, які яшчэ раней прапаведаваў у Літве слова Божае сярод паганцаў.

Цяпер можна было прыступаць і да хрышчэння. Паганцы, аднак, заявілі, што не здрадзяць запаветам продкаў і не пакінуць сваіх багоў. Гэта не спыніла Ягайлу, ён загадаў заліць свяшчэнны агонь Зніч, што гарэў у паганскім храме ў даліне Святарога. Пагас агонь, і апанаваныя жахам паганцы ўбачылі, што богі не ўгневаліся на такую дзёрзкасць, не ўдарылі перуны, не пакаралі тых, хто асмеліўся лінуць ваду на Зніча. «О, як моцны Бог Ляхаў, знішчаюць нашых багоў, а яны нічога злоснага зрабіць не могуць, вось калі б хто з нашых так зрабіў, пэўна, без суровай кары не абышлося», — казалі паганцы[46]. Са слязьмі на вачах глядзелі яны, як разбуралі іх святыні. Спазнаўшы бяссілле сваіх багоў перад руплівымі каралеўскімі слугамі, паганцы заявілі, што згодны хрысціцца.

Праз некалькі дзён, калі некаторых з іх так-сяк пазнаёмілі з асновамі веры, з малітвамі і сімваламі, іх пачалі хрысціць. Неафіты атрымлівалі суконныя кашулі і нагавіцы. Гэтым і падкупіў Ягайла паганцаў — яны натоўпамі спяшаліся ў Вільню атрымаць адзежу, а хто хітрэйшы, дык прыходзіў «хрысціцца» па некалькі разоў. Паганцаў дзялілі на мужчын і жанчын, і кожны натоўп акрапляўся святою вадою ды атрымліваў адно на ўсіх імя.

Некалькі месяцаў Ягайла са сваёй світай раз'язджаў па Аўкштайціі, Дзяволтве і Нальшчанах, дзе тлумачыў паганцам, што за веру яны прымаюць*. Так было ахрышчана 30 000 чалавек. Хаця і тут Ягайла падмануў палякаў: не паехаў з імі ў Верхняе Панямонне, не хрысціў там літвінаў. Толькі ў 1405 годзе Тураўскі біскуп Антоній са згоды Вітаўта ахрысціў Верхненёманскую Літву ў праваслаўе. Як растлумачыць падобныя дзеі Ягайлы? Верагодна, ён жадаў «падстрахавацца» на выпадак няўдачы. Ягоны шлюб з Ядвігай, а значыць, і законнасць атрымання польскай кароны не прызнаваў папа рымскі. Не зміры ўся са стратаю польскага каралеўства Вільгельм, які апеляваў да папы і да Ордэна. Не быў упэўнены Ягайла, што палякі не

---

*Паколькі літвіны не разумелі польскую мову прапаведнікаў, пазней з Кракава прыехалі на Літву бенедыкціны, якія спраўлялі каталіцкую службу на царкоўнаславянскай мове. Першым цэнтрам бенедыкцінаў на Літве стаў Наваградак.

расчаруюцца ў ім, і тады — вяртанне ў Вялікае княства. На такі выпадак трэба было мець апору ў барацьбе за велікакняжацкі вянец. Ну, з праваслаўнымі ён мог паразумецца, зноў перайсці ў праваслаўе, ды і гвалту над іх верай не чыніў. А вось паганцы? Таму ён і не пайшоў у Верхненёманскую Літву (а яна ўваходзіла ў Крэўскае княства), не стаў разбураць там капішчаў і гнаць літвінаў-паганцаў у каталіцтва, не настроіў, такім чынам, іх супраць сябе.

ІЗНОЎ ІЗГОЙ

Вяртаючыся ў Кракаў, Ягайла пакінуў пасля сябе ў Вялікім княстве намесніка — Скіргайлу «а трымаць мне яго вышэй іншай браціі»[47], узнагародзіўшы яго за падаўленне паўстання Андрэя Полацкага новымі ўладаннямі: Менскам, Прапошскам, Ігуменам, Лагойскам, Свіслаччу, Бабруйскам, Рэчыцай. З надзеямі на вярхоўную ўладу ў Вялікім княстве Вітаўт развітаўся. Ясна, якую ролю адвёў яму Ягайла — удзельнага князя, васала Скіргайлы. З такім становішчам ён не хацеў мірыцца. А Ягайла глядзеў на Вітаўта як на свайго слугу. У жніўні таго ж 1387 года ён паслаў яго адваёвываць захоплены венграмі Галіч. Пад началам Вітаўта ў паход ішлі харугвы князёў Юрыя Белзскага, Хведара Ратненскага, Васіля Пінскага, Грыцькі Слуцкага, Сымона Сцяпанскага і Хведара Любартавіча. Штурмам горада не ўзялі, тады Вітаўт ад каралеўскага імя абяцаў кашталяну замка багатыя ўладанні на Русі і схіліў таго здаць горад. Гэтая перамога не радавала Вітаўта. Быць выканаўцам чужой волі — якая тут радасць.

Каб неяк заспакоіць Вітаўта, Ягайла «да волі сваёй» перадаў яму ў 1388 годзе Луцкую і Уладзімірскую землі. Быў у гэтым наданні і палітычны разлік — выдаліць Вітаўта з Гародні падалей ад Прусіі. Мала таго, дык пад ціскам Ягайлы і Скіргайлы Вітаўт зноў перайшоў у праваслаўе. Таксама спадзяваліся яны, што праваслаўны князь не будзе шукаць падтрымкі ў Ордэна. Аднак наступныя падзеі пацвердзілі асцярогу караля наконт Вітаўта. У Луцк, дзе ў гэты час жыў Вітаўт, прыехаў старэйшы сын маскоўскага князя Дзмітрыя Іванавіча Васілій. Два гады ён, захоплены падчас пасольства ў Залатую Арду, жыў у няволі ў Тахтамыша, які патрабаваў за яго выкуп у 8 000 рублёў. Нарэшце князю ўдалося ўцячы з Арды на Падолле, адтуль праз Малдавію ён дабраўся да Кракава. Па дарозе на радзіму Васілій завярнуў у Луцк да Вітаўта. Падставай для наведання апальнага князя паслужыла сватанне да Вітаўтавай дачкі Софіі. Вітаўт згадзіўся на гэты шлюб, і маладыя былі заручаны. Безумоўна, не толькі пра будучае вяселле раз-

маўлялі князі, але і пра саюз паміж сабою. Пры садзейнасці мітрапаліта Кіпрыяна яны заключылі патаемнае пагадненне. Гэтыя сустрэчы ў Луцку ўстрывожылі Ягайлу, і ён пазбавіў Вітаўта Луцка і Уладзіміра, не даў сваёй згоды на шлюб Софіі з Васілём, а некалькіх Вітаўтавых баяр звязеніў і выпытваў у іх пра намеры мяцежнага князя. Але мала было Ягайлу аслабіць свайго праціўніка, трэба было трымаць яго ў сваіх руках. Кароль забараніў Вітаўту зносіцца з Масквою. За кожным Вітаўтавым крокам цяпер пільна цікавалі Ягайлавы віжы. Князю не дазвалялі высылаць пасольства за мяжу Літвы. Поўная ізаляцыя ад усяго свету. У Вітаўтава брата Таўцівіла быў забраны Наваградак, а ў бліжэйшага паплечніка князя Івана Гальшанскага — Гальшаны.

А Скіргайла дык і не ўтойваў, што жадае забіць або атруціць Вітаўта і яго сям'ю. Падтрымка праваслаўных феадалаў, якія, нягледзячы на Скіргайлаў буйны нораў, любілі яго за прыхільнасць да праваслаўя, надавала князю рашучасці, і ён прагнуў расправіцца з Вітаўтам. «Нават дзіця маё, маю дачку, не дазволена мне было выдаць замуж, за каго я жадаў, баючыся, каб я такім чынам не набыў сяброў і аднадумцаў, хаця многія суседнія князі прасілі яе рукі. Адным словам, я быў нібыта нявольнік ва ўладзе Ягайлы, а брат ягоны, Скіргайла, уладар маіх родных Трок, рабіў замах на маё жыццё», — прызнаваўся Вітаўт пазней крыжакам[48]. Верыць далей Ягайлу — значыць, пасіўна чакаць сваёй смерці. Кароль не хацеў і слухаць скаргі Вітаўта. Ягоных паслоў кароль кінуў у вязніцу, ад іх пад пакутамі вымагалі прызнання аб Вітаўтавых намерах. Што заставалася яму, як не рыхтавацца да барацьбы з Ягайлам. Ён дае прывілеі яўрэям і заручаецца падтрымкай багатых яўрэйскіх абшчын у Гарадзенскім княстве. З мэтаю прыцягнуць да сябе каталіцкіх святароў дорыць віленскаму біскупству землі. Акружае сябе феадаламі, незадаволенымі Скіргайлам.

Скіргайла, «па натуры сваёй смелы і люты, хуткі ва ўсім — на язык, на руку, на справу»[49], без перапынку весяліўся ў Троках. Баючыся атруты, ён загадваў, каб віначэрпій першы піў з дзежкі, а пасля ўжо Скіргайла са сваімі прыяцелямі асушалі чашу за чашай. Напіўшыся, ён траціў розум, выхопліваў шаблю і ў шаленстве сек ею тых, хто трапляў яму пад руку. Наступным днём сам лячыў параненых застольных прыяцеляў. Вось так праходзілі дні Скіргайлы.

Ягайла ж атрымаў з Рыма грамату, у якой ягоны шлюб з Ядвігай прызнаваўся папай. Сэрца караля салодка замірала ад папскай пахвалы. «Сярод усіх каралёў зямлі табе належыць першае месца ў пачуцці ўдзячнасці святой Рымскай царквы,



Гравюра з «Хронікі Еўрапейскай Сарматыі» А.Гваньіні.
Скіргайла. *1578 г.*

маці нашай! Вітаем цябе, узлюблены сын, верны слуга, які за справы свае атрымаў вартую ўзнагароду, вянец зямной велічы і, вядома, з часам атрымаеш вянец нябесны. Суцяшай сябе, сын, што мог загінуць з цэлым народам, як схаваная каштоўнасць, ты знойдзены! Суцяшай сябе ў глыбіні тваёй душы, што такая вялікая слава ходзіць па ўсім свеце праз дзеі твае і што ты, такі любезлівы і мілы, знаходзішся ў зіхаценні славы ва ўлонні маці-царквы»[50]. Як не закружыцца галава пасля такіх пахвал.

І вось ужо злятаюць з Ягайлавых вуснаў дакоры Ядвізе, вось ён ужо абвінавачвае сваю жонку ў нявернасці, у патаемных сустрэчах з Вільгельмам. Даведзеная абразамі да адчаю Ядвіга не хоча бачыць мужа. Польскія паны, устрывожаныя магчымым разрывам шлюбу, ледзь прымірылі караля і каралеву. Прымірыць прымірылі, а вось пазбавіць Ягайлу падазрэнняў у Яд-

візінай нявернасці не пазбавілі. Цяжкім стала для Ядвігі жыццё з чалавекам, які не любіў яе, не давяраў, а часта і абражаў.

Гэта асабістае жыццё новага польскага караля, а вось у палітычнай дзейнасці ён «развярнуўся». Далучыў да Польшчы Галіцыю і Валынь. Ягайлавы прыхільнікі атрымалі там багатыя ўладанні. Земавіту Мазавецкаму быў падараваны Белз з прадмесцямі. Кракаўскі ваявода Спытка атрымаў частку падольскіх земляў, некалі вызваленых навагрудцамі ад татараў. Холмскія землі Ягайла падзяліў паміж тымі, хто запрасіў яго на польскае каралеўства.

Не мог спадабацца галіцка-валынскім феадалам такі гандаль іхняю радзімаю. Былі незадаволены таксама сыны валынскага князя Любарта. А ў Слуцку паўстаў супраць Ягайлы князь Грыцька Канстанцінавіч. Паўстанне было задушана, і Грыцька апынуўся ў няволі. Але іскра ўпала на глебу незадавальнення, каб успыхнуць пажарам мяцежу. Гэта ўсё ўлічыў Вітаўт. Улічыў ён і тое, што ў Полацку і Віцебску паўсталі супраць Ягайлы месцічы. Вітаўт вырашыў пачаць вайну з каралём.

Дзесьці ў сярэдзіне 1389 года ён сабраў у Гародні сваіх паплечнікаў: братоў Таўцівіла і Жыгімонта, князёў Юрыя Белзскага, Івана Гальшанскага, баярына Судэмонта Вейшышскага і іншых — і са скрухай наракаў на тое, што чужынцы авалодалі Літвой, а Ягайла «ў Вільню прыслаў старосту свайго лядцкага, чаго раней не бывала ў Літоўскай зямлі»[51]. Толькі падліў масла ў агонь. Тыя самыя пачуцці — крыўда і злосць на Ягайлу — ахоплівалі астатніх. Раздаліся галасы, што трэба авалодаць Вільняю і абвясціць вялікім князем Вітаўта. Але сіл для гэтага было мала, і Вітаўт пайшоў на хітрасць. Было вырашана, што ён прывядзе ў сталіцу абоз з дровамі, пад якімі на вазах схаваюцца воі.

Неўзабаве выпаў зручны момант. Напрыканцы года пачаліся хваляванні ў Полацку, і Скіргайла адправіўся супакойваць палачан. У Вільні астаўся кіраваць ад яго імя Карыбут. Вітаўт з Крэва, дзе ён жыў пад наглядам Ягайлавых служак, выехаў у Гародню, каб адтуль выступіць на сталіцу. Але Карыбута нехта папярэдзіў аб Вітаўтавым намеры*, і, калі абоз, дзе пад дровамі хаваліся змоўшчыкі, пад'ехаў да Вільні, яго акружылі. Змоўшчыкі здаліся на міласць Карыбуту. Задуманае не здзейснілася.

Пакінуўшы ў Гародні ды Бярэсці моцныя атрады, князь разам з сям'ёю і блізкімі адправіўся ў Мазовію да князя Януша. Гісторыя паўтарылася: зноў ізгой, зноў той шлях, па якім уцякаў з Крэўскай вязніцы. Януш і на гэты раз адмовіўся падтрымаць Вітаўта войскам. Адмовіўся гэта зрабіць і Земавіт. Заставалася яшчэ адна надзея — на ... Ордэн.

---

*Гэта нібыта быў баярын Судэмонт.

НАДЗЕЯ НА ПЕРАМОГУ

Хаця Вялікае княства Літоўскае і было цяпер хрысціянскай дзяржаваю і місія «распаўсюдніка хрысціянства» ў Літве для Ордэна скончылася, але ні магістр, ні рыцары не думалі складаць зброю і прысвячаць сябе малітвам. Наадварот, Ордэн яшчэ з большым жаданнем пачынае рыхтавацца да вайны з Вялікім княствам. Так, не пераканаўшы папу ў незаконнасці шлюбу Ягайла з Ядвігаю, Ордэну воляй-няволяй давялося пайсці на мірныя перамовы з польскім каралём. Патрабаванні, якія прад'яўлялі крыжакі, а менавіта: вызваліць усіх ордэнскіх падданых, што трапілі ў палон, не нападаць на ордэнскія землі і быць у саюзе з Ордэнам — Ягайла не прыняў. Адразу ж пасля гэтых перамоваў магістр даносіў папе Урбану VI, што Ягайла падманвае Ордэн і ўсё хрысціянства, што трэба штодня чакаць павароту ад хрысціянства палякаў і літвінаў і папу належыць дапамагчы Ордэну, бо ён знаходзіцца ў вялікай небяспецы. Між тым магістр набіраў за грошы польскіх вояў з паморскіх земляў для вайны з «князем літоўскім, які прызнае сябе польскім каралём». А падставай для вайны паслужыў выпадак у Мазовіі.

У ліпені 1388 года Вітаўт са сваёй гарадзенскай дружынаю, а таксама і Карыбут суправаджалі Ягайлу ў паездцы па Мазовіі. Па дарозе на іх напалі крыжакі з замка Візна. Вітаўт і Карыбут у адказ захапілі замак. Ордэн гэтага толькі і чакаў. Магістр данёс папе пра здраду Ягайлы. Восенню 1388 года Ордэн распачаў вайну. Але да Візны ордэнскае войска не пайшло, а напала на Жамойць. Скіргайла з кернаўскім князем Вігундам выступілі супраць крыжакоў, але так і не здолелі спыніць іх. Крыжакі спустошылі землі паміж Нявежаю і Дубісою. Цяпер, вырашыўшы, што Ягайла стане згаворлівым, магістр зноў запрапанаваў яму сесці за перамовы. У дзень Тройцы 1389 года ў горадзе Нейдэнбургу Ягайлавы паслы Земавіт Мазавецкі, біскуп познаньскі Дабрагост сустрэліся з ордэнскімі пасламі, якіх узначальваў маршал Конрад Валенрод. Ордэн высунуў ранейшыя ўмовы. І маглі б дамовіцца з крыжакамі, калі б тыя не сталі дамагацца прызнання правоў, дараваных Ордэну папскімі граматамі і імператарскімі прывілеямі. Земавіт і Дабрагост заявілі, што не ведаюць, якія такія правы павінен прызнаць Ягайла за Ордэнам. Ордэнскія паслы выцягнулі стос грамат, у тым ліку і шэсць падробленых «Міндоўгавых», дзе гаварылася, што Міндоўт, папы Інакенцій IV і Аляксандр IV, імператар Фрыдрых II даруюць Ордэну права валодаць язычніцкімі землямі, якія яны заваююць зброяй. «Цяпер мы ясна бачым, што Ордэн вядзе вайну з Ягайлам зусім не

дзеля каталіцтва, а дзеля авалодання Літвою», — адказалі Ягайлавы паслы і пакінулі Нейдэнбург[52].

Тым часам князь Януш, які ездзіў у Кракаў да Ягайлы, каб прымірыць яго з Вітаўтам, прыслаў у Чэрск вестуноў папярэдзіць княгіню Ганну, што трэба хутчэй пакідаць Мазовію. У пачатку 1390 года Вітаўтава сям'я ў суправаджэнні Жыгімонта Кейстутавіча прыбылі ў Прусію. Сваякі Вітаўта выступілі паручыцелямі ў ягоных шчырых намерах памірыцца з Ордэнам дзеля саюзу супраць Ягайлы ды Скіргайлы. Спакуса зноў выкарыстаць Вітаўта ў барацьбе з Ягайлам была настолькі вялікай, што магістр не толькі забыўся пра ягоную здраду, але ахвотна прапанаваў пазычыць 30 000 коп грошай пад залог Жамойці. Усю сям'ю і бліжніх Вітаўта крыжакі, як заложнікаў, размясцілі па розных замках. Княгіню Ганну з Софіяй і Вітаўтаву сястру Рынгалу зачынілі ў Крэмцінскім замку, двух малалетніх Вітаўтавых сыноў Івана і Юрыя трымалі ў Кралеўцу (Кёнігсбергу). Паплечнікі Іван Гальшанскі і Юрый Белзскі знаходзіліся ў Маругенскім замку. Глеб Святаславіч сядзеў у Мальбаргу. Цяпер калі Вітаўт і задумаў быздрадзіць Ордэну, дык за гэта паплаціліся б ягоная сям'я і блізкія яму людзі.

У Гародню, дзе ў гэты час знаходзіўся князь, прыбылі ордэнскія паслы. 19 студзеня 1390 года Вітаўт заключыў саюз з Ордэнам. Умовы былі ранейшыя. Вітаўт прызнаваў сябе ордэнскім васалам. Неўзабаве маршал Конрад Валенрод прывёў у Гародню крыжакоў.

Галоўны ўдар Ордэн разлічваў нанесці летам, таму ўжо зімою крыжакі вербавалі па Германіі паломнікаў. Неабходна было забяспечыць мір з Польшчаю. «Польская карона заўсёды можа разлічваць на нашу любоў», — улагоджваў Ягайлу магістр Конрад Цольнер[53]. Толькі б Польшча не дапамагала Вялікаму княству, толькі б не выступіла супраць Ордэна! Адбываецца некалькі сустрэч з польскімі дзяржаўнымі мужамі, на якіх многа гаворыцца пра мір, пра любоў да Польшчы і падносяцца палякам каштоўныя падарункі. Конрад Валенрод у лістах не скупіцца на ласкавасці Ядвізе: «Цяпер толькі на цябе, усеміласцівейшая панна, уладальніца кароны польскай, на цябе надзея наша»[54].

Пагаліўся на ордэнскае золата заўжды бедны князь Земавіт, а за ім і калішскі ваявода Тапорчык. Паморскія князі ацанілі Ягайлаву галаву ў 500 грыўнаў і абяцалі дабыць яе і падараваць Ордэну.

Дзейнічаў і Ягайла. З польскім войскам ён выступіў на Гарадзенскае княства і захапіў Бярэсце і Камянец. З-за недахопу харчавання частка войска вярнулася ў Польшчу. Ягайла з

тысячным атрадам падышоў да Гародні, дзе ў замку зачыніліся Вітаўтавы воі і крыжакі. На дапамогу каралю прыслаў некалькі атрадаў Скіргайла. Ад князя Уладзіміра прыйшла кіеўская дружына. З Наваградка-Северскага прыбыў Карыбут.

Гародня апынулася ў цесным коле Ягайлавых войскаў. Пачалася аблога. Бесперапынна абстрэльваўся з бамбардаў замак. Мноства абаронцаў было забіта і паранена. Ягайлавы атрады штурмам завалодалі прадзамчам. Цяпер бамбарды білі прама па замку. Цяжкасці выпалі і на долю Ягайлы. У лагеры пачаўся голад. Коней кармілі лістотай ці старой саломай, якую здымалі з дахаў дамоў. Тым часам на вызваленне сваёй сталіцы прыйшоў з ордэнскім войскам Вітаўт. Стаўшы на другім беразе Нёмана супраць замка, ён пачаў насыпаць земляны пагорак і ўзводзіць на ім новую крэпасць.

Каб падтрымаць абаронцаў замка харчамі і зброяй, вывезці адтуль параненых і хворых і папоўніць гарнізон новымі воямі, Вітаўт загадаў наладзіць мост. Цераз раку працягнулі жалезны ланцуг, на якім замацавалі лодкі. З Ягайлавага боку ў адказ ссеклі некалькі магутных ялін і пусцілі іх па рацэ. Гэты таран, падхоплены хуткай плынню, разарваў ланцуг і раскідаў лодкі. Патанула некалькі лодак з крыжакамі, што спрабавалі спыніць таран. Адзін з іх, нягледзячы на крыкі сваіх таварышаў, якія пераконвалі яго патануць, але не здацца ў палон, выбраўся на бераг, дзе знаходзіўся каралеўскі стан. Гэты крыжак і распавёў Ягайлу пра размяшчэнне крыжацкага войска і паведаміў, што гэтай ноччу Вітаўт надумаў адступіць ад Гародні.

Так яно і здарылася: Вітаўт з крыжакамі адступіў, выдаў сваіх вояў у замку на расправу Ягайлу. Пакінутыя без дапамогі абаронцы замка здаліся. Усё Вітаўтава княства цяпер належала Ягайлу. У гарадах ён паставіў польскія гарнізоны. Але заставалася яшчэ Жамойць. Вітаўт адправіўся туды і схіліў жамойцкіх старэйшых заключыць саюз з Ордэнам. Жамойцкія паслы ў маі прыбілі ў Кёнігсберг, дзе іх ласкава прынялі ордэнскія саноўнікі. Жамойты прызналі ўладу Ордэна, але пад началам Вітаўта, якога яны назвалі сваім кунігасам. Крыжакі ж тытулавалі Вітаўта каралём жамойцкім. Але асаблівую радасць адчуў Вітаўт, калі даведаўся, што «горад Полацк паддаўся яму»[55]. Спраўджваліся спадзяванні, што літвіны, незадаволеныя здрадай Ягайлы Літве, падымуцца супраць яго. Можна было змагацца з Ягайлам. Надзею на перамогу Вітаўт не згубіў.

ПАХОД НА ВІЛЬНЮ

За ўсімі гэтымі падзеямі надышло лета. У Прусіі сабралася шмат паломнікаў. Прыйшлі англійскія стралкі з графам Генрыхам Дэрбі, будучым англійскім каралём Генрыхам IV. Славуты французскі рыцар Бусіка прывёў змагароў з Францыі. Нямецкіх рыцараў узначаліў маркграф Фрыдрых. Крыжацкае войска налічвала каля 52 000 вояў, і ўзначаліў яго маршал Энгельгард Рабэ. Мэтаю паходу быў захоп Вільні і ўзвядзенне на велікакняжацкі пасад Вітаўта. Такім чынам Ордэн спадзяваўся разарваць унію Вялікага княства і Польшчы пад Ягайлаваю ўладаю.

Скіргайла з літвінамі стаў на беразе Нёмана каля Коўны. Маршал Рабэ, даведаўшыся пра гэта, пераправіўся цераз раку ў другім месцы. Князь рушыў за крыжакамі і каля Вільні на беразе Віліі 27 жніўня дагнаў ворага. Літвіны, не вытрымаўшы агню крыжацкіх гармат, адступілі да Трок. У палон трапілі князі Сямён Заслаўскі, Глеб Чартарыйскі, Іван Цеця, Леў Плаксіч і інш. Перамогу крыжакі адсвяткавалі шумным баляваннем.

Тут, каля Вільні, да прускіх рацараў далучыліся лівонскія браты па крыжы на чале з магістрам Вільгельмам Фрымерсгейскім. Аб'яднаўшыся, крыжакі павярнулі да Трок, якія пакінуў Скіргайла, і захапілі месца.

4 верасня ордэнскае войска ізноў падышло да Вільні. Усе віленцы, разбурыўшы свае дамы, пахаваліся па навакольных лясах, а хто зачыніўся ў віленскіх замках. У паўночнай частцы Вільні ўзвышаўся на Крывой гары Вышні замак, пабудаваны яшчэ Гедымінам. Унізе, каля гары, на месцы старажытнага Крывыграда, знаходзіўся драўляны Крывы замак, які разам з літвінамі абаранялі і палякі. Быў узведзены на хуткую руку і трэці замак — яго абараняў Скіргайла. Гэтыя замкі і акружылі крыжакі. Скіргайлаў замак узялі ў аблогу прускія рыцары на чале з Энгельгардам і англійскія лучнікі. Супраць Вышняга замка дзейнічалі лівонскія рыцары. Вітаўт са сваёй дружынаю абклаў Крывы замак, дзе сядзела болей за 14 тысяч вояў. Яго і вырашылі браць першым. Аднак толькі вар'ят мог пайсці на штурм гэтай добра ўмацаванай цвержы з такім шматлікім гарнізонам. Вітаўту нейкім чынам удалося звязацца са сваімі прыхільнікамі і дамовіцца з імі пра сумесныя дзеі. 6 верасня, калі Вітаўт павёў сваё войска на штурм, змоўшчыкі падпалілі дзве замкавыя вежы. Полымя хутка перакінулася на сцены. І тады мсціслаўскі князь Карыгайла, які ўзначальваў абарону, вырашыў прарвацца праз шэрагі штурмуючых. Каля замкавай брамы ўсчалася жорсткая сеча. Мноства абаронцаў загінула пад варожымі мячамі, яшчэ болей згарэла ў полымі, шмат здалося

ў палон. Самога Карыгайлу захапілі крыжакі і тут жа на полі бою адсеклі яму галаву*. Узняўшы яе на дзіду, яны паказвалі гэты жудасны трафей абаронцам Вышняга замка, палохаючы іх падобнай расправай і пераконваючы здацца на іх міласць. Так з неверагоднай лёгкасцю пала галоўная крэпасць Вільні, засталося ўзяць яшчэ два замкі.

Вітаўт не пакутаваў ад дакораў сумлення, што пралівае кроў суайчыннікаў. Шлях да велікакняжацкага пасада ўсцілаў ён трупамі і, пераступіўшы цераз іх, не азіраўся — вочы сляпіла золата велікакняжацкага вянца, у сэрцы жылі крыўда на Ягайлу і пачуццё помсты. Гэта ўжо не высакародны юнак, гэта жорсткі і хітры чалавек, які сам сабе здрадзіў.

Пасля падзення Крывога замка ўвесь удар крыжацкія раці накіравалі на Вышні замак. Вітаўт на бліжэйшых пагорках укапаў гарматы, якія пачалі біць па крэпасці. Англійскія лучнікі засыпалі замак стрэламі. Прускія і лівонскія ваяры крышылі сцены таранамі. Хутка была разбіта першая сцяна. Кашталян замка польскі падканцлер Мікалай Маскаржэўскі не губляў надзеі. Ён выправадзіў з замка літвінаў, баючыся іх здрады. Удзень і ўночы палякі мужна адбівалі прыступы крыжакоў і Вітаўтавых вояў. У рэдкія хвіліны перадышак наладжвалі праломы ў сценах зямлёю, перагноем і скурамі жывёл, а па начах рабілі нечаканыя вылазкі з замка. Не адседжваўся ў сваім замку і Скіргайла, ён таксама па начах вадзіў сваіх вояў да крыжацкага лагера, пакідаючы пасля сябе мноства забітых і параненых і «заўсёды вяртаючыся ў свой стан пераможцам»[56].

Аблога зацягвалася. Чацвёрты тыдзень крыжакі беспаспяхова штурмавалі два замкі. Ваколіцы месца былі завалены забітымі. Зграі здзічэлых сабак гойсалі паміж імі, накідваліся на адзінокіх людзей.

Раззлаваны няўдачамі Вітаўт сваёй жорсткасцю ўражваў нават крыжакоў. У шаленстве ён загадаў пакараць узятага ў палон князя Нарымонта, жанатага на стрыечнай сястры яго жонкі Ганны**. Князя павесілі за ногі на дрэве, і Вітаўт з лука расстраляў яго. Лёс адпомсціў Вітаўту: падчас аднаго з прыступаў ад ядра бамбарды загінуў ягоны брат Таўцівіл.

На пяты тыдзень аблогі ў ордэнцаў скончыліся порах для гармат і харчы. Пайшлі халодныя восеньскія дажджы. Кры-

---

*Пазней крыжакі апраўдваліся, што яны гэтага не чынілі. У лісце да Ягайлы, прынамсі, пісалі, «што князь Карыгайла быў забіты, ніхто ў нас не ведаў аж пяць дзён, пакуль адзін уцякач літвін не паведаміў пра яго смерць». (Narbutt T. Dzeje narodu Litewskiego. T. 5. S. 453.)

**Верагодна, гэта быў сын Нарымонта Аляксандр. Ён выклікаў на паядынак крыжацкага рыцара, але быў выбіты з сядла і трапіў у палон.

жакі знялі аблогу. Пакідаючы Вільню, яны палілі касцёлы, жорстка расправіліся з палоннымі: забівалі іх, саджалі на палі дзяцей і жанчын. Хаця Вільня і выстаяла, аднак усе наваколь-ныя землі былі страшна спустошаны, ляжалі ў папялішчах сёлы.

«МНОГА ЛІХА ЎЧЫНІЎ»

Вярнуўшыся ў Прусію, удзельнікі паходу даведаліся, што памёр вялікі магістр Цольнер. На яго месца выбралі ваяўнічага і хітрага Конрада Валенрода. Ён таксама падтрымаў Вітаўта, даў яму атрады рыцараў, і той не горш за ордэнскіх важароў вадзіў крыжакоў на жамойцкія і аўкштайцкія землі, «забіраючы ў палон і забіваючы жыхароў абодвух палоў, спальваючы селішчы і творачы мноства рабаванняў»[57].

Той жа восенню ў Бартэнштэйн, дзе жыў Вітаўт, прыбыло пасольства ад вялікага князя маскоўскага Васіля за Софіяй. Яна ў суправаджэнні князя Івана Гальшанскага па Балтыйскаму мору адправілася ў Маскву, дзе 21 студзеня абвянчалася з Васілём Дзмітрыевічам. У Вітаўта з'явіўся яшчэ адзін саюзнік. Ён станавіўся куды небяспечнейшы, чым гэтага чакаў Ягайла. І тут трэба было б думаць па-дзяржаўнаму, прымірыцца з Вітаўтам, выканаць ягоныя ўмовы. Не лілася б кроў людская. Але ж не...

Конрад Валенрод не ведаў спакою, рыхтаваў новы паход на Вільню, каб ужо на гэты раз захапіць яе і абвясціць Вітаўта вялікім князем літоўскім і рускім. Па ўсёй Еўропе ордэнская брацыя прапаведавала крыжовы паход на паганцаў і абяцала нябеснае выратаванне кожнаму, хто прыме на сябе крыж. Самымі гучнымі словамі расхваляліся гасціннасць, шчодрыя падарункі, узнагароды, якія чакаюць паломнікаў у Прусіі. Конрад Валенрод у сваёй грамаце ва ўсе каталіцкія краіны абяцаў ім такі шыкоўны стол, якога яшчэ не давалі нікому ў Прусіі. Заклікі, абяцанні, запрашэнні зрабілі сваю справу — у Прусію сталі з'язджацца паломнікі. Ізноў на чале нямецкіх рыцараў прыбыў маркграф Фрыдрых Мэйсенскі. Сабраліся рыцары з Францыі, Англіі, Шатландыі. Каб утрымаць Польшчу ад удзелу ў вайне з Ордэнам, Конрад Валенрод пачынае з Ягайлам перамовы і дамагаецца міру. Толькі нязначную дапамогу аказалі палякі літвінам. У Вільню прыехаў Ягайла з абозам і зброяй, гарматамі, порахам, тканінай, вопраткай і харчамі. З'яўленне караля некалькі падняло дух літвінаў. Аднак Ягайла не збіраўся рызыкаваць сваёю венцаноснаю асобаю, паставіў у Вільні намесніка — паляка Яську Аляшцкага і вярнуўся ў Польшчу. Скіргайла застаўся ўзначальваць абарону Вільні. На

папялішчы спаленага Крывога замка паспешліва ўзводзілі з дрэва новую крэпасць. У сталіцу з усёй Літвы збіраліся баявыя харугвы. Скіргайла гатоў быў даць належны адпор ворагу.

У пачатку лета падрыхтоўка да паходу была закончана. Пад ордэнскія сцягі сабралася каля 70 000 крыжакоў. Яшчэ ні разу за ўсё сваё існаванне Ордэн не меў такога вялікага войска. Ніхто з крыжакоў не сумняваўся ў перамозе. Не сумняваўся ў перамозе і Вітаўт. Здавалася, што гэтую сілу нельга перамагчы, і Вільня падзе перад ёю.

Перад паходам рыцары перасварыліся паміж сабой. Спачатку дайшло да крывавай бойкі паміж саксонцамі і англічанамі, у якой загінуў слаўны рыцар Вільгельм Дуглаш. Пасля ўжо французы счапіліся з англічанамі. Так, рыцараў трэба было хутчэй весці ў паход.

Валенрод пастараўся надаць паходу паболей урачыстасці. Войска суправаджалі натоўпы музыкаў і гарольдаў. На працягу ўсяго шляху гучалі спевы труб і барабанны бой. Над галовамі вояў луналі сцягі. Пад Коўнаю, як і абяцаў магістр, крыжакам быў дадзены багаты стол. На зялёнай выспе пасярод Нёмана за доўгімі сталамі цэлы дзень пілі і елі пад гукі труб удзельнікі паходу. Кожнага паломніка Ордэн шчодра адарыў. Гэтае шыкоўнае баляванне каштавала паўмільёна грыўнаў. Будучы вялікі князь літоўскі Вітаўт павінен быў з пажытку адплаціць Ордэну за такія вялікія выдаткі. Трокскае княства, якое ён перадаваў Ордэну, каштавала куды больш.

Не сустракаючы супраціўлення, крыжакі падышлі да Вільні. На самай ускраіне горада на іх імкліва напаў невялічкі атрад абаронцаў на чале са Скіргайлам. Крыжакі паставілі на бліжэйшай гары гарматы і адкрылі агонь па літвінах. Не адзін з іх загінуў пад ядрамі. Атрад кінуўся ўцякаць. Сам Скіргайла ледзь выратаваўся, пераплыў Вілію і схаваўся ў адбудаваным Крывым замку.

Зноў пацягнуліся доўгія дні аблогі віленскіх замкаў. Крыжакі абстрэльвалі іх з гарматаў. Вітаўт укапаў некалькі бамбардаў на Туравай гары і з яе біў па Крывым горадзе. На штурм крыжакі, памятаючы леташнюю няўдачу, не рваліся. А спадзяванні, што тыя з літвінаў, якія варожа ставіліся да Скіргайлы, адкрыюць замкавыя брамы, былі марнымі: нават яны пасля крывавых паходаў Вітаўта адвярнуліся ад яго. Надзей на перамогу амаль не заставалася.

Крыжакі вырашылі адступіць ад Вільні. Аднак не вяртацца ж назад без «подзвігаў». Яны захапілі некалькі невялікіх крэпасцяў. Вітаўт са сваёй дружынаю авалодаў мястэчкам Мэркенпілс, а жыхароў адаслаў да вялікага магістра. Каб неяк су-

пакоіць засмучанага Вітаўта, Ордэн пабудаваў для яго каля Коўны замак Рытэрсвердэр, з якога ён мог нападаць на сваю былую радзіму. Не паспеў Вітаўт абжыцца ў сваім новым прытулку, як пад Рытэрсвердэр заявіўся князь Вігунд. Не даўшы адпачыць сваёй польска-літвінскай дружыне, ён павёў яе на прыступ замка і ледзь не захапіў яго. Аднак абаронцы ўсё ж адбілі штурм. Праз нейкі час ужо Вітаўт выправіўся ў паход на Літву. Ён авалодаў Мераччу і падышоў да Гародні — сталіцы свайго княства. Вітаўтавым воям і крыжакам удалося падпаліць замак. Тады абаронцы вырашылі здацца на міласць пераможцы. Яны напалі на палякаў, якія былі ў замку, абяззброілі іх і адчынілі перад Вітаўтам браму. Пятнаццаць палякаў крыжакі тут жа забілі. Вельмі красамоўнае тлумачэнне даюць ордэнцы такой жорсткай расправе. На іх думку, гэтае пакаранне горад заслужыў за тое, што, «нягледзячы на шматлікія запэўненні ў іх любові і дапамозе яму, не дазваляў ім авалодаць усёю Літвою і Руссю, якія належаць ім па праву даравальных грамат Міндоўга, імператараў і пап»[58]. Так крыжакі адзначылі ролю Гародні ў барацьбе з Ордэнам.

ПРЫМІРЭННЕ З ЯГАЙЛАМ

Пасля пераходу Гародні на бок Вітаўта, падтрымкі яго Полацкам Ягайлу б самы час задумацца. Нямала літвінаў, незадаволеных падначаленнем Вялікага княства польскай кароне, пераходзілі да Вітаўта. Не паслугача крыжакоў бачылі яны ў асобе гарадзенскага князя, а чалавека, які мог узначаліць барацьбу за разрыў уніі з Польшчай. Некаторыя князі, напрыклад Юрый Доўгут, Юрый і Андрэй Заслаўскія, парушылі клятву Ягайлу і абяцалі павінавацца яму толькі пасля Вітаўтавай смерці. А выпадак падчас зімняга паходу на Падляшша, калі палякі пакінулі войска, паказаў Ягайлу, што стаўка на польскую дапамогу вельмі ненадзейная. Ды гонар і недальнабачнасць — дарадчыкі Ягайлы. Ён пацвярджае Скіргайлу правы на вялікае княжанне. А той па-ранейшаму п'янствуе і гуляе.

Нарэшце Ягайла не вытрымаў і замест Скіргайлы паставіў сваім намеснікам у княстве Вігунда. Новы вялікі князь акружыў сябе палякамі. Некалькі месяцаў уладарыў ён у Вялікім княстве, а пасля нечакана памёр. Заўчасную смерць вялікага князя тлумачылі атручаннем. Падазравалі Вітаўта. Верагодней дапусціць другое, што супраць Вігунда — заўзятага прыхільніка палякаў — літвінскія феадалы ўчынілі змову, каб убраць яго і тым самым нейтралізаваць польскі ўплыў на дзяржаўныя справы ў Вялікім княстве. Так ці інакш, але Вігундава смерць



А.Зайкоўскі. Атручванне крыжакамі Вітаўтавых сыноў.
Гравюра паводле малюнка Я.Манюшкі. 1878 г.

спрыяла збліжэнню Ягайлы з Вітаўтам. Кароль нарэшце пераадолеў свой гонар і першым зрабіў крок да прымірэння з мяцежным князем. Зразумеў ён, што апынуўся ў нялёгкім становішчы. Мала таго, што трэба ваяваць з Ордэнам і баяцца паўстання супраць сябе ў Літве, дык яшчэ Вітаўтаў зяць маскоўскі князь Васіль атрымаў ад хана Тахтамыша ярлык на вялікае княжанне. Таго і чакай — падтрымае цесця. І сапраўды, Васіль пачаў вайну з Ноўгарадам, дзе правіў Ягайлаў намеснік Лунгвен-Сымон. Трывожылі і зносіны Тахтамыша з падольскімі ўлусамі. Як бы не давялося біцца адначасова з усімі імі, і хто там ведае, чым закончыцца барацьба з Вітаўтам. Прызнаў Ягайла, што брат выйграў у яго дыпламатычную вайну. Да Вітаўта адправіўся малодшы брат мазавецкіх князёў Януша і Земавіта — Генрых. Каб не выклікаць падазрэнняў у крыжакоў, ён ехаў у Прусію нібыта весці перамовы пра мір паміж Ордэнам і Польшчаю. У пачатку 1392 года Генрых сустрэўся з комтурамі Хрыстаборгскага і Балгскага замкаў і заявіў, што каралеўская рада жадае заключыць з Ордэнам мір і што праз свае

сувязі ў Кракаве ён гатовы асабіста садзейнічаць гэтаму. Ордэнцы паверылі Генрыху і нічога небяспечнага не западозрылі, калі ён папрасіў пабачыцца з Вітаўтам нібыта дзеля таго, каб ажаніцца з ягонай сястрой Рынгале. Генрых сустрэўся з Вітаўтам і перадаў яму Ягайлаву просьбу: «Не спусташай болей той зямлі Літоўскай, сваёй і нашай вотчыны. Пайдзі, брат, з намі на мір і будзь з намі ў вялікай братэрскай любові, і бяры сабе вялікае княжанне ў Вільні, пасад вялікага стрыя твайго князя Альгерда і бацькі твайго вялікага князя Кейстута»[59].

І на гэты раз Вітаўт паверыў Ягайлу, паверыў, бо не хацеў быць памагатым крыжакам. Але ўсё ж параіўся са сваімі паплечнікамі, як быць. Яны падтрымалі яго. Ды толькі няпроста было зноў пакінуць Ордэн: у прускіх замках сядзелі заложнікамі жонка, дзеці, брат, сястра, сваякі. Асудзіць іх на смерць? Дапамог Генрых. Ён абяцаў угаварыць магістра адпусціць заложнікаў.

З Рытэрсвердэра Вітаўт адправіўся ў Гародню — ці ўступіць у зносіны са сваімі прыхільнікамі на Літве, ці сустрэцца з патаемнымі Ягайлавымі пасламі. А Генрых паехаў у Крэмітэнскі замак, дзе жылі княгіня Ганна і Рынгала. У Крэмітэне ён абвянчаўся з Вітаўтавай сястрою і выехаў у Мальбарг. Не вельмі было прыемна магістру чуць ад Генрыха, што Вітаўтавы людзі кажуць, быццам княгіню Ганну крыжакі трымаюць у палоне. І калі той запрапанаваў вызваліць заложнікаў, Валенрод згадзіўся, тым больш што Ордэн ужо нямала патраціўся на заложнікаў і Вітаўт сам можа іх утрымліваць. Так былі вызвалены Ганна, Рынгала, Глеб Смаленскі, Юрый Белзскі і іншыя, толькі Жыгімонт Кейстутавіч, Вітаўтавы два сыны, Юрый ды Іван, засталіся пад ордэнскім наглядам.

Каб засведчыць вернасць Ордэну і вызваліць сваіх блізкіх, Вітаўт зноў хадзіў на Літву пад Ліду. У паходзе ўдзельнічалі, апроч крыжакоў, англійскія рыцары з графам Нартумберленгскім. Князь Карыбут, які абараняў Ліду, уцёк з замка. Хоць, магчыма, ён здзейсніў гэта па дамове з Вітаўтам, які не хацеў зноў праліваць братнюю кроў. Другі паход Вітаўта таксама закончыўся бескроўным узяццем Меднікаў. Лёгкія перамогі Вітаўта не насцярожылі крыжакоў, але яны не давяралі яму. Па-ранейшаму Жыгімонт, Юрый ды Іван сядзелі ў крыжацкіх замках. На ўсялякі выпадак Ордэн пабудаваў непадалёк ад Рытэрсвердэра два замкі — Метэмбург і Нейгартэн (Новая Гародня), з якіх збіраўся кантраляваць Вітаўта. А тым часам набліжаўся дзень Купалля, калі па дамове з Ягайлам ён павінен быў пакінуць крыжакоў. Вітаўт рашыўся, хаця ведаў, што аддае на пакуты або і на смерць блізкіх сабе людзей.

І вось наступіў гэты дзень. Па загаду Вітаўта ягоныя воі захапілі арсенал крыжакоў, што жылі ў Рытэрсвердэры, а саміх узялі ў палон. Шматлікіх паломнікаў адпусцілі. Вітаўт прапанаваў былому свайму палоннаму Маркварду фон Зальцбаху, а цяпер паплечніку вярнуцца з ім на Літву, абяцаў багата адарыць. У адказ пачуў насмешку: «Я багацейшы за цябе». Не прадбачыў, што не сябрамі яны расстаюцца, а ворагамі. Падпаліўшы замак, князь павёў сваю дружыну на Гародню. Нямецкі гарнізон ужо ведаў, што здарылася ў Рытэрсвердэры, і выйшаў са зброяй насустрач Вітаўту. Пасля кароткай сечы немцы былі разбіты, і Вітаўт пераможцам уехаў у сваю сталіцу. Нядоўга ён заставаўся ў Гародні — папоўніўшы шэрагі сваёй дружыны гарадзенцамі, выступіў да новых крыжацкіх замкаў Метэмбург і Нейгартэн. Ягоная дружына перамагла аб'яднанае войска з гэтых замкаў і авалодала імі. З радасцю сустракалі Вітаўта ў Вільні. Радаваліся людзі, што замірыліся браты і, можа, які мірны год-другі дасць Бог Літве.

Даведаўшыся пра вяртанне Вітаўта, Ягайла разам з Ядвігай выехаў на Літву. 5 жніўня ў вёсцы Востава Вітаўт пакаяўся ў «непаразуменні» і па старадаўняму звычаю апрануўся ў простую адзежу, адпусціў бараду — паказаў сваю бяду. На каленях прасіў у Ягайлы міласці. Ягайла зрабіў належныя высновы. У дамове з Вітаўтам ужо не гаварылася пра далучэнне Вялікага княства да Польшчы — тым самым кароль саступаў перад праціўнікамі Крэўскай уніі. Але ад Вітаўта ён усё ж патрабаваў клятвы «заставацца назаўжды ў саюзе з польскім каралеўствам і польскай каронаю»[60]. Вітаўт, здавалася, шчыра пакляўся ў вернасці польскай кароне.

З Востава Ягайла і Вітаўт адправіліся ў Вільню. Ягайла адхіліў Яську Аляснiцкага і яго братоў ад кіравання Вільняй. З гэтага часу Аляснiцкія сталі яго ворагамі. Не дзіўна, што адзін з іх, кракаўскі біскуп Збігнеў, пазней дасць адмоўную характарыстыку Ягайлу, так яго абняславіць, што Ягайла прадстане, дзякуючы біскапскаму вучню храністу Яну Длугашу, нейкім увасабленнем усіх чалавечых заганаў. Неўзабаве надышоў дзень каранацыі. Віленскі біскуп Андрэй Васіла ў касцёле святога Станіслава надзеў князю на галаву Альгердаву карону, і, як належыць паводле звычая, маршалак літоўскі перадаў новаму вялікаму князю літоўскаму і рускаму знакі яго ўлады: меч, жэзл і велікакняжацкую пячатку. Сябе Ягайла тытулаваў вярхоўным князем Літвы і Русі.

Тое, што Вітаўт марыў, здзейснілася — ён стаў вялікім князем літоўскім і рускім. Толькі нядоўгай была радасць. Не ўдалося вызваліць сыноў Івана ды Юрыя, закулі іх і атруцілі. Атруціў іх сябар Вітаўта рыцар Андрэй Саненберг. Ён прыехаў з

Юрбарга ў Кралевец для выкрадання дзяцей Вітаўта, але быў выкрыты. Нібыта Саненберг, маючы выбар «паміж адступніцтвам рэлігійным і адступніцтвам веры»[61], выбраў апошняе, каб не дапусціць вяртання Івана і Юрыя ў паганства і выратаваць іх душы. Самі крыжакі, выракаючыся гэтага ганебнага злачынства, апраўдваліся, што сыноў Вітаўта забіла яго здрада. Жыццё зноў брала дарагую плату з Вітаўта за ўзвышэнне.

«ПАНОВАННЕ САМОВЛАДНОЕ»

Раз'юшаныя Вітаўтавай здрадаю крыжакі не толькі спагналі злосць на заложніках, але і выправіліся ў паход на Літву, захапілі і спалілі мястэчка Сураж. Зімою яны напалі на Аўкштайцію і вывелі адтуль тры тысячы палонных.

Між тым ганарлівыя Альгердавічы і не думалі схіліцца перад новым вялікім князем. Першым «пачаў нешта задумваць і праяўляць яму непаслушэнства»[62] ноўгарад-северскі князь Карыбут Альгердавіч. Не хацеў Карыбут прысягі чыніць новаму вялікаму князю і перадаў яму праз пасла: «Я близшую часть маю до Вильня и князства его, яко дедич, нижли ты, а так не дочекаеш, абым ти тое чинил и отдавал послушенство як ты хочеш»[63]. Вітаўт выступіў з войскам на Ноўгарад-Северскі. Толькі Карыбут не чакаў ворага ў сваёй зямлі і з войскам пайшоў насустрач вялікаму князю «не задаючи ему на Север далекой дороги»[64]. Спаткаліся абодва войскі каля сяла Данудава (вёска ў Лідскім раёне на правым беразе Нёмана). Доўга ў сляпой лютасці секліся воі. І вось нарэшце Карыбутава дружына пачала адступаць. Карыбут, убачыўшы, што вынік бітвы ўжо вырашаны, з невялічкай купкай уцёк з поля бою. Пераможцы «лупы зобрали» з пабітых ворагаў і наступным днём пахавалі сваіх забітых сяброў.

Такі-сякі час падрыхтавацца да аблогі Наваградка ў Карыбута быў. І калі Вітаўт падышоў да горада, Карыбутавы воі гатовы былі бараніцца. Пацягнуліся дні аблогі. У вялікай тайне рылі падкопы пад замкавыя сцены і распальвалі пад імі агонь. Абаронцы тушылі пажары. Мінула нямала часу. Нарэшце горад узялі штурмам. Карыбута разам з сям'ёю Вітаўт адаслаў у Вільню, дзе прасядзеў ён пад стражаю ў замку, пакуль за вязня не паручыўся разанскі князь Аляксандр. Толькі тады Карыбут выйшаў на свабоду, але замест сваіх ранейшых уладанняў, якія перайшлі пад руку Вітаўта, атрымаў землі на Падоллі.

Наступным, з кім давялося Вітаўту скрыжаваць зброю, быў князь Свідрыгайла. Да пары да часу ён не выказваў да Вітаўта

непрыязнасці, хаця лічыў сябе пакрыўджаным: спадзяваўся атрымаць ад Ягайлы Вялікае княства, а застаўся ні з чым. Але вось у 1393 годзе памерла вялікая княгіня Ульяна Цвярская, і Ягайла аддаў Віцебск, у якім жыла ўдава, свайму ўлюбёнцу — лоўчаму Хведару Вясне. Свідрыгайла з атрадам крыжакоў і сваіх паплечнікаў заявіўся ў Віцебск, захапіў каралеўскага намесніка і скінуў яго са сцяны. Вясна зламаў сабе шыю і памёр.

Пэўна, недалюбліваў Ягайла свайго брата: ні багатых яму ўладанняў не даў, ні спраў дзяржаўных не давяраў. А даведаўшыся пра захоп ім Віцебска, даслаў Вітаўту ліст, каб той «адпомсціў за крыўду»[65] Свідрыгайлу. З асаблівай руплівасцю ўзяўся Вітаўт выконваць Ягайлаву просьбу. І не таму, што прагнуў засведчыць сваю вернасць яму, а таму, што не прамінуў скарыстацца варожасцю паміж Альгердавічамі, каб пазбавіцца ад аднаго з іх.

Па дарозе праз густыя барысаўскія лясы войска ўначы засцігла моцная бура. Князь спыніў рух і загадаў зрабіць сабе начлег на высокай гары каля дуба. На вяршыні выкапалі яму і ўслалі яе скурамі. У гэтым прытулку і пераначаваў Вітаўт. Так распавядае паданне. З тых часоў гару, дзе спыніўся на начлег князь, людзі пачалі зваць Вітагор'ем[66]. Цікавая ў гэтым паданні пра «князя Віта» замалёўка нялёгкага паходнага побыту Вітаўта. Заўжды вярхом на кані, пад соцнам, і пад дажджом, ноччу і днём, спіць на зямлі, падклаўшы тольскі скуру. Усе цяжкасці паходу ён трывае разам са сваімі ваярамі.

Сваім прыкладам ён натхняў воінаў. Калі ж трэба было, знаходзіў і патрэбнае слова, каб падбадзёрыць іх. Аднойчы паплечнікі не раілі яму пачынаць бітву з татарамі ў марозны дзень. Вітаўт дасціпна адказаў ім: «Тым больш павінны сёння біцца, калі пераможам, пераможам два разы. Калі ж прайграем, то паддадзімся сіле двух непрыяцеляў — татараў і марозу»[67]. І перамог гэтых двух непрыяцеляў.

Да Вітаўта далучыўся і полацкі князь Скіргайла. Спачатку яны пайшлі на Друцк. Друцкія князі — даўнія нашчадкі Ізяславічаў — сустрэлі Вітаўта з мірам і «просили у него зараз ласки»[68]. Паспрабавалі супраціўляцца аршанцы. Два дні адбівалі яны прыступы войска Вялікага княства, але ўсё ж здалі замак. Цяпер заставаўся Віцебск. Свідрыгайла паспеў падрыхтавацца да абароны, запасціся харчамі і зброяй. Так што вялізарнаму Вітаўтаву войску давялося папрацаваць: будаваць абложныя машыны, насыпаць палісады, закідваць равы. На дапамогу Вітаўту падаспеў князь Юрый Святаславіч Смаленскі.

Чатыры тыдні Вітаўт абстрэльваў з гарматаў Ніжні замак. Драўляныя сцены вытрымлівалі град ядраў. Сакрэт такой трываласці быў просты — іх абклалі дзірванамі, у якіх і вязнулі

ядры. Нарэшце пасля штурму Ніжні замак быў захоплены. Вітаўт загадаў укаціць гарматы ў Дабравешчанскі храм і адтуль павёў абстрэл Вышняга замка. Калі ў абаронцаў не стала харчоў і голад пачаў касіць іх шэрагі, Свідрыгайла здаў замак. Пад вартай яго адправілі ў Кракаў, а Вітаўт асадзіў у Віцебску сваё рыцарства. Такім чынам, пад непасрэднай уладаю Вітаўта апынуліся Наваградская, Крэўская і Віцебская землі, якія дагэтуль належалі Альгердавічам.

Іншы шлях барацьбы з Вітаўтам выбраў Скіргайла. Ён не ўзяўся за зброю, а пачаў інтрыгаваць, падштурхоўваць феадалаў да звадак і дзёрзкіх спрэчак з Вітаўтам, і звадкі гэтыя ўжо дайшлі да таго, што можна было чакаць адкрытага мяцяжу. Занепакоены Ягайла разам з Ядвігай у снежні прыехаў у Белз, каб прымірыць абодвух князёў. Высвятленне адносін было нялёгкім. Скіргайла выказаў нямала скаргаў на Вітаўта. Ён спадзяваўся, што Ягайла, памятаючы ўсё зробленае ім для яго, пераменіць сваё рашэнне. І пралічыўся. Новай вайны з Вітаўтам Ягайла не жадаў. Ён прызнаў Скіргайлавы скаргі неспраўядлівымі і прымусіў брата памірыцца з Вітаўтам. Аднак, каб заспакоіць Скіргайлу, перадаў яму Крамянец, Старадуб, Старыя Трокі і Кіеўскае княства, надаўшы яму тытул вялікага князя рускага. Па дамове Вітаўт павінен быў адваяваць для Скіргайлы Кіеў ва Уладзіміра Альгердавіча. Калі разабрацца, дык Ягайла справакаваў вайну паміж Вітаўтам і Уладзімірам. Думаецца, што менавіта Скіргайла настаяў на тым, каб ягоная страта велікакняжацкага вянца кампенсавалася Кіеўскім княствам.

Вітаўту нічога не заставалася, як выконваць дамову. У тым жа 1392 годзе ён з войскам ідзе на Кіеў. Але, відаць, ужо ў паходзе перадумаў і замест Кіева напаў на Падолле, уладар якой Хведар Карыятавіч выбіўся з падданства і павіннасці вялікаму князю.

Пад Брацлавам Падольскім літвінскае войска Вітаўта разбіла войска Хведара Карыятавіча. Князь ледзьве ўнёс ногі з поля сечы і схаваўся ў Камянцы Падольскім. Вітаўт са сваім віцязьствам браў адзін замак за другім: Брацлаў, Заслаўе, Смотрыч, Чырвоны Гарадок, Бэкоту, Скалу.

На дапамогу Карыятавічу прыйшлі суседнія валахі. Абяцаў дапамогу яму ўгорскі кароль Жыгімонт. Шукаў Хведар паразумення і са Скіргайлам, адправіўшы да яго камянецкага ваяводу, але, пэўна, мала верыў у перамогу. І калі Вітаўт аблажыў Камянец, князь, зразумеўшы, што яму не абараніцца, здаўся на міласць пераможцу. А міласць была такая: князя адправілі ў Вільню, дзе ён і прасядзеў у вязніцы да 1403 года.

Так даволі хутка Вітаўт зламаў супраціўленне самых моцных удзельных князёў, «чинячи собе пановане самовладное в

Литве и в Руси»[69]. Плёнам яго перамогі скарыстаўся Ягайла, які, каб акупіць ваенныя выдаткі, заклаў Падолле за 14 тысяч злотых кракаўскаму кашталяну Спытку з Мельштына. Пазней на гэтай падставе палякі будуць прэтэндаваць на падольскія землі.

Скіргайла знаходзіўся ў Кракаве і чакаў, калі Вітаўт адваюе для яго Кіеў. А Вітаўт не спяшаўся. Уладзімір не выказваў да яго варожасці, і неабходна было захаваць з ім мір перад вайной з Ордэнам. Вітаўт ведаў, што Ордэн рассылаў лісты да германскіх феадалаў і дацкай каралевы Маргарыты з паведамленнем пра ягоную здраду. У Прусію прыбывалі паломнікі, і ў пачатку 1393 года крыжакі пасля трохдзённых штурмаў захапілі і спалілі гарадзенскі замак. Пасля Ордэн здзейсніў яшчэ адзін паход на Вялікае княства. Крыжакі, пераправіўшыся цераз Нёман, у хвалях якога іх шмат патанула, захапілі жамойцкае мястэчка Бартэну і спалілі яго. Некалькі дзён спусташалі яны Жамойць і вывелі ў палон 400 чалавек. Нечаканая смерць 25 ліпеня 1393 года Конрада Валенрода сарвала задумы крыжакоў. Давялося замест паходаў на Вялікае княства выбіраць новага магістра. Ім стаў Конрад фон Юнінген. І ён не адмовіўся ад вайны з Літвою.

У Прусію па-ранейшаму сцякаліся паломнікі заслужыць дараванне грахоў і рыцарскія астрогі*. Зімою 1393 года прыбылі з вялікімі атрадамі нямецкі граф Лейнінген, французскія рыцары; з Англіі прыехаў граф Бэтфорд. Крыжацкае войска пад кіраўніцтвам маршала Вернера Тэцінгера рушыла да захопленага літвінамі замка Нейгартэн. Тыя, падпаліўшы замак, пакінулі яго. І тут крыжакі вырашаюць замест спустошаных Жамойці ды Аўкштайціі выступіць у глыб Літвы. Пэўна, Вітаўт не чакаў ад крыжакоў гэтага: лічыў, што пайдуць яны на Трокі або Вільню. А яны, абышоўшы гэтыя гарады, раптам з'явіліся каля Ліды. Невялічкі Лідскі гарнізон падпаліў горад і засеў у замку. Засцігнутыя знянацку людзі сотнямі траплялі ў палон. Больш за 2 тысячы нявольнікаў павялі з сабою ў Прусію рыцары. Але замак так і не ўзялі.

Удача натхніла крыжакоў, і ўжо сам магістр пайшоў шукаць «славы і здабычы ў рабаванні Літвы»[70]. З вялікім войскам ён уступіў у Жамойць і спустошыў землі каля мястэчка Райтэн. Вітаўт і на гэты раз скарыстаў стары прыём, дзякуючы якому літвіны не раз прымушалі адступаць крыжакоў. Ён са шматлікім войскам пайшоў на Прусію, бязлітасна спальваючы ўсе сустрэчныя сёлы. Магістр паспешліва вывеў войскі з Жамойці. Аднак неўзабаве крыжакі зноў напалі на Вялікае кня-

*Астрогі — шпоры.

ства. Балгскі камандор Конрад фон Кібург уступіў у Драгічынскую зямлю і захапіў там 300 чалавек.

Усё гэта былі дробныя набегі, якія не прыносілі Ордэну істотных вынікаў, і ён задумаў авалодаць Вільняю. Конрад фон Юнінген узяўся рыхтавацца да паходу на сталіцу Літвы. На ягоныя заклікі ў Прусію сабраліся рыцары з Сілезіі, Аўстрыі, Германіі, Швейцарыі, Францыі. Філіп Бургундскі прыслаў 200 адборных стралкоў. Напрыканцы ліпеня 1394 года ўсё было падрыхтавана для паходу — і войска, і зброя, і правіянт, і дарогі. Сам магістр узначаліў гэты паход. Ордэнскае войска ў Лабіве села на караблі і, увайшоўшы ў Нёман, спусцілася па рацэ да Коўны. На караблях везлі штурмавыя машыны, гарматы і зброю.

Вялікі магістр загадаў аднавіць спалены Вітаўтам замак Рытэрсвердэр. Закіпела работа. Пад Рытэрсвердэр падышоў з войскам і Вітаўт. Разам з ім быў вызвалены з няволі Карыбут. Расставіўшы вакол Коўны засаду, Вітаўт нападамі на дробныя крыжацкія атрады перашкаджаў пабудове замка. 13 жніўня з прускімі рыцарамі злучылася войска лівонскага магістра Вільгельма Фрымерскага — сілы крыжакоў узраслі.

Няволяю Вітаўту давялося адступаць. Але на ўсіх лясных дарогах ён паставіў засады. Даведаўшыся пра гэта ад палонных, магістр павёў войска па балоцістых і бездарожных мясцінах, насцілаючы на сваім шляху гаці. Пераход прынёс крыжакам немалыя страты, мноства іх загінула ад стрэл літвінаў, што нападалі з засады, шмат патанула ў рэках ці завязла ў балотах.

Да Вільні крыжакі выйшлі з парадзелымі шэрагамі. Войска ж Вітаўта папоўнілася прысланымі Ягайлам польскімі воямі. Тым не менеў крыжакі ўзялі ў аблогу Крывы замак. Вітаўт стаў з войскам непадалёк ад непрыяцельскага стану. Вялікі магістр адправіў на яго атрады балгскага, брандэнбургскага, бартэнскага комтураў і біскупаў эрмландскага і самландскага. Бітва адбылася каля мястэчка Рудаміна. Крыжакі праз лес і багністую мясцовасць выйшлі да літвінскага войска. Першы ўдар яны нанеслі па флангу, дзе знаходзіліся харугвы пад даводствам князя Карыбута. Не вытрымаўшы ўдару, літвіны кінуліся на ўцёкі. У пагоню за імі паскакала частка крыжацкай конніцы на чале з графам Золенам. Астатняя частка крыжацкага войска ўдарыла ў цэнтр, дзе быў сам Вітаўт. Да цемры біліся абодвы войскі. Вітаўт лічыў, што ў ворага застаўся рэзерв, і апасаўся ўдару ў аголены фланг і выхаду крыжакоў у тыл яго войска. Таму ён загадаў трубіць адыход. У бітве ён страціў 500 воінаў.

Пагоршылася становішча і ў абаронцаў Крывога замка — у ім успыхнуў пажар, згарэла частка харчовых запасаў. У кры-

жакоў з'явілася надзея ўзяць замак голадам. Але абаронцы адчайна адбіваліся. У адной з вылазак яны дабраліся ажно да намёта магістра, толькі харугва брандэнбургскага камандора Яна Стрэйфана, якая вярталася з бітвы пад Рудамінам, адбіла літвінаў. Крыжакі па-ранейшаму ўсялякімі сродкамі намагаліся захапіць замак: абстрэльвалі яго з бамбардаў, вялі падкопы, капалі абвадны канал, каб спусціць з ірвоў ваду. Вітаўт разумеў, што працяг вайны не на ягоную карысць, таму ён увесь час непакоіў крыжакоў імклівымі нападамі на іх стан. Крыжакі не маглі выехаць з лагера па прадукты і фураж. Паспрабаваў маршал, але яго харугву разбілі дазвання. А тут у абозе французскіх і фламандскіх рыцараў успыхнуў пажар — згарэлі запасы прадуктаў і фуражу, загінулі ў полымі людзі. Крыжацкаму войску пагражаў голад. Магістр пачаў думаць пра вяртанне ў Прусію. Чатырохтыднёвая аблога Крывога замка так і не прынесла жаданай перамогі.

Магістр уступіў у перамовы з Вітаўтам і дамовіўся з ім вывесці сваё войска ў Прусію. Крыжакі адступілі ад Вільні, мінулі Трокі і выйшлі да ракі Страва. Тут ад палоннага літвіна магістр даведаўся, што па загаду Вітаўта на дарозе зрабілі шанцы і засекі, якія абараняюць літвіны, а ззаду ідзе літвінскае войска. Магістр зразумеў, што трапіў у пастку. Трэба было хутчэй ратавацца. На штурм шанцаў пайшла не толькі пяхота, але і спешаныя рыцары. Крыжакі зацята палезлі на шанцы, ішлі па трупах сваіх сяброў і ўзялі ўмацаванні, забіўшы 250 літвінаў. Хутка былі разабраны засекі. Шлях быў свабодны. Крыжацкае войска паспешліва адступіла да Коўна, адтуль да Юрбарга, дзе пераправілася цераз Нёман. Страты былі настолькі вялікімі, што яму «давялося спыніць на доўгі час паходы на Літву як згубныя для сябе і сваіх»[71].

Вось такія несуцяшальныя для Ордэна вынікі гэтага паходу на Вільню. І калі зімою 1394 года ў Прусію прыбылі новыя партыі паломнікаў, дык магістр адмовіўся весці іх на Вялікае княства. А тут яшчэ германскі імператар Венцаслаў, заключыўшы з Ягайлам мір, прыслаў у Прусію грамату, якой забараняў Ордэну ваяваць землі, што належалі польскаму каралю. Конрад фон Юнінген запрапанаваў Вітаўту падпісаць мірную дамову паміж Ордэнам і Вялікім княствам, але той без ведама Ягайлы не мог самастойна заключаць сепаратныя саюзы з другімі краінамі. Пакуль Вітаўт не ўмацаваў сваю ўладу ў Вялікім княстве, ён вымушаны быў падначальвацца Ягайлу.

Два гады княжання Вітаўта ў Вялікім княстве Літоўскім і Рускім прайшлі ў войнах і баявых паходах. Вялікі князь не ведаў спакою. І былі вынікі: Ордэн, так і не дамогшыся пера-

могі, спыніў вайну з Літвой. А ўнутры дзяржавы Вітаўт расправіўся з двума буйнымі ўдзельнымі князямі — Карыбутам Альгердавічам і Хведарам Карыятавічам. Перамог ён і Свідрыгайлу. Але да поўнай улады ў Вялікім княстве было яшчэ далёка. Па-ранейшаму Вітаўт лічыўся васалам Ягайлы, заставаўся небяспечным для яго і Скіргайлы. Той жыў у Кракаве і раз за разам патрабаваў ад Вітаўта забраць ва Уладзіміра Альгердавіча Кіеўскае княства і перадаць яму. І трэба было дзеля міру са Скіргайлам выконваць умову іх пагаднення.

Сілы Літвы і Кіеўскай зямлі былі няроўнымі. Уладзімір Альгердавіч бачыў, што яму не выстаяць супраць войска Вітаўта. А заняцце вясною 1394 года літвінамі Жытоміра і Оўруча канчаткова перакрыжавалі ягоныя надзеі ўтрымаць Кіеўскае княства ў сваіх руках. Уладзімір Альгердавіч добраахвотна прыехаў да Вітаўта і здаўся на ягоную міласць. Узамен Кіева ён атрымаў Капыл, а ў старажытнай сталіцы Русі сеў Скіргайла. Але, здаецца, сам лёс дапамог Вітаўту пазбавіцца ад небяспечнага ворага. Скіргайлу, як кажуць, атруціў кіеўскі манах Фама Ізуфаў. А верагодней усяго, Скіргайла перапіў на баляванні, якое ўчыніў дзеля яго Фама. Падарванае п'янствам і гульбамі здароўе на гэты раз не вытрымала. Князь захварэў і на сёмы дзень памёр. З ягонай смерцю вызваляліся кіеўскі і полацкі княжацкія пасады.

Разумеючы значэнне Полацка ў Вялікім княстве, Вітаўт не жадаў, каб там сядзеў князь, які мог бы варагаваць з ім. Ён ліквідуе княжанне ў Полацку, сваім прывілеем пацвярджае ўсе артыкулы старадаўніх дамоваў палачан з князямі. Па Вітаўтаву прывілею за Полацкай зямлёю захоўвалася аўтаномія са сваімі мясцовымі правамі. Вялікі князь не меў права назначаць свайго намесніка супраць волі палачанаў, якога абіралі на вечы. Прадугледжваў прывілей і абарону палачанаў ад самавольных пабораў з боку намесніка, забараняў яму падарожжы па Полацкай зямлі, апроч палявання, падчас якога насельніцтва вызвалялася ад павіннасцей намесніку. Палачане атрымлівалі свой суд, непадуладны велікакняжацкаму. Усе справы палачанаў з жыхарамі іншых земляў павінны былі разглядацца толькі ў Полацку. Палачане набывалі права жыць у любым месцы Вялікага княства Літоўскага і Рускага і маглі карыстацца нажытай маёмасцю па сваёй волі. Полацкія купцы вызваляліся ад мыта на ўсёй тэрыторыі Вялікага княства. Сам вялікі князь сваіх правоў у адносінах да Полацкай зямлі не мог нікому перадаваць. Узамен палачане абавязаны былі заўсёды падтрымліваць Вітаўта на выпадак вайны. Вітаўтаў прывілей быў не што іншае, як пагадненне паміж Полацкаю зямлёю і Вялікім княствам Літоўскім.

А ў Кіеў быў пасланы даўні Вітаўтавы паплечнік Іван Гальшанскі. Такім чынам, Вітаўт аб'яднаў пад сваёю ўладаю ўсё Вялікае княства.

Мы мелі магчымасць бачыць Вітаўта «млодзенцам удатным», бачылі яго і мужным воем «сердца смелого, до войны охочего», сталі сведкамі яго жорсткасці. Як высветлілася, там, дзе можна было выкарыстаць падман і хітрасць, Вітаўт не цураўся і гэтага. Менавіта хітрасцю завалодаў ён Смаленскім княствам.

Смаленскія князі Юрый і Глеб змагаліся паміж сабою за ўдзелы княства. Вітаўт вельмі ўдала скарыстаўся тымі звадкамі. Калі Юрый паехаў па дапамогу да свайго цесця, князя Алега Разанскага — гэта было ў 1395 годзе, — ён з войскам прыйшоў да Смаленска і паслаў перадаць Глебу, які ў гэты час сядзеў на смаленскім пасадзе, што выступіў ён раццю на хана Цемір-Кутлуга. Князь паверыў Вітаўту, прыехаў да яго ў стан з невялікім атрадам. Вялікі князь ласкава прыняў госця, не сквапіўся ні на пашану, ні на падарункі, на развітанне мовіў: «Чуў я пра тое, што ты з братамі сваімі жывеш не ў згодзе і не ў сяброўстве. Выехалі б вы да мяне, і я разбяруся ў вашых справах і ўчыню паміж вас згоду»[72]. Глеб, які некалі добраахвотна быў заложнікам Вітаўта ў крыжакоў, не мог і ўявіць, што той падмане яго. Смаленскія князі разам з баярамі выехалі з горада да Вітаўта ў стан і былі захоплены ў палон. Вітаўт 28 верасня ўвайшоў у горад. Так ён далучыў да сваёй дзяржавы Смаленскае княства.

Між тым Юрый Святаславіч заставаўся на волі і жыў у разанскага князя Алега. Даведаўшыся пра заваёву Смаленска, ён з Алегам павёў на горад разанскую дружыну. Вітаўтаў саюзнік маскоўскі князь Васіль перагарадзіў ім шлях. Тады Юрый і Алег абышлі маскоўскую дружыну, уварваліся на ўсходнія літвінскія землі і бязлітасна іх спустошылі. Вітаўт адплаціў тым жа — літвіны таксама пралівалі кроў у Разанскім княстве.

У Каломне вялікага князя з пашанаю сустрэў Васіль. Яны разам прыехалі ў Смаленск, дзе адсвяткавалі Вялікдзень. Паміж сяброўскімі баляваннямі і ловамі вырашаліся дзяржаўныя справы. Вітаўту ўдалося схіліць Васіля падтрымаць яго ў барацьбе з крыжакамі. Яны адправілі паслоў у Ноўгарад з патрабаваннем да веча разарваць мір з Ордэнам. Паслы вярнуліся з адмовай. Угневаны Вітаўт пачаў пагражаць вайною. Ваяваць з Ноўгарадам узяўся Васіль, які і адняў некалькі наўгародскіх валасцей на Дзвіне. Вітаўт жа павінен быў зноў скрыжаваць зброю са Свідрыгайлам.

Вызвалены Ягайлам, Свідрыгайла ў 1396 годзе з'явіўся ў Лівоніі і выпрасіў у крыжакоў дапамогу. З нямецкім атрадам

ён прабраўся праз пскоўскія і полацкія землі на Віцебшчыну. Жыхары Віцебска адчынілі перад ім браму і ўпусцілі ў горад. Свідрыгайла ізноў абвясціў сябе віцебскім князем. У такой шырокай падтрымцы Свідрыгайлы віцьбічамі праявілася перш за ўсё незадавальненне літвінаў палітыкай Вітаўта, які сваім прызнаннем над сабою ўлады Ягайлы пацвярджаў пастанову Крэўскай уніі пра далучэнне Вялікага княства да Польшчы. Свідрыгайла, які стаяў у апазіцыі і да Ягайлы, і да Вітаўта, мог бы ўзначаліць барацьбу літвінаў за незалежнасць іх дзяржавы ад Польшчы. Але Вітаўт таксама не хацеў мірыцца з пастановамі Крэўскай уніі і толькі з палітычных меркаванняў да пары да часу прызнаваў яе. Калі зірнуць на яго бліжэйшае акружэнне, то ўбачым князёў Юрыя Пінскага, Міхайлу Заслаўскага, Івана Гальшанскага, Івана Друцкага, Уладзіміра Слуцкага, Аляксандра Лукомскага, Мінгайлу Ашмянскага — тых, хто праз два гады на Саленскім возеры абвясцяць яго каралём Літвы і Русі. Значыць, настрой на разрыў Крэўскай уніі ўжо панаваў пры Вітаўтавым двары. Але паколькі вялікі князь і ягоныя паплечнікі хавалі свае задумы, дык віцьбічы віталі Свідрыгайлу, які паўстаў супраць Ягайлы і ягонага васала.

Вітаўт павёў войска да Віцебска і абклаў яго. І зноў віцьбічы адчайна абаранялі свой горад. Пасля трыццацідзённай аблогі штурмам быў узяты Ніжні замак. Віцебскія воі і жыхары адступілі ў Вышні замак. Там сабралася столькі людзей, што яны не маглі ўсе размясціцца. Вырашылі вывесці месцічаў з замка. Гэтым і скарыстаўся Вітаўт. Пакуль віцьбічы пакідалі крэпасць і брама заставалася адчыненай, войска рынулася на штурм і ўварвалася ў замак. Вітаўт дараваў віцьбічам, толькі бліжэйшыя Свідрыгайлавы паплечнікі паплаціліся жыццём, а самога мяцежнага князя ён адправіў у кайданах да Ягайлы.

Бліскучыя поспехі Вітаўта праславілі яго як дзейснага і таленавітага палітыка. На баляванні ў гонар угорскага караля Жыгімонта польскі магнат Крапідла заявіў: «Ні ты (Жыгімонт. — *В.Ч.*), ні кароль Ягайла не атрымаеце славы з вашага ўладарання. Толькі вялікі князь Вітальд варты быць каралём! Ягайла і ты — вы нявартыя насіць скіпетр! Той з галавою аддаўся ў свае ловы, а вы гатовы пазбавіцца гонару дзеля жаночай спадніцы... Таму не хваліся каралеўскімі вартасцямі! Калі б мне дадзена было сеяць каралей, я б ніколі не сеяў Жыгімонтаў, ніколі Ягайлаў, але заўсёды адных толькі Вітальдаў!»[73]

ПАСОЛЬСТВА КОНРАДА КІБУРГА

Вітаўт збіраўся ў паход на татараў і прапанаваў Ордэну саюз. Крыжакі за тое запатрабавалі, каб вялікі князь дазволіў ім свабодна распаўсюджваць каталіцтва на балцкіх землях, плаціў папу рымскаму даніну, прызнаў сябе васалам германскага імператара, аднавіў разбураныя ордэнскія замкі, абяцаў выканаць тыя прывілеі, якія далі Ордэну вялікія князі літоўскія. Для Вітаўта такія ўмовы былі непрымальныя, і ён прасіў магістра адправіць да яго пасольства для новых перамоваў. На чале пасольства паехаў Конрад Кібург.

У пачатку чэрвеня 1398 года ордэнскія паслы прыплылі на караблях па Нёману да Коўна. Тут іх сустрэў камендант ковенскага замка баярын Іван Фёдаравіч Русін. Вось якім убачыў горад Кібург: «Коўна шмат страціў ад сваёй мінулай велічы: колькасць будынкаў зменшылася, многія ляжаць у руінах, уся падзамкавая частка, некалі шматлюдная, цяпер пераважна занята гародамі. Адраджэнне горада нялёгкае, таму што гандаль цяпер сустракае шмат перашкод. Тутэйшы замак пабудаваны з густам і ўяўляе сабой вялікія ўмацаваныя крамы для складоў з таварам. Цвержа гэтая, пабудаваная Гедымінам і Альгердам, так шмат страціла ў сваёй сіле, што можа даць вельмі слабы адпор непрыяцелю. Мы не бачылі ніводнай гарматы вялікага калібра, якімі славіўся раней Коўна; праўда, крамы вялікія, добра даглядаюцца і, як распавядаюць, напоўнены мноствам запасаў і зброі. Сцены, што звернуты да Нёмана, найбольш ацалелі, бліжэйшыя ж да Нярыс, асабліва там, дзе галоўная брама, носяць на сябе сляды жахлівага спустошэння. Гарнізон складаецца з чатырох тысяч літвінаў і жамойтаў, ён заняты ўладкаваннем умацаванняў: пры нас адкапвалі нейкі будынак, зусім завалены смеццем, і папраўлялі заднюю сцяну, але нам гэтую працу не паказалі. Супраць нашых акон (мы жылі ў падзамкавай частцы), на правым беразе Нярыса, размясціўся стан кавалерыі, чатыры або пяць тысяч коней. Уражвала незвычайная разнастайнасць адзежы і ўзбраення асобных атрадаў; хаця мы прыглядваліся здалёк, мы ўсё ж налічылі пяць або шэсць відаў зброі і адзення. Болей усяго прыцягвала ўвагу цяжкая кавалерыя, закутая ў жалеза на манер польскай. Але гэтае адзенне, не маючы покрыва, якога-небудзь плашча, здавалася нечым незакончаным, складвалася ўражанне, што на конях сядзяць аголеныя людзі. Другія атрады былі ў шапках, якія так псавалі выгляд вершніка, што трэба здзіўляцца, каму гэта прыйшло ў галаву выдумваць такую смешную форму. Лёгкая кавалерыя апраўдвала сваю назву, таму што вершнікі не мелі другой зброі, апроч простай дубіны, а

коні іх былі такімі худымі, што, я думаю, і прускі вазок ім не па сілах, тым не менш яны здаваліся даволі рухавымі; быў яшчэ атрад, што складаўся з людзей старых, з доўгімі барадамі, апранутых, як браты мінарыты, ад якіх яны адрозніваліся толькі рознакаляровымі каптанамі і ніжняй адзежай. Якую мэту, які сэнс мела гэтая адзежа? Мы ніяк не маглі здагадацца. Гэтай кавалерыяй загадваў нейкі князь Юрый, верагодна, з тою мэтаю, каб воіны, разышоўшыся па дамах, былі ўзорам для іншых, а можа быць, для таго, каб пакрасавацца перад намі»[74].

Горад яшчэ не залячыў раны ад варожых нашэсцяў і паходзіў на вайсковы стан. Такі лёс усіх памежных з Ордэнам гарадоў. Пэўна, падобнае можна было ўбачыць і ў Бельску, і ў Гародні: спаленыя сядзібы, разбураныя цвержы, кучы смецця і штодзённыя вайсковыя навучанні вояў.

На трэці дзень прабывання нямецкага пасольства ў Коўне сюды прыехаў баярын Атакар Осцікавіч (так называе яго Кібург)*. Ён прывёз прывітанне ад вялікага князя. Разам з ім пасольства адправілася ў Вільню, куды прыбыло 22 чэрвеня.

Пройдземся і мы разам з Конрадам Кібургам па сталіцы Вялікага княства.

«Ля гарадской брамы нас сустрэлі намеснік Альбрэхт Манівід і маршалак Ямант, ачоленыя рыцарствам і гарадскімі чыноўнікамі. Манахі ордэна св. Францыска, мінарыты, стаялі перад брамай свайго манастыра і, прывітаўшы нас, запрасілі ўвайсці ў царкву Дзевы Марыі, так званую «На пясках». Яна пабудавана з камянёў, але пашкоджана пажарам, стаіць пакуль без даху, толькі частка яго там-сям збераглася. Бедныя манахі, якім мы раздавалі міласціну, распавялі нам, што вялікі князь выратшыў за свой кошт аднавіць манастыр і царкву і што ўжо чакаюць для гэтага рамеснікаў з Луцка. Каля брамы Ніжняга замка віталі нас баяры вялікага князя па звычаю з хлебам-соллю і кубкам піва, паднесенымі на залатым блюдзе.

Тут мы злезлі з коней і пехатою ў суправаджэнні вялікай колькасці княжацкіх прыбліжаных і рыцараў пайшлі ў кафедральны сабор. Святарства сустрэла нас з кадзіламі і святой вадою; пасля кароткай малітвы мы адправіліся ў адведзены нам дом, што знаходзіўся ў тым жа Ніжнім, або, як звычайна яго называюць, Крывым замку. Дом наш драўляны, нядаўна пабудаваны, ляжыць пад Віліяй і называецца пасольскім дваром, але ён так добра ўмацаваны, што хутчэй варта яго назваць астрогам. Там мы сустрэлі ўсялякія зручнасці і прыемны адпачынак пасля дарогі, хаця яна зусім не была цяжкай.

---

*Атакар Осцікавіч — продак родаў Радзівілаў і Осцікавічаў.

Даводзілася нам быць у многіх замежных уладароў, але павінны прызнацца, што нідзе не знаходзілі мы такіх зручнасцей, такой гасціннасці і такога ладу ва ўсім, як цяпер у Літве»[75].

Паколькі Вітаўта не было ў Вільні, паслы вымушаны былі чакаць яго і добра пазнаёміліся з горадам. Кібург падрабязна апісвае свае ўражанні: «Якое моцнае становішча замкаў! У Вышнім мы не былі, бо прасіць пра гэта няёмка, але нават здалёк можна было заўважыць магутныя ўмацаванні; між іншым, мы ясна бачылі крыж і царкоўную вежу, што ўзносілася ўгару. Царкоўныя сцены, якія звернуты да ракі, маюць на сябе бруствэры... У горадзе дамы драўляныя, наяўнасць дрэва і ягоная таннасць дазваляюць адмаўляцца ад будаўніцтва каменных, а між тым гэты матэрыял вельмі небяспечны пры пажары. У Ніжнім замку, апроч даўно ўжо пабудаванага біскупскага дома, кафедральнага сабора, вежы і храма, усё з дрэва; аднак сцены ў парадку і трывалыя, таксама, як і астатнія ўмацаванні. Мноства садоў раздзяляюць дамы, сустракаюцца вельмі старыя пладовыя дрэвы, што даказвае існаванне паселішча на гэтым месцы яшчэ да Гедыміна. Лепшая адбудаваная частка горада займае ягоную сярэдзіну, а болей населеная знаходзіцца каля Ніжняга замку. Калі мы спыталіся, дзе палац вялікага князя, нам паказалі шырокае месца паміж саборам і Вышнім замкам, на якім валяліся кавалкі дрэва, абпаленыя шматкі і знаходзіўся невялікі канал, засмечаны травою. Тут быў палац Гедыміна і Альгерда. Ягайла і ягоныя браты рэдка жылі ў Вільні, а вялікі князь Вітаўт жыве ці ў Троках, дзе ён мае магутны каменны замак на выспе возера, ці ў Старых Троках, дзе ёсць драўляны палац, ці ездзіць па землях. Такім чынам, у Вільні ён бывае рэдкім госцем і тады селіцца пад Віліяй, ніжэй замка, у добрым драўляным доме, невялікім, так што ягоны двор, не маючы там памяшканняў, размяшчаецца як вайсковы стан. Вялікі князь не любіць шумлівых баляванняў; вялікая княгіня, якая часта суправаджае мужа ў ягоных паездках па краі, трымае пры сваёй асобе лічаных слуг.

Аглядаючы горад звонку, мы заўважылі, што сляды штурмаў яшчэ не зніклі, асабліва пашкоджана мясцовасць каля царквы святой Панны і ў падзамкавай частцы горада; але віленцы хутка будуюць; цяпер ужо абводзяць горад сцяною і закладваюць шмат будынкаў, болей трывалых і прыгожых і размешчаных у лепшым парадку»[76].

У той час, калі просты народ потам сваім зарабляў на хлеб, феадалы бавілі свой час за баляваннямі. На адно з іх быў запрошаны Кібург. «Баляванне пачалося музыкаю, якая звычайна ў літвінаў робіць столькі шуму, што можна звар'яцець ад яе, але ўсё ж інструменты, якія ціха іграліся ў прамежках і пры-

емныя словы на мове нам незразумелай, мелі штосьці меладычнае, што моцна западала ў сэрца. Мы сядзелі за вялікім, авальным сталом, у прасторным пакоі, асвечаным васковымі свечамі: кожны сеў, дзе хацеў, таму што ў грамадстве ўсе роўныя. Хвала літвінам, што яны захоўваюць гэта хрысціянскарыцарскае равенства (з часу вяртання да сваіх вялікага князя Вітаўта), можа быць, з большай дакладнасцю, чым мы»[77].

Вялікае ўражанне атрымалі крыжакі ад Купалля. Запрасіў іх на святкаванне Агакаф Олькавіч. «На ўсходнім баку горада ляжыць руская слабада, юр'еўская, або святаюр'еўская, за ёю па пагорках цягнецца лес, у якім сям-там сустракаюцца прыгожыя даліны, усыпаныя кветкамі, нібыта пакрытыя размаістым дываном. У гэтым лесе, на пагорках і ў далінах, убачылі мы мноства буданоў, шалашоў і раскладзеных агнёў, каля іх тоўпіўся народ, гул гучаў ад говара і спеваў, лілося віно, кружыліся хуткія пары танцораў, адным словам, панавала самая шчырая вясёласць. Далей сустрэлі мы даліну рэдкай прыгажосці; пасярод яе гарэла вялікае вогнішча, а вакол снувалі людзі вышэйшага саслоўя, мужчыны асобна ад жанчын; адны праходжваліся, другія сядзелі на траве, пакрытай дыванамі, трэція сілкаваліся за нізкімі сталамі, былі, нарэшце, такія, што бавілі час, слухаючы спевы старцаў і баб, а слугі святілі васковымі паходнямі. Незвычайнае, непаўторнае відовішча»[78].

Паводле звестак Кібурга, у Вільні жыло каля 25 тысяч чалавек з якіх 6 тысяч складаў гарнізон. Жаўнеры неслі вартавую службу і аднаўлялі гарадскія ўмацаванні. Але горад не паходзіў на вайсковы стан — сваім ладам цякло тут жыццё. «Лад ва ўсім выдатны, бяспека ўсюды поўная; рэдка чуваць пра забойства, крадзежы бываюць, але за гэта караюць сурова»[79]. Адчувалася суровасць Вітаўта да злодзеяў і рабаўнікоў. І яны яго баяліся. Не патрэбны быў і кат — самі пасля выраку лезлі ў пятлю, каб яшчэ больш не угневаць вялікага князя. Цікавілі Кібурга і жыхары горада, іх норавы, і заняткі. «З першага ж погляду адрознівалі мы русінаў і літвінаў, паколькі розныя ў іх твары, адзежа і звычаі. Русіны пераважна ніжэйшага росту, колер іх валасоў чарнаваты, блізкі да рудога, іх звычаі і вобраз жыцця, таксама як і вера, выразна адрозніваe іх ад літвінаў; яны займаюцца гандлем і некаторымі рамёствамі. Літвіны высокага росту, але вельмі гультаватыя ў сваім хатнім ладзе, любяць моцныя напоі, меней заможныя, чым русіны»[80]. П'янства, як і ўсюды, агульнае. Русіны часцей займаюцца продажам моцных напояў; іх жанчыны ўтрымліваюцца ў строгасці, менш распутныя. Літвінкі ж больш вольных нораваў»[81]. Гэта датычыцца нацыянальнага складу жыхароў сталіцы, а вось, што датычыцца заняткаў віленцаў, мы даведаемся, што сярод

іх шмат купцоў, рамеснікаў і што найбольш удачлівыя з іх «учынілі заводы», на якіх выраблялюць шкло, ганчарны посуд, металічныя рэчы. Прыемна, што не ўбачыў Кібург у сталіцы галечы і жабрацтва, народ жыў больш-менш заможна.

Асаблівую сімпатыю ў Кібурга выклікае гасціннасць віленцаў. «Іншаземец, што прыехаў у Вільню, і яго маёмасць таксама ў бяспецы, як у сваім доме; у гэтым краі з далёкіх часоў існуе звычай — вынаходніцтва мудрай палітыкі, па якому іншаземец, што ступіў на зямлю літоўскую, як толькі ўвойдзе ў першы сустрэчны дом, становіцца свяшчэннай асобай для гаспадара, апошні лічыць сваім абавязкам ахоўваць яго»[82].

І вось 26 чэрвеня паслам паведамілі аб прыездзе ў Вільню Вітаўта. Пойдзем разам з імі ў велікакняжацкі палац, каб сустрэцца з Вітаўтам. «Гадзіны за тры да заходу сонца прыйшлі па нас шыкоўна апранутыя прыдворныя чыноўнікі і рыцары, у суправаджэнні якіх, пры гуках вайсковай музыкі, мы адправіліся да палаца вялікага князя. Каля ўваходу нас сустрэў вялікі маршал з атрадам баяраў, прыслуга, багата апранутая, стаяла ў два шэрагі па баках нашага шляху як на двары, так і ў агромністых сенцах. Калі нам заставалася не больш пяці крокаў да прыёмнай залы, дзверы расчыніліся насцеж і каля іх мы ўбачылі брамнікаў — волатаў, чатырох у зале і столькі ж у пярэдняй; яны трымалі бердышы срэбныя або з паліраванай сталі, на галовах іх былі высокія, у локаць, чорныя мехавыя шапкі, якія зашпільваліся пад падбародкам залацістай рыб'яй лускай, тырчэлі вялікія вусішчы волатаў, бароды ж былі чыста паголены. У глыбіні залы на багата ўпрыгожаным крэсле сядзеў вялікі князь Вітаўт, па баках яго стаялі па два маладых пажы ў белых адзежах. Некалькі далей за двума сталамі, накрытымі багатымі персідскімі дыванамі, сядзелі на зэдліках міністры, дарадчыкі і сакратары. Калі мы дайшлі да паловы залы, вялікі князь і ўсе астатнія падняліся, мы нізка нахіліліся, спачатку князю, пасля направа і налева, на што атрымалі ўзаемныя паклоны. Тады загаварыў адзін з маршалаў, гучна распавядаючы пра абставіны нашага прыезду і называючы нашыя імёны, на што вялікі князь, ужо седзячы, кіўнуў галавою; пасля другі маршал запрасіў нас падысці да падножжа трона. Мы падышлі, вялікі князь падняўся, падаў нам руку і прыняў ліст вялікага магістра і некаторых знаёмых яму прадстаўнікоў Ордэна. Пасля таго як тайны сакратар Мікалай* прачытаў пра мэты нашага пасольства і ціха ў некалькіх словах паведаміў пра гэта вялікаму князю, нас запрасілі ў залу маршалаў, на гэтым скончылася публічная аўдыенцыя.

---

*Мікалай Цыбулька — сакратар вялікага князя.

З серады пачаліся прыватныя сустрэчы, якія адбываліся ў дыпламатычнай канцылярыі, што знаходзілася ў вялікім пакоі, асветленым з трох бакоў вокнамі; яго сцены абабіты самымі вытанчанымі ўсходнімі дыванамі, лаўкі абкладзены падушкамі. Каля галоўнай сцяны вялікі парадны стол, накрыты дыванам, расшытым золатам і срэбрам, на ім высокае, у 3—4 локця распяцце і побач велікакняжацкая карона, меч і залаты жэзл або штосьці наконт скіпетра, не даўжэй двух локцей; апроч таго стаяла яшчэ штосьці багата ўпрыгожанае, падобна на малую сметніцу. Над сталом паміж двума квадратнымі вокнамі, што былі высока прарэзаны, вісеў абраз нейкага святога ў срэбнай рамцы, вышэй яго — барыльеф св. Панны, зроблены з золата і срэбра, перад якім у залатой, вытанчанай работы скрыні гарэла лампада з рымскага крышталю — яна спускалася са столі на залатым ланцугу. У правым баку другі стол, прыгожа накрыты чырвонай тканінай з шаўронамі і кісцямі і завалены паперамі, пёрамі, чарнільніцамі, і за ім сядзеў сакратар. Каля ўваходу стаяў паж, які пазіраў за пясочным гадзіннікам і пры кожным іх абароце біў кійком у шкляны званочак. Калі мы ўвайшлі, вялікі князь падняўся з-за сакратарскага стала, ласкава нас прывітаў, пасадзіў на зручныя крэслы і міласціва разгаварыўся з намі. Пры імя св. Айца папы Бенедыкта XIII ён падняўся і зняў шляпу, калі называліся імёны каралей, рымскага або польскага, не падымаючыся, агаляў галаву, а пры ўпамінанні вялікага магістра толькі трохі нахіляў яе. Ягоны капялюш быў падобны на іспанскае самбрэра. Іншая вопратка складалася з жоўтага шаўковага камзола, зашпіленага да самага горла залатымі гузікамі на залатых пятліцах, ніжняя сукня — ружовая, з татарскай тканіны і чырвоныя скураныя боты з залатымі астрогамі. Пасам служыла нешырокая лента, шытая золатам і зашпіленая багатаю спражкаю, на ёй віселі кручкі для прышпільвання шаблі; зверху накінуты каптан гранатавага колеру, пашыты па-літвінску, толькі каротка падрэзаны; з-за паса выглядала ручка штылета, асыпанага карункамі. Нядрэнна кажа па-нямецку і калі-нікалі ўжывае лацінскія выразы, нібыта жадаючы паказаць сваю адукацыю, бо яго выхаваў брат нашага Ордэна Гана Віндытгейм, які спачатку быў нявольнікам, пасля Кейстутавым прыяцелем у Троках, навучаў ягоных дзяцей і жыў там да самой смерці. Мы размаўлялі пра гэтага рыцара: вялікі князь вельмі хваліў яго і абвяргаў даўнюю пагалоску пра ягонае адступніцтва. Пры гэтым зручным выпадку я прасіў вялікага князя растлумачыць нам тайну чатырох нашых братоў, якія нядаўна збеглі ў Літву, але ён перарваў мяне, мовіўшы, што нічога пра іх не ведае, за выключэннем таго, што яны перайшлі мяжу і з'яўляліся ў некалькіх месцах са сваімі каханкамі. Каму ж верыць?

Твар вялікага князя малажавы, вясёлы і спакойны. Вітаўт амаль не змяніўся з тых часоў, як я бачыў яго ў Інстэрбургу, толькі тады ён не быў такім рухавым. Пры ўсёй сваёй мажнасці ён здаецца хворым. Позірк ягоны зачароўвае, што вабіць да яго сэрца кожнага; кажуць, што ён атрымаў гэтую рысу ад маці: любіць абавязваць болей добразычлівасцю і ласкай, чым дарамі, адносна апошніх іншы раз праз меру шчодры. У адносінах з людзьмі ён строга выконвае ўмоўнасці, і прыдворныя ягоныя вызначаюцца спрытнасцю і пачцівасцю. Ніколі праз меру не п'е моцных напояў, нават у ежы ведае меру. Вялікі князь шмат працуе, сам займаецца кіраваннем края і жадае ведаць пра ўсё; мы часта самі бачылі яго дзівосную дзейнасць і, размаўляючы з намі пра справы, што патрабавалі поўнай увагі, ён у той жа час слухаў чытанне розных дакладаў і прымаў рашэнні. Народ мае свабодны доступ да яго, але ўсякі, хто жадае прыблізіцца, папярэдне дапрашваецца баярынам, які для гэтага назначаны, а пасля просьба да манарха пішацца на паперы або прасіцель сам ідзе з баярынам і вусна перадае яе вялікаму князю. Штодня мы бачылі шмат людзей, што прыходзілі з просьбамі або прыязджалі з аддаленых мясцін з якімнебудзь даручэннем. Цяжка зразумець, як дастае яму часу на столькі заняткаў; штодня вялікі князь слухае літургію, пасля якой, да абеда, працуе ў сваім кабінеце, хутка абедае і пасля нейкі час, таксама нядоўга, застаецца сярод сям'і або забаўляецца выхадкамі сваіх прыдворных блазнаў, затым вярхом на кані ён едзе аглядаць пабудову дома або карабля або чагонебудзь, што заслугоўвае яго ўвагу. Пагрозлівы ён толькі ў вайсковы час, але ўвогуле поўны дабраты і справядлівасці, умее караць і мілаваць. Мала спіць, мала смяецца, болей халодны і разважлівы, чым гарачы; добрую ці дурную навіну атрымае ён, твар яго без пачуццяў, у гэтых адносінах ён вельмі мала змяніўся з тых часоў, як быў у Прусіі»[83].

«ПОЎНЫ ДАБРАТЫ І СПРАВЯДЛІВАСЦІ»

Нельга сумнявацца ў аб'ектыўнасці Кібурга, і дадзеная ім характарыстыка Вітаўта — не ліслівасць госця. Вітаўт прадстае перад намі чалавекам, які падначаліў сваё жыццё служэнню Вялікаму княству. Ён у клопатах, ён вырашае дзяржаўныя справы, толькі ў рэдкія хвіліны можа дазволіць сабе адпачыць, правесці час з сям'ёй. Усё гэта заслугоўвае павагі. Але вось з чым нельга пагадзіцца, дык з сцвярджэннем Кібурга, што Вітаўт пагрозлівы «толькі ў вайсковы час, але ўвогуле поўны дабраты і справядлівасці». Не адмаўляю, што Вітаўт цаніў справядлі-

васць і вышэй за ўсё праўду. Калі неяк хвалілі красамоўства аднаго пана, ён заўважыў: «Жадаў бы, каб ён не гладка мовіў, а праўду»[84]. Аднак скажам так: Вітаўт быў сынам свайго часу — жорсткага і крывавага, са сваімі законамі, а гэтым законам хацеў ці ні хацеў, а павінен быў падначальвацца вялікі князь. Як піша Длугаш, Вітаўт трымаў літвінаў у жаху[85]. Таму, асабліва не задумваючыся, ён выносіў нялюбым яму людзям або злачынцам смяротны прысуд. Адбывалася і такое, што ў падарожжах па краіне, злавіўшы злачынцу, Вітаўт без суда сам хапаў лук і здзяйсняў свой прысуд.

Не даводзіцца шмат казаць і пра Вітаўтаву справядлівасць. Безумоўна, калі справа не датычылася асабіста яго, вялікі князь мог вырашаць справы, і справядліва, а вось калі закрануты яго гонар... Красамоўны выпадак. Восенню 1400 года Вітаўт быў у Полацку і прасіў нямецкіх купцоў пазычыць яму сукна, абяцаючы заплаціць за яго праз некалькі тыдняў. Купцы адмовіліся, спасылаючыся на забарону немцам даваць у пазыку тавары рускім і літвінам. Сябелюбівы Вітаўт у гневе мовіў купцам, што такой абразы яму ніколі не даводзілася ведаць ад немцаў, што яны робяць так, нібыта ў яго землях няма ніводнага сумленнага чалавека. Угневаўшыся, вялікі князь забыўся, што ён уладар, а значыць, павінен весці сябе разважліва. З-за аднаго гэтага выпадку ён гатоў быў разарваць такі выгодны для яго дзяржавы гандаль з Рыгай. Вітаўт піша рыжскаму магістрату, што забарона на пазыку тавару, можа, вельмі зручная для нямецкага купецтва, але для яго, князя, вельмі ганебная і крыўдная, калі яго раўняюць з ягонымі падданымі і сялянамі і адмаўляюць яму ў даверы, а таму ён выдасць закон «на карыць паданых маіх», каб немцы не заходзілі далей Полацка[85]. Рыжскі магістрат папрасіў прабачэння ў Вітаўта, і той суняў свой гнеў, напісаў у Рыгу, што выпадак гэты забывае і гатоў адносіцца па-сяброўску да рыжан.

За сваю абразу Вітаўт помсціў зброяй. Калі ў 1428 годзе наўгародцы назвалі яго здраднікам і п'яніцам, то павёў у Наўгародскую зямлю раць і прымусіў іх кланяцца яму і плаціць вялікі выкуп. Гатовы ён помсціць і за абразу родзічаў. Калі сын малдаўскага ваяводы Эліяш адаслаў сваю жонку і Вітаўтаву сястру Рынгалу, то раззлаваны такой ганьбай вялікі князь пачаў рыхтавацца да вайны. Толькі багатымі наданнямі Рынгале адкупіўся ваявода ад гневу Вітаўта.

А ці можна назваць справядлівымі адносіны Вітаўта да арандатараў велікакняжацкіх маёнткаў? Ён дазваляў ім набіваць кішэні, а пасля знаходзіў падставу і прысуджаў іх да канфіскацыі маёмасці. Як тлумачыць Длугаш: «Гэта азначала — дазваляць губкам насычацца вадкасцю, каб пасля выціснуць іх»[86].

Хаця забраная маёмасць ішла ў дзяржаўную скарбніцу, але гэта не апраўдвае Вітаўта і ніяк не надае яму высакароднасці. Здабытыя вось такімі хітрыкамі грошы Вітаўт мог раздаць потым сваім улюбёнцам. У падобнай шчодрасці больш пахвальбы, жадання праславіцца як па-рыцарску шырокі на руку, чым патрэба душы прынесці камусьці прыемнае і добрае. Так, адпускаючы са сваёй службы польскага рыцара Мікалая Малдржыка, Вітаўт вырашыў у дадатак да ранейшых падарункаў даць яму яшчэ сто коп грошай. Вялікая княгіня Ганна заўважыла, што такімі выдаткамі ён спусташае скарбніцу. І як жа ўспрыняў яе словы Вітаўт? Зусім не як руплівы гаспадар, а як бяздумны хвалько: «Ну, калі так, дык ужо прынясіце яму яшчэ сто коп». Княгіня адгаворвала мужа, а ён увайшоў у ролю шчодрага гаспадара: «Яшчэ сто коп!»[87] На кожныя жончыны адгаворы загадваў прынесці сто коп. Так паўтаралася чатыры разы, пакуль рыцар не атрымаў 800 коп грошай і Вітаўт не зразумеў, што з-за сваёй упартасці ён можа разарыцца.

Затое, калі яго слугі абакралі скарбніцу і ўцяклі ў Ордэн, Вітаўт настойліва патрабаваў іх выдачы. Крыжакі адмаўляліся, і вялікі князь гатовы быў пасварыцца з Ордэнам з-за некалькіх залатых драбніц, абы дамагчыся свайго. Гонар не дазваляў адступіцца.

Часта простыя чалавечыя пачуцці: гнеў, любоў, нянавісць, зайздрасць, пахвальба, фанабэрыя — перамагаюць у ім разважлівасць і дасціпнасць. Але ад чалавека, які надзелены вялікай уладай, залежыць лёс людзей, і калі ён больш падначальваецца сваім адчуваннем, чым розуму, гэта можа стаць не толькі ягонай трагедыяй, але і бядой для ягоных падданых. А бедаў і няшчасцяў нямала хлябнулі людзі па Вітаўтавай віне. Карону велікакняжацкую ён атрымаў, а вось расплаціліся за гэта сваімі галовамі, або няволяй, або спаленымі дамамі тысячы людзей. Расплаціліся сваім жыццём і ягоныя сыны. Ці хоць раз пакаяўся Вітаўт? Летапісы маўчаць пра гэта.

САЮЗ З ХАНАМ ТАХТАМЫШАМ

Палітычныя абставіны ва Усходняй Еўропе складваліся на карысць Вялікага княства Літоўскага і Рускага. Хаця і не быў заключаны мір з Ордэнам, усё ж наконт гэтага вяліся перамовы. Становішча ў Залатой Ардзе таксама спрыяла Вітаўту. Гэтая дзяржава ўжо не ўяўляла тую сілу, што трымала ў паслушэнстве землі Усходняй Русі, Крым, кіпчацкія стэпы.

Гісторыя Залатой Арды другой паловы XIV стагоддзя — гэта трагічны шэраг палацавых пераваротаў і міжусобных войнаў,

бясслаўнае паражэнне на Куліковым полі. Дзейсны хан Сіняй Арды Тахтамыш з дапамогаю сярэднеазіяцкага ўладара Цімура захапіў уладу ў Залатой Ардзе. Русь, якая ўжо была выйшла з-пад татарскай улады, пасля крывавага паходу Тахтамыша ў 1382 годзе на Маскву ізноў стала плаціць даніну Ардзе. Ад Крыма да Арала распаўсюджвалася Тахтамышава ўлада. Адзінаццаць манетных двароў чаканілі грошы ў ягонай дзяржаве. З Венецыі, Германіі, Літвы, Русі, Персіі, Сярэдняй Азіі прыязджалі ў Сарай купцы. Прыдворныя праслаўлялі веліч і заслугі Тахтамыша. Арда нібыта перажывала другое нараджэнне. Але росквіт гэты быў штучны, не праца людзей, а сіла зброі ажывіла Залатую Арду. А вайсковае шчасце пераменлівае. Тахтамыш, які прызнаваў сябе «сынам» Цімура, вырашыў вызваліцца ад «бацькоўскай» апекі «Жалезнай нагі», як здзекліва ён называў свайго сюзерэна.

Адзінаццаць гадоў доўжылася вайна паміж імі. Тахтамыш цярпеў паражэнне за паражэннем. Нарэшце ў 1395 годзе на берагах Церака войска Цімура ўшчэнт разбіла яго войска. Пераможаны хан уцёк у Крым. Цімур пасадзіў на ханскі пасад Кайрычак-Аглана, аднак феадалы заходніх улусаў зрабілі сваім ханам Таш-Цімура. А на Ніжняй Волзе, у Астрахані, уплывовы бек Эдыгей абвясціў ханам Цемір-Кутлуга. Такім чынам, Залатая Арда была падзелена на тры ханствы. Ізноў пачалася міжусобная вайна.

Цімур пайшоў на заходнія улусы, якія падтрымлівалі Таш-Цімура. З уласцівай яму жорсткасцю «Жалезная нага» расправяўляўся з ворагам. Дзе прайшлі ягоныя войскі, заставалася пустэча. У руінах ляжалі багацейшыя золатаардынскія гарады Кафа, Стары Сарай, Бельджымен, Маджар, Азак, Салхат, Астрахань. Цімурава войска дасягнула Русі і захапіла Елец. Гэты паход стаў сакрушальным ударам па Залатой Ардзе. У 1397 годзе да Цімура прыбылі паслы ад Эдыгея, якія прасілі ад імя свайго ўладара прыняць Залатую Арду ў сваё падданства. Цемір-Кутлуг быў прызнаны ханам улуса Джучыева пры ўмове пакорлівасці і падначалення Цімуру.

Вітаўт выношваў задумы скарыстацца міжусобіцай у Залатой Ардзе і пашырыць межы Вялікага княства да Чорнага мора. З гэтаю мэтаю яшчэ ў 1395 годзе па ягонаму загаду кіеўскі князь Скіргайла адваяваў у татарскага князя Бек-Ярына захопленыя Ардою Чаркасы і Звянігарад. Адначасова Вітаўт спрабаваў стварыць антыардынскую кааліцыю. Пэўна, пытанні сумеснай вайны супраць татараў абмяркоўваліся Вітаўтам з Васілём Маскоўскім і мітрапалітам Кіпрыянам у красавіку 1396 года на сустрэчы ў Смаленску. Восенню таго ж года абодва ўладары сустрэліся ў Каломне, дзе, відаць, таксама ішла гавор-



Мініяцюра з «Ліцавога Зводу». Тахтамыш. *XVI ст.*

ка пра вайну супраць Залатой Арды. Пасля Вітаўт у Кіеве сустракаўся з мітрапалітам Кіпрыянам і Ягайлам, і можна дапусціць, што перамовы вяліся пра магчымасць аб'яднанага паходу Вялікага княства Літоўскага, Польшчы і Вялікага княства Маскоўскага, гаварылі таксама пра магчымасць заключэння царкоўнай уніі і ўключэнне ў склад літвінскай мітраполіі Русі, Малдавіі і часткі Балгарыі. Між тым на паўднёвых

межах Княства абнаўляліся ўмацаванні і будаваліся новыя. З Польшчы паступала ўзбраенне і гарматы. З Угорыі быў выкліканы Свідрыгайла. Каб князь не думаў скарыстацца адсутнасцю Вітаўта і з дапамогаю крыжакоў не ваяваў Літву, ён атрымаў Ноўгарад-Северскі і Усходняе Падолле.

Хан Тахтамыш тым часам працягваў барацьбу з Цімурам. Аднак Васіль Дзмітрыевіч перастаў плаціць яму даніну з Паўднёва-Усходняй Русі, і хану не было за што трымаць войска. Тахтамыша магла выратаваць багатая Кафа, і ён павёў сваё войска на гэты горад. Кафа вытрымала аблогу, а з тылу ўдарыла войска Цемір-Кутлуга. Разбіты Тахтамыш у 1397 годзе ўцёк у Кіеў і папрасіў у Вітаўта дапамогі. Відаць, той узамен патрабаваў прызнання за Вялікім княствам Звянігарада і Чаркасаў. Для Тахтамыша ён выдзеліў землі на паўднёвых ускраінах сваёй дзяржавы каля Чаркас і Канева, такім чынам уключыў атрады беглага хана ў абарончую сістэму Літвы.

Мабыць, пасля ад'езду пасольства Кібурга Вітаўт паспяшаўся ў Кіеў, дзе ўжо сабралася войска з усёй Літвы і Падолля. Войска выступіла ў паход напрыканцы лета. Яно дайшло да нізоўяў Дона — месца традыцыйных ардынскіх качаванняў. Адтуль Вітаўт выступіў у Крым. 8 верасня каля Кафы ягонае войска разбіла атрады мясцовых бекаў і мурзаў. Крым ізноў апынуўся ў руках Тахтамыша, які адразу пачаў рассылаць па Ардзе позвы, сабіраць сваіх прыхільнікаў. Вітаўт жа вывеў з Крыма шматлікі палон. Адных захопленых татараў ён размясціў на паўднёвых межах, другіх падараваў Ягайлу, трэціх рассяліў па Літве. Некаторыя выказвалі апасенні, што небяспечна сяліць на Літве такі люты народ. Вітаўт мудра адказаў: «Не, я другога меркавання, таму што дабрынёй і найдзікага звера ўдаецца прыручыць»[88]. Ведаў гэтую мудрасць — дабрыня мацней за сілу. Ведаў іншую — каб быць добрым, трэба быць моцным. Крымскія татары, выведзеныя Вітаўтам, а таксама іх нашчадкі вераю і праўдай служылі сваёй новай радзіме, са зброяй у руках абаранялі яе ад ворагаў.

Перамога ў Крыме дорага каштавала Вітаўту — загінуў ягоны брат Патрыкій. З шасці Кейстутавых сыноў засталося толькі двое — Вітаўт і Жыгімонт, які яшчэ сядзеў заложнікам у крыжакоў.

Нядоўга ўладарыў Тахтамыш. Напрыканцы зімы 1398 года Цемір-Кутлуг выгнаў яго з Крыма. Былы золатаардынскі хан уцёк у Кіеў. Ніканаўскі летапіс так перадае сутнасць перамоў паміж Вітаўтам і Тахтамышам. «Пойдзем возьмем у палон зямлю Татарскую, пераможам цара Цемір-Кутлуя, возьмем царства яго і падзелім багацце і вотчыны яго, і пасадзім у Ардзе на царства яго цара Тахтамыша, і на Кафе, і на Азове, і на Кры-

му, і на Астрахані, і на Заяіцкай Ардзе, і на ўсім Прымор'і, і на Казані; і тое ўсё будзе нашым, і цар наш, а мы не толькі Літоўскай зямлёю і Польскай валодаць будзем, і Севераю, і Вялікім Ноўгарадам, і Псковам, і Немцы, але і ўсімі вялікімі княствамі Рускімі, і з усіх вялікіх князёў Рускіх пачнем дані і аброкі браць, а яны нам скарацца і служаць і волю нашу чыняць, як мы хочам і загадваем ім»[89].

Арыгінальнага тэксту дамовы Вітаўта з Тахтамышам не захавалася. А.Прахаска паводле пазнейшых ярлычкоў крымскіх ханаў вялікім князям літоўскім аднавіў прыкладны тэкст дамовы. Тахтамыш за дапамогу ў вяртанні ханскага пасада перадаваў Вітаўту наступныя землі: Кіеўскую, Уладзімірскую, Луцкую, Смаленскую, Падольскую, Сокальскую, Звенігародскую, Чаркаскую, Іхалтаеўскую — і гарады: Хачыбей, Маяк, Глінск, Жолваж, Пуціўль, Бірынь, Сінец, Хоцін, Лосічы, Хотмышль, Чарнігаў, Рыльск, Курск, Мілалюб, Мужач, Аскол, Старадуб, Бранск, Мцэнск, Любуцк, Тулу, Ратно, Казельск, Пронск, Валконск, Іспаш, Данец, Яб-гарадок, Балыкты, Корсунь, Чорны горад, Дашаў, Нямір, Тушынь, Ходараў[90].

Большасць з пералічаных зямель і гарадоў уваходзіла ў склад Вялікага княства, і сваім ярлыком Тахтамыш гэта афіцыйна прызнаваў. Прызнаў ён за Вялікім княствам і Прычарнамор'е (у спісе названы Хачыбей — сучасная Адэса — і Чорны горад, які знаходзіўся над Днястроўскім ліманам), якое адышло да Літвы у час паходу Вітаўта ў 1397 г. Верагодна, на гэты час у складзе Вялікага княства былі Мцэнск, Любуцк, Тула. Як вынікае з ярлыка, Вітаўт патрабаваў ад Тахтамыша прызнання за Вялікім княствам былых золатаардынскіх зямель, якія ўвайшлі ў склад дзяржавы.

Вайне з Залатой Ардой Вітаўт імкнуўся надаць ідэалагічны характар справядлівай барацьбы супраць «няверных», што захапілі хрысціянскія землі. «Я забяспечыў назаўсёды мір і незалежнасць Літвы ад мечаносцаў, цяпер я павінен вызваліць і астатніх хрысціян ад прыгнёту іншых прыгнятальнікаў», — заявіў вялікі князь[91].

Як бачым, у Маскве Вітаўт не збіраўся сядзець. Наадварот, хацеў ён вызваліць Усходнюю Русь ад ардынскага ярма. Маскоўскі князь Васілій Дзмітрыевіч быў з ім у саюзе і прыслаў да цесця дружыну на чале з героем Кулікоўскай бітвы Дзмітрыем Валынскім.

Вітаўт прасіў польскага караля Ягайлу, каб той паспрыяў яму дамагчыся ў папы рымскага абвяшчэння крыжовага паходу на татар. Гэта дало б Вітаўту дадатковыя сілы еўрапейскага рыцарства і матэрыяльную дапамогу каталіцкага касцёла. Аднак быў і палітычны разлік. Слава абаронцы хрысціян і пераможцы «няверных», асабліва пасля скрышальнага паражэння еўрапейскага войска ад турак у бітве пад Нікапалем у 1396 г., падняла б аўтарытэт Вітаўта ў хрысціянскім свеце і ў вачах папскай курыі. 4 мая 1399 года папа Баніфацый IX выдаў булу, якой прадпісваў польскім святарам прапаведаваць крыжовы паход на татараў, абяцаў адпушчэнне грахоў тым, хто прыме ў ім удзел. Толькі на заклікі святароў адклікнулася няшмат польскіх рыцараў. І вось чаму.

У 1398 годзе каралева Ядвіга прыслала да Вітаўта патрабаванне плаціць даніну. Тут бы Вітаўту не паддацца пачуццям, праявіць розум і нават хітрасць. Не, ён адчувае сваю сілу і дзейнічае адпаведна. У Вільні вялікі князь склікаў сойм і спытаўся ў літвінскіх, аўкштайцкіх і ўкраінскіх феадалаў, ці лічаць яны сябе падданымі польскай кароны, ці абавязаны плаціць ёй даніну. І пачуў адказ, які і чакаў: «Мы не падданыя Польшчы ні пад якім выглядам; мы заўсёды былі вольнымі, нашы продкі ніколі палякам не плацілі, не будзем і мы плаціць, застанемся пры нашай ранейшай вольнасці»[92]. Па сутнасці гэта было адкрытае непрызнанне ўмоў Крэўскай уніі. Што за гэтым магло атрымацца? Ягайла заняў нейтральную пазіцыю, але вось абражаная Ядвіга ўсяляк стала перашкаджаць удзелу польскіх рыцараў у Вітаўтавым паходзе. Паколькі прама яна не магла ім забараніць ісці ў паход, бо тым самым выступіла б супраць папскага прадпісання, дык каралева абвясціла, што падчас малітвы перад распяццем выява Хрыста прадказала ёй Вітаўтава паражэнне. Гэтага было дастаткова для таго, каб большасць рыцараў засталася дома. А яны спатрэбіліся б у бітве з татарамі.

Але з другога боку можна дапусціць, што вялікі князь наўмысна не стаў хаваць сваіх адносін да Польшчы. Чаму? Можа, таму, што асабліва не верыў у дзейсную падтрымку палякаў, якія зусім не былі зацікаўлены ў яго ўзмацненні. А вось сімпатыі тых феадалаў, якія адстойвалі незалежнасць Вялікага княства, яму б не замінулі. І ён не прызнаў улады польскай кароны над Вялікім княствам, чым вельмі іх задаволіў. Відаць, такім ходам Вітаўт купіў сэрцы многіх сваіх падданых, што з радасці ахвотна згадзіліся ісці на Залатую Арду.

Пасля віленскага сойму Вітаўт выправіў паслоў у Ордэн з прапановаю пачаць мірныя перамовы. Ён баяўся, што Ягайла апярэдзіць яго і заключыць сепаратны мір з крыжакамі супраць Літвы. Конрад фон Юнінген прыняў прапанову і прыслаў сваіх паўнамоцных для папярэдняга заключэння міру. 23 красавіка ў Гародні Вітаўт падпісаў мірную дамову з Ордэнам. Ён ішоў на значныя ахвяры: саступаў крыжакам частку заходняй Жамойці (хаця, відаць, асабліва не перажываў з гэтай нагоды, бо Жамойць не ўваходзіла ў склад Вялікага княства), абяцаў пабудаваць для Ордэна на літвінскіх межах некалькі замкаў. За апошнюю паслугу князь Жыгімонт павінен быў атрымаць волю. Падзялілі «сферы ўплыву» — Вітаўт не стане перашкаджаць Ордэну заваёўваць Пскоў, а Ордэн дапаможа яму завалодаць Вялікім Ноўгарадам. Дамовіліся і пра дапамогу ў войнах з агульнымі ворагамі. Гэтае пагадненне Вітаўт заключыў у абыход Ягайлы, тым самым яшчэ раз заявіў пра сваю незалежнасць ад польскага караля. Абодва бакі засталіся задаволенымі: Ордэн атрымаў новыя землі, раз'яднаў саюз Польшчы і Літвы, а Вітаўт забяспечыў мір з крыжакамі і заручыўся іх падтрымкаю. Было вырашана, што магістр і вялікі князь сустрэнуцца ў пачатку кастрычніка на Салінскім возеры, каб падпісаць канчатковую дамову.

Адпусціўшы ордэнскіх паслоў, Вітаўт з Гародні адправіўся ў Кіеў. Летам ён здзейсніў паход на землі Арды. Уздоўж Дняпра войска Вялікага княства выйшла да берагоў Чорнага мора. Існуе паданне, што Вітаўт нырнуў са скалы ў мора і, праплыўшы палову мілі, вярнуўся на бераг. Так, паводле старажытнага літвінскага звычая, ён паказаў, што цяпер Чорнае мора належыць Літве.

Каля вусця Дняпра на правым яго беразе па Вітаўтаваму загаду была пабудавана каменная крэпасць Святаіванаўская, а ўверх па цячэнні каля выспы Тавань, у самым вузкім месцы ракі, таксама ўзвялі каменную цвержу. Мэта гэтага паходу была ўзяць пад сваю ўладу Ніжняе Падняпроўе і тым самым цалкам кантраляваць Дняпроўскі гандлёвы шлях, а таксама перашкодзіць Залатой Ардзе нанесці ўдар па Вялікаму княству з Крыма. Што ж, рыхтаваўся Вітаўт да вайны грунтоўна, агароджваў з усіх бакоў Вялікае княства ад небяспекі. Не забыўся і пра Маскву. Туды летам ездзіў смаленскі намеснік Ямант. Нам невядомыя вынікі ягонай перамовы з Васілём, але, відаць, гаворка ішла пра ўдзел маскоўскага князя ў антыардынскай кааліцыі. І такая дамоўленасць была дасягнута. Васіль паслаў да Вітаўта атрад на чале з Дзмітрыем Валынскім.

12 кастрычніка Вітаўт у суправаджэнні князёў Уладзіміра Слуцкага, Юрыя Пінскага, Міхайлы Заслаўскага, Аляксандра



М.Цюнд. Замак у Гародні. *1568 г.*

Лукомскага, Івана Гальшанскага, Івана Друцкага, баяраў Мінгайлы Ашмянскага, Гаштольда Крэўскага, Яманта Клецкага, Осіпка Барташа, Карэйкі з Меднікаў, маршалка Чупрыны і разам з жонкаю прыехаў на Салінскае возера на сустрэчу з вялікім магістрам, які прыбыў сюды ў акружэнні лівонскага магістра, біскупаў і ордэнскіх вышэйшых асоб. Шыкоўнасць і багацце ўпрыгожанняў княгіні Ганны і Вітаўтавай світы здзівілі рыцараў. Але і крыжакі ўразілі Вітаўта і ягоных паплечнікаў шчодрымі падарункамі: залатымі даспехамі, конямі, лоўчымі сокаламі. І без гэтых шчодрых паднашэнняў Вітаўт быў згаворлівы. На з'ездзе канчаткова зацвердзілі акты Гарадзенскай дамовы, вызначаны межы той часткі Жамойціі, якая адыходзіла да Ордэна.

Перамовы ўвесь час суправаджаліся баляваннямі. На адным з іх літвінскія князі і баяры абвясцілі Вітаўта «каралём Літвы і Русі». Немцы ахвотна падтрымалі іх і пажадалі вялікаму князю зберагчы назаўжды за сабою гэты тытул. Вітаўт, добра разумеючы, што паспешлівымі рашэннямі можа выклікаць гнеў Ягайлы, а сварыцца з ім напярэдадні паходу недарэчна, сціпла адказаў: ён не лічыць сябе вартым такога тытулу. Але ў дамове падпісаўся: «вярхоўны князь Літвы і Русі»[93] — тым тытулам, які належаў Ягайлу.

Пасля перамоваў Вітаўт паехаў у Гародню. Тут ён разам з жонкаю ледзь не згарэў. У пакоі, дзе пачываў князь, успыхнуў пажар. І толькі дзякуючы ручной малпе, што крыкамі разбудзіла Вітаўта, яму і Ганне ўдалося выскачыць з агню. Можа, гэта Ягайла праз сваіх агентаў паспрабаваў фізічна ўбраць непакорлівага васала, каб на ягонае месца паставіць болей згаворлівага. Ці то была простая выпадковасць? Вітаўт загадаў замест спаленага драўлянага замка пабудаваць каменны.

Гэты год быў пераломным для Вітаўта. Ён адкрыта заявіў пра разрыў з Польшчай. «Кароль Літвы і Русі» — вось галоўная мэта, якую ставіў перад сабою Вітаўт. І, відаць, ён рабіў дзеля гэтага патрэбныя захады, бо ў лютым 1398 года да Ордэна даходзілі чуткі пра жаданне Вітаўта прасіць сабе каралеўскай кароны ў папы.

ТРАГЕДЫЯ НА ВОРСКЛЕ

Вясною 1399 года ўсё было падрыхтавана для паходу. У Кіеў сабраліся літвінскія харугвы. Невялічкі атрад у сто рыцараў прыслаў Ордэн. Чатырыста вояў налічваў польскі атрад. Прыехаў да Вітаўта і нашчадак Мамая князь Лёкса, які па назве аднаго са сваіх гарадоў — Глінеска атрымаў прозвішча Глінскі. Лёкса біў чалом, каб Вітаўт узяў ягоныя землі пад сваю ўладу.

Вітаўт прыняў Лёксу пад сваю руку і дараваў яму новыя вотчыны.

Па імёнах князёў, якія ўдзельнічалі ў паходзе і адзначаны ў летапісах, можна меркаваць, што ў войску былі смаляне пад кіраўніцтвам Глеба Смаленскага, дручане на чале са сваім князем Андрэем Друцкім, заслаўцы з князямі Міхайлам ды Хведарам Яўнутавічамі. Ішлі ў паход князь Свіслацкі ды князь Сцяпанскі. Безумоўна, удзельнічалі ў гэтым паходзе і харугвы былога Гарадзенскага княства, у якім некалі княжыў Вітаўт. Пэўна, прыйшла харугва з Вільні. Нельга дапусціць, што не былі ў паходзе атрады з Полацка, Пінска, Турава, Слуцка, Менска, Мсціслаўля, Віцебска, Бярэсця. Усяго войска Вялікага княства Літоўскага разам з войскам Тахтамыша налічвала дзесьці 70 тысяч[94].

Рыхтавалася да вайны і Залатая Арда, якая сабрала шматлікае войска (называецца лічба ў 200 тысяч вояў)[95]. Аднак гэтыя лічбы яўна завышаныя. Напрыклад, у самай вялікай бітве таго часу пад Нікапалем у 1396 годзе войска ўгорскага караля Жыгімонта Люксембургскага налічвала 10 тысяч чалавек, а ў яго праціўніка, турэцкага султана Баязеда, было 12 тысяч. Улічваючы мабілізацыйныя магчымасці ВКЛ, можна назваць лічбу ў 25—30 тысяч чалавек. Магчыма, войска Залатой Арды было большае — 35—40 тысяч чалавек.

Цемір-Кутлуг прыслаў да Вітаўта паслоў: «Выдай мне цара беглага Тахтамыша, — заявіў хан Залатой Арды. — Ён мой вораг, не супакоюся, пакуль ён жывы і знаходзіцца ў цябе, таму што пераменлівае нашае жыццё: сёння хан, а заўтра ўцякач; сёння багаты, а заўтра жабрак; сёння шмат сяброў, а заўтра ўсе ворагі. Я баюся і сваіх; а хан Тахтамыш мне чужы і мой вельмі злосны вораг, выдай яго мне, а ўсё, што з ім, можаш узяць сабе». Вітаўт ганарліва адказаў: «Тахтамыша не выдам, а з Кутлуем убачуся сам»[96].

18 мая войска Вялікага княства Літоўскага і Рускага выступіла з Кіева. Вітаўт павёў яго да ракі Ворсклы. Ад віжаў вялікі князь ведаў, што менавіта сюды рухаецца з татарскім войскам Цемір-Кутлуг. Разгадаў ён і ханскую задуму: імкліва напасці на Тахтамыша, загоны якога знаходзіліся на правым беразе Дняпра, і, перш чым яны злучацца з войскам Вялікага княства, разбіць іх.

За кароткі тэрмін літвінскае войска пераправілася цераз чатыры рэчкі і прайшло па левым беразе Дняпра 50 міляў. Гэта было рэдкае відовішча. Дзесяткі тысяч закутых у браню вояў. Коні цягнулі каваныя жалезам вазы са зброяй і харчовымі запасамі. У момант небяспекі вазы можна было паставіць колам — гатовае ўмацаванне.



Мініяцюра з «Ліцавога Зводу».
Перамовы Вітаўта з Эдыгеем. *XVI ст.*

Трывожна было на душы ў Вітаўта і радасна. Такую раць вывеў на бітву! А калі паражэнне? Цяжка было паверыць, што яго шматтысячнае войска, гэтую сілу, можна перамагчы. Па дарозе да Вітаўта далучаліся харугвы, якія не паспелі на збор у Кіеў: прывёў сваіх вояў падольскі намеснік Спытка, падышоў Тахтамыш з лёгкай конніцай.

5 жніўня войска Вітаўта дасягнула Ворсклы. Ля сутоцы яе з Дняпром спыніліся. За ракой у стэпе ўжо стаялі тумены* Цемір-Кутлуга. Хан не адважыўся перапраўляцца цераз раку і прыняць бой. На дапамогу яму спяшаўся з крымскімі татарамі

**Тумен* — вайсковая адзінка ў мангола-татарскім войску, якая налічвала 10 тысяч вояў.

Эдыгей. Трэба было выйграць час. Цемір-Кутлуг адправіў да Вітаўта паслоў. «Навошта ты пайшоў на мяне? Я ж не чапаў ні тваёй зямлі, ні тваіх гарадоў, ні тваіх сёлаў?» — перадаў пасол ханскія словы. Вітаўт не ведаў пра набліжэнне Эдыгея і прымірэнчыя словы Кутлуга ўспрыняў як боязь перад сваёю сілаю. Ганарлівы і самаўпэўнены вялікі князь адказаў: «Бог скарыў мне ўсе землі, скарыся ж і ты мне і будзь мне сынам, а я табе буду бацькам; і давай мне кожнае лета даніну. Калі ж ты не пажадаеш скарыцца, дык будзеш маім рабом і ўсю тваю арду знішчу мячом!»[97] Атрымаўшы такі адказ Цемір-Кутлуг папрасіў тры дні на роздум. І гэтую хітрасць Вітаўт не разгадаў. Якая легкадумнасць лічыць, што Цемір-Кутлуг прыйшоў з войскам на Ворсклу, каб прызнаць сябе «сынам» вялікага князя літоўскага! Гэтыя тры дні Вітаўт хану даў і не ведаў, што падараваў свайму ворагу перамогу над сабою.

Вітаўт правёў яшчэ раз агляд свайму войску. Ваяры гарцавалі на конях перад сваім важаром. Немаведама як — ці прытупаў за войскам, ці жыў побач — з'явіўся ў стане сівабароды стары і вітаў кожнага князя і рыцара па імёнах. Вітаўт запрасіў яго ў свой шацёр. Хто ён такі, не адкрыўся. Адно прадказаў — страшэннае паражэнне літвінам. Вітаўт не паверыў старому.

Каб Вітаўтавы воі з-за недахопу харчу не сталі патрабаваць пачынаць бітву, татары прыслалі ў іх стан чароды авечак, валоў, іншага правіянту. А час ішоў.

Эдыгей з крымскімі татарамі паспеў да Ворсклы і, даведаўшыся пра Вітаўтавы ўмовы, мовіў Цемір-Кутлугу: «Лепш нам памерці, чым быць гэтаму»[98]. Колькасная перавага цяпер была на татарскім баку, але літвінскае воінства акружыла сябе некалькімі шэрагамі акаваных жалезам вазоў. А па баках іх стан ахоўвалі рэкі Ворскла і Дняпро. Чорнымі жорламі на татар глядзелі гарматы. Пры штурме літвінскага стану шансаў на перамогу ў татар не было. Затое ў адкрытым полі лёгкая татарская конніца мела і колькасную, і маняўровую перавагу над літвінскай. Цемір-Кутлуг і Эдыгей вырашылі выманіць Вітаўта са стану і ў стэпу даць яму бой.

Раніцай 12 жніўня войска Эдыгея рушыла з татарскага коша па беразе Ворсклы. Вітаўт, які палічыў, што гэта і ёсць войска Цемір-Кутлуга, таксама вывеў свае дружыны са стану і рушыў паралельна па другім беразе. Для абароны стана ён пакінуў Тахтамыша. Прайшоўшы тры мілі, войскі спыніліся і пачалі шыхавацца ў баявы лад. Перад пачаткам сечы Эдыгей захацеў перамовіць з Вітаўтам: «Пабачся сам са мною, о добры і ўдалы Вітаўце», — перадаў ён праз пасла. Абодва важары пад'ехалі да рэчкі і праз яе пачалі размову. «Вялікі князь Літоўскі! Цар



Мініяцюра з «Ліцавога Зводу». Бітва на Ворскле. *XVI ст.*

Цемір-Кутлуг хацеў справядліва прызнаць сябе тваім сынам, бо ты старэйшы за яго. Але трэба табе зразумець і тое: бо ты вельмі мудры і ... і ты маладзейшы за мяне, старога; таму мне трэба быць тваім бацькам, а табе — маім сынам і плаціць мне штогадовую даніну і выбіваць мой сцяг на літоўскіх грошах»[99]. Угневаны Вітаўт спыніў перамовы і гатоў быў падаць знак да бітвы, але кракаўскі ваявода Спытка, адчуўшы небяспеку, выклікаўся быць пасрэднікам у перамовах з Эдыгеем. Крымскі ўладар настойваў на сваіх умовах.

Калі татарскія ўмовы абвясцілі на вайсковай радзе, князі і рыцары абурыліся і запатрабавалі ад Вітаўта пачынаць бітву. Разважлівыя папярэджанні Спыткі адразу ж адхілілі. Фанабэ-

рысты паляк Павел Шчуркоўскі пыхліва мовіў: «Калі табе шкада прыгожай жонкі і вялікіх скарбаў, дык не перашкаджай задавальненню змагацца астатнім, якія абыякавыя да смерці». На што кракаўскі ваявода адказаў: «Я зрабіў усё, што мог, каб віна дарэмна пралітай крыві не пала на маю галаву. Цяпер жадаю вам такой дзейнасці са зброяй у сечы, якую вы праявілі тут языком. «Паміж табою, — звярнуўся Спытка да Шчуркоўскага, — і мною няхай Бог сёння будзе суддзёй! Спадзяюся, што пакуль зойдзе сонца, я памру слаўнай смерцю, а ты ганебна ўцячэш!»[100]

Не розум, не развага перамаглі на радзе, а пачуцці і амбіцыі, а яны дрэнныя дарадчыкі. Было вырашана даць татарам бой. Асабліва выказалі прагу змагацца маладыя літвінскія віцязі, якія лаялі старэйшых: «Мы хочем битися, а не мирити; битися, битися пршили с мо». Шаблі ды мячы — з похваў! «Біціся!» Абрадаваны Вітаўт мовіў: «Поневаж вижу вашего рицарства цноту, и тую до бою смелость и мужное серце, толко сполне мужество свое окажете, а я вас не выдам»[101].

Паводле «Хронікі» Бярнарда Вапоўскага, Вітаўт патрабаваў ад Эдыгея адступіць за Дон. Палякі і ліцвіны гатовы заключыць мір з Тамерланам і верна яго захоўваць: «Калі ты гэтую прапанову не прымеш, Палякі і Ліцвіны не забыліся на зброю, і вольнасць і межы свае ад усялякіх крыўд непрыяцельскіх засланіць могуць». Адказ Эдыгея быў такі: «Тамерлан кароль каралёў, вялікі цар Азіі, які ў крывавых бітвах скарыў Персаў, Медаў, Туркаў, Егіпцян, пастанавіў таксама Еўропу да панстваў сваіх далучыць, а калі Польшча і Літва падначаляцца Тамерлану і прылежна будуць плаціць даніну і заложнікаў паставяць, адвяду свае войскі за Дон». Паслы Вітаўта адказалі, што палякам і ліцвінам даражэйшая за жыццё воля[102]. Гэтае паведамленне Вапоўскага, як і паведамленне Ніканаўскага летапісу, указвае на мэту паходу Цемір-Кутлуга і Эдыгея — пакарэнне Вялікага княства Літоўскага і Польшчы, а пры спрыяльным ходзе падзей і нашэсце на Еўропу. Такім чынам, войска Вітаўта на Ворскле бараніла свабоду сваёй краіны і хрысціянскага свету.

І вось загучаў над шэрагамі літвінскага войска баявы заклік труб. Вітаўт на кані аб'ехаў войска і расставіў яго. Кожнага водцу называў па імені і заклікаў мужна біцца з ворагам.

Бітва пачалася за дзве гадзіны перад заходам сонца. Татары першымі пайшлі ў наступ. Лёгкая татарская конніца пераправілася цераз Ворсклу і віхрам наляцела на літвінаў, якія сустрэлі іх агнём гармат, градам стрэл з лукаў і куш. А пасля абодва войскі сышліся ў сечы. Вызначыўся Дзмітрый Карыбутавіч, які на чале сваёй дружыны напаў на татарскія шэрагі «и

там секлся долго, з коней татар валячи». «Госпадзі, дапамажы!», — падбадзёрвалі сябе літвіны. «Крик, гук отвсюль валяючихся як волном морским для ветров бурачихся, кули, стрелы, як дождь, свищучи, летят з обу сторон в полях як рой пчолный; кричат, шабли, мечи, гримят, зброи от копий трещат»[103]. Татары не вытрымалі наступу літвінаў і крок за крокам пачалі адступаць да Ворсклы. Вітаўт у акружэнні аховы з'яўляўся ў розных месцах бітвы і падтрымліваў баявы дух сваіх вояў. Яны ўжо верылі ў перамогу. Яшчэ адзін удар — і вораг пабяжыць. Тут і з'явіўся са сваім войскам Цемір-Кутлуг. Ён пераправіўся цераз Ворсклу каля літвінскага стану. Тахтамыш не толькі не спыніў ворага, а, разрабаваўшы стан, кінуўся наўцёкі. Цемір-Кутлуг без перашкод зайшоў у спіну літвінскаму войску. За воблакам парахавога дыму, якое засціла месца сечы, цяжка было заўважыць падыход новай татарскай раці. Град стрэл абрынуўся на літвінаў ззаду. А пасля ў справу пайшлі і вострыя татарскія шаблі. Становішча ўскладнілася і тым, што раптам паднялася бура. Рэзкі вецер дзьмуў збоку, біў у твар літвінам камякамі зямлі, валіў з ног. А татары з усіх бакоў грамілі хрысціянскае войска. Парушыліся баявыя шэрагі, і цяжка было наладзіць абарону. Пачалася паніка. Той, хто мог выратавацца, уцякаў. Адным з першых павярнуў свайго каня з сечы пан Шчуркоўскі. Самога Вітаўта сілком увялі ягоныя грыдзі*. Вялікі князь прапанаваў ісці за ім і Спытку: «Ты не зганьбішь сябе ўцёкамі, а заслужыш пахвалу, таму што выратуеш мяне»[104]. Храбры паляк выбраў геройскую смерць. А на полі гінула літвінскае войска. Амаль усе, хто не вырваўся з акружэння, паляглі пад татарскай зброяй.

Татары захапілі Вітаўтаў абоз і ўсе гарматы. Але і пераможцы панеслі значныя страты. Цемір-Кутлуг атрымаў небяспечную рану, ад якой неўзабаве памёр**

Разбіўшы войска Вялікага княства, татары рушылі ў пагоню за ягонымі рэшткамі. Цемір-Кутлуг са сваімі туменамі пайшоў на Кіеў, а Эдыгей — на поўдзень, каб пераправіцца цераз Дняпро каля выспы Тавань, дзе рака мела не болей 300 крокаў ушыркі.

Ніканаўскі летапіс узгадвае пра 74 загінуўшых князёў. Сярод іх Андрэй Альгердавіч Полацкі, Дзмітрый Альгердавіч Бранскі, Глеб Святаславіч Смаленскі, Міхайла Яўнутавіч Заслаўскі, Дзмітрый Данілавіч Валынскі-Баброк, Фёдар Патрыке-

---

*Грыдзь — ахоўнік.

**Верагодна, смяротную рану нанёс яму Свідрыгайла. У крыніцы ўказвалася: «...А князь ... Олгердович самого царя убиша...» (Начало великого княжения Литовского. С. 79.)

евіч Рыльскі, Андрэй і Іван Друцкія, Дзмітрый, Леў, Глеб і Сымон Карыятавічы, Гальшанскі, Міхайла і Аляксандр Падбярэзкія, Іван Юр'евіч Белзскі, Васіль Барэйкавіч, Ямант Тулунтавіч, Іван Нос, а таксама кракаўскі ваявода Спытка і іншыя. Шматлікія страты былі ў шэрагах простых воінаў. Як адзначаў летапіс, загінула «многае мноства хто зможа падлічыць»[105]. Рэшткі войска, якія вырваліся з акружэння, татары праследавалі да самага Кіева, «праліваючы кроў, як ваду»[106].

Вітаўт з невялікім атрадам у суправаджэнні брата Жыгімонта, Свідрыгайлы, комтура Рагніты Марквалда Салазбаха ўцёк з поля сечы і трое сутак блукаў па стэпах, пакуль не паабяцаў правадніку, сыну Лёксы Глінскага Івану: «Толькі вывядуць мяне твае вожы да маёй Украіны, да каторых маіх гарадоў ці валасцей, і я тымі гарадамі і валасцямі цябе памілую»[107]. Тады Іван вывеў уцекачоў да гарадка Хароблля. Вітаўт стрымаў сваё слова і ўзнагародзіў князя Івана Хароблем.

Жахлівы прывід татарскага нашэсця раптам ператварыўся ў рэальнасць. Але Вітаўт не паддаўся адчаю. Прыбыўшы ў Кіеў, ён сабраў рэшткі свайго войска, склікаў апалчэнне і загадаў рыхтаваць горад да абароны. А сам выступіў насустрач Эдыгею. Рызыкоўнае, але ўсё ж правільнае рашэнне — не даць Эдыгею пераправіцца цераз Дняпро. Невялікае войска Вітаўта імклівым маршам дайшло да выспы Тавані. Дзень і ноч кіпела праца. Вітаўт умацоўваў крэпасць, дняпроўскі бераг. Сваёй дзейнасцю, рашучасцю зноў скрыжаваць зброю з ворагам Вітаўт падняў дух у вояў. Яны рваліся ў сечу. І калі Ягайла прыслаў ліст з абяцаннем дапамогі, Вітаўт самаўпэўнена адказаў: «Гэта не трэба. Калі не толькі Эдыгей, але і сам Тамерлан з усімі войскамі адважыцца на пераправу цераз Дняпро, я магу затрымаць яго»[108]. Усё ж Вітаўт не драматызаваў паражэнне на Ворскле і не губляў надзеі на лепшае.

Вопытны Эдыгей ухіляўся ад бітвы. Татары пайшлі паўз Тавань у Крым. Разрабаваўшы Таўрыду, Эдыгей вярнуўся на Дняпро, але зноў сустрэў каля Тавані літвінскае войска. На гэты раз ён не пераправіўся цераз раку і пайшоў у Залатую Арду. Нічога значнага не дамогся і Цемір-Кутлуг. Ён з войскам падышоў да Кіева, атрымаў ад месцічаў выкуп у 3000 рублёў, ад Пячэрскай Лаўры 30 рублёў і павярнуў назад. Усё ж асобныя татарскія загоны пераправіліся цераз Дняпро і парабавалі землі аж да Луцка. Так былі выратаваны паўднёвыя межы Вялікага княства ад спусташальнага татарскага нашэсця. Заслуга ў гэтым перш за ўсё тых вояў, што загінулі каля Ворсклы. Перамога татарам каштавала дорага, і сіл для нашэсця ў іх ужо не было.

У ПОШУКАХ ВЫЙСЦЯ

Палітыка Вітаўта першыя гады XV стагоддзя была накіравана на пазбаўленне трагічных вынікаў ворсклаўскага паражэння. Ён кідаўся з аднаго краю сваёй дзяржавы на другі, абараняючы яе ад асмялелых суседзяў. Адно суцяшала — знікненне пагрозы татарскага нашэсця. Пасля смерці Цемір-Кутлуга Эдыгею было ўжо не да Літвы. На берагах Волгі з'явіўся Тахтамыш. Эдыгей са згоды Цімура пасадзіў на ханскі пасад Шадзібека, брата памерлага хана. Тахтамыша ж падтрымалі заўральскія татары Сіняй Арды, у якой некалі ён уладарыў. Даводзілася цярпліва чакаць Цімуравай смерці — вось тады і спадзяваўся Тахтамыш адваяваць ханскі пасад Залатой Арды. А пакуль сабіраў войска. Асцярожны і хітры Эдыгей і не думаў працягваць вайну з Вялікім княствам Літоўскім і Рускім. Падобная авантура магла дорага каштаваць. Так што Залатая Арда не пагражала Вялікаму княству. А сапраўдная пагроза Вітаўту з'вілася ў абліччы... Ягайлы.

Праз тры дні пасля таго, як літвінскае войска засеяла касцямі берагі Ворсклы, а сам Вітаўт блукаў па стэпу, уцякаючы ад татар, у Кракаве хавалі каралеву Ядвігу. Кароткі век выдаўся гэтай жанчыне. Палітычныя інтарэсы польскіх магнатаў скалечылі яе лёс. Каралеўская карона не прынесла ёй шчасця. Апошнія гады ўсё больш часу праводзіла яна ў малітвах. Ды відаць, нябёсы не чулі яе зваротаў. Немаўляткам памерла Ядвізіна дачка. Знясіленая, без прагі да жыцця каралева адышла з гэтага свету. Перад смерцю яна прасіла Ягайлу ажаніцца з яе швагеркай, дачкой графа Цілі і ўнучкай Казіміра Вялікага.

Ягайла апынуўся ў хісткім становішчы. Фактычна ён — польскі кароль, а юрыдычна пасля жончынай смерці пазбаўляўся кароны. Тут яшчэ ордэнскі магістр слаў лісты да Вільгельма Аўстрыйскага і раіў яму прад'явіць свае правы на польскі пасад. Ягайла вырашыў падстрахавацца і прыехаў на Літву з мэтаю вярнуць сабе Вялікае княства. Дый польскаю каронаю ён асабліва не даражыў — памятаем ягоную фразу: «Я вас ужо прасіў, каб вы ўзялі сабе сваю карону і дазволілі мне вярнуцца ў маю родную Літву». Так нічым і не праявіў сябе Ягайла на Польскім каралеўстве. Не адваяваў у крыжакоў страчаных земляў і не аб'яднаў з Польшчаю Вялікае княства. Нібыта марыянетка быў Ягайла ў руках польскіх магнатаў. Самастойна вырашаць дзяржаўныя справы яму не давалі. Палякам болей падабалася, калі кароль слухаўся іх, выдаваў новыя прывілеі, шчодра адорваў, кіруючыся прынцыпам: «Ад княжацкага пасада не павінны ісці без суцяшэння»[109], або клапаціўся пра ўдавіц і сірот, або ездзіў па святых месцах.

Ягайлаў прыезд у Літву ўстрывожыў Вітаўта. Аддаваць уладу ў Вялікім княстве ён не збіраўся. Каб вярнуць сімпатыі палякаў, Ягайла завёў размову з Вітаўтам пра новую унію. Вітаўту, безумоўна, не хацелася вяртання Ягайлы на велікакняжацкі пасад. Да таго ж ён разумеў, што без польскай дапамогі цяжка будзе супрацьстаяць і татарам, і крыжакам, таму ж Свідрыгайлу, які не змірыўся са сваім становішчам удзельнага князя і слаў лісты да папы, каб дамагчыся ягонай падтрымкі. Міжволі Вітаўт шукаў паразумення з Ягайлам і прыняў ягоную прапанову. Задаволены Ягайла ад'ехаў у Кракаў і ўзрадаваў палякаў перспектывай аднаўлення уніі з Літвой. Пасля гэтага рада прыняла ўхвалу аб правамоцнасці каралеўскай улады Ягайлы. Вітаўт з палёгкаю ўздыхнуў — ад галоўнага прэтэндэнта на велікакняжацкі пасад ён пазбавіўся.

Наступныя падзеі не пакінулі Вітаўту спадзяванняў на тое, што ён абыдзецца без польскай дапамогі. Захваляваўся Смаленск — адны месцічы жадалі Вітаўта, а другія — князя Юрыя, дзедзіча. У Разань, дзе Юрый жыў у свайго цесця, князя Алега, прыехалі паслы і слязліва прасілі яго ў Смаленск. Юрый звярнуўся да Алега: «...зрабі міласць дапамажы мне сесці на вялікім княжэнні смаленскім»[110]. І Алег «зрабіў міласць» — стаў збіраць войска для паходу на Смаленск. Непакоіў і Ордэн. Крыжакі зацята, агнём і мячом насаджалі ў Жамойць каталіцтва. Па патрабаванні магістра Вітаўт паслаў туды свой атрад, які не меней жорстка прыводзіў жамойтаў у паслушэнства Ордэну. Але было ясна, што за Жамойцю крыжакі пачнуць ваяваць і Літву.

Напрыканцы 1400 года Вітаўт прыехаў у Кракаў і абгаварыў з Ягайлам умовы заключэння новай уніі Вялікага княства з Польшчаю. Ён саступаў польскім дамаганням сюзерэнітэту, каб толькі захаваць за сабою велікакняжацкі пасад і атрымаць польскую дапамогу на выпадак вайны з Ордэнам або з другім ворагам. Ягайла да Калядаў прыбыў у Вільню на скліканы Вітаўтам сойм. 18 студзеня 1401 года Вітаўт граматаю пацвердзіў абяцанне захаваць вернасць польскаму каралеўству і каралю, які даў яму ўладу над Вялікім княствам Літоўскім, прызнанне Ягайлы і ягоных паслядоўнікаў уладарамі Вялікага княства пасля сваёй смерці. Апроч таго, была адна агаворка, што калі Ягайла памрэ раней, дык палякі не павінны выбіраць другога караля без згоды Вітаўта. Аднак палякам не ўдалося цалкам дасягнуць сваёй мэты. Вялікае княства не было далучана да Кароны. Не ўсе літвінскія феадалы прыехалі ў Вільню, і Ягайлу давялося асобна браць у іх граматы на вернасць. Сярод іх князі Іван Гальшанскі, Сымон Друцкі, Рыгор Заслаўскі, Аляксандр Лукомскі, Рыгор Доўгаўт.



Грамата Вітаўта, напісаная кірыліцай

Ізноў аднавілася палітычная унія Вялікага княства і Польшчы. Але гэта не азначала, што Вітаўт адмовіўся ад жадання ператварыць Вялікае княства ў самастойнае каралеўства. У лістах да Ягайлы Вітаўт называе сябе вялікім князем, што не рабіў раней. Князі ў прысяжных граматах прызнаюць Вітаўта сваім «гаспадаром» і абяцаюць паслушэнства Ягайлу, толькі пасля смерці вялікага князя. Сам Вітаўт заяўляў, што ён не назначаны каралём, а выбраны на Вялікае княства Літоўскае і Рускае. Таму палякі не верылі Вітаўтавай клятве. Памяталі, як ён падмануў Ордэн. У верасні 1403 года яны зноў патрабуюць ад яго клятвы вернасці польскай кароне. Вітаўт нібыта шчыра згадзіўся. У прысяжнай грамаце паведамляе, што ўзнаўляе прысягу польскаму каралю, каб развеяць усялякія падазрэнні ў ягонай нявернасці, і болей таго — абяцае скасаваць усе дамовы, заключаныя з усімі, хто пагражае Ягайлу, і дапамагаць Польшчы супраць яе ворагаў. Путамі клятвенных абяцанняў палякі марылі скаваць дзеі Вітаўта, пазбавіць яго самастойнасці ў зносінах з суседнімі краінамі, і асабліва з Ордэнам, а там праз каралеўскую адміністрацыю з дапамогай літвінскіх феадалаў-католікаў пачаць самім запраўляць Вялікім княствам.

У жніўні 1401 года Алег Разанскі разам з Юрыем Смаленскім і дружынамі пронскага, мураманскага і казельскага князёў падступілі да Смаленска. Алег паведаміў смалянам: «Калі не адчыніце горада і не прымеце ўладара вашага, князя Юрыя, дык буду стаяць тут доўга і пакараю вас мячом і агнём; выбірайце паміж жыватом і смерцю»[111]. Смаляне выбралі «жывот». Свой узыход на смаленскі пасад Юрый адзначыў жорсткімі пакараннямі праціўнікаў. Ён забіў намесніка, князя Рамана Міхайлавіча Бранскага, з ягонымі баярамі, перабіў і тых смаленскіх баяр, што падтрымлівалі Вітаўта.

Алег Разанскі вырашыў акупіць выдаткі, панесеныя ім у паходзе, і напаў на полацкія воласці. Вось яны, плачэўныя вынікі ворсклаўскага паражэння. Такога ні Алег, ніхто іншы з рускіх князёў раней не дазволіў бы сабе. А цяпер асмялелі. Аднак і Вітаўт не збіраўся так лёгка саступіць Смаленск і пакінуць без пакарання спусташэнне Полаччыны разанцамі. Не такі ён слабы, як гэта сабе ўявілі ягоныя непрыяцелі. І ўжо восенню Вітаўт з войскам быў пад Смаленскам. У горадзе ўспыхнула паўстанне Вітаўтавых прыхільнікаў, але Юрый перамог іх. Вітаўт чатыры дні прастаяў каля Смаленска, заключыў з Юрыем перамір'е і адступіў. Гэтая няўдача вялікага князя літоўскага абнадзеіла Алега Разанскага, дазволіла паверыць у лёгкую перамогу. Наступным, 1402 годам ён паслаў раць на чале са сваім сынам Радаславам адваёўваць Бранск. Каля Любуцка разанцаў сустрэлі Сымон-Лугвеній і Аляксандр Лукомскі з мсціслаўскай, старадубскай і лукомскай дружынамі. Літвіны ўшчэнт разбілі разанскае войска, а князя Радаслава ўзялі ў палон. Магутнасць Разані ў адзін дзень была падарвана. Гэтага Алег не пражыў. Разань ужо не магла сапернічаць з Масквою. Як ад паражэння літвінскага войска на Ворскле, так і цяпер ад паражэння разанцаў выгадаў маскоўскі князь: два найбольш небяспечныя для яго праціўнікі аслабелі, і цяпер слова было за ім, за Васілём Дзмітрыевічам. Якое слова, Вітаўт не ведаў. На вернасць Васіля ён спадзяваўся.

Напружанымі заставаліся адносіны і з Ордэнам. Крыжакі імкнуліся замацавацца ў Жамойці і зброяй насаджалі там каталіцтва. Жамойты, якія не жадалі хрысціцца, уцякалі ў Вялікае княства. Магістр Конрад Юнінген патрабаваў ад Вітаўта выдачы ўцекачоў як сваіх падданых. Вітаўт не згаджаўся, спасылаючыся на тое, што саступіў Ордэну Жамойць, але не народ. Пайшлі ўзаемныя абвінавачанні ў невыкананні мірнай дамовы. Вітаўт напісаў грамату да хрысціянскіх уладароў, у якой скардзіўся на рыцараў. Маўляў, Ордэн у Жамойці чыніць і робіць усё паводле свайго жадання, не зважаючы ні на якое права і слушнасць. Папярэджваў, што на вайну адкажа вайной. Магістр у сваю чаргу таксама разаслаў скаргі на Вітаўта і да германскіх феадалаў, і да вроцлаўскага біскупа, і да папы, і нават да бургундскага герцага — пэўна, жадаючы выпрасіць у яго стралкоў для будучага паходу на Літву. Нарэшце Вітаўт быў вымушаны падпарадкавацца ордэнскім патрабаванням. «Вы, відаць, жадаеце, каб я ўсім жамойтам загадаў вярнуцца ў іх зямлю, — адказаў князь крыжакам. — Добра, але ведайце, што гэтыя людзі самыя гарачыя прыхільнікі незалежнасці, якую вы аднялі ў іх землякоў; ніхто лепш за іх не абароніць яе»[112]. Даведзеныя да роспачы жамойты з мальбой звярталіся да Еў-

ропы: «Слухайце, слухайце! Вы, князі, як духоўныя, так і свецкія, пачуйце воплі прыгнечаных. Мы людзі вольнага паходжання, а Ордэн імкнецца пазбавіць нас свабоды. Ён не хоча выратаваць нашы душы, а толькі хоча захапіць нашы землі... Загуба дакранулася да нас... усё багацце нашага края ордэнская брацыя забрала ў нас, вольных людзей гоняць на начную працу, аднялі ў нас паляванне і рыбалоўства, забаранілі нам гандаль з суседнімі землямі... забіраюць да сябе нашых дзяцей заложнікамі, ганьбяць нашых жанок... сясцёр і дочак сілком цягнуць да сябе — а яшчэ крыж святы на вопратцы носяць... Змілуйцеся! Мы просім хрышчэння, але ўспомніце, што мы людзі, створаныя па вобразу і падабенству Божаму, а не звяры якія... Ад усёй душы хочам быць хрысціянамі, але хочам хрысціцца вадою, а не крывёю»[113]. Крыжакі адказвалі: «Люд Жамойцкі ёсць зацвярдзелы, нават дарэмны і быў заўсёды здрадлівых звычаяў»[114]. Апраўдваліся, што абыходзіліся з імі добра, а яны хай што хочуць мовяць. Віноўнікам супраціўлення жамойтаў крыжакі назвалі Вітаўта, ды яшчэ ў якіх выразах: «Стары вужака, д'ябал падбухторыў іх»[115]. У 1401 годзе жамойты паўсталі. Яны разбуралі замкі і палілі касцёлы, забівалі крыжакоў. Слалі жамойты паслоў і да Вітаўта, каб ён якія яму былі заўжды вернымі і якія ёсць адзін народ з Літвой, не аддаваў іх у няволю прагнаму ворагу. Вітаўт сам ледзь не плакаў, але вымушаны быў патрабаваць, каб жамойты падначаліліся крыжакам і далі з насмялейшай моладзі заложнікаў. Пачынаць вайну з Ордэнам было не ў разліках вялікага князя.

Нечакана ў гэты час увайшоў з войскам у Аўкштайцію лівонскі магістр. Вітаўт, ведаючы, што яго сілы саступаюць крыжакам, а «ягоныя падданыя няўстойлівыя і ненадзейныя»[116], што з'яўлялася следствам незадаволенасці часткі феадалаў Віленскай уніяй, зачыніўся ў Вільні. Крыжакі, уволю парабаваўшы аўкштайцкія сёлы, павярнулі назад у Лівонію. Толькі папоўніўшы шэрагі сваёй дружыны прысланымі Ягайлам воямі, Вітаўт павёў патаемна войска, не выдаваў сябе. Крыжацкія віжы да апошняга моманту не змаглі выявіць яго. Калі ж крыжакі разышліся па дамах, вялікі князь напаў на Дынабург. Без цяжкасцей войска захапіла замкавыя прадмесці. Абаронцы Дынабурга, не спадзеючыся выстаяць, здаліся і выйшлі з крэпасці з паднятымі крыжамі і дарамі Вітаўту, каб заслужыць ягоную літасць. Князь спаліў замак і з палонам вярнуўся ў Вільню.

Напад лівонскіх рыцараў, няўдача пад Смаленскам сталі прадвесцем новай нялёгкай вайны Літвы на два франты — з Ордэнам і Паўночна-Усходняй Руссю. Вітаўт не памыліўся, заключыўшы саюз з Ягайлам; ягоная дапамога была цяпер як

ніколі патрэбнай. А падзеі разгортваліся імкліва. У 1402 годзе, калі ў Кракаве Ягайла святкаваў вяселле, няўрымслівы Свідрыгайла, пераапрануўшыся купцом, уцёк з Падолля ў Прусію*. Момант выбраў ён спрыяльны: Вітаўт ужо не той пагрозлівы ўладар земляў ад Балтыйскага да Чорнага мораў, у дзяржаве многа незадаволеных, адпаў Смаленск, узмацнілася Масква, выступіў супраць Вялікага княства разанскі князь. Свідрыгайла мог спадзявацца ўзысці на велікакняжацкі пасад. У сваіх пасулах Ордэну ён шчодра абяцаў саступіць нават тое, што і не належала яму, — Полацкую зямлю. Як ён і чакаў, Ордэн паквапіўся на такі «падарунак», але, галоўнае, крыжакі разлічвалі, што Свідрыгайла будзе болей паслухмяны ім, чым Вітаўт. Ведалі яны, што падтрымліваюць Свідрыгайлу незадаволеныя уніяй з Польшчаю літвіны. А разарваць унію Вялікага княства з Польшчаю — даўняя мара Ордэна. Такім чынам, Свідрыгайла знайшоў у крыжакоў самы цёплы прыём.

Конрад Юнінген, забыўшыся на мірную дамову з Вітаўтам, пачаў рыхтавацца да вайны. Адразу пасля прыезду Свідрыгайлы ў Прусію крыжакі зрабілі набег на Гарадзенскую зямлю. Напэўна, ведаючы, што Вітаўт часта жыў у гэтым горадзе, разлічвалі знянацку захапіць яго. Мір быў парушаны. Адначасова лівонскія рыцары ваявалі тую частку Жамойці, што ўваходзіла ў склад Вялікага княства. Жамойты ў адказ нечаканым нападам авалодалі Мемелем і спалілі яго. А Вітаўт захапіў адбудаваную крыжакамі крэпасць Рытэрсвердэр. Толькі руіны пакінуў ён ад яе.

За мірны час Ордэн здолеў сабрацца сіламі. Каля 40 тысяч крыжакоў у пачатку лета выступілі ў паход на Вільню. Да іх далучыўся і Свідрыгайла. Шмат спадзяванняў было ў яго на сваіх прыхільнікаў у Вільні, але іх змову выкрылі, і Вітаўт пакараў Свідрыгайлавых паплечнікаў. Сумны вопыт папярэдніх штурмаў віленскіх замкаў не абнадзейваў, і магістр абышоў Вільню, даўшы рыцарам магчымасць паказаць сябе ў рабаванні мірных сёлаў. Крыжакі пайшлі пад Меднікі, абаронцы спалілі замак і ўцяклі ў лес. Пажывіцца тут не было чым, таму крыжакі спустошылі Ашмянскі край. Па дарозе назад спалілі Салечнікі. Вітаўт чакаў іх, учыніў на шляху засекі, паставіў засады. Нялёгка давялося б крыжакам, каб не прыхільнікі Свідрыгайлы, якія папярэдзілі іх пра небяспеку. Крыжакі пайшлі іншым шляхам праз Эйшышкі, Араны, Прэвалкі, дзе пераправіліся цераз Нёман. Хоць і нарабавалі і спустошылі нямала, але паход не прынёс чаканага выніку. Вільня не пала.

---

*У 1401 годзе Свідрыгайла на грамаце ў вернасці Вітаўту павесіў фальшывую пячатку, значыць, даў яму хлуслівую клятву.



Пячатка Вітаўта

Магістр меркаваў на наступны год паўтарыць паход на сталіцу Літвы. Пачалася ідэалагічная апрацоўка Еўропы. Ордэн рассылаў лісты: «Няверныя паднялі зброю на хрысціян, нішчаць нашыя краі, выводзяць у жорсткую няволю людзей»[117]. У Прусію прыбывалі «абаронцы» хрысціян.

Пасля вяртання з паходу Свідрыгайла атрымаў ад Ордэна невялічкае мястэчка Бісла к, дзе ён мог бы прымаць сваіх прыхільнікаў. Свідрыгайла паўтараў Вітаўтаў шлях. І калі нават не ўдалося б мяцежнаму князю сесці ў Вільні, дык бяды ён мог прынесці шмат. Як было Вітаўту пазбавіцца ад небяспекі з боку Свідрыгайлы? Выманіць яго з Ордэна шчодрымі ўзнагародамі? Але малым яго не купіш.

1403 год пачаўся з новага паходу крыжакоў. Вёў іх маршал Вернер Тэцінген. Крыжакі распускалі пагалоскі, што ідуць на Гародню. Вітаўт, як прадбачыў гэтую хітрасць, не пакінуў сталіцу. Гэта стрымала маршала ад нападу на Вільню. Крыжакі спалілі Мерач і вярнуліся ў Прусію, вывеўшы 3 тысячы лю-

дзей у палон. З усходу Аўкштайцію беспакарана рабавалі лівонскія рыцары. Вітаўт адпомсціў ім тым, што пайшоў на лівонскія землі за Дзвіною, а вяртаючыся назад, ізноў спаліў Дынабургскі замак. Насуперак ордэнскім спадзяванням Вялікае княства было даволі моцным і на крыжацкія паходы адказвала спусташальнымі набегамі. Вайна магла зацягнуцца, і хто ведае як скончылася б яна для Ордэна.

Магістр прапанаваў Вітаўту сустрэцца. Сустрэча адбылася на выспе ракі Дубісы. Прыслаў сваіх прадстаўнікоў і Ягайла. Крыжакі дамагаліся перадачы Ордэну зямель, якія некалі адпісаў ім Вітаўт, патрабавалі выплаты страт. Зразумела, што Вітаўт не пагадзіўся на гэтыя патрабаванні. На гэтым перамовы закончыліся. Магістр і Вітаўт раз'ехаліся па сваіх лагерах, а прадстаўнікі з абодвух бакоў засталіся ў намёце баляваць. І ўсё добра, каб не п'яны брандэнбургскі камандор Марквард фон Зальцбах не назваў Вітаўта здраднікам, супастатам і нягодным чалавекам. Літвіны былі абражаны і заступіліся за гонар свайго ўладара, выклікаўшы камандора на двубой. Той, пэўна, палічыў ніжэйшым за сваю годнасць прыняць выклік ад «няверных». Ён і камандоры дэманстратыўна пакінулі намёт, селі на ладдзю і адправіліся ў крыжацкі лагер. Тады літвіны па рыцарскай традыцыі прыслалі да Зальцбаха герольда з паведамленнем, што шэсць літвінскіх рыцараў выклікаюць яго і пяць камандораў на паядынак за зняважаны імі гонар вялікага князя літоўскага. П'яныя слугі Зальцбаха накінуліся на герольда, ледзь іх адагналі ад яго рыцары. Калі пра гэты выпадак даведаўся магістр, то страціў сон. Перамовы маглі завершыцца кровапраліццём. Ноччу ён паслаў слугу да Вітаўта з прабачэннем і прасіў утрымаць сваіх рыцараў ад паядынку, каб справа не дайшла да бітвы. Разбуджаны Вітаўт, калі ўцяміў, у чым справа, то абурыўся. Напісаў ліст магістру са скаргай на камандора, а рыцарам не забараніў выйсці на паядынак. Калі наступіў ранак, літвінскія рыцары ўжо чакалі выкліканых на паядынак камандораў. Але магістр забараніў сваім біцца і напісаў Вітаўту, зноў прасіў прабачэння за нанесеную яму абразу і кляўся, што «адбылося гэта па-за маёй волі і вельмі перажываем з гэтага»[118]. Вітаўт суцішыў сваё абурэнне і таксама забараніў сваім рыцарам удзельнічаць у паядынку, але не захацеў працягваць перамовы. Яны былі перанесены на пазнейшы тэрмін.

Папа рымскі Баніфацый IX прыслаў у Мальбарг булу, якой забараняў крыжакам ваяваць з Вялікім княствам. А без папскага дазволу ахвотнікаў прыняць крыж і паслужыць Ордэну будзе мала. Конрад Юнінген змяніў палітыку і запрапанаваў Вітаўту прымірыцца. Вялікі князь не працівіўся. 23 мая 1404 года ў Рацёнжу быў заключаны мір паміж Вялікім княствам

Літоўскім і Рускім, Польшчаю і Прусіяй. Ён у асноўным паўтараў умовы Салінскага дагавору. Новых было некалькі: Ордэну перадавалася ўсходняя частка Жамойці, Вітаўт не павінен быў 10 гадоў прымаць да сябе жамойтаў, і ў ягоны абавязак уваходзіла дапамагаць Ордэну супраць усіх ягоных ворагаў, апроч польскага караля. Тое самае абяцаў і магістр. Не забыўся Вітаўт і пра Свідрыгайлу і паскардзіўся магістру, што Ордэн падтрымлівае ягонага непрымірымага ворага, які падсылае да яго наймітаў-забойцаў. Магістр адказаў князю: «Ён звярнуўся да нас, спадзеючыся на нашу вернасць, і мы не жадаем і не можам адпусціць яго ад сябе»[119]. Толькі праз пасрэдніцтва Ягайлы Вітаўт замірыўся і са Свідрыгайлам, які атрымаў ад яго выкупленае ад удавы Спыткі заходняе Падолле і прызнаў сябе велікакняжацкім васалам. Аднак занепакоеныя каралеўскія вяльможы выдалі ўказ, каб ніхто, апроч палякаў, не меў на Падоллі ўладанняў. Наспяваў новы канфлікт.

«ПАХОДНЯ ВАЙНЫ»

Так называлі Вітаўта яго сучаснікі. І сапраўды, паходня вайны не згасала ў руках Вітаўта. Міры́ўся з Ордэнам, са Свідрыгайлам, а тым часам ваяваў са Смаленскам. Разам з Вітаўтам у гэтым паходзе ўдзельнічалі мсціслаўскі князь Лугвеній, ноўгарад-северскі князь Жыгімонт Карыбутавіч і Свідрыгайла. Калі меркаваць па летапісных звестках, дык яшчэ да падпісання 23 мая Рацёнжскай дамовы з Ордэнам каля Смаленска стаяла Вітаўтава войска, а значыць, прыйшло яно дзесьці ў сярэдзіне лютага. Пэўна, з Смаленска Вітаўт і паехаў на сустрэчу з магістрам, а пасля ізноў паспяшыў пад горад. Годам раней Лугвеній разам з мсціслаўцамі ўзяў Вязьму. Становішча Смаленска пагоршылася. Сем тыдняў войска трымала Смаленск у аблозе. Гарматы абстрэльвалі горад, але Вітаўт так і не ўзяў яго. Князь Юрый бачыў, што яму не выстаяць аднаму, а Вітаўт не супакоіцца, пакуль не верне Смаленск, і ён адправіўся ў Маскву да Васіля Дзмітрыевіча: «Табе ўсё магчыма, — казаў ён, — паміры нас, каб не крыўдзіў мяне. Калі ж ён ні слёз маіх, ні тваёй сяброўскай парады не паслухае, дык дапамажы мне, няшчаснаму, не аддавай мяне на з'ядзенне Вітаўту, калі ж і гэтага не хочаш, дык вазьмі горад мой за сябе; валодай лепш ты ім, а не паганая Літва». Васіль Дзмітрыевіч абяцаў дапамогу.

Адразу пасля ад'езду Юрыя смаленскія баяры прасілі Вітаўта хутчэй ісці да горада: «Таму што хочам і любім цябе»[120]. Вітаўт прыйшоў. 26 чэрвеня баяры адчынілі перад ім гарад-

скую браму і выдалі яму Юр'еву жонку. Найбольш зацятыя прыхільнікі смаленскага князя паплаціліся галовамі. На гэтым і скончыліся пакаранні. Вітаўт узрадаваў смалян тым, што надаў ім прывілеі, падкупіў іх сэрцы вольнасцямі, якія не сніліся ім пры Юрыі. Калі Васіль даведаўся пра авалоданне Вітаўтам Смаленскам, дык звалiў усю віну на Юрыя: «Прыехаў ты сюды з падманам, загадаўшы смалянам здацца Вітаўту»[121]. Аднак Юрый знайшоў падтрымку ў Ноўгарадзе, які прызнаў яго за свайго князя. Такі паварот падзей ніяк не задавальняў Вітаўта. На гэтае княства сам прэтэндаваў. Нездарма і з крыжакамі на Салінскім возеры дамаўляўся пра іх дапамогу ў авалоданні Ноўгарадам.

У 1405 годзе Вітаўт абвясціў Ноўгараду вайну і выступіў з войскам у Пскоўскую зямлю. Сам паход быў падобны на дэманстрацыю вайсковай моцы Вялікага княства з мэтаю запалохаць Ноўгарад. Аднойчы такі дэмарш удаўся Альгерду, калі ён, паваяваўшы наўгародскія ваколіцы, прымусіў наўгародцаў расправіцца з непажаданым яму пасаднікам Дваранінцавым. Не здзіўляе таму і незвычайная жорсткасць Вітаўтавых воінаў. Узяўшы 5 студзеня 1406 года горад Каложу, яны спалілі яго і вывелі ў палон 11 тысяч жыхароў, якіх пасялiў у Гародні. А пад горадам Вароначам накідалі дзве лодкі забітых дзяцей. «Такой гадасці, — піша пскоўскі летапісец, — не бывала з тых часоў, як Пскоў стаў»[122]. Гэтак Вітаўт адпомсціў пскавічам за тое, што яны здзіралі скуру з яго палонных воінаў. Помста жорсткая і бяздумная. І адно апраўданне можа быць, што ўчынілі гэтае зверства без ведама Вітаўта, хоць гэта не здымае грэх з яго душы.

Сваімі дзеямі Вітаўт дамогся адваротнага — не жаху, а прагі помсты. Ноўгарад адгукнуўся на просьбу пскавічоў і прыслаў ім тры палкі. Высветлілася, што храбры Вітаўт не такі ўжо і храбры — як даведаўся пра наўгародскія палкі, павярнуў дадому. Пскавічы прагнулі помсты і прапанавалі наўгародцам: «Пойдзем, панове, з намі на Літву помсціць за кроў хрысціянскую». Але ваяводы наўгародскія ўзрадаваліся, што пранесла бяду, і адказалі: «Нас уладыка не блаславіў ісці на Літву, і Ноўгарад нам не ўказаў, а ідзем з вамі на немцаў»[123]. Шляхі пскавічоў і наўгародцаў разышліся. Наўгародцы адправіліся дадому, а пскавічы паваявалі Ржэў і Вялікія Лукі. У наступным, 1406 годзе яны паднялі ўсё княства і падышлі да Полацка. Трое сутак прастаялі яны каля горада і адступілі ад яго, бо ў гэты час на пскоўскія воласці напалі лівонскія рыцары. Уступілі ў дзеянне ўмовы дагавору: ворагі Вітаўта — ворагі Ордэна.

Аднак адносіны Вітаўта з крыжакамі заставаліся напружанымі. Ён не збіраўся перадаваць Ордэну Жамойць. Спатрэбі-

лася сіла прымусіць вялікага князя выканаць Рацёнжскую дамову. Магістр восенню ў 1404 годзе з войскам хадзіў на Аўкштайцію. Вітаўт пазбягаў адкрытага бою і нападаў на крыжакоў з засад. Дапамог Ягайла, які прыслаў моцны польскі атрад. Але магістр паспяшаўся вывесці сваё войска з Аўкштайціі.

28 чэрвеня 1405 года Вітаўт і Конрад Юнінген пабачыліся ў Саліне. Сустрэча праходзіла без ранейшай шыкоўнасці, ды і прыязнасць паміж двума ўладарамі суседніх дзяржаў знікла. Вітаўту давялося выслухаць і сцярпець нямала дакораў ад ордэнцаў. Яго абвінавачвалі ў падмане і невыкананні дамовы.

Вітаўт адмовіўся ад Жамойці і абяцаў дапамагчы Ордэну ўціхамірыць жамойтаў. Крыжакі настойліва прасілі яго выканаць дадзенае слова. Той жа брандэнбургскі камандор Марквард фон Зальцбах цяпер ліслівa назваў Вітаўта дабрадзеем і прызнаваўся, што «усе надзеі нашы на параду і дапамогу Вашай Велікакняжацкай мосці ўскладаем, адзіную падтрымку ад Вас і ад Бога бачым у нашай справе»[124]. Ды і сам магістр слёзна прасіў Вітаўта: «Пане, дапамажы нам сваёй парадай, як можна пакласці канец тым справам і працам Вашай мосці, бо гэта ў інтарэсах нашага Ордэна, суцяшэнне і поспех нашы ў руцэ Вашай Велікакняжацкай мосці»[125]. А калі яму надакучылі патрабаванні крыжакоў, не стрымаўся і рэзка адказаў ім: «Яшчэ я ёсць не ваш падданы, каб пад прымусам выконваў вашу волю»[126].

Слова дадзена, і трэба было яго выконваць. Вітаўт сам прывёў на дапамогу крыжакам у Жамойць некалькі атрадаў. Жамойты адчайна супраціўляліся. З мольбамі і плачам звярталіся да Вітаўта, прасілі не перадаваць іх пад ордэнскую ўладу. Зноў Жамойць стала разменным грошам у палітыцы Вялікага княства Літоўскага. Вітаўт жорстка падавіў паўстанне жамойтаў, спаліўшы не адно іх селішча. Па ягонаму загаду жамойты пабудавалі два замкі на рацэ Нявежы, а трэці на Нёмане, пры ўпадзенні ў яго ракі Дубісы. У іх пасяляліся крыжакі, каб валоданне Жамойціяй было «болей спакойным і доўгатэрміновым»[127]. За гэтую паслугу Вітаўта магістр вызваліў з заложнікаў ягонага брата Жыгімонта Кейстутавіча. Паходню вайны Вітаўт так і не загасіў.

СЛОВА ВАСІЛЯ ДЗМІТРЫЕВІЧА

Васіль не заступіўся за Смаленскае княства, але ж згубіць Наўгародскую зямлю, з якой ён браў срэбра для выплаты даніны Ардзе, азначала пазбавіцца першынства сярод князёў Паўночна-Усходняй Русі. А гэтага Васіль не мог дапусціць. Мір з

Вялікім княствам Літоўскім ён разарваў, а за ім тое самае зрабіў і цвярскі князь. Неўзабаве дайшла справа і да зброі. Маскоўскія раці падступілі да Вязьмы, Сярпейска і Казельска. Часы былі жорсткія і з ворагам не цырымоніліся. У адказ Вітаўт загадаў перабіць усіх маскоўскіх купцоў, што знаходзіліся ў гэты час у Літве. Абодва вялікія князі рыхтаваліся да рашучай схваткі.

Эдыгей з Сарая ўважліва назіраў за зменай адносін паміж Літвой і Масквой і не прамінуў яшчэ больш распаліць варожасць паміж непрыяцелямі. Як піша летапісец: «Эдыгей сварыў цесця з зяцем, каб яны траціліся свае сілы ў барацьбе і тым лягчэй сталі б з здабычаю татар; Эдыгей пасылаў у Маскву да вялікага князя Васіля, падбухторваючы яго на Вітаўта, даючы яму дапамогу сваю, а князі і баяры, і ўсе радцы велікакняжацкія, і ўся Масква радаваліся Эдыгеевай любові да Васіля Дзмітрыевіча і казалі: «Уся Арда ў волі вялікага князя, каго хоча ваюе»[128]. Летапісец дакладна вызначыў таго, хто быў зацікаўлены ў варожасці паміж Масквою і Літвою. Васіль яшчэ больш асмялеў, калі Эдыгей прыслаў яму татарскае войска пад кіраўніцтвам хана Шадзібека.

У той час Эдыгей заспакойваў Вітаўта: «Ты мне будзеш друг, а я табе буду друг»[129]. Вітаўт верыў яму, не чакаў татарскай дапамогі Маскве і рыхтаваўся да паходу. Ён напоўніў сваё войска крыжацкай харугвай у 1400 вершнікаў, а за гэта абяцаў Ордэну заваяваць Пскоў. Прывёў харугву з малдаван і палякаў Свідрыгайла. Аднак перад паходам у жніўні на Літве з'явіўся былы смаленскі князь Юрый Святаславіч. На чале наўгародскай дружыны ён прабраўся ажно да Ліды, дзе ў замку сядзела ў палоне яго сям'я. Усе штурмы абаронцы адбілі, і Святаслаў убраўся прэч. Міжволі прызнаў ён сваё паражэнне. Пэўна, каб спагнаць сваю злосць, пайшоў на Вільню. Каля горада ён захапіў французскі кляштар і замучыў трох манахаў. Пёк іх на ражнах, паліваў кіпенем, пэўна, дамагаўся выведаць пра схаваныя скарбы. Вось так нізка паў гэты чалавек.

У верасні 1406 года Вітаўт выступіў на Маскву. Яго суправаджалі галандскія і бургундскія герольды. Хаця баёў з маскавітамі не адбылося, але літвінам давялося нялёгка. Непагадзь і недахоп харчоў сталі сур'ёзнай перашкодай. Была яшчэ адна небяспека. Праваслаўныя літвіны без асаблівай ахвоты ішлі ваяваць супраць адзінаверцаў. Сяброўства Вітаўта з Польшчай, патаканне ім каталіцкай царквы не проста не падабаліся праваслаўным феадалам, а выклікалі ў іх пратэст. Сын Івана Гальшанскага, Андрэй Нялюб, ад'ехаў у Маскву. І вось у паходзе высветлілася, што старадубскі князь Аляксандр Лукомскі, бацька першай Вітаўтавай жонкі Марыі, адзін з тых, хто з такім



Мініяцюра з «Ліцавога Зводу».
Сустрэча Вітаўта і Васіля Дзмітрыевіча на Угрэ. *XVI ст.*

імпэтам абвяшчаў Вітаўта на Салінскім возеры «каралём Літвы і Русі», таксама задумаў перайсці да Васіля Дзмітрыевіча. Аляксандра зняволілі, але ж гэта не выйсце. Вітаўт увачавідкі пераканаўся, што ягоная палітыка не была папулярнай у дзяржаве. Ён губляў былых паплечнікаў, і ніякімі пагрозамі і карамі не прымусіш іх заставацца вернымі яму. Не выпадкова адзначыў польскі храніст Длугаш, што падданыя Вітаўта пасля прыняцця Віленскай уніі былі «ненадзейныя»[130]. Ці мог Вітаўт пры такіх абставінах спадзявацца на перамогу над маскоўска-та-

тарскім войскам? Ён асцярожнічаў і не лез у бой. Ведаў, што за паражэнне вельмі дорага заплаціць. Таму, калі абодва войскі сустрэліся на рацэ Плаве каля Тулы, Вітаўт дарэмна не рызыкаваў. Паміж вялікімі князямі пачаліся перамовы. Вітаўт патрабаваў выдаць яму Юрыя Смаленскага і Андрэя Нялюба. Але Васіль так і не саступіў яму. Заключылі перамір'е ад 8 верасня 1406 года да 28 чэрвеня 1408 года.

Незадаволеныя гэтым татары, каб не вяртацца дадому з пустымі рукамі, на зваротным шляху парабавалі рускія воласці.

Не прайшло ўстаноўленага тэрміну, як Вітаўт, парушыўшы клятву, захапіў Адоеў. Адбылося гэта ў пачатку лютага 1407 года. Васіль адказаў тым жа — узяў і спаліў горад Дзмітравец. Як і раней, на рашучую бітву вялікія князі не адважыліся і зноў заключылі перамір'е. Два літвінскія паходы на Маскву ўсё ж прынеслі плён — Васіль не толькі саступіў Адоеў, але выклікаў з Ноўгарада князя Юрыя і даў яму Таржок.

Жыццё гэтага князя закончылася трагічна. Ён закахаўся ў жонку вяземскага князя Сымона, Ульяну. Не дамогшыся ўзаемнасці, Юрый спрабаваў сілком завалодаць каханай і забіў яе мужа. Ён не чакаў сустрэць у жанчыны такой прысутнасці духу: Ульяна на ягоных вачах нажом зарэзала сябе. Ратуючыся ад Васілёвага гневу, Юрый уцёк у Арду. Прабыў там нядоўга, вярнуўся на Русь і пастрыгся ў манахі. Неўзабаве ён памёр. А з ягонай смерцю Вітаўт стаў паўнапраўным уладаром Смаленскага княства. Толькі такая ў вялікага князя доля — нічога лёгка не давалася яму ў жыцці. За ўдачай прыходзіць бяда. У 1408 годзе ўжо Свідрыгайла ад'ехаў да Васіля, а разам з ім князі Патрыкей Звенігародскі, Сымон Перамышльскі, Уруставай Менскі, Міхайла Хацеўскі, Аляксандр Лукомскі з сынам Хведарам і шмат праваслаўных баяраў. Васіль шчодра адарыў Свідрыгайлу, даў яму Пераяслаўль Юр'еў, Волак Ламскі, Ржэў і палову Каломны. Што станецца ўслед за гэтым пераходам, Вітаўт прадбачыў: цяпер ужо пад маскоўскай апекай Свідрыгайла пойдзе дабываць велікакняжацкі вянец, і падтрымаюць яго ў Літве многія князі і баяры.

Вітаўт загадзя сабраў пяцітысячнае войска. Ізноў прыйшлі крыжакі, прывёўшы з сабою і жамойтаў, далучыліся палякі. З Северскай зямлі вялікаму князю данеслі, што маскавіты з'явіліся каля Пуціўля і парабавалі навакольнае насельніцтва — сеўрукоў. Вітаўт патрабаваў ад Васіля пакарання вінаўных у рабаванні і выплаты страт. Васіль гэтага не выканаў. З'явілася падстава для паходу, і Вітаўт выступіў на маскоўскія землі. Каля ракі Акі літвінаў сустрэў з рускімі і татарскімі палкамі Свідрыгайла. Некалькі дзён спрабавала літвінскае войска захапіць вузкі праход паміж балотамі. Свідрыгайла ўдачна адбіў

усе напады. Вітаўт так і не дамогся перамогі і павёў сваіх вояў у абыход маскоўскай заставы. Васіль адразу ж паслаў да Вітаўта зварот: «Пан вялікі князь Вітаўт! Ты мне, як бацька, і не гневайся на мяне, я не вінаваты, што ліхія людзі без майго ведама зрабілі, і калі б я тых людзей знайшоў, што тваім сеўрукам нанеслі шкоду, і я іх выдаў бы галавой. А калі не змагу знайсці, дык загадаю аплаціць страты, і ты з-за гэтага на мяне не гневайся і землі мае не спусташай, і не разрывай, твая міласць, са мной мір»[131].

Як ніколі, Маскве патрэбны быў мір з Літвою, бо ёй пагражала Залатая Арда. Пасля смерці Цімура ў Тахтамыша з'явілася надзея адваяваць золатаардынскі пасад. Тахтамыш паспрабаваў захапіць Сарай, але быў пераможаны ханам Шадзібекам і ўцёк да нізоўяў Табола, дзе загінуў. Перамога Шадзібека паказала Эдыгею, што ўчарашні нявопытны хан-юнак пасталеў і ўжо можа абысціся без ягонай дапамогі. Мурза паспяшыў пазбавіцца ад Шадзібека, і хан памёр. А на ягонае месца Эдыгей узвёў новага — сына Цемір-Кутлуга, Булата.

Уладкаваўшы ўнутраныя справы, Эдыгей стаў збіраць войска для паходу на Русь. Вось ужо 12 гадоў пасля разгрому Цімурам Залатой Арды маскоўскі князь не слаў у Сарай даніны і сам не ездзіў на паклон хану. Татарскіх паслоў у Маскве сустракалі насмешкамі і кпінамі. Эдыгей доўга трываў непакорлівасць Васіля Дзмітрыевіча, але, калі ханская скарбніца абяднела, вырашыў пакончыць з вольнасцю Масквы. Ён улічыў памылкі Мамая і не стаў адкрыта выступаць на княства, а паведаміў Васілю, што Булат з Ардою ідзе «пакараць літоўскага ворага твайго»[132]. Васіль Дзмітрыевіч, відаць, не давяраў Эдыгею, адсюль яго імкненне своечасова замірыцца з Вітаўтам.

Вітаўт па просьбе зяця 1 верасня сустрэўся з Васілём. Сустрэча адбылася на рацэ Угрэ. Вітаўт у суправаджэнні баярына Андрэя Літвіна выехаў на мелкаводдзе. Васіль таксама, узяўшы з сабою аднаго баярына, з другога берага паехаў насустрач. Пасля працяглай размовы яны пастанавілі, што межы паміж літвінскімі і маскоўскімі землямі пралягуць па Угры. Ваяўнічы баярын Андрэй звярнуўся да Вітаўта: «Гэта не сапраўдны мір, таму што паміж уладарамі кровапраліцця не было», на што Вітаўт адказаў: «Мілы брат, што адбылося, таго ўжо не вярнуць, і я свайго слова ніякім чынам не хачу адмяніць, няхай ужо будзе мір»[133]. Менавіта тады за сваю непрымірэнчасць баярын Андрэй атрымаў ад Вітаўта мянушку «Няміра», і з гэтага часу ягоны род пачаў называцца Неміровічы.

У наступным годзе Эдыгей з татарамі ўварваўся на Русь. Васіль Дзмітрыевіч пакінуў абараняць Маскву дзядзьку Ула-

дзіміра Андрэевіча і братоў Андрэя і Пятра, а сам з сям'ёю ўехаў у Кастраму. Татары разрабавалі маскоўскія ўладанні, месяц прастаялі пад Масквою і адступілі. Але асноўны ўдар прыйшоўся па ўладаннях Свідрыгайлы з мэтаю аслабіць яго пазіцыі на Русі. І адной з умоў заключанага з Ардою міру быў разрыў саюза Масквы з Свідрыгайлам. Такім чынам, Свідрыгайла вымушаны быў у 1409 годзе вярнуцца ў Літву. Аднак ёсць звесткі, што ён трапіў у татарскі палон і Вітаўт выкупіў яго з няволі[134].

Арда інтрыгамі дамагалася раздраблення Уладзімірскага княства на некалькі княстваў. Ад Масквы аддзяліўся Ноўгарад Ніжні. Зноў супрацьставілі сябе маскоўскаму князю цвярскія князі.

Такім было становішча на Маскоўскай Русі. Ім і скарыстаўся Вітаўт, каб уцягнуць у арбіту сваёй палітыкі Ноўгарад. У 1407 годзе гэты горад прыняў ягонага намесніка Мсціслаўскага князя Сымона-Лугвенія. Пскавічы таксама паслалі ў Вільню паслоў прасіць міру.

НАПЯРЭДАДНІ ВЯЛІКАЙ ВАЙНЫ З ОРДЭНАМ

30 сакавіка 1407 года памёр вялікі магістр Конрад Юнінген. Сучаснікі называлі яго міралюбівым і нават баязліўцам, а ордэнскія блазны здзекаваліся з яго. Перад самай смерцю ён раіў захоўваць мір з Вялікім княствам і Польшчаю і не выбіраць магістрам ягонага брата Ульрыка, які прагнуў вайны з гэтымі дзяржавамі. Не быў Конрад Юнінген міралюбівым, а быў прадбачлівым. Ён адзін з нямногіх у Ордэне ясна зразумеў, што вайна супраць Літвы і Польшчы можа скончыцца паражэннем Ордэна. І, стрымліваючы ваяўнічых рыцараў, шукаў паразумення з Ягайлам і Вітаўтам.

Чаго ён баяўся, тое і адбылося, і рыцары абралі новым магістрам ягонага брата Ульрыка. Той быў больш падобны на свецкага рыцара, чым на манаха: аматар пацех і баляванняў, заўзяты гулец у косці, смелы ваяр, і разам з тым вызначаўся шчодрасцю да жабракоў, удавіц і старых, клапаціўся пра манастыры і цэрквы. Новы магістр адразу апраўдаў надзеі ордэнцаў. Яшчэ служылі па памерлым паніхіды, у тым ліку і ў польскіх касцёлах, а крыжакі захапілі польскую крэпасць Сантак. А калі польскія паслы прыехалі ў Мальбарг, новы магістр наўмысна пакінуў горад, каб такім чынам зняважыць іх.

З выбраннем магістрам Ульрыка Юнінгена Ордэн адкрыта пачаў рыхтавацца да вайны з Польшчаю. Асаблівая ўвага надавалася нейтралізацыі Вітаўта, спробе пасварыць яго з Ягай-



Гравюра з «Хронікі Прусіі». Ульрык фон Юнінген. *1648 г.*

лам. Крыжакі як ніколі заляцаліся да яго: «Пасля пана Бога, Ордэн мае толькі аднаго дабрадзея і бацьку — Вітальда». «Усё, што мовіць Вітальд, тое будзе святым для Ордэна»[135]. Толькі Вітаўт добра разумеў, чаму такія пачцівыя да яго крыжакі. На сустрэчы Ульрыка з Ягайлам, якая адбылася ў пачатку 1408 года, Вітаўт як трацейскі суддзя прысудзіў спрэчны горад Дрэздэнка палякам і адназначна паказаў, каго ён падтрымлівае.

Аднак не будзем ідэалізаваць адносіны Вітаўта і Ягайлы. Як і раней, яны былі складанымі і супярэчлівымі. Калі пасля Ворсклы ўмовы дыктаваў Ягайла, то цяпер гэта рабіў Вітаўт. З ліста комтура Свенцы ад 2 чэрвеня 1409 года даведваемся, што паміж абодвума ўладарамі ўзнікла моцная нязгода, якой раней ніколі не было[136]. Што за нязгода? Вітаўт патрабаваў перадачы Падолля Вялікаму княству, а на гэтую зямлю прэтэндавалі і палякі. Вітаўт настойваў на сваім, пагражаючы разарваць з Польшчаю мір. Пагроза падзейнічала, і Ягайла паабяцаў саступіць Літве. Вось табе і васал! Ну што ж, тыя клятвы, што даваў Вітаўт, як цяпер высветлілася, былі палітычным манеўрам, а настаў зручны момант, і ён не прамінуў нагадаць, што лічыць сябе самастойным уладаром і дапамагаць Польшчы ў вайне з крыжакамі будзе не па прычыне васальнай залежнасці ад польскага караля, а толькі дзеля зямельных уступак.

Пераканаўшыся ў тым, што Вітаўт застаўся ў саюзе з Польшчаю, Ордэн адкрыта выказаў сваю варожасць да Вялікага княства.

1408 год выдаўся неўраджайным у Аўкштайціі і Літве, бо дажджы знішчылі пасевы яравых. Магістр даў загад ордэнцам не прапускаць з Прусіі хлеб у Літву. Тады Вітаўт папрасіў у Ягайлы прадаць зерне. Польскі кароль паслаў 20 караблёў з хлебам па Вісле, Балтыйскаму мору і Нёману да Рагнеты, каб адтуль караблі падняліся ўверх па Нёману ў землі Вялікага княства. У Рагнеце караван захапілі крыжакі. Каб апраўдаць гэты ўчынак, магістр Ульрык Юнінген заявіў, што на караблях везлі зброю для паганцаў супраць хрысціян. Цярпенне Ягайлы скончылася, ды каронная рада ўгаварыла яго стрымаць крыўду.

Надзеі, што ўдасца паразумецца з Ордэнам, былі дарэмнымі. Крыжакі напалі ў Рагнеце на літвінскіх купцоў і разрабавалі іх. Ганарысты Вітаўт нават не стаў весці з магістрам перамовы пра вяртанне купцоў і іх маёмасці. Ён ведаў, чым адказаць Ордэну. На патаемнай нарадзе ў Навагрудку Вітаўт і Ягайла вырашылі адваяваць Жамойць. У Жамойць быў пасланы атрад пад кіраўніцтвам маршалка Румбальда. Жамойць паўстала супраць Ордэна. Жамойты распраўляліся з ненавіснымі прыгнятальнікамі. Полымем гарэлі каталіцкія касцёлы і жытла ка-

ланістаў. Вітаўт адкрыта заявіў Ордэну: «Калі паспее жыта, ён выступіць з жамойтамі на Прусію і агнём і мячом пагоніць немцаў да мора, каб там патапіць іх»[137].

Толькі і крыжакі не сядзелі без справы. Паміж Ордэнам, германскім імператарам Робертам Клемам, брандэнбургскім маркграфам і угорскім каралём ішлі перамовы аб падзеле Польшчы. З такімі моцнымі саюзнікамі Ордэн адчуваў сябе ў небяспецы, а прывідная лёгкасць перамогі ў будучай вайне надавала крыжакам упэўненасці ў сваіх сілах. Ордэнскія паслы ў чэрвені 1409 года ўльтыматыўна заявілі Ягайлу, што, калі ён не пакіне Вітаўта і ў далейшым «жадае дапамагаць яму ў несправядлівай справе, хай рыцары і вяльможы Каралеўства Польскага не гневаюцца на магістра і Ордэн, калі, зняважаны глыбокай несправядлівасцю, ён пачне вайну супраць Польскага Каралеўства»[138]. Не выслухаўшы Ягайлавага адказу, крыжацкія паслы з'ехалі. Гэтая фанабэрыя крыжакоў ясна паказала Ягайлу: Ордэн скінуў з сябе маску добрага сябра, і захоўваць з імі мір, парваўшы з Вітаўтам, значыць, вырыць магілу і сабе, і Польшчы. Сёння Ордэн з дапамогай імперыі распраўіцца з Літвой, а заўтра чарга дойдзе і да Польшчы. Выбар быў зроблены. У канцы ліпеня польскія паслы сустрэліся ў Мальбаргу з магістрам Ульрыкам Юнінгенам. Спачатку яны запэўнівалі магістра, што польскі кароль абяцае паклапаціцца пра ўладкаванне непаразуменняў Літвы з Ордэнам, але пачулі ад магістра, што ён «не будзе далей трываць крыўды ў адносінах да сябе і Ордэна і зараз жа з усімі сіламі пойдзе вайной на Літву». Пасол Мікалай Куроўскі, архібіскуп Гнезненскі, адказаў: «Перастань, магістр, пужаць нас, што пойдзеш вайной на Літву. Калі ты адважышся гэта зрабіць, дык не сумнявайся, што наш кароль пойдзе на Прусію». Узрадаваны магістр заявіў: «Дзякую за шчырасць, велебны ойча. У такім выпадку звярну свой меч лепш на галаву, чым на тулава, лепш на пасеяную зямлю, чым на пакінутую, і лепш на гарады і сёлы, чым на лясы. Павярну зброю, назначаную супраць Літвы, на Польскае Каралеўства. Болей карысці мне і майму Ордэну адсекчы галаву, чым ногі, болей карысці пайці на ўрадажайныя землі, а не на палі, лясы і пушчы»[139].

6 жніўня магістр аб'явіў вайну Польшчы, а 14 жніўня крыжацкае войска стаяла ўжо каля польскага горада Добжына. Вось тады, пэўна, пашкадаваў Мікалай Куроўскі, што прагаварыўся і выдаў Ягайлаў намер — Польшча яшчэ была не падрыхтавана да вайны з Ордэнам. Як бы цяпер спатрэбіліся тыя тры-чатыры месяцы міру, пакуль хітрыя дыпламаты вадзілі магістра за нос, запэўніваючы яго ў самых добрых пачуццях Ягайлы да Ордэна! За гэты час сабралася б польскае воінства.

А цяпер даводзілася расплачвацца крыўднымі паражэннямі. Пасля абстрэлу з бамбардаў і пускання вогненных стрэлаў крыжакі лёгка захапілі Добжын. Горад спалілі, а ўсіх абарончаў пакаралі смерцю. Магістр сам адсек галаву добжынскаму старосце.

Пасля Добжына палі Баброўнік, Рыпін, Ліпна. Моцнага супраціўлення крыжакі не сустракалі. Перад штурмам крэпасці Залатыры рыцары прыгналі з Торна жанчын і дзяўчат і весела балявалі з імі, а простыя ландскнехты ў той самы момант захапілі крэпасць і ўчынілі там крывавую расправу. Перш чым паспелі палякі ачуняць ад весткі пра крыжацкі напад, Добжынская зямля апынулася ў руках Ордэна.

Вітаўт у гэты час стаяў з войскам пад Коўнам. Даведаўшыся, што магістр разарваў мір з Польшчаю, вялікі князь перайшоў цераз раку Нявежу і ўступіў у Жамойць. Жамойцкі фогт Міхаэль Кухмэйстэр спаліў свой замак на рацэ Дубісе і адступіў за Нёман. Вітаўт авалодаў Велонаю і паслаў асобныя харугвы рабаваць прускія землі да Мемеля.

Выступіў нарэшце з палякамі і Ягайла. Польскае войска абклала горад Быдгомшч. Ульрык Юнінген не адважыўся ваяваць адначасова супраць дзвюх дзяржаў і папрасіў чэшскага караля Венцаслава быць пасрэднікам у перамовах з Ягайлам. Вечны ордэнскі даўжнік Венцаслаў з ахвотаю ўзяўся выканаць гэтую паслугу. Ён прыслаў да Ягайлы паслоў з прапановаю заключыць перамір'е. Між тым Вітаўт паведаміў Ягайлу, што ён не можа прыйсці да яго з войскам і добра было б заключыць з Ордэнам перамір'е да будучага лета, каб ён мог лепш падрыхтавацца да вайны.

Існавала і іншая прычына, чаму Вітаўт не прыйшоў на дапамогу Ягайлу — боязь паўстання Свідрыгайлы. Той, вярнуўшыся з Масквы, па-ранейшаму інтрыгаваў, збіраў вакол сябе назадаволеных вялікім князем, зноў спісаўся з Ордэнам. Усё гэта стала вядома Вітаўту, чые віжы сачылі за кожным крокам няўдачлівага прэтэндэнта на велікакняжацкі пасад. Свідрыгайлу схапілі і кінулі ў вязніцу Крамянецкага замка.

Ягайла згадзіўся на перамір'е з Ордэнам, якое і заключылі 8 верасня тэрмінам да 14 чэрвеня 1410 года. Як трацейскі суддзя Венцаслаў абяцаў рассудзіць усе спрэчкі паміж Польшчаю і Ордэнам. А да прысуду абодва бакі валодаюць тым, што мелі ў дзень заключэння перамір'я. Такім чынам, Ордэн хоць на невялікі тэрмін пакінуў за сабою Добжынскую зямлю. Ягайла па дамове не мог дапамагаць жамойтам і іх саюзнікам, пад якімі разумеліся Вітаўт з літвінамі. Апроч таго, Ягайла не павінен быў тытулаваць сябе ўладаром Памор'я, г.зн., ён прызнаваў за Ордэнам польскае Памор'е. Пасля Ягайлавай смерці

палякі не могуць выбіраць у каралі вялікіх князёў літоўскіх, што азначала скасаванне Крэўскай уніі. На гэтым і пагадзіліся. Просты люд, калі даведаўся пра такое перамір'е з Ордэнам, кляў апошнімі словамі сваіх уладароў, якіх нібыта падкупілі золатам крыжакі.

Пакуль польскія і нямецкія дыпламаты спрачаліся з-за ўмоў перамір'я, Вітаўт усё ж працягваў вайну з Ордэнам. Пасланае ім войска на чале з ягоным братам Жыгімонтам спаліла прускія гарады Дзядлоў, Тамоў і Няверне. Крыжакі абвінавацілі Вітаўта ў парушэнні міру, хаця пра заключэнне яго ён і не ведаў. Але ці гэта важна было для крыжакоў, галоўнае абвінаваціць вялікага князя перад усёй Еўропай у вераломстве і падмане. Дэмагогія цяпер як ніколі была патрэбна Ордэну, каб завабіць у свае шэрагі даверлівых паломнікаў.

Перамір'е Ордэн выкарыстаў для падрыхтоўкі да вайны. Рыцары жылі чаканнем Іванава дня, калі скончыцца тэрмін, указаны ў дамове, і можна будзе пачынаць ваяваць з Польшчай і Літвой. У перамозе яны не сумняваліся. Найболей заўзятыя давалі ўрачыстыя клятвы, як, напрыклад, тухоўскі комтур Генрых, які абяцаў насіць перад сабою два мячы, пакуль не амочыць іх у польскай крыві. Сам магістр павесіў сабе на грудзі цудадзейныя рэліквіі — яны павінны былі прынесці яму перамогу. Але болей Юнінген спадзяваўся на грошы. Велізарныя сумы плаціў Ордэн на набыццё зброі, гармат, харчоў. Агенты наймалі на службу вайсковыя атрады з Германіі, Чэхіі, Францыі, Швейцарыі, Англіі. Грошай хапала. За дзвесце гадоў рабаўніцкіх войнаў у ордэнскай скарбніцы назбіралася нямала багацця. Ульрык Юнінген хваліўся: «У мяне ёсць цэлая вежа золата, якім я заваюю дзесяць такіх каралеўстваў, як Польшча»[140]. А калі ёсць золата, дык можна купіць і караля. За 60 тысяч залатых магістр падкупіў чэшскага караля Венцаслава, каб той прысудзіў Добжынскую зямлю Ордэну. Не ўстояў перад бляскам жоўтага металу і кароль Жыгімонт угорскі. Яму заплацілі 40 тысяч угорскіх залатых. Угорыя і Ордэн заключылі паміж сабою саюз, па якому Жыгімонт абяцаў абвясціць Польшчы вайну, калі Ягайла пачне ваяваць з крыжакамі. Былі таксама падкуплены лівонскі, курляндскі і эзэльскі біскупы.

З пашанай сустракаў Ордэн вялізныя натоўпы паломнікаў, што рушылі ў Прусію з усёй Еўропы. Баляванні, рыцарскія спаборніцтвы, ловы пацяшалі гасцей. Склікалася і прускае апалчэнне. Мальбарг быў падобны на вайсковы стан. Бесперапынна цягнуліся да гарадскіх брам вазы з харчам, зброяй, падыходзілі атрады вояў. Ва ўсіх ордэнскіх кузнях выраблялі зброю. Ліцейныя заводы ў Мальбаргу, Данцыгу адлівалі гарматы і сярод іх адну буйнога калібру, «якую не бачылі дагэ-

туль ні ў воднай нямецкай краіне, ні ў Польшчы, ні ва Угорскай зямлі»[141].

Рыхтаваліся да вайны ў Польшчы і Літве. Вітаўт рашуча заявіў, што крыжакі хочуць прымусіць літвінаў пакінуць родную зямлю, але яны напояць сваіх коней у Рэйне. 17 кастрычніка 1409 года Ягайла прыехаў у Бярэсце на сустрэчу з Вітаўтам. Тут абодва ўладары абмеркавалі план сумесных дзеяў супраць Ордэна. Для хуткай пераправы цераз Віслу яны вырашылі пабудаваць загадзя мост на лодках, каб потым падвезці яго да ракі па сушы. Пасля ўступіць з войскам у Прусію, ісці на ордэнскую сталіцу. Тут, у Бярэсці, прысутнічаў і Тахтамышаў сын, Саладзін (Джалал-ау-Дзін), якога Вітаўт угаварыў быць у саюзе з Вялікім княствам. Але Саладзін мог шмат абяцаць, толькі магчымасці ягоныя былі абмежаваны. Длугаш указвае, што ў Грунвальдскай бітве ўдзельнічала толькі адна татарская харугва ў 300 вершнікаў. Тым не меней Саладзін выгандляваў сабе абяцанне ад Вітаўта дапамагчы яму стаць ханам Залатой Арды.

З Бярэсця Вітаўт з Саладзінам адправіліся ў Вільню, а заўзяты паляўнічы Ягайла не прамінуў пацешыцца ловамі. Восем дзён гойсаў ён у нетрах Белавежскай пушчы. Сотні паляўнічых білі звера: зуброў, аленяў, ласей, вепрукоў. Але не толькі дзеля забавы цікавалі звера лоўчыя, а сяляне выганялі яго з гушчару на стралкоў — пушча шчодра ахвяравала сваё багацце войскам Ягайлы і Вітаўта. Мяса салілі ў дзежках і на караблях сплаўлялі па рэках Нараў і Вісла ў Плоцк на запас для будучай вайны.

Кожны займаўся сваёй справай: паляўнічыя дабывалі мяса для войска, рукадзельныя майстры кавалі зброю, ліцейшчыкі ў гарачыні лілі гарматы і ядры, баяры путныя, не шкадуючы сваіх коней, скакалі з аднаго краю дзяржавы ў другі, неслі ваяводам загады вялікага князя. Рабілі сваю справу і віжы. Пад выглядам манахаў з жабрацкай торбачкаю бадзяліся яны па Прусіі, выглядвалі, распускалі хлуслівыя чуткі пра задумы Ягайлы і Вітаўта, збіваючы з панталыку крыжакоў. Пачалі барацьбу і дыпламаты. Па ўсіх еўрапейскіх дварах развозілі яны граматы супраць Ордэна, каб выкрыць яго драпежніцкую сутнасць: «Толькі адно радуе крыжакоў на гэтым шляху — любы захоп чужых земляў. Адсюль вынікае, што яны будуць рабіць з другімі ўладарамі вось так няправедна, як яны цяпер робяць з намі, і тады, пэўна, з цяжкасцю хто-небудзь здолее вытрымаць. Без сумнення, калі іх з Божаю дапамогаю не ўтаймаваць, дык у далейшым яны ўсе дзяржавы і ўладанні пачнаяць свайму панаванню. Ёсць у іх дзеях нешта вельмі агіднае і вартае шкадавання, паколькі яны зусім не жадаюць узгадняць

тыя дзеі з якім-небудзь законам або царкоўнымі пастановамі... іх імкненні і воля накіраваны на тое, каб утрымліваць сваё, чужое прысвойваць і дамагацца яго. Яны жадаюць заўжды карыстацца чужым дабром, берагчы сваё ад кожнага; пры захопе чужога яны не звяртаюць увагі ні на закон, ні на справядлівасць...»[142]. Аднак усе заходнія манархі адкрыта падтрымлівалі Ордэн і Ягайлавым пасланням не давалі веры, а то проста здзекаваліся з польскіх паслоў. Ужо вядомы нам Генрых IV, англійскі кароль, які ў свой час дапамагаў тэўтонам у іх паходах, спытаўся ў польскага пасла аб прычынах паўстання жамойтаў. Калі ж пачуў паміж іншых прычын тую, што крыжакі гвалцілі жамойцкіх жанчын, здзекліва заўважыў: «І я таксама маю немаленькую зямлю, але што было б з намі, калі б я губляў яе пасля кожнага жарту маіх рыцараў з чыёй-небудзь жонкай»[143].

Захад падтрымаў Ордэн. А што ж Усход? Маскоўскае княства залечвала раны пасля Эдыгеевага нашэсця. І хаця і не падтрымаў Васіль свайго цесця войскам, але і не збіраўся ўдарыць у спіну. Нейтральным застаўся і Пскоў. Ноўгарад прыслаў дружыну, якую прывёў князь Лугвеній.

Вітаўтавым дыпламатам удалося аднавіць адносіны з Валахіяй, і адтуль прыйшлі вайсковыя атрады валахаў, бесарабаў і армян. На бок Польшчы перайшлі мазавецкі князь Земавіт і паморскі князь Багуслаў. У чэшскіх землях каралеўскія чыноўнікі нанялі на службу каля 10 тысяч вояў. Аднак галоўная надзея была на свае харугвы. Тагачасны падарожнік, які ехаў па Літве, мог бачыць вайсковыя табарышчы, куды збіраліся з сёлаў апалчэнцы. Цэлы дзень напралёт там гудзелі стрэлы, з гікам насіліся па колу вершнікі, цэлячы шаблямі і дзідамі ў вешкі. Мог падарожнік назіраць, як маладыя вясёлыя хлопцы і ўжо сталыя мужчыны вярхом на конях навыперадкі «лётам лятуць — толькі тупат ды грывы па ветры»[144], ці ўбачыць, як рынулі з берага таксама на конях голыя людзі і плывуць па шыю ў вадзе. Так рыхтавалася народнае апалчэнне да вайны. Пра гэта мы чытаем у паэме «Песня пра зубра» таленавітага літвінскага паэта-лацініста Мікалая Гусоўскага:

Доблесць тая сталела ў лясах і па вёсках.
Славы сястру, яе песцілі ў годы княжэння
Грознага Вітаўта ўсюды на землях дзяржавы.
Кожны дзядзінец пры замках, груды між балотаў —
Гэта пляцы і пляцы для вайсковых заняткаў.
Мірны перыяд між войнамі быў перадышкай,
Каб адпачыць, падвучыцца і, страты пакрыўшы,
Рушыць у новы паход...
...Войны прадбачачы ўслед за малой перадышкай,
Князь рыхтаваў да вайны сваё войска і княства.

Мудрая справа — у часе самой падрыхтоўкі
Вытравіць боязь і страх са свядомасці вояў
І прывучыць іх зараней да ўсякай нягоды.
Сам гартаваны, як меч на кавалдзе паходнай,
Вітаўт і знаць не хацеў сабе большага шчасця,
Чым гартаваныя ў бітвах бясстрашныя раці.
Доблесць пры ім афіцыйна лічылася першай
Якасцю воіна, і на вайсковых аглядах
Ён, як аптэкар на вагах, узважваў, хто лепшы,
Лепшаму там жа за доблесць і дзякаваў шчодра*[145].

ГРУНВАЛЬД

Так за падрыхтоўкай да вайны надышоў 1410 год. У Прагу да караля Венцаслава, які браўся рассудзіць Ордэн і Польшчу, прыехалі польскія і мазавецкія паслы на чале з познаньскім біскупам Ястшэмбецам, разам з імі і літвінскія паслы: рыцар Бутрым і велікакняжацкі сакратар Мікалай Цыбулька. Заўжды п'яны чэшскі кароль болей забаўляўся, чым думаў пра даручаную яму справу. Хаця што думаць? Усё было вырашана ўжо тады, калі ён атрымаў ад крыжакоў хабар. Польскія, мазавецкія і літвінскія паслы не цешылі сябе надзеямі ў справядлівасць Венцаславага суда. А крыжацкія паслы для большай упэўненасці падкуплялі чэшскіх высокапастаўленых асобаў.

Час ішоў, а кароль па-ранейшаму п'янстваваў ды забаўляўся. Нарэшце мараўскі маркграф Йодык настояў, каб Венцаслаў выказаў свой прысуд. 15 лютага паслы сабраліся ў каралеўскім палацы. Венцаслаў з пачырванелым і апухлым тварам зусім не цікавіўся тым, што адбывалася ў зале, выразаў нажом з дрэва нейкую цацку. Яму ўручылі грамату, і ён без ахвоты падняўся на памост, каб зачытаць яе. Як толькі польскія, літвінскія і мазавецкія паслы пачулі, што Венцаслаў чытае яе па-нямецку, выйшлі з пакоя. Кароль паслаў ім сваю грамату. І нічога нечаканага для сябе ў ёй яны не знайшлі: Жамойць і частка Судавіі, што межавала з Гарадзенскімі землямі, прысуджаліся Ордэну; Добжынская зямля адыходзіла да чэшскага караля, які перадасць яе таму ці другому боку па свайму рашэнню; Польскае каралеўства не павінна ніколі болей выбіраць у каралі вялікіх князёў літоўскіх, а толькі заходніх уладароў. Венцаслаў поўнасцю абараніў інтарэсы Ордэна. З такім рашэннем трэцейскага суддзі ні Ягайла, ні Вітаўт не пагадзіліся — падрыхтоўка да вайны з Ордэнам працягвалася.

---

*Пераклад Язэпа Семяжона.

Ордэн таксама рыхтаваўся. Ужо было сабрана прускае апалчэнне. Усе крэпасці запасліся харчамі і зброяй. На межах дзяржавы стаялі войскі. Магістр падумваў, як бы рассварыць Ягайла з Вітаўтам, раз'яднаць саюз Польшчы з Вялікім княствам. Не спыніўся Юнінген і перад магчымасцю забойства Вітаўта. Даведаўшыся, што вялікі князь збіраецца ехаць з княгіняй Ганнай у Польшчу, крыжакі паспрабавалі перахапіць яго па дарозе ў Ваўкавыск. Праз бязлюдныя мясціны паміж Гародняй і Бельскам на Літву патаемна прабраўся атрад рыцараў. Каля мястэчка Яскеры несла службу літвінская варта. Па дымку вогнішча крыжакі вылічылі вартаўнікоў і, падкраўшыся, напалі на іх. Усе да аднаго літвінскія воі загінулі, ніхто цяпер не мог папярэдзіць людзей у Ваўкавыску пра небяспеку. У горадзе ніхто ворага не чакаў. Была вербная нядзеля, і ў храмы з'ехалася з навакольных вёсак мноства народу. Крыжакі акружылі горад і ўварваліся ў яго. Загінула мноства мірных жыхароў. Разрабаваўшы хаты, цэрквы і запаліўшы горад, крыжакі з палонам павярнулі назад.

Вітаўта ў горадзе не было (шчаслівая для князя выпадковасць!), ён разам з Ганнаю знаходзіўся ў Слоніме ў сямі мілях ад Ваўкавыска. Калі вялікі князь даведаўся пра напад крыжакоў, дык, «ахоплены моцным жахам»[146], разам з Ганнай схаваўся ў глухіх дрыгвяністых лясах каля Здзітава і не выходзіў адтуль, пакуль не пераканаўся ў бяспецы. Нечаканыя для Вітаўта паводзіны. Смелы і мужны — а маладушна хаваецца ад крыжакоў. Можа, гэта звычайная баязлівасць, а можа, і мудрасць, разуменне сваёй адказнасці за лёс народа, усведамленне, што ад выпадковай ягонай смерці можа не ажыццявіцца тая справа, марай пра якую жыло не адно пакаленне літвінаў, — разгром Ордэна.

Крывавы ўрок крыжакоў літвінскія ваяры засвоілі. З гэтага часу вартавыя, каб іх не выкрыў вораг, складвалі вогнішчы з дубовай кары, якая гарэла без дыму.

Тое, што не ўдалося здзейсніць крыжакам, узяўся зрабіць угорскі кароль. У красавіку Вітаўт прыехаў у гарадок Кежмарк на сустрэчу з Жыгімонтам. Гэта сустрэча павінна была даць адказ, ці збіраецца кароль выконваць мірную дамову з Польшчаю. Вітаўт прасіў Жыгімонта захаваць мір. Але ж не ведаў ён, што той ужо падкуплены Ордэнам. Жыгімонт адказаў, што ён не стане захоўваць умовы міру, калі Польшча нападзе на Ордэн, але запрапанаваў быць пасрэднікам у перамовах з магістрам.

У тыя ж дні на вуліцы, дзе спыніўся Вітаўт са сваёй світай, успыхнуў пажар. Зноў пажар! Пэўна, здагадаўся князь, што менавіта яго хацелі спаліць у агні, а таму засабіраўся ў дарогу. І Жыгімонт ухапіўся за апошнюю магчымасць. Не была для

яго таямніцай Вітаўтава мара, і таму ведаў ён, што прапанаваць ганарыстаму вялікаму князю — каралеўскую карону. Жыгімонт — такі добразычлівец! — уладаю сваёю абяцаў Вітаўту вызваліць яго ад клятвы Ягайлу, сяброўства сваё і падтрымку. Разумеў Вітаўт, дзеля чаго той так стараецца: разарваць саюз Вялікага княства і Польшчы напярэдадні вайны з Ордэнам. У іншы час мог бы і прыняць Жыгімонтаву прапанову, але цяпер — гэта крывадушная здрада саюзным абавязкам, здрада агульнай справе — разгрому Ордэна, здрада памяці Кейстута. Аднак Вітаўт умеў хітрыць — ён згадзіўся, каб Жыгімонт не затрымаў яго, а калі вярнуўся да сябе, падняў сваіх людзей і выехаў з Кежмарка. Жыгімонт, даведаўшыся пра гэта, паспяшаўся за Вітаўтам і нагнаў яго, але пра карону маўчаў, толькі развітаўся са сваім госцем.

У Новым Сандэце Вітаўт сустрэўся з Ягайлам, распавёў пра перамовы з угорскім каралём. Ізноў абодва ўладары абмеркавалі падрыхтоўку да вайны з крыжакамі. Пасля Вітаўт адправіўся ў Літву. У Бярэсці яго чакала Ганна. Як толькі прыехаў у княства, адразу загадаў падымаць харугвы ў паход. І панесліся вестуны па сёлах і гарадах. Месцам збору войска была Гародня. Сюды прыйшло сорак харугваў. Некаторыя з іх пералічвае Длугаш: Трокская, Віленская, Гарадзенская, Ковенская, Лідская, Медніцкая, Полацкая, Віцебская, Кіеўская, Пінская, Наваградская, Берасцейская, Ваўкавыская, Дрыгічынская, Мельніцкая, Крамянецкая, Старадубская, тры смаленскіх палкі. 10 харугваў былі пад сцягам з гербам «Калюмны», а значыць, іх выставіў сам Вітаўт, астатнія мелі герб «Пагоня». Названы харугвы некаторых князёў: мсціслаўскага князя Лугвенія, Жыгімонта Карыбутавіча. Былі ў войску харугва з Малдавіі ў 800 воінаў, харугва святога Юрыя з Чэхіі, татарская харугва Саладзіна. Усё войска магло налічваць 18 тысяч конніцы і 1500 пяхоты. Не выклікае сумненняў, што выставілі свае харугвы ўдзельныя літвінскія князі Іван Гальшанскі, Рыгор і Андрэй Заслаўскія, Сямён і Пуцята Друцкія. Харугву прывёў невядомы нам князь Юрый, пад якім разумеюць ці Юрыя, сына Сымона — Лугвенія, ці Юрыя Уладзіміравіча, князя пінскага, ці Юрыя Міхайлавіча, сына Міхайлы Заслаўскага. Была харугва і з Ноўгарада Вялікага пад кіраўніцтвам мсціслаўскага князя.

Аддаў загад польскім воям брацца за зброю і Ягайла. Чым менш заставалася часу да заканчэння перамір'я з Ордэнам, тым болей кароль упадаў у набожнасць, нібыта сваёй святасцю спадзяваўся заслужыць дапамогу нябёсаў. Ён адправіўся на Лысую гару ў манастыр Святога крыжа. Два дні запар кароль на каленях правёў у малітвах, «аддаючы сябе і сваю справу абароне Госпада і Святога крыжа»[147]. А дні няўмольна беглі.

Напярэдадні Івана Купалы (14 чэрвеня), дня, калі заканчвалася пермір'е, польскія атрады запалілі ордэнскія сёлы па берагах Віслы. Пад зарыва гэтых пажарышчаў у лагеры пад Свецам Ульрык Юнінген сустрэўся з угорскімі пасламі Мікалаем дэ Гарам і Сцыборам Сцыбожыцам, якія ў свой час выклікаліся быць пасрэднікамі ў перамовах Ордэна з Польшчаю. Разлаваны магістр накінуўся на паслоў: «Што гэта за перамовы вы вядзеце з намі, нібыта клапоцячыся пра мір, калі яны (палякі. — *В.Ч.*), крывадушныя, на маіх вачах паляць, забіваюць і рабуюць у маіх уладаннях». Паслы заспакоілі магістра: «Гэта маленькі і няўдалы пажар не перашкодзіць перамовам пры заключэнні міру, бо вайна мае свае ўмовы і сваё права. Ты звяртаеш увагу на невялікую страту, нанесеную табе Каралеўствам Польскім, але не прызнаеш шкоду, забойствы і пажары, якія ты прынёс Каралеўству Польскаму рабаваннем і захопам Добжынскай зямлі гэтага Каралеўства. Каб лягчэй і паспяхова пры нашым пасрэдніцтве пачаць перамовы пра мір, нам здаецца разумным заключыць паміж вамі на некалькі дзён перамір'е»[148]. Магістр, жадаючы канчаткова завяршыць падрыхтоўку да вайны, згадзіўся на перамір'е на два тыдні і паслаў угорскіх пасрэднікаў да Ягайлы.

Яны знайшлі караля з войскам каля Віслы ў горадзе Вальбожэ, куды яшчэ падыходзілі польскія харугвы і атрады чэшскіх, мараўскіх і іншых наймітаў. Ягайла прыняў прапанову Ордэна, бо чакаў падыходу Вітаўта.

26 чэрвеня польскае войска рушыла ў паўночна-ўсходнім кірунку насустрач літвінскаму войску. Вітаўт паведамляў, што ён стаіць каля ракі Нараў, але асцерагаецца крыжакоў, таму просіць Ягайлу прыслаць для падмацавання некалькі атрадаў. Кароль выслаў свайму саюзніку 12 харугваў. 30 чэрвеня цераз Віслу быў наладжаны загадзя пабудаваны на лодках мост. У той жа дзень польскае войска пераправілася цераз раку і спынілася на другім беразе Чэрвінску. Пад вечар сюды падышоў са сваім войскам і Вітаўт. Ягайла выехаў насустрач яму за чвэрць мілі ад лагера. Не думаў ён шмат гадоў таму, калі Вітаўт чакаў смерці ў Крэўскім замку, што вось такі выпадзе ім лёс; былыя сябры, а пасля ворагі стануць саюзнікамі, і наканавана ім плячом да пляча разам завяршыць справу сваіх продкаў — перамагчы Ордэн, і з нецярплівасцю будзе ён чакаць Вітаўта і шчыра на радасцях абдымаць яго пры сустрэчы.

Прускае войска заставалася стаяць у лагеры пад Свецам. Самаўпэўнены Ульрык Юнінген, даведаўшыся ад Дабеслава Скарачоўскага, які пабываў паслом у Ягайлы, што польскае войска пераправілася цераз Віслу і да яго далучылася войска Вялікага княства, зняважліва заўважыў: «У Вітаўтавым войску

можна знайсці болей людзей з лыжкамі, чым са зброяй». Дабеслаў запярэчыў яму: «Павер мне, магістр, што войска князя Вітаўта не толькі вялікае і моцнае, але і добра ўзброенае». Магістр ганарліва адказаў: «Мы лепш цябе ведаем яго і якое войска ў князя, якую моц яно ўяўляе людзьмі, зброяй і конямі: нам гэта добра вядома па частаму вопыту...»[149]. Легкадумна аднёсся Юнінген і да паведамлення, што непрыяцельскія войскі пераправіліся цераз Віслу па плывучым мосце, як па сушы. Ён рассмяяўся і звярнуўся да ўгорскіх паслоў: «Гэта лухта, і ўсё, што адважыўся распавесці гэты чалавек, вельмі падобна на выдумку. Бо надзейныя нашы віжы прынеслі вестку, што польскі кароль знаходзіцца і раз'язджае каля Віслы і спрабуе, праўда, але не ў сілах пераправіцца цераз яе. Ужо шмат ягоных вояў пры спробе перайсці яе ўброд загінула ў хвалях: Вітаўт жа стаіць каля ракі Нараў і не асмеліцца перайсці яе»[150].

Падвялі магістра ягоныя віжы, так і не разгадалі яны хітры манеўр непрыяцеля. А Ягайла і Вітаўт ужо вялі свае войскі да прускіх межаў. Самыя нецярплівыя па начах пакідалі лагер і рабілі набегі на ордэнскія землі, каб прыдбаць сабе луп. Саюзнікі ішлі на Мальбарг кароткай дарогай, і былі ўжо непадалёк ад ракі Дравенц. А там рукой падаць да Ордэнскай сталіцы.

Толькі цяпер магістр даведаўся пра хітрасць Ягайлы і Вітаўта. Ён падняў крыжакоў і паспяшаўся да Дравенца. Ордэнскае войска апярэдзіла польска-літвінскае. Крыжакі ўмацавалі свой бераг густымі шэрагамі вострых бярвенняў, засекамі і воўчымі ямамі. З бліжэйшых крэпасцей і з Мальбарга прывезлі мноства бамбардаў, якія ўстанавілі на беразе. Польска-літвінскае войска знаходзілася ў гэты час пад гарадком Яжова. Сюды 5 ліпеня прыехалі ўгорскія паслы Гар і Сыбожыц, якія заклікалі караля і вялікага князя згадзіцца на мір і назваць свае ўмовы. Ягайла пасля рады з Вітаўтам даў такі адказ: «Мне ніколі не былі чужымі і далёкімі мірныя намеры; таксама і цяпер я не адмаўляю любога справядлівага міру, каб не давялося праліваць крыві каталікоў. Але мір толькі тады будзе справядлівым, калі за Вялікім княствам Літоўскім застанецца Жамойцкая зямля, зямля ж Добжынская, гвалтам занятая магістрам Прусіі і крыжакамі, будзе вернута каралю і Каралеўству Польскаму...»[151]. Паслы адправіліся ў лагер крыжакоў, якія сталі пад мястэчкам Куртэнтнікам. Ганарлівыя рыцары патрабаванне вярнуць тое, што яны са зброяй у руках заваявалі, успрынялі як абразу. На радзе яны аднадушна вырашылі: «Вайна! Вайна!». Ульрык Юнінген заявіў паслам: «Нашым рознагалоссям і спрэчкам — пакладуць канец не нашы словы, хаця б і моўленыя ад імя цэзара, і не пасрэдніцтва якой другой улады,

але меч і зброя; пасля таго як мы бачылі, што спусташаюцца нашы воласці і гараць нашы хаты, мы патушым нашы пажары варожай крывёй». Адзін толькі мевенскі камандор граф фон Вендэ запярэчыў: «Я думаю, што верны мір лепш надзеі на перамогу». Да слоў яго не прыслухаліся. «Табе трэба заставацца дома пад дахам, бо ты больш здатны для нагляду за хворымі братамі Ордэна, чым для вайсковых спраў»[152], — пачуў граф зняважлівы адказ крыжакоў.

Між тым аб'яднанае войска Ягайлы і Вітаўта працягвала рухацца да Дравенца. Ішлі па мазавецкіх землях, якія заклаў Ордэну князь Земавіт. Прагныя да лупу татары і літвіны рабавалі сёлы мазураў, забівалі не толькі дарослых, але і немаўлят у калысках. Маці забітых дзяцей прабіваліся праз варту да каралеўскага шатра, плакалі і прасілі перад каралём заступы. Святары, што суправаджалі войска, пачалі патрабаваць ад Ягайлы спыніць дзікунства і марадзёрства, пагражаючы пакінуць лагер. Ягайла і Вітаўт загадалі вызваліць палонных мазураў і назначылі смяротную кару за рабаванне. Загад гэты не ўстрымаў рабаўнікоў. Па-ранейшаму палілі яны сёлы, забівалі людзей, рабавалі касцёлы. Устрывожаныя польскія вяльможы і рыцары, баючыся божай кары, паскардзіліся Ягайлу і Вітаўту і заявілі, што, пакуль віноўныя не панясуць кары, яны не стануць пад сцяг. Па Ягайлавым загаду зрабілі вышук і выявілі двух рабаўнікоў — завадатараў марадзёрства. Лёс іх быў вырашаны. У такіх выпадках Вітаўт судзіў хутка — пазбавіць горла. Асуджаныя самі паставілі сабе шыбеніцу і самі накінулі на шыю вяроўку, спяшаючыся выканаць прысуд, каб Вітаўт не ўгневаўся на іх маруднасць і не загадаў пакараць больш цяжка. Пасля гэтага рабаўнікі ўтаймавалі сваю прагу да спажывы.

10 ліпеня дасягнулі Дравенца. Пераканаўшыся, што цераз раку немагчыма пераправіцца, Ягайла і Вітаўт павялі войскі ў абыход да вярхоўяў Дравенца, каб адтуль ужо ісці на Мальбарг. Натупным днём у лагер прыехаў прадстаўнік ад угорскіх паслоў — сілезец Фрыг фон Рэпткі. Ён абвясціў Ягайлу: «Паколькі Жыгімонт, кароль угорскі... з'яўляецца адначасова намеснікам Рымскай імперыі, дык не варта яму пакідаць магістра і Ордэн крыжакоў, падуладны Рымскай імперыі. Таму па загаду ўгорскіх баронаў я даю тваёй светласці пасланне Жыгімонта, караля ўгорскага, якім ён разрывае з тваёй светласцю мір і прымае бок магістра і Ордэна»[153].

Як ні горка было Ягайлу выслухоўваць гэтыя словы, але яны не былі для яго нечаканымі. Заставалася надзея, што хітры і асцярожны Жыгімонт усё ж не асмеліцца адразу напасці на Польшчу, будзе чакаць вынікаў вайны з Ордэнам. Пра разрыў

з Угорыяй войску не абвясцілі, каб не пасеяць у сэрцах вояў трывогу і няўпэўненасць.

Крыжакі ўспрынялі манеўр польска-літвінскага войска як адступленне перад імі. Магістр паспяшаўся з крыжакамі ўслед за Ягайлам і Вітаўтам. Ніякіх сумненняў у сваёй перамозе ў яго не ўзнікала: «Я ўпэўнены, што польскі кароль і яго войска ўцякае, спалохаўшыся маіх сіл і магутнасці». Нейкі стары, вопытны рыцар слушна заўважыў: «Сцеражыцеся, магістр, каб гэтымі ўцёкамі, пра якія нам паведамляюць, каралеўскае войска не намыліла табе галаву і каб ты не адмовіўся ад падманлівага меркавання, якое цябе радуе, толькі тады, калі зразумееш, што каралеўскае войска напала на тваі гарады»[154]. Магістр задумаўся — можа, і сапраўды Ягайла з Вітаўтам водзяць яго за нос. Магістр загадаў спыніць войска каля замка Браціана і стаў тут лагерам.

Пакуль крыжакі рыхтаваліся да пераправы цераз раку, войска Ягайлы і Вітаўта падышло да мястэчка Дамброўна. Вечарам каля яго адбылася сутычка паміж атрадам крыжакоў і польскімі рыцарамі. Дарэмна загадваў Ягайла праз глашатаяў спыніць прыступ, воі не звярталі ўвагі на каралеўскі загад і ўжо па драбінах падымаліся на крапасныя сцены. Мястэчка стала здабычай пераможцаў. Тут ужо паказалі сябе палякі, якія бязлітасна забівалі месцічаў, рабавалі іх маёмасць.

Даведаўшыся ад віжоў пра захоп і спаленне Дамброўна, Юнінген раз'юшыўся і загадаў ордэнскаму войску перапраўляцца цераз Дравенц.

Мінуў яшчэ адзін дзень. Раніцай Ягайла вызваліў з палону ўсіх захопленых месцічаў, апроч крыжакоў і гарадской знаці. Войска засталося стаяць каля мястэчка, каб сабраць там яшчэ здабычу. Ноч выдалася яснай і ціхай. Як заўсёды перад бітвамі, не абышлося без містыкі. Некаторыя воі, якія стаялі на варце, упэўнівалі раніцай сваіх прыяцеляў, што бачылі, як нібыта на месяцы змагаліся кароль і манах і апошні, перможаны каралём, упаў уніз. Гэта палічылі добрай адзнакай. Але з прускага боку насоўвалася навальніца. Спачатку дасталася крыжакам. Моцны вецер звaліў усе намёты ў іх лагеры, ударылі пяруны, і праліўны дождж абрынуўся на зямлю. Крыжакі за ўсю ноч ні разу не заплюшчылі вочы. Потым насунуліся хмары на лагер саюзнікаў, і над ім паліў дождж.

Раніца 15 ліпеня выдарылася пахмурнай і халоднай, дзьмуў моцны вецер. Каралеўскія слугі ніяк не маглі паставіць шацёр для паходнай капліцы. Набожны Ягайла хацеў выслухаць абедню на месцы стаянкі. Але кожны раз, калі слугі разгортвалі шацёр, ён пад парывамі ветру падаў. Вітаўт угаварыў караля выступіць у дарогу.

Войскі, прайшоўшы дзве мілі, дасягнулі сёлаў Логдаў і Фаўлен, што знаходзіліся збоку ў палове мілі ад Грунвальда. Саюзнікі спыніліся на ўзлеску. Перад імі ляжала шырокае зялёнае поле, пасярод якога віднеліся дахі сяла Грунвальд*, а некалькі далей, направа, ляжала сяло Танненберг, за якім пачыналася паравое поле. Паміж Танненбергам і лагерам саюзнікаў расла купка вялізных дубоў. Войскі спыніліся каля Грунвальда на кароткі адпачынак і набажэнства. Ягайлава сэрца ўсцешылася: слугі нарэшце паставілі царкоўны шацёр на пагорку каля Любенскага возера. Кароль мог маліцца. А з другога боку Грунвальда падыходзілі першыя крыжацкія харугвы. Польскія віжы прыскакалі да Ягайлы з паведамленнем, што заўважылі паблізу варожае войска. Аднак кароль не даў ніякіх загадаў, а праслухаў дзве імшы. Гэтага яму здалося мала, і ён, стаўшы на калені, маліў Бога паслаць яму перамогу. Вітаўт не знаходзіў сабе месца, слаў аднаго за другім вестуноў да Ягайлы, каб ён заканчваў маліцца, і, не вытрымаўшы, сам заявіўся да караля. Узбуджаны, раззлаваны на маруднасць стрыечнага брата, ён без асаблівай пашаны да ягонага сану запатрабаваў успомніць нарэшце і пра войска. Набожнасць Ягайлы магла дорага каштаваць, бо войска яшчэ не было падрыхтавана да бою. Аднак крыжакі палічылі, што непрыяцель наўмысна стаіць каля лесу, каб завабіць іх у засаду, таму яны чакалі падыходу ўсіх сваіх харугваў.

Ягайла да апошняй хвіліны пазбягаў бітвы. Можа, крыжакі ўсё ж пагадзяцца на мір на ягоных умовах?

Вітаўт пакінуў караля і паехаў да свайго войска. Харугвы Вялікага княства стаялі баявым шэрагам супраць крыжакоў з боку Любенскага возера. Палякі, якімі камандаваў Зындрам Мышковіц, занялі левае крыло, пасярэдзіне размясціліся тры смаленскія палкі. Шыхаваліся да бітвы і крыжакі. Здалёк былі відны крыжы на іх белых плашчах, гербы на сцягах.

Няшмат мінула часу — і абодва варожых войскі ўжо стаялі адно супраць аднаго. Стрымлівалі нецярплівых коней вершнікі, нацягвалі цеціву тугіх лукаў стралкі, забілі ядры ў жорлы гармат гарматчыкі, пяхота натапырылася лесам дзідаў. Вецер раздуваў сцягі. Харугвы абодвух войскаў ушыхаваліся клінамі — традыцыйнай баявой пабудовай тых часоў. Уперадзе і па баках стаялі закутыя ў латы вопытныя і смелыя воі, за імі знаходзіўся сцяганосец, а ў сярэдзіне знаходзіліся лучнікі, арбалетчыкі, лёгкаўзброеныя апалчэнцы.

Польска-літвінскае войска налічвала 90 харугваў: 50 польскіх (з іх перамышльская, львоўская, холмская, тры падольскіх —

*Славянская назва — Дуброўна.

украінскія і чатыры з чэшскіх, мараўскіх, сілезскіх наймітаў) і 40 — з Вялікага княства. Ордэнскае войска было падзелена на 51 харугву.

Колькі ж вояў удзельнічала ў бітве? Тэўтоны, жадаючы хоць неяк апраўдаць сваё паражэнне, называлі астранамічную лічбу свайго непрыяцеля — 500 тысяч[155], пазней гэтая лічба зменшылася да 163 тысяч. А ў Ордэна — 83 тысячы воінаў[156]. Прыводзіліся лічбы ў 100 тысяч — польска-літвінскае войска (25 тысяч конніцы) і адпаведна 60 тысяч — крыжацкае (15 тысяч конніцы)[157]. Польскі гісторык С.Кучынскі, аналізуючы мабілізацыйныя магчымасці абодвух бакоў, прыйшоў да высновы, што польска-літвінскае войска налічвала 31,5 тысячы вояў, з якіх 29 тысяч складалі вершнікі; ордэнскае войска — 32 тысячы, з якіх 21 тысячу складала конніца і 11 тысяч — пяхота[158]. Аднак якія лічбы не прыводзілі б летапісцы і гісторыкі, адно без сумнення: Грунвальдская бітва — адна з буйнейшых бітваў Сярэднявечча.

Так стаялі войскі адзін супраць аднаго на адлегласці палёту стралы. Тры баявыя шэрагі ўтварылі палякі і літвіны. За іх спінаю знаходзіўся ўмацаваны абоз. Крыжакі занялі найбольш прыдатныя пазіцыі на ўзвышшы, зручныя як для нападу, так і для абароны. Але цяжкаўзброеным рыцарам было невыгодна атакаваць варожае войска, якое стаяла на ўзлеску ў забалочанай мясцовасці. Таму магістр вырашыў выманіць непрыяцеля з лесу на чыстае поле пад знішчальны агонь бамбардаў і самастрэлаў, а пасля атакай цяжкай конніцы разбіць.

Калі ён на свае вочы ўбачыў, якое шматлікае войска перад ім, былыя фанабэрыя і самаўпэўненасць пакінулі яго. І, нібыта зразумеўшы, што надзей на перамогу мала, Ульрык фон Юнінген заплакаў. Камандоры намагаліся пераканаць свайго важара весці сябе па-мужчынску, не маладушнічаць і сваёй мужнасцю падаць прыклад рыцарам. Магістр адказаў на гэта, што, маўляў, праліў ён слёзы не ад баязлівасці, а з-за сваёй набожнасці і шчырага смутку, бо пральецца ж так многа хрысціянскай крыві.

Перад самым пачаткам бітвы 300 чэшскіх наймітаў са сваім правадыром-рыцарам з Трачкова (гісторыкі лічаць, што гэта Ян Жыжка, які падпісваўся «з Трачкова») перайшлі на бок крыжакоў. Магістр не прыняў іх, ганарліва мовіўшы: «Я не Хрыстос, і мне не патрэбны Юда»[159]. Чэхі вярнуліся ў польскі лагер.

Час ішоў, а бітва не пачыналася. Ягайла па-ранейшаму маліўся і не адклікаўся ні на патрабаванні Вітаўта, ні на просьбы прыдворных пачынаць бітву. Занервавалiся і крыжакі. Стомленыя начной бяссонніцай, цяжкім маршам і вось цяпер —

доўгім стаяннем у жалезных латах, яны нецярпліва паглядалі на ворага. Магістр не даваў знаку да бою, добра разумеючы, што ад цяжкай конніцы не будзе ніякай карысці ў лясной мясцовасці. Родны брат Конрада Валенрода, Фрыдрых, сабраў раду з ордэнскімі высокапастаўленымі асобамі, і сталі думаць, як прымусіць ворага пайсці ў сечу. Прыгадалі, што па рыцарскіх законах, калі непрыяцель ухіляецца ад сечы, пасылаюць яму два мячы — выклік да бою. Каб яшчэ болей падахвоціць ворага да бітвы, вырашылі адступіць трохі назад, каб той мог рушыць наперад. Да Ягайлы паслалі двух герольдаў. Кароль, закончыўшы маліцца, апрануўся ў баявыя даспехі і на кані паехаў на высокі пагорак, каб зірнуць на крыжацкае войска. Выгляд гатовых да сечы варожых шэрагаў не падняў у Ягайлы баявы дух. Ён больш сумна маўчаў, чым размаўляў. Спусціўшыся з пагорка, кароль аперазаў ахвотнікаў рыцарскім пасам і сабіраўся ўжо ехаць да абозу, як ад крыжакоў прыйшлі герольды.

«Святлейшы кароль! — заявілі яны. — Вялікі магістр Прусіі Ульрык шле табе і твайму брату два мячы як заахвочванне да бітвы, каб ты з ім і з усім сваім войскам адразу з большаю адвагаю, чым выказваеш, уступіў у бой і не хаваўся болей, ухіляючыся ад сечы і седзячы сярод лесу. Калі ты лічыш поле цесным і вузкім для разгортвання твайго шэрагу, дык магістр Прусіі Ульрык, каб выманіць цябе ў бой, гатовы адступіць столькі, колькі ты хочаш роўнага поля, занятага яго войскам; або выбраць другое Марсава поле, каб далей не ўхіляцца ад бітвы». Вітаўту і Ягайлу перадалі мячы. Кароль адказаў герольдам: «Хаця ў мяне і майго войска хапае мячоў і мне не патрэбна варожая зброя, аднак дзеля вялікай падтрымкі, аховы і абароны маёй правай справы і гэтыя пасланыя маімі ворагамі, якія прагнуць маёй і майго народа крыві і вынішчэння, два мячы, што даставілі мне, я прымаю ў імя Бога і прыбегну да яго як да справядлівага карніка нясцерпнай ганарлівасці, да яго маці, прысвятой Марыі, і абаронцаў маіх і каралеўства майго святых Станіслава, Адальберта, Венцаслава, Фларыяна і Ядвігі. Я буду маліць іх абрынуць гнеў свой на іх, на дзёрскіх і нягодных ворагаў, бо іх нельга суцешыць і замірыць ні справядлівасцю, ні змірэннем, ні прапановамі маімі, пакуль яны не пральюць крыві, ні раскрамсаюць чэрава і не адзенуць нам на шыю ярма; упэўнены я на надзейную абарону Божую і яго святых і іх падтрымку і клопат. Яны падтрымаюць мяне і мой народ сіламі сваімі і сваёй абаронай і не дапусцяць, каб я і народ мой былі пераможаны такім лютым ворагам, у якога так часта я шукаў міру. І цяпер я не адмовіўся б ад міру, калі ён быў бы магчымы на справядлівых умовах; я апусціў бы нават

занесеную для бітвы руку і тады, калі б убачыў у гэтых двух мячах, прынесеных вамі, відавочнае нябеснае знаменне, што абяцае мне перамогу ў бітве. Выбару ж поля бітвы я для сябе не патрабую і не прэтэндую на гэта, але, як і належыць хрысціяніну, чалавеку і каралю, выбар яго аддаю Божай волі, каб атрымаць тое месца для сечы і той вынік, якія будуць вызначаны міласцю Божай і шчасцем сённяшняга дня; я ўпэўнены ў тым, што Усявышні спыніць лютасць крыжакоў, чым утаймуе іх нягодную і нясцерпную ганарлівасць, бо я цвёрда ведаю, што вышэйшыя сілы будуць стаяць за справядлівую справу. Поле, на якім мы стаім і дзе нам трэба будзе змагацца, Марс, роўны для абодвух бакоў, і справядлівы суддзя расціне і зняважыць вялікую ганарлівасць маіх ворагаў па малітвах маіх, што Бог дапаможа мне і майму народу ў бітве»[160].

Ці не запэўнівае такая яскравая прамова, што памыляюцца тыя гісторыкі, якія малююць Ягайлу неразумным, абмежаваным чалавекам. У яснасці розума, у красамоўстве яму не адмовіш.

Ягайла пасля прыёму крыжацкіх герольдаў ужо не спадзяваўся на мір, цяпер толькі меч мог вырашыць спрэчку з Ордэнам. Апошняя падрыхтоўка перад бітваю. У розных месцах былі пастаўлены коні, на якіх кароль у выпадку небяспекі мог бы ўцячы. Шэсцьдзесят рыцараў ахоўвалі яго, сярод іх былі Хведар Любартавіч і Жыгімонт Карыбутавіч. Тут жа каля караля знаходзіліся і польскія саноўнікі.

Ягайла падумаў пра ахову сваёй асобы, а вось Вітаўта гэта мала хвалявала. Ён аддаў ахову свайго жыцця і волі Богу, толькі невялічкая купка вояў суправаджала яго.

І вось загучалі трубы. Пакуль палякі спявалі «Багародзіцу», Вітаўт павёў сваё войска ў бой. Удар наносіла конніца. Шматтысячная хваля вершнікаў неслася на крыжацкія шэрагі. Ад тупату капытоў дрыжэла зямля. У паветры гучаў баявы кліч вояў Вялікага княства: «Вільня!». Пачаў крапаць дождж. Неба прасяклі вогненныя стрэлы маланак. Крыжакі сустрэлі Вітаўтаву конніцу залпам з бамбардаў. Ядры разрываліся ў гушчы вершнікаў. Многія з іх паляцелі забітымі на зямлю. Яшчэ раз стрэлілі смяротным агнём гарматы, выбіўшы з сёдлаў нямала вояў. Але наступ конніцы не спыніўся. Імгненне — і вершнікі запрацавалі мячамі і шаблямі па галовах гарматчыкаў. Ордэнцы кінуліся наўцёкі. Цяпер лічаныя метры аддзялялі літвінаў ад рыцараў. Арбалетчыкі і лучнікі асыпалі літвінскую конніцу градам стрэлаў. У той жа момант кранулася закутая ў браню сцяна рыцарскай конніцы. Рыцары рынуліся насустрач непрыяцелю. Схіл пагорка аблягчаў бег іх коней, павялічваў сілу ўдару. Пайшлі ў бой і перадавыя польскія харугвы. Ворагі сыш-



Гравюра з «Хронікі ўсяго свету» М.Бельскага.
Грунвальдская бітва. *1564 г.*

ліся ў сечы. І завярцеўся крывавы клубок: цяжка было разлічыць, дзе чужыя, дзе свае, дзе баязлівец, дзе герой. Стаяў немаверны гул ад баявых клічаў, крыкаў, іржання коней, бразгату зброі. Як саломінкі, ламаліся дзіды, трашчалі пад ударамі сякер і мячоў шчыты. Гудзелі стрэлы і кулі. Падалі забітыя, курчыліся на зямлі параненыя.

Вітаўт, забыўшыся пра небяспеку і стому, без аховы, з некалькімі воямі, з'яўляўся то адным, то ў другім месцы сечы, аднаўляў расстроеныя шэрагі свайго войска, заклікаў і вёў у бой. А то скакаў да Ягайлы і патрабаваў болей дзейсна падтрымаць яго. Кароль не рызыкаваў і не ўводзіў галоўныя сілы ў бітву. Але баявы дух абуяў і яго. Некалькі разоў, не вытрымаўшы, ён даваў шпоры каню, жадаючы прарвацца ў гушчу сечы, каб амачыць меч у варожай крыві. Каралеўская варта ледзь стрымлівала Ягайлу, засланіўшы яго конямі і людзьмі. Раззлаваны, ён раз нават канцом сваёй дзіды ўдарыў чэха За-

лову, які схапіў ягонага каня пад вузду. Пад канец бітвы Ягайла ад крыку сарваў голас.

Гадзіну біліся абодва войскі без усялякага поспеху. Магістр кідаў свежыя харугвы на левы край, дзе змагаліся Вітаўтавы воі. У гэтым месцы крыжакі мелі колькасную перавагу. Крок за крокам цяснілі яны войска Вялікага княства. Ды і нельга было здзейсніць немагчымае — вытрымаць ціск закутых у браню рыцараў, якія па колькасці пераўзыходзілі літвінаў. І тады Вітаўт адважыўся на смелае рашэнне. Ён даў загад адступаць праваму краю свайго войска. Разлік быў у тым, каб адступленнем адцягнуць на сябе ўвагу значнай часткі крыжакоў, зблытаць іх шэрагі, а ў гэты час палякі павінны нанесці па варожаму войску ўдар галоўнымі сіламі. Тое, што гэта было прадуманае адступленне — завабленне ворага (у свой час Вітаўт якраз і падаўся на гэты падман пры Ворскле), а не ўцёкі, як гэта маляўніча распісвае ў сваёй хроніцы Длугаш, сведчаць факты тых часоў. Ордэнскі храніст Пасільге паведамляў, што «паганцы»-літвіны ў нялёгкі для палякаў момант напрыканцы бітвы ўдарылі з другога боку, акружылі рыцараў і разбілі іх, а гэта значыць, што літвіны перашыхаваліся і вярнуліся на поле сечы. І вось яшчэ сведчанне. Пераемніка Юнінгена папярэджвалі, што нельга праследаваць адступаючага праціўніка, пакуль не пераканаешся ў тым, што вораг і сапраўды пераможаны, а не робіць хітры манеўр з мэтай зблытаць вашыя шэрагі, як гэта адбылося ў вялікай бітве[161]. Ясны намёк на грунвальдскае адступленне Вітаўта.

Адступленнем літвіны навялі крыжакоў на гарматы і тыя трапілі пад агонь. Шэрагі крыжакоў парадзелі ад смяротнага граду ядраў. А Вітаўт тым часам на чале наваградскай і валынскай харугваў стрымліваў варожы націск.

Моцны ўдар нанеслі крыжакі па цэнтру польска-літвінскага войска, дзе стаялі воі трох смаленскіх палкоў*. Змагаліся яны адчайна, стрымліваючы ворага, які ў некалькі разоў пераўзыходзіў іх па колькасці. Адзін полк поўнасцю загінуў, і яго сцягі крыжакі ўтапталі ў зямлю. Але два другіх «змагаліся з найвялікшай храбрасцю, як належыць мужам і рыцарам»[162], і спынілі наступ праціўніка. Вітаўт пасылаў да Ягайлы вестуноў, каб ён пераходзіў да рашучых дзеяў. Кароль марудзіў, чагосьці чакаў. Можа, захоўваў сваё войска і быў зусім не супроць, каб крыжакі высеклі палову вояў Вялікага княства, што аслабіла б Вітаўта.

---

*Паводле Стрыйкоўскага, крыжацкі ўдар у цэнтры разам са смалянамі стрымалі віленская, трокская, гарадзенская і жамойцкая харугвы.



Фрагмент з карціны Я.Матэйкі «Грунвальдская бітва».
Вітаўт. *1878* г.

Вітаўт асабіста паскакаў у стан Ягайлы і раззлаваны накінуўся на яго: «Ты імшу слухаеш, а князі ды паны, браты мае, ледзьве не ўсе забітыя ляжаць, а твае людзі ніяк дапамагчы ім не хочуць». На што Ягайла адказаў: «Мілы браце, ніяк іначай учыніць не магу, толькі імшу даслухаць мушу»[163]. Вітаўт на

чале з надворнай харугвай зноў рынуўся ў бітву, «выконваючы павіннасць і водцы, і воіна, прычыніўся да звіцязтва»[164].

Перадавым польскім харугвам таксама даводзілася нялёгка. Крыжакі ўпарта атакавалі іх. Пад ціскам крыжацкай конніцы палякі адступілі. На вачах у польскіх вояў упаў вялікі каралеўскі сцяг. Ахова сцяганосца тут жа падхапіла сцяг, і натхнёныя воі ў лютасці ўдарылі па ворагу.

Між тым рыцары, якія ўдзельнічалі ў пагоні за літвінамі, вярнуліся на поле сечы і ўбачылі, што непрыяцель насуперак іх спадзяванням не разбіты. Яны кінулі палонных і здабычу і паскакалі на дапамогу сваім. Магістр Ульрык ужо вырашыў, што перамога блізкая, яшчэ адзін моцны ўдар — і вораг пабяжыць. Ён асабіста павёў на левы край польскага войску шаснаццаць свежых харугваў. Ягайла са сваёй світы стаяў непадалёк ад дарогі, па якой скакаў магістр са сваімі рыцарамі. Кароль не пагнаў каня прэч з поля бітвы, а паслаў да бліжэйшай харугвы па дапамогу. Каралеўскага вестуна груба аблаялі: «Хіба ты не бачыш, няшчасны, што на нас нападаюць ворагі, а ты вымагаеш нас, пакінуўшы сечу, ісці на абарону караля!»[165]. Без дапамогі прыскакаў вестун да Ягайлы. Каб не выдаваць прысутнасць караля, звярнулі малы каралеўскі сцяг.

Конніца магістра праскакала паўз месца, дзе знаходзіўся кароль, трымаючы кірунак на харугвы левага флангу. Толькі адзін рыцар аддзяліўся ад крыжакоў і накіраваўся да каралеўскага атрада. Убачыўшы перад сабою самога караля, ён нацэліў на яго дзіду. Ягайла падняў насустрач сваю. Але на рыцара збоку наляцеў каралеўскі сакратар Збыгнеў Аляснікі і выбіў яго з сядла. Калі той упаў на зямлю, Ягайла дзідой ударыў яму ў твар — абмачыў зброю ў крыві ворага. Крыжакі кінуліся адпомсціць за смерць свайго таварыша, але магістр крыкамі спыніў іх. Траціць час на бой з нязначным атрадам палякаў — значыць, сарваць атаку. Ягайла пазбегнуў небяспекі.

Затое ў небяспецы апынулася яго войска. Крыжакі наступалі па ўсім фронце. Адбіваліся з апошніх сіл воі Вялікага княства. Смаленскія воі не адступілі ні на крок. Ужо над полем загучаў урачысты ордэнскі гімн: «Хрыстос уваскрэс! Будзем радавацца, браты Госпаду, што Ён зламаў паганцам рогі! Хрыстос уваскрэс!»[166] Але радасць крыжакоў была дарэмная. Ягайла загадаў выступаць запасным харугвам. З лесу па крыжаках ударылі найміты: чэхі, маравы, сілезцы, а таксама апалчэнцы. У гэты момант пачулася: «Літва вяртаецца!» Тыя літвінскія харугвы, якія адступілі, цяпер вярнуліся на поле сечы і напалі на крыжакоў збоку. Крыжакі апынуліся ў цісках польска-літвінскага войску. Як толькі перамога стала хіліцца на бок

непрыяцеля, сотні прусаў, мабілізаваных у крыжацкае апалчэнне, пакідалі сцягі і зброі і пачалі здавацца ў палон. За імі падымалі рукі і рыцары. Кульмскія рыцары, якія знаходзіліся ў апазіцыі да кіраўніцтва Ордэна, пабеглі з сечы[167]. Магістру раілі пакінуць бітву. Ён усклікнуў: «Не дай Бог, каб я ўехаў з поля, на якім загінула столькі храбрых»[168]. Меч помсты знайшоў ганарлівага правадыра. Нехта з літвінаў забіў Ульрыка фон Юнінгена. Пасля ягонай смерці крыжакі ўжо не думалі пра якую-небудзь абарону — пабеглі з поля сечы. Загінуў і вялікі маршал Фрыдрых Валенрод. З 700 ордэнскіх братоў загінула 203 рыцара. Частка крыжакоў схавалася ва ўмацаваным лагеры — вагенбурзе. Польскія і літвінскія воі ўварваліся туды і расправіліся з ворагам. У руках пераможцаў апынуўся ўвесь крыжацкі абоз. Ордэн паклапаціўся не толькі пра зброю ды харч, але і пра кайданы, ланцугі для палонных, пра віно, каб пасля бітвы адсвяткаваць сваю перамогу. Кайданы і ланцугі згадзіліся — у іх закулі палонных крыжакоў. А вось віно? Убачыўшы яго, пераможцы забыліся і на бітву, збегліся да дзежак хто спатоліць смагу, а хто выпіць за перамогу. Чэрпалі пляшкамі, пальчаткамі, а хто нават скідваў боты і піў з іх. Ягайла, баючыся, што войска перап'ецца і не здолее даць адпор непрыяцелю, загадаў разбіць дзежкі. Віно палілося на зямлю, змешваючыся з крывёю.

Разрабаваўшы абоз, воі кінуліся ў пагоню за ворагам. Далёка наперадзе зіхацелі ў вечаровых промнях даспехі ўцякаючых рыцараў. Некалькі міль, пакуль не села сонца, гналі крыжакоў палякі і літвіны, секлі, бралі ў палон. Мноства ордэнскіх вояў патанула ў сажалцы, што ляжала ў дзвюх мілях ад поля сечы. Ганарлівы тухальскі камандор Генрых, які даў абет насіць перад сабою два мячы, пакуль не амочыць іх у польскай крыві, не шкадаваў свайго каня, але быў дагнаны і забіты.

Як указваў у сваёй буле папа рымскі, «загінула каля 18 тысяч крыжакоў». Па іншых разліках — каля 50 тысяч і 40 тысяч трапіла ў палон[169].

Апошнія сонечныя промні падалі на зямлю. Жахлівае відовішча ўяўляла Грунвальдскае поле. Тысячы забітых людзей і коней у самых неверагодных позах валяліся на ім. Чуліся стогны параненых і паміраючых. Чырванелі крывавыя ручаіны. Там-сям паміж забітых хадзілі пераможцы. Хто шукаў сваіх таварышаў, а хто здымаў з забітых даспехі і зброю. Вярталіся з пагоні воі, вялі палонных. Ягайла паглядаў на поле. Здзейснілася! Слава і магутнасць Ордэна зніклі вось на гэтым полі, самы небяспечны вораг славян разбіты. Ці не пра гэта марыў яго бацька Альгерд? А яшчэ раней Гедымін і Віцень, Тройдзень і Міндоўг. Яму было наканавана выканаць мару прод-

каў. У тую хвіліну кароль, пэўна, яшчэ не ўсвядоміў веліч атрыманай перамогі. Спынены шматвяковы наступ нямецкіх феадалаў на славянскія і балцкія землі. Выратавана Польшча, Літва, Жамойць, Аўкштайція, Русь. І якім цяжкім і доўгім быў гэты шлях да Грунвальда — амаль два стагоддзі! Колькі загінула за гэты час у баях з Ордэнам вядомых і невядомых літвінскіх, жамойцкіх, аўкштайцкіх, рускіх, латышскіх, прускіх, украінскіх, польскіх воінаў, набліжаючы гэты дзень!

Да Ягайлы пад'ехаў на кані ўзрушаны Вітаўт. Кропелькі поту цяклі па яго твары, але князь радасна ўсміхаўся. Для самалюбівага Вітаўта гэтая перамога радасная ўдвая: не толькі разбіты вораг, але ў палон трапілі ягоныя асабістыя ворагі — брандэнбургскі камандор Маркварда фон Зальцбах і рыцар Андрэй Сакенберг. Першы некалі лаяў яго на перамовах у Саліне, а другі атруціў ягоных сыноў. Цяпер Вітаўт цешыў сябе думкай пра помсту — адсекчы галовы сваім крыўдзіцелям. Што робіць з людзьмі час! Некалі ў юнацтве куды болей высакародным быў Вітаўт, чаго не скажаш пра крывадушнага Ягайлу. І вось ужо Ягайла выказвае зычлівасць, адгаворвае Вітаўта ад помсты: «Не варта, дарагі брат, праяўляць жорсткасць да ворагаў, якіх мы адолелі ў баі не нашай доблесцю, а воляй міласцівага Бога; не трэба помсціць палонным за нашы крыўды і абразы, але адслужыўшы ўдзячны малебн усявышняму Богу за падараваную перамогу, трэба праявіць да пераможаных усялякую літасць. Бо досыць і таго, што па справядліваму Божаму прысуду мы ўжо ўтаймавалі і пакаралі іх, і цяпер нам трэба злітавацца з тых, над кім злітавалася сіла і вайсковае шчасце»[170]. Усё ж запалі ў душу Ягайлу словы енвагельскія і ад многай брыды ачысцілі яе.

Вітаўт не знайшоў, што адказаць стрыечнаму брату, і памілаваў крыжакоў. Толькі тыя, нібыта зняважаныя падобнай міласцю, развязалі свае языкі. Знявага за знявагай зляталі з іх вуснаў. Вітаўт не вытрымаў і загадаў іх пакараць. Маркварда і перад смерцю верыў, што Ордэн адродзіцца і расквітаецца за сваё паражэнне. «Нікольк не баюся я цяперашняй долі, поспех хіліцца то на гэты, то на другі бок; перамяніцца шчасце, і адораць нас, пераможаных, тым, чым вы валодаеце, пераможцы, сёння»[171].

ПАХОД НА МАЛЬБАРГ

Весялосць панавала ў лагеры саюзнікаў. Радасць перамогі была мацнейшай за стому, голад, горыч страты сяброў. А з пагоні вярталіся воі, ведучы перад сабою палонных, везлі захоплены луп і сцягі. Кароль, зняўшы даспехі, адпачываў у сваім

шатры. Хаця які там адпачынак! Адзін за адным з'яўляліся вестуны, дакладвалі пра трафеі, палонных крыжакоў. Стала вядома, што загінуў магістр. Ягайла не выказаў радасці, уздыхнуў і прамовіў: «Вось, о мае рыцары, на колькі агідная ганарлівасць перад Богам; хто ўчора хацеў скарыць сваёй уладзе многія краіны і каралеўствы, хто лічыў, што не знойдзецца яму па магутнасці роўных, пераможаны і ляжыць без усялякай дапамогі сваіх паплечнікаў, забіты такім ганебным чынам. Вось наколькі ганарлівасць ніжэй за змірэнне»[172]. Па Ягайлаваму загаду магістра і другіх ордэнскіх саноўнікаў наступным днём пахавалі. Параненых крыжакоў ён загадаў лячыць. У той жа дзень ляглі ў зямлю і воі, што загінулі за Літву і Польшчу. Вечная ім слава!

У каралеўскай паходнай капліцы адбылася служба, а пасля Ягайла даў шыкоўнае баляванне сваім бліжэйшым паплечнікам. Хтосьці з войска ад сквапнасці рыскаў па ваколіцах у пошуках лупа і палонных. Будзь Ягайла больш рашучым, не стаяў бы пад Грунвальдам, а павёў войска на Мальбарг, зняцку захапіў бы ордэнскую сталіцу. Але не спяшаўся кароль. Яму раілі дзень і ноч без стомы рухацца да Мальбарга, пакуль сэрцы нешматлікіх абаронцаў сталіцы ахоплены жахам. Гэта было б вартым Грунвальдскай перамогі сканчэннем вайны. Не рашыўся Ягайла. Затое крыжакі не гублялі дарэмна часу.

Не згубіў галавы ў гэты нялёгкі для Ордэна час камандор Свеца Генрых фон Плаўэн. Даведаўшыся пра Грунвальдскае паражэнне, ён з атрадам у 500 вояў паспяшаўся ў Мальбарг. Па дарозе да яго далучыліся гарнізоны з іншых замкаў. Ордэнскую сталіцу камандор застаў у разгубленасці. Гараджане, як ашалелыя, бегалі па горадзе, хавалі сваю маёмасць, плакалі, скардзіліся адзін аднаму на сваю безабароннасць. Многія ўцякалі. Нешматлікі гарнізон з жахам чакаў падыходу непрыяцеля. Генрых фон Плаўэн прыняўся дзейна рыхтавацца да абароны ордэнскай сталіцы. Правіянт, зброю, маёмасць з горада перанеслі ў замак. Сам горад камандор загадаў спаліць, засталіся толькі адна царква і ратуша. Разбурылі таксама мост цераз раку Нагату, каб непрыяцель не змог ім скарыстацца. Месцічы ўзброіліся. На дапамогу ім прыбывалі крыжакі з суседніх гарадоў і замкаў. З Данцыга падышлі 400 матросаў. Папоўнілі шэрагі абаронцаў і воі, што выратаваліся ад смерці на Грунвальдскім полі. Пад камандаваннем Генрыха фон Плаўэна сабралася 5 тысяч чалавек.

17 чэрвеня войска Ягайлы і Вітаўта выступіла на Мальбарг. Перад пераможцамі адчынялі брамы ўсе сустрэчныя гарады і замкі: Гогенштэйн, Маронга, Прусмарк, Дзежгонь. З дальніх гарадоў да Ягайлы прыязджалі пасольствы, каб кароль прыняў



Сярэдневяковая гравюра. Мальбарг.

іх пад сваю руку. Ягонае з Вітаўтам войска сустракалі як вызваліцеляў. Амаль уся Прусія, апроч Новай Мархіі, прызнала Ягайлаву ўладу. Заставаўся яшчэ Мальбарг, і з яго падзеннем Ордэн перастаў бы існаваць як вайскова-палітычнае ўтварэнне, а з ім сышла б у нябыт і заснаваная крыжакамі Пруская дзяржава.

Ягайла, вядома, быў задаволены такім ходам падзей, падобнага ён не мог уявіць у самых смелых сваіх марах. А вось Вітаўт прызадумаўся. Умацаванне Польшчы і гібель Ордэна пагражалі перш за ўсё яму. Цяпер у яго не будзе ранейшага саюзніка супраць Ягайлы. Так што пасля Грунвальда іх дарогі разыходзіліся. Толькі вось проста так гэтага не заявіш Ягайлу. Тут патрэбна хітрасць, каб усё выглядала прыстойна, каб не пасварыцца з каралём і выгадаць сваё. Калісьці вялікім інтрыганам быў Ягайла, умеў ён і туман у вочы пусціць, і камень за пазухай схаваць, і чужымі рукамі жар заграбаць. Але час і Вітаўта чамусьці навучыў.

25 ліпеня падышлі да Мальбарга. Паглядаючы на непрыступныя сцены ордэнскага замка, мацнейшага ў Еўропе, Ягайла не цешыў сябе надзеяй узяць яго штурмам. Наперадзе чакала доўгая аблога. Войска шчыльна акружыла замак, затым пачаўся абстрэл з гармат. Абаронцы частымі вылазкамі імкнуліся захапіць бамбарды. Іх праганялі назад у замак. У адной з такіх сутычак палякі ледзь не ўварваліся на плячах крыжакоў у крэпасць. Каб спыніць іх, абаронцы замка ўзарвалі сцяну, пад камянямі якой знайшлі сабе магілу шмат польскіх вояў.

Канец чэрвеня і ўвесь ліпень доўжылася аблога. У абаронцаў канчаліся харчы. Генрых фон Плаўэн ужо не верыў у дапамогу і ў пачатку жніўня папрасіў сустрэчы з Ягайлам. Гэта сустрэча адбылася. Прыехаўшы да караля, Плаўэн прыніжана прасіў «не імкнуцца назаўжды знішчыць наш Ордэн»[173], перадаваў Польшчы Памеранію, Кульмскую і Міхайлаўскую землі, каб толькі Ягайла пакінуў крыжакам Прускую зямлю. У шчырасць крыжака мала хто паверыў. На вайсковай радзе Ягайлу раілі не прымаць крыжацкіх умоў: Мальбарг хутка здасца, а калі Ордэн не разграміць, дык ён з цягам часу можа адваяваць землі, што цяпер саступае. Ягайла згадзіўся з гэтымі меркаваннямі і праз маршалка Збыгнева з Бжэзя фанабэрыста патрабаваў здачы Мальбаргскага замка. Генрых Плаўэн заявіў: «Я пастараюся абараніць яго ўсімі сіламі і не дазволю нават калі давядзецца загінуць, знішчыць мой Ордэн»[174].

З гэтага часу вайсковае шчасце здрадзіла Ягайлу. Адна адчайная вылазка крыжакоў закончылася паспяхова, ім удалося адбіць і сапсаваць некалькі бамбардаў. Трохі пазней адна з бамбардаў пры адкаце ўдарыла ў сцяну мураванага будынка,

сцяна разбурылася і прыдавіла 20 мазавецкіх вояў. Гэта падзейнічала на настрой у войску. Няшчасны выпадак, які здарыўся з адным гарматчыкам, узмацніў дурны настрой у войску. Гармату нацэлілі на крэпасную царкву, на сцяне якой вісеў абраз Божай Маці. Пры стрэле гарматчык аслеп. Гэта было прынята за дрэнную адзнаку. Палякі неслі адчувальныя страты пры адбіцці вылазак крыжакоў. Ягайла нават у адчаі ўсклікнуў: «Мы думаем, што мы іх аблажылі, але хутчэй яны нас аблажылі»[175]. У дадатак да вайсковых няўдач дабавіліся і бытавыя цяжкасці. У лагеры развялося такое мноства мух ад здохлых коней і гнілі, што воям не было ад іх ніякага паратунку. Кожны новы дзень прыносіў расчараванне і бязвер'е ў перамогу. Аднойчы з Мальбарга выйшаў стары святар і папрасіў прапусціць яго праз лагер, маўляў, не па сілах у ягоных гадах яму перанесці нястачы аблогі. Ягайла загадаў прапусціць яго. А святар нёс схаваны ліст да нямецкіх камандораў і 30 000 залатых для набору наймітаў.

Еўропа гатова была дапамагчы крыжакам. Жыгімонт Угорскі рассылаў граматы, у якіх заклікаў усіх манархаў Заходняй Еўропы падтрымаць Ордэн. Сам ён з войскам напаў на паўднёвыя землі Польшчы. Плаўэн атрымаў ад Жыгімонта ліст, які быў зачытаны пры гуках труб і літаўраў. Дух абаронцаў Мальбарга прыўзняўся. Ім на дапамогу спяшаўся з войскам лівонскі магістр маршал Бернд Гевальман. Насустрач яму выступіў Вітаўт.

Вось тут для Вітаўта і з'явілася магчымасць выгадаць свой інтарэс — не даць Ягайлу канчаткова разбіць Ордэн і тым самым не дапусціць узмацнення Польшчы. Ён уступіў у перамовы з Гевальманам і заключыў з Лівонскім ордэнам перамір'е. Пэўна, Вітаўту паабяцалі Жамойць і Судавію, а за гэта ён павінен быў адвесці сваё войска ад Мальбарга. Вярнуўшыся ў каралеўскі лагер, Вітаўт патрабаваў ад Ягайлы зняць аблогу, прычым настойваў на перадачы ордэнскіх земляў Вялікаму княству. Ягайла не згаджаўся, добра разумеючы, куды хіліць ягоны брат. Нарэшце Вітаўт заявіў, што ён уводзіць сваё войска, спаслаўшыся на хваробы, што пачаліся сярод ягоных вояў. Ягайлу давялося прыніжана ўпрошваць свайго саюзніка застацца, але той быў непахісным.

У пачатку жніўня войска Вялікага княства адступіла ад Мальбарга, а за ім — і мазавецкія воі. Ягайла, бачачы, што сілай яму ніяк не здабыць ордэнскую сталіцу, вырашыў ужыць хітрасць. Ён даведаўся, што Плаўэн і ягоныя набліжаныя ў пэўны час збіраюцца ў той палове замка, якая падтрымліваецца высокай калонай. Палякі падкупілі аднаго з крыжакоў, каб ён махнуў з акна чырвонай шапкай, калі ў пакоі будзе Плаўэн

з рыцарамі. Было вырашана стрэліць з гарматы ў калону і такім чынам разбурыць тую замкавую частку, якая трымалася на калоне. Дачакаўшыся ўмоўнага знаку, стрэлілі з гарматы, але ядро праляцела міма. Так што не дапамагла і хітрасць.

Кароль мог наракаць сам на сябе, што некалі, уступаючы на польскі пасад, ён шчодра раздаваў шляхце прывілеі. Па гэтых прывілеях вайна за польскімі межамі вялася за каралеўскія грошы. Толькі вось не так і шмат іх у скарбніцы. Ягайла ўжо шкадаваў, што не прыняў умовы Плаўэна і не заключыў з ім выгадны для Польшчы мір. Хацеў дамагчыся большага, а давядзецца суцешыцца малым.

22 верасня Ягайла адступіў ад Мальбарга, а ўслед за палякамі ішлі ордэнскія рыцары і атрады іх наймітаў і адваёўвалі назад тыя землі і гарады, якія прызналі ўладу польскага караля.

11 лютага 1411 года ў горадзе Торуне паміж Польшчаю, Вялікім княствам і Ордэнам быў заключаны мір. Саюзнікаў прадстаўляў Вітаўт, і ён асабліва не адстойваў польскія інтарэсы. Па дамове Жамойць адыходзіла да Вялікага княства, але толькі ў пажыццёвае валоданне Вітаўта. Земавіт Мазавецкі атрымаў закладзеныя раней Ордэну землі, Польшча вярнула Добжынскую зямлю, а Памор'е, Кулемская і Міхайлаўская землі заставаліся ў Ордэна. Спрэчка пра прыналежнасці Дрэздэнка і Сантака перадавалася на разгляд асобага суда, назначанага магістрам і каралём, а ў выпадку, калі камісія не прыйдзе да адназначнага рашэння, — на суд папы. Ягайла стрымаў сваё слова і насуперак волі палякаў перадаў Вялікаму княству Падолле і прызнаў за ім Валынь. Так што большы плён ад перамогі атрымаў Вітаўт. З гэтага часу ён будзе афіцыйна тытулаваць сябе вялікім князем літоўскім, хоць дагэтуль падпісваўся ў граматах «першы сярод князёў».

ДЗЯРЖАЎНЫ КЛОПАТ

Цяпер можна было прыступаць да здзяйснення сваёй запаветнай мары — да ператварэння Вялікага княства ў самастойнае каралеўства. Задача не з простых. Усімі сіламі гэтаму будуць супрацьяцца Ягайла, польскія саноўнікі і святары, іх прыхільнікі ў Вялікім княстве — былыя паганскія баяры, што прынялі каталіцтва і дзякуючы Ягайлавым прывілеям атрымалі манаполію на ўладу ў Літве. Трэба было падумаць, як нейтралізаваць польскі ўплыў праз каталіцкі касцёл. І трэба дамовіцца з Жыгімонтам, каб ён зноў запрапанаваў каралеўскую карону. І трэба, каб карона гэта была асвечана папам рымскім. І трэба пазбегнуць пасля разрыву з Ягайлам вайны з

Польшчай. Не, не проста стаць каралём. Абвясціць можна, як у 1398 годзе, але ж ніхто з уладароў еўрапейскіх не прызнае яго каралём, а ягоную дзяржаву каралеўствам.

У 1411 годзе Вітаўт ездзіў ва Угорыю ў суправаджэнні світы праваслаўных біскупаў. Невядома, ці сустракаўся ён з Жыгімонтам, а калі сустракаўся, пра што яны дамаўляліся. Жыгімонт, які стаў імператарам Свяшчэннай Рымскай імперыі, у Вітаўце бачыў свайго саюзніка. Усе імператарскія ворагі звярталіся да Ягайлы: уладары Венецыі, Валахіі, аўстрыйскія герцагі Эрнэст і Фрыдрых. Жыгімонт шчыра прызнаваўся: «Бачу, што кароль Уладзіслаў праставаты і ва ўсім слухаецца Вітаўта, трэба прыцягнуць Вітаўта да сябе, каб праз яго валодаць і Ягайлам»[176].

Можна дапусціць, што калі Вітаўт і Жыгімонт сустракаліся (адсутнасць звестак можа ўказваць на тое, што сустрэча праходзіла патаемна), дык гаварылі яны пра саюз супраць Польшчы, пра магчымасць пераўтварэння Вялікага княства ў каралеўства. Прыезд праваслаўных епіскапаў з Вітаўтам ясна паказвае, што ўжо тады падымалася пытанне царкоўнай уніі. Вітаўт добра бачыў, што наяўнасць дзвюх рэлігійных канфесій у Вялікім княстве не служыць аб'яднанню народа, а, наадварот, раз'ядноўвае яго. Ні каталіцкі касцёл, ні праваслаўная царква не служылі інтарэсам Вялікага княства, бо кіраванне ўсімі царкоўнымі справамі ў католікаў адбывалася з Польшчы ад кардынала, а ў праваслаўных — з Масквы ад мітрапаліта і такім чынам касцёл адстойваў польскія інтарэсы, а царква — маскоўскія. Выхад з такога становішча Вітаўт бачыў у царкоўнай уніі, якая аб'яднала б каталіцтва і праваслаўе ў адзіную царкву і яна падпарадкавалася б ягоным стаўленікам, зацверджаным папам.

Пэўна, Вітаўт і абгаворваў з Жыгімонтам магчымасць уніі і знайшоў у ім аднадумцу. Аднак польскі ўрад таксама прадпрымаў меры, каб разарваць кантакты Вітаўта з Захадам. 15 сакавіка 1412 года ў Любаўле Ягайла заключыў дамову з імператарам Жыгімонтам. Дамова датычылася, у прыватнасці, спрэчак паміж Польшчаю і Угорыяй з-за Галіцкіх і Падольскіх земляў. Польскі кароль дамогся «часовай» уступкі гэтых земляў Вялікаму княству. Тым самым Ягайла выступаў быццам бы гарантам знаходжання Падолля ў складзе Вялікага княства і прывязваў Вітаўта да саюза з Польшчаю. Для вялікага князя станавілася немагчымым выкарыстаць свяшчэнную Рымскую імперыю ў сваіх намерах пераўтварэння Вялікага княства ў каралеўства. Да таго ж пасля смерці Саладзіна і прыходу да ўлады Керым-Бердэя Вітаўт страціў падтрымку Залатой Арды. Усё гэта вымушала яго зноў адкласці ажыццяўленне сваёй за-



Ягайла. *XVI ст.*

паветнай мары. І тым не менеў ён робіць крокі, каб хоць наблізіцца да яе.

У красавіку 1412 года ў Вільні Вітаўт заключае сепаратную дамову з імператарам праз пасла герцага Конрада Эльскага, у якой абяцае дапамагаць Жыгімонту і яго нашчадкам супраць

усіх іх ворагаў (значыць, і Ягайлы). Прычым за Вітаўта ручаліся віленскі біскуп Мікалай, віленскі ваявода Манівід і полацкі намеснік Іван Няміра. Тую самую двайную гульню назіраем і ў Вітаўтавай палітыцы ў адносінах да Ордэна. Нібыта і заключаны мір з крыжакамі, а між тым у дамове Вітаўта з Ноўгарадам і Псковам (у якім быў Вітаўтаў стаўленік пінскі князь Юрый Нос) з'явіўся артыкул пра сумесныя дзеянні супраць Ордэна. Трымаў мір і з цвярскімі князямі — даўнімі саюзнікамі супраць Масквы. У Ніжнім Ноўгарадзе з Вітаўтавай падтрымкай селі браты Барысавічы, і адначасова ён падтрымліваў з Масквою мір. Яшчэ ў 1411 годзе ў Смаленск да Вітаўта прыязджалі разанскія князі і прынялі яго ўладу. Суседнія дзяржавы Вітаўт звязаў пагадненнямі з Вялікім княствам і супраць кожнай патаемна заключаў дамовы з другой.

Ягайла, занепакоены магчымым разрывам саюзу з Літвой, запрапанаваў Вітаўту новую унію. Той не адмовіўся падпісаць яе. Саюзам з каталіцкай Польшчай спадзяваўся ён задобрыць і супакоіць рымскую курыю, якая не вельмі прыхільна паглядала на Вялікае княства пасля Грунвальдскай бітвы. А згода папы патрэбна была для каранацыі. Паспрыяла Вітаўтаву рашэнню і пагаршэнне міжнароднага становішча. Пскоў і Ноўгарад разарвалі саюз з Вялікім княствам. Літвінскі намеснік Лугвеній пакінуў Ноўгарад. Ордэн напаў на Мазовію. У Ардзе сядзеў варожы Літве хан Керым-Бердэй. Міжволі давялося Вітаўту зноў згадзіцца на унію з Польшчай. Гэтую унію Ягайла выдаваў перш за ўсё, як клопат пра Літву. У акце ён адзначыў, што жадае «каб імя наша літвінскае і грамадзяне панаванню нашаму падлеглыя (над якім прасцёр руку вольнасці) усё хутчэй сцвярджаліся ў прынесенай намі веры хрысціянскай, жадаючы, каб усё хутчэй урасталі ў цноты, і скінулі з каркаў сваіх ярмо, якое іх дагэтуль прыгнятала, з прыроджанай нам дабрыні і ласкавасці тым жа землям Літвінскім вольнасці, ласкі і прывілеі, як католікам, прызвычаўся надаваць». Але дорага каштавала для Літвы гэтая ласка — Вялікае княства павінна было аб'яднацца з польскім каралеўствам дзеля таго, «каб землі Літвінскія з-за наездаў варожых і здрады крыжакоў і немцаў, іх памагатых, якія землі Літвінскія і каралеўства Польскага намагаюцца знішчыць і на іх загубу прысяглі, каб у лепшай пэўнасці, сіла апецы паставіць і вечна ім злучыць свой пажытак»[177]. Мэта высакародная! Тут Ягайла выступае як шчыры літвін, жадаючы абараніць свой народ ад знішчэння крыжакамі. Але разам з тым ён праявіў сябе і разважлівым валадаром — не выпусціў Літву з-пад свайго бярла, далучаючы яе да свайго каралеўства.

У 1413 годзе, 2 кастрычніка, у мястэчку Гародле на Бузе сустрэліся Ягайла і Вітаўт. У выніку перамоў былі зацверджаны тры граматы. Першая пацвярджала саюз Польшчы і Вялікага княства, прывілеі каталіцкай царкве на Літве і ранейшыя прывілеі феадалам-католікам, у тым ліку палітычныя: назначэнне іх на дзяржаўныя пасады ў межах утвораных Віленскага ваяводства (з гарадамі Вільня, Вількамір, Уцяна, Біржы, Кернаў, Свенцяны, Менск, Ашмяны, Ліда, Браслаў, Свіслач, Бабруйск, Барысаў, Рэчыца, Прапойск, Чачэрск, Крычаў, Магілёў, Быхаў, Слуцк, Нясвіж, Шацк, Узда) і Трокскага ваяводства (з гарадамі Трокі, Коўна, Упіта, Бірштаны, Аліта, Эйшышкі, Радунь, Васілішкі, Астрына, Жалудок, Беліца, Моўчадзь, Слонім, Ваўкавыск, Камянец, Грэск, Бераставіца, Гародня, Скідаль, Крынкі, Масты, Індура, Дзярэчын, Шарашова, Івацэвічы, Зэльва). Для вырашэння агульных спраў назначаліся соймы ў Любліне або Парчове. У выпадку смерці бяздзетнага Ягайлы польскі кароль павінен быць выбраны са згоды Вітаўта і ягоных саноўнікаў; калі ж памрэ бядзетны Вітаўт, дык палякі і літвінскія феадалы-католікі разам з Ягайлам выбіраюць ягонага пераемніка. Гэтае рашэнне тлумачылася тым, «што розніца ў веры стварае розніцу ў жаданнях і што ў радзе патрэбна таямніца»[178]. Такім чынам, праваслаўныя былі адхілены ад цэнтральных дзяржаўных пасад. Што давала магчымасць ўзвысіцца былым паганцам, якія прынялі каталіцтва.

У дзвюх другіх граматах 47 польскіх паноў дзяліліся сваімі гербамі з літвінскімі феадаламі, а тыя, прыняўшы герб, абяцалі вернасць палякам. На падставе гэтых грамат літвінская шляхта каталіцкай веры была прылічана да польскай шляхты. Так, віленскі ваявода Манівід, атрымаў герб Леліву, троцкі ваявода Яўніс — Задору, віленскі кашталян Мінгайла Ашмянскі — Раву, троцкі кашталян Сенгайла — Лісіцу, Осцік з Ашмянаў (продак родаў Осцікавічаў і Радзівілаў) — Тромбы, Бутрым — Сякеру, Няміра — Ястржэбцаў, Гетаўт — Копач і г.д.

Спачатку літвіны абураліся: «Палякі, пэўна, не былі шляхтай, калі гербы ад Чэхаў прынялі і вялікімі дарамі купілі тыя клейноты шляхецтва. Мы ж, літвіны, ёсць старая шляхта Рымская*, калісці нашы продкі прыбылі з гербамі да гэтай зямлі, заслужанымі ў бітвах, таму гэтыя клейноты дасюль паміж намі ўжываюцца, не трэба нам гербоў новых, калі маем дзедзічныя ад нашых продкаў»[179]. Палякі адказалі, што не сумняваюцца ў даўнасці і знатнасці літвінскай шляхты і не пра новыя гербы размова, а пра братэрскі звязак паміж абодвума народамі, каб была паміж імі згода і прыязнь.

---

* Літвінская шляхта лічыла сябе нашчадкамі рымлян, якія перасяліліся на Літву.

Гэта была добра прадуманая палітычная акцыя — палякі і Ягайла куплялі частку літвінскай шляхты (кароль сам выбраў іх і, трэба думаць, выбіраў па прынцыпу адданасці сабе), рабілі іх прыхільнікамі уніі, бо цяпер толькі захоўванне яе служыла гарантыяй апошнім іх манаполіі на ўладу ў Вялікім княстве. Але і тут Вітаўт знайшоў выйсце: большасць шляхты, баяраў, якія атрымалі гербы, так і не былі дапушчаны ім да важных дзяржаўных пасад. Толькі роды Гаштольдаў, Радзівілаў, Сапегаў, Неміровічаў, Корсакаў у далейшым здолелі ўвайсці ў эліту дваранства Вялікага княства, але прадстаўнікі гэтых прозвішчаў якраз і вызначаліся сваім літвінскім патрыятызмам.

Гарадзельская унія была ўсё ж Вітаўтавай перамогай, бо ён замацаваў палітычную самастойнасць Вялікага княства ад Польшчы. Вялікае княства так і не стала польскай правінцыяй. Палякі адклалі справу далучэння Літвы да Польшчы да часу Вітаўтавай смерці.

Пасля падпісання Гарадзельскай уніі Ягайла і Вітаўт адправіліся ў Жамойць, каб ахрысціць яе і ўстанавіць там велікакняжацкае кіраванне. Поспехі абодвух венцаносных асобаў на апостальскай ніве ў Жамойці былі сціплыя. Нягледзячы на ўгаворы, падарункі, подкуп старэйшын, жамойты ўпарта трымаліся бацькоўскай веры. Тады Вітаўт пачаў сілай прымушаць сваіх новых падданых прымаць каталіцтва. Высякаліся свяшчэнныя дубровы, у вогнішчы гарэлі стоды* паганскіх багоў. Жамойты вымушаны былі падначальвацца. «Мы спазналі, найяснейшы кароль Ягайла і найсвяцейшы Вялікі князь Вітаўт, пан наш, што нашы багі немоцныя і знямоганыя, ад вашага Бога скінуты, пакідаем іх, і да Бога вашага, як мацнейшага прыстаём»[180]. Так нёс у Жамойцію хрысціянства Вітаўт. Нянавісць выклікаў ён у сэрцах жамойтаў, нават крыжацкая ўлада здавалася ім цяпер лепшай за Вітаўтаву. У 1419 годзе яны будуць прасіць крыжакоў прыйсці ў Жамойць, каб перадаць край Ордэну. Толькі велікакняжацкая адміністрацыя і падтрымлівала тут Вітаўта. Калі ж жамойты заявілі, што хутчэй пакінуць радзіму, чым расстануцца са сваімі багамі, Вітаўт цынічна мовіў паплечніку Яна Гуса, Іраніму Пражскаму, які на той час прыехаў у Вялікае княства: «Хрыстос хутчэй абыдзецца без падданых, чым я»[181].

У гэтых словах яскрава праявіліся адносіны Вітаўта да рэлігіі, якую ён разглядаў як адзін са сродкаў сваёй палітыкі. З лёгкасцю ён мяняў веру-паганства на праваслаўе, праваслаўе на каталіцтва — і з ахвотаю ўспрыняў ідэі рэфармацыі царквы Яна Гуса, што яму выкладаў Іранім Пражскі. Не магло не пада-

* Стоды — ідалы.

бацца Вітаўту патрабаванне Гуса адабраць у царквы землі. Прываблівала яго гусіцтва і імкненнем утварыць народную чэшскую каталіцкую царкву, што супадала з яго задумамі аб уніі цэркваў і ўтварэнні народнага літвінскага каталіцтва ў сваёй дзяржаве. Таму так міласціва сустрэў ён Іраніма і суправаджаў яго ў паездцы па сваёй дзяржаве. Разам наведалі яны Віцебск, дзе Іранім у прысутнасці віцьбічаў ушанаваў абразы і мошчы ў праваслаўных храмах і заявіў, што праваслаўная вера ёсць правільная, а не ерэтычная. Біскуп Віленскі ўвяшчаў Вітаўта за такую вось хулу хрысціянскай веры. Толькі Вітаўт глядзеў на гэта скрозь пальцы, ён быў палітык і зневажаць адкрыта праваслаўе, калі большасць яго падданых — праваслаўныя, не мог.

Прыезд Іраніма Пражскага ў Вялікае княства не быў выпадковым падарожжам. Адзін з духоўных лідэраў чэхаў у іх барацьбе з нямецкім засіллем шукаў падтрымку ў героя Грунвальдскай бітвы. Чэхам патрэбна была Вітаўтава дапамога, а вялікаму князю — іх саюз супраць Жыгімонта і Ордэна. Адносіны з імператарам, які яшчэ нядаўна кляўся ў любові да яго, як і з Ордэнам, зноў сапсаваліся. Аслаблены, але ацалелы Ордэн збіраў сілы. Жыгімонт падтрымліваў яго, заключыў з ім мір, пры гэтым абяцаў у выпадку скарэння Польшчы Добжынскую і Куяўскія землі. З далёкай Францыі, абараняючы Ордэн, пагражаў вайною кароль Карл VI. Не сціхалі дыпламатычныя баталіі: Вітаўт і крыжакі спрачаліся за горад Велону. Крыжакі пераконвалі пасланага Жыгімонтам суддзю Бенедыкта Марка, што Велона пабудавана Вітаўтам на ордэнскіх землях, а таму горад павінен быць зрыты. Вітаўт у сваю чаргу пераконваў, што горад стаіць на ягоных землях. Марк узяў Вітаўтаў бок, чым раззлаваў крыжакоў, якія нагадалі, што лепшым сродкам вырашэння спрэчак быў для іх меч. Вітаўт у адказ разарваў гандлёвую дамову паміж Полацкам і Рыгай.

Восенню 1413 года ордэнцы, сабраўшы значнае войска, напалі на Мазовію. Аднак паход гэты быў спынены. Многія ў Ордэне не забыліся пра Грунвальд і не адобрылі вайны з Польшчаю і Вялікім княствам. У Мальбаргу быў скліканы ордэнскі капітул, і Генрых фон Плаўэн пазбавіўся сана вялікага магістра. Адразу ж да Вітаўта і Ягайлы накіравалася пасольства. Вось што даносіў у Мальбарг Балгскі камандор: «19 кастрычніка прыехалі мы да іх у Трокі, адкуль павінны былі ехаць з імі па вельмі дрэнных дарогах. ...На трэці ж дзень падчас абеду шмат задавалі нам розных пытанняў, што датычыцца звергнутага магістра і вечнага міру... князь выказаў жаданне, каб змовіліся наконт часу і месца з'езду. Спрачаліся з-за фармальнасцей у дакументах пра з'езд, прычым Вітаўт сумняваў-

ся, што рыцары змогуць выканаць сваё абяцанне адносна тэрміну з'езду, бо ў іх няма магістра... Кароль, каралева і Вітаўт накіраваліся ў Вільню. Мы сталі развітвацца. Калі яны вусна прынялі прапанову пра з'езд, Вітаўт мовіў: «Паведаю вам праўду. Пісаў я перад вашым прыездам да рымскага караля пра шкоду, якую мы церпім ад Ордэна, а пісаў я яму дзеля таго, каб не дакараў мяне ў тых выніках, якія могуць з гэтага ўзнікнуць»[182]. Так, нямала было спісана паперы на ўзаемныя скаргі. Ордэн скардзіўся Жыгімонту і папу рымскаму на Вітаўта і Ягайлу, а тыя ў сваю чаргу — на Ордэн. Кожны бок выстаўляў свайго непрыяцеля ў непрыглядным выглядзе, прад'яўляў яму тэрытарыяльныя прэтэнзіі.

З'езд, на які было так шмат спадзяванняў, не задаволіў ні тых, ні другіх. У красавіку 1414 года ў мястэчку Грабаве палякі ад імя Ягайлы і Вітаўта патрабавалі ў ордэнскіх упаўнаважаных вяртання Памор'я, Хелмінскай, Міхайлаўскай земляў, мястэчкаў Дрэздэнка і Сантока, кампенсацыі страт ад леташняга крыжацкага пахода на Мазовію, прызнання межаў Вялікага княства. Крыжакі адверглі гэтыя патрабаванні. Так нічога і не вызначылі перамоўшчыкі.

Польшча і Вялікае княства пачалі рыхтавацца да новай вайны з Ордэнам. Ордэнскі магістр Міхаэл Кухместэр з трывогай успрыняў паведамленне, што Вітаўт заключыў саюз са Псковам, і пісаў чэшскаму каралю, што крыжакам давядзецца ваяваць з Белай Руссю[183]. Істотная падрабязнасць: гэта адна з першых дакладных лакалізацый Белай Русі, і, як бачым, назва «Белая Русь» у той час не адносілася да старажытных беларускіх земляў — так крыжакі называлі Пскоўскую і Наўгародскую землі[184].

Ягайла і Вітаўт 18 лістапада аб'яўляюць вайну Ордэну. Пэўна, пасылаючы Міхаэлу Кухместэру вестку пра разрыў міру, Ягайла і Вітаўт разлічвалі на хуткую перамогу. Толькі атрымалася зусім не так. Ужо ў дваццатых лічбах ліпеня саюзнае войска ўвайшло ў Ордэнскія землі. Крыжакі выбралі іншую тактыку. Яны не выставілі ў поле войска, а ўмацавалі гарнізоны ў гарадах, спадзеючыся на непрыступнасць сценаў.

Дванаццаць дзён прастаяла польска-літвінскае войска перад першым прускім горадам на іх шляху — Нэйдэнбургам, пакуль ён не здаўся на міласць пераможцаў. Замак Гогенштэйн крыжакі пакінулі і спалілі. Вырашыўшы, што ордэнцы напалоханы і цяпер стануць болей згаворлівымі, Ягайла і Вітаўт запрапанавалі мір, але Ордэн адхіліў яго. Вайна працягвалася. Пад Гайльсбургам польска-літвінскае войска панесла адчувальныя страты ад смелых вылазак абаронцаў месца. І чым далей яно рухалася ў глыб Прусіі, тым з большай упартасцю абара-



Вітаўт. *XVI ст.*

няліся гарады. Між тым атрад крыжакоў зрабіў набег на польскую воласць Нетцы, дзе з не меншай, чым іх праціўнікі, лютасцю расправіўся з палякамі. Другі атрад па рацэ Вісле прыйшоў у Добжынскую зямлю, спаліў мястэчка Ліпна і па-

чаў спусташаць навакольныя селішчы. Трэці атрад рухаўся ад Страсбурга да Рыпніцы. Лівонскія рыцары грамілі Куявію. І хаця палякам з літвінамі ўдалося захапіць некалькі крыжацкіх замкаў, Ордэн упарта супраціўляўся. Каля Голанда крыжакі адбілі напад непрыяцеля. У баі нямала палягло вояў з Вітаўтавага войска, сярод іх адзін з паплечнікаў вялікага князя — Бутрым. Крыжакі перахапілі абоз з правіянтам, які следаваў з Мазовіі. Паміж Ягайлам і Вітаўтам разгарэліся спрэчкі. Вялікі князь, не зацікаўлены ў разгроме Ордэна, патрабаваў сканчыць вайну, кароль стаяў на сваім — ваяваць да перамогі. Знясіленае ў баях, галоднае ад недахопу харчу войска ў сярэдзіне верасня падступіла да Страсбурга (былой Бродніцы). Тры тыдні доўжылася аблога. Немцы адбілі штурм. А голад, што пачаўся ў польска-літвінскім лагеры, забіраў на той свет болей вояў, чым меч на полі сечы. Крыжакі тым часам адваявалі Кэйдэнбург і Аленштэйн і рынуліся на безабаронную Мазовію. Тут і паказаў сябе зноў Вітаўт — насуперак Ягайлавым упрошванням ён увёў сваё войска. Без Вялікага княства польскі кароль не стаў працягваць вайну.

Праз пасрэдніцтва папскіх легатаў у лістападзе пачаліся перамовы аб міры. Было вырашана перадаць спрэчку на суд Канстанцкага сабору. Так што ніякіх вынікаў гэтая «галодная вайна» (так яе называлі палякі) не прынесла Польшчы: ні Памор'е, ні іншыя захопленыя Ордэнам землі палякі не вярнулі. Хто выйграў ад гэтай калатнечы, дык гэта зноў Вітаўт: Польшча не перамагла Ордэн, а той яшчэ раз атрымаў адчувальны ўдар. За дзевяць тыдняў вайны абедзве дзяржавы растрацілі большасць сваіх фінансаў. Моцныя і ваяўнічыя суседзі Вялікага княства выйшлі з вайны значна аслабелымі.

У канцы года ў Канстанцы (Швабія) адкрыўся царкоўны сабор. Вышэйшае святарства Еўропы сабралася абмяркоўваць надзённыя пытанні тагачаснага жыцця: уздым ерэтычных вучэнняў, пагроза турэцкага нашэсця на Паўднёвую Еўропу, спрэчкі паміж Ордэнам з аднаго боку і Польшчаю і Вялікім княствам — з другога, звяржэнне трох існуючых пап і выбранне на іх месца новага.

Рыхтаваўся да сабору і Вітаўт. Адным з пытанняў, якое меркавалася разглядаць у Канстанцы, — унія цэркваў. Пад ціскам рымскай курыі Ягайла таксама павінен быў садзейнічаць царкоўнай уніі. У лісце да папы Ягайла апраўдваўся, што, калі б не вайсковыя перашкоды, ён даўно перавёў бы праваслаўных у падначаленне рымскай царкве. Пісаў кароль пра унію і ў Канстанцінопаль патрыярху. Але, каб правесці такое аб'яднанне, трэба было аддзяліць праваслаўную царкву Вялікага княства ад Маскоўскай мітраполіі. Пасля смерці ў 1406 годзе

літвінскага мітрапаліта Кіпрыяна* князь з літвінскімі і ўкраінскімі епіскапамі выбраў у мітрапаліты полацкага ўладыку Феадосія і паслаў яго ў Канстанцінопаль для пасвячэння. У сваёй грамаце патрыярху Матфею I Вітаўт прасіў: «Пастаўце Феадосія нам у мітрапаліты, каб сядзеў на пасадзе Кіеўскай мітраполі па старыне, будаваў бы па-ранейшаму царкву Божую, таму што па волі Божай мы валодаем горадам Кіевам»[185].

Патрыярх праігнараваў Вітаўтаву просьбу і са згоды маскоўскага князя Васіля паставіў мітрапалітам Фоція. Той ехаў ва Усходнюю Еўропу, каб забяспечыць фінансавую і палітычную падтрымку Візантыйскай імперыі. Шэсць месяцаў новы мітрапаліт пражыў у Кіеве, знаёмячыся з палітычным становішчам у Вялікім княстве. Між тым маскоўскі князь вёў з ім перамовы і абяцаў сваю дапамогу Візантыі. Фоцій пакінуў Кіеў і пераехаў у Маскву. Вітаўт, каб пазбавіць свае землі ўплыву Масквы праз вернага ёй мітрапаліта, разарваў з ім адносіны, а пасля, абвінаваціўшы ў тым, што «он туто, на Кияву, в нас не живал»[186], не дазволіў яму прыязджаць у сваю дзяржаву. Паказальна, што ў сваёй грамаце Вітаўт указаў, што зрабіў гэта са згоды «с нашею братьею, с князьми Рускими», г.зн. падобны ўчынак не быў ягоным самаўпраўствам. У важнейшых пытаннях дзяржаўнага жыцця вялікі князь раіўся і шукаў згоды з князямі. Вітаўт паслаў у Канстанцінопаль да імператара Мануіла II і патрыярха Яўхімія II Кіпрыянава братаніча Рыгора Цымбалака, просячы іх пасвяціць таго ў мітрапаліты. Патрыярх і на гэты раз адмовіўся, жадаючы мець аднаго мітрапаліта ва Усходняй Еўропе — вернага яму Фоція. Але для Вітаўта існаваў прыклад Балгарыі і Сербіі, дзе «ўчынілі самі сабе, сваімі епіскапамі, першасвяціцеля, і да гэтага дня трымаюць так першасвяціцеля, з многімі епіскапамі»[187]. Вось вырашыў і князь без канстанцінопальскага патрыярха паставіць у сваёй дзяржаве «першасвяціцеля».

Восенню 1414 года Вітаўт склікаў у Наваградку сабор літвінскіх і ўкраінскіх епіскапаў: Феадосія Полацкага, Ісакія Чарнігаўскага, Дыянісія Луцкага, Герасіма Уладзімірскага, Галасея Перамышльскага, Сабасцьяна Смаленскага, Харытона Холмскага, Яфіма Тураўскага. Цікавая матывіроўка Вітаўтам неабходнасці мець асобнага ад Масквы мітрапаліта: «а іншыя людзі з боку кажуць: «Гаспадар не ў той веры, таму царква і збяднела», каб таго слова ад людзей на нас не было»[188]. Не думаю, што Вітаўт крывіў душою, хаваючы за гэтымі словамі сапраўдную прычыну аддзялення літвінскіх і ўкраінскіх епіскапаў ад адзінай з Масквою мітраполіі. Князь жыва цікавіўся

* Руская праваслаўная царква прычысліла Кіпрыяна да ліку святых.

справамі царквы, бо добра разумеў яе палітычную сілу. Калі перайшоў у каталіцызм, нямала садзейнічаў распаўсюджанню каталіцтва на Літве і Жамойці, але нямала рабіў, каб не «збяднела» і праваслаўная вера. У яго праўленне на Літве ўзводзяцца новыя праваслаўныя цэрквы ў Слуцку, Крэве, Браславе, Мазыры, Віцебску, Маламажэйках, Сынковічах, Навагрудку, Клецку. Княгіня Ганна фундавала ў Бярэсце Нікольскую і Крыжаўздзвіжанскую цэрквы. Трэцяя Вітаўтава жонка Ульяна Гальшанская — Юр'еўскую царкву ў Троках. Сам Вітаўт заснаваў на Гарадзеншчыне Малецкую царкву і Паходную царкву для праваслаўных вояў[189]. Нагадаем, што па Вітаўтавым загаду ў 1405 годзе тураўскі епіскап Антоній хрысціў у праваслаўе Верхненёманскую Літву. Крыжакі не раз абвінавачвалі Вітаўта, што ён болей ласкавы да праваслаўных, чым да католікаў. За такую гарачую прыхільнасць католіка да праваслаўя папа Марцін V забараніў у 1427 годзе каранаваць Вітаўта каралём.

Епіскапы падтрымалі вялікага князя. «И сами не перво слышим то и видим, што церковь скудеет, а царь и патриарх строителя доброго к нам церкви не дасть: но правилом, нам годиться митрополита збором поставити»[190]. І паставілі Рыгора Цымбалака, які паходзіў са знатнага румынскага роду. Доўгі час ён знаходзіўся на Афоне і ў Канстанцінопалі, пасля служыў святаром у Малдавіі. Па запрашэнні свайго дзядзькі мітрапаліта Кіпрыяна прыехаў у Вялікае княства. Па натуры быў ён чалавек авантурны, аматар розных махлярстваў і інтрыг, за што ў свой час у Канстанцінопалі пазбавілі яго святога сана і праклялі. Вось такі ўладыка, якому важна была ні вера, а кар'ера ў царкве, якраз і падыходзіў Вітаўту: ён не стане з-за тэалагічных догмаў адстойваць праваслаўе, а наадварот, спакусіўшыся высокім санам ва уніяцкай царкве, усёй душой падтрымае унію.

Аднак епіскапы запрапанавалі Вітаўту яшчэ раз прасіць у патрыярха пасвячэння ў мітрапаліты Цымбалака. Вітаўт згадзіўся з імі. Рыгор Цымбалака разам з Вітаўтавымі пасламі пабываў у Канстанцінопалі, але іх апярэдзілі паслы ад Фоція, якія скардзіліся на Вітаўта. Патрыярх Яўхімій II працягваў палітыку сваіх папярэднікаў на захаванне ва Усходняй Еўропе адзінай праваслаўнай царквы пад апекай канстанцінопальскага патрыяршаства. Масква разглядалася канстанцінопальскімі патрыярхамі і візантыйскімі імператарамі як рэальны саюзнік у барацьбе з турэцкай небяспекай. Разлічвалі патрыярхі і на прытулак у Маскве ў выпадку авалодання туркамі Канстанцінопаля. Не апошнім аргументам былі і шчодрыя паднашэнні, якія паступалі ў патрыяршаства з Масквы. Таму Яўхімій, хаця і прыняў літвінскіх паслоў, аднак пасвяціць у мітрапаліты

Цымбалака адмовіўся. Толькі Вітаўт не адступіўся ад сваёй задумы. У сярэдзіне 1415 года ён паўторна склікаў епіскапаў і рашуча патрабаваў ад іх узвядзення ў сан мітрапаліта свайго стаўленіка, нават пагражаў ім: «Калі не паставіце мне мітрапаліта ў маёй зямлі на Кіеў, то зло памрэце»[191]. І ўсё ж ён саступіў епіскапам у патрабаванні атрымаць патрыяршае бласлаўленне. У Канстанцінопаль паехалі паслы. Аднак у назначаны тэрмін 14 лістапада 1415 года Вітаўт так і не атрымаў адказу ад патрыярха. А ўжо наступным днём у Наваградку епіскапы ўзвялі ў сан мітрапаліта Рыгора Цымбалака. Яшчэ адна перамога Вітаўта. У сваёй грамаце ён паведамляў: «хто хоча па старыне трымацца пад уладаю мітрапаліта кіеўскага — добра, а хто не хоча, дык як хоча, ведайце адно: мы не вашай веры, і калі б мы хацелі, каб у нашых уладаннях вынішчылася ваша вера і цэрквы вашы стаялі без ладу, то мы б ні аб кім і не стараліся... Але мы, жадаючы, каб ваша вера не вынішчалася і цэрквам вашым было ўладкаванне, пастанавілі саборам мітрапаліта на Кіеўскую мітраполію, каб руская чэсць уся стаяла на сваёй зямлі»[192].

У 1418 годзе Цымбалак з праваслаўнымі епіскапамі і феадаламі прыехаў у Канстанц. Ужо былі спалены па прысуду сабора Ян Гус і Іранім Пражскі — адны з нямногіх католікаў, што не лічылі праваслаўе ерэтычнай верай. Расправа над чэшскімі прапаведнікамі паўплывала на рашэнне Вітаўтавай дэлегацыі. Літвінскія епіскапы заявілі, што не жадаюць вяршэнства Рыма і аб'яднання цэркваў, і пакінулі сабор. Дарэчы, новавыбраны папа Марцін V і сам не выказаў асаблівай ахвоты займацца справай уніі і паспяшаўся закончыць сабор.

Відаць, такое рашэнне святароў прыйшлося не па душы Вітаўту, бо адразу пасля свайго вяртання Цымбалак ад'ехаў з Вялікага княства ў Малдавію, а пасля ў Сербію. Давялося Вітаўту мірыцца з Фоціем, і той некалькі разоў наведваў Вялікае княства.

Не рассудзіў сабор спрэчкі паміж Ордэнам і Польшчаю разам з Вялікім княствам. Па даўняй завядзёнцы абодва бакі абсыпалі адзін аднаго папрокамі, прычым Ордэн абвінавачваў Вітаўта ў тым, што ён, убачыўшы, як Жамойць задаволена ордэнскім кіраваннем, падбіваў жамойтаў на паўстанне і што скаргу яны напісалі па ягоным загаду. Папа хацеў не пакрыўдзіць крыжакоў і адначасова заваяваць прыхільнасць да сябе Вітаўта і Ягайлы. Справа ў тым, што ў 1415 годзе туркі разбілі ўгорцаў і ўся Паўднёвая Еўропа апынулася пад пагрозай турэцкага нашэсця. На саборы з'явілася думка нацкаваць на туркаў Польшчу і Літву. Сабор прасіў Ягайлу і Вітаўта пайсці на ворагаў Хрыста, абяцаючы за гэта памірыць іх з Ордэнам.

Той жа Жыгімонт у сваіх лістах паабяцаў Вітаўту сяброўства і кляўся падтрымліваць яго супраць усіх ворагаў. Толькі Вітаўта не спакушала перспектыва класці сваіх вояў за чужыя інтарэсы. Ніяк не выпадала пачынаць вайну з Турцыяй, у той час, калі Вялікае княства варагавала з Залатой Ардой. Вітаўтаў стаўленік хан Саладзін загінуў ад рукі свайго брата Керым-Бердзея, якога падтрымліваў Эдыгей. Пачынаць вайну з туркамі пры такіх адносінах з Залатой Ардой — сапраўдная авантура.

Вітаўт і Ягайла адкрыта не адмовіліся выступіць супраць туркаў, нават адправілі паслоў у Турцыю заступіцца за ўгорцаў, паслалі хлеб грэкам, але да паходу не збіраліся. Зразумела, што сабор ухіліўся ад разгляду ордэнскіх спраў, каб не пакрыўдзіць Ордэн, калі прысуд будзе не на яго карысць, і не пазбавіцца дапамогі Польшчы і Вялікага княства, калі прысуд вынясуць не на карысць апошніх. Так што, спрэчка Ордэна з Польшчаю і Вялікім княствам з-за Памор'я, Добжынскай зямлі і Жамойці не скончылася, а значыць, у любы момант вайна паміж непрыяцелямі магла выйсці з дыпламатычных пакояў на поле сечы.

Пакуль жа паміж імі існавала перамір'е. У 1417 годзе 15 кастрычніка Ягайла і Вітаўт сустракаліся ў Велоне з магістрам Міхаэлам Кухместэрам. Рыцары не змянілі сваіх патрабаванняў, каб межы Ордэна былі вызначаны згодна іх дакументаў. Можна ўявіць, дзе б пралягліся гэтыя межы. Дакументаў крыжакі маглі паказаць шмат: і граматы Міндоўга, дзе ён аддаваў Ордэну Жамойць, і граматы Канстанціна Полацкага, у якіх той аддаваў Латыгольскую зямлю, і таго ж Вітаўта, які таксама аддаваў Ордэну і Жамойць, і Аўкштайцію; паказалі б грамату Андрэя Полацкага з перадачай ім Полацкай зямлі. Амаль палову Вялікага княства патрабавалі. Маглі паказаць і грамату імператара Людвіга Баварскага, у якой ён дарыў Ордэну Жамойць, Літву і Русь. Хіба з такім можна пагадзіцца? Пачаліся ўзаемныя прэтэнзіі, абвінавачванні. «Мы прыехалі, каб паразумецца з вамі, а вы кажаце пра межы і мінулыя падзеі; калі б мы, са свайго боку, нагадалі мінулае, дык ніколі не прыйшлі да згоды. Таму давайце вырашаць сённяшнія справы», — заявілі Ягайлавы і Вітаўтавы паслы. Крыжакі ў адказ: «Не можам і мы прыняць цяпер вашы прапановы. Прасіце караля, каб пакінуў нас пры нашых краях і межах на падставе дакументаў»[193]. Нічога не вырашылі і гэтыя перамовы. Абодва бакі зноў раз'ехаліся, незадаволеныя адзін адным.

1417 год прайшоў болей-меней спакойна. Вітаўт на некалькі дзён забыўся на дзяржаўныя справы і гуляў на вяселлі сваёй унучкі Анастасіі, дачкі маскоўскага князя, з князем Алелькам Уладзіміравічам Слуцкім. Мабыць, са смуткам паглядаў ён на

маладых, прыгадаўшы, як, здавалася, яшчэ не так даўно, выдаваў сваю дачку Софію за Васіля, а вось ужо і вяселле іх дачкі. Не заўважыў, як столькі часу сышло ў нябыт. Што ж, зрабіў ён нямала добрага для дзяржавы і народа. Але горка думаць, што абдзяліў яго Бог — не паслаў сына-наследніка. Балюча ўспамінаць, што з-за ягонай прагі да ўлады загінулі сыны Юрый ды Іван, і няма цяпер каму стаць прадаўжальнікам спраў вялікага князя.

Трывожным выдаўся наступны 1418 год. Скончыўся тэрмін мірнай дамовы з Ордэнам. Князі Хведар Астрожскі і Аляксандр Нос Пінскі хітрасцю і зброяй вызвалілі з крамянецкага замка Свідрыгайлу. Вось як яны гэта зрабілі. Крэпасць ахоўвалі верныя Вітаўту воі пад кіраўніцтвам немца Конрада Франкенберга. Двое слуг Астрожскага ў вялікі чацвер прыехалі ў Крамянец і наплялі кашталяну замка, што ў паходзе супраць татараў яны згубілі ўсю сваю маёмасць і не маюць сродкаў вярнуцца на радзіму. Франкенберг паверыў і залічыў іх у свой гарнізон. А праз некаторы час, калі ім выпала стаяць на варце, ноччу да крэпасці падышлі атрады Астрожскага і Носа. Была адчынена брама і спушчаны мост. Змоўшчыкі ўварваліся ў замак, перабілі варту і вывелі на волю Свідрыгайлу. Сам Франкенберг са зброяй у руках загінуў у баі. Вітаўт, як даведаўся пра гэта, баючыся паўстання ў Вільні, схаваўся за моцныя сцены Трокскага замка і прасядзеў там некалькі тыдняў. А мяцежны князь напаў на Луцк, разрабаваў там Вітаўтаў замак, а пасля ў суправаджэнні князя Андрэя, былога смаленскага намесніка, з атрадам у дзве сотні вершнікаў накіраваўся ў Кастанц, дзе зблізіўся з нямецкімі князямі. Ён наладзіў зносіны з Ордэнам. Звяртаўся Свідрыгайла і да імператара Жыгімонта. Рагніцкі камандор даносіў магістру, што ўсё Падолле паклялося Свідрыгайлу ў вернасці. «Па гэтай прычыне вялікі князь Вітаўт трымае Свідрыгайлаву жонку пад пільнай вартаю, бо баіцца што калі Свідрыгайла сустрэнецца са сваёю жонкаю, дык усё княства Літоўскае скарыцца яму»[194]. А магістр абяцаў Свідрыгайлу даваць прытулак яго прыхільнікам, якія ўцякуць у Прусію. Вітаўт з трывогай чакаў, што ўчыніць далей Свідрыгайла.

Другой падзеяй у гэтым годзе было паўстанне летам у Жамойці. Жамойты з нянавісцю распраўляліся з велікакняжацкай адміністрацыяй, разбуралі і палілі касцёлы. Некалькі жамойцкіх атрадаў, каб выклікаць вайну Ордэна з Вялікім княствам, напалі на прадмесці Клайпеды і захапілі шмат коней і валоў, якія належалі ордэнцам. Вітаўт паслаў на ліхадзеяў жамойцкага старосту Кезгайла. У лісце да магістра ад 11 чэрвеня Вітаўт паведамляў, як Кезгайла «пайшоў паходам на ліхадзеяў у Расіяні з іншымі добрымі людзьмі і... хапаў, біў усіх тых, хто

гэта рабіў. І калі мы даведаліся пра гэта, дык мы таксама адправіліся туды і дайшлі да Эйрыголы, але перад нашым прыбыццём іншыя справіліся з імі і вярнулі спакой. І пры нас шмат нападалі, а яшчэ штодня да нас прыводзяць тых, хто ўдзельнічаў у мяцяжы»[195]. Вітаўт не з-за сціпласці прамаўчаў, што пакаранне было жорсткім. Мяцежных жамойтаў тапілі, вешалі, забівалі, кідалі ў мядзвежых скурах зграям сабак. Шэсцьдзесят жамойцкіх старэйшын, болей за пяць тысяч простага люду паплаціліся жыватом. За такую жорсткасць Вітаўт атрымаў ад сучаснікаў мянушку «Крывапіўца».

І зноў давялося Вітаўту адкладваць ажыццяўленне сваёй мары — каранацыі. Ніяк не выходзіла абысціся без Ягайлы. Вось ужо які год каралеўская карона, як мроіва, бачыцца яму, і не даецца ў рукі. І крыўдна, і неспакойна на душы. Што чакае дзяржаву пасля ягонага адыходу ў іншы свет, калі ён так і не ператворыць яе ў каралеўства? Стане польскай правінцыяй? Значыць, усе яго намаганні, яго бязлітаснасць да самога сябе — усё дзеля вось такога ганебнага выніку? Павялічваецца колькасць незадаволеных ім. І ўжо не маўчаць, і нават не асуджаюць, а дзейнічаюць. Вось вызвалілі Свідрыгайлу, і прыйдзі той з крыжакамі на Літву, дык не адзін князь або баярын ці людзін просты падтрымае яго. Дастаткова іскры — і пажар успыхне.

Ну, ці не іронія лёсу: ён марыць каранавацца, а сам у Вільні ставіць на ханства, ускладае ханскі вянец на тое чало, на якое асабіста вырашыць. Залатая Арда, перад якой дранцвее ў жаху Еўропа, атрымлівае сваіх уладароў па ягонай, Вітаўтавай, волі, а сам жа па сану лічыцца ніжэйшым за самага беднага караля.

Толькі жыццё ішло сваім парадкам, і даводзілася болей думаць не пра каралеўскую карону, а пра справы надзённыя. Ізноў Вільня бачыла, як узводзіцца Вітаўтам на Залатаардынскае ханства новы хан. На гэты раз яшчэ адзін Тахтамышаў сын, Ярым-Фердэй. Узброены Вітаўтам, умацаваны харугвамі Вялікага княства, Ярым-Фердэй захапіў уладу ў Сараі. Перамогу яму ў рашучай бітве з братам Керым-Бердзеем на берагах Волгі прынёс якраз удар з засады літоўскіх казакоў. Састарэлы Эдыгей, які яшчэ два гады таму паліў і рабаваў Кіеўшчыну, прыслаў Вітаўту прымірэнчы ліст. «Дажылі мы, ясны кароль, вячэрніх гадоў жыцця нашага. Апошнія дні нашы трэба пражыць у міры. Кроў, якую мы пралівалі на войнах нашых, няхай убярэ зямля. Словы абраз і крыўд, якімі мы адзін аднаго асыпалі, хай унясе вецер. Няхай гнеў наш сгарыць у полымі. Пажары ж нашых войнаў няхай у будучым залье вада»[196]. А у падарунак Эдыгей прыслаў трох вярблюдаў і 27 коней.



Мікалай Цыбулька. *1860 г.*

У тым жа 1418 годзе памерла княгіня Ганна. З яе смерцю адчуў Вітаўт, наколькі ён адзінокі. Не парушыць вечарам цішыню ў яго пакоях дзіцячы смех, няма з кім абмовіцца шчырым словам пра набалелае — ён застаўся адзін. А так хочацца пабыць не ўладаром, а проста чалавекам, каб не толькі гнеў ускіпаў у яго душы, не толькі пра дзяржаву думаць, а каб любоў блізкіх абуджала ў яго пяшчоту, каб сярод родных яму людзей забыцца пра ўсе гэтыя спрэчкі з Ордэнам, пра свой непакой, пра нявырашаныя пытанні, каб не мучыць сябе думкамі пра заўтрашні дзень. Але кожнаму сваё, і ад свайго лёсу ён не ўцёк, не абхітрыў яго. Трэба несці свой крыж праз стому і

знямогу. У жонкі ён выбраў Ульяну Гальшанскую, удаву князя Карачэўскага. Але і тут Вітаўту давялося змагацца за сваё права. Віленскі біскуп адмовіўся вянчаць іх, бо Ульяна даводзілася пляменніцай Ганне. Ні просьбамі, ні пагрозамі не ўдалося ўгаварыць біскупа. Але Вітаўт не прывык адступацца ад свайго. Ён знайшоў больш падатлівага влоцаўскага біскупа Яна Крапідла, які абвянчаў яго з Ульянай.

Новы 1419 год прынёс мала суцяшальнага. У лютым даведзеныя да адчаю жамойты паклікалі рыцараў. У якасці ўладара Жамойці называўся Свідрыгайла.

На пачатку мая ўпаўнаважаныя Ордэна, Польшчы і Вялікага княства з'ехаліся ў Куявіі ў мястэчку Гнеўкаве. Ізноў з-за спрэчных земляў ніхто не саступаў адзін аднаму. Так і засталіся пры сваіх інтарэсах і раз'ехаліся. Імператар Жыгімонт, выбраны трэцейскім суддзёй, паспрабаваў прымірыць ворагаў. Замест вялікага магістра ў Кошыцы, дзе сустрэўся Ягайла з Жыгімонтам, прыехаў торнскі камандор. Абражаны імператар прыгразіўся, што калі Ордэн не жадае прызнаваць яго імператарскі аўтарытэт, дык ён прыме Ягайлаў бок.

Вярнуўшыся з Кошыц, Ягайла загадаў збіраць войска і паведаміў пра гэта Вітаўту. Устрывожаны вайсковай падрыхтоўкай у Польшчы і Літве Міхаэл Кухместэр пісаў германскаму магістру: «...Мы павінны даць адпор нашым непрыяцелям, інакчай нас чакае поўнае знішчэнне, страта ўладанняў. Ніколі мы не бачылі так ясна нашай загубы, як цяпер»[197]. Гэта ўжо не той саманадзейны, упэўнены ў сваіх сілах Ордэн, які пахваляўся перамагчы дзесяць такіх каралеўстваў, як Польшча. Цяпер толькі б выжыць. Але вайна не пачалася — імператар і папа замірылі непрыяцеляў і абяцалі рассудзіць іх наступным годам на з'ездзе ў Брэслаўлі. Не вельмі верачы ў аб'ектыўнасць Жыгімонтава прысуду, Ягайла і Вітаўт у ліпені заключылі мірную дамову з дацкім і шведскім каралём Эрыкам супраць Ордэна. Магчымасць вайны не выключалася.

Чаго было чакаць ад Жыгімонта I? На з'ездзе ў Брэслаўлі ён заявіў, што Памор'е, Кульмская і Міхайлаўская землі па праву належаць Ордэну. Адносна Жамойці імператар увогуле прыняў Саламонава рашэнне: пры Вітаўтавым жыцці яна ўваходзіць у Вялікае княства, але ўсе даходы з гэтай зямлі павінны аддавацца Ордэну. Вельмі хітра-мудра... Вітаўт у 1420 годзе паслаў да Жыгімонта свайго сакратара Мікалая Цыбульку, які разам з польскім паслом Збігневам Аляснщкім у Вроцлаве прасіў імператара перагледзець брэслаўскі прысуд. Імператар адмовіўся. Тады Цыбулька прама ў вочы мовіў, што яго пан добра спазнаў характар Жыгімонта і не хоча з ім больш ні прымірэння, ні прыязні, што калі той надумае парушыць пры-

нятыя абавязкі ці змяніць іх, дык Вітаўт пачне з ім вайну. Нечуваная знявага яго імператарскай мосці! Жыгімонт ускіпеў ад злосці і намераваўся загадаць утапіць непачцівых да яго высокай асобы паслоў. Толькі ўстрывожаныя пагрозай Вітаўта нямецкія электары астудзілі злосць імператара і адгаварылі яго ад неразважлівага намеру. Цыбулька вярнуўся ні з чым — імператар адмовіўся ад Вітаўтавай прапановы.

Калі ж жамойцкія прадстаўнікі са слязмі скардзіліся Вітаўту, што Жыгімонт прысудзіў Жамойць Ордэну, той гнеўна мовіў: «Гэтага Бог не дазволіць, каб цэзар мог раздаваць мой край і маіх падданых, пакуль я жыву»[198]. Ён гатовы быў змагацца з самім імператарам. Крыжакам, якія палохалі яго вайной з Жыгімонтам, даў зразумець, што мае дастаткова сілы: «Я ні на кога не аглядаюся, бо ніхто не здолее мяне перамагчы»[199].

КАРАЛЕЎСКАЯ ГОДНАСЦЬ

Вітаўт знайшоў, як паўплываць на Жыгімонта І. Пасля смерці чэшскага караля Венцаслава ў 1419 годзе Жыгімонт унаследаваў чэшскую карону. У гэты ж час паслядоўнікі Яна Гуса паднялі паўстанне і супраць Жыгімонта, і супраць нямецкага засілля ў каралеўстве. Паўстаннем кіраваў рыцар Ян Жыжка. Жыгімонт кінуў рыхтавацца да паходу супраць туркаў і стаў збіраць войска на гусітаў. Тыя ж запрапанавалі чэшскую карону Ягайлу. Асцярожны Ягайла, не жадаючы сварыцца з рымскім імператарам, адхіліў прапанову гусітаў. Тады чэхі звярнуліся да Вітаўта, і, як піша ў сваёй грамаце Ягайла: «...невядома якім чынам дамагліся, каб наш брат вырашыў адправіць да іх князя Жыгімонта» (Карыбутавіча. — *В.Ч.*), хаця мы не раілі і не згаджаліся на гэта»[200]. Вітаўт заставаўся самім сабою — адстойваў перш за ўсё інтарэсы Вялікага княства — і Ягайла яму не ўказ. У сваім лісце да нямецкіх курфюрстаў ён прызнаваўся, што імкнуўся перашкодзіць імператару, які без усялякай справядлівасці хоча забраць ягоныя спадчынныя землі, і толькі гэта падштурхнула яго падтрымаць чэхаў; не прагнасць і ганарлівасць, не чэшская карона, а жаданне спыніць войны паміж хрысціянамі і вярнуць чэхаў ва ўлонне царквы, аб чым яны прасілі яго. Вітаўт заявіў чэшскім паслам, што не можа ехаць у Чэхію, а назначыць туды свайго намесніка Жыгімонта Карыбутавіча. Чэшскае пасольства адправілася дадому, а ўслед за імі паехаў Вітаўтаў пасол Вышка Рачынскі. Чэхі згадзіліся прыняць велікакняжацкага намесніка, але прасілі, каб і сам Вітаўт прыехаў у Прагу.

З прыняццем чэшскай кароны Вітаўт рэальна пагражаў цэласнасці Свяшчэннай Рымскай імперыі. Чэхія з яе срэбнымі радовішчамі — самы дарагі дыямент дзяржавы. Зразумела, што імператар станавіўся Вітаўтавым ворагам. У сваіх лістах да Ордэна ён просіць крыжакоў напасці на Вялікае княства. Ды часы ўжо не тыя, Ордэн сам баіцца, каб не пачалася вайна з літвінамі. Разам з тым Жыгімонт у лістах да Вітаўта запэўнівае, што ён нічога варожага не тоіць у душы супраць яго і вельмі шкадуе, што князь, які заўсёды лічыўся абаронцам хрысціянскай веры, можа згубіць добрую славу, пасябраваўшы з ерэтыкамі. Устрывожыўся і папа рымскі Марцін V, што «ўказаны сын наш, муж шляхетны» Аляксандр Вітаўт спрыяе ерэтыкам — чэхам. Пагрозу ўсяму хрысціянскаму свету ўбачыў ён. І слёзна просіць Ягайлу: «Намагайся нагаданага Аляксандра выратаваць з той ганебнай пакуты, калі ён ужо ў яе трапіў»[201]. Але прыслухоўваўся Вітаўт да слова Ягайлы толькі тады, калі яму было выгадна.

У той жа час вярнуўся ў Вялікае княства Свідрыгайла. Усе ягоныя спробы падбіць на вайну з Вітаўтам то імператара, то Ордэн, то маскоўскага князя Васіля праваліліся. Засталося ехаць да свайго ворага з пакаяннем. Вітаўт прымірыўся са Свідрыгайлам, за якога паручыўся Ягайла. Свідрыгайла атрымаў княжанне ў Чарнігаве і Трубчэўску. Ён абяцаў падпарадкавацца вялікаму князю і выправадзіць ад сябе тых набліжаных, на якіх яму ўкажа Вітаўт. Невыпадкова з'явіўся ў дамове пункт пра «ненадзейных» — Вітаўт і цяпер баяўся папулярнасці Свідрыгайлы сярод праваслаўных і клапаціўся пра тое, каб яго палітычны праціўнік не змог акружыць сябе сваімі прыхільнікамі. Аднак так і не расстаўся Свідрыгайла з марай пра велікакняжацкі вянец. Нібыта і не бунтаваў супраць Вітаўта, а баляваў у сваім замку з гасцямі — праваслаўнымі князямі і баярамі. Ды толькі так ён здабываў прыязнь да сябе многіх феадалаў.

Месца для княжання Свідрыгайлу выпала неспакойнае — побач Залатая Арда, «Поля Дикие». Хаця Вітаўт і трымаў мір з золатаардынскім ханам, сваім стаўленікам, і Эдыгеем, але паміж імі ішла вайна за ўладу. У 1421 годзе Свідрыгайла вызначыўся — разбіў загон, пэўна, крымскіх татар, які нападаў на яго ўладанні. Угневаны Вітаўт загадаў павесіць 30 палонных, прысланых яму Свідрыгайлам. Гэтая перамога ахаладзіла заваёўніцкі пыл татараў, і гады чатыры яны не думалі пра набегі.

У 1422 годзе Вітаўт паслаў у Чэхію набранае ў Літве пяцітысячнае войска на чале з Жыгімонтам Карыбутавічам. «Жадаючы адпомсціць за крыўду майму ворагу, каралю Жыгімонту,

выслаў у Чэхію майго братанка Жыгімонта Карыбутавіча, каб мой вораг Жыгімонт зразумеў нарэшце, каго зачапіў, ведаў, што і ў нас ёсць сіла і адвага, і перастаў у рэшце рэшт дакучаць сваімі злачыннымі ўчынкамі»[202], — паведамляў ён. Імператар адступіў з Чэхіі ва Угорыю. Літвіны ўзялі штурмам мястэчка Нэйстаў у Маравіі. Адсюль Карыбутавіч адправіў да чэхаў і мараваў заклік, абвясціўшы, што прыйшоў у Чэхію як Вітаўтаў намеснік, каб ад яго імя кіраваць краінай і абараняць яе ад ворагаў, і запрашаў прадстаўнікоў усіх саслоўяў на сойм у мястэчку Чаславах. Чэхі і маравы ў сваёй большасці з прыязню аднесліся да Жыгімонта Карыбутавіча. На сойме яго абвясцілі каралеўскім намеснікам Чэхіі і Маравіі. Карыбутавіч пакляўся выконваць гусіцкія палажэнні, якія лічыліся папаю ерэтычнымі, а значыць, у вачах каталіцтва ён і Вітаўт былі ерэтыкамі.

16 мая Жыгімонт Карыбутавіч пад радасныя прывітанні месцічаў урачыста ўехаў у Прагу. Была выбрана новая гарадская рада. Жыгімонт пачаў кіраваць Чэшскім каралеўствам. Правадыр табарытаў* Ян Жыжка прызнаў над сабою ўладу Вітаўтава намесніка.

Яшчэ адна важная падзея адбылася ў гэтыя часы, хаця насіла яна нібыта прыватны характар — жаніцьба Ягайлы. Пасля смерці трэцяй Ягайлавай жонкі Альжбэты Граноўскай Жыгімонт I павёў перамовы з польскім каралём пра ягоны шлюб з чэшскай каралевай Офкай. Вітаўт, які ўсё часцей і часцей умешваўся ва ўнутраныя польскія справы, успрацівіўся гэтаму шлюбу. Частка польскіх вяльможаў, у прыватнасці каралеўскі сакратар Збігнеў Аляснцкі, шукалі пагаднення з імператарам і выступалі за шлюб Ягайлы з Офкай, за якую Жыгімонт I абяцаў аддаць у пасаг Сілезію. А ў гэтым Вітаўт не быў зацікаўлены: узвышэнне Польшчы, збліжэнне яе са Свяшчэннай Рымскай імперыяй, аслабленне Ордэна наносіла ўдар па ягоных задумах стварэння з Вялікага княства каралеўства. Мабыць, не абышлося без інтрыгі. Як адгаварыць Ягайлу ад жаніцьбы з чэшскай каралевай? Ён намаўляў Ягайлу, што Офка ўжо ў гадах і не дасць яму нашчадкаў, і параіў маладую прыгажуню Софію Гальшанскую, сваячку сваёй жонкі. Лепш за словы дзейнічае чароўны позірк прыгажуні.

У адзін з прыездаў Ягайлы на радзіму яны з Вітаўтам наведалі ў Друцку князя Сымона Дзмітрыевіча. Тут і ўбачыў кароль дзвюх яго пляменніц (маці іх была сястрою Сымона Дзмітрыевіча) — Васілісу і Софію. Усхвалявалася Ягайлава сэрца ад прыгажосці юных князёўнаў. Пасля абеду кароль

---

* Табарыты — рэвалюцыйна-антыфеадальнае крыло гусітаў.

папрасіў Вітаўта: «Было ў мяне ўжо тры жонкі — дзве полькі, трэцяя немка, а нашчадкаў яны мне не далі. Цяпер прашу цябе, высватай мне ў князя Сымона малодшую пляменніцу Софію, яна з роду рускага, і, можа, Бог дасць мне нашчадкаў». Вітаўт з ахвотаю выканаў братаву прапанову. Адказ князя Сымона быў такім: «Гасудар вялікі князь Вітаўт. Кароль Ягайла, брат твой, — каранаваны і вялікі гасудар, і не магло быць лепей для маёй пляменніцы, як з яго міласцю пабрацца шлюбам, аднак не варта ганьбіць старэйшую сястру яе, выдаваць малодшую раней за старэйшую, і таму няхай бы яго міласць узяў старэйшую». Калі Вітаўт перадаў Ягайлу гэтыя словы, той мовіў: «Сам ведаю, што старэйшая прыгажэйшая, але ў яе вусікі, а гэта азначае, што яна дзеўка моцная, а я чалавек стары і баюся на яе спакусіцца»[203]. Выхад усё ж знайшлі: за Васілісу пасваталі князя Івана Бельскага, а пасля Ягайла пасватаўся да Софіі. 24 сакавіка 1422 года ў Наваградку ў фарным касцёле, які зафундаваў Вітаўт, Ягайла абвянчаўся. Літвінская княгіня, нашчадак полацкіх князёў Софія Гальшанская стала польскай каралевай. Вітаўт спадзяваўся праз яе як сваячку ўплываць на Ягайлу. Як высветлілася, жаноцкім сэрцам нялёгка загадваць.

Гэты шлюб не ашчаслівіў каханнем Ягайлу. Маладая каралева сумавала са старым мужам і ажывала ў кампаніі маладых прыдворных. Прыхільна паглядала на прыгожых юнакоў. Ягайла нават раіўся з Вітаўтам, што зрабіць, каб Софія пазбавілася ад лёгкадумнасці. І нічога слушнага два венцаносцы не прыдумалі, як даваць каралеве менш есці, а мо паразумнее.

1422 год быў вяршыняй магутнасці Вітаўта. Ён — чэшскі кароль, і ў Чэхіі кіруе яго намеснік. Ягоную ўладу прызнае Ноўгарад, дзе літвінскім намеснікам сядзіць князь Сымон Гальшанскі. Прынялі літвінскую ўладу і разанскія князі. Новы стаўленік Вітаўта Улуг-Мухамед уладарыць у Залатой Ардзе. Князь маскоўскі Васіль Дзмітрыевіч прызначыў вялікага князя літоўскага апекуном над сваімі малалетнімі дзецьмі. Валашскі гаспадар Аляксандр шукае ў Вітаўта падтрымкі супраць туркаў. Значны ўплыў Вітаўта на ўнутраныя польскія справы. На яго арыентуецца ў сваёй палітыцы польскі канцлер Ястржэмбец, польскія саноўнікі часта звяртаюцца да вялікага князя, каб ён садзейнічаў у тых ці іншых справах. Вітаўт з'яўляецца пасрэднікам паміж Ягайлам і Земавітам Мазавецкім і апраўдвае апошняга, адвяргаючы абвінавачванні, што той чаканіў у Мазовіі польскую манету. Не палохаюць ўладара пагрозы папы рымскага адлучыць яго ад царквы, калі ён не кіне падтрымліваць гусітаў. Англійскі кароль шле яму падарункі.

Вітаўт нібыта ўвасабляў веліч і магутнасць Вялікага княства Літоўскага і Рускага. Веліч і магутнасць, якую заваявалі яго-


Чудскае воз.
Пскоўскае воз.
воз. Ільмень
Рыжскі заліў
Балтыйскае мора
Пскоў
Рыга
Ліфляндскі ордэн
Тэўтонскі ордэн
Ізяслаўскае княства
Вялікія Лукі
Цвер
Волга
Вялікае княства Маскоўскае
Маскоўскае княства
Вялікае княства Разанскае
Масква
Вязьма
Дарагабуж
Смаленск
Віцебск
Полацк
Дзвіна
Дняпро
Оршыца
Оршa
Мсціслаў
Магілёў
Гомель
Старадуб
Трубчэўск
Бранск
Ноўгарад-Северскі
Курск
Рыльск
Путывль
Сейм
Чарнігаў
Глінск
Кіеў
Дняпро
Сож
Десна
Ворскла
Ахтырка
Полтава
Харкаў
Чорнае мора
Азоўскае мора
Крымскае ханства
Перакоп
Кафа
Белгарад
Дняпроўскі лiман
Дняпроўскае плоскагор'е
Днястр
Ягорлык
Ачакаў
Буг
Прут
Малдавія
Сучава
Сірэт
Трансільванія
Венгрыя
Мурэш
Ціса
Камянец-Падольскі
Брацлаў
Узаркасы
Жытомір
Ольвоў
Галіч
Дністр
Стрый
Буг
Заходні Буг
Бярэсце
Пінск
Прыпяць
Тураў
Слуцк
Клецк
Нясвіж
Наваградак
Ваўкавыск
Гародня
Ліда
Мінск
Заслаўе
Менск
Друць
Друя
Друцк
Крзва
Налібоцкая пушча
Ашмяны
Троікі
Вільня
Вількамір
Браслаў
Дынабург
Нямунас
Рагнета
Кёнігсберг
Гродна
Аргерд
Альгерд
Кейстут
Ольгерд
Вітаўт
Ягайла
Скіргайла
Свідрыгайла
Жыгімонт Кейстутавіч
Жыгімонт Аўгуст
Стэфан Баторый
Ян Сабескі
Пётр I
Кацярына II
Аляксандр I
Напалеон I
Напалеон III
Напалеон Банапарт
Напалеон Банапарт
Напалеон Банапарт

ныя воі ў сечах з ворагамі, якую ствараліі хлебаробы, і рамеснікі, і дойліды, і купцы, і мужы дзяржаўныя. Сярод апошніх — Іван і Сымон Гальшанскія, Аляксандр Лукомскі, Юрый Пінскі, Іван Баба, брат яго Пуцята Друцкі, Леў Друцкі, Сымон Друцкі, Міхайла Заслаўскі, Іван Нясвіжскі, Сенька Сапега, Андрэй Няміра, Вышка Рачынскі, Мацей Лабішын, Лелюш Чупруна, Мікалай Надабовіч, Васіль Барэйкавіч, Гневаш Талевіч, Ян Бутрым, Юрый Страміла, Алехна, Мінгайла Ашмянскі, Ян Гаштольд з Крэва, Манівід з Граўжышак, блізкі сябар і ўлюбёнец Вітаўтаў Смолька. Прыгадаем яшчэ мужную літвінку Алену, якая ахвяравала сабою дзеля Вітаўта, каб ён шмат добрага зрабіў Літве. І славу Літвы сын Кейстута павялічыў. Ніколі за ўсю сваю гісторыю Вялікае княства не было такім моцным, як цяпер, пры Вітаўце.

У велічы і славе ўбачыў Вітаўта англійскі пасол у Турцыі Гільбер дэ Лануа. Вось як ён апісвае сваю сустрэчу з ім: «Праз нізкую Русь я адправіўся да герцага Вітальда, вялікага князя і караля Літоўскага, якога я застаў у Камянцы* на Русі разам з жонкаю і світаю татарскага князя і многіх другіх князёў, княгінь і рыцараў. Таму герцагу Вітальду я перадаў мірныя граматы ад абодвух каралёў (французскага Карла VI і англійскага Генрыха V. — *В.Ч.*) і перадаў яму падарункі ад англійскага караля. Уладар выказаў мне вялікую пашану і даў мне тры абеды і садзіў мяне за свой стол разам са сваёй жонкаю, герцагіняю, і сарацынскім князем Татарыі, па прычыне чаго я бачыў і ў пятніцу на стале мяса і рыбу. І быў там татарын з барадою, ніжэйшай за калені, захутанай ў нагалоўнік. І за ўрачыстым абедам, дадзеным ім паслам вялікага Ноўгарада і каралеўства Пскоўскага, яны, цалуючы зямлю перад сталом, паднеслі яму шмат дзіўных падарункаў: скуры куніц, шаўковыя сукенкі, футравыя шапкі, маржовую костку, золата, срэбра — да шасцідзесяці розных падарункаў. Ён прыняў дары Ноўгарада Вялікага, пскоўскія ж адвергнуў і нават не захацеў іх бачыць па прычыне нянавісці. Герцаг даў мне перад маім ад'ездам лісты, якія былі мне патрэбны, каб з іх дапамогаю праехаць праз Турцыю, напісаныя па-татарску, па-руску і па-латыні. Ён даў мне ў правадніки двух татараў і шаснаццаць чалавек рускіх і валахаў. Зрэшты ён мовіў, што мне будзе немагчыма перабрацца цераз Дунай з-за вайны, якая ідзе ў Турцыі...»[204]. Вітаўт багата адарыў англійскага пасла і адпусціў яго. Па дарозе ў Крым Лануа бачыў у Падоллі, як тамтэйшы намеснік Гедыгольд за месяц пабудаваў на беразе адной з рэк замак. Гедыгольд прывёў з сабою 12 тысяч будаўнікоў і 4 тысячы вазоў,

* Камянец-Падольскі.

нагружаных каменнямі і лесам. Так Вітаўт умацоўваў паўднёвыя межы Вялікага княства. Дзесьці каля Крыма Лануа сустрэў Джамбалыкскую арду і знайшоў яе хана Жамба, «сябра і слугу герцага Вітальда»[205]. Каля Кафы на пасольства напалі Эдыгеевы татары. «На шчасце, у гэты дзень я і людзі мае насілі на сабе шлемы і знакі службы Вітальда, а татары, што знаходзіліся ў засадзе, былі з людзей старога імператара Солкацкага (Эдыгея. — *В.Ч.*), які памёр, а раней быў у вялікім сяброўстве з Вітальдам. І так яны мяне адпусцілі»[206].

Апошні выпадак з паслом яшчэ раз сведчыць, наколькі быў моцны палітычны ўплыў Вітаўта ў татарскіх землях. Пра гэта сведчылі і прускія рыцары, паведамляючы, што татары да якога-небудзь паходу Вітаўта і Ягайлы добраахвотна прысылаюць ім столькі тысяч, колькі яны пажадаюць. Рыцары прыводзяць і такі факт, аб якім яны даведаліся з Вітаўтава ліста: «...па смерці татарскага хана двое ягоных сыноў спрачаюцца за ўладу і, не здолеўшы пагадзіцца, перадалі справу ў ягоныя (Вітаўта. — *В.Ч.*) рукі і прыехалі да яго да Кіева, і ён там, як хваліцца, загадаў каранаваць старэйшага на хана, на што і малодшы пагадзіўся»[207].

Еўропа паважала Вітаўта за «караля сарацынаў» (сарацынамі еўрапейцы называлі мусульманскія народы. — *В.Ч.*)[208]. Аднаго не хапала Вітаўту — кароны караля Літвы.

БАЦЬКА ДЗЯРЖАВЫ

Як бачым, у пачатку 20-ых гадоў Вітаўт імкнуўся стварыць умовы для ажыццяўлення сваіх задум. Ён умела карыстаецца напружаным палітычным становішчам у Еўропе, падтрымлівае гусітаў і тым самым вымушае імператара Жыгімонта I шукаць з ім пагадненне. У адносінах да Арды супрацьстаўляе адных татарскіх ханаў другім, не даючы ні аднаму з іх умацавацца. То ён змагаецца супраць варожых яму Худайдаты і Борака, што прыйшлі са сваімі ордамі ў волжскія і данскія стэпы з Сярэдняй Азіі, рукамі свайго стаўленіка золатаардынскага хана Улуг-Мухамеда, то ўжо супраць самога Улуг-Мухамеда, які паспрабаваў захапіць Крым, то падтрымлівае крымскага хана Даўлей-Берды.

Дзеля той жа мэты — пераўтварэння Вялікага княства ў каралеўства падтрымлівае Ордэн. Праз новага вялікага магістра Росдорфа спадзяваўся вялікі князь паразумецца з імператарам Жыгімонтам I ды знайсці прыхільнасць папы рымскага. Таму, калі ў лістападзе 1422 года пачалася новая вайна Польшчы з Ордэнам, Вітаўт запрапанаваў Паўлу Росдорфу быць пасрэд-

нікам у перамовах з Ягайлам. Пісаў яму: «Магістр, калі жыве ў думцы тваёй намер пакою і хочаш учыніць радасць і нашым жаданням, прыбудзь да нас. Кажу за караля, што ён не супроць заключыць пакой, а я з майго боку буду старацца нахіліць яго да гэтай справы»[209]. Магістр, чакаючы дапамогі нямецкіх курфюрстаў і імператара Жыгімонта I, адхіліў гэтую прапанову. Вітаўт быў абураны адмовай і патрабаваннем вывесці з Прусіі войска: «Ведай, магістр, што не раз ужо з войскамі нашымі вярталіся з поля бітвы з трыумфам. Не думаем пра роспуск нашага войска, бо з той мэтай яго сабралі і сюды прывялі, абы для краёў нашых пакой вечны заключыць. Калі ж больш яшчэ прагнеш заспакоіць нашы слушныя жаданні, пастарайся пра тое своечасова, абы краі твае не цярпелі з-за тваёй маруднасці. Не захочаш гэтага ўчыніць, няхай Бог рассудзіць нас і на душу тваю няхай спадзе адказнасць за тое, што адбудзецца далей»[210]. Вітаўт хацеў міру, але гэты мір ён мог заваяваць зброяй. І трэба было ваяваць... Пасля ўзяцця палякамі месца Голуба (адсюль і вайна атрымала назву Голубскай) і Хэльмы крыжакі сталі згаворлівымі. А тут яшчэ Вітаўт пагражаў магістру: «Не адступлю ад вайны, пакуль не вазьму вечнага пакою»[211]. 17 верасня каля возера Мельна быў заключаны мір. Польшча так і не дамаглася свайго — усе заваяваныя крыжакамі польскія землі засталіся ў Ордэна, затое ад Жамойці ён адмовіўся. Гэта была ўступка Вітаўту — цяпер у князя знікала неабходнасць вайны з Ордэнам. Падкуплены такім чынам Вітаўт стаў падтрымліваць Ордэн. Асабліва прыкметна гэта выявілася ў 1425 годзе, калі паміж Польшчаю і Ордэнам разгарэліся спрэчкі з-за замка Любіч. Паводле Брэслаўскага прысуду Жыгімонта і Мельнінскай дамовы, замак Любіч і млын, пабудаваны на рацэ Дравенка, крыжакі разбурылі. Магістр дамагаўся права аднавіць замак і млын, яго падтрымліваў Вітаўт. Ягайла і польскія вяльможы выступілі супраць. Тады Вітаўт заявіў, што пры адмове караля ён аддасць Ордэну Палангу. Ягайла заўважыў, што калі Вітаўт падаруе Палангу, то будуць пасля ён і Літва плакаць. Вітаўт ускіпеў: «Ніколі не плакаў бы, калі Паланга была б не маёй. Паніжае мяне кароль польскі — абразіў колькі разоў перад каралём Жыгімонтам робіць мяне нявольным»[212]. Гэта ўжо не супярэчнасці, гэта ўжо адкрытая варожасць.

На сойме ў Ленчыцах палякі пастанавілі задобрыць Вітаўта і ўступіць ягоным патрабаванням, дазволіць крыжакам будаваць Любічанскі замак, але з дрэва. Прама з сойму да Вітаўта адправілася пасольства на чале з кракаўскім біскупам Збігневам Аляснцкім і падкорміем Пятром Шафранцам. Крыху пазней да яго прыбыў балгскі камандор даведацца пра Любіч.



Пячаткі Вітаўта. *Уверсе: вялікая дзяржаўная пячатка з гербамі Вялікага княства Літоўскага, Трокскага княства, Валыні і Жамойці*

Вялікі князь быў настроены рашуча і заявіў, што калі польскія паслы не прыедуць бліжэйшыя чатыры дні, дык ён уручыць магістру дакументы на валоданне Палангай. Паслы паспелі, але Вітаўт не прыняў умову будаваць замак з дрэва і запатрабаваў скасаваць гэты пункт. Паслы, што не мелі на такі выпадак ніякіх паўнамоцтваў, адправілі вестуна да Ягайлы, і той загадаў аддаць Любіч крыжакам без усялякіх абмежаванняў. Але тая перамога каштавала Вітаўту 9 000 грыўнаў срэбра, якія ён заплаціў Ягайлу. А ўжо калі не шкада яму было такіх грошай, дык ясна, што спрэчкі з-за Любіча — гэта не капрыз вялікага князя, а сур'ёзны намер усялякімі сродкамі аслабіць Польшчу, абараніць Ордэн ад разгрому, а канчатковая мэта ўсё тая — абвяшчэнне Вялікага княства каралеўствам.

Пасля заключэння з Ордэнам Мельніцкага міру і прызнання правоў на Жамойць за Вялікім княствам Вітаўт перамяніў сваю палітыку і адносна гусітаў. Калі раней ён выкарыстоўваў гусіцкі рух супраць імператара Жыгімонта I, дык цяпер падтрымка «ерэтыкоў» магла яму вельмі пашкодзіць. Сварыцца з усёй Еўропай з-за Чэхіі і быць адлучаным папам ад царквы не ўваходзіла ў палітычныя разлікі вялікага князя. Ужо адразу пасля Мельніка папа Марцін V зноў запатрабаваў ад Вітаўта вываду войска з Чэхіі ў двухмесячны тэрмін і прыгразіў адлучэннем ад царквы. Жыгімонт I заключыў саюзы з сілезскімі князямі, Ордэнам, аўстрыйскім, баварскім герцагамі супраць Польшчы і Вялікага княства. Нават распрацаваў план падзелу Польшчы. Аднак чуткі, якія хадзілі па Еўропе, што Ягайла і Вітаўт зблізіліся з татарамі і туркамі, стрымлівалі імператара. Напрыканцы сакавіка 1423 года Ягайла і Жыгімонт I сустрэліся ў Кесмарке і заключылі саюз. Ад Вітаўта гэтую дамову падпісалі берасцейскі намеснік Мацей Лабішын, падольскі намеснік Гедыгольд і велікакняжацкі дарадца Мікалай Сапінскі. Абрадаваны Марцін V пісаў Вітаўту, што дачакаўся лепшага дня свайго жыцця — прымірэння яго і Ягайлы з імператарам.

Жыгімонт Карыбутавіч з літвінскай дружынай пакінуў Чэхію. Але з другога боку Вітаўт не быў зацікаўлены ў мірным вырашэнні гусіцкай праблемы: мяцежная Чэхія звязвала па руках імперыю, таму вялікі князь яшчэ доўгі час патаемна падтрымліваў гусітаў. А тыя і пасля адыходу Жыгімонта Карыбутавіча лічылі Вітаўта сваім уладаром. У 1423 годзе яны заявілі польскаму паслу Сестрынічу, што не могуць заключыць з непрыяцелямі перамір'я без ведама Вітаўта: «Наш уладар вялікі князь можа нас дакараць, што мы зрабілі гэта без ягонай рады і згоды»[213]. Вітаўт, паабяцаўшы ўдзельнічаць у крыжовым паходзе супраць гусітаў разам з Ягайлам, імператарам, шведскім каралём Эрыкам, нямецкімі герцагамі, тым не менеі не выс-

тупіў з войскам і сарваў паход. Аднак сваё спачуванне чэхам цяпер даводзілася хаваць. Так, вельмі холадна прыняў вялікі князь у 1424 годзе гусіцкіх паслоў, заявіўшы ім, што лічыць гусітаў сваімі ворагамі. Пра гэта ён не прамінуў напісаць імператару. Тая сустрэча з пасламі адбылася ў красавіку, а ўжо ў чэрвені Жыгімонт Карыбутавіч з атрадам у 1500 вояў зноў з'явіўся ў Чэхіі і ўвайшоў у Прагу. Чэшская сталіца прыняла літвінскага князя з пашанаю і перадала ў яго рукі кіраванне горадам. Жыгімонт Карыбутавіч на вачах пражан прыняў прысягу па гусіцкаму абраду і абвясціў сябе чэшскім каралём. Вітаўт паспяшаўся адмежавацца ад свайго падданага і залічыць яго ў ворагі. Ці так было на самой справе? Можна здагадвацца, што з'яўленне Жыгімонта Карыбутавіча ў Чэхіі ўсё ж не абышлося без Вітаўтавай на тое згоды. Ён ігнаруе ўсе імператарскія і папскія просьбы стаць абаронцам рымскай царквы ад ерэтыкоў, а дакладней, зброяй расправіцца з гусітамі, не падтрымлівае немцаў у крыжовых паходах на Чэхію. А Жыгімонт Карыбутавіч у лістах да Вітаўта просіць у вялікага князя абароны ад Ягайлавых інтрыг і ўпрошвае не забываць свайго «вернага слугу», які жадае быць яму дагодлівым. Ясна, што «верны слуга» дзейнічаў па загаду свайго ўладара.

Жыгімонту Карыбутавічу ўдалося замірыць паміж сабою гусітаў — табарытаў і чашнікаў. Славуты важар Ян Жыжка прыехаў у Прагу, дзе быў сустрэты князем. Пасля смерці Жыжкі Карыбутавіч узначаліў войска гусітаў і пад Аўсігам на Эльбе ў 1426 годзе разбіў імператарскае войска. Аднак чашнікі шукалі згоды з імператарам, а табарыты засталіся непрымірымымі да яго. «Чэшскі кароль» прыняў бок чашнікаў. Карыбутавіч прасіў Ягайлу і Вітаўта стаць пасрэднікамі ў прымірэнні гусітаў з імператарам. Ягоная перапіска з польскім каралём і вялікім князем трапіла ў рукі простых пражан, якія падтрымлівалі табарытаў. Успыхнула паўстанне, і Жыгімонта Карыбутавіча зняволілі. Чатыры месяцы прасядзеў ён пад вартаю ў замку Вальдштэйн, а пасля яго выправадзілі з Чэхіі. Шляхі Вітаўта і чэхаў разышліся. Вітаўт дапамог чэхам выстаяць супраць імперыі, а яны сваёй крывёю адстаялі права вялікага князя Літоўскага на Жамойць.

Вось тут і адбылася для яго прыемная і непрыемная адначасова падзея.

31 лістапада 1424 года каралева Софія нарадзіла Ягайлу сына, якога назвалі Уладзіславам. З'явіўся законны спадкаемец велікакняжацкай кароны. Плён працы Вітаўта цяпер павінен дастацца Ягайлаваму сыну. Вітаўт, спаслаўшыся на непрыязныя адносіны з каралеўскімі саноўнікамі, не паехаў на хрэсьбіны пляменніка, а паслаў ад сябе срэбную калыску.

Як бы лёс не склаўся, аднак трэба кіраваць дзяржаваю. Пачасціліся напады варожых Вялікаму княству татараў. Вітаўт скардзіўся на татарскія набегі папу — пэўна, каб пераканаць, што яму вельмі дастаецца ад «няверных» і таму на гусітаў, як той патрабаваў, ён не можа выступіць. У 1425 годзе татары напалі на падуладныя Вялікаму княству разанскія землі. Вітаўт паслаў супраць іх войска. Ніканаўскі летапіс дае нам пералік важароў, якія ўдзельнічалі ў гэтым паходзе: «Послал князя Андрея Михайловича ратью и князя Андрея Всеволодовича, и князя Ивана, нарицаемого Бабу, и брата яго Путяту, Дрюцких князей, и князя Дмитрия Всеволодовича и Григория Протасьевича, воеводу Мчекского»[214]. У сваім лісце да ордэнскага магістра Вітаўт паведамляў: «Паважаны і ўлюбёны наш магістр! Мы не сумняваемся, што Вы як наш дарагі сябар з задавальненнем пачуеце, што нас абрадавала і ашчаслівіла. Таму мы Вам паведамляем, што татарская дзяржава раздвоена і падзелена, так што цяпер там шэсць уладароў, якія змагаюцца за ўладу ў розных месцах, бо іх землі вялікія і неабсяжныя. І вось здарылася, што адзін хан па імені Кудандах напаў на зямлю адоеўскага князя, а гэты князь падначалены маскоўскаму вялікаму князю, і хан тры тыдні прабыў у Адоеўскай зямлі, а адтуль рушыў да нашых межаў, дзе прастаяў восем дзён, і, убачыўшы, што нічога не можа зрабіць, адправіўся ў зямлю разанскіх князёў, якія падначалены нам. І тады нашы князі, баяры і людзі, якія жывуць на мяжы, сабраліся і пайшлі за ханам. І дагнаўшы яго, біліся з ім у Разанскай зямлі і выйгралі бітву без вялікіх затрат. А паганых было шмат забіта і ўзята ў палон — знатных людзей улан, якія княжацкага роду, князёў, прыбліжаных і іншых людзей, так што сам хан ледзьве ўцёк з нямногімі слугамі. Але ягоныя жонкі і сёстры і жонкі іншых князёў былі або забіты, або ўзяты ў палон, бо яны былі адзеты ў мужчынскую вопратку. Гэтая падзея нас вельмі абрадавала, што міласцівы Бог дараваў нам і нашым людзям такое шчасце, што яны атрымалі такую выдатную перамогу, якой яшчэ ніколі не было, хаця і часта адбываліся бітвы»[215].

Яшчэ б не радавацца Вітаўту: пасля перамогі над татарамі Вялікае княства Літоўскае і Рускае стала мацнейшай дзяржавай ва Усходняй Еўропе. Залатой Ардзе было ўжо не па сілах весці барацьбу за рускія землі, і Вітаўт мог без перашкод падначаліць іх сваёй уладзе. І сапраўды, праз два гады «вернасць і паслушэнства» Вітаўту выкажуць разанскі, пераяслаўскі, пронскі, новасільскі, адоеўскі, варатынскі, а пазней кашынскі і цвярскі князі. А Масква?

27 лютага 1425 года памёр маскоўскі князь Васіль Дзмітрыевіч. Вялікі князь літоўскі па Васілёву запавету прызнаваўся апекуном яго дзевяцігадовага сына, таксама Васіля. Вітаўт, што робіць яму гонар, не скарыстаўся спрыяльнымі для сябе абставінамі і не захапіў княства ўнука, але затое паспрабаваў падначаліць Пскоў. Ён звярнуўся па дапамогу да ордэнскага магістра, і, мяркуючы па тым, што ў пскоўскіх летапісах у складзе войска Вялікага княства названы і немцы, Ордэн падтрымаў яго. Папоўніў свае шэрагі Вітаўт і татарамі.

Ягайла, які хацеў пераключыць увагу Вітаўта ад барацьбы з ім на войны з суседзямі, падбухторваў князя ісці на Пскоў і абяцаў даць яму войска. У жніўні 1426 года Вітаўт рушыў на пскоўскія землі і падступіў да горада Апочкі. Месцічы, даведаўшыся пра небяспеку, падрыхтаваліся да бою. У рове перад гарадской брамай яны паўбівалі паляў, а перакідны мост не паднялі. Самі ж пахаваліся за гарадскія сцены. Калі Вітаўт падышоў да горада, нікога не ўбачыў на сценах і вырашыў, што жыхары ад жаху разбегліся. Ён паслаў наперад татарскі загон. Як толькі татары ўступілі на мост, месцічы перарэзалі канаты. Мост паляцеў у роў, амаль усе татары загінулі, напароўшыся на палі. Вітаўт адступіў ад Апочкі і абклаў Варончу. Тры тыдні стаяла тут Вітаўтава раць, болей спадзеючыся ўзяць горад аблогаю, чым зброяй. Пскавічы паслалі біць чалом Вітаўту, каб замірыцца з ім. Князь не прыняў пскоўскага чалабіцця і працягваў вайну. У адну з начэй разыгралася навальніца. Як у дні патопу, лінуў дождж, ударылі пяруны, паласавалі неба маланкі. Паводле летапісу, пярун быў настолькі моцны, што трэслася зямля. Напалоханы Вітаўт, ухапіўшыся за шатровы слуп, крычаў: «Божа, памілуй!»[216]. Калі скончылася навальніца, Вітаўт, паддаўшыся прымхліваму жаху сваіх вояў, зняў аблогу з Варончы. Даведаўшыся, што пскавічы выставілі супраць яго раць, ён паслаў на іх сямітысячны атрад. І хаця пскоўскія летапісы пішуць што «пскавічы пабілі літоўскай раці шмат»[217], панеслі адчувальныя страты і яны. Гараджане ізноў паслалі да Вітаўта чалабітную. Той, узяўшы са Пскова выкуп у 1000 рублёў, заключыў са пскавічамі мір. Так без асаблівага трыумфу закончылася гэта вайна.

У 1427 годзе Вітаўт, як ніколі, рашуча дамагаецца каралеўскай кароны. На тое былі прычыны. Год таму Софія нарадзіла Ягайлу яшчэ аднаго сына — Казіміра, але ён памёр немаўлём. І вось цяпер яна ізноў ашчаслівіла мужа сынам, названым таксама Казімірам. Вітаўт вырашыў адхіліць Ягайлавых сыноў ад права наследаваць велікакняжацкую карону. Сярод каралеўскіх

набліжаных папаўзлі пагалоскі, што Софія нарадзіла дзіця не ад мужа, а ад сваіх палюбоўнікаў, нават называліся іх імёны. «Каралева польская Софія з некаторымі рыцарамі польскімі патаемна мела залёты»[218].

І знаходзіліся такія, хто верыў: занадта здавалася не верагодным, каб амаль васьмідзесяцігадовы Ягайла мог стаць бацькам. Дайшлі чуткі і да караля.

Уражвае тое, што ён паверыў намове і таксама засумняваўся ў вернасці сваёй жонкі. Як не бажылася Софія, але Ягайла не даваў ёй веры. Пачалося дазнанне. Многіх маладых рыцараў, западозраных у сувязях з каралевай, як злодзеяў, катавалі ў лёхах. Праявіў дзейнасць і Вітаўт. Ён кінуў у вязніцу бліжэйшае жаночае акружэнне каралевы і жорсткімі адносінамі дамагаўся патрэбнага для сябе прызнання. Каля года дакапваліся да ісціны каты. Няшчасныя ахвяры Вітаўтавай авантуры адмаўлялі сваю віну. Так і не атрымаў князь жаданых для яго доказаў Сафіінай нявернасці. На сойме ў Гародле Софія прынесла клятву ў сваёй невінаватасці. Ягайла замірыўся з жонкаю. Авантура правалілася.

У наступным годзе, летам, Вітаўт наведаў Разанскую зямлю. Пра гэтую паездку ён пісаў магістру: «Нас сустрэлі вялікія герцагі з рускіх земляў, якія тут называюцца вялікімі князямі, разанскі, пераяслаўскі, пронскі, новасільскі, адоеўскі, варатынскі... і абяцалі нам вернасць і паслушэнства... Прымалі нас усюды з вялікай пашанай і дарылі золата, срэбра, коней, шаблі. Па дарозе назад мы думалі наведаць нашу дачку — вялікую княгіню Маскоўскую па яе просьбе, што можна было зрабіць за тры дні; але мы затрымаліся, і нам трэба было яшчэ шмат ехаць, дык мы гэтага не зрабілі. Як мы вам паведамлялі, наша дачка, вялікая княгіня Маскоўская, сама нядаўна наведала нас і разам са сваім сынам, землямі і людзьмі аддалася пад нашу карону»[219]. Вось узор аднаго пагаднення: «Гаспадару майму вялікаму князю Вітаўту я, князь вялікі Іван Фёдаравіч разанскі, біў чалом і паддаўся яму на службу, і мяне ён прыняў. Абавязуюся служыць яму верна і без хітрасці супраць усіх непрыяцеляў. З кім ён у міры, з тым і я павінен быць у міры. Вітаўт павінен абараняць мяне супраць усіх, а без яго волі ні з кім не буду заключаць дамову і не дапамагу. Калі Вітаўт загадае мне даваць дапамогу вялікаму князю Васілю Васільевічу, свайму ўнуку, тады я павінен яго паслухаць, суд жа і праўду з Васілём Васільевічам абавязаны мець па старому звычаю. Калі ў Вітаўта адбудзецца звадка з Васілём Васільевічам, або яго дзядзькамі, або братамі, тады я павінен дапамагаць Вітаўту як майму гаспадару...»[220]. Падобную васальную дамову заключыў з «гаспадаром» сваім і цвярскі князь Барыс Аляксандравіч «быці мы



Вышыўка на сакасе мітрапаліта Фоція. Софія Вітаўтаўна. *XV ст.*

з ім заадзін, пры яго баку, і дапамагаць яму на ўсякага»[221]. Васальную прысягу Вітаўту таксама прынеслі князі Навасільскія, Адоеўскія і Варатынскія.

Вітаўт прадбачыў, што ягоная барацьба за карону немінуча прывядзе да адкрытай варожасці з Ягайлам і Польшчаю, а можа, нават і да вайны, і ўжо загадзя рыхтаваўся да яе. Заключаныя з рускімі княствамі дамовы забяспечвалі Вялікаму княству надзейны тыл. Тое, што Вітаўт рыхтаваўся да вайны, ясна вынікае з ліста ягонага блазна Гене, які быў крыжацкім шпігам. Той пісаў магістру, што да Вітаўта ў Менск прыехала шмат татараў з паўднёвых межаў княства. Па дарозе з Трок у Смаленск мясцовыя князі паставілі Вітаўту 2700 коней. Брат Жыгімонт даў яму 210 коней, Свідрыгайла — 90, адзін з ваяводаў (імя ў лісце не ўказана) — 150*. Ясна, дзеля чаго былі патрэбны Вітаўту столькі коней. У падарожжы па сваёй дзяржаве князь увесь час прымаў іншаземныя пасольствы «ад татарскага цара, ад турэцкага султана і ад многіх другіх хрысціянскіх і нехрысціянскіх князёў»[222]. Падобныя дыпламатычная і вайсковая падрыхтоўкі, як пакажуць далейшыя падзеі, была зусім незалішняя. Як толькі адносіны паміж Ягайлам і Вітаўтам абвастрыліся «і нянавісць так узрасла, што справа павінна была вырашыцца зброяй і вялікім праліццём крыві»[223] (як прызнаваўся папскі легат), вялікі князь вельмі хутка здолеў мабілізаваць вайсковыя сілы Вялікага княства і тым самым прымусіў Ягайлу адмовіцца ад вайны.

Зусім нечакана для Вітаўта яму давялося выступіць на Ноўгарад. Наўгародцы на вечы назвалі яго здраднікам і п'яніцай. Гэтай абразы Вітаўт не дараваў, і ў лістападзе 1428 года павёў сваё войска. Паводле звестак Длугаша, ягонае войска складалася з чарнігаўцаў пад кіраўніцтвам Свідрыгайлы, старадубцаў на чале з Жыгімонтам Кейстутавічам, мсціслаўскай харугвы Юрыя Лугвенавіча, слуцкай Алелькі Уладзіміравіча. Удзельнічалі ў паходзе полацкая і цвярская харугвы. Шырокіх вайсковых дзеяў Вітаўт не вёў — відаць, галоўнай мэтай было напалохаць наўгародцаў і вымусіць іх прызнаць сябе ягонымі васаламі. Спачатку літвінскае войска падышло да Вышгарадку і прастаяла там два дні, пасля Вітаўт пайшоў да Порахава. Тут ён вырашыў праверыць у баі велізарную гармату, названую ім Галкай. Пры першым стрэле гармату разарвала на кавалкі. Загінуў майстра і некалькі чалавек прыслугі. Ядро, праляцеўшы праз увесь горад, выбухнула перад полацкім намеснікам і забіла яго. Сам Вітаўт, які знаходзіўся паблізу ад «Галкі», вельмі

---

* Лануа пісаў, што Вітаўт асабіста валодаў 10 000 конямі (Kochanowski J. Witolg Wielki... S. 159).

напалохаўся. Нягледзячы на гэтую няўдачу, літвінскае войска працягвала аблогу. Гарадскі пасаднік Рыгор Кірыловіч са слязьмі на вачах прасіў князя зміласцівіцца над горадам, а наўгародцы паслалі да Вітаўта паклон. Князь прыняў чалабіцце наўгародцаў і, атрымаўшы ад іх выкуп у 6000 рублёў, заключыў мір па старыне. І не ўстрымаўся, каб не мовіць наўгародцам: «Вось вам за тое, што назвалі мяне здраднікам і бражнікам»[224].

СТРАЧАНАЯ НАДЗЕЯ

Канец 1428 года прайшоў у Вітаўта ў перапісцы з вялікім магістрам Русдорфам і імператарам Жыгімонтам І. Датычылася яна ў асноўным будучага з'езду ў Луцку, на якім павінна было вырашацца пытанне каранацыі. Зацікаўленым Вітаўтавым прыхільнікам выступіў магістр, што ўгаварыў імператара каранаваць князя. Безумоўна, не сяброўскія пачуцці кіравалі магістрам, а палітычны разлік: для Ордэна адзіным выратаваннем бачылася раз'яднанне Польшчы і Вялікага княства. Гэта было выгадна і Свяшчэннай Рымскай імперыі.

У пачатку 1429 года адбыўся доўгачаканы з'езд. У студзені ў Луцк сабраліся пасольствы ад Ордэна, Данii, візантыйскага імператара, папскі легат. Прыбыў з Масквы Вітаўтаў унук князь Васіль Васільевіч у суправаджэнні мітрапаліта Фоція, цвярскога і разанскага князёў. Прыбылі мазавецкі князь і малдаўскі гаспадар. Сярод шматмоўнага наплыву гасцей выдзяляліся сваім выглядам «няверныя» — татары перакопскага хана Аджы-Гірэя. У суправаджэнні польскіх вяльможаў, нібыта вязень пад пільнаю аховаю, з'явіўся Ягайла.

Каля 15 000 тысяч удзельнікаў з'езду сабралася ў Луцку, і ўсіх трэба было карміць, паіць. Вітаўт не сквапіўся, «выходзіла на іх штодня мёду сычанага сямсот дзежак, апроч мускатэля і він і мальвазіі і іншых розных напояў, а цялушак сямсот, бараноў і вепрукоў сямсот, зброю па шэсцьдзесят, ласёў па сто, апроч іншых звяроў і мясных вырабаў і хатніх прысмакаў»[225]. Штодня наладжвалі рыцарскія турніры і баляванні. Знешне спакойны вялікі князь з нецярпеннем чакаў Жыгімонта І. Імператар спазняўся. У абяцаны дзень 6 студзеня ён не прыехаў. І з кожным новым днём усё неспакойней рабілася на душы ў Вітаўта.

Любая выпадковасць магла перашкодзіць, а значыць, ізноў не збудзецца запаветная мара пра каралеўскую карону. Ягайла не ведаў, што на з'ездзе зойдзе гаворка пра Вітаўтаву каранацыю. Як ён успрыме гэтае паведамленне? Можна здагадацца — не згодзіцца, палякі не дазволяць.



Замак у Луцку. *Канец. XIX ст.*



А. Дзюрэр. Жыгімонт Люксембургскі. *XV ст.*

Нарэшце 22 студзеня разам са сваёй жонкаю Барбараю прыехаў і Жыгімонт I. Пры ўездзе ў горад яго сустрэлі ўсе госці: каталіцкае, праваслаўнае, армянскае і яўрэйскае святарства. Як і належыць каталіцкаму манарху, імператар ушанаваў толькі каталіцкага біскупа, не падышоўшы да «схізматыкаў» і «няверных». Зноў пачаліся шыкоўныя баляванні. Госці славілі шчодрасць гаспадара. Калі было выпіта нямала і прагучалі здравіцы венцаносным асобам, прыступілі да перамоваў. Першым пытаннем разгледзелі прапанаваны Жыгімонтам I падзел Малдавіі ў пакаранне яе гаспадара Аляксандра, які не хацеў ваяваць з туркамі. Паколькі Аляксандр быў васалам Польшчы, імператарская прапанова не сустрэла падтрымкі Ягайлы. Ішла гаворка і пра царкоўны сабор для аб'яднаных цэркваў, прычым з імператарскіх вуснаў прагучалі даволі ерэтычныя словы: «Не павінны мы адхіляць злучэнне з грэкамі, таму што яны спавядаюць адну з намі веру, адрозніваючыся ад нас толькі бародамі, ды тым, што святары ў іх жанатыя. Але ў гэтым не трэба іх дакараць, таму што грэчаскія святары задаволены адною жонкаю, а лацінскія трымаюць іх па дзесяць і болей»[226]. Гэтыя словы вельмі не спадабаліся польскім святарам. Не прынялі палякі таксама імператарскай прапановы дапамагчы Візантыі супраць туркаў.

А Вітаўт чакаў галоўнага для яго пытання пра каранацыю. Жыгімонт шчыра здзіўляўся чаму Вітаўт васал. Яго слава пашырылася па ўсёй Еўропе. Дзяржава яго вялікая, дык чаму ён не бярэ кароны? Чаму не хоча быць каралём, калі такі магутны? Магутны, але ў яго дамова з польскім каралём і без таго згоды нельга каранавацца. Тады Жыгімонт асабіста павёў перамовы з Ягайлам. Казаў, што Вітаўт чалавек знакаміты і годны быць каралём, а гэта прынясе карысць Літве. «Прызнаю яго за годнага не толькі каралеўскай, але нават і цэзарскай кароны і гатовы саступіць яму каралеўства Польскае і аддаць карону. Аднак нельга мне даць згоду на такую важную справу без згоды прэлатаў і маіх паноў», — адказаў Ягайла[227]. Вітаўт выступіў перад імі з наступнымі словамі: «Жыгімонт-цэзар мае намер Вялікае княства Літоўскае на каралеўства, а мяне на караля паднесці. Прасіў ён, каб і кароль Уладзіслаў не быў далёкім ад прызвалення і каб сваёй каралеўскай абаронай зазначыў годнасць кароны, на што, аднак, вашай згоды хоча. Зрабіце гэта дабрадзейства для дому Гедымінавага і народа літвінскага і галасамі сваімі пацвердзіце згоду.

Такім учынкам мяне і народ мой літвінскі з Русі і Жамойці наймоцным вузлом на вякі з сабою і каронай польскай злучыце супраць прыкрых нястач у кожным часе і ўсялякіх войнаў з непрыяцелем вашым». У адказ гаварыў прамову Збігнеў

Аляснiцкi. Ён абурана звярнуўся да прысутных: «Лiтва з падначаленымi яе ўладзе Русю i Жамойцю з Польшчай злучана ...якiм чынам з'явiлася думка, каб нахабна i непрызвычана гэта адмяніць?». Нагадаў i пра дапамогу палякаў Лiтве супраць Ордэна, а пасля заявiў Вiтаўту, каб не марыў стаць каралём: «Забудзь пра гэтую думку, найсвятлейшы князь». Аднак усё ж пастараўся i ўлагодзiць яго: «А калi так дарага табе карона на сваёй галаве, дык хочаш, аддадзiм табе i каралеўства сваё i карону»[228].

Польскiя саноўнiкi, задаволеныя адказам, падтрымалi кракаўскага бiскупа. Вiтаўт гняўлiва кiнуў, пакiдаючы сабранне: «Няхай так, а я ўсё ж зраблю па-свойму». Як толькi вялiкi князь выйшаў, палякi пачалi дакараць Ягайлу: «Ты нас за тым сюды паклiкаў, каб быць сведкамi аддзялення ад Польшчы такiх добрых уладанняў?»[229]. Ягайла са слязьмi на вачах пакляўся, што нiколi не даваў згоды Жыгiмонту i Вiтаўту на каранацыю i гатовы хоць цяпер ехаць з Луцка. У той жа дзень польскiя вяльможы адправiлiся ў Польшчу. Перад ад'ездам яны ўмалялi выправадзiць з Луцка iмператара, баючыся патаемнай дамовы таго з Вiтаўтам. Гэта ўжо было занадта. «Я не магу яго выгнаць, лепш хутчэй убяруся сам», — адказаў ён панам[230]. I ўслед за iмi ноччу Ягайла ўбраўся з Луцка. У пачатку лютага ад'ехаў ва Угорыю i Жыгiмонт, дамовiўшыся з Вiтаўтам пра новы з'езд у Вiльнi, дзе павiнна будзе адбыцца каранацыя. Усiх сваiх луцкiх гасцей вялiкi князь запрасiў у наступным годзе на каранацыю ў Вiльню. Суцяшаў сябе надзеяй здзяйснення мары, а не ведаў, што яна страчана.

АПОШНЯЕ СУЦЯШЭННЕ

Пасля Луцка ўсе намаганнi палякаў разам з Ягайлам былi накiраваны на адно — не даць Вiтаўту каранавацца. У лiсце да Жыгiмонта I Ягайла адмаўляўся ад сваёй згоды на каранацыю Вiтаўта. «Баюся, што памiж Польшчаю i Лiтвой могуць пачацца нязгоды, войны, спрэчкi i шмат прыкрасцяў, якiя цяжка будзе суняць. ...Паны i жыхары лiтвiнскiя, аслепленыя такiм гонарам (каронаю), могуць асмялець пасля смерцi нашага брата (якому карону i ўсялякага iншага гонару мы шчыра жадаем) — выбраць сабе новага караля па сваёй волi, без паразумення з польскiмi пасламi... Апроч таго наш брат трымае нашыя дзедзiчныя землi толькi да свайго жывата... з каранацыяй яны будуць страчаны для нас i кароны польскай»[231]. Iмператар прапанаваў Ягайлу назначыць новы з'езд, на якiм яшчэ раз абмеркаваць пытанне аб каранацыi. Пра Ягайлавы настрой

імператар паведаміў Вітаўту і прыслаў копію ягонага ліста. Вялікі князь, прачытаўшы, угневаўся на караля («нас вельмі прынізіў і на сорам выставіў, і нас за свайго нявольніка лічыць»[232]) і напісаў яму ліст: «Святлейшы гасудар і ўлюбёны брат! Калі святлейшы імператар, рымскі кароль, наш брат і сваяк, у прысутнасці Мікалая Сапінскага пачаў справу пра карону, аб якой, Бог сведка, мы раней нічога не ведалі і не думалі, а ніводнага слова не прамовілі (не трэба забывацца, што гэта піша палітык. — *В.Ч.*), і калі ён на гэтым настойваў, мы адказалі яму так: «Гасудар, мы ніколі не думалі пра такую важную справу; апроч таго, мы з каралём польскім заўсёды раіліся і нічога не робім без рады адзін з адным». Але, паколькі імператар мовіў, што хоча пра гэта размаўляць з Вашаю светласцю, мы адказалі, што гэта ўсё ў ягонай волі, мы ж пра гэта нічога не думаем. Раніцай наступнага дня, калі мы, як звычайна, ішлі да Вашай светласці, нас сустрэў імператар з жонкаю і мовіў, што размаўляў ужо з Вамі пра гэтую справу і атрымаў Вашу згоду і пасля запрасіў разам са сваёй жонкаю ўвайсці да Вас. Калі ж мы прыйшлі да Вас у пакой, імператар пачаў размаўляць з Вашаю светласцю пра ўчарашнюю справу, ваша светласць адразу выказала сваю згоду і задавальненне. Мы ж па-літвінску мовілі Вам: «Кароль, не спяшайцеся з гэтым, парайцеся спачатку з прэлатамі і баронамі — Вы з Вашымі, а я з нашымі». Вы ж радаваліся, што імператар і ягоная жонка Вас дзякавалі. А потым, калі мы сталі адыходзіць, да Вас уваходзілі на раду Вашы прэлаты і бароны. Мы ж сталі раіцца са сваімі, а пасля Вашы радцы запрасілі нас да сябе. Калі мы да іх увайшлі, яны пачалі нас сур'ёзна дакараць і настойліва адгаворваць; убачыўшы гэта нашы князі і бароны пачалі спрачацца з Вашымі рыцарамі, мы ж загадалі ім маўчаць. Нарэшце, пакінуўшы іх, мы прыйшлі да Вас, распавялі, як радцы Вашы супраціўляліся гэтай справе, і дзякавалі Вас за згоду, хаця ніколі не думалі гэту справу рабіць. Ізноў пры ад'ездзе Вашым з Луцка мы выказалі адзін аднаму задавальненне па гэтай справе, і Вы, як і раней, аднесліся да яе з жывейшай добразычлівасцю. Але днямі імператар прыслаў нам копію Вашага паслання да яго. Гэтую копію мы загадалі прачытаць у нашай радзе ў прысутнасці віленскага біскупа, галоўных нашых радцаў і многіх іншых баяр. З гэтай копіі бачым, як Вы прыніжаеце нас, нашу дзяржаву і нашых вяльможаў, якія гэтым вельмі пакрыўджаны. Вы пішаце, што ў выпадку нашай каранацыі нашы баяры, заганарыўшыся, маглі б пасля нашай смерці выбраць сабе гасудара па асабістаму разуменню, не параіўшыся з баронамі Польшчы, што парушала б ранейшыя дамовы паміж Літвою і Польшчаю. Няхай Ваша

светласць добра падумае пра тое, ці правільна Вы параілі; замест таго, каб звяртацца з нейкімі заявамі да імператара, ці не лепш было б прама звярнуцца да нас і абмеркаваць гэтае пытанне на зборы нашых ды Вашых вяльможаў, не ганьбячы і не прыніжаючы нашых баяраў. Не варта выносіць у чужыя дзяржавы таго, што можна абмеркаваць паміж намі. Улюбёны брат, якія б не ўзнікалі паміж намі нязгоды, будзем іх вырашаць самі, але, калі на гэты раз Вы не хацелі ўчыніць па старому правілу, варта было б, зрэшты рэшт, паслаць больш вопытных паслоў і не весці справу так паспешліва. Што ж датычыцца імператара, дык гэтыя дамовы, што трактуюць пра агульнае выбранне літвінамі ды палякамі новага ўладара ў выпадку нашай або Вашай смерці, не служыць перашкодаю ў дадзеным выпадку: пакуль Вы жывы, няма патрэбы ў выбранні ўладара Вашымі баронамі, ды і пасля нашай смерці можна абысціся без гэтага, бо мы ўжо выбраны вялікім князем і маем цвёрдую ўладу над нашаю дзяржаваю і, калі б жадалі, дык маглі б і канчаткова яе аддзяліць — не здаецца нам, каб тыя, якія Вам параілі, здолелі нам у гэтым перашкодзіць. Здзіўляемся, што Вы раней казалі і пісалі нам, што любіце нас, як сябе, моліцеся за нас, як за сябе, жадаеце нам доўгага жыцця і г.д., а цяпер не жадаеце нават звярнуцца да нас па важнай справе, а пішаце імператару, зневажаеце нашых баронаў, не лічыце іх роўнымі з польскімі і прыніжаеце нас перад імператарам, сцвярджаючы, што мы атрымалі некаторыя землі ў пажыццёвае карыстанне, пра што мы маглі б паразмаўляць з Вамі і прыйсці да правільных высноў»[233]. І Вітаўт адкрыта заявіў, што калі кароль і палякі захочуць перашкодзіць яму ў яго намерах, дык ён вымушаны будзе вырашыць сваю справу зброяй.

Затоеная нянавісць паміж абодвума ўладарамі магла вырваць вонкі, а далей і да зброі справа дойдзе. Яны гэта прадчувалі і загадзя рыхтавалі зброю да вайны. Ягайла патаемна зносіўся з гусітамі і крыжакамі. Даведаўшыся пра гэта, Вітаўт узяў прысягу з князёў, паноў і шляхты на вернасць яму і гэтым вызваліў іх ад клятвы Ягайлу. У апраўданне Вітаўт прыслаў грамату да польскіх паноў, якой даваў ім зразумець, што ў будучай вайне вінаваты Ягайла. «Калі кароль толькі ад'ехаў з Луцка, дык пачаў прыніжаць нас перад каралём Жыгімонтам, калі і да сталіцы апостальскай паслаў супраць нас шмат зняважлівых артыкулаў і перад усім светам зняважыў. Таму мы пачалі думаць якім чынам пазбавіцца крыўднага прыніжэння і стасункаў нявольніцтва, з дапамогай якога кароль мяне і зямлю маю прыціскае, якая дагэтуль ніколі не была нявольнай. З гэтай нагоды патрабавалі ад караля, каб пажадаў агласіць аб нашай вольнасці. І хоць у гэтай справе шмат трактавалі з ка-



Збігнеў Аляснiцкі. *1447 г.*

ралём, як праз лісты, гэтак і праз пасольствы, аднак і дагэтуль я не атрымаў ніякага станоўчага адказу». Вітаўт папярэджваў, што «тады толькі падыме зброю, калі б вы або кароль ваш пачалі б вайну, бо на той час належыла б нам абараняцца і адбіваць напад»[234].

Ягайла яшчэ раз пераканаўся ў цвёрдых намерах Вітаўта каранавацца. Дзеля гэтага князь можа абысціся і без ягонай згоды і праігнараваць Віленскую і Гарадзельскую дамовы. Вітаўта ў ягоным намеры падтрымліваюць князі і баяры, і яны жадаюць «скінуць з сябе сорам і закід няволі, якімі хоча абмежаваць нас і землі нашы кароль польскі»[235]. Ізноў літвіны заяўляюць, што «яны спрадвеку былі свабоднымі людзьмі, сваім гасударом паважаюць вялікага князя і яго маюць сваім гасударом, а палякам ніякім іх зямля не належала, і яны пры сваёй незалежнасці могуць застацца і надалей і ніколі нічога з яе не саступяць»[236].

Адгаварыць Вітаўта ад ягонага намеру прыехаў 16 красавіка ў Гародню Збігнеў Аляснікі. «Ведай, — казаў ён князю, — што каралеўская карона хутчэй прынізіць тваю веліч, чым узвысіць: паміж князямі ты першы, а паміж каралямі будзеш апошні; што за гонар у немаладыя гады ўпрыгожыць галаву невялікай колькасцю золата ды карункаў, а цэлыя народы асудзіць на жахі кровапралітнай вайны?» Вітаўт у які раз паказаў сябе хітрым палітыкам. «Ніколі ў мяне і ў галаве не было намеру стаць незалежным каралём: даўно ўжо імператар пераконваў прыняць каралеўскі тытул, але я не згаджаўся, цяпер ужо сам кароль Уладзіслаў патрабаваў гэтага ад мяне: саступаючы ягоным упрошванням, падначальваючыся яго загаду, я пры людзях згадзіўся, пасля чаго ганебна было б для мяне выракацца свайго слова»[237].

Вось так: не ён, Вітаўт, жадае стаць каралём, а сам Ягайла гэтага патрабуе ад яго. У ліпені Вітаўтавы паслы маршалак Румбольд і княжацкі сакратар Мікалай Малдржык на сойме польскай шляхты ў Ленчыцах заявілі: «Вялікі князь літоўскі даручыў мовіць, што вырашыў прыняць і мець карону, незалежна ад таго, у дагоду гэта вашай каралеўскай мосці або не»[238]. Перад ад'ездам паслоў Ягайла зноў прыняў іх і кляўся, што любіць Вітаўта, як і раней, і просіць Бога ў штодзённых малітвах аб здароўі і шчасці князя, якому болей гэтага зычыць, чым самому сабе. І шчыра запэўніваў: «Брат мой можа ўчыніць тое, што яму падабаецца, а з майго боку зычу яму поспеху і дабра. Варта яму пра свой намер пагадзіцца з маёй радай, паводле даўнейшых нашых запісаў і ўвогуле чыніў бы так, каб яму тое выйшла на дабро і не прыніжала яго годнасці. Брат мой ёсць вольны, як і я, і за брата майго найдаражэйшага яго

ўважаем; княжат і паноў літвінскіх уважаем за вольных роўна, як і паноў каронных»[239]. Нібыта Ягайла шчыра спрыяў брату. Толькі Вітаўт не верыў яму. У лісце да імператара ён выкрыў двурушнасць Ягайлы: «Сапраўды, мой брат кароль польскі часта чыніў мне гадасці і крыўды, сапраўды не аказваў ён ніколі належных майму становішчу гонару і пашаны, аднак я заўсёды цярпліва без наракання тое зносіў, не жадаючы паміж сабой і братам і каралеўствам яго сеяць зерне нязгоды і непаразумення. І нават ніколі не скардзіўся Вашай міласці ў тых справах малой вагі. Не толькі мне кароль Ягайла нанёс абразу, але і княжатам і баярам маіх зямель, як бы з намерам накідвае на іх ярмо няволі і робіць іх даннікамі сваёй кароны, што вельмі блізка сабе яны на сэрца ўзялі, як людзі вольныя, якія ніколі не былі галдоўнікамі»[240]. Іначай, чым паслам, казаў Ягайла пра Вітаўта польскім сенатарам: «Да таго дайшло, што апроч вымаўленых горкіх пагроз, кінутых мне ў вочы, якога паднёс на бацькоўскі пасад, які дзякуючы мне валодае ўсім, што мае, дык славу дому майго і дзяцей зняважыў князь, калі хоча адабраць назаўсёды ад іх Літву»[241]. Вось яно што! Ягайлу больш хваляваў не лёс Літвы, а правы сваіх дзяцей на яе. Калі б Літва стала каралеўствам, то яны пазбавіліся б іх. Баяліся страціць Літву і палякі. Таму словы Ягайлы падлілі алею ў агонь.

На Вавелі панаваў адчай. Як перашкодзіць Вітаўту разарваць унію? І палякі ідуць на новую авантуру. Што ж, калі князь так хоча надзець на сваё чало каралеўскую карону, хай будзе так, але гэта павінна быць карона польскага караля. Такім чынам захаваецца унія. Польскім вяльможам удалося ўгаварыць Ягайлу адмовіцца ад сваёй кароны на карысць Вітаўта. Зноў адправілася на Літву польскае пасольства на чале са Збігневам Аляснiцкім. Здзівіўся Вітаўт, калі пачуў ад палякаў, што Ягайла саступае яму польскую карону. Ды зразумеў ён, што пасля яго, Вітаўтавай, смерці ў Вялікім княстве сядзе Ягайлаў сын і не быць Вялікаму княству каралеўствам. Разумелі гэта добра і паплечнікі вялікага князя і не маглі згадзіцца на падобны падарунак: Вітаўт адказаў, што будзе нягоднікам, адняўшы ў брата карону. Каб заспакоіць палякаў, паабяцаў, што сам не стане дамагацца каралеўскай кароны, але калі яе прышлюць, дык не адмовіцца каранавацца.

Не суцешыў ён паслоў такім прызнаннем. Да таго ж на свае вочы яшчэ раз пераканаліся яны ў сардэчнай прыхільнасці імператара Жыгімонта I да Вітаўта. У тыя дні ў Ваўкавыск, дзе вялікі князь прымаў польскае пасольства, прыехаў імператарскі пасол рыцар Леанард і прывёз яму ордэн Цмока, уладальнікі якога складалі адно братэрства і павінны былі дапамагаць адзін аднаму. А гэта значыла, што імператар стры-

мае слова — прышле Вітаўту карону. Таму ў сакавіку 1430 года паспешліва быў скліканы сойм польскай шляхты ў мястэчку Едльне. Ягайла дамогся прызнання сына Уладзіслава нашчадкам польскай кароны і (у парушэнне Гарадзельскай уніі) велікакняжацкай кароны. За гэта ўдзячны кароль выдаў шляхце прывілей на права асабістай недатыкальнасці. Кароль без суда не мог звязеніць шляхціца, апроч злодзея, злоўленага на месцы злачынства.

Пастанова Едльненскага сойму раззлавала Вітаўта. Яшчэ больш раззлаваўся ён, калі даведаўся пра пасольства Ягайлы да імператара. Паслы прасілі Жыгімонта не каранаваць Вітаўта. Апраўданнем Ягайлы, што інструкцыю для паслоў напісаў без яго ведама падканцлер, ён не верыў. Хіба мог падканцлер рабіць іначай, чым яму наказаў кароль, а калі зрабіў, дык чаму не пакараны? Ясна, што інструкцыя была напісана па волі караля. Не дасць ён ператварыць Літву ў каралеўства, каб яго дзеці не страцілі на яе правы. Не тое, што крыўдна. Атрымліваецца так, што ўсё жыццё, усе яго дзеянні не дзеля Айчыны, а дзеля Ягайлы. 15 сакавіка ён піша магістру, што мае намер выступіць супраць саюзу Ягайлы і шляхты і абавязкова жадае каранавацца. Са свайго боку магістр абяцаў не зносіцца з Ягайлам без Вітаўтавай згоды.

Далейшы крок палякаў — даказаць незаконнасць Вітаўтавай каранацыі. У красавіку на Нюрнбергскім з'ездзе нямецкіх феадалаў выступіў польскі пасол і зачытаў апеляцыю для папы рымскага. У апеляцыі пісалася, што Ягайла назначыў Вітаўта вялікім князем як свайго намесніка ў Вялікім княстве, і то пажыццёва; літвінскія вяльможы абяцалі быць вернымі Ягайлу і пасля смерці Вітаўта прызнаць яго вялікім князем; цяпер настойваюць перад імператарам Жыгімонтам I, каб Літва стала каралеўствам, а Вітаўт каралём. Палякі даводзілі папу Марціну, што, калі Літва адасобіцца ад Польшчы, каталіцызму там пагражае небяспека, бо запануе «грэчаская вера».

Напужаны такім довадам папа забараніў імператару слаць карону, а Вітаўту прымаць яе. Пазней, 13 лістапада папа выдаў булу. Ён папярэджваў Вітаўта, што калі дойдзе «да стварэння такога каралеўства і тваёй каранацыі», то гэта прывядзе да вайны, спусташэння зямель «чаго ўсялякімі сродкамі належыць пазбягаць». І сярдэчна прасіў: «Каб не зведала страты тваё добрае імя, якое ўсюды цешыцца найлепшай славай і каб твая душа не была абцяжарана такім вялікім грахом, каб пазбегнуў асуджэння на апошнім судзе, як спраўца тых усіх няшчасцяў, якія без сумнення наступілі б. Для гэтага, дарагі сын, у такой небяспечнай справе кіруй сваёй воляй і прыстань да нашага бацькоўскага напаміну і парады! Мы высока цэнім цябе з-за

тваіх незвычайных, вялікіх і асаблівых заслуг, якія паклаў на пашырэнне веры Хрыстовай; бацькоўскай міласцю любім тваю справядлівасць і цябе і ўважаем за вельмі годнага для шаноўнага становішча караля. Але хацелі б, каб твая асоба была аздоблена такімі пашанамі з мірам, без бунту, крыўды і нежадання з боку твайго брата»[242]. А брат, якраз і не жадаў каралеўскіх пашанаў Вітаўту.

Вялікі князь абвініў Ягайлу ў тым, што той нагаворвае на яго папу, і ўзяў клятву са сваіх князёў і баяраў служыць яму супраць караля і Польскага каралеўства. Збігнеў Аляснікі ў трэці раз адправіўся на Літву ў Гародню. Святар-інтрыган пачаў супакойваць Вітаўта: «Кароль Уладзіслаў не меў ніякага намеру пакрыўдзіць славы Вашай Велікакняжацкай мосці, з якім праз цэлае жыццё быў у згодзе і з'ядночанні і ўвогуле заўжды стараўся і стараецца пра ваша ўласнае дабро і павелічэнне славы. Але калі перад папам і каралём яго мосці каталіцкім чыніў заявы, дык быў на тое змушаны патрэбай: бо бачыў ушчэрбак сваім правам, як вынікае з той каранацыі. Тым больш, калі цэзар Жыгімонт падтрымлівае яе. Сталіца Апостальская мела больш права тым намерам пакласці канец». Дакараў Вітаўта тым, што ён узяў прысягу з літвінскай шляхты, не ўзгадаўшы ў ёй імя Ягайлы, а таксама ўмацаваў замкі. Пасля прама прапанаваў яму адмовіцца ад кароны да лепшага часу. Разгневаны Вітаўт не захацеў асабіста адказваць злахітраму біскупу. Адказ перадаў слуга: «Вялікі князь супраць панства і караля польскага не задумаў, ані з гэтай мэтай вымагаў прысягу ад сваіх, ці замкі ўзмацніў, каб па-непрыяцельску ўчыніць, але прадбачыў патрэбу ўласнай небяспекі, каб непрыяцелі знянацку не напалі на яго: тым больш, калі ўвачавідкі ўбачыў, што чэхі ерэтыкі налягалі на караля польскага і прасілі, каб ён прапусціў іх праз Польшчу да Прусіі і Літвы. Кароль супраць даўняга звычаю таіў перад вялікім князем свае зносіны з ерытыкамі»[243]. Абвінавачваў Ягайла, абвінавачваў Вітаўт і абодва хавалі сваю нянавісць.

Аб адносінах Ягайлы і Вітаўта ў гэты час папскі легат пісаў у Рым: «Пасля таго як у Луцку імператар абяцаў карону вялікаму князю, паміж князем літоўскім і польскім каралём пачаліся звадкі... абодва збіраюць сілы для барацьбы адзін з адным, і нянавісць так узрасла, што справа можа вырашыцца зброяй і вялікім праліццем крыві. Калі вялікі князь са шматлікімі ўсходнімі народамі, татарамі і рускімі, палякі са сваімі сіламі былі ўжо падрыхтаваны, ерэтыкі (табарыты. — *В.Ч.*) таксама падрыхтаваліся стаць на бок той партыі, якая прызнала б іх ерась»[244].

Вось як накаліліся адносіны паміж Вітаўтам і Ягайлам. У хвіліны роздуму Вітаўта адольвалі сумненні: а што калі і сап-

раўды з-за гэтай кароны ўспыхне вайна паміж Польшчаю і Вялікім княствам. У лісце да Жыгімонта I князь дзеліцца з імператарам сваімі трывогамі[245]. Імператар просіць яго не радумваць. Ужо зроблена карона і для яго, і для княгіні, гатова і пасольства, якое прывязе каралеўскі вянец. А папскую пагрозу няхай не бярэ блізка да сэрца: многія каралі пры каранаванні абыходзіліся без папскага бласлаўлення. Імператар пісаў: «А калі хтосьці хоча раіць супраць і адгаварываць вас ад каранацыі, якая толькі выйдзе на гонар і славу вашу, зямлі і падданых вашых. Калі б хто хацеў бы ў вас абудзіць якое сумненне ў справе гэтай каранацыі, просім мы вас гарачымі словамі, якія паходзяць з глыбіні сэрца нашага не давайце таму веры»[246]. Імператар прыслаў князю і праекты каранацыйнага акта і акта ўзвядзення Вялікага княства ў каралеўства. «Літоўскія каралі будуць самастойнымі і непадуладнымі або васаламі ані нашымі (імператара. — *В.Ч.*), ані святой імперыі, ані чыімі іншымі, служачы шчытом хрысціянства на гэтым памежжы — дапамагаючы супраць паганскіх нападаў»[247].

Прэч сумненні! 17 жніўня Вітаўт піша магістру, што мае цвёрды намер стаць каралём і запрашае яго на каранацыю. «Калі ж палякі не дазволяць нашай каранацыі і нас, і наш край няволіць будуць, тым хутчэй вымушаны будзем уздзець на чало нашу карону»[248]. Не пахіснулі Вітаўта і ўпрошванні польскіх паслоў, якія на каленях прасілі яго адкласці каранацыю і яшчэ раз параіцца з Ягайлам. У верасні да Вітаўта прыехалі імператарскія паслы Баптыст Цыгаль ды Жыгімонт Рот. Яны заявілі, што каралеўскую карону прывязуць да 8 верасня.

Набліжаўся доўгачаканы дзень. У Вільню сабраліся запрошаныя госці: вялікі князь маскоўскі Васіль Васільевіч разам з мітрапалітам Фоціем, князі цвярскі, разанскі, адоеўскі, мазавецкі, перакопскі хан, валашскі гаспадар, паслы візантыйскага імператара, лівонскі магістр. Затрымліваўся вялікі магістр — ён баяўся нападу палякаў на Прусію. Польскія атрады стаялі на прускіх межах, каб перахапіць імператарскіх паслоў. Устрывожаны Вітаўт падзяліўся сваёй трывогай з палякамі, якія прыехалі на каранацыю: «Баюся, што войска велікапольскае гатуе мне ганьбу і пазбавіць мяне маёй годнасці». Палякі ўпэўнівалі Вітаўта, што войска гэтае маленькае, а паслы маюць дастаткова супраць яго сіл. Вялікі князь скептычна заўважыў: «Хоць бы палякі мелі сілы роўныя сілам паслоў, чаго найменей не дапускаем, але яны адважнейшыя і гатовы іх сэрцы на смерць і не завагаюцца біцца з вялікімі сіламі»[249]. Не, гэта не было прызнанне адвагі палякаў, Вітаўт разумеў, што яны хутчэй загінуць, чым дапусцяць яго каранацыю. І ён не памыліўся. Палякі зняволілі Вітаўтавага пасла, сакратара Барталамея і імпе-

ратарскага пасла Баптыста Цыгаля і з папер, якія тыя везлі імператару, пераканаліся, што Жыгімонт I адпраўляе да вялікага князя пасольства з каронаю. Даведаўшыся пра польскія заставы, імператарскія паслы не рашыліся ехаць праз Польшчу і вярнуліся ў Вену.

У прызначаны дзень карону ў Вільню не прывезлі. Вітаўт пераносіць каранацыю на 29 верасня. А 21 верасня староста Новай Мархіі напісаў магістру ў Вільню, што колькасць польскіх атрадаў на межах з імперыяй і Прусіяй павялічылася, палякі адкрыта заяўляюць аб намеры не прапусціць праз Польшчу імператарскае пасольства і пагражаюць вайною тым, хто дапаможа паслам. У Рыме палякі ізноў прасілі папу забараніць каранацыю Вітаўта. Не прыехалі паслы Жыгімонта I і 29 верасня. Госці, што сабраліся на каранацыю, пачалі раз'язджацца з Вільні.

У лісце Вітаўта да Жыгімонта I, які ён паслаў 13 кастрычніка, адчуваецца крыўда: «...запрасіў шаноўных гасцей на ўрачыстасць, а ты перашкаджаеш мне, кароны як няма, так і няма... прыслаў бы яе патаемна, і я пазбег бы прыніжэнняў і сораму, і вялікіх выдаткаў...»[250] Вітаўт упаў духам. На схіле жыцця кожны дзень як ніколі патрэбны — проста можна не дажыць да здзяйснення сваёй мары. А пра блізкую смерць князь думаў. 21 кастрычніка ён склаў запавет, у якім прасіў пахаваць сябе ў Віленскім касцёле святога Міхала «побач з нагробкам памершай жонкі нашай, дзе і для сябе дамавіну выбраў»[251]. Аднак Вітаўт адчуваў яшчэ сілы і гатоў быў дамагацца каралеўскай кароны. Ён запрасіў Ягайлу ў Вільню.

Яшчэ спадзяваўся пераламаць мяккадушнага караля і вырваць у яго згоду на каранацыю. 9 кастрычніка Ягайла ў акружэнні світы і саноўнікаў, якімі верхаводзіў Збігнеў Аляснiцкі, прыехаў у сталіцу Вялікага княства. На Вітаўтаву просьбу не перашкаджаць каранацыі Ягайла адказаў, што ўсе рашэнні ён прымае са згоды паноў і Аляснiцкага і перш за ўсё трэба заручыцца іхняй падтрымкай. Вітаўт абяцаў Аляснiцкаму горы золата і срэбра. «...Абдару такімі знатнымі падарункамі, якімі нікога перад табой у гэтым палацы не абдарваў». Кракаўскі біскуп быў непахісны: «Дзеля чаго князь Вітальд хоча каранавацца, бо для яго і для земляў Літвы будзе вечная зняслава, а не слава, вечная бітва, а не пакой, вечная кроў, а не радасць, вечнае выпрабаванне, а не сіла»[252], адказваў ён. Угневаны Вітаўт абяцаў патраціць усё гэта золата, каб пазбавіць Збігнева Аляснiцкага ягонага біскупства.

Толькі палякі прыехалі да Вітаўта не гнявіць яго, а самога падкупіць. Ізноў падсоўвалі яму польскую карону, якую гатовы былі сарваць з Ягайлавай галавы. Прычым сам жа Ягайла і

прапанаваў яе, але з умоваю, каб яна пасля перайшла да ягонага сына. Непатрэбна Вітаўту такая ласка. Вітаўт адказаў: «Узяць карону польскую сабе, якая належыць майму брату, гэта справа абразлівая і няслушная. Было б гэта, у маім разуменні, найвялікшай шкодай маёй славы, каб забраў карону з галавы брата пры яго жыцці і ўсклаў на сваю галаву»[253]. У лісце да Жыгімонта І ён просіць прыслаць карону праз Прусію.

Навіна пра тое, што карону затрымалі ў Франкфурце, ударыла Вітаўту прама ў сэрца. І ён ужо не сцярпеў і ўзмаліўся да Ягайлы. «Не з-за ўлады шукаю я кароны, але ўвесь свет ведае пра мае пошукі яе і я не магу ж адмовіцца цяпер ад гэтага без вялікай для сябе ганьбы; таму зрабі мне гэтае суцяшэнне ў апошнія хвіліны майго жыцця». Ягайла маўчаў. «У такім выпадку, дай мне карону на тры дні, на дзень, на гадзіну, клянуся, што адразу ж яе складу»[254]. Ягайла па-ранейшаму маўчаў. Яго маўклівае вераломства было сапраўднай пакутай для Вітаўта, бо прыніжала яго гонар, знізводзіла ў нішто ўсё ім створанае. Аднак ужо ў наступным пасланні, даведаўшыся, што імператар гатоў падтрымаць зброяю сваё пасольства, князь адгаворвае імператара ад гэтага намеру і паведамляе, што перамовы з Ягайлам могуць прывесці да паразумення і карону можна будзе прыслаць праз Польшчу.

Толькі час ужо быў супраць Вітаўта. З кожным днём князь губляў сілы. 16 кастрычніка ён адправіўся з Ягайлам у Трокі. Як звычайна, ехаў вярхом на кані. Па дарозе ад кволасці ўпаў з сядла і сеў у карэту княгіні Ульяны. І на смяротным ложку Вітаўт марыў пра карону і са слязьмі прасіў у Ягайлы: «Слабы я, не маю надзеі выйсці з гэтай хваробы, але хацеў бы перад смерцю маю і маёй улюбёнай жонкі галовы ўвянчаць каралеўскімі каронамі, якія дагэтуль маглі заслужыць у караля, пана і брата майго найлепшага і ў дарагой айчыны маёй. Калі ж мяне смерць у гэтай балючай хваробе абміне, складу і вярну карону ў каралеўскую руку і да згону буду жыць у кляштарным спакоі і самотнасці»[255]. Гэты крык адчаю спакутаванага сэрца Ягайла не пачуў. А калі пачуў? Што ён мог вырашыць без згоды сенату і станаў? Амаль нічога. Хоць бы і мог, але не захацеў суцешыць паміраючага брата нават прывіднай надзеяй на карону.

Сенат адказаў Вітаўтавым паслам: «Вітаўт годны найпаважнейшых пасад, нават самой кароны, але без парушэння міру і гвалту прысягі раз дадзенай дамагчыся таго не здолее. Раім мы яму больш не жадаць яе, бо як і сам разумее, больш, апроч, ганьбы, агіды і вечнай няславы ў будучыні не можа атрымаць, а на Літву і Польшчу накліча страшэнныя паражэнні»[256]. Дзівіліся сенатары, што Вітаўт на згоне жыцця, без нашчадкаў дамагаецца кароны. І папярэдзілі, што ні просьбамі, ні лас-

камі, ні скарбам, ні пагрозамі, ні сілай не даможацца свайго. Хай лепш думае пра веру, чым пра карону. Адказ гучаў, як здзек. У Вітаўта не засталося ніякіх надзей. І нялёгка, балюча было ўсведамляць, што ён прайграў сваю галоўную бітву, прайграў часу. Ён, які звыкла паўтараў: «Страчвае заўжды той, хто чакае на час»[257], вось цяпер страціў яго для ажыццяўлення сваёй запаветнай мары. Гэта была драма яго жыцця.

А 27 кастрычніка Вітаўт на вачах Ягайлы, мітрапаліта Фоція, маскоўскага князя Васіля Васільевіча памёр, паручыўшы перад смерцю княства клопату польскага караля. Па іншых звестках, Вітаўт завяшчаў свой пасад Свідрыгайлу[258].

Вельмі падазроная гэтая нечаканая смерць. Тады ніякай экспертызы не было, і лекары не маглі ўстанавіць яе прычыну, так што можна было спаслацца на старасць. Але вось такія факты. 13 лістапада ў першым лісце да Жыгімонта І Вітаўт паведамляе, што ад жадання каранавацца не адступіцца, гэта значыць ён адчувае сябе здаровым. А ўжо праз тры дні ён настолькі аслабнуў, што не вытрымаў дарогі ў Трокі. Напярэдадні, 15 лістапада, у другім лісце да Жыгімонта І князь выказвае надзею на Ягайлаву згоду і просіць не слаць карону праз Прусію, бо яе можна будзе прывезці праз Польшчу. З чаго раптам сталі такімі згаворлівымі польскія вяльможы, чаму яны вырашылі не перашкаджаць Вітаўту каранавацца? Ці не таму, што вялікі князь быў ужо асуджаны на смерць і пра гэта ведалі тыя, хто асабліва супраціўляўся разрыву уніі з Вялікім княствам, — Збігнеў Аляснцкі і яго спадручнікі, якія ўжо не хвалявaліся і ад'ехалі ў Польшчу. Іх прысутнасць была лішняй, ведалі, што Вітаўт асуджаны на хуткую смерць. Час быў выйграны. Вітаўт памёр, так і не ажыццявіўшы сваёй галоўнай мары.

У апошнюю сваю гадзіну Вітаўт нарэшце паверыў ва ўваскрашэнне пасля смерці і прызнаўся віленскаму біскупу Мацею: «Раней, веручы ў іншыя догмы, гэтую лічыў я для веравання цяжкай. Але цяпер не толькі ўжо верай, але і розумам ахопліваю, што кожны чалавек уваскрэсне пасля смерці і за ўчынкі свае атрымае вартую плату»[259]. Гэтае прасвятленне было апошнім суцяшэннем Вітаўта.

«Веліч Літвы была ім створана і з ім згіне», — адзначыў вынік яго жыцця храніст Длугаш[260]. А наступным пакаленням уяўляўся ён слаўным і вялікім. «Немагчыма распавесці сілу і храбрасць яго»[261]. Таму і прызналі Вітаўта Вялікім.

Праз стагоддзі памяталі літвіны свайго «караля-багатыра» і верылі, што ў хвіліну нялёгкіх выпрабаванняў ён падымецца з магілы і дапаможа ім[262].

«...НА ВЯЛІКІМ КНЯСТВЕ РУСКІМ»





СВІДРЫГАЙЛА
(1370—1452)
Гравюра з «Хронікі Еўрапейскай Сарматыі» А. Гваньіні. ***1578 г.***

СВІДРЫГАЙЛА



му здавалася, што ён здольны на большае. Не мог аніяк прымірыцца са сваім становішчам удзельнага князя. Вабіў яго велікакняжацкі пасад. Паўставаў супраць Ягайлы ды Вітаўта, уцякаў да крыжакоў і з іх дапамогаю прагнуў дамагчыся свайго. Расчароўваўся, шукаў дапамогі ў венграў, у маскавітаў, татараў. У многіх краях давялося яму князяваць: у Крэве, у Віцебску, ва Усходнім Падоллі, у Старадубе, у Чарнігаве, Ноўгара-дзе-Северскім. І нідзе не пусціў ён каранёў. На доўгія гады трапіў ён у вязніцу, пакуль у 1418 годзе не вызвалілі яго князі Даніла Астрожскі ды Аляксандр Нос, бо бачылі ў ім пераемніка Вітаўта, чалавека, які здолеў бы ўзначаліць рух праваслаўных феадалаў супраць уніі з Польшчай. За гады княжання ў розных землях Свідрыгайла набыў нямала сяброў і паплечнікаў. З кім падзяляў яго палітычныя памкненні, каго падкупіў сваёй прыхільнасцю да праваслаўя, а каго — шчодрасцю і гасціннасцю. Нягледзячы на тое, што быў Свідрыгайла католікам (перайшоў у каталіцтва з праваслаўя, вядомыя яго граматы, якія ён падпісваў імем Аляксандр[1], у каталіцтве насіў імя Баляслаў), менавіта яго пасля Вітаўтавай смерці вылучылі праваслаўныя феадалы на велікакняжацкі пасад. Аднак польскія саноўнікі хацелі пакінуць велікакняжацкі пасад за Ягайлам, каб такім чынам Вялікае княства пазбавілася самастойнага валадара, або пасадзіць у Вільні свайго стаўленіка — Вітаўтавага брата Жыгімонта Кейстутавіча. Называліся таксама кандыдатуры Жыгімонта Карыбутавіча і слуцкага князя Алелькі Уладзіміравіча. Аднак большасць князёў і баяраў, што з'ехаліся на Вітаўтава пахаванне і воляю лёсу сталі ўдзельнікамі выбрання новага вялікага князя, жадалі бачыць сваім уладаром Свідрыгайлу. Перад іх рашучасцю не ўстаяў Ягайла. Таму кароль, шкадую-

чы брата, «які жыў у жабрацкім стане, кіданы рознымі бурамі», не пытаючыся рады ні каралеўства, ні вялікага княства паслаў да Свідрыгайлы свайго сакратара Яна Межыка з паведамленнем, што перадае яму велікакняжацкі вянец[2]. Ён не толькі прызнаў брата гаспадаром Вялікага княства Літоўскага і Рускага, але не ўзяў з яго ніякіх клятваў на выкананне ўмоў Крэўскай і Гарадзельскай уній. Ды яшчэ асабіста надзеў Свідрыгайлу на руку пярсцёнак. Здзейснілася запаветная Свідрыгайлава мара — ён стаў вялікім князем. Тыя гады, што мінулі пасля яго вызвалення з Крамянецкага замка, Свідрыгайла не патраціў дарэмна. Як ні намагаўся Вітаўт ізаляваць князя ад яго прыхільнікаў, але вось не дагледзеў. Ужо калі Вітаўту было не да Свідрыгайлы, калі смерць заглядвала яму ў вочы, Альгердавіч, па словах Аляснiцкага, «прыцягнуў да сябе потайкі ледзь не ўсіх праваслаўных князёў і баяр і прывязаў іх да сябе ўсякімі ласкамі, асабліва абяцаннямі, што калі ён дойдзе да свайго сучаснага становішча (вялікага князя), дык паспрыяе іх веры і з іх радаю будзе кіраваць»[3]. Дарэчы Аляснiцкі як мог ачарняў Свідрыгайлу: «гэты князь не прыслухоўваецца да розуму, бо не вызначаецца розумам, але чыніць тое, да чаго цягнуць яго сляпыя пачуцці»[4]. Тое самае паўтарыў за сваім апекуном Длугаш: «Ён (Свідрыгайла. — *В.Ч.*) любіў п'янставаць і забаўляцца, натуру меў велікадушную, але зменчывую і парывістую, розумам і здольнасцямі не вызначаўся, не было ў ім разважлівасці ды павагі, часта паддаваўся шалёнаму гневу, настрой мяняўся ў яго пад падувам ветру, бо ў ім вечна змагаліся розныя і супраціўныя пачуцці. Нягледзячы на гэта, вялікаю шчодрасцю і п'янкамі ён здабыў сабе прыязнь багатых, асабліва Русінаў, бо хаця быў сам католікам, паказаў вялікую прыхільнасць да іх веры»[5].

Так ён і зрабіў, акружыў сябе праваслаўнымі літвінамі. Зазірнем у тагачасныя дакументы, каб пераканацца ў гэтым. Вось склад велікакняжацкай рады, указаны ў Свідрыгайлавай грамаце за 5 кастрычніка 1430 года: князь Іван Васільевіч Чартарыйскі, яго брат Міхайла — маршалак, Іван Каварын Разанавіч, вядомы нам Няміра — цяпер ён ужо стараста Луцкі, Гаўрыла Шыла, Васіль Полацкі, Пешка — маршалак, князь Хведар Казека, Сямашка Епафінавіч, Хведзька Каладзянскі, Хведзька Казлоўскі — канцлер[6].

Круты нораў Свідрыгайла паказаў адразу. Асадзіў сваімі людзьмі і Вільню і пачуваў сябе, як вялікі князь, хоць яшчэ і не каранаваўся. А Ягайлу пагрозліва нагадаў: «Ты мяне, кароль, з князем Вітаўтам звязенілі, звязалі і дзевяць гадоў трымалі звязанага ў цяжкіх кайданах. Цяпер надышоў час, калі з Божай волі ты трапіў у мае рукі. Цяпер я магу аддаць табе

поўнасцю тое самае і помсціць на тваёй галаве мае крыўды». Ягайла ведаў неўтаймаванасць брата, але паспрабаваў яго ахаладзіць: «Сунімі гнеў, найдаражэйшы браце, дзякуючы Божай дабрыні і маёй гойнасці атрымаў ты сталіцу, дык забудзь пра ўсялякія даўнія крыўды»[7]. Свідрыгайла не забыў. Жыў Ягайла пад яго пільным наглядам, нібыта і вольны, а разам з тым і нявольнік. Свідрыгайла затрымліваў каралеўскіх паслоў, адбіраў у іх граматы. Кароль апынуўся ў ізаляцыі.

4 снежня ў Віленскім саборы св. Станіслава ў прысутнасці Ягайлы Свідрыгайла каранаваўся на вялікага князя літоўскага, рускага і жамойцкага. Але марыў Свідрыгайла пра большае — каралеўскую карону. Яшчэ 8 лістапада ён адправіў пасла Жыгімонта Рота да імператара, каб засведчыць сваю прыязнь і выказаць падзяку за дапамогу, калі знаходзіўся пры імператарскім двары. А на пытанне Рота, што адказаць імператару, калі той спытаецца ці не жадае князь каранавацца, Свідрыгайла наказаў адказаць: «Калі тое Вашай каралеўскай мосці падабаецца і калі захоча паслаць князю карону, то той ахвотна яе прыме і будзе за тое ўдзячны пакуль жыве, як сын свайму бацьку і як слуга свайму пану, як ва ўласнай асобе, гэтак і з баярамі і шляхтай літвінскай»[8]. А Ягайла цешыўся, што задаволіў мяцежніцкі дух брата і памыліўся — толькі распаліў яго.

З прыходам да ўлады Свідрыгайлы феадалы-католікі апынуліся на задворках улады. Нібыта на знак гэтай перамогі паводле Свідрыгайлавага загаду на гарадской браме вывесілі абраз Божай Маці, прывезены некалі Альгердам з Корсуня і падораны праваслаўным манахам. Кракаўскі біскуп Збігнеў Аляснiцкі скардзіўся кардыналу Юльяну Цэзарыні, што Свідрагайла ва ўсім слухаецца «рускіх схізматыкаў», і раздаў ім усе важнейшыя пасады і замкі[9]. А што ж тыя дзеячы, якія дзякуючы прыняццю каталіцтва атрымалі дзяржаўныя пасады? Яны ў сваёй большасці не прызналі ўладу Свідрыгайлы. Вось у гэтым асяроддзі і пачаў польскі двор шукаць сваіх прыхільнікаў. Усе надзеі палякаў пасля Вітаўтавай смерці прыбраць да рук Вялікае княства развеяліся, як дым. Непатрэбнымі аказаліся акты Гарадзельскай уніі. Насуперак волі польскіх паноў, у выбранні вялікага князя ўдзельнічалі праваслаўныя і паставілі на княжанне свайго кандыдата. А той адразу пасля каранацыі заявіў Ягайлу і яго акружэнню, што разрывае саюз з Польшчаю і не збіраецца клясціся яму на вернасць і падначальвацца. Якніяк, ён уладар воляю Божаю і па спадчыне ад продкаў.

Таму адкрыта казаў набліжоным: «Я ні з яго ласкі, але з Божай і з права прыроджанага майго Вялікі князь; маю цяпер час адпомсціць яму за мае даўнейшыя крыўды, але няхай будзе ўдзячны, што я і дагэтуль шаную і паважаю яго проста як

старэйшага брата і караля польскага»[10]. Сябе васалам Ягайлы не лічыў. Вось так. І бывайце багатыя Валынь і Падолле — землі, якія палякі лічылі ўжо сваімі. Не, з гэтым яны не могуць прымірыцца. І ўжо збіраецца польская шляхта ў загоны. Вясною 1431 года палякі пад зверхнасцю братоў Бучацкіх уварваліся на Падолле. Былі захоплены гарады Смотрыч, Скала і Чырвонаград. Падышоўшы да ўмацаванага Камянца Падольскага, палякі выклікалі з цвержы падольскага намесніка Даўгерда, які яшчэ не ведаў пра Вітаўтаву смерць, маўляў, маюць яны пільную патрэбу перадаць яму ад Вітаўта паведамленне. Палякі звязенілі ваяводу, які выйшаў з замка, і ўварваліся ў Камянец.

Пасля Бучацкія павялі свае загоны на Валынь. Тут ужо ворага чакалі. Палякаў адбілі ад Уладзіміра ды Луцка. Свідрыгайла — чалавек крутога нораву — так і ўскіпеў, калі даведаўся пра напад палякаў на Вялікае княства. На сваю бяду ў Вільні ў гэты час гасцяваў Ягайла. Першым жаданнем вялікага князя было расправіцца з польскімі саноўнікамі. Раз'юшаны, ён уварваўся ў пакой да Ягайлы і, схапіўшы караля за бараду, ледзь не вырваў яе. У гневе звярнуўся да Ягайлы: «Мілы брат, дзеля чаго ты трымаеш Падольскую зямлю, вотчыну той зямлі Літоўскай: вярні яе мне, а калі не хочаш вярнуць яе мне, я цябе з Літвы не выпушчу»[11]. І стрымаў сваё слова — прыставіў да яго варту. Кароль паспрабаваў змякчыць Свідрыгайлаў гнеў: «Мілы брат, я Падольскай зямлі ў цябе не адымаю, але ёсць братана наша, уладальніца той Падольскай зямлі княгіня Соф'я Жэдзівідаўна, жонка князя Міткі Зубравіцкага, якая даручыла яе мне ў апеку як свайму дзядзьку і абаронцу, і хаця я ёю кірую, увесь жа прыбытак атрымлівае яна»[12]. Аднак таму не ўдалося выкруціцца: Свідрыгайла стаяў на сваім — вярні Падолле. Тады Ягайла пачаў сароміць Свідрыгайлу. «Мілы брат, ты мне малодшы брат, а я табе як бацька, а ты мяне так зганьбіў, як бы твайго бацьку, як ты асмеліўся гэта зрабіць: кінуўся да маёй барады. Табе не варта так чыніць са мною, тваім старэйшым братам і да таго ж божым памазанцам, хрысціянскім уладаром, слаўным каралём. А ты асмеліўся пасадзіць мяне ў вязніцу, і я так лічу, што зрабіў ты гэта без згоды на гэта сваёй рады, а зрабіў гэта паводле свайго разумення»[13]. Выступіў кароль і перад велікакняжацкаю радаю: «Князі і паны-рада Вялікага княства, слугі верныя брата майго. Памятаеце, што калі жыў брат мой вялікі князь Вітаўт, ваш уладар, я заключыў з ім дамову ў вашай прысутнасці з маім братам вялікім князем Вітаўтам на такіх умовах: калі б у князя вялікага Вітаўта былі сыны, а я не меў бы, тады дзеці вялікага князя Вітаўта павінны былі б кіраваць пасля маёй смерці Вялікім княствам Літоўскім і Каралеўствам Польскім, а калі б брат мой Вітаўт дзяцей не

меў, а я меў бы, тады пасля нашай смерці мае дзеці павінны былі б кіраваць Каралеўствам Польскім і Вялікім княствам Літоўскім. І вы ўсе, рада Вялікага княства і мая рада ўсяго Каралеўства Польскага, былі пры заключэнні той дамовы і на ўсё тое згадзіліся як мая рада, так і вы, рада майго брата, і на тым мне прысягнулі, а мая рада брату майму і вам. А вы пра гэта памятаеце, таму што я вас ад той прысягі яшчэ не вызваліў. І хаця я маю двух сыноў і адзін з іх можа быць у вас уладаром згодна з дамовай паміж мною і маім братам і згодна з вашай прысягай, аднак я на гэтым не настойваю, таму што сын мой пакуль вельмі малады, каб быць у вас уладаром. І я раю вам узяць сабе ўладаром брата майго старэйшага Жыгімонта, роднага брата вялікага князя Вітаўта»[14].

Ягайла прапаноўваў скінуць з велікакняжацкага пасада Свідрыгайлу і прывесці да ўлады Жыгімонта Кейстутавіча. Гэтага дамагаліся і палякі. Тады ўжо сапраўды — бывай незалежнасць Вялікага княства. Узведзены на вялікае княжанне пры польскай падтрымцы, Жыгімонт стане верным служкам палякаў. На такое велікакняжацкая рада не пагадзілася.

Ягайлавы паплечнікі-палякі і не ведалі, што рабіць. Параіўшыся паміж сабою, яны вырашылі забіць Свідрыгайлу, а пасля захапіць віленскі замак і абараняцца, пакуль не падаспее польскае войска. У Польшчы ўжо ведалі пра звязенне караля і збіралі вояў. Праўда, былі і такія, што не без злаславасці казалі, што Ягайла «тое сам сабе нарабіў»[15]. Аж да папы Марціна V паляцела данясенне пра нейзаздросны лёс польскага караля. Папа дзівіўся і перажываў з таго, што здзейснены гвалт з такога «знакамітага і годнага караля, якога мы і касцёл горача любім і славім». А таму прасіў Свідрыгайлу: «Спачуваючы табе з бацькоўскай міласцю, жадаючы пазбавіць тваю душу ад путаў такога вялікага граху і сцерці з твайго імя пляму такой няславы, просім тваю шляхетнасць, даверся, нягледзячы на тытулы, святому паслушэнству, якое павінен нам праяўляць, як заступніку Ісуса Хрыста, абы з пакорлівым сэрцам дараваць твайго брата і прычынёныя яму крыўды, вярнуў яму ранейшую вольнасць, абы вярнуўся з ім, як належыць, да ласкі, любіў яго як брата і шанаваў як караля»[16]. Як не прасіў папа Свідрыгайлу пачуць яго голас, ды толькі той меў свой розум.

Стары Ягайла быў мудрэйшы за сваіх набліжаных, якія пасміхаліся з яго, называючы някемлівым. Прадбачыў ён, што Свідрыгайлава смерць выкліча абурэнне ў сэрцах літвінаў. І не абараніцца палякам у замку. Ды і не хацеў кароль яшчэ адной бяды сваёй радзіме. Хай пануе паміж імі мір. А ён абяцае вярнуць Падолле Вялікаму княству. І Свідрыгайла памірыўся з братам, адарыў яго 1100 рублямі серабром і багатымі

падарункамі. Паверыў у згоду з ім і пралічыўся. А палякі, абрадаваныя, што так і не ўдарылі над іх галовамі перуны, хутчэй ад'ехалі ў Польшчу. Але на самой справе палякі і не думалі адмаўляцца ад Падолля. Калі Ягайла адпраўляў свайго пасла Тарла Шчэпіовіча да Бучацкіх у Камянец Падольскі, загадаўшы ім вярнуць горад Свідрыгайлаваму намесніку Міхайлу Бабе Друцкаму, польскія саноўнікі пусціліся ў хітрыкі. Яны патаемна напісалі ліст да Бучацкіх, у якім раілі не слухаць караля, а яго пасла і Міхайлу Бабу звязеніць. Каб ліст не стаў вядомы Свідрыгайлу, яго аблілі воскам, надалі выгляд свечкі, пасля чаго перадалі аднаму са слуг Шчэповіча, той і ўручыў гэтую свячу Бучацкім, каб яны «пашукалі ў ёй святла»[17]. І «святло», якое знайшлі тыя, расплюшчыла ім вочы. Цяпер ужо яны ведалі, што рабіць. Каралеўскі пасол і Баба апынуліся ў вязніцы.

Як толькі Ягайла прыехаў у Польшчу, дык адразу ж сабраў у Сандаміры сойм, на якім і заявіў, што не прызнае Свідрыгайлу вялікім князем, бо Вялікае княства далучана назаўжды да Польскага каралеўства. Каралеўскія паслы перадалі Свідрыгайлу, што Ягайла ўчыніў гэта з мэтай прывесці малодшага брата да разумнай развагі. Свідрыгайла ясна даў ім зразумець і каб перадалі каралю: «Ні Луцка не саступлю, ні Падолле адабраць не дам. Тлумачэнняў вашых не патрабую: таму што з права спадкаемца дзедзічнага трымаю Вялікае княства Літоўскае, а не з чыёй-небудзь ласкі»[18]. Тое самае перадаў Ягайлу і Свідрыгайлаў пасол віцебскі намеснік Васіль Красны «Вялікі князь не можа ні пад якой падставай аддаваць Луцк кароне Польскай, ні Падолля. Наадварот моцна просіць вярнуць Літве астатнія землі. У адваротным выпадку ніякія прыяцельскія ўклады не будуць заключаны, таму што не была вырашана галоўная справа»[19]. Стала ясна, што вайны з Свідрыгайлам не пазбегнуць. Ён быў больш рашучым, чым сам Вітаўт. Палякі голасна клялі Свідрыгайлу і заклікалі на яго галаву Божую кару.

ВАЙНА ЗА ПАДОЛЛЕ

Свідрыгайла яшчэ нічога не ведаў пра лёс Міхайлы Бабы і дзеля чаго палякі, па чутках, якія даходзілі да яго, вярбуюць наймітаў. Ніяк не мог князь дапусціць, што Ягайла падмануў яго і рыхтуе войска для вайны з ім. Лічыў, што палякі збіраюцца на Ордэн і таму папярэджваў магістра: «Калі палякі нападуць на вас, мы не пакінем вас і гатовы дапамагчы ўсімі сіламі нашымі»[20]. Свідрыгайла, як і Вітаўт, у барацьбе з Польшчаю арыентуецца на Ордэн. Як і Вітаўт, ён марыць ператварыць Вялікае княства ў каралеўства і ўвянчаць сваю га-

лаву каралеўскай каронай. Імператар Жыгімонт I не супроць. Ён збіраўся выехаць у Прусію, каб каранаваць Свідрыгайлу. Аднак наступныя падзеі фатальна паўплывалі на лёс вялікага князя. А пакуль Свідрыгайла і не падазрае, што бяда побач. Ён заняты дзяржаўнымі справамі. Пасылае да Ягайлы пасольства на чале з віцебскім намеснікам князем Васілём, да хана Залатой Арды Улуг-Мухамеда — пад зверхнасцю наваградскага намесніка Пятра Мантыгірдавіча. Паехалі паслы і да табарытаў у Чэхію. 7 студзеня 1431 года князь прымаў у Вільні наўгародскіх паслоў. Шмат часу адымалі праблемы ўнутрыдзяржаўныя. Трэба было разабрацца з Вітаўтавай адміністрацыяй. Хто з былых саноўнікаў гатовы верай служыць яму, а хто — не.

У крыніцах мы не знойдзем паведамленняў, што Свідрыгайла пачаў помсціць набліжаным Вітаўта, хаця ж і мог спагнаць на іх злосць і крыўду за свае прыніжэнні ад былога вялікага князя. Наадварот, ён жадае падтрымліваць з імі добрыя адносіны. Так, былому Вітаўтаваму фаварыту Смольку ён выпісвае крэдытную грамату да ордэнскага маршала. Няміра становіцца луцкім старастам. На ваяводствах Віленскім і Трокскім застаюцца былыя Вітаўтавы ўраднікі. Па-ранейшаму маршалкам літоўскім быў Румбольд.

Ягайла ж, даведаўшыся, што Ордэн таксама збірае войска, адправіў паслоў да магістра з прапановаю міру. Аднак лівонскі магістр, які добра ведаў, што Свідрыгайлу падтрымліваюць праваслаўныя феадалы і просты люд, папярэдзіў вялікага магістра: «калі ён адмовіць у дапамозе Свідрыгайлу, дык усе рускія звернуць на яго сваю зброю»[21]. І з гэтым трэба было лічыцца. А на Падоллі працягваліся баі з атрадамі Бучацкіх. Свідрыгайлавы воі адваявалі назад Збараш, Крамянец, Алесна. Устаялі толькі Смотрыч і Камянец.

У сакавіку польскае войска на чале з Ягайлам рушыла на Падолле. Пра гэта Свідрыгайла даведаўся ў Троках і адразу адпісаў магістру. «Палякі з Камянца паспешліва рушылі на Падолле да горада нашага Брацлава і на шляху сваім па сёлах прычынялі падданым нашым вялікую шкоду, гвалт і нечуваныя жорсткасці»[22]. Гэты ліст супярэчыць звесткам Длугаша, што Свідрыгайла, парушыўшы дамову з Ягайлам, напаў на Валынь і прыняўся яе спусташаць. Як вынікае з ліста, не Свідрыгайла са сваімі воямі займаўся рабаваннем, а, наадварот, палякі. І ніяк ён не мог знаходзіцца зімою 1431 года на Падоллі або Валыні. З яго перапіскі з магістрам вынікае, што 25 студзеня Свідрыгайла ў Вільні заключыў мір з Ноўгарадам, а 5 лютага ён па-ранейшаму яшчэ ў Вільні, дзе піша ў Ордэн крэдытную грамату для былога Вітаўтавага фаварыта Смолькі. А ў сакавіку ў Троках ён даведаўся пра напад палякаў на Брац-



Пячатка Свідрыгайлы

лаў. (Ці то Длугаш фальсіфікаваў гісторыю, ці то не меў пад рукою дакладных дакументаў пра тыя падзеі...)

Палякі пачалі адкрытую вайну супраць Вялікага княства. Паслы, што вярнуліся ў красавіку ад Ягайлы, перадалі князю каралеўскія пагрозы. Ягайла абяцаў нацкаваць на Вялікае княства Ордэн і гусітаў. Аднак кароль толькі палохаў свайго брата. У той жа час у Навагрудак, дзе быў Свідрыгайла, вярнуліся паслы ад гусітаў. Правадыр табарытаў Пракоп і князь Жыгімонт Карыбутавіч разам з старэйшынамі гусітаў абяцалі Свідрыгайлу прызнаваць яго ворагаў сваімі ворагамі. Козыр Ягайлаў быў біты — Польшча заставалася без саюзніка. Цяпер Свідрыгайла поўны рашучасці «дамовіцца з імператарам Рымскім і з яго згоды зрабіць штосьці дзеля знішчэння ганарлівасці палякаў»[23]. Але спачатку ён патрабуе ад Ягайлы вярнуць яму Камянец і Смотрыч. Зразумела, кароль і не думаў згаджацца на гэтую прапанову. Між тым вярнуўся ад татар навагрудскі намеснік Мантыгірдавіч і таксама прывёз добрую навіну.

Свідрыгайла 9 мая піша магістру з Гародні, што золатаардынскі хан Улуг-Мухамед «жадае быць з ім у шчырай любові і сяброўстве, як і з папярэднікамі яго, і гатовы дапамагаць яму не толькі ўсім войскам, але і асабіста прысутнічаць, дзе і калі патрэбна»[24]. Пакуль што для Свідрыгайлы палітычная кан'юнктура складвалася ўдала: ён у прыязных адносінах з імператарам Жыгімонтам, падтрымлівае саюз з Ордэнам, заключаны мірныя дамовы з Ноўгарадам, Залатой Ардою і Чэхіяй. А ў Польшчы вырашылі, што пасля брацлаўскіх падзей Свідрыгайла стане паслухмяным каралеўскай волі. У Вільню адправіліся Ягайлавы паслы Ян Лутэка і Бржэскі з патрабаваннем да вялікага князя прызнаць Падолле польскім уладаннем, перадаць Польшчы Валынь, а самаму адправіцца ў Кракаў для клятвы на вернасць польскаму каралю. Аднак Свідрыгайла — гэта не дыпламатычны Вітаўт: такія прамовы ён моўчкі не ўмее слухаць. Ён гаспадар Вялікага княства. «Усё, што чыніў або чыню, слушна і паводле права паступаю»[25]. Варта было Бржэскаму толькі заікнуцца пра Ягайлавы патрабаванні, як князь ускіпеў і з усёй моцы заехаў паслу па вуху. Той куляй вылецеў

з княжацкіх пакояў, ілбом адчыніўшы дзверы. На гэтым і скончыўся прыём.

Свідрыгайла развітаўся з пустымі надзеямі мірным шляхам адстаяць незалежнасць сваёй дзяржавы. На радзе са сваімі паплечнікамі вялікі князь вырашыў рыхтавацца да вайны з Польшчаю. Было дамоўлена з Ордэнам, што крыжакі падтрымаюць Вялікае княства. Імператар Жыгімонт, хоць і не абяцаў дапамогі, спасылаючыся на вайну з гусітамі, але абнадзеіў князя, што ўвянчае яго каралеўскай каронай.

Калі пра ўсё гэта стала вядома пры кракаўскім двары, там пачаўся перапалох. Тут жа вырашылі паслаць да Свідрыгайлы новае пасольства і ўсяляк адгаварыць яго ад вайны. Паехаў у Вільню ўсё той жа Бржэскі. На гэты раз яму яшчэ больш не пашчасціла. Свідрыгайла і слухаць не стаў пасла і зноў заехаў яму па вуху і загадаў кінуць у вязніцу.

Палякі прынялі Свідрыгайлаў выклік і рушылі з войскам на Падолле і Валынь. Паводле Длугаша, «горшаю за смерць» была гэтая вайна для Ягайлы. Не хацелася каралю ваяваць са сваёю Айчынаю. Але польскія саноўнікі прымусілі яго ўзначаліць паход. Як толькі польскае войска падыходзіла да якога горада, кароль патаемна пасылаў туды вестуноў з папярэджаннем пра небяспеку. Першаю ахвяраю гэтай вайны стала Гародла — гарадок, дзе калісьці Вітаўт і Ягайла падпісалі Гарадзельскую унію і дзе польскія паны шчыра і па-сяброўску дзяліліся сваімі гербамі з літвінскай шляхтай. Палякі «спустошылі зусім» (паводле Свідрыгайлавых слоў) Гародла[26]. Нянавісць і жорсткасць валодалі людзьмі. Абодва бакі не шкадавалі палонных — забівалі іх. Праваслаўныя палілі касцёлы і распраўляліся з каталіцкімі святарамі. Палякі пакідалі на сваім шляху спаленыя сёлы і разрабаваныя мястэчкі. Жыхары ўцякалі ў лясы і хаваліся там ад ворага, і мноства іх загінула ад голаду і хвароб. Ворагу супрацьстаялі літвінскія дружыны Хведара Нясвіжскага ды Аляксандра Носа. Сілы няроўныя. Давялося без бою пакідаць Збараш і Уладзімір. Польскія перадавыя атрады наблізіліся да Луцка. Ягайла з велікапольскім войскам, якое падышло пазней, таксама выступіў пад Луцк. Сюды на чале з 6 тысячамі конніцы прыйшоў і Свідрыгайла і стаў на другім беразе Стыры, каб бараніць пераправу. 31 ліпеня палякі адкрылі агонь з гармат і пачалі перапраўляцца цераз раку. Свідрыгайла быў разбіты, нават разнеслася пагалоска, што ён загінуў. Даведаўшыся пра гэта, Ягайла вельмі шкадаваў брата. Але ён быў жывы і схаваўся за муры замка Сцепаніа. Праўда, Свідрыгайла іначай тлумачыў сваё паражэнне. Ён 22 ліпеня без войска прыбыў да Луцка на сустрэчу з Ягайлам, але не застаў там караля. Некалькі

польскіх харугваў пераправіліся цераз раку і аблудліва напалі на атрад Свідрыгайлы, таму і давялося ратавацца ўцёкамі. Што ж, яшчэ раз бачым, як Длугаш «праўдзіва» пісаў сваю хроніку.

Два тыдні заваёўнікі рыхтаваліся да штурму Луцкага замка, абаронаю якога кіраваў баярын Юрша. 13 жніўня абаронцы адбілі варожы прыступ. Уся віна за няўдачу пала на Ягайлу: маўляў з-за яго нерашучасці і бяздзейнасці Луцк так і не ўзяты. Ягайла адказаў, што няўдача — гэта Божы гнеў за рабаванне касцёлаў. Так яно і было — палякі, як паганцы, рабавалі храмы, а няшчаснага луцкага біскупа Ядржэя так абчысцілі, што ён прадстаў перад каралём з галавы да ног абрабаваны.

У суседніх землях таксама кіпелі баі з палякамі: у Белзскай зямлі Свідрыгайлавы воіны спалілі Бужск. Трымаў аблогу 6-тысячнага польскага атрада Алескі замак. Білі палякаў на Холмшчыне. А Луцк па-ранейшаму трымаўся. Канчалася лета. У польскім лагеры не хапала харчоў. Ад эпідэміі дохлі коні. Да Ягайлы прыходзілі нярадасныя весткі. Валашскі гаспадар Аляксандр рабаваў польскія землі. На дапамогу Свідрыгайлу з'явіліся татары. Час ад часу чакалі нападу крыжакоў, якія і сапраўды 17 жніўня ўварваліся ў Польшчу. Прускае войска не сустракала супраціўленне — польскія войскі стаялі пад Луцкам.

Ягайла паспяшыў заключыць са Свідрыгайлам перамір'е, якое абяцаў перамяніць у вечны мір. За палякамі заставаліся Камянец, Смотрыч, Скала і Чырвонагорад. Ягайла не даацаніў вялікага князя. Той змог стварыць антыпольскую кааліцыю: Ордэн, Валахія, Лівонія, перацягнуў да сябе гусітаў, заключыў саюзы з татарамі і наўгародцамі. Патрэбны быў час, каб пазбавіць Свідрыгайлу саюзнікаў, разбіць Ордэн, а пасля ўправіцца і з Вялікім княствам. І гэты час Польшча выйграла. Заключанае 6 верасня перамір'е з Польшчай было палітычнай памылкай Свідрыгайлы. Ён не скарыстаў выступленне Ордэна і не працягваў вайны з Польшчаю, якая не мела сіл змагацца на два франты. Нездарма крыжакі ўсяляк настойвалі, каб Свідрыгайла не мірыўся з Ягайлам, даводзячы яму, што тут хаваецца здрада, але ён не хацеў верыць гэтаму да таго часу, пакуль не ўпэўніўся ў тым на самой справе: «бо мірам пры Луцку ўстроіў ён сваё няшчасце і ад гэтага адбылося ўсё яго зло»[27], казалі крыжакі.

ПЕРАВАРОТ

Дзейнічаць Ягайла вырашыў праз папу. У Рым паехаў польскі пасол Фашкер, якога Свідрыгайла называў «галоўнаю спружынаю ўсіх звадак і вайны паміж намі і каралём»[28]. Ягайла дамагаўся ад папы, каб той зняў са Свідрыгайлавых падданых клятву ў вернасці. Калі папа выслухаў аповяд пра «жорсткасці», якія чыняць крыжакі разам з паганцамі (вось так: тыя літвіны і жамойты, якіх так руплівa хрысціў Ягайла, ужо сталі «паганцамі»), дык так угневаўся, што не пажадаў слухаць тлумачэнняў ордэнскага прадстаўніка.

На Базельскім саборы абнародавалі грамату, у якой Ордэн дакаралі за саюз з Вялікім княствам. Імкнучыся разарваць гэты саюз, палякі не жадалі дапусціць ордэнскіх дыпламатаў на сойм у Парчаў, дзе павінны былі зацвердзіць вечны мір паміж Польшчаю і Вялікім княствам. Свідрыгайла разгадаў задуму палякаў і настойваў на ўдзеле Ордэна ў сойме. Магістру ён піша: «Не сумнявайцеся ў нас, нішто на свеце не зможа разлучыць нас з вамі, мы са шчырасцю гатовы заўсёды і ва ўсім дапамагаць вам»[29].

У адрозненне ад Свідрыгайлы крыжакі не выканаюць сваіх саюзных абавязкаў і здрадзяць яму. А пакуль ён упэўнены ў іх падтрымцы і зусім не падазрае, што ўжо блізкі час яго звяржэння з велікакняжацкага пасада.

Ягайла так і не дачакаўся прыезду брата на Парчаўскі сойм. Свідрыгайла без удзелу на ім крыжакоў і валахаў не згаджаўся весці з палякамі якія-небудзь размовы пра вечны мір. Заставалася апошняе — убраць Свідрыгайлу з велікакняжацкага пасада. Хоць быў і другі намер — нізлажыць Ягайлу і выбраць каралём Свідрыгайлу, абы ён далучыў Літву і парваў з Ордэнам. Але самі палякі разумелі, што Свідрыгайла на гэта не пагодзіцца. Заставалася адно... Ягайла выклікаў да сябе Жыгімонта Кейстутавіча і прапанаваў яму стаць вялікім князем пры ўмове леннай залежнасці ад польскай кароны і перадачы Польшчы Падолля, Валыні і Кіева. За ўладу Жыгімонт гатовы здрадзіць інтарэсам Вялікага княства. Замена Свідрыгайлу знойдзена, цяпер трэба было падрыхтаваць пераварот. У княства адпраўляецца польскае пасольства на чале з Лаўрэнціем Зарэмбам, які быў блізкі з Жыгімонтавым сынам Міхайлам. Нібыта ехалі паслы, каб перадаць вялікаму князю Ягайлава пажаданне захоўваць перамір'е, а сапраўды — скласці змову феадалаў-католікаў супраць Свідрыгайлы. А незадаволеных новым вялікім князем хапала: маршалак Ян Гаштольд, наваградскі намеснік Пётр Мантыгірдавіч, віленскі ваявода Гедыгольд, віленскі біскуп Мацвей. Душою змовы быў Сымон Гальшанскі,

брат каралевы Софіі. Улада Свідрыгайлы абмяжоўвала яго асабістую ў Вялікім княстве. Так што яму было за што змагацца. Ён, па словах Свідрыгайлы, і «падбунтаваў Жыгімонта і падвучыў». Прычыніўся да змовы і палітыкан у сутане Збігнеў Алясніцкі, які рыхтаваў ідэалагічнае апраўданне пераварота. Папе Яўгену IV ён прыслаў ліст з трывожным папярэджаннем: «Князь Свідрыгайла ва ўсім раіцца з схізматыкамі і жонку узяў паводле іх ладу жыцця: так ведайце, хоць літвіны, якія цяпер католікі, хацелі яго схіліць да згоды з намі, то русіны, якія праз справу і волю таго князя, маюць большую ўладу за літвінаў. Не дапускайце таго, бо баюся, каб літвінаў абрадак і ўлада не ўпала. Схізматыкі ўсе важнейшыя замкі і ўрады ў сваіх руках трымаюць, чаго не было пры жыцці Вітаўта»[30]. Як пасля такіх навін не захвалявацца курыі?

Палякі заручыліся падтрымкай сваіх прыхільнікаў і патаемна пачалі збіраць войска для Жыгімонта. Хведар Нясвіжскі папярэджваў Свідрыгайлу, што палякі ўзбройваюцца. Князь асабліва не прыслухоўваўся. Становішча яго ў дзяржаве трывалае. Верныя саюзнікі гатовы дапамагчы на выпадак вайны з палякамі. Ордэн трымае на польскай мяжы свае атрады. І на заявы палякаў, што крыжакі парушаюць перамір'е, вялікі князь проста адказвае: «Вы ўвесь час гатовы да вайны і стаіце ў баявым шыхце — чаму ж мы, магістр і ўсе астатнія саюзнікі нашыя, не можам падрыхтавацца да вайны»[31]. 7 мая ў Кірсмемелі Свідрыгайла і магістр узнавілі дамову паміж Вялікім княствам і Ордэнам. Свідрыгайла прыехаў у акружэнні світы з праваслаўных феадалаў, якія і паставілі свае подпісы пад дамоваю. Гэта — князі Іван Уладзіміравіч, Андрэй Уладзіміравіч, Іван Сымонавіч Пуцята-Друцкі, яго брат Васіль Сымонавіч, Глеб Кіндэравіч, Хведар Нясвіжскі. Усё для Свідрыгайлы складвалася нібыта ўдачна. Імператар Жыгімонт паведамляў, што чакае ад яго пасольства. Князі Мазавецкія выказалі жаданне ўступіць з ім у вечны мір. Князь Земавіт Мазавецкі са слязьмі скардзіўся Свідрыгайлу, «што не ўстане выносіць пыхі і нянавісці палякаў»[32]. Князі Адоеўскія шукалі ў яго заступніцтва ад Масквы і кляліся служыць яму. У чэрвені месяцы наўгародскія паслы прасілі яго згоды ўзяць намеснікам у Ноўгарад князя Юрыя Лугвенавіча — сына мсціслаўскага князя Лугвенія. У жніўні ўжо пскавічы прасілі намесніка і прапаноўвалі сваю дапамогу. Сяброўскія адносіны склаліся ў Свідрыгайлы з сілезскімі князямі. Падманлівы поспех? Ягайла ўжо сабраў Жыгімонту Кейстутавічу войска; цераз Віслу наводзяцца масты, а польскія паслы пускаюць Свідрыгайлу туман у вочы: то пра мір заводзяць гаворку, то прапаноўваюць яму стаць рэгентам, Ягайлавым пераемнікам на польскім пасадзе.

Апошнія дні ўладарыў Свідрыгайла Вялікім княствам. У сярэдзіне жніўня Жыгімонт Кейстутавіч з польскімі атрадамі патаемна ўступіў на Літву. Да яго далучыліся Сымон Гальшанскі, Пётр Мантыгірдавіч, Гаштольд, які дзякуючы Свідрыгайлавым клопатам вярнуўся з польскага палону, нейкі князь Аляксандр (верагодна, Алелька Уладзіміравіч) і іншыя феадалы, незадаволеныя вялікім князем. Ён у гэты час жыў у Ашмянах. Змоўшчыкі збіраліся акружыць Ашмяны, захапіць Свідрыгайлу і звязеніць яго. Калі яны ў ноч на 17 жніўня былі непадалёк ад мястэчка, Свідрыгайлу папярэдзіў пра небяспеку троцкі ваявода Манівід, і князь разам з жонкаю ў акружэнні 14 вершнікаў перад самым носам сваіх ворагаў пакінуў Ашмяны. Па лясных дарогах, аб'язджаючы сёлы і гарады, скакаў князь у старажытны Полацк. Ведаў: там яго падтрымаюць.

Жыгімонт Кейстутавіч тым часам уступіў у Вільню. Віленскі ваявода Гаштольд адкрыў перад ім браму. Ва ўсіх гарадскіх храмах была зачытана папская була, у якой папа вызваляў Свідрыгайлавых падданых ад прысягі яму. Жыгімонт пайшоў на падман: абвясціў, што Свідрыгайла памёр. І на гэтую хлусню папаліся многія шчырыя Свідрыгайлавы прыхільнікі, як, напрыклад, той жа троцкі ваявода Манівід; паверыў у смерць вялікага князя і просты народ.

Вільня, Трокі, Коўна, Жамойць прызналі ўладу новага князя. Прынеслі яму клятву і ў Гародні — былой сталіцы Вітаўта. Бярэсце Жыгімонт Кейстутавіч падначаліў сілаю. Як даносіў магістру ордэнскі віж Войгт: «Увесь народ літоўскі ахвотна згадзіўся прызнаць Жыгімонта з-за слабасцяў Свідрыгайлавых; бо ваявода Гедыгольд і важары абвясцілі новаму вялікаму князю, што Свідрыгайла не паважаў хрысціянства і аслабляў яго, што нават жонцы сваёй дазволіў жыць па асабістай яе волі»[33]. Пра тое самае даносіў у Ордэн і крыжацкі шпег Рэбенц: «Свідрыгайла нейкім чынам сам гэтага заслужыў, таму што па любові да жонкі і да русінаў прыніжаў веру рымскакаталіцкую і пачаў выказваць болей прыхільнасці да веры рускай: абдзіраў літоўцаў, абагачаў русінаў»[34].

З Вільні Жыгімонт Кейстутавіч выступіў на Трокі. Абяцаннямі пакінуць Манівіда віленскім ваяводам перацягнуў таго на свой бок. Але Свідрыгайла жывы, на волі, і не змірыцца са сваім паражэннем. Новы вялікі князь выказаў жаданне заключыць саюз з Ордэнам. З просьбаю пра дапамогу звяртаецца з Полацка да магістра і Свідрыгайла. Лівонскія рыцары, даведаўшыся пра яго бяду, адразу ж пайшлі на Жамойць. Толькі вялікі магістр не спяшаўся дапамагаць свайму былому саюзніку: можна ж паразумецца і з новым вялікім князем. Да Жыгімонта 26 жніўня прыязджае ордэнскі пасол Ганс Балг з ма-

гістравымі ўпэўніваннямі ў шчырым сяброўстве. Жыгімонт здзівіўся. Як сяброўства, калі ў гэты час лівонцы паляць сёлы ў Жамойціі? «Як такое магло здарыцца?» — «Без згоды і дазволу магістра», — растлумачыў пасол. — «Няхай абвесціць Ордэн, ці намераны ён захоўваць мір?» — спытаўся князь. І Ганс Балг абрадаваў яго станоўчым адказам[35]. У сваім данясенні ў Ордэн ён апісаў настрой Жыгімонтавых прыбліжаных: усе яны пылаюць нянавісцю да Свідрыгайлы і радуюцца, што вялікім князем стаў Жыгімонт Кейстутавіч, які адразу вярнуў многім з іх былыя пасады і землі. «Гэтым заваяваў ён любоў сваіх падданых, якія аднадушна ўсклікалі: «Вось як міласціва чыніць з намі гаспадар наш; гэта ніколі бы не зрабіў Свідрыгайла; і мы гатовы пакласці за яго жываты свае». «Мы ўсе ахвотей згодзімся праліць да апошняй кроплі кроў нашую, чым прызнаем зноў Свідрыгайлу»[36], — заяўлялі яны.

У Кракаве не хавалі радасці: польскі стаўленік на велікакняжацкім пасадзе! 1 верасня Ягайла прызнаў Жыгімонта вялікім князем Літоўскім, хоць сябе па-ранейшаму тытулаваў вярхоўным князем Літвы — лічыў сябе яе гаспадаром. У Вільню адправілася пасольства павіншаваць новага гаспадара. Узначальваў яго Збігнеў Аляснцкі. Жыгімонт з шыкоўнасцю прыняў польскіх паслоў у Гародні, пакляўся, што Вялікае княства падначаліцца Польшчы, а для пачатку і перадаў ёй Валынь, Падолле і Кіеў. Пасля сваёй смерці, абяцаў Жыгімонт, усё Вялікае княства Літоўскае і Рускае пяройдзе да Польскай кароны, толькі Трокская зямля застанецца ва ўладанні ягоных нашчадкаў. Прызнаў ён Ягайлу за «пана і брата старэйшага». Ведаў бы Гедымін, як унукі будуць гандляваць яго спадчынай! 26 кастрычніка Жыгімонт быў каранаваны каронай свайго дзеда. На Літве пачалося праўленне «жорсткага і гвалтоўнага чалавека, забойцы ўласных падданых, які шмат нявінных людзей рознымі мучэннямі пазбавіў жыцця», — гэтак ацаніў яго панаванне не менеў жорсткі і гвалтоўны чалавек вялікі магістр Пауль фон Росдорф[37]. Крывавая тыранія Жыгімонта ўразіла нават крыжакоў.

Каб адвадзіць ад Свідрыгайлы праваслаўных феадалаў і «каб у будучыні паміж абодвума народамі не было розніцы або якойнебудзь няроўнасці, якою можна наносіць шкоду дзяржаве, каб усе былі суцешаныя аднолькавымі міласцямі, аднадушна і згодна, з аднолькавай дбайнасцю і пастаянствам клапаціліся пра дабро і росквіт дзяржавы, старанна і верна выконвалі волю караля Ягайлы і брата яго вялікага князя Жыгімонта»[38], кароль выдаў прывілеі. Праваслаўным феадалам гарантавалася самастойнае валоданне сваімі вотчынамі і пажалаванымі маёнткамі, ім дазвалялася займаць дзяржаўныя пасады ў Трокскім



Пячатка Жыгімонта Кейстутавіча

і Віленскім ваяводствах, уступаць у гербавыя братэрствы з каталікамі. 15 лістапада Жыгімонт Кейстутавіч абнародаваў гэты прывілей. Аднак нават гэтая ўступка не адвадзіла ад Свідрыгайлы праваслаўных феадалаў. Круты нораў Жыгімонта, жорсткія расправы над сваімі палітычнымі праціўнікамі, патуранне палякам і здрада інтарэсам Вялікага княства расплюшчыла вочы многім з іх. «Уся зямля Літоўская супраць палякаў, і прасталюдзіны кажуць, што яны скарыліся Жыгімонту не ведаючы, што Свідрыгайла жывы, многія жыхары, пакінуўшы жонак і дзяцей, сцякаюцца да Свідрыгайлы»[39], — даносіў магістру Ганс Балг, які жыў у Вільні. Жыгімонт трымаўся на вялікім пасадзе толькі з дапамогай польскай зброі. А ў Полацку праваслаўныя феадалы абвясцілі сваім вялікім князем Свідрыгайлу і пасадзілі яго на Вялікае княства Рускае. Полацк, Віцебск, Смаленск, Орша, Мсціслаў, Магілёў, Крычаў, Чачэрск, Барысаў, Гомель, Друцк, Браслаў, Дрысвяты, Брагін, Рэчыца, Мазыр, Кіеў, Чарнігаў, Пуціўль, Ноўгарад-Северскі, Трубчэўск, Старадуб, Любуцк, Серпейск, Тула, Курск, Вязьма, Ржэва, Вележ, Аскол — вось гарады, якія прызнавалі Свідрыгайлаву ўладу.

Уваходзілі ў Вялікае княства Рускае таксама Валынская і Луцкая землі. Нягледзячы, што Падолле знаходзілася ў руках палякаў, там ваявалі супраць іх дружыны на чале з Хведарам Нясвіжскім, пінскім князем Аляксандрам Носам (значыць, Пінскае княства таксама ўваходзіла ў склад Свідрыгайлавай дзяржавы). І што характэрна, падзел Вялікага княства на дзве дзяржавы: княства Літоўскае і княства Рускае пралёг па мяжы старажытнай Літвы — па Дняпроўскай Бярэзіне, бо ўжо ў зямлі Літоўскай «Хроніка Быхаўца» называе гарады Менск, Заслаўе, Маладзечна[40]. Значыць, яшчэ ў тыя часы памяталі, адкуль пачынаецца зямля Літоўская. І хоць літвіны ўжо былі пераважна асіміляваныя, і ў самой Літве жыло нямала крывічоў, дрыгавічоў, але яшчэ адрознівалі сябе літвіны ад русінаў. І цяпер вось гатовы былі біць адзін аднаго ў братазабойчай вайне, не звяртаючы ўвагі на тое, што ў баі на адной мове прасілі: «Злітуйся, Божа».

ПАХОД НА ЗЯМЛЮ ЛІТОЎСКУЮ

Не, яшчэ нічога не было вырашана. За ім, Свідрыгайлам, немалая сіла, і ён гатовы змагацца за еднасць былога Вялікага княства Літоўскага і Рускага, за яго незалежнасць. Што не пазбегнуць вайны са Свідрыгайлам, добра разумеў і Жыгімонт Кейстутавіч. Перад новым ордэнскім паслом ён абяцае захоўваць саюз з Ордэнам на ўмовах ранейшых пагадненняў Свідрыгайлы, і таму просіць магістра, не ўступаць у зносіны з былым вялікім князем. Свідрыгайла праз пскоўскага князя Васіля Іванавіча звярнуўся да лівонскага магістра, каб той паўплываў на вялікага магістра Паўля фон Росдорфа. «Калі мы адмовім у дапамозе нашаму князю Свідрыгайлу, — пісаў лівонскі магістр Росдорфу, — дык тым адвадзім ад сябе саюзнікаў нашых, і яны лёгка абвінавацяць нас у нявернасці і непастаянстве... Калі князь Жыгімонт пераможа свайго непрыяцеля і Вялікае княства Літоўскае злучыцца з Каралеўствам Польскім, якія могуць быць ад гэтага выгады Ордэну? Пра гэта ваша міласць можа падумаць лепш за нас. Калі ж і без нашай дапамогі справы Свідрыгайлы будуць мець поспех, дык якіх варожых і непрыязных дзеяў павінен чакаць ад яго Ордэн: гэта таксама ўлічыце, ваша міласць, што рускія і татары ўсё яшчэ застаюцца на яго баку»[41]. Усё гэта магістр разумеў, але вось хацеў палавіць у мутнай вадзе рыбы. Моцнае Вялікае княства палохала крыжакоў таксама, як і саюз яго з Польскім каралеўствам. А тут вось-вось успыхне братазабойчая вайна і княства сцячэ крывёю. Выгадна гэта Ордэну? — выгадна. А ў

Свідрыгайлы дастаткова пакуль што і сваіх сіл, каб змагацца з Жыгімонтам. Дык хай б'юцца, і чым болей будзе доўжыцца іх вайна, тым лепш. А для гэтага хай сілы абодвух князёў будуць роўнымі.

Свідрыгайла даволі хутка — за два месяцы — сабраў вялікае войска. Паводле ліста лівонскага магістра, пад яго сцягамі стаяла 20 тысяч татараў, 50 тысяч валахаў і 50 тысяч літвінаў, украінцаў і рускіх[42]. Усе гэтыя лічбы завышаныя (так, Улуг-Мухамед не прыслаў сваіх атрадаў). Лівонскі магістр быў Свідрыгайлавым прыхільнікам і хацеў уразіць Росдорфа тою моцаю, якой валодаў князь. Аднак, калі ўлічыць, што Свідрыгайла выдзеліў 10 тысяч вояў ахоўваць сваю цяжарную жонку*, «каб непрыяцель, уварваўшыся ў замак, не парушыў патрэбнага для парадзіхі спакою»[43], дык войска меў ён немалае. Ваноўскі называе лічбу ў 20 тысяч воінаў[44]. Паводле «Хронікі» Стрыйкоўскага Свідрыгайлава войска складалі палачане, смаляне і цверцы, а пскоўскі летапіс называе палачан, смалян і немцаў[45].

Магістр палічыў слушным наладзіць сувязь з Свідрыгайлам і паслаў да яго Людвіга Ланца. Пакуль той дабіраецца да Свідрыгайлы, абодва варожыя бакі заканчваюць апошнія прыгатаванні да вайны.

Жыгімонт Кейстутавіч адправіў у Польшчу Гаштольда па дапамогу, хоць у Вільні і стаяў польскі гарнізон. Ягайла сам збіраўся на Літву, каб пераканаць Жыгімонта саступіць Свідрыгайлу ўсходнелітвінскія, украінскія і рускія землі, каб такім чынам адвадзіць яго ад Літвы. Даведаўшыся пра гэта, крыжакі раскусілі Ягайлаву задуму. Астэродскі камандор папярэджваў магістра, каб ён параіў Свідрыгайлу не слухацца Ягайлы. «Кароль з уласцівай яму хітрасцю лёгка можа завабіць яго, прадставіўшы, што тое, што ўсё здарылася з Свідрыгайлам, — яму вельмі не даспадобы, і што ён па-брацку готовы саступіць яму Рускія землі яго з тым, каб ён спакойна валодаў імі і не быў даведзены да крайнасці. Калі ж Свідрыгайла пагодзіцца, дык гэта прывядзе яго да згубы. Відаць, палякі звернуцца таксама і да Ордэна з ліслівымі абяцаннямі; але, як звычайна, не стрымаюць свайго слова. Няхай гросмайстар прачытае ўсе летапісы, і ён, мабыць, не знойдзе ні ў адным з іх, каб палякі захоўвалі калі-небудзь дадзенае імі слова»[46].

На Літву Ягайла не паехаў, зразумеўшы, што Свідрыгайла не прызнае Жыгімонта вялікім князем літоўскім. Па чутках, што даходзілі з Вільні, многія феадалы запрашалі Свідрыгайлу

---

*Сын Свідрыгайлы нарадзіўся каля 13 снежня 1432 г., але неўзабаве памёр.

ў зямлю Літоўскую ўзяць пад сваю руку «спадчыну баць-коўскую». Пра гэта прызнаваўся ў сваім лісце да магістра і сам Свідрыгайла[47]. А русіны гатовы былі ісці з Свідрыгай-лам на Літву і «з ім жыць і памерці», — як даносіў магістру Ланц[48].

У кастрычніку 1432 года Свідрыгайла рушыў са сваім войс-кам на Літоўскую зямлю. У Барысаве, апошнім горадзе перад літоўскай мяжою, да яго далучыўся нейкі князь Уладзімір з многімі баярамі, якія прыехалі з Літвы. Тут, у Барысаве, Свідры-гайла даведаўся пра тое, што яго воі захапілі сястру польскай каралевы Софіі Гальшанскай, жонку князя Івана Уладзіміра-віча Бельскага. Толькі з'явілася на літвінскай мяжы войска на чале з Свідрыгайлам, захваляваўся на Літве народ. Жыгімонт абвясціў, што былы вялікі князь загінуў. А тут, вось — ён жывы-здаровы, ды яшчэ з войскам ідзе караць тых, хто адступіўся ад яго. Супраць Жыгімонта склалася змова, якой верхаводзілі троцкі ваявода Манівід і маршалак Румбольд. Нейкім чынам Жыгімонт Кейстутавіч даведаўся пра гэта, і Манівід, і Рум-больд з паплечнікамі паплаціліся сваімі галовамі.

Натоўпы людзей беглі з усёй Літвы да Свідрыгайлы. А ён не спяшаўся, чакаў падыходу лівонскіх крыжакоў, якіх паслаў магістр пасля таго, як Свідрыгайлаў пасол на каленях прасіў аб дапамозе. 80 рыцараў у суправаджэнні 300 вершнікаў праз Пскоў ехалі ў Полацк.

Тым часам на Падоллі паспяхова дзейнічалі атрады Хведа-ра Нясвіжскага і Аляксандра Носа. Ягайла асабіста ўзначаліў польскае войска ў вайне з імі. Партызанскімі наездамі літвіны, а таксама іх саюзнікі татары ды валахі наносілі палякам адчу-вальныя страты. Пасля працяглай аблогі палякі захапілі Алескі замак. Падольскі намеснік Хведар Нясвіжскі, які, па словах Длугаша, «паміж усіх князёў Літвы і Русі вызначыўся вялікаю адвагаю і вайсковаю славаю»[49], 8 снежня падсцярог польскае войска каля вёскі Капестрына на рэчцы Морахвы і, калі яно перапраўлялася цераз раку, напаў на ворага. Палякі кінуліся ратавацца. Хто па пераправе, а хто па крохкім лёдзе, які ла-маўся пад іх нагамі, уцякалі на другі бераг. Частка польскіх вояў, загнаўшы вазы ў балоцістую мясціну, перавярнула іх і прыняла бой. Хведар Нясвіжскі акружыў польскі лагер і штур-мам захапіў яго. «Русь отвсюль нагревала, бючи, топячи, има-ючы поляков»[50]. Польскае войска было б разбіта, калі б русі-ны не кінуліся рабаваць польскі абоз. Тут па ім і ўдарыла з тылу харугва ў 100 вершнікаў, якая вярталася са збору фура-жу. Русіны, згубіўшы баявы парадак, уцяклі. Палякі прыпісалі сабе перамогу, хоць Свідрыгайла пахваляўся, што яны страцілі 12 тысяч чалавек, сярод іх 350 рыцараў.

Прастаяўшы з войскам у Барысаве каля месяца, Свідрыгайла перайшоў літвінскую мяжу. Тысячы людзей сцякаліся ў яго войска. 10 лістапада ён спыніўся за 14 міляў ад Вільні. Пасланыя ім вестуны прыбылі пад гарадскія сцены і нагадалі віленцам пра клятву былому вялікаму князю. Разлічваў Свідрыгайла, што жыхары пяройдуць на яго бок. Ужо многія мястэчкі і цвержы добраахвотна здаліся яму, у тым ліку і Коўна, але гэта было ў асноўным на паўночна-заходніх літвінскіх землях, дзе пераважалі праваслаўныя, а ў Вільні сабраліся Жыгімонтавы прыхільнікі, і Свідрыгайла адступіў у Ашмяны. Для ўзяцца моцных віленскіх цвержаў не хапала гармат, і таму ён у лісце да лівонскага магістра, які меў намер прыехаць да яго, прасіў іх прывесці. Давялося чакаць падыходу крыжакоў. Тут, у Ашмянах, князь даведаўся, што яго жонка нарадзіла сына. Здавалася, што лёс зноў зміласцівіўся з яго, і гэтая вось спроба вярнуць віленскі пасад закончыцца ўдачаю.

Відаць, Жыгімонт улавіў нерашучасць Свідрыгайлы і вырашыў даць яму бой. У «Хроніцы Быхаўца» наступныя падзеі апісваюцца так. «І князь вялікі Жыгімонт прыйшоў з Вільні з літоўскаю сілаю, у сем тысяч*. І была ў іх сеча месяца студня восьмага дня ў панядзелак, і дапамог Бог вялікаму князю Жыгімонту і пабеглі князі і баяры вялікага князя Свідрыгайлы, а князёў рускіх многіх забілі, а некаторых забралі ў палон: князя Юрыя Лугвенавіча, князя Мітку Зубравіцкага, князя Васіля Чырвонага, брата яго Дэдыголдавіча пана віленскага, пана Юшку Гальцэвіча, пана Івана Вяжэвіча»[51]. Пра гэтую сечу дабаўляе і «Хроніка Літоўская і Жамойцкая». Тое, што Свідрыгайла «коне переменяючи в малой дружине на Киев ледво утёк», і што войска яго лягло 32 тысячы, і што ў палон трапілі яшчэ маршалак Румбольд і Манівід, ваявода троцкі[52]. Стрыйкоўскі таксама піша пра паражэнне Свідрыгайлы, пра 10 тысяч забітых і чатыры тысячы палонных, сярод якіх Дэдыгольд, Манівід, Румбальд, Хведар Адынцэвіч, і князь Юрый Сымонавіч[53].

Так распавядаюць летапісы. Але мы ўжо не раз пераконваліся, колькі недакладнасцей сустракаецца ў іх.

Звернемся да дакументаў. Адзначым, што ні Манівіда, ні Румбальда Жыгімонт не мог захапіць у палон у гэтай бітве, бо яны былі ўжо ім пакараныя. Нельга прыпісаць Жыгімонту і перамогу ў бітве, хаця ў лісце да магістра ён і ўпэўнівае, што Свідрыгайла разбіты і, толькі дзякуючы цемры, уцёк[54]. Аднак і Свідрыгайла прыпісвае перамогу сабе і таксама ўпэўнівае ма-

---

*Гэтай «літоўскай» сілай, паводле Пскоўскага летапісу, былі жамойты: «Жыгімонт скапіў сабе зімаіты» (ПЛ. Вып. 2. С. 122).

гістра, што «не згубіў у бітве і дваццаць добрых воінаў, і няхай непрыяцель хваліцца поспехамі сваімі колькі хоча: супраць аднаго рускага воя, які застаўся на полі, лягло шэсць літвінаў»[55]. Так, што калі Свідрыгайла і не перамог Жыгімонта, то і небыў разбіты, і ні ў які Кіеў ён не ўцёк, а па-ранейшаму знаходзіўся ў Літоўскай зямлі ў той час, калі Жыгімонт схаваўся ў Вільні.

Пад Ашмянамі ні Жыгімонт ні Свідрыгайла не дамагліся свайго. Жыгімонту так і не ўдалося выгнаць ворага са сваёй дзяржавы. А Свідрыгайла, хаця і не пакінуў Літвы, на штурм Вільні не адважыўся. 21 студзеня ў Вентвішкі, куды ў гэты час перабраўся князь, прыязджае ордэнскі пасол Людвіг Ленц. Свідрыгайла гатоў на любыя ўмовы, толькі б Ордэн падтрымаў яго. І крыжакі не прамінулі выпадку, каб не выгандляваць сабе зямельных уступак. Свідрыгайла ідзе і на гэта — перадае Ордэну Палангу. Аднак магістр вёў сваю гульню — нікому не дапамагаць, каб ні ў Жыгімонта ні ў Свідрыгайлы не было перавагі адзін над адным. Стары прыём: падзяляй і ўладар. Так і не дачакаўшыся ордэнскай дапамогі, Свідрыгайла ў канцы студзеня вярнуўся ў Полацк. Усю вясну ён збіраў сілы для новага паходу на княства Літоўскае. Татарскі хан Улуг-Мухамед паведамляў князю, што ён па першым яго знаку гатовы з усім войскам «сесці на коней» і разам з кіеўскім князем Міхайлам прыйсці да яго[56]. Свае абяцанні хан падмацаваў прысылкаю тумена вояў. Перамяніла свае адносіны да Свідрыгайлы і Жамойць. Жамойцкія феадалы, абрадаваныя расколам Вялікага княства, марылі скарыстацца момантам і аддзяліцца ад літвінскай дзяржавы. Самаўпэўнена яны заяўлялі, што калі толькі Свідрыгайла прышле ім некалькі сваіх харугваў, дык жамойты скораць усю зямлю Літоўскую і выдадуць яму Жыгімонтавых набліжаных. З далейшых падзей вынікае, што ўсе іх заявы нішто іншае, як пустая пахвальба.

На гэты час прыпадае спроба Свідрыгайлы заключыць перамір'е з княствам Літоўскім. Жыгімонт ні на якія мірныя перамовы не згаджаўся. Сумны лёс чакаў Свідрыгайлавых паслоў — іх па загаду Жыгімонта ўтапілі ў рацэ. Не меней жорстка ён расправіўся і са сваімі пасламі, якія вярнуліся ад Свідрыгайлы: іх таксама кінулі на рачное дно. А паслы, накіраваныя Свідрыгайлам да польскага караля Ягайлы, былі звязенены і перададзены Жыгімонту. Іх чакала смерць. Ні Жыгімонт, ні Ягайла не прызнавалі Свідрыгайлы, не жадалі з ім весці ніякіх перамоў. Па-ранейшаму цямніў магістр. Ён не казаў цвёрдага «Так, падтрымаю», але і не выракаўся свайго былога саюзніка. Лівонцы — тыя засталіся вернымі Свідрыгайлу і зноў хадзілі на Аўкштайцію, дзе, як звычайна, пралілі нямала крыві і спалілі не адно сяло.

Калі на Літве наступіў кароткі мір, дык на Валыні і Падоллі не сціхалі баі. Луцкі староста Аляксандр Нос летам каля мястэчка Сампуры разбіў буйны польскі атрад і захапіў у палон 500 вершнікаў. Князь Хведка Нясвіжскі з чатырма тысячамі татар ваяваў на Падоллі і ў адным з баёў паланіў камянецкага старасту Фрыдрыха Бучацкага. Пасля, аб'яднаўшыся, яны адваявалі ў палякаў Брацлаў і Мельнік. Свідрыгайлавы атрады кантралявалі Берасцейшчыну, Наваградскую, Слуцкую і Клецкую землі. Але гэтыя поспехі азмрочыла здрада Валахіі, якая перайшла на бок Польшчы. І цяпер Свідрыгайла чакаў валашскіх набегаў на Падолле і Валынь.

«...ЗЛА НЯМАЛА ЗРАБІЛІ»

Трэба думаць, што ў канцы вясны князь зноў выступіў на княства Літоўскае, бо ў данясенні ордэнскага обер-маршала магістру нагадваецца, што Свідрыгайла і Жыгімонт са шматлікімі войскамі стаялі адзін супраць аднаго (дзе — не ўказваецца) і пастанавілі даць сечу ў дзень св. Барталамея (24 жніўня). Калі меркаваць, што крыжакі нічога не ведалі пра гэтую бітву, дык яна і не адбылася. Відаць, абодва князі не ўпэўненыя ў сваіх сілах, вырашылі лішні раз не рызыкаваць, а заручыцца падтрымкаю саюзнікаў. Хто быў сябрам Жыгімонтавым, ясна — Польшча. Свідрыгайлу, апроч літвінаў, украінцаў, рускіх, татар, лівонцаў, падтрымаў яшчэ і мазавецкі князь Уладзіслаў. І тут Свідрыгайла ішоў на ахвяры, абяцаў князю вярнуць яму «аднятыя Вітаўтам у бацькі яго землі»[57]. Гаворка тут не пра Падляшша і Берасцейшчыну, заваяваныя некалі мазавецкім князем Янушам, а пасля вернутыя Ягайлам, а пра нейкія іншыя землі. З дакументаў не вынікае, якія землі і калі адарваў ад Мазовіі Вітаўт. Можа быць, цвержу Візну, закладзеную ў свой час князем Янушам, Ордэну.

Па-ранейшаму на Свідрыгайлаў бок пераходзілі феадалы Вялікага княства Літоўскага. Так, баярын Страміла, які ўваходзіў у Вітаўтаву раду, пакрыўджаны на Жыгімонта за тое, што той не плаціў яму за службу, «прасіў нас (Свідрыгайлу. — *В.Ч.*), каб не злаваліся на яго за тое, што ён да гэтага часу знаходзіўся супроць нас у саюзе з Жыгімонтам, і прапаноўваў нам разам з братам свае паслугі»[58]. Нейкі баярын Рог прасіўся да князя на службу, абяцаючы прывесці з сабою 600 вершнікаў і 200 драбаў* і патрабаваў жалаванне 60 000 грошай. Свідрыгайла згадзіўся, хоць грошы не малыя. Не думаю,

*Драб — пешы воін у феадальным шляхецкім апалчэнні.

што князь меў іх, бо ўся яго скарбніца ў Вільні стала здабычаю Жыгімонта. Хто мог утрымліваць войска? Нагадаем, як некалі князь Брачыслаў казаў варагам, якія прасіліся да яго на службу, што грошы на жалаванне яму дае Полацк. Вось у такім становішчы апынуўся і Свідрыгайла. Абвешчаны ў Полацку вялікім князем рускім, ён атрымліваў ад палачан, а таксама з другіх усходнелітвінскіх, украінскіх і рускіх гарадоў плату. Як і ў былыя часы, палачане верхаводзілі ў вялікай палітыцы. Хто-хто, але толькі не яны былі зацікаўлены ў падначаленні Вялікага княства Літоўскага і рускага польскай кароне.

Нагадаю і пра цікавае паведамленне Астародскага камандора ад 23 красавіка пра тое, што народ натоўпамі бяжыць да Свідрыгайлы з Літоўскай зямлі; ад чаго палякі ў вялікім жаху, а Жыгімонт звар'яцеў, баючыся, каб яны не пакінулі яго[59].

Жыгімонт не звар'яцеў, а вось спакой страціў. Можа, і не ўяўляў ён, калі даваў згоду стаць вялікім князем, што столькі турбот будзе каштаваць яму вялікае княжанне. Ён траціць вытрымку. Жорстка распраўляецца з пасламі свайго непрыяцеля, а тых, каго ён западозрыў у нявернасці, чакае смерць. Нават шчырыя яго прыхільнікі, што кляліся змагацца са Свідрыгайлам, і тыя баяліся яго. Ніхто з іх не мог быць упэўненым, што заўтра князеў гнеў не ўпадзе на іх. Адна намова якога зайздросніка... і галава з плеч. Трымаўся ён толькі, дзякуючы клопату палякаў, якія давалі яму войскі і грошы (запазычыў ім ажно 100 тысяч коп). Таму зразумела яго прыніжанасць перад Ягайлам. «Брат ваш меншы, вялікі князь Жыгімонт чалом б'е», — так рабалепна кланяўся ён у граматах Ягайлу.

Так адбываліся падзеі перад другім Свідрыгайлавым паходам на зямлю Літоўскую, на які ён ускладаў нямалыя надзеі. Па папярэдняй дамоўленасці яго павінны былі падтрымаць лівонскія рыцары, татары, цвярскі князь Барыс, з сястрою якога быў ён жанаты. Падбіваў Свідрыгайла выступіць супраць Польшчы і прускіх рыцараў. Як гэта часта бывае ў жыцці, усё пайшло зусім не так, як думалася яму. Лівонцы першыя напалі на княства Літоўскае. Магістр Цызе фон Рутэнберг са сваім войскам дванаццаць тыдняў паліў і спусташаў аўкштайцкія сёлы. Перамагла крыжакоў хвароба. У войску ўспыхнула эпідэмія. Ад крываўкі, адзін за адным, паміралі рыцары. Магістр павёў войска ў Рыгу і па дарозе сам памёр ад хваробы.

Свідрыгайла так і не дачакаўся татарскіх атрадаў. Пасла Свідрыгайлы Івана Манівідавіча татары аблаялі, маўляў, яго пан аблудліва іх падмануў і яны ніколі не будуць ні за якія дары ваяваць супраць Вітаўтава брата і караля польскага. Пэўна, Улуг-Мухамед, зацікаўлены ў раздзьмухванні полымя вайны паміж Свідрыгайлам і Жыгімонтам, аддаў перавагу апош-

няму. Хаця Стрыйкоўскі піша, што ў Свідрыгайлавым войску знаходзіліся і татары[60]. Мабыць, гэта былі загоны ўнука Тахтамыша Сеід-Ахмеда, непадуладнага Залатой Ардзе. Вёў з сабой князь полацкія, маскоўскія, цвярскія, северскія, кіеўскія і смаленскія палкі[61]. У жніўні ён рушыў на Літву. Пэўна, перш за ўсё ён павёў войска ў Жамойць, спадзеючыся на тое, што жамойты падтрымаюць яго. Перапужаны Жыгімонт з купкай сваіх паплечнікаў хаваўся ў глухіх лясах. Вільню застаўся абараняць польскі гарнізон. Як і раней, натоўпы простага люду і многія баяры падаліся да былога свайго гаспадара. Свідрыгайла авалодаў Коўнам, перабіў там польскіх ваяроў. Захапіў яшчэ адну цвержу Кранве, якую перадаў лівонцам. Як высветлілася, жамойты не жадалі прымаць ніякага ўдзелу ў вайне і адмовіліся дапамагаць як Жыгімонту, так і Свідрыгайлу. Таму князь, абцяжараны вялікім палонам, павярнуў назад да сваіх межаў. Так пра гэты паход распавядаў у сваім данясенні Рагніцкі камандор[62]. Інакш яго падае «Хроніка Быхаўца», паводле якой, Свідрыгайла падыходзіў да Вільні, але абмінуў горад. Чатыры дні прастаяў ён пад Трокамі, пэўна, спадзяваўся, што яму адчыняць браму. Але ж і Трокі абаранялі палякі і ведалі, што літасці ад Свідрыгайлы не дачакаешся. Яшчэ чатыры дні князь знаходзіўся ў Эйшышках, пакуль яго віжы рыскалі па пушчах у пошуках Жыгімонта. Адсюль ён выступіў пад Крэва і штурмам захапіў замак. Каля Маладзечна яму паведамілі, што Жыгімонт паслаў войска ў пагоню. Свідрыгайла выслаў насустрач сваё пад зверхнасцю кіеўскага князя Міхайлы. Каля вёсачкі Капачы, паблізу ад Маладзечна, ягонае войска разбіла Жыгімонтаву пагоню. Па дарозе Свідрыгайла спаліў Заслаўе і Менск, «і шмат воласцей і вёсак і зла нямала зрабілі ў Літоўскай зямлі»[63]. Зла зрабіў шмат. Калі не ў адкрытай сечы разбіў Жыгімонт, то ператварыў яго край у папялішча. Жыгімонт слёзна наракаў у лісце да Ягайлы: «Зямля наша спустошана з іх (Свідрыгайлы. — *В.Ч.*) прычыны, усе месцы падданыя ў нас адабраў, а таксама мёд, срэбра, куніцу і ўсякую даніну. Не ведаю з чым прыйдзецца да зімы выжываць»[64]. Адначасова дружыны Хведара Нясвіжскага, Аляксандра Носа і Юршы занялі Пружаны, Кобрын, Здзітаў, Клецк і Слонімскую воласць. Свідрыгайла авалодаў большай часткай Літвы, але толькі смерць Жыгімонта прынесла б яму ўладу ва ўсёй дзяржаве. Свідрыгайла спыніўся ў Лукомлі. Тут ён даведаўся, што непадалёк у сваім маёнтку дажывае старасць князь Міхайла Іванавіч Гальшанскі, брат яго найзлейшага ворага Сымона Гальшанскага. І хоць Міхайла не выступаў супраць Свідрыгайлы, усё роўна гэта не выратавала яго. Аслеплены гневам Свідрыгайла расправіўся над старым — загадаў утапіць яго ў Дзвіне. У сваёй

жорсткасці Свідрыгайла нічым не адрозніваўся ад Жыгімонта. Абодва гатовы былі за ўладу праліць рэкі крыві.

Галоўнага Свідрыгайла не дамогся: не авалодаў Вільняй, не расправіўся з Жыгімонтам — вайна паміж імі працягвалася. Свідрыгайла чакаў удару ў адказ. Па словах Юрыя Лугвенавіча, які ўцёк з вязніцы, Жыгімонт узбройвае супраць яго літвінаў. Палякі збіраліся напасці на Луцк. Усё складаней было весці вайну на два франты. Не падазраваў ён і таго, што паміж Ордэнам і Польшчаю ідуць патаемныя перамовы аб заключэнні міру: верыў у крыжацкую дапамогу. А што заставалася рабіць прускім рыцарам? Ягайла з'яднаўся з гусітамі і разам з імі спустошыў Памеранію, дзе ацалелі толькі чатыры сёлы. Каб уратаваць Ордэн ад разгрому, магістр запрасіў міру. У канцы 1433 года Польшча і Ордэн замірыліся на 12 гадоў. Імператар Жыгімонт, як даведаўся пра гэта, дык разразіўся пагрозамі ў бок магістра, прадракаючы Ордэну пагубу ад саюзу з Польшчаю. Імператар пагражаў забраць у Ордэна землі і пазбавіць усіх прывілеяў, атрыманых ад Рымскай імперыі, калі магістр не разарве ганебны мір з палякамі і не паспяшае на дапамогу Свідрыгайлу. Нічога падобнага — не паспяшалі крыжакі ваяваць за свайго былога саюзніка, не выракліся і міру з Польшчаю. Была ўсё ж для прыліку і спроба заступіцца за Свідрыгайлу: прасіў магістр Жыгімонта Кейстутавіча даць стрыечнаму брату «хоць некалькі вобласцей». Адказ Жыгімонта: не!

І толькі лівонскія рыцары засталіся вернымі Свідрыгайлу. У адрозненне ад прускіх рыцараў, лівонцы не пацярпелі ад грунвальдскай катастрофы. Іх скарбніца па-ранейшаму багацела. Шэрагі Лівонскага ордэна папаўняліся новымі сябрамі. Вялікі магістр раз за разам клянчыў у лівонцаў сродкаў. А гэта ўжо прызнанне сваёй кволасці. Лівоніі была ў цяжар залежнасць ад аслабленай Прусіі. А тут здарылася нагода заявіць пра сваю незалежнасць, што новы лівонскі магістр Франк фон Керсдорф і зрабіў. А раз незалежны, дык і вялікі магістр не ўказ.

Свідрыгайла яшчэ не ведаў пра ордэнскую здраду і шчыра паведамляў у лістах да Ордэна пра свае справы. Так, у красавіку 1434 года князь пісаў з Вязьмы*, што да яго прыехаў пасол татарскага хана, «узведзенага намі на пасад»[65] і перадаў, што хан ідзе з войскам у Кіеўскую зямлю і чакае далейшых яго, Свідрыгайлы, загадаў. З гэтага ліста мы даведаемся, што на Падоллі нейкі князь Вятка разбіў польскі атрад. У другім лісце, ужо са Смаленска, Свідрыгайла пісаў, што ягоныя падданыя на мяжы даносілі пра намер палякаў на Тройцу вынішчыць

*Тут ён вёў перамовы з маскоўскім князем Юрыем Дзмітрыевічам і дамовіўся з ім пра саюз.

агнём і мячом або голадам Луцк і Крамянец, злучыцца з літвінамі, напасці на ягоныя землі. А Бранскі намеснік Няміра прыбыў да яго ад татарскага хана Сеід-Ахмеда разам з вялікім князем гэтага хана Бато. Паслы данеслі яму, што хан з моцным войскам і з усімі сваімі князямі і ваяводамі падрыхтаваўся ўжо да паходу. Таму па радзе князёў сваіх і вяльмож ён, Свідрыгайла, адправіў Сеід-Ахмеду Манівідавіча (сына Манівіда. — *В.Ч.*) з прапановаю татарам ісці да польскай мяжы і ахоўваць гарады і замкі; у той жа час ён сам з іншымі саюзнымі войскамі рушыць у зямлю Літоўскую. Даведваемся з ліста, што вялікі князь маскоўскі прыслаў да Свідрыгайлы сына свайго са шматлікім войскам, таксама і князь цвярскі і князі Адоеўскія, «якіх папярэднікі нашыя ніколі не маглі мець сваімі саюзнікамі, хан аддаў нам сваіх князёў Адоеўскіх і землі іх у нашае валоданне і асабіста зацвердзіў іх за намі»[66].

На заканчэнне Свідрыгайла прасіў крыжакоў ударыць па паляках. «Калі мы такім чынам будзем дапамагаць адзін аднаму, як давалі ў тым абет і кляліся разам з падуладнымі нам, тады з Божай ласкі лёгка можам супрацьстаяць ворагам нашым»[67]. З гэтага пісьмовага сведчання мы бачым, як рыхтаваўся Свідрыгайла да новага паходу на княства Літоўскае. Яму ўдалося паставіць пад свае сцягі маскоўскія, цвярскія, адоеўскія палкі. І па-ранейшаму спадзяваўся ён на Ордэн, які ўжо здрадзіў яму. Яшчэ адна цікавая звестка. З лістоў вынікае, што Свідрыгайла ў той час, калі быў вялікім князем у Полацку, узвёў на пасад хана Сеід-Ахмеда. Мы памятаем, што хан Залатой Арды Улуг-Мухамед здрадзіў Свідрыгайлу і падтрымаў яго праціўніка. Каб нейтралізаваць Арду, Свідрыгайла ў 1433 годзе на прычарнаморскіх землях паміж Дняпром і Донам стварыў новае ханства, на якое і пасадзіў Сеід-Ахмеда. Гэта быў унук Тахтамыша, які нарадзіўся і рос у Літве. Новы хан саступіў Свідрыгайлу Адоеўскія землі і як яго саюзнік увесь час падтрымліваў у вайне з Жыгімонтам.

НЯЎДАЧЫ СВІДРЫГАЙЛЫ

Пра падрыхтоўку Свідрыгайлы да новага паходу добра ведалі ў Вільні. Пазбаўлены народнай падтрымкі, Жыгімонт прасіў Ягайлу прыехаць на Літву, каб падняць аўтарытэт сваёй улады ў вачах простага люду. Баяўся ён зносін Ягайлы са Свідрыгайлам. На радзе са сваімі набліжонымі ажно расплакаўся: «Хацеў, каб кароль нас сам пакараў, калі яго такая воля, чым нас яму выдаў, калі згоду з ім чыніць. Хоць нават Бог хацеў бы той згоды з Свідрыгайлам, то мы да таго не дапусцім, і тыя крыў-

ды бязмерныя на сябе прынятыя, адпомсцім, бо зямля наша праз іх спустошана»[68]. Стары кароль пацягнуўся ў нялёгкае ў ягоных гадах падарожжа. Гэта было апошняе яго наведванне Бацькаўшчыны. Стары кароль перажываў за брата: «Праўда і горкая праўда, што Свідрыгайла вельмі вінаваты, але майго роднага брата не магу асудзіць, ані перанесці таго на маім сэрцы, каб зычыць яму вялікія крыўды. Да Бога і суда яго аддаюся, абы паправіў сэрца нашага брата, альбо невыпраўленага пакараў. Што да мяне, дык пакуль жыву не перастану быць яму братам і любіць яго як роднага брата», — казаў ён[69]. Але вялікім князем загадаў прызнаваць Жыгімонта. Жыгімонт яшчэ раз пацвердзіў сваю адданасць Польшчы і 27 лютага аднавіў акт уніі 1432 года. Насуперак яго жаданню Ягайла хацеў змірыцца са Свідрыгайлам. Той адказаў, што без згоды саюзнікаў не да якіх перамоў не прыступіць. Так і не запанаваў на Літве мір і спакой.

Ягайла вярнуўся ў Польшчу. А ў маі ён памёр. Здарылася гэта па дарозе ў Галіцыю, куды ехаў кароль, каб прыняць прысягу ад валашскага гаспадара Стафана. У Перамышльскай зямлі на берагах Саны (правы прыток Віслы) каля вёскі Медыні, спыніўся Ягайла адпачыць. І пачуў вечарам дзіўныя салаўіныя спевы. Кароль падкраўся да дрэва, дзе спявала птушка, і прысеў на зямлю. Зачараваны, ён некалькі гадзін слухаў салаўя, пакуль не апусціліся поцемкі і холад прабраў яго да касцей. Наступным днём ён так і не падняўся з ложка. Васьмідзесяцігадовы кароль не перамог хваробы. 31 мая Ягайлы не стала*. З мястэчка Гродэка, дзе кароль памёр, яго цела адправілі ў Кракаў і пахавалі там у саборы св. Станіслава.

Пасля смерці Ягайлы на польскі каралеўскі пасад 18 чэрвеня ўзвялі яго старэйшага сына Уладзіслава. Улада апынулася ў руках кароннай рады на чале са Збігневам Аляснідкім — лютым ворагам незалежнасці Вялікага княства Літоўскага і Рускага.

Жыгімонт Кейстутавіч, баючыся, каб у яго адсутнасць да Вільні не заявіўся Свідрыгайла, на сойм, дзе выбіралі новага караля, не паехаў, а адправіў туды паслоў, якія ад яго імя пацвердзілі ўсе ранейшыя дамовы з Польшчаю. Сам ён з польска-літвінскім войскам выступіў на княства Рускае. У «Хроніцы Быхаўца» ёсць узгадка пра гэты паход: «І ў тую восень князь вялікі Жыгімонт сабраў вялікую сілу літоўскую і польскую, пайшоў на Рускую зямлю і стаў пад Мсціслаўлем, прастаяўшы там тры тыдні і не авалодаўшы замкам, пайшоў у сваю зямлю»[70].

Летапісец і на гэты раз падаў недакладныя звесткі. Так, з перапіскі рыжскага камандора з вялікім магістрам даведваем-

*Па іншых звестках Ягайла памёр 1 чэрвеня.

ся, што паход пачаўся ў чэрвені (ліст памечаны 6 чэрвеня)[71], а не восенню. Ёсць у лісце і цікавыя падрабязнасці пра тыя падзеі. Камандор пісаў, што, па чутках, Жыгімонтаў сын Міхайла пакінуў свайго бацьку і з 200 вершнікамі і 60 баярамі перайшоў да Свідрыгайлы, а баярын Страміла ўцёк ад Жыгімонта. Адзначу, што ў крыніцах няма сведчанняў пра пераход Міхайлы Жыгімонтавіча да Свідрыгайлы. Але падобныя чуткі не маглі нарадзіцца проста так. Відаць, паміж бацькам і сынам узніклі непаразуменні, і Міхайла не ўдзельнічаў у паходзе. Хадзіў Жыгімонт не пад Мсціслаўль, а пад Віцебск, пра што паведамляў магістру лівонскі ландмаршал[72]. Свідрыгайла ў той час збіраў супраць ворага войска. Лівонскія рыцары скарысталіся адсутнасцю Жыгімонта і напалі на Жамойць. Але ўдача здрадзіла ім. У бітве з жамойтамі крыжакі страцілі восем соцень чалавек і толькі ўцёкамі рэштка рыцараў выратавалася. Гэта быў адчувальны ўдар і па Свідрыгайлу, які ўжо не мог разлічваць на дзейсную дапамогу аслабленага Лівонскага ордэна.

Жыгімонт пастараўся замацаваць сваю перамогу і павёў патаемныя перамовы з рыжскім архібіскупам супраць рыцараў. Паступова палітычнае становішча складвалася на карысць Жыгімонта, хоць пад Віцебскам ён так нічога і не дамогся. Невядома ці падыход Свідрыгайлавага войска да Віцебска, ці няўдачы самога Жыгімонта пры ўзяцці горада вымусілі яго зняць аблогу. Аднак ясна, што польска-літвінскае войска сустрэла на Віцебшчыне адчайнае супраціўленне. Ужо калі пскавічы на Жыгімонтава патрабаванне пакоры адказалі, што яны гатовы «пакласці галовы свае за Свідрыгайлу»[73], дык што тут казаць пра віцьбічаў, якія паклалі ўжо не адну галаву за свайго абаронцу. Увосень Жыгімонт вярнуўся ў Вільню. Паход не прынёс і яму рашучай перавагі. Свідрыгайла па-ранейшаму, дзякуючы падтрымцы праваслаўных, заставаўся моцным і ўся барацьба паміж імі яшчэ была наперадзе. Адзінай удачай быў палон Свідрыгайлавай жонкі. Княгіню Софію Жыгімонт кінуў у вязніцу. Міласэрнасцю князь не вызначаўся.

У справу ўмяшаўся папа Яўген. Ён патрабаваў заключыць мір са Свідрыгайлам і вызваліць яго жонку. «Самыя паганскія заваёўнікі, беручы гарады, шкадавалі жонак і адпускалі іх з гонарам у свае дамы: тым больш абавязаны рабіць гэта ўладары хрысціянскія», — пісаў у сваёй буле ад 13 лістапада папа[74]. Відаць, польскі стаўленік у Вільні быў больш жорсткі за «самых паганскіх заваёўнікаў». І для яго апекуна з Кракава Збігнева Аляснцкага хрысціянскія запаветы — не ўказ: галоўнае — перамога над Свідрыгайлам, любым коштам.

Жыгімонтаў разлік, што яго непрыяцель пойдзе на ўступкі, каб вызваліць сваю жонку, не спраўдзіўся. Свідрыгайла такса-

ма далёкі ад ідэалу. Пры жывой жонцы, калі яна нават у палоне, ужо немалады князь задумаў уступіць у шлюб з дачкою малдаўскага гаспадара, каб такім чынам прыдбаць сабе яшчэ аднаго саюзніка і адарваць Малдавію ад Польшчы і Турцыі.

З намерам гэтым Свідрыгайла азнаёміў імператара Жыгімонта I. Той падтрымаў князя і, як заўсёды, шчодра абяцаў аддзякаваць за дапамогу супраць туркаў. Імператару Жыгімонту I і самому прыходзілася нялёгка: ледзь паспяваў збіраць войскі супраць гусітаў і туркаў. А вось каралеўскую карону Свідрыгайлу прапаноўваў. Паведамляў, што, нягледзячы на сваю занятасць, сам прыедзе вянчаць Свідрыгайлу на каралеўства. На жаль, імператар так і не знайшоў часу выканаць свой намер. Хто ведае, як адбываліся б наступныя падзеі і ўвогле як пайшла б нашая гісторыя, калі б Свідрыгайла ў Полацку каранаваўся. Але гісторыя не ведае ўмоўнага ладу. І тагачасныя падзеі ішлі сваім парадкам.

У 1434 годзе Свідрыгайла распачаў справу, поспех якой мог даць яму важкі козыр у змаганні з Жыгімонтам. Князь захацеў ажыццявіць даўнюю Вітаўтаву мару — унію каталіцкай і праваслаўнай царквы. Гэтым Свідрыгайла заваяваў бы падтрымку папы рымскага, нейтралізаваў бы каталіцкі касцёл у Літве, які падтрымліваў Жыгімонта Кейстутавіча і палякаў. Князь знайшоў чалавека, які браўся абладзіць унію, — літоўскі мітрапаліт Герасім. Пра Свідрыгайлаў намер ведалі і ў Рыме. Папа ў сваёй буле заахвочваў князя да уніі і дадаваў: калі Свідрыгайла дасягне мэты, дык дакажа, «што ён выбраны Богам на дабро свайго народа»[75]. Папа раіў сабраць на сабор літвінскіх, украінскіх і рускіх епіскапаў, каб Герасім атрымаў на ім паўнамоцтвы весці перамовы з Рымскай курыяй. Свідрыгайлу ўдалося склікаць такі сабор, і 26 мая 1434 года ў Ноўгарадзе архірэі, што прыехалі туды, абвясцілі Герасіма і мітрапалітам Маскоўскім. Аднак мітрапаліт Маскоўскі Фоцій успрацівіўся гэтаму выбранню. І Герасім так і не быў узведзены ў новы сан. Гэтая няўдача астудзіла Свідрыгайлу. У крыніцах мы не знаходзім звестак аб новых спробах князя ўчыніць унію. А славалюбны Герасім звязвае свае надзеі з Жыгімонтам. Паміж імі наладжваецца патаемная сувязь. Герасім гатовы арганізаваць змову супраць Свідрыгайлы і падбіць на яго праваслаўных.

А настрой іх мяняўся. Вось ужо чацвёрты год палыхала міжусобная вайна. Лілася кроў, прыбаўлялася на могілках крыжоў, пад якімі знаходзілі супакой забітыя ў бітвах. Воі рабавалі і чужых і сваіх. Многія сяляне падаліся ў разбой. А тут яшчэ голад. «Был голод великий, по селам и по городам зверь людей ядал, а в городе Смоленску по посаду и по улицам люди людей ядали, псы головы, руки и ноги человечи волачивались по се-



Князь Алелька Слуцкі. *XVI ст.*

лам и по волостям, и в то время четверть была жита по три копы грошей. И много лиха того лета учинилося во всей земли Литовской, и много пролития крови сталося, брат брата роженаго убивал, и моры были сильные. О таковом страху люди старые не могут паметовати», — пісаў летапісец[76]. Людзі стаміліся ад вайны. А Свідрыгайла і чуць не хацеў пра мір. А што ж удзельным князям, як ім не лічыцца з настроем сваіх падданых? У пачатку верасня Аляксандр Нос выйшаў з вайны

і паслаў прымірэнчую грамату да Жыгімонта. З Вільні ў Луцк адправіўся Гаштольд, каб прыняць кіраванне Луцкаю зямлёю. Хвалявaліся людзі ў Кіеве. Жыгімонт паслаў туды князя Алельку. Свідрыгайла апярэдзіў яго — туды паспеў Івашка Манівідавіч: угаворамі і заклікамі суцішыў гнеўных кіян. Свідрыгайла стаў падазраваць многіх сваіх прыхільнікаў у здрадзе. У падазрэнне трапіў і верны Хведар Нясвіжскі. Яго схапілі і кінулі ў вязніцу. Вось як ён адазваўся пра свайго былога гаспадара: «Свідрыгайла не памятаў маёй вернай службы і загадаў з намовы маіх ворагаў мяне нявінна і бяспраўна звязеніць і пакараць, а жонку маю і дзяцей пазбавіць маёмасці, каб забраць маю годнасць»[77]. Гнеў дрэнны дарадчык. Свідрыгайлавы пралікі адразу ж скарысталі палякі. Староста камянецкі Міхайла Бучацкі вызваліў вязня з Крамянецкага замка. Хведар Нясвіжскі прызнаў сябе польскім васалам. Так Свідрыгайла пазбавіўся бліжэйшых сваіх паплечнікаў.

Такія падзеі адбываліся ў 1434 годзе. «Хроніка Быхаўца» нагадвае яшчэ пра паход Свідрыгайлы на Літву. Але далей як да Браслава, дзе да яго далучыліся лівонскія рыцары, князь з-за дажджоў не дайшоў. Згадак пра гэты паход няма ні ў крыжацкіх дакументах, ні ў Свідрыгайлавых лістах, ні ў лівонскай хроніцы Русава, аднак адмаўляць верагоднасць падобнай акцыі не варта.

Князь у Віцебску стаў чакаць зімы. Яму ўдалося сабраць шматлікае войска з княства Рускага, прыйшлі цвярскія дружыны, прывёў чэхаў, славакаў, ракушан Жыгімонт Карыбутавіч. Больш за 20 тысяч вояў абяцаў прывесці да Свідрыгайлы лівонскі магістр. Падтрымаў вялікага князя Рускага і хан Сеід-Ахмед, які асабіста прыехаў у Віцебск. Перад самым паходам смаленскі намеснік Юрый Бутрым выкрыў змову Герасіма. І Свідрыгайла робіць чарговую памылку. Замест таго, каб неяк паладзіць з Герасімам, князь у гневе загадвае спаліць яго на вогнішчы ў Віцебску. Якія б там ні былі апраўданні гэтага ўчынку, а жорсткая кара над праваслаўным святаром настроіла супраць Свідрыгайлы просты праваслаўны люд. А з якім настроем ішлі ў бой тыя, якія бачылі ў князя змагара за праваслаўе? Расчараванне, жаль, туга. З такім настроем не перамагчы ворага. Ні Жыгімонт, ні яго польскія апекуны не здолелі так нашкодзіць Свідрыгайлу, як ён сам сабе. Пэўна, не адзін задаваў сабе пытанне, дык за каго яны змагаюцца? За чалавека, які жадае аднавіць адзінства Вялікага княства Літоўскага і Рускага, зрабіць яго незалежным ад Польшчы ці за ўладалюбнага няўдачніка, які іх крывёю здабывае страчаны велікакняжацкі пасад? І многія воі адправіліся ў паход на Літву без ахвоты, без ранейшай веры ў свайго князя.

Паход гэты адбыўся ў студзені — лютым 1435 года, а не ўвосень, як падае «Хроніка Быхаўца», бо 26 лютага Свідрыгайла пісаў магістру пра паражэнне яго войска каля Вількаміра. Значыць, гэтая рашучая бітва паміж двума князямі разыгралася не 1 верасня, а ў лютым. Тым не меней звернемся да хронікі. Паводле яе, Свідрыгайла з «усімі сіламі рускімі»* выступіў з Віцебска і накіраваўся да Браслава. Сюды падышоў з рыцарамі і лівонскі магістр. Саюзнікі рушылі да Вількаміра. Жыгімонт, які не рызыкаваў удзельнічаць у бітвах, і на гэты раз вырашыў адсядзецца за замкавымі сценамі. Жыгімонтава войска ўзначаліў яго сын Міхайла. Галоўнай сілай былі палякі. Збігневу Аляснцкі прыслаў польскаму стаўленіку дванаццацітысячны корпус[78]. Ніякіх дакладных паведамленняў пра бітву хроніка не падае. Вядома, што абодва войскі сустрэліся каля Вількаміра на рацэ Святой. «І дапамог Бог вялікаму князю Жыгімонту і яго сыну Міхайлу, і пабілі князя Свідрыгайлу і ўсю яго сілу»[79]. Сам князь не стаў чакаць заканчэння бітвы і ўцёк з поля сечы. А тыя, хто застаўся на ім, паляглі пад варожай зброяй. Знайшоў сваю смерць князь Даніла Сымонавіч Гальшанскі (вось так, бацька быў на Жыгімонтавым баку, а сын на Свідрыгайлавым), князі Яраслаў Лугвенавіч Мсціслаўскі, Міхайла Балабан, Міхайла Вяземскі, Яраслаў Цвярскі і «другіх князёў і баяр, і немцев шмат пабілі»[80]. У палон трапіў паранены Жыгімонт Карыбутавіч. На пытанне чаму ён не ўцякаў, годна адказаў: «Чэсць вышэй за жыццё прынашу, ганьбай уцёкаў пакрыцца не хацеў»[81]. Ён памёр ад ран.

З другіх крыніц вядома, што абодва войскі сустрэліся за 12 кіламетраў ад Вількаміра на месцы, дзе пазней узнікне сяло Пабойка, якая і атрымае сваю назву ад гэтай сечы. Свідрыгайла, лічачы, што балоцістая мясцовасць не падыходзіць для бітвы, вырашыў адвесці сваё войска бліжэй да Вількаміра. Гэта і скарыстаў Міхайла Жыгімонтавіч, які рашуча напаў на адыходзячае Свідрыгайлава войска. Ударыў па цэнтры, які займалі лівонскія рыцары. Так і не ўдалося Свідрыгайлу перастроіць свае шэрагі і развярнуць іх насустрач ворагу. Ініцыятывай завалодаў Міхайла Жыгімонтавіч. А паніка, што пачалася сярод Свідрыгайлавых вояў, прывяла да паражкі[82]. Адзін толькі Жыгімонт Карыбутавіч са сваімі гусітамі працягваў змагацца, засеўшы за вазамі, якія расставіў у круг. Супраціўленне Карыбутавіча дало магчымасць Свідрыгайлу з 30 вершнікамі ўцячы. Сам ён страціў і каня, і зброю, а каб не ўцёк, і жыццё.

---

*Паводле Пскоўскага летапісу ў Свідрыгайлы былі смаляне, кіяне, віцьбічы, палачане і крыжакі (ПЛ. Вып. 2. С. 131).

Куды большыя страты панеслі лівонцы. «Было забіта дванаццаць тысяч чалавек знатных і высакародных вояў. Ніколі яшчэ раней не было ў Лівоніі такой страты, праз што Лівонія вельмі аслабла», — прызнаецца ордэнскі храніст Русаў[83]. Магістр ад дзвюх ран у галаву памёр тут жа на полі. Вількамір для Лівонскага ордэна стаў тым самым, што Грунвальд для прускіх рыцараў. Цяпер і Лівонія выйшла з вайны.

ПЕРАМОГА ЖЫГІМОНТА КЕЙСТУТАВІЧА

Свідрыгайла ўцёк у Віцебск, адсюль ён напісаў вялікаму магістру Росдорфу, нагадваючы яму пра ранейшы саюз і дружбу, і прасіў дапамогі. І зараз ён верыць у Ордэн, які ўжо здрадзіў яму. Сляпая вера. За дапамогай да імператара Жыгімонта адпраўляецца Свідрыгайлаў пасол. Не, князь яшчэ не апусціў рукі. А Жыгімонт Кейстутавіч цешыў сябе думкаю, што з яго ворагам усё скончана. Яшчэ адзін удар — і вайна выйграна. Праз тры тыдні ён паслаў сына на Свідрыгайлу.

Міхайла ўзяў у аблогу Оршу. Паколькі Орша лічылася горадам Смаленскай зямлі, дык са Смаленска да Міхайлы прыбылі паслы. Смаляне пераходзілі да Жыгімонта. Зразумела, што паўплывала на іх рашэнне Свідрыгайлава расправа над Герасімам і паражэнне на Святой. Хто і застаўся верным Свідрыгайлу, дык Віцебск і Полацк. Пад Віцебск і павёў войска Міхайла. Шэсць тыдняў здабываў ён горад, і няўдачна. Зімой Жыгімонт шле новае войска, але ўжо пад Полацк. Толькі і палачане падняліся са зброяй на абарону свайго горада. І на гэты раз Жыгімонтава войска адступіла. Інакш адбывалася на Русі. Там разнеслася пагалоска, што Свідрыгайла загінуў. Сярод князёвых прыхільнікаў панавала разгубленасць. Што цяпер рабіць? Мцэнскі намеснік перайшоў на Жыгімонтаў бок. Адпаў ад Свідрыгайлы Старадуб. Пакінула вялікага князя Рускага і Северская зямля, вось толькі ён яшчэ не ведаў, да каго яна далучылася: ці да Вільні, ці да Масквы. Перачакаўшы ў Віцебску Жыгімонтаў паход, Свідрыгайла напрыканцы года адправіўся на Украіну на злучэнне з татарамі, каб з іх дапамогаю вярнуць Смаленск. Тым часам да імператара прыязджае яго пасол Вегуна, які ўпэўнівае Жыгімонта, што Свідрыгайла атрымаў паражэнне не такое і жорсткае, як пра гэта кажуць, і князь поўны жадання змагацца са сваім ворагам.

Імператар і цяпер не падаў Свідрыгайлу дзейснай дапамогі, спаслаўся на тое, што ён дамаўляецца аб міры з палякамі, якія абяцалі болей не падтрымліваць князя Жыгімонта. У сваім лісце імператар суцяшае Свідрыгайлу: «Але мы спадзяемся на дапа-

могу ўсемагутнага Бога, спадзяемся, з дапамогаю сіл нашых, аднавіць усё да гонару і карысці вашай... Таму, любезны брат, не губляйце мужнасці, будзьце цвёрдымі ў надзеі на Бога, і запэўніце князёў вашых, баяр і падданых у нязменнай падтрымцы нашай...»[84].

Свідрыгайла верыць імператару. Быць можа, гэта і добра, што ён падмануўся імператарскімі абяцаннямі — у рэшце рэшт упэўніў сябе, што для яго нічога яшчэ не згублена. Вайсковае шчасце пераменлівае. Сёння перамог Жыгімонт, а заўтра пераможа ён — Свідрыгайла.

Як толькі стала вядома, што Свідрыгайла не загінуў, Северская зямля зноў прызнала яго сваім уладаром, вярнуўся да яго і мцэнскі намеснік Пратасій, і смаленскі намеснік Бутрым. Пасланае князем войска на чале з Нямірам адваявала ў Жыгімонта Старадуб. Татарскі хан Сеід-Ахмед прыйшоў з конніцай і стаў лагерам каля Кіева. Свідрыгайла збіраўся разам з татарамі ісці на Падолле і Валынь. Мяняюцца адносіны да Свідрыгайлы і ў Польшчы. Прапольская палітыка Жыгімонта не прынесла яму папулярнасці і падтрымкі ні сярод феадалаў, ні сярод простага народа. Пад ціскам каталіцкіх святароў у 1436 годзе ён адмяніў Ягайлаў указ, якім гарантавалася недатыкальнасць праваслаўных цэркваў і свабоду веравызнання праваслаўных вернікаў. За 43 гады раней іспанскай інквізіцыі Жыгімонт увёў сваю пад кіраўніцтвам паляка Мікалая Ленчынцкага з правам караць ерэтыкаў (гусітаў. — *В.Ч.*) і праваслаўных і прыводзіць іх «да паслушэнства рымскага пасада». І разам пазбавіўся падтрымкі праваслаўнага панства і люду. Затое знайшоў сабе апору ў асобе Ордэна і пачынае заігрываць з магістрам, і ўжо вядуцца перамовы пра мір. Польскі каралеўскі двор гэта непакоіла. Памятаем, як перамяніўся літаральна на вачах Вітаўт — спачатку верны каралеўскі васал, а пасля заўзяты змагар супраць уніі. Такім шляхам мог пайсці і Жыгімонт. Таму Свідрыгайлу каралеўская рада разглядала, як тую сілу, што вымушала б Жыгімонта трымацца Польшчы. Палякі першымі і прапанавалі Свідрыгайлу пачаць перамовы аб міры. Князь адправіў у Кракаў епіскапа кіеўскага і баярына Маска Умвіча, хаця і не верыў у добры канец гэтых перамоў, і лічыў, што паслоў чакае лёс нявольнікаў. А таму працягваў вайну супраць княства Літоўскага і Польшчы. З татарскай конніцай князь вярнуў сабе Брацлаў і Крамянец на Падоллі і паставіў там новага намесніка Івашку Манівідавіча. Прызнала яго ўладу і Луцкая зямля. У суседняй Малдавіі сябар яго Стэзка прыйшоў да ўлады.

Можна было разлічваць і на дапамогу Малдавіі. Аднак новаму гаспадару з-за міжусобіц у яго краі было не да Свідрыгайлы. Сапраўднай нечаканасцю для князя стала навіна, што Жыгімонт

Кейстутавіч заключыў мір з Ордэнам. «Але мы гэтаму не хочам верыць, і за ўсё сваё жыццё не парушым падпісанага намі саюза», — паведамляў вялікаму магістру Свідрыгайла[85]. Так, цяжка было яму змірыцца, што яго вораг заручыўся падтрымкай і Ордэна, а значыць, сілы ягоныя ўзраслі. Князь яшчэ чапляецца за крохкую надзею, што зможа неяк перамяніць нешчаслівы для яго ход падзей. Застаецца ж у яго руках і Усходняя Літва, і Кіеўшчына, і Падолле, і Луцкая зямля. Ёсць яшчэ імператар Жыгімонт, які ўвесь час абяцае дапамагчы. Вось толькі нешта не спяшаецца гэта зрабіць. Свідрыгайла знаходзіць выхад, абяцае імператару прыняць яго падданства. Той і цяпер толькі суцяшае князя, што ён «можа быць упэўнены, што мы паходам нашым у Польшчу дапаможам яму»[86]. І забываецца аб ім.

А лёс усёй вайны і самога Свідрыгайлы вырашаўся на Полаччыне. Жыгімонт Кейстутавіч быў настолькі злосны на супраціўленне Полацка і Віцебска, што загадаў патапіць полацкіх і віцебскіх паслоў. У 1437 годзе Жыгімонт зноў паслаў сваё войска на Полацк і Віцебск. Палачане і віцьбічы, «не бачачы сабе ні ад каго дапамогі[87], прызналі Жыгімонта сваім князем. Удар для Свідрыгайлы вельмі цяжкі. Так, ён яшчэ валодаў рускімі землямі, але як дакладна заўважыў гісторык М.Грушэўскі, з'яўляліся яны «анексіраванай правінцыяй, уладарнаю дзяржаваю былі землі літоўскія і беларускія»[88]. Таму «Хроніка Быхаўца» і адзначыла: «...і пачаў вялікі князь Жыгімонт княжыць у Вялікім княстве Літоўскім і Рускім»[89].

Палачане яшчэ гатовы былі працягваць змагацца і казалі: «Калі б толькі мелі якую-небудзь дапамогу ад Свідрыгайлы, то хацелі б да яго вярнуцца»[90]. Але Свідрыгайлу не ставала сіл вярнуць страчанае, хоць як утрымаць тое, што яшчэ ў яго засталося. Жыгімонт, каб падкупіць палачан, выдаў Полацку новы прывілей, якім пацвердзіў «добраволенствы» Скіргайлы, Вітаўта і Свідрыгайлы. І ў адрозненне ад ранейшых новы забараняў полацкім намеснікам распараджацца гарадской маёмасцю «городом дарити», абараняў насельніцтва Полацкай зямлі ад самавольных паборaў і павіннасцей з боку свецкай і духоўнай улады.

Са стратай сваёй сталіцы Свідрыгайла губляў і тытул вялікага князя Рускага. Свідрыгайла апынуўся ў цяжкім становішчы. Нельга было спадзявацца, што зброяй ён пераможа Жыгімонта, а тым болей весці вайну з Польшчаю за Падолле і Валынь. Яшчэ адно няшчасце — памёр імператар Жыгімонт. У Еўропе ў Свідрыгайлы не засталося болей уплывовых заступнікаў. Воляй-няволяй давялося яму шукаць перамір'я з Польшчаю, і ён пасылае адно пасольства за другім у Кракаў. Свідрыгайлу патрэбны мір з Уладзіславам, нават коштам крайніх ахвяр, толькі б разарваць саюз Польшчы і Жыгімон-

та. Першы крок для гэтага князь зрабіў, ён склаў дамову з польскімі панамі з Галіцкай зямлі. Свідрыгайла саступіў галіцкай шляхце Луцк, а па яго смерці ўсе яго ўладанні — Кіеўшчына, Брацлаўшчына пераходзяць да Польшчы. Узамен галіцкія паны абяцалі яму дапамогу супраць Жыгімонта. Да Свідрыгайлавага войска далучыліся галіцкія і мазавецкія палкі. Іх прыход быў дарэчы, бо Жыгімонт, калі даведаўся, што Свідрыгайла выехаў у Кракаў на сустрэчу з каралём, паслаў адно войска на Луцк, другое на Кіеў. Першае было адбіта ад Луцка. А пасля таго, як прыйшла вестка, што Свідрыгайла 13 жніўня заключыў мір з Уладзіславам, Жыгімонтавы воі адступілі. Другое войска разбіў з татарамі кіеўскі намеснік Юрша. Адносіны да Свідрыгайлы памяняліся, калі ён прызнаў сябе васалам польскага караля. На Серадзкім сойме яго прызналі як удзельнага князя Кіева, Луцка з часткай Валыні, але з умовай, што гэтыя ўладанні пасля яго смерці пяройдуць да Польшчы. Гэта быў хітры манёўр, каб трымаць у залежнасці Жыгімонта. Невыпадкова, што Жыгімонт устрывожыўся і праз паслоў заявіў сойму: «Князь Свідрыгайла даўно быў бы ўжо даўно разбіты дазвання, калі б яго некаторыя панове палякі, рада перасцярогай і выразнай дапамогай не падтрымлівалі»[91]. Цяпер, калі Свідрыгайла схіліўся перад Уладзіславам, кароль узяўся памірыць яго з Жыгімонтам. У Гародню да Жыгімонта прыехала пасольства з біскупам Збігневам Аляснiцкім. Паслы заявілі, што Свідрыгайла сдаўся пад уладу караля, не просіць ён княства вялікага, а толькі ўдзелу ў бацькоўскай зямлі. «Ведаю я добра Свідрыгайлу, старасць яго шаленства не скарала. Яшчэ той самы дух яго мяцежны ажыве; нават жыццё яго небяспечна для Літвы, калі вернецца да яе зноў жахліва запылае вайна. Што да маёй асобы, я каралю і панству яго верны, але гатовы ўсялякія стасункі разарваць, калі Свідрыгайлу ўпусціць у межы Літвы», — адказаў Жыгімонт[92]. А каб даказаць сваю вернасць Польшчы, Жыгімонт зноў пацвердзіў умову, што Вялікае княства Літоўскае і Рускае пасля яго смерці пераходзіць да Польшчы, але палякі не павінны падтрымліваць Свідрыгайлу. Так што змова з галіцкімі і падольскімі панамі аказалася не дзейснай. Усе палякі, якія паступілі да яго на службу, пакінулі Свідрыгайлу. Яму засталося толькі спадзявацца на Ордэн і ён падбухторвае крыжакоў падняцца на Жыгімонта, «які быў і павінен быць маім слугой»[93]. Ордэн не адклікнуўся на заклікі свайго былога саюзніка.

Нельга дакладна ўказаць, якія землі засталіся пад Свідрыгайлавай уладаю. З грамат у 1437 і 1438 гадах вынікае, што ўлада Свідрыгайлы распаўсюджвалася на Кіеўшчыну, Падолле з горадам Крамянцом, Валынь з горадам Астрогам і Луц-

кам[94]. Аднак луцкія баяры ў 1439 годзе паддаліся пад Жыгімонтаву ўладу. Гэта яшчэ больш аслабіла Свідрыгайлу. Баючыся трапіць у рукі да Жыгімонта, князь уцёк у Малдавію. Калі ж неўзабаве ён вярнуўся, то кароль пашкадаваў свайго няшчаснага дзядзьку і надзяліў яго латыгоўскім паветам на Падоллі і назначыў яму 2000 грыўнаў штогод з каралеўскіх эканомій. Князь змірыўся са сваім апрычонным лёсам — заставалася дажываць у спакоі старасць.

ВЫРАК ГІСТОРЫІ

Нядоўга ўладарыў на велікакняжацкім пасадзе і Жыгімонт. Ён стаў яшчэ больш падазраваць сваіх набліжаных у здрадзе. Калі бачыў, што два чалавекі размаўлялі паміж сабою, загадваў звязеніць іх і кожнага выпытваў. Адно слова, якое магло супярэчыць у іх паказаннях, — і князь караў іх як змоўшчыкаў. Набліжаў ён да сябе бязродных слуг, раздаваў ім маёнткі пакараных феадалаў. «...І вельмі лютаваў да сваіх падданых, асабліва над шляхтаю, хапаў іх і рабіў над імі жахлівыя жорсткасці, караў іх нявінна, забіваў і мучыў іх так, як толькі мог прыдумаць, і паступаў так з усімі князямі і панятамі і з усім шляхецкім саслоўем усіх земляў літоўскіх, рускіх і жамойцкіх», — так апісвае Жыгімонтава ўладаранне «Хроніка Быхаўца»[95]. У вязніцы апынуліся князь Юрый Лугвенавіч і князь Алелька Уладзіміравіч разам са сваёю сям'ёю, княгіняю Анастасіяй, унучкаю Вітаўта, і двума сынамі Сымонам і Міхайлам, а таксама князі Пінскія, Крошынскія, Палубенскія, Сагушкі. Але незадаволеных ім не станавілася менш. І з іх настроямі Жыгімонт усё ж не мог не лічыцца. Ізноў выступалі супраць Жыгімонта Кейстутавіча ў Полацку і Віцебску. Паступова ён пачынае пераарыентацыю сваёй палітыкі і збліжаецца з новым германскім імператарам Альбрэхтам. Калі ж палякі сталі даводзіць імператару, што вялікі князь, як польскі васал не самастойны ўладар і не мае права ўступаць у ніякія саюзы, Жыгімонт заявіў: «Ніколі мы не былі нічымі падданымі, і Вялікае княства, пакуль жыве людская памяць, ніколі не было нікому падуладна, і мы трымаем яго не з рук палякаў, а занімаем пасад ад Бога дзедзечным правам пасля нашых папярэднікаў. Па смерці нашага брата вечнай памяці Вітаўта яно па праву перайшло да нас, як на праўдзівага спадкаемца і мы на гэтым пасадзе з Божаю дапамогаю нікога, апроч Бога, не баімся»[96]. Сярод набліжаных Жыгімонта, пераважна католікаў, яго новая палітыка не адабралася. Нават яго сын Міхайла і той быў супраць антыпольскіх настрояў свайго бацькі. Так што Жыгі-

монт апынуўся ў адзіноце. Адны феадалы яго ненавідзелі, а шчырыя прыхільнікі баяліся, што ён у дагоду сваёй новай палітыцы ахвяруе імі. У такім вось становішчы Жыгімонт склікаў вялікі сойм Вялікага княства Літоўскага і Рускага, нібыта для вырашэння земскіх спраў. Але яму ўжо не давяралі. Па княстве папаўзлі чуткі, што збірае вялікі князь усё панства, каб расправіцца з ім. Нельга адмаўляць, што ў Жыгімонта была задума пазбавіцца ад няўгодных яму феадалаў. Пра гэта кажа і «Хроніка Быхаўца», што віленскі ваявода Даўгерд і троцкі ваявода Лелюш даведаліся, што сойм склікаецца «для загубы ўсяго шляхецкага саслоўя і іх саміх»[97]. Гэтыя два ваяводы і вынеслі Жыгімонту прысуд — забіць. У змову ўцягнулі і князя Аляксандра Чартарыйскага, а таксама і князя Алельку Уладзіміравіча. Па іх плану пасля смерці вялікага князя яны з прыхільнікамі зоймуць Вільню і Трокі і дадуць вестку Свідрыгайлу прыязджаць на вялікае княжанне. Але як усё гэта ажыццявіць? Жыгімонт жыў у Троках пад пільнаю аховаю польскіх воінаў. Калі напасці на замак, дык вялікі князь можа праз патаемны ход уцячы і адразу паспяшыць у Польшчу за войскам. Выйсце знайшлі. У Трокі накіравалі кіеўскага баярына Скабейку і далі яму абоз у трыста вазоў з нібыта дзякольным сенам*. На кожным возе пад сенам схавалася па пяць воінаў. Яшчэ адзін правіў канём. Такім чынам 1800 чалавек удзельнічала ў змове. У вербную нядзелю 20 чэрвеня 1440 года Аляксандр Чартарыйскі ды Скабейка прывялі абоз да Трокскага замка. Варта нічога падазронага не заўважыла і адчыніла браму. Як толькі абоз уехаў у замак, з-пад сена выскачылі воі і расправіліся з вартаю. Чартарыйскі і Скабейка з атрадам змоўшчыкаў паспяшылі да пакояў Жыгімонта. Вялікі князь у гэты час слухаў у капліцы імшу, і дзверы туды былі зачынены. Не ламаць жа іх, бо гэта спужае Жыгімонта і ён праз патаемныя хады ўцячэ. Змоўшчыкі спыніліся ў нерашучасці. Праз вакно Чартарыйскі ўбачыў на двары ручную мядзведзіцу. Ён не раз быў сведкам, як яна пасля гульні на двары, лапай скрэбла па дзвярах княжацкіх пакояў, і Жыгімонт упускаў яе да сябе. Чартарыйскі паскрэбаў рукою па дзвярах. Уведзены ў зман Жыгімонт адчыніў і змярцвеў ад нечаканасці. У капліцу ўваліліся ваяры, акружылі князя. Разгублены стаяў ён перад імі і слухаў, як Чартарыйскі пералічваў усе тыя злачынствы, якія ён учыніў. «Што ты падрыхтаваў князям, панам і ўсім нам выпіць, дык ты цяпер вып'еш адзін»[98], — закончыў казаць Чартарыйскі і кінуўся на вялікага князя. Але ў яго пад рукою не было зброі. Тады Скабейка схапіў вілы, якімі па-

*Дзякла — пастаўкі зерня, сена, садавіны і агародніны вялікаму князю і феадалам.

праўлялі ў каміне дровы, і ўдарыў імі вялікага князя па галаве. Жыгімонт нежывы паваліўся на падлогу. З суседняга пакоя на шум прыбег яго слуга Слаўка. Слугу выкінулі з вакна. Кодаб Жыгімонта вывезлі на санях да возера і пусцілі пад лёд.

Даволі ўдала прайшла і другая частка змовы. Па знаку з Трокаў Даўгерд захапіў Ніжні Віленскі замак. Верхні заняў Міхайлаў прыхільнік Нарбут. Сам Міхайла Жыгімонтавіч запёрся ў Малым Троцкім замку. У далёкую Малдавію паскакалі вестуны клікаць Свідрыгайлу на вялікае княжанне. Свідрыгайла, відаць, не давяраў пачутай навіне, баяўся падману. Ён прыехаў у Луцк і спыніўся там. Чаго чакаў? Пакуль сціхнуць у Вільні страсці, ці пакуль яму паднясуць велікакняжацкі вянец, ці чакаў, якая партыя возьме перавагу. Бо шмат было і тых, хто баяўся за сваю здраду Свідрыгайлавай расправы, а таму стаялі супраць яго. Гэтую партыю ўзначальваў Юрый Сымонавіч Гальшанскі. Ён і сабраў у Гальшанах жамойцкага старасту Кезгайлу, віленскага старасту Мікалая Неміровіча і маршалка земскага Мікалая Радзівіла — яны і вырашылі запрасіць на вялікі пасад Казіміра Ягайлавіча. У Кракаў адразу ж адправіліся Міхаіл і Ян Кезгайлы. Тым часам у Вільню з'язджаліся князі, паны і шляхта. Адны патрабавалі аддаць вялікі пасад Міхайлу Жыгімонтавічу, другія — Свідрыгайлу, трэція — абвясціць вялікім князем польскага караля Уладзіслава. Усе тры кандыдатуры не падыходзілі. Міхайла пужаў сваёй прыхільнасцю да палякаў, Свідрыгайла — занадта круты, каб не паляцелі зноў з плеч яснавяльможныя галовы. Уладзіслаў — хто ведае, ці не зробіць ён княства польскай правінцыяй. І вырашылі прасіць на вялікі пасад другога Ягайлавага сына — Казіміра.

Да Казіміра Свідрыгайла аднёсся варожа і не прызнаў над сабой ягоную ўладу, а прызнаў сябе леннікам «сыноўца нашага мілага» польскага караля Уладзіслава. Мабыць, яшчэ спадзяваўся Свідрыгайла змагацца за велікакняжацкі пасад, але з Ордэнам пасля 1438 года ён не меў ніякіх стасункаў. Арда трымала мір з Літвой, а сіл самаму вярнуць вялікі пасад не хапала. Ды і цяжкая хвароба вымагала састарэлага князя супакоіцца. Зрэшты ён зразумеў марнасць сваіх надзей стаць вялікім князем літоўскім, а таму напрыканцы 1445 года прызнаў сябе «верным слугой вялікага князя Казіміра»[99]. Да радасці літвінскіх феадалаў «вялікі князь» Свідрыгайла прыехаў у 1445 годзе на віленскі сойм. Казімір прыязна сустрэў «дзядзьку нашага князя Свідрыгайлу» і надаў яму Гомель, Давыд-Гарадок і землі у Мазырскім і Тураўскім павеце, а ягонай жонцы княгіні Ганне Іванаўне — Здзітаў, Гарадок і Дварэц.

У 1452 годзе 10 лютага Свідрыгайла памёр. Адышла ў гісторыю і слаўная эпоха двух першых пакаленняў Гедымінавічаў, тых, хто быў з канца дзіды ўскормлены і пад шоламам спавіты.

ПАМІЖ СКІЛАЙ І ХАРЫБДАЙ





КАЗІМІР
(1427—1492)
Я. Матэйка. ***Сярэдзіна XIX ст.***

КАЗІМІР



ялікім князем выбралі яго — чатырнаццацігадовага юнака. Гэта быў лёс. Зусім не па сваёй волі, і не дзякуючы сваім заслугам (іх яшчэ не было), стаў малодшы Ягайлаў сын Казімір вялікім князем літоўскім, рускім і жамойцкім*. Тое, што яго папярэднікі заваявалі зброяй, да чаго імкнуліся гадамі, яму прапанавалі — вялікакняжацкі вянец. Так нечакана развітаўся ён з бесклапотным дзяцінствам. Пачыналася новае жыццё.

Кароль Уладзіслаў III, большы Ягайлаў сын, і яго польскія саноўнікі добра ведалі, што на розуме ў літвінскіх паслоў, якія прыехалі прасіць у іх, каб адпусцілі Казіміра ў Вільню. Абвесцяць там яго вялікім князем — і зноў унія з Вялікім княствам застанецца толькі на паперы. Таму, пускаючы свайго брата ў Вялікае княства як свайго намесніка, кароль павучаў яго: «Каб перад Вышнім Богам справядлівасць мілаваў, еднасць паміж каралеўствам Польскім і Вялікім княствам Літоўскім і міласць узаемна ўтрымліваў і прагных войнаў без дазволу Уладзіслава не вёў, а заўсёды памятаў добрадзейства ад каралеўства Польскага, стараўся аб ягоным дабру, памнажэнні і славе»[1]. А каб літвіны ўсё ж не абвясцілі Казіміра сваім валадаром, разам з ім адправілася світа польскіх наглядчыкаў.

Упершыню адкрываў ён для сябе Літву. Штосьці таямнічае было ў глухіх пушчах, праз якія ехалі яны ў Вільню. Яшчэ зусім нядаўна гарэлі тут паганскія вогнішчы. Ехалі паўз сёлы і

---

*У маленстве Казімір быў хрышчоны ў праваслаўе і насіў імя Андрэй. Гэты факт добра ведалі на Русі. Напрыклад, у Васкрэсенскім летапісе ўзгадваецца: «Ондрей Казимир» (ПСРЛ. Т. 7. С. 256), у Кіеўскай Чэцы: «Король Андрей», у Гарадзенскай «Триоди» (1466 г.): «при велики корол Андрей» (В.Ластоўскі, Гісторыя Беларускай... С. 166), у Пскоўскім летапісе: «литовский король Андрей» (ПЛ. Вып. 2. С. 63).

гарады. Бачыў князь і галечу, і раскошу. Замкі нагадвалі аб войнах, што адбываліся на гэтых землях. Гэта і была бацькоўская радзіма — краіна ваяўнічых літвінаў ды русінаў. Ужо ад Бярэсця Казіміра суправаджалі літвінскія феадалы: дзядзька Юрый Гальшанскі, Мікалай Неміровіч, маршалак земскі Осцік, жамойцкі староста Кезгайла, Ян Гаштольд. Апошні — самы ўплывовы вяльможа ў краі. У дасканаласці авалодаў пан Ян навукай палітычных пераўвасабленняў. І пры Вітаўце быў адным з першых у княстве, і пры Свідрыгайлу не апошняе месца займаў, а калі захістаўся пад тым велікакняжацкі пасад, своечасова перабег да Жыгімонта Кейстутавіча і пасля яго смерці верхаводзіў пры віленскім двары. Ён і стаў апекуном юнага Казіміра. Яго разважлівасці, хітрасці, палітычнаму такту ў многім будзе абавязаны вялікі князь.

Па дарозе ў Вільню ў Рудніцкай пушчы Казімір сустрэўся з Міхайлам Жыгімонтавічам. Той ехаў з Гародні ў Мазовію да свайго шурына, князя Баляслава. І вось сутыкнуліся. Міхайла не разгубіўся, ударыў чалом Казіміру і папрасіў выказаць да яго міласць. Дзе было Казіміру ведаць, што ў Міхайлы на розуме. А ехаў ён у Мазовію па дапамогу ў барацьбе за велікакняжацкі пасад. Казімір велікадушна перадаў Міхайлу яго вотчыны — Бельск, Сураж на Падляшшы, Клецк, Койданава, Бранск і Старадуб. І здавалася, задаволіў Міхайлу, не будзе бунтаваць.

Як адбылося абвяшчэнне новага вялікага князя, дакладна невядома. Паводле «Хронікі Быхаўца», ужо ў Бярэсці літвінскія феадалы ўзвялі каралевіча на вялікае княжанне. Але, думаю, гэта не дакладна. Паводле Длугаша, усё адбылося ў Вільні. Палякі, што ехалі разам з Казімірам, не давалі згоды на абвяшчэнне Казіміра вялікім князем. Тады літвінскія вяльможы пайшлі на хітрасць. 29 чэрвеня 1440 года яны закацілі шыкоўнае баляванне і перапаілі ўсю польскую світу Казіміра. Пакуль тыя яшчэ спалі п'яным сном, раніцай, Казіміра абвясцілі вялікім князем і ўздзелі на яго чало Гедымінаву карону. Ад гучных крыкаў народа, які вітаў свайго новага ўладара, палякі прачнуліся. Спачатку нічога не ўцямілі, але калі ім паведамілі, у чым справа, дык зразумелі — праспалі... Тут ужо гнеўныя словы з іх вуснаў загучалі, але позна. Палякаў супакоілі дарамі і адправілі ў Польшчу. Так з інтрыгі пачалося Казімірава княжанне.

Польскі кароль Уладзіслаў не прызнаў свайго брата вялікім князем літоўскім, рускім і жамойцкім. Зноў у пакоях Кракаўскага замка плялася інтрыга супраць літвінскай дзяржавы. Каралеўская рада прапаноўвала каралю расчляніць княства, забраць да Польшчы Валынь і Берасцейскую зямлю, аддаць Баляславу Мазавецкаму Драгічынскую зямлю, пакінуць Міхай-



Фрагмент абраза. Юны Казімір. *XV ст.*

лу Жыгімонтавічу Трокі. І вось такое абкарнанае княства перадаць Казіміру, «каб яно шукала сабе расшырэння ў заваёвах і ў такім зменшаным стане не выступала супраць Польшчы»[2].

У Вільні пра гэта нічога не ведалі. Там шукалі вінаватых у смерці Жыгімонта Кейстутавіча. Аляксандра Чартарыйскага прысудзілі да выгнання і канфіскацыі маёмасці. За брата заступіўся Іван Чартарыйскі, які прыслаў панам рады ліст: «Не пакаранне заслугоўвае забойца Жыгімонта, — пісаў ён, — але ўзнагароду і гонару: бо забіў тырана, жорсткую пошасць і ўсялякага дабра айчыны непрыяцеля, таго, хто шмат маёмасці ў каталікаў забраў, шмат паноў мячом жыцця пазбавіў без ніякай прычыны, які паводле навучання вешчуноў усе свае чыннасці рабіў, сабак вышэй людзей цаніў, збожжа ў падданых забіраў, каб яны хутчэй памерлі з голаду, і тое збожжа таіў у

закрамах сваіх; а што ў закрамы і склады не мог памясціць, скармліваў коням; якога плюгавасць, кровазмяшанне, чужаложства, рабаванне, марадзёрства былі штодзённа»[3]. Гэтую праўду прызнаць было цяжка тым, хто верна прыслугоўваў тырану і яны праглі расправіцца з зачыншчыкамі змовы. На першай велікакняжацкай радзе былыя паплечнікі Жыгімонта Кейстутавіча перагрызліся паміж сабою. Віленскі ваявода Доўгерд вырашыў адхрысціцца ад забойства Жыгімонта і зваліў віну на троцкага ваяводу. «Лелюш не павінен засядаць з намі ў радзе, таму што ў яго ваяводстве і Троцкім замку зарэзалі князя Жыгімонта, відаць, па яго загаду»[4]. Казімір забраў ваяводства ў Лелюша і перадаў яго Яну Гаштольду. І становіцца ясна, хто так рупіў пра мараль паноў-рады, — Гаштольд. Не прамінуў былы ашмянскі староста выкарыстаць момант ды прыбраць у свае рукі ўладу. Ну, а Казімір — гэты юнак — які, нягледзячы на тое, што насіў велікакняжацкі вянец, быў толькі выконваючым абавязкі вялікага князя, але не гаспадаром Вялікага княства. Ён трапіў пад уплыў Гаштольда — сапраўднага гаспадара, некаранаванага ўладара. З яго падказкі і волі кіруе дзяржавай Казімір. З другіх дыгнітараў* княства сваім уплывам на палітычныя справы вылучаліся Юрый Сымонавіч Гальшанскі, Глеб Даўгольдавіч, віленскі ваявода Доўгерд, земскі маршалак Пётр Мантыгірдавіч, смаленскі намеснік Андрэй Саковіч, полацкі намеснік Алехна Судэмонтавіч, ковенскі намеснік Судзівой Валімунтавіч, віцебскі намеснік Івашка Гойцавіч, а таксама Андрэй Неміровіч.

Гаштольду выпала «тушыць пажар» — уладкоўваць канфлікты, што выніклі пасля Казіміравага ўскняжання. Зноў узбунтавалася Жамойць. Старасту Кезгайлу з яго намеснікамі жамойты прагналі, а на яго месца выбралі свайго — жамойта Даўмонта. Князь Міхайла Жыгімонтавіч слаў да жамойтаў лісты і падымаў іх супраць Казіміра. Разважлівы Гаштольд стаў адгаворваць Казіміра ад непатрэбнай вайны: «Гасудар, князь Казімір, не варта табе біцца са сваімі падданымі, таму што калі яны цябе перамогуць, дык табе, гасудару нашаму міласціваму, будзе сорам, а калі ты іх паб'еш, дык табе не будзе славы, бо ты пераможаш войскам сваіх падданых, але зрабі так: дай, ваша міласць, ім старасту па іх жаданню — Кантоўта, таму што цяпер у Жамойці верхаводзіць братаніч Кантоўта. А той іх саміх і свайго братаніча ўгаворыць, каб яны зямлі сваёй не далі спустошыць, таму што калі ты, гасудар наш, пойдзеш на іх са сваім войскам, дык усю зямлю іх спустошыш ды іх саміх

---

*Дыгнітарыі (ад лац. dignus — годны), тытулаваныя саноўнікі Вялікага княства Літоўскага.



Юрый Лугвенавіч. *XV ст.*

палоніш, і ніякай ад іх не будзе карысці»[5]. Казімір так і зрабіў. Да жамойтаў паехаў Кантоўт і пераканаў іх не пачынаць вайны. Старастам на тры гады застаўся Даўмонт. Жамойты прыехалі да Казіміра ў Коўна і прысягнулі яму на вернасць.

Толькі замірыліся з Жамойцю, як новая бяда: Міхайла Жыгімонтавіч не прызнаў новага вялікага князя. Сваім панам Міхайлу абвясцілі Гародня, Ліда, Бярэсце і ўсё Падляшша. Па яго просьбе мазавецкія атрады занялі Драгічын, Бельск, Мельнік. У краіне наспявала чарговая вайна. І Гаштольд з войскам пайшоў на Бранск. Міхайла Жыгімонтавіч не чакаў для сябе трагічнай развязкі і ўцёк у Маскву, адкуль перабраўся ў Польшчу, дзе яго з радасцю прынялі: князь мог спатрэбіцца ў будучай барацьбе з Вялікім княствам.

У прамой сувязі з гэтымі падзеямі можна лічыць выступленне сваяка Міхайлы, Баляслава Мазавецкага. Яго войска заняла Падляшша і здабывала Бярэсце. Драгічынскі староста Юрый Насута пажадаў далучыць Драгічынскую зямлю да Мазовіі і служыць Міхайлу Жыгімонтавічу. І тут Гаштольд праявіў сябе. Літвінскае войска пад яго кіраўніцтвам выбіла мазураў з Падляшша і з-пад Бярэсця.

Адначасова з гэтымі падзеямі ўспыхнуў бунт у Смаленску. Смаленскі люд выгнаў з горада велікакняжацкага намесніка Андрэя Саковіча, маршалка Петрыка ўтапілі ў Дняпры і запрасілі да сябе нашчадка смаленскіх князёў Андрэя Дарагабужскага. Аднак смаленскія баяры білі чалом Казіміру, скардзячыся, што Дарагабужскага выбралі супраць іх волі. У Вільні зусім не віталі вось такое самаўпраўства смалян. Казімір стаў збіраць войска. Тады смаляне запрасілі да сябе мсціслаўскага князя Юрыя Лугвенавіча, які пакараў смерцю баяраў, што ездзілі да Казіміра, а іх выменні параздаваў мсціслаўскім баярам. Да Смаленска далучыўся Полацк і Віцебск. Відавочна, што Юрый Лугвенавіч выношваў задуму стварыць на ўсходнелітвінскіх землях самастойную дзяржаву. Гэта быў прамы выклік Казіміру і велікакняжацкай радзе. Былі зроблены захады, каб ад Вялікага княства не адпалі крывіцкія землі — Смаленск, Полацк і Віцебск. Пад Смаленск адправілася войска, ачоленае панамі-радай. Паход гэты не змірыў смалян. Горад тры тыдні трымаў аблогу, і войска адступіла. Ужо самому юнаму вялікаму князю давялося ўзначальваць восенню новы паход да мяцежнага горада. На гэты раз Смаленск быў узяты. І там зноў быў пастаўлены намеснікам Андрэй Саковіч. Юрый Лугвенавіч з жонкай уцёк у Ноўгарад.

Пазбаўлены свайго княства, Юрый усё ж вырашыў павініцца перад Казімірам і зрабіў гэта праз усё таго ж Яна Гаштольда, у якога ў свой час хрысціў дзяцей. Гаштольд замовіў слова перад Казімірам за ізгоя. Казімір дараваў Юрыю і вярнуў яму Мсціслаў. Гэты выпадак яшчэ раз паказвае, хто запраўляў пры двары — Ян Гаштольд. Аддамо належнае Гаштольду: былы прыхільнік уніі Вялікага княства з Польшчаю, той, на каго палякі ўскладвалі свае надзеі, рэзка памяняў сваю палітыку — стаў барацьбітом за самастойнасць Вялікага княства. Ясна, што на гэта паўплывалі падзеі, звязаныя з Жыгімонтавай смерцю. Трэба было лічыцца з феадаламі, якія змагаліся за разрыў уніі з Польшчаю.

Моц Вялікага княства прызналі былыя васальныя рускія княствы. 20 лютага 1442 года навасільскі і адоеўскі князь Хведар Львовіч заключыў з Казімірам «даканчанне», абавязаўся яму «служыць верна, без усякай хітрасці»[6]. Спаквaля Вялікае княства аднаўляла сваю былую веліч.

Падзеі ў Смаленску вырашыў скарыстаць маскоўскі князь Васіль — ён у 1444 годзе паслаў войска пад Вязьму. Разам з маскавітамі прыйшлі і казанскія татары. Казімір, выправіў супраць ворага войска з гетманам Станіславам Кішкай. Важна тое, што з літвінскімі і польскімі воямі (апошніх вялікі князь наняў) у паходзе ўдзельнічалі і жамойты — гэта паказвае, што Казіміравa ўлада ўмацавалася на Жамойці. І цяпер удача спрыяла маладому вялікаму князю. Маскавіты, пачуўшы пра літвінскае войска, паспешліва адступілі ад Вязьмы. Кішка, якому вельмі карцела паказаць сваю ваяўнічаць, павёў сваіх вояў у Маскоўскія воласці, «бурил, палил, стинал люд», даволі лёгка заваяваў Мажайск, Казельск, Веру і Калугу. Шлях далей перагарадзіла 15-тысячнае маскавіцкае войска. «Хроніка Літоўская і Жамойцкая» падрабязна распавядае пра сечу з маскавітамі[7]. Можна даведацца пра тактыку літвінскіх ваяводаў — тут і падманлівыя адступленні, і «хітрыя засадкі», і нечаканыя ўдары ў абход на флангах, і праследаванне непрыяцеля. І бітву Кішка правёў проста паказальна. Сваім адступленнем ён заманіў маскавітаў у пастку, дзе ў «хітрых засадках» хаваліся атрады Зіновіча і Радзівіла. Нечаканы іх удар з двух бакоў выклікаў паніку ў маскавіцкіх шэрагах. Ды і Кішка вельмі хутка перашыхаваў свой атрад і перайшоў у наступ. Маскавіты не вытрымалі і кінуліся на ўцёкі. Перамога была поўная.

Але разам з тым Вялікае княства страціла Валынь. Хаця частка валынскіх баяраў і князёў прыязджалі ў Вільню і білі чалом Казіміру, большасць з іх заклікала на княжанне Свідрыгайлу. Мяцежны князь стаў абачлівым, і каб пазбегнуць барацьбы з Казімірам, прынёс васальную прысягу польскаму каралю Уладзіславу III і атрымаў ад яго Клецк і Койданава.

У руках мазураў заставалася Драгічынская зямля і трэба было яе вярнуць. За шырокімі спінамі паноў-рады вялікі князь адчуваў сябе спакойна і асабліва не ламаў галаву над дзяржаўнымі справамі. Ёсць на гэта Гаштольд і паны-рада. Князь праводзіў дні у пацехах. Асабліва любіў паляванні. Тыднямі прападаў у пушчах, ганяючы звяроў і птушак. Толькі не да пацех было яго ворагам.

Ужо плялася змова Міхайлы Жыгімонтавіча. Па начах неслілся па дарогах Міхайлавы вестуны на сустрэчы з яго прыхільнікамі. Было вырашана: падсцерагчы Казіміра і забіць яго. Выканаць гэта браліся князі Валожынскія. Яны на чале пяці соцень вершнікаў прыбылі пад Мерач, дзе ў гэты час паляваў Казімір, але палясоўшчыкі заўважылі падазроных узброеных людзей і паведамілі пра гэта дворнаму маршалку, сыну Гаштольда — Андрэю. Той разам з Казімірам на конях уцёк у Трокі, адкуль паведаміў пра ўсё ў Вільню свайму бацьку. Гаш-

тольд падняў войска і паспяшыў у пагоню за Валожынскімі. Паміж Крэвам і Ашмянамі велікакняжацкая пагоня нагнала змоўшчыкаў і разбіла іх. Князі Валожынскія трапілі ў палон. Ад іх і даведаліся, хто прагнуў крыві вялікага князя. Паводле Длугаша, забіць Казіміра ўзяўся князь Сухта Валожынскі, якога ён так любіў, што часта спаў з ім у адным ложку. Аднойчы на ловах, калі паляўнічыя захапіліся і Казімір застаўся сам-насам са Сухтам, таму выпаў зручны момант ажыццявіць задуманае. Сухта папрасіў сабаліную футру, якая была на Казіміру. Вялікі князь зняў яе з сябе і падараваў Сухце, і той змілаваўся. Але, калі змову выкрылі, Казімір не пашкадаваў свайго ўлюбёнца і пакараў яго смерцю.

А Міхайла Жыгімонтавіч толькі з 7 вершнікамі адправіўся ў Жамойць, спадзеючыся на падтрымку жамойтаў. Па дарозе ён трапіў у крыжацкую засаду. Ад смерці яго выратавала тое, што ён голай рукой выхапіў з рук варожы меч, параніўшы далонь. Астатнія яго спадарожнікі загінулі. Некалькі дзён Міхайла хаваўся ў гушчары і багністых мясцінах. Крыжакі з сабакамі шукалі яго і знайшлі ўжо знясіленага. Ці то з ласкі, ці па іншых прычынах яго вылечылі і адпусцілі на волю. Міхайла вярнуўся ў Мазовію, але пасля з'ехаў у Сілезію да князей Аляскіцкіх. Са сваім становішчам ён так і не зміры ўся, жадаў змагацца за бацькоўскую спадчыну.

АБРАННЕ ПОЛЬСКІМ КАРАЛЁМ

У 1443 годзе Вялікае княства пачынае вайну з Мазовіяй за Драгічынскую зямлю. Літвінскае войска пры падтрымцы татарскіх атрадаў узяло ў аблогу Драгічын. Баляслаў Мазавецкі падцягнуў сюды свае войскі. На дапамогу яму паспяшылі палякі. Але яны разумелі, што пасля таго, як пачнецца вайна з Вялікім княствам, унія, заключаная Жыгімонтам, будзе скасавана. Таму Казіміру прапанавалі перамір'е, пакуль не вернецца з Угорыі выбраны там за караля Уладзіслаў III. Перамір'е заключылі.

Толькі Уладзіслаў ужо не вярнуўся ў Польшчу. 10 лістапада 1444 года ў бітве з туркамі пад горадам Варна ён загінуў ад турэцкай кулі. На сойме польскай шляхты ў Сераддзе вырашылі, з парады Збігнева Аляскіцкага, перадаць каралеўскую карону Казіміру і такім чынам пацвердзіць унію з Вялікім княствам. Спадзяваліся, што бязвольны Казімір, які адначасова будзе і польскім каралём, і вялікім князем літоўскім і рускім, пад уплывам каралеўскай рады стане праводзіць польскую палітыку ў Вялікім княстве. Але ў Вільні добра ведалі пра па-

літычныя задумы палякаў, і не далі сябе падмануць. Больш за тое, набліжаныя да Казіміра баяліся, што ў яго адсутнасць Міхайла Жыгімонтавіч захопіць уладу ў Вялікім княстве і расправіцца з імі, а таму не хацелі пускаць вялікага князя ў Польшчу. Калі польскія паслы прыехалі ў Полацк, дзе знаходзіўся Казімір, запрашаць яго на каралеўства, ён пад уплывам паноў-рады адмовіўся ад польскай кароны. Яшчэ два разы прыязджалі палякі прасіць на каралеўскі пасад Казіміра і вярталіся ні з чым. Нават просьбы маці Софіі Гальшанскай, каб «здаровую раду ўжываў»[8], не падзейнічалі на Казіміра. Ён адгаворваўся, што на Раство Хрыстова склікаў сойм у Вільні, каб там і «памовіць» з панамі, што рабіць. На наступным сойме, які праходзіў 28 сакавіка 1446 года ў Петркове, Казіміравы паслы Васіль Красны (з князёў Друцкіх) і Юрый Гальшанскі перадалі: «Казімір уступіў у сталіцу Літоўскую не як радца ад каралеўства Польскага... але як пра́вы і прыроджаны дзедзіч княства Літоўскага, які па продках сваіх Вялікім княствам Літоўскім слушным правам і супольна ў ім справуе ўладзе... Вялікая ягоная зямля і паветы, багацце і сіла, найвышэйшыя панствы і каралеўствы не могуць быць яму мілейшымі»[9].

Палякі яшчэ раз паслалі да Казіміра запрашэнне на каралеўства. Ён адмаўляўся, але недвухсэнсоўна папярэдзіў: «Хто міма яго волі захоча сесці на Польскім троне, таго ўважаць будзе за свайго ворага і ўсімі сіламі пастараецца сагнаць яго»[10]. І тады палякі задумалі інтрыгу. На тым жа Петркоўскім сойме яны абралі каралём Баляслава Мазавецкага. Аднак ягоную каранацыю адклалі. Палякі палохалі літвінаў, што «замест павольнага для вас Казіміра стане каралём Баляслаў, а за вялікага князя будзе яго зяць Міхайла. Пра першага ведаеце, што ён нелагодны, другога дазнаеце, як мсціўцу за смерць бацькі. Раім вам кінуць страшыць, не баімся разрыву, вайны і чым хочаце яшчэ страшыць, бо не баімся таго ўсяго»[11].

Вось тут і задумаліся ў Вільні. Баляслаў даўно прагнуў прыдбаць Драгічынскую зямлю, Падляшша, Берасцейшчыну, і калі ён стане польскім каралём — можа пачацца вайна з Польшчаю за гэтыя землі. Як сваяк Міхайлы Жыгімонтавіча, ён падтрымае яго ў барацьбе за велікакняжацкі пасад. Разумелі гэта паны-рада і сам Казімір, таму да маці ён напісаў, каб яна намовіла палякам прыслаць новае пасольства. Да Казіміра паехала яшчэ адно пасольства і папрасіла яго прыбыць у Парчаў для перамоваў аб кароне. На сойме ў Вільні феадалы дазволілі Казіміру прыняць польскую карону, але ўзялі з яго клятву скасаваць Крэўска-Гарадзельскую унію, захаваць і пашырыць тэрыторыю Вялікага княства, даць права пасля яго смерці выбраць сабе вялікага князя. Выбар быў зроблены.

Далейшы лёс Казіміра — гэта лёс чалавека, які раптам аказаўся паміж Скілай і Харыбдай. З аднаго боку, ён польскі кароль і павінен адстойваць польскія інтарэсы, а з другога боку — вялікі князь літоўскі, рускі і жамойцкі, а тут зусім іншыя інтарэсы, прама супрацьлеглыя польскім. І з таго і з гэтага боку насядалі на яго, патрабавалі, прымушалі, абвінавачвалі. Трэба было мець палітычнае чуццё, знаходзіць кампрамісныя рашэнні, каб тыя страсці, што кіпелі паміж Вялікім княствам і Польшчаю, не ўспыхнулі вайною. Трэба было валодаць сабою, каб не гарачыцца, не рабіць глупстваў. Але ж усядзець на двух крэслах няпроста, а тут — на двух пасадах. І які з іх надзейны? Апынуўшыся ў Польшчы, Казімір воляй-няволяй мусіў слухаць польскіх паноў, нават калі і працівіўся гэтаму. І ўсё болей бралі над ім уладу палякі. А што ім мог ён супрацьпаставіць: волю, характар, інтрыгу?

Нельга было чакаць ад слабавольнага Казіміра, які любіў лазню і ловы, што ён настаіць на сваім. Летапісцы называюць яго няшчасным, якому лёс прынёс нямала засмучэнняў і непрыемнасцей. Ужо на першым агульным сойме палякаў і літвінаў у верасні 1446 года ў Парчаве Казіміру прыйшлося нялёгка. Палякі першымі прыехалі і занялі лепшыя дамы. Літвіны не вельмі давяралі палякам і, калі даведаліся, што горад запаланіла польская шляхта, западозрылі няладнае. У Парчаў яны не паехалі, а спыніліся ў Бярэсці. Польскія паны ў сваю чаргу таксама ўстрывожыліся, ці не жадаюць літвіны ноччу напасці на іх і перарэзаць. Дзень і ноч жаўнеры ахоўвалі дарогі ў Парчаў. Тое самае зрабілі і літвіны: паставілі свае заставы на дарогах у Бярэсце. Палякі запрашалі Казіміра ў Парчаў, але ён адказаў: «Не хачу за трон ваш змагацца, не нам да вас прыязджаць»[12].

Пад аховай вояў прыязджалі паслы то ў Парчаў, то ў Бярэсце. Некалькі месяцаў спрачаліся паміж сабою, абвінавачвалі адзін аднаго, даказвалі, што Валынь і Падолле — гэта іх спрадвечныя землі. Казімір настойваў, каб палякі падпісаліся пад яго граматай, у якой ён прызнаваў за Вялікім княствам Падолле ды Валынь, і даваў права літвінскім феадалам выбіраць вялікага князя. Палякі адмаўляліся. Упартасць абодвух бакоў завяла перамовы ў тупік і палякі саступілі. Бярэсце наведалі польскія святары і ўгаварылі Казіміра прыехаць у Парчаў. Абодва бакі пагадзіліся, што іх рассудзіць Казімір пасля таго, як стане каралём, бо яму «будзе латвей кіраваць намерамі паноў абодвух народаў, як сваімі падданымі»[13]. Будучы кароль выдаў грамату, у якой абвясціў, што паводле аднадушнай згоды ўсіх прысутных на сойме, ён злучыў абедзве дзяржавы ў братні саюз, жадаючы з Божай міласці быць ім гасударам і



Я.Матэйка. Уладзіслаў III Ягайлавіч. *1871 г.*

абаронцам ад варожых нападаў. Для прыняцця польскай кароны Казімір абяцаў прыехаць у Кракаў да дня Яна Хрысціцеля, каранавацца і пацвердзіць прывілеі князёў, прэлатаў, паноў, шляхты і мяшчан. Калі ж ён не прыедзе ў прызначаны час, палякі маюць права аддаць карону Баляславу Мазавецкаму.

У прызначаны час Казімір прыехаў. 25 чэрвеня 1447 года ён каранаваўся. Сярод запрошаных гасцей быў і Свідрыгайла.

Пакідаючы княства, Казімір 2 мая 1447 года выдаў прывілей князям, панам, шляхце, баярам і мяшчанам Вялікага княства Літоўскага і Рускага. Вялікі князь цяпер быў абавязаны ўсе дзяржаўныя справы вырашаць толькі пры згодзе паноўрады, а дзяржаўныя пасады, зямельныя ўладанні даваць толькі патомным жыхарам Вялікага княства. Вызваляў ён паноў, шляхту, баяраў, мяшчан ад вайсковага падатку — срэбшчыны. Хацеў гэтым падкупіць шляхту, а падарваў дзяржаўныя фінансы, бо вельмі хутка спатрэбіліся гэтыя грошы, і ў 1450 годзе ён зноў абкладае вайсковым падаткам шляхту. Ён сам сябе паставіў у залежнасць ад буйных землеўладальнікаў, якія, даючы сродкі на вайну, дамагаліся новых прывілеяў.

ПАН АБОДВУХ НАРОДАЎ

Не паспеў Казімір прывыкнуць да каралеўскай кароны, як ён быў вымушаны пацвердзіць польскай шляхце правы і вольнасці папярэдніх польскіх каралёў. А праз два месяцы пасля каранацыі, у жніўні, на сойме ў Петркове магнаты і шляхціцы ўжо патрабавалі ад Казіміра: «каб земляў Рускіх, Луцкіх і Падольскіх ад Каралеўства Польскага не адарваў». Казімір адказаў, што не можа гэтага выканаць «з-за прысягі, якой уперад забавязаўся літвінам»[14]. Адмовіўся таксама пацвердзіць і прывілеі магнатам, шляхце і мяшчанам, пакуль вяльможы не падпішуцца пад ягонай клятвай літвінам. Вось гэтага не чакалі. Казімір пачуў незадаволеныя ім галасы. З парады літвінскіх паслоў Казімір у ноч на 14 жніўня пакінуў Петркоў і адправіўся ў Літву. Тут ён пражыў з восені па вясну, гойсаючы па пушчах за зверам. І толькі ягоная маці Софія Гальшанская, якая прыехала ў Вільню, угаварыла Казіміра вярнуцца ў Польшчу. 12 мая Казімір прыехаў на сойм у Люблін. Яго суправаджала світа літвінскіх феадалаў: вілінскі біскуп Мацей, князі Юрый Гальшанскі, Васіль Красны, Іван Астрожскі, віленскі ваявода Ян Гаштольд, троцкі ваявода Іван Манівід, наваградскі намеснік Пётр Мантыгірдавіч, полацкі намеснік Андрэй Саковіч і другія.

Зноў палякі патрабавалі ад караля далучыць да Польшчы Вялікае княства. Літвінскія паслы прапаноўвалі выкрэсліць з граматы Гарадзельскай уніі артыкул «пра вечнае з'яднанне Літвы з Польшчаю». «Няхай абедзве дзяржавы злучацца ў асобе аднаго валадара, і тое, калі не будуць парушаны нашы інтарэсы», — казалі літвіны[15].

Палякі працівіліся, прапаноўвалі княству ўвайсці ў Польскае каралеўства на такіх жа ўмовах, як іншыя польскія землі. І тады скончацца спрэчкі. Але паслы заявілі, што яны не згодны на такія ўмовы, бо гэта ганьба — скасаванне тытула вялікага князя літоўскага, рускага і жамойцкага. І ў сваю чаргу патрабавалі вярнуць княству Уладзімір, Алесна, Ратна, Падолле. Зразумеўшы, што нічога не даб'юцца, палякі ўхіліліся ад прамога адказу, супакоілі абяцаннямі літвінскіх паноў. А калі тыя пакінулі Люблін, узяліся за Казіміра. На гэты раз яны пастараліся не выпусціць яго і павезлі пасля сойму ў Кракаў. Ледзь вырваўся Казімір на Літву. Не падабаліся маладому каралю нахабныя дамаганні палякаў. На сойме ў Наваградку Казімір з феадаламі пастанавіў ні ў якім разе не ісці на унію з Польшчаю.

Сойм прыпыніла вестка, што Міхайла Жыгімонтавіч падняў мяцеж. Казімір недаацаніў свайго праціўніка. Неўзабаве пасля каранацыі 1 ліпеня 1447 года ў Калішы ён сустракаўся з Міхайлам Жыгімонтавічам, які прасіў перадаць яму Трокі. Кароль адмовіў таму, што задумаў аблудліва звязеніць Міхайлу, і падкупленыя ім крыжакі вартавалі дарогі з Мазовіі, каб схапіць яго. Міхайла пазбег няволі, прабраўся ў Малдавію, знайшоў сабе саюзнікаў — хана Вялікай Арды Сеід-Ахмеда, зацікаўленага ў аслабленні Вялікага княства. На чале татарскіх загонаў Міхайла захапіў Кіеў. У княстве аб'явілі пагоню. Сабранае войска павёў пад Кіеў той жа Гаштольд. Міхайла не рызыкнуў памерацца з ім сіламі і ўцёк у Маскву да князя Васіля Васільевіча. Трэба было чакаць, што і Масква падтрымае яго. А тут нечакана ў 1449 годзе адбылося «розмирье» паміж Вялікім княствам Літоўскім і васальным Цвярскім княствам. Казімір з войскам выступіў на цвярскога князя Барыса Аляксандравіча. Той прыслаў паслоў да літвінскага валадара і заключыў з ім мір. Паводле дамовы, да Цверы пераходзіла Ржэва, а цвярскі князь, абяцаў Казіміру «стояти за один противу всех сторон»[16]. Такім чынам, уступаючы Ржэва, Казімір захаваў у васалах Цвярское княства, што было вельмі важным у барацьбе за Ноўгарад супраць Масквы.

Выбару ў наўгародцаў не было: ці ярмо маскоўскага князя і канец вечавой вольнасці, ці падначаленне Вялікаму княству, што вяло да ўлады літвінскіх намеснікаў. Таму Ноўгарад, зыходзячы з палітычнага становішча, прымаў да сябе то маскоўскіх намеснікаў, то літвінскіх. У Маскве выношвалі план канчатковага далучэння Ноўгарада. Казімір, а дакладней паны-рада, якія вызначалі яго палітыку, прапанаваў Ноўгараду дапамогу, але з умоваю падданства. Наўгародцы не згадзіліся. Маскоўскі князь Васіль Васільевіч навёў на Вялікае княства татарскія загоны. Татары спустошылі ваколіцы Вязьмы, Бранска ды

Смаленска. Пасланае Казімірам сямітысячнае войска на чале з Судзівоем, Радзівілам Осцікавічам, Андрэем Мсціславічам, Андрэем ды Мікалаем Неміровічамі падышло да Калугі. Тут адбылася бітва, якая не прынесла перамогі ні рускім ні літвінам.

У 1449 годзе паміж Вялікім княствам і Масквою быў заключаны мір. Паводле ўмовы, Казімір адмаўляўся ад прэтэнзій на Ноўгарад і Пскоў, разрываў пастанову Фларэнтыйскай саборнай царкоўнай уніі і прызнаваў маскоўскага мітрапаліта Іёну главою праваслаўнай царквы ў Вялікім княстве Літоўскім. Маскоўскі князь у сваю чаргу адракаўся ад тытулу «великий князь всея Руси».

Адной з прычын, што штурхала Казіміра ісці на ўступкі Маскве і заключыць з ёю мір, была пагроза міжусобнай вайны з Міхайлам Жыгімонтавічам, якога апякаў вялікі князь Васіль. Таму Казімір даваў абяцанне не прымаць да сябе Васілёвага суперніка — князя Дзмітрыя Васільевіча і быць з вялікім князем «заадзін». Тое самае абяцаў і Васіль у адносінах да Міхайла Жыгімонтавіча. Ідучы на кампраміс з Казімірам, Васіль прызнаваў васальную залежнасць Цвярскога княства ад Вялікага княства Літоўскага. А калі б Казіміру пажадаў служыць разанскі князь Іван Хведаравіч, Васіль абяцаў «про то на него не гневаться, не мстити ему»[17]. Па сутнасці княства ў барацьбе з Масквою пазбавілася двух саюзнікаў — Ноўгарада і Пскова. Мала таго, дамова 1449 года развязвала рукі Маскве. Яна жорстка пакарае Ноўгарад і ўстановіць сваю ўладу над Паўночна-Заходняй Руссю, што ў рэшце рэшт прывядзе да трагічных вынікаў і Вялікае княства Літоўскае.

Па прыездзе ў Польшчу Казімір зноў сутыкнуўся са старымі клопатамі, і палякі зноў патрабавалі пацвердзіць прывілеі і вольнасці і прывесці да уніі Вялікае княства. Казімір адказаў, што дзеля гэтага трэба згода літвінаў і ён не можа «у шкоду Вялікаму княству пацвердзіць правоў Каралеўства Польскага». Абураная шляхта прыгразіла каралю: «Адмаўляемся ўсялякага паслушэнства, пакуль правы і свабоды Каралеўства Польскага пісьмова і прысягай не зацвердзіш»[18]. Увагу палякаў ад Літвы адцягнула вайна з Малдавіяй. Увесь 1450 год Казімір быў у Польшчы, аднак зіму і вясну наступнага года ён правёў у Літве. Бавіў час на ловах. У студзені на Віленскім сойме літвінскія феадалы ў прысутнасці Казіміра вырашылі не саступаць палякам Падолле і Валынь. Прама з сойму Казімір адправіўся ў Віцебск, пасля наведаў Смаленск і Полацк. Пэўна, паездка не была выпадковай: вялікі князь хацеў заручыцца падтрымкай гэтых гарадоў. Праўдападобна, што тады і пацвердзіў ён Полацкай, Віцебскай і Смаленскай землям ранейшыя прывілеі. Пайшоў і на ўступкі кіянам, якія прасілі ад-

навіць Кіеўскае княства. З гэтай ідэяй выступілі і паны-рада. Існавала пагроза, што Міхайлу Жыгімонтавічу з дапамогай Масквы і Арды зноў удасца авалодаць старажытнай сталіцай Русі і абвясціць сябе вялікім князем рускім. Каб пазбавіць Міхайлу дамаганняў на Кіеў, Казімір пасылае ў горад слуцкага князя Алельку Уладзіміравіча з сынамі Сымонам і Міхайлам. У сакавіку да Казіміра ў Коўна прыехалі паслы ад бургундскага герцага Філіпа і арагонскага герцага Альфонса з просьбай дапамагчы адваяваць у туркаў Святую зямлю. Казімір расчараваў паслоў: «Вяду вайну з татарскай ардой — дзікай, спрытнай і моцнай у баях. Пакуль гэтым непрыяцелем заняты — не магу аб другіх выправах думаць»[19].

Летам Казімір адправіўся ў Польшчу, бо ў Парчаве была прызначана сустрэча паміж прадстаўнікамі Кароны і Княства. Літвінскія паслы, баючыся аблудлівасці палякаў, адмовіліся ехаць у Парчаў без ахоўных грамат. Казімір сам асабіста сустрэў іх на мяжы і праводзіў у Парчаў. Трэба заўважыць, што Гаштольд, каб паказаць сваю незадаволенасць Казімірам, так і не паехаў разам з астатнімі пасламі. Ад імя літвінскай дэлегацыі выступіў віленскі біскуп Мацвей. Ён патрабаваў скасавання ранейшых актаў уніі і замены іх новымі, з якіх выкасавалі б пункты пра ўваходжанне княства ў склад Польшчы. Патрабаваў ён і прызнання за Вільняю Валынскай і Падольскай земляў. Ад палякаў выступіў Збігнеў Аляснцкі. Ён паспрабаваў пасароміць літвінскіх дэлегатаў, мовіўшы, што прадстаўнікі княства неаднойчы пацвярджалі ўмовы уніі, спасылаўся на дамову Жыгімонта Кейстутавіча, які саступаў спрэчныя землі Польшчы. На што літвінскія паслы заявілі, што іх папярэднікі, не ведаючы пра змест уніяцкіх дамоваў, прынялі іх па загадзе вялікага князя, самыя артыкулы напісаны не на іхняй мове, а таму яны не сапраўдныя. Літвіны вярнуліся дадому, а Казімір застаўся сам-насам з угневанымі на яго палякамі. Збігнеў Аляснцкі не прамінуў выпадку выступіць супроць караля. «Альбо мы з табой, альбо ты сам у граху», — казаў ён. Здзіўленаму Казіміру Збігнеў растлумачыў ягоную «віну» — парушэнне клятвы Міхайлу Жыгімонтавічу. «Кару Божую зазнаў за падобнае парушэнне прысягі брат твой родны». Напамін аб лёсе Уладзіслава не спадабаўся Казіміру і ён рэзка адказаў: «Не спадзяваўся ніколі з тваіх вуснаў пачуць такія словы. Не змусіш мяне схіліць, каб я ўчыніў тое, пра што мне нагадваеш. Упадзе яшчэ не адна галава, пакуль князь Міхайла будзе вяртаць свае вотчыны»[20]. Так Казімір паказаў і свой характар. Аднак і польскія вяльможы мелі гонар і рашуча нагадалі Казіміру: «На тое каралём абраны, каб не толькі правы каралеўства ўсцерагаў, але ва ўсім стараўся іх пашырыць» і прыг-

разілі зброяй адстойваць Падолле і Валынь. Казімір не стаў распальваць звадкі і прапанаваў разгледзець спрэчныя з Літвой пытанні на наступным сойме, а каб улагодзіць палякаў, прызнаўся, што «спрыяў Польшчы, але не Літоўскаму княству. Аднак мне належала быць абачлівым, каб Літва не выйшла з паслушэнства»[21].

Пэўна, з палёгкай на душы пакідаў Казімір Польшчу. Хоць на нейкі час пазбавіўся ён ад надакучлівых патрабаванняў палякаў. Хаця і не жадалі яны адпускаць караля ў Вільню, але той спаслаўся на трывожныя падзеі на ўсходніх межах княства і паехаў. У Вільні Казіміра нецярпліва чакалі.

ПЕРАЛОМ

У пачатку 1452 года на свята Раства Хрыстова адбыўся ў Вільні сойм. Зноў літвіны патрабавалі ад Казіміра не саступаць Польшчы Валынь і Падолле. Было ўжо вядома, што Свідрыгайла ляжыць на смяротным ложку. Вырашылі паслаць атрады і заняць валынскія гарады пад Літву. Адначасова польскія вяльможы на чале са Збігневам Аляснiцкім паслалі да Казіміра ліст: «каб памятаў, што ён польскі кароль, і не рабіў учынкаў, не вартых сваіх папярэднікаў»[22].

Шмат залежала ад пазіцыі Свідрыгайлы. Ён узяў клятву з луцкага намесніка Няміры, князёў Чартарыйскіх і луцкіх бояраў, што Валынь застанецца ў складзе Вялікага княства. Адразу пасля яго смерці, 10 лютага 1452 года, на Валынь уступілі атрады пад зверхнасцю князя Юрыя Пінскага, Радзівіла Осцікавіча і баярына Юршы. Як толькі пра гэта даведаліся ў Кракаве, раздаліся заклікі брацца за зброю. Асабліва ваяўнічым быў Збігнеў Аляснiцкі. А да яго прыслухоўвалася нават каралева Софія. Палякі вырашылі патрабаваць ад Казіміра перадачы Польшчы Валыні. Рашуча выступіў кракаўскі ваявода Ян Тэнчынскі: «Дарэмна з гэтым пасылаць да караля, бо Луцк з яго ведама ўзяты. Баюся, каб літвіны не выбралі іншага князя. Болей жадаю зброяй гэтую цвержу здабыць, а спалёны літвой Уладзімір аднавіць і асадзіць сваімі людзьмі»[23]. Баявы запал палякаў трохі аціх, калі на паўднёвыя польскія землі напалі загоны хана Сеід-Ахмеда. Гэты напад татараў адбыўся не без удзелу паноў-рады. Як не дзіўна, Казімір не забараніў панам-рады адправіць да Сеід-Ахмеда з падарункамі Радзівіла Осцікавіча, а пазней і прыняць самога хана, разбітага крымскімі татарамі. Няма чаго гадаць, бо ясна, што сам Казімір даваў згоду панам выплаціць са скарбніцы Сеід-Ахмеду «падзяку» за набег на Польшчу.

У гэты ж час памёр князь Міхайла Жыгімонтавіч. Паводле «Хронікі Быхаўца», яго атруціў у Маскве нейкі ігумен, даўшы прычасце з атрутаю[24]. Перад смерцю Міхайла напісаў да Казіміра ліст. «Любы, міласцівы кароль, выгнаны праз цябе з майго ойчага дзедзіцтва не мог заслужыць тваёй ласкі і прабачэння, нават найвялікшай пакорай перад табой не хацеў ты адступіць ад маіх правоў, а цераз гэтае туляўся я сярод паганых і варвараў, ад паганай мне працы надышоў дзень смерці, без споведзі перад капланам каталіцкім і астатніх праў рэлігійных, малю, той ласкі, якой пры жыцці выпрасіць не мог, прызнай пасля смерці, не адмаўляў цела маё пахаваць у Віленскім касцёле побач дзядоў і бацькоў маіх»[25]. Ліст гэты расчуліў Казіміра. Шкада было стрыя, які з-за яго стаў выгнанцам. Казімір аплакваў Міхайлу і раскайваўся, што так аблудліва аднёсся да яго.

Толькі становішча дзяржаваўладцы вымагала забывацца пра свае пачуцці і падпарадкоўваць іх палітычным інтарэсам. Наперадзе Казіміра чакала цяжкая барацьба з польскімі вяльможамі. Казімір адправіў у Польшчу Мікалая з Барысовіч з просьбай, «каб палякі ўстрымаліся ад вайны і не выступалі збройна з мэтай адабрання замка Луцка», а заадно абяцаў «шукаць другіх сродкаў, якімі гэтую спрэчку» можна вырашыць. Аднак палякаў раззлавала Казімірава папярэджанне, што ў выпадку вайны за Луцк Польшчы пагражае «напад». «Чаму кароль не ўтрымаў літвінаў ад заняцця Луцка», — з гневам накінуліся польскія саноўнікі на Казімірава пасла. Той спакойна адказаў: «Задавайце такія пытанні каралю і атрымаеце адказ»[26]. Зноў выступіў Збігнеў Аляснiцкі і пачаў падбухторваць вяльмож супраць Казіміра, абвініўшы яго ў тым, што ён звёз у Літву польскую скарбніцу. Казімір, як даведаўся пра словы Аляснiцкага, адправіў да польскіх вяльмож лісты, у якіх называў таго «чалавекам дымным і сваім непрыяцелем»[27]. Цяпер усё залежала ад цвердасці самога Казіміра. Нялёгка давялося Казіміру, калі ён прыехаў у Польшчу. На сойме ў Сандаміры Збігнеў Аляснiцкі зноў стаў вінаваціць яго: «не досыць дбаў пра дабро і слушнасць каралеўства» і правы не пацвердзіў, і землі да Польшчы належачыя адарваў, і ад непрыяцеля і лотраў не бараніў, і пра гаротных не клапаціўся, і «даходы каралеўства пераводзіў на карысць літвінаў», а таму прыгразіў, каб Казімір свае «звычаі і ўчынкі адмяніў»[28]. Нямала непрыемнага пачуў Казімір. А тут яшчэ паслы мазавецкіх князёў Уладзіслава і Баляслава патрабавалі Тыкоцын і Гонядзь. Угневаны кароль абараніў літвінаў: «Справядліва іх забралі, як свае»[29]. Чым яшчэ больш раззлаваў палякаў і яны пачалі выгаварываць Казіміру за спрыянне літвінам, абвінавачваць іх у непаслухмя-

насці яму. Кароль, апусціўшы галаву, моўчкі выслухоўваў. На каленях кароль кляўся перад польскімі магнатамі і шляхціцамі, што выканае іх патрабаванні. Але на сойме ў Сераддзі, які пачаўся 24 жніўня, ужо літвіны выстаўлялі свае патрабаванні. Паслы Андрэй Давойнавіч і Міхайла Мантыгірдавіч заявілі, каб «Літву пакінулі пры непарушных межах, асабліва землі Падолля і Луцка», літвіны хочуць «жыць з палякамі ў братнім саюзе і роўнасці, а не служыць ім у падданстве». І хаця палякі пераконвалі літвінскіх паслоў, што ўважаюць літвінаў «за братоў і прыяцелей», аднак пачуўшы пра унію, Давойнавіч і Мантыгірдавіч выехалі на Літву[30]. Палякі зноў накінуліся на Казіміра. Яго прама абвінавацілі, што ён здрадзіў Польшчы, а з такім каралём нельга служыць Айчыне. Казімір на таемнай нарадзе з польскімі саноўнікамі растлумачыў, што «не мог прозбе их учинити для небезпечности головы своей»[31]. Як толькі ў княстве даведаюцца пра пацвярджэнне уніі, дык яго падданыя там адмовяцца падпарадкавацца яму і адкрыта або тайна паспрабуюць пазбавіць яго жыцця.

Палякі настойвалі. І Казімір адступіў, пакляўся, што з'яднае Вялікае княства з Польшчаю і далучыць да кароны Валынь і Падолле. Толькі прасіў адкласці выкананне клятвы на год. Нецярплівая шляхта не пагадзілася з гэтым. Тады кароль прапанаваў паслам выбраць восем чалавек, якім ён растлумачыць сваё рашэнне. І што ж? Як высветлілася, кароль палохаўся, што ў выніку паспешлівых дзеянняў не ўдасца ўратаваць тыя падаткі з Валыні і Падолля, што ішлі ў каралеўскую скарбніцу. Ці не лепш без шуму і гвалту асадзіць валынскія і падольскія гарады сваімі людзьмі і вывезці скарбніцу ў Кракаў? Слушна. З каралём пагадзіліся. Год ён выйграў. Але, каб не забываўся пра сваю клятву, з яго вытрабавалі пісьмовае абяцанне выканаць яе.

Ужо мінула даволі часу і Казімір з'арыентаваўся ў палітычным становішчы Польшчы і зразумеў, што верхаводзіць тут групоўка Збігнева Аляснцкага. Спакваля кароль спрабуе вызваліцца ад уплыву некаранаванага валадара Польшчы. У гэты час у Базелі праходзіў царкоўны сабор, на якім нізлажылі папу Яўгена IV. Той сабраў свой сабор у Фларэнцыі. Аляснцкі спачатку падтрымліваў Яўгена, а калі на яго месца выбралі новага галаву каталіцкай царквы, Мікалая V, кракаўскі архібіскуп слушна выбраў нейтралітэт у адносінах да абодвух пап. Пераемніка Яўгена IV, Мікалая V, прызнаў імператар Фрыдрых III. Дамагаўся новы папа свайго прызнання іх ад Казіміра. Кароль згадзіўся, але з умоваю, што Мікалай саступіць яму права прызначаць святароў на царкоўныя пасады. Атрымаўшы такое права, Казімір мог цяпер расправіцца з незалежнасцю царкоўных



Казімір з жонкай Альжбетай сярод бернардзінцаў. *XVII ст.*

іерархаў. І не прамінуў з гэтага скарыстацца. Аляснiцкі прэтэндаваў на зверхнасць у польскай царкве, але Казімір аддаў старшынства гнезненскаму архібіскупу. Але гэта былі часовыя перамогі. Апазіцыя Казіміра заставалася па-ранейшаму моцнай і ў Польшчы, і ў Вялікім княстве. Партыя Яна Гаштольда ставіла пытанне аб тым, каб замест Казіміра быў абраны новы вялікі князь — Радзівіл Осцікавіч. Казімір адправіўся ў маі 1453 года на Віленскі сойм уладзіць канфлікт. Страсці там так напаліліся, што прыхільнікі абедзвюх партый выхапілі

зброю. І пачалася сеча. Нехта паспрабаваў у замятні распрaвіцца з вялікім князем, секануў яго шабляй, але толькі параніў. Што ж, прадчуванні Казіміра спраўдзіліся — яго хацелі пазбавіць жыцця.

Як тут знайсці кампраміснае рашэнне? Пакуль што Казімір навучыўся адкладваць складаныя пытанні «на пазней»[32]. Аднак свой шлюб «на пазней» ён не адклаў. Калі ў Гародні, дзе ўвесну 1452 года жыў Казімір, да яго прыбыло пасольства з прапановай высватаць для яго дачку імператара Альберта II Альжбэту, дык ён даў сваю «ўхвалу».

Толькі вось «на пазней» перанесці сваю клятву палякам Казімір на гэты раз не змог. Год прабег хутка і трэба было выконваць абяцанне, дадзенае польскім панам і шляхце. Быў назначаны новы сойм у Парчаве. Польская шляхта натоўпамі з'язджалася туды. Адправіліся ў Парчаў літвінскія дэлегаты: браты Юрый і Барыс Гальшанскія, Андрэй Саковіч, Іван Неміровіч, Мікалай Пац, Радзівіл Осцікавіч, Іван Хадкевіч. Але перадумалі, спыніліся, як і раней, у Бярэсці. Даведаліся, што на дарогах у Парчаў палякі зрабілі засады. Калі ў Бярэсце прыбыло польскае пасольства, літвінскія дэпутаты заявілі, што ў Парчаў яны не паедуць, бо палякі надумалі іх забіць. Палякі зноў накінуліся з дакорамі на Казіміра. Кароль ад такога «салодкага жыцця» страціў сон, ежа не лезла ў рот. Наспяваў разрыў з Вялікім княствам. Казімір пасылаў ад свайго імя прасіць літвінаў на сойм. Але як толькі яны прыехалі, зноў пачаліся ранейшыя спрэчкі. Зноў літвіны стаялі на сваім: ніякай уніі, ніякіх зямельных уступак Польшчы. Нарэшце палякі прапанавалі заклікаць пасрэднікам германскага імператара або папу. Літвіны з насмешкаю прапанавалі крымскага хана. Палякі пакрыўдзіліся і спынілі перамовы.

Што адбывалася далей, апавядае «Хроніка Быхаўца». Польскія паны вырашылі: калі нельга ні праз караля, ні зброяй дамагчыся свайго, дык лепш скарыстацца здрадаю і аблудлівасцю — перарэзаць літвінскую дэлегацыю. Так некалі палякі на сойме расправіліся з рускімі баярамі з Перамышля і захапілі горад. «І быў паляк высакароднага паходжання Андрэй Рагацінскі»[33], ён і папярэдзіў літвінскіх феадалаў пра небяспеку. Тыя і не паверылі, але ўсё ж патаемна з'ехалі ў Бярэсце. Польская шляхта, не ведаючы пра гэта, напала на абоз літвінскага пасольства. Паслоў не знайшлі. А тыя пераканаліся ў аблудлівасці палякаў. Пры такіх стасунках цяжка было разлічваць на якое-небудзь паразуменне.

Між тым палякі рыхтаваліся даць Казіміру бой. 24 чэрвеня на сойме ў Петркове Аляснцкі прапанаваў весці пасяджэнні ў дзвюх палатах: магнатаў і шляхты. Ведаючы, што патрабаванні

абедзвюх палат да караля супадуць, кардынал спадзяваўся аказаць на Казіміра маральны ціск. Ён падбухторыў магнатаў і шляхту да непадпарадкавання каралю і ў выпадку адмовы нізлажыць яго. Казімір папрасіў дзень на роздум і на другі адказаў: «Мы не годит присяги противной чинити на першую присягу, которую учинили Литве, где мене на Великое князство Литовское выбрали, еднак учиню вам присягу не яко кроль, але як князь литвинский»[34]. Казіміравы хітрыкі адразу раскусілі: аднак справа патрабаваць выканання прысягі ад свайго караля, а другая з гасудара іншай дзяржавы, хаця гэта і адзін чалавек. «Нестачечная и подейзраная» прысяга не задаволіла паноў і яны зноў пачалі «упорное налегати» на караля. Нават яго маці — каралева Софія Гальшанская і то «налегала грозбою», каб «пилно справовал» карону, а «литвяков от своего обецования пречь отдалил»[35].

Некаторыя з польскіх вяльможаў нават патрабавалі «іншага абраць караля»[36]. І Казімір адступіў. На Евангеллі і крыжы пацвердзіў ён прывілеі сваіх папярэднікаў і пакляўся далучыць да каралеўства Валынь і Літву. Згадзіўся кароль і з тым, каб да яго прыставілі чатырох вяльмож, з парады якіх ён і будзе прымаць свае рашэнні.

На Літве рашэнне Казіміра расцанілі як здраду Вялікаму княству. Ян Гаштольд, Іван Манівід, Кезгайла, Петраш Мангірдавіч, Радзівіл Осцікавіч і іншыя феадалы-католікі адракліся ад сваіх гербаў, атрыманых на Гарадзельскім сойме. Урад Вялікага княства пачаў рыхтавацца да вайны. Літвінскія паслы наракалі на Казіміра перад вялікім магістратам Тэўтонскага ордэна, што ён прадаўся палякам. Вялікае княства заручылася падтрымкай Крымскага ханства.

У гэты час у жыцці Казіміра адбылася сапраўды прыемная падзея. 10 лютага ў Кракаве ён узяў шлюб з Альжбэтай Габсбург. Праўда, спачатку Казімір хоць і даў згоду на шлюб, але пасля перадумаў*. Ён склікаў раду, каб абмяркаваць з сенатарамі важнае пытанне, як гэта пазбегнуць шлюбу. Сенатары параілі не чыніць гэтага, бо шлюб караля павінен прынесці вялікую славу і дабро Рэчы Паспалітай. Калі ж Казімір заўпарціўся, то яму цвёрда заявілі: «Кароль, не будзе таго»[37]. Вось і давялося падначальвацца волі добразычліўцаў.

Адукацыяй і выхаваннем Альжбэты пераўзыходзіла свайго мужа. Яна ведала нямецкую, чэшскую, вянгерскую, лацін-

---

*Магчыма, Казімір упадабаў дачку дацкага караля. Пазней ён прызнаўся: «Шкада мне таго, што гэтую белагаловую не ўзяў, маючы на тое магчымасць, за якую Эрык кароль дацкі, яе дзед, даваў мне добры пасаг». (Golebiowski L. Op. cit. S. 346.)

скую мовы. Так што ў параўнанні з ёй Казімір выглядаў невукам, але Альжбэта не імкнулася вучыць яго жыццю, не лезла ў дзяржаўную справу — цалкам прысвяціла сябе сям'і. Хоць заўсёды раіла мужу больш цаніць людзей пачцівых няхай і бедных, чым нікчэмных, але багатых. І як адзначалі сучаснікі: «З няўдзячнага спярша малжэнства яно потым было ўдзячным, якое Пан Бог узнагародзіў значным патомствам і з якога былі чатыры каралямі каранаваны, пяты кардыналам, а шосты так памёр»[38]. Але ж гэты шосты Казімір за сваю набожнасць быў кананізаваны і стаў лічыцца нябесным апекуном Літвы. Не кожны кароль меў такое патомства. Дык можа, веліч Казіміра як раз у тым, што ён узгадаваў такіх дзяцей. І калі ў дзяржаўнай дзейнасці не бачыў ён шчасця, дык у сямейным жыцці пашчасціла. Мілаваў сваю жонку Казімір, а «яна яго таксама»[39]. Паўнюткі дом дзяцей быў у Казіміра. Шасцёра сыноў і сямёра дачок нарадзіла Альжбэта мужу: Уладзіслава (1456 год, будучы чэшскі і ўгорскі кароль), Казіміра (1458 год, за хрысціянскую добрадзейнасць прылічанага да святых, нябесны заступнік Літвы), Яна Альбрэхта (1459 год, будучага польскага караля), Аляксандра (5 жніўня 1461 года, будучага вялікага князя літоўскага і рускага, польскага караля), Жыгімонта (1 студзеня 1467 года, будучага вялікага князя літоўскага і рускага, польскага караля), Фрыдрыха (1468 год, будучага кракаўскага архібіскупа), Ядвігу (1457 год, жонка князя баварскага), Софію (1464 год, жонка маркграфа брандэнбургскага Фрэдэрыка), Альжбэту (1465—1466 гг.), Альжбэту (1470 год), Ганну (1476 год, жонка паморскага князя Багуслава), Барбару (1478 год, жонка сакскага князя Эразма), Альжбэту (1483 год, жонка легніцкага князя Фрэдэрыка II)[40]. Было за што Казіміру дзякаваць Богу за шчасце. І добра ён ведаў: «Шчасце ёсць праверка цноты»[41].

НЕСПАКОЙ

У Кракаве без радасці ўспрынялі навіны з Літвы. Вайна з Вялікім княствам палохала палякаў, бо ў гэты час Польшча ўжо ваявала з Ордэнам. Прускія гарады, не жадаючы знаходзіцца пад ордэнскай уладаю, звярнуліся да Казіміра з прапановаю прыняць іх у польскае падданства. Але падпісанае на паперы пагадненне трэба было ажыццявіць. Ордэн не збіраўся саступаць свае правы на Прускую зямлю.

Нягледзячы на пратэст Аляснщкага, Казімір са згоды каралеўскай рады пачаў вайну з Ордэнам. Сабраная на вайну шляхта ўзбунтавалася ў лагеры пад Цэркавіцай і дамаглася ад караля прывілея, паводле якога ён не мог прымаць новых законаў і

склікаць паспалітае рушэнне без соймавага дазволу. Гэты прывілей быў накіраваны на абмежаванне каралеўскай улады і пазбаўляў Казіміра хоць нейкай самастойнасці. Ён станавіўся выканаўцам волі шляхты і магнатаў.

У першай жа буйной бітве пад Хойніцамі 18 верасня 1454 года крыжакі разбілі польскае войска. У бітве ўдзельнічаў пяцітысячны літвінскі атрад на чале з полацкім намеснікам Алехнам Судэмонтавічам. Сам Казімір ледзь выратаваўся ад крыжацкай пагоні. Толькі шэсць вояў суправаджалі яго. Па дарозе кароль напароўся на крыжакоў. Алехна Судэмонтавіч, жадаючы выратаваць Казіміра, заклікаў: «Мілыя браты, выратуем гэтага рыцара»[42]. Крыжакі памылкова прынялі полацкага намесніка за караля, акружылі яго і захапілі ў палон. Казімір са сваім слугою Юрыем Валом* уцёк. На іх шляху ляжала балота. Стомлены конь пад каралём упаў. Пакуль Казімір прабіраўся праз твань на другі бераг, Вол з лука адстрэльваўся ад ворага. Караля і яго слугу сустрэў пад Хойніцамі кракаўскі пан Ян Рутвянскі і абрадаваўся: «Дзякуй госпаду Богу, што тваю міласць бачым здаровага...» Як высветлілася, Рутвянскі не біўся з крыжакамі, а мыўся ў лазні. Расстроены Казімір адказаў: «Пан Рутвянскі, вы мыліся ў лазні вадою, а мае верныя слугі з Літвы ў непрыяцельскіх руках крывёю ўмываюцца»[43]. Казімір прыбыў у Быдыгошч «смутны і наракаючы на няшчасны лёс»[44]. Ён гатовы быў змагацца і разаслаў па прускіх гарадах граматы, «што паражэнне больш яго разгневала, чым паканала, і хутка пры Боскай дапамозе пастараецца абы вораг нядоўга цешыўся перамогай»[45]. Спадзяваўся ён больш на дапамогу Літвы, чым Бога.

Гэтае паражэнне яшчэ больш распаліла гнеў палякаў на свайго караля. Не ведалі як і абразуміць яго. Знайшоўся нехта Судзівой, канонік гнезніскі і муж вельмі набожны. Калі ён у свіце караля быў у Бярэсці, то прыехаў сюды нейкі парыжскі тэолаг і навучыў як. І вось нібыта маліўся Судзівой Богу, каб той паведаміў за якія правіны напусціў ён на Казіміра і на яго люд такую кару, што ў справядлівай вайне ад малай купкі непрыяцеляў быў пераможаны. І нібыта Бог адказаў, «што за вялікія злачынствы караля, чым люду тое здарылася паражэнне». І наказаў яму ісці да Казіміра і выкрыць яго ў тых правінах. Бог дазволіць яму кампенсаваць гэтае паражэнне, калі выправіцца ў сваіх блудах. Судзівой, натхнёны сваёй незвычайнай місіяй, адправіўся да караля і слёзна, і гнеўна прамаўляў яму: «Гэта я табе моўлю Пан, калі быў дзіцёнкам і ва ўсім

---

* Заснавальнік роду Валовічаў.

лёгкадумным, з малодшага ўчынілі вялікім, і спачатку на пасад літоўскі, а потым на каралеўства Польскае пасаджаны. Колькі разоў ад смерці, якая тваю закранула галаву, быў захаваны. Святым малжэнствам ашчасліўлены. Прускія і Паморскія землі пад тваё берло схіліліся. Стаў у свеце слаўным і над усімі каралямі польскімі ўзняўся. А ты цяжкімі ўчынкамі ўзбудзіў гнеў Боскі дагэтуль не хочаш выправіцца»[46]. Судзівой папярэдзіў караля, што калі не выправіць сваю віну, дык ніякая яго справа не адбудзецца, а патомства нікчэмна згіне. Не вельмі было прыемна слухаць такія словы. Нібыта, ён, кароль, вінаваты ва ўсіх бедах і няшчасцях. А хто ж яшчэ? Ён пан, гаспадар, валадар і ён адказвае за ўсё ў сваім панстве. А першая віна яго была ў тым, што не перадаў Польшчы Валынь. Таму і наракалі на яго, што спрыяе больш літвінам, чым палякам. І каб улагодзіць тых і тых ён на з'ездзе ў Бярэсці прымае саламонавае рашэнне — падзяліць спрэчныя землі. Літве даставалася Валынь, ўсходняя частка Падолля і брацлаўская зямля, а Заходняе Падолле і валынскія гарады Алесна, Лапацін, Ратна адыходзілі да Польшчы. Гэтым рашэннем абодва бакі былі незадаволеныя і лічылі сябе абдзялёнымі. У Літве зноў загучалі незадаволеныя галасы і сярод іх саліраваў Ян Гаштольд.

На паседжанні паноў рады Ян Гаштольд, Аляксандр Судэмонтавіч і князь Юрый Астрожскі заявілі: «Былі мы шчаслівымі пакуль з палякамі не былі супольна. Узялі сабе каралёў з княжат нашага племені. Лепш, каб вочы іх зацміліся, вушы іх закрыліся, як далонь іх злучыла нас з палякамі. Калі сыны Ягайлы забыліся пра роднае гняздо і да палякаў невідушча прывязаліся, калі нас выракліся і пакінулі, то і мы іх пакідаем і выракаемся. Патрэбны нам уладар, які сярод нас прыбываў бы і сам панаваў сваёй асобай. Паколькі не для сябе пасаду прагнем, для агульнага ўсіх дабра, асобнага хочам князя. Таму Сымон Алелькавіч варты гэтага пасаду, яго выкрыкнем сваім панам, ён зноў ашчаслівіць нас, няхай узначаліць наш народ. А Ягайлавічы і палякі няхай убачаць, што страцілі Літву, дзе замест верных падданых або роўных ім суграмадзян ужо чужы і непрыязны ім народ убачаць»[47]. Супраць гэтага намеру выступіў троцкі ваявода Манівід. Ён нагадаў тое добрае, што зрабілі Ягайлавічы для края, а цяпер трэба парушыць ім прысягу, адабраць іх дзедзічну і пайсці ўслед за неразважлівай парадай або за чыімсці жаданнем. Так, цешыць Казіміра польская карона, але больш за ўсё прысвяціў ён сябе кахаючым яго літвінам. «І ці вольныя мы ад віны, якую цалкам на пана свайго ўскладаем, калі праз яго даверана нам улада? Не так чынім як належыць»[48]. І довады яго знайшлі паразуменне ў сэрцах паноў.

А Казімір, даведаўшыся пра намер Гаштольда, занепакоіўся. Трэба было нешта рабіць...

Увесну 1455 года Казімір прыехаў у Вільню і, як паведамляе Длугаш, «суцішыў неспакой, падняты Гаштольдам, і адгаварыў літвінаў ад перамены адносін, задуманых імі»[49]. Кароль «суцішваў» абяцаннем, што не адступіцца ад сваёй клятвы, не дапусціць уніі. Таго-сяго з уплывовых вяльмож багата адарыў. Удалося яму ўгаварыць велікакняжацкае панства дапамагчы Польшчы. Ён пазычыў з дзяржаўнай скарбніцы 80 тысяч злотых. На дапамогу палякам выступіла васьмітысячнае войска пад зверхнасцю віцебскага намесніка Івана Хадкевіча і трохтысячны татарскі загон.

Асаблівую радасць у Казіміра выклікала вестка пра смерць Збігнева Аляснцкага. Не стала небяспечнага для яго палітычнага праціўніка і можна было спадзявацца на ўмацаванне сваёй улады ў Польшчы. А тут яшчэ такая радасць: 1 сакавіка 1456 года нарадзіўся сын Уладзіслаў*. Радасць змянілася гораччу. Казімір не дасягнуў асаблівых поспехаў у вайне з Ордэнам. Крыжакі адваявалі Торунь, а Кралевец паўстаў супраць яго ўлады і адчыніў браму ордэнскаму войску. Шляхта не хацела плаціць новыя падаткі на вайну. Чарговы паход у Прусію восенню 1455 года закончыўся для Казіміра бясслаўна. Войска гэтак і не ўзяла невялічкае места Лашчын і пад ціскам маразоў і пагрозы голаду адступіла. Засмучаны Казімір не ведаў «якім чынам працягваць вайну і адкуль узяць на яе сродкі, калі ў скарбу не было пянёндзаў»[50]. Зноў паступілі нярадасныя весткі з Вільні. Ян Гаштольд, Юрый Гальшанскі, Юрый Астрожскі, Алехна Судэмонтавіч ды іншыя відныя феадалы расчараваліся ў Казіміры і нікольк не верылі яму. Летам у 1456 годзе яны адправілі ў Легніцу да караля Мікалая Неміровіча і Татвіла ад «паноў і ўсяго вялікага князства». Партыя Яна Гаштольда рашуча патрабавала ад Казіміра вярнуць Вялікаму княству Падолле, іначай давядзецца адваяваць яго са зброяй. Сам Казімір «каб памятаў, што, паслухаўшы палякаў, загінуў ягоны брат Уладзіслаў, кароль Угорскі і Польскі, і сам праз іх быў у небяспецы, з якой толькі Бог міласцівы выратаваў, каб вярнуўся да Літвы, дзе без трывог мог жыць спакойна і шчасліва»[51]. Нічога не паабяцаў паслам, шчодра адарыў іх і адпусціў у Вільню. А там будзе відаць, што рабіць.

Аднак польскія саноўнікі разумелі, што Вялікае княства можа скарыстацца з вайны паміж Польшчай і Прусіяй ды выбраць

---

* Звездары прарочылі, што становішча планет у гадзіну яго нараджэння абяцае яму вялікую будучыню і панаванне над многімі народамі і каралеўствамі. У гонар дзеда яго назвалі Уладзіславам. Сапраўды, прароцтва збудзецца, бо Уладзіслаў стане чэшскім і венгерскім каралём.

сабе новага вялікага князя, сілаю адваяваць Падолле. І Казімір прадчуваў, што падобны ход падзей ускладніць і без таго яго нялёгкае становішча як польскага караля і пазбавіць велікакняжацкай кароны. Таму ён прымае захады, каб пазбегнуць сумнай развязкі. На Падоллі з'явіліся польскія камісары, якія ўзялі ў тамтэйшых феадалаў прысягу на вернасць польскай кароне. Замкі падрыхтавалі да вайны. Кароль, нягледзячы на незадаволенасць сенатараў, якія падазравалі, што ён усё ж паслухае Гаштольда, сабраўся ў Вільню. Прысутнасць яго там была неабходнай. Іван Манівід паведамляў, што паны-рада шукаюць саюзу з Ордэнам. Аднак самае трывожнае тое, што Ян Гаштольд, Юрый Гальшанскі, Радзівіл Осіпавіч, Алехна Судэмонтавіч задумалі ўзвесці на вялікае княжанне Сымона Алелькавіча і схіляюць на свой бок просты люд. Да ўнутранага неспакою ў Вялікім княстве дадаўся і знешні. Вялікі князь маскоўскі Васіль II адразу ацаніў палітычную кан'юнктуру, што склалася ва Усходняй Еўропе. Вайна Польшчы з Прусіяй і польска-літвінскі канфлікт дазвалялі яму павесці рашучы наступ на Наўгародскую і Пскоўскую рэспублікі. Ні Ордэн, ні Вялікае княства, якое па дамове Казіміра з Васілём у 1449 годзе выраклася саюзу з Ноўгарадам і Псковам, не маглі прыйсці на дапамогу гэтым гарадам. У 1456 годзе Васіль рушыў маскоўскія раці і саюзных яму татараў на Ноўгарад. На баку наўгародцаў змагаліся і пскавічы. Пад Русай наўгародскае войска было ўшчэнт разбіта маскавітамі. Ноўгарад прызнаў над сабою ўладу Масквы і выплаціў маскоўскаму князю вялікую кантрыбуцыю. Паводле маскоўска-наўгародскай дамовы, Ноўгарад адмаўляецца прымаць літвінскіх пасаднікаў і скасоўвае вечавы лад. Вялікае княства пазбаўлялася саюзніка супраць Масквы. Паражэнне Ноўгарада паўплывала і на пазіцыю разанскага і цвярскога князёў, якія паддаліся пад уладу маскоўскага гасудара.

Узмацненне Масквы выклікала зразумелую трывогу ў Вільні, і адтуль настойліва патрабавалі хутчэйшага прыезду Казіміра. Палякі ж баяліся, каб той не застаўся на Літве і не адмовіўся ад польскай кароны. У караля ўзялі пісьмовую клятву, што ён не выдасць ніякага акту супраць Польшчы і не парушыць умоў уніі. Толькі пасля гэтага Казіміра адпусцілі з Польшчы. Восенню 1456 года ён прыехаў у Вільню і, нягледзячы на прускую вайну, пражыў там зіму. Перад соймам вялікі князь «наданем маетностий и годностю ублагал» адных і абяцаннямі вярнуць княству Падолле схіліў на свой бок другіх феадалаў і, ў прыватнасці, троцкага ваяводу Івана Манівіда і канцлера Міхайлу Монтыгірдавіча. Менавіта адсутнасць адзінства сярод феадалаў і скарыстаў Казімір. На сойме ён рэзка дакараў іх за «неспа-

кой», а яны не адважваліся выступіць супраць вялікага князя і звалілі ўсю віну на Гаштольда і яго паплечнікаў. Маўляў, не ведаюць яны нічога пра пасольства да караля і ніхто не даваў Гаштольду ніякіх паўнамоцтваў. Нават патрабавалі следства і пакарання вінаватых. Ад Гаштольда чакалі тлумачэнняў. Казімір, памятаючы, калі сам ледзь не загінуў ад шаблі нейкага разгарачанага Гаштольдавага прыхільніка, распусціў сойм. Пішучы пра гэта, Ян Длугаш са скрухай наракаў, што кароль дзейнічаў «не нараканнем слушным і пагрозай, але лагоднымі намовамі, шчодрасцю і ласкавасцю»[52]. А гэта, як высветлілася, больш дзейсная зброя, чым сіла. Відаць, у гэты час і забраў у свайго былога апекуна яго родавае выменне Геранёны. Так бы мовіць, прыпугнуў таго на будучыню. І тым не менш Казімір пацвердзіў свой прывілей ад 1447 года пра захаванне Вялікага княства ў межах, якія пакінуў пасля сябе Вітаўт, і вяртанне Падолля. А тым самым зноў уступіў у супярэчнасць са сваімі ж клятвамі палякам.

Што ж датычыцца адносін з Масквою, дык Казімір не праявіў тут рашучасці. Уступаць у канфлікт з Масковіяй, калі ў той жа час ён вёў вайну з Прусіяй, вялікі князь не пажадаў. Польскія інтарэсы аказаліся для яго важнейшыя, чым літвінскія. Гэта адмова Казіміра ад актыўнай палітыкі на Усходзе спрыяла ўзмацненню Масквы. Ніхто не перашкаджаў Васілю далучаць да Масквы новыя землі. У 1456 годзе ён ліквідаваў Серпухава-Бароўскае княства, пасадзіў у Разані свайго намесніка, а пазней далучыў да Масквы Растоўскае княства. На вачах суадносіны сіл паміж Вільняй і Масквой мяняліся. Праўда, у Літве надарылася магчымасць узяць рэванш у Масковіі, але і тут літвінаў напаткала няўдача.

У 1458 годзе Ноўгарад шукаў палітычных сувязей з Вялікім княствам. Наўгародскі пасаднік Іван Лукініч Шчака прасіў у Казіміра «князя на пригороде». Гэтым князем быў Юрый Мсціслаўскі, разам з ім у Ноўгарад прыехаў літвінскі пасол Андрэй Ісакавіч. Дамоўленасці пра саюз так і не ўдалося заключыць. Юрый Сымонавіч і Андрэй Ісакавіч без вынікаў вярнуліся ў Вільню.

Таксама беспаспяхова закончылася спроба збліжэння з Псковам. Туды пасля пскоўскага чалабіцця прыехаў князь Аляксандр Чартарыйскі, вядомы нам сваім удзелам у забойстве Жыгімонта Кейстутавіча. Аднак Чартарыйскі адмовіўся даваць клятву на вернасць, якую патрабаваў Васіль II. На вечы Чартарыйскі палымяна ўсклікнуў: «Не слуга я вялікаму князю, і не будзе цалавання ваша на мне і маё на вас; калі не пачнуць пскавічы сокалам вароны біць, вось тады і мяне, Чартарыйскага, успомніце»[53]. Ён вярнуўся ў Вялікае княства, а ў Пскове сеў маскоўскі стаўленік.

Так неспрыяльна для Вялікага княства складваліся падзеі на Усходзе. Казімір не праявіў да іх асаблівай увагі, і абрадаваны, што хоць неяк заспакоіў незадаволеных ім феадалаў, адправіўся ў Польшчу. Куды больш яго хвалявала барацьба за венгерскую і чэшскую кароны, якія засталіся свабоднымі пасля смерці іх уласніка караля Уладзіслава. Казімір выслаў пасольствы ў Венгрыю і Чэхію з напамінам пра свае правы на гэтыя кароны. Ні там і ні там не сталі слухаць яго паслоў. Важкім аргументам на сваю карысць была б перамога над Ордэнам. Але вайна зацягвалася, і пра перамогу палякі ўжо не думалі, хацелі міру. І сам Казімір схіляўся да міру, аднак з-за слабавольнасці паддаўся тым, хто раіў яму працягваць весці вайну.

На Петркоўскім сойме ў 1459 годзе кароль зноў выслухаў дакоры палякаў за прыхільнасць да Вялікага княства. І ад каго? — ад Яна Рутвянскага. Абвінавачваў Рутвянскі Казіміра ў тым, што ён «коні, золата, срэбра і ўсялякія клейноты» перадае літвінам, «якія нічым ані табе, ані бацьку твайму не саслужылі». Дасталося Казіміру і за Луцк. Кароль заўважыў, што не ён забраў Валынь, а літвіны. Аднак Рутвянскі слушна адзначыў: «Ніхто іншы, як ён (Казімір. — *В.Ч.*) быў вялікім князем літоўскім і ад ягонай волі і слова залежала вяртанне Польшчы Луцкай зямлі ды іншых паветаў»[54]. Усе прасілі Казіміра «каб палякаў роўна, як літвінаў мілаваў і да ўсіх просячых справядліва адносіўся»[55]. Займаўся абаронай краю. На наступным сойме зноў скардзіліся прэлаты і паны, што за яго віны падае ў дзяржаве ўлада. Кароль, як звычайна, зноў абяцаў старацца ўсцерагчы край ад заняпаду. А значыць, трэба было пераможна закончыць вайну з Ордэнам. Казімір не праявіў ні мужнасці ні ваеннага таленту. Чарговы паход у 1461 годзе на Прусію таксама закончыўся бясслаўна. Польскае войска прастаяла палову месяца ў абозе пад Хойніцамі, пакуль ваяры не пачалі абурацца на караля, «што іх вывеў не на вайну, а на бязчынае гібенне, не для справы рыцарскай, а для пасмешышча, і што ён сам больш, чым непрыяцель, жадаў ім паражэння доўгім паходам і накладам»[56]. Нават халопы і тыя бегалі ўслед за каралём і з'едліва крычалі: «Злая рада!» Восенню кароль адступіў у Польшчу. І сам ён са скрухай прызнаў, што за яго панаванне павялічыліся «ўсялякія супярэчнасці, здарэнні і небяспекі».

Былі незадаволены Казімірам і літвінскія вяльможы. Хаця і памёр іх галоўны паступец Ян Гаштольд, ды ад сваіх задум яны не адмовіліся. Зноў пагражалі зброяй забраць ад Польшчы Падолле. І крымскі хан Хаджы-Гірэй паведамляў, што літвінскія паслы схіляюць яго да паходу на Камянец. Казімір склікае ў пачатку 1461 года ў Вільні сойм.



Аблога Казімірам Мальбарга. *XV ст.*

Думаў уціхамірыць ваяўнічы запал сваіх падданых, але атрымалася наадварот. Літвінскія феадалы прыступілі да Казіміра: «каб або асабіста сядзеў у Літве, або Сымона Алелькавіча князя кіеўскага паставіў на Літве вялікім князем»[57]. Казімір ужо добра навучаны, што галоўнае — не распальваць страсці, з усім пагаджацца, улагодзіць сваёй згодаю гарачыя галовы, але пасля не спяшыць з выкананнем абяцанага, а то і зусім не выконваць. Абы з рук збыць, а там дасць Бог, што-небудзь і прыдумае. Так ён зрабіў і цяпер: суцішыў панства, заявіўшы, што не перастане выкарыстоўваць дзейсныя сродкі для ўладкавання ўнутраных парадкаў, а што датычыцца свайго намесніка ў Літве, то прасіў адкласці гэтую справу «вялікай вагі» да зручнага часу. А калі польскія паны запатрабавалі ад княства дапамогі ў вайне з Прусіяй, ён сумна адзначыў: «Літва цяпер не прышле мне ні граша»[58]. На ўсе яго просьбы да панства ўсё ж падтрымаць Польшчу, тыя спасылаліся на вечны мір, заключаны з Ордэнам.

Так і не дачакаўшыся ад Казіміра выканання сваіх абяцанняў, літвіны паслалі з княства дэлегатаў на Петркоўскі сойм, які праходзіў у маі 1463 года. Ад Казіміра патрабавалі вырачыся польскай кароны, вярнуць княству Падолле. Калі ж ён ад-

маўляецца зрабіць гэта, — вялікім князем абяруць Сымона Алелькавіча і адваюють зброяй забраныя палякамі землі. Тое самае дэлегаты паўтарылі 16 лістапада на сойме ў Парчаве. І абураныя Казімірам, тут жа далі клятву, што вялікім князем прызнаюць Алелькавіча. Казімір паехаў у Вільню ўлагоджваць панства Вялікага княства. Ён абласкаў падарункамі феадалаў-католікаў і памірыўся з імі. Праваслаўныя феадалы пазбаві-ліся сваіх саюзнікаў з каталіцкага лагеру. Каб аслабіць праваслаўных феадалаў і ўвогуле праваслаўную царкву, якія былі галоўнымі ворагамі аб'яднання з каталіцкай Польшчаю, Казімір пад ціскам палякаў вяртаецца да ідэі царкоўнай уніі. Але нагадаем, што і Вітаўт і Свідрыгайла ў свой час разглядвалі царкоўную унію, як адзінае выйсце з таго рэлігійнага становішча ў Вялікім княстве, калі дзве канфесіі не спрыялі кансалідацыі народа, умацаванню дзяржавы, а наадварот, сеялі паміж каталікамі і праваслаўнымі звадкі, а па-другое, служылі правадні-камі прапольскай і прамаскоўскай палітыкі. Ужо ў 1456 годзе па загаду Казіміра каталіцкія святары пачалі прапаведаваць ідэю уніі на Літве. У 1458 годзе літвінскі мітрапаліт Рыгор пры-няў унію. Але сярод простага праваслаўнага люду, далёкага ад палітычных тонкасцей тагачаснага жыцця, унія цэркваў не сустрэла падтрымкі. А цераз дзесяць гадоў Казімір з расчара-ваннем пісаў папу, што унія ў Вялікім княстве не мае поспеху, затое «схізма» яшчэ болей умацавалася.

Так што разлікі палякаў праз царкоўную унію падарваць пазіцыі праваслаўнага панства ў Вялікім княстве не спраўдзі-ліся. Па-ранейшаму іх палітычны ўплыў вызначаў палітыку дзяржавы. Хоць і ўдалося Казіміру замірыцца з каталіцкімі феадаламі, але ж тыя ўсё ж азіраліся на праваслаўных, пры-слухоўваліся да іх голасу. І як ні ўгаворваў Казімір падтры-маць Польшчу ў вайне з Прусіяй, і тыя ж католікі, і тыя ж праваслаўныя феадалы адмовіліся, не паквапіліся атрымаць пасля перамогі над Ордэнам памежныя з Жамойцю землі.

Польшча перажывала нялёгкі час у сваёй гісторыі. Вайна зацягвалася, а ў каралеўскай скарбніцы не было грошай для платы наёмным войскам. Правадыры наймітаў адмаўляліся слухацца караля і рабавалі польскія сёлы. Можна было скары-стаць зручны момант. Але не было ў Вялікім княстве чалавека, які б узначаліў барацьбу з каралём. Кіеўскі князь Сымон Алель-кавіч, якога вылучылі на вялікае княжанне, не праяўляў дзей-насці, займаўся болей справамі свайго княства. Казімір здолеў папоўніць скарбніцу новымі падаткамі на царкву і з арэнды каралеўскіх земляў. За грошы кароль падкупіў ордэнскіх най-мітаў, якія таксама не атрымлівалі плату. Падкуплены ім пра-вадыр наёмнага войска чэх Ульрык Чырвонка перадаў паля-

кам ордэнскую сталіцу Мальбарг і дапамог заваяваць іншыя землі. У 1466 годзе пры пасрэдніцтве папы ў горадзе Торуне Польшча і Ордэн заключылі мір. Да Польшчы адыходзілі Памор'е, заходняя Прусія з Мальбаргам. Ордэн прызнаваў сябе польскім васалам.

Перамога дазволіла Польшчы выйсці да Балтыйскага мора. Ды і Казімір умацаваў сваю ўладу ў каралеўстве. Красамоўны факт: калі пасля смерці кракаўскага біскупа папа хацеў прызначыць на яго месца свайго стаўленіка, Казімір насуперак папскаму жаданню і капітулу паставіў на кракаўскае біскупства свайго паплечніка. «Я гатоў згубіць каралеўства, чым мець біскупа не па сваім жаданні»[59], — заявіў кароль.

Казімір ужо не той нявопытны ў палітыцы юнак, не той бязвольны ўладар, якім памыкалі то адны, то другія. Ён пасталеў, набраўся розуму і досціпу. З'явілася ў караля ўпартасць, якую можна прыняць і за цвёрдасць яго характару. Хаця Казімір часта паўтараў, што ён вельмі цярплівы, але цяпер усё часцей карыстаецца сілай сваёй улады. «Sic volo, sic iubeio» (так хачу, так кажу), — гэтыя словы сталі любімым выслоўем Казіміра[60]. Напрыклад, варта было ўзнікнуць пагрозе яго правам на чэшскае каралеўства, як Казімір рашуча заявіў, што хоча расправіцца з тым, хто будзе прэтэндаваць на чэшскую карону. Калі ж папа пачаў дакараць яго за зносіны з ерэтычнымі чэхамі, то ён рэзка адказаў: «Падданым не чыню крыўд, а калі іншай веры, чым папеж, тады яму няма нічога да гэтага, самаму Богу аддам адказ»[61]. А сілу паважаюць. І цяпер ужо не раздаваліся галасы з патрабаваннем замены Казіміра на велікакняжацкім пасадзе. І Польшча пасля доўгай вайны з Ордэнам не настойвала на сваіх прэтэнзіях да Вялікага княства. Нягласна два супрацьстаячыя бакі пайшлі на часовы кампраміс.

КАМПРАМІСЫ

У 1468 годзе Казімір правёў у Вільні зіму і пачатак вясны. Тут ён вырашаў розныя дробныя дзяржаўныя справы, прымаў пасольствы князёў, ездзіў на ловы ў навакольныя пушчы. Тады ж Казімір выдаў збор законаў, які ў гісторыі атрымаў назву «Судзебнік Казіміра».

Як лічыць большасць даследчыкаў, Судзебнік прызначаўся для земляў Трокскага і Віленскага ваяводстваў[62]. (Полацкая, Віцебская, Смаленская землі, Кіеўскае, Мсціслаўскае, Слуцкае, Пінскае княствы жылі паводле сваіх мясцовых законаў, пацверджаных велікакняжацкімі прывілеямі.) Гэта быў своеасаблівы кампраміс Казіміра з панамі-рады, бо вялікі князь пе-

радаваў радзе судова-адміністрацыйную ўладу ў Троцкім і Віленскім ваяводствах падчас сваёй адсутнасці ў Вільні. Ды і дыпламатычнымі зносінамі ў яго адсутнасць займаліся паны-рада. Так, у 1474 годзе яны паведамлялі Ордэну, што з-за мору не адбудзецца з'езд упаўнаважаных для заключэння вечнага міру паміж княствам і Прусіяй. Паны-рада загадвалі і вайсковымі сіламі дзяржавы нават раздавалі выменні і землі. Адначасова Казімір выдаў прывілей, паводле якога забаранялася будаваць новыя і рамантаваць старыя праваслаўныя цэрквы. Гэты акт Казімір здзейсніў пад ціскам каталіцкіх святароў.

Аднак больш за ўсё расчараваў Казімір літвінаў сваёй нерашучасцю ў наўгародскіх падзеях.

На ўсходзе мацнела маскоўская дзяржава, дзе ўладарыў новы князь Іван III. Яшчэ не так даўно ён пачціва называў свайго стрыечнага брата Казіміра «вельмі высокі, высакародны, слаўны, вялікі»[63], а цяпер забыўся на пачцівасць. Прагным позіркам ён паглядваў на Ноўгарад і Пскоў, марыў зрабіць іх «отчиной» сваёй. Тыя гады, калі Ноўгарадам кіравалі маскоўскія стаўленікі, былі не мядовымі. Усё больш і больш наўгародцаў хацелі «за караля польскага і вялікага князя літоўскага Казіміра»[64]. У Ноўгарадзе складвалася антымаскоўская змова на чале з баярамі Барэцкімі. Наўгародскія паслы прасілі ў Казіміра прыслаць намесніка — Міхайлу Алелькавіча. Урад Вялікага княства разглядаў антымаскоўскі выступ Ноўгарада як частку буйнай вайсковай акцыі супраць Масквы. І вось ужо літвінскі пасол Кірэй Крывы ў Сарай-Берке дамаўляецца з золатаардынскім ханам Ахматам пра сумесныя дзеянні супраць Масквы. Занепакоены ардынска-літвінскім збліжэннем, новы крымскі хан Менглі-Гірэй шукае кантактаў з Іванам III. Сам Казімір наведаў Літву, пабываў у Смаленску, Віцебску і Полацку. У Полацку Казімір 16 студзеня 1470 года прымаў пскоўскіх паслоў. Вырашаліся пытанні «о земли и воде, о пороубежных местах и о обидных делех»[65]. Казімір ухіліўся прымаць нейкія рашэнні. Дамовіліся, што пазней яго ўпаўнаважаныя паслы сустрэнуцца з пскоўскімі прадстаўнікамі для ўладжвання памежных спрэчак. 14 верасня паслы Радзівіл Осцікавіч, Мікалай Неміровіч і Багдан Адрушкевіч сустракаліся ў Берзнічах з пскоўскімі пасламі. Але перамовы не прывялі да нейкіх істотных вынікаў. Відаць, урад Вялікага княства вывучаў магчымасць уступлення Пскова ў антымаскоўскую кааліцыю.

Развязка маскоўска-наўгародскіх адносін наступіла ў тым жа 1470 годзе. Прымаючы наўгародскае пасольства, Іван III сказаў пра Ноўгарад: «отчина моя». У Ноўгарадзе ўспрынялі гэтую заяву як замах на тую прывідную свабоду, якую дакляравала Яжабліцкая ўмова. На вечы наўгародцы вырашылі: «Не

хочам за вялікага князя маскоўскага ні звацца вотчынай яго, але хочам за караля польскага і вялікага князя літоўскага Казіміра»[66]. Наўгародскае пасольства заключыла дамову з Казімірам, паводле якой Ноўгарад прымаў да сябе велікакняжацкага намесніка Міхайлу Алелькавіча і прызнаваў духоўную ўладу літвінскага мітрапаліта Рыгора Баўгарэвіча. Міхайла Алелькавіч прыехаў у Ноўгарад 8 лістапада. Каб умацаваць саюз Ноўгарада і Вялікага княства, меркаваўся шлюб Міхайла Алелькавіча з Марфай Барэцкай. Няма чаго казаць, што далучэнне Ноўгарада да Вялікага княства рэзка мяняла б становішча ва Усходняй Еўропе. Гэтага баяліся і ў Ардзе, і ў Крыме, і ў Маскве. Баяліся і ў Польшчы. Важна было адцягнуць Казіміра ад спраў Вялікага княства, угаварыць яго не падтрымліваць Ноўгарад і не ўступаць у канфлікт з Масквою. І такая нагода здарылася.

Пасля смерці бяздзетнага караля Угоршчыны і Чэхіі, Уладзіслава, Казімір як муж сястры нябожчыка прад'явіў свае правы на абедзве каралеўскія кароны. Аднак угорцы выбралі сваім каралём Мацвея Корвіна Гуніяда, а чэшскія гусіты — Юрыя Падэбрада. Пад уплывам папы Паўла II чэшскія католікі адмовіліся павінавацца Юрыю. Папа прасіў Казіміра прыняць чэшскае каралеўства: «Каб паўстаў са зброяй і каралеўства названае для хвалы Боскай і ўзвышэння рэлігіі каталіцкай, а пасля з прычыны законнага права, як агульнасці роду і мовы, з рук неправага правіцеля і абрыдлага іарха забраў, за што памножыць сабе пабожную заслугу перад Богам і імя сваё праславіць на вякі»[67]. Калі ж ён не можа сам, дык няхай пашле на гэтае каралеўства каго-небудзь са сваіх сыноў. Казімір, які не адважыўся пасля прускай вайны зноў пачынаць вайну, адмовіўся ад чэшскай кароны. Тады яе прапанавалі Мацвею Корвіну. Юрый у такім становішчы абвясціў сваім спадкаемцам Уладзіслава. У 1471 годзе ён раптам памёр, і Уладзіслаў стаў чэшскім каралём, а Уладзіслава чэхі выбралі сваім каралём і 21 жніўня каранавалі. Падзею гэтую радасна віталі і ў Польшчы, і ў Літве. Толькі і казалі, каб Польшча, Літва, Русь і Чэхія былі адзіным цэлым. Казімір атрымаў важнейшую дыпламатычную перамогу. Але вось з венгерскай каронай справа была горш. Угорцы, не задаволеныя Корвіным, запрасілі на каралеўскі пасад малодшага Казіміравага сына Казіміра. Польскае войска, якое суправаджала каралевіча ў Венгрыю, было разбіта. Адначасова Корвін заключыў саюз з Ордэнам і пачаў вайну з Польшчаю. Скарысталі момант і польскія каталіцкія святары, якія адмовіліся падначальвацца каралю.

Казіміру трэба было выбіраць: ці весці дынастычную вайну за чэшскую і ўгорскую кароны, ці ехаць у Вялікае княства і ўзначаліць бітву за Ноўгарад. Ад узвядзення ў Чэхіі і Венгрыі

славянскай дынастыі выйгравала не толькі славянства, якое сутыкнулася з нямецкай і турэцкай экспансіяй, але і перш за ўсё Польшча. Заваёва ж Масквою Ноўгарада паслабляла Вялікае княства. А гэта было, зноў-такі, выгадна Польшчы. Так што дынастычныя інтарэсы Казіміра супадалі з польскімі палітычнымі інтарэсамі. А гэта і вызначала пазіцыю Казіміра.

Прадбачачы, што адмова падтрымаць Ноўгарад выклікае незадаволенасць многіх феадалаў і што можа паўстаць пытанне пра абвяшчэнне вялікім князем Міхайлы Алелькавіча, Казімір пасля смерці Сымона Алелькавіча скасоўвае Кіеўскае княства. Сам па сабе гэта вельмі красамоўны факт у тым сэнсе, што паказвае сталенне палітычнага розуму Казіміра. Цяпер ён не ахвяра абставін, а прадбачыць іх, разлічвае свае хады далёка наперад і сам уплывае на падзеі. Толькі ёсць моманты, якія можна і не дагледзець. Кіяне адмовіліся прымаць у горад пасланага Казімірам сына Яна Гаштольда, Мартына. Кіеўляне гатовы былі «лепш загінуць або выбраць сабе іншага ўладара, чым падначаліцца літвіну і схіліць перад ім галаву». Прасілі яны караля даць князя грэчаскага абраду, а ўрэшце лацінскага, толькі кагосці са сваіх сыноў. Аднак Казімір ужо не той слабавольны ўладар. Заўважыў гэтую змену Ян Длугаш, адзначыўшы: «Але нарэшце кіеўляне, баючыся сілы караля, паддаліся зверхніству Мартына Гаштольда»[68]. А літвіны наракалі, што страцілі магчымасць, якая выпала ім у час вайны палякаў з Ордэнам, каб вярнуць Падолле і адстаяць правы на Валынь. Каб заспакоіць кіянаў, кароль выдае Кіеўскай зямлі новыя правы і вольнасці. Міхайла Алелькавіч, даведаўшыся пра братаву смерць, пакінуў Ноўгарад, ды спазніўся — Кіеў ужо знаходзіўся ў руках Гаштольда. Заставалася яму ехаць у Слуцк.

А ў маі месяцы маскоўскае войска выступіла на Ноўгарад. Іван III надаў свайму паходу ідэалагічную афарбоўку, заявіўшы, што паход выкліканы пераходам наўгародцаў у «латинство». Наўгародцы ўзяліся за зброю, каб адстаяць сваю волю. Але, нягледзячы на колькасную перавагу, наўгародскае войска саступала маскоўскаму ў вайсковай вывучцы і ўзбраенні. На рацэ Шэлоні маскавіты разбілі наўгародцаў. Ноўгарад здаўся перад Іванам III. Маскоўскі князь накінуў Ноўгараду новую ганебную дамову. Паводле яе, Ноўгарад адмаўляўся запрашаць да сябе літвінскіх пасаднікаў і павінен быў «неотступно» павінавацца маскоўскаму князю. Паражэнне Ноўгарада стала адначасова і паражэннем Вялікага княства. За спінай рады Вялікага княства Казімір у чэрвені прымае ў Кракаве маскоўскае пасольства. Казімір аддаваў Ноўгарад на расправу Маскве. І Альгерд, і Вітаўт заўжды імкнуліся супыняць Маскву, падтрымлівалі яе праціўнікаў і тым самым не дазвалялі ёй умацоўвацца, а Казімір свя-

дома адмовіўся ад гэтай палітыкі. Няўдачай закончылася і пасольства Кірэя Крывога да Ахмата. Хан пратрымаў пасла ў сябе цэлы год і так не пайшоў на вайсковы саюз з Вялікім княствам. Затое маскоўскі саюзнік — крымскі хан паслаў свае загоны спусташаць паўднёвыя землі княства. Казімір не толькі не прыслаў кіеўскаму намесніку Гаштольду дапамогі, а нават не папярэдзіў пра татарскі набег кашталянаў памежных замкаў. Такая нядбаласць сваімі дзяржаўнымі абавязкамі, зразумела выклікала нараканні і абурэнне. Падчас знаходжання Казіміра ў Вільні 31 сакавіка ноччу загарэўся ляцкі канец. Пажар праглынуў у сваім вогненным чэраве чатырыста дварoў польскіх выхадцаў. Сам Казімір, які тут спыніўся, ледзь не згарэў. Такія буйныя пажары ўспыхвалі невыпадкова. Відаць, Казімірава апазіцыя вырашыла фізічна расправіцца з вялікім князем.

ЗМОВА

Да пары да часу праціўнікі Казіміра змірыліся з яго знаходжаннем на велікакняжацкім пасадзе. Аднак Казімір сваёй здрадлівай бяздзейнасцю дазволіў Маскве канчаткова завалодаць Ноўгарадам. Трэба адзначыць, што ў Ноўгарадзе не адмовіліся ад думкі пра унію з Вялікім княствам. Так, у 1476 годзе Іван III, прыехаўшы ў гэты горад, пакараў жыватом чатырох відных прыхільнікаў гэтай ідэі. Калі ж у Ноўгарадзе пачаліся антымаскоўскія хваляванні, Іван III акружыў горад войскамі і навязаў наўгародцам сваю волю. А «воля» гэта горшая за няволю. Наўгародская рэспубліка была пазбаўлена аўтаноміі і далучалася як «отчина» да Масквы. Славуты звон, які колькі стагоддзяў клікаў наўгародцаў на веча, Іван III вывез у Маскву. А Казімір і на гэты раз не прыйшоў на дапамогу Ноўгараду. І адразу ж пасля гэтых падзей літвінскія феадалы ў сакавіку 1478 года, калі Казімір знаходзіўся ў Бярэсці, прасілі ў яго адпусціць на велікакняжацкі пасад сыноў Казіміра або Альбрэхта. Сам Альбрэхт са слязьмі маліў бацьку даць згоду. Казімір адмовіўся і заявіў: «Пакуль жыву, ніякай мерай праўленне Літвой нікому іншаму не даверу»[69]. Пэўна, баяўся нязгоды з назначаным ім вялікім князем. Памятаў прыклад свайго бацькі Ягайлы і Свідрыгайлы, калі браты пайшлі адзін на аднаго са зброяй. Адмовіўся ён і пачынаць вайну з Масковіяй, заявіўшы літвінскім вяльможам, каб яны «добра ведалі, што калі з Масквой захочуць памерацца сіламі, дык хутчэй будуць пераможанымі, чым пераможцамі»[70]. Вось тады сярод праваслаўных князёў і нарадзілася змова супраць Казіміра. Узначалілі яе Міхайла Алелькавіч, Іван Гальшанскі, жанаты з Ганнаю Чартарыйскаю. Трэці ўдзельнік змовы Хведар

Бельскі (род якога паходзіў ад Уладзіміра Альгердавіча) быў у блізкім сваяцтве з Гальшанскімі праз шлюб з Васілісай Гальшанскай. Змоўшчыкі марылі ўзвесці на велікакняжацкі пасад Міхайлу Алелькавіча. Нагадаем, што Алелькавічы паходзілі ад Уладзіміра Альгердавіча і мелі права на вялікі пасад.

Для ажыццяўлення сваёй задумы князі збіраліся выкарыстаць вяселле Аляксандра Чартарыйскага з дачкою Хведара Бельскага. На гэтае вяселле ў Кобрын быў запрошаны і Казімір, дзе яго і думалі забіць. Праўдападобна, што Алелькавіч шукаў паразумення з Іванам III, бо ёсць звесткі пра яго перамовы з маскоўскім князем, якія адбыліся нібыта з прычыны пасрэдніцтва ў справе шлюбу Іванавага сына з дачкою малдаўскага гаспадара Стафана.

Змова Алелькавіча супала з падзеямі, якія істотна паўплывалі на ход гісторыі ва Усходняй Еўропе. У Ноўгарадзе пры падтрымцы Вялікага княства рыхтавалася паўстанне супраць маскоўскай тыраніі. Каб развязаць сабе рукі ў вайне з Масковіяй, урад княства зноў патрабаваў ад Казіміра саступіць вялікае княжанне аднаму са сваіх сыноў. Тое самае паўтарылася і ўзімку 1480 года. І на гэты раз Казімір заявіў, што да сваёй смерці нікому не перадасць велікакняжацкі вянец. Але настойлівасць паноў-рады і феадалаў падтрымаць Ноўгарад вымагала ад Казіміра хоць нейкіх дзеянняў. Быў заключаны антымаскоўскі саюз з Вялікай Ардой. Вяліся перамовы з Лівоніяй і Швецыяй. Між тым супраць Івана III падняліся яго браты Андрэй і Барыс. Яны ўцяклі з Масковіі і звярнуліся па дапамогу да Казіміра.

І тут высветлілася, што вялікі князь верны сваёй палітыцы — пазбягаць вайны з Масковіяй. Ён не падтрымаў уцекачоў. Аб'ектыўна Казімір дзейнічаў на карысць польскіх інтарэсаў. Узмацненне Масквы вяло да таго, што Вялікае княства вымушана было прасіць уніі з Польшчаю. Зразумела, цяпер, калі суадносіны сіл Вільні і Масквы былі яшчэ на карысць першай, Польшча стрымлівала вайну з Масковіяй. Мяцежныя князі Андрэй і Барыс Васільевічы вярнуліся ў Маскву і прымірыліся з братам. Неўзабаве ў паход на Масковію выступіў з войскам хан Ахмат. Паводле дамоўленасці з Казімірам, яму на дапамогу павінна было прыйсці войска Вялікага княства. Ахмат спыніўся каля Варатынска, чакаючы Казіміра. Але дапамога так і не прыйшла. У гэты час Казімір даведаўся пра змову Алелькавіча. Верагодна, выкрыў змоўшчыкаў кіеўскі намеснік Іван Хадкевіч, бо ўжо пазней — у 1567 годзе — князь Іван Бельскі па даручэнні Івана Жахлівага пісаў Рыгору Хадкевічу: «Продкі твае здрадзілі нашаму сваяку Міхайле Алелькавічу ў Кіеве і не захацелі павінавацца нам»[71]. Можна дапусціць, што Алелькавіч схіляў на свой бок Івана Хадкевіча, а той выдаў яго



Вялікі князь сярод набліжоных.
Копія з старажытнага малюнка. 1838 г.

Казіміру. Хоць не выключана, што змоўшчыкаў выдаў брат Хведара Бельскага Сымон. Памяць пра яго здраду доўга жыла на Літве. Гэтак яшчэ ў 1503 годзе жонка вялікага князя Аляксандра Казіміравіча Алена пісала бацьку Івану III, што «Семен Бельский Июда... будучи здесе в Литве, братью свою князя Михайла и князя Ивана переел, а князя Феодора на чюжу сторону прогнал»[72]. Таму на Літве Сымона Бельскага параўноўвалі з Каінам, які ходзіць па шыю ў крыві. Паводле іншых звестак выкрыў змову Казіміравы слуга Ян Штэндэл. Ён, чакаючы прыезду Казіміра ў Кобрын, аглядаў замак і знайшоў па-

таемны склеп, дзе захоўвалася зброя. Калі Казімір прыбыў, то Штэндэл паведаміў яму пра падазроную знаходку. Казімір, адчуўшы небяспеку, не пайшоў на вясельнае баляванне, нібыта з прычыны недамагання. Тут жа быў учынены пошук. Пад катаваннямі слугі Бельскага выкрылі змову. Сам Бельскі, ноччу, прама з ложку, уцёк са свайго замка і накіраваўся ў Маскву. Міхайлу Алелькавіча і Івана Гальшанскага схапілі і кінулі ў вязніцу. У гэты ж час на Падолле напаў з татарамі крымскі хан Менглі-Гірэй. Таму Казімір, не зважаючы на патрабаванні паноў-рады, не павёў войска да Варатынска. Ахмат так і не дачакаўся войск Вялікага княства. Доўгі час ён прастаяў на рацэ Угры, на другім беразе якой знаходзілася маскоўскае войска. І Ахмат, і Іван баяліся пачынаць бітву. Нарэшце маскоўскі князь прыслаў хану даніну за апошнія гады, і Ахмат адступіў. Па дарозе ў Арду татары, помсцячы Казіміру, разрабавалі паўднёва-ўсходнія землі Вялікага княства. Казімір запрасіў міру, але Іван III не прыняў любоў вялікага князя літоўскага і рускага. Паспрабаваў Казімір заключыць мір і з Крымскім ханствам. Перамога нагайцаў над Ахматам і яго смерць пазбаўляла Крым небяспечнага ворага і цяпер саюз з Масквою аказваўся нібыта і непатрэбным. У канцы студзеня 1481 года доўгачаканы мір з Крымам быў падпісаны. Але пратрымаўся ён нядоўга. Іван Васільевіч настойваў, каб Менглі-Гірэй «каралю дамову склаў»[73]. Неўзабаве крымскі хан пераканаўся, што маскоўскі ўладар куды больш выгадны саюзнік, бо ў Крым даходзілі трывожныя весткі, што Залатая Арда сабралася сіламі і вяла перамовы з Казімірам.

Між тым у вялікай тайне амаль год доўжылася судовая справа Алелькавіча і Гальшанскага. Суддзямі былі віленскі ваявода Алехна Судэмонтавіч, дачка якога Софія была жонкай Аляксандра Гальшанскага, а таксама троцкі ваявода Мартын Гаштольд, жанаты на роднай сястры Івана Гальшанскага. Аднак, нягледзячы на сваяцтва, змоўшчыкам вынеслі смяротны прысуд. 30 жніўня 1481 года іх пакаралі.

Што гэта: палітычная блізарукасць Казіміра ці свядомая дзейнасць на падрыў адзінства Вялікага княства? Вынікі гэтай Казіміравай акцыі зноў прынеслі шкоду дзяржаве. Напалоханыя такой крутой расправай над прадстаўнікамі апазіцыі праваслаўныя князі Іван і Зміцер Варатынскія, Іван Перамышльскі, Андрэй і Васіль Бельскія, Іван Глінскі ўцяклі ў Маскву. Гэта абвастрыла і без таго напружаныя адносіны паміж Вялікім княствам і Масковіяй. Становішча вымагала ад уладу княства рашучых дзеяў. Не выпадкова, што ў 1480—1483 гадах Казімір жыве на Літве: то ў Троках, то ў Вільні, то ў Наваградку. У канцы 1481 года ён шле ў Маскву Багдана Саковіча з патрабаваннем перадачы Ноў-

гарада і Вялікіх Лук. Іван III не толькі адмовіўся, але адправіў у Крым да Менглі-Гірэя пасла з прапановаю: «...Каралю прысягу склаў бы і раць на яго пусціў»[74]. Іван абяцаў крымскаму хану за такую «ласкавую» паслугу, не адпускаць з Масквы ягонага брата Нур-Даўлета, які прэтэндаваў на ханства. 1 верасня 1482 года Менглі-Гірэй прывёў сваю раць пад Кіеў. Татары ўварваліся ў горад, разрабавалі Сафійскі сабор і вывелі кіян разам з намеснікам Іванам Хадкевічам у няволю.

Напад татараў застаў Казіміра знянацку. Крымскі хан слаў дагэтуль пасольства за пасольствам да Казіміра і ўпэўніваў яго: «...ад мяне і ад братоў маіх меншых, і ад сына майго ліха не будзе»[75]. Казімір верыў яму. Да гэтага часу паміж Вялікім княствам Літоўскім і Крымскім ханствам захоўваліся неблагія адносіны. Бацька Менглі-Гірэя, хан Хаджы-Гірэй у часы, калі ягоныя ворагі выгналі з Крыма, прыехаў да Вітаўта ў «гасцінае». Гасціў ён і пры Казіміры, пакуль у 1440 годзе крымскія мурзы і ўланы «ад усёй арды Перакопскай» не запрасілі яго на ханства. Вось за тое, што ў Літве «хлеб і соль еў» і з дапамогі Казіміра «пасад царскі дастаў» Хаджы-Гірэй да самай смерці ў 1446 годзе быў удзячным сябрам Літвы[76]. Ягоныя наступнікі Нур-Даўлет, а пасля Менглі-Гірэй упэўнівалі Казіміра ў сваім шчырым сяброўстве з ім. Менглі-Гірэй нават пацвердзіў бацькоўскае «наданне» Літве ўкраінска-рускіх земляў. Ды толькі не Менглі-Гірэй вызначаў палітыку Крымскага ханства, а турэцкі султан. А для Турцыі перашкодай у наступе на Паўднёвую Еўропу былі Польшча, Угорыя і Літва, дзе ўладарылі Ягайлавічы.

АПОШНІЯ ГАДЫ

Устрывожаны кіеўскім пагромам, урад Вялікага княства абвясціў Пагоню. У 1485 годзе з усёй Літвы збіраліся войска і натоўпы сялян — «на работу кіеўскую» — аднаўляць Кіеў. Вялікі маршалак Багдан Саковіч павёў пад Кіеў саракатысячнае войска і дваццаць тысяч сялян. Апроч таго, каля Смаленска Казімір пакінуў заставу ў 10 000 чалавек. Ды толькі Казімір — не Альгерд і не Вітаўт, якія не баяліся памерацца сіламі з ворагам. Далей Кіева войска не пайшло. Казімір зноў шукаў міру з Менглі-Гірэем, даруючы яму спусташэнне Кіева: «Было тому городу гореть и тым людем погинуть коли на них божий гнев пришел. А з Божье ласки у нас есть городов и волостей и людей досыть»[77]. Ну што тут тлумачыць. Так мог казаць толькі чалавек цынічны, ну а як гаспадар дзяржавы, дык і ўвогуле Казімір раскрыў сябе поўнасцю — рабуйце, паліце, не збяднее, што мне смерць маіх людзей, у мяне іх «досыть». А крымскі

хан заставаўся верным саюзнікам Масквы. Ён патрабаваў зямельных уступак і грошай. Тым часам Іван III, рыхтуючыся да заваёвы Цвярскога княства, з якім Вялікае княства трымала мір, перацягнуў на свой бок малдаўскага гаспадара Стафана і ўгорскага караля Мацвея Корвіна. У сваю чаргу Казімір павёў перамовы з наследнікамі хана Ахмата, Муртазой і Сеід-Махматам, і падбіў іх напасці на Крымскае ханства. У гэтую барацьбу ўцягваецца і Турэцкая порта, якая падтрымлівала Крым.

На ўсходзе Еўропы склаліся два лагеры. Венгрыя і Германія сталі саюзнікамі Масквы. Да пары да часу саюзнікамі Масквы былі таксама Крымскае ханства і Турцыя, якія заключылі перамір'е з Венгрыяй. Польшча і Вялікае княства Літоўскае апынуліся ў варожым акружэнні. Германія хацела захапіць польскія землі, Масковія і Крым марылі пра землі Вялікага княства. У гэтых абставінах Казімір баяўся раздражняць Масковію, хоць менавіта актыўная антымаскоўская палітыка вяла б да поспеху. Ён праігнараваў заваёву Масквою Цвярскога княства ў 1485 годзе. Не выкарыстаў Казімір спрыяльны момант і тады, калі Масква ў тым жа годзе ваявала з Казанскім ханствам, а Вялікая Арда — з Крымскім ханствам, а таксама і выступ наўгародцаў супраць маскоўскага намесніка Якава Захар'іна. Маскоўскі князь вырашыў раз і назаўсёды задушыць наўгародскую вольнасць і вывеў з Ноўгарада каля сямі тысяч сем'яў, якія рассяліў па сваім княстве. І пасля гэтага яму давялося яшчэ раз вывозіць з Ноўгарада болей за тысячу сем'яў. На месца выгнаннікаў Іван Васільевіч пасяліў маскоўскі люд. І замест дапамогі наўгародцам Казімір шукаў прыязні Івана III, каб «нам за один стояти против всякого нашого недруга, и ти бы и нине с нами стал за один против того неприятеля и всего хърестиянства, как то всякому господару хърестиянъскому годится то въчинити»[78]. Непрыяцелем для Казіміра была Турцыя, якая пагражала Валахіі і Польшчы, а вось «прыяцель» — маскоўскі гасудар, які зямлю за зямлёй адбіраў у Вялікага княства. І не дзіўна, што некалькі разоў хадзілі на дапамогу валахам літвінскія войскі, грамілі туркаў.

Нерашучасць Казіміра прывяла да таго, што Вялікае княства займела на ўсходзе вельмі небяспечнага ворага — цэнтралізаваную рускую дзяржаву. Паміж Масквою і Крымам быў распрацаваны план падзелу паміж сабою літвінскіх і ўкраінскіх земляў, а ў перспектыве і Польшчы.

Маскоўскі гаспадар не распачынаў вайны з Вялікім княствам Літоўскім, хоць на мяжы і здараліся дробныя сутычкі. Іван чакаў спрыяльнага часу. Менглі-Гірэй шчыра дзяліўся з Іванам III: «Каралю з падмана добрыя словы скажу, а ты сваіх тысячу людзей полем прышлі — я вазьму табе Кіеў, і ў Літве... Вільню і Кракаў дасць Бог возьмем»[79].



Пячаткі Казіміра

У 1490 годзе памёр угорскі кароль Мацвей Корвін. На венгерскі пасад паклікалі Уладзіслава Казіміравіча. Дзеля гэтага ён вымушаны быў ажаніцца з удавою па венгерскім каралі — Беатрычэ Неапалітанскай. Венгрыя выпала з варожай кааліцыі.

Становішча Вялікага княства ўскладнілася ў 1491 годзе. Здрадзіла Вялікая Арда, якая зблізілася з Крымам. Велікаардынскі атрад з пяці тысяч чалавек увосень 1487 года з'явіўся на Правабярэжжы Дняпра. Перамога над ім польскага войска

пад зверхнасцю Казіміравага сына Яна Альбрэхта асабліва не радавала. Асноўныя сілы Арды на чале з «Ахматавымі дзецьмі» Муртазам і Сеід-Ахмедам стаялі на рацэ Ворксле і ў любы момант маглі пайсці ці на Вялікае княства ці на Польшчу. Польская шляхта адмовілася даваць грошы на вайну. Безвынікова закончыліся спробы Казіміра вытрабаваць грошы ў васальнага Ордэна. Пасланае Казімірам у 1489 годзе польскае войска Яна Альбрэхта прагнала татар на левы бераг Дняпра. Але ў наступным годзе Муртаза і Сеід-Ахмед спустошылі Валынь. Казімір асабіста ўзначаліў войска Вялікага княства. 25 студзеня 1491 года каля Зацлава 9-тысячнае татарскае войска было разбіта ўкраінскімі і літвінскімі воямі. Гэтая перамога ўзмацніла Маскоўскае княства і Крымскае ханства. Тая сіла, якая стрымлівала Менглі-Гірэя ад нападаў на Вялікае княства, палягла на полі пад Зацлавам. Менглі-Гірэй спадзяваўся з дапамогаю Казіміра канчаткова знішчыць Вялікую Арду і таму павёў з каралём перамовы. Такая дваістая пазіцыя Крыма таксама стрымлівала Івана Васільевіча ад адкрытай вайны з Вялікім княствам. Ды і асцерагаўся ён рашучасці Казіміра, які мовіў яго паслам: «Манарх ваш любіць патрабавць, але сам не хоча задаволіць маіх патрабаванняў: гэта мяне вымушае браць з яго прыклад»[80].

Так у бурных палітычных баталіях і прайшлі апошнія гады жыцця Казіміра. У 1492 годзе, цяжка хворы, ён спытаўся ў свайго доктара: «Ці ёсць якая надзея на здароўе?». Доктар прама і адказаў: «Ужо не можаш быць жывым». І Казімір змірыўся са смерцю: «Трэба тады памірaць»[81]. Перад смерцю ён прасіў паноў-рады ўзяць Аляксандра на вялікае княжанне, а польскіх паноў — абвясціць сваім каралём Яна Альбрэхта. Здавалася, усё ж такі Казімір выканаў даўнюю мару літвінаў — даў ім асобнага ад Польшчы валадара, тым самым нібыта асабіста разрываў унію. Толькі, па-мойму, не кароль і вялікі князь памірaў у гарадзенскім замку, а... бацька, заклапочаны вельмі простымі рэчамі, як падзяліць сваю спадчыну паміж сынамі і нікога не пакрыўдзіць. Невыпадкова, што адкрыў ён сховіну, дзе было 100 000 дукатаў і запаветаваў падзяліць іх паміж дзецьмі.

Ну, а дзяржава дзядоў? З Божае ласкі яшчэ гарадоў і валасцей, і людзей было досыць. І тут сапраўды трэба быць удзячным Богу, ды... і Казіміру — сваю клятву ён стрымаў — княства заставалася ў сваіх старых межах. Так што з пачуццём выкананага абавязку заплюшчыў апошні раз вочы Казімір. А было гэта 7 чэрвеня 1492 года. Пакінуў ён пасля сябе памяць, як «справядлівы і добры» гаспадар[82].

«А НАЗЫВАЛІ ЯГО МІЛАСЦІВЫМ»





АЛЯКСАНДР
(1461—1506)
Гравюра са старажытнага партрэта. *XVI ст.*

АЛЯКСАНДР



н памяраў і ведаў пра гэта. Нябачная постаць смерці ўжо даўно цярпліва чакала свайго часу. Дарэмна стараліся слаўны ў кароне лекар Балінскі, які не адыходзіў ад хворага, і святары, што глухім голасам чыталі ў пакоі Святое пісьмо. Сілы пакідалі ягонае некалі моцнае, а зараз знясіленае ад цяжкай барацьбы з хваробай цела. Гады трывог, няўдач, страт, клопату і маетнасці кралі яго сілы.

Чатырнаццаць гадоў Аляксандр уладарыў у Вялікім княстве Літоўскім і Рускім, чатырнаццаць гадоў не шкадаваў сябе на службе Айчыне. Не хаваўся ад цяжкасцей, усё, што меў: грошы, здароўе, час, — усё аддаў Бацькаўшчыне. І болей чым зрабіў, зрабіць ужо не можа. Аднак хто зразумее яго, хто апраўдае? Калі яшчэ, як не пры ім — Аляксандры, княства страціла столькі земляў? Калі яшчэ татары штогод агнём і мячом спусташалі Літву? Калі яшчэ, як не пры ім, аслабела дзяржава?

І вось ляжыць пры смерці на радасць панам-рады, ды хіба толькі ім. Хіба не казалі, не раздаваўся на кракаўскіх падваротнях: «Божа, мы жадаем выратавання каралю Аляксандру. Забяры яго і дай нам лепшага заступніка?»[1]. А паспрабаваў ён, кароль, навесці парадак. Ну і што? Паказаў раз свой характар, прагнаў на Берасцейскім сойме паноў-рады з вачэй, а яснавяльможныя такі вэрхал усчалі, што дзе там нечысці на Янаву ноч. Кароль прадаўся Глінскаму — гэтаму здрадцу і душаемцу, які хоча знішчыць вяльможнае панства на Літве. Не даспадобы ім кароль, не даспадобы ім Глінскі. Сам біскуп віленскі Войцех Табар памкнуўся абаронцам іхнім быць, і на сойме ў Парчаве перад пасламі ад усёй шляхты польскай дакараў яго. Там, на сойме, Аляксандра і разбіў паралюш. Караля прывезлі на Літву. Ён яшчэ спрабаваў правесці ў Лідскім замку сойм Вялікага княства, сабраць войска супраць татараў, але на гэта моцы ўжо не хапіла. А было столькі надзей...

ПАДНЯСЕННЕ НА ВЕЛІКАКНЯЖАЦКІ ПАСАД

Аляксандр збіраўся суправаджаць цела свайго бацькі ў Кракаў, аднак прыступілі да каралевіча паны-рада з мальбамі «абых тут зостал у вотчине нашой у великом княжьстве Литовском и Русском, для некоторых пригод и нагабаней неприятельских на отчину нашу»[2]. Намёк іх зразумеў — жадалі яны выбраць яго вялікім князем. І — застаўся.

Аляксандру ішоў трыццаць першы год. Няшмат захавалася звестак пра яго жыццё да выбрання вялікім князем літоўскім і рускім. Бацькі Аляксандра хацелі даць сваім дзецям еўрапейскую адукацыю. Казімір Ягайлавіч любіў паўтараць: «Для маіх вушэй няма лепшай музыкі, як плач дзяцей маіх пад розгамі настаўнікаў»[3]. Так што кароль, каб навука лепш даходзіла да яго сыноў, дазваляў настаўнікам узяцца і за розгі. І як быў задаволены ён, калі ў прысутнасці іншаземных паслоў каралевічы размаўлялі па-лацінску. Пра гэта сведчыць венецыянскі пасол Кантарыні, які прыехаў у Люблін, «дзе знаходзіліся чатыры сыны Яго Вялікасці». «Старэйшаму з іх, здавалася, не болей чым 15 гадоў, яны жылі тут пад наглядам вельмі шаноўнага настаўніка... Адзін з іх прывітаў мяне ў такіх выразах, якія ясна даказвалі, якую павагу мелі яны да свайго настаўніка»[4]. Яшчэ раз Кантарыні сустрэўся з каралевічамі на прыёме ў Казіміра. «Яго Вялікасць сеў на падрыхтаванае для яго цудоўнае крэсла паміж двух юных сыноў сваіх, апранутых у чырвоны строй, і чароўных, як анёлы...»[5]. Кароль дазволіў паслу паціснуць рукі каралевічамі, і яны ўслед за бацькам прасілі Кантарыні перадаць іх паклон Венецыянскай Рэспубліцы.

Выхоўвалі каралевічаў, у тым ліку і Аляксандра, польскі гісторык Ян Длугаш ды вядомы ў Еўропе гуманіст Піліп Калімах, які прыехаў па запрашэнні каралевы Альжбэты з Венецыі. Вось як успамінаў Аляксандраў брат Жыгімонт пра выхаванне Длугаша: «Было нас колькі братоў, адданых навучанню Лонгіну, якога проста звалі Длугашам, зімой адзявалі нас у кажухі з бараніны, ежу спажывалі простую, віно зусім не дазвалялі ўжываць, спалі на цвёрдым ложку»[6]. Ніякай палёгкі, ніякай раскошы. Настаўнікі прывучалі дзяцей да нялёгкіх выпрабаванняў, прымушалі пераносіць голад і холад. Асаблівая ўвага надавалася вывучэнню лацінскай мовы і старажытнай лацінскай літаратуры. Длугаш — польскі патрыёт, спрабаваў прывіць Казіміравічам любоў да Польшчы, знаёміў з польскай гісторыяй. Але разам з тым, той жа Аляксандр добра ведаў і літвінскую мову, на якой размаўляў у сваім штодзённым жыцці і пісаў дзяржаўныя дакументы. Мову продкаў шанавалі пры двары Ягайлавічаў і не забывалі яе.



В.Эліяш. Калімах вучыць дзяцей Казіміра. *1865 г.*

Калімах выхоўваў каралевічаў у любові да філасофіі, літаратуры і мастацтва. Аднак Аляксандр так і не прыдбаў дару філосафа, і не вылучаўся красамоўствам і, як Казімір, болей маўчаў, чым гаварыў. Затое адрозніваўся ад бацькі густам, любіў акружаць сябе прыгожымі рэчамі, не сквапіўся на набыццё

мастацкіх каштоўнасцей і не шкадаваў немалыя грошы за кнігі; прыносілі задавальненне яму дарагая і модная адзежа, смачная ежа і пародзістыя коні. Быў ён аматарам музыкі. А любімы спявак Чурылка радаваў яго беларускімі песнямі. Не ахвотнік да шумных баляванняў Аляксандр мог выпіць у вузкім коле сваіх сяброў і набліжоных. З людзьмі вёў сябе проста, без пыхі і гонару. Каралева Альжбэта так ахарактарызавала свайго сына: «...такі ж таварыскі ды шчодры Аляксандр. На паляванні ці ў дарозе, ён не праміне ніводнага селяніна, каб не спыніць яго і не перамовіцца слоўцам; не агідна яму было напіцца з чаркі ўбогай ды асушыць яе да дна»[7]. Увогуле па натуры ён быў чалавекам добрым, называлі яго міласцівым[8].

Думаю, толькі з ласкі лёсу яго, а не дзейснага Жыгімонта, абралі вялікім князем. Літвіны спяшаліся скарыстаць зручны момант, абысці акт уніі з Польшчай: займець асобнага валадара — паставіць палякаў перад фактам.

З Гародні ва ўсе канцы Вялікага княства Аляксандр і паны-рада разаслалі вестуноў з паведамленнем пра Казіміраву смерць і з запрашэннем князям, баярам, шляхце ехаць на сойм для выбрання новага вялікага князя. Аляксандр не забыў нагадаць панству пра іх клятву, не мець нікога сваім валадаром, «нижьли сына его милости (Казіміра Ягайлавіча. — *В.Ч.*), которого ваша милось, згодившися посполу с братьею своею, паны-радою великого княжьства Литовского, оберете»[9]. Напамін своечасовы. На велікакняжацкі пасад меціў і слуцкі князь Сымон Міхайлавіч Алелькавіч, за якога маглі аддаць галасы праваслаўныя феадалы. Сам князь, разам з князямі Іванам Мсціслаўскім і Аляксандрам Гальшанскім з'явіўся ў Вільню на чале коннага загону ў 500 вершнікаў. Мабыць, прадбачыў, што спрэчкі могуць дайсці і да зброі. Сойм адкрыўся на дзень святога Іллі (20 ліпеня). Як і чакаў Аляксандр, прыхільнікі Алелькавіча выставілі яго кандыдатуру на велікакняжацкі пасад. Прыход праваслаўнага ўладара не радаваў феадалаў-католікаў і асабліва тых, хто сядзеў у велікакняжацкай радзе: давялося б таму-сяму развітацца са сваімі пасадамі. Большасць паноў-рады падтрымлівалі Аляксандра, ды і яго выбранне супадала б з прадсмяротным жаданнем Казіміра, што не дало б палякам падставы казаць пра незаконнае ўскняжанне новага валадара літоўскага і рускага. Паны-рада абвясцілі сойму, што Казімір даў запавет, каб вялікім князем абралі Аляксандра, а польскім каралём — Яна Альбрэхта. І сойм прагаласаваў за Аляксандра. 30 ліпеня ў Віленскім кафедральным саборы Аляксандра ўзвялі на вялікае княжанне. Маршалак земскі Пётр Мантыгірдавіч, падаў Аляксандру меч і скіпетр, і прасіў новага ўладара быць мужным, не шкадаваць за благія ўчынкі і міласціва ўзнага-

роджваць за добрыя.[10] Віленскі біскуп Войцех Табар блаславіў на панаванне і таксама выказаў пажаданне: «Вартае гэтае княства за ўселякія панствы: толькі тут абедзьвюма рукамі нам пануй; у адной меч, а ў другой, трымаючы ласку. Просім, каб не валошскім, які ёсць аблудны, ані чэшскім альбо нямецкім звычаем, але праўдзівым літоўскім, і Вітаўтавым прыкладам нас радзіў і судзіў. Іначай будзеш прычынай уласнай і нашай загубы»[11]. Як пакажуць далейшыя падзеі папярэджанне біскупа было недарэмным. Ён, як прадбачыў драматычны лёс Аляксандра. Вялікі князь падзякаваў і абяцаў кіраваць дзяржаваю «па праўдзіваму літоўскаму і Вітаўтаву звычаю». Але абяцанні не задаволілі ні паноў-раду, ні другіх феадалаў, а таму 6 жніўня Аляксандр выдаў прывілей, якім пацвердзіў князям, панам, баярам і мяшчанам Вялікага княства правы і вольнасці, дараваныя ім ягонымі папярэднікамі. Як своеасаблівую плату за падтрымку на сойме можна лічыць і абавязак Аляксандра прымаць дзяржаўныя рашэнні толькі са згоды паноў-рады. Так Аляксандр з самага пачатку трапіў у залежнасць ад сваёй рады і ўжо да самай смерці яму не вызваліцца ад волі вяльмож.

ВАЙНА З МАСКОВІЯЙ

Вельмі абрадаваўся Казіміравай смерці Іван III. Надышоў зручны момант развязаць вайну з Вялікім княствам. Ужо восенню 1492 года пачаўся ад'езд у Масковію падданых Вялікага княства — рускіх князёў. Першым падаўся князь Сымон Хведаравіч Варатынскі са сваім братанічам. Каб не з'яўляцца пры маскоўскім двары з пустымі рукамі, Варатынскія захапілі гарады Сярпейск ды Мезецк. За Варатынскімі перайшоў на службу да Івана III князь Міхайла Мезецкі. Так як вояў у князя было малавата, каб браць гарады ў дар будучаму гаспадару, князь звязеніў двух сваіх братоў і прывёз іх на Маскву. Князь Андрэй Юр'евіч Вяземскі, які змагаўся за Вязьму са сваякамі, таксама выказаў жаданне паслужыць праваслаўнаму гасудару і выпрасіў у яго войска, з якім заняў горад. Такі арганізаваны пераход адразу некалькіх князёў на бок Масквы быў падрыхтаваны Іванам III. Невыпадкова літвінскія паслы абвінавачвалі маскоўскага валадара, што ён шле «прелестные листы» да праваслаўных князёў у Вялікае княства. Аляксандр натуральна не прызнаў пераход гэтых князёў і лічыў іх здраднікамі. Яго пасол перадаў Івану III: «Князи Вяземьские и Мезецкие наши были слуги, а здрадивши нас присяги свои, и втекли до твоее земли, как то лихие люди»[12].

Адначасова Іван Васільевіч падбухторваў да вайны з Вялікім княствам і Менглі-Гірэя. Абодва валадары згаварыліся пра сумесныя дзеянні, у ходзе якіх татары павінны былі захапіць Кіеў, а маскавіты — Вільню і Кракаў. Вось так Іван Васільевіч гатоў быў не толькі вызваляць праваслаўных ад «поганой латины», а несці «святло праваслаўя» і далей — палякам-католікам.

Пасланае Аляксандрам войска на чале з смоленскім ваяводам Юрыем Глябовічам, Васілём Півавым і князямі Друцкім і Сымонам Мажайскім вярнула гарады Сярпейск ды Мезецк, аднак Іван III не думаў саступаць іх Літве. Маскоўскія палкі зноў адваявалі гэтыя гарады. Мезецк здаўся без супраціўлення, а вось Сярпейск давялося ваяваць і біць па ім з гармат, браць прыступам. Узялі маскавіты таксама гарадок Апакаў і прывялі яго жыхароў да хроснага цалавання на вернасць Івану III. А пасля маскоўскія атрады занялі Любуцк, Мцэнск, Хлепень.

Хаця абодва бакі і не абмяняліся разметнымі граматамі і фармальна Вільня і Масква нібыта трымалі мір, сапраўды паміж імі пачалася вайна. Іван III прагнуў яе і спадзяваўся на перамогу. Падбухторваў выступіць Менглі-Гірэя: «...садись на конь и иди на Литовскую землю не мотчая!»[13]. А для крымскага хана якраз выпадаў зручны момант — Вялікая Арда, якой палохаўся Менглі-Гірэй, адкачавала за Дон. У Крыме рыхтаваліся да паходу на Вялікае княства.

Дзеля заключэння новага міру з Масквою Вялікае княства павінна было прызнаць усе ранейшыя і новыя заваёвы маскавітаў. Гэта разумелі ў Вільні, таму неабходна было ўсяляк пазбегнуць вайны з Масковіяй і заручыцца хаця б саюзам з Польшчаю. Яшчэ да выбрання Аляксандра вялікім князем у паноў-рады нарадзілася задума пачаць з Іванам III перамовы пра сватанне Аляксандра да яго дачкі. Пакуль вырашалася б гэтая справа, можна было б паразумецца з Польшчаю. Калі б Аляксандр ажаніўся з Аленай Іванаўнай, мір паміж Масковіяй і Вялікім княствам захаваўся і з'явілася б магчымасць нейтралізаваць саюзнікаў Масквы — Крымскае ханства і Малдавію. Не адкладваючы справы на доўгі час, урад Вялікага княства пачаў рыхтаваць глебу для перамоў аб шлюбе Аляксандра. 14 ліпеня 1492 года полацкі намеснік Ян Забярэзінскі паслаў свайго пісара Лаўрына да наўгародскага намесніка Якава Захар'евіча. Лаўрын і завёў гаворку пра сватанне Аляксандра. Якаў Захар'евіч пра ўсё паведаміў Івану III і той, відаць, палічыў, што гэтай жаніцьбай ён даможацца прызнання ад Аляксандра яго заваёў, і згадзіўся весці перамовы. Увосень у Маскву прыбылі ўжо афіцыйныя паслы ад Аляксандра — Станіслаў Гля-



К.Кучыньскі. Літвінскія воіны.
Паводле нямецкай гравюры XVI ст. 1861 г.

бовіч ды Іван Уладычка. Прымаў іх князь Іван Юр'евіч Патрыкееў — нашчадак Нарымонтаў. Пасля выпітых чарак у паслоў развязаліся языкі і яны завязалі гаворку пра сватанне. Але Іван Патрыкееў заявіў, што перш за ўсё трэба вырашыць пытанне пра мір. Іван III дамагаўся афіцыйнага прызнання сваіх

заваёў. На гэтым пасольства і скончылася. 6 лютага 1493 года ў Вільню прыбыло маскоўскае пасольства на чале з Дзмітрыем Загражскім. Пра сватанне не казалі. Пасольства павінна было скласці прысягу перад Аляксандрам за князёў, што перайшлі на службу Маскве. У сваёй грамаце замест ранейшага тытула Іван III напісаў «Государь всея Руси», тым самым паказаў, што лічыць сябе законным уладаром усіх рускіх земляў. Адпускаючы паслоў у Вільню, Іван III павучаў іх, на выпадак, калі ў Вільні спытаюцца: «Чаго гэта вялікі князь загадаў — «Гасудар усея Русі», — адказаць так: «Гасудар мой сам мною загадаў: а хто хоча тое ведаць, і ён едзь у Маскву, там пра гэта мовяць»[14]. Ні Аляксандр, ні яго рада не прынялі новы тытул Івана III: калі б прызналі яго, маскоўскі ўладар пачаў бы патрабаваць усе землі былой Кіеўскай Русі ды яшчэ Смаленшчыну і Полаччыну. Літвінскім паслам Андрэю Аляхновічу ды Войтку Яновічу ўсё той жа князь Патрыкееў паведаміў, што яго гасудар «ад пачатку і ёсць прыродны гасудар усея Русі»[15]. Сам Іван III ультыматыўна патрабаваў прызнаць яго новы тытул і пагражаў вайною. Перад гэтаю пагрозаю Аляксандр у сакавіку 1493 года адправіў Літавора Храбтовіча ў Польшчу прасіць у Яна Альбрэхта «радни и помощи». Літавор атрымаў наказ перамовіць з важарамі польскіх наёмных атрадаў аб найме іх на велікакняжацкую службу. Аляксандр прасіў наняць хаця б трыста жаўнераў.

З выбраннем асобнага ад Польшчы ўладара Вялікага княства рвалася тая сувязь з Польшчаю, якую ўвасабляў агульны ўладар Казімір. Акты уніі цяпер страцілі сілу. Ніхто не паехаў з княства ў Карону на выбранне польскага караля, тым самым яшчэ раз урад Літвы пацвердзіў скасаванне уніі. І ў сваім пасланні брату Яну Альбрэхту, які стаў польскім каралём, Аляксандр віншаваў яго з выбраннем на каралеўскі пасад, нагадваў яму пра сяброўства, але ні словам не абмовіўся пра аднаўленне уніі. І вось цяпер у Польшчы з'явілася магчымасць скарыстацца нялёгкім становішчам Вялікага княства і навязаць ягонаму ўраду ўмовы уніі. Амаль год Ян Альбрэхт і каралеўская рада не адказвала Вільні: спасылаліся на занятасць, перамовы з туркамі, венгерскім каралём, брандэнбургскім маркграфам, а сапраўды ў Кракаве чакалі далейшага абвастрэння адносін паміж княствам і Масковіяй. Напрыканцы 1493 года польскі кароль паведаміў Аляксандру, што Польшча будзе дапамагаць Вялікаму княству супраць усялякага непрыяцеля, як пра гэта дамовіліся ў папярэдніх «запісах», але дзеля гэтага трэба аднавіць іх. Польшча зноў прапаноўвала нявыгадную для літвінскай дзяржавы унію. На такія ахвяры ўрад Вялікага кня-



К.Кучыньскі. Ваенныя музыканты войска ВКЛ.
Паводле нямецкай гравюры XVI ст. 1861 г.

ства не згадзіўся, і Аляксандру засталося пайсці на ўступкі Івану III. У студзені 1494 года ў Маскву прыбылі троцкі ваявода Пётр Белы і стараста жамойцкі Станіслаў Гаштольд, Войтка Яновіч і Хведар Грыгор'еў.

Пасля доўгіх спрэчак 8 лютага быў заключаны чарговы «вечны» мір. Іван III вяртаў назад Любуцк і Мезецк, адмаўляўся ад прэтэнзій на Смаленск, Бранск, Любуцк, Мцэнск, Серпейск, Янчына, Масальск, Дзмітраў, Залідаў, Бышковічы, Апакаў, а за Масквой заставаліся Вялікі Ноўгарад, Пскоў, Цвер, Вялікія Лукі, Вяземскае княства і Холмская воласць, адыходзілі ад Літвы і

землі «ўкраіных» князёў, якія перайшлі да маскоўскага князя. На такі кампраміс з Масквою паўплывалі і сватанне да Алены мазавецкага князя Конрада III і яго жаданне разам з прускім магістрам «стати соодиного» на «Казимировых детей». Так што шлюбам з Аленай Аляксандр нейтралізаваў Мазовію і Ордэн, якія без падтрымкі Масковіі не наважыліся б пачынаць вайну з Вялікім княствам.

ШЛЮБ З АЛЕНАЙ ІВАНАЎНАЙ

Пасля заключэння міру прыступілі да перамоваў пра сватанне Аляксандра. Іван III і сам быў зацікаўлены выдаць сваю дачку за вялікага князя літоўскага і рускага, каб гэтым шлюбам замацаваць за сабою заваяваныя землі — зручны плацдарм для наступу на Смаленск.

Маскоўскі гасудар вылучыў умову, каб яго дачка заставалася праваслаўнай і яе не прымушалі перайсці ў каталіцтва. Паслы ўпэўнілі вялікага князя: «Той няволі не быць»[16] і атрымалі згоду Івана III на шлюб Аляксандра з Аленай Іванаўнай.

Адбыліся заручыны. Замест Аляксандра ягоны пярсцёнак і залаты ланцужок з крыжыкам паднёс пасол Станіслаў Гаштольд. Княгіня абмянялася з паслом сваім пярсцёнкам і залатым крыжыкам. Справа была зроблена. Мірныя граматы напісаны. Іван III цалаваў над імі крыж. Так сасваталі за Аляксандра дачку маскоўскага валадара. Уражаныя прыгажосцю дзевятнаццацігадовай княгіні паслы даносілі Аляксандру, што яны любуюцца «яе крсоты». І здавалася, што з гэтай прыгажуняй не толькі шчасце прыйдзе ў дом Аляксандра, але і мір у яго краіну.

У сакавіку на Літву выехала маскоўскае пасольства, каб прысутнічаць пры цалаванні крыжа Аляксандрам на дамове пра мір і атрымаць ад яго грамату, што няволі ў веры Алене Іванаўне не будзе. Крыж Аляксандр пацалаваў і патрэбную грамату выдаў, але з адной умовай: «а калі захоча сваею воляю прыступіць да папскага Рымскага закону, дык ёй у тым воля». Маскоўскія паслы адмовіліся прыняць гэтую грамату. Развітваючыся з пасламі, Аляксандр дапусціў іх да сваёй рукі і прамовіў: «Мы брату и тестю нашему дякуем за то, что он хочет с нами жить в кровном связанье и вечной приязни, дай то боже, абы межи нами на веки было»[17].

Пытанне пра «грэчаскі закон» будучай вялікай княгіні літоўскай і рускай усё ж не ўдалося вырашыць. Аляксандр, які разумеў, што гэты пункт у дамове дае Івану III магчымасць умешвацца ва ўнутраныя справы Вялікага княства, пасля няўдалых

спробаў неяк нейтралізаваць яго, усё ж павінен быў саступіць. Маскоўскі гасудар праз сваіх баяр катэгарычна заявіў літвінскаму паслу Літавору Храбтовічу, які мовіў, што яго гасудар думаў ці «не палюбіцца вялікаму князю маскоўскаму прыбаўлены радок», — «...калі вялікі князь Аляксандр такой граматы не дае, дык і нашаму гасудару нельга за яго даць сваю дачку»[18]. У канцы 1494 года Аляксандр атрымаў з Рыма дазвол ад папы Аляксандра VI, каб ён каталік ажаніўся з дачкою «схізматыка», пры ўмове з цягам часу і паводле абставін звярнуць яе ў каталіцтва (прычым вялікі князь увёў у зман папу, не паведаміўшы яму пра сваё абяцанне маскоўскаму ўладару не «нудить к Рымскому закону» сваю будучую жонку). У Маскву прыехаў велікакняжацкі пісар Адам і прывёз патрэбную грамату. На вадохрышча ў 1495 годзе прыбыло пасольства з Вільні па вялікую князёўну. За ўрачыстым абедам Іван Васільевіч, які выпіў раманею* за здароўе свайго будучага зяця, прамовіў, маючы на ўвазе багатыя паднашэнні ад яго: «Чым бы тыя падарункі можна адарыць?» Літвінскія паслы пад зверхнасцю Яна Забярэзінскага падняліся з-за стала і ўдарылі чалом вялікаму князю: «Тыя падарункі патрабуюць вялікай прыязні Вашай царскай міласці да нашага вялікага князя, каралевіча польскага Аляксандра». Іван III адказаў: «А якой? Не адмоўлю». Паслы мовілі: «Наш вялікі князь не мае бацькі, дык просіць, каб твая царская міласць прыняў яго і быў яму другім бацькам, даўшы за яго дачку сваю, Алену». Іван Васільевіч адказаў наступным днём на прыёме пасольства: «Калі Богу гэта ў дагоду, хай будзе яго воля»[19]. Яшчэ раз Іван III нагадаў, каб яго дачку не прымушалі прымаць каталіцтва і каб Аляксандр загадаў пабудаваць для яе праваслаўную царкву. Сустрэліся паслы і з Аленай Іванаўнай. На каленях яе прасілі трымаць іх гаспадара ў ласцы. Расчуленая княгіня расплакалася. Іван Васільевіч пажадаў зірнуць на партрэт Аляксандра, і паслы паслалі на падвор'е па партрэт. Іван Васільевіч застаўся задаволены выявай свайго зяця: «Сапраўды каралевіч польскі! Ну, Алена, хай маляваны застаецца ў мяне ў пакоях, а табе жывы вялікі князь Аляксандр будзе назаўжды прыяцель»[20], — прамовіў маскоўскі гасудар.

13 студзеня Алена Іванаўна пакінула родны горад, каб ужо ніколі не вярнуцца ў яго. Нялёгкі лёс чакаў гэтую жанчыну. Яе сямейнае шчасце было прынесена ў ахвяру палітычных амбіцый яе бацькі і яе мужа. Адпускаючы ад сябе дачку, Іван Васільевіч падрабязна настаўляў яе: «у лацінскую бажніцу не хадзіць, а хадзіць... да сваёй царквы... Будзе ў Вільні маці Аляк-

* Раманея — так называлі ў Масковіі віно, прывезенае з Італіі.

сандра, і калі пойдзе да сваёй бажніцы і загадае Алене ісці з сабою, дык правесці свякроў да бажніцы, і пасля ветла адпрасіцца ў сваю царкву, а ў бажніцу не хадзіць»[21]. Амаль кожны крок Алены вызначаў Іван III: з кім ёй сустракацца, што адказваць ёй падчас вянчання на пытанне біскупа, ці любы ёй Аляксандр. Суправаджалі князёўну дзве тысячы вояў і світа бараў, над якімі верхаводзіў князь Сымон Рапалоўскі. Усю дарогу маскоўскія баяры з лаянкай патрабавалі ад літвінскіх паслоў, каб вянчанне адбылося ў праваслаўным храме.

Алену сустракалі ўрачыста. Перад кожным горадам будучую вялікую княгіню віталі натоўпы люду і разадзетай шляхты. Гарматы палілі ў яе гонар. Праваслаўныя святары ў аблачэнні выходзілі насустрач. Просты люд шчыра верыў, што са шлюбам Аляксандра з Аленай Іванаўнай скончыцца варожасць паміж Вялікім княствам і Масковіяй. Непадалёк ад Віцебска князёўну сустрэлі пасланыя Аляксандрам маршалак Станіслаў Страміла, князі Канстанцін Астрожскі, Іван ды Васіль Глінскія. Яны прывезлі ад вялікага князя дар — багата ўпрыгожаны экіпаж, запрэжаны васьмёркай жарабкоў. Алена адмовілася перасядаць са свайго вазка ў экіпаж. А за тры вярсты ад Вільні выехаў ёй насустрач вярхом Аляксандр. Па дарозе стаялі воі, якія радаснымі крыкамі віталі князёўну. Відовішча гэтае было яркае і запамінальнае: тысячы людзей, радасныя твары, бляск упрыгожанняў на вопратках, крыкі, музыка. Убачыўшы вялікага князя, маскоўскія баяры акружылі падковай вазок княгіні.

Трыццаць чацвёрты год ішоў Аляксандру. Сярэдняга росту, плячысты і рухавы, ён выглядаў значна старэйшым за свае гады. Барада і вусы старылі яго. На твары ўжо адбіліся зморшчынамі першыя трывогі і выпрабаванні велікакняжацкага ўладарства. Але па-маладому саскочыў з каня вялікі князь і па расцеленым чырвоным сукне пайшоў да вазка княгіні. Алена выйшла яму насустрач. Аляксандр падаў ёй руку, спытаўся пра здароўе. Усё гэта адбывалася пад крыкі прысутных: «Хвала Госпаду за такі вялікі дар, што даў нам дачку манарха маскоўскага мець сваёй паннай! Няхай жыве многія лета вялікі князь Аляксандр, над намі пануючы!»[22]. Гучалі мушкетныя стрэлы. Пасля князёўна села ў свой вазок, і ўрачысты поезд рушыў да Вільні. Аляксандр ехаў наперадзе Аленінага вазка. Леваруч яго ішлі баярскія дзеці, а праваруч княжаты і паны. З гарадскіх валоў і замкаў ударылі гарматы. Віленскі люд выбег насустрач велікакняжацкай працэсіі і кідаў кветкі на дарогу.

Праз тры дні ў кафедральным саборы св. Станіслава Аляксандр вянчаўся з Аленай. Перад храмам нявесту сустрэў біскуп Войцех Табар, але не блаславіў яе. Вянчанне служылі біскуп і



Вільня. *Гравюра XVII ст.*

праваслаўны святар, які прыехаў з княгіняй: біскуп чытаў малітвы Аляксандру, а поп — Алене, над якой па праваслаўнаму звычаю княгіня Рапалоўская трымала вянец. Падалі выпіць агульную чашу. Алена паспытала віно і перадала келіх Аляксандру, а ён, выпіўшы яго да дна, кінуў на шчасце на падлогу. Келіх да засмучэння прысутных не разбіўся — гэта быў дрэнны знак. Тады Аляксандр растаптаў яго і загадаў асклёпкі выкінуць у Вілію. Ужо з самага вянчання рэлігія стала паміж маладымі, каб раз'яднаць іх. Мабыць, Аляксандр адчуваў штучнасць падобнага абраду. Ён забараніў папу́ казаць малітву, а княгіні Рапалоўскай трымаць вянец. Тут жа князь Сымон Рапалоўскі стаў яго адгаворваць. Пра палітыку не забыліся і ў храме. На пытанне біскупа, ці любы ёй князь Аляксандр, Алена, як і вучыў яе бацька, адказала: «Любы мне, і не пакінуць мне яго да жывата. Трымаць мне грэчаскі закон, а яму мяне да Рымскага закону не прымушаць»[23]. Пасля шлюбу маладажоны адправіліся ў своеасаблівае вясельнае падарожжа: Полацк—Віцебск—Смаленск—Орша—Менск. Аляксандр хацеў паказаць Алене сваю дзяржаву, а падданым вялікую княгіню. Усюды іх радасна віталі. Людзі шчыра верылі, што гэты шлюб прынясе мір з Масквой. Ды і сам Аляксандр спадзяваўся на гэта.

Гэты шлюб не прынёс шчасця ні Аляксандру, ні Алене. Каталіцкае акружэнне ўвесь час дакарала вялікага князя за шлюб з праваслаўнай. Нават папа Аляксандр VI Борджыя і той ў сваёй буле настойваў развесціся з жонкаю «схізматкай». А як было Алене, калі насядалі на яе католікі, каб прыняла іх веру, калі палякі адмовіліся прызнаць яе сваёй каралевай, калі многія ў велікакняжацкім атачэнні бачылі ў ёй віноўніцу войнаў з Масковіяй? Не спраўдзіў гэты шлюб і палітычных разлікаў Аляксандра. Так і не атрымаў за жонку пасаг — землі страчаныя. Хаця ўдалося стрымаць маскоўскі наступ на Вялікае княства. Аднак як доўга працягнецца гэты мір?

«НЕЛЮБОЎ» З ІВАНАМ III

Аляксандр спяшае выкарыстаць выпадак, каб уцягнуць Івана III у саюз супраць Малдавіі і Крымскага ханства, але ж гэта маскоўскія саюзнікі. Ужо ў першым пасольстве, пасля шлюбу з Аленай, Аляксандр прапаноўвае Івану III быць заадзін супраць валадара малдаўскага, які вёў вайну з Польшчаю і адначасова нападаў на паўднёвыя землі Вялікага княства. У Маскве адказалі, што іх гасудар у сяброўстве і сваяцтве са Стафанам. Не згадзіўся Іван III дапамагаць Аляксандру і супраць крымскага хана. Паміж абедзвюма сталіцамі зачасцілі пасольствы, у граматах везлі яны ўзаемныя прэтэнзіі. Іван III абвінавачваў свайго зяця, што «ўсё не па таму становіцца, як Аляксандр нам абяцаў»[24]. Не вянчаўся ў праваслаўным храме, і прыдворнай царквы не пабудаваў для жонкі, і слуг яе — маскоўскіх баяраў — адсылае назад, і загадаў ёй зняць маскоўскую адзежу, а даў сваю, і граматы піша не па дамове, не ставіць у іх тытул Івана III «Государь всея Руси». Ясна, што ён загадзя рыхтаваў глебу для абвінавачвання Аляксандра ў невыкананні ўмоў міру. У сваю чаргу і Аляксандр адказваў: «Нашу Вялікую княгіню трымаем у гонары, а і пасля, аж Бог дасць, хочам у гонары трымаць»[25]. Аляксандр казаў шчыра. Як мог так і дагаджаў жонцы. Надзяліў яе Браславам, Жыжмарамі, Княжычамі, Смалянамі, Чырчынскам, Лошыцай, Градзішчам, замкам Папова Гара і староствам Магілёўскім. А каб пацяшаць Алену запрасіў у палац музыкаў і спевакоў. Да канца свайго жыцця не адпускаў з віленскага двара кіраўніка кракаўскай капэлы Генрыка Фінцка. За жонку Аляксандр гатовы быў нават спаліць на вогнішчы нейкую яўрэйку, якая лячыла яе і нібыта чарамі навяла бясплодства. Толькі заступніцтва Івана III выратавала яе ад пакарання, але з гэтага часу Аляксандр узненавідзеў усіх яўрэяў. Нават хацеў выгнаць іх з Літвы. Пад канец свайго праў-

лення прыступіў да свайго намеру — сагнаў на поле каля Гародні тутэйшых яўрэяў для перасялення іх на Украіну у пустынныя мясціны. Смерць Аляксандра выратавала іх. Толькі гарачае каханне магло прымусіць вялікага князя на такія ўчынкі.

На астатнія абвінавачванні цесця Аляксандр адказваў, што ніякай няволі Алене не чыніў, што «слугі рымскага закону прыстаўлены да вялікай княгіні таму, што яны да гэтага годныя, і ад гэтага яе грэчаскаму закону няма ніякай парухі», што «пабудаваць для жонкі маёй царкву ў палацы, на пераходах я не магу, так як гэтым парушаліся б тыя законы, якія выдадзены і маім бацькам, і мною аб забароне пабудовы новых праваслаўных цэркваў. Калі ж княгіні захочацца хадзіць у праваслаўную царкву, дык такая ёсць непадалёку ад палаца ў горадзе, і я гэтаму не буду перашкаджаць»[26]. Аляксандр змаўчаў пра сапраўдныя прычыны сваіх рашэнняў. Маскоўскіх баяраў, якія прыехалі з Аленай, «каб ёй сумна не было», Аляксандр не без падстаў падазраваў у шпіянажы і выслаў у Маскву. Будаваць жа царкву ў палацы Аляксандр не рашыўся, каб не злаваць каталіцкае святарства і так незадаволенае, што ён ажаніўся на праваслаўнай.

Адносіны паміж двума ўладарамі сталі яшчэ болей напружанымі пасля таго, як Аляксандр не прапусціў праз свае ўладанні турэцкага пасла, які ехаў у Маскву, і па дарозе аглядаў землі княства. Зноў Іван III абвінаваціў Аляксандра ў парушэнні дамовы. Аляксандр адказаў: «Брат наш і цесць мовіць толькі пра свае справы, а не кажа, хаця і абяцаў, пра што мы пасылалі да яго пасла, што нашым падданым з яго зямель усялякія крыўды чыняцца. А што ён кажа, што Менглі-Гірэй і Стафан хочуць з намі любові і даканчання (згоды. — *В.Ч.*), так яму вядома, якія шкоды ад іх нам сталіся, і цяпер робяцца, а таму ён можа меркаваць, якімі яны могуць быць нам прыяцелямі. Мы ад міра і прыязні з імі не адмаўляемся, але няхай яны шкоды выправяць і наперад не будуць іх чыніць»[27]. Аляксандр казаў праўду. Маскоўскія атрады ўвесь час рабілі дробныя набегі на землі Вялікага княства. Тое самае адбывалася і з боку Крыма і Малдавіі, хаця Іван III заяўляў, што ён нібыта рупіцца, каб яны «былі ў міру з Аляксандрам»[28]. Яшчэ болей рэзкай па зместу была грамата Аляксандра, якую ён паслаў Івану III у кастрычніку 1496 года. «Уразумелі мы з тваёй дачкою, а з нашай Вялікай княгіняй, што ты, брат і цесць наш, хочаш ведаць, для чаго мы з табою добрага жыцця не трымаем, як належыць быць паміж намі, спадзяемся, што ты сам добра ведаеш, што ты забраў многія гарады і воласці, які здавён служылі нашай Дзяржаве. Ты, абыходзячы нас, уваходзіш у прыязнь з Турэцкім, Перакопскім, Валашскім, ты загадваеш,

каб мы з Перакопскім і Валашскім былі ў сяброўстве і прыязні, але пасля таго, як ты з імі перасылаешся, ад іх яшчэ больш шкоды нарабілася і робіцца: але ж, з Божаю дапамогаю, мы можам табе і тваім дзецям быць лепшымі прыяцелямі, чым яны. Ды яшчэ з тых часоў, як узялі мы з табою даканчанне, нашым землям, не ведаем, ці з твайго ведама, або не з твайго, робяцца шмат шкоды. Ты б брат наш, гарады і воласці, якія забраў у нас, вярні, а шкоды загадай выплаціць, а калі будзе ў нас з табою любоў па даканчанню, дык непрыяцелі не будуць на нас мысліць, а прыяцелі радавацца»[29]. Як вынікае, Аляксандр ведаў, хто наводзіць крымскія і малдаўскія загоны на Вялікае княства — Іван Васільевіч. Так, маскоўскі гасудар падтрымліваў і крымскага хана, і валашскага гаспадарыча. «Я на чым табе слова мовіў, на тым і стаю — друг другу, а недругу недруг, — і ты б таксама на сваім слове стаяў», — паведамляў Іван III у 1495 годзе Менглі-Гірэю[30]. І як бачым, стаяў супраць свайго «недруга» Аляксандра.

Звернем увагу і на тое, што Аляксандр патрабаваў вяртання захопленых земляў, як залог міру паміж абедзвюма дзяржавамі. Год таму ён пра гэта і заікнуцца не мог, а цяпер заявіў у поўны голас. І пабудзіла Аляксандра да гэтага ўпэўненасць у хуткай перамозе над Малдавіяй, на якую выступілі паходам Польшча і Вялікае княства.

МАЛДАЎСКІ ПАХОД

У 1495 годзе паміж Польшчаю і Вялікім княствам па ініцыятыве палякаў пачаліся перамовы пра аднаўленне уніі. Польшча шукала дапамогі ў літвінскай дзяржавы супраць крымскай і турэцкай небяспекі. Яшчэ ў 1494 годзе татарскія загоны выпалілі шмат сёлаў на Падоллі і Валыні, забралі ў палон тысячы людзей. Польскі кароль Ян Альбрэхт выслаў за ворагам у пагоню невялікі атрад, да якога далучылася мясцовая шляхта. Пад Вішнявіцамі татары разбілі палякаў. Пазбаўленыя абароны Падолле і Валынь сталі іхняй здабычай. Аб'яднанымі сіламі Польшчы і Вялікага княства лягчэй было супрацьстаяць Крымскаму ханству, і Ян Альбрэхт паслаў да Аляксандра свайго дарадца Піліпа Калімаха з прапановаю зрабіць «запісы» паміж абедзвюма дзяржавамі «слушным а радным абычаем, без ображенья чести и без шкоды»[31], каб разам чыніць адпор татарам. У становішчы, калі Вялікае княства акружалі тры варожыя дзяржавы: Масковія, Крымскае ханства і Малдавія, саюз з Польшчаю быў проста неабходны. Саюз, але не рабаўніцкая унія, якая пазбаўляла б княства дзяржаўнай самастойнасці.

На яго згадзіліся Аляксандр і паны-рада. Вялікі князь прасіў паведаміць брата, якія «запісы» жадае ён аднавіць, а таксама прапаноўваў размясціць у памежных замках гарнізоны і заняць малдаўскія гарады Белгарад і Кілію, з якіх зручна перахопліваць татарскія загоны. Ян Альбрэхт прыслаў з пасламі копію «запіса», каб Аляксандр і яго дарадцы паправілі яго, калі ўбачаць нейкі «выступ і праціўнасць» супраць Вялікага княства. Палякі прасілі заключыць унію, спасылаючыся на турэцкую пагрозу і на татар, якіх пасылаюць туркі ваяваць Польшчу. Аляксандр і паны-рада пацвердзілі стары «запіс», у якім не знайшлі «шкоды» для сваёй дзяржавы. Аднак, палохаючыся падману з польскага боку, яны заявілі, што пацвердзяць толькі стары «запіс», копію якога ім прывезлі, а не іншыя «запісы», якія сталі «нерадным и неслушным обычаем, чести внимаючи, чести парушаючи одное стороны». І, відаць, трапілі вельмі дакладна, бо палякі разлічвалі, што з падпісаннем гэтага «запіса» займаюць сілу і акты Гарадзельскай уніі і акты, падпісаныя Жыгімонтам Кейстутавічам. Так як хітрыкі іх выкрылі, польскія паслы вярнуліся ў Кракаў і такі важны для абедзвюх дзяржаў саюз павіс у паветры. І ўжо Аляксандр, які да гэтага часу мог пераканацца, што Іван Васільевіч не збіраецца дапамагаць яму ў барацьбе з Малдавіяй і Крымскім ханствам, а болей таго можа і сам напасці на Вялікае княства, уздымае пытанне уніі з Польшчай. У жніўні 1496 года ў Кракаў прыбыло велікакняжацкае пасольства, ачоленае Луцкім біскупам Янам і панам Сымонам Алізар'евічам. Але і цяпер «канца не сталася», бо палякі хацелі накінуць на Вялікае княства ўмову не «роўнага злучэння», а ўсё тую рабаўніцкую унію, паводле якой княства ўваходзіла ў склад Кароны. Трохі пазней восенню гэтага ж года Аляксандр адправіўся на сустрэчу з братам. Гаворка павінна была весціся пра сумесны паход Польшчы і Вялікага княства на Малдавію. Гаспадар Стафан перад пагрозай турэцкага нашэсця прызнаў сябе васалам Турцыі. Наяўнасць на паўднёвых межах Княства і Польшчы дзвюх пратурэцкіх дзяржаў Малдавіі і Крымскага ханства выклікала трывогу і ў Кракаве, і ў Вільні. Польскі кароль Ян Альбрэхт выношваў задуму пасадзіць на малдаўскі пасад малодшага брата Жыгімонта. Такім чынам да супрацьтурэцкай кааліцыі Польшчы, Вялікага княства Літоўскага і Рускага, Чэхіі, Угорыі далучылася б і Малдавія. Па-другое, пасля захопу туркамі гарадоў Кіліі і Белграда ў турэцкіх руках апынуліся вусці Дуная і Днястра. І Польшча, і Вялікае княства Літоўскае імкнуліся цалкам валодаць двума гандлёвымі шляхамі, якія злучалі Чорнае мора з Балтыйскім. Першы пачынаўся з Белграда і ішоў да Сучавы — сталіцы Малдавіі, і праз Львоў і Кракаў выходзіў або на Вроцлаў, або

на Данцыг. Другі — у Крыме, і праз Кіеў і Вільню ішоў да Кёнігсберга і Рыгі. Татары і туркі, заваяваўшы Крым, Белгарад і Кілію, перарэзалі гэтыя шляхі. Таму валоданне Малдавіяй было жыццёва неабходным для развіцця і ўмацавання як Польшчы, так і Вялікага княства. Летам 1496 года Аляксандр і Ян Альбрэхт збіраліся ў паход на Малдавію. Аляксандр у жніўні пасылаў Каспара Гармантовіча да Менглі-Гірэя, каб схіліць яго ўдзельнічаць у вайне з Малдавіяй або не падтрымліваць яе. Менглі-Гірэй адназначна мовіў: «У нас са Стафанам праўда і дамова ёсць, і яго нам пакінуць нельга: калі хочаш мірыцца з намі, дык мірыся і з ім, і нам усім праўду і дамову ўчыні»[32]. Між тым у Вялікую Арду Аляксандр адправіў свайго пасла Халецкага з прапановаю хану Шых-Ахмету выступіць супраць Крыма. Менглі-Гірэй, даведаўшыся пра гэта пасольства, звязеніў Каспара Гармантовіча і накіраваў некалькі загонаў на паўднёвыя межы Вялікага княства. І так, нягледзячы на адносныя няўдачы ў дыпламатыі, Аляксандр разлічваў, што ні Масква, якая звязана з Вялікім княствам мірам, ні крымскі хан, які палохаўся нападу Арды, на дапамогу Малдавіі не прыдуць, а таму быў упэўнены ў перамозе над ёю. Адсюль такі рэзкі тон у грамаце да Івана III, дзе Аляксандр яшчэ раз нагадаў, што са стратай заваяваных маскоўскім уладаром земляў ён не змірыўся і не прызнаў яго «Государем всея Руси». Але гісторыя распарадзілася па-свойму. Польскія паны адмовіліся ісці на Малдавію. Ян Альбрэхт адклаў паход на год.

У студзені 1497 года польскі кароль з атрадам, пасланым тэўтонскім магістрам Цыфенам, рушыў на Малдавію. З літвінскім войскам выступіў Аляксандр, які, як некалі Альгерд, захаваў тайну паходу. Калі войска дасягнула разбуранага малдаванамі Брацлава на Бузе, незадаволеная шляхта спыталася ў яго: «Міласцівы гасудар наш, куды, твая міласць, ідзеш за намі?» Аляксандр яшчэ сур'ёзна не сутыкнуўся з самалюбівай шляхтай, таму пыхліва адказаў: «Калі б мае думкі ведала сарочка, што на мне, я спаліў бы яе». І пачуў: «Калі ты, гасудар, наш, нам рашэння і задумы сваей не мовіш, ня хочам ісці за раку Буг»[33]. Вось так.

Іван III упарта патрабаваў, каб літвіны не ўдзельнічалі ў польска-малдаўскай вайне, і дарэмна ўвяшчаў Аляксандр свайго цесця: «Мы спадзяемся, што брат наш, вялікі князь, больш жадае дабра нам, зяцю свайму, чым Стафану — ваяводзе»[34]. Аляксандр не забываўся пра магчымасць крымскіх набегаў на Вялікае княства, і таму на дапамогу палякам адправілася частка войска пад зверхнасцю лідскага пана Станіслава Пятровіча Кішкі, князёў Сымона Іванавіча Мажайскага і Васіля Іванавіча Шамячыча, а сам ён з другой часткай застаўся ў Брацлаве і прыняўся за аднаўленне горада.

Ян Альбрэхт дзейнічаў супраць малдаван вельмі няўдала. Стафан умацаваў сваю сталіцу Сучаву і з адборным атрадам адступіў у горы, дзе засеў у цвержы Путна. Некалькі дзён прастаялі палякі каля Сучавы. Зразумеўшы, што штурмам яму не авалодаць малдаўскай сталіцай, Ян Альбрэхт зняў аблогу і рушыў на Путна. Стафан прыслаў да яго сваіх паслоў, прызнаў сябе польскім васалам і заключыў мір. На гэтым, здавалася, і скончылася вайна з Малдавіяй. Але на адваротным шляху ў глухіх лясах Букавіны пад Лукаўцамі польскае войска трапіла на засаду малдаванаў і было ўшчэнт разбіта. У палон трапіў польскі гетман Тычынскі. Пасланы Аляксандрам атрад спазніўся. Каля Днястра ён уступіў у бой з малдаванамі і разбіў іх, што і затрымала літвінаў. Тым не менеў перапужаны Ян Альбрэхт абрадаваўся, убачыўшы літвінскіх вояў, пад аховай якіх ён дабраўся да Камянца. Гэтая няўдача перакрэслівала надзеі Аляксандра на лёгкую перамогу над Масквою. Трэба было плесці інтрыгі і супраць Крыма, і супраць Малдавіі, каб хоць неяк нейтралізаваць іх на выпадак вайны з Масковіяй. З Вільні ў Вялікую Арду да хана Шых-Ахмета ізноў паехалі паслы, падбухторваць яго падняцца на Менглі-Гірэя. Пра гэта пасольства добра ведалі ў Крыме. Менглі-Гірэй даносіў Івану Васільевічу, што Аляксандр наводзіць на яго недругаў. Маскоўскі гасудар заспакойваў свайго саюзніка: «Калі на Крым пойдзе Вялікая Арда, дык мы пашлем на яе Касімаўскага цара, братаніча твайго, таксама сваю рускую раць, і, апроч таго, пашлем у Казань, каб і Абдылетыф паслаў туды сваю раць»[35]. Шых-Ахмет асцярожнічаў. Паспешлівым выступам супраць Крыма велікаардынскі хан рызыкаваў апынуцца паміж двух агнёў. Перапіска паміж Іванам Вісільевічам і Менглі-Гірэем працягвалася. Іван шчыра ўпэўніваў свайго памагатага, што заўсёды будзе заадно на літоўскага князя. Вось так, не пра шчасце сваёй дачкі думаў ён, а пра вайну з яе мужам.

Спроба Аляксандра дыпламатычнымі захадамі разваліць маскоўска-крымскі саюз не атрымалася. Раз за разам Іван Васільевіч паўтараў у сваіх пасольствах у Вільню і літвінскім паслам, што Аляксандр «не правит по докончанию». Тое самае ў жніўні 1499 года ён перадаў Станіславу Глябовічу: «Калі Аляксандр і так нічога не выконвае па даканчанню, яшчэ будзе нашую дачку нудзіць да Рымскага закона, дык ён тым міру з намі не хоча»[36]. Аляксандр жа ўзамен прызнання поўнага тытула свайго цесця жадаў унесці ў прымірэнчую грамату дамову пра прыналежнасць да Вялікага княства Кіева. Згода Івана Васільевіча азначала ягоную адмову ад заваёў украінскіх земляў. Маскоўскі ўладар з гэтым не пагадзіўся. Абодва ўладары разумелі, што іх спрэчкі вырашыць зброя, абодва рыхтаваліся да вайны.

ЗАМЯТНЯ ВЯЛІКАЯ

Аляксандр і паны-рада прымаюць прапанову Польшчы аднавіць унію. Палякі жылі ў жаху ад турэцкага нашэсця вясною 1498 года. Болей за сто тысяч нявольнікаў звялі ў палон туркі з Падолля і Галіцыі. Разумеючы турэцкую небяспеку для ўсёй Усходняй Еўропы, угорскі кароль Уладзіслаў Казіміравіч прапанаваў брату саюз супраць туркаў. Гэты саюз падтрымаў і Стафан малдаўскі, нягледзячы на тое, што Іван III усяляк намагаўся перашкодзіць яму. Нават як плату за вернасць Маскве абвясціў Стафанавага і свайго ўнука Дзмітрыя вялікім князем маскоўскім і «Гасударом усея Русі». Але змена знешнепалітычнай арыентацыі малдаўскага гаспадара прывяла і да няволі Дзмітрыя.

Пасля таго як туркі восенню 1498 года зноў напалі на Польшчу, Ян Альбрэхт адправіў да Аляксандра пасольства з прапановаю ўступіць у антытурэцкую кааліцыю, а так як Крымскае ханства з'яўлялася васалам Турцыі, гэты саюз быў накіраваны і супраць Крыма. Па-другое, Іван Васільевіч падтрымліваў дыпламатычныя зносіны з турэцкім султанам Баязедам, пра што ведаў Аляксандр і не без падстаў падазраваў, што маскоўскія дзеянні супраць Вялікага княства могуць пачацца з адначасовым нападам Турцыі і Крыма на Польшчу і на княства. Аляксандр згадзіўся дапамагчы брату «со всеми моцами своими», калі туркі зноў рушаць на Польшчу. Але разважлівыя паны-рада не спяшаліся даваць абяцанні. Ці дапамога Польшча ў выпадку вайны з маскавітамі? Самым надзейным гарантам выканання саюзнай дамовы паны-рада лічылі унію, без прыніжэння «почесности обеюх панств». Апроч таго, скарыстаўшыся момантам, урад Вялікага княства патрабаваў ад Яна Альбрэхта, каб польскія пракуратары, якія прыязджалі ў Рым, не лезлі ў справы назначэння біскупаў у княства.

У пачатку лютага 1499 года на польскі сойм, які праходзіў у Любліне, прыбыло велікакняжацкае пасольства на чале з жамойцкім біскупам Мартынам і троцкім ваяводам Янам Забярэзінскім. На гэты раз палякі не дамагаліся сваіх умоў і прынялі «ровное злучанье», якое прапаноўваў урад Вялікага княства.

14 мая на кракаўскім сойме былі складзены «реверсалы» (граматы), у якіх палякі згаджаліся на ўмовы Вялікага княства. Польшча прызнавала самастойнасць Вялікага княства. Абедзве дзяржавы дамаўляліся не пакідаць адна другую ў нялёгкі час і дапамагаць і парадамі, і справай супраць ворагаў. Магнаты і шляхта княства абяцалі не выбіраць вялікага князя, а палякі — караля, без ведама, і не папярэдзіўшы адзін аднаго. Аднак у акце хавалася небяспека для Літвы, бо ў ім было запісана, што Каралеўства Польскае і Вялікае княства Літоўскае

ў будучыні павінны мець сумесны ўрад і агульнага манарха, якога выбіраюць на супольным з'ездзе абодвух народаў з тытулам караля польскага і Вялікага княства Літоўскага. Усе літвінскія ўраднікі прысягаюць на вернасць каралю польскаму. Прадугледжвалася, што «ўсё будзе агульным для абодвух народаў»[37]. Літвіны не разгледзелі небяспекі, не разумелі, што падпісваюць прысуд сваёй краіне.

Для канчатковага пацверджання актаў новай уніі Аляксандр і паны-рада склікалі ў ліпені сойм усіх земляў Вялікага княства. Большасць дэлегатаў разумелі маскоўскую і крымскую небяспеку і бачылі ў саюзе з Польшчай, калі не выйсце з нялёгкага становішча, але магчымасць аблегчыць яго. Таму сойм прайшоў без кіпення страсцей варожых палітычных груповак, і Аляксандр атрымаў патрэбную яму згоду на пацверджанне заключанай уніі.

У Маскве пільна сачылі за падзеямі на Літве. Унія Вялікага княства з Польскім каралеўствам, саюзныя адносіны літвінскай дзяржавы з Чэхіяй ды Угорыяй, з Вялікай Ардой пужалі Івана Васільевіча. У вайне з Літвой ён спадзяваўся на дапамогу Крымскага ханства. Турэцкая пагроза Польшчы і Угорыі надавала маскоўскаму ўладару надзею, што гэтыя дзяржавы не змогуць дзейсна дапамагаць Аляксандру. Тым больш за спінай Польшчы заставалася варожая імперыя Габсбургаў. За свой тыл Іван Васільевіч быў спакойны, пасаджаны ім на Казанскае ханства Абдул-Латыф паслухмяна падначальваўся яго волі. І на паўночных межах для Масквы ўсё складвалася спрыяльна. Саюзнік — дацкі кароль Іаан заняў шведскі пасад і тым самым выключалася магчымасць выступлення Швецыі на баку Лівонскага ордэна. Баючыся, што Аляксандр заключыць дамову з Менглі-Гірэем, Іван III выклікаўся быць пасрэднікам у іх перамовах і павёў іх так, каб крымскі хан пачаў патрабаваць ад Вялікага княства даніны з Кіева, Канева, Чаркас, Пуціўля і іншых украінскіх гарадоў. У лісце да Івана Менглі-Гірэй ужо дзяліў украінскія землі і аддаваў Маскве Кіеў і Чаркасы. Даведаўшыся пра патрабаванні хана, Аляксандр з абурэннем адзначыў: «Цар Менглі-Гірэй у нас хоча таго, чаго продкі яго цары і бацька яго ў нашых продкаў, вялікіх князёў літоўскіх, і бацькі нашага, караля яго міласці, ніколі не хацелі а не ўспаміналі»[38]. Аднак, разумеючы нялёгкае становішча сваёй дзяржавы, Аляксандр марудзіў з канчатковым адказам Менглі-Гірэю. Слушна было б абяцаннямі ўступак стрымаць Крым ад вайны. А маскоўскія паслы штурхалі Менглі-Гірэя да паходу на Вялікае княства. Умела выкарыстоўваў Іван Васільевіч і незадаволенасць праваслаўнага насельніцтва царкоўнай палітыкай Аляксандра.

Знаходзячыся пад ціскам рымскай курыі, якая патрабавала хутчэйшага ажыццяўлення царкоўнай уніі, Аляксандр міжволі павінен быў нешта рабіць у гэтым напрамку. Але ж разумеў, што час для уніі не той — незадавальненне праваслаўных скарыстае маскоўскі гасудар, які тут жа абвясціць сябе «абаронцам» праваслаўя і павядзе свае войскі на Літву. Хаця існаваў указ Казіміра, які забараняў будаваць новыя цэрквы ў дзяржаве, Аляксандр скрозь пальцы глядзеў на яго выкананне і праваслаўныя феадалы ў сваіх землях будавалі цэрквы, засноўвалі манастыры. Сам вялікі князь, каб патрафіць праваслаўным іерархам, узяў некалькі цэркваў і манастыроў на велікакняжацкае наданне. Грунтоўны ў сваіх учынках і здзяйсненнях Аляксандр не спяшаўся апярэджваць падзеі. Ідэя уніі павінна была авалодваць розумам і феадалаў, і простага люду, і праваслаўных святароў. Ён шукае сярод праваслаўных іерархаў тых, хто мог згадзіцца на унію. Гэтак Аляксандр шчодра надзяляе землямі смаленскага ўладыку Іосіфа Балгарынавіча, якому адводзіў ролю галоўнага выканаўца сваёй задумы. Адначасова канцлер вялікай княгіні Іван Сапега не аднойчы заводзіў з Аленаю размову пра пераход у унію. Але Алена была цвёрдая ў сваім выбары.

У 1497 годзе па дарозе ў Кіеў загінуў ад татараў літвінскі мітрапаліт Макарый. На яго месца ў 1498 годзе Аляксандру ўдалося правесці свайго стаўленіка Іосіфа Балгарынавіча. Той з запалам узяўся за прапаганду уніі. Пад'ячы Алены, Хведка Шастакоў, потайкі перадаў у Маскву ліст, у якім пісаў: «У нас адбываецца замятня вялікая паміж латынню і нашым хрысціянствам: д'ябал усяліўся ў смаленскага біскупа і ў Івана Сапегу. Вялікі князь вялікую княгіню ў латынскую веру... усё хрысціянства наша хочуць схіліць. І гасударыню нашу Бог навучыў, ды ўспомніла навуку гасудара бацькі свайго. І гасударыня вялікая княгіня адказала так: »Я, гасудар, без волі гаспадара бацькі не магу тое ўчыніць«[39].

Івану Васільевічу выдавалася магчымасць абвінаваціць Аляксандра ў парушэнні дамовы, а калі так, дык разарваць з ім мір і пачаць вайну пад ідэйным прыкрыццём — абароны праваслаўных. Аляксандр прадбачыў такі ход падзей і, каб заспакоіць праваслаўных, выдаў прывілей кліру, дзе гарантаваў не ўмяшанне свецкай улады ў справы мітрапаліта і біскупаў, недатыкальнасць мітрапалітавых уладанняў, забарону здымаць каталікамі праваслаўных святароў, адказнасць каталікаў за знявагу праваслаўных святароў перад мітрапалітам. Дае дазвол будаваць новыя і аднаўляць старыя цэрквы. Мітрапаліт Іосіф урачыста асвячае пабудаваны Аляксандрам Хадкевічам Супаральскі манастыр, пра што пазней вялікі князь паведамляе Канстанцінопальскаму патрыярху, жадаючы ўлагодзіць главу праваслаўна-

га свету. Як ніколі, Аляксандр шчодры быў на міласці да праваслаўных, асабліва да князёў, вотчыны якіх межавалі з Масковіяй. Князі Мажайскія атрымалі Чарнігаў, Гомель і Стародуб. Уладарамі новых земляў сталі князі Глінскія і Масальскія. Полацк і Менск былі надзелены магдэбургскім правам. І разам з тым Аляксандр робіць захады для прыняцця царкоўнай уніі.

У Рым прыехаў з граматай ад мітрапаліта Іван Сапега (у той час ягоная старая маці ў Полацку прыняла манашаства ў праваслаўным манастыры). У ёй Іосіф прызнаваў адзін з дагматаў (з-за якога паміж абедзвюма царквамі не сціхалі спрэчкі), што Святы Дых сыходзіць і ад Сына Божага. Ім прызнавалася старшынства папы і, самае галоўнае, ён прасіў прыняць у рымскае ўлонне праваслаўную царкву Вялікага княства. Папа адказаў Аляксандру амаль праз год, нагадаўшы, што праваслаўныя не аднойчы згаджаліся на унію, але яна разам з тым так і не ажыццявілася, і патрабаваў ад яго настаяць на пераходзе Алены Іванаўны ў каталіцтва і калі яна не згадзіцца — разарваць з ёю шлюб. Папа толькі даваў указанні, але ні чым не дапамог. Аляксандр спадзяваўся, што царкоўная дзесяціна указам папскай булы пойдзе ў дзяржаўную скарбніцу на вайну з «схізматыкамі». Пралічыўся. Таму вялікі князь так і «не выратаваў сваёй душы», жыў з «схізматкай», якая ўпарта не хацела выракціся праваслаўя. Тут жа пасланцы маскоўскага ўладара пачалі схіляць праваслаўных князёў, вотчыны якіх межавалі з Масковіяй, падацца на службу да Івана Васільевіча. Першым ад'ехаў князь Сымон Бельскі, за ім падаліся ў Маскву князі Масальскія, князь Хацеўскі. Літвінскім паслам Станіславу Кішку і Хведару Грыгор'еву Іван III заявіў, што брат яго і зяць не правіць па дамове, прымушае праваслаўных у «Рымскую веру» і дзеля гэтых прымусаў ён прыняў князёў і іншых ў сваё падданства[40]. Князі ўцекачы, баючыся выдачы Аляксандру, падбухторвалі Івана III на вайну. А тут яшчэ літвінскія паслы паказалі копію яго ліста да крымскага хана з абяцаннем быць з ім заадно супраць «Літоўскага князя». Аляксандр са скрухай дакараў Івана: «Брат і цесць! Успомні душу і Веру»[41]. Тайнае стала яўным і чаго было прытварацца і апраўдвацца? Іван вырашыў пачаць вайну.

Іван Васільевіч паслаў у Вільню разметную грамату: «Вялікі князь Аляксандр па даканчанню не правіць: вялікую княгіню Алену, князей і паноў рускіх да Рымскага закону нудзіць, таму Вялікі князь Іван Васільевіч здымае з сябе хроснае цалаванне, і за хрысціянства хоча стаць, колькі Бог яму дапаможа»[42]. Гэта было абвяшчэнне вайны. Яшчэ не даехалі паслы да Вільні, а маскоўскія войскі пад зверхнасцю казанскага царэвіча Махмет Аміня перайшлі межы Вялікага княства Літоўскага і Рускага. Адна частка войск рухалася на Чарнігаў і Стародуб, дру-

гая — на Дарагабуж і Смаленск, трэцяя — на Тарпец. Асабліва адчувальным была страта Бранска, жыхары якога перайшлі на маскоўскі бок. Бранскі намеснік Станіслаў Барташэвіч трапіў у палон. Тут жа падкупленыя Іванам Васільевічам князі Сымон Мажайскі і Васіль Шамячыч (нашчадкі князёў, якія ўцяклі з Масквы ў сярэдзіне шасцідзесятых гадоў і атрымалі ад Казіміра вотчыны) прыехалі да маскоўскага ваяводы Юрыя Захарыніча і прысягнулі служыць Маскве з усімі сваімі вотчынамі: Чарнігавам, Старадубам, Гомелем, Ноўгарадам-Северскім, Рыльскам. Навіна гэтая нарабіла перапуду сярод паноў-рады. Сам вялікі князь ужо не дзівіўся нягодніцтву цесця — дзейнічаў ён як заўсёды — пусціў вайну і агонь у яго зямлю, а пасля прыслаў разметную грамату. Дзейнічаў, як хіжы злодзей. З такім сваяком толькі зброяй можна было размаўляць. Аляксандр выслаў трохтысячны атрад шляхты пад начальствам гетмана Канстанціна Астрожскага на ахову дзяржаўных межаў. Сам жа прыехаў у Менск, каб сабраць з літвінскай шляхты новае войска і дачакацца прыходу наёмных польскіх і мараўскіх атрадаў. Канстанцін Астрожскі, даведаўшыся, што ваявода Юрый Захарыніч з невялікім атрадам стаіць каля Дарагабужа на рацэ Ведрашы, вырашыў напасці на яго. Да гетманскіх вояў далучыліся і смаляне на чале са сваім намеснікам Станіславам Кішкам. 14 ліпеня атрад Астрожскага быў разбіты маскоўскай раццю. А сам ён трапіў у палон. Разам з ім маскавіты захапілі і другіх знатных вяльмож: дворнага маршалка Рыгора Осціка, маршалка Літавора Храбтовіча, Мікалая Глябовіча, Мікалая Зеноўевіча, Хведара Няміру, Багдана Масковіча, князёў Друцкіх. Але і маскавіты панеслі сур'ёзныя страты, і ваяводы прасілі ў Івана III прыслаць папаўненне.

Аляксандр даведаўся пра паражэнне свайго перадавога атрада, калі стаяў з асноўным войскам каля Барысава на рацэ Бобр. Вялікі князь «вельмі засумаваў». Гэтая навіна прыгнятальна падзейнічала і на вояў. Найміты, якія знаходзіліся ў войску, патрабавалі платы за службу. Вось тут, пэўна, і наракаў вялікі князь на бацьку, які з-за сваіх палітычных інтарэсаў саступіў апазіцыі і адмяніў вайсковы падатак. Не такая ж і багатая была дзяржаўная скарбніца. Важар наймітаў кінуў свой шолам пад ногі вялікаму князю і вярнуўся са сваімі людзьмі ў Вільню. Пасля гэтага выпадку Аляксандр ужо не рызыкаваў шукаць перамогу над маскавітамі на полі сечы. Доўгі час прастаяў ён з войскам у Абольцах, але так і не выступіў. Аляксандр спадзяваўся болей на дыпламатыю, чым на зброю, а таксама на дапамогу Вялікай Арды. Каб заахвоціць Шых-Ахмета выступіць супраць Крымскага ханства і Масковіі, ён выплаціў яму 30 000 залатых. Давялося аддаваць пад залог панам свае велікакня-

жацкія выменні. А што паны? А яны не жадалі раскашэльвацца. У гэты час і стаў варагаваць Аляксандр са сваёй радай. І наблізіў да сябе дзейснага і самалюбівага князя Міхайлу Глінскага, які таксама марыў аслабіць улады паноў-рады.

СЛОВА Ў АПРАЎДАННЕ АЛЯКСАНДРА

Не ўсё ўдавалася, не ўсё прыносіла свае вынікі, але дакараць Аляксандра ў бяздзейнасці, у няздольнасці кіраваць дзяржавай не выпадае. Цяжка пазбегнуць няўдач. І Вітаўт, і Гедымін, і Альгерд спазналі іх, але за доўгае сваё праўленне змаглі яны дамагчыся і перамог. А вось Аляксандру жыццё не адпусціла шмат гадоў, час яго перамог так і не надышоў. А таму і сучаснікі ягоныя, ды і наступнікі, толькі абвінавачвалі Аляксандра, як, напрыклад, польскі храніст Мацей Мяхоўскі: «У войнах ён быў пазбаўлены шчасця, ніколі не выграваў. У панаванне ягонае адбываліся вялікія напады, разбурэнні, захопы людзей, жывёлы і маёмасці. Ворагі заўсёды, калі хацелі, свабодна прыходзілі і ўходзілі без ніякіх стратаў»[43]. Так, войны з Масковіяй склаліся для Вялікага княства няўдала. Але ж хіба не заганная палітыка Казіміра дала магчымасць умацавацца Масковіі, а ягоныя прывілеі феадалам аслабілі ўладу вялікага князя, хіба не адмена «срэбшчыны» абядніла дзяржаўную скарбонку, а вось Аляксандру расхлёбваць... І хіба так беспакарана адчуваў сябе вораг на землях Літвы? Улічым тактыку крымскіх татар: пазбягаць сеч, парабаваць сёлы і хуценька ўбірацца прэч. і тым не менш татары часта цярпелі паражэнні, як, напрыклад, у 1497 годзе, калі Канстанцін Астрожскі разбіў загон Махмет-Гірэя, ці нагадаем перамогі Сымона Слуцкага. Толькі ў сечы каля Грычанскага балота паплаціліся галовамі тры тысячы татар. А непрыступны Слуцк татары так і не заваявалі, а пад Клецкам сабранае смяротна хворым Аляксандрам літвінскае войска разбіла трыццацітысячнае крымскае войска. Значыць, не так сябе беспакарана адчуваў вораг на Літве. Ды і ў паражэнні на Ведрышы нельга дакараць Аляксандра. Трэба ўлічваць, з якімі сіламі выйшаў Астрожскі супраць саракатысячнай маскоўскай раці — у яго было толькі каля чатырох тысяч. Тут не пра паражэнне, не пра ганьбу варта казаць, а пра гераізм літвінскіх вояў, якія нанеслі адчувальныя страты ворагу і сарвалі на пэўны час паход на Смаленск. Так што дарэмна дакараў Мяхоўскі Аляксандра ва ўсіх бедах і няшчасцях, што спасціглі Вялікае княства.

І неяк забываюцца пра рупнасць Аляксандра ў дзяржаўным будаўніцтве. Ён даваў гарадам магдэбургскае права, а любімую Вільню «з дня на дзень штораз лепш у размаітых



Ф.Смуглевіч. Брама Субач у Вільні. *Канец XVIII ст.*

мастацтвах памнажаў»[44], — як прызнавалі сучаснікі. Пры ім Вільня запрыгажэла. Ён абнёс яе сцяной. З яго клопату будаваўся славуты касцёл св. Ганны.

Удзячным Аляксандру павінен быць і сённяшні Мінск — сталіца Беларусі. Гэта ж з яго клопату горад набыў магдэбургскае права. «Иж маючы взгляд посполитого доброго розмноженья и хотечи положенье места нашого Менского в мере лепшой поставити, абы люди наши, там мешкаючыи, через врад добрый а справедливый были размножены, тое место нашо Менск справа Литовского и Руского... у право Немецкое, которое зоветься Майтборское, переменяем»[45]. У кожным слове гучыць паэтычны дух таго часу, непаўторны каларыт мовы тагачасных літвінаў.

Вось так, па волі Аляксандра, «через врад добрый а справедливый были размножены» месцічы Менска. З маленькага правінцыяльнага гарадка Менск неўзабаве стане ваяводскім і адным са значных гарадоў у дзяржаве. А нашчадкі менчукоў у сталічным горадзе-герою Мінску ці ўспомнілі ўдзячным словам дабрадзея сваіх продкаў? Не... Гэта зусім не няўдзячнасць. Гэта бяспамяцтва. Нашчадкі не вартыя годнасці і славы сваіх продкаў. Сумная гісторыя, несправядлівая. І слова ў апраўданне Аляксандра — слова ў яго гонар!



Ф.Смуглевіч. Вострая брама ў Вільні. *Канец XVIII ст.*



Ф.Смуглевіч. Гродзкая брама ў Вільні. *Канец XVIII ст.*

ПРАЦЯГ ВАЙНЫ З МАСКОВІЯЙ

«Памінкі», пасланыя Шых-Ахмету з пасольствам Міхайла Халецкага, лепш за ўгаворы падзейнічалі на хана, — ён засабіраўся ў паход. Аляксандр нецярпліва прыспешваў свайго саюзніка напасці на землі маскоўскага ўладара: «І з якога боку мог бы ты ісці на яго зямлю, а з якога мы; і з Божаю дапамогаю, тады справу сваю давядзеш, па волі сваёй, як сам таго захочаш, а халопа свайго сказніш»[46]. Аднак за спінаю Шых-Ахмета Аляксандр прапаноўвае Менглі-Гірэю жыць у міры, абяцаў плаціць даніну па тры грошы з чалавека з Кіеўскай, Валынскай і Падольскай зямлі і падбухторваў хана супраць Івана Васільевіча: «А хто перад тым тваім продкам халопам табе пісаў, той ныне цябе ўжо братам называе... кожны халоп, калі перавагу возьме над сваім гаспадаром, не можа ніколі яму дабра мысліці, таму ўсё злое хоча яму ўчыніці, каб зноў у рукі да свайго гаспадара не трапіў у тое халопства»[47].

Аднак Менглі-Гірэй не разарваў саюзу з Масквою. Восенню ён паслаў пятнаццацітысячны атрад у набег на паўднёвыя землі Вялікага княства і Польшчы. Як смерч пранеслася татарская конніца па Падоллі, Валыні і Галіцыі. Асобныя татарскія загоны даходзілі да Любліна. Спалілі татары і прадмесці Бярэсця. Месцічы толькі водкупамі і выратавалі свой горад ад штурму.

Не ўдалося Аляксандру перацягнуць на свой бок і малдаўскага гаспадара Стафана, хаця той, даведаўшыся пра лёс свайго ўнука і дачкі, здавалася, гатоў быў падтрымаць вялікага князя літоўскага. Аднак не варагуючы з Літвой, Стафан адначасова і не ўступаў у вайну з Масковіяй, толькі затрымаў маскоўскае пасольства, якое вярталася з Італіі і везла з сабою шмат італьянскіх майстроў. Куды лепшых вынікаў дамагласа Аляксандрава дыпламатыя ў перамовах з Лівонскім ордэнам. З сакавіка 1501 года ў Вільні Аляксандр заключыў саюзную дамову з магістрам Лівонскага ордэна Вальтарам фон Плетэнбергам, Рыгай, лівонскімі прэлатамі. Лівонія абяцала пачаць вайсковыя дзеі супраць Масковіі.

А вайна працягвалася. Восенню 1500 года маскоўскія раці рушылі на Смаленск. Іван Васільевіч прапаноўваў Менглі-Гірэю адначасова выступіць у кірунку Слуцк—Тураў—Пінск—Менск. Такім чынам Вялікае княства апынулася б пад двайным ударам.

Перамога пад Смаленскам адкрывала б маскавітам шлях на Літву. Гэта быў рашучы момант першага перыяду вайны. Маскавіты, акружыўшы горад, дзень і ноч абстрэльвалі яго з гармат, некалькі разоў хадзілі на штурм, але «несучы страты, і губляючы сваіх людзей, з жалобаю і са слязьмі цярпелі з вялікімі насмешкамі паражэнні пад горадам і з ганьбаю, і з сорамам ад



Іосіф Солтан. *XVI ст.*

горада былі адбіты»[48]. На дапамогу абаронцам, якіх узначальваў смаленскі епіскап Іосіф Солтан, Аляксандр паслаў войска пад зверхнасцю жамойцкага старасты Станіслава Кезгайлавіча.

Як толькі князь Дзмітрый Жылка, які кіраваў аблогай горада, даведаўся пра тое, што літвінскае войска пераправілася цераз Дняпро, дык адразу загадаў адступаць. Смаленск выстаяў — гэта быў крах спадзяванняў Івана Васільевіча на хуткую і лёгкую перамогу над Вялікім княствам Літоўскім і Рускім. Аднак ён і не думаў адмаўляцца ад сваіх захопніцкіх планаў. Паслам польскага караля Яна Альбрэхта і ўгорскага караля Уладзіслава, якія прапаноўвалі Івану Васільевічу прымірыцца з Аляксандрам і пагражалі ў выпадку адмовы вайною, маскоўскі ўладар прама заявіў: «Пагроз вашых не баюся, дапамагайце неправай справе, я спадзяюся на Бога і сваю справядлівасць і Бог мне дапаможа»[49].

У першай палове 1501 года ў княстве з'явілася магчымасць пераламаць ход вайны на сваю карысць. Амаль да лета Іван Васільевіч, чакаючы абяцаных Аляксандрам «вялікіх паслоў» і спадзеючыся, што дзеля міру літвінскі ўладар прызнае за Масковіяй захопленыя ёю землі, не вёў актыўных вайсковых дзеяў. Аляксандр не спяшаўся слаць «вялікіх паслоў» у Маскву — гэтым тактычным ходам ён выйграў патрэбны час і дачакаўся ўступлення ў вайну саюзніка Лівоніі.

Цяпер ужо Масковія апынулася пад двайным ударам — з поўначы лівонцы, а з захаду літвіны. Крымскі хан не мог нічым дапамагчы Масковіі. Калі Менглі-Гірэй ужо збіраўся ў набег на Вялікае княства, — атрымаў вестку, што Шых-Ахмет вядзе дваццацітысячнае войска на Дон, таму хан вымушаны быў выступіць яму насустрач. Няўпэўнены ў сваёй перамозе, Менглі-Гірэй маліў Івана Васільевіча даць яму 10 тысяч вояў. Маскоўскі ўладар адклікнуўся на просьбу і паслаў супраць Шых-Ахмета казанскага хана Мухамед-Эміна і полк з Разанскай зямлі. Між тым Менглі-Гірэй, так і не дачакаўшыся маскоўскай дапамогі, адступіў ад рэчкі Ціхай Сасны, на другім беразе якой стаяў ягоны вораг. Шых-Ахмет атрымаў прастору і павёў сваё войска пад Рыльск. І так вайсковыя дзеі на ўсходзе і поўдні для Вялікага княства складваліся ўдала. Асцярожнічалі лівонцы — буйныя маскоўскія атрады сцераглі мяжу. Вальтэр фон Плетэнберг чакаў падыходу літвінскага войска пад зверхнасцю Чарняка, каб разам ісці на Пскоў. А галоўны ўдар на Масковію нанесла б Вялікае княства. Каб усё так выйшла, дык цяжка казаць, як развіваліся б далейшыя падзеі. Але смерць 7 чэрвеня Яна Альбрэхта пераблытала задумы Аляксандра. Для ўраду Вялікага княства, які ведаў зацікаўленасць палякаў у уніі, надавалася магчымасць прапанаваць у польскія каралі Аляксандра, каб ён, стаўшы каралём, мог выкарыстаць і польскую дапамогу ў вайне з Масковіяй.

Аляксандр спісаўся з братам Фрыдрыхам, архібіскупам Гнезненскім, і прасіў у яго падтрымкі ў барацьбе за карону. Фрыдрых адказаў: «Чытаў твой ліст маці. Мы абодва ўпэўнены, што ты будзеш дамагацца польскай кароны прыстойным сродкам, а не сілай ды зброяй, як пра тое ходзяць пагалоскі»[50]. У адказным лісце Аляксандр апраўдваўся і прасіў брата быць пасрэднікам паміж ім і маці. «Хай пажадае ваша светласць супакоіць яе Высокасць, упэўніваючы яе ад нашага імя, што мы, згодна нашаму звычаю, жадаем паступаць паводле волі яе Вялікасці разам з жонкай нашай, якая падначальваецца яе каралеўскай Вялікасці і жадае, як апошняя раба, служыць яе Вялікасці і ўсё, што ні згадае яе Вялікасць, усё выканае яна з поўнай радасцю і пакорлівасцю»[51].



Мініяцюра. Каранацыя Аляксандра. *Пачатак XVI ст.*

Ліст гэты Аляксандр напісаў са згоды Алены Іванаўны. Яна не толькі не перашкаджала свайму мужу дамагацца польскай кароны, а і выказала жаданне зрабіць усё, што залежыць ад яе, каб яго выбралі ў каралі. Падобная аднадушнасць супругаў ніяк не ўваходзіла ў разлікі Івана Васільевіча. Дачка выслабадзілася з-пад ягонай апекі. Мабыць, абяцанне Алены служыць з «поўнай радасцю і пакорлівасцю» падкупіла каралеву Альжбэту. Тое, што не ўдалося ні папу рымскаму, ні каталіцкім святарам, цяпер магла зрабіць яна — паўплываць на Алену, каб тая перамяніла веру. І праславіцца ў Еўропе. Каралева ўстрымала малодшага сына Жыгімонта ад прэтэнзій на карону. Слаў лісты Аляксандр і да польскіх вяльмож, прасіў іх дапамогі, абяцаў слухацца іх парад і быць ім удзячным.

У жніўні на гарадзенскім сойме літвінскія феадалы далі Аляксандру згоду выставіць сваю кандыдатуру на атрыманне

польскай кароны. Аляксандр перамог над сваімі канкурэнтамі братамі, угорскім каралём Уладзіславам і Жыгімонтам. І быў выбраны польскім каралём. Асабліва выступалі за яго брат Фрыдрых, архібіскуп Куяўскі Крэслава і канцлер Ян Ласкі, якія «піталі сябе карыслівымі надзеямі»[52] адцясніць ад улады шляхту, на якую ў свой час абапіраўся Ян Альбрэхт. Фрыдрых тым часам паспяшаў прадухіліць дамаганні на карону старэйшага брата ўгорскага караля Уладзіслава, паведаміўшы яму, што ён, хаця і быў на яго баку, але Польшча жадае самастойнага ад Угорыі гасудара і цеснага саюза з Вялікім княствам. Тут жа на Петркоўскім сойме палякі прапанавалі паслам Аляксандра Войцэху Табару, Яну Забярэзінскаму і Мікалаю Мікалаевічу Радзівілу свае акты уніі. Польшча і Вялікае княства аб'ядноўваліся ў адну дзяржаву пад зверхнасцю агульнага ўладара, якога павінны выбіраць на сойме. Абедзве дзяржавы будуць мець адну манету, але асобныя суды і пасады. Ранейшыя дамовы, заключаныя адной дзяржавай, цяпер станавіліся абавязковымі і для другой. Новавыбраны ўладар абавязаны быў пацвердзіць прывілеі абедзвюх дзяржаў.

Раптам на сойм даляцела трывожная вестка, што Аляксандр ідзе з войскам адстойваць сваё дзедзічнае права на польскі пасад. Выдавала, як раз на тое, бо Аляксандр і сапраўды на чале 1400 вершнікаў набліжаўся да межаў Польшчы. Толькі ліст каралевы-маці, у якім яна адгаворвала сына ад яго намеру, спыніў Аляксандра ў Бярэсці. Тут ён нецярпліва чакаў вестак з сойма. Разам з яго пасламі прыехалі і прадстаўнікі польскага панства. Толькі паведамілі Аляксандру, што ён абвешчаны польскім каралём, як паны патрабавалі ад яго падпісаць новыя прывілеі, якія абмяжоўвалі б каралеўскую ўладу. І не адмовішся, бо пакуль яшчэ не каранаваны. Няволяй даводзілася ісці на ўступкі, і Аляксандр падпісаў прывілей, па якому дзяржаўная ўлада ў Польшчы пераходзіла да сенатарскай рады, дзе кароль займаў месца старшыні. Прычым адказвалі сенатары толькі перад сенатарскім судом, што давала ім магчымасць не падначаліцца каралю. Аляксандр, відаць, мала думаў пра наступствы гэтага прывілея — галоўнае хутчэй каранавацца. Гэтая спешка не дазволіла Аляксандру склікаць сойм, каб абмеркаваць польскія ўмовы уніі. Таму, без згоды сойма, Аляксандр 23 кастрычніка ў Мельніку пацвердзіў прысягаю новазаключаную унію і абяцаў палякам прывесці да прысягі і астатніх феадалаў княства. Разам з дворным маршалкам Міхайлам Глінскім, Юрыем Радзівілам у суправаджэнні 1400 коннікаў 20 лістапада ён прыехаў у Кракаў, дзе праз пяць дзён прысягнуў на захоўванне ранейшых прывілеяў. Першы бой з сенатарамі будучы польскі кароль прайграў. Як не настойваў ён на тым, каб каралеўскай каронай вянчалася і

ягоная жонка Алена, тыя не згаджаліся, каб «схізматка» стала польскай каралевай. І яго аднаго 12 студзеня каранаваў ягоны брат Фрыдрых. Алена нават не прыехала ў Кракаў. Як бы там не радаваўся Аляксандр каралеўскай кароне, але абраза, нанесеная яму сенатарамі, азмрочыла гэтую радасць.

Алена прыехала ў Кракаў у пачатку лютага, калі ўрачыстасці, прысвечаныя каранацыі яе мужа, скончыліся. У праваслаўнай царкве, пабудаванай Софіяй Гальшанскай, яна прысутнічала на набажэнстве. Гэта быў свайго роду выклік каталіцкаму кліру. На кракаўскім саборным капітуле каталіцкія святары адкрыта абураліся Аляксандрам і заявілі, што ён прыняў безразважлівае рашэнне, уступіўшы ў шлюб з маскоўскай княгіняй: іх кароль кепскі хрысціянін і сваёй прысутнасцю ён ганьбіць Бога. Аляксандр, даведаўшыся пра падобную дзёрскасць святароў, адпісаў Фрыдрыху: «У справе шлюбу мы дзейнічалі толькі са згоды папы і з удзелам кардынала Фрыдрыха. Як там ні было, капітулу не падабае ў гэта ўблытвацца, гэта спакуса і дрэнны прыклад для малодшых»[53].

Аляксандр прызнаўся, што цярпець свавольства не стане і ён не жадае быць марыянеткай ні ў руках каталіцкага святарства, ні магнатаў, ні шляхты.

СТРАЧАНАЯ ПЕРАМОГА

Алена, можа, і не адправілася б ў Кракаў, але, ведаючы намеры свайго бацькі працягваць вайну, паспяшыла ў Польшчу, каб вярнуць Аляксандра ў Вялікае княства. Аднак з Кракава Аляксандр разам з жонкай выправіўся ў падарожжа па Польшчы для прыняцця прысягі і агітацыі палякаў дапамагчы Вялікаму княству.

Між тым паны-рада ў адсутнасць вялікага князя не прымалі рашучых захадаў для вайны з Масковіяй. І быў упушчаны спрыяльны момант, калі супраць Масквы адначасова выступілі Лівонія і Вялікая Арда. Лівонскі магістр, так і не дачакаўшыся літвінскага войска, на сваю рызыку ў жніўні рушыў на Пскоўшчыну. У першай жа бітве на рацэ Серацы лівонцы разбілі буйны маскоўскі атрад. Храніст Русаў нават прыводзіць лічбу сорак тысяч забітых маскавітаў. Вось тут бы літвінам дапамагчы лівонцам. Немцы паспрабавалі развіць поспех і штурмавалі Ізборск, але былі адкінуты ад горада. Не ўдалося ім і перапраўціцца на другі бераг ракі Вялікай, пскавічы абаранілі броды. Паход на Пскоў быў сарваны. Русаў тлумачыць гэтае адступленне цяжкай хваробаю сярод лівонскіх вояў «цёку крыві». Літвінскі даводца Чарняк, які вёў свой атрад на злучэнне з лівонцамі,

даведаўшыся пра ўход саюзнікаў, таксама павярнуў назад. Затое Іван Васільевіч свой шанц не ўпусціў, скарыстаўшыся тым, што галоўныя сілы Вялікага княства стаялі без дзеяння, ён адправіў раць з ваяводамі Данілай Шчэняй і князем Аляксандрам Абаленскім ваяваць Лівонію. 24 лістапада рыцарскае войска каля Юр'ева (Дэрпта) сустрэла маскоўскую раць. У жорсткай сечы абодва бакі панеслі цяжкія страты. Але колькасная перавага заставалася за маскавітамі, і яны рынуліся на безабаронную Лівонію. Паводле Русава, пасля маскавіцкага паходу загінула або трапіла ў палон 40 тысяч чалавек[54]. Пасля такога сакрушальнага ўдару Вальтар фон Плетэнберг спыніў вайсковыя дзеі супраць Масквы. Так з вайны быў выведзены адзін з саюзнікаў Літвы. Няўдача чакала і Вялікую Арду. Шых-Ахмет верны саюзніцкай дамове ў кастрычніку заняў Ноўгарад-Северскі. А каля Мсціслаўля сабралася буйная літвінская раць вояў. Ад Мсціслаўля да Рыльска, дзе знаходзіўся хан Вялікай Арды, было 300 км. Для татарскай конніцы пераадолець гэтую адлегласць не складала цяжкасці. Для ўзгаднення сумесных дзеяў Шых-Ахмет адправіў пасольства да Аляксандра. Паслы не засталі яго ў Вільні, той ужо адправіўся ў Полыпчу. Шых-Ахмет чакаў Аляксандравай весткі: па-ранейшаму стаяў у Северскай зямлі.

Гэтай раз'яднанасцю саюзнікаў і скарыстаўся Іван III. Выдавалася магчымасць расправіцца са сваімі ворагамі па асобку. Пасланая Іванам да Старадуба і Рыльска раць напужала Шых-Ахмета і ён пакінуў Северскую зямлю. Ад Старадуба маскавіты фарсіраваным маршам рушылі да Мсціслаўля. З'яўленне маскоўскага войска, відаць, было нечаканасцю для літвінскіх ваявод князя Міхайла Мсціслаўскага і крычаўскага намесніка Астапа Дашковіча, бо яны як след не падрыхтавалі сваіх вояў для бітвы, 4 лістапада пад сценамі горада разыгралася жорсткая сеча. Маскоўскія летапісы перамогу прыпісваюць маскавітам. Паводле Васкрэсінскага летапісу, літвіны страцілі сем тысяч чалавек. Калі і перамаглі маскавіты, дык гэта была Пірава перамога. Правадыры маскавіцкай раці Сымон Мажайскі і Васіль Шамячыч так і не адважыліся на штурм Мсціслаўля і адышлі ад горада. Сумесны паход войскаў Літвы і Вялікай Арды сарваўся, але і планы Івана III таксама не здзейсніліся. Задуманы маскоўскім уладаром шырокі наступ на Смаленск з адначасовым набегам крымскай конніцы ў кірунку Пінск—Слуцк—Менск застаўся невыкананым. Лівонія і Вялікая Арда сваімі дзеямі адцягнулі на сябе частку войск Масковіі і стрымалі ад выступу Крымскае ханства. А што ж Польшча? Аляксандр так і не дамогся дапамогі. Польская шляхта адмовілася ад вайсковых падаткаў і не адгукнулася на каралеўскі заклік аб паспалітым рушэнні. І на былых саюзні-



Пячаткі Аляксандра Казіміравіча

каў было мала надзей. Лівонія ўжо не ўяўляла для Масковіі сур'ёзнай пагрозы. А Шых-Ахмет, што спыніўся на зіму каля Белгарада, абмяняўся з Іванам Васільевічам пасламі і мог перайсці на ягоны бок. Іван Васільевіч быў зацікаўлены ў разгроме Вялікай Арды і патрабаваў ад Менглі-Гірэя выступіць на яе. Лёс і другога саюзніка Вялікага княства быў вырашаны. Арда Шых-Ахмета, пазбаўленая падтрымкі Літвы, стала лёгкай здабычай Крымскага ханства. Менглі-Гірэй, выпрасіўшы ў турак гарматы, выпаліў стэп, дзе качавала Вялікая Арда, і галодная зіма даканала яе. Каб неяк выратавацца, частка войска разам з жонкай Шых-Ахмета ўцяклі ў Крым. Сам Шых-Ахмет хацеў перайсці цераз Днепр і стаць каля Кіева, але кіеўскі намеснік князь Дзмітрый Пуцячыч-Друцкі, атрымаўшы Аляксандраў загад, не пускаў Арду за Днепр. Аляксандр баяўся, каб свавольныя ардынцы не разрабавалі Кіеўскую зямлю. Няма чаго

казаць пра недальнабачнасць Аляксандра. У маі 1502 года Менглі-Гірэй без асаблівай цяжкасці разбіў Вялікую Арду, пры чым на яго бок перайшлі многія ўлусы. Пераможаны Шых-Ахмет з трыста вершнікамі ўцёк на Волгу. Вось так бясслаўна закончылася існаванне некалі магутнай Залатой Арды — «улуса Джучыева». Цяпер Менглі-Гірэй мог не апасацца свайго даўняга ворага.

Чакаючы, пакуль Менглі-Гірэй падрыхтуе свае загоны для паходу на Літву, Іван Васільевіч не пачынаў вайсковых дзеяў. І толькі ў сярэдзіне ліпеня 1502 года маскоўскія раці, якіх вёў Іванаў сын Дзмітрый, падступілі да Смаленска. Аляксандр вярнуўся на Літву ў чэрвені. Яму ўсё ж удалося наняць атрад польскай шляхты, які ён і накіраваў пад Смаленск. Палякі, так і не дабраўшыся да горада, павярнулі назад, бо атрымалі вестку аб руху туркаў на Польшчу. Спадзявацца заставалася на свае сілы і моц смаленскіх сцен. А горад і сапраўды ўяўляў сабою непрыступную цвержу: «град же, имел твердость, стремнинами гор и холмов высоких затворено и стенами великими укреплено»[55]. Калі меркаваць па лісту Аляксандра да лівонскага магістра, што вялікая колькасць нябожчыкаў пад Смаленскімі сценамі з'яўляецца прычынай заразы, дык маскавіты панеслі адчувальныя страты[56]. Няўдачныя баі падзейнічалі і на дысцыпліну маскавіцкага войска. Без ведама Дзмітрыя Іванавіча многія ваяводы ад'язджалі рабаваць смаленскія воласці. Асобныя маскоўскія атрады рабавалі ваколіцы Полацка, Віцебска, спалілі пасад Мсціслаўля і даходзілі аж да Беразіны.

А ў жніўні ў паход выступілі крымскія татары. Сам Менглі-Гірэй называў лічбу ў 90 тысяч воінаў. І не трэба забывацца, што татарскае войска было конным, а значыць, імклівым і манеўраным. Вялі татараў сыны Менглі-Гірэя: Біціс-Гірэй і Бурнаш. Татары смерчам пранесліся па ўкраінскіх землях. Ваколіцы Луцка, Львова, Брацлава, Вішняўца, Белза ўяўлялі сабою пустэчу. Палалі ваколіцы Кіева. Біціс-Гірэй, выконваючы наказ свайго бацькі, пайшоў з шасцітысячным атрадам на Літву. Ён разбіў на рацэ Ушы за Оўручам невялічкі аб'яднаны атрад пінчукоў князя Хведара Іванавіча Яраславіча, дуброўчан князя Юрыя Іванавіча Дубравіцкага і дручан князя Рыгора Глінскага.

30 жніўня татары, пераправіўшыся цераз Прыпяць, імклівым маршам выйшлі да Слуцка. Князь Сымон Міхайлавіч Алелькавіч толькі падзівіўся такому нечаканаму з'яўленню ворага. На ягоных вачах татары хапалі ў палон случакоў. Каля Слуцка татары сталі кошам і ваявалі каля Клецка, Нясвіжа, Навагрудка ды Ішкальдзі, спалілі Клецк. «І учыніўшы хрысціянам неапісанае кровапраліцце, з вялікай колькасцю нявольнікаў і з дабычай» пайшлі назад[57].

Паход татар усё ж не дасягнуў сваёй галоўнай мэты — войска Вялікага княства не панесла вялікіх страт, што паспрыяла б маскавітам узяць Смаленск. Па-ранейшаму гэты горад стрымліваў асноўныя вайсковыя сілы Івана Васільевіча. Маскавіты абстрэльвалі горад з гармат, хадзілі на штурм. 16 верасня адбыўся апошні штурм, які абаронцы адбілі. Смаленск на гэты раз выстаяў.

Так і не авалодаўшы Смаленскам, Дзмітрый Іванавіч у лістападзе адступіў. Угневаны Іван Васільевіч загадаў біць кнутом вінаватых, некаторых з іх кінуў у вязніцу. Задуманы наступ на Вялікае княства ізноў праваліўся. За тры гады вайны Івану III удалося завалодаць толькі землямі, з якімі падаліся да яго князі-здраднікі. Вайсковая моц Вялікага княства Літоўскага заставалася незломленай, але яе не хапала, каб вярнуць назад захопленыя Масковіяй землі. Усё ж Аляксандр гатоў быў працягваць вайну за іх вяртанне. Яшчэ гулялі на Вялікім княстве татарскія загоны (адзін з іх каля Бабруйска разбіў «з своим рыцерством» князь Сымон Слуцкі, толькі ў палон трапіла болей за паўтары тысячы татараў), а Аляксандр паслаў да Менглі-Гірэя грамату: «Я, пачуўшы, што ты ўзяў Вялікую Арду, абрадаваўся. Ты не думай, што я прывёў Шых-Ахмета на цябе: ці можна гэта зрабіць? Я ж твой стары паплечнік і братам табе быў. Усё атрымалася так: я, каб быць у згодзе з Вялікім князем Іванам, яму сынам стаў, ды пасля рассварыліся, і я прывёў Шых-Ахмета Вялікага князя ваяваць, а Вялікі князь за гэта цябе і мяне недругам зрабіў. Ты цяпер на мяне раці не пасылай, я да цябе адпраўлю паслом Кіеўскага ваяводу Дзмітрыя Пуцячыча, чалавека знатнейшага, за якога ў мяне людзей мала: з гэтага часу тваім братам, царэвічам, дзецям і ўсім буду пастаянна памінкі пасылаць»[58]. Менглі-Гірэй асабліва не верыў Аляксандру і не пасквапіўся на багатыя дары — беспакаранае рабаўніцтва земляў Вялікага княства і Польшчы прыносіла куды больш багацця, чым «памінкі». І новыя татарскія загоны пусціліся ў набег на Польшчу. Напалоханыя палякі патрабавалі ад Аляксандра спыніць вайну і заключыць з Іванам Васільевічам мір. Нават адправілі ад імя кардынала Фрыдрыха ды іншых польскіх біскупаў ліст да Алены з просьбаю паўплываць на Аляксандра і выступіць пасрэднікам у перамовах з Масковіяй. Алена, якая ў гэты час знаходзілася разам з мужам у Менску, адпісала: «...пакорлівая мужу, нічога не магла зрабіць без ягонай волі, а раз вы мяне выклікалі, ахвотна вазьмуся за справу, толькі атрымаю на тое дазвол ад караля»[59]. Аляксандр яшчэ вагаўся, але калі малдаўскі гаспадар Стафан, скарыстаўшы момант, заняў Днястроўскія гарады Коламю, Галіч, Пакуцце, Сняцін, Чырвонае і Белае, — здаўся. Трэба было прасіць у

Івана міру. Пра сваё рашэнне Аляксандр паведаміў лівонскаму магістру і запрашаў і яго заключыць з Масковіяй мір. Вальтар фон Плетэнберг не ўцярпеў, каб не папікнуць Аляксандра за тое, што той не дапамог лівонцам, але ўсё ж згадзіўся спыніць вайну. Пасрэднікам у перамовах з Масковіяй па Аляксандравай просьбе стаў папа Аляксандр VI Борджыа, зацікаўлены ў далучэнні Івана III да антытурэцкай кааліцыі. У канцы 1502 года ў Маскву прыехаў венгр Сантай з папскай граматай. Папа заклікаў Івана Васільевіча замірыцца з Аляксандрам супраць ворагаў хрысціянства — туркаў. Іван Васільевіч адказаў паслу: «Мы з Божаю міласцю заўсёды стаялі і будзем стаяць наперад супраць паганых і просім Бога, каб хрысціянскія рукі былі высока над імі. А калі ў нас з зяцем вайна, дык не я прычынаю, а зяць і яго брат Уладзіслаў, яны павінны добра ведаць, як і сам папа павінен ведаць, што пад Літвою шмат нашай вотчыны знаходзіцца і нам трэба яе ўзяць...»[60].

У палітычныя разлікі Івана Васільевіча не ўваходзіла вайна супраць Турцыі, а таму ён і не даў дакладнага адказу наконт антытурэцкай кааліцыі, а вось замірыцца з Літвой і замацаваць за Масковіяй заваёваныя землі ён пагадзіўся. Выбару ў Аляксандра не было і не яму дыктаваць свае ўмовы. Адзінае, чаго ён жадаў, дык заключыць мір паводле старой дамовы 1494 года. З гэтай прапановай канцлер Алены Іван Сапега прывёз ад яе ліст да Івана Васільевіча. Алена дакарала бацьку за праліццё хрысціянскай крыві. «Па ўсяму свету паганства радуецца, хрысціянскія гасудары не могуць надзівіцца і цяжка скардзяцца: спакон вякоў, кажуць, не чуваць, каб бацька сваім дзецям беды чыніў. Калі, гасудар бацюшка, Бог табе не паклаў на сэрца мяне, дачку сваю, жалаваць, дык навошта мяне з зямлі сваёй выпусціў і за такога брата свайго выдаваў? Тады і людзі б з-за мяне не гінулі, і кроў хрысціянская не лілася. Лепш бы мне пад нагамі тваімі ў тваёй зямлі памерці, чым такую славу пра сябе чуць, усе адно толькі і кажуць: дзеля таго ён аддаў дачку сваю ў Літву, каб там зручней зямлю і людзей выглядзець...

...Змілуйся, вазьмі па-старому любоў і сяброўства з братам і зяцем сваім...»[61]. Іван не прыняў Аляксандравай умовы і цвёрда стаяў на сваім: «што мы з Божай дапамогай узялі, таго не аддадзім». А да мольбаў дачкі, дык і не прыслухаўся, а павучальна яе дакараў: «І ты дачка ў сваёй грамаце іншае не па справе да нас пісала, табе было і не прыгожа да нас пісаць»[62]. Раіў ёй трымацца праваслаўнай веры — вось і ўвесь бацькоўскі наказ.

Замест міру абодва бакі 31 жніўня 1503 года заключылі перамір'е на шэсць гадоў да 1509 года. Да Масковіі адыходзілі «на перамірныя гады» ўсе землі, якімі валодалі князі-ўцекачы Сымон Мажайскі, Васіль Шамячыч, Сымон Бельскі, Трубец-

кія і Масальскія, з гарадамі Чарнігаў, Старадуб, Гомель, Ноўгарад-Северскі, Рыльск, Любеч, Бранск, Трубчэўск, Радагошч, Почэп, Парчэў, Мцэнск, Масальск, Серпейск, Мезачэск, Любуцк і інш. Такім чынам у руках Івана Васільевіча апынуўся ўвесь верхні басейн Дзясны і басейн Угры, а гэта давала Масковіі вайскова-палітычныя перавагі для наступа на Кіеў, да якога ад маскоўскай мяжы — рукой падаць — якіх 45—50 км, а таксама для наступа на Смаленск, Віцебск і Полацк. Пры чым Смаленск апынуўся пад пагрозай двайнога ўдару і з усходу ад Дарагабужа — і з поўначы з земляў былога Бельскага княства. Такі вынік вайны ніяк не назавеш удачным для Вялікага княства. Упершыню Літва страціла і свае этнічныя землі: Смаленшчыну, Браншчыну, Гомельшчыну.

ДА АБСАЛЮТНАЙ ЎЛАДЫ

Аляксандр мог рабіць несуцяшальныя высновы. Адной з прычын паражэння ў вайне з Масковіяй была абмежаванасць яго каралеўскай і велікакняжацкай улады. Так і не дамогся ён ад панства вайсковага падатка «срэбшчыны» і войска, не атрымліваючы жалавання, адмаўлялася ісці на вайну, а многія з шляхты зусім не з'явіліся. І каб паменшыць сілу паноў і шляхты, Аляксандр узвышае гарады, надаючы ім магдэбургскае права: Бярэсцю (1494 г.), Луцку (1497 г.), Драгічыну (1498 г.), Полацку (1498 г.), Менску (1499 г.), Літавіжу (1501 г.), Высокаму (1503 г.), Уладзіміру і іншым.

Калі ж яго пачалі абвінавачваць у тым, што не можа арганізаваць абароны супраць татар, разгневаны Аляксандр нагадаў шматлікія парады паноў супраць склікання паспалітага рушэння і мовіў: «Тым, хто не раіў склікаць паспалітае рушэнне ў патрэбны час, няхай Бог адплоціць за тую злосную параду»[63]. І загадаў, каб на Русі ў кожнай вёсцы ўзброіць пяць чалавек, даць ім хоць вілы, мачугі абы яны маглі хутчэй памерці, як добрыя хрысціяне, чым быць гнанымі, як быдла, на загубу. Аляксандр больш верыў у мужнасць простага смерда, чым ганарлівага шляхціца.

У Польшчы сенатары ніяк не маглі навесці парадак у краіне, падаткі збіраліся з цяжкасцю, шляхецкае апалчэнне паказала сябе бездапаможным перад татарскімі набегамі, развялося процьма злодзейскіх шаек, якія рабавалі і беднага і багатага. Народ наракаў. Высвятляецца, даваць парады сенатары ўмелі, а вось кіраваць дзяржавай ім было не па сілах. Брат Фрыдрых, якога Аляксандр пакінуў замест сябе старшынёю сената, чалавек «розума невялікага» п'янстваваў і цешыўся забавамі. Пат-

рэбна была моцная ўлада, каб падначаліць сенат і велікакняжацкую раду, толькі тады можна было разлічваць на лепшае. У знешняй палітыцы неабходна было ў часы перамірных гадоў стварыць выгаднае становішча для супрацьстаяння Масковіі.

27 верасня Аляксандр у Вільні прывесіў сваю пячатку да перамірнай граматы і цалаваў крыж у выкананні ўмоў перамір'я. Але, адпускаючы маскоўскіх паслоў, загадаў ім перадаць маскоўскаму князю: «Што якія нашыя землі ўзяў сабе, і ён бы тыя нашыя землі аддаў; а якіх нашых людзей узяў, і ён бы тых людзей нашых адпусціў, каб у тым паміж нас братэрства і любоў не парушалася»[64]. Аляксандр адкрыта заяўляў, што ўмовы для заключэння перамір'я ён не прымае за ўмовы мірнага пагаднення, а значыць, непазбежна новая вайна з Масковіяй.

З Вільні Аляксандр выехаў у Польшчу, куды яго настойліва заклікалі сенатары. Брат Фрыдрых ужо быў у магіле. Ехаў кароль не проста навесці ў краіне парадак, а зрабіць усё магчымае, каб падначаліць сваёй уладзе сенат, прымусіць Польшчу выконваць свае саюзныя абавязкі да Вялікага княства. Велікакняжацкую ўладу ў княстве павінен быў ажыццяўляць яго ўлюбёнец Міхайла Глінскі і паны-рада.

Два гады правёў Аляксандр у Польшчы. Адразу ж дзейсна прыняўся кароль наводзіць парадак у каралеўстве. Бязлітасна расправіўся са злодзейскімі шайкамі. Некалькі паноў паплаціліся галовамі. Не пашкадаваў ён нават і жанчыну — іх судзельніцу — адправіў на шыбеніцу. Ганенні былі і на каталіцкіх святароў.

У 1504 годзе Аляксандр склікаў шляхецкіх паслоў на сойм у Петркоў. На гэтым сойме Аляксандр вызначыў абавязкі каралеўскіх чыноўнікаў, дамогся прыняцця закона, які забараняў вяльможам займаць адначасова дзве пасады. Аднак гэтыя перамогі набываў Аляксандр уступкай шляхце. Цяпер без згоды сойма кароль не мог закладваць каронныя выменні, што стварала Аляксандру сур'ёзную перашкоду на шляху да абсалютнага кіравання. Перашкаджалі для гэтага і мельніцкія прывілеі, а таму Аляксандр на наступным сойме ў 1505 годзе ў Радоме скасаваў іх. Утвораная Аляксандрам пасольская палата, у якую ўваходзілі прадстаўнікі шляхты, цяпер супрацьстаяла сенату. У сферы дзейнасці сената засталося ўстанаўленне надзвычайных падаткаў і законатворчая дзейнасць. Кароль адабраў ад сената ўсю судзебную і выканаўчую ўладу. Удалося Аляксандру правесці і фінансавую рэформу, стварыць сістэму падаткаў. Неўзабаве давялося яму сутыкнуцца і з панамі-радай. Яны былі незадаволеныя ўзвышэннем Міхайлы Глінскага, які меў уплыў на вялікага князя. Так Аляксандр па жаданні Глінскага перадаў ягонаму сваяку Андрэю Дразду Ліду. Лідскі старас-



Канцлер Ян Ласкі перадае Аляксандру статут. *Пачатак XVI ст.*

та Ільініч паскардзіўся панам-радзе: віленскаму біскупу Войцэху, віленскаму ваяводзе Мікалаю Радзівілу, троцкаму ваяводзе Яну Забярэзінскаму, жамойцкаму старасце Станіславу Кезгайлавічу, полацкаму ваяводзе Станіславу Глябовічу, смаленскаму намесніку Станіславу Кішку. Паны-рада згодна Аляксандравага прывілея, які ён выдаў, калі сядаў на вялікае княжанне, пакінулі Ліду за Ільінічам, заявіўшы, што пасаду адабраць нельга іначай, як з гербам, гэта значыць пазбавіць шляхецтва. Даведаўшыся пра гэтае рашэнне, Аляксандр угневаўся. Гэтым і скарыстаўся Глінскі, нагаворваючы на паноў-раду: «Пакуль у Літве будуць жыць гэтыя паны, да тых часоў у княстве не сціхнуць звадкі»[65]. Аляксандр прыехаў на Літву. На Берасцейскім сойме ў 1505 годзе ён нават не выслухаў паноў-рады, а прагнаў іх прэч. Яна Забярэзінскага, зацятага ворага Глінскага, паводле парады апошняга, Аляксандр пазбавіў пасады троцкага ваяводы, а Ільініча засадзіў у вязніцу. Напужаныя паны-рада ад'ехалі ў Наваградак і раіліся, што рабіць далей. Пад уплывам Глінскага вялікі князь гатоў быў да рашучых крокаў. Дворны маршалак даводзіў яму, што Забярэзінкі, Кішка, Гля-

бовіч — ворагі вялікага князя. І Аляксандр вырашыў распра-віцца з імі. Усё гэта адбывалася, калі пад Слуцкам і пад Менскам стаялі татарскія загоны. Меней усяго хвалявала паноў абарона Айчыны — радзілі, як бы ўміласцівіць караля і згадзіліся падацца пад Глінскага.

Паслалі да вялікага князя ў Бярэсце. Аляксандр абяцаў прыняць паноў міласціва на Радомскім сойме і адправіўся зноў у Польшчу. Аднак паны-рада знайшлі сабе заступніка — віленскага біскупа Войцэха Табара, які восенню (1 лістапада) на Радомскім сойме рэзка выказаўся каралю: «Міласцівы кароль, ты гневаўся на нас без прычыны, з-за некаторых людзей, таму што мы супраць цябе, нашага гасудара, не выступалі, але мы абаранялі свае прывілеі, жадаючы іх захаваць. І таму, міласцівы гасудар наш, як пастыр гэтай дзяржавы і Ваш, павінен засцерагчы і цябе, гасудара нашага, каб ты ахоўваў правы нашыя і свае прывілеі, дадзеныя нам. Калі ж хто ўздумае іх парушыць — Божа адпомсці кожнаму, хто такое ўздумае»[66]. Гэта яму, Аляксандру, пагражалі божай карай, жадалі яе. Хто? Яго ж падданыя. Слухаючы гэтыя словы Аляксандр увесь кіпеў гневам. Пасля гэтай сустрэчы з біскупам Аляксандра разбіў параліч. Папраўляўся ён марудна. Ледзь падняўся з ложка, яшчэ як след не ачуняўшы, адправіўся ў Люблін, каб працягваць рэформы. Тут на сойме ён вымушаны быў вырашаць «важную» дзяржаўную справу. Спрачаліся свецкія і духоўныя прэлаты. Паны патрабавалі, каб святары не атачалі яго пасад з абодвух бакоў, а менавіта яны стаялі з левага боку, жадалі яны таксама падаткаў з касцёльных уладанняў. Вось якія праблемы хвалявалі сенатараў! Аляксандр не стаў сварыцца з святарамі. Толькі хвароба не адступала. Аляксандр адчуваў сябе ўсё горш. У пачатку 1506 года ён пахаваў сваю маці каралеву Альжбэту і зусім хворы ў маі адправіўся ў Вільню. Улада прынесла адно расчараванне, а цяпер вось і забірае апошнія сілы. Аляксандр вырашыў перадаць уладу ў Кароне і княстве малодшаму брату Жыгімонту.

Толькі ён быў ужо асуджаны. Глінскі параіў Аляксандру замяніць лекара Мацея Блоня. Хворага прыняўся лячыць вядомы алхімік Аляксандр Балінскі, якому заплацілі 300 чырвонцаў. Новы лекар загадаў напаліць лазню і, прывёўшы туды Аляксандра, ледзь яго не замарыў. Гэта яшчэ больш аслабіла здароўе Аляксандра. Шапталіся, што Глінскі падкупіў лекара, каб той «горш здоровье его (Аляксандра. — *В.Ч.*) псовал»[65]. Не без падстаў падазравалі, што ўсемагутны Аляксандраў фаварыт задумаў «подсести» велікакняжацкі пасад. У гэты час да Вільні дайшлі звесткі, што за Дняпром з'явіліся татары. Кароль абвясціў паспалітае рушэнне.

Аляксандру так і не ўдалося замірыцца з Крымскім ханствам. Менглі-Гірэй, якога падтрымліваў маскоўскі князь Іван і турэцкі султан Баязед, пасылаў свае загоны на Вялікае княства. У 1503 і 1504 гадах ён яшчэ баяўся Шых-Ахмета і абмяжоўваўся дробнымі набегамі. Аднак былому хану Вялікай Арды так і не ўдалося адрадзіць сваю дзяржаву. З невялікім атрадам вояў Шых-Ахмет падаўся ў 1504 годзе на Волгу. Каля Кіева ён трапіў у засаду кіеўскага ваяводы Дзмітрыя Пуцячыча і быў зняволены.

Як жа аднёсся Аляксандр да свайго былога саюзніка? Кароль выкарыстаў Шых-Ахмета для ціску на Менглі-Гірэя.

«Недругаў тваіх Шых-Ахмеця і Хозяка, Холека злавіў і ты (Менглі-Гірэй. — *В.Ч.*) з намі ссылайся: як наперад таго бацька твой Азі-Гірэй цар з Казімірам каралём ссылаліся, а ты з намі ссылайся; а не захочаш таго, і нам што чыніці? Шых-Ахмеця цара з брацію супраць цябе паставім»[68]. Каб болей запужаць Менглі-Гірэя, Аляксандр дэманструе сваё жаданне дапамагчы Шых-Ахмету. Калі хана-ізгоя пад вартай прывезлі ў 1505 годзе ў Бярэсце, — кароль выехаў яму насустрач і загадаў паслаць сукно там, дзе быў павінен злезці з каня Шых-Ахмет. На абедзе Аляксандр пасадзіў хана як «сябра» побач з сабою.

Хоць Шых-Ахмет і наракаў на свайго саюзніка: «Бог справядлівы мсціўца ўсялякай нягодлівасці караля і мяне рассудзіць, упэўнены, што не даруе мае страты, беды і гэтае крывапрысяжства»[69]. Ад імя караля хану адказалі, што ва ўсіх сваіх бедах ён вінаваты сам. Маючы вялікае войска, стаяў каля Кіева, замест таго, каб напасці на Крым і захапіць яго, або шукаць спажыву ў маскоўскіх землях, пакуль не падайдуць літвінскія атрады. На Радомскім сойме кароль абяцаў падтрымаць Шых-Ахмета супраць крымскага хана. Мабыць, паход татараў восенню 1505 года быў спробай крымскага хана сілаю прымусіць Аляксандра выдаць яму Шых-Ахмета. Татары пад зверхнасцю Біціс-Гірэя і Бурнаш-Салтана няўдала штурмавалі Слуцк, абарону якога ўзначаліла ўдава Сымона Слуцкага княгіня Анастасія. Старэйшы брат Махмет-Гірэй стаяў пад Менскам. Ягоныя загоны хадзілі пад Вільню і за Вілію, да Полацка, Віцебска і Друцка. Паны-рада, сабраўшыся ў Наваградку, не думалі пра абарону краю, а раіліся, як памірыцца з каралём і як толькі яны даведаліся, што татары з-пад Слуцка рушылі да Наваградка, дык адразу разбеглiся. Наваградская шляхта абараніла горад і адбіла татар. Рабаўнікі з вялікай здабычай і палонам вярнуліся ў Крым.

Свае спадзяванні ў барацьбе з крымскім ханствам Аляксандр звязваў і з казанскім ханам Мухамед-Эмінам і нагайскай Ардой, якія ў чэрвені 1505 года пачалі вайну супраць Мас-

ковіі і хадзілі на Ніжні Ноўгарад. Што гэты выступ не абышоўся без уплыву Аляксандра, сведчыць той факт, што ён адбыўся неўзабаве пасля прыезду да нагаяў літвінскага пасла Ратамскага. На паўднёвых межах Масковіі склалася спрыяльная для Вялікага княства становішча — татарскія ханствы аб'ядноўваліся для адраджэння сваёй улады над Руссю. Шых-Ахмет цяпер стаў толькі разменнай манетай у гандлі з Менглі-Гірэем. Таму, калі прыбыло пасольства ад крымскага хана, які абяцаў мір пры ўмове, што Шых-Ахмета зняволяць, Аляксандр, не задумваючыся, вырашыў лёс «сябра». Той, прадчуваючы сумны канец з дапамогай нагайскіх паслоў, якія прыязджалі да яго, уцёк. Злавілі яго ўжо каля Кіева і прывезлі ў Коўна, дзе ён і пражыў пад аховаю да сваёй смерці. Не ўсе адабралі ўчынак Аляксандра. Той жа Мяхоўскі пісаў: «О лютая жорсткасць! Кінуць у вязніцу сяброў і саюзнікаў! О вар'яцкае рашэнне! Паверыць аблудліваму і заўжды прагнаму ворагу больш, чым клятве і саюзу! Вернасць і прысягу трэба выконваць у адносінах і да варвараў няверных»[70]. І ён быў правы.

Тым не менш доўгачаканага міру з Крымам Аляксандр так і не дамогся. Іван III увесь час пужаў Менглі-Гірэя, што Аляксандр падманвае яго і не з-за міру кароль трымае Шых-Ахмета ў палоне, а таму, што баіцца яго помсты: «...хто на сябе свайго ліхадзея пускае»[71] і падбухторваў хана да новых набегаў на Вялікае княства. Смерць Івана Васільевіча ў 1505 годзе абнадзеіла Аляксандра на ўдачную вайну з Масковіяй. У канцы года кароль звярнуўся з прапановаю да лівонскага магістра Вальтэра фон Плетэнберга разам ваяваць супраць Масковіі. Аляксандр нават гатоў быў ахвяраваць Лівонскаму ордэну Жамойць, толькі б заключыць патрэбны саюз з немцамі. Выступленне татар у 1506 годзе, відаць, трэба разглядаць, як папярэдні ўдар Маскоўска-Крымскай кааліцыі, каб не даць Аляксандру скарыстацца не трывалым становішчам новага вялікага маскоўскага князя Васіля Іванавіча. Больш за 30 тысяч татар прывялі на Літву Махмат-Гірэй, Біціс-Гірэй і Бурнаш-Салтан. Два апошнія з дваццаццю тысячамі зноў няўдала штурмавалі Слуцк. Махмат-Гірэй беспаспяхова здабываў Менскі замак.

Аляксандр дажываў свае апошнія дні. Лекар Балінскі парыў Аляксандра ў лазні і паіў віном, прыгатаваным Глінскім. Каралеўскі лекар Блонь убачыў у такім лячэнні пагрозу здароўю Аляксандра. Па просьбе Блоня Балінскага арыштавалі, але яму ўдалося ўцячы. Пэўна, Аляксандр зразумеў, што ўжо не па сілах яму панаваць. А таму адправіўся да Польшчы, каб перадаць уладу брату Жыгімонту. Але літвіны прасілі яго вярнуцца і самаму ўзначаліць войска супраць татар. Гэтага дамагаўся і Глінскі, хоць яго і папярэджваў каралеўскі лекар, што лішнія турботы вельмі



Аляксандр Казіміравіч. *1888 г.*

зашкодзяць здароўю Аляксандра. А кароль не шкадаваў сябе і хворы прыехаў у Ліду, дзе сабралася войска.

Гэта былі самыя пакутлівыя дні ў яго жыцці, пужала і блізкая смерць. Мучыўся ад немагчымасці самаму ўзначаліць войска, ажно гневаўся, што не мог сядзець на кані. Даведаўшыся, што кароль у Лідзе, сюды прыехалі чатыры тысячы шляхціцаў і шмат сялян. Пад баявыя харугвы сабралася больш за сем тысяч вояў. Як раз у гэты час у Ліду прыскакаў паранены стралой у твар віж і паведаміў пра набліжэнне татар. З'яўленне каля Ліды татараў вымагла паноў-раду падумаць пра небяспеку караля, і яго адправілі назад у Вільню. Везлі Аляксандра ў гамаку, прывязаным паміж двума канямі, якімі правілі вершнікі. Побач ехала на кані Алена Іванаўна, якая даглядала хворага. Па дарозе Аляксандру стала горш — ён ужо не мог размаўляць, бо распух язык.

Глінскі выйграў Клецкую бітву — разбіў татарскую раць. Вестуны, якія прынеслі навіну пра перамогу, засталі Аляксандра яшчэ жывым. Гэтая вестка была апошнім суцяшэннем караля на смяротным ложку. «Тады за гэты вось найшчасліўшы поспех мы падзяку Богу, збавіцелю нашаму ўзнеслі», — радаваўся Аляксандр і зычліва паціскаў рукі сваім набліжоным[72]. Нарэшце час перамог настаў, але яго час жыцця канчаўся. Але як горка расставацца з жыццём, калі нарэшце надышлі дні перамогі, калі можна было ўзяць рэванш за свае крыўдныя паражэнні, як горка было ўсвядоміць, што так і не паспеў здзейсніць задуманага. У цяжкіх думках праводзіў апошнія свае дні Аляксандр. Ноч з 19 на 20 жніўня Аляксандр так і не пражыў. Пахавалі яго ў Вільні ў саборы св. Станіслава. Паны-рада, шляхта не дазволілі польскім прадстаўнікам перавезці цела Аляксандра ў Кракаў, нібыта ягоная смерць стала ім дакорам, што страцілі яны чалавека, які ўсё жыццё служыў сваёй Бацькаўшчыне і дзеля яе зняважыў ён смерць, і вось гэтым пахаваннем на радзіме продкаў аддавалі яму запозненую пашану і гонар.

«Быў Аляксандр сярэдняга росту, твару прадаўгаватага, валасоў рудых, касцісты, плеч шырокіх і сілу меў у сабе, але досціпу не было, а таму быў маўклівым. Больш за ўсё захапляўся людзьмі рыцарскімі і музыкай. Дабратой усіх іншых братоў пераўзыходзіў, што сабе за вартасць меў. Калі каму што дараваў, дык больш застратнага лічылі, чым за шчырага лічылі. Сапраўды ў час памёр, пакуль яшчэ не раздаў усё як у Польшчы, гэтак ў Літве»[73]. Такую вось памяць пакінуў па сабе Аляксандр.

1987—1990 гг.

ХРАНАЛОГІЯ ПАДЗЕЙ

862 г. — Першая ўзгадка ў гістарычных крыніцах пра Полацк.

Сярэдзіна X ст. — Пачатак уладарання першага вядомага ў гістарычных крыніцах полацкага князя Рагвалода. Паход Рагвалода і ягонага брата Тура на Палессе і заснаванне горада Турава.

980 г. — Сватанне наўгародскага князя Уладзіміра і кіеўскага князя Яраполка да Рагвалодавай дачкі Рагнеды. Адмова Уладзіміру. Заваёва Уладзімірам Полацка і забойства Рагвалода. Гвалтоўны шлюб Уладзіміра на Рагнедзе. Перамога Уладзіміра над кіеўскай дружынай на рацэ Дручы. Заваёва Уладзімірам Кіева. Смерць Яраполка.

Сярэдзіна 80-ых гадоў X ст. — Замах Рагнеды на Уладзіміра. Ссылка Рагнеды і яе сына Ізяслава ў Заслаўе. Аднаўленне Полацкага княства. Назначэнне князем у Тураве Яраполкавага сына Святаполка.

988 г. — Прыняцце Уладзімірам хрысціянства і хрышчэнне Русі. Заснаванне Рагнедай жаночага манастыра ў Заслаўі.

1001 г. — Смерць князя Ізяслава і пачатак княжання ягонага сына Брачыслава.

1009 г. — Першае ўпамінанне Літвы ў гістарычных крыніцах.

15 ліпеня 1015 г. — Смерць Уладзіміра і ўскняжанне ў Кіеве ягонага сына Барыса. Уцёкі Святаполка ў Польшчу.

Восень 1015 г. — Міжусобная вайна паміж Барысам і наўгародскім князем Яраславам.

1016—1017 гг. — Праўленне ў Кіеве Яраслава.

Зіма 1017 г. — Паход на Кіеў Барыса з печанегамі. Смерць Барыса ад падасланых Яраславам забойцаў.

1018 г. — Паход Святаполка і кракаўскага князя Баляслава на Кіеў. Перамога над Яраславам у бітве каля Буга. Ускняжанне Святаполка ў Кіеве. Паход Яраслава з наўгародскай дру-

жынай на Святаполка і перамога над ім. Смерць Святаполка.

1001—1044 гг. — Княжанне ў Полацку Брачыслава Ізяславіча.

1021 г. — Патрабаванне Яраслава перадачы Кіеву часткі полацкіх земляў. Паход Брачыслава на Ноўгарад. Заваёва Наўгародскага княства. Мірнае пагадненне паміж Яраславам і Брачыславам. Пераход да Полацкага княства гародоў Віцебска і Усвятаў.

1044 г. — Смерць Брачыслава. Паход Яраслава Мудрага на Літву і заснаванне ім Навагрудка.

1044—1101 гг. — Княжанне ў Полацку Усяслава Брачыславіча Вешчая Душа.

1055 г. — Удзел Полацкага княства ў кааліцыі паўднёварускіх князяў супраць торкаў.

1065 г. — Паход Усяслава на Пскоў і перамога полацкай дружыны над наўгародскім князем Мсціславам Ізяславічам на рацэ Чарэсе.

1066 г. — Заваёва Усяславам Ноўгарада.

Пачатак 1067 г. — Паход кіеўскага, чарнігаўскага, пуціўльскага князёў на Полацкае княства. Спаленне Менска. Першая ўзгадка пра Менск у летапісах.

3 сакавіка 1067 г. — Бітва на рацэ Нямізе. Адступленне паўднёварускіх дружын з Полацкага княства.

10 ліпеня 1067 г. — Перамовы пад Оршай Усяслава з кіеўскім князем Ізяславам. Зняволенне Усяслава.

15 верасня 1068 г. — Паўстанне ў Кіеве супраць князя Ізяслава і вызваленне паўстанцамі з няволі князя Усяслава. Абранне князя Усяслава на кіеўскі пасад.

Верасень 1068 — сакавік 1069 г. — Час княжання Усяслава Вешчая Душа ў Кіеве.

Сакавік 1069 г. — Паход князя Ізяслава Яраславіча на чале польскага войска на Кіеў. Вяртанне Усяслава ў Полацк і ўцёкі адтуль.

23 кастрычніка 1069 г. — Бітва на рацэ Гзені паміж водскай дружынай Усяслава Вешчая Душа і наўгародскай князя Глеба Святаславіча. Палон Усяслава і ягонае вызваленне.

1069—1071 гг. — Княжанне ў Полацку кіеўскага намесніка князя Святаполка.

1071 г. — Выгнанне Усяславам Вешчая Душа кіеўскага намесніка з Полацка, аднаўленне незалежнасці Полацкага княства. Бітва полацкай дружыны з паўднёварускімі дружынамі каля Галацічаска.

Другая палова 70-ых гадоў XI ст. — Узвядзенне Усяславам менскага дзядзінца і аднаўленне Менска на рацэ Свіслачы. За-

снаванне ў Менску Узнясенскага манастыра, дзе жыў паэт Баян.

Лета 1077 г. — Паход рускіх дружын на чале з Уладзімірам Манамахам на Полацк.

Зіма 1078 г. — Паўторны паход Уладзіміра Манамаха на Полацк. Заваёва Усяславам Смаленска.

1084 г. — Заваёва Уладзімірам Манамахам Менска і спаленне яго.

14 красавіка 1101 г. — Смерць Усяслава Брачыславіча Вешчая Душа, вялікага князя полацкага.

1101—1129 гг. — Княжанне ў Полацку Барыса-Рагвалода Усяславіча.

1102 г. — Паход князя Барыса Усяславіча на яцвягаў і перамога над імі. Заснаванне горада Барысава.

1104 г. — Ускняжанне ў Менску Глеба Усяславіча. Паход на Менск рускіх князёў.

1106 г. — Паход полацкай дружыны на Земігалію. Паражэнне палачан ад земігалаў.

1116 г. — Заваёва Глебам Усяславічам у Смаленскага княства Оршы і Копыся.

Студзень — люты 1117 г. — Аблога Менска рускімі дружынамі на чале з кіеўскім князем Уладзімірам Манамахам.

Верасень 1119 г. — Заваёва Менска рускімі князямі і зняволенне Глеба Усяславіча.

13 верасня 1119 г. — Смерць Глеба Усяславіча ў Кіеве.

1129 г. — Напад полацкай дружыны на кіеўскія ўладанні. Паход рускіх князёў на Полацк. Мірная дамова полацкага веча з рускімі князямі. Высылка полацкіх князёў у Візантыю. Уладаранне ў Полацку кіеўскага намесніка.

1130 г. — Паход рускіх князёў на Літву да Заслаўя.

1131 г. — Паўторны паход рускіх князёў на Літву. Разгром літвіна-полацкім войскам рускіх дружын.

1132 г. — Выгнанне з Полацка кіеўскага намесніка. Узвядзенне палачанамі на полацкі пасад князя Васілька Святаславіча.

Канец 30-ых гг. XII ст. — Ускняжанне ў Менску князя Расціслава Глебавіча.

1140 г. — Вяртанне з Візантыі полацкіх князёў Івана і Рагвалода-Васіля Барысавіча.

1143 г. — Выбранне князя Рагвалода-Васіля на полацкі пасад.

1143—1151 гг. — Княжанне ў Полацку князя Рагвалода-Васіля. Вайна Полацка са Псковам.

1151 г. — Выбранне на полацкі пасад князя Расціслава Глебавіча.

1158 г. — Паход князя Рагвалода-Васіля на Полацк. Паўстанне палачан супраць князя Расціслава Глебавіча і выбранне на полацкі пасад князя Рагвалода-Васіля.

1158—1162 гг. — Міжусобныя войны паміж менскім князем Расціславам Глебавічам і полацкім князем Рагвалодам-Васілём.

1162 г. — Ускняжанне ў Полацку князя Усяслава Васількавіча.

1167 г. — Паход менскага князя Валадара Глебавіча на Полацк і паражэнне менскай дружыны.

1186—1216 гг. — Княжанне ў Полацку князя Уладзіміра.

1186 г. — Дазвол Уладзіміра прапаведаваць хрысціянства ў Лівоніі святару Мейнарду. Пачатак нямецкай экспансіі ва ўсходняй Прыбалтыцы.

1195 г. — Перамога полацка-чарнігаўскага войска над смаленска-разанскім войскам пад Віцебскам.

1198 г. — Напад полацкай і літоўскай дружын на Вялікія Лукі.

1201 г. — Паход полацкай дружыны на Літву. Заснаванне немцамі Рыгі.

1202 г. — Заснаванне крыжацкага Ордэна мечаносцаў.

1203 г. — Паход полацкага князя Уладзіміра на крыжацкія замкі Ікельсколу і Гольм. Напад герцыкскага князя Усевалада разам з летонамі на Рыгу.

1206 г. — Паход Уладзіміра ў Лівонію.

1207 г. — Напад крыжакоў на Кукейнос.

1208 г. — Уход кукейноскага князя Вячкі ў Ноўгарад.

1209 г. — Захоп крыжакамі Герцыке.

1210 г. — Гандлёвая ўмова паміж Полацкам і Рыгай.

1212 г. — Перадача Лівоніі полацкім князем Уладзімірам рыжскаму біскупству.

1216 г. — Смерць полацкага князя Уладзіміра.

1219 г. — Першае ўпамінанне ў летапісе пра князя Міндоўга.

1222—1232 гг. — Княжанне ў Смаленску полацкага стаўленіка князя Святаслава Мсціславіча.

1224 г. — Абарона князем Вячкі Юр'ева.

1226 г. — Запрашэнне Тэўтонскага ордэна ў Мазовію.

1248 г. — Заваёва Міндоўгам Літвы.

1248—1254 гг. — Вайна Наваградскага княства з Галіцка-Валынскім княствам.

1253 г. — Каранацыя Міндоўга.

1254—1258 гг. — Княжанне ў Наваградку галіцка-валынскага стаўленіка Рамана Данілавіча.

1254—1263 гг. — Княжанне ў Полацку Таўцівіла Добрага.

1258 г. — Ускняжанне ў Наваградку Войшалка. Паход татара-мангольскага войска Бурундая на Літву.

1260 г. — Паход Міндоўга на Мазовію.

1262 г. — Сумесны паход полацка-наўгародскага войска на Юр'еў.

1263 г. — Смерць Міндоўга.

1264—1266 гг. — Утварэнне Вялікага княства Літоўскага.

1266 г. — Смерць Войшалка.

1270—1282 гг. — Княжанне ў Вялікім княстве ЛітоўскімТройдзеня.

1274 г. — Паход татарска-рускага войска на Наваградак.

1277 г. — Аблога Тройдзенем крыжацкай цвержы Дынабурга.

1278 г. — Паход татарска-рускага войска на Вялікае княства Літоўскае.

5 сакавіка 1279 г. — Перамога літвінскага войска над крыжакамі пад Ашэраданам.

1279 г. — Мір паміж Вялікім княствам Літоўскім і Мазовіяй.

1282 г. — Смерць Тройдзеня.

1282—1293 гг. — Княжанне ў Вялікім княстве Літоўскім Лютавера.

1283 г. — Паход літвінскага войска на Сандамірскую зямлю. Заваёва Тэўтонскім ордэнам Прусіі.

1284 г. — Напад крыжакоў на Гародню.

1286 г. — Заваёва літвінамі Добжына (Польшча). Абвяшчэнне папам Мікалаем IV крыжовага паходу на Літву.

1289 г. — Паход літвінскага войска на Прусію.

1293—1315 гг. — Княжанне ў Вялікім княстве Літоўскім Віценя.

1294 г. — Паход Віценя на Польшчу. Перамога літвінскага войска над войскам Куяўскага князя Казіміра каля Сахачава.

1298 г. — Саюз Вялікага княства Літоўскага з Рыгай.

1 чэрвеня 1298 г. — Перамога літвіна-рыжскага войска на чале з Віценем над лівонскімі рыцарамі каля ракі Трэйдры. Мірная дамова ВКЛ з Лівонскім ордэнам.

Пачатак XIV ст. — Аб'яднанне ВКЛ з Вялікім княствам Полацкім.

1304 г. — Пачатак новых вайсковых дзеяў Тэўтонскага ордэна супраць ВКЛ.

1306 г. — Напад крыжакоў на Гародню.

1311 г. — Голад на Літве.

6 красавіка 1311 г. — Паражэнне літвінскай дружыны на чале з Віценем ад крыжакоў у Прусіі каля Растэнбурга.

1314 г. — Крыжовы паход Тэўтонскага ордэна на ВКЛ. Паражэнне крыжакоў пад Наваградкам ад дружыны гарадзенскага кашталяна Давыда.

1315 г. — Смерць Віценя. Ускняжанне на Вялікім княстве Літоўскім Гедыміна.

1316 г. — Зацвярджэнне візантыйскім імператарам Андронікам Наваградскай мітраполіі.

1318 г. — Шлюб Альгерда Гедымінавіча з дачкою віцебскага князя Яраслава Марыяй.

1319 г. — Паход дружыны Давыда Гарадзенскага на Прусію.

1320 г. — Перамога войска ВКЛ на чале з Гедымінам над крыжакамі каля Меднікаў.

1321 г. — Абвяшчэнне папам Янам XXII крыжовага паходу супраць ВКЛ.

1322 г. — Паход крыжакоў на Аўкштайцію.

1323 г. — Удзел дружыны Давыда Гарадзенскага ў абароне Пскова ад лівонскіх і дацкіх рыцараў. Мірная дамова Гедыміна з магістратам Рыгі. Пасланне Гедыміна да папы Яна XXII. Першая ўзгадка пра Вільню як пра сталіцу ВКЛ.

1324 г. — Паход дружыны Давыда Гарадзенскага на Мазовію.

Лістапад 1324 г. — Перамовы Гедыміна з прадстаўнікамі папы Яна XXII. Адмова Гедыміна хрысціць Літву.

1326 г. — Саюз ВКЛ з Польшчай, Мазовіяй і Псковам супраць Тэўтонскага ордэна. Паход Давыда Гарадзенскага на Брандэнбургскую Марку. Смерць Давыда Гарадзенскага.

Красавік 1328 г. — Паход Гедыміна на ўладанні лівонскіх рыцараў. Напад прускіх рыцараў на Гародню. Крыжовы паход на Жамойць.

1333 г. — Паход крыжакоў на Полацк.

1335 г. — Любарт Гедымінавіч становіцца валынскім князем.

1338 г. — Мірная дамова ВКЛ з Лівонскім ордэнам.

1340 г. — Уваход у склад ВКЛ Берасцейскай зямлі і Валыні.

1341 г. — Смерць Гедыміна. Ускняжанне ў ВКЛ Яўнута Гедымінавіча.

Лістапад 1342 г. — Паход віцебскай, полацкай і трокскай дружын на дапамогу Пскову супраць крыжакоў. Абранне пскоўскім князем Андрэя Альгердавіча.

Сярэдзіна 40-ых гг. XIV ст. — Вызваленне Падолля наваградскай дружынай Карыятавічаў ад татарскага ярма.

1342 г. — Абранне полацкім князем Андрэя Альгердавіча.

1345 г. — Захоп Альгердам велікакняжацкага пасада. Паход літвінскага войска на чале з Альгердам на Лівонію.

1346 г. — Паход Альгерда на Ноўгарад.

2 лютага 1348 г. — Бітва літвінскага войска Альгерда і Кейстута з крыжакамі каля ракі Стравы.

1349 г. — Польская экспансія на галіцкія і валынскія землі.

1358 г. — Перамовы Альгерда з імператарам свяшчэннай Рымскай імперыі Карлам IV. Далучэнне да ВКЛ Мсціслаўля. Прызнанне васальнай залежнасці ад ВКЛ смаленскім князем Святаславам Іванавічам.

1359 г. — Далучэнне Бранскага княства да ВКЛ.

1360 г. — Аднаўленне крыжацкіх паходаў на ВКЛ. Узяцце крыжакамі ў палон троцкага князя Кейстута.

1361 г. — Уцёкі Кейстута з крыжацкага палону і паход ягонай дружыны на Прусію.

1362 г. — Заваёва крыжакамі Коўна.

1363 г. — Паход літвінскага войска на чале з Альгердам у «Поля Дикие». Перамога літвінскага войска над татарамі каля ракі Сінія Воды. Вызваленне ад татарскага ярма і далучэнне да ВКЛ Кіеўскага, Чарнігаўскага, Ноўгарад-Северскага княстваў. Напад крыжакоў на Жамойць і Аўкштайцію.

1364 г. — Напад лівонскіх рыцараў на Вількамірскую зямлю.

1365 г. — Напад лівонскіх рыцараў на Упіцкую зямлю. Паход літвіна-жамойцкага войска на Прусію і заваёва трох крыжацкіх замкаў. Паход крыжакоў пад Вільню. Паўстанне ў Вільні язычнікаў супраць хрысціян.

1366 г. — Рэйды крыжакоў на Жамойць, Аўкштайцію і да Полацка.

1367 г. — Спусташэнне крыжакамі Упіцкай зямлі. Заваёва палякамі Валыні. Паход Кейстута на Мазовію.

Вясна 1368 г. — Паход літвінскага войска на чале з Альгердам на Маскву. Мірнае пагадненне ВКЛ з Вялікім княствам Уладзімірскім. Літвінскі стаўленнік у Цверы.

1369 г. — Новае наступленне Ордэна на ВКЛ.

18 лютага 1370 г. — Бітва літвінскага войска на чале з Альгердам і Кейстутам з крыжакамі каля Рудавы ў Прусіі.

1370 г. — Адваёва Любартам і Кейстутам Валыні і паход літвінскага войска на Люблінскую і Сандамірскую землі. Паход Альгерда на Маскву.

Кастрычнік 1372 г. — Бітва літвінскага і цвярскога войска з мас-

коўскім каля Любуцка. Перамір'е ВКЛ з Вялікім княствам Уладзімірскім.

1373—1374 гг. — Баі літвінскага войска з татарамі.

1373 г. — Абранне Юрыя Карыятавіча «гаспадаром зямлі Малдаўскай». Прапанова папы Рыгора XI Альгерду, Кейстуту ды Любарту прыняць каталіцкую веру. Паход полацкай дружыны на чале з князем Андрэем на Дынабург.

1374 г. — Паход Кейстута на Прусію. Напад лівонскіх рыцараў на Полацкую зямлю. Паўторны паход палачанаў на Дынабург.

1375 г. — Крыжовы паход на Трокскае княства. Напад літвінскага войска на Лівонію. Штурм крыжакамі Гародні. Выдзяленне Гарадзенскага княства з Трокскага.

1376 г. — Аблога крыжакамі Коўна і набегі на Бельск і Камянец. Паход Альгерда на Прусію. Паход Кейстута і Любарта на Польшчу.

1377 г. — Аблога крыжакамі Трокаў. Смерць Альгерда. Ускняжанне ў Вялікім княстве Літоўскім і Рускім Ягайлы. Ад'езд полацкага князя Андрэя ў Пскоў. Аб'яднаны паход на Жамойць Ордэна і войска герцага Альбрэхта III. Напад лівонскіх рыцараў на Друю.

Снежань 1377 г. — Захоп крыжакамі Бельска.

Студзень 1378 г. — Паход прускіх і лівонскіх рыцараў на Аўкштайцію.

Снежань 1378 г. — Пераход князя Дзмітрыя Альгердавіча на бок маскоўскага князя Дзмітрыя Іванавіча. Паход маскоўскага войска на чале з Андрэем Полацкім на Старадуб і Трубачэўск.

Лета 1379 г. — Паход крыжакоў на Жамойць і Берасцейскую зямлю.

29 верасня 1379 г. — Мірная дамова паміж Трокскім княствам і Ордэнам.

1 чэрвеня 1380 г. — Сепаратны саюз Ягайлы і Ордэна, накіраваны супраць троцкага князя Кейстута і гарадзенскага князя Вітаўта.

Жнівень—верасень 1380 г. — Паход літвінскага войска на чале з Ягайлам на дапамогу золатаардынскаму хану Мамаю і разанскаму князю Алегу супраць маскоўскага князя Дзмітрыя Іванавіча.

8 верасня 1380 г. — Удзел князёў Андрэя Полацкага, Дзмітрыя Альгердавіча і Дзмітрыя Друцкага ў Кулікоўскай бітве.

Восень—зіма 1380 г. — Паход крыжакоў на Падляшша. Аблога імі Драгічына і Бужска.

1380 г. — Выгнанне з Полацка князя Скіргайлы Альгердавіча. Аблога Полацка лівонскімі рыцарамі пад зверхнасцю Скіргайлы Альгердавіча

1381 г. — Авалоданне Кейстутам Вільняй і выкрыццё сепаратнай дамоўленасці Ягайлы з Ордэнам.

1381—1382 гг. — Вялікі князь літоўскі і рускі Кейстут.

Снежань 1381 г. — Захоп літвінскім войскам прускага горада Астэродэ.

Пачатак 1382 г. — Паход літвінскага войска на прускую вобласць Вармію.

Восень 1382 г. — Аблога літвінскага войска Юрбарга. Паход Кейстута на ноўгарад-северскага князя Карыбута Альгердавіча. Заваёва Мазовіяй Бельскай зямлі.

12 ліпеня 1382 г. — Авалоданне Ягайлам Вільні.

Пачатак жніўня 1382 г. — Сустрэча войск Ягайлы і Кейстута каля Трокаў.

Восень 1382 г. — Забойства ў Крэўскім замку Кейстута. Уцёкі Вітаўта з Крэўскага замка ў Мазовію.

1 лістапада 1382 г. — Перамовы Ягайлы з Ордэнам і ўступка крыжакам заходняй Жамойці.

1383 г. — Саюз Вітаўта з Ордэнам. Сватанне Ягайлы да дачкі Дзмітрыя Іванавіча Софіі.

Красавік 1383 г. — Разрыў міру паміж Вялікім княствам Літоўскім і Рускім і Ордэнам.

30 ліпеня 1383 г. — Паход Ордэна на Вільню з мэтай узвядзення на велікакняжацкі пасад Вітаўта.

30 студзеня 1384 г. — Пацвярджэнне Вітаўтам ранейшай дамовы з Ордэнам на пераход пад ордэнскую ўладу Трокскага княства.

Лета 1384 г. — Пабудова Ордэнам замка Марыенвердэра на Нёмане.

9 ліпеня 1384 г. — Вяртанне Вітаўта на Літву.

25 кастрычніка 1384 г. — Узяцце літвінскім войскам на чале з Ягайлам Марыенвердэра.

1384 г. — Згода Ягайлы на абранне яго польскім каралём. Паход літвінскага войска на чале з Ягайлам на Мазовію.

12 лютага 1385 г. — Ягайлавы паслы ў Кракаве прапаноўваюць яго кандыдатуру ў польскія каралі.

14 жніўня 1385 г. — Заключэнне ў Крэве уніі (Крэўская унія) паміж Вялікім княствам Літоўскім і Рускім і Польшчай.

18 лютага 1386 г. — Шлюб Ягайлы з польскай каралевай Ядвігай.

4 сакавіка 1386 г. — Каранацыя Ягайлы на Польскае каралеўства.

Вясна 1386 г. — Паўстанне Андрэя Полацкага. Вайна Смаленскага княства супраць ВКЛ.

29 красавіка 1386 г. — Бітва на рацэ Вехра паміж войскамі ВКЛ і Смаленскага княства.

Лета 1386 г. — Літвінскі стаўленік князь Юрый Святаславіч у Смаленску.

1387 г. — Прывілеі Ягайлы феадалам за пераход у каталіцкую веру. Хрышчэнне Літвы.

20 лютага 1387 г. — Назначэнне Ягайлам вялікім князем літоўскім Скіргайла Альгердавіча.

Восень 1388 г. — Пачатак вайны Ордэна з ВКЛ.

1389 г. — Змова Вітаўта супраць Ягайлы і Скіргайлы. Уцёкі Вітаўта ў Ордэн.

19 студзеня 1390 г. — Падпісанне ў Гародні саюзнага пагаднення паміж Вітаўтам і Ордэнам.

Зіма—вясна 1390 г. — Паход польскага войска на чале з Ягайлам на Гарадзенскае княства. Заваёва Ягайлам Бярэсця і Гародні.

Восень 1390 г. — Аблога віленскіх замкаў ордэнскім войскам і атрадам Вітаўта.

21 студзеня 1391 г. — Вянчанне Софіі Вітаўтаўны з маскоўскім князем Васілём Дзмітрыевічам.

Лета 1391 г. — Паход крыжакоў на Вільню.

Восень 1391 г. — Узвядзенне крыжакамі для Вітаўта замка Рытэрсвердэра. Авалоданне Вітаўтам Гародні.

Пачатак 1392 г. — Захоп крыжакамі Суража і спусташэнне Аўкштайціі.

5 жніўня 1392 г. — Востраўскае пагадненне паміж Вітаўтам і Ягайлам. Перадача Ягайлам улады ў Вялікім княстве Літоўскім і Рускім Вітаўту.

Восень—зіма 1392 г. — Перамога Вітаўта над ноўгарад-северскім князем Карыбутам. Падаўленне Вітаўтам мяцежа князя Свідрыгайлы Альгердавіча ў Віцебску.

Зіма 1392/93 г. — Паход крыжакоў на Ліду і Драгічынскую зямлю.

6 снежня 1393 г. — Белзкае пагадненне паміж Вітаўтам і Скіргайлам. Наданне Ягайлам Кіева Скіргайлу і прызнанне за ім тытулу «вялікі князь рускі».

1394 г. — Авалоданне Вітаўтам кіеўскіх прыгарадаў Жытомір і Оўруч. Перавод кіеўскага князя Уладзіміра Альгердавіча ў Капыль. Ускняжанне ў Кіеве Скіргайлы.

Ліпень—жнів. 1394 г. — Паход крыжакоў на Вільню.

1395 г. — Адваёва Скіргайлам у татараў гарадоў Чаркасы і Звянігарада. Смерць Скіргайлы. Пераход кіеўскага і полацкага княстваў пад уладу Вітаўта. Скасаванне Полацкага княства і ўвядзенне ў Полацку інстытута намесніцтва. Прывілеі Вітаўта Полацкай зямлі.

28 верасня 1395 г. — Далучэнне Смаленскага княства да ВКЛ.

1396 г. — Захоп Свідрыгайлам Віцебска і аблога горада Вітаўтам.

Чэрвень—лістапад 1397 г. — Прыезд у Вільню крыжацкага пасольства Конрада Кібурга да Вітаўта.

Восень 1397 г. — Паход Вітаўта на Крым у падтрымку хана Залатой Арды Тахтамыша.

1398 г. — Віленскі сойм. Заява літвінаў, што яны не «падданыя Польшчы».

23 красавіка 1398 г. — Заключэнне ў Гародні мірнага пагаднення паміж ВКЛ і Ордэнам.

Лета 1398 г. — Паход Вітаўта ў «Поля Дикие». Сімвалічнае прыняцце Чорнага мора пад уладу ВКЛ.

12 кастрычніка 1398 г. — Перамова Вітаўта з Ордэнам каля Салінскага возера. Абвяшчэнне літвінскімі феадаламі Вітаўта «каралём Літвы і Русі».

Вясна 1399 г. — Саюз Вітаўта з былым залатаардынскім ханам Тахтамышам.

12 жніўня 1399 г. — Паражэнне аб'яднанага літвіна-татарскага войска Вітаўта ад войск Залатой Арды каля ракі Ворсклы.

Восень 1399 г. — Паход залатаардынскага войска на Кіеў. Абарона Вітаўтам пераправы цераз Дняпро каля Тавані.

18 студзеня 1401 г. — Падпісанне ў Вільні новай уніі (Віленскай) паміж ВКЛ і Польшчай.

Вясна—лета 1401 г. — Паўстанне жамойтаў супраць Ордэна. Напад лівонскіх рыцараў на Аўкштайцію. Узяцце Вітаўтам Дынабурга. Адпадзенне Смаленскага княства ад ВКЛ.

1401 г. — Напад дружыны Алега Разанскага на Усходнюю Літву.

Восень 1401 г. — Аблога Вітаўтам Смаленска.

Кастрычнік 1402 г. — Перамога літвінскага войска над разанскім каля Любуцка.

Люты 1402 г. — Паход крыжакоў на Гарадзенскую зямлю. Узяцце Вітаўтам Рытэрсвердэра.

Лета 1402 г. — Паход Ордэна на Вільню. Уцёкі Свідрыгайлы ў Ордэн.

Пачатак 1403 г. — Паход Ордэна на Аўкштайцію. Паўторнае ўзяцце Вітаўтам Дынабурга.

23 мая 1404 г. — Мірная дамова паміж ВКЛ і Ордэнам у Раценжы. Перадача Вітаўтам Жамойці Ордэну. Замірэнне Вітаўта і Свідрыгайлы.

26 чэрвеня 1404 г. — Далучэнне Смаленскага княства да ВКЛ.

Восень 1404 г. — Напад крыжакоў на Аўкштайцію.

Зіма 1405 г. — Паход літвінскага войска на Пскоўскую зямлю.

1406 г. — Адмова Вітаўта ад Жамойціі.

28 чэрвеня 1406 г. — Сустрэча ў Саліне Вітаўта і магістра Конрада фон Юнінгена.

Верасень—кастрычнік1406 г. — Паход пскоўскай дружыны на Полацк.

Зіма 1406 г. — Канфлікт ВКЛ з Маскоўскім княствам. Заключэнне перамір'я.

1407 г. — З'езд у Коўне Вітаўта, Ягайлы і магістра Юнінгена. Новы канфлікт ВКЛ з Маскоўскім княствам і заключэнне новага перамір'я.

1408 г. — Ад'езд Свідрыгайлы ў Маскоўскае княства.

Паход Вітаўта на Маскву. Устанаўленне мяжы ВКЛ з Маскоўскім княствам па рацэ Угры.

1409 г. — Вяртанне Свідрыгайлы на Літву і звязенне яго Вітаўтам. Паўстанне жамойтаў супраць Ордэна.

6 жніўня 1409 г. — Пачатак вайны паміж Ордэнам і Польшчай.

Жнівень 1409 г. — Заваёва Ордэнам Дабжынскай зямлі. Уступленне ў вайну ВКЛ на дапамогу Польшчы.

8 верасня 1409 г. — Заключэнне перамір'я паміж Ордэнам і Польшчай.

17 кастрычніка 1409 г. — Сустрэча ў Бярэсці Ягайлы і Вітаўта і абмеркаванне імі плана будучай вайны з Ордэнам.

15 лютага 1410 г. — Прысуд чэшскага караля Венцаслава Ордэну Добжынскай зямлі, Жамойці і Усходняй Судавіі.

Сакавік 1410 г. — Напад крыжакоў на Ваўкавыск.

Красавік 1410 г. — Сустрэча ў Кежмарку Вітаўта і ўгорскага караля Жыгімонта. Прапанова Вітаўту каралеўскай кароны.

14 чэрвеня 1410 г. — Узнаўленне вайны паміж ВКЛ і Польшчы з Ордэнам.

15 ліпеня 1410 г. — Грунвальдская бітва.

25 ліпеня — 22 верасня 1410 г. — Аблога войскамі Польшчы і ВКЛ Мальбарга.

11 лютага 1411 г. — Торуньскае пагадненне паміж Ордэнам, Польшчай і ВКЛ. Пераход да ВКЛ Жамойці.

1411 г. — Паездка Вітаўта ва Угорыю.

Красавік 1412 г. — Віленская дамова паміж ВКЛ і Свяшчэннай Рымскай імперыяй.

2 кастрычніка 1413 г. — Гарадзельская унія паміж ВКЛ і Польшчай.

1413 г. — Хрышчэнне Жамойці. Прыезд у Літву Іераніма Пражскага.

1414 г. — Саюз ВКЛ і Пскова. «Галодная» вайна Польшчы і ВКЛ супраць Ордэна.

1414—1418 гг. — Канстанцкі сабор.

14 лістапада 1415 г. — Сабор праваслаўных епіскапаў ВКЛ у Навагрудку і хіратонія мітрапаліта Рыгора Цымбалака.

1416 г. — Набег татар на Кіеўскую зямлю.

1417 г. — Сустрэча ў Велоне Вітаўта, Ягайлы і магістра Міхаэла Кухместэра.

1418 г. — Вызваленне Свідрыгайлы з вязніцы і ўцёкі яго ў Ордэн. Паўстанне жамойтаў. Узвядзенне Вітаўтам на ханскі пасад Залатой Арды Ярым-Фердэя. Смерць княгіні Ганны. Шлюб Вітаўта з Ульянаю Гальшанскай.

Ліпень 1419 г. — Мірная дамова ВКЛ са Швецыяй і Даніяй. Вяртанне Свідрыгайлы ў Літву.

1421 г. — Англійскі пасол Гільбер дэ Лануа сустракаецца з Вітаўтам.

1422 г. — Прыход у Чэхію пяцітысячнага войска на чале з Жыгімонтам Карыбутавічам. Прызнанне чэхамі сваім каралём Вітаўта.

24 сакавіка 1422 г. — Вянчанне Ягайлы і Софіі Гальшанскай.

27 чэрвеня 1422 г. — Мельнікоўская дамова паміж Польшчай, ВКЛ і Ордэнам. Адмова Ордэна ад прэтэнзіі на Жамойць.

Сакавік 1423 г. — Заключэнне міру паміж ВКЛ і Свяшчэннай Рымскай імперыяй. Адмова Вітаўта ад чэшскай кароны. Абвяшчэнне чэшскім каралём Жыгімонта Карыбутавіча.

1424 г. — Вывад літвінскага войска з Чэхіі.

1425 г. — Перамога літвінскага войска над татарскім ханам Кудандахам у Разанскай зямлі. Прызнанне Вітаўта маскоўскім князем Васілём Дзмітрыевічам апекуном сваіх дзяцей.

Ліпень—жнівень 1426 г. — Аблога літвінскім войскам на чале з Вітаўтам Апочкі і Варончы.

1427 г. — Забарона папам рымскім Марцінам IV каранаваць Вітаўта.

Лета 1427 г. — Падарожжа Вітаўта па ВКЛ і Русі. Пераход пад уладу ВКЛ разанскага, пераяслаўскага, пронскага, новасільскага, адоеўскага, варатынскага княстваў. Прызнанне васальнай залежнасці ад ВКЛ Маскоўскага княства.

2 ліпеня 1428 г. — Паход Вітаўта на Ноўгарад і аблога Порахава. Выкуп з Ноўгарада.

Студзень—люты 1429 г. — З'езд у Луцку. Абмеркаванне магчымасці каранацыі Вітаўта.

Верасень 1430 г. — З'езд у Вільні. Польскія інтрыгі супраць каранацыі Вітаўта.

27 кастрычніка 1430 г. — Смерць Вітаўта.

1430 г. — Абранне вялікім князем Літоўскім і Рускім Свідрыгайлы Альгердавіча.

25 студзеня 1431 г. — Заключэнне саюза паміж ВКЛ і Ноўгарадам.

Вясна 1431 г. — Захоп польскім войскам Падолля. Канфлікт Свідрыгайлы з Ягайлам. Саюз ВКЛ з табарытамі.

Ліпень—жнівень 1431 г. — Аблога польскім войскам на чале з Ягайлам Луцка. Вайна Ордэна з Польшчай.

7 мая 1432 г. — Кірсмемельская мірная дамова паміж ВКЛ і Ордэнам.

Жнівень 1432 г. — Дзяржаўны пераварот у ВКЛ. Прыход да ўлады польскага стаўленіка Жыгімонта Кейстутавіча.

15 лістапада 1432 г. — Абнародаванне прывілея Ягайлы і Жыгімонта Кейстутавіча аб наданні праваслаўным феадалам ВКЛ роўных правоў з каталіцкімі феадаламі.

Восень 1432 г. — Абвяшчэнне ў Полацку вялікім князем Рускім Свідрыгайлы. Утварэнне Вялікага княства Рускага са сталіцай у Полацку. Перамога літвінскага войска на чале з Хведарам Нясвіжскім над польскім войскам каля рэчкі Морахвы.

Кастрычнік 1432 г. — студзень 1433 г. — Паход Свідрыгайлы на Вялікае княства Літоўскае.

8 снежня 1432 г. — Бітва пад Ашмянамі.

Жнівень 1433 г. — Другі паход Свідрыгайлы на Вялікае княства Літоўскае.

1433 г. — Падтрымка Свідрыгайлам татарскага хана Сеід-Ахмеда.

31 мая 1434 г. — Смерць Ягайлы Альгердавіча.

18 чэрвеня 1434 г. — Абранне польскім каралём Уладзіслава Ягайлавіча.

Май 1434 г. — Паход на Віцебск Жыгімонта Кейстутавіча.

1435 г. — Бітва пад Вількамірам. Паражэнне Свідрыгайлы.

1436 г. — Мірная дамова паміж Жыгімонтам Кейстутавічам і Ордэнам.

1437 г. — Пераход Полацка і Віцебска на бок Жыгімонта Кейстутавіча.

1439 г. — Уцёкі Свідрыгайлы ў Малдавію.

10 сакавіка 1440 г. — Забойства Жыгімонта Кейстутавіча.

1440 г. — Абранне вялікім князем Літоўскім і Рускім Казіміра Ягайлавіча.

29 чэрвеня 1440 г. — Каранацыя ў Вільні Казіміра Ягайлавіча.

1440—1492 гг. — Княжанне ў ВКЛ Казіміра Ягайлавіча.

1440 г. — Паўстанне жамойтаў і смалян. Захоп князем Баляславам Мазавецкім Падляшша.

1443 г. — Вайна ВКЛ з Мазовіяй.

2 мая 1447 г. — Прывілеі Казіміра князям, панам, шляхце і мяшчанам ВКЛ.

5 чэрвеня 1447 г. — Каранацыя Казіміра Ягайлавіча на Польскае Каралеўства.

Жнівень 1447 г. — Адмова літвінскай дэлегацыі на Петркоўскім сойме заключыць унію паміж ВКЛ і Польшчаю.

Май 1448 г. — Паўторная адмова літвінскай дэлегацыі на Люблінскім сойме заключыць унію паміж ВКЛ і Польшчаю.

1448 г. — Паўстанне Міхайлы Жыгімонтавіча.

1449 г. — Саюзная дамова ВКЛ з Цвярскім княствам. Паход літвінскага войска пад Калугу. Мір з Масковіяй.

10 лютага 1452 г. — Смерць Свідрыгайлы Альгердавіча.

Зіма 1452 г. — Пераход Валыні пад уладу ВКЛ. Смерць Міхайлы Жыгімонтавіча.

Май 1453 г. — Віленскі сойм. Замах на Казіміра Ягайлавіча.

1455—1456 гг. — Апазіцыя групоўкі Яна Гаштольда Казіміру Ягайлавічу.

1458 г. — Прыняцце царкоўнай уніі мітрапалітам Рыгорам.

Снежань 1463 г. — Патрабаванне апазіцыяй адмовы Казіміра ад польскай кароны.

1468 г. — «Судзебнік Казіміра».

1469 г. — Саюз ВКЛ з Залатой Ардой.

1470 г. — Міхайла Алелькавіч наўгародскі намеснік. Жаданне Ноўгарада далучыцца да ВКЛ. Скасаванне Кіеўскага княства. Паражэнне Ноўгарада ў вайне з Масквою.

1480 г. — Змова супраць Казіміра. Саюз ВКЛ з Залатой Ардой.

1 верасня 1482 г. — Разбурэнне Кіева крымскімі татарамі.

7 чэрвеня 1492 г. — Смерць Казіміра Ягайлавіча.

20 ліпеня 1492 г. — Абранне на Гарадзенскім сойме вялікім князем Літоўскім і Рускім Аляксандра Казіміравіча.

6 жніўня 1492 г. — Прывілеі Аляксандра прымаць дзяржаўныя рашэнні са згоды паноў-рады.

1492—1494 гг. — Вайна ВКЛ з Масковіяй.

1494 г. — Шлюб Аляксандра Казіміравіча з Аленай Іванаўнай, маскоўскай княгіняй.

Студзень 1497 г. — Сумесны паход польска-літвінскага войска на Малдавію.

14 мая 1499 г. — Унія («ровное злучанье») Польшчы і ВКЛ.

1500 г. — Пачатак новай вайны ВКЛ з Масковіяй.

14 ліпеня 1500 г. — Бітва на рацэ Ведрашы. Палон гетмана К.Астрожскага.

Восень 1500 г. — Аблога маскоўскім войскам Смаленска.

3 сакавіка 1501 г. — Саюзная дамова ВКЛ з Лівонскім ордэнам супраць Масковіі.

23 кастрычніка 1501 г. — Падпісанне Аляксандрам Казіміравічам Мельнікскай уніі ВКЛ і Польшчы.

12 студзеня 1501 г. — Аляксандр Казіміравіч карануецца на Польскае каралеўства.

Ліпень 1502 г. — Аблога маскоўскім войскам Смаленска.

Жнівень 1502 г. — Паход крымскіх татар на ВКЛ.

1503 г. — Перамір'е ВКЛ з Масковіяй. Пераход да Масковіі Чарнігаўскай, Бранскай, Гомельскай, Ноўгарад-Северскай земляў.

1505 г. — Берасцейскі сойм. Канфлікт Аляксандра Казіміравіча з панамі-радай. Набег крымскіх татар на ВКЛ і аблога імі Слуцка.

Лета 1506 г. — Паход крымскіх татар на ВКЛ.

5 жніўня 1506 г. — Перамога войска ВКЛ над крымскімі татарамі пад Клецкам.

20 жніўня 1506 г. — Смерць вялікага князя Літоўскага і Рускага, польскага караля Аляксандра Казіміравіча.

БІБЛІЯГРАФІЯ

РАГВАЛОДАЎ РОД

1. Полное собрание русских летописей. Т. 1. М., 1962. С. 299. Далее: ПСРЛ.
2. ПСРЛ. Т. 2. М., 1962. Стб. 63.
3. *Морошкин М.* Славянский именослов. СПб., 1867. С. 158.
4. *Рыч В.* Звесткі пра Беларусь у ісландскіх сагах // Беларусіка Albaru-thenica G. Ч. 2. Мн., 1997. С. 172.
5. *Беляев Н.* Рорик Ютландский и Рюрик начальной летописи // Сб. статей по археологии и византиноведению. Т. 3. Прага, 1929. С. 264.
6. Сочинения императрицы Екатерины II. Т. 10. СПб., 1901. С. 8.
7. ПСРЛ. Т. 15. М., 1965. С. 21—22.
8. *Гаусман М.* Исторический очерк М. Турова. Мн., 1877. С. 2—3.
9. *Татищев В.И.* История Российская. Т. 1. М.-Л., 1962. С. 111.
10. *Софонович Ф.* Хроніка з літописців стародавніх. Київ, 1992. С. 63.
11. *Забелин И.* История русской жизни. Ч. 2. СПб., 1864. С. 253.
12. Повесть временных лет. Ч. 1. М.-Л., 1950. С. 54. Далее: ПВЛ.
13. Там же.
14. *Руднев В.А.* Слово о князе Владимире. М., 1989. С. 84.
15. Там же.
16. Татищев В.И. Указ. соч. Т. 1. С. 111.
17. Там же. С. 112.
18. ПВЛ. Ч. 1. С. 54.
19. Там же.
20. *Руднев В.А.* Указ. соч. С. 87.
21. ПВЛ. Ч. 1. С. 55.
22. Великая хроника о Польше, Руси и их соседях XI—XII вв. М., 1987. С. 70, 211.
23. ПВЛ. Ч. 1. С. 57.
24. ПСРЛ. Т. 1. С. 299.
25. *Латвийский Г.* Хроника Ливонии. М.-Л., 1938. С. 250.
26. *Урбан П.* У сьвятле гістарычных фактаў. Мюнхэн—Нью Ёрк, 1972. С. 19.
27. Там жа. С. 21.
28. *Руднев В.А.* Указ. соч. С. 147.
29. Легенды і паданні. Мн., 1983. С. 230.
30. ПСРЛ. Т. 9. М., 1965. С. 687.

«АКАЯННЫ»

1. Легенды і паданні. С. 281.
2. ПВЛ. Ч. 1. С. 91—98.
3. *Фортинский Ф.Л.* Титмар Мерзебургский и его хроника. СПб., 1872. С. 198.
4. *Рыдзевская Е.А.* Древняя Русь и Скандинавия. М., 1978. С. 31.
5. Там же.С. 93.
6. Там же.
7. Там же.
8. Там же. С. 94.
9. Там же.

10. *Головко А.* Кто убил Бориса и Глеба? // Наука и религия. 1988. № 2. С. 30.
11. Там же.
12. Там же.
13. *Рыдзевская Е.А.* Указ. соч. С. 97—98.
14. Там же. С. 98.
15. Там же. С. 99.
16. Там же. С. 100.
17. *Фортинский Ф.Л.* Указ. соч. С. 198.
18. ПВЛ. Ч. 1. С. 97.
19. Там же.
20. Там же.
21. Там же. С. 98.
22. Там же.
23. *Długosz J.* Dziela wszystkie dzejow Polskich. T. 1. Ks. I—IV. Krakow, 1867. S. 178.

УНУК РАГВАЛОДА

1. ПВЛ. Ч. 1. С. 99.
2. *Рыдзевская Е.А.* Указ. соч. С. 101.
3. Там же.
4. Там же.
5. *Długosz J.* Op. cit. S. 179.
6. *Рыдзевская Е.А.* Указ. соч. С. 102.
7. *Długosz J.* Op. cit. S. 179.
8. *Рыдзевская Е.А.* Указ. соч. С. 102.
9. *Заяц Ю.* Менская зямля: этапы фарміравання // Беларускі гістарычны часопіс. 1993. № 4. С. 11.

ВЕШЧАЯ ДУША

1. *Ліньнікава М.* Новае пра Усяслава Чарадзея // Спадчына. 1994. № 3. С. 70—71.
2. *Станкевіч Я.* Хрышчоныя імёны велікалітоўскія (беларускія) // Спадчына. 1993. № 1. С. 78.
3. Слово о плъку Игореве // Старажытная беларуская літаратура. Мн., 1990. С. 81.
4. Тамсама.
5. ПВЛ. Ч. 1. С. 112.
6. Там же. С. 114.
7. Там же.
8. Там же.
9. *Długosz J.* Op. cit. S. 285.
10. *Татищев В.И.* Указ. соч. Т. 4. М.-Л., 1964. С. 155.
11. ПВЛ. Ч. 1. С. 122.
12. Воспоминание о древнем православии Западной Руси. М., 1867. С. 170, 179.
13. Поучения Владимира Мономаха // Хрестоматия по истории Белоруссии. Мн., 1977. С. 14.

НЯСПРАЎДЖАНЫЯ ПАДЗЕІ

1. ПСРЛ. Т. 32. М., 1975. С. 22—23.
2. *Дмитриева Г.* Сказание о князьях Владимирских. М.-Л., 1955. С. 138.
3. *Софонович Ф.* Указ. соч. С. 101.
4. Там же. С. 84.
5. Там же.
6. Там же. С. 84—85.
7. ПВЛ. Ч. 1. С. 201.
8. Воспоминание о древнем православии Западной Руси. С. 161—162.
9. *Narbutt T.* Dzeje narodu Litewskiego. T. 3. Wilno, 1838. S. 270—273. Далее: Narbutt. T. Dzeje.
10. *Заяц Ю.* Указ. сач. С. 13.

У ЧАСЫ МІЖУСОБІЦ

1. *Татищев В.И.* Указ. соч. Т. 2. М.-Л., 1963. С. 139.
2. Там же. С. 142.
3. Сочинения императрицы Екатерины II. Т. 10. С. 37—38.
4. ПСРЛ. Т. 32. С. 23.
5. Там же. Т. 2. Стб. 494.
6. Там же.
7. Там же.
8. Там же.
9. Там же.
10. Там же.
11. Там же. Т. 7. СПб., 1856. С. 164—166.
12. *Stryjkowski M.* Kronika Polska, Litewska, Żmudska i wszystkiej Rusi. T. 1. W-wa, 1846. S. 286.

ЗА ДВА СТАГОДДЗІ ДА ГРУНВАЛЬДА

1. *Латвийский Г.* Указ. соч. С. 248.
2. Livlandische Reimhronik. Padebron, 1876. V. 645—648.
3. *Латвийский Г.* Указ. соч. С. 251.
4. *Чешихин Е.* История Ливонии с древнейших времен. Т. 1. Рига, 1884. С. 262.
5. *Татищев В.И.* Указ. соч. Т. 3. М.-Л., 1964. С. 141.
6. *Ермаловіч М.І.* Старажытная Беларусь. Мн., 1990. С. 242.
7. Тамсама. С. 243.
8. *Татищев В.И.* Указ. соч. Т. 3. С. 127—128.
9. *Ермаловіч М.І.* Указ. твор. С. 244.
10. *Татищев В.И.* Указ. соч. Т. 3. С. 160.
11. *Латвийский Г.* Указ. соч. С. 84.
12. Там же. С. 90.
13. Там же.
14. Там же. С. 91.
15. Там же. С. 115.
16. Там же. С. 113.
17. Там же.
18. Там же. С. 115—116.
19. Там же. С. 116.
20. Там же. С. 152.
21. *Чешихин Е.* Указ. соч. С. 57.
22. *Латвийский Г.* Указ. соч. С. 224.
23. Там же. С. 226.
24. Там же. С. 227.

ПАДМАНЛІВАЯ ВЕЛІЧ

1. Легенды і паданні. С. 392—393.
2. Тамсама. С. 393.
3. Тамсама. С. 392—393.
4. ПСРЛ. Т. 2. Стб., 776.
5. *Ермаловіч М.І.* Указ. твор. С. 316.
6. ПСРЛ. Т. 2. Стб., 818.
7. *Stryjkowski M.* Op. cit. T. 1. S. 267.
8. *Поболь Л.Д.* Древности Белоруссии в музеях Польши. Мн., 1979. С. 112.
9. *Stryjkowski M.* O początkach. W-wa, 1978. S. 93.
10. Хроника Быховца. М., 1966. С. 57, 54.
11. ПСРЛ. Т. 32. С. 64.
12. *Урбан П.* Указ. твор. С. 64—65.
13. Тамсама. С. 67—68.
14. *Voigt J.* Geschichte Preussens. Bd. 1. Königsberg, 1827. P. 621.
15. *Юргевич В.* Опыт объяснения имен литовских князей // Чтения в Императорском обществе истории и древностей российских. М., 1883. Кн. 3. С. 26.
16. *Бірыла М.П.* Беларуская антрапанімія. Мн., 1969. С. 283—285.
17. *Урбан П.* Старажытныя ліцьвіны. Мн., 2001. С. 173.
18. ПСРЛ. Т. 32. С. 26.
19. Livlandische Reimhronik. P. 630.
20. *Семянчук Г., Шаланда А.* Да пытання аб пачатках Вялікага княства Літоўскага ў сярэдзіне XIII ст. (яшчэ адна версія канструявання мінуўшчыны) // Białoruskie Zeszyty Historyczne. Białystok, 1999. № 11. S. 33.
21. Сочинения императрицы Екатерины II. Т. 10. С. 95.
22. *Топоров В.Н.* Об одной «ятвяжской» мифологеме в связи со славянской параллелью // Acta Baltico-Slavica. T. 3. Białystok, 1966. S. 143.
23. ПСРЛ. Т. 2. Стб. 827—828.
24. *Седов В.* Курганы ятвягов // Советская археология. 1964. № 4. С. 37.
25. *Гудавичюс Э.* «Литва Миндовга» // Проблемы этногенеза и этнической истории балтов. Вильнюс, 1985. С. 225.
26. Skarbiec diplomatov. T. 1. Wilno, 1860. S. 82.
27. Великая хроника. С. 186.
28. *Зверуго Я.Г.* Верхнее Понеманье в IX—XII вв. Мн., 1989. С. 159.
29. Там же. С. 155.
30. *Ермаловіч М.І.* Па слядах аднаго міфа. Мн., 1989. С. 59.
31. ПСРЛ. Т. 2. Стб. 815.
32. Новгородская первая летопись. М.-Л., 1950. С. 85. Далее: НПЛ.
33. ПСРЛ. Т. 2. Стб. 862.
34. Там же. Стб. 858.
35. *Чешихин Е.* Указ. соч. Т. 2. С. 18.

36. ПСРЛ. Т. 2. Стб. 815.
37. Там же.
38. Там же.
39. Легенды і паданні. С. 392—393.
40. ПСРЛ. Т. 32. С. 208—209.
41. *Stryjkowski M.* О początkach. S. 196.
42. Летопись Рюссова // Сб. материалов и статей по истории Прибалтийского края. Т. 2. Рига, 1879. С. 201.
43. Хроника Быховца. С. 42.
44. Летопись Рюссова. С. 201.
45. *Чешихин Е.* Указ. соч. Т. 2. С. 39.
46. Skarbiec diplomatov. T. 1. S. 79.
47. Ibid.
48. ПСРЛ. Т. 2. Стб. 818.
49. Там же.
50. *Narbutt T.* Powniejsze pisma historyczhe. Wilno, 1856. S. 22—24.
51. ПСРЛ. Т. 2. С. 342.
52. *Voigt J.* Op. cit. Bd. 3. P. 38.
53. Skarbiec diplomatov. T. 1. S. 82, 94.
54. *Latkowski J.* Mendog krol Litewski. Krakow, 1892. S. 65.
55. ПСРЛ. Т. 2. Стб. 819.
56. Там же.
57. Там же.
58. *Stryjkowski M.* Kronika. T. 1. S. 287.
59. ПСРЛ. Т. 2. Стб. 817.
60. *Ермаловіч М.І.* Па слядах аднаго міфа. С. 53.
61. ПСРЛ. Т. 32. С. 208.
62. Livlandische Reimehronik. V. 6471—6513.
63. Великая хроника. С. 186.
64. Там же.
65. Livlandische Reimehronik. V. 6514—6585.
66. Великая хроника. С. 247.
67. ПСРЛ. Т. 2. Стб. 860.
68. *Narbutt T.* Dzeje. T. 4. Wilno, 1838. S. 211—212.
69. *Latkowski J.* Op. cit. S. 125.
70. *Narbutt T.* Dzeje. T. 1. Wilno, 1835. S. 375.
71. *Latkowski J.* Op. cit. S. 125.
72. *Сапунов А.* Река Западная Двина. Витебск, 1893. С. 66.

НАВАГРАДСКІ КНЯЗЬ

1. ПСРЛ. Т. 2. Стб. 858.
2. *Макарий.* История Русской церкви. Кн. 3. Т. 4. М., 1995. С. 86.
3. *Софонович Ф.* Указ. соч. С. 158.
4. *Stryjkowski M.* Kronika. T. 1. S. 248.
5. Сочинения императрицы Екатерины II. Т. 10. С. 295.
6. НПЛ. С. 85.
7. ПСРЛ. Т. 10. М., 1965. С. 144.
8. Там же. Т. 2. Стб. 862.
9. Там же.
10. НПЛ. С. 123.
11. *Ермаловіч М.І.* Па слядах аднаго міфа. С. 81.
12. *Софонович Ф.* Указ. соч. С. 158.
13. *Wlodarski B.* Rywa Lizacja oziemie Pruskiej w polowe XIII w. // Roczniki TNT. 1958. R. 61. S. 183.
14. ПСРЛ. Т. 10. С. 144.
15. Там же. Т. 2. Стб. 868.
16. Там же.
17. Там же. Стб. 868.
18. Сочинения императрицы Екатерины II. Т. 10. С. 299.

СЛАЎНЫ ВАЛАДАР

1. ПСРЛ. Т. 32. С. 32.
2. Там же. Т. 17. СПб., 1907. С. 612.
3. Витебская старина. Т. 4. Ч. 2. Витебск, 1885. С. 50.
4. ПСРЛ. Т. 35. М., 1980. С. 132.
5. Там же. Т. 2. Стб. 869.
6. Там же. Т. 32. С. 32.
7. Там же. Т. 2. Стб. 871.
8. Там же.
9. Там же. Стб. 873.
10. Спутник. 1989. № 11. С. 56.
11. ПСРЛ. Т. 2. Стб. 877.
12. Там же.
13. Там же.
14. Там же.
15. Там же.
16. *Stryjkowski M.* Kronika. T. 1. S. 312.
17. *Narbutt T.* Dzeje. T. 4. S. 281.

СНЫ АБ РАДЗІМЕ

1. Псковские летописи. М., 1950. Вып. 2. С. 16. Далее: ПЛ.
2. Там же. С. 17.
3. Там же. С. 84.
4. Там же. С. 8, 87.

МЕЧ І СЛАВА

1. Петр из Дусбурга. Хроника земли Прусской. М., 1997. С. 173.
2. Там же. С. 164.
3. Там же. С. 164—165.
4. Там же. С. 170.
5. Там же. С. 180.
6. ПЛ. Вып. 2. С. 22.
7. Gedimino. Laiškai. Vilnius, 1966. S. 62—64.
8. Петр из Дусбурга. Указ. соч. С. 181.
9. *Narbutt T.* Dzeje. T. 4. S. 570.

ВІЦЯЗЬ ПАГОНІ

1. ПСРЛ. Т. 35. С. 151.
2. Петр из Дусбурга. Указ. соч. С. 148.
3. Живописная Россия. Т. 3. М. СПб., 1882. С. 293.
4. Сборник Российского исторического общества. Т. 71. СПб., 1892. С. 108. Далее: Сб. РИО.
5. *Цітоў А.К.* Гарадская геральдыка Беларусі. Мн., 1989. С. 45.
6. Временник Московского общества истории и древностей российских. Кн. 10. М., 1851. С. 75.
7. *Chodynicki K.* Ze studjow nad dziej opisarstwem Rusko-Litewskiem // Ateneum Wileńskie. Wilno, 1925—26. R. III. Z. 10—11. S. 400.
8. *Narbutt T.* Dzieje. T. 1. S. 158—160.
9. Задонщина // Изборник. М., 1987. С. 192.
10. *Ochmański J.* Giedyminowicze — «prawnuki Skolomedowy» // ARS historica. Poznań, 1976. S. 256.
11. Петр из Дусбурга. Указ. соч. С. 148.
12. Там же. С. 318.
13. *Puzyna J.* Kim był i jak cię naprawdę nazywał Pukuwer, ojciec Gedymina // Ateneum Wileńskie. Wilno, 1935. R. X. S. 27.
14. Ibid.
15. *Zajączkowski S.* Przyczynki do gipotezy o pochodzeniu dynastji Gedymina ze Żmudzi // Ibid. 1927. R. IV. Z. 13. S. 409.
16. Петр из Дусбурга. Указ. соч. С. 155.
17. ПСРЛ. Т. 1. СПб., 1846. С. 207.
18. Там же. Т. 2. С. 343.
19. Там же. Т. 32. С. 35.
20. Петр из Дусбурга. Указ. соч. С. 140.
21. *Panucevic V.* Żamojdz i Litva. Roznyja krainy i narody. T. 1. Chicago, 1953—54. S. 300.
22. Хроника Быховца. С. 49.
23. ПСРЛ. Т. 2. Стб. 831.
24. Gedimino. Op. cit. S. 25.
25. Ibid. S. 31.
26. Ibid.
27. Русско-Ливонские акты. СПб., 1868. С. 21.
28. Сочинения императрицы Екатерины II. Т. 11. СПб., 1906. С. 65.
29. Петр из Дусбурга. Указ. соч. С. 148.
30. Там же.
31. Там же. С. 149.
32. ПСРЛ. Т. 32. С. 34.
33. Петр из Дусбурга. С. 149.
34. Там же. С. 152.
35. Там же. С. 163.
36. *Чешихин Е.* Указ. соч. Т. 2. С. 168.
37. *Пашуто В.Т.* Образование Литовского государства. М., 1959. С. 417.
38. Хрестоматия по истории Белоруссии. Мн., 1977. С. 22.
39. *Татищев В.И.* Указ. соч. Т. 1. С. 357., 440; Т. 2. С. 311.
40. Хрестоматия по истории Белоруссии. С. 25.
41. *Ластоўскі В.* Гісторыя беларускай (крыўскай) кнігі. Каўнас, 1926. С. 60.
42. *Ленсу Я.* Зэўс — прататып вершніка з Пагоні? // Спадчына. 1993.

№ 1. С. 60.
43. ПСРЛ. Т. 32. С. 35.
44. Петр из Дусбурга. Указ. соч. С. 168.
45. Там же.

ДОБРЫ ВАЛАДАР

1. Русско-Ливонские акты. С. 30.
2. *Пашуто В.Т.* Указ. соч. С. 392.
3. ПСРЛ. Т. 32. С. 35.
4. Там же. С. 36.
5. Там же.
6. Там же.
7. Там же.
8. *Ткачев М.* Замки Белоруссии. Мн., 1987. С. 14; Живописная Россия. Т. 3. С. 140.
9. Хроника Быховца. С. 53—54.
10. Дневник посольства главного начальника госпиталя Тевтонского ордена графа Конрада Кибурга к великому князю Витовту // Записки Императорского Новороссийского ун-та. Одесса, 1868. Вып. 1. Т. 2. С. 13.
11. *Голубович В., Голубович Е.* Кривой город — Вильно // Краткие сообщения Ин-та истории материальной культуры. М., 1945. Вып. 11. С. 116.
12. *Marburg W.* Cronica nova Pentenica // Seritores Rerum Preussicarum. Leipzig, Bd. 2. 1863. P. 623.
13. *Кибург К.* Указ. соч. С. 16—17.
14. Там же. С. 15.
15. Хроника Быховца. С. 50—51.
16. *Антонович В.Б.* Монографии по истории Западной и Юго-Западной России. Т. 1. Киев, 1885. С. 47—58.
17. Там же. С. 52.
18. *Чешихин Е.* Указ. соч. Т. 2. С. 167.
19. Gedemino. Op. cit. S. 23—27.
20. Ibid. S. 35.
21. Ibid. S. 41.
22. Русско-Ливонские акты. С. 36.
23. *Чешихин Е.* Указ. соч. Т. 2. С. 190.
24. Там же.
25. Gedemino. Op. cit. S. 168.
26. *Васильевский В.Г.* Обращение Гедимина в католичество // Журнал м-ва нар. просвещения. СПб., 1872. Ч. CLIX. С. 177. Далее: ЖМНП.
27. Gedemino. Op. cit. S. 119.
28. Ibid. S. 120.
29. Ibid. S. 126.
30. Ibid. S. 127—128.
31. *Васильевский В.Г.* Указ. соч. С. 185.
32. Gedemino. Op. cit. S.135.
33. Ibid. S. 144.
34. Ibid.
35. Ibid. S. 177.
36. *Чешихин Е.* Указ. соч. Т. 2. С. 202.
37. *Narbutt T.* Dzeje. T. 4. S. 588.
38. Ibid.
39. Gedemino. Op. cit. S. 194.
40. Петр из Дусбурга. Указ. соч. С. 184.
41. *Никжянтайтис А.* Гедиминас // Вильнюс. 1990. № 4. С. 149.

ВЯЛІКІ СЛАВАЙ

1. ПСРЛ. Т. 32. С. 41—42.
2. *Narbutt T.* Dzeje. T. 5. Wilno, 1839. S. 236—237.
3. *Stryjkowski M.* Kronika. T. 2. W-wa, 1846. S. 2.
4. Хроника Быховца. С. 56.
5. ПЛ. Вып. 2. С. 24.
6. ПСРЛ. Т. 11. М., 1965. С. 11.
7. ПЛ. Вып. 2. С. 25.
8. Там же.
9. Хроника Быховца. С. 55.
10. ПСРЛ. Т. 35. С. 133.
11. Там же. Т. 32. С. 42.
12. Там же.
13. Хроника Быховца. С. 57.
14. Там же.
15. Там же.
16. ПСРЛ. Т. 32. С. 43.
17. Хроника Вартерберга. С. 105.
18. Хроника Быховца. С. 58.
19. Там же. С. 59.
20. Там же.
21. *Prochaska A.* Czy istnial krywe na Litwe // Kwartalnik Historyczny. Lwow, 1904. R. 18. Z. 3—4. S. 485—486.

22. НПЛ. С. 358.
23. Там же. С. 359.
24. *Антонович В.Б.* Указ. соч. С. 105.
25. Хроника Вартерберга. С. 108.
26. Сочинения императрицы Екатерины II. Т. 11. С. 141.
27. Хроника Быховца. С. 57.
28. Хроника Вартерберга. С. 108.
29. Там же.
30. ПСРЛ. Т. 10. С. 228.
31. Сочинения императрицы Екатерины II. Т. 11. С. 166.
32. *Marburg W.* Op. cit. Bd. 2. P. 527.
33. Ibid. P. 534—535.
34. ПСРЛ. Т. 32. С. 43.
35. *Шабульдо Ф.М.* Земли Юго-Западной Руси в составе Великого княжества Литовского. Киев, 1987. С. 71—72.
36. ПСРЛ. Т. 32. С. 43.
37. Там же.
38. Хроника Вартерберга. С. 111.
39. Хроника Быховца. С. 59.
40. *Кибург К.* Указ. соч. С. 40.
41. Хроника Быховца. С. 59.
42. *Кибург К.* Указ. соч. С. 41.
43. *Marburg W.* Op. cit. Bd. 2. P. 557.
44. Хроника Вартерберга. С. 113.
45. ПСРЛ. Т. 11. С. 11.
46. Хроника Быховца. С. 58.
47. *Stryjkowski M.* Kronika. T. 2. S. 13.
48. *Чешихин Е.* Указ. соч. Т. 2. С. 369.
49. Хроника Вартерберга. С. 118.
50. Там же. С. 119.
51. Там же. С. 133.
52. *Marburg W.* Op. cit. Bd. 2. P. 566.
53. Хроника Вартерберга. С. 130.
54. *Narbutt T.* Dzeje. T. 5. S. 193.
55. *Иловайский Д.* История России. Т. 2. СПб., 1884. С. 99.
56. *Шайноха К.* Ядвига и Ягайло. Т. 1. М., 1880. С. 265.
57. Хроника Вартерберга. С. 131.
58. Там же.
59. ПСРЛ. Т. 11. С. 10—11, 26.

ЧАС ПОДЗВІГУ НАДЫШОЎ

1. Задонщина. С. 192.
2. *Геденштейн Р.* Записки о московской войне. СПб., 1884. С. 88.
3. ПЛ. Вып. 2. С. 99.
4. Хроника Вартерберга. С. 128.
5. ПСРЛ. Т. 11. С. 50.
6. Там же. С. 42.
7. *Тарасаў К.* Памяць пра легенды. Мн., 1990. С. 67.
8. ПСРЛ. Т. 32. С. 51.
9. Там же. Т. 11. С. 56.
10. Повести о Куликовской битве. М., 1959. С. 35.
11. *Костомаров Н.И.* Русская история. М., 1991. С. 604—605.
12. Хрестоматия по истории Белоруссии. С. 30.

СЛАЎНЫ ВА ЎСІХ ЗЕМЛЯХ

1. *Корчинский И.* Витовт Великий. Каунас, 1930. С. 8.
2. *Унбегаун Б.* Русские фамилии. М., 1989. С. 241.
3. Slownik Starożytnośći Słowiańskieh. W-wa, 1975. S. 169.
4. *Юргевич В.* Указ. соч. С. 25.
5. *Урбан П.* Старажытныя ліцьвіны. С. 137.
6. *Шайноха К.* Указ. соч. Т. 1. С. 315.
7. Там же.
8. Wasilewski T. Op. cit. S. 32.
9. Suchenwirt P. Werke, heransgeg von Primissier. Wien, 1827. P. 11—13.
10. *Marburg W.* Op. cit. Bd. 2. P. 605.
11. *Narbutt T.* Dzeje. T. 5. S. 260.
12. *Чешихин Е.* Указ. соч. Т. 2. С. 395.
13. *Костамаров Н.И.* Бунт Стеньки Разина. М., 1994. С. 451.
14. Хроника Быховца. С. 61.
15. Там же.
16. Там же.
17. Там же. С. 62.
18. *Marburg W.* Op. cit. Bd. 2. P. 286.
19. Хроника Быховца. С. 63—64.
20. Там же. С. 65.
21. *Кибург К.* Указ. соч. С. 36.
22. Там же.
23. *Корчинский И.* Указ. соч. С. 15.
24. *Смирнов М.* Ягело-Яков-Владислав и первое соединение Литвы с Польшею // Записки Императорского Новороссийского

ун-та. Одесса, 1868. Т. 2. Вып. 1—6. С. 40.
25. Kodex dyplomatyczny Litwy. Wroclawia, 1845. S. 60.
26. *Малиновский И.* Рада Великого княжества Литовского в связи с боярской думой Древней Руси. Ч. 2. Вып. 1. Томск, 1904. С. 84.
27. Kodex dyplomatyczny Litwy. S. 62—63.
28. *Шайноха К.* Указ. соч. Т. 2. С. 10.
29. *Vojgt J.* Op. cit. Bd. 5. P. 437.
30. *Narbutt T.* Dzeje. T. 5. S. 20.
31. Хроника Быховца. С. 65.
32. *Długosz J.* Roczniki czuli kroniki Sławnego Krolewstwa Polskiego. Ks. 10. W-wa, 1981. S. 189; Далее: Roczniki.
33. Ibid.
34. Ibid. S. 190.
35. *Шайноха К.* Указ. соч. Т. 2. С. 49.
36. Там же. С. 118.
37. Там же. С. 123.
38. Там же. С. 118.
39. Там же. С. 147.
40. *Vojgt J.* Op. cit. Bd. 3. P. 185.
41. *Шайноха К.* Указ. соч. Т. 2. С. 54.
42. Там же. С. 56.
43. *Suchenwirt P.* Op. cit. P. 67.
44. Хроника Быховца. С. 69.
45. *Wapowski B.* Dzieje korony Polskiej i Wielkiego księstwa Litewskiego otod roku 1380 do 1535. T. 1. Wilno, 1847. S. 75.
46. *Narbutt T.* Dzieje. T. 5. S. 402.
47. *Kolankowski L.* Dzieje Wielkiego Xięstwa Litewskiego za Jagiellonow. T. 1. W-wa, 1930. S. 48.
48. *Vojgt J.* Op. cit. Bd. 5. P. 533.
49. *Длугош Я.* Грюнвальдская битва. М.-Л., 1962. С. 17.
50. *Długosz J.* Roczniki. Ks. 10. S. 212.
51. ПСРЛ. Т. 35. С. 158.
52. *Чешихин Е.* Указ. соч. Т. 2. С. 420.
53. *Vojgt J.* Op. cit. Bd. 5. P. 520.
54. Ibid. P. 577.
55. Хроника Быховца. С. 70.
56. *Длугош Я.* Указ. соч. С. 24.
57. Там же. С. 25.
58. *Шайноха К.* Указ. соч. Т. 2. С. 390.
59. Хроника Быховца. С. 72.
60. *Длугош Я.* Указ. соч. С. 29.
61. *Korotyński W.* Otrucie dzieci Witolda // Tygodnik powszechny. 1879. № 2. S. 22.
62. Хроника Быховца. С. 72.
63. ПСРЛ. Т. 32. С. 70.
64. Там же.
65. Хроника Быховца. С. 72.
66. Легенды і паданні. С. 302.
67. *Narbutt T.* Dzieje. T. 6. Wilno, 1839. S. 555.
68. ПСРЛ. Т. 32. С. 73.
69. Там же. С. 71.
70. *Длугош Я.* Указ. соч. С. 32.
71. Там же.
72. Хроника Быховца. С. 74.
73. *Przezdziecki A.* Życie domowe Jadwigi i Jagełły z regestrow skarbowych 1388—1417. W-wa, 1854. S. 55.
74. Кибург К. Указ. соч. С. 3—5.
75. Там же. С. 6—7.
76. Там же. С. 16—18.
77. Там же. С. 12.
78. Там же. С. 15.
79. Там же. С. 20.
80. Там же. С. 19.
81. Там же. С. 21.
82. Там же. С. 21.
83. Там же. С. 32—36.
84. *Stryjkowski M.* Kronika. T. 2. S. 534.
85. *Гильденбрант Г.* Немецкая контора в Полоцке // Сб. мат. и ст. по ист. Прибалтийского края. Т. 2. С. 55.
86. *Długosz J.* Roczniki. Ks. 11. W-wa, 1985. S. 318.
87. Ibid. S. 323.
88. *Narbutt T.* Dzeije. T. 6. S. 556.
89. ПСРЛ. Т. 11. С. 172.
90. *Prochaska A.* Uklad Tohtamysza z Witoldem // Przegląd Historyczhy. 1912. T. 15. S. 260.
91. *Narbutt T.* Dzeije. T. 5. S. 612.
92. Ibid. S. 594.
93. *Posilge J.* Chronik des Landes Preussen // Scriptores Rerum

Prussia-carum. Bd. 3. Leipzig, 1866. P. 224.
94. *Чешихин Е.* Указ. соч. Т. 2. С. 436.
95. *Иловайский Д.* Указ. соч. Т. 2. С. 200.
96. ПСРЛ. Т. 11. С. 172.
97. Там же. С. 173.
98. Там же.
99. Там же.
100. *Długosz J.* Roczniki. Ks. 10. S. 296.
101. ПСРЛ. Т. 32. С. 76.
102. *Wapowski B.* Op. cit. T. 1. S. 137.
103. ПСРЛ. Т. 32. С. 76.
104. *Długosz J.* Roczniki. Ks. 10. S. 297.
105. ПСРЛ. Т. 11. С. 174.
106. Там же.
107. Подлинный родослов Глинских князей // Временник Московского об-ва истории и древностей Российских. Кн. 10. С. 195.
108. *Wapowski B.* Op. cit. T. 1. S. 140.
109. *Шайноха К.* Указ. соч. Т. 2. С. 26.
110. *Иловайский Д.* Указ. соч. Т. 2. С. 202.
111. *Соловьев С.М.* История России с древнейших времен. Кн. 2. Т. 3—4. М., 1988. С. 364.
112. *Narbutt T.* Dzeije. T. 6. S. 19.
113. Ibid. S. 34.
114. Ibid. S. 53.
115. Ibid.
116. *Длугош Я.* Указ. соч. С. 36.
117. *Narbutt T.* Dzeije. T. 6. S. 24.
118. Ibid. S. 66.
119. *Коцебу А.* Свидригайло, великий князь Литовский. СПб., 1855. С. 55.
120. ПСРЛ. Т. 11. С. 189—190.
121. *Соловьев С.М.* Указ. соч. Кн. 2. С. 367.
122. ПЛ. Вып. 1. С. 28.
123. Там же.
124. *Narbutt T.* Dzeije. T. 6. S. 102.
125. Ibid.
126. *Prochaska A.* Dzieje Witołda w. ksiecia Litwy. Wilno, 1914. S. 94.
127. *Длугош Я.* Указ. соч. С. 43.
128. *Соловьев С.М.* Указ. Соч. Кн. 2. С. 371.
129. ПСРЛ. Т. 11. С. 208
130. *Длугош Я.* Указ. соч. С. 36.
131. ПСРЛ. Т. 32. С. 149.
132. *Карамзин Н.М.* Предания веков. М., 1988. С. 379.
133. Хроника Быховца. С. 76—77.
134. *Lewicki A.* Powstanne Swidrygełły. Krakow, 1892. S. 59.
135. *Шайноха К.* Указ. соч. Т. 2. С. 590.
136. Codex epistolaris Vitoldi. Cracoviae, 1882. P. 411.
137. *Vojgt V.* Op. cit. Bd. 7. P. 43.
138. *Длугош Я.* Указ. соч. С. 47.
139. Там же. С. 48—49.
140. *Wapowski B.* Op. cit. T. 1. S. 215.
141. *Шайноха К.* Указ. соч. Т. 2. С. 601.
142. *Длугош Я.* Указ. соч. С. 54.
143. *Vojgt V.* Op. cit. Bd. 7. P. 62.
144. *Гусоўскі М.* Песня пра зубра // Старажытная беларуская літаратура. С. 143.
145. Тамсама. С. 142—143.
146. *Длугош Я.* Указ. соч. С. 56.
147. Там же. С. 65.
148. Там же. С. 67.
149. Там же. С. 70.
150. Там же.
151. Там же. С. 72.
152. Там же. С. 77.
153. Там же. С. 80.
154. Там же. С. 81—82.
155. *Шайноха К.* Указ. соч. Т. 2. С. 619.
156. *Барбашев А.* Витовт последние двадцать лет княжения. СПб., 1891. С. 61.
157. *Гейсман П.Л.* Польско-литовско-русский поход в Восточную Пруссию. СПб., 1910. С. 13—14.
158. *Kuczyński S.* Wielka wojna z Zakonem krzyzackim. W-wa, 1966. S. 224—225, 235, 238.
159. *Шайноха К.* Указ. соч. Т. 2. С. 624.
160. *Длугош Я.* Указ. соч. С. 99.
161. *Jučas M.* Žalgirio mušis. Vilnius, 1990. S. 158.
162. *Длугош Я.* Указ. соч. С. 102.
163. Хроника Быховца. С. 79.
164. *Wapowski B.* Op. cit. T. 1. S. 236.

165. *Длугош Я.* Указ. соч. С. 105.
166. *Шайноха К.* Указ. соч. Т. 2. С. 634.
167. *Дельбрук Г.* История военного искусства. Т. 3. М., 1933. С. 303.
168. *Шайноха К.* Указ. соч. Т. 2. С. 636.
169. Там же. С. 640.
170. *Длугош Я.* Указ. соч. С. 110.
171. Там же.
172. Там же. С. 112.
173. Там же. С. 124.
174. Там же. С. 126.
175. *Vojgt J.* Op. cit. Bd. 7. P. 113.
176. *Корчинский И.* Указ. соч. С. 69.
177. Zbior pamiętnikow historycnych o dawnéj Polscze. T. 1. W-wa, 1822. S. 341—344.
178. Ibid. S. 344.
179. *Narbutt T.* Dzeje. T. 6. S. 299.
180. Ibid. S. 305.
181. *Дашкевич И.* Борьба культур и народностей в Литовско-Русском государстве // Киевские университетские известия. Киев, 1884. № 10. С. 296.
182. Codex epistolaris Vitoldi. P. 271.
183. Ibid. P. 245.
184. *Станкевіч Я.* Нарысы з гісторыі Велікалітвы—Беларусі. Нью-Джэрзі, 1978. С. 27.
185. *Мартос А.* Беларусь в исторической государственной и церковной жизни. Мн., 1990. С. 101.
186. Акты, относящиеся к истории Западной России, собранные и изданные Археографической комиссией. Т. 1. СПб., 1846. С. 36; Далее: АЗР.
187. Там же. С. 37.
188. Там же. С. 36.
189. Там же. Примечание. С. 10; Батюшков П.Н. Белоруссия и Литва. СПб., 1890. С. 110.
190. АЗР. Т. 1. С. 36.
191. *Мартос А.* Указ. соч. С. 103.
192. Там же. С. 104—105.
193. *Барбашев А.* Витовт последние двадцать лет княжения. С. 218.
194. *Коцебу У.* Указ. соч. С. 67.
195. Codex epistolaris Vitoldi. P. 411.
196. *Długosz J.* Roczniki. Ks. 11. S. 114.
197. *Барбашев А.* Витовт последние двадцать лет княжения. С. 223.
198. *Prochaska A.* Dzieje Witolda w. ksiecia Litwy. S. 367.
199. Codex epistolaris Vitoldi. P. 259.
200. *Барбышев А.* Витовт последние двадцать лет княжения. С. 156.
201. Zbior pamietnikow historycznych o dawnej Polsce. T. 1. S. 327.
202. *Długosz J.* Roczniki. Ks. 11. S. 185.
203. Хроника Быховца. С. 75—76.
204. Путешествие и посольство господина Гилльбера де Ланнуа // Записки Одесского общества истории и древностей. Одесса, 1853. Т. 3. С. 436.
205. Там же. С. 440.
206. Там же. С. 442.
207. Codex epistolaris Vitoldi. P. 1031—1032.
208. *Kochanowski J.* Witold wielki ksiaze Litewski. Lwow, 1900. S. 136.
209. *Prochaska A.* Ostatnie lata Witołda. W-wa, 1882. S. 19.
210. Ibid.
211. Ibid. S. 20.
212. *Prochaska A.* Dzieje Witolda. w. ksiecia Litwy. S. 373.
213. *Барбышев А.* Витовт последние двадцать лет княжения. С. 164.
214. ПСРЛ. Т. 11. С. 239.
215. Codex epistolaris Vitołdi. P. 688.
216. ПСРЛ. Т. 12. М., 1965. С. 7.
217. ПЛ. Вып. 2. С. 123.
218. *Bogucka M.* Kazimierzs Jagiellonzyk i jego czasy. W-wa, 1981. S. 29.
219. *Барбышев А.* Витовт последние двадцать лет княжения. С. 196.
220. Акты археографической экспедиции. Т. 1. СПб., 1836. С. 17.
221. АЗР. Т. 1. С. 46.
222. Codex epistolaris Vitoldi. P. 798.
223. *Барбышев А.* Витовт последние двадцать лет княжения. С. 352.
224. ПСРЛ. Т. 12. С. 8.
225. Хроника Быховца. С. 82.
226. *Брянцев П.Д.* История Литовского государства с древнейших времен. Вильна, 1889. С. 259.
227. *Długosz J.* Roczniki. Ks. 11. S. 265.

228. Ibid. S. 267.
229. Ibid. S. 269.
230. *Kraszewski J.* Wilno od poczatkow jego do roku 1750. T. 1. Wilno, 1840. S. 125.
231. Codex epistolaris Vitoldi. P. 810.
232. *Prochaska A.* Ostatnie lata Witolda. S. 285.
233. Codex epistolaris Vitoldi. P. 815—818.
234. *Prochaska A.* Ostatnie lata Witołda. S. 207.
235. Codex epistolaris Vitołdi. P. 815—818.
236. Seriptores Rerum Prussicarum. Bd. 3. P. 493.
237. *Długosz J.* Roczniki. Ks. 11. S. 276.
238. *Prochaska A.* Ostatnie lata Witolda. S. 217.
239. Ibid. S. 218.
240. Ibid. S. 162—163.
241. Ibid. S. 219.
242. *Dlugosz J.* Roczniki. Ks. 11. S. 278—288.
243. Ibid. S. 297—298.
244. *Барбышев А.* Витовт последние двадцать лет княжения. С. 252.
245. Там же. С. 258.
246. *Prochaska A.* Ostatnie lata Witolda. S. 230.
247. Codex epistolaris saecali XV. T. 1. Krakow, 1876. P. 246.
248. *Prochaska A.* Ostatnie lata Witolda. S. 280.
249. *Dlugosz J.* Roczniki. Ks. 11. S. 304.
250. *Prochaska A.* Ostatnie lata Witolda. S. 333—334.
251. *Wapowski B.* Op. cit. T. 1. S. 401.
252. *Długosz J.* Roczniki. Ks. 11. S. 312.
253. *Narbutt T.* Dzeje. T. 6. S. 521.
254. *Kraszewski J.* Op. cit. T. 1. S. 130.
255. *Narbutt T.* Dzeje. T. 6. S. 543.
256. Ibid. S. 544—546.
257. Ibid. S. 556.
258. *Коцебу А.* Указ. соч. С. 75.
259. *Dlugosz J.* Roczniki. Ks. 11. S. 316.
260. Ibid.
261. Начало великаго княженія Литовскаго // Временник Московского об-ва истории и древностей Российских. Кн. 10. С. 79.
262. Легенды і паданні. С. 234.

«...НА ВЯЛІКІМ КНЯСТВЕ РУСКІМ»

1. *Грушевський М.* Історія України—Русі. Т. 4. Львів, 1903. С. 516.
2. *Długosz J.* Roczniki. Ks. 11. S. 319.
3. *Грушевський М.* Указ. соч. Т. 4. С. 186.
4. *Długosz J.* Roczniki. Ks. 11. S. 318.
5. Ibid. S. 319.
6. Акты, относящиеся к истории Южной и Западной России. Т. 1. СПб., 1863. С. 11.
7. *Długosz J.* Roczniki. Ks. 11. S. 320.
8. *Prochaska A.* Ostatnie lata Witolda. S. 343.
9. *Грушевський М.* Указ. соч. Т. 4. С. 162—163.
10. *Narbutt T.* Dzeje. T. 7. Wilno, 1840. S. 5.
11. Хроника Быховца. С. 85.
12. Там же.
13. Там же.
14. Там же.
15. *Długosz J.* Roczniki. Ks. 11. S. 329.
16. Ibid. S. 328.
17. *Narbutt T.* Dzeje. T. 7. S. 28—29.
18. Ibid. S. 33.
19. *Коцебу А.* Указ. соч. С. 85.
20. Там же. С. 111.
21. Там же. С. 91.
22. Там же. С. 93.
23. Там же. С. 94.
24. *Stryjkowski M.* Op. cit. T. 2. S. 181.
25. *Коцебу А.* Указ. соч. С. 95.
26. Там же. С. 21.
27. Там же. С. 101.
28. Там же. С. 103.
29. *Lewicki A.* Op. cit. S. 147.
30. *Коцебу А.* Указ. соч. С. 125.
31. *Lewicki A.* Op. cit. S. 143.
32. *Коцебу А.* Указ. соч. С. 142.
33. *Боричевский И.* Православие и русская народность в Литве. СПб., 1851. С. 57.

34. *Коцебу А.* Указ. соч. С. 145.
35. Там же. С. 146.
36. *Narbutt T.* Dzeje. T. 7. S. 136.
37. *Wapowski B.* Op. cit. T. 2. Wilno, 1847. S. 208.
38. *Коцебу А.* Указ. соч. С. 152.
39. Хроника Быховца. С. 87.
40. *Коцебу А.* Указ. соч. С. 147.
41. Там же. С. 153.
42. Там же. С. 154.
43. *Wapowski B.* Op. cit. T. 2. S. 174.
44. *Stryjkowski M.* Op. cit. T. 2. S. 187.
45. *Коцебу А.* Указ. соч. С. 150.
46. Там же. С. 153.
47. *Lewicki A.* Op. cit. S. 160.
48. *Грушевський М.* Указ. соч. Т. 4. С. 210.
49. ПСРЛ. Т. 32. С. 83.
50. Хроника Быховца. С. 86.
51. ПСРЛ. Т. 32. С. 83.
52. *Stryjkowski M.* Op. cit. T. 2. S. 188.
53. *Коцебу А.* Указ. соч. С. 158.
54. Там же.
55. Там же. С. 169.
56. Там же. С. 179.
57. Там же. С. 174.
58. Там же. С. 183.
59. *Stryjkowski M.* Op. cit. T. 2. S. 189.
60. Ibid.
61. *Коцебу А.* Указ. соч. С. 183—184.
62. Хроника Быховца. С. 87.
63. *Lewicki A.* Op. cit. S. 200.
64. *Коцебу А.* Указ. соч. С. 192.
65. Там же. С. 196.
66. Там же.
67. *Lewicki A.* Op. cit. S. 203.
68. *Narbutt T.* Dzeje. T. 7. S. 154.
69. Хроника Быховца. С. 87.
70. *Коцебу А.* Указ. соч. С. 197.
71. Там же. С. 201.
72. Там же.
73. Там же. С. 205.
74. Там же. С. 206.
75. ПСРЛ. Т. 35. С. 232.
76. *Kolankowski L.* Op. cit. T. 1. S. 204.
77. *Грушевський М.* Указ. соч. Т. 4. С. 220.
78. Хроника Быховца. С. 88.
79. Там же.
80. *Wapowski B.* Op. cit. T. 2. S. 246.
81. История Литовской ССР. Вильнюс, 1978. С. 66.
82. Летопись Рюсова. С. 272.
83. *Коцебу А.* Указ. соч. С. 215.
84. Там же. С. 222.
85. Там же. С. 219.
86. Хроника Быховца. С. 88.
87. *Грушевський М.* Указ. соч. Т. 4. С. 220.
88. Хроника Быховца. С. 88.
89. *Lewicki A.* Op. cit. S. 276.
90. *Narbutt T.* Dzeje. T. 7. S. 209.
91. Ibid. S. 211.
92. Ibid. S. 213.
93. Акты, относящиеся к истории Южной и Западной России. Т. 1. С. 12—13; АЗР. Т. 1. С. 48—49.
94. Хроника Быховца. С. 88—89.
95. Codex epistolaris saecali XV. T. 2. P. 261.
96. Хроника Быховца. С. 89.
97. Там же. С. 90.
98. *Halecki O.* Ostatnie lata Swidrygellu i sprawa Wolonska za Kazimierza Jagiellonczuka. Krakow, 1915. S. 22.
99. Ibid. S. 29, 46, 47, 111, 114, 118, 123, 143.

ПАМІЖ СКІЛАЙ І ХАРЫБДАЙ

1. *Bogucka M.* Op. cit. S. 42.
2. *Dlugosz J.* Dziela wszystkie dzejow Polskich. Krakow, 1869. T. 4. Ks. 11—12. S. 621.
3. *Narbutt T.* Dzeje. T. 8. Wilno, 1840. S. 20—21.
4. Хроника Быховца. С. 93.
5. Там же.
6. *Кром М.М.* Меж Русью и Литвой. М., 1995. С. 38—39.
7. ПСРЛ. Т. 32. С. 86.
8. *Stryjkowski M.* Op. cit. T. 2. S. 224.
9. *Dlugosz J.* Dziela wszystkie dzejow Polskich. T. 5. Ks. 13—14. Krakow, 1870. S. 11.
10. Ibid. S. 15.
11. *Koronowicz W.* Slowo dziejów Polskich. T. 1. Lipsk, 1858. S. 202—203.
12. *Golebiowski L.* Dzieje Polski za

panowania Kazmirźa, Jana Olbrachta i Alexandra. W-wa, 1848. S. 22.
13. *Narbutt T.* Dzeje. T. 8. S. 63.
14. *Długosz J.* Dziela wszystkie dzejow Polskich. T. 5. Ks. 13—14. S. 36.
15. Ibid. S. 43—44.
16. АЗР. Т. 1. С. 66.
17. Там же. С. 65.
18. *Długosz J.* Dziela wszystkie dzejow Polskich. T. 5. Ks. 13—14. S. 65.
19. Ibid. S. 91.
20. Ibid. S. 80—81.
21. Ibid. S. 83—84.
22. Ibid. S. 95.
23. *Golebiowski L.* Op. cit. S. 46.
24. Хроника Быховца. С. 97.
25. *Długosz J.* Dziela wszystkie dzejow Polskich. T. 5. Ks. 13—14. S. 97—98.
26. Ibid. S. 98.
27. Ibid. S. 100.
28. Ibid. S. 102.
29. *Golebiowski L.* Op. cit. S. 51.
30. *Długosz J.* Dziela wszystkie dzejow Polskich. T. 5. Ks. 13—14. S. 106.
31. ПСРЛ. Т. 32. С. 87.
32. *Bogucka M.* Op. cit. S. 111.
33. Хроника Быховца. С. 99.
34. ПСРЛ. Т. 32. С. 87.
35. Там же.
36. *Dubiecki M.* Obrazy i studia Historyche, Serya III. W-wa, 1899. S. 160.
37. Ibid. S. 174.
38. *Długosz J.* Dziela wszystkie dzejow Polskich. T. 5. Ks. 13—14. S. 130.
39. *Stryjkowski M.* O Poczatkach. S. 450.
40. *Bogucka M.* Op. cit. S. 140.
41. Wizerunki krolow. S. 214.
42. Хроника Быховца. С. 101.
43. Там же. С. 102.
44. *Długosz J.* Dziela wszystkie dzejow Polskich. T. 5. Ks. 13—14. S. 176.
45. Ibid. S. 176—177.
46. Ibid. S. 184.
47. Ibid. S. 179—180.
48. *Golebiowski L.* Op. cit. S. 55—56.
49. Ibid. S. 56.
50. *Długosz J.* Dziela wszystkie dzejow Polskich. T. 5. Ks. 13—14. S. 199.
51. Ibid. S. 211.
52. Ibid. S. 223.
53. ПЛ. Вып. 2. С. 51.
54. *Długosz J.* Dziela wszystkie dzejow Polskich. T. 5. Ks. 13—14. S. 275—276.
55. Ibid. S. 276.
56. Ibid. S. 301.
57. Ibid. S. 294.
58. Skarbiec diplomatov. T. 2. S. 202.
59. *Гребенский В.* История польского народа. СПб., 1910. С. 88.
60. *Bogucka M.* Op. cit. S. 212.
61. *Golebiowski L.* Op. cit. S. 259.
62. *Старостин И.П.* О месте судебника Казимира 1468 г. в праве ВКЛ // Культурные связи народов Восточной Европы в XVI в. М., 1976. С. 108.
63. *Kolankowski L.* Op. cit. T. 1. S. 298.
64. ПСРЛ. Т. 25. С. 284.
65. ПЛ. Вып. 2. С. 169.
66. ПСРЛ. Т. 25. М.-Л., 1949. С. 284.
67. *Długosz J.* Dziela wszystkie dzejow Polskich. T. 5. Ks. 13—14. S. 440.
68. Ibid. S. 515.
69. *Papée F.* Studya i szkice z czasów Kazimierza Jagellończyka. W-wa, 1907. S. 146.
70. *Długosz J.* Dziela wszystkie dzejow Polskich. T. 5. Ks. 13—14. S. 658.
71. Послания Ивана Грозного. М.-Л., 1951. С. 422.
72. Сб. РИО. Т. 35. СПб., 1882. С. 371.
73. Там же. Т. 41. СПб., 1884. С. 301.
74. *Карпов Г.* История борьбы Московского государства с Польско-Литовским. Ч. 1. СПб., 1867. С. 123.
75. Литовская метрика. Т. 1. СПб., 1910. С. 333.
76. *Грушевський М.* Указ. соч. Т. 4. С. 260.
77. Там же. С. 327.
78. Литовская метрика. Т. 1. С. 433.
79. *Карпов Г.* Указ. соч. Ч. 1. С. 135.
80. *Narbutt T.* Dzeje. T. 8. S. 245.
81. *Stryjkowski M.* Op. cit. T. 2. S. 291.
82. ПСРЛ. Т. 35. С. 123.

«А НАЗЫВАЛІ ЯГО МІЛАСЦІВЫМ»

1. *Меховский М.* Тракт об двух Сарматиях. М., 1939. С. 25.
2. АЗР. Т. 1. С. 115.
3. *Golebiowski L.* Op. cit. S. 347.
4. *Церетели Е.* Елена Иоановна великая княгиня литовская и русская, королева польская. СПб., 1898. С. 140—141.
5. Там же.
6. *Dubiecki M.* Op. cit. S. 170.
7. *Церетели Е.* Указ. соч. С. 145.
8. ПЛ. Вып. 2. С. 84.
9. АЗР. Т. 1. С. 115.
10. *Любавский М.* Литовско-Русский сейм. М., 1900. С. 136.
11. *Golebiowski L.* Op. cit. S. 358.
12. Сб. РИО. Т. 35. С. 216.
13. *Карпов Г.* Указ. соч. Ч. 1. С. 135.
14. Там же. Ч. 2. С. 10.
15. Там же. С. 13.
16. Там же. С. 18.
17. АЗР. Т. 1. С. 138.
18. *Карпов Г.* Указ. соч. Ч. 2. С. 24.
19. Там же. С. 28.
20. Там же.
21. Там же. С. 29.
22. Там же. С. 32.
23. Там же. С. 30.
24. Там же. С. 36.
25. *Муханов П.А.* Сборник Муханова. М., 1836. С. 79
26. *Карпов Г.* Указ. соч. Ч. 2. С. 38.
27. Там же. С. 40.
28. Там же. С. 44.
29. Там же.
30. Там же. С. 50.
31. *Любавский М.* Указ. соч. С. 139.
32. *Карпов Г.* Указ. соч. Ч. 2. С. 51.
33. Хроника Быховца. С. 108.
34. *Соловьев С.* Указ. соч. Кн. 3. Т. 5—6. М., 1989. С. 106.
35. *Карпов Г.* Указ. соч. Ч. 2. С. 52.
36. Там же. С. 56.
37. *Narbutt T.* Dzeje. T. 8. S. 350.
38. Сб. РИО. Т. 35. С. 293.
39. *Церетели Е.* Указ. соч. С. 191.
40. *Карпов Г.* Указ. соч. Ч. 2. С. 59.
41. *Муханов П.А.* Сборник Муханова. С. 56.
42. *Карпов Г.* Указ. соч. Ч. 2. С. 63.
43. *Меховский М.* Указ. соч. С. 25.
44. *Papée F.* Aleksander Jagellonczyk. Krakow, 1949. S. 24.
45. Хрестоматия по истории Белоруссии. С. 44.
46. АЗР. Т. 1. С. 214.
47. Там же. С. 210.
48. Хроника Быховца. С. 114.
49. *Брянцев П.Д.* Указ. соч. С. 308.
50. *Golebiowski L.* Op. cit. S. 453.
51. Ibid.
52. *Меховский М.* Указ. соч. С. 26.
53. *Церетели Е.* Указ. соч. С. 230.
54. Летопись Рюссова. С. 299.
55. ПСРЛ. Т. 8. С. 253.
56. *Базилевич К.В.* Внешняя политика Русского централизованного государства, вторая половина XV в. М., 1952. С. 494.
57. Хроника Быховца. С. 117.
58. *Карпов Г.* Указ. соч. Ч. 2. С. 91.
59. *Golebiowski L.* Op. cit. S. 483.
60. *Брянцев П.Д.* Указ. соч. С. 311.
61. *Соловьев С.* Указ. соч. Кн. 3. Т. 5—6. С. 116—117.
62. *Елагин Н.* Елена Иоановна, великая княгиня литовская и королева польская // ЖМНП. 1846. № 4. Отд. 2. С. 70.
63. *Papée F.* Aleksander Jagellończyk. S. 59.
64. Сб. РИО. Т. 35. С. 439.
65. *Stryjkowski M.* Op. cit. T. 2. S. 322.
66. Хроника Быховца. С. 121.
67. ПСРЛ. Т. 35. С. 167.
68. АЗР. Т. 2. СПб., 1848. С. 39.
69. *Albertrandeg J.* Panowanie Kazimierza, Jana Alberta i Alexandra Jagiellończyków. T. 2. W-wa, 1827. S. 255.
70. *Меховский М.* Указ. соч. С. 25.
71. Сб. РИО. Т. 41. СПб., 1884. С. 533.
72. *Варонін В.* Два акты пра бітву пад Клецкам у 1506 г. // Беларускі гістарычны агляд. 1995. Т. 2. Сш. 2. С. 283.
73. Kronika Marcina Bielskiego. T. 2. Ks. 4—5. Sanok, 1856. S. 933.

ЗМЕСТ

АД АЎТАРА 3
РАГВАЛОДАЎ РОД 5
РАГВАЛОД, РАГНЕДА 7
«АКАЯННЫ» 19
СВЯТАПОЛК 21
УНУК РАГВАЛОДА 33
БРАЧЫСЛАЎ ІЗЯСЛАВІЧ 35
ВЕШЧАЯ ДУША 39
УСЯСЛАЎ БРАЧЫСЛАВІЧ 41
НЯСПРАЎДЖАНЫЯ НАДЗЕІ ... 53
ГЛЕБ МЕНСКІ 55
У ЧАСЫ МІЖУСОБІЦ 65
РАГВАЛОД-ВАСІЛЬ 67
ЗА ДВА СТАГОДДЗІ ДА ГРУНВАЛЬДА 79
УЛАДЗІМІР ПОЛАЦКІ 81
«ВЯЛІКІ КАРОЛЬ ВАЛЬДЭМАР» 84
ПОЛАЦКАЕ КНЯСТВА НАПРЫКАНЦЫ XII СТАГОДДЗЯ 86
ПАЧАТАК ВАЙНЫ З ОРДЭНАМ 88
НАСТУП ОРДЭНА 93
ПАДМАНЛІВАЯ ВЕЛІЧ 99
МІНДОЎГ 101
«ЛИТВА МИНДОВГА» 102
ШЛЯХ ДА ЎЛАДЫ 108
ВАЙНА З ГАЛІЦКА-ВАЛЫНСКІМ КНЯСТВАМ 110
ПРАЗВАЛІ ЯГО ДОБРЫМ 118
ЦЯЖАР УЛАДЫ 119
ЗМОВА ТРАНЯТЫ 121
НАВАГРАДСКІ КНЯЗЬ 125
ВОЙШАЛК 127
СЛАЎНЫ ВАЛАДАР 137
ТРОЙДЗЕНЬ 139
СНЫ АБ РАДЗІМЕ 151
ДАЎМОНТ 153
МЕЧ І СЛАВА 161
ДАВЫД ГАРАДЗЕНСКІ 163
ВІЦЯЗЬ ПАГОНІ 173
ВІЦЕНЬ 175
ЗАГАДКІ ВІЦЕНЯ 175
ПАЧАТАК КНЯЖАННЯ 179
«ИЗМЫСЛИ СЕБЕ ГЕРБ» 185
«І ПАНАВАЎ ШМАТ ГАДОЎ» .. 187
ДОБРЫ ВАЛАДАР 191
ГЕДЫМІН 193
НОВАЯ СТАЛІЦА ВЯЛІКАГА КНЯСТВА 195
ПАХОД НА КІЕЎ 199
МІРНАЯ ІНІЦЫЯТЫВА ГЕДЫМІНА 202
ПЕРАМОВЫ З ПАПСКІМІ ПАСЛАМІ 209
БАРАЦЬБА З ОРДЭНАМ 213
ЗБІРАННЕ ЗЕМЛЯЎ 217
«...УСЕ СВАЕ СІЛЫ АДДАЎ» ... 220
ВЯЛІКІ СЛАВАЙ 223
АЛЬГЕРД 225
СЫНЫ ГЕДЫМІНА 225
ДАПАМОГА ПСКОВУ 228
ВЯЛІКІ КНЯЗЬ 230
БІТВА НА СТРАВЕ 236
«ДБАННЕ АБ ДЗЯРЖАВЕ СВАЁЙ» 239
«...КАБ УСЯ РУСЬ НАЛЕЖАЛА ЛІТВЕ» 243
НАСТУП ОРДЭНА 247
БІТВА КАЛЯ СІНІХ ВОДАЎ 250

ГАДЫ ВЫПРАБАВАННЯЎ 254
«КАП'Ё ЛІТОЎСКАЕ СТАЯЛА ПАД МАСКВОЙ» 258
РУДАЎСКАЯ БІТВА 263
«ТРЫМАЎ УЛАДУ ВЯЛІКУЮ...» 266
ЗНОЎ ВАЙНА 270
ЧАС ПОДЗВІГУ НАДЫШОЎ ... 275
АНДРЭЙ ПОЛАЦКІ 277
СЛАЎНЫ ВА ЎСІХ ЗЕМЛЯХ ... 285
ВІТАЎТ 287
ЦЯЖКІЯ ЧАСЫ 291
ЯГАЙЛАВА ЗДРАДА 294
КЕЙСТУТ — ВЯЛІКІ КНЯЗЬ ЛІТОЎСКІ 301
УЦЁКІ 309
ІЗГОЙ 313
З КРЫЖАКАМІ СУПРАЦЬ ЛІТВЫ 315
ТРЫУМФ ЯГАЙЛЫ 320
ЯГАЙЛА — ПОЛЬСКІ КАРОЛЬ 328
ПАЎСТАННЕ АНДРЭЯ ПОЛАЦКАГА 332
ХРЫШЧЭННЕ ЛІТВЫ 333
ІЗНОЎ ІЗГОЙ 335
НАДЗЕЯ НА ПЕРАМОГУ 339
ПАХОД НА ВІЛЬНЮ 342
«МНОГА ЛІХА ЎЧЫНІЎ» 344
ПРЫМІРЭННЕ З ЯГАЙЛАМ ... 346
«ПАНОВАННЕ САМОВЛАДНОЕ» 350
ПАСОЛЬСТВА КОНРАДА КІБУРГА 359
«ПОЎНЫ ДАБРАТЫ І СПРАВЯДЛІВАСЦІ» 365
САЮЗ З ХАНАМ ТАХТАМЫШАМ 367
«КАРОЛЬ ЛІТВЫ І РУСІ» 372
ТРАГЕДЫЯ НА ВОРСКЛЕ 375
У ПОШУКАХ ВЫЙСЦЯ 383
«ПАХОДНЯ ВАЙНЫ» 391
СЛОВА ВАСІЛЯ ДЗМІТРЫЕВІЧА 393
НАПЯРЭДАДНІ ВЯЛІКАЙ ВАЙНЫ З ОРДЭНАМ 398
ГРУНВАЛЬД 406
ПАХОД НА МАЛЬБАРГ 422
ДЗЯРЖАЎНЫ КЛОПАТ 427
КАРАЛЕЎСКАЯ ГОДНАСЦЬ ... 445
БАЦЬКА ДЗЯРЖАВЫ 451
ШЛЯХ ДА МАРЫ 457
СТРАЧАНАЯ НАДЗЕЯ 461
АПОШНЯЕ СУЦЯШЭННЕ 465
«...НА ВЯЛІКІМ КНЯСТВЕ РУСКІМ» 477
СВІДРЫГАЙЛА 479
ВАЙНА ЗА ПАДОЛЛЕ 484
ПЕРАВАРОТ 489
ПАХОД НА ЗЯМЛЮ ЛІТОЎСКУЮ 494
«...ЗЛА НЯМАЛА ЗРАБІЛІ» 499
НЯЎДАЧЫ СВІДРЫГАЙЛЫ 503
ПЕРАМОГА ЖЫГІМОНТА КЕЙСТУТАВІЧА 510
ВЫРАК ГІСТОРЫІ 514
ПАМІЖ СКІЛАЙ І ХАРЫБДАЙ 517
КАЗІМІР 519
АБРАННЕ ПОЛЬСКІМ КАРАЛЁМ 526
ПАН АБОДВУХ НАРОДАЎ 530
ПЕРАЛОМ 534
НЕСПАКОЙ 540
КАМПРАМІСЫ 549
ЗМОВА 553
АПОШНІЯ ГАДЫ 557
«А НАЗЫВАЛІ ЯГО МІЛАСЦІВЫМ» 561
АЛЯКСАНДР 563
ПАДНЯСЕННЕ НА ВЕЛІКА-КНЯЖАЦКІ ПАСАД 564
ВАЙНА З МАСКОВІЯЙ 567
ШЛЮБ З АЛЕНАЙ ІВАНАЎНАЙ 572
«НЕЛЮБОЎ» З ІВАНАМ III ... 576
МАЛДАЎСКІ ПАХОД 578
ЗАМЯТНЯ ВЯЛІКАЯ 582
СЛОВА Ў АПРАЎДАННЕ АЛЯКСАНДРА 587
ПРАЦЯГ ВАЙНЫ З МАСКОВІЯЙ 590
СТРАЧАНАЯ ПЕРАМОГА 595
ДА АБСАЛЮТНАЙ УЛАДЫ ... 601
ЧАС ПЕРАМОГІ 605
ХРАНАЛОГІЯ ПАДЗЕЙ 609
БІБЛІЯГРАФІЯ 624



Навукова-папулярнае выданне

Чаропка Вітаўт (Віктар Кузьміч)

ІМЯ Ў ЛЕТАПІСЕ

2-ое выданне, дапрацаванае

Рэдактар *С.І.Міхайлава*
Мастацкі рэдактар *Л.І.Мялоў*
Тэхнічнае рэдагаванне
і камп'ютэрная вёрстка *Т.А.Тарасенка*
Карэктары *Л.А. Адамовіч, Л.Р. Кузьміна,*
Л.К. Сямёнава
Камп'ютэрны набор *І.У.Грыцэль, А.У.Гурыновіч*

Падпісана ў друк з гатовых дыяпазіціваў 10.06.2003. Фармат 60×90 $^{1}/_{16}$. Папера афсетная. Гарнітура Балтыка. Афсетны друк. Ум.друк.арк. 40,0. Ул.-выд.арк. 41,22. Тыраж 3500 экз. Зак. 66

Рэспубліканскае унітарнае прадпрыемства «Выдавецтва «Беларусь» Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Ліцэнзія ЛВ № 2 ад 31.12.2002 г. Мінск, праспект Машэрава, 11

Рэспубліканскае унітарнае прадпрыемства «Мінская фабрыка каляровага друку». 220024, Мінск, Каржанеўскага, 20

менедѣла. и сенѣ мелю бнѣ шкмене. сомладенцемъ.
и повелѣ ѣ ноу строити въ всю половецкоую. и сповѣда
посагле ѣ. и не вѣстина постеле свѣтле. въ храминѣ.
да пиша е потиетыю. и на ласо сотвори. и да шемчь
спѣ и на славо вроуческоу сагъ:



ре ѣ ко шнидетин ѡць. руны стопа. ѡчье гаедиными
шихода. воломерѣ ре. а сто тами нѣ зѣ. и повергъме
сѣ. и со зла бояры и повеѣ мъ. ѡни ре шлоу не бнѣе а дета
тидѣ ѣ. ново зѣ ни ѡчино ѣе. и да ѣ сосѣмъ сво
имъ. володимеро же коу строи горо. и да ѣма. и нареч
и мла гра томо. и да слабль. и ѡтоле мечь возима
ѣть. роговоложи и вноци. противъ ѣ яро слав лювно:





ѣлѣто преставѣ и да слав ѣсто полчи. де. сг. лѣ ѣ.
х лѣ. престави кнѣзь полоцкыи. борѣ. всѣлѣто. бы
водавелиса. потопилюи жита и хоромы оуне се. все
желѣ ѣ переѣша. печерамецрквь. дмитреи. и на реко
шаюпетра. согрехомъ велико. и не право. в толѣто
заложы црквь камено. мстислав ъ. стогофеѣра.
ѡснѣже всеславнѣхъ нцее. и со сказаша вседо щии.
ко роговолодо. держащо и володѣющо. и сна що по ти
ско юземлею. а володимиро соуще в моѣ городе. и
кртиро у ко юземлю. а сие напи сахо зда ѣ. памати
дѣла. а володимиро младо соуще. нѣщетогано. нѣ ѣ
оуне го оуне го добрына. боѣ пода храборъ. и на радемъ.
моу. и сеи посла ярого володо. и просноуне го дщерне го
за володимира. ѡнже ре ѣ жерне своей. хотешли за во
димира. ѡна же ре. не хочюро зотн. добничча. но ѣро
по ка хочю. г ѣ бороть воло. пришелъ и зъ ламори и.
и ма ше волость свою полтеск ѣ. и слышавже володи
миръ. и разгнева ѣ ѡ той рѣчи. не хочюла зъ робничча.
по ка лися добрына. и и сполнися ѣ ярости. и тоѣмъша
вой. и до стана полтеск ѣ. и побѣди стародоволода.

ВЫДАВЕЦТВА

«БЕЛАРУСЬ»



ВІТАЎТ ЧАРОПКА ІМЯ Ў ЛЕТАПІСЕ